Іван Шамякін

Роздум на апошнім перагоне

Дзённікі 1980-1995 гадоў

Мінск
«Мастацкая літаратура»
1998

УДК 882.6-4
ББК(4Беи)6
Ш 19

ISBN 985-02-0187-8

© І. П. Шамякін, 1998.

Да чытача

Дзённікі, напэўна, самы масавы жанр літаратуры. Іх пішуць усе — школьнікі, якія яшчэ не зусім авалодалі арфаграфіяй, і старыя акадэмікі, якія ўжо забываюць яе. Сярод мноства гэтых чалавечых дакументаў пісьменніцкія дзённікі займаюць асаблівае месца: да іх павышаная ўвага чытача. У адрозненне ад навуковай працы, мастацкага твора, нават лірычнага верша, дзе мае быць аб'ектыўнасць, дзённік вызначаецца глыбокай суб'ектыўнасцю, гэта — дакумент настрою аўтара. Але менавіта ў гэтым і цікавасць яго.

Я пісаў дзённік у юнацтве, пра што чытачы даведаюцца, пісаў у арміі. На жаль, вельмі эпізадычна звяртаўся да гэтага жанру ў гады сваёй літаратурнай маладосці. Залішняя прагнасць да напісання мастацкіх твораў і ўвогуле прагнасць да жыцця не пакідалі часу на «калупанне» ў сваёй душы і галаве.

Да дзённіка я вярнуўся, калі пастарэў: калі пераваліла за шэсць-дзесят. пацягнула на запісы і падзей дня сённяшняга, і ўспамінаў аб часе мінулым — аб сабе, сям'і, настаўніках, калегах, аб жыцці, палітыцы.

Гадоў восем назад я апублікаваў запісы 1982-1984 гадоў, назваўшы іх «Карэнні і галіны». У «дзённіку» тым дзевяноста працэнтаў занялі ўспаміны пра далёкае — расказ пра дзядоў, бацькоў маіх і маёй жонкі, пра сваякоў з яркімі характарамі і пра маё лясное маленства. Дзённік склаў палову аднайменнай кнігі, дапоўненай успамінамі пра Якуба Коласа, Пятра Глебку, Івана Мележа, Петруся Броўку, Андрэя Макаёнка. Расказ пра гэтых самабытных людзей, дружбу з якімі падарыў мне лёс,— таксама своеасаблівы дзённік, хіба толькі ў дзённіку пра людзей пішаш больш лаканічна, а ў спецыяльных нарысах — шырока. Пра Андрэя Макаёнка я напісаў цэлую аповесць, якую так і назваў — «Аповесць пра сябра».

Гадоў пяць (1985-1989) зноў дзённікавыя запісы я вёў эпізадычна — акунуўся ў мастацкія творы. Але ў апошнія гады амаль увесь творчы час прысвяціў успамінам, напісаў не адну сотню старонак. Розняцца яны ад «Карэнняў і галін» тым, што падзеі нашага бурнага часу, як кажуць, дзень сённяшні вымушае прысвячаць яму непараўнаўча больш месца. Але нямала ўплецена ўспамінаў пра сябе на вайне, пра свае першыя крокі ў літаратуры, дапоўнены раней напісаныя партрэты Коласа, Броўкі, іншых сваіх калег.

Няхай чытача не здзіўляюць некаторыя парушэнні храналогіі: асобныя запісы 1982-1983 гадоў ідуць раней запісаў 1981 года. Я гэта зрабіў знарок. Прычыну, бадай, растлумачу: гэтая частка дзённікаў —

успаміны пра маіх бацькоў, сваякоў, пра маленства і юнацтва. І я хацеў, каб іх прачыталі раней: ведаючы біяграфію маю, вытокі творчасці, чытачам будзе больш зразумелы мой роздум на апошнім перагоне.

Аўтар

Май 1982 года

З 13 мая знаходжуся ў маскоўскай бальніцы. 2 мая адчуў дыскамфорт у левым воку. 5 мая акуліст падняла трывогу, паказала прафесару Т. В. Бірыч. Тромб сасуда. Паклалі ў рэспубліканскую бальніцу. Праз тыдзень, нягледзячы на інтэнсіўнае лячэнне, я, па сутнасці, страціў зрок левага вока: густы туман, заслона. Кансіліум мінскіх прафесараў вырашыў накіраваць мяне ў вочнае аддзяленне гэтай бальніцы.

За 12 дзён урачы нібыта бачаць аб'ектыўнае паляпшэнне, я ж асаблівага зруху не адчуваю, хіба трохі выразней вырысоўваюцца блізкія прадметы, дальнія засланы тым жа туманам.

Сусед па палаце Фёдараў А. А., работнік Міністэрства спецмантажных работ, чалавек вясёлы, цёрты, з тым жа дыягназам, але ў яго гэта ўпершыню здарылася дзевяць гадоў назад, суцяшае: магло быць горш — тромб мог патрапіць у іншы сасуд. Суцяшэнне, безумоўна, але сумнае.

Л. П. Чагіна, наведваючы мяне ў Мінску, махнула рукой: у яе мужа гэта здарылася 27 гадоў назад.

— І што?

— Нічога. Жыве з адным вокам. Працуе. Чытае больш за мяне.

Суцяшэнне весялейшае. Але пры ўсіх філасофскіх развагах (пераступіў 60 — рыхтуйся да ўсяго!) настрой цяжкі.

Палохае нейкая паслядоўнасць удараў лесу, іх спалучэнне: пералом рукі, смерць сястры Галі, цяпер — вока.

Думаю, гісторыя з раманам, расчараванне ў людзях, якія абвяшчалі сябе мнімымі сябрамі, не апошнюю ролю адыгралі ў захворванні. Ахапіла нуда. І крыўда. Столькі рабіў. Столькі дапамагаў людзям. Забяспечыў мрыстойнае жыццё сям'і. З верасня мінулага года рамантаваў дачу — пераначаваў адну ноч... І вось — доўгая бальніца. Вясной. Улетку. Тут, у Кунцаве, нядрэнны парк, выходжу гуляць, але чамусьці не грэюць гэтыя сосны, бярозы. Здаюцца чужымі. Ад настрою? Чатыры першыя дні наведвала Маша, жонка прывезла мяне сюды. Зазірае мой франтавы сябар Віктар Вольскі. У нядзелю была наша зямлячка, кансультант Саюза пісьменнікаў СССР

Валянціна Шчадрына. Як гэта важна — увага блізкіх і сяброў! Нідзе яе не цэніш так, як у бальніцы.

Цяпер я разумею старых акцёраў. Самае страшнае — сысці са сцэны і быць забытым пры жыцці. Пры эгаізме нашых вучняў, пры іх веры ў сваю геніяльнасць здарыцца такое можа нават з нашым братам, пісьменнікам. У нейкай меры гэта перажыў Міхась Лынькоў. Я разумеў яго, і ён быў удзячны за мае наведванні дома, у бальніцы, за тое, як я гаварыў пра яго ў сваіх артыкулах, выступленнях.

Быў Віктар Вольскі. Сядзелі ў парку гадзіну, абмяркоўвалі Харчовую праграму. Дакументы сур'ёзныя. Дай бог, каб выконваліся яны лепш, чым многія папярэднія добрыя пастановы.

31 мая

Настрой сапсаваны. Сёння, пасля выхадных, я не прачытаў сваім хворым вокам і першы радок, які, між іншым, прачытаў яшчэ тыдзень назад. Па сутнасці, ніякага паляпшэння, відаць, проста прывыкаю жыць з адным вокам. Канешне, жыць можна і з адным вокам. Магчыма, і працаваць. Але ўсё роўна сумна.

У пятніцу і суботу была Маша. Праводзіла са мной гадзін па шэсць-сем. І гэта было ўжо амаль нармальнае жыццё: без нуды, без хандры, без сумных думак. Звычайная бытавая гаворка, больш — аб дзецях, менш — аб справах, зусім мала — аб літаратуры, пра яе ўсё сказана. Як гэта важна, каб побач быў блізкі чалавек. А хто бліжэй за жонку?! Мы хораша пражылі свае 42 гады. Мы любілі адно аднаго. І любім. Хоць характар любові зусім іншы, чым у маладосці. Якасна іншы. Адбылося поўнае парадненне. Роднасць душ, агульнасць жыцця, прывычак, клопатаў. Ёсць свае чары і ў такім узросце, свае радасці. Але ўсё часцей і часцей надараюцца беды. Гэта палохае. Пачынаеш жыць з аглядкай — не стукнула б яшчэ з якога боку! Можа, трэба і праз такое прайсці? А потым ужо наступіць супакаенне нават пры хзаробах. Але ж хочацца яшчэ жыць поўным жыццём! Часам думаеш: выйду з бальніцы — і буду жыць зусім інакш. Як? Не буду! Будзе тое ж: гарэнне, хваляванне, выступленні, жаданне пісаць. Але будзе горш: жаданне ёсць, а сілы няма — найгоршая трагедыя. Хоць, між іншым, вось зараз і пісаць не хочацца. Ёсць сюжэты, але ўсе здаюцца дробнымі. Чаму? Раней ніводзін сюжэт не здаваўся дробным. Пра ўсё пісалася з цікавасцю. Як я пісаў Леніна? Здаецца, палітыка, а хвалявала па-сапраўднаму. Грэла тэма, захапляла ідэя, інтрыгаваў падтэкст.

У бяссонныя ночы — чаму раптам бяссонніца — ад хваробы, ад лякарстваў? — усё яшчэ жыву раманам, «пракручваю» сюжэт,

правяраю сітуацыі, дэталі. Здзіўляюся, што помню цытаты, асабліва ленінскія. Ніводным творам, пасля завяршэння, не жыў так доўга. Хачу асэнсаваць — для сябе! — чаму пад старасць пацягнула на гістарычную тэму, ды яшчэ такую,— адказную і складаную. Другая і трэцяя частка дагэтуль «ходзяць па інстанцыях». Некаторыя «сябры» папсавалі мне нервы, можа, давялі да слепаты. Але тут, у бальніцы, я спакойны: адчуванне такое, што я напісаў сур'ёзную рэч. А калі яе апублікуюць — якое гэта мае значэнне?!

Крытыка і чытачы лічылі мяне пісьменнікам сучаснай тэмы. Хоць, прызнаюся, сам я не думаў так катэгарычна, што я толькі распрацоўваю надзённыя тэмы. Мне здавалася, што ў кожным маім рамане, кожнай аповесці прысутнічае і гісторыя. У прыватнасці — Вялікая Айчынная вайна, каторая стала ўжо для нас гісторыяй.

Першы свой твор пра вайну «Глыбокая плынь» я напісаў роўна праз тры гады пасля нашай перамогі над фашысцкай Германіяй. Сказаць, што я пісаў гістарычны раман, нельга было, праз тры гады гэта была самая што ні ёсць найсучаснейшая тэма. Тэма, якая хвалявала ўвесь народ, кожнага чытача.

Пазней жа, калі ўжо ў сталым узросце — праз дваццаць, праз трыццаць гадоў пасля вайны — я звяртаўся да гэтай тэмы, то ўзнімаў яе па-рознаму. І непасрэдна пісаў пра вайну, як аповесці «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч». І рэтраспектыўна, калі лёс герояў цягнуўся з вайны, адтуль пачыналіся сюжэтныя калізіі — так, у прыватнасці, пабудаваны раманы «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Вазьму твой боль». Дарэчы, што датычыцца «Сэрца на далоні» і асабліва «Снежных зім», то там гісторыя прысутнічае яўна. Многія ўдзельнікі партызанскага руху на Беларусі пазналі прататыпаў, пазналі тыя падзеі, якія леглі ў аснову калізій, у аснову сюжэтаў гэтых раманаў.

Чаму я, пісьменнік сучаснай тэмы — нельга адмаўляць гэтага,— узяўся за тэму рэвалюцыі, за тэму Леніна?

Думаю, што многія з нас, савецкіх літаратараў, людзей партыйных, мараць калі-небудзь напісаць вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна, кожны — у сваім жанры. Прасцей, відаць, гэта паэтам. І яны ўнеслі найбольшы ўклад у мастацкую Ленініяну. Хоць такі эпічны вобраз, як у Маякоўскага, у яго паэме, яшчэ не створаны.

У беларускай літаратуры, у беларускім мастацтве, калі гаварыць увогуле пра ўсё, што зроблена ў Ленініяне, безумоўна, больш плённа папрацавалі нашы скульптары — такія, як Азгур, Бембель, Селіханаў, Анікейчык,— і нашы жывапісцы. Думаю, яны зрабілі найбольшы ўклад у Ленініяну. Нямала зроблена паэтамі, пачынаючы ад Купалы і Коласа, Броўкі, Куляшова, Панчанкі і канчаючы самымі маладымі,

якія толькі пачынаюць сваё творчае жыццё. Значна менш тэма рэвалюцыі, Леніна распрацавана ў нашай прозе і драматургіі. Тлумачыцца гэта, думаю, многімі прычынамі. І маладосцю самой літаратуры, і адноснай маладосцю нашых празаікаў і драматургаў, і, магчыма, пэўнай бояззю.

Я таксама не адразу адважыўся. Хоць даўно-даўно пра гэта думаў. Нясмела прыступіў да гэтай тэмы гадоў пятнаццаць назад, напярэдадні стагоддзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. З чаго пачынаць? Пачаў перачытваць Леніна. І працы фундаментальныя, тэарэтычныя, і галоўным чынам яго пісьмы, тэлеграмы савецкага перыяду. Таму што гэтыя пісьмы, гэтыя тэлеграмы датычацца і самых значных падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, будаўніцтва сацыялістычнага ладу і лёсу вельмі многіх людзей.

Узяў я пяцідзесяты том Збору твораў Уладзіміра Ільіча. І раптам чытаю такую тэлеграму:

«В Московский продсовдеп.

Прошу дать удостоверение Аксинье Емельяновой Кузнецовой, живущей в г. Москве, по Цветному бульвару, в доме № 25 (Морозова), кв. 12, в том, что Московский продсовдеп не имеет ничего против разрешения ей провезти в Москву собственный (не покупной) хлеб в количестве от 2 до 4 пудов (подчеркнуто) от братьев Кузнецовой, Дворецких, живущих в деревне Озерки, Веневского уезда, Тульской губернии.

Прошу уведомить меня об исполнении.

Пред СНКВ. Ульянов (Ленин)».

Не магла не ўсхваляваць такая тэлеграма. Звяртаю ўвагу, як гэта напісана. Не можа быць ніякага сумнення, што такая запіска ў Маскоўскі прадсаўдэп магла быць напісана толькі ў прысутнасці самой прасіцельніцы. З такімі падрабязнасцямі, з такім адрасам — дом Марозава! Адразу фантазія пачынае працаваць у напрамку стварэння праўдападобнасці сітуацыі. Простая маскоўская работніца ў вельмі цяжкі час — гэта напісана 12 снежня 1918 года, калі харчовае становішча Масквы, Петраграда, іншых прамысловых цэнтраў было надзвычай цяжкае і ў сувязі з гэтым была ўведзена хлебная манаполія, уведзены прадатрады — з тым, каб прысекчы на корані спекуляцыю хлебам і прадуктамі,— раптам звяртаецца да Уладзіміра Ільіча, і ён разумее яе становішча. Тут жа піша вось такую запіску. Канечне, жанчыну гэтую ўжо знайсці нельга было, аднак аднавіць усю карціну, як гэта было, не ўяўляла цяжкасці. І я сеў —

самае простае сесці за рабочы стол — і напісаў апавяданне «Хлеб». Апавяданне было хораша прынята, і за гэты час, гадоў за трынаццаць, многа разоў перавыдавалася, перакладзена на многія мовы народаў СССР і замежныя.

Поспех невялікага апавядання натхніў мяне: значыцца, умею нешта зрабіць і ў гэтай тэме. І я далей пачаў распрацоўваць яе. Напісаў аповесць «Першы генерал». Там, праўда, толькі адзін эпізод, адзін раздзел сустрэчы з Леніным, але гэта яшчэ адна спроба напісаць вобраз Уладзіміра Ільіча. Подступы. Подступы, уласна кажучы...

Мой дзённік ператвараецца ў мемуары. Не магу не пісаць. Усюды пісаў — у санаторыях, у бальніцы, як толькі мог сесці за стол. Адзіная радасць. Тут, у бальніцы,— асаблівая. Каб прыйшоў сюжэт апавядання! Але, можа, так і лепш: пра сябе. Трэба ж калі-небудзь аглянуцца і на сябе, зрабіць рэвізію таго, што стварыў за многія гады.

Глядзеў тут фільм Ю. Сямёнава «7 снежня». Маленькі каменьчык кінуў аўтар у Каменева. Далікатненька гэтак. Іграе інтэлігентна — сімпатычны акцёр. А больш нікога не крануў. Колькі разоў размова ідзе пра перагаворы з немцамі — і ні слова пра Троцкага. Дыпламаты!

Ляжу і думаю вось аб чым. У апошнія гады ў літаратуру, у кіно, на сцэну тэатра выведзены ўсе гістарычныя бандыты: цары, Бенкендорф, Сталыпін, Распуцін, Каледзін, Керанскі, Карнілаў, Дзянікін, Калчак, Савенкаў (гэты стаў галоўным героем многіх фільмаў) і далей — Гітлер, Мусаліні, Гебельс, Герынг, уся фашысцкая хеўра. Ну, Чэрчыль — гэта ўжо ладна. Усё ж саюзнікам быў.

Пры Сталіне ўсе гэтыя персанажы хіба толькі асцярожна ўціскаліся ў раманы. У кіно, у спектаклі — ні-ні. Безумоўна, мастацкая гістарыяграфія стала больш поўнай і праўдзівай. Але хто, калі налажыў вета на Троцкага, Зіноўева, Каменева? Ёсць жа і ленінскія ацэнкі многіх з гэтых «рэвалюцыянераў». Каму трэба такое маўчанне?

Божа мой! Чэрвень! Лета праходзіць у бальніцы! А я так хораша адрамантаваў дачу, так хацелася правесці там лета, у сям'і, з унукамі! Учора прасіўся дадому. Урачоў гэта здзівіла. Яны прывыклі да кантынгенту, які ў бальніцы гэтай і лечыцца і адпачывае. Большасць пенсіянераў. Куды ім спяшацца? Ды і тым, хто ў дзяржплане, у міністэрствах? Работа ідзе. Як яна ідзе — пра гэта любяць паразважаць, пакрытыкаваць уласныя парадачкі, але гэта — хобі ўжо, бяздзейсная балбатня рускіх інтэлігентаў, пра што пісалі яшчэ Чэхаў і Горкі. Мы не пішам. У нас героі занадта дзейныя, актыўныя. Мы ігнаруем псіхалогію ўзростаў.

Прыходзіла Улада, жонка майго франтавога сябра Вольскага, выказала надзіва мудрыя думкі.

Званіў Ц, Я. Кісялёў. Як здароўе? Пажаданні. Прыемна. Ён і ў Мінску званіў у бальніцу, віншаваў з Днём Перамогі. А некаторыя, хто кляўся ў дружбе, мабыць, выкінулі з памяці. Сумна. Але хіба толькі ад гэтага сумна?

Званілі Лабанок, Палякоў, Сняжкова, Андрэй Макаёнак, Грачанікаў, Сіпакоў, Сачанка...

Прыемна, што людзі не забываюць. Можа, і недарэмна я працаваў 26 гадоў у СП. Працаваў з поўнай аддачай. Нешта ж зрабіў, што нельга выкінуць з памяці людзей.

Суседа майго цэлы дзень няма — гуляе. А я не магу гуляць, мяне, здаецца, атруцілі лекамі, я задыхаюся. Ці ад таго, што холадна? Пачатак чэрвеня, а ўначы мінусавая тэмпература. Чым заняцца? Мемуары дык мемуары. Выстраю для будучых выступленняў перад чытачамі, калі яны будуць, гісторыю «Петраграда — Брэста».

У тым жа 50-м томе чытаю ленінскую тэлеграму:

«Орша. Комиссару станции Орша Иващенко. Благодарю за пропуск 36-ти вагонов в Германию. Это для наших бедствующих военнопленных. Прошу опровергнуть все гнусные клеветы и помнить, что мы должны помогать нашим военнопленным изо всех сил.

Предсовнаркома Ленин».

Тэлеграма напісана 4 ліпеня 1918 года. У тыя дні, калі левыя эсэры зрабілі спробу сарваць Брэсцкі мірны дагавор. Становішча было вельмі цяжкае. Па Брэсцкаму міру павінен быў адбыцца абмен палоннымі. А ў гэты час пачалася ўжо грамадзянская вайна. І таму мы не маглі так хутка правесці абмен. На ліпень месяц, як я пасля даведаўся, прачытаўшы многія матэрыялы, у Германіі заставалася нешта каля двух мільёнаў рускіх палонных. І вось у гэтай цяжкай сітуацыі, калі галадалі Масква, Петраград, Ленін думаў пра гэтых людзей. Тым больш што становішча нашых ваеннапалонных было надзвычай цяжкае. Германія, прадаўжаючы вайну з краінамі Антанты, сама ўжо галадала. Палонных французаў, англічан, амерыканцаў падкармліваў Чырвоны Крыж. Карміць рускіх палонных пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі гэтая «гуманная» арганізацыя адмовілася — пратэставала супраць рэвалюцыі.

Тэлеграма такая мяне ўсхвалявала. Аднак тэлеграмы адной мала, каб нешта напісаць. Трэба было вывучыць становішча, якое склалася ў Оршы, і агульную гістарычную сітуацыю. У Оршы старшыня савета Кавалёў, левы эсэр, падбухторыў групу хуліганаў: маўляў, пасылаем хлеб нямецкім імперыялістам, ніхто не ведае, ці даходзіць ён да

ваеннапалонных. Была спроба затрымаць гэты састаў з 36-ці вагонаў. Але камісар станцыі Івашчанка, матрос Балтыйскага флоту ў мінулым, дубровенскі хлопец, аказаўся сапраўдным бальшавіком і зрабіў усё неабходнае для таго, каб эшалон гэты прайшоў.

На аснове тэлеграмы і ўсяго таго, што я вычытаў, напісаў кінааповесць «Эшалон прайшоў». Па ёй пазней быў зняты на нашай студыі «Беларусьфільм» маладым рэжысёрам Нікіфаравым фільм «Хлеб пахне порахам». Праўда, мушу сказаць пра адну асаблівасць гэтага фільма. У сцэнарыі кінааповесці ёсць вобраз Уладзіміра Ільіча. Напісана было некалькі праўдзівых, я лічу, сцэн з Леніным. Але і сам Нікіфараў, і кіраўніцтва студыі пабаяліся здымаць, і нам прыйшлося гэтыя сцэны выразаць — здымаць фільм без вобраза Леніна...

Чаму трэба такі далёкі экскурс? Каб даць зразумець будучаму чытачу ці слухачу, што не адразу я ўзяўся, сеў і напісаў «Петраград — Брэст». Падступаў я да гэтай работы доўга і, можа, нават залішне асцярожна. Але менавіта з ленінскай тэлеграмы, з таго, што, адказваючы на пытанні, якія паставіла гэтая тэлеграма, з таго, што яна прымусіла мяне прачытаць многія дакументы, якія адносяцца да Брэсцкага міру,— адгэтуль, па сутнасці, і пайшла задума рамана. Для пісьменніка, які ў чыста гістарычным жанры амаль нічога не пісаў, гэта быў смелы крок.

Напісана пра рэвалюцыю нямала. Вялікімі майстрамі. Такімі, як Шолахаў, Талстой, Федзін, Фадзееў. Але ў беларускай літаратуры, у прыватнасці ў прозе — зноў-такі раблю агаворку, што ў паэзіі зроблена значна больш,— тэма гэта мала даследавана.

Рэвалюцыя — гэта рух мільённых мас. Рабочых, сялян, салдат. Гэта ломка псіхалогіі. Уступленне ў рэвалюцыю інтэлігенцыі — свая тэма. Контррэвалюцыя, нарэшце. Як людзі аказваліся па той ці па гэты бок барыкад? У кожнай рэспублікі, у кожнай вобласці, у кожным горадзе ўсё гэта праходзіла па-свойму.

Кастрычнік у Беларусі — ух, якая тэма, які пласт! Мы былі на асобым становішчы. Недалёка ад Мінска, паміж Мінскам і Баранавічамі, Маладзечнам і Лідай праходзіла лінія фронту. Тут была маса салдат, казакаў, і ў залежнасці ад таго, як павядуць яны сябе, мог рашыцца лёс рэвалюцыі. Тое ж значэнне меў фронт і пасля перамогі рэвалюцыі. Было падпісана перамір'е. Праходзіла братанне. Вялася прапагандысцкая работа сярод нямецкіх салдат. І ад таго, наколькі часці былой знясіленай арміі былі здольны затрымаць імклівасць нямецкага наступлення пасля зрыву Троцкім падпісання мірнага дагавора, таксама залежаў лёс рэвалюцыі, лёс Савецкай улады.

Думаю, што і ў нашай гістарычнай навуцы яшчэ далека не ўсё распрацавана і нашаму кіно, прозе, драматургіі ўзнімаць гэтую тэму вельмі няпроста.

Але, акрамя жадання «запоўніць вакуум», ёсць, пэўна, і іншыя матывы, чалавечыя, грамадзянскія, якія прымушаюць нашага брата звяртацца да гісторыі.

Цікавасць да гістарычнай тэмы расце. У самым шырокім плане. Не толькі да гісторыі рэвалюцыйнай, але і да гісторыі старажытнай. Гістарычныя кніжкі карыстаюцца поспехам. Гістарычны раман, як правіла, ідзе гэтак жа, як класіка, як лепшыя кніжкі савецкіх пісьменнікаў. Яшчэ ў большай меры расце цікавасць да рэвалюцыйнай тэмы. Тая міжнародная абстаноўка, якая складваецца ў свеце, пагроза тэрмаядзернай вайны, нагнятанне атмасферы амерыканскай адміністрацыяй і ўсе прошукі імперыялістаў,— яны прымушаюць людзей звяртацца да мінулага, звяртацца да вучэння Леніна. Да вялікай ленінскай ідэі міру, да вытокаў палітыкі нашай партыі.

23 чэрвеня

Дома. Выпісаўся 18-га. Апошнія дні перад выпіскай жыў у напружанасці, прыслухоўваючыся да кожнага болю. Асабліва страшыла галавакружэнне. Здаецца, мяне атруцілі лякарствамі. Атрымаў штук 300 уколаў, ад ін'екцый гепарыну дагэтуль сіні жывот. Праглынуў паўтысячы таблетак. Жах! Па-мойму, лекавая тэрапія — цёмны лес. Як дзейнічае тая ці іншая таблетка? Калі якую прымаць? Атрымліваў іх на сястрынскім пасту, па дарозе ў сталоўку, па 6-7 штук, і пасля яды, запіваючы чаем, глытаў. І гэтак — усе іншыя.

Ёсць трапны жарт наконт урачоў. Хірургі: мала знаюць, усё ўмеюць. Тэрапеўты: многа знаюць, мала ўмеюць. Неўрапатолагі: нічога не знаюць, нічога не ўмеюць.

Вынік цяжкай тэрапеўтычнай артылерыі вельмі блізкі да нуля. Чуць хіба выразней бачу бліжнія прадметы і адрозніваю яркія колеры — чырвоны, зялёны. Пазнаць чалавека не магу, чытаю праз туман, першы радок — 0,1.

Віктар Вольскі лаяў мяне, што я не дамогся кансультацыі Фёдарава (ёсць такі вядомы афтальмолаг, лячыў Уладу, Віктар з ім асабіста знаёмы). Прасіў яго паглядзець мяне. Але мяне пераконвалі (заг. аддзяленнем Кадышава Е. Н.), што Фёдараў — хірург і яго кансультацыя мне не патрэбна. А сусед па сталу, былы намеснік старшыні Дзяржплана СССР Ракоўскі М. Я., сказаў:

— Не прасіце. Без згоды галоўнага афтальмолага 4-га Упраўлення ніхто не адважыцца запрасіць Фёдарава. Антыподы! Чаго ім не

хапае? Хворых? Двое вядомых вучоных! Калі мы пераадолеем у сабе гэтае дзікае пачуццё?

Дома! Як хораша дома! У суботу жыў у ружовым тумане. Цэлы дзень аглядаў сваю рэканструяваную дачу. Добра атрымалася. Расстаўляў мэблю. Хлопцы расстаўлялі па маім указанні. Здаецца, ужыўся ўжо ў бяздзейнае існаванне. Можна, выходзіць, і так жыць. Не чытаць. Не пісаць, Думаць. Як раіў стары Талстой: менш чытайце, больш думайце. Усё больш і больш разумею Глебку, Шолахава.

Пытаюцца, ці не паеду я ў санаторый. Нікуды не хачу. Цешуся ўнукамі. Славяна падрасла. Смяецца. Гудзіць. Поўненькая, як пампушачка. У Таццяны не хапала малака, і Маша адпаіла яе геркулесавым адварам з сумесямі, а зараз — з малаком. Трымае яшчэ карову гаспадыня, у якой мы многа гадоў купляем малако. Але ці доўга пратрымае?

6.7.82

Адзначылі 100-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы. Адарваны хваробай ад людзей, ад простых людзей, ад глыбінь народных, я не магу сказаць, які водгук гэтая падзея нацыянальнай культуры знайшла ў рабочых, сялян, інтэлігентаў, партыйных, савецкіх работнікаў, які след пакінула ў свядомасці, як адбілася на свядомасці. Закранула якія струны душ? Прымусіла задумацца над праблемамі нацыянальнага жыцця, нацыянальнай сутнасці? Ці засталася падзеяй чыста літаратурнай?

Падрыхтоўка да юбілею вялася лакальна, з меншым размахам, з меншым пранікненнем у народныя масы, чым падрыхтоўка да 90-годдзя Купалы і Коласа. Ці мне так здавалася?

Праведзена само 100-годдзе з размахам. Хораша прайшоў юбілейны вечар у Мінску, на які я паехаў, нягледзячы на прастуду. Паехаў і ў Вязынку. Там таксама свята паэзіі прайшло выдатна. Прысутнасць Ц. Я. Кісялёва, членаў бюро ЦК узняла арганізацыйны ўзровень. Стараліся кіраўнікі вобласці, раёна, Міністэрства культуры.

Учора Цэнтральнае тэлебачанне паказала маскоўскі вечар. Сам факт правядзення вечара ў Вялікім тэатры надаў падзеі ўсесаюзнае значэнне.

На юбілейным вечары І. Навуменка сказаў, што на маю долю выпала рабіць даклад на сесіі АН, прысвечанай 100-годдзю Коласа. З якой лёгкасцю раней я рабіў гэтыя даклады! Нават пра Чэхава, Талстога, хоць ніколі не займаўся іх творчасцю з пазіцый літаратуразнаўчых. А тут Колас, з якім я сто разоў сустракаўся,— і я спалохаўся. Як перачытаць творы, напісаць даклад з адным вокам?! Як выйсці на

аўдыторыю, дзе нямала будзе людзей, якія ядуць хлеб дзесяткі гадоў на вывучэнні Коласа?!

З хваляваннем ехаў я на купалаўскі вечар. Спалохаўся сустрэчы з такой колькасцю знаёмых — сотні! Нічога, вытрымаў. Роспыты, спачуванні шчырыя. І няшчырыя... Былі і такія. Ці раблюся падазроным, недаверлівым? Цяпер я часта думаю: якія шчаслівыя былі маладосць мая і сталасць. Я любіў людзей. Я верыў ім. Я не ведаў, што такое вораг. Яшчэ гадоў дзесяць назад я з чыстай душой, без ніякіх задніх думак, мог пайсці ў госці да любога з нашых пісьменнікаў, да ўсіх бадай жа трохсот чалавек. А вось цяпер — пайду? Хачу і надалей любіць людзей! І дараваць ім іх слабасці.

А між тым як бы адыходжу ад іх, ад людзей. Напрыклад, сябры з іншых рэспублік... Не так даўно сустракаліся з радасцю. Адзначалі сустрэчы. Перапісваліся, перазвоньваліся. Віншавалі адзін аднаго са святамі. А цяпер сустрэліся — і ніякіх эмоцый я не адчуў. Нават да Андрэя не цягне так, як раней. Яшчэ нядаўна Маша раўнавала: «Ты не можаш пражыць без яго і аднаго дня». Не мог. А цяпер магу жыць тыдзень, месяц. Што гэта: першая прыкмета старасці — жаданне адзіноты, уединения? Агідная гэта рэч — старасць. Ці гэта часовая псіхалогія хворага? Комплекс?

З кожным днём, як ільдзіна вясной, растае мая надзея на вяртанне зроку. Прыйдзецца дажываць аднавокім. Не было б горш. Суцяшэнне адно: знікае адчуванне трагедыі, якое было ў бальніцы, радзей здараюцца прыступы роспачы. Спрыяюць хатнія ўмовы, сям'я.

І яшчэ адна псіхалагічная з'ява, якую цяжка растлумачыць: як цягнула ў бальніцы пісаць «мемуары» — гісторыю стварэння раманаў, аповесцяў, а дома зусім не хочацца. Лянота, расслабленасць? Ці вяртаюся непрыкметна, спаквaля ў сваю стыхію — «захворваю» новым раманам. Але пакуль што ў галаве толькі старыя сюжэты — тыя, што даўно адкладзены ў «заказнік», на запас.

Аднак гісторыю «Петраграда...» варта завяршыць хоць вельмі каротка.

Што мяне хвалявала пры напісанні гэтай незвычайнай рэчы — з гістарычнымі персанажамі, з цытатамі з ленінскіх работ, з пратаколаў, газет таго часу? Чытабельнасць. Ці будуць чытаць?

Аднойчы мой маладзейшы калега, паэт, якога мала хто чытае, але які высокай думкі пра сябе і нізкай пра іншых, сказаў, што не ўсё тое сапраўды высокамастацкае, што карыстаецца ў чытачоў папулярнасцю; дэтэктывы, маўляў, таксама здорава чытаюць. Я не пісаў дэтэктывы. Я ведаю, што не дасягнуў вышэйшых узораў мастацкасці. Але, як пісьменнік-рэаліст, у пэўным сэнсе летапісец свайго часу, я

меў найвялікшае шчасце: мяне чыталі. А хіба не для чытача мы пішам? Чыталі, пачынаючы калі не з першай аповесці, то, ва ўсякім разе, з першага рамана «Глыбокая плынь» і канчаючы, скажам, раманам «Вазьму твой боль». Спадзяюся, што і «Петраград — Брэст» таксама будзе чытацца. Я адчуваў бы сябе няшчасным чалавекам, каб кніжкі мае ляжалі на паліцах кнігарняў, на паліцах нашых бібліятэк. Мне часам шкада бывае некаторых маіх калег, калі я прыходжу ў бібліятэку, бяру фармуляры і чытаю, што кнігу гэтую бралі адзінкі чытачоў, хоць сам па сабе раман і нядрэнны. Але, пэўна, чагосьці не хапае.

Тыя, хто прачытаў раман, сцвярджаюць, што не толькі раздзелы вымышленыя — з Багуновічам і Мірай, з Бульбай-Любецкім і многія іншыя, чытаюцца, але чытаюцца і раздзелы дакументальныя, гістарычныя. І гэта мяне радуе. Бо кожны разумее, што, пішучы вобраз Леніна, ёсць пэўныя рамкі, за якія нельга выходзіць. Дакумент тут — закон.

Некаторыя маі таварышы, калегі, якія, відаць, не вельмі знаёмы з гісторыяй, чамусьці лічаць, што я карыстаўся нейкімі асобымі матэрыяламі. Глыбока схаванымі і глыбока закрытымі. Усё гэта не так. Я карыстаўся тым, што даступна кожнаму даследчыку, кожнаму гісторыку і, натуральна, кожнаму пісьменніку, калі ён захоча ўзяцца за гэтую тэму.

Перш за ўсё, канешне, гэта сам Ленін. Пяцьдзесят пяць тамоў яго работ. Не скажу, што я прачытаў пяцьдзесят пяць тамоў, але я вельмі ўважліва перачытаў усе работы, каторыя адносяцца да перыяду Кастрычніцкай рэвалюцыі і, у прыватнасці, да перыяду барацьбы за падпісанне Брэсцкага міру.

Ленін палемічны заўсёды. Асабліва ў сваіх дарэвалюцыйных працах. Калі ён пачынае палемізаваць, адчуваецца такая пальмянасць, такая страсць, такое гарэнне! І бязлітасны да ворагаў, да апазіцыянераў ён быў.

А ў час барацьбы за Брэсцкі мір — цэлы цыкл работ і выступленняў. Некалькі дзесяткаў. На адну тэму. На тэму міру. І кожная з гэтых работ палемічная. Адчуваеш, што Ленін адказвае сваім апанентам. Адказвае тым, хто ўжо выступіў у прэсе ці выступіў на пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта РСДРП, Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта. Гэтая палемічнасць дае надзвычайны прастор для пошукаў і нават для пэўнага вымыслу.

Вось, напрыклад, чытаю... сачу па «Біяграфічнай хроніцы» за дзейнасцю Леніна ў гэты час. 1 студзеня (па новаму стылю) 18-га года Леніну даюць кароткі адпачынак. Усяго на пяць дзён. І ён едзе ў

санаторый «Халіла» ў Фінляндыю з Надзеяй Канстанцінаўнай і Марыяй Ільінічнай, сваёй сястрой. Канешне, Ленін не адпачывае. Там ім напісаны цэлыя чатыры працы, і, у прыватнасці, вядомая і надзвычай цікавая работа «З дзённіка публіцыста (тэмы для распрацоўкі)» — так ён і называе. А тэм гэтых ажно цэлых сорак чатыры! І вось дваццатая тэма: «Сепаратный мир». Его опасность и его возможное значение. Есть ли сепаратный мир «соглашение (соглашательство) с империалистами»? Тэма для распрацоўкі!

Хачу звярнуць увагу, што робіць Ленін. Як ён запісвае гэта. У першай фразе «сепаратны мір» ён бярэ ў двукоссе. У другой фразе: «Есть ли сепаратный мир соглашение» Ленін сепаратный мир у двукоссе не бярэ. Ён у двукоссе бярэ «соглашение» і растлумачвае, што «не соглашение, а соглашательство», як «некаторыя называюць»,— ясна, што некаторыя называлі іменна сепаратны мір «соглашательство» з імперыялістамі.

І далей. Дваццаць другі тэзіс: «Провокация империалистов». Зноў-такі звяртаю ўвагу, як запісана: «Дай нам удобный повод скорее задушить тебя, республика Советов!..» Дыялог у востpай драме! Вось які ход ленінскай думкі!

Чытаеш гэтыя работы, яны ўсе цесна звязаны, і адчуваеш палемічную думку Уладзіміра Ільіча.

Але аўтару гістарычнага твора трэба ведаць больш. А што ж гаварылі апаненты? Мне гісторыкі падказалі, і я легка гэта знайшоў. Даволі было ўзяць падшыўку «Правды» за той час, за тыя месяцы. Там апублікаваны многія артыкулы і Бухарына, і Радэка, і Урыцкага, і Іофе, і Ломава-Апокава — бяру «левых камуністаў», якія асабліва горача, з палымянасцю, вартай лепшага прымянення, выступалі супраць ленінскай ідэі заключэння Брэсцкага міру.

Карыстаўся я і пратаколамі пасяджэнняў ЦК, яны таксама апублікаваны. Па многіх пытаннях звяртаўся ў Інстытут марксізму-ленінізму. Таварышы вельмі хораша адгукаліся, заўсёды адказвалі. Звяртаўся я і ў Інстытут гісторыі партыі Украіны — было многа пытанняў, звязаных з Украінай, з барацьбой украінскага народа за Савецкую ўладу. І ўжо зусім канкрэтна памагалі нашы гісторыкі, нашы таварышы з Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, з кафедры гісторыі партыі Белдзяржуніверсітэта, з Акадэміі навук. Канкрэтна, я глыбока ўдзячны Мікалаю Стэфанавічу Сташкевічу, які «хварэў» за мой раман не менш, чым сам аўтар.

Павінен сказаць, што не ўсё лёгка давалася. Часам маленькая дэталь, а яе нялёгка было знайсці. У «Біяграфічнай хроніцы» гаворыцца, што 1 студзеня, у дзень першага замаху на Леніна, пра які

я пішу, машыну вёў шафёр Гарахавік. Прозвішча яўна беларускае. І мне вельмі хацелася знайсці біяграфію гэтага чалавека, каб даць шырэй. На вялікі жаль, тады гэта не ўдалося[1].

Адной з надзвычай багатых крыніц, якія паказваюць Леніна як чалавека, з'яўляюцца ўспаміны. Я добра помніў словы Надзеі Канстанцінаўны: «Он был человеком, которому ничто человеческое не чуждо. Любил он жизнь во всей многогранности, жадно впитывал ее в себя...»

Я стараўся пазбегнуць залішняга замілавання, каторае часам перарастае, груба кажучы, у сюсюканне.

Была вялікая спакуса напісаць Леніна ў штодзённым жыцці, у яго, па-руску кажучы, «общении» з супрацоўнікамі, з апаратам, са сваімі блізкімі. Многа чаго і напісаў у гэтым плане. Але калі пачаў рэдагаваць раман, перачытваць у «поўным аб'ёме», пасля таго, як раман прачыталі сябры, некаторыя кансультанты, я прыйшоў да вываду, што тут патрэбны вельмі і вельмі асцярожны падыход, вялікае пачуццё меры. Сапраўды, раман палітычны, ёсць галоўная тэма — тэма барацьбы за мір, тэма вельмі драматычная,— і ўсё трэба падпарадкаваць гэтай тэме!.. Гэта — не біяграфія. Гэта — самы драматычны эпізод барацьбы Леніна за ўмацаванне Савецкай Рэспублікі.

Магчыма, калі я ў будучым вазьмуся за сапраўдныя мемуары, напісанню першага апавядання «У снежнай пустыні», і «Глыбокай плыні», і «Снежных зім», і «Атлантаў...», і асабліва «Петраграду...» будзе адведзена ў іх нямала месца. Гэта цікавая гісторыя і павучальная ў сэнсе творчага вопыту. А цяпер — даволі.

Зноў была бяссонная ноч, хоць дома спіцца лепш, але на гэты раз я ўспамінаў сваё маленства. Чаму раптам?

7. VII

Ці я перажыў той час, калі хочацца ўспамінаць маленства, юнацтва, ці яшчэ не дажыў да таго? Мне даўно хацелася нешта напісаць пра сваё лясное дзяцінства. Але адчуваю, не магу, чагось не хапае. А можа, перашкаджае такі шэдэўр, як «Новая зямля»? У апісанні жыцця лесніка, няхай сабе і савецкага перыяду, нельга не паўтарыць Коласа. Але лепш не напішаш. Гэта унікальны твор,

[1] Пасля публікацыі рамана на рускай мове мне напісала пляменніца Тараса Гарахавіка, жыхарка Мінска, і паведаміла, што Тарас Мітрафанавіч нарадзіўся ў сяле Нікалаеўка Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. У Бранскім краязнаўчым музеі ёсць усе матэрыялы пра шафёра Леніна. Як кажуць, ляжала на паверхні. Але не трапіўся гісторык, які падказаў бы, дзе шукаць. Здараецца і такое. Па выхадзе рамана кандыдат гістарычных навук Э. Карніловіч апублікаваў у «Советской Белоруссии» артыкул пра Гарахавіка.

магчыма, адзіны ў гэтым родзе ў сусветнай літаратуры, «На ростанях» — слабей. Хоць, здавалася б, проза дае большыя магчымасці для бытавой эпічнасці.

Маё маленства і юнацтва неяк вельмі ж аддаліліся. Занадта не падобна жыццё дзяцей маіх, унукаў на жыццё сына лесніка і нават тагачаснага студэнта.

Ва ўзросце 30-40 гадоў я жыў сваім мінулым. З нецярпеннем чакаў паездкі на Гомельшчыну. Кожны раз наведваў сядзібу леснічоўкі пад Краўцоўкай, хоць застаўся з вайны там адзін калодзеж. Але якімі роднымі былі лес навакольны, поле, гутнецкае, краўцоўскае! Я паказваў іх дзецям, як нешта дзівоснае, казачнае. У Гомелі я неаднойчы адрываўся ад кампаніі сваіх калег, з якімі прыязджаў у родны горад на выступленні, і ішоў на вуліцу Астроўскага. Хадзіў там з дзіўным душэўным трапятаннем. Вуліца не гарэла, і кожны драўляны дом быў да шчымоты ў сэрцы знаёмы. Гэта была вуліца нашага з Машай кахання, на ёй Маша кватаравала, і я штовечар лётаў туды на спатканне. Нават у асенне-зімовы час мы хадзілі да позняй ночы па скрыпучых драўляных тратуарах. А ў вяснова-летні — да ранішняй зары.

І вось мінула добрая чвэрць стагоддзя, як я не заглядваў на тую вуліцу, хоць часта праязджаў побач, паралельна ў трохстах метрах — па Барыкіна, каторая да вайны была Будзённага. Туды, гуляючы, мы рэдка заходзілі. Будзённага была брукаваная і магістральная — шумная нават у даваенны час. А на Астроўскага і Бакуніна — як у глухім сяле. Толькі за поўнач спявалі пеўні.

Цяпер прыязджаю ў родныя мясціны — і ў душы глуха. Між іншым, на гэта скардзіўся і Андрэй. Дык я ж хоць зрэдку наведваюся ў сваё маленства, а ён, здаецца, зусім перастаў ездзіць.

11. VII

Учора Ліне было 41 год. І я зноў, з асаблівай вастрынёй, адчуў, як многа пражыта, здалося — цэлае стагоддзе. Як даўно гэта было — наша з Машай каханне. Незвычайны шлюб, мары пра першынца. Помню, што мне 19-гадоваму сапраўды вельмі хацелася, каб нарадзіўся хутчэй у нас сын ці дачка. Была ў гэтым рамантыка і юнацкая бесклапотнасць. У Еўропе палыхала вайна. Патыхала порахам у наш бок. Я збіраўся ў армію. І ўсё роўна мы думалі пра дзіця. Недзе толькі ў канцы жніўня, калі быў здадзены Гомель, дайшло ў Мурманск апошняе пісьмо ад Машы з паведамленнем, што ў нас нарадзілася дачка, і я трывожна радаваўся, чамусьці вельмі ўпэўнены, што Маша эвакуіравалася. Не магла яна застацца ў акупацыі. Праўда, з'яўлялася думка, што не паспела яна з малым дзіцем выехаць, адступіць — і

тады я халадзеў ад страху. Я шукаў яе па радыё. І дзесьці, здаецца, пад канец 1942 года нехта злосна пажартаваў: напісаў з Урала пісьмо ад яе імя. Почырк незнаёмы. Маша заўсёды была стрыманая ў выяўленні пачуццяў. А ў тым пісьме было многа ласкавых слоў, і яны здаваліся мне няшчырымі. Але, можа, гэтак яна згладжвае сваю віну? — пакутліва думаў я. Былі ў пісьме дэталі, якія не мог напісаць абсалютна незнаемы чалавек.

Загадкавае пісьмо. Шкада, што я не захаваў яго.

Думаю, што пісала яго наша з Машай знаёмая. Ці іншае... На адно маё пісьмо па радыё адгукнулася смалянка Жэня Бугрова, работніца свярдлоўскага завода. Мы пачалі перапісвацца. Гэта была разумная, адукаваная дзяўчына, літаратуру яна ведала лепш, чым я. Пісьмы яе былі доўгія і цікавыя. Такія пісьмы нямала значылі. Дарэчы, такая перапіска, завочная, была вельмі распаўсюджаная ў першыя гады вайны. Шкада, што пісьмы не захаваліся. Гэта былі цікавыя дакументы, якія хораша перадавалі атмасферу таго часу, дэталёва расказвалі пра жыццё тылу. Каб удалося вярнуць мае пісьмы, можна было б напісаць цікавую аповесць.

15. VII

Мяне заўсёды цікавіла мая радаслоўная. Хто былі мае прадзеды, дзяды? Сяляне, безумоўна. Але якія яны былі? Працавітыя, дзелавыя, разумныя ці непаваротлівыя, безыніцыятыўныя? Помню я толькі сваіх дзядоў, лепш — па бацькавай лініі, менш — па матчынай. Але з расказаў блізкіх, асабліва майго стрыечнага брата Ігната Міхайлавіча Шаўчэнкі, які памёр у мінулым годзе ва ўзросце 76 гадоў (у пасляваенны час ён жыў у Мінску і мы часта сустракаліся), я лепш уяўляю якраз другога дзеда — Сцяпана Халімонавіча Калініна. Мне кажуць: я падобны на яго, маўляў, такі ж пузаты, як кажа цётка, і такі ж галавасты.

Дзед па бацьку — Міна Васільевіч Шамяка, у хаце яго прайшло мае маленства. Помню яго, невысокага ростам, барадатага і фенаменальна сварлівага: ён штодня мацюкаў сыноў, нявестак, дачку, пляменніцу, а калі баба Вася, Васіліна Логвінаўна, пачынала абараняць дзяцей, даставалася і ёй.

«Кручаная!» — крычаў дзед, гэта была яго любімая лаянка. Усе, хто выклікаў яго гнеў,— кручаныя. (Здаецца, ніхто з нас, пісьменнікаў-гамяльчан, не ўжываў гэтае слова.)

Галоўная яго прэтэнзія да сыноў, да нявестак: гультаі, абібокі. Сапраўды яны былі такія? Ці гэта тое ж, што ёсць цяпер: тыя ж нараканні на моладзь? Ва ўсякім разе, бабуля і маці мае былі вялікімі

працаўніцамі. (Праўда, ім менш і даставалася, зрэдку хіба, калі дзед разыходзіўся дай бог як.)

Я разумею яго. Сам ён працаваў як вол, батрачыў, ездзіў у «адходную» і ніяк не мог выбіцца з беднасці. Сям'я сапраўды была вельмі бедная. Калі дзед памёр, рана, нешта гадоў у 56-57, і пад час калектывізацыі бурылі гумно, то знайшлі царскія грошы, называлі суму, якой нібыта хапіла б на тры дзесяціны зямлі. Не паспеў дзед купіць зямлю. Для нашых бязлесных мясцін, дзе ўся зямля была ворыўная, тры дзесяціны нямала, у Карме кулакі мелі па 15 дзесяцін.

У дзеда была вулічная мянушка — Кацель. Кацель — ледзяны кругляк, які высякалі з тоўстага пласта лёду, і на ім малыя і дзяўчаты каталіся з горкі, а хлопцы рабілі калаўрот: на слупе ўмацоўвалі кола, да яго прывязвалі доўгую жардзіну, да яе чаплялі кацель і так раскручвалі, што толькі самыя спрытныя ўтрымліваліся на такой «цэнтрыфузе». Некаторыя адляталі так, што разбівалі твары, ламалі рукі.

Ад чаго Міначку, як яго звалі ў вёсцы, далі мянушку Кацель? Круглым ён не быў. Ці не ад таго, што яго, бедака, гэтак жа круціла жыццё і адкідала на ўзбочыну?

Было ў нас яшчэ другое прозвішча — Чарназёмавы. Ніколі не маглі сказаць: «Ідзі пазыч у Шамякіных», заўсёды гаварылі: «Пазыч у Чарназёмавых», «жыве за Чарназёмавымі» і г. д.

Ігнат сцвярджаў, што гэта сапраўднае прозвішча нашага роду, Чарназёмамі былі прадзеды. А прозвішча Шамякін нібыта ўзнікла такім чынам. Старэйшы брат майго дзеда Пімен служыў у войску і вярнуўся з арміі з новым прозвішчам, запісаным у казённую паперу. Бацька іх да таго часу памёр, Міна быў непаўналетні, і натуральна, што ўсю сям'ю запісалі на прозвішча Шамякіны. Тлумачэнне трохі наіўнае. Хоць чаго не было ў «Государстве Российском»!

Для мяне загадкава іншае. У Карме дзесяткі Калініных, Мальцавых, Буравых, Алампіевых, Атрошчанкаў, Шаўчэнкаў і ніводнага Чарназёмава. І Шамякіных — адна сям'я. Была тады. Цяпер не засталося ніводнай.

Ці не быў прадзед мой ці прапрадзед прышэльцам з чарназем'я і Чарназёмавы — мянушка? А ў сапраўднасці ўсё-такі былі Шамякі. (Таццяна жартуе: «Ці не княскага ты роду, тата?»)

Мой бацька быў старэйшы ў сям'і, 1899 года нараджэння. За ім ішоў Трафім, Трышка, як называлі яго ў сям'і, маладзейшай была Мар'я, якая жыве яшчэ і цяпер, а я, грэшны, не бачыў яе ўжо многа гадоў, хоць яна і сыны яе пішуць мне, як правіла, просяць дапамогі — грошы, лякарства, і Маша, душа добрая, нярэдка высылае то пасылку, то грошы, хоць сёстры мае, Галя і Таня, калі даведаліся, што 40-

45-гадовыя дзецюкі — стрыечныя браты (абодва нежанатыя) «дояць» брата, абурыліся і раілі нам «не балаваць гультаёў».

Трышка, як помню, быў чалавек вясёлы, гарэзлівы. Дзед мацюкае яго, а ён смяецца. Быў аматар на выдумкі. Уступіў у камсамол (колькі там было тых камсамольцаў у 20-я гады!), а потым пайшоў спяваць у царкоўны хор. З камсамола яго з трэскам выключылі.

Мяркую, што чалавек ён быў таленавіты. Музыка. Спявак. Завадзіла на гулянках. Фантазёр. Мог у зімовую ноч заткнуць камунебудзь з суседзяў комін. Мог украсці ў дзяўчат клубкі пражы і ніткі паснаваць праз вуліцу, з палісадніка на палісаднік. Адзін такі выпадак я добра помню. На вуліцы гоман. Здаецца, нават папа прывозілі. А Трышка стаіць каля акна і рагоча. Маці яго ручніком аперазала: «Ета ты, чарцяка, нехрысць, кручаны!»

Трышка часам прыходзіў пабіты. Але ўвогуле яго любілі. Усе. Бабуля. Мы, малыя. Маці мая, бацька. І толькі дзед Міначка лаяў на чым свет. Не любіў? Не магу сказаць. А вось жонку яго Хрысцю пэўна не любіў. Праўда, васпаватая жанчына з суседскай сям'і сама была сварлівая, непакорлівая. Чуць што — бегла да сваёй маці, і тая прыбягала з качаргой біцца з «кручаным Кацялём».

Можна зразумець, чаму не любіў яе свёкар. Але крыўдна, што сына не любіў. Нас з Паўлам любіў, а Федзьку з малой Хрысцяй не пераносіў. Ужо тады, у нейкія сем-восем гадоў, я адчуваў гэтую несправядлівасць і стараўся, як мог, абараніць стрыечных брата і сястру.

І дзед — чаго я не магу дараваць яму — усё роўна як пракляў сям'ю свайго малодшага сына.

Сам Трышка ў 1929 годзе паехаў у Бранск на заработкі. Рабіў на будоўлі. Паспрачаўся, што ўзнясе на другі паверх бочку з цэментам. Паспрачаўся на паўкіло марожанага. Узнёс. З'еў марожанае І... памёр. Дачка яго гады праз 3-4 памерла ад дызентэрыі. Застаўся сын Федзя. Па-мойму, ён быў 1925 года нараджэння. У армію яго забралі ў 1943 годзе. Але трапіў ён на Далёкі Усход. Удзельнічаў у вайне супраць Японіі. І пасля вайны ў канцы 1945 года адарваўся ад саставу вагон, крайні, у якім ён ехаў. Набіраў на спуску хуткасць. Ён і яшчэ колькі салдат выскачылі. Тыя, хто пабаяўся скакаць, загінулі. Вагон разбіўся. Але і Фёдар атрымаў траўму галавы. Яго камісавалі. Вярнуўся ён дадому, у галодную Карму, і вёў шалапутнае жыццё. Прыставаў у прымы да адной удавы, другой... Легка разыходзіўся. Гадоў дзесяць назад да мяне з'явіўся хлапчына. «Я — Іван Церашкоў». Церашковы — прозвішча кармянскае. «І які ты мне сваяк?» — «Я пазашлюбны сын Фёдара, вашага брата».

Прыгледзеўся — падобны. Не толькі па абліччы. Па хватцы. Недавучаны мастак, недавучаны музыкант. Кончыў музычнае вучылішча, а пайшоў у маляры на «Гомсельмаш». Дзелавы, праворны: ужо мае машыну.

Такім быў і бацька яго. Меў добрыя рукі. Напрыклад, быў неблагі пячнік. Але больш любіў вяселлі, на якіх выступаў у ролі нязменнага баяніста. Сам не піў, з-за траўмы галавы. Сышоўся з добрай дзяўчынай, яна нарадзіла яму дзяцей. Але шлюб свой афармiў толькі перад смерцю, здаецца. Ці зусім не афармiў? Траўма дала пухліну ў мазгу. Памiраў ён доўга і пакутліва. Я лажыў яго тут, у Мінску, у бальніцу. Прафесар Злотнік дзёўб яму чэрап, але гэта, па-мойму, толькі паскорыла канец. Трагедыяй для сям'і была не яго смерць, з ёй звыкліся. У апошні месяц жыцця Фёдар чамусьці (таксама загадка!) перайшоў да сваёй маці, якая была замужам за нейкім старым.

Трагедыяй, якая скаланула мяне, была смерць яго сына. Калі бацька ўжо быў у непрытомнасці, хлопец утапіўся ў Сожы напярэдадні свайго прызыву ў армію.

Трышка, безумоўна, заставаўся паэтам і фантазёрам. Але думаю, што і бацька мой не быў пазбаўлены фантазіі, хоць вонкава, па складу характару, выдаваў больш празаічным, рацыяналістычным. Гадоў у 18-20, відаць, у 1917-м або 1919-м, бо ў 1918 годзе ён ажаніўся і знаходзіўся дома, падаўся Пятро ажно на Урал шукаць лепшай долі

Для хлопца з двума класамі прыходскай школы ды яшчэ ў такі трывожны час — гэта было смела. На Урале прабыў нядоўга, месяцы чатыры, здаецца. Рабіў пры нейкім манастыры ў садзе і на канюшні. Шчасця не знайшоў. Усё-такі адбылося гэта, напэўна, у 1919-м, бо на манастыр наляцела банда, і хлопцы нашы, іх было трое з Кармы, спалохаліся і падаліся дамоў.

Думаю, што пабачыў бацька там нямнога. Але расказаў пра гэтае падарожжа хапіла на многа гадоў. Калі Пятро рабіў ужо ў лесе і леснікі зрэдку, тады гэта сапраўды рабілася зрэдку, збіраліся на бяседу, узяць па чарцы пад капусту і сала, галоўнай тэмай гаспадара была яго паездка на Урал. Пра забавы манахаў (я, малы, не разумеў, што да чаго) бацька расказваў так, што леснікі хапаліся за жываты, а маці плявалася.

Цяпер я ўпэўнены, што шмат што бацька прыдумляў.

Помню, ён пераконана даводзіў, так, маўляў, яму сказаў вучоны манах, што Урал ажно на трыццаць вёрст вышэй, чым наша зямля. Спачатку я з захапленнем уяўляў, як высока лазіў бацька: трыццаць вёрст было да Кармы, і мы на кані ехалі туды бадай жа цэлы дзень. А класе ў трэцім, калі я прачытаў нямала кніг і, напэўна, дабраўся да

геаграфіі старэйшых класаў, помню, аднойчы, калі бацька зноў «загнуў» пра трыццаць вёрст, я сказаў, што няпраўда гэта, што на зямлі няма такой зышыні, а Уральскія горы самыя нізкія. Бацька вельмі здзівіўся, але, вельмі можа быць, і ўзрадаваўся. Здзівіўся, што я так асмялеў, да таго мы, малыя, сядзелі пры бацьку, як мышы пад венікам,— баяліся яго. Каб улазіць у размову пры старонніх, пры гасцях — крый божа.

Бацька не цыкнуў на мяне. Толькі сказаў, як бы перапрашаючы гасцей:

— Во змей! Бацьку вучыць.

Нехта з леснікоў сказаў:

— Будзе, гад, Войтавым.

Войтаў — тагачасны ляснічы, пэўна, чалавек адукаваны, інтэлігент; ён збіраў леснікоў і праводзіў з імі заняткі — вучыў малаадукаваных служкаў і прафесійна і наогул. Заняткі леснікі цярпелі, нават гаварылі, што цікава, але страшэнна не любілі экзаменаў. Дзень такі для іх быў чорны. Яны мацюкалі Войтава і, сабраўшыся, экзаменавалі адзін аднаго — хто што запомніў. Помню, бацька згадзіўся, што «ляснічым я непрыменна стану». Той жа Войтаў даваў леснікам кніжкі. Бацьку трапіў Дзям'ян Бедны, і паэму пра старца Адзісія ён вывучыў на памяць і чытаў яе маці, леснікам. Пазней ён гэтак жа вывучыў «Біблію» Крапівы, чытаннем якой абураў маці: бязбожная кніга! Трапіла ў леснічоўку ў нейкім абшарпаным выглядзе і «Новая зямля». Яе леснікі чыталі калектыўна. Чыталі і любоўна мацюкалі пісьменніка:

— Во змей! Як у нас падгледзеў.

Прыходзілі да высновы, што напісаць так мог толькі ляснік.

21. VII

Пасля халоднага дажджлівага чэрвеня наступіў цёплы ліпень. Другая дэкада цёплая, але неспякотная. Хораша. За гэтыя дні можна нарыхтаваць многа сена.

Па прэсе і тэлеперадачах я не бачу тае напружанасці ў нарыхтоўцы кармоў, якая была ў апошнія гады, асабліва ў 1980-м, калі секлі галіны. Праўда, тады была засуха. А ў гэтым годзе травы выдатныя. А можа, і добра, што менш шуму. Можа, справы лепш ідуць?

Як збажына? Чую самыя супрацьлеглыя думкі. Паездзіць бы самому. Ды ўсё перашкаджае лячэнне: штодня ўколы. У скроню. Балючыя. А воку не лепш.

Прыкметна запаволіўся рытм: нічога не паспяваю зрабіць нават з тых абавязкаў, творчых, службовых, бытавых, якія я абмежаваў да мінімуму.

Што гэта — вынік хваробы ці наступление старасці? Кажуць: твае гады — сярэдні ўзрост. Можа, для іншых так. Для тых, хто не вычарпаў свой рабочы рэсурс: нямала людзей, якія не вельмі перагружалі сябе. Мой жа, здаецца, мотарэсурс канчаецца. Ці не таму захацелася напісаць пра сваіх бацькоў?

Бацька, як і яго бацька, дзед мой, часта лаяў маці, нас з Паўлам, а пазней, расказвала маці, і дзяўчат, Галю і Таню: маўляў, гультаі. І даказваў, што адзін ён шчыры працаўнік.

Што датычыць мяне, то папрок гэты, магчыма, і меў падставы: я не вельмі кідаўся да фізічнай працы. Але я выдатна вучыўся. Мяне прымусілі пасвіць кароў у сем гадоў. Статак быў галоў восем, болей цялят. У тыя гады была завядзёнка: сяляне вёсак, дзе не хапала выпасаў, аддавалі маладняк у адпас леснікам — аб'ездчыкам, пуцявым абходчыкам. Першыя гады два свайго пастухоўства я і зараз успамінаю, як успамінаюць, мабыць, катаргу. Асабліва першы год. Лета было мокрае. Камароў і машкары — хмары. Разбуджаны гадзіны ў чатыры-пяць раніцы, я, горкае дзіця, амаль штодня, калі прыгравала сонца, засынаў. Статак без пастуха брыў бог ведае куды, але часцей — на бліжэйшае поле, рабіў патраву. Я калаціўся. Перад бацькам. І той неаднойчы намерваўся адлупцаваць мяне, але маці абараняла. Маці знаходзіла каровы, маці дамаўлялася з гаспадарамі, каму зрабілі патраву, неаднойчы, употай ад бацькі, адносіла мерку ячменю, грэчкі. Але часцей дазваляла набраць дроў з двара леснічоўкі. У выніку аблаў, якія праводзілі леснікі,— а наша «стража» была крайняя на шляху ў Дабранку, куды вазілі дровы на продаж, за зіму каля нас вырасталі шуркі на многія дзесяткі кубоў гатовых — піленых, колатых бярозавых дроў. А ўвогуле ратавала мяне тое, што да патраў лесніковым быдлам адносіліся з разлікам, што некалі і ён, злавіўшы ў лесе, зробіць «скідку».

Ужо калі я падрос, хадзіў у школу і прыахвоціўся да чытання, бацька мяне, старэйшага, «запрагаў» у работу — араць, баранаваць, весці санітарную высечку лесу. Я ахвотна мяняўся з братам. Павел страшэнна не любіў пасвіць жывёлу, а я палюбіў гэтую работу, дарэчы, у той час, пасля калектывізацыі, у адпас не аддавалі, не было чаго аддаваць, пасвіць трэба было нейкія свае дзве каровы, адно цяля, рахманых, прывычных да лесу. Ляжы — чытай ці глядзі ў неба, вывучай лес, выведвай гнёзды. Навучыўся захапляцца прыгажосцю. Кнігі навучылі. Яны ж навучылі і думаць, разважаць над з'явамі прыроды, яе тайнамі, над жыццём людзей.

У адносінах да маці і Паўла бацька быў несправядлівы. Маці была працаўніца нястомная. Яна ўсё ўмела — араць, сеяць, касіць. У

яе хіба трохі не хапала гаспадарлівасці, нароблeнае яна не заўсёды даводзіла да ладу. Многія гладышкі малака скісалі, і яго вылівалі свінням. А масла пры наяўнасці дзвюх кароў было такім ласункам, што нават мы, дзеці, каштавалі яго хіба ў свята. Цяпер я здзіўляюся, чаму мы жылі вельмі небагата, калі не сказаць бедна. Малако не прадавалі, не здавалі. Раз у месяц адвозілі два-тры фунты масла на рынак у Дабранку. Малапрадукцыйныя каровы?

Пасля вайны бацькі трымалі адну карову, але жылі непараўнаўча багацей, ва ўсякім разе масла было штодня, ад дзяцей яго не хавалі. Я прыязджаў з чатырма сваімі дзецьмі, і бабуля хіба што не купала іх у малацэ.

Пасля вайны маці неаднойчы казала: «Навучыліся людзі жыць». Бадай што так: навучыліся.

Я помню: у 20-30-х гадах маці не ела памідоры, рэдкая была гародніна нават для Гомельшчыны: у Карме ніхто іх не садзіў, садзілі толькі гараднянскія «маскалі» (Агародня-Гомельская — тры кіламетры ад Кармы).

У галодны 1933 год бацька выменяў на бульбу ў цыганоў жарабя і зарэзаў яго, каб падтрымаць дзяцей. Маці сыходзіла з хаты, калі бацька варыў гэтае мяса, дарэчы, надзіва смачнае. Дагэтуль помню смак яго. Хіба таму, што галодныя былі? А пасля вайны бацька прывозіў са Злынкі ці Добруша кілбасу і знарок жартаваў: «Конская».

«Няхай сабе і конская, абы смачная»,— адказвала маці.

Сынклета (такое рэдкае імя мела маці) паходзіла з сям'і непараўнаўча больш багатай, чым бацькава. Расказвалі, што маці маёй маці галасіла, што выдаюць дачку за бедняка. Але Сцяпан Калінін, мяркуючы па ўсім, быў чалавек разумны, дэмакратычны, гаспадарлівы. Напэўна, за розум і справядлівасць яго да рэвалюцыі колькі разоў выбіралі старастам сяла. А сяло вунь якое — 700 двароў! Ды пасёлкі: Селішча Першае, Другое, Палянкі, Зайцава і яшчэ нешта.

Дзеду, напэўна, стараства не даравалі б у пэўны час, але, безумоўна, улічылі, што сын яго Андрэй аддаў жыццё за рэвалюцыю.

Іх было пяцёра братоў, тры сястры. Цётак я помню лепш, чым дзядзькоў. Але ведаю найбольш пра Андрэя, які загінуў за тры гады да майго нараджэння. Пра яго многа расказвала маці, яшчэ больш Ігнат, ды і іншыя людзі, сваякі, сяльчане. Андрэй быў чалавекам, безумоўна, таленавітым. Па-першае, найбольш адукаваным: недзе вучыўся пасля прыходскай школы, рабіў у Гомелі. Там ён стаў рэвалюцыянерам. Яшчэ ўлетку 1917-га прывёз з Насовіч зброю, арганізаваў атрад. Мяркуючы па тым, што пры выбарах ва Устаноўчы сход ён агітаваў

за бальшавіцкі спіс (пра гэта гаварылі ўсе), належаў ён да РСДРП. Пад яго кіраўніцтвам была ўстаноўлена ў Кармe Савецкая ўлада.

Украінская Рада абвясціла поўдзень Гомельскага павета ўкраінскай тэрыторыяй. Выкарыстаўшы гэта, кайзераўцы і пасля падпісання Брэсцкага міру працягвалі наступленне на Клінцы, Навазыбкаў, падбіраліся бліжэй да Масквы.

Маскоўскія пралетарскія палкі, атрад Шчорса і многія навакольныя партызанскія атрады аказвалі ўпорнае супраціўленне акупантам.

Андрэй Калінін арганізаваў такі атрад з сялян Кармы, Перароста, Агародні. Атрад даў няроўны бой пад Крупцам і Ігаўкай (дакументальна мне не ўдалося ўстанавіць дату, але Ігнат сцвярджаў, што быў бой 18 сакавіка).

Атрад адступіў на Злынку. Камандзір вырашыў забегчы дадому. Перад бацькавай хатай быў забіты, куля трапіла ў патыліцу. Труп не паспелі падабраць, як уварвалася нямецкая кавалерыя. І продкі фашыстаў тры дні не давалі дазволу забраць цела і пахаваць.

Іван і Фёдар памерлі рана. Я помню Паўла і Ціхана.

Павел, па мянушцы Сяўра, праславіўся зусім інакш. Яго ведаў увесь раён. Якія толькі пасады не займаў! Быў старшыня сельсавета, калгаса, рабіў у райза, у МТС. Адусюль яго выганялі з трэскам. За развал работы, за п'янства. Разы тры выключалі з партыі. Аднаўлялі і зноў выключалі. Разоў пяць пакідаў жонку і ішоў да іншых жанчын.

Сцепанец, як называлі дзеда, перастаў прымаць у доме такога сына. Павел мацюкаў і бацьку роднага: «Пузаты Халімошка! Кулак! Я да цябе дабяруся!»

Слова Сяўра стала абразлівым ва ўсіх сем'ях вялікага роду Калініных. Калі хто шалапуціў, яго лаялі: «Сяўра ты няшчасны! Увесь у дзядзьку свайго!»

Я такога гонару не меў. А брата майго Паўла зрэдку, у злосці, і бацька і маці абзывалі гэтак, хоць хлопец ён быў крыштальна сумленны, але ўпарты і настойлівы, ад свайго не адступаў. Я быў хітрэйшы, больш дыпламатычны.

Між іншым, у Сяўры была надзіва добрая, шчырая жонка. Я слаба помніў яе ў маладосці. Але недзе ў годзе 60-м ехаў на машыне да бацькі з дзецьмі. Спыніўся ў лесе каля Плоскага. Ідзе жанчына гадоў 55-ці. У такім узросце сялянкі бываюць змарнелыя. А гэта нішто, бадзёрая, прывабная. Угледзелася ў мяне, узрадавана пляснула далонямі:

— Іван? Сынклецін?

— Я.

— А божачка! Які ж ты! Як дзед твой, Сцепанец,— паказвае на жывот, смяецца.

Гляджу на яе здзіўлена.

— Сяўрыха я. Ульяна. Заязджайце ж да нас. Во парадуецца мой Сяўра. Яму ж абы з кім выпіць. Мы ж тут, на Плоскім. Хату сабе збудавалі,— і пачала расказваць пра сваіх сыноў. Адзін быў ужо начальнікам станцыі, скончыў Гомельскі чыгуначны. — А другі (яна назвала яго імя, але я забыўся, бо хлопцаў яе я не ведаў, не бачыў) — у бацьку. Жыве з другой жонкай.

Пра ўсё яна расказвала з вясёлым гумарам. Вельмі падабалася Машы. Зараз я шкадую, што так ні разу і не заехаў да іх, хоць колькі разоў праязджаў міма.

Сяўра пад старасць супакоіўся, але ўсё роўна «бушуе», як казала мая маці. Маці ставілася да брата паблажліва, але не раднілася асабліва. Хоць заўсёды частавала, калі ён прыязджаў. А бацька мой нярэдка абараняў швагра. Бацьку нечым прываблівaў гэты няўрымслівы характар.

Смерць Сяўры, можна сказаць, была недарэчнай. П'янаваты, вёз па лесе сена, заснуў на возе, воз перакуліўся, і чалавек ударыўся галавой аб пень. Здаецца мне, што бунтаваў Павел Калінін ад незадаволенасці жыццём і сабой. Адчуваў, што здольны на большае. Шукаў справу, месца, людзей, якія зразумелі б яго. Не знаходзіў.

Нават з расказаў тых, хто яго не любіў, выходзіць, што Павел Калінін чалавек быў зусім не дурны, галава ў яго варыла.

Ігнат яго асуджаў. Але са смехам расказваў, як Павел, стаўшы старшынёй, вырашыў арганізаваць працу ў калгасе, сістэму аплаты па-свойму. Гэта ў 30-я гады! Склікаў сход — і людзі яго падтрымалі. Але дайшло да райкома, і яго тут жа бясшумна знялі, паслалі некуды ў пажарную: давай пражакцёрствуй на пажарах!

22. VII. 82

Генеральныя консульствы ГДР і ПНР з выпадку нацыянальных свят заўсёды наладжвалі прыёмы. Немцы гэта рабілі кожны раз з размахам — запрашалі чалавек па 300. Палякі больш сціпла, заўсёды ў сваім будынку. Учарашняе запрашэнне было зусім сціплае: на прагляд фільмаў.

Фільмы паказалі старыя: нядрэнны мантаж кадраў нашай ваеннай кінахронікі аб вызваленні Польшчы і каляровы, яркі, публіцыстычна ўзнёслы фільм 1974 года аб Польшчы. Зроблены па ўзорах нашай дакументалістыкі.

Пасля генконсул і яго жонка запрасілі ў сад. І там на лужку паміж руж стаялі столікі з напіткамі і лёгкай закускай. Проста, сціпла — і хораша. Запрошаных было чалавек 25, усе знаёмыя: Дзялец, Мінкевіч, Мяшкоў, Сінчылін, Стук, Таразевіч. Хто мог, трохі выпіў. Я шкадаваў, што не магу выпіць, — баюся за вочы. Але ўвогуле было прыемна. Пагутарылі, пажартавалі. Відаць, сустрэчы такія з людзьмі неабходныя, яны ўзнімаюць жыццёвы тонус. А то я зусім ужо адчуваў сябе інвалідам, пенсіянерам.

Зноў пра бацьку.

Моцна ён ганяў усю сям'ю, каб рабілі як можна больш. Усе мы былі гультаямі — у яго разуменні. Але калі я падрос і пачаў прыглядацца больш уважліва і аналізаваць, то прыйшоў да высновы, што сам бацька не вельмі любіў цяжкую працу на зямлі, у гаспадарцы. Даручаў маці араць ці нам, па сутнасці яшчэ дзецям, касіць (больш за ўсё я не любіў касіць — дужа цяжка), а сам браў дубальтоўку, ішоў у абход і — бачыў я неаднойчы — у цяньку салодка спаў. Праўда, нельга не зрабіць скідку на яго калецтва. Пры моцнай кульгавасці яму нялёгка было ісці за плугам ці жаць жыта сярпом. Але службу ляснік Шамяка, як яго называлі, нёс бездакорна. За падобную шчырасць у ахове лесу яму нямала дасталася, але і пасля перажытых трагедый ён працаваў з ранейшай адданасцю і, я сказаў бы, смеласцю.

Першая бяда яго напаткала ў 1927 годзе. Служыў ён тады ў самым неспакойным абходзе — каля Насовіч. У тыя гады ўсе сяляне жылі па прынцыпу: хто ў лесе не злодзей, той у доме не гаспадар. Але Насовічы славіліся тым, што ў мястэчку гэтым было больш, чым дзе, злодзеяў, якія кралі не толькі лес, зладзейства асобных насаўлян межавала з бандытызмам: напрыклад, яны рабавалі вагоны цягнікоў. Між іншым, гэтым займаліся і ў першыя пасляваенныя гады.

Мне ішоў сёмы год. Але я добра запомніў той асенні дзень. На вуліцы загаласіла маці. У хату ўнеслі акрываўленага бацьку. Унеслі чырвонаармейцы. Дарэчы, па шчаслівай выпадковасці ў гэты час узвод ці аддзяленне спынілася каля леснічоўкі адпачыць, напіцца вады.

Ранены бацька быў у нагу, вышэй калена. Салдаты зрабілі яму перавязку. Запрэглі каня. Павезлі ў бальніцу ў Гомель. З імі паехала маці, пакінуўшы нас, малых, на чырвонаармейца, якому камандзір даручыў прыгледзець за дзецьмі. Галі быў адзін годзік. Што ж адбылося ў лесе?

Двое парубшчыкаў валілі сосны. Загаду лесніка везці спілаваныя бярвенні да стражы не падпарадкаваліся. Бацька схапіў лейцы, каб

затрымаць каня: па каня прыйдуць, нікуды не дзенуцца. Але ў гэты міг старэйшы парубшчык падбег і напэўна хацеў аглушыць лесніка абухом. Але не пацэліў па галаве, а ўдарыў па прыкладу пістонаўкі. Бацька меў звычай насіць стрэльбу ўніз дулам. Ад удару куркі раздушылі пістоны, і два зарады дробі з пакуллем, з парахавым гарам глыбока загнала ў нагу, пасекла косці. Добра, што бацька не разгубіўся: абломкам стрэльбы ўдарыў малодшага парубшчыка і прымусіў яго, спалоханага, скінуць бярвенні і везці параненага да леснічоўкі. Старэйшы, убачыўшы, што натварыў, уцёк.

Пятру цудам уратавалі нагу, не ампутавалі, хоць, помню, першыя дні маці вярталася з бальніцы ў слязах: «Адрэжуць бацьку нагу». Мяне гэта вельмі палохала, я не мог уявіць бацьку без нагі.

Праляжаў бацька ў бальніцы доўга, здаецца, месяцаў пяць. Вярнуўся кульгавы, але з нагамі. Застаўся на працы. Для сям'і гэта было шчасце.

Між іншым, пра следства таго часу. Пакуль бацьку перавязвалі, не ведаючы сутнасці справы, ашаломлены напачатку хлапчына непрыкметна знік. Парубшчыкі засталіся непакараныя. Па звароце з бальніцы бацька ні аднаго з тых, на каго падала падазрэнне, не здолеў пазнаць. Баяўся памыліцца. Можа, не столькі ён баяўся, колькі маці: «Не дай бог, Пятро, засадзіць у турму невінаватага». Гэта яна паўтарала і пазней, калі бацька часам казаў: «А ўсё ж я яго, гада, пазнаў».

У красавіку 1928 года бацька прыступіў да працы, а ў маі — новая бяда.

Хадзіў ляснік у лесе на досвітку. Хадзіў на мяжы з суседнім абходам, лесніка гэтага абхода Цыкунова гадзіну назад сустрэў. І раптам пачуў яго голас. Чалавек яўна прасіў ратунку. Бацька пакульгаў, як толькі дазваляла нядаўняя рана.

Пяць парубшчыкаў, узброеныя тапарамі, наступалі на Цыкунова. Той прыціснуўся спіной да дуба і пагражаў парубшчыкам дубальтоўкай. Але ў стрэльбе быў толькі адзін набой, і ляснік ведаў: стрэльні ён, парань каго-небудзь з іх — астатнія ўчыняць страшную расправу над ім. Аднак і злодзеі баяліся: усё-такі стрэльба, а жыццё адно. Пагражалі, мацюкаліся, але ніводзін не кінуўся, каб ударыць вартавога лесу.

Убачыўшы бацьку, спалоханы Цыкуноў закрычаў:

— Страляй іх, бандзюгаў, Пятро!

Бацька быў узброены аўстрыйскай трафейнай вінтоўкай, доўгай, цяжкай, з тупымі меднымі кулямі, з магазінам на пяць патронаў (вінтоўку леснікі называлі «вінцірлі», наўрад ці так яна афіцыйна называлася па-нямецку).

У бацькі, безумоўна, яшчэ свежыя былі ў памяці пакуты ад ранення, яшчэ балела рана, была вялікая злосць на парубшчыкаў, ды і ўвогуле чалавек ён быў гарачы, узрываўся рэдка, але ў гневе траціў уладу над сабой. І ён націснуў на спускавы кручок. Грымнуў стрэл, «вінцірлі» біла што з гарматы, і самы агрэсіўны парубшчык падкошана звaліўся на дол. Забіў яго насмерць. Астатнія кінулі коней і — хто куды.

Леснікі прывезлі труп у лясніцтва. Забіты аказаўся насаўляніным, вядомым злодзеем, які двойчы сядзеў у турме.

Гэтая акалічнасць, а таксама тое, што перад тым, магчыма, гэтыя ж людзі ранілі яго самога, а больш за ўсё, як расказваў пасля бацька, рашучае выступленне ляснічага ў абарону свайго шчырага работніка ратавалі Пятра Мінавіча ад турмы. Далі лесніку год умоўна.

З падзеі гэтай запомніліся мне не бацькавы перажыванні, а матчыны — яе страх, што насаўляне, сваякі нябожчыка, адпомсцяць за смерць свайго чалавека.

Страх яе быў дзейсны, таму і запомніўся. Удзень яна хоць з аглядкай, але рабіла на гародзе, у хаце. А ўвечары вяла, несла нас, дзяцей, на начлег да суседняга лесніка ці ў бліжэйшыя пасёлкі, бадай штоночы мяняючы хаты. Помню: вяла яна нас не па дарозе, а па глухіх сцежках, праз гушчар, па палявых разорах, за гародамі мы звычайна ляжалі, чакаючы, пакуль не сцямнее, каб ніхто не бачыў, да каго мы пайшлі.

Пасля я даведаўся, што бацька дамаўляўся ўдзень — у каго нам начаваць.

Маці кідала гаспадарку, але не кінула бацьку, не паехала ў Карму. А бацька і пасля гэтага здарэння службу не хацеў кідаць.

Мы начавалі ў некага, а ён — на гарышчы леснічоўкі, узброены. Пільнаваў гаспадарку, для чалавека многа значылі конь, карова, свінні, хатні набытак. Але ніхто не крануў і куранятка, так расказвала пасля маці. У хуткім часе, можа, тыдні праз тры-чатыры, бацьку перавялі пад Краўцоўку. Ад Насовіч гэта ўсяго кіламетраў 17. Але маці неяк адразу супакоілася. Няўжо лічыла, што такая адлегласць гарантуе ад помсты?

Мясціна гэтая прыйшлася бацькам даспадобы. Ды і нам, дзецям, таксама. Леснічоўка стаяла на паўдарозе паміж Студзёнай Гутай і Дзікалаўкай, на шляху з Дабранкі ў Гомель. Але бліжэй была Краўцоўка, трохі ў баку ад шляху. Адна вуліца гэтага даволі вялікага сяла, якую называлі Аднабочкай, хоць заселены былі два яе бакі, падступала амаль жа да лесу.

Урочышча называлася Клецянкай. Тут, у Клецянцы, дзе мы пражылі поўныя пяць гадоў, прайшло свядомае маленства, бадай, самае шчаслівае, калі пазнаецца свет і пачынаеш задумвацца над з'явамі прыроды, над паводзінамі людзей. Тут я пачаў пасвіць каровы. Навучыўся чытаць. Навучыўся, дарэчы, надзіва хутка. Бацька прывёз буквар, паказаў літары. Не вельмі ўмеў нават раскрыць тайну складання літар, гукаў у словы. Але я сам дайшоў да гэтага. І вельмі здзівіў маці, бацьку, суседніх леснікоў, калі месяцы праз два-тры, не ходзячы яшчэ ў школу, прачытаў ім тэкст, не з буквара, з нейкай іншай кнігі лепш, чым чыталі некаторыя з іх. А маці мая ўвогуле была непісьменная, пазней я навучыў яе распісвацца і з цяжкасцю прачытаць па букварах, да большага яна не дайшла.

Маці маё чытанне здавалася дзівосным. Помню, яна нават усумнілася напачатку, спытала ў бацькі: «Пятро, праўда, Іван так чытае ці ета ён выдумляе ад сябе?» Бацька раскрыў старонку буквара ў канцы і таксама быў здзіўлены, што я так бойка чытаю.

Пахваліў:

— Во, змей, чэша! Быць табе ляснічым!

Стаць ляснічым — мара гэтая і ў мяне трымалася, можа, да сёмага класа, пакуль лёс не занёс у тэхнікум будаўнічых матэрыялаў.

У першым класе школы, куды я пайшоў на дзевятым годзе жыцця, мне не было чаго рабіць побач з вясковымі хлапчукамі і дзяўчаткамі, большасці з якіх вельмі туга давалася тайна чытання, арыфметыкі. Часта замест задання першага класа я паспяхова выконваў заданне трэцяга класа, вучні якога сядзелі побач, правей, займаючы другі рад парт. Вяла класы адна настаўніца — Валянціна Андрэеўна Рабцава. Яна вучыла мяне да пятага класа. Я любіў сваю настаўніцу. Мне здавалася, што жыве яна зусім іншым жыццём, чым усе навакольныя людзі. Жыццё гэтае вабіла мяне. Вельмі хацелася падгледзець яго, пазнаць. Парадак, чысціня ў яе кватэры моцна ўражвалі. Я паспрабаваў наводзіць такі парадак дома, але з гэтага нічога не атрымалася, за падобнае новаўвядзенне добра ўляцела ад бацькі.

У Валянціны Андрэеўны не было мужа, але, калі мы былі яшчэ ў першым класе, яна нарадзіла дзіця, дачку. Пра гэта было многа размоў. Яе асуджалі. А для мяне настаўніца зрабілася яшчэ больш таямнічай, загадкавай.

Дзіцячы розум мой якраз у той час біўся над пазнаннем вялікай тайны прыроды: чаму целіцца карова (як яна целіцца, я, пастух, бачыў), адкуль бяруцца дзеці, у казкі пра буслоў я ўжо не верыў. Здаецца, я ўжо дайшоў да разгадкі, што без мужа жанчына не можа нарадзіць. Не дазволена. Абавязкова павінны быць і маці і бацька.

Ведаў я дзяцей-сірот, але ў іх памерлі бацька і маці. Дык адкуль жа дзіця ў Валянціны Андрэеўны? «Нагуляла»,— растлумачыў нехта са старэйшых і яшчэ больш заблытаў тайну, якая нібыта пачала ўжо прасвятляцца.

Вярнуўшыся з дзіцём (ішлі размовы, што бацька настаўніцы поп, што таксама было дзіўна, бо сама яна часта гаварыла нам, што бога няма, што яго выдумалі папы, каб ашукваць людзей), Валянціна Андрэеўна прывезла жанчыну — ліліпута: з твару старэйшая за яе, а ростам ніжэй за нас, першакласнікаў. Жанчына гэтая няньчыла дзіця. Для краўцоўскіх баб яна была дзівам. А для мяне — новая загадка прыроды.

Між іншым, недзе ў гэты час бацька ўпершыню павёз мяне ў Гомель і там павёў у цырк, на дзённае прадстаўленне. (Аб любові бацькі да цырка я раскажу пазней.) Усё прадстаўленне складалася з таго, што паказвалі высачэзнага мужчыну — тры аршыны — і двое ліліпутаў, меншых за няньку. Нейкі чалавек расказваў, чаму яны такія выраслі, але я нічога не зразумеў. Помню хіба адно: страх, які апанаваў,— не застацца самому гэткім малым. Але і вялікім, як той мужчына, не хацелася вырасці. Здалося страшэнна абразлівым, што цябе, як дзіва нейкае, паказваюць іншым.

Што б ні казалі пра яе — я любіў сваю настаўніцу. Улюбёны быў шчыра, аддана, так любяць толькі дзеці. Яна ва ўсім здавалася незвычайнай, не падобнай на іншых людзей. Арэол, які я стварыў вакол яе, пабляк, здаецца, у трэцім, калі нават не ў чацвёртым класе. Прыехаў да нас настаўнік, дужы, грубаваты хлапчына, якога мы не любілі, веў ён не наш клас, але чапляўся на перапынках за ўсялякую дробязь і ў пакаранне даваў балючыя пстрычкі. Лупцавалі нас дома мацней, ды і адзін аднаму мы наганялі добрыя гузакі.

Але пстрычкі настаўніка абражалі і абуралі, можа, таму, што наша Валянціна Андрэеўна не толькі нікога ніколі не зачапіла пальцам, але і голас рэдка павышала.

І вось аднойчы на перапынку, праз акно, я ўбачыў, як гэты настаўнік цалуе Валянціну Андрэеўну. І яна не адбіваецца.

Перажыў я гэта як уласную трагедыю. І сама настаўніца раптам зрабілася ў маім уяўленні звычайнай бабай.

Успаміны — ліпучае рэчыва. Хацеў пісаць пра бацьку, а збіўся на сябе.

І там, у Кляцянцы, «кульгавы чорт», як бацьку завочна называлі вяскоўцы, выконваў свае леснічоўскія абавязкі гэтак жа старанна.

Але — сцяміў я пазней — больш хітра: не абвастраў гэтак свае адносіны з людзьмі.

Да калектывізацыі лес там кралі бязлітасна, асабліва зімой. Вёскі навокал бедныя, зямля пясчаная. Іншага заробку блізка не было. У далёкія гарады, у Данбас з гэтых вёсак неяк не заведзена было ездзіць. З Кармы ездзілі больш. Ці, напрыклад, з Грабаўкі, да якой усяго шэсць вёрст праз лес, там — славутыя муляры, цесляры; грабаўцы будавалі першы маўзалей Леніна.

Са Студзёнай Гутай клопатаў было менш, тыя секлі ў іншых абходах. А дзікалаўцы (самыя зацятыя парубшчыкі), краўцоўцы і нават гарнастаеўцы (суседняя ўкраінская вёска) — бацькава «кліентура». Людзей нельга асуджаць. Адзіны іх заробак на соль, запалкі, на аршын-другі «чартакожу» дзецям на штаны, на сшыткі, на хустку жонцы быў з воза ўкрадзеных у лесе і прададзеных дабранскім яўрэям дроў. У кожнага былі свае спажыўцы.

У зімовыя, незавейныя, светлыя ночы бацька не начаваў дома. Маці баялася гэтых паходаў.

«Заб'юць цябе, Пятро».

«Няхай забіваюць».

«Што ета ты, дурны, кажаш. А дзеці?»

У першыя гады маці ўсё ж баялася заставацца адна з намі, малымі. Часта пасярод ночы яна выходзіла на ганак і страляла з пістаноўкі. У хаце, паміма «вінцірлі», былі дзве стрэльбы-аднастволкі і двухстволка. Калі бацька хадзіў па лесе са сваёй стрэльбай, не з казённай (за патроны ад яе трэба было даваць справаздачу), то адказваў стрэлам. Часцей — трубіў у ражок. Адказ супакойваў маці.

Пад раніцу часта скрыпелі сані, мацюкаліся парубшчыкі, скідаючы спіленыя бярозы. Раніцой мы бачылі новыя бацькавы трафеі — пілы і тапары. Іх набіралася ў клеці дзесяткі. Сякера і асабліва піла для тагачаснага селяніна — рэчы каштоўныя, дарагія. Удзень парубшчык з'яўляўся выпрашваць у лесніка вярнуць карміліцу — пілу.

«Будзеш яшчэ красці?»

«Клянуся, Мінавіч...»

«Вот жа брэша, гад».

«Не хрысціся, Карней,— падключалася маці. — А хату чым нагрэеш? Дзеці памерзнуць».

«То няўжо сухастоінку не дасі, Мінавіч?»

«Тапор — на. А за пілой прыедзеш у панядзелак. А то я знаю цябе: пад нядзелю пагоніш дровы ў Дабранку».

Хітрасць бацькі заключалася ў тым, што пратаколы ён складаў толькі на самых злосных парубшчыкаў. Пратаколаў баяліся — вялікі

штраф. Лепш, калі ляснік карае сам. Тут як бы ішла вясёлая гульня: хто каго перахітруе. Чалавек божыцца, што нагі яго не будзе ў лесе. І сам сабе не верыць, употай думае: усё роўна перахітру цябе, чорта кульгавага. Бацька ведае пра гэта і як бы прымае правілы гульні.

«Я ж цябе, гада, у суботу злаўлю. Тады не прыходзь ужо».

Злоўленыя трэці... пяты раз не прыходзілі па месяцу, два. Здаралася, што такія тапары і пілы здаваліся ў лясніцтва. Там іх за зіму набіралася ад усіх леснікоў столькі, што, помню выпадкі, па вясне іх распрадавалі за сімвалічную цану. Выкуплялі свае пілы самі гаспадары. І знарок неслі міма «стражы», наладжваючы вясёлую музыку піл: дарэмна, маўляў, ты стараўся, ляснік.

Калі прайшла калектывізацыя і абагулілі коней, кралі лес значна менш, галоўным чынам для сябе, калі вельмі ўжо пільная патрэба была. Зрэдку — для калгаса. Кража гэтая набыла зусім іншы змест, ды і формы. Ва ўсякім разе, знікла «вясёлая гульня» паміж «зладзеямі» і вартаўнікамі. Бацька сумаваў без звыклай працы. А маці радавалася: у зімовыя ночы Пятро бестурботна спаў дома.

Дарэчы, пра калектывізацыю. Я не так блізка ведаў вёску, яе людзей, каб мяне гэта закранула. Помню хіба адно. Калі пачалося раскулачванне, бацька паведамляў маці як бы спалоханым шэптам, што забралі Сядога ці Дубадзела. Мяркую, сітуацыя была такая. Заможныя дзядзькі, дзелавыя і хітрыя, рэдка ўніжаліся да таго, каб красці лес па-зладзейску ўначы. Дровы на продаж яны не вазілі. Лес ім трэба быў страявы, для пабудовы. Такі лес яны выпісвалі. Але лес замяраецца па-рознаму нават у наш час высокай механізацыі ўліку. Натуральна, што «законнікі» стараліся наладзіць найлепшыя адносіны з леснікамі.

Але ўвогуле Пятро Шамяка быў чалавекам гордым, непадкупным. У час свайго маленства я не помню выпадку, каб прыехаў хтось да яго з пляшкай гарэлкі. Увогуле да вайны выпіваў бацька вельмі рэдка. Можа, раз у месяц збіраліся леснікі, і ім на чатырох-шасцярых хапала паўлітэркі — пускалі адну чарку па кругу. Маці радавалася такім зборам: яна была гасцінная і любіла, калі наведваліся людзі. Яна і парубшчыкаў па-свойму любіла і нярэдка ўпотай ад бацькі вяртала тапор ці пілу. Тапароў набіралася так многа, што бацька матчынай хітрасці не заўважаў. Толькі часам здзіўляўся:

«Во гад Кулікаў! Плакаў, што апошні тапор, што дровы не будзе чым калоць, а не ідзе за тапаром. Разбагацеў, такую яго...»

Я здзівіўся, калі ў сорак пятым, вярнуўшыся з войска, наведаўся дадому і маці паскардзілася, што бацька лішняе выпівае.

Думаю, прычын было некалькі. Па-першае, сама вайна, нервовае напружанне, пераацэнка многіх каштоўнасцей жыцця. Пасля вайны ўсе, хто застаўся жывы, пілі больш. Пэўна, інерцыя працягваецца і цяпер, а можа, нават набірае разгон, п'янства даўно стала бядой, амаль катастрофай. Лес пасля вайны ніхто не краў. Не было на чым. Ды і не было патрэбы. Вакол усё спалена — сёлы, гарады. Дзяржава шчодра выпісвала лес — толькі будуйцеся! За ўсю гісторыю арганізаванага лесаводства ніколі не высякалі столькі лесу, як у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Значна цяжэй было вывезці яго. У першыя гады гэта была праблема з праблем. Пакуль франтавік ці ўдава выпрасіць у калгасе машыну... А колькі іх было — машын! Адна-дзве — у лепшым выпадку. Прасілі ў лесніка не лішні пень, не лішняе бервяно, часцей прасілі такое месца, адкуль лягчэй вывезці, дзе не трэба тралявацъ, куды можна пад'ехаць на машыне, на трактары. За гэта леснікоў частавалі. Памагчы чалавеку з меншай затратай сіл і сродкаў вывезці бярвенні, каб збудаваць дзецям хату, вывесці іх з зямлянкі — бацька лічыў грамадзянскім абавязкам. Я назіраў яго работу ў той час. Людзі прыязджалі бясконца, на досвітку, позна ўвечары (чалавек перахапіў недзе армейскую машыну) — і ляснік ніколі нікому не адмаўляў. Лес ён ведаў лепш, чым уласную хату,— дзе што ляжыць. Можна было дзівіцца яго памяці — на прозвішчы, на аблічы.

Пры мне — аднаму ў афіцэрскім шынялі:

— Не адпушчу я твой лес.

— Гэта ж чаму?

— Галлё ты сабраў? Спаліў? Я за цябе буду рабіць? Навядзі парадак на вырубцы — падпішу білет.

Так што піць яго прывучылі не парубшчыкі — франтавікі. Іншы бядак прыязджаў з пляшкай самагонкі, а на перакус не меў і зерня макавага. Вінавата шкроб патыліцу.

— Мінавіч, акрайчык хлеба не знойдзецца?

Канешне, знаходзіў. Ды такім і маці не шкадавала. Галоднаму апошні кавалак аддаць магла.

Шамяку паважалі. З ім лічыліся — старэйшы ляснік. Хоць маладзейшыя, не ведаючы традыцый старой лясной гвардыі, сачынялі пра яго анекдоты — пра сумленнасць, прынцыповасць яго.

Расказваў мне ляснічы Капытаў, са смехам, але з гонарам за сваю варту:

— Тут аднойчы прыбягае да мяне бледны, як палатно, адзін дабрушанін, невялікі начальнічак... нарыхтоўшчык. Вядомы даставала. Крычыць: «Слухай, зачэм ты дзержыш сумашэдшых леснікоў? Оні ў

цебя людзей побьют». — «Хто гэта ў мяне сумашэдшы? Пакажы мне!» — «Да это храмой, чорны. Зверь зверем...»

А гісторыя была такая. Не ў бацькавым абходзе. У суседняга лесніка. Прыязджае гэты нарыхтоўшчык. Дубовыя падмуркі яму спатрэбіліся. Выпісаў пару дубоў, а ссекчы хацеў пяць. Для гэтага рашыў улашчыць леснікоў. Дастаў з кірзавай торбы дзве бутэлькі гарэлкі, паставіў на стол. «Вы, хлопцы, выпіце, а я спілую тыя два дубкі, што засталіся на прасецы». А стаялі там не дубкі, а добрыя дубы. Ды тут падхапіўся бацька.

«Дык ты, сукін сын, купіць нас хочаш за бутэльку?» — і кульгель да нарыхтоўшчыка. Той, спалоханы,— з хаты.

«Гарэлку сваю забяры!» І выкінуў пляшкі ў адчыненае акно. Разбіў.

У акупацыю сям'ю з леснічоўкі не выселілі, нікому не трэба была старая хата на краю лесу, на самай мяжы Беларусі і Расіі. Але лесніком яго не зрабілі — паставілі іншага, з суседняй вёскі.

Пра сувязь сваю з партызанамі бацька расказваў скупа. «Было дзела. Пераводзіў разы тры праз жалезную дарогу». Але гадоў праз дваццаць пасля вайны, здаецца, ужо тады, калі бацькі не стала, работнік Гомельскага архіва Карпаў паказаў мне некалькі партызанскіх рапартаў, у якіх гаварылася, што атраду памог ляснік Шамякін. На жаль, дэталяў не было — як, у чым памог. І людзей з гэтага атрада не ўдалося знайсці.

Маці расказвала. Наляцелі аднойчы паліцаі. Пабілі бацьку, павялі з сабой. «Расстраляюць»,— думала маці і разам з дзяўчатамі прагаласіла ўсю ноч. Але раніцой бацька вярнуўся, аднак пабіты да таго, што харкаў крывёю і доўга хварэў.

Вярнуліся нашы — і Пятро да з'яўлення афіцыйнага прызначэння ляснічага пачаў выконваць свае леснічоўскія абавязкі, быццам і не было двухгадовага перапынку з восені 1941-га па восень 1943-га, калі вызвалілі ўсходнюю Гомелышчыну.

Пры адступленні немцы спалілі леснічоўку, не мінулі і адзінокай хаты.

У 1944 годзе бацька пачаў будаваць уласную хату: трэба жыць, а спадзявацца, калі пабудуе лясніцтва,— доўгая песня.

Хату ён паставіў хітра: на краі пасёлка Чэхаў, «упісаўшыся» ў вуліцу. Але... пасёлак рускі, Навазыбкаўскага раёна, а бацькава хата — на беларускай зямлі, у Добрушскім лясніцтве. Пасля ён расказваў са смехам: удакладнялі картографы мяжу, візіравалі прыборамі і — да бацькі з прэтэнзіяй: «Дзед, ты што гэта нарабіў? Ты знаеш, што

палавіна твайго хлява ў Беларусі, а другая палавіна — у Расіі?» Маці баялася, што прымусяць разбурыць хлеў.

Падатак і страхоўку спачатку плаціліў Каменскі сельсавет: побач жа, нейкія два кіламетры. Але нейкі ўніклівы чыноўнік з Добрушскага райфа дакапаўся, што адзін з леснікоў папаўняе капейкамі не тую касу, і прымусіў плаціць кармянскаму Савету, за 15 кіламетраў. Бацька абураўся: «Якая розніца? Не адно государства, ці што?»

Але перад смерцю выказаў нечаканае пажаданне: не хаваць яго на каменскіх могілках, пахаваць у Дубецкім, дзе пасля вайны вырас пасёлак пасярод лесу. Там, на лясных могілках, пад дубамі, мы пахавалі яго 2 студзеня 1966 года. Да яго на могілках тых было пахавана ўсяго тры чалавекі: два салдаты і старая.

Жыццё аддаў лесу і ляжаць захацеў у лесе.

Там пахаваны і маці і сястра мая Галя, тры магілы побач.

Зусім маленькая тады бярозка каля самай бацькавай магілы, якую я прасіў зберагчы, выросла ў добрую бярозу. І дубы засланяюць сваімі кронамі паўмогілак, на якіх ужо пахаваны не адзін дзесятак чалавек. На могілках гэтых мяне заўсёды агортвае нейкі дзіўна суцішаны смутак. І шум лесу — як элегічная музыка. Думаеш пра кароткасць жыцця і пра вечнасць яго, няспыннасць.

І зноў пра бацьку. Успомніў уначы. Эпізод яго службы. Пасля вайны ўжо, недзе ў 50-я гады, наведаўся я да бацькоў, здаецца, з-за хваробы маці. Адзін. Без машыны. А можа, і не было яшчэ яе? Трэба ехаць назад. Цягнік у шэсць раніцы. Бацька запрог каня. Паехалі чамусьці не на Злынку — у Закапыцце. Пэўна, у бацькі былі справы ў лясніцтве. Цёмна яшчэ было — чатыры гадзіны. Углыбіліся ў лес — стук тапара. Бацька тут жа:

— Тпру,— з воза і пакульгаў.

— Ты куды?

— Не чуеш хіба?

— Во так? Без зброі?

Ухмыльнуўся:

— На чорта мне тое аружжа.

Я прывязаў каня. Пайшоў следам.

Бацька падышоў да парубшчыкаў. Прывітаўся:

— Здарова, хлопцы.

Тыя прыкметна спалохаліся. Потым чалавек у гадах плюнуў:

— Цьфу, мара! Не спіцца табе, старому чорту!

— Не спіцца. Ты мне прысніўся. Дык як тут заснеш? Сон — у руку.

Мяне не ведаюць. Глядзяць з апаскай: не іначай нейкі лясгасаўскі інспектар.

Бацька садзіцца на павалены дуб. Дастае кісет.

— Ладна, папаліся — судзі. Але дай закурыць.

Бацька паказвае парубшчыку фігу.

Мяне забаўляюць іх адносіны. Закурыць усё ж дае.

Сядзяць, кураць. Я пазіраю на гадзіннік.

Парубшчык пачынае апраўдвацца:

— Панімаеш, Мінавіч, нужда прыпёрла. У зяця во,— паказвае на малодшага, што стаяў збоку і глядзеў з-пад ілба,— шулы пагнілі.

— Не брашы, Смірноў. Заганяеш ты клёпачку ў Злынку. Каму? Даўно я цябе каравулю...

— Яй-богу, Мінавіч, першы раз за лета.

— Ну, навальвай дубок.

— Куды?

— Павязём у Плоскае.

Замаліўся парубшчык:

— Мінавіч, толькі не ў лясніцтва. Знаю, якую катушку могуць наматаць. Хоць бабу закладвай. Я завязу дубок да тваёй хаты.

— Там леташнія твае гніюць.

— Ну, напішы пратакольчык... божаскі. Знаеш жа, якія ў мяне грошы...

— Не буду пісаць.

— А што?

— Злаўлю яшчэ раз — усе спіленыя ў абходзе дубы на цябе запішу. Во тады і праўда штаноў у цябе не хопіць. На фабрыку пойдзеш штраф адрабляць. (Побач, у Малым Вышкаве, запалкавая фабрыка, на якой не хапала рабочых.)

— Ды ты што! — не на жарт палохаецца парубшчык.

— А тое... на носе сабе засячы. А за пілой прыйдзеш...

Забраў пілу і пайшоў на дарогу, да свайго каня. Мяне сцэнка гэтая развесяліла: спектакль!

Аб леснікоўскім лёсе.

Перачытваю «Новую зямлю». Геніяльная кніга! Столькі ў ёй таго, што знаёма мне! Хацеў было напісаць аповесць аб сваім лясным маленстве. Але ўспомніў «Новую зямлю»... Лепш не напішаш! Безумоўна, час іншы. Але ў 20-я і нават 30-я гады служба мала чым адрознівалася ад службы Міхала.

І пераезды былі нечаканыя — па волі ляснічага, ад жадання яго паказаць уладу сваю.

Так улетку 1933 года бацьку раптам назначылі ва ўрочышча Воленка ў самы далёкі ад лясніцтва абход. Назначылі тады, калі не здолелі яшчэ вызваліць месца. Лесніком у Воленцы быў партызан часоў грамадзянскай вайны, ардэнаносец. Ці не адзіны ў раёне. Не, быў яшчэ ў Маркевічах кітаец, таксама меў ордэн; кітаец гэты так і не ўступіў у калгас, хоць яго разы два арыштоўвалі. Пасля вайны, калі я працаваў у Пракопаўцы, кітаец з дзікім лямантам уварваўся да мяне ў школу, шукаў партыйнага сакратара. Яму не прадалі ў мясцовай краме лапату. Лапаты былі дэфіцытам, прадавалі іх па спісу, лепшым людзям ці на нарыхтоўку яек. А ён, кітаец, з суседняга сельсавета, і ордэн яго не меў ужо той сілы, што да вайны: амаль кожны франтавік меў ордэн. І не адзін.

Аднак пра Скоблікава гэтага, лесніка. Зволілі яго за тое, што біў парубшчыкаў. Пісалі скаргі.

Загад падпісалі ў лясніцтве, а выселіць яго з леснічоўкі не мелі сілы.

Бацька колькі разоў хадзіў да яго, за дваццаць вёрст, каб прыняць абход.

«Прынімай. Мне здаваць няма чаго».

У Кляцянку прыехаў новы ляснік. Дзве сям'і ў адной хаце.

Ляснічаму абрыдлі дзівацтвы Скоблікава, і ён загадаў бацьку пераязджаць: куды дзенецца, у яго свая хата ў Церахоўцы! Помню, дзесьці ў ліпені, у спёку, пагрузілі мы скарб свой, куфры і бочкі, сталы і лаўкі, на тры фурманкі, прывязалі да вазоў кароў і цялушак. З цялушкай было бяды. Упіралася. Колькі разоў сарвалася. Ганяліся за ёй.

Ехалі па пясчанай дарозе цэлы дзень. Прыехалі позна ўвечары, смяртэльна стомленыя. Малыя сёстры спалі на возе.

Я таксама засынаў на нагах. Але спалохаў мяне барадаты, як цыган, Скоблікаў. Нарабіў крыку на ўвесь лес. Не пушчу ў хату! Са стрэльбай на парозе стаў. Ён некуды ездзіў — у Гомель ці нават у Мінск,— нехта яго падтрымаў.

Бацька трохі не счапіўся з ім. Таксама схапіўся за стрэльбу. Маці — уголас, мы з Паўлам таксама плачу нарабілі. Утаймаваўся, барада. Дазволіў дзецям паначаваць у хаце. Але павярнуў-такі прызначанага на яго месца лесніка назад. А куды ехаць? Сваёй хаты няма. Назад — у Кляцянку. Маці ўсю дарогу плакала: а што, калі і Харкоў (новы ляснік) не пусціць?

Бацька кіпеў, няхай паспрабуе не пусціць! Маці разумела: не дай божа здарыцца гэта — быць бядзе. На прывале схавала стрэльбу ў скрыню, зачыніла на замок, ключык аддала мне:

«Скажу, што згубіла».

На шчасце, новы ляснік быў чалавекам вясёлым, кампанейскім. Ён толькі пасмяяўся: «А я знаў, што Скоблікаў вас не пусціць».

Ведаў ён добра гэтага крыкуна.

Маці шчаслівая была, што не засталіся без страхі над галавой.

«А то хоць да цыганоў ідзі»,— казала яна. Месяцы тры мы жылі ў абжытай леснічоўцы разам з сям'ёй новага лесніка. Жылі дружна. Але бацькам і нам, дзецям, пакутлівым было гэтае доўгае развітанне з кутам, што стаў родным. Бацька перажываў, што яго часова зрабілі пажарным вартаўніком. Служба летняя і рангам ніжэйшая. Перажываў і ад таго, што бестурботны Харкоў парушаў добрыя леснічоўскія традыцыі: гэты чалавек і выпіць мог, і за пляшку дрэва мог прадаць.

Мне балюча было думаць, што трэба пакідаць Краўцоўскую школу. Чатыры гады правучыўся. Грамацеем стаў, як хваліўся бацька, на ўсю акругу.

«Настаўнікаў, змей, ставіць у тупік».

Тагачасных настаўнікаў няцяжка было «паставіць у тупік» нечаканымі пытаннямі. Школа выросла ў сямігодку, з'явіліся прадметнікі — з тэхнікума, з курсаў. Але сярод іх сапраўднай настаўніцай заставалася толькі Валянціна Андрэеўна. Расчараванне маё ад таго, што яна цалавалася, знікла, і я па-ранейшаму захапляўся ёю, любіў. Была і кропля суцяшэння: у пятым класе яна не будзе вучыць нас, а таму не так шкада пакідаць гэтую школу.

Усё ж у пяты клас я пайшоў у Краўцоўку. Месяца паўтара вучыўся. І за гэты час перажыў прыгоду, якая не забываецца,— закахаўся.

Маша смяецца, калі я расказваю, што ўпершыню закахаўся ў пятым класе.

А між тым я добра помню тое дзівоснае, трапяткое, як расінка на траве, пачуццё.

З'явілася новая вучаніца — сястра крамніцы, што прыехала, здаецца, з тых жа Насовіч. Мястэчка пры чыгунцы, у якім многія падрабляліся пад гараджанак. Дзяўчынка была апранута не па-вясковаму, ва ўсё крамнае. Выглядала прынцэсай. Магчыма, гэтым і прывабіла мяне, малога «эстэта», які начытаўся кніжак. Смешныя заляцанні ў такім узросце! Хацелася дагадзіць ёй ва ўсім, аддаць усё лепшае. Але што ў мяне было? Хутка маю ўвагу пачалі прыкмячаць. Дзяўчаткі — перш-наперш. Малыя-малыя, а праніклівыя. Пачалі смяяцца. А «каханая мая» (усё помню, імя не помню) пачала саромецца, пазбягала мяне і нават крыўдзіла. Новыя пакуты.

У асенні час патрэба ў пажарніку знікла, і бацьку прызначылі... крамнікам АРЗа пры лясніцтве. Пераехалі ў Пыхань. (У сапраўднасці

ўрочышча, дзе размяшчалася лясніцтва, называлася Епіфань, але навакольныя сяляне для лёгкасці вымаўлення назвалі Пыханню, што пасля прыжылося нават у афіцыйных дакументах.)

Пайшоў у школу ў Церуху — у сяло, якое ўвайшло ў маю біяграфію больш трывала, чым Карма. Пераязджаў я з болем. Пасля, мабыць, месяца паўтара, кожную нядзелю хадзіў у Краўцоўку. Нібы да сябра свайго Аніські, маці хлопца, малдаванка, кранута была такой сяброўскай вернасцю. Але хадзіў я за восем вёрст не да Аніські. Мне хацелася ўбачыць сваю «каханую». Я праходзіў міма хаты, у якой яна кватаравала, з замiраннем, стаіўшы дыханне і чуючы ўдары ўласнага сэрца. Хацелася хоць на міг убачыць яе. Але так ні разу і не ўбачыў. З'явіліся новыя захапленні тут, у Церухскай школе. За мной сядзелі тры дзяўчынкі, яны скублі вавёрчын каўнер майго паліто і падглядалі задачкі: я выдатна ведаў арыфметыку і алгебру, і ў школе, і пасля — у тэхнікуме, асабліва ўмеў рашаць задачы.

Заўсёды я быў дысцыплінаваны, прыкладны. А там, у Пыхані, як чорт пасяліўся ўва мне. Пэўна, гэта быў нейкі пратэст. У школу разам са мной хадзілі з пасёлка Каралін. Я часта біўся з гэтымі вучнямі, яны скардзіліся дырэктару, той часам браў мяне за вуха і выводзіў да дошкі, каб паказаць класу: палюбуйцеся, маўляў, на гэтага задзірыстага пеўня. Але перад дзяўчатамі, што скублі каўнерык, я ўсё роўна як млеў, з імі я быў рыцарам. Асабліва падабалася адна, беленькая, нават трохі рыжаватая, самая далікатная з іх — Маша Кротава. Праз сем гадоў яна стала маёй жонкай.

Бацьку мы баяліся. Прыходзіў ён, асабліва калі не адзін,— сядзелі на печы. Ішоў ён у абход — радаваліся, засмучаючы гэтым маці. Ён быў строгі, хоць папругу распяразваў рэдка. У памяці засталося ўсяго два выпадкі, калі мне добра дасталася. Першы раз, калі мне было гадоў сем. Бацькі сабраліся ў Карму. Я нарабіў плачу, каб ехаць з імі. І доўга бег за возам. Бацька разоў колькі цыкнуў на мяне, прыстрашыў.

Я не адставаў. Тады ён паманіў:

— Ну, хадзі сюды.

Я ўзрадаваўся: бацька бярэ мяне з сабой! Падбег да воза. Але, замест таго каб пасадзіць на воз, бацька перацёг мяне пугай па спіне, ды так, што крывавы пісяг тыдні два трымаўся. Пасля гэтага я ніколі нічога не прасіў у яго. Неяк адразу пасталеў.

У другі раз я атрымаў лупцоўку ўжо тады, калі мяне пакідалі за гаспадара. Бацькі паехалі на луг да Сожа касіць сена. Мы, дзеці, засталіся самі. Звычайна бацькі вярталіся дацямна. А тут цямнела, а іх няма. Зрабілася страшна. І мы з Паўлам вырашылі напалохаць і

нядобрых людзей, і драпежных звяроў. Так у зімовыя ночы палохала ўяўных бандытаў маці. Мы дасталі са скрынкі «вінцірлі» і з ганка выпусцілі ўсю абойму, цэлячыся ў цёмны лес, дзе, здавалася нам, прытаіліся ворагі нашы.

Пасля гэтага леглі на падлозе спаць, вінтоўку палажылі побач з сабою. І, безумоўна, хутка заснулі. Заснулі мы з Паўлам такім сном, што бацькам прыйшлося выстаўляць шыбу, адчыняць акно, каб залезці ў хату.

Раніцою бацька зусім не строга, нават весела, паклікаў нас з Паўлікам:

— Ану, сынкі, хадзіце, раскажыце, як вы стралялі.

Павел малодшы, а сцяміў хутчэй, чым скончыцца наш расказ,— шмыгнуў у запечча, адтуль — на двор. Магчыма, яму дала знак маці. А мяне бацька схапіў, заціснуў галаву між каленъ і... давай паласаваць папругай. Каб не маці, якая вызваліла мяне, я не толькі сесці — ляжаць бы не мог доўгі час.

Дзіўна, але ў пятым класе, менавіта там, у Пыхані, я неяк нечакана стаў баяцца бацькі значна менш. Вельмі можа быць, што я адчуў пэўную перавагу над ім. Я адчуў слабасць яго на нязвыклай пасадзе крамшчыка. Я ўмеў лічыць лепш, чым ён, і справаздачы пісаў нядрэнна.

Была картачная сістэма. Амаль усе прадукты выдаваліся па картачках. Крамнік адразаў нажніцамі ад агульнай карты спажыўца маленькія, трохі хіба большыя за паштовую марку, картачкі і кідаў у агульную скрынку. А ўвечары прымушаў мяне разбіраць яе: хлеб — асобна, крупы — асобна, цукар — асобна, рыбу — асобна (мяса і кілбасы кіколі не было). Трэба было не толькі разабраць картачкі, наклеіць на кардонкі, палічыць, запісаць. Работа чартоўскі нудная. Разбіраеш — і клюеш носам. Крупы трапляюць у рыбу, мука — у цукар. Зрэдку бацька даваў пстрычку, каб я не спаў.

Бацька трымцеў над кожнай карткай. Але аднойчы ён узяў мяне з сабой у АРЗ. І ўбачыў я там: стрыжаная жанчына толькі глянула на акуратна падклееныя карткі, запісала нешта ў адзін вялікі агульны сшытак і... шуганула ўсю маю працу ў грубку. Пасля гэтага знікла мая павага да картачак і да працы, бацькавай і сваёй уласнай.

Маці вельмі баялася, каб Пятро не пратаргаваўся. І ён такі прагарэў; месяцы чатыры ўсяго і парабіў. А мусіў прадаць цялушку, каб пакрыць нястачу. Пайшоў кланяцца ляснічаму, каб даў яму пасаду лесніка. А той якраз «даканаў»-такі Скоблікава, здаўся партызан, пайшоў у нейкую раённую арганізацыю.

Зноў — Воленка!

У Церухскай школе не правучыўся я і паўгода. Ад Воленкі школа далёка, у Макаўі, за сем вёрст. І мяне справадзілі ў Карму, да бабулі.

1. VII. 82

І зноў пра бацьку. Прыгадваю дэталі і прыходжу да высновы, што быў ён чалавекам цэльнай натуры і па-свойму таленавітым. Але не ў вядзенні сваёй уласнай гаспадаркі. Схільны думаць, што сказалася пэўная спадчыннасць, гены. У дзеда Міны пры ўсёй яго шумлівасці, пры тым, што працаваў ён да знямогі, біўся як рыба аб лёд, каб разбагацець, нечага не хапала, мабыць, сялянскага таленту, уменя павесці справу так, каб праца давала плён. З такіх людзей ніколі не вырасталі багацеі, кулакі, нават пры самых спрыяльных умовах. Гэта катэгорыя тых сялян, якія да рэвалюцыі (ды і пасля яе) папаўнялі армію пралетарыяту. На шахтах, заводах, дзе не трэба было асабліва варушыць мазгамі, дзе за цябе думаюць майстры, інжынеры, з іх атрымоўваліся нядрэнныя рабочыя, нярэдка — вельмі добрыя рабочыя. Вядзенне ўласнай гаспадаркі патрабуе асаблівага арганізацыйнага таленту. Праўда, была і трэцяя катэгорыя сялян, якіх і заможныя мужыкі і такія, як Міна, называлі гультаямі. Такія ў сяле не багацелі і рэдка падаваліся ў рабочыя. Безумоўна, не ўсе гэтыя беднякі былі гультаямі, але ў многіх з іх не хапала ініцыятывы, дзелавітасці, кемлівасці, а можа, і самалюбства, гонару, жадання ўзняцца над іншымі. Як ёсць — так і добра, і няма чаго трапятацца, няхай надрываюць пупы тыя, каму многа хочацца. З гэтай катэгорыі нямала было сузіральнікаў, сялянскіх філосафаў; для іх самае цікавае — паназіраць і паразважаць. Парадоксам нашага часу з'яўляецца тое, што з вёскі, з калгасаў, хлынулі ў горад менавіта дзве першыя катэгорыі сялян: дзелавыя, ініцыятыўныя, таленавітыя і такія, як Міна,— шчырыя рабацягі «цягучыя». Першая катэгорыя, калі і не выязджае, то выбіваецца ў начальнікі, у кіраўнікі, устаноў розных хапае і на сяле, напладзілі больш, чым трэба. У сферы сельскагаспадарчай вытворчасці застаюцца, як правіла, трэція. Да сваіх традыцыйных заняткаў — сузіраць і філасофстваваць наконт кожнай з'явы — дадалі трэці «прыемны» занятак — браць чарку. Раней не было за што, а цяпер на «чарніла» кожны можа зарабіць, для гэтага не трэба ні мазгі сушыць, ні «ўкалваць» да сёмага поту.

Я пісаў ужо: бацька не вельмі любіў рабіць на зямлі, але працаваў ён многа і шчыра — у лесе, па службе.

Абавязкі лесніка — не толькі вартаваць лес, ён выконваў мноства самых розных работ: пасадка, прачыстка, улік, адвод дзялянак пад прамысловыя вырубкі, водпуск страявога лесу і дроў насель-

ніцтву, спажыўцам, збор дзікіх траў, шышак, жалудоў, розныя лесамерныя і землямерныя работы і г. д.

Аднак сям'я наша жыла на мяжы беднасці, у той час, калі некаторыя суседнія леснікі ўмелі разбагацець за тры-пяць гадоў. Не толькі тыя, хто злоўжываў службай — прадаваў лес, такія ў той час выкрываліся значна хутчэй, чым у нашы дні, але і тыя, у каго хапала спрыту, сілы раскарчаваць выгарышча пад проса, хто мог узараць і засеяць кожную дзялянку, выкасіць кожную паляну і нават з дароў лесу — грыбоў, ягад, дзічы — атрымаць выгаду, зарабіць лішнюю капейку.

Успамінаю перадваенныя гады. На першых курсах тэхнікума, пакуль не пачаў падрабляць, я нярэдка галадаў. Прыязджаў дадому — і ў маці не знаходзілася шматка сала, галкі масла, каб даць мне з сабой. Употай ад бацькі яна ішла да дырэктара падсобнай гаспадаркі запалкавай фабрыкі (гаспадарка была ў трохстах метрах ад леснічоўкі) і пазычала ў тоўстага Букатага дзесятку нейкую, каб я паехаў не з пустымі рукамі.

Бацьку здавалася, што 60 рублёў маёй стыпендыі дастаткова на пражыццё, няма чаго шыкаваць. Сам ён атрымоўваў рублёў 120, памойму, не больш. Помню: калі я пайшоў у школу, бацькаў аклад раўняўся 20 рублям. Мне купілі першыя боты, яны каштавалі пяць рублёў; бацька шкроб патыліцу перад паездкай у Дабранку і мацюкаў шаўца-яўрэя пасля пакупкі: вот жа, гад, здзёр дык здзёр — ажно пяць рублёў!

Яшчэ ў 1939 годзе на спатканне да Машы я хадзіў у брызентавых чаравіках. Начышчу іх зубным парашком, адпрасую пад матрацам штаны — і «первый парень на деревне». А «дзярэўня» — Гомель, Залінейны раён. Сорамна мне не было: так французілі амаль усе студэнты-вяскоўцы, толькі некаторыя гараджане, не ўсе, мелі скураныя чаравікі, «шаўётавыя» касцюмы.

Не скажу, што бацька быў скупы. Беднасць прывучыла яго да ашчаднасці. Маці была надзіва шчодрая, яна магла аддаць чужому чалавеку апошні кавалак. З-за гэтай яе «безгаспадарчасці», як лічыў бацька, паміж імі часта ўзнікалі сваркі. Бацька быў круты, ён нярэдка паднімаў на маці руку. Мы, дзеці, шкадавалі маці і па-свойму стараліся абараніць яе. Помню, я быў ужо на апошнім курсе, без тыдня тэхнік, жаніх (бацька любіў гэтае слова і надаваў яму многія адценні, жаніхамі ён называў нас з Паўлам яшчэ тады, калі нам было гадоў па дванаццаць). Наведаўся я дадому. Збіраўся ад'язджаць. Бацька з-за нечага «завёўся». Спярша лаяў мяне і Паўла. Мама прысароміла яго: «Што ты ўз'еўся на хлопцаў, Міначка кручаны!» Не

любіў вельмі, калі хтось чапаў памяць яго бацькі. Падхапіўся, кінуўся да маці, замахнуўся. Ды тут шаснаццацігадовы Павел упершыню загарадзіў яму дарогу, узяў за плечы і не надта мякка пасадзіў на лаўку. І пагразіў:

«Пальцам кранеш матку — тады наракай на сябе!»

Бацька сядзеў ашаломлены. На Паўла — ні слова. Як абмяк. Толькі, можа, тыдзень ніякай работы разам з малодшым сынам не рабіў. А маці пазней з радасцю, задавальненнем, нават са смехам расказвала, да вайны і пасля вайны неаднойчы паўтарала:

«Пасля таго як Павел схапіў яго за плечы, трасянуў добранька, ніколі ўжо не кідаўся біцца. Лаяцца лаяўся, а руку не падымаў».

3 жніўня 1982 года

Пра сябе, пра сваё сталенне, пра перажыванні на розных этапах (якія помняцца, а помню я нямала) хочацца напісаць асобна, толькі зраблю я гэта пазней, калі будуць сілы і будзе час. Але наўрад ці стану пісаць пра маленства, таму што нямала расказаў тут, пішучы пра бацьку, пра сям'ю, ды і таму, што пра жыццё лесніка лепш не напішаш, як зрабіў гэта Колас.

Менавіта таму, што наўрад ці вярнуся да школьных гадоў, варта дадаць некалькі штрыхоў.

У Карме я вучыўся апошнюю чвэрць пятага класа і ў шостым класе. Гэтыя няпоўныя паўтара года толькі і звязваюць мяне з сялом, дзе нарадзіўся. У памяці засталося некалькі суседзяў, некалькі аднакласнікаў, якія ўцалелі ў вайну (а ўцалела хлопцаў мала) і якія пасля вайны, калі я стаў вядомым пісьменнікам, нагадалі пра сябе. Я нават не помніў усіх стрыечных сясцёр і братоў — па матчынай лініі. Здзіўляюся сціпласці гэтых людзей: яны нярэдка прыязджалі ў Мінск, спыняліся ў Ігната, але вельмі рэдка хто-небудзь з іх заглядваў да мяне. Больш праворныя іх дзеці, мае стрыечныя пляменнікі, яны саромеліся менш, калі трэба была мая дапамога.

З вучобы ў Карме не засталося нават якіх-небудзь цікавых успамінаў. Не было ніякіх захапленняў, хоць разам з іншымі вучнямі я любіў наведваць вячоркі, якія наладжвалі старэйшыя хлопцы і дзяўчаты. Гульні, танцы цікавілі. Але была тут яшчэ дзіцячая, мабыць, гульня: перахітрыць настаўнікаў; некаторыя з іх былі халасцякамі і таксама хадзілі на вячоркі. Карма сяло вялікае, восемсот хат, кожная вуліца мела свае вячоркі. Мы вывучалі, дзе ходзяць найбольш строгія настаўнікі, і выпрацоўвалі свае маршруты, свае камбінацыі. Хацелася ж не проста схавацца, а трохі і падражніць настаўніка: з'явіцца дзе-небудзь у цёмнай вуліцы перад ім, гукнуць, свіснуць і знікнуць. Адзін

з іх, здаецца, хімік, любіў весці допыт у класе: «Хто ўчора позна гойсаў па Кудлаёўцы? Па Мальцах... па Шкабарах?..»

Помню, у шостым класе я прызначаў нейкай дзяўчынцы спатканне, пісаў запісачкі. Але ў памяці не захавалася ні імя, ні вобраза маёй абранніцы. Усё гэта рабілася таму, што так рабілі іншыя, асабліва вучні сёмага класа, тады ў сёмым класе хлопцам і дзяўчатам было па 15-16 гадоў; я таксама пайшоў у школу, маючы без малога дзевяць гадоў,— позна ўвосень 1929 года. Больш выразна запомніліся мае пошукі кніг, бо тагачасную школьную бібліятэку я «пракаўтнуў» месяцы за два. Прыахвоціўся я да чытання рана. Валянціна Андрэеўна з першага класа разумна падагравала, развівала, накіроўвала гэтае маё захапленне: аднаму мне давала кніжачкі з уласнай бібліятэкі. Помню, як недзе ў класе другім я чытаў «Амока» Маўра. Якое гэта было захапленне! А ў чацвёртым дабраўся да кнігі, у якой даволі натуралістычна апісваліся адносіны мужчын і жанчын. Але гэтую кніжку ці часопіс мне дала не Валянціна Андрэеўна, яе прынёс майстра па падсочцы, які кватараваў у нас; прозвішча яго было Аніскавец. Ён часта расказваў пры нас, пры дзецях, пра свае любоўныя прыгоды, здзіўляючы і маці і бацьку. Цяпер я ўпэўнены, што большасць з тых прыгод ён вычытаў у кнігах. Аднак расказамі сваімі адкрываў мне таямніцы жыцця, уводзіў у цёмны лес любоўных адносін.

З падсочкай звязаны яшчэ адзін зпізод майго маленства, там, у Кляцянцы. Нейкае лета рабілі на выбарцы смалы тры практыканткі — студэнткі Гомельскага лесатэхнічнага інстытута. Кватаравалі яны ў Краўцоўцы. Але ў нас, у леснічоўцы, пераадзяваліся, скідалі свае прыгожыя гарадскія сукенкі і надзявалі камбінезоны, а пасля работы мыліся. Мыліся ў двары. Маці ім грэла ваду, але гарачай яны мылі галовы, а цела аблівалі халоднай, з калодзежа — яе налівалі цэлую бочку.

Я залез аднойчы на гарышча хлява і ўбачыў іх голых. І ў мяне, далібог жа, заняло дыханне ад прыгажосці іх целаў. У наступныя дні я з нецярпеннем чакаў вечара. Падганяў раней кароў да стражы, прасіў Паўла паглядзець за імі, а сам, як злодзей, са страхам, каб не ўбачыў хто — сорамна ж! — прабіраўся на сенавал, у камору, адкуль было акенца на дрывотню, нават у крапіву, што расла ля хлява, у тытунь, які бацька садзіў у двары, дзе глеба добра ўгнойвалася жывёлай, паўдвара займаў «самасадам». І адтуль падпільноўваў, як яны мыліся. Перасыхала ў роце, грукацела сэрца...

Урэшце дзяўчаты такі высачылі малога зладзейчыка. Дзве схаваліся ў сенцы. Трэцяя, голая, падбегла з вядром і «ахрысціла» мяне за шуркай дроў ледзяной вадой.

Я трохі не заначаваў у лесе — баяўся ісці дадому. Пасля тыдні два не пападаўся дзяўчатам на вочы — саромеўся. А пасля вельмі быў удзячны ім, што яны нікому не расказалі пра мой саромны ўчынак.

Аднак — пра кнігі. Я проста пакутаваў ад кніжнага голаду. У Краўцоўцы кніг было мала. Я, адзіны з вучняў, не пасаромеўся папрасіць кнігі ў новага дырэктара школы, але яго бібліятэкі хапіла хіба што тыдні на два-тры.

Упершыню смагу сваю наталіў спаўна ў Пыхані.

У другой палавіне дома, у якім пасялілі нашу сям'ю, размяшчаўся чырвоны куток лясніцтва. Ці не ў першы дзень я выявіў, што над лежаком грубкі, каля коміна, пад самай столлю ёсць шчыліна, праз якую мне, малому, можна пралезці ў гэты прывабны чырвоны куток, дзе — угледзеў я ўдзень — стаялі ажно дзве шафы з кнігамі.

Дзён колькі я вагаўся, выпрабоўваў цярпенне ці хутчэй за ўсё вывучаў абстаноўку — калі прыходзіць рабочком — кульгавы Цімох Цакуноў, сын таго лесніка, якога бацька ратаваў ад парубшчыкаў.

Адна шафа была адчынена, другую я лёгка адчыніў цвічком. І — о! — якое шчасце! Кнігасховішча! Я браў дзве-тры, засоўваў пад сарочку, узлазіў на шафу, адтуль на грубку і — у сваёй хаце. Рабіў гэтую аперацыю ў той момант, калі дома не было нікога. Потым забіраўся ў сушылку, дзе сушылі шышкі, і жыў у іншым свеце. Іншы дзень і на школу забываўся, не ішоў туды, але тады ўжо не вылазіў з сушылкі, пакуль не пачую галасы равеснікаў, што вярталіся з Церухі дадому — у Каралін, у лясніцтва.

Тут здарылася камічная прыгода. Неяк, калі я выбіраў кнігі, нечакана, не ў час, з'явіўся Цімох са сваім сябрам. Куды дзецца? І я нырнуў у шафу, на ніжнюю паліцу, дзе ляжалі газеты. Іншага выйсця не было. Уявіў, якая лупцоўка будзе ад бацькі, калі мяне зловяць, як злодзея, хоць усе прачытаныя кніжкі я вяртаў.

Хлопцы селі гуляць у шахматы, і гулялі так доўга, што я заснуў. Ці то храпануў, ці ўдарыў нагой у сценку шафы — словам, неяк выдаў сябе. Соннага, мяне выцягнулі з кнігасховішча. Са слязамі пакаяўся я ў сваім «смяртэльным граху». Атрымаў літасцівае памілаванне. Больш таго: дазвол хадзіць па кнігі праз дзверы.

Прыгода мая не адразу і зусім у іншай інтэрпрэтацыі дайшла да бацькоў: быццам я заснуў пад крэслам у часе сходу леснікоў і рабочых, што мяне цікавілі размовы дарослых і я часам прысутнічаў на іх сходах ці, відаць, хутчэй за ўсё на лекцыях і дакладах.

З кармянскіх успамінаў найвыразней захаваліся тыя, што звязаны з кнігамі.

У бацькі аднакласніка свайго выявіў я некалькі тамоў Ляскова дарэвалюцыйнага выдання. Трымаў іх дзядзька ў скрыні, пад замком, як скарб, здабыты, пэўна, у рэвалюцыю з панскага маёнтка ў Ігаўцы ці Зэфелі.

Сябра паказаў мне кнігі ўпотай, калі бацькі не было дома. Ох, як я згараў ад нецярпення прачытаць іх! Дзядзька быў строгі, але я адважыўся папрасіць у яго кнігі. І — на здзіўленне жонкі яго і дзяцей, якім не дазваляў крануць кнігі,— ён пачаў даваць мне па адной кніжцы, сам абгортваючы іх у газету. Напэўна, я пакарыў яго сваімі ведамі, сын яго вучыўся дрэнна, і я памагаў яму.

Упершыню я чытаў сур'ёзнага «дарослага» пісьменніка, класіка, у такім аб'ёме — тамоў шэсць. Пазнаваў зусім іншае жыццё, іншыя чалавечыя страсці і — дзівосна ўзбагачаўся, усё роўна як раптам вырас, узняўся над сваімі аднакласнікамі. Здаецца, нават глядзеў на іх як бы з вышыні. Не помню, да Ляскова ці пасля, у хрэстаматыі для старэйшага класа (брат другога майго аднакласніка хадзіў у восьмы ці дзевяты клас) прачытаў я «Мцыры» Лермантава. І быў да ашаламлення захоплены, да таго, што пайшоў на злачынства, на кражу: употай выразаў лісты з «Мцыры». Пабілі за гэта сябра майго, і мяне мучыла сумленне, я гатовы быў аддаць лісткі назад, тым больш што паэму вывучыў на памяць. За адзін дзень вывучыў. У дарозе. Вясной, калі трохі падсохла, я на выхадны хадзіў да бацькоў, за трыццаць вёрст, каб запасціся харчамі, баба Вася жыла бедна, без каровы, кожны дзень бедавала, што я столькі чытаю, так «сушу галоўку» і сяджу на нішчымніцы. З дому я прыносіў глечык смятаны, фунт масла, тварагу.

Цяпер здзіўляюся, што мяне, шасцікласніка, так проста адсылалі ў такую дарогу. У суботу выходзіў пасля ўрокаў і, каб дайсці дацямна, бадай што бег, босы — шкадаваў чаравікаў, у якіх хадзіў у школу, разумеў, што новыя не купяць.

Дык вось па дарозе з Кармы да Воленкі я вывучыў «Мцыры». Дома здзівіў бацьку, зачараваў і замілаваў маці, прачытаўшы ім на памяць такую дзівосную рэч. Бацька здзівіўся, што нас гэткаму вучаць — пра манахаў. Бацька любіў чытаць, але, бадай, да канца жыцця ўяўляў літаратуру па Беднаму і па «Бібліі» Крапівы. «Усё пераліцавана»,— даводзіў ён. Пасля вайны ўжо я пачуў яго сумненне ў тым, што Пушкін выдаецца слова ў слова так, як напісаў 130 гадоў назад.

«Ды ідзі ты! Пераліцавалі даўно такія, як ты, на свой лад. Як трэба цяпер».

Я рагатаў — ён крыўдзіўся. Здаецца, толькі Маша і дзеці маі, школьнікі, пераканалі яго.

І трэці ўспамін.

Рускую мову і літаратуру выкладаў Шкаруба (імя і імя па бацьку не помню). Надзіва дэмакратычны і шчыры чалавек. Гаварыў ён з намі як з дарослымі, гэта асабліва паланіла. Літаратуру ён любіў, асабліва паэзію, мяркую, што сам пісаў вершы. Дазваляў нам хадзіць на вячоркі і насмешліва адзываўся пра сухара-хіміка, які не проста праганяў нас з вячорак, а літаральна паляваў: зловіць і распякае там, перад дарослымі дзяўчатамі, а пасля выстаўляе перад класам: «Паглядзіце на гэтага жаніха!» Некаторыя хлопцы адносіліся да яго праборак спакойна, а я, злоўлены аднойчы і выстаўлены перад класам, ледзь не згарэў ад сораму і пасля таго рэдка і вельмі асцярожна наведваў, памойму, даволі цікавыя маладзёжныя прадстаўленні, што называліся вячоркамі. Самадзейнасць. Тэатр. Там хораша спявалі дзяўчаты, танцавалі. Цалаваліся ў закутках. Зрэдку хлопцы біліся — з-за дзяўчыны. Але каб хто прыходзіў п'яны — такога не помню.

Дык вось Шкаруба гэты неяк павёў групу лепшых сваіх вучняў па вясне на луг да рэчкі і таямніча сказаў:

«Калі не выдасце мяне, прачытаю нешта цікавае».

Прачытаў вершы, якія заваражылі мяне, да таго я нідзе іх не сустракаў. Вельмі ж простыя, зразумелыя, такія, што дапасоўваліся да настрою, да майго замілавання прыродай — вясновым лугам, рэчкай, беразняком у Воленцы, клёнам каля нашай хаты.

Клен ты мой опавший,
Клен заледенелый,
Что стоишь, качаясь,
Под метелью белой?

Так я ўпершыню сустрэўся з Ясеніным. Прасіў у Шкарубы даць кнігу, каб перапісаць вершы. Не даў. Баяўся чалавек. Ясеніна баяўся даць вучням. Каго баяўся? Дырэктара?

Дырэктарам быў нехта Букініч, малады і тоўсты, з бяльмом на воку. Успамінаю адзін выпадак і думаю, што Шкаруба недарэмна асцерагаўся. Неяк на ўроку па дзіцячай дурасці я драпнуў цыркулем сшытак і прарваў вокладку якраз на воку Сталіна. Сусед па парце, малы даносчык, тут жа сказаў Букінічу:

«А Іван вока Сталіну выкалаў».

Дырэктар павёў мяне ў настаўніцкую і цэлы ўрок з жахлівай строгасцю, ад якой мяне кідала то ў жар, то ў холад, дапытваўся, хто мой бацька, што ён гаворыць дома, хто мае дзяды, хоць аднаго з іх ужо не было, хто дзядзькі... А Сяўру тады якраз выключылі з партыі. І я па шчырасці сказаў пра гэта, бо перад тым чуў, як дзед Сцепанец

лаяў свайго непуцёвага сына. Успамінаю, як Букініч схапіўся за гэты «факт маёй біяграфіі». Было гэта ў 1935 годзе.

Між іншым, размоў палітычных тады я нідзе не чуў — ні ў леснічоўцы, ні сярод кармянцаў. Хіба толькі п'яны Сяўра лаяў раённае начальства. Ды запомніўся больш ранні анекдот, пэўна, з часоў калектывізацыі. Нібыта арганізавалі ў Паддабранцы (Дабранка ўкраінскае, Паддабранка — беларускае мястэчка) ці то цыганскі, ці то яўрэйскі калгас. Далі ім насенную грэчку, каб пасеялі. Пасеялі. Але не ўзыходзіць грэчка. Прыехала камісія, капнула зямлю — шаройкі. Абадралі грэчку калгаснікі, крупы з'елі, шаройкі пасеялі.

Мяне страшна смяшыў гэты анекдот. Пра хітрыкі я не думаў, думаў пра тое, што дарослыя людзі не ведаюць, што шаройкі і мякіну сеяць нельга. Як можна не ведаць гэтага, калі я ведаю вунь з якога часу — як толькі помню сябе! Такой была дзіцячая логіка.

Мабыць, у Карме быў нядрэнны калгас, бо я не чуў ніводнага слова нараканння на калектыўную працу. Жылі бедна, але калгасам былі задаволены — верылі людзі, што дзецям іх будзе лягчэй: у жыццё ўваходзілі машыны, трактары. У тэхніку верылі.

Наш сусед бязногі Мікіта, інвалід вайны, не ўступіў у калгас, і бабуля мая асуджала яго:

«Дурны! Сам душыцца, як праклятый, і дзяцей задушыў работай».

Пра Ясеніна. Перапісаў я невялічкі яго зборнік і вывучыў вершы з яго на памяць толькі ў тэхнікуме. Адзін студэнт, нехта Кузьміч, «стары», гадоў на восем старэйшы за нас, армію адслужыў, меў зборнічак і — во хапуга, спекулянт! — за рубель мог даць яго на адну ноч: хочаш чытай, хочаш перапісвай. Я перапісваў да раніцы.

У знак пратэсту хлопцы змовіліся ўкрасці ў Кузьміча гэты зборнік. Я быў супраць: помніў, як пакутаваў, украўшы «Мцыры». Мне прыгразілі, што, калі выдам — буду мець «цёмную». Хлопцы такі адчынілі замочак на фанерным чамадане «старога». Безумоўна, не ад любові да паэзіі — ад таго, што, страціўшы прыбаўку да стыпендыі, Кузьміч ажно заплакаў і пагражаў страшнай карай усім нам. А нас у пакоі было васьмёра. Хлопцы спалохаліся, што Кузьміч скажа дырэктару, а дырэктар, Аронаў, чалавек добры, педагог макаранкаўскай вывучкі, мог дараваць любыя студэнцкія штучкі, але кражы нікому не дараваў, тут жа выключаў. Вярнулі хлопцы Ясеніна, падлажылі прыватніку пад матрац. А калі Кузьміч знайшоў кнігу, трохі не далі яму кухталёў: маўляў, сам, гад, схаваў, а сумленных людзей абражаеш!

Дзіўная рэч — успаміны! Як яны счапляюцца, як выстройваюцца, часам з рэтраспекцыяй, часам з заскокам наперад... Якія нечаканыя асацыяцыі выклікаюць!

6 жніўня

Закончыў курс уколаў. Цэлы месяц калолі ў скроню. Балюча. Але каб вярнуць хоць яшчэ працэнтаў колькі зроку, гатовы пайсці на ўсё. Аднак паляпшэння, па сутнасці, няма, усё тыя ж 0,1, першы радок табліцы, ды і то ў тумане. Бачу толькі абрысы бліжніх прадметаў. Людзей, калі закрываю правае вока, не пазнаю. Мусіць, прыйдзецца жыць аднавокім. Выбіла гэта са звыклага рытму працы, нават адпачынку. Баюся далёка ехаць, нават гуляць у лесе адзін баюся — хадзіць у глухія, бязлюдныя гушчары, што заўсёды любіў. Ці не ад боязі блізкага фіналу з'явілася жаданне ўспомніць сваё лёгкае маленства? Успаміны выцягваеш са скарбонкі памяці, як старыя забытыя рэчы з глыбокай скрыні. Не помніш, што там ляжыць, а дастаеш адно, другое і ўспамінаеш, што павінна яшчэ быць трэцяя рэч, чацвёртая, якія ў свой час былі дарагія і іх не выкінулі. Шмат што выкінута, як непатрэбшчына, і цяпер ні з якога куфра яго не выцягнеш. Помніш, што нешта было... Але што? Калі было? Якое? Крыўдна, што забыліся людзі — сябры тых гадоў, настаўнікі, бацькавы калегі, аб'ездчыкі, ляснічыя, сяляне, найбольш блізкія да лесніка. Былі такія, што рабілі ў лесе, памагалі бацьку на прачыстках, у сенакос, у малацьбе. Безумоўна, людзі гэтыя зрабілі нямала для станаўлення характару майго, густаў, поглядаў.

Не магу вытлумачыць, чаму найбольш сцёрліся з памяці падзеі студэнцкіх гадоў. Можа, не столькі падзеі, колькі людзі, з якімі разам вучыўся ці якія вучылі мяне. А без людзей, з туманнымі фігурамі, без імёнаў, характараў, падзеі — што навакольны свет у маім хворым воку: цьмянае святло, цені, контуры прадметаў. Дзіўна. Чатыры гады самага актыўнага жыцця, калі многа чытаў, многа думаў, горача кахаў!.. А можа, менавіта і не помню будняў, што жыў у свеце кніг, фантазіі, высокіх імкненняў, што тое ж каханне засланіла, выціснула ўсе іншыя перажыванні таго часу? Аднак — во парадоксы памяці! — з гэтых чатырох гадоў я здзіўляюча выразна помню два месяцы — дыпломную практыку на цэментавым заводзе ў Росі, пад Ваўкавыскам у лютым-сакавіку 1940 года. Помню ледзь не кожны дзень і даволі шырокае кола людзей, з якімі сустрэўся. Пэўна, таму, што многае там, у Заходняй Беларусі, якую ўсяго пяць месяцаў назад вызвалілі, было незвычайнае, не падобнае на аднастайнае студэнцкае жыццё.

Уражвалі расказы людзей, сам лад жыцця, адносін. А можа, таму помніцца, што я падрабязна аб усім запісваў у дзённік. Шкада, што ён не захаваўся. Уяўляю, колькі там было нечаканых дэталяў, разваг, думак. Яшчэ тады, калі я пісаў «Непаўторную вясну», мне хацелася напісаць аповесць аб нашай практыцы — трох студэнтаў, лепшых камсамольцаў. Адбіралі туды, у Заходнюю, строга, у гарком камсамола запрашалі. І недарэмна. Дыпломамі сваімі мы займаліся менш за ўсё. Кантролю за нашай практыкай — ніякага. На заводзе мы з'яўляліся рэдка. Але агітацыйную работу вялі актыўна. Стваралі камсамольскую арганізацыю. Гэта патрабавала работы з моладдзю. А моладзь — пераважна дзяўчаты, цікавыя, хораша апранутыя, лепш, чым нашы студэнткі. Да нас, савецкіх, яны праяўлялі асаблівую ўвагу. Пасля мы даведаліся, што была цэлая змова, не толькі саміх дзяўчат, але і матак — ажаніць нас усіх трох. Жэня Крахмалаў быў рацыяналіст, а мы з Мішам Бахуном — паэты, фантазёры. Я штодня пісаў пісьмы ў Гомель і «цалаваўся з полькамі», як падазравала ў сваіх адказах Маша. Нас выклікалі ў райком партыі, давалі заданні, асабліва калі пачалася кампанія па выбарах у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР — давыбары ад заходніх абласцей. Ад гэтага мы адчулі сваю значнасць. Адразу пасталелі. Але заставаліся рамантыкамі.

Аднак далёка я пераскочыў. Залез «у кнігу другую». Будзе здароўе, будзе бачыць хоць адно вока — я напішу пра гэты час у больш шырокім плане, чым зрабіў гэта ў «Непаўторнай вясне».

Воленка была райскім кутком зямлі. Невялікі квадрат старога лесу (гектараў сто), пераважна ліцевага — дуб, граб, клён, алешына, бяроза. Пасярод лесу, паміж дубоў, невялікая паляна з хатай лесніка: тут была звычайная хата, не кардон, не «стража», што будаваліся яшчэ да рэвалюцыі ў лясах князя Паскевіча па адным праекце. Вакол — палі і калгаснае драбналессе. Бліжэйшыя вёскі — Пракопаўка і Займішча. Але Займішча было ўбаку. На шляху — Пракопаўка з былой панскай сядзібай, з прыгожым паркам, з рэчкай Церухой, якая тады, да асушэння балот, заўсёды была паўнаводнай, рыбнай, асабліва многа лавілі ракаў; цяпер Цераха ля Пракопаўкі — канаўка, толькі каля Церухі яна яшчэ рэчка, хоць і абмялелая.

Воленка падабалася мне, юнаму паэту. Бацьку ж яна зусім не здавалася раем. Бацька скардзіўся: «Во ўгадзілі старому лесніку, інваліду, за службу маю». Справа ў тым, што абход тут быў самы цяжкі. Сама Воленка — нейкая чвэрць абходу, а тры чвэрці — Гардуноўшчына. Аддзелена гэтае ўрочышча ад леснічоўкі полем, добрыя вярсты тры было да асноўнай часткі абходу. А цягнулася Гардуноўшчына

вёрст на восем, пад самыя Гардуны, трохі не да Насовіч. Лес там — сасновы маладняк. З ім было нямала клопатаў: санітарная прачыстка, высечка прасек паміж кварталамі, якія ў маладняку зарасталі штогод. Але найбольшы страх для лесніка — пажары. Бацька са страхам чакаў лета. У сухмень кідаў любую сваю работу, начаваў і дняваў там, у Гардуноўшчыне. Касьба, жніво, малацьба цалкам лажыліся на матчыны плечы. Добра, што мы падраслі і памагалі ёй, асабліва Павел, дужы хлопец, вышэйшы за мяне ростам, больш здатны да фізічнай працы.

У першае лета, паміж пятым і шостым класам, я хварэў на малярыю. Паганая хвароба! Дагэтуль застаўся страх перад ёю. Бязлітасна калаціла! А ў наступнае лета я быў поўны радасці жыцця, зачараваны харaством прыроды. Бліжэй пазнаёміўся з пракопаўскімі хлопцамі. Хадзіў у кіно — часцей, чым у Кармe, магчыма, што ў саўгасе карціны паказвалі часцей, у той час найбольшая ўвага была рабочаму класу. У лесе ў любы час ночы я адчуваў сябе што рыба ў вадзе — ніякіх страхаў. Вяліся ваўкі, стралялі іх часам паляўнічыя. Але я чамусьці зусім не баяўся ваўкоў, не думаў пра іх. І дрэнных людзей у лесе не баяўся. У полі ўначы хадзіў менш упэўнена: далёкія начныя цені, размытыя абрысы дрэў, будынкаў часам здаваліся прывідамі.

Баяўся я ў сенцах сваёй хаты, у хляве, у пуні. Думаю, што гэта ад казак пра дамавікоў. Прыгадваю, чытаў «Вія». Але гэта было яшчэ ў Кляцянцы. Чытаў уначы пры лямпе, бацька спачатку ганяў, што газу палю, пасля змірыўся. За акном зіма, завея. Гудзіць, трашчыць лес. Хата напаўняецца зданямі. З'яўляецца «Вій». «Падніміце мне павекі!» Я млеў ад страху. Баяўся глянуць у акно, у цёмны кут. Азіраўся толькі на ложкі, дзе спалі бацькі, брат, сёстры. Іх прысутнасць, іх чалавечае пахрапванне вярталі са страшнай казкі ў рэальнае жыццё, у якім я пакуль што яшчэ нічога не баяўся. Колькі разоў загортваў кнігу. Але баяўся тушыць лямпу, застацца ў цемры. Ды і кніга... як не хацеў забыцца на яе, але адарвацца не меў сілы. Нельга «Вія» не дачытаць да канца! Асабліва ў такім узросце.

...Пасля вайны ўжо неяк прыйшлося ісці ў асеннюю ноч па лесе, і я адчуваў непрыемны халадок страху. Успамінаў маленства і смяяўся сам з сябе, дарослага, свабоднага ад усіх забабонаў, казак. І цяпер, калі ўжо стары... Не ведаю, як у лесе, а ў горадзе, у Мінску, пасля дванаццаці ночы хадзіць баюся. Здаралася, затрымліваліся ў кафэ Саюза пісьменнікаў, і я праз парк не ішоў дадому — па праспекце ішоў.

Міжволі прыходзіш да высновы: старыя не толькі кансерватыўныя, але і баязліўцы, баяцца за сваё жыццё больш, чым малыя, маладыя. Загана? Ці закон прыроды? Прыходзіць асцярожнасць, расце перасцярога, калі жыць застаецца нядоўга. Магчыма, ёсць у гэтым

пэўная мудрасць. Нехта сказаў: «Пакуль мы маладыя, мы бессмяротныя».

Недзе, здаецца, у 1942 годзе трапіў да мяне ў падначаленне, у гарматны разлік, чалавек гадоў пяцідзесяці, бацька дарослых дзяцей, сыны ваявалі. Камандзірам агнявога ўзвода быў неразумны, па-дурному прыдзірлівы лейтэнант. Я заеўся з ім і вырашыў пісаць рапарт з просьбай паслаць мяне ў франтавую артылерыю. Дык стары доўга ўгаворваў мяне не рабіць гэтага. Усё-такі ў зенітчыкаў не было такіх страт, як на батарэях першага эталона, асабліва ў супрацьтанкавых. Мы — другі эталон. Стары любіў мяне, як сына, і засцерагаў. Цяпер я разумею: ён не быў ні баязліўцам, ні дрэнным патрыётам, у ім жыла адвечная бацькоўская мудрасць: дзе можна, зберагчы дзяцей. Мудрасці такой не заўсёды хапала ў некаторых вялікіх і малых военачальнікаў: часам страты былі неапраўданыя, не па маштабу тактычных поспехаў. Напрыклад, дагэтуль не магу зразумець, навошта было штурмаваць акружаны Кёнігсберг так, як мы яго штурмавалі, у той час, калі армія падступала да Берліна?

Гнеў і абурэнне выклікаюць сіянісцкія бандыты Ізраіля, якія па ўзору фашыстаў знішчаюць палесцінцаў. Але нельга не задумацца над стратамі Ізраіля ва ўсіх войнах. Яны мізэрныя. Усе іх аперацыі спланаваны так, каб дасягнуць мэты з найменшымі ахвярамі. У недарэчнай да дзікасці вайне Ірака з Іранам з двух бакоў у любым актыўным баі гінуць тысячы. Пры штурме Бейрута, у кожным штурме гінуць сотні палесцінцаў і адзінкі ізраільцян. У суадносінах 1:15. Бегін і Шарон маглі б узяць Бейрут, як кажуць, з ходу. Але такая вайна дорага каштавала б: тысячы жыццяў салдат, афіцэраў. А гэта падарвала б маральны дух арміі, упэўненасць, што яны, ізраільцяне, умеюць перамагаць малой крывёю. Такая ўпэўненасць вынікае з сіянісцкай дактрыны. Таму робіцца ўсё, каб апраўдаць яе, каб даказаць, што яўрэі, «богом избранный народ», намнога разумнейшыя за нейкіх там арабаў, славян, англічан. Яны ўмеюць багацець з працы іншых, умеюць кіраваць, умеюць ваяваць...

Бацькі далі мне права выбару: застацца ў Кармянскай школе ці хадзіць у сёмы клас у Макаўе, за сем кіламетраў. Я выбраў Макаўе, гэтак палюбіў Воленку, Пракопаўку. Адлегласць не палохала. І я не пралічыўся. Апошні школьны год, бадай, быў самы яркі, шчаслівы, багаты на добрае сяброўства, рамантычныя захапленні.

Хадзіў я ў школу як ніколі акуратна. Дзень у дзень. Ніякіх прагулаў. Калі бацька спрабаваў запрэгчы ў работу — пратэставаў даволі рашуча. Але, здаецца, і бацька пачаў патроху разумець, што гэта адказна — выпускны клас. Непісьменная маці заўсёды добра разу-

мела, што вучоба — не гульня, а вельмі нялёгкая работа. Яна заўсёды была за тое, каб я ішоў у школу, а не на прачыстку сасняку ці капаць бульбу. Увосень гэта была самая працяглая і цяжкая работа. «Самі выкапаем,— казала маці.— А хвойнік твой пачакае, не гарыць». Думаю, што мая апантанасць у вучобе пакарыла і бацьку. Сем вёрст туды, сем назад, шэсць урокаў, гурткі, а пасля — выкананне хатніх заданняў, сядзеў над кнігамі да поўначы. Тут газы для мяне не шкадавалі, палі колькі хочаш.

Асенні дождж, слата, гразь, зімовыя завеі, снежныя заносы, вясенняя паводка — нічога мяне не страшыла, не спыняла. Я ішоў у школу, як на свята. Сапраўды гэта было штодзённае свята. Не толькі сама вучоба. Уся атмасфера, педагагічны калектыў, разумны дырэктар Кірушчанка, шумны, вясёлы, але добры, не тое што пануры аднавокі Букініч. Настаўнікі любілі мяне, і я любіў іх. Беларускую мову і літаратуру выкладала Яугенія Кузьмінічна Анціпава. Думаю, што менавіта яна навучыла мяне сапраўднай беларускай мове, мове Купалы і Коласа, у канцы года я пісаў самыя лепшыя сачыненні, без адзінай памылкі. І літаратуру яна выкладала неяк зусім інакш, чым рабілі гэта другія настаўнікі,— з нейкім асаблівым набліжэннем да жыцця. Расказвала пра Коласа, Самуйлёнка, Лынькова, Галавача, Глебку, як пра знаёмых простых людзей, што жывуць не на Алімпе — на зямлі, побач з намі і ўсё ведаюць пра наша жыццё. Гэта было адкрыццё, якое перавярнула ўяўленне маё пра пісьменнікаў і творы. Упершыню прыйшло разуменне, што літаратура існуе не для таго, каб вывучаць яе ў школе, а каб жыць па ёй, рабіцца падобным да герояў — да лепшых герояў. Пушкін, Лермантаў, Гогаль, Тургенеў, Талстой, Чэхаў да таго здаваліся амаль багамі, міфічнымі персанажамі, вельмі далёкімі, як жыхары неба, і пісалі яны пра жыццё, якое мала было падобна на наша. Хіба толькі жыццё Каліныча, Ванькі Жукава...

Анціпава вучыла па-інакшаму разумець і рускіх класікаў. Вельмі любіла расказваць пра Шаўчэнку, па-ўкраінску на памяць, чытала яго вершы. Словам, рабіла ўсё, каб вывесці нас з вузкай клеткі школьнай праграмы, расшырыць наша ўяўленне пра мастацкія каштоўнасці твора, пра значэнне гэтых каштоўнасцей для чалавека.

Як многія мае равеснікі ў той час, я марыў аб ваеннай школе. Яугенія Кузьмінічна дазналася пра маё жаданне і, нічога не сказаўшы супраць ваеннай школы, доўга пераконвала мяне паступаць у педтэхнікум, даводзячы, што я маю педагагічны талент.

Вабіла мяне не толькі школа, але і дарога да школы, якая б цяжкая яна ні была. Да Пракопаўкі я ішоў (не ішоў — ляцеў!) адзін, а там уліваўся ў гурт пракопаўцаў, будзішчанцаў. Размовы, расказы,

гульні, спрэчкі, сваркі, часам бойкі (біліся малыя, пяці-шасцікласнікі, а мы, выпускнікі, іх важатыя, нам даручалася дырэктарам школы сачыць за імі, памагаць — мірылі іх) — усё гэта рабіла дарогу кароткай, вясёлай для мяне, жыхара лесу,— радаснай. Між іншым, я ніколі ні з кім не біўся, ні ў малодшых, ні ў старэйшых класах, зрэдку — з Паўлам, давалі кухталёў адзін аднаму, але без зацятасці, без злапомнасці — мірыліся праз пяць мінут. Мне ніколі не была ўласціва бацькава суровасць, яго зласлівасць. Я — увесь у маці, у яе быў надзіва мяккі характар. Сварлівасць матак некаторых маіх сяброў непрыемна ўражвала, з малых гадоў я лічыў, што ўсе маткі павінны быць такімі, як наша. Калі яна часам і сцёбала нас ручніком,— іншай зброі экзекуцыі не прызнавала,— то ад гэтага нам з Паўлам хацелася не плакаць, а смяяцца. Плакалі мы назнарок, каб маці лягчэй стала, хутчэй адышло яе сэрца. Хітруны! Паплачам — і маці тут жа шкадавала нас, намазвала скібкі хлеба маслам ці давала па драбку цукру.

Хадзіў я так апантана ў школу яшчэ па адной прычыне. Закахаўся. Спачатку — у настаўніцу рускай мовы, у казачна прыгожую яўрэйку Лідзію Маркаўну. Безумоўна, сваё захапленне я таіў, як самую вялікую тайну. Ніхто не здагадаўся, не выкрыў. Акрамя яе самой. Даючы дыктант ці расказваючы на ўроках літаратуры пра класікаў (расказвала яна звычайна — па-школьнаму, не так, як Анціпава), Лідзія Маркаўна спынялася каля мяне, і ад яе блізкасці, ад водару духоў у мяне так кружылася галава, што расплываліся літары, я прапускаў у дыктанце словы, рабіў грубыя памылкі, ставіў кляксы. Вопытная жанчына забаўлялася захапленнем хлапчука.

Зімой настаўніца паехала да свайго мужа, ваеннага. І я перажываў гэтую разлуку.

Пасля я «закахаўся» ў сваю аднакласніцу — Марусю А. Я бяру гэтае святое слова ў двукоссе, бо, безумоўна, юнацкія захапленні нельга назваць каханнем. Па-сапраўднаму я пакахаў пазней, на трэцім курсе тэхнікума, дзяўчыну, якая ў пятым класе скубла мой вавёрчын каўнер, падглядала ў мяне рашэнне задач і падказвала, як напісаць тое ці іншае слова (у школе, асабліва да сёмага класа, я быў мацнейшым вучнем па арыфметыцы, алгебры і сярэднім па мовах). Пакахаў на ўсё жыццё.

Маруся была дзяўчынай неразумнай, пазбаўленай фантазіі. Я пісаў ёй пісьмы, падкладваў у падручнікі — яна тут жа зачытвала іх усяму класу. З мяне смяяліся. Я прыціхаў, стараўся скіраваць увагу на каго іншага з дзяўчат. Не, ніхто не падабаўся. А я, начытаўшыся кніг, проста-такі прагнуў рамантыкі. Хацелася мець таямнічыя спатканні. Па вясне, калі ўжо стаялі цёплыя вечары, распусціліся вербы,

бярозы і заспявалі салаўі, я ўсё ж рызыкнуў прызначыць Марусі спатканне — на мосце перад Макаўем, ад яе хаты праз гароды гэта нейкія трыста метраў. А мне трэба было ў другі раз за дзень адолець адлегласць у чатырнаццаць кіламетраў. Але што такое 28 кіламетраў дзённага прабегу перад магчымасцю мець упершыню ў жыцці такое рамантычнае спатканне! Пад вербамі, з журчаннем рэчкі, спевам салаўёў. Як у ружовым тумане чакаў я вечара. Дома сказаў, што ў Пракопаўцы кіно. Ісці звычайнай дарогай пабаяўся: убачаць пракопаўскія аднакласнікі, здагадаюцца — жыцця не будзе ад іх жартаў, насмешак. Абыходзіў па палявых сцежках, уброд фарсіраваў даволі яшчэ паўнаводную і халодную рэчку.

Ляцеў на крыллях. Але замест Марусі з-пад моста выскачылі «чэрці» з намазанымі мордамі, у зімовых шапках, вывернутых кажухах, накрылі мяне смярдзючай дзяругай. Неяк я адбіўся, выкруціўся, скочыў у сваіх лепшых штанах у ваду і ўцёк пад галёканне «чарцей». Плёўся назад, чапляючыся нагой за нагу, глытаў слёзы крыўды і сачыняў варыянты пометы. Самае страшнае — як заўтра прыйду ў школу. А не пайсці нельга: вось-вось пачнуцца экзамены. Але адбыўся нейкі цуд, вытлумачыць які не магу дагэтуль. Раніцою я надзіва спакойна пайшоў у школу. Макаўскія хлопцы сустрэлі мяне рогатам: «Ну як, ухажор? Штаны высушыў?»

Але я прытварыўся, што нічога не ведаю. Яны расказвалі падрабязнасці — я здзіўляўся, смеючыся разам з імі. Ігра мая была настолькі натуральная, што і ўдзельнікі акцыі (іх было двое, трэці з імі быў нехта з дарослых хлопцаў) і ўсе вучні, асабліва дзяўчаты, пачалі сумнявацца, што на мосце быў я. Ці не памыліліся яны ў цемры? Ці не пакалечылі некага зусім іншага? Кпіны сціхлі. А я адчуваў сябе амаль героем. Паверыў у нейкую невядомую дагэтуль сваю сілу — уменне пераўвасобіцца і прымусіць паверыць сабе. Адбыўся як бы скачок, пераход у іншы псіхалагічны стан, у іншую «якасць». Я раптам як бы намнога пасталеў, вырас ва ўласных вачах. Безумоўна, усялякія пачуцці да той дурніцы тут жа згінулі. Я зневажаў, ігнараваў яе. І яна адчувала сябе ніякавата. Як пасля расказала мне Каця, дзяўчаты асудзілі Марусю за такую здраду: ты магла не прыходзіць, але расказваць хлопцам, паказваць запіску...— гэта подласць. Між іншым, у сёмым класе і пазней, у тэхнікуме, лепшае ўзаемаразуменне ў мяне было з дзяўчатамі, чым з хлопцамі: яны разважалі больш стала, бадай гэтак жа, як і я. Пэўна, таму, што многа чытаў, я перарос сваіх равеснікаў — вясковых хлопцаў. Са мной нават настаўнікі размаўлялі, як з дарослым.

Маруся ў вайну выйшла замуж за ляснічага, што служыў у немцаў. Яго асудзілі, саслалі. Пасля вайны мне разам з ёй прыйшлося працаваць у Пракопаўскай школе. Была яна злоснай, сварлівай, сквапнай бабай, дрэннай настаўніцай, малапісьменнай, выкладала рускую мову і літаратуру, а сама нічога не чытала, акрамя хрэстаматыйных урыўкаў. Мяне ненавідзела, але баялася: я быў сакратаром партарганізацыі, а на ёй пляма: муж — нямецкі памагаты.

Маша адносілася да яе і раўніва і варожа. Маша не даравала тым, хто служыў у немцаў, хто выходзіў замуж за здраднікаў.

Аднак вярнуся яшчэ хвілін на колькі туды, у сёмы клас. Не зважаючы на фіяска на мосце, мне моцна хацелася мець спатканне хоць з якой-небудзь дзяўчынай. Вясна бурліла, паэзіі наўкола — хоць адбаўляй, і процьма фантазіі ў галаве.

Выбар мой упаў на дзяўчыну, якая на працягу года зусім не падабалася, больш таго — адносіўся я да яе раўніва: мы спаборнічалі, але яна заўсёды перамагала, яна была першай вучаніцай у класе, я — другім. Чым жа яна паланіла? У тую злавесную раніцу, калі мяне сустрэлі рогатам, убачыў я, што яна, Каця, адна, без насмешкі глядзела на мяне з цікавасцю і, бадай, з захапленнем. Запомнілася гэтая яе сур'ёзнасць, у якой свяцілася разуменне маіх перажыванняў, майго жадання прыгод.

І я прызначыў спатканне Каці. Пэўна, мела значэнне і геаграфія: Каця жыла на пасёлку Данец, а пасёлак гэты недалёка ад Воленкі, кіламетры за два-тры, толькі данецкія хадзілі ў Макаўе па іншай дарозе — па правым беразе рэчкі.

Безумоўна, навучаны горкім выпадкам, ішоў я на першае спатканне з перасцярогай, не па торнай дарозе, прабіраўся хмызнякамі.

Каця чакала мяне за пасёлкам, на ўзлессі.

З ёй было цікава: мы гаварылі пра кнігі.

Бацька яе быў настаўнікам, рабіў у пачатковай школе, там жа ў сваім пасёлку, школа была ў іх хаце, першы і другі клас. Зімой Каця перажыла гаротную — за бацьку. Прыехала камісія ажно з Мінска, з наркамата. Далі дыктант сямікласнікам — Каця адна напісала на «выдатна». Пасля ўвечары сабралі ў сямігодку настаўнікаў з усіх школ сельсавета, далі той жа дыктант ім. Многія напісалі горш за вучняў, а Кацін бацька ўляпіў памылак дваццаць. Дырэктар меў неасцярожнасць кінуць на ўроку: «Каця, навучы бацьку пісаць пісьменна!» Як яна загарэлася, нябога! Пасля колькі дзён Каця не прыходзіла ў школу.

Гэтае сваё першае свядомае рамантычнае спатканне я падрабязна напісаў у апавяданні «Непрыгожая», хоць, безумоўна, з пэўнай

доляй вымыслу. Правобразам гераіні — настаўніцы Надзеі Іванаўны, безумоўна, была Каця.

Спатканні з ёй былі яшчэ адной прыступкай на лесвіцы, што вядзе ў сталасць, да многіх радасцяў жыцця.

Так падрабязна напісаў я пра свой апошні школьны год таму, што, здаецца, менавіта там нараджалася, расла тая фантазія, якая пасля стала асновай творчасці, крыніцай яе. З таго года ў памяці засталося больш, чым з любога іншага. Хіба толькі вайна пакінула гэтак жа многа ўспамінаў. Між іншым, я менш, чым хто з маіх калег-франтавікоў, выкарыстаў у творчасці асабіста перажытае на вайне. Адна аповесць «Агонь і снег». Усё іншае — «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», «Вазьму твой боль» — падказана трагедыяй народа, гераізмам партызан і падпольшчыкаў. Подзвіг беларусаў — тэма невычэрпная. Нас, удзельнікаў вайны, незалежна ад таго, дзе хто ваяваў, яна прыцягвала з асаблівай сілай. Цікаўнасць тых, што ідуць за намі, мае іншы змест, іншую эмацыянальную афарбоўку. Многія імкнуцца стаць Быкавымі, Бондаравымі. Але, ведаючы, што паўтарыцца нельга, пачынаюць «сачыняць» вайну. Колькі яе, гэтай сачынёнасці!

Але — яшчэ колькі ўспамінаў.

Узрост і шчаслівыя абставіны далі магчымасць бліжэй пазнаць вёску, працу людзей на зямлі, новыя адносіны сялян у выніку калектывізацыі. Праўда, у Пракопаўцы была асобая форма калектыву — саўгас. У той час розніца паміж калгасамі і саўгасамі была непараўнальна больш істотная, чым у нашы дні, калі аджыў свой век працадзень, уведзена грашовая аплата з аднолькавымі ў калгасе і саўгасе нормамі, аднолькавым планаваннем, пенсійным забеспячэннем і г. д. Фармальна, у прамовах, артыкулах, у дысертацыях, адзначаецца істотная розніца паміж гэтымі дзвюма формамі арганізацыі сельгасвытворчасці. Але ў практыцы кіравання, асабліва ў першым звяне, раённым, паміж калгасамі і саўгасамі мяжа даволі ўжо ўмоўная.

Андрэй, напэўна, мае рацыю: сялянства як клас, у разуменні перадваенным і пасляваенным, знікла (скажу мякчэй — знікае), застаюцца сельскагаспадарчыя рабочыя з аднолькавай арганізацыяй працы і ў саўгасе, і ў калгасе, з аднолькавай псіхалогіяй. Прыкмета селяніна хіба адна: свая хата, свой двор. Але моладзь не хоча мець ні сваёй хаты, ва ўсякім разе не трымаецца за яе, ні сваёй каровы. Як шмат у чым, мы баімося назваць рэчы сваімі імёнамі, прызнаць рэальнасць і на яе аснове выпрацоўваць палітыку. Харчовая праграма — дакумент сур'ёзны. Але ўсе шырокія і дарагія мерапрыемствы, рэарганізацыі не спыняць працэсу, што нарастае з хуткасцю снежнай

лавіны,— самазнішчэння традыцыйнай вёскі з тыпова сялянскай псіхалогіяй і з бытам, які мала ў чым, да нядаўняга часу, мяняўся на працягу стагоддзяў. Цяпер гэты быт руйнуецца, бо не задавальняе, не можа задаволіць таго чалавека, якога выхавала школа, літаратура, кіно, але яшчэ ў большай меры — само жыццё, урбанізацыя. У гэтым плане нельга не прызнаць сілу нашых ідэалагічных сродкаў; здорава мы пастараліся, каб развянчаць традыцыйную любоў селяніна да зямлі, і гэтак жа добра папрацавалі, каб прывучыць моладзь да новага жыцця — без гною, свінні, з гарачай вадой і прадуктовым магазінам на першым паверсе.

Добрым сябрам маім быў Іван Сільчанка, хлопец гультаяваты ў вучобе, але сталы і вопытны ў пытаннях жыццёвых. Бацька яго рабіў у саўгасе старшынёй рабочкома. Не магу сказаць, які ён быў кіраўнік, але сын ганарыўся бацькам, тым, што той ходзіць з рэвальверам. Сёння дзіўна, што прафсаюзнага работніка ніжэйшага рангу так узбройвалі. Стары Сільчанка любіў пагаварыць. І гэткім жа быў сын. Ён ведаў усе таямніцы саўгаснага жыцця. Расказваў іх па сакрэту. Цяпер не сумняваюся, што нямала ён выдумляў, маніў, але ўсё грунтавалася на цвёрдай глебе рэальнасці, фантазіраваць хлопец не ўмеў.

Калі я працаваў настаўнікам, Сільчанка гэты прыехаў на пабыўку да бацькоў. Старшыной служыў на Далёкім Усходзе. Прыходзячы ў госці, ён даволі нетактоўна хмыкаў на маю беднасць. Машы ён не падабаўся.

Карацей кажучы, як бы там ні было, але дружба з Іванам, з іншымі хлопцамі — дзецьмі рабочых, якія заставаліся яшчэ сапраўднымі сялянамі, дала мне нямала ў пазнанні жыцця вёскі і некаторых сацыяльных працэсаў таго часу.

11 жніўня

Перачытаў «Непрыгожую». Намнога цікавей напісаны ў апавяданні камічна-лірычны эпізод майго юнацтва. Што значыць падсаліць і падперчыць рэальнасць вымыслам!

Учора ўвечары завіталі А. Савіцкі і Э. Скобелеў. Прыемна. А то часам і я, як Кулакоўскі, пачынаю адчуваць сваё адзіноцтва.

Маша малая — імянінніца, шэсць годзікаў. Ад ліберальнасці мамы, бабуль, дзеда дзіця стала абсалютна непаслухмяным. Сядзіць у ёй дух супярэчнасці. Тут, на дачы, ад іншых дзяцей навучылася такім словам, ад якіх мы хапаемся за галаву. Спрабавалі караць — не памагае. Махнулі рукой — перарасце. Але гэта — ад педагагічнай бездапаможнасці. А поўная ж хата педагогаў.

Маша — учора ўвечары:

— Дзед! А што ты мне падарыш?

— О, каб ты знала! У мяне два падарункі.

— Падары адзін сёння, другі — заўтра.

— Сёння я дару табе дачу.

— Не хачу дачу! Бяры яе сам. Ляльку хачу. Ці звярушку.

Сёння паглядзела ў пакет, убачыла калготкі, расчаравалася:

— Адзявай іх сам!

...І зноў — у юнацтва, як у паратунак ад праблем неспакойнай старасці.

У саўгас прыехаў Старшыня ЦВК БССР Чарвякоў. Саўгас спецыялізаваўся на вырошчванні трусоў. Вырашалася мясная праблема. Дарэчы, праз год, калі Чарвякова не стала, трусіная ферма была закрыта як шкодніцкае пачынанне.

Нас адпусцілі з урокаў, і мы чатыры вярсты ляцелі на крыллях, каб пабачыць такога высокага госця. Кіраўнікі саўгаса хацелі прагнаць малых — Чарвякоў дазволіў, каб мы хадзілі следам. Пасля я быў ашаломлены: хлопцы, не вучні, рабочыя, укралі з машыны яго шапку.

Але самае цікавае адбылося, калі госць ад'язджаў. Рабіў у саўгасе трактарыст Дзяніс Баранаў, асілак, падковы гнуў. І ён пажартаваў: калі госці селі ў машыну і шафёр завёў матор, Дзяніс падняў «эмку» ззаду, адарваў колы ад зямлі. Шафёр газуе, колы круцяцца, як шалёныя, а машына не рухаецца. Рабочыя рагочуць. Чарвякоў зразумеў, што нешта ўтварылі, вылез з машыны. Хтось са спалоханых кіраўнікоў яму сказаў, што здарылася. Як хораша ён смяяўся! І вельмі хацеў паглядзець на гэтага трактарыста, але Дзяніс нырнуў у натоўп і схаваўся ў парку.

Магчыма, што эпізод гэты не ўсплыў бы з дна памяці, але нядаўна я сустрэўся з Дзянісам, старым ужо чалавекам, інвалідам вайны.

Дзмітрый Міхлееў здымаў фільм пра мяне — да майго юбілею. Паехалі ў Пракопаўку, дзе я жыў у школьныя гады і настаўнічаў пасля вайны. Напярэдадні здымалі ў Церусе. Быў сонечны марозны лютаўскі дзень, усё іскрылася вакол. А ўначы разгулялася завіруха. Круціла ўвесь дзень. Свету белага не відаць было. Ад Калініна да Пракопаўкі, праз Грабаўку, Маркавічы, Чарацянку, наперадзе нашых машын ішоў грэйдэр, чысціў дарогу.

Здымаць было нельга, хоць і спрабавалі. Але людзям паведамілі, людзі чакалі. Чакалі, безумоўна, з нецярпеннем: большасць — мае былыя вучні. Сустрэча была цёплая, але хутчэй не як з пісьменнікам, а як з дэпутатам, са старшынёй Вярхоўнага Савета: многа просьб, скарг, якія раздражнялі сакратара РК Г. С. Шведаву, бо я тут жа звяртаўся да яе. Трэба было вырашыць пытанні і з рэйсам аўтобуса, і

з падвозам школьнікаў, і з палівам, і з будаўніцтвам школы (школай я займаюся да гэтага часу; школу пабудуюць!), і з цэглай на рамонт печаў (праблема, якая асабліва абурыла, бо побач, у Будзішчы, за тры кіламетры,— раённы цагельны завод, а цэглу не прадаюць), і з многім іншым, усяго ўжо і не помню.

Пасля старшыня калгаса запрасіў да сябе на вячэру. Ішла дванаццатая гадзіна ночы. Завіруха не сціхала. І раптам адчыняюцца дзверы і ўвальваецца заснежаны чалавек. Асілкам ён не выглядаў. Я не пазнаў яго: пасля вайны, калі я рабіў настаўнікам, Дзяніс прадаўжаў служыць у арміі. Атрымалася так, што ён даведаўся аб маім прыездзе толькі пасля сустрэчы, калі вярнуліся з клуба школьнікі. Не вытрымаў — пайшоў за два кіламетры з Займішча ў такую непагадзь. Прыйшоў Дзяніс з гармонікам і, калі выпіў, іграў у мой гонар франтавыя песні.

Уначы ўспомніў яшчэ адзін выпадак, які ў пэўнай меры характарызуе маё захапленне літаратурай яшчэ ў той час, калі марыў я пра ваенную школу.

Дайшло да Макаўя, што ў Грабаўцы будзе выступаць пісьменнік. Як можна прапусціць такое! Падбіў хлопцаў пайсці. Грабаўка — за Макаўем, за восем кіламетраў. З пракопаўскіх, будзішчанскіх вучняў, з якімі б я мог вяртацца дадому, ніхто не адважыўся пайсці, згадзіліся толькі макаўцы. Але не спыніла мяне, што назад вяртацца прыйдзецца аднаму, позна ўначы, па зімовай дарозе, па марозе. Начаваць у чужых людзей я не мог, ні разу не начаваў, хоць, здаецца, бацька дамаўляўся са знаёмым макаўцам, каб у выпадку чаго — завірухі, дажджу — я знайшоў прытулак у яго хаце.

Прыйшлі ў Грабаўку і даведаліся, што выступленне платнае, а ў нас ні ў кога ні капейкі. Жах, трагедыя! Нехта з хлопцаў пачаў вінаваціць мяне: паслухаліся дурня! Я кусаў застылыя пальцы. Але свет не без добрых людзей. Мабыць, грабаўскі настаўнік — чалавек быў у добрым паліто — даведаўся, што мы ажно з Макаўскай школы, пасмяяўся і правёў нас.

Выступаў зусім не пісьменнік — акцёр-чытальнік. Чытаў Маякоўскага, іншых паэтаў. А пасля Ясеніна. Многа Ясеніна, больш, чым чытаў нам некалі Шкаруба. Я радасна здзівіўся: чаму ж баяўся Шкаруба, калі можна чытаць вось так — перад бітком набітай залай хаты-чытальні.

Вярнуўся я гадзіны ў дзве ночы: 30 вёрст за дзень адмахаў. Дома не перажывалі, лічылі, што я начую, ці мала чаго мог затрымацца ў школе! Але калі я прыдыбаў сярод ночы ў змёрзлых валенках, ледзьве жывы ад стомы, і расказаў, дзе быў, бацька лаяўся, толькі неяк па-

асобаму, нязлосна, хутчэй, відаць, са здзіўленнем і, можа, нават з гонарам: во які апантаны да навукі сын! Здзіўляўся ён з тыдзень. Сядзіць, пляце ўвечары лапці і хмыкае, пакруціць галавой: «А такую тваю маць!.. То ж трэба! То ж панеслі чэрці ажно ў Грабаўку! Валёнак не напасешся, другі раз за зіму падшываю».

Але і пра валёнкі — нязлосна. А недзе ў гэты ж час, пазней ці раней трохі за наш паход да пісьменніка, абураўся зусім недарэчна, з-за дробязі. Ехаў ён на кані ад аб'ездчыка, а мы ладнай чарадой ішлі ў школу. Малодшыя неслі кнігі ў торбах палатняных, сямікласнікі — хто ў цыратавым партфелі, хто так, звязаўшы вяроўкай, але ў руках. А я лоўка навучыўся ладны стус кніг несці на галаве. Чаму гэта так моцна абурыла бацьку — не магу ўцяміць і цяпер. Доўга ён прыпамінаў мой акрабатычны нумар.

«То ж трэба! Усе людзі як людзі, а ён — што шут гарохавы. На галаве кнігі носіць! Шурку дроў узвалі на дурную галаву!»

«Не такая яна дурная ў яго,— абараняла маці.— Разумнейшая за тваю».

«Дык я што, па-твойму, дурны? — узрываўся бацька і пачынаў хрысціць усіх па парадку: — Кручаныя! Лодыры!»

Маці не здавалася:

«Ты адзін работнік! Малыя дзеці косяць, а ты пад кустом спіш».

Быў улетку выпадак, калі бацька ўручыў нам з Паўлам косы, а сам адышоў, прысеў пад дубам і заснуў, маці знайшла яго там.

Вельмі не любіў, калі маці нагадвала пра яго сон у сенакос. З кулакамі кідаўся. «Без мяне вы з голаду пухлі б!»

Рыхтавалі нас у камсамол. Сам Кірушчанка горача займаўся, каб хутчэй стварыць у школе камсамольскую арганізацыю: здаецца, якраз у той час быў зніжаны ўзроставы цэнз.

Каці і мне, лепшым вучням, дырэктар сам даў рэкамендацыі. Я праяўляў асаблівую актыўнасць у падрыхтоўцы да паступлення ў камсамол, па сутнасці, стаў нявыбраным сакратаром, бо і настаўнікі і вучні прарочылі мне гэтую ганаровую пасаду, калі арганізацыя будзе створана.

У зімовы дзень пайшлі ў Церахоўку, у райком. Усіх прынялі ў члены, а мяне і Кацю — у кандыдаты: бацькі — служачыя. Служачым не было поўнага даверу. Каця ведала гэта са Статута, які мы вызубрылі. А я ніколі не лічыў бацьку служачым. Ды і ніхто не лічыў. Падумаеш, служачы — непісьменны ляснік!

Боль крыўды помню дагэтуль. Назад не вяртаўся разам з усімі, ішоў адзін, як воўк, і глытаў слёзы. Зневажаў бацьку — за тое, што ён служачы.

Дома чакалі. Малыя з цікавасцю: які я, калі буду камсамольцам? Маці з трывогай: зусім у бога перастану верыць. Бацька з гонарам: сына прымаюць у камсамол! Не жартачкі. Вырас хлопец, адукаваны. Убачылі маю панурасць — спалохаліся ўсе: няўжо не прынялі? Ганьба ж!

Бацька асцярожна:

«Прынялі, сын?»

Я — з крыўдай:

«Ты ж — служачы».

«То што?»

«А служачых — у кандыдаты прынімаюць».

Тады бацька абурыўся і лаяў камсамольскае начальства:

«Дурні! Які служачы — ляснік? Ён — горш за шахцёра. Лесаруб. Пажарнік».

Я супакоіўся хутчэй, а ён доўга не мог супакоіцца. Перажываў.

У маі перад выпускнымі экзаменамі бацька нечакана перабраўся ў Доброўшскае лясніцтва: вызвалілася месца. Не прыжыўся ў Воленцы, дзе так добра было мне. Палохаў яго, кульгавага, абход: набліжалася лета з пажарамі ў Гардуноўшчыне.

Сям'я паехала на новае месца, а я пасяліўся на кватэры ў свайго пракопаўскага аднакласніка, матцы яго, удаве, паабяцаў бацька частку пасеянага на сядзібе лесніка жыта.

Нягледзячы на экзамены, я ледзь не штовечар бегаў на спатканне з Кацяй.

Знікненні мае страшэнна інтрыгавалі не толькі аднакласнікаў, але і старэйшых хлопцаў і дзяўчат. Выдумлялі самыя неверагодныя здагадкі, напрыклад, такія: бацька закапаў дабро і я хаджу пільнаваць яго. Мяне падпільноўвалі, наладжвалі засады, але не там, перахітрыць іх было легка, бо ніхто не здагадаўся, што я летаю ажно вунь куды — на Данец. У класе мы з Кацяй ніводным позіркам не выдавалі сябе. Усё гэта надавала нашым спатканням асаблівую рамантычнасць.

Аднак, здаецца, хопіць. Радасна было вярнуцца да вясны маёй, але —

Цябе навек, вясна, хаваю,
Назад не прыйдзе хваля тая,
Што з быстрай рэчкай уплывае.

Бывай, мае маленства! Мой ціхі, мой вялікі акіян! Я хораша акунуўся ў твае цёплыя хвалі.

Наперадзе яшчэ лета... восень... А можа, і зіма? А дзе яно, мае лета? У якіх гадах?

Пайшоўшы на пенсію, бацька прыехаў да мяне ў Мінск. Дарэчы, пенсіі ён чакаў з нецярпеннем, як свята — стаміўся чалавек за шэсць-дзесят гадоў, цяжка стала хадзіць па лесе. Людзі фізічнай працы амаль усе вось так чакаюць выхаду на пенсію.

Жыў бацька ў мяне месяцы тры, зімовыя, калі дома не было ніякага занятку. Адкрываў ён такія рысы свайго характеру, якія я не ведаў раней.

Перш-наперш — надзвычайную цікаўнасць. У такім узросце! Штодня выходзіў у паход па горадзе. Прывычка лесніковая? Не толькі. Вывучыў усе маршруты трамваяў, тралейбусаў, аўтобусаў, гарадскія і міжгароднія, расклады цягнікоў і самалётаў. Неяк прызнаўся, што ўсю тэрыторыю аэрапорта абышоў пехатою. Са сваёй кульгавасцю! Па-дзіцячаму не мог зразумець, чаму я і ўнукі яго смяяліся. Гэтак жа абышоў паўз плот трактарны завод. Здзіўляўся: «Вялікі завод. Як абход мой. Вот бы, сын, паглядзець, што там, на заводзе».

Вельмі хацелася глянуць, як робяць машыны. Наконт трактарнага завода — не помню, ці абяцаў я арганізаваць туды экскурсію, а вось як друкуюць кнігі — абяцаў паказаць. Але не паказаў. Цяпер шкадую.

Я пражыў да таго часу гадоў шаснаццаць у Мінску, але не ведаў горада так, як уведаў бацька за месяц-паўтара. Не я яму, а ён мне расказваў, дзе што знаходзіцца. Часам называў такія ўстановы, пытаючыся, што ж там робяць, чым займаюцца, пра якія я і не чуў ні разу, не чытаў. Сам здзіўляўся, што існуюць такія адмысловыя канторы. Бацька выявіў, дзе жыве мітрапаліт, і нават умудрыўся перамовіцца з ім.

Маша смяялася: «Вы што — на прычасце хадзілі?»

Бацька пасміхаўся: маўляў, жартуйце, жартуйце.

Машу ён часам раздражняў сваім залішнім клопатам пра сына.

Садзяцца абедаць — уздыхае:

«Зноў без гаспадара абедаем».

«Не бойцеся, не памрэ ваш сынок з голаду. Не ў лесе. У горадзе. У іх Саюзе пісьменнікаў штодня госці...»

У тыя далёкія гады я любіў паабедаць у добрым рэстаране. Ды хіба я адзін? Нам не столькі трэба быў абед, як кампанія, цікавыя размовы — літаратурныя.

Да творчасці маёй бацька адносіўся з павагай, але разумеў яе своеасабліва. Адарвалі ад стала, далі нейкае гаспадарчае даручэнне. Я запярэчыў:

«Мне ж працаваць трэба».

Бацька здзівіўся, хмыкнуў:

«Хіба гэта работа?»

«А што ж?»

«Ды так... забава».

«Пачакай. Як забава? А грошы мне за што плацяць?»

«Грошы табе плацяць за розум, а не за работу».

Вось так!

Паспрабаваў я далучыць бацьку да мастацтва, бо бачыў, што чытаць яму цяжка, на тоўстую кнігу не хапае цярпення. Між іншым, прачытаў яму «Біблію» Крапівы; успомніў, як ён захапляўся гэтым творам у маладосці. Не, таго захаплення не было, хіба мільганулі праблісковыя далёкіх успамінаў, як бы намагаўся нешта ўспомніць. Не мог.

Папрасіў я дзяцей звадзіць дзеда ў тэатр. Вядома ж, у Купалаўскі. На які спектакль? Вядома ж, на «Паўлінку». Народнае прадстаўленне! Што можа быць больш зразумелым яму!

Пайшоў. Вяртаецца не надта вясёлы.

«Ну, што, бацька?»

«Ды так...»

Як? Чаму? Ашаломлены, я не мог уцяміць, што яму не падабалася.

Ён растлумачыў:

«Над мужыком смяюцца».

Ну і ну!

Пасля, здаецца, Таня, гарэза, прапанавала жартам:

«Давайце зводзім дзеда ў оперу».

Ідэя падабалася — усім карцела пачуць, як дзед адзавецца пра оперу.

Глядзелі, здаецца, «Яўгенія Анегіна».

Вяртаецца бацька нейкі ўрачыста-прасветлены.

«Ну, як опера, бацька?»

«Харашо, сын».

«Харашо?!»

«Як у царкве».

А вось кіно чамусьці не любіў, хоць, блукаючы па горадзе, часта заходзіў у кінатэатры, магчыма, пагрэцца, адпачыць.

«Што ж ты глядзеў?»

«Ды так, ерунду».

Відаць, цяжка яму было пры сучасным кінамантажы выстраіць скразны сюжэт.

Спачатку ішоў з дому на цэлы дзень, а потым пачаў знікаць і ўвечары.

Маша жартавала:

«Вы часам удаву якую сабе не знайшлі?»

Загадкава пасміхаўся.

І раптам просіць:

«Выпішы, сын, мне «Советский цирк».

Таня залілася рогатам.

«Цырк? Навошта вам цырк?»

А я адразу сцяміў, дзе бацька бывае ўвечары. У той час падпіска на часопісы ішла туга, і кожная ўстанова вяла прапаганду свайго выдання. На другі дзень прапанаваў Тані і Сашу пагуляць каля цырка перад пачаткам прадстаўлення: ці не ходзіць дзед у цырк?

Вярнуліся дзеці — смяюцца: у цырку дзед, ён там як свой, усе білецёршы ведаюць яго.

Прызнаўся бацька, трохі збянтэжана, што тыдні тры ўжо штовечара бывае ў цырку. Так захапіла яго гэтае мастацтва.

Хвароб у старога лесніка, інваліда, было процьма. Я раздабыў пуцёўку. Паехаў бацька ў Сочы ранняй вясной. Я баяўся, што санаторнае жыццё яму не спадабаецца. Памыліўся. Чалавек упершыню ўбачыў мора, і яно зачаравала яго. Пра гэта бацька пісаў у пісьмах. Шкада, што пісьмы не захаваліся. Пісьмы ён не вельмі любіў пісаць, і тыя, што слаў з лесу, былі як бы несур'ёзныя, з гумарыстычным ухілам. Пра сур'ёзнае ён паведамляў коратка. А вось як вучыўся ездзіць на матацыкле ці як яго кабыла ўвалілася ў калодзеж, як яе выцягвалі ўсім пасёлкам — пра гэта распісваў падрабязна, на многа старонак. З Сочы ён пісаў пісьмы сур'ёзныя і ў кожным дзякаваў, што паслалі яго на курорт.

Увогуле бацька любіў ездзіць. Маці расказвала: калі пайшоў на пенсію, рэдка які дзень не ехаў у Навазыбкаў, у Добруш, у Гомель.

«Чаго ты не бачыў у тым Добрушы? Тысячу разоў быў».

«А так... піва выпіць».

Гэта цяжка было зразумець. Безумоўна, не з-за піва ён ехаў на ноч на веласіпедзе ці мапедзе да Галі, начаваў, уставаў у пяць раніцы, рабочым цягніком ехаў у Добруш і вяртаўся ў шэсць вечара. На веласіпедзе яму, відаць, было не вельмі зручна — з кароткай нагой. А мапед упадабаў, хоць пад чаркай на лясной дарозе неаднойчы падаў з яго. «Як рынуўся, так усю хару абадраў»,— з бязлітасным гумарам расказваў. Прасіў, каб я купіў яму матацыкл. Ды матка адгаварыла:

«Не купляй, Іван. Заб'ецца, дурны».

У апошні час бацьку стала цяжка ездзіць: задыхаўся. Хвароба прымусіла яго сядзець дома, і ён быў прыдзірлівы, раздражнёны, усімі незадаволены. Шчодрасцю асаблівай ён не вызначаўся і раней, не тое што мама, але пад канец жыцця стаў залішне ашчадны, скупы. Схаваў на гарышчы ў мякіне яблыкі — яны пагнілі. Хаваў грошы, іх знаходзілі ў розных месцах пасля яго смерці. Пабіўся з зяцем, які хацеў забраць частку выкапанай бульбы; яны з Галяй урабілі гарод і, натуральна, мелі права на частку ўраджаю. А калі зяць перастаў ездзіць, бацька перажываў, скардзіўся на яго мне:

«Во заеўся, паразіт, хворага бацьку не можа праведаць».

А маці скардзілася на бацьку, але адначасова неяк па-свойму, па-жаночаму, і шкадавала, адчуваючы яго бездапаможнасць. Бадай, правільна тлумачыла яго душэўны стан: «Ета ён бесіцца, што не трэба нікому. То ж было — поўная хата людзей кожны божы дзень. А цяпер — рэдка хто з суседзяў зайдзе».

Адчуванне сваёй непатрэбнасці — страшная рэч. Але гэта бяда, бадай, кожнага старога. Стомлены, бацька чакаў пенсіі, пасля запаўняў час «экскурсіямі», як ён называў свае паездкі, а калі і ездзіць цяжка стала — пакутаваў.

У снежні 1965 года бацька трапіў у добрушскую бальніцу. У бальніцах ён і дагэтуль ляжаў неаднойчы. Але на гэты раз у мяне ўзнікла трывожнае прадчуванне, я збіраўся паехаць. Але ўсё ніяк не мог вырвацца: канец года, справы, справы. Супакоіла, пэўна, тое, што бацька неяк сам пазваніў з бальніцы і гаварыў бадзёрым голасам.

«Як ты там?»

«Ды нічога, сын».

Я тут жа пагутарыў з урачом, што лячыў яго.

«Што вам сказаць? Хвароб у яго цэлы букет. Старасць».

У перадднавагодні вечар я, вясёлы, радасны, пайшоў у ГУМ — купляць дзецям падарункі. Хадзіў доўга — навагоднія чэргі. Вярнуўся і з парога, па тым, як ціха сядзелі дзеці, пачуў, што нешта здарылася. Глянуў на Машу — здагадаўся.

«Бацька?»

«Бацька».

І зрабілася мне вельмі балюча. Я зарыдаў.

Ехалі з Машай у пустым вагоне. Праваднікі страчалі Новы год, у вагоне было холадна, няўтульна. Спаць не мог. Боль прытупіўся, але наплыў, як туман, апатычны смутак, здавалася, што я хаваю палавіну ўласнага жыцця, а другая палавіна — у тумане невядомасці.

У Гомелі панерваваўся: Новы год, установы зачынены, каб у некага папрасіць машыну, а таксісты, адпрацаваўшы бурную ноч, адмаўляюцца ехаць за паўсотню кіламетраў. Паехаў у парк і чуць упрасіў дыспетчара.

Дома ўразіў матчын спакой. Цела яшчэ не прывезлі, нішто не парушалася ў хаце, і маці буднічна займалася сваімі хатнімі справамі і расказвала больш пра жывое. Калі і пра бацьку, то таксама пра жывога. Як заўсёды раней, калі я прыязджаў, а бацька недзе хадзіў па лесе.

«Перад тым як сабрацца ў бальніцу, доўга чысціў ружжо. «Нашто табе ета ружжо?» — «З сабой забяру, а то зяцю аддасі». Падражняўся так. А сам жа і завёз ружжо Галі (таму ж зяцю), калі ехаў у Добруш. Можа, баяўся, што ўкрадуць яго ў хаце, я па вечарах к суседзям хаджу». Тут маці не разумела, я зразумеў: стрэльба, бадай, адзіная рэч, што нагадвала бацьку саракагадовую службу ў лесе. І гэта — вельмі ж дарагая рэч.

Маці неяк здзіўлена-спалохана зіхнула, калі ўбачыла свайго Пятра ў труне, і тут жа адчула сябе блага. Не магла стаяць. Я, сёстры, Маша спалохаліся за яе, не давалі паднімацца. Не пусцілі на могілкі.

Пахавалі Пятра Мінавіча Шамякіна 2 студзеня 1966 года. Я хацеў, каб да самых лясных могілак, на якіх ён пажадаў ляжаць, мы ішлі следам за машынай, каб доўгім быў апошні бацькаў шлях па лесе. Але дарога была зімовая, слізкая. Леснікі пераканалі мяне, што так і дацямна не дойдзем — шэсць кіламетраў!

Трое леснікоў прыйшло са стрэльбамі і далі залп над магілай — пахавалі, як салдата. Дарэчы, і побач з салдатам.

Жнівень 1983 года

Паўгода пайшло на напісанне ўспамінаў пра Андрэя. Атрымалася дакументальная аповесць аркушы на чатыры.

Спачатку была задума перамяжоўваць успаміны пра яго дзённікавымі запісамі падзей нашага жыцця, што адбываліся пасля яго смерці. Але нічога не адбывалася, што магло б прадоўжыць яго літаратурнае жыццё, яго думкі. Сумна ад таго, што людзі, якія кляліся яму ў дружбе, так хутка забываюць свае клятвы. Горка.

Цяпер — пра іншае. Вярнуўшыся да дзённіка, я зусім не маю намеру запісваць падзеі кожнага дня, тым больш літаратурныя. Бледныя яны, гэтыя падзеі. Пакуль што хачу прадоўжыць радаслоўную сваёй сям'і. Другая лінія яе — жончына. Лёс скрыжаваў гэтыя лініі, і з'явілася лінія трэцяя — наша, нашых дзяцей. Зноўтакі не магу не ўпікнуць сябе за мужыцкую абыякавасць да сваіх продкаў: хто яны?

што за людзі, як жылі? Пры жыцці бацькі маёй жонкі Філата Азаравіча Кротава я мог бы залезці глыбей у карані гэтага дрэва, напэўна, глыбей, чым у карані Чарназёмавых-Шамякіных. Філат быў чалавекам начытаным, цікаўным, не дапускаю, каб ён не ведаў сваіх дзядоў, а можа, і прадзедаў. А гэта ўжо прапрадзеды Машы, яе брата і сясцёр і прапрапрадзеды нашых дзяцей.

З цікавасцю чытаю «Памяць» У. Чывіліхіна. Але не вельмі паверыў, што ў выніку пошукаў дакументаў пра дзекабрыстаў ён дакапаўся, што Мікалай Мазгалеўскі — прапрадзед яго жонкі. Схіляюся думаць, што наадварот: раней адкрыты факт гэты навёў яго на пошукі, якія можна назваць подзвігам. Выдатная кніга! Выдатная ідэя яе: памяць — галоўнае багацце чалавека, сям'і, народа, нацыі. Пануючыя класы добра гэта разумелі і стваралі свае радаслоўныя — нанімалі летапісцаў, мастакоў, не скупіліся на затраты. Асабліва гэта было развіта ў эпоху Адраджэння. Жаданне захаваць яе, Памяць, дало штуршок развіццю літаратуры, жывапісу. Але яны ж, тыя, што трымалі ўладу, рабілі ўсё, каб падуладныя, чэрнь, мелі як мага карацейшую памяць. З гэтай кароткай памяццю і прадаўжаюць жыць шырокія масы нашых людзей. І гэта крыўдна, бо мільёны з іх па адукацыі сваёй, інтэлекту ўзняліся вышэй князёў, баронаў, графаў, маркізаў, лордаў і многіх падобных з капіталістычнага свету.

Восень 1918 года. Час няпэўны, неспакойны. Стары Азар Кротаў даводзіў да ладу яму для збожжа.

Яма рабілася, відаць, не толькі таму, што хацелася нешта схаваць, утаіць ад улады. Такая была завядзёнка ў нас, на Гомельшчыне,— хаваць збожжа ў ямах. Нават я помню гэтыя ямы, іх рабіў бацька, ляснік. Хоць колькі ў яго было таго хлеба?! І ніхто на яго не пасягаў. Сакрэтам ад суседзяў такая яма была рэдка, пазней хіба, у час калектывізацыі, кулакі, цвёрдазаданнікі маскіравалі іх. Ямы гэтыя рабіліся адмыслова. Па-першае, выбіралася месца, дзе не магла падступіць вада. Малому мне здавалася яма вельмі глыбокай. Ва ўсякім разе бацька залазіў і вылазіў з яе па лесвіцы. Мела яна форму гладышкі. І ўся, ад краёў да дна, старанна аббівалася бяростай, так што пясок у збожжа не трапляў. А калі трапляў (помню такі выпадак у некага з краўцоўцаў), то гаспадара такога асуджалі. «Гэта той Пракоп, што змяшаў жыта з зямлёй. Во недарэка!»

Азар забіваў калкі ў бяросту на дне ямы. І раптам адчуў, што хтось стаіць над ім. Узняў галаву, паспеў радасна крыкнуць: «Сынок!» — і ўпаў мёртвы. Над ямай стаяў яго сын Філат, якога бацька не бачыў тры гады, быў сын на вайне, у акопах першай сусветнай бойні.

Эпізод гэты, праўда, кожны па-свойму, мне расказвалі і Маша, і Вольга, і суседзі, у прыватнасці Даніла Дзям'янавіч Кротаў, ненамнога маладзейшы за Філата; чалавек гэты яшчэ жыве, маючы ўжо гадоў 85.

Мяркуючы па ўсім, Азар меў зямлі нямнога. Увогуле ў Церусе не было вялікіх надзелаў, бо зямлі ворыўнай навокал было мала. Вёска лясная, прырэчная — побач Сож. Але хоць лес быў уладаннем князя Паскевіча, церушане менавіта з лесу мелі пэўны прыробак да таго, што вырастала на пясчанай зямлі. Цераха — вёска патомных бондараў. Бочкі, цэбры, вёдры церухскія ішлі першым гатункам, мелі, як цяпер сказалі б, знак якасці. У 20-30-х гадах там дзейнічала бандарная арцель прамысловай кааперацыі. Славілася на ўсё навакольле. Выводжу з расказаў старых, што была гэта разумная арганізацыя: улетку людзі працавалі на зямлі, зімой рыхтавалі клёпку, рабілі бочкі з нарыхтаванай у мінулы бандарны сезон і высушанай за лета клёпкі. Той жа Даніла Кротаў сказаў мне: «Цераха жыла бедна, але ніколі не галадала». Ні ў цяжкім трыццаць трэцім, калі побач — у Гарнастаеўцы, Сямёнаўцы, Краўцоўцы — былі нават смяротныя выпадкі. Ці пад час нямецкай акупацыі. Праўда, Маша расказвае, як іх сям'я галадала вясной 1942 года, дагэтуль успамінае са страхам. Але лес, Цераха (рэчка) і Сож ратавалі нават у той крытычны час. Пасля, у наступную ваенную зіму, бандарства памагло стварыць запас на такую ж галодную вясну 1943 года. Філат Азаравіч і сын Мікалай рабілі бочкі, Вольга выпрашвала ў старасты ці багацейшага суседа каня і з братам везлі гэтыя бочкі ажно на Украіну, у багацейшае Задняпроўе, і там мянялі на збажыну. А Маша рабіла яшчэ больш цяжкую і рызыкоўную справу: каня кожны раз не напросішся, і яна на санках-самацяжках везла бочкі, цэбры ў Навабеліцу на рынак — за дваццаць кіламетраў. Везла па шашы Гомель — Чарнігаў, па якой хадзілі нямецкія ваенныя машыны.

Аднак дэталі ваеннага жыцця я паказаў у «Трывожным шчасці». Увесь быт таго часу падказаны жыццём Церухі і канкрэтна сям'і Кротавых.

Некалькі слоў пра бандарства. Мяне захапляла, як майстравалі бочкі Даніла, Філат і малады яшчэ ў той час Мікалай. Гэта здавалася высокай творчасцю, мастацтвам. Лепшых бочак, як у гэтых і іншых церухскіх майстроў, я не сустракаў ні ў адным раёне Беларусі. Хіба што ў вінных пограбах Крыма, Малдавіі, Балгарыі, Югаславіі, якія наведваў.

Філат Азаравіч быў чалавек цікавы, але супярэчлівы да парадаксальнасці. Ён шмат што ўмеў — і бочку змайстраваць найлепшую, і

гаспадарку весці амаль па-навуковаму — для свайго часу, нярэдка суседзі звярталіся да яго за парадамі. Але разам з тым селянінам, гаспадаром, як успамінаюць дзеці, ён быў зусім нялепшым. Невядома, у сілу якіх генетычных законаў чалавек гэты быў запраграмірованы на працу разумовую. Думаю, што, каб яму ўдалося атрымаць хаця б сярэднюю адукацыю, з яго атрымаўся б значны інтэлектуальны работнік, настаўнік — напэўна. Пры тым любіў ён аднолькава і матэматыку, і літаратуру, і геаграфію, і гісторыю. З адукацыяй царкоўна-прыходскай школы малады Філат Кротаў у першыя паслярэвалюцыйныя гады быў першым грамацеем у воласці. Рабіць ён пайшоў пісарам, пасля быў крамнікам, рахункаводам, бухгалтерам. Сяльчане яго паважалі. Але душой грамадства, лідэрам хаця б адной групы людзей ён ніколі не быў — з-за сваёй маўклівасці. Яго паважалі і... баяліся. Уласныя дзеці баяліся, хоць у той жа час сцвярджаюць, што голас на каго-небудзь з іх узвышаў вельмі рэдка. Бацькі няма — малыя ходзяць на галовах, матчын ручнік, якім яна сцёбала каго-небудзь з іх, не толькі не ўтаймоўваў, наадварот, як бы падбіваў на большае свавольства; бацька прыйшоў з канторы — дзеці шмыгаюць на печ, як мышы, і там не пікнуць. Маша прызнаецца: «Мы з нецярпеннем чакалі, каб ён куды пайшоў, і радаваліся, калі ён выходзіў з хаты».

Ці яшчэ расказваюць. Старэйшая дачка Галя была ўжо нявеста. Па чарзе збіраліся на вячоркі — то ў хаце адной, то ў хаце другой дзяўчыны. Галя была весялуха, выдумшчыца. У яе гулялі весела... калі не было бацькі. Маці выходзіла на вуліцу і стаяла на марозе, падпільноўвала мужа, прасіла яго, каб ён абышоўся з маладымі ласкавей.

Філат уваходзіў у хату, вельмі ветліва вітаўся, спрабаваў нават жартаваць, каб падтрымаць вяселле. Але яно ўраз затухала. Хлопцы па адным выбягалі з хаты, за імі чарадой высыпалі дзяўчаты. Галя плакала, упікала бацьку. Ён і сам перажываў, але разумела гэта адна Уліта, яго жонка.

Маўклівасць Філата даходзіла да неверагоднасці, бадай да абсурду.

У пачатку вайны 48-гадовага запасніка прызвалі ў войска. Але часць не паспела, па сутнасці, сфарміравацца. Няўзброеныя і ненавучаныя (калі яны служылі ў войску!) запаснікі ўцякалі аднекуль з-пад Калінкавіч. Рускія, украінцы пайшлі далей. Атакія, як Філат, натуральна, падаліся дадому. У бацькаву хату сабраліся дзеці — дочкі, хто адкуль — з Гомеля, з Рэчыцы, з Церахоўкі, пазней дачэпаў ажно з Ліды семнаццацігадовы Коля, які за год да таго скончыў ФЗВ электрыкаў і рабіў у Заходняй. Зварот дзяцей вымусіў другую жонку

Філата, з якой удавец ажаніўся гады тры назад, пайсці з хаты, у яе там жа, у Церусе, была свая хата, свая дачка. Але гэта — асобая тэма, выкарыстаная мной з некаторай трансфармацыяй у мастацкіх творах. Зараз магу хіба адзначыць, што і тут праявілася жыццёвая мудрасць Філата: ніякага канфлікту з-за таго, што дзеці «выцеснілі» мачаху, не ўзнікла. Як расказваюць Маша і Вольга, бацька не сказаў ні слова. Бацька маўчаў. Маўчаць гэты чалавек умеў не гадзіну і не дзве, не дзень — многія гады.

Філат Азаравіч раптам падаўся ў пісары. Пасада амаль сімвалічная, бо воласці ў Церусе не было, адзін староста. Пісар пры старасце. Але ж усё адно — служба ў немцаў! Дочкі і сын, камсамольцы, шчырыя патрыёты, рашуча запратэставалі: кінь гэтую службу! Але бацька колькі месяцаў праяўляў незразумелую ўпартасць. А потым раптам, калі ўжо, здавалася, супакоіліся дзеці, змірыліся вяскоўцы — свой чалавек, сумленны, справядлівы! — лепш мець за пісара, які будзе перапісваць жывёлу, пісаць даведкі, такога, чым якога-небудзь гада ці п'яніцу,— Філат ад пасады сваёй адмовіўся, як ні ўгаварвалі яго «прадстаўнікі ўлады».

Калі ўвосень 1943 года мясцовасць вызвалілі, савецкія органы выклікалі Філата на допыт. Зноў калаціліся дзеці: пасадзяць бацьку за службу ў немцаў. І бацькі шкада і ганьбы баяліся. Але на другі ці трэці дзень бацька вярнуўся.

«Што вам сказалі, тата?»

«Нічога не сказалі».

«А пра што пыталіся?»

«А ні пра што. Як мы жылі тут».

«А пра службу вашу пісарам пыталіся?»

«Пыталіся».

«Ну і што?»

«Анічога».

Так ён адказаў дзецям — надзіва лаканічна.

Філат Азаравіч вярнуўся на сваю даваенную пасаду — рахункаводам калгаса. Цяпер у калгасах у бухгалтэрыях сядзяць па некалькі чалавек з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй. А тады адзін чалавек, якога афіцыйна і неафіцыйна называлі рахункаводам і які меў чатырсхкласную адукацыю, вёў улік працадзён, прадукцыі, грошай. Як працаваў Філат Кротаў — пра гэта я раскажу ніжэй, бадай, у камічным эпізодзе. Цяпер адзначу, што працаваў ён з надзвычайнай шчырасцю, сумленнасцю. Я неаднойчы чуў ад старэйшых церушан: «Такога, Пятровіч, бухгалтера, як ваш цесць Філат, не было і не будзе.

Цяпер іх у канторы саўгаса дзесяць чалавек сядзіць, інстытуты паканчалі, а таго не робяць, што ён адзін рабіў».

Але — пра маўклівасць. Пісарская служба яго адгукнулася гадоў праз пяць пасля вайны незвычайным чынам. Не для самога старога, для сына яго Мікалая. Прызваны ў армію ў 1943 годзе, Коля стаў бясстрашным разведчыкам. Яго расказы пра вылазкі за «языкамі» — тэмы для аповесцей. Шкадую, што не здолеў выкарыстаць іх. Неяк не дабраўся я да падзей на перадавой, да франтавікоў. Хлопец тройчы ранены, будучы інвалідам, атрымоўваючы пенсію, шчыра рабіў у калгасе, на ферме, у полі. Стаў загадчыкам фермы буйнарагатай жывёлы. Яго парэкамендавалі ў партыю, аднагалосна прынялі на сходзе калгаснай арганізацыі. Паехаў на бюро райкома. Усё ідзе як мае быць. І раптам пытанне зал і ш не пільнага начальніка міліцыі ці пракурора, не помню дакладна: «Гэта вы сын таго Кротава, што быў пісарам пры немцах?» У той час аднаго такога пытання было дастаткова. Адкласці!

Вярнуўся Коля з Церахоўкі з вялікай крыўдай на бацьку. Падвыпіў — пачаў папракаць залішне, нават жорстка, у гэтай сям'і да бацькі адносіліся паважліва ды і адзін да аднаго таксама, Коля быў выключэннем, але, сёстры даравалі яму — інвалід, калека.

І зноў Філат нічога не расказаў. Адно заладзіў:

«Нічога, сын, уладзіцца...»

Уладзілася, безумоўна. Мікалая ўжо праз колькі месяцаў паўторна выклікалі на бюро. Праўда, ён не паехаў — пабаяўся. Гады на два ці на тры зацягнулася яго ўступленйе ў партыю.

А недзе ўжо ў 50-х гадах (сям'я мая адпачывала там, шкадую, што мяне не было) прыехаў у Церуху з Масквы, здаецца, чалавек з сям'ёй, пачаў пытацца, ці жывы такі чалавек — Філат Азаравіч. Жывы. І расказаў госць церушанам, як у 1941-м аднавясковец іх ратаваў яго і яшчэ аднаго афіцэра, раненых: тры месяцы хаваў у лесе, кармію, лячыў. Людзі не здзівіліся: колькі іх было, такіх выпадкаў! Ды і Філата добра ведалі. Дзеці здзівіліся: чаму за столькі гадоў бацька і слова не прамовіў пра свой подзвіг? Каб атрымаць ад старасты «натуру» — хлеб, бульбу, гародніну і карміць гэтым харчам акружэнцаў, бо з дому не было чаго ўзяць, ды і выявілася б гэта хутка, прыйшлося б тлумачыць,— пайшоў ён у пісары. Дык иавошта ведаць пра такое лішнім людзям, няхай сабе і дзецям?! Маладыя, яшчэ прагаворацца дзе.

Філата Азаравіча збянтэжыла ўдзячнасць чалавека, якому некалі памог. А тут яшчэ дзеці накінуліся: чаму маўчаў? Я таксама ўпікнуў старога: такі сюжэт!

«Ды што тут пісаць. Ты лепш пішаш».

Сюжэт гэты я доўга «абкатваў», але рэалізаваць не здолеў, бо ўжо быў напісаны Карп Маеўскі, рысы характару цесцевага блізкія пазнавалі і ў гэтым вобразе і ў некаторых іншых персанажах. Я напісаў маленькае апавяданне «Дзівак чалавек», у якім адсутнічае вымысел. Але факт гэты, расказаны мною Андрэю Макаёнку, сябра майго не проста прафесійна зацікавіў — па-чалавечаму ўсхвалявaў. Безумоўна, Цярэшка Калабок з «Трыбунала» мала падобны на маўклівага, сур'ёзнага грамацея Філата Кротава, але не сумняваюся, што нараджэнне сюжэта трагікамедыі не абышлося без гэтай жыццёвай гісторыі, па-свойму тыповай і па-свойму незвычайнай.

Як працаваў Філат рахункаводам? Вось той эпізод, які церушане расказвалі, як анекдот,— са смехам. Прыслалі новага старшыню, «чужога», з раёна. Чалавек аказаўся «цёрты»,— з тых, што на адным месцы доўга не затрымліваюцца. Можа, сам па сабе ён і неблагі работнік быў, але тагачасная беднасць і бескантрольнасць псавалі слабых людзей: яны хутка пачыналі блытаць сваю кішэню і калгасную.

Старшыня пачаў з дыпламатычнага збліжэння з рахункаводам:

«Ну, Азаравіч, будзем працаваць так, каб не падводзіць адзін аднаго».

«Ды ўжо ж»,— згадзіўся стары.

Старшыня не краў — выпісваў для сваёй патрэбы машыну дошак (была ў калгасе піларама і свой лес), мяшок грэчкі, гуркі, капусту. Яўна спадзяваўся, што рахункавод усё гэта аформіць так, як афармлялі яму ў іншых калгасах, дзе ён рабіў перад тым. Філат Азаравіч сапраўды афармляў як мае быць, па закону. Карацей кажучы, кал і былі падбіты гадавыя вынікі для аплаты на працадні і абнародавана справаздача, выявілася, што не калгас равінен старшыні, а старшыня — калгасу, нават па сабекошту прадукцыі,— даволі вялікую суму.

Старшыня страціў ветлівасць, «законнасць» І тут жа выгнаў такога памочніка. На гэтым, дурань, пагарэў. Знайшліся людзі, якія інфармавалі райком партыі. Сам Філат Азаравіч ніколі не скардзіўся, ён не быў змагаром за праўду, ён быў шчырым выканаўцам законаў праўды, я сказаў бы, ён па-біблейску адносіўся да гэтых катэгорый чалавечай прыстойнасці.

Райком аператыўна разабраўся ў справе, і вельмі хутка сход калгаснікаў без удзячнасці развітаўся са старшынёй і вярнуў рахункавода.

Але пры тым, што чалавек гэты больш меў ведаў, чым іншыя сяляне, і нямала чаго меў, гаспадаром ва ўласным доме ён быў далека

не лепшым. Не цікавіўся ён гаспадаркай — у яе вясковым разуменні. Парадаксальна? А які чалавечы характер не парадаксальны?

«Усё жыццё бацька любіў адно — чытаць»,— заключаюць свой расказ дзеці, старэйшыя. Адна хіба Клава, малодшая, якая пасля вызвалення, калі зноў усе раз'ехаліся на працу, а яна, чатырнацацігадовая, засталася з бацькам адна, лічыла, што бацька ўмеў усё рабіць, нават тое, што ў вёсцы, як правіла, выконваюць жанчыны. Старэйшыя сестры, згаджаючыся з ёй, прыгадвалі, што пад час акупацыі ў яго абудзіўся селянін, нават з'явілася ашчаднасць і скупасць, у чым раней Філата ніхто не мог упікнуць. Не цяжка зразумець чалавека, які нёс адказнасць за вялікую сям'ю. Ніхто ж з дзяцей не рабіў ні фельчарам, ні настаўнікам, ні паштовым работнікам, ні электрыкам. Здабыць харч, каб жыць, маглі толькі працай на зямлі (у Церусе зямля была раздзелена ў самым пачатку акупацыі) ды даўнім промыслам — выпрасіць у лесніка ці ўкрасці дуба і зрабіць бочкі.

Расказваюць, што бацька выпрасіў дзялянку ў лесе і вельмі хацеў раскарчаваць яе, каб пасеяць проса, сам працаваў да знямогі, дзяцей прымушаў. Але праца гэта д'ябальскі цяжкая (я помню яе з малых гадоў), і знясіленыя за галодную зіму маладыя жанчыны, пры ўсім разуменні неабходнасці лішняга мяшка проса, літаральна забаставалі.

Бацька здаўся, толькі ўпікнуў:

«Людзі карчуюць, а мы не можам. Беларучкі!»

«Людзі сала ядуць, а ў нас кавалка хлеба няма».

Было ў сяле некалькі гаспадарак, якія і ў час акупацыі ўмелі акулачвацца: набылі коней, трымалі кароў, «арандавалі» зямлю ў тых, у каго не хапала сілы ўрабляць яе ці не было чым засеяць.

Аб Філатавай сялянскай ашчаднасці ў гэты цяжкі час расказваюць такі эпізод, трагікамічны.

У Церусе кватаравала італьянская часць. Салдат прыйшоў у двор да Кротавых і хацеў рэквізаваць адзінага парсючка. І тут адбылося незвычайнае: пяцідзесяцігадовы Філат, маленькі, худзенькі чалавек, счапіўся біцца з адкормленым акупантам. Вольга і Маша ўбачылі гэтую жахлівую сцэну, калі на крык італьянца ў двор убеглі іншыя салдаты. Дочкі абамлелі: канец бацьку, застрэляць. Але італьянцы — вясёлы народ! — абкружылі задзір, што качаліся ў пяску, у курыным памёце, і пляскалі ў далоні, крычалі «бравісіма!» то свайму сябру, то селяніну — у залежнасці ад таго, хто каго падмінаў пад сябе.

Парсючка бацька ўратаваў. У той раз. Але праз колькі дзён італьянцы ўсё роўна ўкралі яго. Вясёлыя і гуманныя, яны ў той жа час былі адмысловымі злодзеямі. Немцы нахабна, адкрыта рабавалі, італьянцы ўпотай кралі, для іх гэта было нешта накшталт спартыўнай

гульні. І свае і суседзі адзікадушныя ў вывадзе: счапіўся б гэтак наш чалавек з немцам ці мадзьярам — не было б яму літасці, верная смерць чакала, можа, нават пакутлівая.

Пасля адкрыцця гісторыі з уратаваннем нашых афіцэраў Філат Азаравіч неяк пад настрой, аднаму мне, расказаў пра свае сувязі з партызанамі. Начытаны чалавек, ён добра ведаў, якія дэталі мяне, пісьменніка, зацікавяць. Ён расказаў, як у цёмную асеннюю ноч праводзіў групу ажно з-пад Шарпілаўкі ў Грабаўку (гэта кіламетраў пятнаццаць і ўсё па лесе), памог ім перайсці чыгунку Гомель — Чарнігаў. Людзі былі змораныя, ішлі, мабыць, ажно з Палесся, перапраўляліся цераз Дняпро, Сож. У падзяку Філат Азаравіч атрымаў пахвалу камандзіра:

«Ну, дзед, ты — што сава, так бачыш лясныя дарогі. У такой цемры!»

Але не помню, каб цесць расказаў, якім жа чынам ён, церушанін, трапіў ажно пад Шарпілаўку і звязаўся з гэтай групай, значыцца, нехта раней ведаў правадніка, мабыць, з мясцовых партызан. Не сумняваюся, што з-за сваёй сціпласці і маўклівасці стары расказаў далека не ўсё нават мне. Я заўважыў, што, калі Філат Азаравіч дасканала чагось не ведаў ці быў не ўпэўнены ў нечым,— пра тое ён ніколі не гаварыў. Відаць, гэта ўсё ад той жа адданасці праўдзе. Чалавек страшэнна любіў раманы (Дзюма для яго быў богам), але сам ніколі не дазволіў сабе пафантазіраваць, зрабіць здагадкі, пайсці на вымысел, паўпраўду.

Калі калгасы ажно двух сельсаветаў, Церухскага і Краўцоўскага, былі рэарганізаваны ў саўгас, Філат Азаравіч, які з'еў зубы на бухгалтарскай справе, многім маладым рахункаводам у раёне памагаў складаць гадавыя справаздачы, раптам папрасіўся на адпачынак. Спалохаўся больш маштабнай работы, новых форм уліку? Магчыма. Бо быў у яго жыцці эпізод, які, магчыма, і зрабіў яготакім — крыштальна сумленным, але і асцярожным. А магчыма, чалавек проста стаміўся, размяняўшы сёмы дзесятак гадоў.

Пенсіі яму не далі, у той час калгаснікі дзяржаўную пенсію не атрымлівалі. Нявестка, Мікалаева жонка Надзя, папракала:

«Парабіў бы ў саўгасе, то хоць якую пенсію меў бы».

Свёкар маўчаў. Маладая гаспадыня хацела запрэгчы ў хатнюю работу. Скардзілася Вользе, Машы: не хоча бацька нічога рабіць. Скарга, бачыў я, несправядлівая: стары зрабіўся нядрэннай нянькай яе дзяцей, ды і нашых дзяцей улетку «пасвіў».

Натуральна, што дочкі абаранялі бацьку перад нявесткай:

«Надзя, ён і малады мала што рабіў у хазяйстве. Не любіў ён корпацца ў зямлі. Больш чытаў. Каб не матка наша, дрэнна б нам жылося».

Жылося ім — ох як не салодка! Але жыццё пры маці ўсе, хто яе помніць, лічаць самым шчаслівым. Я ко, жыццё, мяркуючы па многіх дэталях, было бедным. Але справа не ў беднасці. Шчасце ў дзяцей тады, кал і грэе сонца, імя якому — Маці. А Уліта Парфенаўна была такім сонцам, была Маці з вялікай літары. Па характару яна — супрацьлегласць свайму мужу. Шчабятуха. Вс сялуха. Пявуння. Нястомная працаўніца. Шчодрая душа. На яе плячах трымалася ўся гаспадарка,калі жылі аднаасобна.

Уліта рабіла ўсё шпарка, спрытна, весела. Любую працу. Першай ішла з сярпом на ніве. Лепш за некаторых мужчын малаціла, ладна веяла, арала, баранавала. Умела смачна накарміць дзяцей і гасцей, нават калі гатавала нішчымнае. Пра дабрыню яе расказвалі праз дваццаць гадоў пасля яе смерці не толькі дзеці, але многія суседзі, той жа Даніла Кротаў, жонка яго, Маня.

У той далёкі час нямногія церушане мелі сады. Азар, які ў маладосці служыў у маёнтку, у пэўным сэнсе быў гаспадаром культурным, адукаваным і пасадзіў лепшы ў вёсцы сад. У 20-я гады ён добра разросся. Думаю, што і Філат пераняў у бацькі садоўніцкую навуку. Безумоўна, дзіцячыя ўяўленні ў сталасці заўсёды ружова перабольшаныя. Але старэйшыя Галя, Вольга ды і Маша заўсёды выказвалі захапленне:

«Які ў нас быў сад! Ні ў каго такога не было. Якія грушы! Цяпер такіх няма».

Дарэчы, сад цалкам вымерз у зіму 1939-1940 года. Спробы Мікалая аднавіць яго не далі вынікаў — гінулі дрэвы. Але Філат паказаў і ў старасці, што ёсць у яго ўменне садоўніка. Над рэчкай на наносным пяску я збудаваў у пачатку 50-х гадоў хаціну — для Вольгі: Машына ўдзячнасць старэйшай сястры. Безумоўна, мелася на ўвазе, што ў летні час хаціна будзе месцам нашага адпачынку. За колькі метраў ад хаты — мелкая, якраз для дзяцей, але ў той час яшчэ крыштальна - празрыстая Церуха, за рэчкай — дзівосны грыбны бор.

Філат пасадзіў каля хаты сад. Вяскоўцы дзівіліся, кпілі: што будзе расці на такім пяску! А вясной яшчэ і залівала, пакуль не збудавалі вышэй плаціну. Сад, надзіва людзям, вырас. Нядрэнна пладаносіў. Справа.іншая, што пладоў гэтых мала спажывала і мая сям'я і Мікалаевы дзеці. Іх збіралі не толькі хлапчукі, але і сталыя дзецюкі. І не толькі церухскія. Гамяльчане, якія прыязджалі на адпачынак, не саромеліся сігануць праз плот, нават калі гаспадары былі дома.

Спакусліва — яблыкі над рэчкай! Сад жыў, пакуль жыў садоўнік. Як толькі Філат Азаравіч памёр, зноў-такі на здзіўленне ўсім, праз год-два пачалі сохнуць дрэвы.

Аднак пра той стары сад і пра шчодрасць гаспадыні яго. Уліта Парфенаўна не магла не занесці яблык, груш, сліў у хату, дзе меліся дзеці, але не было саду. Для яе гэта было святым абавязкам. Людзі цягнуліся да яе дабрыні, да яе ветлівасці. Жылі недалёка ад школы больш заможныя гаспадары, але настаўнікі, усе, якіх помняць, тады яны часта мяняліся, бралі малако ва Уліты Кротавай. Менавіта — бралі, а не куплялі, бо за такія прадукты, як яблыкі і малако, грошай Уліта ніколі ні ў кога не брала. Лічыла такі гандаль грэшным. На рынак, безумоўна, вазілі збожжа, масла — трэба ж апранацца і абувацца! Але каб узяць грошы за гладышку малака ды яшчэ з настаўніка, які вучыць тваіх дзяцей,— крый божа! І гэта пры тым, што свая сям'я наўрад ці ела малака ўдосталь, ва ўсякім разе і смятану і масла каштавалі хіба толькі на святы.

Ці многа засталося такіх жанчын, як Уліта? Добрых і шчодрых душ нямала сярод старых сялянак. Але звужэнне натуральней гаспадаркі, гарадскі лад жыцця, калі ўсё трэба купіць, а калі купіць, то і прадаць, змянілі псіхалогію нашых людзей у іншы бок ад таго ідэалу, пра які марылі яшчэ мы, камсамольцы 30-х, марылі ўсе, хто верыў у хуткае выхаванне новага чалавека. Не так проста ён выхоўваецца, гэты чалавек! Не так проста, як мы думалі,— у сілу аб'ектыўных законаў развіцця грамадства, напрыклад, таго ж імклівага росту гарадскога насельніцтва, што не лепшым чынам уплывае на народную мараль, этыку. Але не лічыцца і з супрацьдзеяннем нельга. Буржуазныя ідэолагі вывучылі і ведаюць слабасці чалавечай псіхалогіі. Спажывецкі бум, які пракаціўся, што цунамі, у апошнія два дзесяцігоддзі, разбурыў нават тое, што было закладзена, збудавана намі ў душах людзей у першыя дзесяцігоддзі рэвалюцыі. Гэта, бадай, адна з самых значных дыверсій супраць камуністычных прынцыпаў, самая прадуманая і самая непрыкметная, хітрая. Тут ніводнага дыверсанта не зловіш за руку. Нібыта ўсё робіцца само сабой. Проста мы, дагматыкі, не выявілі гэтай хвалі на стадыі яе зараджэння і нічога не маглі паставіць на яе шляху, калі непрыкметная, як і цунамі, яна набірала сілу. А цяпер мы расчышчаем друз ад тых разбурэнняў, якія яна зрабіла.

Уліта нарадзіла семярых дзяцей, шасцёра з іх здолела зберагчы. Выхаваць малых у сялянскіх умовах, у той час, калі лютавалі войны, разруха, голад, эпідэміі розных інфекцыйных хвароб, дзіцячых асаблівa, калі ні пра якую прафесійную медыцынскую дапамогу не ведалі

і не марылі,— гэта вялікая заслуга матак нашых. Каб нехта правёў такое даследаванне, то, безумоўна, прыйшоў бы да вываду, што дзіцячая смяротнасць вельмі залежала ад таго, якая была маці. Дзеці паміралі там, дзе панавала спрадвечнае сялянскае дзікунства, дзе нічога не рабілася, каб пераадолець яго. Калі жанчына-маці адносілася да іх па прынцыпу: «Цэлы будуць» ці «Бог даў — бог узяў». Калі ў хаце не было выпрацаванага стагоддзямі ладу, таго ладу, пра які так хораша напісаў В. Бялоў, калі добра не мылася, не прыбіралася і дзеці елі з адной міскі з кошкамі, адным словам, як кажуць цяпер, адсутнічала здаровая сялянская санітарыя,— у такую хату, ведалі, часта заглядвала кастлявая.

Уліта ўмела ў самыя цяжкія гады накарміць дзяцей, адзець, абуць, трымаць у цеплыні і чысціні і гэтым зберагчы іх.

Сям'я нічым не выдзялялася з суседніх сем'яў. Але быў у ёй той асаблівы мікраклімат, які ўмеюць ствараць толькі такія маці, якой была Уліта Парфенаўна.

Гэтая яе рыса — усю цеплыню душы сваёй — дзецям — перадавалася дочкам, ды і сыну таксама, хоць у мужчыны гэта праяўляецца інакш.

Уліта памерла на сорак другім годзе жыцця ад запалення лёгкіх. Засталося шасцёра сірот. Матроне было дванаццаць, Машы — дзесяць, Мікалаю ішоў восьмы, а Клаве ўсяго два. Галя, не пазбаўленая эгаізму, хоць асуджаць яе за гэта нельга, разумеючы, які цяжар узваліўся пасля смерці маці на яе, старэйшую, неўзабаве выйшла замуж у суседнюю вёску, далёкую, па мерках таго часу,— за дзесяць вёрст.

Лёс чацвярых малодшых і свой уласны ўзваліла на свае зусім яшчэ дзіцячыя плечы Вольга; ёй ішоў шаснаццаты год. Забягаючы наперад, скажу: тое, што зрабіла Вольга Філатаўна, інакш нельга назваць як самаахвярны подзвіг.

Уявім той час. Завяршалася калектывізацыя. З-за супраціўлення кулацтва і з-за немалых перагібаў у правядзенні гэтай сацыяльна-эканамічнай рэвалюцыі ў сяле, галоўным чынам з-за рэзкага зніжэння колькасці жывёлы стварыліся значныя цяжкасці з харчаваннем. У краіне была ўведзена картачная сістэма. Безумоўна, сяляне атрымлівалі хлеб, бульбу на працадні. Але іх трэба было зарабіць, гэтыя працадні. А колькі іх магла зарабіць сям'я Філата Кротава? Ды і што вырастала на церухскіх пясках без гною? Адчуваючы адказнасць за дзяцей, Філат Азаравіч перайшоў на працу ў АРЗ (аддзел рабочага забеспячэння) на чыгуначнай станцыі Церуха. Хоць нейкі паёк будзе. Рабіў у краме. Але нядоўга. Растраціўся, як і мой бацька, які працаваў на год пазней у такой жа краме лясніцтва. Свядома растраціць

чалавек, які ніколі не піў, не курыў, вызначаўся надзвычайнай сумленнасцю, не мог. Усе церушане, з якімі мне пасля ўдалося пагаварыць, у адзін голас сцвярджалі: ашукалі Філата. У той час у гандлі рабілі пераважна былыя дробныя нэпманчыкі; яны як бы бралі рэванш за страту ўласных крам. Такія людзі маглі прадаць бацьку роднага.

Але сам Філат ніводнага слова не сказаў ні супраць гэтай ці іншай катэгорыі работнікаў таго часу, ні супраць людзей увогуле.

Мой бацька «пакрыў» растрату бычком, Філату Азаравічу не было з чаго ўзяць, забраць ад дзяцей апошнюю карову ён не мог. Яго асудзілі на тры гады. Праўда, вярнуўся ён праз два, бо і там, у калоніі, працаваў з усёй шчырасцю.

Але дзеці засталіся, па сутнасці, круглымі сіротамі.

І вось тут пачаўся той подзвіг Вольі, пра які я абавязаны яшчэ напісаць у рамане ці аповесці. Я спрабаваў гэта зрабіць у «Добрым часе» ў вобразе Машы Кацубы, але там гэта па маёй маладосці, узнёсласці атрымалася трохі спрошчана, падсалоджана. Подзвіг яе працягваецца па сённяшні дзень — цэлае паўстагоддзе!

Аднак, гаворачы пра самаахвярнасць гэтай жанчыны (тады дзяўчынкі, падлетка), нельга не сказаць аб нашым савецкім ладзе. У любых іншых сацыяльных умовах такая сям'я была б асуджана на вернае жабрацтва. Гэтага не толькі не здарылася, але гадоў праз семвосем няўдачнікі і гультаі зайздросцілі гэтай сям'і — зайздросцілі таму, што дзеці без маці (ды, па сутнасці, і без бацькі) «выйшлі ў людзі». Сапраўды-такі выйшлі. Але чаго гэта каштавала Вользе ды і ім, малодшым, якім яна замяніла маці і якім, як і маці іх, аддала ўсю цеплыню і дабрыню свайго вялікага сэрца?!

Памаглі мясцовыя ўлады Вользе ў адным: ёй далі пасаду, якая аплачвалася нейкімі мізэрнымі грашамі,— пасаду паштальёна, як тады называлі залішне гучна, бо не была яна работнікам сувязі ў цяперашнім разуменні, хоць і адказвала за паштовыя паступленні. Галоўная работа калгаснага паштальёна вельмі нялёгкая — разнесці газеты, пісьмы, пераводы. Дзвесце хат у Церусе, за чатыры кіламетры — Каралін, Пыхань, за тры — Кустарны, здаецца, тады яшчэ былі нейкія пасёлкі, хутары, якія пазней зніклі: іх знеслі ў саракавым годзе ці спалілі ў вайну. Але на паштарскі заработак не пражывеш. Пракарміць мог гарод, працадні ў калгасе. Таму, атрымаўшы пошту, разносіць газеты і пісьмы, акрамя пераводаў грашовых, Вольга даручала малодшым — Матроне, Машы, а сама бегла ў калгас — каб працадні былі. Каб соткі не абрэзалі. Урабляла як найлепшая гаспадыня свой прысядзібны ўчастак. Мне расказвала Маня Кротава — Даніліха, суседка, не сваячка:

«Пятровіч, вы не можаце ўявіць, што ета за дзеці былі! За імі вялікія (дарослыя) не маглі ўгнацца. О, не, яны не краты, хіба што ў норку сваю цягнулі, як краты... Яны — што раннія пташкі! Яны і пошту разносілі — ніколі пасля іх так акуратна не насілі. Не паспееш аглянуцца — а яны ўжо і ў Каралін і ў Кустарны злётаюць. і па грыбы, па ягады — раней за іх ніхто не ўставаў. Як рана ні падымешся, а прыйдзеш у лес — Філатавы ўжо там. Асабліва Вольга і Маша — вот жа шустрыя былі».

У 1932-1933 гадах я хадзіў у пяты клас у Церухскую школу, вучыўся з Машай, і я помню, што ні Моця, ні яна не былі адзеты бядней, чым іншыя дзяўчаткі, нават больш таго, просценькія плацці іх былі акуратна пашытыя, заўсёды чысценькія, і вучаніцы-сіроты выглядалі не горш за дзяцей настаўнікаў, дырэктара бандарнай арцелі.

Дарэчы, пра год трыццаць трэці. Вясна гэтага года была кульмінацыяй цяжкасцей «вялікага пералому». Як вядома, найбольш пражыла Украіна. Натуральна, нястачы адбіліся і на паўднёвых раёнах Гомельшчыны.

Вольга Філатаўна скупа расказвае пра жыццё тых гадоў, пра вайну ўсе сёстры расказваюць больш шчодра. Але аднойчы ў яе вырвалася, і сказала яна не без гордасці, не без стоенай пахвалы і сабе і малодшым сестрам, брату: «А ў трыццаць трэцім ніхто з нашых дзяцей не апух. Некаторыя з бацькамі і маткамі — а пухлі. Лес нас карміў, рэчка. У нас, калі не ленавацца, з голаду не памрэш».

Маша расказвала. Елі ў тую цяжкую вясну ўсё: сасновую «кашу», маладыя парасткі, «пучкі», шчавель, але асабліва падтрымлівала рыба, якую ўмела лавіў дзесяцігадовы Мікалай.

Гэта быў першы крок Вольчынага подзвігу — зберагчы дзяцей. Але гэтага мала. Трэба было яшчэ вывесці іх у людзі.

Было галодна, але свабодна. Шырока адчыніліся дзверы ў вялікі свет, у навуку. Моця кончыла сем класаў — паступіла ў Гомельскі педтэхнікум, праз год, у 1936 годзе, Маша паступіла ў медыцынскі тэхнікум, як ён тады называўся. Праз два гады паехаў у ФЗВ Мікалай. Сяльчане здзіўляліся з Вольгі: «Падумаць толькі, мала што на ног і ўсіх падняла, дык яшчэ і ў навуку выпраўляе».

Але ці стала лягчэй самой Вользе? Яна ахвяравала асабістым шчасцем — адмовілася выйсці замуж, хоць яе і сваталі. Яна не адразу згадзілася на ўгаворы раённага паштовага начальства перайсці на працу ў раённае аддзяленне сувязі. Дзе тая Церахоўка? За трыццаць вёрст! А як жа без яе застанецца Клава? Але ўсё-такі, мабыць, разважыла, што, маючы намнога вышэйшы заробак, яна здолее больш

памагаць дзецям. На рашэнне паехаць у раённы цэнтр паўплывала і тое, што бацька рабіў рахункаводам у калгасе і пачаў займацца гаспадаркай з большай увагай, чым раней, ды і Клава падрасла. У дзевяць-дзесяць гадоў стала гаспадыняй, умела падаіць карову, дагледзець гарод. Але калі пасля даволі працяглага ўдоўства, гадоў восем, бацька ажаніўся, Вольга і Маша (Маша ўжо кончыла тэхнікум і паехала ў Рэчыцкі раён працаваць фельчарам) вельмі перажывалі — за Клаву: ці не будзе мачаха яе крыўдзіць? А Мікалай, вучань ФЗВ, пратэставаў супраць жаніцьбы бацькі тым, што колькі месяцаў не прыязджаў дадому. А Вольга, наадварот, прыязджала часцей, ледзьве не кожную нядзелю: «Як там Клавачка?»

О, гэтыя паездкі яе! Адны яны могуць многа расказаць пра характар чалавека! Ехала яна з Церахоўкі да Навабеліцы поездам. А з Навабеліцы... нярэдка хадзіла пехатой: «нядоўгая» дарога — усяго 20 кіламетраў! На аўтобусах тады хіба ў сталіцах ездзілі. Машын таксама — колькі іх было? Адна ў гадзіну праходзіла. Рэдка трапляла на спадарожную машыну. Ды і то садзілася тады, калі трапляўся сумленны шафёр і «не дзёр шкуру». Для яе кожная капейка была дарагая: усім жа трэба памагчы, усім даць на адзенне, абутак.

Выхадны быў адзін — нядзеля. А законы суровыя: за прагул — пад суд. Ды і сумленне не дазваляла зрабіць прагул. І часта было так: прыходзіла з Навабеліцы пехатой пасярод дня, а праз дзве-тры гадзіны ішла назад, каб паспець на вячэрні рабочы поезд. А яшчэ прасцей: з Церахоўкі да Церухі пехатой. І ў той жа дзень назад. Шэсцьдзесят кіламетраў! Калі Маша расказвае пра гэтыя паходы дзецям, яны не хочуць верыць, сумняваюцца. Я пісаў ужо, што ў акупацыі тая ж Вольга ды і Маша рабілі яшчэ даўжэйшыя паходы і не з дзвюма буханкамі хлеба, кілаграмам прасянкі ці цукру, а з бочкамі, якія везлі на санках-саматужках.

Між іншым, нямала пахадзіла і Маша, калі вучылася. Стыпендыі, безумоўна, не хапала. Не кожны дзень дазвалялі сабе такую раскошу, як паабедаць у рабочай сталоўцы. Гэта я ведаю па сабе. А дзяўчаты былі яшчэ больш ашчадныя, ім хацелася на гэтую стыпендыю купіць хоць паркалёвае плацце, чаравікі. «Французская», як яе тады называлі, булка за 72 капейкі, грамаў трыццаць (сто грамаў на тры разы) цукру, растворанага ў чыстым кіпятку (на чай мала хто траціўся), лічылася шыкоўнай вячэрай, святочнай; такія траты нават мы, хлопцы, дазвалялі сабе не кожны дзень. Стыпендыя ж усяго 60 рублёў.

Безумоўна, усім нам дапамагалі з дому. Але багатым студэнтам лічыўся той, хто мог прывезці ад бацькоў сала. Нават у майго бацькі,

лесніка, сала было хіба што на Каляды, пазней маці давала яго мне ўпотай ад бацькі, бо той лічыў, што я там, у горадзе, булкі ем, а сала трэба для сенакосу, інакш не пацягнеш касы.

У Філата... не, не ў Філата, у Вольгі, яна гаспадарыла, сала вялося яшчэ радзей. А студэнтак трэба падтрымліваць. Галка тварагу, пляшка малака... Калі жылі на прыватных кватэрах, дзе можна зварыць (у інтэрнатах у той час кухань не было, не дараслі яшчэ да такой раскошы),— везлі з дому бульбу, грачнёўку, прасянку.

Здаралася, што і Маша хадзіла пехатой да роднай вёскі — з Гомеля, тады нават да Навабеліцы — пяць кіламетраў — ніякія аўтобусы не хадзілі. (Божа, якія мы былі бедныя! І якія багатыя цяпер! І яшчэ часам выказваем незадаволенасць!) Але Маша страшэнна не любіла першай трэці дарогі — па Гомелі і па даўжэзнай Навабеліцы. Калі цяпер праязджаем там на машыне, яна кожны раз успамінае: «Каб вы ведалі, як я не люблю гэтай даўжэзнай Навабеліцы! Дамы тут тады былі драўляныя, але чамусь, як нідзе, падобныя адзін на адзін. Нудна! І людзі былі з кулацкім духам, у кожным двары — сабака... Вады захочаш — не дадуць. Стараверaў было многа».

Маша ездзіла поездам да станцыі Церуха. Але па лініі Гомель — Чарнігаў не было рабочых паяздоў, хадзіў адзін пасажырскі, позна ўвечары. Часта прыязджала адна. І бегла сем кіламетраў па лесе — уся дарога праз лес — апоўначы, разуўшыся нават у асенні прымаразак — каб зберагчы свае адзіныя чаравікі. Збівала аб карэнні ногі.

«Не баялася?»

«Ты паверыў бы, каб я сказала, што не баялася? Канешне, баялася. Кожны пень здаваўся бог ведае чым — ваўком, нячысцікам. Цяпер нізашто не пайшла б...»

«Каб голад пагнаў — пайшла б».

Згаджаецца:

«Гэта праўда. Каб убачыла, што галадаюць дзеці, — куды я ні пайшла б! Хоць у пекла».

Так яны жылі, тры сястры, калі не лічыць малой Клавы, якая заставалася дома. Інакш вучыўся Мікалай — у ФЗВ кармілі і адзявалі.

Галя жыла нябедна, мела ўсяго адну дачку, але памагала сестрам мала. У пачатку вайны яна закапала свае немалыя для сялянкі набыткі (швейная машына была, а гэта ўжо — ого!), збожжа, але так няўмела, што немцы, маючы вопыт, у першыя ж дні акупацыі знайшлі яе «скарб» і ўсё хапнулі — нічыйнае: з хат яны тады яшчэ так не рабавалі.

Расказвае Маша:

«Прыйшла Галя да нас у слязах, у роспачы. А нам штось зусім не хацелася спачуваць ёй. Здаецца, я нават упікнула: так табе і трэба, не сквапнічай. Нядобра гэта, праўда? Цяпер мне сорамна».

Дзіўна, што ў апошнія гады, у старасці, асабліва пасля смерці мужа, Галя стала гэткай жа шчодрай, як і сестры яе. Дачка яе, Рая, выйшла замуж у Кіеў, мае дваіх дзяцей. Бабуля ўсё адсылае ўнукам. Жыве пры шашы Ленінград — Кіеў. Выбірае мяшок ранняй бульбы, выносіць на шашу, спыняе грузавік, дае шаферу пляшку самагонкі, якую ўмела гнаць, і просіць завезці дзецям бульбу. І вельмі ж радуецца, што «бабу Галю ні разу не ашукалі» — усё акуратна дастаўлялі. Нават сала. Во час настаў!

Калі мела сілу, вырошчвала свіней, калола парася, пісала нам: «Прыязджайце па сала, у вас жа свая машына». Але хто цяпер есць сала?! Зяць яе, слесар, і той на сала не глядзіць. Ды і ёй не столькі сала хочацца аддаць, колькі лішні раз пабачыць кагонебудзь з сясцёр. І мяне. Любіць са мной пагутарыць.

Пасёлак Новая Гута, у якім яна жыве (незадоўга да смерці іван яе, спявак, выпівоха, але нястомны працаўнік, збудаваў новую хату), дажываў свае дні — заставаліся адны старыя. Ды раптам побач, каля Краўцоўкі, збудавалі гіганцкі свінагадоўчы комплекс — на 108 тысяч галоў. Жылы масіў «пасадзілі» ў Новай Гуце. І 70-гадовай жанчыне вельмі ж падабаецца мнагалюднае, бадай жа гарадское жыццё. «Каб ты ведаў, Іван, як памірaць не хочацца,— казала Ганна Філатаўна мне пры апошняй сустрэчы.— Усё пад бокам: магазін, кіно, школа».

«А школа табе навошта?»

«Вельмі ж люблю глядзець, як дзеткі ў школу ідуць. Як званочак звініць. Стаю, гляджу, слухаю і плачу. Ад радасці. Ці, можа, ад таго, што памірaць не хочацца?» — гэта ўжо з гумарам.

Сутнасцю Вольгі праз усё жыццё яе было памагаць іншым — сваім, чужым. Людзям увогуле. Сама шкадавала з'есці лішні кавалак, купіць навейшую хустку, а сестрам, пляменнікам, унукам, супрацоўнікам, суседзям магла аддаць апошняе.

Калі ў верасні 1943 года прыйшло вызваленне, у гаспадарцы Філата Кротава ацалеў адзіны бычок — леташак. Вольга і Маша аддалі яго чырвонаармейцам, убачыўшы, якія яны стомленыя: за два месяцы з-пад Курска дайшлі, з суровымі баямі.

Аднаўлялася жыццё ў раёне — і Вольга тут жа вярнулася ў Церахоўку, разумеючы, як у вайну вырасла значэнне яе паштарскай службы. І зноў пачаліся яе паездкі, паходы ў рэдкія выхадныя, у святочныя дні ў Церуху, у Новую Гуту. Пакуль ішла вайна і ў першыя пасляваенныя гады больш было паходаў, бо паязды хадзілі

неакуратна, а шафёры спадарожных машын не саромеліся браць плату не па яе грашах. Патрэбна было ашчаджаць кожную капейку. Не для сябе. Для блізкіх. У Церусе засталася малая Клава, вучаніца школы. Там жа ў бацькавай хаце жыла хворая Моця з двухгадовай дачкой Тамарай. Моця да вайны яшчэ выйшла замуж і жыла ў Навабеліцы ў свякрухі. Адступаючы, гітлераўцы пагналі яе з дзіцем, як і многія тысячы іншых, на захад — у рабства. Гналі пехатой, босых, раздзетых. Недзе ажно за Пінскам, у палескіх балотах групе жанчын удалося ўцячы, вярнуцца пад Мазыр і там сустрэць Чырвоную Армію. Але ад усіх перажыванняў жанчына цяжка захварэла — пачаліся прыступы эпілепсіі. Нават настаўніцай працаваць не здолела, мусіла пайсці на пенсію. А якая там пенсія была ў той час, ды яшчэ чалавеку без стажу работы! Капейкі. Між іншым, муж Моці, Папкоў, вярнуўшыся з вайны і ўбачыўшы, што жонка хворая, пакінуў сям'ю і схаваўся недзе ў Прыбалтыцы, каб не плаціць аліменты. Але яго і не шукалі. Вырасла Тамара і без яго. Вольга выгадавала. Я трохі памог, калі вучылася. Цяпер яна мне памагае.

Дарэчы, жыццё пакарала Папкова. Калі Тамара канчала ўжо сельскагаспадарчую акадэмію, бацька, цяжкахворы, прыехаў да яе і ў інтэрнаце на каленях прасіў дараваць яму. Запрашаў у Рыгу, дзе ў яго свой дом, палавіну якога ён мае права «адпісаць» ёй. Даваў грошы. Тамара ад усяго адмовілася. Але прыезд бацькі так узрушыў яе, што яна тыдні два не магла займацца, прыехала да нас у Мінск, і мы з Машай яе суцяшалі. І да Вольгі ездзіла. Ледзь супакоілася дзяўчына.

...Вользе не толькі трэба было хадзіць да хворай Моці, да малых — Клавы і Тамары. Памагчы ім у гаспадарцы, прынесці частку свайго пайка. Не магла старэйшая сястра мінуць і Машу, якая рабіла фельчарам у Маркавіцкай бальніцы і жыла разам з трохгадовай Лінай. Маркавічы на паўдарозе ад Церахоўкі да Церухі, але трохі ўбаку, з заходам туды набіралася дарогі на добрых сорак кіламетраў. У лясах блукалі яшчэ былыя паліцэйскія, дэзерціры. Але нікога жанчына не баялася. Дарэчы, гэтак жа смела паводзіла сябе і Маша. Адзін час яна загадвала аптэкай і на бальнічным кані ездзіла па лякарствы ажно ў Гомель. Праўда, з фурманам. Вярталіся звычайна позна ўвечары.

«Чамусь я зусім не баялася дэзерціраў. Я зневажала іх і лічыла, што гэта яны павінны дрыжаць перад кожным сумленным чалавекам. А калі ў Гомелі двойчы папала пад бамбёжку, то — ой, як! — спалохалася. Дзіўна, у акупацыі нічога не баялася. А тут апанаваў

страх. Ведала ж ужо, што ты жывы. Сустрэчы чакала. Ад таго і жыць вельмі хацелася».

25 жніўня

Старасць — гэта калі знікае ці ва ўсякім разе зніжаецца, прытупляецца паэтычнае ўспрыняцце свету — прыроды, людзей, кахання, перастаюць хваляваць успаміны маленства, юнацтва. Парадаксальна, што ўспаміны гэтыя ўсплываюць часцей, чым у 30 — 40 гадоў, але цяпер яны зусім іншай якасці — рацыянальныя, філасофскі разважлівыя і ў большасці выпадкаў не прыводзяць да эмацыянальнага ўзрушэння. Я пісаў ужо, з якой усхваляванасцю прыязджаў у мясціны свайго маленства ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе — гадоў да сарака. Мяне цягнула і ў Кляцянку, дзе пачалося свядомае маленства, тое, што запомнілася, і ў Краўцоўку, дзе вучыўся ў першых класах школы. З незвычайным хваляваннем хадзіў па лясных дарогах, дзе, здавалася, яшчэ быў знаёмы кожны корань, аб які збіваў босыя ногі, з асалодай купаўся ў Церусе каля Пыхані, менавіта там, у лесе, было асабліва прыемна акунуцца ў сцюдзёнай вадзе, халодная яна там была ў самую вялікую спёку, бо рэчку абступалі вольхі. У Пракопаўку цягнула, дзе рабіў настаўнікам. І ў Карму, дзе нарадзіўся...

І вось зноў наведаў родныя мясціны. Усклаў кветкі на магілы бацькі, маці, Галі, яны пахаваны побач. Сумна зрабілася не ад таго, што іх няма,— ад думкі, што і ўласнае жыццё праляцела і набліжаецца да фінішу. Аднак захацелася, як ніколі раней,— наведаць цётку Мар'ю, сястру бацькаву, ёй ужо 75. Адчуў як бы віну перад ёй, хоць сям'і гэтай, няўдалай, беднай, памагаю амаль увесь пасляваенны час, настойлівыя просьбы братоў маіх, якім па пяцьдзесят ужо, часам і раздражнялі. Адчуў няёмкасць, што колькі гадоў ужо як бы адкупляюся грашамі, пасылкамі. А штогод прыязджаю на магілы бацькоў і праязджаю міма Кармы. Не трымцела ніводная струнка, калі з новай шашы я бачыў знаёмую званіцу царквы і ўжо незнаёмыя абрысы сяла: набудавана многа новага, цагляных дамоў, ферм, сіласных веж. Аднойчы прыехаў, але быў перахоплены былым старшынёй калгаса Шукайлам, і тут жа паехалі ва Уборак, на ўзлесак таго ўрочышча, дзе леснікаваў бацька, на пасеку, дзе ўжо былі іншыя госці з Добруша, з Гомеля.

Наведванне цёткі пакінула цяжкое ўражанне. Беднасць, нягледзячы на маю дапамогу, глядзела з кожнага кута. Хацінка старэнькая, трухлявая. З'явілася злосць на братоў: гультаі, абібокі! Маглі б хоць нешта падладзіць, навесці парадак у двары, у хаце. Але што папра-

каць іх? Урэшце, адзін з іх, Шура, сапраўды хворы з маленства. Уразіла, што ў старасці цётка вельмі ж стала падобная на брата свайго — майго бацьку. У маладосці гэта неяк не заўважалася.

Але больш, чым цётчына беднасць, узрушыла і, бадай, абурыла іншае. Карма — сяло вялікае, некалькі вуліц. Па вуліцы, на якой я нарадзіўся, пакладзены асфальт, яна стала цэнтральнай. І хаты на ёй мелі заможны выгляд — акуратныя агародчыкі, пафарбаваныя парканы. А цётка — на суседняй, паралельнай, вуліцы, якая раней называлася Давыдаўкай, а цяпер — Чапаева. Вуліца гэта бліжэй да паплавоў, ніжэй, гароды там у дажджлівае лета вымакалі, а ў сухое давалі багаты ўраджай. Але сама вуліца, даволі шырокая (у Карме ўсе вуліцы шырокія), заўсёды была зялёнай, зарослай травой, на ёй пасвіліся гусі. Цяпер вуліца ашаламіла страшэннай недагледжанасцю. Разбітая машынамі на ўсю шырыню, ад агародчыка да агародчыка... Лужы, гразкія мясціны захламлены бог ведае чым — кавалкамі шыферу, бетоннага друзу, старымі шынамі... Лета сухое. Дзень спякоткы.

Нават за маёй «Волгай» уздымалася хмара пылу. Рэдкія кветкі ў агародчыках шэрыя ад пылу. Шэрыя хаты. Старыя, струхлелыя. Зусім не падобныя на тыя, што стаяць за нейкія трыста метраў — адлегласць двух гародаў — на вуліцы Кірава, што была Шкабараўкай (ёмкія назвы давалі!), дзе пакладзены асфальт.

Праехаўшы па вуліцы, што носіць імя легендарнага героя, я, здаецца, яшчэ глыбей зразумеў, чаму моладзь уцякае з вёскі. Сапраўды, жыць на такой вуліцы не хочацца. Між іншым, розніца паміж дзвюма суседнімі вуліцамі нават аднаго сяла, аднаго калгаса — тыповы ўзор паказухі. Там, дзе ездзіць начальства, праязджаюць штодзень шматлікія падарожнікі з Украіны, з Браншчыны,— усё дагледжана, багата. А ўбаку...

Наконт таго, чаму моладзь уцякае нават з лепшых калгасаў. Думаю, што гэта, можа, адзіны ў гісторыі чалавецтва выпадак, калі псіхалогія людзей, іх культурныя запатрабаванні аказаліся наперадзе і вышэй матэрыяльных умоў жыцця. У вёсцы. Тут грунтоўна папрацавалі літаратура і асабліва кіно і тэлебачанне. Ідэалізацыя, лакіроўка, прыгажосць быту, які мы паказвалі, далі свой плён. Станоўчы. Але законы дыялектыкі бязлітасныя. За ўсё трэба плаціць. За імкненне людзей да прыгожага жыцця, да цывілізацыі плацім спадам сельскагаспадарчай вытворчасці. Тут выбірай: або Давыдаўка і сала, або асфальт, модныя басаножкі...

Усё часцей зайздрошчу людзям простым, як тая ж Вольга Філатаўна, якая пражыла свае 68 гадоў без усялякіх прэтэнзій, у працы, у клопаце пра іншых — сваіх і чужых.

Учора з раніцы яна паехала на магілу Клавы. Прайшло восем гадоў, як памерла самая малодшая сястра. Вольга бадай што не прапусціла ніводнай нядзелі, каб не наведацца на яе магілу. Калі я вадзіў машыну, то адсюль, з дачы, падвозіў яе на могілкі. Мне гэта было нялёгка. Могілкі на мяне робяць цяжкае ўражанне. Магілы блізкіх людзей — а Клава была блізкім чалавекам і для мяне — глыбока хвалююць. Але калі я наведваюся на магілы бацькоў, Галі, адзін, без старонніх, ці з людзьмі, якія не выяўляюць асаблівых пачуццяў, такой эмацыянальнай узрушанасці не бывае. З Вольгай Філатаўнай — цяжка. Кожны раз яна падае перад магілай сястры на калені. А калі пачынае любоўна і ласкава хусцінкай выціраць барэльеф на помніку і цалуе бронзавы воблік сястры — я з поўнымі слёз вачамі хаваўся за бліжэйшыя бярозы, за абеліскі. Пасля, калі садзіўся за руль, у мяне дрыжалі рукі, я баяўся весці машыну.

Клаве, якая зусім не помніла маці, Вольга аддавала большую долю сваёй сястрынскай любові. Ды і ўсе старэйшыя праяўлялі да малой найбольшы клопат, аднак зусім не песцілі так, як песцяць зараз унукаў. Рабілі ўсё, каб дзяўчына не адчувала свайго сіроцтва, але працаваць навучылі. Клава, дарослая ўжо, неяк прызналася, што сіратой сябе адчула, калі бацька прывёз у хату мачаху. Мачаха не крыўдзіла, але па ўсіх расказах адчувалася, што два гады жыцця з ёй былі для ўражлівай, чулай школьніцы цяжкімі. Пасля — вайна. Яна перапыніла радасць вучобы; з першага класа Клава вучылася вельмі старанна, гэта пры тым, што пасля ад'езду Вольгі і да з'яўлення мачахі на ёй, малой, ляжала ўся хатняя работа — выпаліць у печы, накарміць жывёлу, курэй. Клава расказвала, што пад час акупацыі яе найбольш страшыла думка, што давядзецца назаўсёды развітацца з вучобай. Безумоўна, страшыла і ўсё іншае, што тварылася навокал. Але вяртанне ў хату старэйшых сясцёр, брата прынесла адчуванне бяспекі. Яны зноў, як і тады, калі яна была маленькай, бераглі яе ад усіх няшчасцяў. Ва ўсякім разе яна не помніць выпадкаў, каб ёй што-небудзь пагражала, акрамя, безумоўна, тых, што пагражалі ўсёй сям'і, усім вяскоўцам: бамбёжкі, артабстрэлы, сядзенне ў «акопах» у лесе, калі набліжаўся фронт. Карнікі, адступаючы, злосна распраўляліся з насельніцтвам. Некаторая частка церушан не схавалася ў лесе, засталася ў вёсцы. Усіх іх, сорак восем чалавек, загналі ў драўляную царкву і спалілі. Не злітаваліся і над сем'ямі паліцэйскіх.

Я, знаходзячыся ў Кандалакшы, прачытаў пра зверскую акцыю ў Церусе ў артыкуле Ілы Эрэнбурга і вельмі моцна перажываў. Не знайшоўшы Машу ў эвакуацыі, хоць разоў колькі звяртаўся па радыё, я здагадваўся, што перажыць усю навалу яна магла толькі ў бацькавай хаце. На шчасце, першае ж маё пісьмо знайшло жонку: Вольга ўзяла яго на пошце і сама прынесла Машы; здаецца, і пісаў я Вользе, спадзеючыся, што ацалела яна, старэйшая, беспартыйная.

Аднак пра Клаву.

Вызваленне, акрамя ўсяго іншага, прынесла ёй радасць адразу ж, у тую векапомную восень: яна пайшла ў школу. Але зноў засталася ў хаце толькі з бацькам. Хоць у хлявах было пуста, але для школьніцы працы хапала: прапаліць, штось згатаваць, а гэта вельмі нялёгка, калі няма з чаго гатаваць, прыбраць, а вясной, калі самы адказны час у школе,— урабіць гарод; ад таго, што там будзе пасеяна, як дагледжана, залежыць ураджай, а гэта — і само жыццё і вучоба. Безумоўна, па нядзелях прыходзіла Вольга, узвальвала частку работы на сябе. За час акупацыі трохі больш рухлівым гаспадаром зрабіўся бацька. Аднак па-ранейшаму заглыбляўся ў сваё рахункаводства і ў чытанне кніг. У акупацыі на ім ляжала адказнасць за жыццё, за лес дзяцей. А вярнуліся яны да сваіх прафесій — на пошту, у медпункт, у школу,— і ён супакоіўся: пры іх працавітасці будуць жыць і Клаве памогуць так, напэўна, разважаў стары.

Толькі ўдумаўшыся, ведаючы, помнячы той час, можна ўявіць, як нялёгка было пятнаццацігадовай дзяўчынцы весці гаспадарку і вучыцца. Але вучылася яна на «выдатна», у класе была першай вучаніцай.

Клава была ашчадная. Нават і пазней, стаўшы ўрачом, была такая ж ашчадная, як і Вольга. Менш ашчадная з іх Маша, цяпер нават схільная да марнатраўства. Ад таго, што раней пабагацела? Не, гэта характар. І філасофія. Яе нязменны жарт: «Менш багацця — лягчэй паміраць». Часам яна палохае мяне сваёй шчодрасцю: гатова раздаць усё.

У сорак пятым вярнуўся Мікалай, за год знаходжання на фронце тройчы паранены, апошні раз цяжка — у галаву. Клопатаў юнай гаспадыні прыбавілася. Хворага брата трэба было як можа лепш карміць. Мікалай слеп, гэта сясцёр вельмі палохала. Слеп да таго часу, пакуль яму не ўдалілі параненае вока; толькі, застаўшыся з адным вокам, ён пачаў патроху ачуньваць.

Як нялёгка жылося Клаве, але была ў яе радасць — вучоба. І светлая мара — вучыцца далей.

У першы пасляваенны год яна стала студэнткай Гомельскага медыцынскага вучылішча, таго, якое за два гады да вайны скончыла Маша, толькі тады яно называлася тэхнікумам.

У 1946-1947 гадах нават мы з Машай, настаўнік і фельчар, жылі так, што на стале не кожны дзень быў хлеб, тагачасны — з прымесямі ячнай, аўсянай мукі, бульбы, па сутнасці, з мякінай, бо прасявалі такую муку не на сіта, а на самае рэдкае рэшата. Між іншым, на паёк часам прадавалі не муку, а збожжа, яго трэба было змалоць. Малолі ў жорнах, бо млын, здаецца, меўся толькі ў Грабаўцы ці Церусе. Не панясеш жа туды 18 кіло аўса! Далёка. Завозна.

Круціць жорны вельмі цяжка. Машы адной не па сіле. Хадзілі ўдваіх. Гіомню, што для мяне гэта была самая пакутлівая работа. Не толькі з-за цяжкасці. Яна абражала мяне. Жорны меліся не ў кожнага. У гаспадара, да якога мы хадзілі малоць, былі мае вучні. Яны глядзелі, як настаўнік абліваецца потам, і — што думалі? Гаспадар пасміхаўся: «Весялей круці, Пятровіч!» Мне здавалася, што занятак такі, як нішто іншае, падрывае і аўтарытэт настаўніка, і аўтарытэт сакратара партарганізацыі. Але, як кажуць, голад — не цётка. Сам, можа, неяк і перабіўся б, але калі няма чым накарміць дзіця — чаго ні зробіш.

Магчыма, сама Клава не перажывала занадта ўжо драматычных момантаў з харчаваннем: студзнтам усё ж выдаваліся нейкія картачкі і ў горадзе яны атаварваліся больш-менш акуратна. Але помню, як калацілася Вольга — «Як там Клавачка?», як дзяліла яна і сваю зарплату, і свой бедны паёк паштавіка, як хацелася ёй накарміць адной буханкай усіх. І не толькі сваіх блізкіх. Цяпер мне здаецца, што гэта ёй удавалася, як Ісусу Хрысту,— з-за яе любові да людзей.

Праўда, жыццё наладжвалася з надзвычайнай хуткасцю, я сказаў бы, з казачнай — пасля такой вайны, такіх разбурэнняў! У снежні 1947 года адмянілі картачную сістэму. Цэны трымаліся высокія, але купіць можна было любыя прадукты, самыя далікатэсныя. А я пачаў друкавацца, атрымоўваць ганарары. Мы з Машай мелі магчымасць памагчы Клаве. Стараліся аддзячыць Вользе, але гэта рэдка ўдавалася: ёй ніколі нічога не трэба было, усяго ў яе хапала — для сябе.

Раней такі аскетызм яе здаваўся часам мне фанатычным. Цяпер я думаю інакш: у гэтым — сэнс яе жыцця і, вельмі можа быць, найвялікшая радасць яго. У працы. і ў тым, што заўсёды рабіла дабро людзям.

Клава скончыла вучылішча з адзнакай і трапіла ў лік «пяціпрацэнтнікаў», што мелі права на паступленне ў інстытут. Вагалася: зноў спадзявацца на дапамогу? На чыю? Брат ажаніўся, гаспадыняй у бацькавай хаце стала нявестка, чакала дзіця. У нас павінна было

нарадзіцца трэцяе. Не ведаючы маіх заробкаў, хіба магла яна разлічваць на нашу дапамогу? Значыцца, зноў — Вольга?

Але менавіта Вольга, у першую чаргу, пасля ўжо мы з Машай, угаварылі Клаву пайсці ў інстытут, у медыцынскі. Не сумняваюся, што, каб Вольга мела магчымасць вучыцца, яна выбрала б сабе гэтую ж прафесію — фельчара, акушэркі, урача.

Маша прагна марыла таксама паступіць у медінстытут і напэўна паступіла б, каб там было вячэрняе аддзяленне. У 1951 годзе, праз год пасля паступлення Клавы, Маша, маці траіх дзяцей, з поспехам здала экзамен на вячэрняе аддзяленне педінстытута — на факультэт літаратуры і мовы. Пасля сямі класаў і медвучылішча! І вельмі здзіўлялася, што паслявaенныя выпускніцы сярэдняй школы, якія вучыліся разам з ёй, не разумеюць элементарных рэчаў, а галоўнае, не маючы ні дзяцей, ні мужоў, не выконваюць прасцейшых заданняў, ледзь цягнуць на тройкі.

Сёстры вучыліся апантана. Машыны поспехі ў вучобе пры траіх дзецях здзіўлялі маіх калег, у прыватнасці Андрэя Макаёнка.

Клава жыла ў нас. Першы год яе вучобы, пакуль мне не выдзелілі асобнай кватэры, жылі мы цесна: займалі адну кватэру разам з Кулакоўскім — па два пакойчыкі-клетачкі, у мяне — шэсць душ і ў яго шэсць. Тузіна на 44 квадратныя метры. Але жылі мы дружна і весела.

Праўда, з Клавай у гэты першы год мелі клопат. Калі прыходзілі госці — маладыя шумныя пісьменнікі, а збіраліся яны часта, запрошаныя, незапрошаныя, часта невядома чые — мае ці Кулакоўскага, пілі, смачна елі, спрачаліся, спявалі, Клава забівалася ў куток, на кухню, у ванну, і пачынала плакаць. Машу гэта засмучала.

«Ну, чаго ты плачаш?»

Неяк прызналася:

«А я пра сваіх думаю. Як яны там? Як жывуць?»

Тады я не разумеў, і яе плаксівасць трохі злавала мяне, псавала настрой Машы. Цяпер разумею. Толькі эгаіст, сябелюбец, якому не баліць за іншых, легка пераходзіць з беднасці ў дастатак — абы яму было добра. Клава з маленства ведала толькі нястачу, але выхавалася ў клопаце пра блізкіх, пра людзей увогуле, мела выдатны прыклад у асобе Вольгі. Нялёгка было прымірыцца з пэўным кантрастам, пераадолець псіхалагічны бар'ер. Яна параўноўвала жыццё бацькі, Мікалая, Вольгі, Моці з нашым, і ёй рабілася крыўдна за іх, шкада іх. Але праз год «пакуты сумлення» яе скончыліся, не таму, што яна, як кажуць, «адаптавалася», не, хутчэй ад таго, што, пабыўшы на летніх канікулах дома, убачыла, што і там ужо жывуць не так бедна, як раней жылі яны, малыя. Мікалаевы раны патроху загаіліся, аперацыя

зняла галаўныя болі, і ён актыўным чынам уключыўся ў калгасную працу, здаецца, у гэты час загадваў фермай.

Пры незвычайнай занятасці вучобай, якая проста ашаламляла мяне (8-10 гадзін у інстытуце, у клініцы, пасля — не адну гадзіну дома над кнігамі), Клава хутка стала «свецкай дзяўчынай», гараджанкай у лепшым сэнсе. Яна знаходзіла час прачытаць навінкі мастацкай літаратуры, паглядзець фільмы, умела падтрымаць размову з любымі маімі гасцямі. З Андрэем Макаёнкам весела жартавала, адказваючы тактоўна на яго іскрысты, востры, але часам грубаваты гумар. Урэшце для будучага ўрача па-ханжаску «закрытых тэм» не магло існаваць.

Клава добра памагала гадаваць нашых дзяцей, без яе Машы даволі часта прыйшлося б прапускаць свае вячэрнія лекцыі.

Дыплом Клаўдзія Філатаўна атрымала з адзнакай. З яе мог бы атрымацца вучоны, з яе адданасцю медыцыне, з яе любоўю да людзей. Але я даўно заўважыў, што ў навуку падаюцца прагматычныя жанчыны, менш адданыя сям'і, эгаістычныя, самалюбівыя.

Клава паехала ў глыбінку — у Краснаполле Магілёўскае. Яна дружыла з хлопцам, які канчаў разам з ёй медвучылішча. Аркадзь Светагор хапіў ліха ў вайну: карнікі спалілі яго сястру, маці і брата загналі ажно ў Аўстрыю. Вярнуўшыся адтуль, маці хутка памерла. Добра, што ў Гомелі жыла цётка; яна памагла сіраце стаць на ногі. Але і ў самога Аркадзя была надзвычайная сіла волі, усё тая ж апантанасць у працы, у вучобе. Меўся, напэўна, і своеасаблівы хлапечы гонар: не адстаць ад дзяўчыны! Паспрабаваў паступіць разам з Клавай у медінстытут — не прайшоў па конкурсу, вучыўся ўсё ж слабей. Папрацаваў фельчарам у сяле. А на другі год падаўся ў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут.

Калі Клава праходзіла практыку ў інтэрнатуры, мы згулялі іх вяселле, у нашай кватэры, тады — ужо даволі прасторнай. Вяселле было немнагалюднае — чалавек трыццаць сваякоў, аднакурснікаў, але шчырае і вясёлае.

Успамінаю, што Андрэй, які быў за свата, сваёй дасціпнасцю так закахаў у сябе дзвюх маладых медычак, што яны трохі не счапіліся паміж сабой.

Аркадзь рабіў ужо аграномам у Краснаполлі. Гэта вызначыла Клавіна накіраванне пры размеркаванні выпускнікоў. Жонка яна была адданая, з тых, што гатовыя ехаць за мужам на край свету.

Маша, я, дзеці сумавалі без яе, мне не хапала чалавека, з якім за шэсць год так зрадніўся. Калі надышоў час Клаве раджаць, мы запрасілі яе да нас, у Мінск. У тым Краснаполлі не лепшае ў іх мелася жыллё, ды і ўвогуле пры сваіх спакайней. І ёй. І Машы. І Вользе. Яна

жыла ў нас тыдні тры да родаў, столькі ж, напэўна, пасля раддома, са сваёй дачушкай Наташай. Але ў клопатах пра малую — а маці яна была ажно залішне трапяткая — не забывала і пра мужа: як ён там адзін? Трэба дабірацца дадому. А дабрацца нялёгка. Наступіла вясна. Па тагачаснай дарозе ад Слаўгарада да Краснаполля не кожны грузавік мог прабірацца. А трэба правезці малое.

Прыехаў бацька нованароджанай. Дамовіліся, што да Слаўгарада павязём на маёй «Волзе», я толькі што перад тым купіў яе, з першай партыі. А ў Слаўгарад прыйдзе саўгасны «газік».

Я спыняюся на гэтым эпізодзе, які з мужчынскай пазіцыі і здалёк можа здацца малазначным, таму, што ўпершыню так блізка, як кажуць, увачавідкі, убачыў, як расце страх маці за дзіця.

У тую вясну была на рэдкасць высокая паводка. Да Бабруйска праз брукаваную шашу, выбітую, траскую, у колькіх месцах перакаталіся вірлівыя патокі. Клава не была оаязліўкай, а тут — як дрыжэла яна, нябога, калі машына ўваходзіла ў такі паток! Не збілася б, не апынулася б у кювеце!

Нялёгкай была яшчэ адна праблема: немаўлятка трэба перапелянаць у сухое. Прасіліся ў хаты, заходзілі ў медпункты. Спыніліся ў Дварцы — падбеглі бабулі: «Бацюшка ў царкве не хрысціць — холадна, у сваім доме...» Пасля, часта едучы з Наташай-школьніцай па гэтай дарозе, я жартаваў: «Вось тут, Наташа, мы цябе хрысцілі».

На пад'ездзе да Слаўгарада праз нядрэнную для таго часу «варшаўку» — цэлае возера. Нават грузавікі перацягваў трактар, бо захлыналіся маторы. Шафёры не параіліі цягнуць новенькую «Волгу» — можна парваць ды і кабіну залье.

Клава — у паніцы.

«Назад!»

«У Мінск? Зноў 250 кіламетраў з дзіцяткам?» — спалохаліся я і Аркадзь.

«Назад!»

Аб тым, што можна праехаць разліў у кабіне грузавіка, і слухаць не стала. А калі няма ў Слаўгарадзе «газіка»? Калі тут такая вада, то што ж там, у пойме Сожа?! Мора! І яна мела рацыю: «газік» у той дзень не прабіўся. Добра, што я ўзяў прафесійнага шафера, адзін везці не рызыкнуў.

Наступіла ноч. Стала цяжэй прасіцца ў хаты, каб перапелянаць малую. Апоўначы вярнуліся ў Мінск.

Тыдні праз два-тры я завёз іх у Магілёў, адтуль абласны аддзел аховы здароўя арганізаваў свайму ўрачу санітарны самалёт.

Несалодкім было Клавіна жыццё ў Краснаполлі. Але найбольшыя цяжкасці чакалі наперадзе.

Светагор паступіў у аспірантуру Інстытута эканомікі. Нейкі час жыў у Мінску адзін. Але што гэта за жыццё — муж у сталіцы, жонка з малым дзіцём у Краснаполлі! Пераехала і Клава. Але колькі было клопатаў з прапіскай, з уладкаваннем на работу! У той час я не меў яшчэ вялікага аўтарытэту, і мне прыйшлося нямала пахадзіць, каб атрымаць дазвол на перавод урача ў Мінск. Колькі трэба было патраціць энергіі, каб прабіць вядомую фармальна-бюракратычную формулу: «Не адрабіла свой тэрмін па накіраванню».

А праблема кватэры? Жыць у нас цэлай сям'ёй немагчыма, свая сям'я — дай бог. Знайсці прыватную з малым дзіцём — ох, як нялёгка было тады і засталося цяпер! Памог мой стрыечны брат Ігнат Міхайлавіч. Параіў жыць у маёй цёткі, якую я да таго не ведаў нават.

Клава рабіла ўчастковым урачом. Жылі цяжка. Але, жывучы ў вельмі цяжкіх умовах, Аркадзь у аспіранцкі тэрмін напісаў дысертацыю і паспяхова абараніўся. Яму прапанавалі пасаду навуковага супрацоўніка ў Інстытуце эканомікі. Неўзабаве далі кватэру. Пазней — больш прыстойную, там жа — у мікрараёне Курасоўшчына, побач з інстытутам. Жыццё патрохі наладжвалася. Расла Наташа. Рос па службе бацька яе. Клава заставалася ўсё тым жа ўчастковым урачом. Ей падабалася гэтая работа. Яе любілі людзі. Урач яна была выдатны — чулы, самаадданы, глыбокі ў ведах: у дыягназах памылялася вельмі рэдка. А хворыя такія якасці ўрача высока цэняць. Між іншым, асабіста я верыў ёй часам больш, чым некаторым прафесарам, што кансультавалі мяне. Яе лячэнне нярэдка давала лепшы эфект. Асабліва ўмела яна лячыць дзяцей, хоць, праўда, яе Наташка хварэла не менш за нашых дзяцей, пэўна, ад таго, што маці занадта дрыжала над ёю, занадта асцерагала.

Адным словам, стараннасць, працавітасць і мужа і жонкі былі ўзнагароджаны. Жылі не ў раскошы, але не горш за іншых інтэлігентаў, можа, нават і за некаторых з тых, хто зарабляў больш. Мелася невялікая, але дагледжаная, з густам абстаўленая, чыстая кватэрка. Уступілі ў садова-агародны кааператыў, збудавалі на ўчастку летні домік, будаваў сам Аркадзь з калегамі па рабоце.

Жыві, працуй, радуйся. Дык не ж... лёс бывае несправядліва жорсткі да добрых людзей. Прычапілася да жанчыны цяжкая хвароба — бранхіяльная астма. Ад чаго? Ад перагрузак у рабоце? Ад розных лякарсхваў — алергія? Пакутавала гады чатыры Клава страшна. Ні сама, ні калегі-ўрачы, прафесары, што вучылі яе ў інстытуце,— ніхто ўжо не мог даць рады.

Пасля мяне мучыла сумленне: здавалася, што я мог бы памагчы ёй лячыцца больш актыўна. Але я паспадзяваўся, што яна, урач, лепш ведае, што трэба — куды паехаць, да каго звярнуцца. А яна, відаць, з-за сціпласці сваёй не вельмі настойвала на актыўным лячэнні. Усё не хапала часу: работа, муж, дачка... Ёсць небяспечная асаблівасць хронікаў — яны прывыкаюць да сваёй хваробы.

26 чэрвеня 1975 года

Стаяла спякота — цяжка дыхаць. Але ў доме — радасць. Наташа здала апошні экзамен за школу, усё — на пяцёркі, як некалі і маці. Назаўтра — выпускны вечар. Колькі клопатаў у дачкі і маці!

(Дарэчы, Клава шыла сама, жыццё навучыла яе ўсё рабіць самой.) Клопатаў хапіла да поўначы — пасля нялёгкага ў спякоту рабочага дня на ўчастку. Недзе ўжо а дванаццатай гадзіне ночы памагла Наташы памыць галаву. Гарачай вады ўлетку не падавалі. Паставіла грэць ваду для сябе. Прысела за кухонным сталом адпачыць. І тут пачаўся прыступ. Каб зняць яго, удыхнула з інгалятара астмапэн. І... упала галавою на стол. Закрычала Наташа. Ускочыў на кухню Аркадзь. Але што яны маглі зрабіць? Пакуль прыехала «хуткая», чалавек памёр. Так раптоўна! Так недарэчна! На сорак шостым годзе жыцця! Самая малодшая з вялікай сям'і.

Мяне не было ў Мінску, калі здарылася гэтая трагедыя. Праходзіла Дэкада беларускай літаратуры і мастацтва на Украіне. Дзесяць дзён яркага іскрыстага свята дружбы і еднасці! Прымалі нас з украінскім размахам і гасціннасцю. З-за спякоты нялёгка было ездзіць з горада ў горад, выступаць. Але цяжкасці адступалі перад радасцю сустрэч.

Чаму раптам Маша вырашыла не паведамляць мне, не выклікаць на пахаванне? Ашчаджала? Баялася за маё сэрца?

Між іншым, Вольгі Філатаўны таксама не было — мы ледзь не сілком адаслалі яе палячыцца ў санаторый у Друскенінкай. За Вольгай раніцой паляцеў Саша, таксама баяліся, што адна яна не дабярэцца, самлее дзе-небудзь у дарозе. Вольга ўбачыла Сашу, выгляд усё сказаў. Але, ведаючы пра хваробу малодшай сястры, яна не падумала, што няшчасце з ёй. У таксі да Гродна і ў самалёце трымалася мужна. Прытомнасць страціла каля труны. У яе не толькі сястрынскі боль, але і матчын: яна вырасціла сірату, аддавала ёй і апошні кавалак, і ўвесь жар матчынай любові.

Таццяна наша, высокаадукаваны чалавек, здаецца, чулая душа, неяк спытала: «Чаму цёця Оля кожную нядзелю ездзіць на могілкі?» Машу пакрыўдзіла да слёз такое доччына неразуменне. Маша таксама

наведвае магілу сястры амаль штотыдня. Я іх разумею — і Вольгу Філатаўну і жонку сваю.

Я прыляцеў на другі дзень пасля пахавання Клаўдзіі Філатаўны. Прыляцелі мы з Андрэем Макаёнкам першым рэйсам. Нас сустрэлі Таня і Саша. Узбуджаны святам, гасціннымі провадамі, я — дараваць сабе не магу! — па выгляду дзяцей не зразумеў, што ў доме бяда. Сусед мой па кватэры Іван Навуменка, які не трапіў на самалёт, папрасіў перадаць сям'і, што ён прыляціць наступным рэйсам. Таму я рваўся на гарадскую кватэру — выканаць даручэнне сябра. А дзеці адгаворвалі і прасілі адразу ж ехаць на дачу, яны трымалі таксі. Не ведаю: мелі яны даручэнне ад маці не казаць мне ў аэрапорце, на людзях, ці самі баяліся? Макаёнку яны сказалі, пакуль атрымоўвалі багаж. І ён прапанаваў «нейтральны» варыянт: заехаць да яго на кватэру.

Ад яго я пазваніў Ядвізе Паўлаўне Навуменка. Яе, безумоўна, здзівіў мой бестурботны бадзёры голас. Яна не сцяміла, што я не ведаю, сумна сказала: «Гэта ж трэба — такое няшчасце з сястрой Марыі Філатаўны».

«З якой?»

«Як? Вы не ведаеце?! Пахавалі ж учора Клаву». Такі нечаканы пераход ад радаснай узбуджанасці да звесткі аб смерці блізкага чалавека так ашаламіў, што, ціха паклаўшы трубку, я нейкі момант сядзеў у страшным утрапенні. Дзеці і Андрэй са страхам глядзелі на мяне. А потым я істэрычна зарыдаў.

Яшчэ цяжэй я зарыдаў, убачыўшы Машу. Яна мужна трымалася і, як магла, суцяшала мяне. Баялася Маша за Вольгу: яна засталася на кватэры і стаяла на каленях перад жалобным партрэтам сястры, траціла прытомнасць. Званіла Наташа, прасіла забраць цёцю Олю. Наташы, напэўна, здавалася, што ў адзіноце, не бачачы цяжкіх сцэн, яна хутчэй суцешыцца. Наташа не плакала на людзях. Яна плакала ў адзіноце.

За Наташу цёткі баяліся. Дзяўчына страціла цікавасць да жыцця. Ледзьве ўгаварылі яе паступаць у інстытут. І яна — малайчына: праз месяц пасля смерці маці паспяхова вытрымала конкурс на вельмі прэстыжны факультэт — архітэктурны. Харошы архітэктар расце. Сама ўжо маці: год назад з'явілася маленькая рыжанькая Насця. І яна калоціцца над дачкой гэтак жа, як над ёй самой калаціласяе маці.

Вольга і Маша ўдзячныя Аркадзю за тое, што не прывёў Наташы мачаху. Яны абедзве замянілі ёй маці — і тады, калі яна вучылася ў інстытуце, і цяпер, калі яна сама маці, і яе апякаюць і бацька і муж, таксама архітэктар. Але няхай толькі Наташа захварэе — Вольга кіне

ўсё і ў любое надвор'е, у дождж, у спёку, у завею, праз увесь горад ці са Ждановіч, паляціць да пляменніцы. І гэта заўсёды мяне кранае.

Пра такога чалавека, як Вольга, варта было б напісаць раман. Я даўно думаў пра гэта. Нейкія рысы яе здзіўляючага характеру пісаў у іншых жаночых вобразах. Але на раман ніяк не мог выйсці. Усё «закручваў» сюжэты. А гэта павінен, напэўна, быць раман-хроніка сямейная, без вострых канфліктаў паміж членамі сям'і і нават без асаблівых сацыяльных канфліктаў. Праца, пераадоленне цяжкасцей жыцця, узаемадапамога, сумленнае стаўленне да людзей, да часу, да гісторыі, сяўба добрага, вечнага. Такія людзі ствараюць духоўную атмасферу грамадства. Часам я параўноўваю сябе з Вольгай. Амаль заўсёды — не ў сваю карысць. У мяне вышэй адукацыя. Але ці заўсёды матывы маіх учынкаў, самых добрых, былі такія ж шчырыя і бескарыслівыя, як у Вольгі? Нямала ў маіх учынках і эгаістычнага было. Цяпер — менш. Яшчэ больш эгаізму ў дзяцей нашых. Шкада, што ніхто з іх не пераняў тое лепшае, чым вызначалася жыццё маці і цёткі. Выхаванне? Умовы? А гены дзе? Нярэдка і ў беднасці душы чарсцвеюць. У Кротавых жа нягоды жыцця выхавалі найлепшыя з тых маральных якасцей, якія варты пераймання.

Баюся, што гэтыя дзённікава-мемуарныя нататкі не памогуць, а, наадварот, перашкодзяць мне напісаць такі раманхроніку з вобразамі добрых, працавітых людзей.

Між іншым, як бы падрахоўваючы сваю творчасць, узважваючы зробленае і тое, што не ўдалося здзейсніць па розных прычынах, я са смуткам прыходжу да высновы: як многа добрых задум не рэалізавана. Сюжэты, што раптоўна з'яўляліся і хвалявалі, але адкладваліся ў запаснік, як правіла, выцясняліся іншымі, больш актуальнымі, а то і проста забываліся — абставіны, хады, дэталі выпадалі з памяці. Гадоў дваццаць назад ці, можа, і больш я было загарэўся напісаць аповесць пра армейскіх разведчыкаў — па расказах Мікалая. Складваўся даволі цікавы сюжэт. Цяпер, каб і захацеў, рэчы такой я не напішу. Зенітчык, я не ведаю жыцця перадавой, тым больш — дзейнасці разведчыкаў-пехацінцаў. А самыя яркія, цікавыя дэталі Мікалаевых расказаў забыліся. Ды цяпер і ён расказвае не так эмацыянальна, больш скупа, неахвотна. Забыўся сам? Ці хвалююць іншыя праблемы? Праблемы дзяцей. І глабальныя, сусветныя — у большай ступені, чым, напрыклад, праблемы саўгаса, хоць параўнаўча нядаўна пры сустрэчах галоўнае, пра што ён расказваў,— гэта справы ў саўгасе, сельсавеце. Салдат, інвалід, пенсіянер, які, аднак, застаецца селянінам, у 60 год зрабіўся філосафам і палітыкам.

Мікалай у нечым натура больш простая, а ў нечым, магчыма, больш складаная, чым сестры яго. Яго, адзінага хлопца ў сям'і, малога песціла маці. Ды, напэўна, і бацька пры ўсёй незвычайнай скупасці выяўлення сваіх пачуццяў да дзяцей сыну не мог не аддаваць больш ласкі; сын — адзін, а дачок — пяць.

Безумоўна, Вольга, прыняўшы на сябе матчыны абавязкі і адказнасць за малодшых, брату таксама аддавала найбольш увагі. І з-за любові сваёй. І з-за характеру яго. А характар у Колі, расказвае яна, з малых гадоў быў нялёгкі — хлопец рос упартым, непаслухмяным, нікому не жадаў падначальвацца — ні бацьку, ні сестрам, ні настаўнікам. Урэшце, думаю, гэта не такі ўжо выключны выпадак, каб, напрыклад, тлумачыць яго спадчыннасцю ад дзядоў ці бацькоў. У такім узросце амаль усе мы, хлопцы, вызначаемся падобнымі рысамі. Я пісаў пра сябе — якім быў у пятым класе, кал і вучыўся ў той жа Церусе.

Коля рана пачаў курыць, лазіць па чужых садах, прапускаў заняткі ў школе. Натуральна, што вучыўся ён далека не з такой стараннасцю, як Маша і Клава. Таму пасля сёмага класа і пайшоў у вучылішча ФЗВ, так называліся цяперашнія НТВ. Вучыўся на электрыка. Паехаў на працу ў Заходнюю, у Ліду. Думаю, што ўжо там, пасля таго як юнак пазнаў «радасці» самастойнага жыцця ва ўмовах асяроддзя, якое жыло яшчэ па законах старога свету, прыйшла да яго поўная сталасць, разумение каштоўнасцей ранейшага жыцця, і характар яго ўвайшоў у сваё натуральнае рэчышча.

Мікалай бадай з гневам расказвае аб гаспадарах, у якіх прыйшлося наймаць куточак на мізэрны заработак вучня, практыканта. Але ён заўсёды з цеплынёй успамінае паляка — машыніста электрастанцыі, які, напэўна, убачыў у памочніка сур'ёзную цікавасць да справы, стараннасць і па-бацькоўску памагаў асвоіць пачэсную прафесію электрыка-машыніста генератара.

«Хоць маліўся не нашаму богу, а — Чалавек»,— трохі наіўна заключыў Мікалай расказ пра свайго настаўніка. Гэты ж машыніст, калі прыйшлі немцы, параіў камсамольцу хутчэй падавацца да сваіх, у родныя мясціны.

Гомель доўга абараняўся. Перайсці лінію фронту, дзе ішлі жорсткія баі, было нялёгка, і Мікалай больш месяца дабіраўся з Ліды да Церухі.

Ад'язджаў з дому калючы падлетак, а праз год вярнуўся сталы мужчына. Навучыла жыццё і вайна. «Не пазнаць было Колю»,— расказвала Вольга. Гаспадар! Ён значыў у хаце больш, чым бацька,

які хоць і адчуваў сваю адказнасць за дзяцей, але ўсё ж быў як бы староннім — больш блукаў па лесе, чым рабіў на сваім полі.

Мікалай араў, сеяў, а галоўнае — бандарнічаў, што дало магчымасць вялікай сям'і пратрымацца ў першы год акупацыі, калі пасля фронту, ды пасля мачахі, якая пакінула іх і прыходзіла і прыхапіла амаль усе запасы, у каморах, у свірне «гуляў вецер». Трохі сабралі бульбы на калгасным полі, якое раздзялілі. Кротавым выдзелілі самую пустую паласу; тыя, хто дзяліў, казалі: «Яны пры балышавіках нажыліся. Бач, усе ў навуку пайшлі». Як жылі, як вучыліся — гэта іх не цікавіла, зайздросцілі, што вывучыліся.

Думаю, што толькі скрытнасць Філата Азаравіча, які меў сувязь з партызанамі, яго оацькоўская асцярожнасць — не ўцягваць дзяцей у небяспечную справу — перашкодзілі Мікалаю пайсці ў партызаны. Маша расказвае, што брат марыў пра гэта, адной ёй прызнаўся, што шукае партызан — нямала паблукаў па лесе. Пра партызан многа гаварылі, але ў такое вялікае сяло, як Церуха, на магістральнай шашы, з паліцэйскім гарнізонам, яны не адважваліся заходзіць. Партызаны — атрад А. Д. Рудака — базіраваліся за Сажом, у міжрэччы. Адтуль, пад час карных аперацый, яны часцей адыходзілі ў партызанскую зону — у васілевіцкія і хойніцкія лясы.

Церуха — на самай мяжы з Украінай, і ў недалёкіх лясах дзейнічалі чарнігаўскія партызаны. Безумоўна, для партызан не існавала тэрытарыяльнага падзелу. У баявых аперацыях. Але падпольныя райкомы, абкомы вялі работу з насельніцтвам, як правіла, у межах сваіх адміністрацыйных адзінак. Даваў нехта з арганізатараў каманду, заклік, і такія хлопцы, як Мікалай, адразу ж станавіліся ў шарэнгі партызан. Справа ў тым, што не да ўсіх маглі дабрацца партызанскія «ваенкаматы», асабліва на першым этапе — у 1941-1942 гадах: зброі на ўсіх не хапала. А ў верасні 1943 года, калі партызанскі рух набываў усенародны размах, усходнія і паўднёвыя часткі Гомельшчыны былі ўжо вызвалены.

У вайну аднавілася вастрэйшая класавая барацьба, кулакі, антысаветчыкі зрабіліся памагатымі фашыстаў! Можна зразумець адносіны тых, хто ваяваў з першага дня, да тых, хто ў самы небяспечны для краіны час сядзеў дома, араў зямлю ці яшчэ горш — рабіў на немцаў, на заводах, на чыгункі і г. д. Не ведаючы ўсіх абставін, усіх умоў акупацыі, я сам, помню, кіпеў гневам да тых, хто павінен быць у арміі, ваяваць, а застаўся ў нямецкім тыле і не пайшоў у партызаны. Гэтыя эмоцыі франтавікоў пэўнымі вайсковымі органамі ўзводзіліся ў палітыку ў адносінах мабілізаваных на вызваленай тэрыторыі. Некаторыя жорсткія камандзіры (а вайна

рабіла людзей жорсткімі), ахоўваючы вопытных, праверaных байцоў — аснову і будучых баявых поспехаў часці, кідалі навабранцаў, ненавучаных, дрэнна ўзброеных, у самыя небяспечныя аперацыі, напрыклад, на фарсіраванне рэк.

Гэта прыводзіла да лішніх ахвяр, якіх можна было пазбегнуць. Пазней на гэты конт быў своечасовы загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, які ўстанаўліваў адказнасць за ўвядзенне ў бой ненавучаных ці слаба навучаных вайсковай справе людзей. Але было гэта, відаць, пазней верасня 1943 года. У 1944-1945 гадах, калі вызваляліся заходнія вобласці Украіны, Беларусі, Прыбалтыка, мала хто з камандзіраў дзейнічаў па прынцыпу: маўляў, няхай акупяць крывёю сваю віну перад Радзімай. Быў загад. Але галоўнае — адбыліся змены ў псіхалогіі: зразумелі, што такое акупацыя, навучыліся адрозніваць тых, хто супрацоўнічаў з гітлераўцамі, ад тых, хто мусіў дзесьці працаваць, каб жыць, карміць дзяцей.

Увосень 1943 года сітуацыя на франтах, якія называліся Беларускімі, склалася цяжкая. Імклівае наступление ад Курска і Арла траціла сваю інерцыю — вычэрпваліся сілы. Немцы ўчапіліся за водныя рубяжы на Дняпры і Сожы. А нашы камандзіры хацелі з ходу зламаць абарону іх на гэтых рэках. Рэзервы Стаўкі ішлі на поўдзень — для аперацыі па вызваленню Кіева.

У такі вірлівы час Мікалая прызвалі ў армію. Разам з іншымі церушанамі, грабаўцамі, краўцоўцамі, нават не абмундзіраваных яшчэ, кінулі іх на Сож пад Цярэшкавічы, за дзесятак кіламетраў ад дома. Ніжэй Лоева нашым часцям удалося фарсіраваць Дняпро і ўварвацца ў палескія раёны. А Сож усё не маглі фарсіраваць, каб перарэзаць фашыстам шляхі адступлення і ўтварыць «гомельскі кацёл», як планавалася.

Але што характэрна: ні разу не пачуў я ад яго крыўды, наракання на тое, што іх кінулі ў атаку ненавучаных. Ён, салдат, лічыў, што ў той час інакш і нельга было, бо часці знясіліліся ад упартых летніх баёў, людзей не хапала. А Дняпро і Сож, лічыў, абавязкова трэба было перайсці адразу, не даць немцу замацавацца. І «фільтрацыю», г. зн. тое, што партызан і такіх, як ён, хто не падлягаў яшчэ прызыву ў 1941 годзе, вылучылі ў асобнае падраздзяленне, Мікалай ухваляў. Ганарыўся, што пасля шпіталя яму аказалі высокі давер — назначылі ў палкавую разведку. Адбіралі туды самых спрытных, смелых, надзейных. Ён апраўдаў гэты давер, прайшоўшы ад Дняпра да Віслы, дзе яго раніла так, што больш у строй не вярнуўся. Амаль год пасля таго «ваяваў» у шпіталях — за жыццё і здароўе сваё ваяваў з дапамогай урачоў. Шчыра шкадаваў, што

нядоўга прабыў нафронце — усяго год. «Вельмі ж хацелася дайсці да Берліна».

Пра разведку Мікалай расказваў многа, але неяк зусім не так, як некаторыя іншыя, а я чуў сотні такіх расказаў. З яго расказаў вынікала, што разведчыкі — зусім не тыя героі, кожная вылазка якіх — подзвіг. Ніколі, нават пад добрай чаркай, не перабольшваў сваіх заслуг, не выхваляўся. Была ў яго расказах нейкая вельмі прывабная прастата. Незвычайная. Магчыма, як у «Севастопальскіх апавяданнях» Л. Талстога. Таму мне і хацелася напісаць так, як расказвае Мікалай. Не напісаў, напэўна, яшчэ і таму, што адчуваў, як гэта цяжка — такая прастата і непасрэднасць. Лягчэй «сачыняць» сітуацыі і герояў.

Нягледзячы на інваліднасць, Мікалай адразу, як вярнуўся дадому, уключыўся ў работу ў калгасе, дома, хоць цяжкая фізічная праца — а іншай ён не ўмеў ды і не хацеў — пагражала слепатой. Толькі лячэнне раненага вока затрымала працэс у здаровым, але засталося там зроку працэнтаў 50, не больш. Весці жыццё інваліда гэты чалавек не мог. Ажаніўся. Нараджаліся дзеці, дачка, за ёй — двое сыноў. Стараўся, каб яго сям'я жыла не горш, чым суседскія. Дапамогі не прымаў нават ад Вольгі. Трымаў мужчынскі гонар. Калі я пабагацеў, Маша часам нешта падкідвала, але не як дапамогу — як плату за будаўніцтва хаты для Вольгі. Бацька мой адразу пасля вайны выпісаў лесу на мяне, франтавіка, і паставіў зруб: трэба ж настаўніку хата! Але настаўнік стаў пісьменнікам, перабраўся ў сталіцу. А зруб стаяў, бацька колькі разоў пытаўся, што з ім рэбіць. Машы прыйшла добрая ідэя: паставіць хату ў Церусе — для Вольгі, каб па выхадзе на пенсію мела свой куток. Перавозку зруба, нарыхтоўку матэрыялу, якога не хапала, і ўсю пабудову Мікалай узваліў на сябе. Яму таксама хацелася аддзячыць старэйшай сястры. Здаецца, толькі рамы заказваў сталяру ды печніка наймаў. Добры бондар не мог не ўмець трымаць цяслярскія, сталярскія інструменты. Пры гэтым варта адзначыць, што будаваў ён хату, не перапыняючы работы ў калгасе, дзе ў той час не было ні нарміраванага рабочага дня, ні выхадных, ні афіцыйных адпачынкаў. Рабілі — як каму падказвала сумленне. Аб сумленнасці Філатавіча хадзілі легенды. Так і казалі: «Ну, гэты — як бацька яго Філат». Украсці Мікалай мог толькі ў адным месцы — у лесе. Лясное сяло, пэўна, ад свайго заснавання жыло па прынцыпу: «Хто ў лесе не злодзей, у доме — не гаспадар». Спілаваць дубок на клёпку нават і не лічылася за кражу. Гэта было нешта накшталт спорту ці палявання. Асуджаліся тыя, хто рабіў гэта так, што падводзіў леснікоў. Ссячы, але не пакінь слядоў, умей схаваць — такі

закон добрых гаспадароў. Быў. Цяпер і гэтага не ўмеюць рабіць, бо калі крадуць, то на машынах, на трактарах, похапкам, а таму і сляды пакідаюць вельмі бачныя. Да шашы. А на шашы — дагані яго! У 50 — 60-х гадах парубкі ў лясах на поўдзень ад Гомеля сталі бедствам, бо красці пачалі ўкраінцы. Прыязджалі за 200-300 кіламетраў. Паспрабуй знайсці такі лес! Мне расказваў мой сябра ляснічы, пасля дырэктар Гомельскага лясгаса М. М. Палевікоў, што лясгас мусіў прасіць аблвыканком, каб той звярнуўся да Чарнігаўскага выканкома — выставіць пост на мосце цераз Дзясну. Закрыць дарогу хоць дальнім злодзеям. Здаецца, некаторы эфект гэта дало.

Такіх парубшчыкаў церушане асуджалі рашуча, гэтак жа, як тых, хто мог пацягнуць з дзяржаўнага склада.

Церухскі калгас у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе быў адным з бяднейшых у раёне. Вельмі ж пясчаныя глебы. А ўгнаенняў — колькі іх было ў той час?! Адзін час фермай (дзве сотні галоў) загадваў таксама інвалід, без адной рукі. Але гаспадар ён быў дрэнны: пагнаіў, даў раскрасці кармы. Жывёле пагражала знішчэнне. Назначылі загадваць фермай Мікалая. Адбіваўся як мог. Але ўтаварылі. Працаваў дзень і ноч. Дабываў кармы, бярог кожны кілаграм. Ва ўсякім разе ферму ўратаваў, вывеў на веснавую траву. Калі ў сярэдзіне 50-х гадоў калгас пераўтварылі ў саўгас, Мікалай адбіваўся ад пасады загадчыка фермы, але мусіў яшчэ колькі гадоў рабіць — узнімаць гаспадарку: у саўгасе справы пайшлі лепш, цяпер церухскія і краўцоўскія пяскі даюць нядрэнны ўраджай.

Работа на ферме для загадчыка пачыналася ў пяць раніцы і канчалася ў лепшым выпадку ў дзесяць, адзінаццаць вечара. За месяц прабывання на адпачынку я мог пабачыць швагра толькі хіба на ферме ці на партыйным сходзе, якія я стараўся не прапусціць,— вывучаў жыццё, жыў праблемамі сяла.

Недасыпанне, нервовыя перагрузкі не маглі не ўплываць на здароўе цяжкапараненага чалавека: зноў пачаліся галаўныя болі. Жонка Мікалаева Надзя, Вольга і Маша гвалтам прымусілі яго перайсці на лягчэйшую работу.

Мікалая зрабілі кладаўшчыком. Гадоў пятнаццаць прарабіў на гэтай «лёгкай», як лічаць некаторыя, пасадзе. Толькі людзі, якія не ўяўляюць абавязкі кладаўшчыка ў калгасе, саўгасе, параўноўваюць з кладаўшчыком на заводзе, будоўлі — выдаў інструмент, прыняў прадукцыю,— могуць думаць, што гэта лёгкая работа. Сапраўды, зімой яна не пыльная, як казаў сам Мікалай. Але ўлетку... у час уборкі зерневых, гародніны, садавіны! Асабліва зерневых. Трэба прыняць сотні тон збожжа. Ідзе яно з камбайнаў у рознае надвор'е, пры рознай

вільготнасці. Нельга дапусціць, каб хлеб згарэў. А сушылка старая, транспарцёраў увогуле няма. Людзей не хапае.

Я неаднойчы назіраў, якая работа ў такі час у кладаўшчыка. Акрамя вялікай адказнасці — катаржная фізічная праца. Мікалай не выпускаў лапату з рук — пералапачваў, цягаў мяшкі. У дні «пік», калі рабілі ўсе камбайны, усе машыны, ён паднімаў сабе на дапамогу жонку, дзяцей, калі яны падраслі, сясцёр, калі яны прыязджалі.

Так працаваў інвалід першай групы да ўзросту, калі здаровыя мужчыны выходзяць на пенсію. Без работы ніколі несядзеў. Паглядзеў: прыязджаюць на ўборку сена шэфы-гараджане, а рабіць ім няма чым. За вясну да наступнага сенакосу змайстраваў паўтары сотні грабель. «Мне дырэктар па два руолі за граблі выпісаў. Ды яшчэ і падзяку аб'явіў».

Мікалай бывае ўпарты. Бывае і круты. Часам залішне самаўпэўнены. Спрачацца з ім нялёгка. У яго сваё бачанне свету, свая ацэнка каштоўнасцей жыцця. З маіх вучоных разваг, як лепш наладзіць сельскую гаспадарку (а гэта не мае суб'ектыўныя думкі, яны вынікаюць з таго, што я пачуў ад вучоных, вычытаў у кнігах), Мікалай нярэдка скептычна хмыкаў. Мяне гэта часам злавала. Пасля я зразумеў, што ў чалавека — практыка. У шчырага селяніна зусім іншыя погляды на тыя праблемы, над якімі ламаюць галаву ў РАПА ці АблАПА. Але да яго гонару — Мікалай н і кол і не быў крытыканам. Ён ніколі не ганіў агулам усё ў сельскай гаспадарцы, як робяць некаторыя з тых, хто спажывае хлеб, а не расціць яго. Ён падказваў «канструктыўныя хады» — са сваіх сялянскіх пазіцый. Цікава, што пошукі гэтых хадоў нярэдка, несвядома, бадай, вяртаюць яго да практыкі першапачатковай арганізацыі калгаснай вытворчасці. Але разам з тым ён вельмі горача падтрымаў заклік развіваць падсобныя гаспадаркі, гадаваць больш жывёлы.

«Каб усе гадавалі столькі свіней, як я, мы не ведалі б, куды дзяваць мяса».

Жаданне сваёй жонкі адпачыць пад старасць Мікалай высмейвае. Без каровы не ўяўляе жыцця. Выкормлівае па чатырыпяць свіней у год. Ды якіх! Якое сала! І гэта не з-за сквапнасці. Прадаваць на рынку, дзе можна было б выгадаць больш, не ўмее і не любіць,— здае на мясакамбінат. «Ніякага клопату: зважылі, выпісалі разлік — ідзі ў бухгалтэрыю». Салам ён забяспечвае ўсю радню, сяброў. Амаль кожную зіму, часцей пад Новы год, заяўляецца з цяжкім мяшком. Прывозіць кумпяк, кілбасы, сала. Ад вакзала да кватэры ідзе пехатой, ніякага транспарту не прызнае.

«Коля! Што, мы сала не можам купіць, што ты з Гомеля вязеш?»

«Дык то ж купленае, а гэта сваё. Ды і не купіце вы такога. На Міншчыне так гадаваць не ўмеюць».

Радасна ад яго гонару за плады сваёй працы, ад яго патрыятызму, няхай і наіўнага.

Дзень пабудзе — збіраецца ў дарогу.

«Ды пагасці ты хоць дні тры».

«Нудна ў вас. Не знаеш, чым заняцца».

Гэта — у сталіцы, пры каляровым тэлевізары, пры бібліятэцы ў тры тысячы тамоў. Кнігі Мікалай любіць чытаць і, можа, чытаў бы, як бацька, але падкасіў зрок: адчуваю, баіцца ператамляць адзінае вока, як, між іншым, і я баюся, калі застаўся з адным вокам. Цяпер мы з ім сябры па няшчасці. Яго скалечыла вайна. Мяне... ці не літаратура?

Дзяцей Мікалай выхоўваў строга і па-сялянску, у працы. Ганарыцца, што ўсе трое атрымалі вышэйшую адукацыю. «Ды ні ў адной стране етага няма, шчоб дзеці мужыка, інваліда, так вывучыліся»,— часта чуў я ад яго. У Мікалая вялікая павага да людзей, якія любяць зямлю. Назначылі ў саўгас новага дырэктара — агранома. Сустрэў яго Мікалай скептычна: здаўся яму М. М. Мураўка занадта маладым, каб кіраваць такой гаспадаркай. А ўбачыў, што з'явіўся сапраўдны гаспадар,— нахваліцца не мог новым дырэктарам, быццам сынам сваім. Прыязджаю, толькі павітаемся — адразу пра Міхайла Міхайлавіча. І ў застоллі іншых тэм не прызнаваў, як толькі пра дзейнасць свайго дырэктара. Асабліва падабалася Мікалаю, як Мураўка наладжваў дысцыпліну, ганяў гультаёў, п'янюг.

Пад старасць, калі Мікалай здаў склад і ў асеннія, зімовыя дні нудзіўся без справы, часам і сам прыкладаўся да чаркі, але мне казаў: «Нам можна, а вам нялъзя: у вас умственная работа. Ад гэтай жа заразы галава буксуе».

Адным словам, і ў слабасцях сваіх чалавек гэты арыгінальны. Чалавечны, я сказаў бы, народны — як герой «Новай зямлі» Коласа, той жа Міхал, напрыклад.

Такія прататыпы герояў рамана-хронікі з жыцця адной сям'і, які мне хацелася напісаць.

Радаслоўная маіх дзяцей — гэта гісторыя двух родаў, кланаў, якія перакрыжаваліся ў нашым з Марыяй шлюбе і такім чынам утварылі трэці род. Як ён? Які будзе яго працяг? Які лёс чакае нашых унукаў?

9 чэрвеня 1984 года

Амаль праз год, не ў храналагічным парадку, я дапаўняю запіс пра сям'ю Кротавых, пра Мікалая. Раблю гэта з глыбокім смуткам.

Чатыры дні назад мы з Машай былі ў горадзе. Збіраліся на дачу, я папрасіў яе:

— Знайдзі ты, калі ласка, працяг радаслоўнай. Дзе я пра вас, Кротавых, пісаў. Трэба перадрукаваць на машынцы.

Маша запярэчыла:

— Не хачу, каб ты публікаваў пра мяне.

— А там не пра цябе. Там — пра Вольгу, Клаву і Мікалая.

Сам я ў завалах рукапісаў з вялікай цяжкасцю знаходжу тое, што патрэбна. Пошукі такія мяне заўсёды раздражняюць. І жонка стараецца, каб я гэтым не займаўся. Сама яна, як правіла, усё знаходзіць легка. У адну хвіліну яна знайшла і гэтую папку.

На дачы я падняўся ў мансарду, у кабінет свой, і, разгарнуўшы папку, пачаў перачытваць тое, што напісаў мінулым летам. І — да неверагоднасці дзіўнае супадзенне! Я чытаў пра смерць Клавы, як пачуў унізе гучнае Машына рыданне. Бяда! З кім! Ударыў у галаву страх за Сашу, ён лечыць сваю язву ў Друскенінкаі. Кінуўся на лесвіцу. Маша, закрыўшы далонямі твар, цяжка паднімалася па ўсходцах.

— Што? Маша! Што здарылася?

— Коля загінуў.

— Дзе? Як?

— Не знаю. Алёша пазваніў Наташы.

Тады з'явіўся страх за другога чалавека — за Вольгу. Яна была на дварэ і нічога не ведала. Яна была ім за маці. Яна выгадавала іх. Яны былі самыя малыя — Клава і Коля, калі памерла маці. І вось бязлітасная смерць першымі забрала малодшых.

— Маша! Трымайся! Думай пра Вольгу!

Вольга, канешне, самлела, пачуўшы гэтую страшную вестку.

Я тут жа пазваніў у гараж, на шчасце, шафёр не паспеў пайсці дадому — мыў машыну. У дзевяць вечара выехалі і ажно да Жлобіна ехалі пад моцным дажджом. З намі паехаў Аркадзь, Клавін муж. Позна ўначы прыехалі ў Церуху. Вольга многа разоў у дарозе выказвала надзею: «А можа — не насмерць? Можа, у бальніцы?»

У хаце — цёмна, і яна, адчуў я, на міг нейкі ўзрадавалася: жывы, калі жонка, дзеці спяць... Не, не спалі яны. Малых дзяцей з цяжкасцю паклалі, таму не ўключылі святло.

І была страшная праўда: Колі няма. І мне хацелася завыць ад недарэчнасці яго смерці. Вайну прайшоў. Тройчы паранены. Сорак гадоў пражыў з пабітай галавой, без вока... На цемені чарапныя косці так і не зрасліся, угледзеўшыся, можна было ўбачыць, як пульсуе рана... Аднак чалавек меў надзіва ясны розум. І працаваў. Як працаваў!

Да апошняга дня. Да апошняга дыхання. Усюды яму хацелася памагчы людзям. Памагаючы тым, каго напаткала бяда, загінуў.

Памёр родны брат яго жонкі — настаўнік Міхаіл Ігнатавіч Горленка. У Гомелі, у бальніцы. Пасля аперацыі на страўніку. Коля разам з Надзяй паехалі за Сож, у яе родную вёску Шарпілаўку, на пахаванне. Прыйшлі ў хату нябожчыка, а там толькі збіраюцца ехаць у Гомель, каб забраць труну з целам Міхаіла. Кажуць, Мікалая адгаворвалі: няхай маладзейшыя едуць. Але ён не мог не памагчы ў бядзе, бо ехала сама ўдава. Вярталіся назад па новай зарэчнай дарозе; раней шарпілаўцы ездзілі праз Цераху і перапраўляліся на пароме.

Трое мужчын сядзелі ў кузаве, дзе стаяла труна. Сядзелі на лавачцы перад кабінай, трымалі вянкі. Мікалай сядзеў крайні злева.

Я гутарыў з гэтымі двума сведкамі, яго сваякамі. Ні адзін з іх не ўгледзеў, як гэта здарылася, не разумелі, якая прычына падняла яго. Адзін лічыў, што ў Мікалая зляцела фуражка і ён рэзка павярнуўся, каб злавіць яе. Другі лічыць, што ён прыпадняўся, каб дастаць з кішэні цыгарэты, курэц ён быў зацяты.

У адзін міг чалавек апынуўся за бортам на хаду машыны. Хоць хуткасць была невысокая — уязджалі ў сяло, але ўдар быў страшны і смерць наступіла імгненна.

Цяжэй за ўсіх перажывала Вольга Філатаўна. Яна суткі не адыходзіла ад труны. Яна гладзіла яго рукі, цалавала разбітую галаву. Па дарозе на могілкі траціла прытомнасць. Але дайшла. Вытрымала.

Звечара і ўсю ноч старыя жанчыны чыталі каля труны псалмы.

«Можа, не трэба? — нясмела сказаў я Машы.— Камуніст...»

«Ваня, гэта не яму трэба, нам... Вользе, Надзі... Гэта дае нейкае супакаенне. Цэлую ноч будзем сядзець».

На пахаванні іграў аркестр і гаварылі паспешлівыя прамовы над магілай. І мне стала крыўдна: як мала і няўмела гавораць пра такога Чалавека — Салдата, Працаўніка! На памінках я сам паспрабаваў сказаць, але і ў мяне атрымалася бледна, невыразна. Цяжка гаварыць з такой нагоды.

Перад пахаваннем сядзелі мы каля хаты з яго франтавым другам, інвалідам, без нагі, Пятром Казіміравым. Вайна, фронт вельмі моцна зрадніў гэтых двух салдат, уся Цераха ведала: больш верных сяброў, як Філатавіч і Казіміраў, няма. Мікалая называлі так — па бацьку: Кротавых многа, а Філатавіч адзін. Была ў гэтым асаблівая павага да чалавека, якога любілі за яго праўдзівасць, шчырасць, дабрыню.

Хацеў я разгаварыць Казіміра: няхай раскажа нешта.

— Вы ўвесь час былі разам? У адным узводзе?

Але адказаў ён нечакана:

— Пятровіч, а знаеце што? Загінуў Філатавіч каля той пераправы, дзе нас першы раз параніла. Там, каля Бабовіч, мы перапраўляліся...

Вунь што ўспомніў франтавік каля труны друга! Вунь пра што думаў!

Я зразумеў яго доўгае маўчанне. І зразумеў: мне таксама лепш памаўчаць.

Вольга хацела застацца там, у Церусе, злавала, калі мы з Машай угаворвалі яе паехаць разам з намі назад у Мінск. Але мы ведалі, што яна дзень у дзень сядзела б ля магілы і знясілела б, звялася б.

На пад'ездзе да Мінска яна як бы згадзілася з намі:

— А можа, і праўда, з дзецьмі мне лягчэй будзе. З унучкамі нашымі — Машай і Славянай. З унукам Алёшам, якога выгадавала з такім жа клопатам, любоўю, як гадавала сясцёр сваіх і брата.

А я думаў там, у Церусе, і думаю тут, дома: ці не ў міг Мікалаевай смерці ў мяне з'явілася жаданне знайсці гэты мінулагодні запіс — кароткі партрэт сям'і працаўнікоў і чалавекалюбаў?

Вечная памяць табе, наш дарагі чалавек!

11 лістапада 1981 года

Разбіраючы перад рамонтам дачы рукапісныя завалы, знайшлі абадраны сшытак — мой юнацкі дзённік за сакавік — май 1939 года. Гэта «разгар» майго кахання да Машы, нашы спатканні на вуліцы Астроўскага ў Гомелі. Безумоўна, дзённік запоўнены каханнем. Але — божа мой! — няўжо ў 18 год мы былі такімі ўзвышана наіўнымі? Цяжка паверыць. Многія запісы чытаеш і чырванееш за наіўнасць сваю. А можа, гэта і хораша, што мы былі такімі? Але магчыма і другое: адносіны нашы былі прасцейшыя, натуральныя, а мне, дурню, які лічыў сябе паэтам, хацелася запісваць іх гэтак — паэтычна-ўзвышана, ідылічна. Напрыклад, не помню, каб я звяртаўся да Машы: «Мая маленькая ластаўка», бо пазней такога не было ні ў пісьмах з арміі, ні пасля, калі я вярнуўся з вайны, па-ранейшаму, між іншым, гэткім жа ідэалістам і гэтак жа закаханым па вушы ў сваю жонку. Пры ўсёй гарачай нашай любові мы ніколі не ўніжаліся да сюсюкання накшталт «ластаўка», «коцік». Мне нават зараз, у 60 год, сорамна спытаць у паважанай бабулі Марыі Філатаўны, ці называў я яе ластаўкай. Баюся, што адкажа яна што-небудзь скептычна-жартаўлівае, што ўласціва старым, а ёй — асабліва.

Дзённік крануў мяне наіўнасцю. Я сапраўды чырванеў. Але не столькі ад саміх запісаў, колькі ад іншага. Гадоў трыццаць назад, калі

я з сям'ёй пачаў праводзіць водпуск у Церусе, Машына сястра і некаторыя яе школьныя сяброўкі гаварылі: «Ой, Пятровіч! Пры немцах, калі не было чаго чытаць, мы вашы дзённікі чыталі. Цікавей за любы раман». Я і тады чырванеў і папракаў Машу: пусціла па руках інтымныя запісы. Патрабаваў, каб яна «.изъяла» дзённікі з гэтай «народнай бібліятэкі». Не помню, каб тады яна нешта знайшла, хоць і згадваю, што шукала ў сваёй старой, дзе пражыла вайну, хаце, на гарышчы. Выходзіць, знайшла, раз абадраны сшытачак гэты апынуўся на дачы тут, у Ждановічах. Я не помню, каб чытаў яго тады, 30 гадоў назад. Можа, не надаў значэння.

Але ў гісторыі з гэтым сшытачкам кранула іншае, пра што, малады, я не думаў, а пасля забыўся і нават у «Непаўторнай вясне» не напісаў. Дзённікі свае — а іх было добры дзесятак сшыткаў, агульных, адыходзячы ў армію ў кастрычніку 1940 года, я перадаў Машы. А потым грымнула вайна.Маша вырашыла з Артукоў Рэчыцкіх, дзе працавала фельчаркаю, прабірацца ў Цераху, у бацькоўскую хату. Гэта быццам бы і недалёка: кіламетраў 30. Але цераз Дняпро, цераз Сож, праз пустынныя балоты міжрэчча... Падвезла яе з дзіцём гаспадыня, у якой кватаравала, толькі да Холмечы. Далей — пехатою. На руках дзіця, пялёнкі, распашонкі, іншы, няхай сабе і бедны, скарб, але ж нейкія кашулі і сукенкі несла. І дзесяць сшыткаў дзённікаў з запісамі, якія цяпер здаюцца да сорамнага наіўнымі. Такімі мы былі! Так кахалі!

Аднак яшчэ колькі слоў пра дзённік. Апрача кахання, ёсць запісы, якія зацікавілі і нават здзівілі. Вось, напрыклад:

18 сакавіка

На літаратурным гуртку канчаткова разбіралася маё апавяданне. Прачытаў яшчэ раз, а потым Мікула стаў рэцэнзаваць, крытыкаваць. І спачатку ж пачаў гарадзіць глупства. Ён падмеціў, што ў мяне палітычна нявытрымана.

— У цябе выходзіць, што адны палякі кіравалі паўстаннем, вызваленнем Беларусі,— сказаў ён.

Потым пачаў гаварыць таксама несправядліва аб сутарэнні, аб блакітных вачах, якія быццам бы не дадаюць нічога канкрэтнага, аб злосным смеху Ядзі і іншае. Калі ён скончыў, усе зразумелі, што чытаў ён апавяданне не больш аднаго разу (чаму мне тады здавалася, што трэба чытаць пяць разоў?), ды і то няўважліва. Пачалі выступаць таварышы. Рабілі ў большасці справядлівыя заўвагі. Апошнім выступіў Гаўрылаў.

— Я з многімі не згодзен,— сказаў ён.— Апавяданне мне ўласна спадабалася. Тэма сустрэчы ў польскім тыле распрацавана добра. Я нічога не бачу дрэннага ў тым, што яе ўкінулі да мужчыны. Гэта, па-мойму, асабліва падкрэслівае цынізм, зверства польскіх акупантаў. Нічога нявытрыманага я не бачу і ў тым, што тут два героі палякі. Наадварот, лічу, што тут добра закранута тэма інтэрнацыяналізму... Шамякіна за апавяданне трэба хваліць...

Што мяне зацікавіла? Па-першае, атмасфера нашых абмеркаванняў. Ці ёсць цяпер такая практыка ў літаб'яднаннях? Але не гэта галоўнае. Я добра помню Леаніда Гаўрылава. Аблічча яго, голас, далікатнасць. Ён сябраваў з Кірэенкам, хадзілі заўсёды разам — студэнты педінстытута, самыя вопытныя і самыя прызнаныя сярод нас, галышоў, паэты. Многа значыла, што яны былі гады на тры старэйшыя за мяне. Помню, Кірэенка заўсёды выступаў востра, бязлітасна, задзірыста. Гаўрылаў далікатна. Але вось загадка памяці. Так помню, так уяўляю Гаўрылава. І абсалютна не помню, хто такі быў Мікула. Студэнт? Настаўнік? Журналіст? Нічога не засталося ў памяці — ні аблічча, ні імя, ні нейкіх рыс характару. А чалавек жа крытыкаваў мяне. Але яшчэ больш дзіўна: зусім не помню гэтага свайго апавядання. Я пісаў пра палякаў? Помню, што недзе ў гэты час я, закаханы ў медычку, напісаў пра маладую акушэрку ці фельчара — як яна ў жонкі лесніка прымае роды. Помню, апавяданне хвалілі. Наіўна, але шчыра: уяўляў будучую Машыну працу.

Няхай на сюжэт пераймальнага апавядання я мог забыцца. Але — дзіўна — забыты не толькі Мікула. Запіс: «Учора ўвесь вечар любаваўся Насцяй Таўкачовай. Гэта маленькая студэнтка першага курса так чароўна выглядае!» І зноў у памяці — чысценькі аркуш паперы, без адзінага іерогліфа. Ні аблічча, ні характару, ні эпізоду якога-небудзь, звязанага з гэтым любаваннем. Чаму?

А вось іншы: запіс:

«Сёння дома, у родных. Прыехаў раніцою. На станцыі спаткаў Наташу Сядую». Зноў-такі — хто яна, Наташа? «Гутарыў не больш адной хвіліны. Увесь дзень вучыў цеплатэхніку! Чорт бы яе ўзяў, гэтую цеплатэхніку!

Вечарам выйшаў на прагулку. Заходзіла сонца. Я з Таняй пайшоў пад бярозы і прагна піў бярозавік, як калісьці ў дзяцінстве. Прыемна піць салодкі сок бярозы!» Ці не пасля гэтага я напісаў навелу «Бярозавы сок», якая помніцца лепш, чым усе астатнія з напісанага ў юнацкія гады. Можа, помніцца таму, што апавяданне гэтае разбіраў Лынькоў і пісьмо яго я захоўваў усю вайну. Не, «Бярозавы сок» я, здаецца, пісаў пазней, у 1940 годзе.

Працяг запісу таго дня: «Вечар быў ціхі-ціхі. Ні адна нават верхавіна высокіх сосен не хісталася. Я прагна лавіў гукі. Нягледзячы на цішыню, іх, гукаў, было шмат, самых розных.

...Дзесьці далека закрычала сава. Ёй, на мае здзіўленне, адказаў гармонік, зусім недалёчка. Ён разліў па лесе вясёлы матыў «сербіянкі». Праз хвіліну сярод дрэў замільгалі постаці хлопцаў — то ішлі гуляць у Камень».

Далей узнёсла-наіўнае, з прэтэнзіяй на паэтычнасць, апісанне вечара. Сухая інфармацыя, паэзія — усё змяшалася. Але дзіўна іншае: усё ажыло ў памяці так, як быццам гэта было ўчора. Адзінокая леснічоўка на краі лесу, на самай мяжы Беларусі і Расіі — літаральна! За глухой сцяной — лес, Добрушскае лясніцтва, бацькаў абход. А перад акном — поле, рускае, каменскае (пазней, у 1940 годзе, на ім збудавалі запасны аэрадром, ваенны, у часе канікул я рабіў на будаўніцтве прарабам).

Менш чым за паўкіламетра ад леснічоўкі размяшчалася падсобная гаспадарка Злынкаўскай запалкавай фабрыкі. Адтуль хлопцы хадзілі на гулянкі ў Камень.

Як хораша помніцца стандартная леснічоўка з вялікай печчу пасярод — так іх будавалі яшчэ пры князю Паскевічу, нібы для таго, каб лесніку было лягчэй абараняцца ад нападу, з беднай мэбляй: стол, ложак, услоны. Бачу сябе за сталом — як вучу цеплатэхніку, нават, здаецца, нешта помніцца з гэтай цеплатэхнікі. Бачу маці, бацьку, брата Паўла, сясцёр Галю і Таню. Маці, маленькая, худзенькая, у няспынных клопатах: паліць печ, поіць карову, корміць свіней. Бацька, высокі, кульгавы (у 1927-м яго падстрэлілі парубшчыкі), сядзіць як бы счарнелы да цыганскага выгляду ад табачнага дыму, сядзіць і смокча, адна за адной, цыгаркі. У яго павышаная цікавасць да маіх заняткаў, ён яўна ганарыцца, што сын падаўся ў навуку, і не прапускае выпадку «шпігануць» Паўла, што той ленаваўся вучыцца, скончыў усяго чатыры класы і кінуў школу, праўда, пасля, пасталеўшы, зразумеўшы, што зрабіў глупства, хадзіў у Камень у вячэрнюю школу і ў тым, 39-м, годзе, здаецца, быў ужо ў сёмым класе.

Малыя, мы баяліся бацьку. Але тады ўжо боязнь тую пераадолелі. Праўда, я заўсёды быў далікатны ў абыходжанні з бацькам. А Павел не саромеўся, ён сёк старому ў вочы. Павел быў усяго на паўтара года маладзейшы за мяне, і ў той час на яго плячах была гаспадарка; бацька наш бясконца папракаў усіх гультайствам, мацюкаў нават малых дачок, але сам не вельмі любіў фізічна працаваць. А лес любіў. Службу сваю любіў.

Тані тады было гадоў сем. Я добра помню яе ў гэтым узросце. Я любіў малодшую сястру. Безумоўна, у яе абавязкі ўваходзіла збіраць бярозавік, я дапамагаў ёй. І мы з карытцаў, выдзеўбаных з бярозавых кражоў, пілі бярозавік, апускаліся на калені і хлябалі ці, калі са збана, з гладышкі, пілі набгом (у нас так кажуць — набгом).

Няма нічога дзіўнага: тое, што блізка, што дарагое, так востра помніцца. Да болю. І няхай не вельмі пісьменныя запісы таго часу не здаюцца наіўнымі. Яны хвалююць. Між іншым, аб мове дзённікаў. Вёў я іх бадай што з першага курса тэхнікума, зрэдку, асцярожна, баючыся, што прачытаюць, запісваў што-нішто са свайго армейскага даваеннага жыцця, смялей, глыбей пачаў пісаць у вайну, інтымныя пачуцці, перажыванні запісваў нават пасля таго, калі быў зачытаны загад, які забараняў у франтавых умовах весці дзённікі. Колькі страчана ад таго загаду! І заўсёды я пісаў па-беларуску. Думаю, што ў той час усе мае сябры, вяскоўцы, апрача хіба гамяльчан, яўрэйскіх хлопцаў,— пісалі свае дзённікі і пісьмы родным на беларускай мове. Гэта было нормай, натуральнай з'явай. Як многа змянілася з таго часу! Як мала набыта ў гэтым сэнсе! Ці больш правільна: як многа страчана, размыта.

12 лістапада

Стары сшытак прымусіў мяне ўзяцца за пяро, за якое, калі не лічыць напісання двух-трох артыкулаў, я не браўся ўжо месяцы тры пасля таго, як аднёс у рэдакцыю «Петраград — Брэст». Паўзы паміж завяршэннем аднаго твора і пачаткам новага заўсёды былі нялёгкімі. У творчым працэсе гэта, напэўна, самае цяжкае — пошукі тэмы, праблем, характараў, канструяванне сюжэта. Але гэтую паўзу я перажываю асабліва пакутліва. Гісторыі баюся — цяжка, не па гадах такая работа. Сучаснасці таксама баюся. Не бачу канфлікту, які мог бы зацікавіць чытача ў наш дужа супярэчлівы, складаны час. Таму з'яўлялася думка, па прыкладу Брыля, напісаць нешта з асабістага — успаміны, роздум, развагі — самыя розныя думкі, няхай сумбурныя, але шчырыя.

Маша не раіць. Я разумею яе жаночую асцярожнасць. Увесь доўгі творчы час я быў ідэалістам, улюбёным у людзей, у жыццё, захоплены веліччу планаў і спраў. Цяпер жа шмат да чаго ў мяне негатыўныя адносіны. І ў людзях я расчараваўся. Раблюся скептыкам.

14 лістапада

Яшчэ пра дзённікі. Калі Мележ апублікаваў свой ваенны дзённік, я неяк выказаўся, што гэта цікавая літаратурная з'ява. Мікола Аўрамчык, калі мы засталіся адзін на адзін, сказаў:

— Ну, ты мяне здзівіў, Іван!

— Чым?

— Ацэнкай дзённіка свайго цёзкі.

— Ты іншай думкі?

— Справа не ў тым, якой я ці ты думкі. Але давай сядзем, і я дакажу табе ледзь не на кожнай старонцы, што ў той час, тым дваццацігадовым Мележам, так не магло быць напісана. Шмат што яўна напісана пазней.

Я прыйшоў дадому, прачытаў многія старонкі дзённіка і згадзіўся, што Мікола мае рацыю. Так мог напісаць толькі вопытны літаратар. Безумоўна, аснова нейкая была, але запісы тых ваенных, 1941-1942 гадоў грунтоўна рэдагаваліся.

Ці можна вінаваціць прафесійнага літаратара, што, аддаючы свае запісы, любога часу, на суд чытачу, ён рэдагуе іх? Я схільны думаць, што гэта натуральны працэс. Адна справа — запіс для сябе, іншая — для публікацыі. Выдатна зроблены ваенныя дзённікі К. Сіманава, гэта мацней за яго раманы. Але ў іх ужо відавочная адкрытая рэдактура рукой сталага майстра.

Між іншым, заўвагі на палях рукапісу рамана «Завеі, снежань», апошняга яго твора: «Развіць», «Паглыбіць», «Павярнуць Васіля туды... а Ганну туды» і г. д. не здаліся мне натуральнымі, сапраўдным жаданнем аўтара нешта перарабіць, дапісаць ці скараціць. Навошта загадваць сабе «скараціць», калі можна ўзяць пяро і скараціць. У такіх «заўвагах для сябе» прысутнічае элемент «ігры на публіку» — на даследчыкаў. Няхай развіваюць адно маё слова «развіць» на аркуш, на два! Трохі злосная думка? Не. Наадварот, я далёкі ад таго, каб дакараць сябра. Я ведаю, які Іван Паўлавіч быў хворы, я ўсведамляў, што хвароба яго не дасць яму пражыць доўгае жыццё, таму яго клопат пра сваё творчае бяссмерце, пра жыццё не толькі сваіх твораў, але і сваіх рукапісаў — гэта зусім не чалавечая слабасць, гэта, бадай, мужнасць. Любы жыццесцвярджальны жэст, зроблены чалавекам, які ўсведамляе свой блізкі фінал,— гэта сапраўды мужнасць. Вось калі некаму хочацца спапяліць усё, што застаецца пасля яго,— гэта ўжо вялікая трусасць, паніка. Людзі не анёлы.

Але, людзі не анёлы. Як і кожны з нашага брата, часта думаю пра гэта, жадаючы зразумець чалавека ва ўсёй яго сутнасці. Зразумець самых розных людзей. Але вось да чаго ў мяне вельмі

супярэчлівыя адносіны: да таго, што пасля смерці ў сваіх успамінах мы часта робім чалавека анёлам. Добра гэта? Дрэнна? Старажытная мудрасць сцвярджае, што пра мёртвых або гавораць добрае, або не гавораць нічога. Можа, і нядрэнна было б, каб формула гэтая была ўсеабдымнай, стала прынцыпам. А то нярэдка бывае і наадварот: чалавека, якога ўзносяць пры жыцці, пасля смерці пачынаюць аплёўваць. Вось гэта крыўдна. За жывых крыўдна.

Але мне ўсё яшчэ хочацца паразважаць пра дзённікі, успаміны, мемуары.

Няхай даруе мне Іван Паўлавіч. Прыгадаўся ён. Мы зрабілі з яго анёла — усе, хто напісаў успаміны. У тым ліку і я. І не толькі літаратурнага. А ён быў чалавекам, можа, больш таленавітым, але ва ўсім астатнім вельмі падобным да ўсіх нас, грэшных.

У нас выпрацаваўся стэрэатып успамінаў, ад якога мы міяк не можам адысці. Можа, не трэба так хутка пісаць іх, успаміны пра сваіх сучаснікаў — пра тых, хто яшчэ ўчора жыў побач з намі? Але бяда, што і пра класікаў мы пішам па такім жа трафарэце. Прыклад — шмат якія кнігі серыі «ЖЗЛ». Кніга Шклоўскага пра Талстога — ганьба, гэта здзек з вялікага сына Расіі. А вось Андрэ Маруа пра сваіх вялікіх папярэднікаў, што з'яўляюцца гонарам не толькі Францыі — чалавецтва,— пра Бальзака, Заля, Жорж Санд напісаў зусім інакш. У яго — яны людзі і ў той жа час — геніі. І гэта праўдзіва і цікава.

22 лістапада

Быў на сесіі Вярхоўнага Савета. Ездзілі з Машай. Яна здзіўлялася, як нас ахоўваюць: на кожным паверсе атэля па некалькі хлопцаў! Мне гэта таксама здаецца залішнім.

Зацвярджалі пяцігадовы план. План, безумоўна, дакумент сур'ёзны. Але па паказчыках сваіх гэты план не такі ўнушальны, як планы нядаўніх пяцігодак. Тады мяне асабіста яны захаплялі, і на славу іх мне хацелася пісаць оды. І я пісаў — артыкулы, публіцыстыку. Цяпер такога захаплення няма. Пастарэў? Не толькі. Залішне многа было дыспрапорцыі ў плане дзесятай пяцігодкі. Вось чаму, слухаючы лічбы, якімі «глушыў» Байбакоў, я міжволі думаў: а ці збалансавана ў плане ўсё як мае быць? Ці не будзе яшчэ большых дыспрапорцый, прарэхаў? Нешта ўсё больш і больш становіцца дэфіцыту. Не хапае не толькі мяса, масла, але не хапае метапу, гаручага, цэменту, лесаматэрыялаў, бавоўны, хоць за бавоўну наш калега, член СП Рашыдаў атрымлівае залатыя зоркі. Перад сесіяй на Пленуме ЦК выступіў Л. І. Брэжнеў. Гэта лепшая за іншыя прамова: не сухія лічбы — развагі, праблемы і, крыху здалося, нібыта —

неспакой, бадай, трывога за становішча з харчаваннем; нямала разумных слоў аб «продовольственной программе». Сапраўды, гэта адна з вострых праблем — харчовая.

Мы ліквідавалі сялянства як клас, а сапраўдных сельгасрабочых не выхавалі: у калгасах, саўгасах працуюць людзі як бы часова, бадай кожны другі з іх хціва пазірае ў бок горада — як бы перакачаваць туды. Таму любы план можа застацца добрым пажаданнем, не больш.

Я ўважліва слухаў. Я хацеў пачуць трывогу за агульнае становішча. Многія гаварылі аб дыспрапорцыях, аб безгаспадарчасці, аб дэфіцыце сыравіны, аб неладах у арганізацыі кіраўніцтва. Але... трывогі не было. Што яны, усе такія аптымісты? Ды не ж, у вуснай размове ўсе выказваюць гэтую трывогу. Я сядзеў з Шабашовым, і мы з ім шчыра пагутарылі. У яго — крык душы за справы ў сельскай гаспадарцы, і ў будаўніцтве, ды і ў прамысловасці таксама.

Прамоўцы — кіраўнікі абласцей, рэспублік — прасілі металу, цэменту, машын, угнаенняў, грошай. Ніхто не заікнуўся пра мяса, масла, бульбу, хоць становішча ў многіх рэгіёнах цяжкае. Што гэта, забароненая тэма? Але ж Брэжнеў гаварыў пра гэта адкрыта.

Між іншым, перад сесіяй, на свята, газета «Сельская жизнь», друкуючы мой артыкул, зняла словы, узятыя мной са справаздачнага даклада XXVI з'езду: «Вместе с тем ЦК, Политбюро, хорошо зная положение в каждой республике, видят, что трудности со снабжением населения продовольствием все еще имеют место».

Што робіць наша прапаганда? Ох, прапаганда! Па-мойму, яна не вытрымлівае крытыкі.

Узор яе на сесіі. Выступалі па-рознаму — добра, пуста. Але ўсе — і даярка, і старшыня СМ — нязменна пачыналі сваю прамову: «Все мы находимся под неизгладимым впечатлением яркой, глубоко содержательной речи...» — поўны тытул, імя, імя па бацьку, прозвішча. Часам нехта ўносіў мадыфікацыю: замест «глубоко содержательной» — «глубоко аргументированной». Божа мой! Хіба можна так? Я разумею даярку — ёй пісаў прамову прапагандыст райкома. Але ж вы, высокія, адукаваныя, разумныя? Няўжо ў вас не знаходзіцца чалавечых слоў, каб выказаць пахвалу «мудрасці» кіраўніка?

26 лістапада

Нехта з саветолагаў на Захадзе, у ЗША ці Францыі, падлічыў, што ў нас штодня 18 мільёнаў чалавек засядаюць. Калі гэта і перабольшана, то наўрад ці ў два разы. А ці падлічыў хто, колькі з гэтых мільёнаў, што праціраюць штаны, адарваўшыся ад асноўнай сваёй працы — у цэху, у полі, у лабараторыі, у тэатры, за сталом

пісьменніка — трацяць камандзіровачных? Ох, як многа! Гэта ж стала законам, што, напрыклад, Міністэрства рыбнай гаспадаркі выклікае людзей з Сахаліна ў Маскву, каб павучыць іх, як лавіць рыбу. Вучыць, як правіла, тэарэтык, які абараніў дысертацыю, але ў мора выходзіў хіба што ў час студэнцкай практыкі.

Наш мудры Віталій Озераў напярэдадні 80-годдзя А. Фадзеева, каб правесці канферэнцыю па яго творчасці, павёз ва Уладзівасток 160 чалавек, многія з якіх наўрад ці прачыталі ўсяго Фадзеева. Колькі страчана грошай, колькі выпіта гарэлкі! Колькі згубілі рабочага часу работнікі Прыморскага краю. 160 дармаедаў! За 8 тысяч вёрст! Туды і назад. Ладна — грошы, ладна — час. Але няўжо і кіраўнікам краю і стараверу Маркаву, сібіраку, не прыйшло ў галаву, што гэта абраза ўсяму Далёкаму Усходу. Няўжо без маскоўскіх гаваруноў яны не маглі правесці такой канферэнцыі? Для гэтага даволі было з Масквы 2-3 асноўных дакладчыкаў. Ну, добра, яшчэ 12-16 паэтаў для публічных выступленняў. Але ж не 160! Каму гэта трэба? ЦТ передало сюжэт на 5 хвілін. Ці не дарагая цана заплачена за 5 хвілін тэлевізійнай перадачы?

Ах, які я наіўны: «ЛГ» апублікавала дзве паласы! І ў цэнтры ўсяе эпапеі — Віталій Озераў, якому павінны прысудзіць Дзяржаўную прэмію. Як яны ўмеюць прыцягнуць увагу да сваіх персон. Нават самыя спрытныя са славян гэтага не ўмеюць.

Да тэмы аб планах. На сваёй сесіі Вярхоўнага Савета, якую я вёў учора і сёння, раптам адчуў трывогу за становішча ў краіне, якой не адчуў на саюзнай сесіі. Гэта пры тым, што ў нас, у Беларусі, становішча непараўнальна лепшае. Нашы старшыні аблвыканкамаў, гарвыканкамаў, міністры выказалі шчырую трывогу ў сувязі з недахопам хлеба. Прызнаюся, я пахаладзеў. Чаго-чаго, думаў я, а хлеба, дзякуй богу, хапае. Не, не хапае!

Міністр харчовай прамысловасці І. Стаўроўская напярэдадні, на пленуме ЦК КПБ, сказала, што вытворчасць хлебапрадуктаў павялічылася на 37 працэнтаў. Праўда, калі няма мяса, ядуць хлеб, ды яшчэ кормяць ім свіней — пры нашай неразбярысе з цэнамі. Але яна, хітрая баба, сказала, што, маўляў, выпечка хлеба не забяспечвае патрэбы таму, што многія новыя хлебазаводы вынесены з гарадоў у прамысловыя зоны, куды аўтобусы ходзяць нерэгулярна, а таму — не хапае рабочых. Яна хораша сказала: «Некаму здалося, што пах хлеба — гэта шкодны пах».

Хіба толькі адно гэтае глупства, якое мы зрабілі? А ўвогуле пра нашых прамоўцаў на пленуме і сесіі я больш высокай думкі, чым пра тых, што выступалі з самай высокай трыбуны. Ну, чаму яны так

аглядваюцца? Сур'ёзныя ж людзіі Не могуць не знаць, што становішча цяжкае і, кіруючы абласцямі, рэспублікамі, так спрытна абыходзяць вострыя вуглы. Каму гэта на карысць? Народу? Ім? Думаю, што ім гэта асабліва пашкодзіць. У будучым. Выходзіць, што гісторыя мала чаму вучыць. Няшчасная гісторыя! Як яе легка павярнуць на патрэбу не толькі часу, але і асобы.

28 лістапада

Ніколі не думаў столькі над эканамічнымі праблемамі, як зараз. Старэю, ці што? Раней больш думаў пра марапь, пра літаратуру, пра сям'ю, пра дэмаграфічнае становішча, пра шлюбы і разводы. Пра вайну — у плане, як адлюстроўваць яе ў сваіх творах. Міжнародная палітыка заўсёды цікавіла, але хвалявала толькі тады, калі ўзнікалі крытычныя сітуацыі, як некапі на Кубе — з ракетамі, у Чэхаславакіі, Афганістане, як зараз у Польшчы; Польшча хвалюе больш, чым усе ракеты. Ракеты былі, ёсць, будуць, і колькасць іх расці будзе. Калінебудзь нейкі вар'ят іх запусціць, але гэта адбудзецца так нечакана, што наўрад ці паспее хто з нас паразважаць на гэты конт, тым больш запісаць нешта. Праўда, часам я халадзею ад страху: гэта тады, кал і гляджу на малую Машу, на яе бесклапотную мілую гарэзлівасць. Божа мой! Няўжо мы, сівыя дзяды, можам спаліць гэтае найвялікшае тварэнне прыроды — дзяцей, людзей? Аднак прыступы гэтага страху нячастыя. А ўвогуле нагнятанне міжнароднай атмасферы, халодны вецер з двух бакоў мяне хвалюе менш, чым наша эканоміка, якую мы яўна заводзім у тупік. Што здарылася? Чаму пасля ўздыму, пасля гадавога росту на 8-10 працэнтаў мы так спаўзаем уніз? Седзячы на сесіі, слухаючы трэці раз нудны даклад Гвоздзева, я ўнікнуў у некаторыя лічбы плана — не ў тыя, пра якія гаварыў дакладчык,— у тыя, што ў матэрыялах, якія былі раздадзены,— у паказчыкі праекта плана. Знізіцца вытворчасць. Вытворчасць мяса ў 1982 годзе будзе ніжэй, чым у 1981-м. Гэта праўда. Гэта суровая і сумная рэальнасць. Зніжэнне электраэнергіі мяне ашаламіла і спалохала. Так дрэнна з палівам? Але далей: паказчыкі 1983 года і па мясу і па электраэнергіі будуць вышэй 1981 года. Адкуль гэта возьмецца? З чаго гэта выведзена? Па прынцыпу «авось» ці «а можа, бог дасць». У навуковасці такога планаванкя пачынаеш сумнявацца. У вогуле ў мяне часам з'яўпяецца злосная думка: з павелічэннем Дзяржплана, яго інстытутаў, з увядзеннем ЭВМ планаванне робіцца ўсё больш і больш заблытаным, маланавуковым, з «казачнымі» дыспрапорцыямі. За тое, што здарылася з чыгункай, трэба гнаць бруднай мятлой усіх, хто планаваў яе развіццё, кіраваў ёй.

На пленуме ЦК КПБ прыводзілі факты: на трактарным заводзе стаіць тры тысячы трактароў, забіты ўсе плошчы — няма вагонаў, на Бабруйскім шынным ляжыць 80 тысяч камплектаў шын розных габарытаўі І гэта ў той час, калі ў краіне сотні тысяч машын, трактароў стаяць з-за адсутнасці гэтых шын. Браткі родныя, што мы робім? Куды мы коцімся?

Робяцца спробы апраўдаць гэтатэмпамі росту: маўляў, у нас былі добрыя тэмпы, таму нам зараз цяжка. Ва ўчарашняй «Правде» нехта К. Улыбін, кандыдат эканамічных навук, піша: «Тот объективный факт, что в современных условиях при ускорении темпов развития экономики темпы роста ресурсов сокращаются, диктует далеко еще не всем ясную задачу: не где побольше взять, а как лучше использовать то, что есть». Апошняе правільна. Але чаму павінны скарачацца рэсурсы мяса, бавоўны? А што нафты, вугалю, дыкздабыча іх, калі верыць статыстыцы, расце. Аўтой жа «Правде» у паведамленні пра новыя оптавыя цэны гаворыцца: «В топливных горнорудных отраслях происходит процесс усложнения горно-геологических условий добычи нефти, газа, угля, руд в ранее освоенных районах страны, в результате чего возрастает стоимость их добычи». З цэнамі ў нас беспарадак, і іх даўно трэба адрэгуляваць — гэта бясспрэчна. Але ўзвядзенне гэтага тлумачэння да ўзроўню эканамічнага закону — глупства, на маю думку. А дзе ж удасканаленне тэхналогіі, рост прадукцыйнасці, пра які так многа мы гаворым? Дзе НТР? Я згодзен, што здабыча нафты, газу ў Сібіры каштуе даражэй. На цэны гэта павінна ўплываць. Але не на спад вытворчасці электраэнергіі прамысловых тавараў. Тут мімаволі думаеш пра Японію: у яе ўвогуле няма ні нафты, ні газу, ні руды, яна возіць усё гэта з Блізкага Усходу, з Амерыкі, Афрыкі. А тэмпы росту якія? А дасягнуты ўзровень, колькасны і якасны! Тэхнічны прагрэс!

Сумная думка: гаспадарым мы няўмела. Але чаму такія прарэхі ўзнікаюць цяпер, калі створаны такі каласальны індустрыяльны патэнцыял? З якімі цяжкасцямі ён ствараўся! У вайну армія не заставалася без снарадаў, патронаў, танкаў, самалётаў. І чыгунка, гэта самая наша чыгунка, якую бязлітасна бамбілі, якая працавала на дарэвалюцыйных цягніках, паспявала ўсё патрэбнае падвезці фронту. Чаго ж не хапае цяпер? Цеплавозаў? Вагонаў? Ці чаго іншага?

1 снежня

Прачнуўся ўначы і гадзіны паўтары жыў з героямі рамана — брэсцкай эпапеі. Магчыма, я забыўся (усё забываецца), але, здаецца, не было раней ні з адным раманам, каб я так доўга працягваў «жыць»

з героямі пасля таго, як раман напісаны. Можа, таму, што тут гістарычныя асобы, і я працягваю папаўняць сваё веданне і гэтых людзей, і таго часу. Ці ўсё выверана, праверана? Думаю, што на гэты раман я патраціў не толькі больш часу, але і творчай энергіі. Сачыняць, даючы волю фантазіі, прасцей, чым трымацца гістарычных фактаў, дакументаў. Як выкарыстаць тую ці іншую тэлеграму Леніна, Троцкага, якія маюць дачыненне да тэмы, у які кантэкст іх уціснуць,— гэта вельмі і вельмі няпроста. Можа, людзям, што «калупалі» сюжэты з уласнага носа, гэта здаецца проста: маўляў, няцяжкая работа — узяць пратаколы пасяджэнняў ЦК і на іх пабудаваць калізіі. Не! Не так гэта проста!

4 снежня

Учора пахавалі Бярозкіна. Уласна кажучы, пахавалі яго больш двух гадоў назад. Не мы. Жонка Ю. Канэ. Пасля інсульту засадзілі ў «Навінкі», тлумачачы ўсім, што, маўляў, ён зрабіўся агрэсіўным. Агрэсіўнасць была ў яго натуры і тады, калі ён быў здаровы. Нехта з урачоў казаў, што ён у выніку інсульту страціў мову, і яго тут жа спісалі як баявую адзінку.

У сталінскі час з ім расправіліся жорстка: тройчы садзілі — у 1937, 1940, 1949 гг. Я разумею: асабліва крыўднай для Бярозкіна была пасляваенная пасадка, бо ўсю вайну ён быў на фронце і супраць фашызму ваяваў, няхай сабе і ў армейскай газеце, шчыра, з поўнай аддачай.

Але з усіх тых, хто быў рэпрэсіраваны і рэабілітаваны пасля XX з'езда, я не сустракаў другога такога, хто меў бы столькі злосці на ўладу. Калі ён зразумеў, што чацвёрты раз яго не пасадзяць — іншы час! — то не таіў гэтай сваёй злосці і нянавісці.

Пайшоў снег. Густы. Адразу за акном зіма. Але зямля не прамёрзла. Была надзіва цёплая восень. Сухая. Вельмі спрыяльная для ўборкі бульбы, гародніны. Па зводках убралі ўсё. Але колькі бульбы застаецца ў зямлі! Сэрца баліць. А ў Астрахані, кажуць, яна па паўтара рубля за кілаграм. Мімаволі халадзееш ад такой цаны. Не так палохае цана на мяса. Але бульба!

Учора была жанчына з Пружан, удава майго таварыша па партыйнай школе. У Пружанах у магазінах кааперацыі даволі мяса, але па шэсць рублёў за кілаграм. А малака няма.

Ад такога забеспячэння ў Пружанах, Ашмянах, Лельчыцах, Ельску і ідзе яе просьба, уніжальная просьба: сын канчае медінстытут, памажыце, родненькі І. П., каб яго размеркавалі ў Мінск. Я спачатку абурыўся і хацеў выгаварыць ёй: мяса хочам есці, а ў вёску нават

урач не хоча ехаць. Але пашкадаваў: маці ёсць маці. Растлумачыў, што займацца мне гэтым няёмка — я ж пішу супраць гэтага.

А ўначы доўга думаў: гэта не проста бяда — трагедыя, што людзі так баяцца вёскі. Не проста людзі. Моладзь! Будучыя гаспадары. Хто ж у гэтым вінаваты? Яны? Не. Мы. Бацькі. Што мы зрабілі з вёскай? Як выхавалі сыноў сваіх і дачок? Дзе народнікі? Дзе падзвіжнікі? Рамантыкі? Рэвалюцыянеры? Адкрывацелі? Няўжо няма іх? А можа, яны пераспяваюць у нашых цяпліцах і хутка загніваюць? Ці не задужа крычым мы аб гераізме моладзі? Ці не замнога сярод іх прагматыкаў, спажыўцоў?

5 снежня

Увесь учарашні дзень і ноч ішоў снег. А зараз растае. Сыра. Няўтульна. Сумна. Учора павінен быў прыляцець да мяне балгарын — даследчык савецкага рамана. Дагэтуль, нябога, сядзіць недзе ў Шарамецьеве. Не зайздрошчу яму.

Не люблю зімы. Баюся яе. З дрыжыкамі ўспамінаю мінулую зіму, якая многім здаецца самай шчаслівай для мяне: атрымаў званне Героя Сац. Працы, юбілей мой адзначаўся шырока, і я сапраўды перажываў душэўны ўздым. 29 студзеня канчаўся з'езд КПБ. Кіраўнікі абласцей ужо ведалі пра ўказ. Прыйшлі віншаваць віцябляне, гамяльчане, магіляўчане. На другі дзень мне ўручылі Зорку, уручыў І. Я. Палякоў. У той жа дзень у тэатры Купалы — юбілейны вечар, па прывітаннях — цёплы, шчыры. А 31-га пасля абеду, які я даў у Доме літаратара, зламаў руку. Упаў у гардэробе, зачапіўшыся за бар'ерчык. Безумоўна, быў шчасліва ўзбуджаны, але п'яны не быў, хоць пасля злыя языкі і пускалі плёткі.

Ашаламіла мяне гэтае падзенне. На абедзе залішне многа гаварылі пра мае рукі — як многа імі напісана, і гэта, маўляў, таму, што я пішу дзвюма рукамі, і г. д. Гаварылі і шчырыя сябры, і тайныя зайздроснікі.

Пасля такіх удараў мімаволі пачынаеш верыць у дурное вока, у тэлепатыю, у любую чартаўшчыну. І ў лёс. У тэорыю ўраўнаважання радасцей і няшчасцяў. А лёс працягваў нанасіць удары. Праз дзевяць дзён, калі я яшчэ не знаходзіў месца ад болю зламанай рукі, штодня ўводзілі баралгін,— страшная вестка: загінула сястра мая Галя. Загінула трагічна, да неверагоднага недарэчна. Трыццаць гадоў працавала яна на ваеннай базе, размешчанай у лесе. За кіламетр-паўтара ад базы жыла, у пасёлку, які вырастай пасля вайны,— пасяліліся вольнанаёмныя, пабудавалі хаты. Яна ездзіла на працу на веласіпедзе, як і многія іншыя. У той дзень была ветраная раніца. Яна не даехала

нейкія пяцьдзесят метраў да прахадной — абламаўся са старой сасны сухі сук, упаў, ударыў па галаве... І адразу насмерць.

Урачы, Маша не пусцілі мяне на пахаванне — з такой рукой! Паехалі Маша і Саша. Божа мой! За ўсе свае 60 гадоў я не перажываў большых пакут, фізічных і душэўных, як у тыя дні. Каб не дзеці, не малая ўнучка, каб застаўся ў адзіноце — напэўна, скуголіў бы, як паранены сабака.

Вот такія ўдары лёсу бываюць, як гаварылі здаўна. І верылі ў лёс. Не маглі не верыць. Магчыма, што я перажываю такія ўдары лягчэй, чым многія іншыя. У сям'і маёй бывае тлумна, часам сумна ад хвароб, ад неразумнасці некаторых дзяцей, але самі гэтыя праблемы здымаюць вастрыню болю ад іншых удараў. Я, можа, як ніколі раней, зразумеў, якое гэта няшчасце — адзіноцтва.

Учора прымаў выбаршчыкаў. Прыйшла жанчына гадоў 40. Медсястра. Жонка дырэктара праектнага інстытута. Бяздзетныя. Трымаюць пудзеля. Ідуць на работу — яго зачыняюць, сабака скуголіць. Суседка колькі гадоў ваюе, каб знішчыць пудзеля, піша скаргі ў самыя розныя інстанцыі.

Наведвальніца спачатку абурыла мяне: інтэлігентная жанчына два тыдні просіцца на прыём да Старшыні Вярхоўнага Савета, каб расказаць пра свайго дурнога пудзеля! Не ведала, што я вораг сабак у гарадскіх кватэрах. Але мяне кранула, з якім хваляваннем яна расказвала — заікалася, са слязамі ў вачах, гатовая разрыдацца.

— Чым жа я вам магу памагчы? — бадай разгублена спытаў я.

— Іван Пятровіч, я не прашу дапамогі. Я дзякую вам, што вы выслухалі мяне. Мне так хацелася расказаць вам... менавіта вам пра сваю бяду. Я чытаю вашы кнігі...

І я зразумеў, што пудзялёк гэты — адзіная дарагая істота, што жанчына не ўяўляе жыцця без яго, а ўвогуле — гэта страх адзіноцтва. Магчыма, не ведаючы яго, адзіноцтва, я не зусім яшчэ ўяўляю, якое гэта няшчасце. Мне часам хочацца застацца аднаму. Але гэта розныя рэчы — пабыць аднаму, адпачыць ад сяброў, ад сям'і, і перажыць адзіноцтва, адчуць сябе адзінокім нават сярод людзей. Адзіноцтва сярод людзей! Жахліва, відаць?

8 снежня

І зноў эканоміка. Учора сабралі членаў ЦК, дэпутатаў. Раздалі тэзісы дакладаў пад гучным загалоўкам: «Рашэнні лістападаўскага (1981 г.) Пленума ЦК КПСС — баявая праграма партыі і народа».

Трэба ехаць у выбарчыя акругі. Большасць «адбарабаняць» па тэзісах. А я ў разгубленасці. У мяне адчуванне: нельга так гаварыць з

народам. Усё правільна: пяцігодка, план 1982 г., міжнародныя акцыі. Аднак, здаецца мне, наступіў час, калі пра ўсё гэта — і пра поспех і пра цяжкасці — трэба гаварыць інакш, зусім інакш. Але як? Гэтага я не ведаю. Гэтага не ведаюць высокія палітыкі.

Былі ў мяне «прастоі» і раней — паўзы паміж творамі, напісаным і тым, які належала напісаць. Але ў гэты час у галаве роіліся сюжэты, характеры — выбірай любы! А цяпер — пуста, з'яўляюцца час ад часу сюжэцікі. Але тут жа здаюцца дробнымі, мізэрнымі, не вартымі ўвагі. Што гэта? Павышэнне патрабавання да таго, што буду пісаць? Ці, можа, спісаўся? Сам падрабнеў, заеўся? Ды не, здаецца, заспакоенасці няма. Наадварот. Нямала роздуму, трывогі за лёс свету. Але трывожуся і за творчы прастой.

Многа заказаў на артыкулы. Але пісаць іх не магу. Соромна.

Пайшоў на экранах фільм «Вазьму твой боль». Кінатэатры арганізуюць сустрэчы з аўтарамі фільма. Разы тры выцягнулі і мяне.

Раней я любіў выступаць. Цяпер радасці ад гэтых сустрэч, хоць прымаюць мяне вельмі шчыра, не маю, адна стомленасць. Вось гэта ўжо, напэўна, прыкмета старасці. Сапраўды, пераступіўшы мяжу 60-ці, я пачуў сябе старым. Можа, гэтаму памаглі тыя беды, якія называю ўдарамі лесу.

10 снежня

Учора адкрылі помнік Максіму Багдановічу і правялі вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння.

Помнік харошы. І месца добрае. За яго ў ліку іншых змагаўся і я, за што ўчора Барташэвіч, які ўвесь час быў супраць гэтага месца, папракнуў мяне: ён па-ранейшаму лічыць, што помнік пастаўлены не там.

Але не гэта ўразіла. Гісторыя з помнікам пачалася ажно ў 1967 годзе. Тады ці, можа, на год пазней мы напісалі пісьмо ў ЦК. Пасля разы тры гаварылі з П. М. Машэравым. Я і Максім Танк. Дзякуючы менавіта яму, Машэраву, яго ініцыятыве, гады тры назад была прынята пастанова аб збудаванні помніка. Але хто ўспомніў пра гэта? Ніхто. Як і не было Машэрава.

Гілевіч зрабіў цікавы даклад. Літаратуразнаўца ён лепшы, чым паэт. Хораша яго на вечары пахваліла літоўская пісьменніца: «Вы, Ніл, выступалі, як ксёндз». Сапраўды-такі ксёндз!

18 снежня

Гэтая зіма пачалася прыгожа: выпаў глыбокі снег, стварыўшы праблемы ў гарадах, на дарогах, апошнія дні ўзялося на мароз. Сёння

ездзіў на дачу. Ад дачы Андрэя да сваёй прайшоўся пехатой. Казка. Сосны абсыпаны снегам. Снежная бель вадасховішча іскрылася пад сонцам, ажно балюча было глядзець.

Я сам, без архітэктараў, якія хацелі ўзяць за праект 4 тысячы, зрабіў някепскі і эканомны праект рэканструкцыі, нават знешне прыгожа, а функцыянальна проста добра. І ўсё гэта ў тры-чатыры разы танней, чым каштавала б па праекце прафесіяналаў, якія многа мудрылі б. Харство і зручнасць у прастаце.

Між іншым, рабочыя рамонтнага ўпраўлення, пра якіх расказваюць анекдоты — п'янюгі, рвачы, мне спадабаліся: ніякія не рвачы, канешне, выпіць могуць, але вядуць сябе прыстойна і за чаркай з імі пагутарыць цікавей, чым з іншымі пісьменнікамі.

Сёння соты спектакль «І змоўклі птушкі». Тэатр робіць маленькае свята, «раскалолі» мяне на вячэру. А я абыякавы. І, можа, упершыню мне шкада грошай на такую мэту. Што здарылася? Перанасыціўся? Страціў цікавасць?

26 снежня

Галоўліт (наш родны, беларускі) затрымаў другую частку (першая апублікавана ў пачатку гэтага года) рамана «Петраград — Брэст». Раман затрымліваецца нейкім цэнзарам Высоцкай. Дама гэтая выкарыстала адсутнасць свайго начальніка А. Маркевіча, пазваніла ў саюзны Галоўліт, магчыма, тамашняй Высоцкай. Давай раман у Інстытут марксізму-ленінізму ў Маскву. Беларускаму інстытуту гісторыі партыі не вераць, лічаць, што тут невукі. Вось так. А раман на беларускай мове. Толькі ленінскія раздзелы займаюць 350 старонак. Рабіць пераклад самому, за свой кошт, каб там прачытаў нейкі малодшы навуковы супрацоўнік? Ну не! Званіў Кузьміну, Паўлаву. Зрабілі выгляд, што нічога не ведаюць. Тым больш дзіўна, калі Высоцкая званіла ў Маскву без свайго ЦК. Хоць паспешнасць, з якой мяне звязалі з Кузьминым, здалася падазронай: здалося, што сакратарка чакала майго званка. З'яўлялася ў мяне і раней крамольная думка, што наш з Андрэем сябра не заўсёды бывае шчырым, такім, як мы з ім. Сумна. Грандыёзная сенсацыя для літаратурных абываталяў: раман члена ЦК, народнага пісьменніка аб Леніне «зарэзаны».

31 снежня

Скончыўся яшчэ адзін год. Сустракаем Новы. Па традыцыі віншуем адзін аднаго, збіраліся ў калектыве, выпілі па чарцы. Але дзе ранейшая радасць? Успамінаю маладосць. Як мы збіраліся! Як шумна балявалі. Аднойчы, помню, пазванілі гадзіны ў дзве ночы Лынькову.

Соф'я сказала, што Міхась Ціханавіч спіць. Здзіўляліся. Абураліся. Во, стары, абываталь: у навагоднюю ноч так рана заваліўся спаць! Праўда, Лынькоў у той год быў яшчэ маладзейшы, чым мы зараз, мы з Андрэем, яму было гадоў 55, не больш. Разумение старасці змясцілася, дзякуючы заявам накшталт тых, што «70 гадоў — сярэдні ўзрост». Як весела смяяліся з такой аптымістычнай заявы. А я адчуў сёння сябе старым і стомленым. Пайшоў у ЦК, каб пагаварыць наконт рамана: Маркевіч сказаў, было б даволі дазволу і тутэйшых дырэктыўных органаў. Сакратарка, дабрэйшая Алена Фёдараўна, і памочнік, здаецца, вадзілі мяне за нос: я сядзеў у Антановіча, АТК (Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін — абрэвіятура Андрэя) званіў яму, а ў кабінеце, калі я прыйшоў, яго не было, дзверы з прыёмнай у кабінет знарок былі адчынены.

Пазней, з БелСЭ, пасля провадаў старога года, я дазваніўся да АТК па ВЧ. Які ён быў добры! Колькі ласкавых слоў сказаў, выдаў найвышэйшыя пахвалы і мне, і раману. Але ўзяць на сябе дазвол на публікацыю не пажадаў.

— Ты ведаеш, тут на мяне і так капаюць,— шчырае прызнанне для кіраўніка такога рангу.— Але я зраблю ўсё, каб ніякай затрымкі не было. Пазваню Ягораву, Сеўруку.

Як умела навучыліся страхавацца нават людзі сумленныя па сваёй прыродзе! У вайну на самалёце ён нічога не баяўся: гарэў, падаў і зноў ляцеў.

У ІМЛ паслалі карэктуру «Полымя». Знойдуць там чалавека, які прачытаў бы па-беларуску?

Баюся дурных заўваг, дурных рэцэнзій. Па такіх заўвагах, якія носяць форму патрабаванняў, рабіць папраўкі немагчыма, бо нельга замест смелага абзаца ўставіць лухту, абракадабру. Ва ўсялякім разе я гэтага не ўмею.

Праўда, можна жыць па філасофіі, якую выказаў І. Я. Палякоў (пазаўчора мы з Андрэем былі ў яго, прасілі за чалавека, якога наўрад ці варта мілаваць, але сумленне не дазволіла адмовіць маці асуджанага, удаве Антона Бялевіча, якога я любіў, з якім выпіў не адну чарку). Калі я сказаў Івану Яўцеевічу, што мне сапсавалі Новы год гісторыяй з раманам, Палякоў адказаў:

— А чаго табе хвалявацца? Ты сваю справу зрабіў — напісаў. Цяпер няхай іншыя хвалююцца — каму трэба візіраваць, друкаваць.

Мудра і проста! Цікава, ці здолеў бы ён сам паводзіць сябе з такім спакоем у падобнай сітуацыі?

Але якое гэта шчасце — умець жыць па такой філасофіі! Я ўсё жыццё ў трапятанні: як бы нешта напісаць, дапісаць, апублікаваць,

як бы выканаць абяцанне, просьбу, нават калі гэта просьба накшталт Бялевічысінай: сынок уліп у гісторыю са згвалтаваннем. Пад канец года я спяшаўся разабраць усю пошту выбаршчыкаў... І так бясконца. Кожны год, месяц, дзень. А можа, хопіць? Сёння пазваніў мне Мікола Аўрамчык з Ялты. Пайшоў на пенсію. І чацвёрты месяц сядзіць у Ялце, у Доме творчасці. Пазайздросціў яму. Мудры чалавек!

Аднак пра год, які мінае. Падбіваю плюсы, мінусы ў апошнія гадзіны старога года. Была радасць — прысваенне Героя. Але ўвогуле год быў цяжкі, трывожны. Пералом рукі, смерць Галі, цяжкае заканчэнне рамана, клопаты з рэдагаваннем і ў заключэнне — затрымка з публікацыяй. І нават іншыя клопаты: рамонт дачы. Няхай бы былі проста клопаты. Але адчуваю, што мне налічваюць за рамонт больш, чым трэба, ужо заплаціў дзесяць тысяч, і гэта яшчэ далека не ўсё.

Было ўніжэнне на з'ездзе пісьменнікаў, прычыны дагэтуль не магу зразумець. Уніжэнне тонкае, езуіцкае, на якое здольны або стараверы накшталт Маркава, або апаратчыкі, як Шаура.

Часам думаю, што быў дадзены сігнал «адкрыць агонь» па раману: перад з'ездам я меў неасцярожнасць надрукаваць у «Звяздзе» раздзелы з Троцкім.

А можа, я раблюся падазроным? Баюся гэтай хваробы.

І ўсё ж: з Новым годам цябе, Іван! Збіраецца сям'я. Робіцца шумна. Адна малая Маша нарабіла каля ёлкі шуму на ўвесь Мінск.

З Новым годам вас, мае дарагія!

З Новым годам, мае добрыя сябры!

3 студзеня 1982 года

Новы год. Якім ён будзе? Для мяне ён пачаўся чадам. Я пачаў баяцца сам сябе: куды ні кінуся — выпіўка. Напярэдадні Новага года сабраліся «генералітэтам» БелСЭ. Выпілі. Сустрэча Новага года — бралі патроху да 4 гадзін раніцы. Першага трымаўся, хоць паўшклянкі кабернэ выпіў. Учора паехаў на дачу. Хацеў ціха пахадзіць, ціха пасядзець у сваёй рэканструяванай дачы. Не! На дачы аказаўся Цітавіч, чалавек, які ад майго імя сочыць за рамонтам, паліць, прыбірае... Пры рамонце вельмі патрэбны чалавек! Але Цітавіч не без хітрасці, не без карысці для сябе. Ён узрадаваўся майму прыезду. У яго захавалася прывезенае мной сала, паўпляшкі гарэлкі. Пілося добра. А пасля чакалі аўтобуса. Змёрз, як цюцік. Схапіў «левака». Магчыма, што тып гэты, нейкі інжынер, пазнаў мяне: выказваў такія думкі, што мне хацелася спыніць яго і вылезці. Распусцілі людзі языкі! Але ці можна асуджаць іх?

Сёння хацеў паляжаць, пачытаць. Чыхаў. Кашляў. Але завалілася ў хату Тамара Фёдараўна Залатухіна з двухгадовай унучкай. Пачалі гаворку аб старшыні Савета па беларускай літаратуры СП СССР. Яна супраць Ал. Ів. Аўчарэнкі, які ўзначальвае Савет сто гадоў. Яна раптам прапанавала Бакланава. О, божа!

Напярэдадні Новага года пазваніў М. А. Барысевічу: яго выбралі акадэмікам АН СССР. Хораша ён мне адказаў: «Нарэшце прабіўся адзін беларус». Я ўзяў даведнік АН БССР і сапраўды пераканаўся, што за 60 гадоў Барысевіч — адзіны акадэмік-беларус!

6 студзеня

Як навучыліся людзі самастойна нічога не вырашаць? Ці развучыліся вырашаць? Што больш правільна? Гэта страшная хвароба падрывае эканоміку, засушвае культуру. Як бы не паправілі зверху! А паколькі жыццё ўсё ж вымушае нешта вырашаць, нешта рабіць, то вынайшлі тысячы хітрасцей, прыёмаў, матэрыяльных і маральных прыпісак. А каго падманваем? Саміх сябе.

Цікава, чым скончыцца гісторыя з раманам? У СП сенсацыя: «зарэзалі» раман Шамякіна аб Леніне. Адны здзіўлены, другія спачуваюць, трэція злараднічаюць.

Паўлаў аптымістычна заспакойвае: фармальнасць! Учора я быў у яго. Шчыра пагутарылі. Але ў абход АТК і ён не хоча дзейнічаць. А АТК здзіўляе мяне і засмучае. Ён жа чытаў раман і віншаваў з удачай. Тыповы выпадак перастрахоўкі: нешта я вымушаны рабіць, але добра, каб усё вырашылася без майго актыўнага ўдзелу, неяк так, каб і козы былі сытыя, і сена цэлае, каб застацца верным партыйным прынцыпам, але і не наклікаць незадавальненне тых, каму раман можа не падабацца.

Часам я заводжуся. А часта бываю надзіва спакойны: а куды мне спяшацца з маім багажом у маім узросце? Няхай людзі пацешаць сябе, у іх жа таксама нямнога радасцей; кнігі некаторых уцэньваюць, прадаюць па капейцы, ці яшчэ горш: купляюць і тут жа здаюць у макулатуру, каб набыць Пушкіна, Горкага, Бальзака, Дзюма ці нават «Чорнага консула».

Заказ на кнігі гэтыя — «на макулатурны фонд паперы» (нібы гэта фонд іншай дзяржавы?) — мільён экземпляраў. М. І. Дзялец раздзяліў тыраж гэтай «класічнай» кнігі («Чорнага консула») ажно на чатыры выдавецтвы — для падкормкі. Яшчэ адзін узорчык нашага «мудрага» планавання!

11 студзеня

Глядзеў, слухаў зараз перадачу «Спор-клуб»: размова бывалых людзей з моладдзю на тэмы маралі. Сёння ў цэнтры былі мужнасць, смеласць, прынцыповасць. Нямала цікавага. Вёў Ралан Быкаў. Не вельмі актыўна вёў: харошы акцёр, рэжысёр, ён адчуваў сябе другараднай фігурай таму, што была першая: Юліян Сямёнаў. Во дэмагог і самарэкламшчык! Па форме ўсё правільна, а па сутнасці — самарэклама. У каментарыях на факты ўласнага жыцця дае прыклады з каралямі, прэм'ерамі, нават з Ота Скарцэні, з якім ён, Сямёнаў, сустракаўся ў Мадрыдзе. Мана, разлічаная на дурняў. І ў такога тыпа ўсё візіруецца, усё праходзіць. Хто ён, Юліян Сямёнаў? ! яшчэ адна дэталь у пісьмах аб фактах сучаснага жыцця мяне ўразіла: часам дробны факт, які нічым асабліва не вызначаецца — пісалі пра гэта сто разоў ва ўсіх газетах,— а пісьмо ананімнае. І Сямёнаў на гэта асабліва акцэнтаваў: асуджаў ананімнасць. Але што за гэтым асуджэннем? Маўляў, паглядзіце: школьнікі і тыя баяцца пісаць адкрыта. Безумоўна, ананімнасць — адна са страшных заган грамадства. Усё ананімнае: сігналы ананімныя, дэфіцыты ананімныя, забарона на выхад кнігі — ананімная, адказнага не знойдзеш. Але магчыма — з гэтым трэба змагацца зусім не так, як раіў гэта Сямёнаў.

...Быў у старшыні выканкома гарсавета С. Таразевіча. Актыўны, дзелавы работнік. Але ў размове, у якой закраналася нямала пытанняў, уразіла яго стаўленне да літаратуры.

— Былі ў мяне Танк і Гілевіч, прасілі кватэры, паказвалі спіс, каму патрабуецца палепшыць умовы. Чалавек сто. Але, прызнаючы шчыра, ніводнага з гэтых ста я не ведаю. Можаце асуджаць мяне.

Можна асуджаць яго? А можа, варта паглядзець на саміх сябе? Ці зрабіць нейкія іншыя вывады? Пра мову, напрыклад.

І аднак... У сваіх частых публічных выступленіях я ўзнёсла гавары ў пра дасягненні нашай літаратуры. Цяпер я часам задумваюся: а ці правільна я рабіў, уздымаючы так сучасную літаратуру? Ці не было гэта «хваробай» нашага часу, на якую хварэюць усе кіраўнікі,— своеасаблівымі прыпіскамі? Як у сельскай гаспадарцы. Вытворчасць расце, а мяса і малака ўсё менш і менш. Ды ці толькі ў сельскай? Працэнты ва ўсіх галінах высокія, а тавараў не хапае.

Так і з літаратурай. Па колькасці нямала, а чытаць няма чаго. Чытаць не хочуць. Просяць лірычнага Тургенева, сумнага Ганчарова, глыбокага Бальзака, лёгкага Дзюма, сучасны заходні дэтэктыў.

Мне здаецца, літаратура адыходзіць ад праблем жыцця. У літаратуры, як і ў грамадстве, залішне многа спажыўцоў развялося: больш узяць, чым даць. Але, бадай, не гэта галоўнае. Спажыўцы

заўсёды былі, спекулянты, і, калі нават сярод іх траплялiся небяздарныя сачыніцелі, не яны вызначалі грамадскую ролю літаратуры. Была сотня нядрэнных пісьменнікаў, і быў адзін Бялінскі. Былі многія прызнаныя «опровергатели», крытыкі тагачаснага ладу, і быў Горкі, які здолеў стаць сцягам.

Той жа Таразевіч спытаў сёння:

— А хто ў нас лепшы пісьменнік зараз? — і тут жа далікатна перапрасіў: — Акрамя вас...

Пазбавіў мяне права пажартаваць.

Я назваў яму дзесяткі імёнаў. Бачыў па выразу твару, што імёны гэтыя для яго, інтэлігента, кіраўніка,— пусты гук.

— А ў Саюзе?

— Шолахаў.

Ён засмяяўся.

— Не. Каб з сучасных...

Імёны — і зноў тая ж рэакцыя. Хіба толькі на Расула Гамзатава адрэагаваў.

— А Маркаў?

Ішоў па наменклатуры.

Тыдзень назад я прачытаў раман Я. Еўтушэнкі «Ягадныя мясціны». Ёсць старонкі таленавітыя. Але канцэпцыя... За што аўтар змагаецца? І арыентацыя: самы «правільны» вобраз Бранштэйна. І сімпатыя аўтара да маскоўскіх салонаў «заходнікаў». І да русафілаў нібыта з сімпатыяй. І пра тых і пра тых з аднолькавай іроніяй, маўляў, бясшкодная гульня — была, ёсць, будзе. Дарэчы, так пішуць большасць аўтараў «Нового мира», «Юности» ды і «Дружбы народов» (Трыфанаў). Маўляў, усё — «салонныя спрэчкі».

...Учора з Андрэем ездзілі на дачу (Маша іранізуе: ён табе звоніць, калі яму патрэбна машына, а не па душэўнай патрэбе). Няхай. Я званю па душэўнай патрэбе, бо толькі яму магу даверыць думкі, якія наўрад ці даверу каму іншаму.

Адзначылі Каляды.

Ён зноў «сотрясал воздух» супраць... Ехалі назад — высадзілі яго каля тэатра, ён пайшоў віншаваць Тарасава, яму прысвоілі званне народнага артыста СССР.

Я:

— Прывет Тарасаву. Усім,— і жартам:— Самы гарачы Раеўскаму.

Ад'ехалі, а Люба па прастаце ці прагнасці:

— Гэты Раеўскі выпрасіўу Андрэйкі паўтары тысячы рублёў.

— Калі?

— Тры дні назад.

— І ён пазычыў? — усё яшчэ не верыў я.

— Кажа, нельга не пазычыць: не пусціць Луцэнку ў Ленінград ставіць спектакль па яго п'есе...

Андрэй???!!!

11 студзеня

Прачытаў у «Нашем современнике» У. Крупіна «Саракавы дзень», аповесць у пісьмах, аповесць-эсэ. Кажуць, першага намесніка С. Вікулава Селязнёва звольнілі з пасады за гэтую рэч. Калі гэта праўда, шкада — неразумна. Не таму, што аповесць мне спадабалася. Я не ўхваляю такі паказ жыцця. Гэта як бы з-за хлява. А голая праўда, як і голая жанчына, непрыстойная, нават калі гэта прыгожая жанчына, тая, пра якую гаворыць маці героя, убачыўшы маладуху ў адным купальніку: «Ты в таком виде попа с обедни сдернешь».

Я не люблю голай праўды. Прыйшоў, убачыў, запісаў — хлёстка, ярка, выклікаў цікавасць. У каго? У абываталя? Дзе філасофія часу? Дзе выйсце, Крупін? Гэта рэпартаж таленавітага сузіральніка. Але праўда такая — што ананімнае пісьмо, на яго не трэба рэагаваць, але не прачытаць яго нельга, калі адчуваеш, што ў ім ёсць хоць дЬля праўды. Таму не трэба такога аўтара распінаць на крыжы! З некаторых назіранняў варта было б зрабіць вывады.

Мяне зацікавілі не самі факты; я іх ведаю не менш.

У маіх раманах, нават тых, што напісаны 20 гадоў назад, ёсць многія з гэтых фактаў. Але ёсць і героі, якія змагаліся з негатыўным, а не проста рэгістравалі, як робіць Крупін. Але ў яго ёсць іншае, чаго, магчыма, не хапае мне,— афарыстычнасць абагульненняў, вывадаў.

Напрыклад:

«Как же долго шел я и как запоздало пришел к тому, что дело не только в знаниях, не в количестве информации, от избытка ее только глупеешь, что не стыдно чего-то не знать. Что ходячие энциклопедии невыносимо скучны, что эрудиты — это мешки, набитые дрянью сведений, а самомнение с Монблан. А телевидение как их плодит. Не успев зародиться, оно вырождается».

«Желание славы и желание славы отечеству — вещи полярные. А слава — это когда ты сам знаешь малое число людей, а тебя многие, так что это арифметика».

«А тот, кто хорошо докладывает о битве, тот не бился».

«И в отдел науки я просился только оттого, что ученые, по крайней мере, знают, что ничего не знают». (Хоць гэта ўжо з анекдота.)

П'яны бацька героя:

«Горю,— ответил он и запел: — Горит село, горит, родное, горит вся родина моя...»

14 студзеня

Пазаўчора былі з Андрэем у АТК. Гутарылі доўга, шчыра, пасяброўску. Але пасля я думаў: а ці ўсё было шчыра ў адносінах да майго рамана? АТК тут жа, пры нас, пазваніў П. А. Радзіёнаву, нам. дырэктара ІМЛ, той нібыта гаварыў камплімenты (так перадаў пасля размовы АТК): ведаем, любім, чытаем, паважаем, верым, але... Хацелі паслаць у наш Інстытут гісторыі партыі. Але... што але? Патрабуюць перакладу на рускую мову. Во як!

У размове Андрэй выказаў прапанову, што, можа, паслаць Зімяніну. АТК пачаў расказваць, як паважаны Міхаіл Васільевіч не любіць, калі яму нагадваюць, што ён беларус. Вось так!

Настрой сёння сабачы. Сядзеў цэлы дзень, чытаў сцэнарыі А. Петрашкевіча, А. Дзялендзіка. Задумы нібыта і нішто, але работа «тапорная», чарнавая. Перад гэтым прачытаў А. Дударава. Канешне, напісаны лепш, чым у гэтых сівых драматургаў. Але... ёсць нейкая літаратуршчына, не ў старым значэнні слова — у новым: новая літаратурная мода, «хадзячы» сюжэт нашага часу, які хлынуў пасля «Прощания с Матерой». Мая няшчасная літаратура! Не кіно. Літаратура. Пра кіно ўвогуле сур'ёзна цяжка гаварыць.

16 студзеня

Лісты ад чытачоў. Колькі іх! За мае творчае жыццё — многія тысячы. Хвалямі. Зараз новая хваля ў сувязі з надрукаваннем «Вазьму твой боль» у «Роман-газете».

Многія просяць кнігу з аўтографам. Цяжка зразумець — хто гэтыя людзі? Сапраўдныя кнігалюбы? Ці спекулянты, якія кнігу з аўтографам прададуць за двайную, трайную цану.

Разбіраў пошту. Пісьмо з Сыктыўкара. Старая жанчына ўзяла ў суседкі «Роман-газету» з маім раманам, і ў яе ў магазіне ўкралі кнігу. Суседка з'ядае. Падобна на праўду. Паслаў два экземпляры. Кнігу з аўтографам Т. І. Паповай з Анадыра, што напісала ад імя сям'і Афанасьевых. Іх бацька, франтавік, палкоўнік, лежачы ў 50-х гадах у шпіталі, арганізаваў па «Глыбокай плыні» канферэнцыю сярод шпітальнікаў. Дачка не можа гэтага забыць. Але кніга ў сям'і не захавалася. Вельмі просяць прыслаць. Выданняў «Глыбокай плыні» ў мяне засталося нямнога. Але ахвяраваў адзін экземпляр. Не столькі таму, што мяне расчуліў расказ пра бацьку, а таму — дзе людзі

жывуць. На краі свету! Дзе той Анадыр?! Мне ў Бабруйск з'ездзіць — праблема.

А вось інвалід з Ленінграда. Я паслаў яму, здаецца, «Сэрца на далоні». І цяпер ён не просіць — патрабуе ўсе мае кнігі, пералічае пад нумарамі: 1. «Крыніцы» і г. д. Такому больш не пашлеш.

Пісьмы чытачоў, выбаршчыкаў, сваякоў. Колькі трачу на іх часу! Расказваў С. Каўганюк, перакладчык «Крыніц» на ўкраінскую мову. Прафесійны перакладчык. З рускай мовы ён пераклаў дзесяткі кніг. У тым ліку «Ціхі Дон». М. Шолахаў не адказаў ні на адно яго пісьмо. У мяне дваістае стаўленне да гэтага факта. А можа, сур'ёзны пісьменнік не павінен траціць час, энергию на падобныя адказы? А Талстой? Горкі?

Цяпер, у старасці, я таксама адказваю далека не на ўсе пісьмы. Але мне ўвесь час здаецца, што гэта нядобра, неэтычна: што людзі будуць думаць пра мяне?

Прыязджаў Мікалай, брат Машы. Перад гэтым чалавекам мне заўсёды чамусьці сорамна. Ён, селянін, лепшы за мяне. Інвалід вайны, без вока, ён, працуючы ў саўгасе, вядзе нядрэнную гаспадарку: карова, свінні, куры. У лістападзе я ездзіў у Церуху, ён закалоў кабана і адваліў мне кілаграмаў 30 свежаніны. Цяпер закалоў другога — і прывёз сам зноў жа кг 30-40, ледзь дацягнуў. І грошы не ўзяў, як ні прасілі.

Вось людзі, якія маглі б заваліць краіну мясам! Але як іх арганізаваць, накіраваць?

З расказаў Мікалая:

Дробны злодзей, клічка Памідор. Прыходзіць да старога, вядомага бондара, які толькі што купіў кг 40-50 жалеза на абручы, заходзіць пад паветку, бярэ палавіну жалеза, перакручвае дротам, нясе ў хату:

— Дзед, жалеза купіш? Дзяшова прадам.

Гэты ж Памідор крадзе сам у сябе, сваё ўласнае сала — каб выпіць. Сала ў кубле змерзлася. Вазьмі зверху — жонка тут жа выявіць кражу. Дык ён паварочвае бочку, выбівае ў дне клёпкі і бярэ спаднізу. Жонка зверху — для сябе, ён знізу — на прапой. Ажно пакуль жонка не дабралася да пустаты. Арыгінал!

Псіхалогія селяніна, безумоўна, мяняецца. Але куды? У які бок?

Я пачынаю разумець «деревенщиков», хоць не з усімі іх канцэпцыямі магу пагадзіцца. Некаторыя з іх не разумеюць, што павярнуць вёску назад нельга. Яе трэба «сарваць» з гэтай п'янай закісі і зусім на новай аснове — на якой? — моцна штурхануць наперад. Няхай гэта будзе ўдар каленам у мяккае месца, няхай разаб'юць

некаторыя лбы, але каб быў нейкі рух, каб не было гэтага тупога застою ў псіхалогіі земля роба.

18 студзеня

Ён пераклаў слабыя раманы Міхася Машары. Пераклады прайшлі непрыкметна. Але пасля таго ён вырас там, у Маскве, ажно да намесніка загадчыка аддзела ЦК КПСС. Я ўспомніў гэтага перакладчыка. Сур'ёзны чалавек. Здолее сказаць слова ў ІМЛ непасрэдна, з вока на вока, аўтарытэтна.

Пазваніў яму, здаецца, яшчэ ў жніўні. Ён адразу ж згадзіўся. Я выслаў яму раман. У лістападзе мы сустрэліся. Ён прыехаў са справаздачнага сходу ў «Советской России» да нас у гасцініцу, вясёленькі. Высокі, лысы, цыганісты. Раман ён хваліў, заўвагі рабіў не па ленінскіх раздзелах, напрыклад, сказаў: «Русафілы не даруюць вам Міры». Прызнацца, гэта мяне насцярожыла: нечакана. Я пісаў гэты вобраз са шчырымі інтэрнацыянальнымі пачуццямі і думаю, што праўдзіва: рэвалюцыю рабілі рускія, украінцы, беларусы, яўрэі, грузіны, армяне.

Але ўвогуле мы хораша пасядзелі, добра выпілі. Выпіць ён умее. Мяне зноў насцярожвала, што ён саркастычна, бадай здзекліва адзываўся пра такіх пісьменнікаў, як Пташнікаў, Адамовіч. Пахваліўся, што гэта ён некалі выступіў у «Правде» супраць «Мёртвым не баліць». Я, між іншым, помніў, што быў такі артыкул, але аўтара не помніў.

— Будзем працаваць? — спытаўся я.

— Безумоўна, будзем! — ахвотна згадзіўся ён.

Калі ўзнікла сітуацыя з пасылкай рамана ў ІМЛ, я званіў яму — ён гаварыў разважліва, абяцаючы памагчы, каб прачытаў нехта ў арыгінале.

Я напісаў яму залішне шчырае пісьмо — са сваімі ладазрэннямі, апасеннямі. Вось тут я, дурань, даў маху. Людзям такога тыпу нельга пісаць, з імі трэба гутарыць па тэлефоне, гэта іх стыль работы, стыль адносін, з усімі, можа, нават з жонкай.

Сёння я пазваніў яму. Голас кіслы.

— Што можна зрабіць, Уладзімір Мікалаевіч?

— Трэба падрадкоўнік.

— І ніякага іншага варыянта?

— Не. Гэта правіла.

— Колькі вам трэба часу на пераклад?

Паўза.

— Ведаеце. У мяне вельмі мала часу. Я не пакрыўджуся, калі вы знойдзеце іншага перакладчыка.

Я, ветлівы чалавек, падзякаваў яму за шчырасць.

На душы пагана — не ад узнікнення новай цяжкасці — ад расчаравання ў чалавеку, якому паверыў. Расці вялікі, Ул. Мік. І

24 студзеня

Пасля сюжэта «Петраграда...» усе сюжэты, усе характары здаюцца дробнымі, непатрэбнымі. Каму патрэбна яшчэ адна сямейная драма ці вытворчы канфлікт, які, як правіла, напалавіну, для закруглення вострых вуглоў, прыдуманы намі, літаратарамі?

Ад гэтага скептыцызму, адсутнасці суразмернага сюжэта, характараў я не магу пачаць новую працу. А трэба! Ох як трэба!

Быць у страі — самае неабходнае адчуванне. Няпраўда, што мы індывідуалісты. Безумоўна, пішам мы кожны ў сваёй нары. Але толькі ў «страі» мы можам ісці наперад, а не таптацца на месцы ці кружыць вакол саміх сябе, як у лесе ў хмарны дзень.

У гэтай агульнай калоне кожны павінен ісці са сваёй зброяй. У каго «пісталет», у каго «гармата», «ракета»,— сюжэт для аповесці, рамана. А ў галаве — сюжэцікі, Ды і на душы пагана. Калі я выйду з гэтага стану?

У бяссонніцу ўспамінаў, як я пісаў... як не мог не пісаць.

Мурмашы. Батарэя. Вучэбная, баявая. Жывём у зямлянцы, цэлы ўзвод у адной зямлянцы. Без вентыляцыі. Няма чым дыхаць. Ды ў дадатак яшчэ — палярная ноч. Ганяюць нас, як сідаравых коз. Амаль штоночы — баявыя трывогі. І не адна. Дзве, а то і тры. Задача: навучыцца за мінуту апрануцца, дабегчы да гарматы, расчахліць, далажыць аб гатоўнасці. Нямногія з гэтых навыкаў спатрэбіліся ў часе вайны, бо адразу ўзніклі зусім іншыя ўмовы. Пэўны аўтаматызм дзеянняў зенітчыку патрэбны. Але больш за ўсё патрэбна была баявая стральба. А мы за восем месяцаў вучобы ні разу не стралялі баявымі снарадамі — хаця б у неба, не па цэлі. А таму ў першыя дні вайны абсалютна не ўмелі страляць. Вайна навучыла. За тыдзень-два. Але гэта між іншым. Адным словам, вельмі не хапала сну. На запятках па тэорыі засыналі, што мухі. І як чакалі, як цанілі абавязковую гадзіну пасля абедзеннага сну. У гэтую гадзіну нават па трывозе рэдка паднімалі: спалі ўсе — курсанты, афіцэры, акрамя дневальных, ды і тыя лоўка навучыліся спаць, прысланіўшыся да «грыбка», да сцяны сталоўкі: у светлую гадзіну палярнай ночы гэта можна было дазволіць сабе — трыбуналу аддавалі за начны сон на пасту.

Як жа здзівіліся мае камандзіры — узводны, батарэйны, калі я раптам звярнуўся з просьбай дазволіць мне ў час пасляабедзеннага сну... пісаць.

У першыя дні камандзіры ажно самі не спалі: заглядвалі ў сталоўку, дзе я сядзеў і пісаў. Калі я падскокваў пры іх з'яўленні, большасць з іх проста бянтэжылася, яўна адчуваючы няёмкасць ад таго, што перашкодзілі чалавеку ў такой працы, забываліся на сваю камандзірскую строгасць.

«Пішы, пішы»,— і знікалі.

Камандзір батарэі Тамразян, пра якога я гадоў праз дваццаць напісаў у артыкуле для армянскай газеты і мы пазналіся зноў, завочна не мог успомніць мяне, ажно пакуль В. Вольскі не нагадаў яму: гэта той, што пісаў, калі ўсе спалі.

Тады Тамразян выгукнуў: «Помню! Помню!»

У вайну пісаць было прасцей, асабліва калі я стаў камсоргам дывізіёна.

Пракопаўка. 1946-1947 гг. Шэсць гадзін у школе. Сход у Будзішчы ці Чарацянцы — за чатыры кіламетры, сход, які з шасці да дзевяці збіраўся і пасля цяжка праходзіў. Я — ідэаліст, я верыў у свае палымяныя заклікі — што і кароў можна легка вырасціць, і поле... усё поле засеяць у самы сціслы тэрмін... з дзесяццю коньмі, з адным даваенным трактарам на два калгасы. Але зноў-такі — гэта асобная тэма, часткова я рэалізаваў яе ў аповесці «Мост».

Вяртаўся галодны, змёрзлы, гадзін у дванаццаць ночы. У пакойчыку холадна. Столік на трох ножках прытулены ў куце, паміж вокнамі. У левым — шыбы з кавалкаў шкла, правае забіта фанерай. Пры ветры праз шыбы моцна дзьмула, часам раніцой са стала змяталі снег.

Сяджу ў шынялі, у шапцы. Пішу да трох ночы, хукаючы на азяблыя рукі. Пішу «Глыбокую плынь». Смяюся і плачу разам з героямі. І столькі радасці, што я ствараю іх, даю жыццё ім!

Мінск, 1948-1949 гг. Прыватны пакойчык — клапоўнік. Двое дзяцей — з'явілася Таня. Я вучуся ў партшколе. Трэба рана на заняткі. Трэба вывучаць сур'ёзныя навукі. Вучу іх, навукі, у школе, дома, трымаючы Таню на руках. Але да болю хочацца пісаць. Пачаты «У добры час». Дамаўляюся ў выдавецтве, яны даюць мне ключ, я іду ў Дом друку і ў пракураным за дзень пакоі пішу вечарамі, у нядзелю. Маша раўнуе. У яе поўна клопатаў. А ёй хочацца жаночых радасцей, хоць маленькіх, ёй жа ўсяго 28 гадоў. А хіба мне не хочацца ў тэатр, у кіно? Але першае і галоўнае — пісаць.

Нядаўняе. У санаторыі «Аксакаўшчына», у люксе. Пішу пра Івана Батрака, які расказвае жонцы, як забілі яго маці. Эмацыянальная сцэна. Не магу адарвацца. Нават на працэдуры не хаджу. Пасля снядання — за стол. Сусед, міністр гандлю Малочка, з якім часам

перад вячэрай бяром па чарцы, здзіўляецца: «Што вы робіце, Іван Пятровіч? Вы так загоніце сябе. Вы столькі ўжо напісалі! Куды вам спяшацца? Вы ж прыехалі адпачываць, палячыцца».

Яму не зразумець майго стану. А мне нібыта няёмка тлумачыць, што ёсць моманты, калі адарвацца ад рукапісу нельга. Ён ад сваёй працы адрываецца, напэўна, лёгка.

І зусім нядаўняе. Ранняя вясна, сакавік і красавік. Сям'я яшчэ не можа выехаць на дачу, дзеці вучацца, працуюць. Жыць аднаму — няўтульна. А ў горадзе за зіму абрыдла. Ды і перашкаджаюць свае і чужыя — званкамі. Еду на дачу з раніцы. Дом не напаліш. Палю лазню, яе можна нагрэць мінут за сорак, за гадзіну. Саджуся ў «прадбанніку» і пішу. Цішыня. Толькі сосны шумяць. Шпакі спяваюць. У лазні самыя прадукцыйныя гадзіны, дні працы. Няёмкасць хіба адна: для «Петраграда...» трэба мець пад рукой нямала кніг, у галаве ўсяго не ўтрымаеш. Важу туды-назад партфель кніг. Раптам назаўтра нешта перашкодзіць «паехаць у лазню», таму кнігі трэба вазіць.

Куды дзявалася мая працаздольнасць? Няўжо так хутка старэю? Ці выбіты з сядла? А пісаць хочацца. Свярбіць рука. Рукі, мае пакутныя рукі, з распухлымі, скручанымі артрытам пальцамі, са з'едзенымі псарыязам пазногцямі. Праклятая хвароба, ад якой вось ужо 17 гадоў пакутую маральна. З-за ногцяў. Мала хто ведае, што гэта такое. Тлумачыць не станеш. Хвароба гэтая пазбаўляе мяне многіх радасцей. Добра, што маю сваю ўласную лазню, там я працую, там мыюся — адзін.

Радасці... Трагедыя ў тым, што іх становіцца ўсё менш і менш. Часам я з болем думаю: што засталося ў Крапівы? Яму 86 гадоў, сляпы. Напісаў дзед п'есу, безумоўна, апошнюю. і Раеўскі робіць усё, каб не паставіць яе. Наша з Андрэем абурэнне ў Кузьміна, здаецца, засталося без вынікаў. Наш наскок на Раеўскага АТК адбіў бадай што са злосцю: «А з кім я застануся?» Вось так! За 25 гадоў выпусцілі з інстытута каля 70 рэжысёраў і ніводнага з іх не вырасцілі да галоўнага. Галоўнымі яны сталі ў іншых рэспубліках, у абласцях РСФСР.

30 студзеня

Праляцеў яшчэ адзін год. Мне — 61. Некаторыя старэйшыя бадрачкі махаюць рукой: гэта, маўляў, узрост ніжэй сярэдняга. Дурная бадзёрасць, калі сур'ёзна абвяшчаюць, што 70 — сярэдні ўзрост. Дорага каштуе народу гэтае бадрацтва.

Я адчуваю свае гады. Я стаміўся. Многа працаваў у жыцці? Ці далі знаць сябе беды гэтага, першага года сёмага дзесятка? Пералом

рукі, смерць Галі, уніжэнне на з'ездзе, недарэчная гісторыя з раманам.

31 студзеня

Аляксей Кулакоўскі толькі сёння ўспомніў пра мой дзень нараджэння. Учора ён цэлы дзень пісаў. Я спачатку пазайздросціў: у 70 гадоў, пасля анкалагічнай аперацыі — і такая работа. А пасля падумаў: а навошта гэтая работа? Апошнія рэчы слабыя, нечытабельныя. Пашка шкадаваў старога. А яшчэ больш шкада стала, калі ён шчыра папрасіў:

— Звані, Іванка. А то я вельмі адзінокі чалавек.

Столькі смутку ў гэтым прызнанні! І прагучэла яно дакорам мне, Андрэю, іншым яго сябрам. Мы гадоў 25 былі разам — чацвёра: я, Андрэй, Аляксей, Пятро Васілеўскі. Андрэй пасварыўся з Пятром, стаў скептычным да Кулакоўскага. Яны адышлі. Мы засталіся ўдвух. Але хіба мы не адзінокія? Гэта трагедыя часу: працуючы ў вялікіх калектывах, людзі, па сутнасці, адзінокія. Асабліва ў старасці.

Вельмі разумею смутак Кулакоўскага і яго прагу пісаць. Пісаць і мне хочацца. Але што? У мяне вышэй пачуццё адказнасці за тэму, за сюжэт. Я меў і пакуль што маю адзіную радасць: мяне чытаюць. Мяне не прызнаюць некаторыя крытыкі, але мяне заўсёды прызнаваў, любіў масавы чытач, розны — ад калгасніка да доктара навук. Тысячы пісем, якія я атрымаў як водгукі на раманы,— сведчанне гэтаму.

Можа, пачаць аповесць па ўспамінах маленства? Банальнымі здаюцца заклікі «вывучаць жыццё», «ведаць жыццё». Але калі быць рэалістамі, то трэба прызнаць: не ведаем мы яго, сучаснае жыццё, не ведаем сучасных праблем, не маем філасофіі для іх асэнсавання.

Намацалі былі праўду часу «деревенщики», але, здаецца, і яны выдыхаюцца — іх выдыхаюць «мудрыя» крытыкі тыпу Озерава.

Многа мы з Андрэем разважаем пра сучаснасць. Але ці ведаем мы яе? Ці не ад няўпэўненасці ў сучасных тэмах я звярнуўся да гісторыі? Андрэй піша камедыю пра амерыканскую вярхушку, што ад страху перад ядзернай катастрофай залезла ў падземны бункер, і там людзі гэтыя дзеляць уладу паміж сабой. Аб атамнай вайне камедыю?!

Не, жыццё мы, магчыма, і ведаем, а вось філасофіі сапраўды не маем. Эклектыка. Размываюцца ўсе крытэрыі.

А можа, праўда — аповесць пра маленства? Зіма. Леснічоўка. Адзінота. Радасць з'яўлення любога чалавека: ці бацька прывядзе парубшчыка, ці прыедзе дабранскі яўрэй і абавязкова зойдзе ў хату, дасць нам, малым, па ледзянцу. І раптам віхор падзей: парубшчыкі цяжка паранілі бацьку, праз год бацька забіў парубшчыка, ратуючы

суседняга лесніка. Не хапае хіба аднаго: настройкі, звароту туды, у шчаслівае горкае маленства. Жыву ўсё ж сучаснасцю. Прагну акунуцца ў сучаснасць, як у гаючую крыніцу,

5 лютага

У БелСЭ быў сход аб новых прынцыпах спаборніцтва, выпрацавалі новае палажэнне, у якім нават прапагандуецца брыгадны метад. У навукова-творчым калектыве? Здалося гэта штучным, як і многія пачынанні ў сельскай гаспадарцы, якія былі скіраваны на павелічэнне вытворчасці, а ў выніку прывялі да яе зніжэння. Але справа не ў гэтым. Страсці, што гарэлі на сходзе — як падлічваць артыкулы, знакі, здаліся мне мізэрнымі, ва ўсялякім разе далёкімі ад маіх творчых інтарэсаў. Разумею, што праца — не свята, а выкананне абавязкаў, часта не такіх ужо прыемных.

У каторы раз падумаў: а ці за сваю я справу ўзяўся на сёмым дзесятку жыцця. Мне гавораць: які ты стары? Зараз сярэдні ўзрост 70. Смешна чуць гэтае «бодрячество»! Выдумка чыноўнікаў, якія навучыліся не вельмі перапрацоўвацца і не вельмі адказваць за справу. Рабочыя, сталявары, напрыклад, з нецярпеннем чакаюць, калі можна будзе пайсці на пенсію.

Мне было нялёгка ў СП. Таму я здаўся на ўгаворы Машы і Андрэя пайсці адтуль. Цяпер часам шкадую. Там былі стрэсы, але работа без падліку знакаў. Тут, у БелСЭ, работа спакойная, не шумная, а стрэс, здаецца мне, я перажываю ціхі, але доўгі. Што больш небяспечна?

Пра сельскую гаспадарку, пра пачынанні ў ёй я прыгадаў у час адной сённяшняй сустрэчы. Выходжу з будынка ЦК. У фае мяне гукае нехта. Паварочваюся. У кутку за столікам, на якім попельніца з гарачымі недакуркамі, сядзіць Барыс Васільевіч Бокуць, рэктар Гомельскага універсітэта, мілейшы чалавек, шчыры беларус, партызан, інвалід вайны, у яго каля пазванка сядзяць асколкі, і ён па некалькі месяцаў ляжыць у ложку, ходзіць у карсеце.

Супраць яго маюць дарагія землякі стварылі справу за тое, што ён пачаў будаваць на Сажы пад Веткай дачку, 35 м жылой плошчы. Рэктар, вучоны-фізік, акадэмік. Чаму ён не мае права хоць колькі гадзін адпачыць на прыродзе, за горадам? Здаецца, недурныя людзі ў абкоме. Навошта ім спатрэбілася цкаваць з-за глупства сур'ёзнага чалавека? Мала вам у Гомелі жулікаў? А галоўнае — мала спраў у сельскай гаспадарцы? Яна ж коціцца ўніз. І ўсё з-затакіх вось нашых левых заскокаў. Так мы нядаўна паступалі з уласнікамі кароў і свіней, як з акадэмікам Бокуцем з-за яго дачы. Тым больш недарэчна, што

калегі яго, што жывуць у Мінску, у Маскве, будуюць намнога лепшыя. Каму ж патрэбна гэтая двайная арыфметыка?

Гутарылі мінут 20, і гэты хворы чалавек скурыў яшчэ штук восем цыгарэт. Божа мой! Няўжо нам сталі непатрэбныя вучоныя-фізікі, вопытныя рэктары? Непатрэбны Бокуць... Сумна.

Учора выступаў у ваенна-палітычным вучылішчы. Ваенныя зрабілі ўражанне рэалістаў. Раней я баяўся іх, нават Жукава некалі баяўся з яго банапартысцкімі заскокамі. А цяпер ваенныя здаюцца большымі рэалістамі, чым Кузьмін, Мікуліч, Хусаінаў.

Пасля добрай гутаркі ў ваенных меў глупства паехаць на юбілейны вечар А. Карпава, кінарэжысёра, цяперашняга першага сакратара СК; ён сапсаваў маю аповесць «Шлюбная ноч», паставіўшы паганы фільм. Ён сам званіў, прасіў быць. Званілі яго падхалімы. Званкоў восем. А я далікатны чалавек. Якая ж помпа была! Местачковы балаган. Сабраў прадстаўнікоў рэспублік і сваіх — творчыя саюзы, прафсаюзы, спортбыт, клубы, піянераў. Сорамна было слухаць!

Гаварыў з маладым галоўным рэжысёрам ТЮГа, дзе пастаўлены тры мае п'есы, аб пастаноўцы «Залатога медаля». А ён: дайце «Брэст»... І з п'янай пагрозай:

— Раеўскі сказаў, што ён гэтага вашага рамана ставіць не будзе.

А я і не прапаноўваў. Не думаў нават. Але якая ўпэўненасць! Намнога гадоў наперад Раеўскі спланаваў, што будзе ставіць, чаго не будзе.

6 лютага

Гадзіны чатыры пісаў прадмову да альбома «Савецкая Беларусь». Да 60-годдзя Саюза ССР. Безумоўна, альбом святочны. Інакш яго нельга скласці. Але тым цяжэй было пісаць гэтую прадмову. Трэба быў высокі стыль, патэтыка. Я гэта ўмеў раней. А цяпер — як заела. Назойліва лезлі штампы. На пераадоленне іх траціласа добрая частка творчай энергіі. За чатыры гадзіны працы літаральна выдыхнуўся. Ажно пасля завяршэння працы захацелася выпіць чарку каньяку. А Маша бурчыць: шукаю прычыны, каб выпіць. Не, не шукаю. Але так атрымліваецца: сустрэчы, вечары, юбілеі, выступленні. Нават ваенныя добра пачаставалі ўчора. І з імі было прыемна выпіць. Не тое што з нашымі некаторымі палітыканамі, перад якімі трэба рэдагаваць нават застольныя тосты, інакш перакажуць іх перавернутымі дагары нагамі.

Людзі рвуцца ў камандзіроўку, тым больш у Маскву, Мне трэба 10 лютага быць на пленуме праўлення выдавецтва «СП», а не вельмі хочацца ехаць. Нецікава. Ды і абараняць нікога не трэба — усе, каго я

рэкамендаваў, кал і быў у СП, прайшлі. Шчасліва вам, сябры! А я... мяне нават уласныя выданні не вельмі цікавяць. Толькі цяпер пачынаю разумець старога Лынькова: у апошнія гады свайго жыцця ён быў абыякавы да сваіх выданняў і 50 тысяч зароблены х за жыццё грошай завяшчаў школе.

Між іншым, мы пасля не ведалі, як і каму іх перадаць, яго грошы. Саўмін мусіў прымаць распараджэнне. Збудавалі нейкую спортзалу. Грошы ў наш час нікому не патрэбны, дай ліміты пад гэтыя грошы. А ліміты выбіваць вельмі цяжка.

Многа я трымаю ў памяці, а сюжэта не маю. Ці не праз тое, што залішне многа ведаю? Ці трэба пісьменніку гэтулькі ведаць пра механізм кіраўніцтва эканомікай? Гэтая інфармацыя, гэтыя веды часам засланяюць людзей. А мне трэба людзі. Людзі!!!

8 лютага

Эпапея з маім раманам развіваецца. Па законах дэтэктыва. Як бы лепш арганізаваць эскіз сюжэта? У пятніцу папрасіўся на прыём да Ціхана Якаўлевіча. Напісаў яму пісьмо. У пятніцу ён быў занят ы!. Памочнік (які памочнік — бог! Сам Крукаў!) сказаў, каб я пазваніў у 9 сёння. Званю.

— Пачакайце. Далажу.

Праз паўгадзіны на мой званок:

— Перадаў, што скажа пазней, — і незразумела дадае: — Чаго не было ніколі.

Шчырае здзіўленне Крукава? Ці — шпілька мне?

Сабралі членаў ЦК, каб прачытаць пісьмо ЦК КПСС аб пазіцыі італьянскай кампартыі. Пазіцыя вядомая. У кампаніі простых людзей гэта трэба так і назваць: «Назіцыя трацкіста Берлінгуэра», Цямнім. Чаму? Навошта?

Садзіцца побач С. Паўлаў:

— Раман твой ІМЛ прысылае ў наш інстытут.

Узрадаваўся.

— Вы сур'ёзна?

— Я чуў размову Кузьміна з Ягоравым (дырэктар ІМЛ).

Узрадаваны, паднімаюся першы ў прыёмную АТК. Чакаю.

Прыходзяць з Нінай Сняжковай. Гутараць мінут 20. Я «адшываю» другога намесніка старшыні СМ Глазкова, віцэ-прэзідэнта — мая чарга.

Заходжу — і, о божа! — на мяне крык. Ветлівы, разважлівы, спакойны (здавалася, што спакойны) Кузьмін крычыць:

— Табе што, няма чаго есці, што ты пішаш Ягораву?

Я напісаў: няўжо ў Беларусі няма людзей, якія ведаюць гісторыю партыі і маглі б прарэцэнзаваць раман?

Хітры акадэмік схапіўся за гэта і паслаў раман у сваю філію — Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

І гэта так вывела з сябе бясстрашнага штурмана авіяцыі.

— Ды ты ведаеш, што ў нас няма ніводнага спецыяліста па гэтаму перыяду? Хто прачытае? Платонаў? — пра дырэктара са знявагай. Так хацелася спытаць: дык навошта вы прызначалі чалавека, які не ведае гісторыю рэвалюцыі?

— Мы ў цябе прасілі пераклад. ІМЛ завізаваў бы яго — і ў цябе была б адкрытая дарога.

Куды дарога? Толькі чыноўніку немагчыма зразумець, што такое пераклад 27 аўтарскіх аркушаў!

Моцна спачатку ўдарыў мяне яго крык. У галаве зазвінела. Але потым я надзіва хутка заспакоіўся. Не толькі заспакоіўся. Мне раптам стала шкада гэтага 64-гадовага, тройчы ранекага на вайне лётчыка. Сапраўды, які ён быў тады смелы! І як цяпер баіцца за ўтульнае крэсла за вялікім сталом! Але самае крыўднае — з-за чаго баіцца! Шкада цябе, Саша!

Я напісаць не пабаяўся, хоць адчуваў пэўную пагрозу. А ты, нябога, баішся, што вымушаны прымаць рашэнне — друкаваць ці не друкаваць. Ад гэтага крычыш на старога заслужанага пісьменніка.

Ён зразумеў хутка, што «перабраў». Пачаў спускаць на тармазах. Пачаў апраўдвацца. Хваліць раман. Нават сказаў:

— Не думай, што баюся. Мне, калі не дадуць сто дваццаць, то семдзесят пэўна дадуць.

Паехаў на дачу да Андрэя. Расказ гэты, безумоўна, больш падрабязны, з дэталямі, усхваляваў майго сябра. Прыехала з горада Люба — памерала крывяны ціск: у яго — 160-100, у мяне 150-100. Даводзім мы сябе. Не, нас даводзяць.

На развітанне АТК па бацькоўску раіў берагчы здароўе.

— Вы нам патрэбны. Вы — наша гордасць.

Формула дзіўная, але, веру, тут ён быў шчыры. Трэба было ехаць у Маскву, на пленум праўлення выдавецтва «СП». Не паехаў. Наступіла абыякавасць. Да ўсяго. Да д'ябла чужыя раманы! Да д'ябла свой уласны! Падумаеш, падзея — 600 старонак пісаніны аднаго чалавека ў наш час, у нашай атмасферы! Вада родныя бомбы вісяць над галавой, і мы не вельмі хвалюемся.

9 лютага

Быў у Ціхана. Я прасіўся да яго яшчэ ў пятніцу. Ён быў заняты. Учора таксама. Віктар Якаўлевіч (вялікі чалавек) сказаў, што сёння рэальна. Да АТК я трапіў знянацку. Пасля размовы ў яго я пайшоў і сказаў В. Я., што, можа, зняць мяне са спісу на прыём, бо пра галоўнае я пагаварыў з АТК.

— Давай пакінем на вырашэнне Ц. Я.

Учора я паехаў да Андрэя і мы доўга абмяркоўвалі: ісці ці не ісці? Выдумалі прычыну: я засмаркаўся і ў такім стане не хачу ісці да такога паважанага чалавека. Але тут нават унушэнне не падзейнічала. Насмарку не было. А я ніколі не ўмеў маніць. Дачакаўся, калі В. Я. патэлефанаваў: «Ц. Я. чакае васу 10,15». Зайшоў адразу. Прынёс пяты том «Кароткай энцыклапедыі Бел. ССР» — персаналін. Ён прагартаў яе. Здавалася, шукаў сябе. Хоць наўрад: праглядаў раней. Спытаў — хто ёсць? Сакратары ЦК? Намеснікі старшыні СМ? Сакратары абкома?

— А старшынь аблвыканкома няма?

Я не помніў, ёсць Косця Мацюшэўскі ці няма. Але зразумеў, што скарга ёсць — ад старшынь. У вогуле, вялікі дзеяч Петрашкевіч, як! ўсё гэта ўзгадняў да мяне, наблытаў нямала. З гэтым намеснікам трэба зуха трымаць востра — палітыканствуе. Увогуле сама ідэя асобнага тома персаналіяў мне ніколі не здавалася разумнай. Персаналіі, раскіданыя па ўсіх тамах, гэтак бы не «крычалі».

Доўга гартаў Ц. Я. кнігу, робячы заўвагі з галоўным упорам на тое, што, маўляў, начальства не забылі, а вось рабочы клас, сялянства забываем.

— Як жа забываем? Дал і ўсіх Герояў Сац. Працы.

Мае аргументы ён прапускаў міма вушэй. Галоўнае: яго думка. Думак было нямала слушных. Але ж не мы адны сачынялі. Усё сто разоў узгаднялася ў гэтым вялікім доме. Але не з ім — вось дзе корань.

Іншыя мае просьбы адфутболіў: аб званнях, кватэрах. Я не зразумеў: прынцып гэта ці нежаданне падтрымаць галоўнага рэдактара, як падтрымліваў некалі П. У. Броўку. Земляка майго ўвогуле бывае цяжка зразумець. Размова ішла гадзіну. Ён глянуў на гадзіннік, але не адпусціў мяне.

— Што там яшчэ ў папцы? — перада мной ляжала папяровая лапка, у якой было толькі пісьмо пра кватэры. Перадаваць пісьмо не было сэнсу.

Я зразумеў, што ён чакае размовы пра раман, з-за гэтага лрыняў мяне, гадзіну размаўляў.

— Напісаў я раман аб Брэсцкім міры. і сустрэўся з цяжкасцямі...

— А чаму ты не даеш пераклад? У нас няма спецыялістаў... Словы Кузьміна. Божа! Як яны не разумеюць, што падобным сцвярджэннем прыніжаюць гістарычную навуку — далей няма куды.

— Ціхан Якаўлевіч! Я карыстаўся толькі адкрытымі крыніцамі: працамі Леніна, біяграфічнай хронікай, пратаколамі ЦК, дысертацыямі гісторыкаў.

— Ну, гісторыкі ў нас могуць напісаць што хочаш, — і непаважлівая тырада пра дактароў навук — якія сярод іх ёсць невукі.— Я ў Маскве якраз займаўся гэтым ВАКам. Угрумаў-Кірылаў паказваў мне некаторыя з дысертацый.

Не помню, у якім кантэксце, але я зноў нагадаў, што ў цэнтры — Ленін.

— Але ж у цябе ёсць і тыя, з кім змагаецца Ленін.

— Ёсць. Троцкі...

— Ну, вось. А матэрыялы пра Троцкага ў нас закрытыя. Я, калі вучыўся... мы маглі прачытаць Троцкага, Бухарына, але са спецыяльнага дазволу, у спецыяльнай зале.

Вось так! А чаму? Чзрчыля чытаем. Рэйгана штодня друкуем, передаём па тэлебачанні і радыё. А Троцкага не дазволена нават чытаць. Ён за сямю замкамі. І моладзь ведае хіба адно: ён быў друг! чалавек пасля Леніна (між іншым, у нейкім кантэксце так вырвалася і ў Ц. Я.), выдатны драмоўца. А што яшчэ?

Падняліся і яшчэ колькі мінут стаялі, развітваліся. Гаварылі пра розныя дробязі — і гэта была самая шчырая, чалавечая частка размовы, без дыгіламатыі, без дыстанцыі.

Раней, калі я прыходзіў да Кісялёва — старшыні Саўміна, гэта быў шчыры і дасціпны чалавек. З ім заўсёды было цікава пагаварыць, як і з Іванам Паляковым. Хацелася пісаць вобраз. Станоўчы. Ад сённяшняй сустрэчы — уражанне дваістае. Хто з нас змяніўся? Ён? Ці я? Можа, і я зрабіўся залішне падазроным. Пішу, а Маша малая перашкаджае. Зачыніўся. Стукае ў дзверы.

— Хто там?

— Ванё?

— Хто там?

— Твая Марыя Філатаўна. Адчыні.

Паспрабуй не адчыніць, калі — Марыя Філатаўна! Паспрабуй зачыніцца...

13 лютага

Настрой сабачы. Дэпрэсія. Нават страх. З-за чаго? З-за рамана? У творчасці я заўсёды быў смелым чалавекам. Хто напісаў у нас

вобразы, падобныя Бародку, Гукану, Ігнатовічу? Усе гэтыя звышсмелыя левакі, што разважаюць пра еўрапейскі ўзровень літаратуры, пісалі лірычныя мініяцюры «вне времени и пространства» і толькі гэта абвяшчалі сапраўднай літаратурай. А можа, яны мелі рацыю? Гэта шлях праторан, наезджаны. А я ішоў, як разведчык, як мінёр. І, здаецца, напароўся на міну.

Бываюць хвіліны, калі шкадую, што ўзяўся за гэтую тэму, патраціў столькі часу, сілы, творчай энергіі. Сказаў пра гэта Андрэю. Ён пачаў папракаць, што маладушнічаю, што, зрабіўшы подзвіг, я адмаўляюся ад яго і г. д. У прыклад ён заўсёды прыводзіць сябе — як прабіваў свае п'есы, якія сутычкі ён меў з Пілатовічам і з міністрамі культуры, асабліва з Міхневічам. Гэта праўда. П'есы яго праходзілі цяжка. Але ёсць адна істотная розніца: іх затрымлівалі дубаватыя чыноўнікі тыпу Гарбунова за крытыку негатыўных з'яў нашага жыцця, сучаснага. Але затое рэжысёрам — ох, як падабалася! Яны смакавалі барацьбу драматурга з афіцыйнымі органамі і памагалі аўтару прабіцца на сцэну.

Дні тры назад я сказаў АТК жартам па тэлефоне:

— Што раблю? Кладу рукапіс рамана ў халадзільнік, у камеру маразільную. Каб не пракіс.

Ён засмяяўся.

А сёння ўначы, калі не спалася, я сур'ёзна падумаў: «А можа, праўда «замарозіць» публікацыю да лепшых часоў?»

Сёння жыву гэтай думкай. Шкада. Але ў такой сітуацыі, якая стварылася, гэта, здаецца, было б правільным рашэннем.

15 лютага

Сон. Шырокая вада, як бы рака ў вясновым разводдзі. Але не вясна — лета. Зялёнага лісця не бачу, але лес густы, лісцвяны. А галоўнае — людзі апрануты легка, па-летняму. Малая Маша і Алеся па-дзіцячы радуюцца вадзе, прастору, сонцу, людзям. Пасля мы плывём на параходзе. І раптам я бачу, што мы плывём міма ўрочышча Клеценка. Параход прыстае, і гід вядзе людзей да той нашай леснічоўкі, дзе мы жылі. Але я добра ведаю, што леснічоўкі няма, і мне сорамна, што людзей падманяць, што нічога яны не ўбачаць, бо нават паляна, дзе стаяла леснічоўка, зарасла сасняком. Засаромлены, я адстаю. А пасля палохаюся за дзяцей. Шукаю іх у лесе і не магу знайсці. Страх. Халодны пот.

Сон як сон. Дзіўна іншае: я рэдка сню маленства і мясціны, дзе яно праходзіла. А тут раптам. Калі прачнуўся, успомніў: калі мы жылі ў гэтай Клеценцы — самай запаветнай марай маёй было: прачнуцца б

раніцою і ўбачыць за гародам, у маладым сасняку, раку, прарэзаную ўначы невядомай дзівоснай сілай. Я ўвесь час адчуваў сябе (ды і ўсю сям'ю) абдзеленай, што каля нашай леснічоўкі няма не толькі ракі, як Сож, але нават ручая. Каля другіх «страж» была рэчка Цераха, ручай Сцюдзёны (ён быў недалёка, вярсты за паўтары), і я вельмі любіў месца, дзе яго пераязджалі на кані, — бялюткі пясочак, празрыстая вада. А былі яшчэ такія шчасліўчыкі, што жылі на беразе Сожа (дзеці аб'ездчыка). Праўда, жылі яны не над самым Сожам, а над «Старыцай» — «Старыком», так ён там называўся. Між іншым, мясціна гэтая не страціла прывабнасці і пасля вайны: адпачываючы ўлетку ў Церусе, я часта вазіў дзяцей у «Старык», і дзецям там вельмі падабалася. Цяпер месца гэта спаганілі: пабудавалі штук пяць дамоў адпачынку, столькі ж, калі не больш, піянерскіх лагераў. А ў выхадны туды прыязджаюць тысячы гамяльчан. Мінулым летам я паехаў туды з дзецьмі, і мне зрабілася сумна.

«Ах, мае залатое маленства!» — выгукалі тысячы разоў розныя людзі, вялікія і звычайныя. Я не гукаю: залатое. Праўда, і галодным яно не было. Хлеб і малако былі. Хоць вясна 33-га была галоднай. І ў тэхнікуме я часам галадаў.

Дзіўна, што з гадамі ў мяне знікла цяга да вады. Праўда, Сож люблю. А Мінскае вадасховішча, каля якога гуляю штодня, пакідае раўнадушным. Не вельмі ахаю і на Нарачы. Каля Сожа нейкая асаблівая атмасфера, можа, толькі там жыву маленствам.

Аб снах. Ваду ўсё ж я часта сню. Вялікую, прасторную ваду. Гэта прыемныя сны. Поўнач, Мурманск, дзе ваяваў, рэдка сню, а Польшчу, Германію часцей. Але ёсць адзін дзіўны сон, які паўтараецца сотню разоў, цяжкі, кашмарны сон. Я не магу выехаць з нейкага сярэднеазіяцкага горада — Душанбе ці Ташкента. Чаму менавіта з Сярэдняй Азіі, а не з Грузіі, не з Малдавіі? Варыяцыі розныя: не знаходжу таксі, і поезд адыходзіць перад носам, не магу знайсці праходу на лётнае поле, дзе стаіць мой самалёт,— усё абгароджана дротам. Нават такая недарэчнасць: не разлічваюць у гасцініцы, перад некім (невядома перад кім) я вінаваты, у некага нешта пазычыў.

У Зошчанкі ёсць кніга аб яго снах, і ён урэшце знаходзіць вытокі гэтых «сонных жахаў» — яны ў маленстве, і вызваляецца ад страху, набывае спакой.

Радзей паўтараецца трэці сон: у гасцініцы, большай за «Расію», я не магу знайсці свой нумар, і ніхто не можа мне сказаць, які мой нумар.

Сны запісвае Юрый Бондараў. Ёсць у яго геніяльны і страшны сон: цяжкі грузавік, без вадзіцеля, ганяецца за ім і яго жонкай па

пустым полі. Чытаў — і халадзеў ад страху. Гэта страшней за «Вія». Некалі малы, у леснічоўцы, пры лямпе, прыцямнёнай, каб не пабудзіць бацькоў, я чытаў «Вія». За акном шумеў лес. Ноч. Пустэча. Тады ўпершыню я адчуўтое, што называюць — валасы станавіліся дыбам. Страх той помніцца дагэтуль. Але была нейкая іншая сіла, што не дазваляла адарвацца ад чытання, закінуць кнігу бог ведае куды — у грубку, у сенцы. Чым страшней, тым з большай сілай цягнула чытаць.

21 лютага

Апошнія два дні многа думаў аб сэнсе жыцця, аб лесе чалавека, аб нечаканых паваротах гэтага лесу, часцей за ўсё трагічных, хоць здараюцца і камічныя ці трагікамічныя.

Пачалося з трох размоў, якія па выпадковым супадзенні адбыліся адна за адной і датычыліся аднаго і таго ж чалавека, ужо нябожчыка. Чалавека гэтага я любіў, хоць не мог не бачыць некаторыя яго слабасці. У каго іх няма? Толькі самаўлюбёныя дурні лічаць, што яны бязгрэшныя, ва ўсім і заўсёды правільныя, самыя даравітыя і ўвогуле самыя, самыя... Мае шчасце (ці бяда?), што я ніколі не быў самаўпэўнены. Я заўсёды сумняваўся ў самім сабе, у сваёй працы, рашэннях. Можа, гэта таксама иядобра: сумненні не давалі праявіць мне волю там, дзе яе варта было б праявіць.

Аднак сённяшні запіс не пра сябе. Хаця і пра сябе таксама. Размова пойдзе пра П. М. Машэрава. І пры яго жыцці і яшчэ больш пасля яго трагічнай гібелі мне хацелася напісаць пра гэтага чалавека. Пры жыцці я зрабіў невялікі нарыс у кнігу пра Герояў Сац. Працы. Пісаць пра самога Пятра пры жыцці, безумоўна, было цяжка. І ў мяне ўжо бадай вырысаваўся сюжэт аповесці пра яго маці, Дар'ю Пятроўну, якую немцы расстралялі, калі сын пайшоў у партызаны. Мяне апярэдзіў Мікола Нагнібеда — напісаў паэму. Паэма куцаватая па падзеях, але шчырая, эмацыянальная.

Пасля яго смерці ў мяне было асабліва гарачае жаданне напісаць пра Пятра. Я меў намер схадзіць да яго брата, да ўдавы, да дачкі. Але мае жаданне патроху астуджваюць. Як-небудзь я прыгадаю размовы з людзьмі ўплывовымі, якія лічылі сябе сябрамі нябожчыка. Цяпер жа пра гэтыя тры ўвогуле выпадковыя размовы.

Гуляю па парку. Жанчына ў калясцы вязе малога. Кабета ў акулярах, у шыкоўнай дублёнцы: былая сакратарка П. М.— Сцёпіна. Працавала разам гадоў пятнаццаць. Во хто можа даць цікавыя штрыхі, дэталі!

Вітаюся. Іду побач. Кажу:

— Неяк хачу зайсці да вас, Святлана Піліпаўна, пагутарыць.

Насцярожваецца. Ці не падумала, што мне трэба яе пратэкцыя? Хуценька паведамляе тое, што я даўно ведаў:

— А я цяпер не ў прыёмнай. Я ў іншай прыёмнай. Дзе прымаюць грамадзян. Гэта на Кірава, дзе быў інтэрнат.

І ва ўсім гэтым — яўная крыўда: што яе з пятага паверха вялікага дома спусцілі ў прыёмную некуды ў былы інтэрнат.

— Цікавая работа? Можна пачуць многа гісторый.

Пачынае ахвотна расказваць кватэрныя гісторыі. Я сам падобных заблытаных скарг выслухаў сотні, калі да мяне прыходзяць на прыём.

Асцярожна падступаю да галоўнага — прызнаюся:

— Я не пакідаю думкі напісаць пра Пятра Міронавіча.

Як бы палохаецца, пачынае гаварыць, што яна, маўляў, мала што ведае, што яна — у прыёмнай, ён — у кабінеце і ў рабоце заўсёды быў строгім. Гэта — няпраўда. Ён быў дэмакратычны, любіў пагаварыць з рознымі людзьмі. Цяжка паверыць, што з чалавекам, які быў бліжэйшым памочнікам, Пятро трымаўся настолькі афіцыйна. На пытанне аб сям'і адказала, што дома ў Машэравых неафіцыйна была толькі аднойчы на яго дні нараджэння. Вырвалася ў яе хіба толькі адно: з Палінай Андрэеўнай у яго адносіны былі складаныя.

— Ён жа ніколі не бываў дома. Рана выязджаў, позна вяртаўся...

Ды маленькая дэталь: П. М. не ўмеў расказваць анекдоты.

Але гэта я бадай што даўно яшчэ адкрыў сам: у пакоі членаў бюро ў часе сесій Вярхоўнага Савета. У часе перапынкаў Ц. Я. Кісялёў, калі быў старшынёй СМ, І. Я. Палякоў сыпалі жарты, каламбуры, анекдоты. Машэраў смяяўся. Але сам хіба, можа, разы два расказаў «барадатыя анекдоты».

Праўда, Святлана Піліпаўна цёпла адазвалася аб Наташы, параіла звярнуцца да яе: толькі яна можа расказаць нешта пра бацьку. Я сказаў, між іншым, што гутарыў з Г. І. Казарцавым, які партызаніў разам з Машэравым.

І тут жанчына выказалася вельмі катэгарычна:

— А вось гэтаму чалавеку не верце. Ён спекуляваў сваім сяброўствам з П. М. і цяпер...

Што цяпер — не сказала.

Развітаўся з ёй і праз колькі хвілін сустрэў земляка, старога знаёмага, пракурора горада Л. Л. Дзядкова. Пагутарылі пра ўсё — пра здароўе, пра зіму. І пацягнула мяне сказаць пра размову са Святланай, пра сваё жаданне напісаць пра П. М.

Пракурор ажно з твару змяніўся.

— Я вам скажу, І. П., пра нябожчыкаў дрэнна не гавораць. Але зусім іншай стала атмасфера ў рэспубліцы. Усе радуюцца перамене. Спытайце ў любога работніка ЦК...

Мяне ашаламіла гэта. Няўжо праўда, што нехта радуецца, што загінуў іх кіраўнік, урэшце, проста чалавек?

Калі Дзядкоў быў некалі пакрыўджаны Машэравым — яго можна яшчэ зразумець. Калі ж такой думкі сапраўды трымаюцца іншыя, то мала сказаць, што мне крыўдна за нябожчыка. Узнікаюць больш сумныя думкі.

Кісялёва ў працы — каб пісаць вобраз — было цікавей назіраць. Дзелавы, дасціпны, з добрым пачуццём гумару... Мы з Андрэем і тады яшчэ, многа гадоў назад, згаджаліся з вывадам, што гаспадарнік, эканаміст Ц. Я., бадай, мацнейшы.

У Пятра свае якасці, напрыклад, ён быў выдатным прапагандыстам.

Але ўразіла: няўжо трэба супрацьпастаўляць жывога і мёртвага? Няўжо параўнанне заўсёды на карысць сённяшняга кіраўніка (на любым узроўні) з прыніжэннем былога, нават калі той і адышоў ужо ў свет іншы?!

Ну, ладна, у гісторыі, напрыклад, са мной: людзі, якія падхалімнічалі, якім я выбіў кватэры, пенсіі, цяпер вітаюцца кіўком галавы. Дык я, дзякуй богу, жывы, атрымаў вышэйшую ўзнагароду, абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук. У такім выпадку людзей прыніжае зайздрасць, якую не кожны здольны пераадолець. Але ці бывае зайздрасць да таго, каго няма ўжо жывога? Не, тут нешта іншае. Што? Сумна было б пагадзіцца з думкай, што ў людзей такое нетрывалае пачуццё ўдзячнасці. У мяне, напрыклад, не слабое пачуццё ўдзячнасці Броўку.

Аднак яшчэ адзін эпізод, звязаны з імем Машэрава.

У мінулую пятніцу да мяне ў БелСЭ прыйшоў хлапчына, папрасіўся на прыём. У кабінеце прысутнічалі Хаўратовіч і Філімонаў.

— Сакрэтаў няма?

— Не.

Хлопец — рэдактар выдавецтва «Ураджай». Яны рыхтуюць кнігу пра Герояў Сац. Працы дзесятай пяцігодкі. Хлапчына папрасіў напісаць пра Машэрава. І я не даў згоды.

Чаму? Змаладушнічаў? Пабаяўся некаму не дагадзіць? Ды не! Але ўсё роўна на душы пагана. Стрымала мяне, бадай, яшчэ адна размова, што адбылася ажно мінулым летам.

Мне пазваніў дырэктар фоталабараторыі Саюза журналістаў: яны рыхтуюць фотаальбом пра Машэрава, ці не згадзіўся б я напісаць

прадмову? Я ахвотна згадзіўся. Але праз колькі дзён трапіў да АТК. І ў шэрагу іншых спраў сказаў пра гэтую. Ён тут жа адказаў:

— Перадай Тоўсціку, каб не спяшаўся з такім альбомам,— і, можа, убачыўшы мае здзіўленне, даверліва растлумачыў: — Калі мы раструбім пра такое выданне цяпер, яго ніколі не будзе. А гады праз два-тры, думаю, здолеем гэта зрабіць.

Што да гэтага чалавека, то я цвёрда ведаю, што ён любіў П. М. шчыра, аддана.

Я зайшоў да яго праз паўмесяца ці праз месяц пасля трагедыі, і ён сказаў:

— Ты разумееш, штоночы сню яго. Дзе мы толькі не бываем! Пра што не гаворым! — у вачах яго заблішчэлі слёзы. Я таксама заплакаў. Мы абодва плакалі і не саромеліся адзін аднаго.

Была ў мяне яшчэ адна размова з АТК. Але пра яе — пасля.

24 лютага

Адбыўся з'езд Саюза мастакоў. Сенсацыйны. Па галасаванні. Забалаціравалі былое кіраўніцтва і многіх іншых — усяго 14 чалавек, прапанаваных партгрупай, ухваленых ЦК, пракацілі, як кажуць, на вараных.

Як ставяцца да гэтага? Пэўная група радуецца: наша бярэ. Употай гэтая група думае адно, публічна тлумачыць: дэмакратыя развіваецца! Усё апраўдваецца дэмакратыяй.

Міхневіч і Ваніцкі расказвалі мне пра з'езд, як пра вясёлую прыгоду, пра спектакль. У Антановіча большая заклапочанасць. Але тлумачэнне вынайшлі выгаднае для людзей, якім належала ўсё ж неяк кіраваць складаным творчым калектывам. Маўляў, вінаваты Грамыка: паддаўся сваёй жонцы, якая пачала кіраваць замест яго: як мастацтвазнаўца, крытык, ставіла сцэнкі, строіла па творчым ранжыры на свой густ.

Знешне нібыта так. А па сутнасці? Ці не варта падумаць, чаму пракацілі большасць беларусаў. Міхасю Савіцкаму, якому ў дзень з'езда споўнілася 60 гадоў і якога ўзнагародзілі ордэнам Леніна, укінулі больш за дзве сотні чорных шароў, ледзь-ледзь прайшоў у праўленне. Між іншым, адзін гэты факт чаго варты! Якая жорсткасць! Хацеў напісаць — бестактоўнасць. Якая там бестактоўнасць! Глянем глыбей! Гэтак жа, як Грамыку (290 з 430), пракацілі Азгура, які ніякіх пасад не займаў.

Не, гэта гульня ў дэмакратыю. А па сутнасці — праява ідэалагічнай барацьбы.

Учора на прэзідыуме, у перапынку, калі лічылі галасы (прымалі ў СП і дзялілі прэміі, між іншым, дзіўна дзялілі), я завёў з Кірэенкам размову аб сваім рамане: што? як? дзе ён зараз? хто чытае? Б. і Г., навастрыўшы вушы, падслухоўвалі і зларадна ўхмыляліся. Людзі гэтыя радуюцца, што затрыманы раман. Вось табе і ўвесь клопат аб развіцці нацыянальнай літаратуры.

Сумна. Сумна ад такіх думак. А часам мне робіцца весела. Успомніў зараз, як спалохаўся мой сябра АТК пасля званка з ІМЛ, што яму прыйдзецца вырашаць лёс майго рамана.

«Табе што — есці няма чаго?» — крычаў добры чалавек.

Уяўляю, як ён лаяў сябе, а можа, і цяпер лае, што згадзіўся прачытаць раман і моцна хваліў, віншаваў з удачай.

Слёзы і смех. Трагікамедыя часу.

Між іншым, старшынёй Саюза мастакоў выбралі Андрэя Бембеля. Чалавеку 76 гадоў. Геніяльная кадравая палітыка!

2 сакавіка

Трэба пачынаць нешта пісаць. Без асноўнай працы пакутліва. Сорак гадоў, амаль сорак я штодня пісаў, нават калі не сядзеў за сталом, перад паперай, быў у паездках — у Маскве, на Украіне, за мяжой — і ўсё роўна «пісаў» — у галаве. Добра ці дрэнна, але я тварыў, сачыняў. Не ўсё «пісанае ў галаве» пераходзілз. пасля на паперу, але няспыннасць, неперарыўнасць творчага працэсу надавала жыццю сэнс. Здаралася, што былі паўзы на паўгода (больш, здаецца, не было) паміж творамі, скончаным і новым. Але гэта былі паўзы ў самім працэсе пісання, а не ў творчасці: я вывучаў матэрыялы, канструяваў сюжэт. Пасля здачы «Петраграда...» у «Полымя» прайшло сем месяцаў. І я ні за што не магу ўзяцца. Выбіты з творчай каляіны. Пасля пералому рукі, смерці Галі я працаваў паранейшаму — дапісваў апошнія раздзелы, правіў, перапісваў.

Што здарылася пасля? Гэтая недарэчная і дзікая гісторыя з раманам? Гісторыі гэтай няма канца. Учора даведаўся, што ў Інстытуце гісторыі партыі раман ніхто з людзей, якія займаюцца гэтым перыядам гісторыі, не чытае і нават не бачыў. Хто ж чытае? Сам Платонаў, дырэктар? О, не! Гэты чалавек ніколі не возьме на сябе адказнасць. Хто ж чытае?

Разы два быў такі душэўны стан, што, каб у мяне былі ўсе экземпляры рукапісу і карэктуры, я пагрэў бы рукі каля вогнішча з гэтай гары паперы і... кропка.

АТК пасля ганебнага выкрыку, палагаднеўшы, праводзячы да дзвярэй кабінета (сама дабрыня), папярэдзіў:

— Май на ўвазе — пасля публікацыі ў цябе з'явяцца ворагі...

Яны баяцца гэтых ворагаў. Ä я не баюся. Што яны зробяць? Страляць не стануць. А гадасці розныя яны рабілі раней, робяць і цяпер. Кланяцца якому-небудзь Б. з надзеяй, што ён нешта пра цябе напіша, як гэта робяць некаторыя «вялікія»,— брыдка.

У мяне былі хвіліны роспачы, калі Сяўрук адмовіўся ад перакладу. Спалохаўся? А ўчора гэты высокі функцыянер раптам прыслаў пісьмо, якое варта захаваць. Ён піша:

«Глыбокапаважаны Іван Пятровіч!

Мяркую, што ўсе Вашы турботы адносна публікацыі другой часткі рамана скончыліся. І вашы мясцовыя і нашы маскоўскія перастрахоўшчыкі тут яўна перастараліся. Спачатку і мяне заблыталі.

Прыйшлося засесці за паперы, пераварушыць усе цыркуляры, каб паставіць у сё на месца. Спадзяюся, што Кузьмін і Паўлаў Вам ужо аб гэтым паведамілі. Вельмі рады, што праца Ваша прадоўжыцца без гэтых непакоячых дробязей.

...Шкада, што не папрацавалі разам, але што зробіш».

Харошанькія дробязі! І ні Кузьмін, ні Паўлаў дагэтуль нічога суцяшальнага мне не паведамілі. Наадварот: «Табе што, есці няма чаго?»

Ну, што ж, будзем чакаць. Урэшце ж павінна скончыцца гэтая «полоса невезения», як называе яе Маша.

4 сакавіка

Партыйны сход у СП. Стала модай запрашаць дакладчыкаў старонніх — сакратароў ЦК, міністраў, вучоных. Такія сходы часта носяць асветніцкі характер. Гэта нібыта і добра. Але гэта і хітрасць маладых сакратароў: лягчэй залрасіць кагось збоку, чым уламаць на даклад свайго. Акрамя таго, свой дакладчык — свая праблема, унутраная, пісьменніцкая. А іх не толькі не хочам вырашаць, але і ставіць. Так спакайней жыць. Роля партыйнай арганізацыі прыніжана: усе кардынальныя пытанні вырашаюцца без яе, там, у вялікім доме, воляю Петрашкевіча ці Антановіча. Бяда, што так робіцца не толькі ў СП. Горш, калі адзін-два чалавекі рашаюць за цэлы калектыў, які вырошчвае хлеб, робіць машыны.

Учора дакладчыкам быў міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі У. І. Паўлючук. Даклад быў па-свойму цікавы — па інфармацыі: што робіцца, як робіцца, у якіх аб'ёмах, якія праблемы ўзнікаюць. Але ўсё выгледзела залішне ружовым: меліярацыя ідзе як мае быць і нічога не псуе ў прыродзе; ігнараваў факты, і хлопцы нашы, часта даволі пасіўныя, праявілі нечакана высокую актыўнасць. Выступіла чалавек дзесяць. Накідалі пытанняў, разнеслі практыку асушэння. Вывады ў

некаторых былі дылетанцкія, бо дагаварыліся да таго, што ў мэтах захавання прыроды трэба спыніць увогуле ўсякую меліярацыю. Але прыклады, як многа меліяратары нашкодзілі, былі такімі, што міністр чырванеў. Пакрыўдзіўся, хоць не паказаў гэтага. Звыкся чалавек з тым, што яму рэдка пярэчаць.

Актыўнасць нашых мне падабалася. Але ж яна бясплодная. У прэсе гэтак востра можа выступіць хіба адзін Толя Казловіч. Магчыма, Міcько. Астатнія будуць ліць у сваіх нарысах, аповесцях «ружовы сіроп», будуць сачыкяць жыццё на асушаных тарфяніках, як сачынілі ў фільме «Паводка». Праблемы быццам правільныя, у іх знешняй сутнасці, а вытворчыя адносіны людзей — сачынёныя найгоршым чынам. А сцэнарыстамі былі пісьменнікі, якія ходзяць у класіках. Учора яны якраз выступілі добра, лепш, чым напісалі.

Як дрэнна мы ведаем сучаснае жыццё!

І яшчэ адна сумная думка, якая ў апошні час не дае спакою: саюзы нашы творчыя мала дапамагаюць творчасці, яны даволі часта не аб'ядноўваюць, а раз'ядноўваюць людзей. З'езд мастакоў — сведчанне таму.

Пасля сходу наведаў Андрэя. У яго тромбафлебіт, ляжыць з перавязанымі нагамі.

Гаворка не ладзілася. Нецікава яму было слухаць пра сход, пра раман, неяк і раней, пад чаркай, ён кінуў: «Надаеў ты са сваім раманам!» Але пасля загладжваў гэта тым, што сам пачынаў гаворку.

І раптам Андрэй загаварыў пра смерць. Ніколі раней не гаварыў — жартаваў з «костлявой». Ляжаў — думаў. І роздум яго сугучны майму. Падыходзім да фінішу. Сумна мне сёння ад гэтай учарашняй размовы.

Стаміўся я. Ад усяго. Слабеюць стымулы. Палохае гэта. А чаму ім слабець, стымулам? Прычына можа быць толькі адна — старасць. Але ці не рана? А так... ці не задужа я паглыбіўся ў гісторыю з раманам? Падумаеш, раман! Адным больш, адным менш. У літаратуры гэта — кропля. Нават у мяне пры наяўнасці дзесяці раманаў — што такое яшчэ адзін? Урэшце, апрача гэтага няшчаснага рамана ёсць жыццё.

10 сакавіка

Быў сход аддзялення АН. Нават тут, у вучоных, не абыходзіцца без фармалізму. Божа! Калі мы пазбавімся ад яго?

У абед прыйшоў у «Энцыклапедыю», пазваніў дадому. Маша кажа: Андрэй уначы трапіў у рэанімацыю. Як абухом па галаве. Апошнія дні ён ляжаў з тромбафлебітам, з перавязанымі нагамі. А раптам тромб? Пазваніў Кузьміну. Ён нічога не ведаў. Устрывожыўся:

«Зараз жа я знайду міністра». І тут форма: «выходзіць» толькі на міністра, ніжэй, на тых, хто бліжэй да хворага, не дазваляе субардынацыя. Дарагі мой штурман!

Вярнуўшыся дадому, я пазваніў Касачу. «Займаемся. Займаемся». Ёмкі тэрмін.

Пазваніў у рэанімацыю. З урачом размова была канкрэтная.

— Інфаркт?

— Пакуль што сказаць цяжка. Але ёсць падазрэнне.

— Прашу вас, зрабіце ўсё, што можна.

—Усё робім, Іван Пятровіч.

Давялі! Любачка давяла.

Восьмага я двойчы званіў яму, ён адказваў кісла.

«Я прыйду да цябе».

«Як хочаш».

Але пазваніла пазней Люба, папрасіла Машу прыйсці.

Жанчыны гаварылі на кухні, мы — у пакоі.

Андрэй быў узбуджаны, але, здавалася, вясёлы. Саркастычна адзываўся пра многае, што вычытаў у газетах, пакуль ляжаў. Пра Венеру, між іншым, таксама: каму патрэбны такія траты, каб зрабіць паўдзесятка няпэўных замераў? Я спрачаўся: навуцы трэба!

І раптам у паўзе:

«Разводжуся з Любай».

Заявы такія былі і раней, і я пераставаў ім верыць, хоць быў перакананы, што нават я са сваім бязвольным характерам даўно развітаўся б з гэтай жанчынай.

«Памірышся».

«Не».

Хітрая баба накрыла стол. Маша ўгаварвала іх памірыцца. Выпіўшы, Андрэй «завёўся» так, як умее толькі ён. Яны нагаварылі адно аднаму гару брыдоты. Было крыўдна, сорамна, сумна.

Не хачу пісаць падрабязнасці ў такі час. Але ў мяне даўно з'яўлялася думка: во раман! — аб тым, як добрага, даверлівага чалавека аблыталі, аплялі павуцінай абываталі, мяшчане, спажыўцы, кулакі. Але і ён вінаваты, што так лёгка паддаўся ім. Размазня!

Але здароўя табе, Андрэй!

Рыхтуецца навуковая канферэнцыя на тэму: «Значэнне гістарычнага вопыту КПСС, роздуму і парад, што выкладзены ў кнізе Л. І. Брэжнева «Успаміны», для патрыятычнага і інтэрнацыянальнага выхавання працоўных». Во размах!

АТК прыслаў мне пісьмо Леаніду Ільічу, каб я паправіў. Але ж даўно выпрацаваўся стэрэатып, ад якога не дазволена адыходзіць. Я

паправіў стыль, не больш. Ён учора на актыве гаворыць: «Зрабі ты гэта, каб было па-чалавечы».

Зрабіў па-чалавечы — не падобна на ўсе іншыя пісьмы, асабліва па форме. Але адчуваю: не пройдзе, пабаяцца. А ў першым варыянце было, напрыклад, такое: «Сердца всех жителей республики преисполнены чувством глубокой благодарности за Ваши теплые, проникновенные слова о «неброской, но за сердце берущей красоте белорусских пейзажей».

Не разумею, чаго тут больш: «верноподданнического» глупства альбо здзеку са старога чалавека, які расчуліўся ад успамінаў пра ўласную маладосць, калі ўсё «брало за сердце»?

12 сакавіка

Прачытаў ва ўспамінах Ф. Шаляпіна.

Ішло прадстаўленне «Барыса Гадунова». Прысутнічаў цар. Калі Шаляпін выйшаў на авансцэну на выклік публікі, за ім высыпалі харысты, каб падаць цару скаргу на дырэкцыю, упалі на калені, запелі «Боже, царя храни».

Шаляпін, каб не тырчэць вежай сярод «коленопреклоненных» жанчын, таксама апусціўся на калена, адно.

Уся дэмакратычная грамадскасць асудзіла яго. Пісалі газеты. Абурыўся Сяроў. Не адказаў Горкі. Нляханаў вярнуў падараванае Шаляпіным фота. Рускія студэнты ў Францыі крычалі яму ўтвар: «Лакей! Мерзавец! Холоп!»

Шаляпін піша:

«Я самым спокойнейшим образом стал бы на колени перед царем или перед патриархом, если бы такое движение входило в мизансцене какого-нибудь ритуала или обряда. Но так вот, здорово живешь, броситься на все четыре копыта перед человеком, будь он трижды царь, — на такое низкопоклонство я никогда не был способен».

Размова з АТК учора на сходзе ў АН.

— Ну, як там мой раман?

— Не ведаю. Ён у гістпарце. Спытай у Платонава.

Пытаю сёння ў Платонава.

— Няма ў нас вашага рамана.

— А дзе ён?

— Не ведаю, — і пачаў заікацца.

Во гульня ў кошкі-мышкі. М-да! Сумна.

Пазаўчора я званіў АТК, што Андрэй трапіў у бальніцу. Здзівіўся, што яму не сказалі, падзякаваў за паведамленне. Паабяцаў тут жа падключыць «лепшыя сілы».

Сустракаліся ўчора, тройчы сёння — перад пасяджэннем, у перапынку, пасля сходу — і ні слова пра Андрэя: як ён? Значыць, нікуды АТК не званіў, інакш сказаў бы, што яму паведамілі на яго званок. А пры кожнай сустрэчы прасіў берагчы здароўе наша, такое патрэбнае! Але няхай бы хоць трохі і спраў было, не адны словы.

Сумна. Але дай бог табе, наш сябра, доўга сядзець у тваім крэсле, бо пасля цябе напэўна прыйдзе горшы. З ліку тых, што могуць адмовіць інваліду, які просіць палепшыць жыллёвыя ўмовы,і будзе спасылацца на закон аб паляпшэнні ўмоў інвалідам: «Дурны гэты закон!»

Не хацелася верыць, калі інвалід паскардзіўся мне. Але я ведаю гэтага чыноўніка: нам. начальніка Упраўлення гарвыканкома па размеркаванні жылля нехта Місько.

І зноў пра раман. Зайшоў да І. І. Антановіча. Размова — проста брацкая. Даверлівасць — на вышэйшым узроўні.

Ён:

— Што з раманам?

Я:

— Не ведаю.

— Як не ведаеце?

— Кузьмін не ведае. Платонаў пачаў заікацца, калі я спытаў пра свой раман.

— Платонаў — вялікі трус. Усё залежыць ад Платонава.

Ні хрена не магу сцяміць: шчырасць ці жаданне ўсё ўзваліць на «шэрага коніка» — Платонава? Урэшце, я без цябе, дарагі Ів. Ів., ведаю, хто такі Платонаў. Навошта табе гэта падкрэсліваць? Не любіш яго? Хочаш перакласці ўсё на яго — абы не займацца самому? Выйшаў ад яго з цяжкім пачуццём, хоць ён быў мёд мёдам.

Быў учора ў Андрэя. Дзякуй богу, інфаркту няма. Спазм. Ён на нагах, у агульнай палаце.

Калі я сядзеў у яго, прыйшлі Ала і брат яго Іван. Іван — сама народная мудрасць.

— Што новага, Іван? — пытаюся я.

— А што новага? Слухаем, як нас палохае Рэйган.

— Баіцеся?

— Хто? Мужыкі? Ні хрена не баяцца.

Выйшаў з палаты Андрэеў сусед — мой зямляк Кажамякін, былы старшыня калгаса, Герой Сац. Працы.

Іван кажа:

— Пятровіч, я вам скажу: вельмі вы далека ад народа, — сумеўся: — не вы канкрэтна. Усе, хто піша ў газетах. Газеты пішуць

адно, а народ жыве не па газетах. Мы — як бы ў двух розных вымярэннях. Вы і мы...

— Які народ, Іван?

— Не лавіце мяне. Вы ведаеце, дзе я жыву. Той народ, што корміць вас — вырошчвае хлеб, мяса.

Між іншым, я не паслядоўны. На мае пытанне: «Што новага?» — ён адказаў:

— Карову купіў.

— Ты? Малайчына!

— Трэба ж вас мапаком карміць.

— Ой, трэба, Іван! Без малака — мы нішто з усімі сваімі высокімі тэорыямі.

Сёння паехаў на дачу. Мне там заўсёды хораша працавалася, і я люблю гэты куток. Але за 23 гады дача захірэла. Мінулай восенню я зрабіў нядрэнную рэканструкцыю. Праўда, рамонт не завершаны. Прыехаў, пахадзіў — і нішто мяне не сагрэла, не парадавала. Хіба толькі з задавальненнем выпіў сто грамаў гарэлкі і закусіў мёрзлым салам. З гумарам падумаў: не філасофія чалавеку патрэбна, а хлеб і сала. Пасля ўжо — філасофія. Але пра гэта лепш сказаў Карл Маркс.

1 верасня 1990 года

І зноў дзённік. Колькі разоў я вяртаўся да яго. Заўсёды ў паўзах паміж працай над раманамі ці аповесцямі. Калі «ўлазіш» у раман, тады не да дзённіка, пісаць можна што-небудзь адно. Апантана, з інтэнсіўнасцю, якой не было і ў маладыя гады, пісаў раман аб нашай бядзе — чарнобыльскай. Хвалявалі тэма, сюжэт, характары. Пэўна, і ўзрост схіляе да трагедыйнага. І агульная атмасфера ў краіне, грамадстве. Без малога дваццаць аркушаў напісаў за год. Небывала. Канешне, калі не лічыць, што да працы за сталом гады два выношваў тэму, пранікаў у матэрыял, апытваў удзельнікаў падзей. Напісана трагедыя. Пачынаецца раман вяселлем, канчаецца дзвюма смерцямі — сына і маці. «Где стол был яств, там гроб стоит». Дзяржавінскі радок (а напомніў яго мне мой зяць Сяргей —дзякуй яму за гэта) лёг дакладным эпіграфам. Цікава развіваліся характары, яны сапраўды-такі выходзілі з-пад маёй аўтарскай улады. Калі я ўвёў у раман прадстаўніка зерхняга эшалона ўлады, то — дзіва! адкуль узялася злосць у абмалёўцы гэтага персанажа. Не заводзіўся, захоўваў аб'ектыўнасць, рэалістычнасць, і ўсё-такі Лявонцій Мікалаевіч (першы герой без прозвішча) напісаны злосна. Уедлівы Іван Пташнікаў адразу ўсёк гэта і паспрабаваў нават папалохаць мяне: маўляў, не даруе той,

хто пазнае сябе. «А пазнае»,— заключылі дзве рэдактаркі, пісьменніцы.

«Злая зорка» — нечаканае спалучэнне, але меў дваццаць варыянтаў назваў і ні на адным не спыніўся, пераважалі лабавыя, прамыя, а хацелася нечага незвычайнага, як сама бяда. Не было такой, кал і не лічыць Хірасіму.

Месяцы два, здаўшы раман, не браўся за пяро. Але тлуміў галаву чытаннем газет. Лаяў сябе, пляваўся, але адарвацца ад іх не мог. Распісаліся браткі! Да чаго дапішамся! З кожнага рэнегата, нават здрадніка, робім героя. Учора «Взгляд» праслаўляў (і як!) сябелюбца Калугіна. «Комсомольская правда» даказвае, што ў Леніна страляла не Каплан. Стралялі быццам Канаплёва і Сямёнаў! Вось так! Так робіцца гісторыя — якая нам патрэбна! А Леніна аплёўваюць. І гэта я перажываю найбольш балюча. Стратэгія тонкая — растаптаць святое. Што Сталін? Дыктатар. Прынізіць Леніна — во глабальная задача, і самае брыдкае і страшнае, што мы, камуністы, пакорліва глынаем гэтых жаб. Большасць так і не цяміць, што ідзе бязлітасная ідэалагічная барацьба. І не толькі ідэалагічная — барацьба за ўладу.

Эканомлю паперу. Люблю пісаць на добрай паперы, а даставаць яе ўсё цяжэй. Нават у нас, у выдавецтве, няма яе. Нявыкарыстаныя дэпутацкія бланкі знайшлі найлепшае прымяненне.

Дзеці паехалі ў горад, у школу, і на дачы апусцела. Пуста і ў галаве, у душы. Не, думак хапае. Але не радасных, сумных, вельмі сумных. Адкуль ім узяцца, вясёлым думкам! А я, між іншым, аптыміст. Быў. І хачу заставацца ім. Хачу верыць, што ўсё-такі здаровы сэнс пераможа. Вялікія ж і мудрыя народы! Славяне — у першую чаргу. Рускія, украінцы, мы, беларусы, хоць у нас, на жаль, нацыянальныя карані падрэзаны, крона аслаблена. Учора чытаў М. Бярдзяева пра лёс Расіі. Зразумела стала, чаму яго адлучылі ад савецкай культуры. Хіба бязродным трэба было вось такое: «Есть только один исторический путь к достижению высшей всечеловечности, к единству человечества — путь национального роста и развития национального творчества».

2 верасня

Жывём палітыкай. Але я нярэдка зайздрошчу людзям, якія не жывуць ёю, не чытаюць газет. Захлынае гэтая мутная плынь думак, поглядаў, меркаванняў, ацэнак, прагнозаў. Ніякай пэўнасці, ніякага прасвятлення.

Два дні засядаў прэзідэнцкі Савет Федэрацыі. Правёў прэсканферэнцыю М. Гарбачоў. І што сказаў? Ніводнай канкрэтнай думкі,

якая хоць трохі супакоіла б народ. Вытхнуўся Міхал. Хітруган Ельцын, антыпод, правёў на другі дзень такую ж прэсканферэнцыю. І нешта сказаў. У нечым запэўніў, хоць праз два гады, але паабяцаў упэўнена стабілізацыю і ўздым. Не люблю я гэтага чалавека. Пазёр. Ігрок. Але Гарбачова ён, здаецца, пераіграе. Ужо перайграў па папулярнасці ў народзе. Проста і хітра: хто кіруе Расіяй, той кіруе Саюзам. Недарэмна злосна жартуюць: улада Гарбачова ў межах Садовага кальца. Злосна, але доля ісціны ёсць. Гэта нейкая трагічная фігура — Гарбачоў. Высокая сусветная папулярнасць і нізкая ў сваім народзе. Некалі, у пачатку перабудовы, я захапляўся яго смеласцю, але пасля ўсё больш расчароўваўся. Эканамічная перабудова мне не спадабалася з самага пачатку. Я не эканаміст, дылетант, але адчуваў: не тое. Яшчэ ў 1987 годзе, выступаючы на пленуме ЦК, я сарваў бурныя апладысменты, сказаўшы: раней, чым перабудоўваць, трэба пабудаваць. Апаратчыкі пасля прасілі мяне зняць гэтыя словы са стэнаграмы. З імем Гарбачова звязаны пакуль што развал усіх ранейшых структур. Добрыя яны былі ці дрэнныя, але была стабільнасць. Усё развалена. Дэмакратычныя выбары? Пакуль што далека не дэмакратычныя. У Саветы налезла плойма дэмагогаў, крыкуноў, нахабнікаў. А законы якія прыняты? Які з іх працуе так, каб штось хоць у вузкай сферы палялшалася? Усё ўносіць разлад, анархію. А які хаос у ідэалогіі! Як легка нашым ворагам удалося разваліць вялікую дзяржаву! Уяўляю, як яны паціраюць рукі — рэйганы, бушы, тэтчэры, колі. Коль на сёмым небе! Яшчэ б! Так легка атрымаць Усходнюю Германію! Ці сніў? Хоць я якраз за ўз'яднанне Германіі. Такі раздзел мог бы скончыцца дрэнна. Але што мы атрымаем ад вялікай Германіі? Рэваншызм, напэўна. А з цягам часу і новага Гітлера, які запатрабуе Кёнігсберг. І мы аддамо. Сказаўшы "а", мусім сказаць і "б".

Аднак даволі палітыкі. А пра што паразважаць з самім сабой, што даверыць паперы, а праз паперу і людзям, рана ці позна? Мае ўспаміны пра маленства, пра бацьку, пра цесця, Мікалая, Клаву, Вольгу далі аснову для кнігі, якая падабаецца мне. Аповяд пра блізкіх людзей — не тое, што расказ пра сачынёных герояў. Гэта зусім іншая творчасць. Разумею пісьменнікаў, якія няблага пішуць нарысы і не могуць сачыніць аповесць. Я напісаў пра некаторых калег сваіх, з якімі быў у блізкіх адносінах,— пра Коласа, Лынькова, Глебку, Броўку, Мележа, найбольш поўна — пра Андрэя, у «Аповесці пра сябра». Я выявіў сутнасць Макаёнка — чалавека, асобы.

3 верасня

Нестабільнасць, разлад жыцця ў краіне пазбаўляе людзей стымулаў да працы, нараджае дэпрэсію, абыякавасць — абы пражыць сёння. Гэта цяжкая хвароба, самая цяжкая з усіх. Як нялёгка нам будзе вылечыцца ад яе. І ніякая прыватызацыя, ніякая раздача зямлі сялянам не паможа. Больш таго, унясе сацыяльна-класавы антаганізм. Варта было б ведаць разумнікам Паповым, Чарнічэнкам: наш народ не змірыцца са з'яўленнем адкрытых мільянераў. Ці бачаць «вялікія эканамісты» і палітыкі нянавісць да кааператываў? А сённяшнія кааператывы — кветачкі. Што будзе з ягадамі? Страшна ад магчымасці сацыяльнага выбуху. Нацыянальны плюс сацыяльны — грандыёзная разня. Жах! Халадзееш ад перспектывы такой. Цяпер трэба змагацца не за мір у сусветным маштабе, а за мір І згоду ў сябе дома. Гэтага патрабуе жыццё. На выбухі яўна падбухторваюць ультрарэвалюцыянеры. Левыя заўсёды авантурысты. Ад іх — прагрэс, сацыяльны, але ад іх і беды, войны, паўстанні.

Аб жыццёвых стымулах. Яшчэ пяць гадоў назад, да «вялікай перабудовы», я меў упэўненасць у забяспечанай старасці. Накапіў трохі грошай. Можна афармляць пенсію і сачыняць мініяцюры, замалёўкі з натуры на вечныя тэмы. Спакойна і надзейна. А я ўсё творчае жыццё стараўся ўзнімаць праблемы. І што маю? Грошы? Чаго яны вартыя? Што на іх можна купіць? Кавалак кілбасы, пляшкі віна не магу дастаць. Ды колькі іх, грошай? Паўстагоддзя рабіў, як вол, і што зарабіў? Яўрэйская сям'я, суседзі па дачы, выехала ў Амерыку — шукальнікі шчасця! — і дачу купіў фізкультурнік, трэнер па тэнісе. Хлопцу 30 гадоў, і ён у тры разы багацейшы за мяне. Яго ўзровень жыцця здзіўляе і ашаламляе нават Вольгу Філатаўну, якая ніколі не зайздросціла чужому багаццю, усё аддавала людзям.

А між іншым, колькі гадоў яшчэ назад нас, пісьменнікаў, лічылі ледзьве не самымі багатымі людзьмі ў краіне, і нават інтэлігенты, асабліва апаратчыкі, кляймілі за «мільённыя ганарары». Пасля з'яўлення кааператараў, пасля ганарараў Пугачовай і Жванецкага (па 7, 10, 20 тысяч за выступление) нашы ганарары здаюцца жабрацкімі — 10 тысяч за раман, які пісаўся тры гады. А наперадзе чакае праблема выдання — з-за вострага дэфіцыту паперы. Вось такое жыццё! Такія стымулы!

4 верасня

У Маскве не хапае хлеба. Каму хочацца ўзрыву? Тым, хто губляе ўладу, ад каго яна сплывае пакуль што без крыві? Ці тым, хто рвецца да яе, да ўлады? Але сілы гэтыя розныя. Самыя сур'ёзныя тыя, што

падтрымліваюцца Бушам і Тэтчэр, Колем і Шамірам. Але гэтыя не зацікаўлены зваліць Мішу, ён ім патрэбны. Яшчэ б! Так памог аслабіць працiўніка, якога яны баяліся і які мог пры брэжневых зрабіць згубны крок. Дык каму ж патрэбны хлебны бунт? А гэта — не табачны. Такі бунт можа змесці ўрад. А хто падніме яе, выкінутую на сметнік уладу? Ельцын адкрыта патрабуе адстаўкі Рыжкова. І, здаецца, з'есць яго. І Гарбачоў пойдзе на гэтую ахвяру, каб утрымацца самому. А дарэмна. Рыжкова народ любіў, нягледзячы на ўсе эканамічныя цяжкасці, Рыжкоў пры пэўным павароце мог бы стаць альтэрнатыўнай фігурай абодвум ім — і Гарбачову і Ельцыну. Хоць практыка наказала, што эканаміст ён слабы, недарэмна ўзяў у галоўныя дарадцы Абалкіна. А Абалкін ёсць Абалкін.

А Рыжкова мне шкада, другой альтэрнатыўнай фігуры не бачна. Чамусьці здаецца, што ў ім стоены больш канструктыўны палітык, больш спакойны, разважлівы, народны, без залішніх амбіцый, якія ў Ельцына, ды і ў Гарбачова.

Палітыка — зараза, ліпне — не адмыцца. Не хочаш ёю жыць, а жывеш. І гэта — усенародны псіхоз. Кожны студэнт лічыць сябе вялікім палітыкам. І кожны музыка накшталт Ландсбергіса гатовы ўзяць уладу. А ў гэтым, па-мойму, бяда, што ў палітыку лезуць дылетанты. Рэвалюцыянеры ленінскай кагорты былі прафесіянальнымі палітыкамі, ва ўсялякім разе, ведалі і гісторыю і тэорыю марксізму. А што ведае Ландсбергіс, якую тэорыю? Наўрад ці вучыў ён глыбока гісторыю Літвы. Прунскене хоць эканоміку вучыла. І гэта адчуваецца. Але невукі не любяць вучонага, як бездары не любяць таленту. Гэтую бабу з'ядуць і гаплічкі выплюнуць. Як з'ядуць і Рыжкова толькі за тое, што многа людзей аддадуць яму свае сімпатыі. Сімпатыі, як каханне — яго ні з кім не дзеляць. Аддай частку некаму — адрываеш ад сябе... Патэнцыяльнага працiўніка трэба адціскаць ці зусім знішчаць, як рабіў гэта Сталін. Такая тайная логіка і псіхалогія палітыка.

Вялікае дасягненне развітых грамадстваў, што барацьба за ўладу ідзе адкрыта, галосна. У нас пакуль што толькі бачнасць адкрытасці і галоснасці. А ў сапраўднасці ўсё творыцца, як у тайных таварыствах сярэднявечча. Я назіраю за лідэрамі БНФ, як яны збіраюцца — змоўшчыкі! — і мне смешна робіцца з іх гульні. Хоць кіраўнікі партыі, да якой я належу без малога паўстагоддзя, таксама не выклікаюць сімпатый. Таксама змоўшчыкі. Маю на ўвазе тых, каго ведаю асабіста. Але галоўнае дрэнныя змоўшчыкі. Разгубленыя, спалоханыя, не здольныя на сур'ёзную барацьбу. Іх аплёўваюць маладыя крыкуны накшталт Навумчыка, а яны не могуць нават абараніцца. Той жа Сакалоў. Як да чалавека я адношуся да яго з павагай. Працаваў ён

сумленна і сакратаром райкома, і сакратаром абкома. Але там недзе, у мінулым, дасягнуў свайго ўзроўню кампетэнтнасці. Тут не цягне, асабліва ў гэтых незвычайных умовах. Самога сябе не ўмее абараніць. Не змагар. Не палітык.

Не палітык Дземянцей. Не за сваю справу ўзяўся. Падставілі яго. А чалавек добры. Знікне бясслаўна і бясследна. Шкада мне яго.

Кебіч... Гэта палітык. Але ці наш, ці нацыянальны? Ва ўмовах суверэнітэту трэба нацыянальныя палітыкі. Многа шуму рабіў Шушкевіч. Атрымаў цёплае крэсла — прыціх. Бацька яго, Станіслаў Шушкевіч, і пасля Сібіры заставаўся змагаром. Але за што? Палітык з яго заўсёды быў аморфны нават у нашых літаратурных справах. Выступаў на кожным сходзе. Але часта — як у лужу... І таму сур'ёзна не прымаўся. А гэта ўжо трагедыя — калі чалавека не прымаць усур'ёз. Што наканавана вучонаму фізіку Станіславу Другому? Можа, лепш, каб ён працягваў займацца фізікай? Хоць вучыў бы студэнтаў.

6 верасня

Праходзяць урачыстасці, прысвечаныя 500-годдзю Ф. Скарыны. Збор на ўчарашнюю сесію АН паказвае, што пэўная частка інтэлігенцыі праяўляе цікавасць да юбілею нашага асветніка, да гісторыі. І паслухаць было што на сесіі, даклады, іх дзесяткі два, не неслі адзнакі параднасці, дзяжурнасці. Вучоныя капалі глыбока. Справа іншая, што Скарына асоба мала вывучаная, супярэчлівая. Дагэтуль спрачаюцца: праваслаўны, католік? Кожны цягне да сябе. Доказна выступіў протаіерэй Міхаіл: усё ж праваслаўны. Спрэчка гэтая не схаластычная. Для нас, ва ўмовах сённяшняй барацьбы за душы беларусаў, яна, спрэчка, мае прынцыповае значэнне. Пэўная частка ідэолагаў, навукоўцаў вельмі хоча як мага больш беларусаў апалячыць. Менавіта апалячыць: католік — паляк.

Інтэлігенцыя шукае асновы для нацыянальнага адраджэння. А народ? Вельмі ж разбеларусілі яго. Ды і некаторыя сённяшнія «змагары» больш моднічаюць, чым адраджаюць. Такія, як Н. Шчасная (добрая мастачка!),— развучылася гаварыць пабеларуску і не вельмі імкнецца вярнуць бацькоўскую мову. А бацька яе з-пад Ракава і быў шчыры беларус.

Нямала і такіх, для якіх барацьба за нацыянальнае — шлях да ўлады. Во рвуцца! Хавалі Міхала Дубянецкага. Не люблю я «гульні ў сімвалы». Ёсць у гэтым нешта дзіцячае. Але ўчора БНФ наладзіў развітанне са сваім членам з нацыянальнай атрыбутыкай — сцягі "Пагоня". І гэта кранула. Асабліва малітва ксяндза — на беларускай мове. Умоўнасці, а хвалююць. Пачынаеш разумець сілу царкоўных

абрадаў. Яны — для душы. Розумам я атэіст, а малітва ўразіла. Вяртаемся да рэлігіі? Ды бог з ёй — няхай рэлігія. Царкоўнае песнапенне — высокае мастацтва. А жывапіс! Асабліва касцельны. Але каб з атрыбутыкай вярталася вучэнне Хрыста: не забі!

7 верасня

Уся творчасць Янкі Брыля, апошнія, прынамсі, гадоў дваццаць — дзённікавыя запісы. Чалавек ён назіральны, заўважае ўсё цікавае, многа бытавых дэталяў. Выдае ён гэтыя запісы як мініяцюры, многім дае назвы. Сапраўды, у асобных выпадках яму ўдаецца зрабіць навелы, лаканічныя, ёмкія, прыгожыя. Але большасць «жменя промняў». Так і называлася адна з яго кніг.

Здаецца мне, што такая форма творчасці — увесь час з нататнікам — перашкаджае сачыненню. А мы ўсё ж сачыніцелі! Якімі сачыніцелямі былі Пушкін, Гогаль, Дастаеўскі, Талстой, Колас, Горкі, Шолахаў. І Чэхаў — аўтар кароткіх навел.

Дастаеўскі апублікаваў многа дзённікаў. Але яны — тлумачэнне яго філасофіі. Ф. М. як бы баяўся, што з раманаў не кожны чытач выведзе яго філасофскую сістэму. У Брыля наадварот: усё — у дзённіках. Часам мне бывае шкада: такі сюжэт убачыў — аповесць, п'еса! — а Янка выкладае яго на адной-дзвюх старонках. А часам я творча зайздрошчу яго лаканічнасці і яго ўменню бачыць жыццё так — асколкамі, блікамі сонечных праменняў. Я жыццё бачу ў комплексе, людзі ў мяне завязаны ў складаную сістэму. Добра? Дрэнна? Позна што-небудзь мяняць. Пра Брыля прыгадаў, чытаючы свежы нумар «Полымя», дзе яго новая «жменя» пад празаічнай назвай «З новай кнігі». Добрая першая мініяцюра — пра Фёдара Янкоўскага. Пра Гогаля — паўтор, было; усе мы паўтараемся.

10 верасня

Два дні ідзе дождж. Не два дні — два месяцы, Ледзьве ўбралі збожжавыя, са стратамі. Вырасла слабая бульба, ды і тую — як убраць? Усё разладжана, шэфства над сялом таксама. Будзем галадаць. У краіне вырашчаны рэкордны ўраджай, а па хлеб чэргі. Ніхто ні ў што не верыць. Ні партыі (ды і партыям!), ні ўраду. І ўсе працуюць — абы, з прыпіскамі, яны паўсюдныя — нацягнуць на зарплату. Не, выплачваюць і прэміі. Але яны ні за што. Прадукцыйнасць не вырасла ні на грам, а грошы плацім — ад прыбытку, а прыбытак — ад павелічэння цаны на прадукцыю. БелСЭ «круціла», пакуль была папера, «Энцыклапедыю маладой сям'і», чацвёртае выданне, зарабілі некалькі мільёнаў і выплачваем прагрэсіўкі. Слова

якое! У мінулым годзе: гадавая, так званая трынаццатая, чатыры квартальныя — па паўтара акладу, тры дапамогі. У гэтым годзе больш: афіцыйна павышаныя а клады і тыя ж прагрэсіўкі, праўда, дапамога пакуль што адна — на адпачынак. І так ва ўсіх выдавецтвах, ва ўсіх дзяржразліковых прадпрыемствах. Грошы ідуць, а купіць няма чаго. Вось табе і «перестройка»! А было ж яшчэ «ускорение». Хапіла розуму адмовіцца ад паскарэння. А то забеглі о яшчэ далей з той хуткасцю. Куды?

Буш спецыяльна прыляцеў у Хельсінкі, каб сустрэцца з Гарбачовым. Дзіўны ваяж. Што выбіў гэты раз? Згоду нанесці ўдар па Іраку? Міша мог даць такую згоду. О, Буш глядзіць далека наперад. Не тое што нашы. ніхто не знае, што будзе заўтра ва Уласнай краіне. Змрочнае яно, наша заўтра. Будзем спадзявацца на паслязаўтра. Але да яго трэба дажыць. Пагрузіцца ва ўспаміны? Але што ўспамінаць? Пра маленства сваё я пісаў з уздымам і хваляваннем. Многія старонкі свайго жыцця ўлажыў у творы «Трывожнае шчасце», «Зеніт», «Карэнні і галіны» і ўспаміны пра настаўнікаў і калег. Пераацэньваць і свае погляды і свае творы? Не маю такой патрэбы, бо ні за што мне не сорамна. Калі не лічыць некаторых публіцыстычных артыкулаў маладосці — таго часу, калі жыў яшчэ Сталін, і я верыў яму і быў поўны энергіі і радасці, што застаўся жывы, выбіўся ў пісьменнікі, то за ўсё іншае не сорамна. «Помста»? Трагедыя і душэўная вялікасць чалавека. А хіба не такімі мы былі, як мой Раманенка? «Глыбокая плынь»? Гераізм людзей. А хіба не было яго? Безумоўна, нота высокая. Але такі быў час, і я быў шчырым сынам свайго часу.

У 1956 годзе я апублікаваў «Крыніцы», пісаць пачаў у 1953 годзе, да XX з'езда, і гэта сведчыць, што ўжо гады аўтар бачыў і ведаў сутнасць Бародкі. Хіба не ад разу зразумеў сістэму, якая нараджала іх, разумение гэтае для ўсіх нас прыйшло з XX з'ездам. І да лірычнай аўтабіяграфіі з вялікай доляй сачынёнасці дадалася суровая споведзь «Мост», якая мйогіх здзівіла. Гісторыю з «Мостам» можна было б напісаць шырэй. Ды не з яе трэба пачынаць! А з чаго? Узяць абкатаную мемуарную форму? Але дзённік вымагае свабоднай плыні ўспамінаў. Лепш не думаць пра чытача: ці зразумее? Урэшце, штосьці, можа, ніколі не будзе апублікавана. Пра чытача нельга не думаць у мастацкім творы. Ва ўсялякім разе я, грэшны, заўсёды думаў. Мяне папракалі: працую на чытача. Не таіў гэтага, ганарыўся нават. А на каго ж працаваць? І чытачы любілі мяне. І гэта давала творчую радасць.

11 верасня

Чаму я пайшоў у тэхнікум будаўнічых матэрыялаў? Што мы, вясковыя дзеці, пасля сямі класаў ведалі? Прачыталі аб'явы ў газеце — і падаліся. Помню, што вельмі хацелася ў аўтадарожны (Шапятовіч канчае аўтадарожны), але не хапіла ўзросту. А вучыцца хацелася. Мне — вельмі хацелася. У сёмы клас я за сем кіламетраў хадзіў, як на свята. Аб гэтым я пісаў у «Карэннях...». Так я паступіў у тэхнікум, якім кіраваў Аронаў і большасць выкладчыкаў былі яўрэі. І мы, вяскоўцы, лічылі гэта натуральным: Гомель — яўрэйскі горад; ніякіх праяў антысемітызму не помню, як не помню і несправядлівасці, знявагі модна адзетых выкладчыкаў да нас, галякоў. Было даволі дэмакратычна. Між іншым, студэнтаў-яўрэяў былі адзінкі, пазней я дапяў — непрэстыжная прафесія на той час: цэгла, цэмент, у суседнім медыцынскім тэхнікуме гараджан вучылася непараўнаўча больш. Уласна падзел ішоў менавіта так: вяскоўцы — гараджане; апошнія трымаліся асобна, хоць нам хацелася з імі сябраваць, праз іх мы ўваходзілі ў іншае жыццё. Вучыліся лепш вяскоўцы — больш працавітыя, менш пеставаныя. Разумныя хлопцы былі! Помню, у нас у групе вучыўся два курсы, здаецца, Анішчанка, з глыбокага Палесся, шэсцьдзесят вёрст да чыгункі. Упершыню ўбачыў поезд, калі ехаў паступаць. У Гомелі пачаў сваю дзейнасць з таго, што ў найвялікшым Доме Камуны, шэсць паверхаў, палічыў колькасць вокнаў, стоячы з торбай. Хлапчына гэты ўсіх здзіўляў. Фізіку выкладаў Грайпінер, немец (у вайну супрацоўнічаў з фашыстамі, але — дзіўна — не выехаў з немцамі і быў асуджаны, казалі, да расстрэлу). Дык гэты стары, чартоўскі строгі, перад ім першакурснікі дрыжэлі, меў сваю методу: праверыць веды па фізіцы на першых лекцыях. І сыпаў нас, гаротных; двойка — няма стыпендыП, і каці, хлапчына, дадому круціць каровам хвасты. Дык Анішчанку Грайпінер пратрымаў ля дошкі ўсе паўтары гадзіны, без перапынку. Спачатку лаяў — не так рашае задачы. А калі ўбачыў, што той рашае па сваёй методзе, пачаў толькі бурчэць і зрабіўся непазнавальна добрым. Пасля ён гэтага студэнта не апытваў, ставіў пяцёркі за пісьмовыя работы. Анішчанка пасля другога курса пайшоў у інстытут. Шкада, што не ведаю яго лесу.

12 верасня

Прозвішча таго хлапчыны не Анішчанка, падобнае, але ўспомніць не магу. Выдумаў сабе працу. Пры рабоце над раманам «пракручваеш» эпізоды сюжэта, размаўляеш з героямі — пачуць іх галасы, іх думкі ў той ці іншай сітуацыі, якую выдумаў. А дзённік —

успамінаеш рэальных людзей, падзеі. І, між іншым, даўнія прозвішчы, імёны ўспамінаюцца цяжка. А безыменна пісаць не магу, зніжаецца праўда расказу. Ёсць творы без імёнаў герояў, яны заўсёды здаваліся мне штучнымі. Жыццё даюць людзі. Але справа не ў прозвішчы — Анішчанка ці Анапрэнка, помню, што ў спісе ён ішоў першы ці другі.

Вучыўся я на «выдатна», але практык быў слабы — не цікавілі мяне гліна, мергалі, пяскі, і да механікі быў не прыдатны. Тэорыю ведаў, а працаваць на машынах не ўмеў і не любіў. Жыў літаратурай і пазней, зтрэцяга курса, каханнем.

Аб тым, як я праседжваў у гарадской бібліятэцы, як захапляўся тагачаснай паэзіяй, Маякоўскім, з якой павышанай цікавасцю ўдзельнічаў у працы літаб'яднання пры «Гомельскай праўдзе» — пра гэта я пісаў, з гэтага, здаецца, пачынаў адну з чарговых «дзённікавых паўз». Пра Кірэенку і Леаніда Гаўрылава пісаў, лідэраў аб'яднання. Я пісаў вершы, слабыя, іх крытыкавалі, вышэй ацанілі першае апавяданне — пра маладую фельчарыцу. Пісаў Машу, якая канчала медыцынскі. Але найбольш сур'ёзным вучэбным творам быў тагачасны мой дзённік. Я пісаў яго для Машы і, канешне, сачыняў на поўную сілу юнацкай фантазіі, пісаў сябе такім героем, такім рыцарам, што, уяўляў, у першай чытачкі (адразу намерыўся паказаць ёй дзённік, а інакш навошта пісаць!) галава закружыцца. І падзеі, героем якіх рабіўся, сачыняў — цэлыя прыгоды. Наіўныя і рамантычныя. Бацька ляснік — давай і прыгоды ляcныя. Са звярамі, парубшчыкамі, паляванням, хоць ніколі я паляўнічым не быў. А галоўнае, добра помню, выдумаў маладую жонку ляснічага, якая закахалася ў мяне і пісала пісьмы мне, дзённік запоўніў гэтымі пісьмамі. Лухта. Маша павінна была б прыраўнаваць, калі я даў ёй дзённік! Але, рэалістка, яна адразу зразумела, што ўсё гэта выдумка, і не прыняла ўсур'ёз. Мне было нават крыўдна. Цяпер смешна. Але, унікаючы ў сутнасць вучобы творчай, гэта быў разумны прыём: ён развіваў фантазію, даваў навык мадэлявання характараў, псіхалогіі іншых людзей. Рэалістычныя ваенныя дзённікі таго не давалі, хоць і там была рамантычная лінія — перапіска са смаленскай дзяўчынай, якая апынулася на Урале, Жэняй Бугровай. Яна напісала, пачуўшы мой зварот па радыё, у якім, як і тысячы іншых, я зрабіў спробу знайсці кагосьці з блізкіх — можа, Машу (верыў, што яна эвакуіравалася), можа, брата Паўла. Жэня, адукаваная дзяўчына, пісала цікавыя пісьмы, і я запісваў цытаты з іх, ды і пісьмы захаваў. Прывёз у Пракопаўку. Вось да гэтай легенды жонка прыраўнавала. Нават да завочнага знаёмства. Таямніцы жаночай псіхалогіі.

Што яшчэ помніцца са студэнцкага жыцця? Самыя яркія ўспаміны — практыкі на заводах у Данбасе, у Кастраме і асабліва дыпломная на цэментавым заводзе ў Росі, куды ў студзені 1940 года, неўзабаве пасля вызвалення Заходняй Беларусі, былі накіраваны лепшыя студэнты, камсамольцы, — Міша Бахун, Жэня Крахмалаў і я. Але і пра гэта, здаецца, пісаў. Пачаткаў «дзённікавых эпапей» ляжыць недзе некалькі, у агромністым архіве з мноствам рукапісаў, пісьмаў, нават знайсці нялёгка. Выпадкова знайшоў адзін сшытак у шуфлядзе стала на дачы. Баюся чапаць архіў, не люблю разбіраць яго. Калі трэба — рэдка магу знайсці сам, шукае Маша. А ведаю калег сваіх, у якіх усё падшыта, складзена ў папкі. Зайздрошчу іх акуратнасці. Я акуратны, пакуль пішу. Напісаў, узяўся за новае і забываюся. Кажуць, Дастаеўскі не помніў сюжэтаў сваіх даўно напісаных раманаў. Веру. Сюжэты я помню, а герояў не помню, нават не другарадных. Хоць і сюжэты... Год назад тэлебачанне зрабіла спектакль па маёй п'есе «Экзамен на восень». Харошы спектакль. Глядзеў і здзіўляўся: і гэта я сачыніў?

...Пачала работу сесія Вярхоўнага Савета СССР. Кардынальнае пытанне: аб эканамічнай рэформе (колькі іх было!), аб пераходзе на рыначныя адносіны. Прызнанне Гарбачова, Рыжкова аб поўным краху палітыкі перабудовы. Ельцын аб гэтым гаворыць адкрыта і даўно. Дэмагог таксама. А што ты зрабіў? Учора сесія РСФСР пад яго кіраўніцтвам і па яго ініцыятыве ставіла пытанне аб недавер'і саюзнаму ўраду. Здаецца, не прынялі, невыразны рэпартаж. Але які бардак! Яны зводзяць рахункі, а краіна развальваецца. Па-мойму, рыжкоўская і шаталінская праграмы, якія супрацьпастаўляюцца, у выпадку прыняцця любой з іх — крок да поўнага развалу. Гарбачоў мусіў нарэшце прызнаць, што ні адзін закон не дзейнічае, акрамя ўказаў аб узнагароджанні. Катастрофа! Слухаеш — і халадзееш. Што чакае нас? Што чакае нашых дзяцей? Хто можа паправіць становішча? Ельцын? Папоў? Абалкін? Пазьняк? Баюся, як бы мы не прыйшлі да свайго Піначэта. Між іншым, пры дыктатуры Чылі набрала эканамічную моц. Усё ў свеце парадаксальна! У Грузіі стварылі таварыства «Сталін». У Сталіна верыць Ніна Андрэева. Жах! У што верыць нам, грэшным?

13 верасня

Падпісаны Дагавор аб знешнепалітычных аспектах аб'яднання Германіі. У Маскве. Зрабілі падарунак немцам. Які падарунак! Мне не падабаўся раздзел Германіі з самага пачатку — бомба! Але ўчора перад тэлевізарам, гледзячы на самазадаволеных немцаў, балюча стала. Салдаты! Што так лёгка аддаём плады перамогі, якая каштавала 27

мільёнаў жыццяў, павержанаму ворагу?! У немцаў — свята. Уяўляю, што будзе рабіцца з кастрычніка. Усё гэта мастацкі свіст — аб беспрацоўі ў былой ГДР. Чорт іх не возьме! Чорт бярэ за горла нас. Са страхам думаю пра зіму, якая наступав. Хапіла б хоць паліва і... хлеба, аднаго хлеба — і гэта было б шчасцем. Цяпер не веру ні Гарбачову, ні Ельцыну, ні Рыжкову, ні Шаталіну. Ад гэтага пуста ў душы. Асуджаю тых, хто выходзіць з партыі. А самому не хочацца выбірацца дэлегатам з'езда, нашага, беларускага. Маюць намер выбіраць ажно ў Гомелі. Трэба ехаць выступаць, гаварыць — пра што? Хваліць сябе? Хоць сказаць мне ёсць што. Я ўсё ж у вобразах людзей розных катэгорый сачыніў летапіс цэлай эпохі: вайна, усе пасляваенныя павароты. Так любіў сустракацца з людзьмі, чытачамі. А цяпер не магу — брыдка, здаецца, людзі стаміліся ад нашай балбатні, заблыталіся, дзе ёсць што. «Смутное время» — так гаварылі пра пэўныя перыяды рускай гісторыі. Ці не самае смутнае зараз? Крушэнне ідэалаў — гэта страшная рэч. І людзі без ідэалаў страшныя, бо тады шмат іх бярэцца за нож і абрэз. Недарэмна такі разгул злачынства. У глухім месцы — і ў горадзе, і ў лесе — баішся кожнага сустрэчнага. За дзяцей дрыжыш. Вось табе і свабода! Пры такім настроі блякнуць самыя ружовыя ўспаміны маладосці.

15 верасня

Пагартаў адзін сшытак даўніх дзённікаў, які апынуўся на дачы, і адкрыў, што некаторыя ўспаміны, якія прыходзяць зараз і кладуцца на паперу, у той ці іншай форме запісваліся 8-9 гадоў назад. Варта было б прачытаць тыя запісы, але ляную ся, ды і цяжка чытаць уласны почырк, такі ён стаў неразборлівы (папухлі пальцы).

Ці была яна ружовай, наша маладосць? Я сачыняў лясную рамантыку, а жыў у суровай прозе. Прыязджаў з тэхнікума на выхадныя да бацькі і ўзяць з дому мог хіба акраец матчынага хлеба, які быў смачнейшы за гарадскі, шматок сала, ды і то не заўсёды, ці галачку масла — і гэта было шчасцем. Грошай у бацькоў ніколі не было. Леснікоўскі аклад быў мізэрны, прадаць што-небудзь не ўмелі. Ды і колькі можна было зарабіць на бульбе, бураках, малацэ? Бацька лічыў, што 60 рублёў маёй стыпендыі — вялікія грошы, у яго, здаецца, гэтакая ж месячная зарплата была. Маці хадзіла ў суседнюю падсобную гаспадарку Злынкаўскай запалказай фабрыкі і ўпотай пазычала ў таўсцяка дырэктара Букатага якую дзесятку для мяне. Пасля ўжо сказаў мне Віктар Вольскі, які вучыўся ў Вышкаўскай школе і добра ведаў гэтага Букатага, што чалавек гэты з дваран. Пасля вайны расказвалі, праверыць было немагчыма, што, выехаўшы з немцамі, ён

невядомым чынам апынуўся ажно ў Егіпце, пісаў нібыта адтуль. Яшчэ адзін чалавечы лёс.

Чаму бацькі былі да вайны такія бедныя? Не ўмелі гаспадарыць? Пасля вайны, маючы адну карову, яны жылі куды багацей, я прыязджаў з трыма дзецьмі ў пачатку 50-х, і дзяцей хіба што не купалі ў малацэ і смятане. і самае парадаксальнае — што пасля вайны бацька не здаваўся скупым, наадварот — залішне шчодрым быў: карміў ледзьве не кожнага, хто прыязджаў у лес. Вайна навучыла?

Помню чэргі па хлеб зімою 1939/40 г., калі ішла фінская вайна. Мы, студэнты, паднімаліся ў чатыры раніцы і на сабачым холадзе, марозы стаялі лютыя, дрыжэлі ў сваім студэнцкім адзенні пад дзвярамі булачных. І цяпер халадзею ад успамінаў пра той холад. Можа, таму здапася раем практыка ў Росі. Якая там сталоўка была на заводзе — па польскіх мерках! Але не сталоўка прыцягвала. Уся атмасфера ўздыму. Людзі радаваліся свабодзе, хоць дзесьці падсвядома мы адчувалі, што пры ўсім гнёце, які панаваў пры Пілсудскім, заходнікі, фабрычныя, як яны называлі сябе, адчувалі сябе свабадней, чым мы. Пра гэта даверліва казаў мне Міша Бахун — мне аднаму, можа, Крахмалаву таксама аднаму, трое мы на такія тэмы не гаварылі — асцерагаліся, хоць ніхто з нашых блізкіх рэпрэсіраваны не быў. І ў тэхнікуме было ціха. Не помню, каб кагосьці з аронаўскай каманды арыштавалі, нават немца Грайпінера не зачапілі. Помню, аднаго студэнта выключылі з камсамола і з тэхнікума за нейкія выказванні ці за чытанне забароненай кнігі, не засталася ў памяці сутнасць справы.

Раскулачванне ў Краўцоўцы было невялікае — сям'і дзве, і я, лясны жыхар, яго не бачыў і не перажываў.

Я быў самы прававерны камсамолец, Бахун, старэйшы гады на два, да ўсяго адносіўся больш крытычна, асабліва да жыцця ў вёсцы, да гаротнага жыцця бацькоў сваіх.

Але менавіта там, у Росі, на заводзе, і мяне абставіны вымусілі задумацца над тым, што ж творыцца навокал, як легка пэўныя органы вырашаюць лес людзей.

Практыку мы праходзілі так сабе — для справаздачы перад Ганчалем, ён выкладаў тэхналогію буд. матэрыялаў. Нас, камсамольцаў, партыйныя ўлады выкарыстоўвалі як прапагандыстаў. Цікава, што мы расказвалі тым заходнікам аб жыцці ў нас, на ўсходзе, у райскай краіне, якая для іх усё яшчэ заставалася за мяжой? За 4-5 месяцаў яны пра многае ўжо даведаліся. Пра шмат што, ды не пра ўсё.

Ішла падрыхтоўка да выбараў ад заходніх абласцей у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР (яны адбыліся ў сакавіку 1940 года).

Праходзіў шумны і вясёлы сход па вылучэнні кандыдатаў. Нам было загадана рассесціся ў розных месцах залы разам з дзяўчатамі і хлопцамі, з якімі пасябравалі, і першымі пачаць пляскаць. Але гэта непатрэбна было, пакуль па вядомай схеме вылучалі Сталіна, Молатава, Варашылава. Зала ўзрывалася такімі апладысментамі, што здавалася, абрушыцца столь.

Але вось чарговы падрыхтаваны прамоўца называе мясцовую кандидатуру: Ніна Сняжко, вугалышчыца, дзяўчына з беднай мнагадзетнай сям'і. Ім, беднякам, далі вялікую кватэру ў заводскім доме, які кампанія будавала для інжынераў. У тым жа доме, паверхам ніжэй, у такой жа вялікай пустой кватэры пасялілі нас, практыкантаў, і мы адразу ж пасябравалі з гэтай сям'ёй, з братамі Ніны, з бацькамі, вясёлымі, прыветлівымі людзьмі. Міша Бахун нават ціскаў у пад'ездзе будучую дэпутатку, яна была перастараркай, гады на тры старэйшая нават за Мішу, і ёй вельмі хацелася выйсці замуж.

Сняжко Ніна Віктараўна... І як мы трое ні стараліся, ніхто больш нас не падтрымаў, ніхто не пляснуў. Магільная цішыня. Першым слова папрасіў мужчына, які быў намнога старэйшы за нас, але нежанаты, як многія заходнікі, і мы з ім сябравалі, ён быў у актыве — загадчык клуба. Забыўся прозвішча, а імя помню — Вацак. Музыка — скрыпач, танцор, спявак, ён быў душой калектыву, меў нейкую адукацыю.

У яго было звычайнае разумение дэмакратыі; ён выступіў супраць Ніны Сняжко: «Хіба такая малапісьменная дзяўчына, вугалышчыца, абароніць нашы інтарэсы ў парламенце?»

Але дырэктар завода, сакратар райкома, партарганізацыі і мы, камсамольцы, выступілі за Ніну, цярпліва тлумачылі сутнасць нашай вышэйшай дэмакратыі, калі і вугалышчыца можа кіраваць дзяржавай. Зала моўчкі прагаласавала. На другі дзень стала вядома, што Вацака забралі. І мы, куміры моладзі, адчулі, як адхілілася ад нас значная частка дзяўчат і хлопцаў, найбольш адукаваных, пераважна польскай нацыянальнасці. Крахмалаў мацюкнуў іх: контра! А мне і Бахуну было крыўдна і балюча. Нам было няўцям: завошта забралі чалавека? Што выказаў сваю думку? Дык і мы трымаліся такой жа думкі, хоць і сябравалі з гэтай Нінай. Міша нават хацеў пахадайнічаць за Вацака і хадзіў да сакратара, але пасля размовы змоўк.

Вацаку таму пашанцавала: тыдні праз два яго адпусцілі, але рабіў ён ужо не ў клубе, а на заводзе, каля печы, з намі сустракацца пазбягаў.

Лес Ніны Сняжко. У лютым 1945 года наш дывізіён перадыслакаваўся з Петразаводска ў Познань. Эшалон спыніўся на ст. Рось.

Як мне хацелася наведацца на завод! Але ж гэта юламетры за тры. Распытваў людзей пра ўсіх знаёмых заводскіх. Дэпутатку немцы адразу ж некуды вывезлі, і лес яе невядомы (і пасля вайны я не даведаўся). Крыўдна было пачуць, што двое братоў яе пайшлі ў паліцыю. Вось табе і беднякі, пралетарыі! Там жа пачуў я, што другая бяднячка, з суседняй вёскі, першы сакратар камсамольскай арганізацыі Вера Целеш павешана фашыстамі. І бацька, падпольшчык яшчэ з польскіх часоў, таксама навешаны. Доўга я выношваў сюжэт з гэтымі падзеямі, з гэтымі характарамі. Чаму не рэалізаваў — не магу ўспомніць. Але штосьці стрымала. Што?

17 верасня

Па тэлебачанні гляджу ўсю муру — лягчэй з адным вокам, чым чытаць. Учора страціў вечар на двухсерыйны фільм «Шафёр для аднаго рэйса». Прыцягнула, што аўтар сцэнарыя Афанасій Салынскі, з якім мы з Андрэем падтрымлівалі бадай жа сяброўскія адносіны. Вядомы драматург. Мэтр. Філосаф. Крытыкі хвалілі ўзахлёб. І во — фільм. Пляваўся, а дагледзеў да канца. Інакш як дурным сачыніцельствам назваць нельга. «Развесистая клюква», як кажуць па-руску. Спекулянты! Вось так яны кампраметавалі літаратуру і мастацтва, якім самі ж прыдумалі метад — сацрэалізм. І самі ж кампраметавалі яго. Ні адзін пісьменнік, які паважае сябе, не мог бы напісаць такі сцэнарый ні па якім метадзе. І ніхто ні ў аднаго сур'ёзнага аўтара такую халтуру не прыняў бы, каб страціць на яе мільён дзяржаўных грошай. Салынскім адкрывалі зялёную вуліцу. Самсонава зрабілі ледзьве не класікам кінарэжысуры. А калі мы рабілі «Гандлярку і паэта», я пераканаўся, што ў лепшым выпадку гэта рамеснік, які набіў руку. Абмежаваны чалавек. Сам не мог напісаць ніводнай рэплікі, якая лагічна састыкоўвалася б з папярэднім дыялогам, з логікай характараў герояў. Такая глухата да літаратурнага слова мяне проста ашаламляла. І другі рэжысёр, Іосіф Шульман, вучыў мяне, маладога, пісаць, здымаючы фільм па рамане «Крыніцы». І зняў па праблемным рамане з такім вобразам, як Бародка (у той час першы такі характер), набор прыгожых пейзажных малюнкаў. Яшчэ адзін творца сацрэалізму. Колькі іх вучыла нас, маладых хлопцаў. Той жа Кучар, першы мой крытык. Пачаў з таго, каб знішчыць церухоўскага настаўніка як пісьменніка. І каго нацкаваў — Лынькова! Гэтаму Кучару хоць пры жыцці сказалі, што ён даносчык. Хоць чорт яго не бярэ: мае 80 гадоў і яшчэ водзіць машыну. Але юбілей яго не адзначыў нават «ЛІМ». Кучар скончыўся як асоба да фізічнага сканання. У беларусаў хапіла мужнасці. Цяпер і рускія пісьменнікі

заслугоўваюць павагі. Позна, праўда, агледзеліся, хто і куды іх вёў. Завялі-такі ўтупік і краіну, і літаратуру. Цяпер заклікаюць адступаць назад ледзьве не ў сярэднявечча — з амерыканскімі камп'ютэрамі. Давай рынак! Давай фабрыкантаў, купцоў, кулакоў! І тут жа другія сілы — давай цара! Вярнулі бога. Добра, няхай. А помнікі Леніну зносяць. І аператары тэлебачання смакуюць гэтыя кадры. Баравік, Шатроў у «Пазіцыі» асуджаюць вандалізм, а словы іх суправаджаюцца здзеклівым паказам, як «баба» б'е па мануменце, як ляжыць на доле павержаны Ільіч. Яўны здзек! Але маўчым. Інтэлігенцыя маўчыць. Партыя маўчыць. Браткі! Таварышы дарагія! Што мы робім? Дзе наш голас? Хаця б голас. А мы яшчэ ўлады не страцілі. Што будзе, калі страцім? Да гэтага ідзе. Звяляць не толькі Леніна. Скосяць нас, жывых. Не можа быць ілюзій наконт кароцічаў, што абвяшчаюць сябе гуманістамі. Ды за свае мільёны яны перарэжуць нам горлы і апраўдаюць гэта — у імя гуманізму. Давёў, Міхал Сяргеевіч! Ох, давёў! І табе спакойна спіцца? Да пэўнага часу я верыў у перабудову, якую ты пачаў, і ў добрыя намеры, даказваў, што на крутых паваротах не бывае без зрываў, правалаў, цяжкасцей. Але дзе ж канец падзенню? Мы згарым раней, чым разаб'ёмся. Мы гарым у шчыльнай і смярдзючай атмасферы антыкамунізму. Нашы знешнія ворагі ніколі не дасягалі такой канцэнтрацыі атрутнага чаду. І народ чадзее, у яго баліць і кружыцца галава. І гэта самае страшнае — што людзі губляюць здольнасць мысліць цвяроза, рэальна, аналізаваць сувязь ідэй, падзей, фактаў. Божа, памілуй нас!

19 верасня

«Буксуе» мой дзённік. Форма, якую я выкарыстаў у «Карэннях...» — вялікія блокі аб сваім маленстве, аб бацьках, амаль сюжэтныя, — тут дрэнна спрацоўвае: не выцягваю на такія блокі аб сваіх студэнцкіх гадах — няма людзей, якія вызначалі б мой лёс. Адна Маша. Але ў «Непаўторнай вясне» амаль дакументальна апісаў наша каханне; любы новы запіс, у любой форме, быў бы бледнай копіяй. Больш яркіх характараў акружала мяне ў арміі (пра Віктара Вольскага варта напісаць больш падрабязна!). Але армія, вайна — у аповесці «Агонь і снег» і ў рамане «Зеніт». Аповесць крытыкі лічылі лепшай у кнізе, хоць, думаю, больш рэалістычная — «Мост». У «Агні...» праўдзівы фон, дакументальна дакладны, першых дзён і месяцаў, мае перажыванні — форма дзённіка героя аказалася ўдалай, пераканаўчай. Але ў аповесці нямала і сачынёнасці, фантазія мая ў гады напісання «Трывожнага шчасця», «Сэрца...» была бязмежная. Тое ж атрымалася і з «Зенітам», хоць напісаны ён у старасці. Праўда, там

сачынёнасць іншага плана. Зноў-такі агульны фон і думкі героя дакладна адпавядаюць таму, што перажыў я. І ўсе атрыбуты баявога жыцця амаль дакументальныя. Праўдзівая гісторыя дывізіёна, такім быў шлях нашага 33-га асобнага зенітна-артылерыйскага (ОЗАД). Калбенка — Калбёка, Кузаеў — Кузьмін, Тужнікаў — Нужненка... Вобразы гэтыя — копіі прататыпаў. А вось характеры дзяўчат шмат у чым сачынёныя, рамантызаваныя. Але лічу, што гэтая рамантычнасць у апісанні вайны, не заўважаная ці не ацэненая крытыкамі, толькі падкрэслівае трагізм лёсу гэтых няшчасных дзяўчат. Бачыў я пакуты гэтых гаротных дзяўчатак. Не магу без слёз успамінаць і расказваць пра іх. І таму, апрача агульнай канцэпцыі, я ўзвышаў іх. Неяк выходзіла, што самі яны ўзвышаліся. Ванда, напрыклад. Была ў нас адукаваная, няўрымслівая, гуллівая, недысцыплінаваная архангельская дзяўчына; не зналі, куды дзяваць яе, камандзіры падгульвалі з ёй, стараліся пазбавіцца — баяліся. Не полька — руская. Але дывізіён пад канец вайны кідаюць у Польшчу — так было ў жыцці, так у рамане. Трэба было глянуць на Польшчу вачамі такога чалавека, які жыве Польшчай. У сапраўднасці я глядзеў на Польшчу вачамі нашага заходніка сяржанта Цішкевіча, які ў Познані дэзерціраваў з дывізіёна — каб не вяртацца ў Саюз. Член партыі, ардэнаносец, лепшы камандзір гарматы. Адразу пасля вайны мне хацелася напісаць аповесць аб тым, які цяжкі лёс напаткаў такога дэзерціра. Але Польшча стала сацыялістычнай, і ўнутраны рэдактар стрымаў мяне ад такога сюжэта.

Успомнілася дзяўчына (імя, прозвішча не помню), якую я з Петразаводска вёз на снарадах у далёкую батарэю МЗА; дзяўчыну пакаралі за сувязь з сяржантам, камандзірам прыбора, але мужчыны, вопытныя зенітчыкі, былі залатым фондам, іх нікуды не адсылалі. «Закрывалі» ЧП вось такім пакараннем няшчасных закаханых дзяўчат. Каму трэба было разлучаць іх? А калі сапраўднае каханне і магла б утварыцца добрая сям'я? Я і мой шэф Калбека былі супраць такіх распраў, але нужненкітужнікавы пільнавалі форму і свой мундзір.

Дзяўчына доўга плакала, не памагалі мае суцяшэнні, плакала, ажно пакуль мы не наскочылі на грузавік, разбомблены нямецкім самалётам. Забітыя, раненыя. І яна пераўтварылася, памагаючы раненым. Яна нават з выгляду змянілася. І зараз стаіць перад вачамі, як перавязвала раненых перада мной, разгубленым, няўмелым. Эпізод з жыцця даў яркую сюжэтную лінію і яркі вобраз. Але пісаў я характар Глашы не з ваенных дзяўчат — з жонкі Віктара Вольскага — Уладзіславы. Так часам ствараюцца вобразы. Улада была яркім характарам! Я яе ведаў гадоў трыццаць і «прыцэльваўся» — куды, у які твор уставіць, у якой іпастасі. і вось... У «Зеніт» яна як бы сама

папрасілася. І вельмі лагічна ўпісалася. Крытыкі папракаюць, што сучасныя сцэны — жыццё і праца прафесара Шыянка — слабейшыя, чым ваенныя. Але ж сучасныя сцэны стэнаграфічна спісаны з нашых з Віктарам адносін, з яго і з Улады, хоць былы сяржант і цяперашні дыпламат атрымаўся сапраўды, можа, «прыгладжаны» (Віктар не такі!) у параўнанні са сваёй яршыстай і выразнай жонкай. Гэта тайна творчасці: часам стараешся, да «сёмага поту», напісаць значны вобраз — а пішацца цень, а побач другарадны характар, «дапаможны», раптам, займаючы сціплае месца ў раманным доме, выходзіць на першы план, засланяе галоўнага. У «Гандлярцы...» я і Вольгу пісаў з такой жа стараннасцю, як і Паэта, а выйшла: Вольга — жывая, рэальная, а Паэт — кніжны. Хочацца мне нагадаць у наш час «мудрым крытыкам», як яны разносілі аповесць (у Маскве, на абмеркаванні прозы!) за тое, што ў яе цэнтры — камароўская гандлярка. Дагаварваліся «мудрацы», што не было такіх у Мінску (гандлярак не было!) і з адыходам нашых часцей ніхто не рабаваў магазіны і склады — такія свядомыя былі савецкія людзі. І так «зашораны» былі зусім не дурныя людзі, разумныя людзі, якіх я паважаў і паважаю, хоць да мяне адзін з іх адносіўся проста па-свінску. Дарую яму.

Самае цікавае, што з пахаваннем сацрэалізму ўсе падобныя крытыкі страшэнна не любяць успамінаць тыя даўнія свае погляды. Нагадай ім — нажывеш ворагаў. А чаго, уласна кажучы, саромецца таго, у што мы шчыра верылі? Можа здарыцца, ды і напэўна здарыцца, што нехта будзе адхрышчвацца ад сённяшніх сваіх ультрарэвалюцыйных выказванняў.

20 верасня

Сесія ВС РСФСР прагаласавала за недавер саюзнаму ўраду. Пайменна, з перавагай 154 пры 189 дэпутатах. Выпадак, па-мойму, беспрэцэдэнтны не толькі ў нас, але і ў буржуазных парламентах — каб суб'ект федэрацыі выказваў недавер цэнтру. А калі цэнтр не згодзіцца падаць у адстаўку? Якія механізмы будуць запушчаны? Не цяжка здагадацца, маючы такога суб'екта — Расію. Палохае іншае. Урад, які давёў краіну да такога крызісу, лепшай долі не заслугоўвае. Няхай ляціць у тартарары. Але суддзі хто? Брыдка, што верх бяруць не высокія прынцыпы, не клопат пра народ, а амбіцыі, звядзенне рахункаў. Горка.

Але яшчэ больш абурыла... і спалохала (не баюся прызнацца), калі вылез нейкі бязвусы ёлуп-дэпутат і зачытаў зварот супраць Кастрычніцкай рэвалюцыі, за адмену святкавання гадавіны рэвалюцыі.

Даехалі — далей некуды. Як адзначаюць французы дзень узяцця Бастыліі! А партыя выцірае соплі. Паралізавана наша партыя.

23 верасня

«Камсамолка» і «Літгазета» апублікавалі вялікі артыкул А. Салжаніцына «Как нам обустроить Россию». Чалавек, які сядзіць у Штатах за высокім плотам з электроннай аховай, лезе ў «отцы нации» (не адной), у прарокі. Ёсць, канешне, цікавыя думкі — не дурны чалавек. Але калі ён раіць, як нам разваліць Саюз, дык нашы хатнія «прарокі» без яго гэта паспяхова робяць, смешныя яго падказкі: аддзяліць 12 рэспублік, утрымаць Украіну (ох, выдадуць яму ўкраінскія нацыяналісты!), Беларусь, Казахстан. Вярнуць земствы, земскі сабор. Адным словам, назад, да сярэднявечча! Быццам і не было шматвекавой гісторыі барацьбы народаў са сваімі эксплуататарамі, гісторыі савецкай дзяржавы. Чакаў, што Салжаніцын і цара прапануе. Не, хапіла розуму: ён за моцную прэзідэнцкую ўладу. Падыгрывае Ісаіч не столькі, можа, прэзідэнту, колькі «сильным мира сего», хто падтрымлівае цяперашняга нашага прэзідэнта. На мяне артыкул зрабіў цяжкае ўражанне.

Гэта вельмі выразна падкрэсліла другая публікацыя ў той жа «Комсомольской правде» — артыкула яшчэ аднаго дысідэнта, яшчэ аднаго выгнанага і рэабілітаванага — Аляксандра Зіноўева «Я хочу рассказать вам о Западе». Проста, даверліва. Адразу відаць, што гэты не сядзеў у ФРГ за высокім плотам, зашораны паталагічным антысаветызмам. Гэтага выслалі за крытыку нашай сістэмы. Але і на той «заходні рай» ён глянуў крытычна, як сур'ёзны вучоны, эканаміст, палітык. «На место старой идеологической лжи относительно Запада как средоточия зол пришла новая идеологическая ложь, в которой Запад выглядит уже как средоточие добродетелей и как образец для подражания».

Сказалі гэта Гарбачоў, Якаўлеў, Мядзведзеў? Сказаў Лігачоў — яго аплявалі. Асцярожна — асцярожнасцю рэформ — спрабуе сказаць Рыжкоў; супраць яго арганізавалі цкаванне на ўзроўні Вярхоўнага Савета Расіі.

Што скажуць пра Зіноўева? Цяжка аспрэчваць чалавека, які 12 гадоў пражыў у «раі». А ён не галадаў — выпусціў 30 кніг. Пры іх ганарарах! І ён піша: «Подавляющее большинство западных людей добывает средства существования ценой усилий и жертв, о каких в России понятия не имеют». Вось так пра рай! «Если Россия тоже встанет на этот путь, она вряд ли попадет в число привилегированных капиталистических стран. Видимое изобилие товаров, возможно,

и появится. Но для кого? Какой ценой? Каким окажется слой изгоев, которым даже нынешний жизненный уровень России покажется недостижимым изобилием?»

Абсалютная праўда! Няўжо нашы гэтага не разумеюць? Пакуль мы дасягнем цяперашняга ўзроўню ФРГ, Англіі, пройдзе 30-50 гадоў. А да таго — ох, сербанём ліха! Няўжо рабочы клас не разумев гэтага? Кароцічы і бурлацкія стануць мільянерамі. А той, хто жыве з мазаля? А калі апынецца ў сітуацыі, што і мазоль не будзе на чым нацерці, каб за гэта заплацілі?

«Западное общество есть по преимуществу общество жмотов. В одной из самых богатых стран мира — в Западной Германии — семья в среднем покупает одну книгу в год, в России же — в среднем одну книгу в месяц».

«Тот благополучный Запад, о котором мечтают в России, есть лишь маленький островок в океане грязи и страданий».

І зноў папярэджанне:

«Можно прийти в отчаяние, глядя, как эта зараза (ідэалогія грошай) овладевает нашей страной».

І самае істотнае, пра што забыліся ідэолагі: «Такое оплевывание своего социального строя и своей истории, какое теперь можно видеть в Советском Союзе, тут не допустили б ни в коем случае». І бязлітасны вывад крытыка камунізму: «Историческая судьба России настолько прочно срослась с судьбой коммунизма, что попытка отказаться от него и перейти на путь западнизации равносильна исторической гибели самой России, выпадению ее в число народов неисторических».

Пачуйце ж голас рэаліста, палітыкі і ідэолагі. Адумайцеся! Агляніцеся! Прымерце! Народ! За кім ты ідзеш?

25 верасня

Распладзілася газет, і ў іх столькі лухты! Сёння ўбачыў адну газету — нашу, «Демократической платформы Белоруссии». Назва «Господин народ». Во дэмагогі! Во змагары! За беларускі народ, а газета на рускай мове. Як жа будзем будаваць свой суверэнітэт?

А колькі напладзілася прарокаў, астролагаў, глобаў і жлобаў, варажбітоў, экстрасенсаў. І ўсё гэта друкуюць часам сур'ёзныя газеты. Але народ ужо стаміўся ад усёй гэтай балбатні — палітычнай, эканамічнай, астралагічнай. Раней газет было не купіць, зараз ляжаць свабодна ўсе, нават «Свободная трибуна писателей». З падаражаннем тыражы, безумоўна, рэзка ўпадуць. Але, можа, у гэтым і ратунак — для нашага брата выдаўца, пісьменніка: не такі востры будзе дэфіцыт паперы. Хоць мафія можа стварaць дэфіцыт і там, дзе прадукцыі

ажно замнога. Інтэрв'ю Рыжкова: 30 працэнтаў прадукцыі не знаходзіць спажыўца, не заключаюцца дагаворы. Цікава, што гэта за прадукцыя? А ўвогуле цяжка зразумець механізм рынку, механізм дэфіцытаў. Усе ж працуюць, зарабляюць грошы. А куды дзяюцца тавары? Трэба надзвычайныя меры да спекулянтаў і сабатажнікаў, як у часы ваеннага камунізму. Ельцын спалохаўся асобых паўнамоцтваў прэзідэнту. Учора ВС іх даў. А я за паўнамоцтвы. Толькі ці рэалізуе іх прэзідэнт? Дарадцы яго не выклікаюць даверу: Якаўлеў, Прымакоў, Шаталін, Абалкін і іншыя. Праўда, учора ад Сабчака і Папова Міхал адхрышчваўся злосна, раздражнёна. Але ці стукне кулаком? А гарады пакінулі на зіму без бульбы, гародніны. Без бульбы будуць есці больш хлеба, і яго не хопіць. Усё ж узаемазвязана. Часам складваецца ўражанне: тое, што бачыш, ведае кожны мал-мала адукаваны чалавек, не бачаць (ці не хочуць бачыць?) кіраўнікі, вучоныя. Каб я прыйшоў да Кебіча з парадай, можа, з ветлівасці ён і паслухаў бы, але нават самае бясспрэчнае — не сумняваюся — не прыняў бы, калі сам да гэтага не дапяў, і паблажліва пасміхнуўся б з фантазіі пісьменніка. Нас яны так і называюць — пісменнікі, гаворачы паруску. Для мяне ў рускай мове слова гэтае гучыць... не тое што зняважліва, а неяк непрыемна, рэжа вуха.

Меў намер пісаць дзённік-успамін — як і ў «Карэннях...». А жыву днём сённяшнім. Такі час! У прарокі я не лезу. Але не выказацца пра тое, што робіцца ў краіне, не магу, гэта тэма ўсіх размоў — на працы, у сям'і, у метро, тралейбусе. Простая баба крычыць у аўтобусе: «Ніводнай партыі не веру! Усежулікі!» Вось так. Такая нам ацэнка. Усім — правым і левым.

Вылучылі і зарэгістравалі на з'езд КПБ. Звоняць з Навабеліцкага райкома: ці прыеду на сустрэчу? Варта было б паехаць. Але — шчыра — баюся. Пра што скажу гэтым людзям — у Гомелі, дзе няма прадуктаў, але ёсць радыяцыя? Ды і райкома ўжо няма — скасавалі. Хто арганізуе сустрэчы? Хто прыйдзе? «Клюнуць» на пісьменніка, на вядомасць маю? Наўрад. Трэба быць рэалістам: людзям не да літаратуры, не да мастацтва. Яны дэградуюць — і літаратура, і мастацтва. Розныя архангельскія, кабаковы («Літгазета») зняважліва выказваюцца нават пра такіх пісьменнікаў, як Шолахаў, Бондараў... У артыкуле «Тихая, счастливая смерть» вывад: «Пример Шолохова, погубившего свой гений коллаборационизмом с дьявольщиной, показывает, что рассматривать случай таланта, поставленного на службу большевизму, нет смысла». А між тым Шолахаў ніводным радком не выдаў той хвалы Сталіну, якую выдаваў Пастарнак.

27верасня

Даваенныя восем месяцаў служыў я ў Мурманску цяжка. Суровы клімат. Дзіўна, што я, сын лесніка, быў мала прывучаны да цяжкай фізічнай працы. А праца была цяжкая ў артылерыі. Трэніроўкі — круглыя суткі, па два-тры разы паднімалі патрывозе ўначы. Як у баі. Папраўлялі правал падрыхтоўкі, які паказала фінская кампанія. Неразумна. Бясконца прыводзілі пушку з паходнага стану ў баявы і наадварот, капалі катлаваны, дзяўблі кольскі граніт — «мартышкин труд», дамагаліся выбегчы па трывозе за... мінуту. Не дамагліся. Жылі ў зямлянках па 25 — 30 чалавек. Дыхаць няма чым. Ад недахопу кісларoду і стомы — санлівасць, ледзь спыняешся — засынаеш. Стаяць на пасту каля склада боепрыпасаў — пакута, не ад холаду, ад гэтай санлівасці. Ледзь абапрэшся на вінтоўку — і спіш. Страшна. За сон — пад суд. Літасці не было. У некаторых здараліся галюцынацыі, яны ўзнімалі трывогу, адкрывалі агонь. А гэта бяссонная ноч для ўсёй батарэі. Быў такі гамяльчанін Суворын, у яго галюцынацыі здараліся неаднойчы. Курсанты ненавідзелі нябогу. Папрасілі не ставіць яго да склада — на кухню, сукінага сына! Але дзедаўшчыны ў цяперашнім разуменні не было. Можа, таму, што батарэя была вучэбная і на 90 працэнтаў з адукаваных навабранцаў. Акрамя малодшых камандзіраў. Сярод іх былі гады. Але і яны дрыжэлі. Якія загады выдаваў бяздарны маршал Цімашэнка! За спазненне са звальнення звыш дзвюх гадзін — штрафны батальён.

(Годзе ў 1949-м, малады пісьменнік, я трапіў на прыём з нагоды ці то з'езда нашага, ці то дзкады нейкай... Там быў камандуючы Беларускай акругі маршал Цімашэнка. Для мяне, учарашняга салдата,бог! Былы міністр! Як жа я быў расчараваны, калі маршал пасвінску напіўся, прыставаў да маладой тады Эдзі Агняцвет.)

Але тады, у 1940-1941гг., сталінскі халуй, ганебна прайграўшы фінскую кампанію, проста шалеў: загад за загадам, адзін страшнейшы за другі. За восем месяцаў нас адзін раз адпусцілі ў Мурманск сфатаграфавацца, ды і то толькі лепшых. Звадзілі пехатою з Мурмашэй да Мурманска, а гэта ўсяго 24 кіламетры — туды ды столькі ж назад. Такой была ўзнагарода за лепшую баявую і палітычную падрыхтоўку! І ўтакіх умовах мы не траціліі чалавечай годнасці. Служылі ў арміі ў 60-х, 80-х гадах сын мой Саша і ўнук Аляксей. Гэтых разявакаў бясконца абкрадвалі. У Алёшы нават мундзір украліі, прыйшлося дзеду купляць у ваенторгу. Я не помню ў той нашай вучэбнай батарэі ні-воднага выпадку крадзяжу, хоць некаторым гарадскім хлопцам прысылалі пасылкі з прысмакамі, а нам, лапцюжнікам, прысылалі рэдка. Што з тагачаснай вёскі маглі

прыслаць? Праўда, кармілі нас добра — палярны паёк. І ніхто з камандзіраў не краў: жылі без сем'яў, прадаць крадзенае не было куды, ды і загады лютыя, хто мог адважыцца!

Прыгадваецца яшчэ адно, што характарызуе людзей і маю «страсць». У мяне быў паганы камандзір гарматы сяржант Цернавой. Ганяў ён нас, як сідаравых коз. І старшына хахол Лысенка быў крыкун і фармаліст, мог падняць у час абеду, вячэры — за размовы выгнаць у гімнасцёрках на палярны холад і — прабежачку. А мне страшэнна хацелася пісаць. А калі? Адзіная «шчыліна» — мёртвая гадзіна пасля абеду, яе захоўвалі няўхільна, недзе яшчэ нехта думаў і пра чырвонаармейца.

Згодна субардынацыі, звярнуўся да свайго камандзіра і да старшыны, яны жылі ў нашай зямлянцы, адгарадзіўшы катушок. І зараз помню іх твары: здзіўленне і... разгубленасць хлопцаў з чатырма класамі адукацыі. Помню, Цернавой на «вы» раптам: «Вы будзеце пісаць у гадзіну адпачынку?» Не адмовілі. І не дазволілі. Не адважыліся. Яўна раіліся з камандзірам узвода, а хутчэй з камандзірам батарэі адукаваным армянінам Папікам Тамразянам. (І дагэтуль мы з ім перапісваемся.) Пасля дазволілі. І я гадзіну пісаў апавяданні ці пісьмы Машы; на пісьмы нейкія паўгадзіны давалася — «личное время», але мне не хапала.

Пісаў я ў сталоўцы, іншага месца не было. Помню, у першыя дні туды заглядвалі па чарзе ўсе камандзіры, малодшыя і сярэднія. І ўсе былі добрыя. Я падхопліваўся. Кожны з іх паблажліва казаў, часам ляпаў на плячы: «Сядай, пішы, пішы». І таварышы мае, што дзяжурылі па кухні, адбываючы нарады — такія не мелі права на адпачынак, адносіліся даволі паважліва, ва ўсялякім разе ніхто не перашкаджаў. А калі я да дня нараджэння Горкага апублікаваў у армейскай газеце ладны, па памеру газеты, артыкул, Тамразян пастроіў батарэю і прачытаў мой артыкул. Задаволены — любіў нечаканасці — спытаў: «Хто напісаў? Ведаеце?» Бадай, ведалі, ва ўсялякім разе сябры мае Віця Вольскі, Іван Майбарада.

«Курсант Шемякин! Два шага вперед! Кругом! Вот наш писатель!»

Вось так упершыню я атрымаў гэтае ганаровае званне. Хоць пазней гэты ж Тамразян уляпіў «писателю» чатыры нарады без чаргі за чытанне на палітзанятках рамана «Белеет парус одинокий». Цікава, што зняў ён іх, гэтыя нарады, у першы дзень вайны. Пад праліўным дажджом на пазіцыі пастроіў батарэю і паздымаў усе спагнанні. Адмыў. У вайну мы ўступілі чысценькія, бязгрэшныя. Маглі аддаваць богу душы нашы. Неяк пры сустрэчы з Папікам Матэвосавічам я

пажартаваў, што, па-мойму, ён верыў у бога. Сівы палкоўнік у адстаўцы збянтэжыўся, як дзяўчына. Можа, праўда, верыў?

30 верасня

Канчаецца верасень. Непамерна дажджлівы. Амаль такімі дажджлівымі былі і летнія месяцы — ліпень і жнівень. Гніло збожжа. Як кара нябесная. Але верасень асаблівы, не помню такога. Ураджай бульбы невялікі, і тая гніе. Разбураны структуры, якія арганізоўвалі гараджан на ўборку. Раней ездзілі ад усіх калектываў. Мы, БелСЭ, мелі ў саўгасе «Пятровічы» свае гектары капусты, морквы. Палолі, убіралі. У гэтым годзе ніхто не пазваніў, і ніхто з нашых не паехаў. Хто працуе там, у гэтых «Пятровічах», і ва ўсіх іншых саўгасах і калгасах? Сялянства знішчылі — гэта так. Але шлях, на які штурхаюць сабчакі, чарнічэнкі, можа прывесці да поўнага развалу, да голаду. Аддаць зямлю... Каму? Хто будзе рабіць на ёй? Тыя, што мітынгуюць у Маскве? Ніводзін з лідэраў не заклікаў людзей паехаць на бульбу. Колькі можна аплёўваць сваю гісторыю? Колькі можна так нізка і ўніжана кланяцца Захаду? Зіноўеў мае рацыю.

Падаражанне хлеба, якое плануецца, адсутнасць бульбы, буракоў узвінцяць цэны на мяса, якое і без таго па 10 рублёў — у нас, у Мінску. Панічна баюся зімы, якая наступае. Хапіла б хоць цяпла! А то — памарозім дзяцей. Перабудаваліся! Няўжо народ даруе ідэолагам, прарабам перабудовы? Але ж і выбух гневу народнага — жахлівая рэч. Зноў кроў. Хопіць, браточкі, родныя! Няўжо не можам прымірыцца? Усе ж клянёмся любоўю да народа. Няхай жа з'яднае нас гэта любоў!

5 кастрычніка

Учора прыехалі з Машай у «Сосны» на Нарачы, у дом адпачынку СМ, камфортны куточак. Адпачываю тут гадоў 12 ужо. Ужо тут, у «Соснах», далека няма таго, што было. Няма лекаў. Хацелі з Машай падмацаваць свае старыя сэрцы, АТФ — няма. Да таго ж яшчэ наплакаўся сёння. Усе гады займалася лячэбнай фізкультурай, рабіла масаж медсястра Кацярына Арлова. Гаварлівая, кампанейская жанчына. Ёй ільсціла весці дружбу з пісьменнікамі, з акцёрамі, міністрамі. Паслужлівая, добрая. Увішная, працавітая. У сорак гадоў паступіла ў фізкультурны інстытут і ў гэтым годзе паспяхова скончыла яго. Пяць гадоў з добрым гумарам расказвала, як яна, 40-гадовая баба, разам з 20-гадовымі здае бег, плаванне, скачкі і ўвесь комплекс спецыфічных прадметаў. І яшчэ пра адно бясконца расказвала — пра свайго сына Валодзю. Развядзёнка, расціла сына

адна. Упершыню пачуў я пра хлопчыка, якога, між іншым, бачыў разы два ўсяго, калі той пайшоў у школу. Дзесяць гадоў ведаў усё пра яго — усе яго паходжанні, прыгоды, забавы, поспехі. У мінулую восень праводзіла ў армію, у дэсантныя войскі. А ў жніўні ёй прывезлі цынкавую труну з Кольскага паўвострава. Разбіўся пры скачку, не раскрыўся парашут. Такая версія камандавання, у якую, між іншым, няшчасная маці не верыць. Трагедыя ашаламіла ўсіх, хто ведаў Кацярыну, яе калег па рабоце. Нястомная фізкультурніца счарнела. Не бачыць сэнсу жыцця. Можна зразумець. Мы з Машай балюча перажывалі гора жанчыны.

Колькі іх гіне, дзяцей нашых! А Шэварднадзе заяўляе, што, калі Савет бяспекі прыме рашэнне, мы пашлём войскі ў Персідскі заліў. Мала нам Афганістана?! Крок быў бы ў вышэйшай меры неразумны, абсалютна непапулярны. Дзяржавай, якая будзе наводзіць парадак у свеце — для сваёй карысці, як робіць гэта Амерыка, мы ўжо ніколі не станем. Дай бог утрымацца самім. Развальваемся. Учора зайшоў у тутэйшы магазін, у якім заўсёды было поўна тавараў першай неабходнасці, і зрабілася мне вельмі сумна. Пустэча. Маша купіла шнуркі для чаравікаў і гумавыя боты. Праўда, ёсць хлеб, масла, мёд — без талонаў, усё астатняе — крупы, цукар, макароны, віно — па талонах. Баюся, што праграма пераходу да рынку, якую падказалі мудрацы — Шаталін, Агянбегян, Абалкін, і на якую клюнулі Ельцын і спалоханы Гарбачоў, прывядзе да поўнай дэстабілізацыі эканомікі, да агоніі. Людзі ўсіх рангаў, ад былога міністра да прыбіральшчыцы, з якой толькі што гаварыў, мараць аб парадку ў краіне.

7 кастрычніка

Успаміны — што паўторны прагляд фільма. Круціш і ўспамінаеш: гэтыя эпізоды выкарыстаў у раманах, аповесцях, а гэтыя — у ранейшых дзённіках. Мала што засталося, і, калі не паўтарацца, цэласнай карціны — мемуараў — не атрымліваецца. Здымкі без мантажу. А мантаж — аснова завершанай карціны.

...У канцы ліпеня 1941 года мяне паслалі камандзірам гарматы на другую батарэю, якая стаяла ў Коле, пазней, у верасні, нас перадыслакавалі ў Мурманск, змянілі некалькі пазіцый, пакуль не выбралі зручную — на паўночнай сопцы, каля горнага возера, якое паіла горад адменнай вадой. Возера ахоўвалася часцю НКУС. Пасля кожнай бамбёжкі вада правяралася ў лабараторыі — фашысты маглі пайсці на тое, каб атруціць пітную ваду.

Я пісаў ужо пра мой незабыўны страх, які перажыў пры першым налёце ў ноч з 22 на 23 чэрвеня, у палярную ноч, калі святліла сонца.

Але гэта быў карогкі страх — гадзіну бою, калі «хенкелі» і «месеры» вылі над намі, абстрэльвалі з кулямётаў. Другі страх, працяглы, тыдні з два, я перажыў, калі ў верасні батарэя была перакінута на заходні бераг Кольскага заліва, на Нетсамскую дарогу. Немцы рваліся ў Мурманск. І кожны з нас разумеў: прарвуцца — нам смерць, адступаць няма куды, заліў не пераплывеш, Ä калі і пераплывеш — куды далей? У бязмежную Кольскую тундру? Гэта быў ужо не страх — адчай безвыходнасці. Да таго ж страшэнна цяжкія ўмовы: выпаў снег, а мы спалі ў гарматным катлаване, пад гарматным чахлом, толькі кухня была збіта з дошак, але і яна не часта дыміла: не заўсёды прывозілі прадукты, такая была пераправа.

Контрудар 52-й дывізіі ратаваў нас. Але колькі іх уцалела з тых хлопцаў, што з цяжкімі ранцамі, аўтаматамі, вінтоўкамі некалькі дзён ішлі міма батарэі на поўнач!

Помню трэці прыступ страху значна пазней — калі плылі на баржы з Мядзведжагорска ў Петразаводск. Але той страх быў нейкі вясёлы (бывае вясёлы страх?). Афіцэры зубаскалілі наконт таго, як будзем тануць. Навучыліся смяяцца са смерці. У «Зеніце» я драматызаваў гэты эпізод: на самай справе не падрывалася баржа, не пакідалася пасярод возера. Але самы моцны прыступ страху быў пасля вайны, кал і я, дрэнны плывец, ратаваў у Варце польскую дзяўчыну. У «Мосце» і ў «Зеніце» я перанёс гэты эпізод у вайну: бамбёжкай змыла з разбуранага моста дзяўчат — зенітчыц. У Ландсбергу сапраўды быў такі факт, у чужым палку. Я не назіраў яго, але мы ў дывізіёне абураліся дурнотай камандзіра, які вытыркнуў узвод МЗА на разбураны мост побач з адноўленым чыгуначным. Дурню было зразумела, што мост будуць бамбіць.

Нас з полькай, якая так абшчапіла мяне, што скавала, несла на гэты разбураны мост. Адкуль узяўся наш кацер! Наканавана было доўга жыць.

Камандзір гарматы я быў слабы — бракавала камандзірскай патрабавальнасці. А байцы — дзяды, як іх цяпер называюць. Ды і вайна дэмакратызавала адносіны, цімашэнкаўскія загады як бы забыліся. На вучэбнай батарэі ў мяне быў паганы камандзір Цернавой. Які ж добры ён стаў у першыя дні вайны! Бацька родны. Хлопцы кпілі на гэты конт.

Між іншым, Цернавой гэты адгукнуўся гадоў праз 15 пасля вайны — убачыў у кіёску «Роман-газету» з маім партрэтам. Напісаў, што па рабоце часта бывае там, дзе мы пачалі вайну. Я не адразу сцяміў, якая ж у яго работа. Здагадаўся Андрэй: «Возіць асуджаных у

лагер». Лагічна —у яго характары. Такому чалавеку трэба хоць якая ўлада над людзьмі; у канваіра — яна бязмежная.

Камандзірам батарэі быў крыклівы, але добры хахол Саўчанка. Паганы быў камандзір узвода Салаўёў. Яго не любілі байцы, а ён зганяў злосць на нас, малодшых камандзірах. Скараспелы выпускнік, ён дрэнна ведаў матэрыяльную частку прыбора, гармат і не ўмеў схаваць гэтага. Яго падводзілі «пад манастыр». Саўчанка крычаў на яго пры ўсіх, Салаўёў валіў віну на нас і чамусьці больш за ўсё на мяне.

Дзяды пахваляліся перад другімі разлікамі сваім камандзірам — мной, але тут жа рабілі брыдкасці: маглі не толькі выпіць маіх сто грамаў, але з'есці і хлеб: прамаўчыць! Мяне такая няўдзячнасць глыбока душэўна раніла. Чаму людзі такія?

Асабліва здзекаваўся мой зямляк, стрэшынскі трактарыст, зараджалышчык Паўлаў, страшэнна, да брыдкасці, неахайны хлопец. Яго неахайнасць ганіла ўвесь разлік. Але яго баяліся. Мяне ён ненавідзеў менавіта за чысціню, фізічную і маральную, так і сказаў аднойчы, дыпламатыі не меў, выразаў не выбіраў. Але Паўлаў зневажаў другога майго нядобразычліўца наводчыка Мухіна, які падлізваўся да яго — «на платформе нелюбові да камандзіра». Мухін гэты быў горшы за Паўлава: усе брыдкасці рабіў употай і ў дадатак быў даносчыкам, можа, не толькі Салаўёва, але і ўпаўнаважанага «Смерш». Маё жыццё ўскладнялася тым, што я быў камсоргам батарэі, мне належала быць правільным і лепшым камандзірам. А лепшым з такой камандай і такім камандзірам узвода я не быў, не мог быць. Між іншым, гэтую раздвоенасць «правільнага» камсамольца, камуніста я так і не напісаў. Я пісаў сапраўды правільных. Але ж нямала і было такіх, дарэмна нас цяпер паліваюць брудам.

8 кастрычніка

Жыццё — усёперамагальная сіла. Няшчасная Кацярына плача, кажа, што не хочажыць, але працуе па-ранейшаму: лячэбная фізкультура, масаж і не страціла цікавасці да жыцця, да радасцей і бед іншых — сваіх знаёмых (а гэта ўвесь рэспубліканскі актыў), распытвае пра іх, расказвае. Доўга расказвала, як выхаджвала хворага, пасля інсульту, Барташэвіча. Во супярэчлівая фігура! Напісаць такога кіраўніка можна толькі цяпер, без цэнзуры. Лёгка дыхаецца без цэнзуры. Але лёгка жывецца і тым, хто свядома разбурае ўсё, што мы стваралі. Такі прастор ім дадзены. Гэта іх галоўная заваёва.

...Зіма 1941/42 г. была не проста суровая — для краіны, франтоў, для Ленінграда — катастрафічная. Самай цяжкай яна была і для нас, зенітчыкаў, што абаранялі Мурманск. Пачалі прыходзіць

караваны саюзнікаў. Як толькі караблі ўцягваліся ў заліў, станавіліся пад разгрузку, немцы бамбілі порт, горад, станцыю дзень і ноч з шалёнай апантанасцю. Эшалонамі і ў адзіночку. Па адзіночцы — у доўгую палярную ноч. Гудзе над галавой, а мы смалім па гуку. Нарэшце дайшла да камандавання іх тактыка — прымусіць нас траціць боепрыпасы. Спынілі стральбу па гуку. Між іншым, не перастаю здзіўляцца, як забяспечвалі нас снарадамі. Выпальвалі за суткі па 1000 штук, і, аднак, не помню выпадку, каб засталіся без зарадаў. Во працавалі заводы і чыгунка! А цяпер, у мірны час, так разбалансавалі эканоміку — жах! Грэшна хацець цвёрдай рукі, але, здаецца, гэта адзіны ратунак ад самай страшнай бяды — грамадзянскай вайны.

Стралялі цэлы дзень. З паўзамі. Ад гармат і прыбораў не адыходзілі ні на крок. А мароз градусаў 30. Абед разносілі па разліках, суп з салёнай траскі замярзаў ледзьве не ў роце. Давалі па сто грамаў. Саўчанка трымаў гарэлку ў сябе ў камандзірскай зямлянцы, нават старшыне не давяраў. Сам наліваў.

Абвясцілі трывогу. Але самалёты не ляцелі. Прадоўжылі абед. Ды камандзір не адыходзіў ад планшэта. Даверыў мне, камсоргу: «Шамякін, ідзі налі свайму разліку», я ўпершыню ў жыцці аказаўся малым зладзейчыкам, акалелы, прамерзлы да нутра, не ўтрымаўся ад спакусы пацягнуць з наска чайніка, а насок, відаць, быў шырокі. А потым законныя выпіў... І развязло мяне, нябогу. Упёк бы мяне Салаўёў пад трыбунал. Ды ратавала палярнае надвор'е, там гэта часта здараецца: раптам яснае неба завалакло хмарамі з мора і пайшоў густы снег. Адбой. Спаць! І ніхто з маіх падначаленых, якія неаднойчы падводзілі мяне ў вайсковай службе — не ў баі — не выдаў свайго камандзіра. Толькі пасля пераможна пасміхаліся, ды яшчэ больш стала панібрацтва: камандзір такі ж грэшны, як усе яны, і абавязаны ім.

Вось так дурная слабасць магла паламаць лёс, не паламаць — паставіць кропку: загналі б у штрафны на Заходнюю Ліцу...

У маі 1942 года з'явілася інфармацыя, што у Крыме немцы прымянілі газы (у пасляваенных публікацыях факт гэты не пацвярджаўся). Але тады гэта выклікала страх не толькі ў нас, радавых. Тутжа былі ўведзены хімінструктары, раздадзены процівагазы, пакеты. Мяне, тэхніка-тэхнолага па адукацыі, які вывучаў у тэхнікуме ажно чатыры хіміі, назначылі хімінструктарам. Райская пасада. Сам сабе гаспадар. І амаль жа роўны таму ж лейтэнанту Салаўёву.

З дзейнасці маёй хімічнай запомніўся адзін эпізод, гумарыстычны. Праз месяц пасля назначэння з'явіўся начальнік хімслуж-

бы корпуса ці арміі, палкоўнік. Загадаў пастроіць батарэю, усіх, камандзіраў і радавых, дастаць процівапрытныя пакеты. І выявілася, што толькі ў мяне аднаго засталася пляшачка з процівапрытнай вадкасцю — чыстым спіртам. Палкоўнік быў вясёлы чалавек: за слабую падрыхтоўку хімінструктару, які так і не што ў пляшцы, уляпіў пяць нарадаў — пад рогат батарэі. гэтыя я не адбываў, але перажываў доўга: з-за іх ледзьве не на год затрымаўся мой перавод з кандыдатаў у члены ВКП(б). А быць членам партыі было гонарам, не для кар'еры мы ўступалі ў партыю. Гляджу, як лёгка пакідаюць яе цяпер, — і сэрца абліваецца крывёю.

10 кастрычніка

Пленум ЦК: аб становішчы ў краіне і аб пераходзе да рынку. Глабальнае пытанне! Раўназначнае — аб узброеным паўстанні. Прачытаў уважліва Гарбачова, івашку. Сумна стала. Становішча катастрафічнае. Але аб гэтым — між іншым, зал і ш не спакойна. Ä трэба крычаць, біць у званы. Крык гэты часам вырываецца ў дэпутатаў. У Генсека і яго наі«ііеніка не вырваўся. Пра рыиак — зады, тое, што прагаворана ў прэсе, на сесіях Саветаў. Што гэта — адрахленне партыі? Той жа старэчы пярдзёж? Дзе ж маладыя сілы? Калі мы не дамо народу праграмы, за якой ён, народ, пайшоу бы, нас адціснуць і стопчуць. Паралельна слухаў сесію БССР. Рынак, усё нібыта правільна ў Кебіча і іншых, але цвёрда ведаю, што 80 працэнтаў палажэнняў рэформы не спрацуюць ці спрацуюць у іншы бок. Настрой паганы. Нудна. Як ніколі марудна цягнецца час, хоць і дзённікам займаюся, чытаю газеты, хаджу ў кіно і па-ранейшаму да мазалёў на с... сяджу перад тэ-

Успаміны пра маладосць, няхай і невясёлую, трохі аздабляюць гаркату старасці — той, у якой перспектыва жыцця расплываецца, як у тумане. Не бачу я уже яе, перспектывы. А без яе жыццё траціць сэне. Пачаць раман? Пра каш час? Злосна напішу. Баюся гэтай злосці. З ёй будзе цяжэй. Лепш заставацца добрым — у жыцці і творчасці. Я быў добры, і гэта давала радасць.

...Са з'яўленнем увосень 1942 года дзяўчат у дывізіёне жыццё набыло нейкі іншы колер, з'явіліся ў камандзіраў новыя клопаты, як бы сямейныя. Але як яны, нябогі, пакутавалі першую зіму. І мы з імі. Былі заляцанні. Нямногія сувязі. Адкрыта жыў камандзір маёй батарэі Трацэнка. Нампаліт, палітаддзел корпуса да яго не прыдзіраліся. Звычайна кожная сувязь рабілася прадметам бестактоўнага ганебнага разбірацельства на камсамольскіх, партыйных сходах.

Здаецца, толькі к лету 1944 года гэта кампанія аслабла, нехта ў камандных вярхах паразумнеў. У «Зеніце» я пішу пра гэты перыяд.

11 кастрычніка

Учора перапынілі мой запіс. Прыйшла няшчасная Кацярына, прынесла пляшку, паклікала Эрынасьяна. Выпілі за памяць яе сына. Цяжка ў яе лячыцца, успаміны яе пра Валодзю даводзяць мяне да слёз. Яна чамусьці не верыць, што ён загінуў пры вучэбным скачку — не раскрыўся парашут. Лічыць, што яго забілі. Перад трагедыяй паслала сыну 50 рублёў. Растраціць ён іх у тундры не мог. Аднак грошай ёй не вярнулі ні па пошце, ні тыя, хто прывозіў труну. Загадкава. І страшна. Няўжо разлажэнне дайшло да такіх фактаў?! Варта напісаць пра трагедыю маці не ў вайне, не тых, чые сыны ваявалі ў Афганістане. Пра тых матак, якія адсылаюць сыноў у мірную армію, і яны там гінуць. Армія занадта доўга была закрытай тэмай. Дрэнна такая бескантрольнасць. Але страшна і тое развянчанне арэолу гераізму, якое так «успешно» праводзяць кароцічы. Аплявалі партыю, аплюём армію... З чым застанемся? Самі сябе адкінем невядома куды — у першапачатковае накапленне капіталу, дзе панавалі разбой, гвалт, рабства, закон пісталета і нажа. Так дзейнічалі перасяленцы-авантурысты ў Амерыцы. Вучоныя ідыёты спакойна разважаюць аб 35 мільёнах беспрацоўных на першай стадыі пераходу да рынку. Халадзееш ад думкі, што можа з'явіцца такая армія незанятых, неарганізаваных, галодных людзей. Зноў няйсе ў палітыку. Літаратура стала другарадным заняткам. І цікавасць да яе падае з кожным днём. Усё сказалі? Літаратуру загубіць адсутнасць ідэалу, станоўчага.

Ад сённяшняй арміі пераклдваю масток у вайну. Яна вымушала прызываць змарнелых хлопчыкаў, якія былі падобныя на 12-14-гадовых дзяцей. Адзін такі падсунуў пальцы пад лапу гарматы, і яго ж хацелі судзіць за самастрэл. Мы з Калбекам ратавалі гэтага хлапчыну. Але яшчэ цяжэй успамінаць, што і дзяўчат такіх прызывалі. У 1943-м я зноў быў камандзірам гарматы, і ў мяне ў разліку была пярмячка, непісьменная, ледзьве гаварыла па-руску, адсталая да першабытнасці. Ледзьве навучылі яе чытаць трубку, ды і то ўстаноўшчыкі трубкі абураліся — так невыразна вымаўляла лічбы. Добра, што стралялі ў гэты час (стаялі ў Кандалакшы) мала. Ды і хутка «сплавілі» яе ў пральню ці на склад, не помню. У гэты ж час у разліку быў стары — бацька дзяцей, якія ваявалі, растоўскі рабочы. Ён апякаў гэтую нябогу і любіў мяне, што я таксама не даваў яе ў крыўду. Стары гэты абураўся: чаму яе прызвалі? Бацька на вайне, у хаце, страшэнна

беднай, чацвёра дзяцей, яна старэйшая. Пайшла яна за кагось іншага, за тую, чые бацькі здолелі сунуць ваенкому хабар,— казаў мне гэты вопытны чалавек. Я ідэалістам быў. «Не можа быць!» — «Наіўны ты чалавек, сынок. Не бачыў ты жыцця». Пэўна ж не бачыў — вырас у лесе. Але вельмі можа быць, што ідэалізм памагаў мне стаць пісьменнікам. Я любіў людзей, верыў ім і славіў іх. І мне шанцавала, калі не лічыць Салаўёва, яшчэ двух-трох ёлупаў: камандзіры і байцы любілі мяне. Я не помню прозвішча гэтага дзеда, ён нядоўга быў, выявілі, што ён цясляр, і забралі ў штаб. Я з удзячнасцю ўспамінаю сваіх байцоў: гамяльчаніна Раманава, іванаўца Кошалева, са сваіх калег-камандзіраў Колю Літвінава, з якім мы разам скончылі тэхнікум, разам праслужылі пяць гадоў, разам ехалі, дэмабілізаваныя ў кастрычніку 1945-га, дадому, у адзін раён — Церахоўскі. Па глупстве разышліся. Працуючы ў Гродне ў партыйных органах, ён пазычыў у мяне тысячу рублёў, не аддаў і пасля саромеўся заходзіць, бываючы ў Мінску, а я саромеўся яго, не званіў, пазбягаў сустрэчы, калі прыязджаў у Гродна, каб не падумаў чалавек, што я патрабую грошы; для мяне ў той час сума гэтая была дробяззю, здаралася, што прапівалі за вечар па столькі.

Помню двух добрых хлопцаў-яўрэяў, абодва былі камандзірамі гармат,— маленькага вяртлявага Хаіма Шалюбскага, якому мы ў вучэбнай батарэі пагражалі намяць бакі за тое, што ён хутчэй за ўсіх выбягаў па трывозе, і высокага, сутулага, з доўгімі рукамі — каваль! — Самуіла Буселя. Яны былі кампанейскія хлопцы, добрыя камандзіры. І не помню выпадку, каб хто з малаадукаваных байцоў, беларусаў, рускіх, комі, пермякоў, карэлаў, праявіў у адносінах да іх хоць які антысемітызм. Пасля вайны Бусель рабіў на Мінскім трактарным кавалём, як ніхто з аднапалчан, наведваўся да мяне, дарыў мне нажы, а я яму кнігі, ён вельмі ганарыўся, што сябруе з пісьменнікам. Двое гэтых хлопцаў з Дзятлава, там знішчылі іх сем'і. Эпізод у «Зеніце» спісаны з Шалюбскага, гэта ён граміў нямецкую кватэру, калі мы ўступілі ў Германію. Аднак у старога немца, які прысутнічаў у кватэры, не стрэліў. Бусель памёр ад рака. З афіцэрамі я пасябраваў, калі заняў афіцэрскую пасаду — камсорга дывізіёна. Многія з іх былі малапісьменныя людзі, і я выручаў іх.

13 кастрычніка

У Кандалакшы наша батарэя стаяла ў маляўнічым месцы, на лясным пагорку, на беразе бурлівай Нівы за пяцьсот метраў ад упадзення яе ў Кандалакшскую губу. Стралялі рэдка. Атрымлівалі ўжо нейкія лендлізаўскія прадукты. У прыватнасці, белы хлеб, якому

спачатку абрадаваліся, а пасля завылі і хадзілі на станцыю выменьваць у чыгуначнікаў на маскоўскі ацеслівы, з мякінай. З такой булкай есці боршч з гнілой капусты і салёнай траскі было немагчыма. Не галадалі, хоць помню дагэтуль, што ўвесь час хацелася есці. Дзіўна, што ўлетку на дывізіён напала паганая хвароба — курыная слепата. У батарэі толькі камандзір яе і я не захварэлі. Спалі ўдзень, а ўсю ноч дзяжурылі — правяралі пасты. Дзяўчаты сапраўды што сляпыя курачкі: ледзь змеркнецца, і нічога не бачаць за два крокі ад сябе. Улетку фіны ў такі тыл не прабіраліся, не помню такога выпадку, а зімою на лыжах нярэдка выходзілі да Кіраўскай чыгункі, выразалі нашы пасты. Побач з намі стаяў 73-ці оатальён ПНУС. У іх выразалі пост за 20 кіламетраў ад Кандалакшы. Я выкарыстаў гэты эпізод у аповесці «Агонь і снег» і ў рамане «Зеніт». У аповесці бой напісаны «густа» — як сам удзельнічаў.

Была каманда збіраць ягады, грыбы. Наша батарэя па сваёй дыслакацыі — стаялі ў лесе — найбольш займалася гэтым. Збор дароў лесу даў скачок цяжарнасці. Праз тры-чатыры месяцы нам далі ў палітадделе корпуса добрую праборку за гэта. Я назначаны быў улетку 1943-га камсоргам дывізіёна і прысутнічаў на гэтай «вясёлай нарадзе» — нас прабіралі і з нас кпілі, у тым ліку суседзі — 73-ці ПНУС. У іх амаль не было маладых мужчын, адны дзяды — бацькі дзяўчат. А пазней мы смяяліся з іх: батальён перадыслакавалі ў Беламорск — падсунулі да палка НКУС. Калі іх разносілі, мая калега, камсорг дывізіёна, хапілася за вушы на мае пытанне: «Што здарылася?» — «Маўчы, не пытайся». Быў у мяне сябра Ханон Слобадаў, мы знаёмыя з Гомеля: я кватараваў у двары, дзе ён жыў,— выдатна забяспечаны вучань школы. Там ён з намі, з дзярэўняй, не вельмі знаўся. Пасябравалі мы на вучэбнай батарэі — землякі. Ён быў прыбарыстам, здаецца, камандаваў дальнамерам. Здольны матэматык. Дык вось яго ўлетку 1943 года назначылі камсоргам дывізіёна. Але прабыў ён на гэтай пасадзе адзін месяц. Ганарысты, занослівы, пыхлівы, ён, як пасля я даведаўся, не спадабаўся намесніку па палітчасці Арлову і парторгу Калбеку. Яны выклікалі мяне і катэгарычна загадалі: «Пойдзеш камсоргам». — «А Ханон?» Арлоў не адказаў. А шчыры, адкрыты Калбека секануў: «Не трэба ён нам! Паслухай, што пра яго камсамольцы кажуць». Слобадаў пасля, здаецца, быў старшыной на адной з батарэй.

Дзесьці ў 60-х гадах, калі я быў ужо ў славе, званок: «Не пазнаеш? Слобадаў Леанід Якаўлевіч. Твой аднапалчанін».

«Ханон! Ты?» — радасна закрычаў я.

«У Мінску».

«Ляці да мяне».

Прымаў яго з усёй шчырасцю. Радаваўся. Выпіць мы тады былі мастакі. Але ён ашаламіў мяне, папрасіўшы: «Не называй мяне Ханонам, я — Леанід». Захацелася моцна вылаяцца. Пасля ён, інжынер-электроншчык, жыхар Масквы, часта прыязджаў у Мінск і прыходзіў да мяне, любіў выпіць і смачна паесці. Але адносіўся я да яго як бы несур'ёзна, з своеасаблівым гумарам. І ў Маскве на яго кватэру ні разу не наведаўся. Гадоў пяць назад, лысы ўжо, галава што бубен, ён даў мне новы адрас, трохі збянтэжаны пры ўсёй сваёй беспардоннасці. Я зразумеў: пакінуў старую жонку і ажаніўся з маладой.

Калбека адразу палюбіў мяне, як сына; мы жылі ў адной зямлянцы ў Кандалакшы, у адным доміку ў Петразаводску, у адной кватэры шыкоўнага нямецкага дома ў Ландсбергу. Я трапіў на сваё месца — прыроджаны прапагандыст. Мяне паважалі нават суровы і маўклівы камандзір дывізіёна Іван Кабанаў, пасля вясёлы Кузьмін і нампаліты — сухі і зласлівы Арлоў і занудлівы Нужненка (Гужнікаў — у «Зеніце»). Гэтыя апошнія — за палітданясенні, якія я сачыняў. Аповесці! Імі я стварыў славу аб нашай палітрабоце. Нас хвалілі. Ставілі ў прыклад. Хоць наўрад ці працавалі мы лепш, чым іншыя. Хіба я адзін: вельмі даспадобы мне была работа камсорга. Дзяўчаты любілі мяне і спавядаліся, як у папа. Нужненка быў гультай, а Калбека — скептык. Яго скептыцызм да партыйнай работы ашаламляў мяне, хоць я і любіў гэтага чалавека. Было ў яго біяграфіі штосьці загадкавае, пра што ён не расказваў нават мне. (Нядаўна да мяне прыязджала яго дачка Ала, яна адмаўляе, што бацьку садзілі, а я быў упэўнены, што сакратара райкома на Украіне, 25-тысячніка, садзілі.) Канстанцін Дзмітрыевіч больш расказваў пра завод абаронны, на якім рабіў перад вайной майстрам, расказваў з любоўю.

15 кастрычніка

Закон (але, амаль закон!) сацрэалізму не дазволіў мне напісаць парторга Калбеку з усімі яго чалавечымі якасцямі. Дзіўна дзейнічаў гэты закон! Рэдактары, якія цяпер ох якія смелыя! з партыі выходзяць — яшчэ чатыры-пяць гадоў назад абавязкова знялі б эпізоды, якія адбываліся з Калбекам.

Парторг Калбека ўмеў гутарыць з людзьмі і абавязкі свае выконваў сумленна. Але мяне, ідэаліста, бянтэжыла, як скептычна ён ставіўся і да палітычнай работы Нужненкі, і да сваёй, і да маёй. Ён з цікавасцю, амаль з захапленнем чытаў мае данясенні, весела хмыкаў, незвычайна хваліў: «Ну, шчалкапёр ты, тваю маць! Няхай чытаюць палітаддзельскія дурні. А ты знаеш, ім гэта падабаецца, яны будуць

думаць, што, дзякуючы іх кіраўніцтву, мы з табою так працуем і такія разумныя. Начальства, брат, усе заслугі прыпісвае сабе».— «І вы прыпісвалі, калі былі сакратаром?» — «Таму мяне і турнулі, што я не навучыўся прыпісваць». «Турнулі» — і не больш таго. Але пасля мяне ашаламіла, як ён перажывае даўнюю драму. Зусім, здавалася, не падобна на яго, насмешніка, скептыка, рэаліста. Без малога два гады я быў побач з ім да Германіі і не ведаў, што ён можа напівацца. Не было дзе ўзяць. Толькі ў Петразаводску разы тры купілі ў ваенторгу віна. А ў Германіі ён напіваўся і, п'яны, плакаў і крыў мацюкамі ўсіх, хіба што Сталіна не чапаў, хоць цвярозы ён і пра яго выказваўся зусім не з тым абагаўленнем, з якім адносіўся да «правадыра ўсіх народаў» я, камсамольскі выхаванец. Аднойчы яму, п'янаму, трапілася газета са здымкам Каротчанкі, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Украіны, генерала. Я ведаю, што з Каротчанкам Калбека некалі працаваў. Чаму здымак Каротчанкі (нічога асабліва абуральнага Калбека пра яго не казаў да таго) раптам выклікаў такія эмоцыі? Канстанцін Дзмітрыевіч дастаў пісталет, заплакаў і... развітаўся са мной. Я кінуўся забраць пісталет. Стрэлілі. Куля прабіла тонкую сцяну пакоя, а за сцяной жыў нампаліт. Калбека працверазеў, падобна — спалохаўся. Мы слухалі, што ў суседнім пакоі — ці не ранілі Нужненку? Цішыня. Адчынілі пакой і ўбачылі — о, жах! куля разбіла вялізную фарфоравую вазу на яго стале. Што рабіць?

Сабралі асколкі, падмялі. Ададралі пад ложкам шпалеры, заклеілі шчыліну. Дуб Нужненка не ўбачыў заклейкі, але ўзняў гвалт — укралі вазу! — і доўга абураўся: во да чаго дажылі, з пакоя нампаліта ўкралі вазу! Калбека на кожнай нарадзе штурхаў у бок мяне, шаптаў: «Слухай, слухай, зараз ён пра вазу зноў пачне». І мне было нясцерпна смешна; не раз Нужненка паднімаў мяне: «Шамякін! З чаго табе смешна? Пасмяшы нас!» Але ніхто так і не даведаўся, з чаго мне смешна.

У Калбекі было трое дзяцей, і ён любіў пагаварыць пра іх з бацькоўскай любоўю. Я лічыў яго прыкладным сем'янінам. Ніводнай дзяўчыны ў дывізіёне ён не крануў — строгі быў. А прыехалі ў Ландсберг, занялі чатырохпавярховы нямецкі дом, і ён у першы ж вечар зацягнуў да сябе немку. О, як гэта ашаламіла мяне і як расчаравала. І настроіла супраць яго. Парторг — з немкай! З ворагам. Акрамя гэтага, і дзёрзкасць яго здзівіла: прывесці немку ў распалажэнне штаба. Хоць мы і не былі яшчэ ўладжаны, але ж каравульныя як мае быць выстаўлены. Гэта была аднаразовая сувязь, больш той жанчыны я не бачыў. Але пазней у яго з'явілася пастаянная каханка, прыгожая жанчына, маці 10-гадовага сынка. Ён не баяўся з ёй прагульвацца нават па вуліцы — пасля Перамогі ўжо. І гэта пры тым, што немцаў-

фашыстаў чалавек гэты люта ненавідзеў. Яго расказы пра фашысцкія зверствы даводзілі дзяўчат да слёз.

Пад 1 мая, калі штурмавалі Берлін, з падвала дома, які мы займалі, выцягнулі немца. Як праваронілі вартавыя?! Думаю, што гэта быў адзін з жыхароў дома — малады хлапчына ішоў да маці. Але дурань падставіў сябе — пачаў выдаваць цэлыя фразы па-руску. Уласавец! — заключылі афіцэры. І Калбека першы ўдарыў яго і біў, калі той упаў. П'яны быў. Мне здалося ганебным для афіцэра, палітработніка біць палоннага. Я схапіў яго за рукі, павіс на ім. Ён ірваўся і крычаў: «Ты либерал! Малакасос! Гаўнюк!» Пасля, праўда, працверазелы, дзякаваў.

Пра гэта я ў «Зеніце» не напісаў. А можна было б напісаць складаны і супярэчлівы характар. У мяне ж ужо быў Бародка, напісаны 30 гадоў назад, калі я толькі адрошчваў крылы, меў небагаты творчы вопыт. Віктар Каваленка дагэтуль лічыць Бародку адкрыццём для нашай літаратуры. Сапраўды, хто яшчэ напісаў такога сакратара? І ў наш час не напісалі. А не ацэнены крытыкай Ігнатовіч — тыповы прадстаўнік кіраўнічага звяна застойных часоў?.. Бачыў я многа. Не ўсё напісаў.

18 кастрычніка

Чытаю «Исповедь на заданную тему» Ельцына. Хітра напісана. Заслуга журналіста? Не, ён сам не дурань — умее падаць сябе нібыта і аб'ектыўна, але ўзвышаючы. Прыёмы, вядомыя для стварэння характеру. Бацька лупіў яго, як сідараву казу. Не піша, што было за што караць. Але даводзіць: за бітага двух нябітых даюць. Пры ўсіх літаратурных прыёмах адчуваецца характар, асоба. Пачаў больш паважаць яго, але і баяцца: з пароды дыктатараў, усе дыктатары ішлі да ўлады праз дэмакратыю. Хіба не такой дэмагогіяй займаліся Сталін, Гітлер? А можа, і трэба цвёрдая рука пры такім развале дзяржавы? Аднак выступленне яго, Ельцына, пазаўчарашняе на сесіі ВС РСФСР, мяне спалохала. Ультыматум Гарбачову, Рыжкову. Не проста ультыматум: ці ўлада мне, ці я вас пакіну без Расіі. А які Саюз без Расіі? Гэта быў бы поўны развал. Выхад Расіі — выхад Украіны. Хто застанецца? Беларусь? Не разумеюць, што нас разарвуць на часткі — Польшча, Літва, Украіна. А насельніцтва ўсходніх абласцей пацягнецца пад крыло Расіі. Такая ў нас перспектыва. Сумная.

Аднак падзей наперадзе, адчуваецца, будзе нямала. Прадказаць іх немагчыма. І ацаніць адназначна немагчыма. Ніякая аб'ектыўнасць, ніякі вопыт не памогуць. Рушацца ўсе ўстоі і разам з імі ўсе ўяўленні. Рушыцца філасофія. А выпрацоўка новай філасофскай

сістэмы — колькі яна патрабуе часу! Ды і розум для гэтага трэба не Гарбачова, Ельцына... Павінны з'явіцца філосафы, эканамісты, палітыкі ўзроўню Маркса, Энгельса, Леніна. А дзе іх узяць? Ды і ўзняцца ім, заявіць пра сябе ў наш час вельмі няпроста. У нашы дні куміры публікі — варажбіты, экстрасенсы, дамарошчаныя прарокі. Па-мойму, роля інтэлігенцыі прыніжаецца ці зніжаецца, нягледзячы на плюралізм і дэмакратыю. Сумны вывад: літаратурай мастацкай мала хто цікавіцца. Ды і пісьменнікі, па-мойму, замерлі, стаіліся ў чаканні, асабліва зацята маўчаць раманісты, якія выпякаюць не тарты, а жытнёвы хлеб літаратуры. Паэзія — публіцыстычная, рэгістрацыйная, без філасофіі. Публіцыстыка, як ні дзіўна, у большай ступені прастытуіравана, чым у сталінскія часы. Плацяць ёй не грашамі — натурай, аб'едкамі са стала новых палітыкаў, што рвуцца да ўлады. Публіцысты налезлі ў парламенты і могуць вяшчаць з трыбуны: «Мы — лепшыя прадстаўнікі народа», як зрабіў адзін дзеяч на нашай сесіі. Вось так, не ніжэй: лепшыя прадстаўнікі. Гэтыя людзі не памруць ад сціпласці. Уяўляю іх на чале дзяржавы. Будуць і Сталіны і Брэжневы — дыктатары і жывыя трупы, якія атруцяць атмасферу жыцця. Усё будзе. І за ўсё разлічыцца народ — за сацыялізм і за капіталізм.

20 кастрычніка

Яшчэ пра Калбеку. Пасля перамогі ўжо. Палякі абжывалі заходнія землі. Перш-наперш адчынялі шынкі (адкуль бралі гарэлку?). Прадавалі за акупацыйныя маркі. Натуральна, мы зрэдку наведвалі гэтыя шынкі. Батарэі былі раскіданы на значнай адлегласці, на розных ускраінах горада Ландсберга. Мы з Калбекам набылі веласіпеды, не помню як, у немцаў не адбіралі, пэўна, нас забяспечыў начальнік АЗО. Ездзілі на веласіпедах. У душы я радаваўся: дэмабілізуюся — павязу транспарт дадому. Ехалі з батарэі — заглянулі ў шынок. Адна чарка, другая... І раптам уваходзіць польская жанчына і паведамляе: «Панове, ваш ровер...» Укралі! Выскачылі на вуліцу. На маім веліку каціў па вуліцы баец ці сяржант, далёка ўжо ад'ехаў. І раптам Калбека выхапіў пісталет і выпаліў яму ўслед. Я павіс у яго на руцэ: «Канстанцін Дзмітрыевіч! Што вы робіце? З-за нейкай ламачыны — чалавека? Як можна?»

Дайшло да яго — расхваляваўся, крыў мацюкамі злодзея. Завёў свой веласіпед у залу, выпіў яшчэ. Глядзеў на мяне, моўчкі плакаў, тыльным бокам далоні (звыклы жэст) выціраў і вусны і вочы. Сказаў: «Сябраты мой дарагі, Ваня. Сынокты мой! Не мяне ты ратаваў — дзяцей маіх».

У жніўні 1945 года мне далі адпачынак з'ездзіць дадому, я настойліва прасіў, пяць гадоў не бачыў жонкі. Выехалі разам з сяржантам Цішкевічам. Але ў Познані ён сказаў мне (і я, наіўны, паверыў), што ў яго тут сваяк і ён на дзянёк затрымаецца. Калі я вярнуўся, а ён не вярнуўся, і ваенкамат у Баранавічах адказаў, што такі адпускнік не з'яўляўся, у мяне былі непрыемнасці: ківалі мне і палітаддзел і «Смерш» — як гэта я, камсорг, злавіў такую варону, лічы, памог падпюгу дэзерціраваць. Мяне абараняў Калбека. Упаўнаважанаму «Смерша» па нашым дывізіёне, капітану, сказаў: «Адстаньце ад хлопца, а то я дакажу, хто вінаваты: ты! Ведаў ты, што ў яго дзядзька ў Познані?» Я ратаваў Калбеку, але і ён мяне ратаваў неаднойчы. Помню, у Петразаводску. Снежань ц! студзень. Мароз 25°. А мяне выклікаюць у палітаддзел корпуса ў... Мурманск. За 1100 км! Во дзікая арганізацыя! Не прасцей было перадаць нас у Ленінградскую зону ПВО? Між іншым, суседзі нашы, зенітны полк і авіяцыя, так і падпарадкоўваліся. А мы ўсё яшчэ, паўгода, лічыліся ў першым корпусе. Калбека правёў мяне на вакзал. Падышоў поезд. Вагоны набіты бітком. Едуць у тамбурах і ваенныя, і цывільныя, на адкрытых пляцоўках. Так паехаць намерыўся і я.

Калбека катэгарычна:

«Не паедзеш!»

«Як не паедзеш? Загад...»

«Пайшлі яны са сваім загадам! ідыёты! Выклікаюць за тысячу вёрст, каб сказаць, што нельга псаваць дзяўчат, ці прачытаць лекцыю пра разгром саюзнікаў у Ардэнах. Я адказваю. Угавару Кузьміна даць тэлеграму, што ты хварэеш».

Кузьмін пабурчаў, але тэлеграму даў. Каб усе камандзіры клапаціліся так пра сваіх падначаленых, ахвяр было б менш.

Ваюючы на поўначы, знаходзячыся ў Польшчы, у Германіі (ды не адзін я), не ўяўляў разбурэнняў на беларускай зямлі. Ехаў праз Мінск. Убачыў яго ў руінах. Хадзіў па Гомелі, дзе ведаў кожны дом, і не пазнаваў яго — дамоў не было. І не ўяўляў той галечы, што сустрэла мяне. Я не мог рабаваць, як іншыя, і таму амаль нічога не прывёз з той праклятай Германіі.

У «Зеніце» ёсць эпізод, як мы з Калбекам не здолелі нават забраць у нямецкім доме скуру на падэшву, што была ўстаўлена замест разбітай шыбы. З натуры напісаны.

Моцна мяне ўсхвалявалі і сустрэча з жонкай і сустрэча з роднымі мясцінамі, балюча было, што Воленку ўсю высеклі, ладны кавалак, гектараў 70, выдатнага лесу — дубы, бярозы, малады сасновы бор. Маша не змянілася, здавалася мне, яшчэ больш папрыгажэла,

набыўшы сталасць, і мае каханне разгарэлася з новай сілай, як бы ўзнялося на новы віток. А я, дурань, ідэаліст няшчасны, сапсаваў ёй радасць сустрэчы: выражыў нічога не таіць і меў глупства расказаць пра сваю адзіную кароткую сувязь. Пасля, калі вярнуўся зусім, была за гэта мне жорсткая кара: нават такую здраду жонка не даравала. Неаднойчы даходзіла да такога напалу, які многіх іншых прыводзіць да разрыву, у нас — і ў мяне, і ў яе — хапала мудрасці спускаць гэта на тармазах, кіпення бурнага хапала ненадоўга, рэдка да наступнага дня. Я не мог зразумець зацятасці і Андрэя Макаёнка і Лены, калі, падрапаўшыся, яны маглі не размаўляць па два-тры тыдні. Жах — што зажыццё. Нам, канешне, памагалі дзеці, пры малых дзецях не да сварак і маўчання, яны вымушалі і засмяяцца і заплакаць.

Калі я быў дома, выйшаў загад Сталіна аб звальненні з арміі. Пад загад гэты трапляў і я — тэхнік прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. Можна было звольніцца праз ваенкамат, не вяртаючыся ў часць, што многія і рабілі. Я не мог не вярнуцца, не мог не развітацца з Калбекам, з сябрамі, так зжыўся з імі, так палюбіў свой дывізіён.

Пяць гадоў у адным дывізіёне — гэты кавалак жыцця незабыўны. Не напісаць пра гэта жыццё я не мог. Думаю, крытыкі не ацанілі шчырасці і праўдзівасці «Зеніту». Крытыкі, за выключэннем асобных, ставіліся да маёй творчасці дзіўна. Прычыну гэтага зразумеў не адразу. Аб ёй я напішу.

22 кастрычніка

Дэталі быту 1945 г.

У Брэсце ў пасажырскі вагон не ўлезлі — у цяплушку, з нарамі. Радавыя, сяржанты, афіцэры — маёры, адзін палкоўнік быў. Усе сталі роўныя. Афіцэры везлі ў Германію сваіх галодных жонак. Але не ва ўсіх былі дазволы. Везлі нелегальна. Просіць маёр: «Таварышы, схавайце жонак нашых». І дзве інтэлігентныя жанчыны залазяць пад брудныя нары, а мы сядайма на нары. І так колькі гадзін стаім на граніцы. Праходзяць пагранічнікі, правяраюць дакументы. «Пад нарамі ў вас нічога няма?» — «Што вы, таварыш капітан! Мы ж сур'ёзныя людзі!» Добра капітан ведае сур'ёзных людзей і напэўна ведае, што пад нарамі жонкі. Заглядвае туды паміж нашымі нагамі, але робіць выгляд, што парушальнікаў граніцы няма. Якія парушальнікі! З Германіі едуць, ідуць пехатою тысячы, гоняць жывёлу з даведкамі ад калгасаў. Туды таксама едуць вайскоўцы, але зусім не па справах вайсковых — пажывіцца трафеямі, не для сябе — для часці, завода, калгаса: хоць якую машыну, хоць дэталі, станок, метал, дрот, гуму. У Саюзе — галеча невымерная, а зямлю трэба засяваць,

тавары выпускаць, на мірныя рэйкі пераходзілі па ваенных законах: паспрабуй не выканай план! Сёння, калі гарэлку даюць па талонах, успамінаю: тады, у 1945-1946 гг., пры голадзе, пры знішчэнні ледзьве не да нуля прамысловага патэнцыялу, пры абсалютна пустых магазінах, гарэлка была ўсюды, у любым сельмагу. З чаго і дзе яе выганялі? Мімаволі думаеш: калі ў кіраўніцтва было больш мудрасці? Яшчэ адзін тавар быў — крабы. Адзіная закуска.

Пераехалі польскую граніцу — расказы аб тым, што палякі падрываюць, абстрэльваюць нашы эшалоны. Абурэнне вызваліцеляў, пераможцаў. І страх. У Брэсце я сустрэў лейтэнанта з нашага дывізіёна Пыльскага, начальніка прадуктовага забеспячэння. Як ён, нябога, дрыжэў тую ноч, пакуль ехалі да Варшавы. Мне смешна нават было, хоць не скажу, што я нічога не баяўся: недарэчна памерці пасля перамогі.

Чаму па ўзведзеным сапёрамі ў 1944 годзе мосце цераз Віслу не хадзілі пасажырскія паязды, хоць ішлі цяжкія вайсковыя эшалоны,— не разумею, пэўна, даў хтось загад год назад і не адмяняў да канца верасня 1945 года. З вакзала ў Празе (усходняя ўскраіна горада) на вакзал у Варшаве перавозілі палякі: пара коней, запрэжаных у платформы на гумавых колах. Садзілі чалавек па 15 на чамаданы. І рабавалі бязлітасна, бралі ўсё — рублі, злотыя, маркі. Дзелавы народ — палякі! Прадпрымальнікі. Яны і зараз выходзяць з эканамічнага крызісу лягчэй, чым мы, недарэкі.

Я не знайшоў свой штаб у Ландсбергу і, прызнаюся, спалохаўся, што дывізіён падаўся ў Саюз. Не, камендант горада сказаў: перадыслакаваны ў Познань. Начаваў у гасцініцы пры камендатуры. Не спаў усю ноч, каб не праспаць адзіны поезд на Познань, які адыходзіў вельмі рана, помню, бег на вакзал ад камендатурскай гасцініцы ў цемры. 150 км ехаў паўдня. Доўга блукаў па Познані, пакуль знайшоў сваіх. Уладзіліся яны прасторна, у казармах, разлічаных на добры полк, там і стаяў некалі польскі кавалерыйскі полк. Упершыню за пяць гадоў гарматы, кулямёты, пражэктары, цягачы стаялі ў паходным парадку, накрытыя чахламі. Дэмабілізаваліся дзяўчаты, іх замянілі хлапчукі, змізарнелыя дзеці вайны. Вучылі іх нехаця. Настрой дэмабілізацыйны. Не было Калбекі. Ён паехаў па сям'ю ў Куйбышаў, якая галадала там. Я не дачакаўся яго: праз паўмесяца мяне дэмабілізавалі. Дэмабілізаваць дэмабілізавалі, а вагонаў ніхто не даваў; камандаванне не ведала, як пазбавіцца ад нас, добрай сотні сяржантаў, радавых, трэба ж карміць, ды і дысцыпліну мы, вольныя, разлагалі. І ў мяне ўзнікла ідэя: купіць вагоны ў палякаў. У Ландсбергу мы скасілі нямецкую пшаніцу і

намалацілі 50 тон збожжа. За хлеб можна купіць усё! Кузьмін згадзіўся. Пайшлі на таварную станцыю. І хутка знайшлі такога паляка. Майго ведання мовы хапіла, каб дамовіцца. «Пяцьсот кілё!» Прадзешавіў, палячок, Кузьмін ахвяраваў тону. Увечары завезлі яму на кватэру пшаніцу. На другі дзень чыгуначнік паказаў нам пабітыя цяплушкі на дальніх запасных пуцях. Кузьмін, Нужненка самі адвезлі нас туды, пад свісткі паравозаў гаварылі прамовы. Развіталіся. Афіцэры ўподбег кінуліся ад вагонаў: нарэшце сплавілі. Мне ажно крыўдна стала.

Размясцілася наша сотня. Стаім, чакаем. Праходзіць дзень, наступіў вечар. Дайшло да нас, што ніхто нашы вагоны да саставу чапляць не будзе. Дабрадзея свайго знайсці не маглі — схаваўся. Дадому хадзілі — няма пана. Хлопцы выменялі на шмаццё самагон, выпілі, некаторыя з начальнікаў-забеспячэнцаў везлі трафейную зброю. Узброілі п'яных, нахабных. Тыя пайшлі, учынілі перад станцыйным начальствам гвалт. Я, між іншым, баяўся, што палякі паскардзяцца нашай камендатуры. Не, абышлося. Пасярод ночы нас прычапілі. Заляскалі колы. Ад радасці мы закрычалі «ўра».

Прачнуліся раніцою. Стаім. Я выскачыў з цяплушкі першы, прачытаў назву станцыі, паглядзеў на польскую карту (у маладосці я любіў геаграфію, збіраў, вывучаў карты). Ашаломлены, ускочыў у вагон. «Браткі! Палундра! Нас не туды вязуць. Гоняць на поўдзень, у Сілезію». Пайшлі да начальніка станцыі, патрабавалі адчапіць вагоны. Адчапілі. А куды прычапіць? Суткі стаялі на вузлавой станцыі. Ішлі нашы вайсковыя эталоны, саставы з рэпарацыйным абсталяваннем, але ніводзін начальнік саставу не хацеў нас прычапляць. Ледзьве ўгаварылі капітана, які ўзначальваў эшалон дзяўчат, што вярталіся з Германіі, з катаргі, дадому. А састаў гэты дзесятага значэння: да Брэста ехалі чацвёра сутак. Пры гэтым супынкі ў яго былі або на малых станцыях, на якіх не было нашых вайсковых прадпунктаў, дзе можна атаварыць атэстат, або далека ад вакзалаў на запасных пуцях. А калі паедзем далей — аднаму богу вядома. Адстаць боязна. Выменьвалі прадукты ў палякаў, аддаючы нямецкае адзенне, рэчы першай неабходнасці, якія так патрэбны там, дома, дзе ў зямлянках голыя маці, браты, сестры. Помню, начальнік абозна-рэчавага забеспячэння старшына Дземчанка вёз нават мэблю (не ўяўляю, як бы ён вёз яе ад Брэста; хутчэй за ўсё там яе проста канфіскавалі б). Вымусілі яго выменяць стол, крэслы. Усім вагонам націснулі. Мусіў скарыцца. За мэблю мы мелі і сала, і самагонку.

У мяне было дзіўнае багацце — мяшок кніг. Пабыўшы ў адпачынку, я пераканаўся, якое бяскніжжа дома. А мне трэба вучыцца! Я пісаў! У «Мосце» я напісаў эпізод з кнігамі дакладна.

У Брэсце мы развіталіся: хтось ехаў на Маскву, на Кіеў, на Баранавічы, мы з Мікалаем Літвінавым знайшлі ў раскладзе поезд на Гомель. Чакалі яго. Вагоны бралі штурмам. Нам з Колем удалося запіхаць праз акно рэчы. І я залез праз акно. А потым з'явіўся каменданцкі патруль, пачалі ачышчаць вагоны. Выкідвапі чамаданы, клункі, гаспадары рэчаў — дэмабілізаваныя — кідаліся за сваімі рэчамі: дабра шкада. Старшына схапіў і мой мяшок, важкі. Закрычаў: «Барахольшчыкі! Ты глядзі — чаго ён напакаваў — не падняць».— «Там кнігі», — сказаў я. «Кнігі?» — вельмі здзівіўся старшына. Памацаў — кнігі. І разгубіўся. Не выкінуў мяшок і не выставіў гаспадара: роўныя па званні. Пакуль вагон запаўнялі паўторна, з пэўнай доляй арганізаванасці, я ўладзіўся бадай жа з камфортам. Перажываў за Літвінава. Пасля і ён з'явіўся: да Жабінкі ехаў на даху вагона.

Так мы дабіраліся дадому. У Гомелі развіталіся: Літвінаў паехаў па Чарнігаўскай дарозе, яго Глыбоцкае бліжэй да Гарнастаеўкі, я — на Церахоўку. Са станцыі пазваніў сястры Машынай — Вользе Філатаўне, яна рабіла на пошце. Здаецца, у яе пакінуў кнігі. Ірваўся хутчэй да Машы. З большым нецярпеннем, чым паўтара месяца назад, калі прыязджаў у адпачынак. Ведаў, што чакае жыццё цяжкае. Але нішто не палохала. Дагэтуль помню незвычайнае, непаўторнае адчуванне радасці — я жывы! Я дома!! адчуванне свабоды. Ішоў дванаццаць вёрст і падскоквaў ад радасці, галёкаў на ўвесь лес, спяваў. Свабода! Свабода! І жыццё! Жыццё!

Жыццё новае, мірнае я праўдзіва напісаў у «Мосце». Гэта самая аўтабіяграфічная рэч у «Трывожным шчасці». Не, яшчэ «Непаўторная вясна». Нават у лепшай, па вызначэнні крытыкаў, аповесці «Агонь і снег» больш сачынёнасці. Паўтарацца не стану. Зазначу хіба, што жылося цяжка. Па-першае, галодна. Але былі і душэўныя пакуты: Маша не даравала здрады, і мы часта сварыліся. А я не ўяўляў жыцця без яе. Маша змянілася, калі зацяжарала. Але ў яе быў выкідыш — ад голаду, ад знясілення. Вясной 1946 года мы літаральна галадалі, здаралася, па кольк! дзён сядзелі ў лепшым выпадку на дзвюх-трох нішчымных бульбінах у дзень. Але працаваў я як апантаны. Меў у школе гадзін 30, вучыўся ў педінстытуце, цягнуў работу сакратара партарганізацыі, тэрытарыяльнай — шэсць страшэнна бедных калгасаў, у якіх было па 10-15 коней. І пісаў, акрылёны першай удачай. Не перастаю здзіўляцца, як удалося ўжо ў канцы 1947 года адмяніць картачную сістэму. Здзіўляюся не адмене, а таму, што паехаў я ў

Гомель і накупляў прысмакаў: масла, кілбасы розных гатункаў, ікру, булкі, пячэнне. Безумоўна, сяло прадаўжала яшчэ галадаць. Селяніна абдзіралі як ліпу. Як мы выбівалі малако, мяса, воўну ў няшчасных удоў. Узяць няма чаго, але патрабавалі: давай! Запісвалі кіраўнікам сельсаветаў, калгасаў, сакратарам партарганізацый вымовы, выключалі з партыі. Першы сакратар райкома Пятро Гарцуеў, прачытаўшы мае апавяданні, нарысы ў «Гомельскай праўдзе», шанаваў мяне, ставіўся строга, але з павагай. Калі Саюз пісьменнікаў парэкамендаваў мяне ў партшколу, у Гомельскім абкоме круцілі насамі: нейкі вясковы настаўнік! Гарцуеў падтрымаў мяне, разумеў чалавек, што вучыцца мне патрэбна. І я ўдзячны яму.

25 кастрычніка

Калбека цаніў мае дакладныя, а да творчасці на беларускай мове ставіўся скептычна. Яшчэ ў Кандалакшы, дзе мы жылі ў адной цеснай зямлянцы, я пісаў «У снежнай пустыні». Святло трэба і ўдзень і ўвечары, а яго не заўсёды давалі, хоць у штаб электрычнасць праведзена. Сядзелі пры газнічцы з гільзы МЗА. Капціла так, што раніцой з натугай прачышчалі «дымаходы» ўласныя. Калбека бурчэў: «Гасі святло, шчалкапёр. Дыхаць няма чым». Успамінаю цікавую дэталь, пра якую расказваю на сустрэчах. Паперы не хапала нават у камсорга, які цёрся каля штабных пісараў. І я напісаў «У снежнай пустыні» на руска-фінскім слоўніку: шрыфт дробны, а чарніла густое. Сачыніў я, што атрымаў спагнанне за папсаваную армейскую маёмасць. Спагнанне ніхто мне не даваў, а вось здзіўленне Калбекі і ўсіх афіцэраў, якім Калбека расказаў, як і на чым я пішу, помню. Пасля Перамогі, у Германіі, дзе хапала адменнай паперы і меліся выдатныя ўмовы, я працаваў з асаблівай апантанасцю, якая здзіўляла Калбеку ўжо да поўнага захаплення. Як можна сядзець цэлы дзень, калі навокал вясна, радасць, польскія шынкі, адносная свабода — для афіцэраў. Дзяўчат і старых — наш асноўны састаў — дэмабілізавалі, пушкі, прыборы пад чахламі. Гуляюць хлопцы, заводзяць полек, немак. А камсорг, дзівак, сачыняе гісторыю часці; сам я выдумаў для ўсіх іншых, што пішу гісторыю, каб зняць насмешкі. Гісторыю я пісаў, так, між іншым. А галоўная праца — аповесць «Помета». Гэта невялікая рэч, 50 старонак на машынцы. Але беларускай машынкі не было, і друкаваць я не ўмеў. Перапісаў аповесць разы тры-чатыры, а гэта ўжо 200 старонак за якія два месяцы. Вось тут, здаецца, парторг паверыў у мае магчымасці. Калі мы сустрэліся гадоў праз 12 пасля вайны, я паехаў да яго ў Хімкі ўжо вядомым пісьменнікам, маючы некалькі кніг, ён вельмі ўзрадаваўся. Ён толькі пахаваў жонку, малая

дачка прасіла яго нікуды не хадзіць, ведала яго слабасць. Але я, эгаіст, не пачуў голас дзіцяці, запрасіў Калбеку ў рэстаран. Ён ахвотна згадзіўся. Здзівіўся, калі я пачаў заказваць — размах купецкі, веданне рэстаранных страў і парадкаў. Канстанцін Дзмітрыевіч піў як бы сарамліва і трымаў сябе без той бацькоўскай паблажлівасці, якой вызначаўся ў дывізіёне. Бясконца паўтараў: «А яці тваю... Гляджу на цябе і не веру. Ты гэта — мой камсорг?»

Мне вельмі хацелася беларускіх кніг, а іх не было. Прасіў Машу прыслаць часопісы. Але дзе ў яе тыя часопісы! Вольга знайшла два нумары «Беларусі». Маючы адзіны адрас, я паслаў «Помету» ў «Беларусь». У добрыя рукі трапіла мая аповесць — Іллі Данілавічу Гурскаму. Не маючы магчымасці надрукаваць яе ў сваім танюсенькім часопісе, ён перадаў яе суседзям — у «Полымя». А там прозай загадваў Усевалад Краўчанка, а галоўным быў Пятрусь Броўка. Рэч ім спадабалася, і яны з ходу запусцілі яе ў нумар. Для пэўнасці я даў жончын адрас, ведаў, што хутка звольнюся. Прыехаў у Пракопаўку — і да радасці звароту яшчэ і гэта радасць: аповесць прынялі да друку! Адчуванне гэтае можа зразумець хіба той, хто сам перажыў такую радасць — першую публікацыю ў сур'ёзным выданні. На сёмае неба ўзнёсся я. Помню, калі ў студзені атрымаў здвоены 11-12 нумар «Полымя» — прислала з Церахоўкі Вольга Філатаўна — і разгарнуў яго ў сельсавеце, дзе змяшчаліся пошта і медпункт, мяне ажно пачало ліхаманіць — ад незвычайнай узбуджанасці.

Яшчэ да выхаду нумара ў снежні мяне запрасілі на першы пленум Саюза пісьменнікаў Беларусі. Які пленум праўлення! Дзе яно, праўленне, выбранае ў 1934 годзе? Засталося 43 члены Саюза. 42 сабралася на першы пісьменніцкі сход. Ды запрасілі чалавек 20 нас, маладых. Але ў зале народу было многа: амаль увесь час прысутнічаў Панамарэнка, а з ім — плойма апаратчыкаў.

Кармілі нас на фабрыцы-кухні ў асобнай зале і так, як ніхто з нас, маладых, яшчэ ніколі не еў. Помню, за наш стол сеў Міхась Ларчанка, магутны чалавек, і адразу заказаў два баршчы, два біфштэксы. Мяне здзівіла, што чалавек не саромеецца. Увогуле мяне, былога салдата, вельмі здзівіла, усцешыла, узрадавала дэмакратычная атмасфера. Не было генералаў і палкоўнікаў. І смеласць выказванняў, асабліва ў рэстаране. Анатоль Астрэйка, партызан, на падпіцці крытыкаваў самае высокае начальства, чытаў нам дасціпныя эпіграмы на калег, на міністраў. Не чапалі толькі Сталіна і Панамарэнку. Між іншым, зараз многа пішуць аб усеагульнай слежцы, данасіцельствах, сексотах і г. д. Думаю, перабольшваюць. Што мы, п'яныя, гаварылі — той жа Астрэйка, Макаёнак, Рылько,— дык, па цяперашнім разуменні

таго часу, нас усіх павінны былі пасадзіць. Не пасадзілі нікога, акрамя чалавек пяцярых яўрэйскіх пісьменнікаў у час барацьбы з касмапалітызмам, дарэчы, тых, хто менш за ўсё крытыкаваў нашы недахопы. Балбатуна Кучара не пасадзілі, а ён правакаваў не такія размовы. Наконт яго нас, маладых, старэйшыя папярэджвалі: пры ім языкі не распускаць. Выходзіць, і ён ні на каго не «стукнуў», пэўна, вайна навучыла яго розуму. Да вайны ён усё ж пасадзіў некаторых, цяпер пэўна вядома.

29 кастрычніка

На Нарачы як ніколі цягнуўся час і хацелася дадому. Было адчуванне нейкага бясплоднага пенсіянерскага існавання: сталоўка, масаж, гулянне. Хоць многа чытаў газет, кожны вечар глядзеў фільмы, пісаў дзённік. Прыехаў дадому — час ляціць хутчэй, але гэтак жа бясплодна. Трэба садзіцца за раман. Страшна загнаць сябе на катаргу. Страшна пачаць і не скончыць.

Учора быў на абедзе ў мітрапаліта Філарэта — з выпадку 25-годдзя яго архірэйскага служэння. Цікава. Сабраўся ўвесь сінод. Парад бародаў. І якое чынапачытанне! Падумаў: такая іерархія павінна быць у дзяржаве — каб ніжэйшы слухаўся старэйшага. Канешне, павінна быць разумная мера і разумная дэмакратыя, як ва ўсіх цывілізаваных людзей. А ў нас цяпер анархія. Указы прэзідэнта павісаюць у паветры. Кожны сабе «прэзідэнт» — Папоў, Сабчак...

Філарэт — дваранскага паходжання, дзед яго быў «предводителем ярославского дворянства». Адзін поп раздабыў кнігу з бібліятэкі «его превосходительства», і падарунак гэты крануў юбіляра. П'юць святары, як і мы, грэшныя. Добра п'юць, асабліва маладыя. Глядзеў я на іх, і вельмі хацелася даведацца: хто з іх верыць шчыра, па веры выбраў такую прафесію? Некаторыя біяграфіі здзіўляюць, напрыклад, даведаўся, што рэктар семінарыі ў мінулым урач. Пасля інстытута, работы — духоўная акадэмія. Нельга не паважаць такога чалавека.

Пажартаваў свайму намесніку па Камітэце абароны міру Івану Кірычэнку, з якім вярталіся з абеду: «Пяць гадоў назад нас з вамі пацягнулі б на бюро за ўдзел у такім абедзе». А на абедзе сказаў з перакананасцю і верай, што царква, маючы тысячагадовы вопыт міратворчасці, можа ў гэтай крызіснай сітуацыі памагчы ўтрымаць людзей ад узаемнай разні. А пэўныя сілы штурхаюць на гэта, і халадзееш ад жаху, што можа здарыцца. Памілуй нас, божа!

1 лістапада

Мяне вылучылі кандыдатам у дэлегаты на з'езд КПБ. Даў згоду. Не выбралі. І што самае дзіўнае: мяне гэта не кранула. Толькі абурыла і засмуціла, што ўвогуле не выбраны ніводзін пісьменнік, мастак. Нікому, выходзіць, не патрэбна літаратура, мастацтва, усе высокія праграмы застаюцца мёртвымі паперамі. Абурае бездапаможнасць ЦК. Чым яны займаюцца ў такі час, у такой адказнай сітуацыі? Эканомікай? Дык што ж яна так развальваецца? Рынак бяднее з кожным днём. Талоны на гарэлку атаварыць нельга, дзікія чэргі. Учора атрымалі талоны на алей. 200 грамаў на месяц. Во жыццё! Эпізод пазаўчарашні. Выдаём двухтомны руска-беларускі слоўнік. Вельмі патрэбны для ажыццяўлення закону аб мовах. Пра гэта сведчыць заказ кнігагандлю: 50 тысяч. Такога тыражу не меў ніводзін слоўнік. На паліграфкамбінаце нешта з машынай высокага друку. Дамовіліся з друкарняй ЦК. Кутавы, дырэктар, пратрымаў заказ і зараз, калі да канца года засталося два месяцы, дае адбой. Гарым! Званю В. А. Пячэннікаву: так і так. «Не мой вопрос. Типографией занимается Управление делами». Я аслупянеў. Выданне слоўніка ў такі час — не пытанне сакратара? Такую тваю, ідэолаг! Не стрымаўся пры ўсёй сваёй далікатнасці: «Ну, Валерый Андрэевіч, даведаюцца пісьменнікі, што друкарня ЦК сарвала выданне слоўніка — скажуць сваё слова, і скажуць гучна!» Дайшло, мабыць. «Хорошо, я переговорю с Кутовым». Але пакуль што вынікаў ніякіх. Нейкая ўсеагульная паралізаванасць усіх структур.

Аднак вяртаюся ў мінулае, роўна на 45 гадоў назад, да таго знамянальнага, ва ўсялякім разе для мяне, пленума. Ен зрабіў мяне пісьменнікам, прызнаў. На ім была цікавая размова, баявая, гарачая. Жылі Перамогай. Жылі верай ва ўсе будучыя мірныя перамогі. Ці засталася стэнаграма пленума? Стэнаграфісткі былі. Безумоўна, славілі Сталіна, але гэта была дань часу, модзе. З вялікай прамовай выступіў Панамарэнка і намаляваў даволі рэалістычную карціну стану гаспадаркі. Не ўсё з таго, што ён сказаў пісьменнікам, было апублікавана. Дзіўна гэта і незразумела. Толькі ж скончылася вайна, яна адкінула эканоміку да нуля, а нехта праз паўгода пасля вайны займаўся яўнымі прыпіскамі, жыццё народа з мільёнамі ўдоў і сірот падавалася ледзьве не як шчаслівае — дзякуючы роднаму бацьку Сталіну. Праз два месяцы я пазнаёмлюся з Андрэем Макаёнкам, інструктарам РК, і ўпершыню ад яго пачую ацэнку Стал і ну, паважлівую яшчэ, але рэальную. А жыццё ў сяле бачыў гэтак жа, як і ён.

Праз сем гадоў, у 1952-м, пры жыцці «бацькі», Андрэй адважыцца напісаць «Выбачайце, калі ласка!» — з развянчаннем сталінскага «першага запавету». Аднак я пераскокваю.

На пленуме мяне захапляла смеласць пісьменнікаў. У прысутнасці Панамарэнкі многія гаварылі тое, пра што газеты і радыё маўчалі. У паўзах, хаваючыся ледзьве не ў туалеце, я пісаў дзённік. Ад захаплення майго ў ім было многа наіўнага, але назіранні, характарыстыкі людзей былі свежыя, жывыя, арыгінальныя. Не магу дараваць сабе, Машы, што дзённік згубіўся, як і даваенныя мае дзённікі. Дзе, калі яны згубіліся? Калі пераязджалі ў Мінск? Дык у нас жа не было ніякага скарбу, адзін чамадан і жалезны ложак — у багажы. Памойму, дзённік згублены пры пераездах у горадзе; тады, шчаслівыя, задаволеныя жыццём, мы абыякава ставіліся да архіваў, пра будучыню не думалі. Цяпер рукапісаў, пісем накапілася грузавік, але парадку ў іх няма; каб захацеў сёння знайсці, напрыклад, дзённікі 8 — 10-гадовай даўнасці, наўрад ці знайшоў бы за адзін дзень.

На пленуме стаяла пытанне аб рабоце з маладымі. Даклад пра нашу творчасць зрабіў Васіль Вітка. Колькі нас выпаўзла з акопаў, з зямлянак? Адзінкі. «Помета» стала з'явай у маладой прозе. Вітка прысвяціў разбору аповесці добрую трэць даклада, хоць нумар «Полымя» і не выйшаў яшчэ. Я адчуваў сябе імяніннікам. Мяне віншавалі — старэйшыя, з маладых мала хто. Тады я, добрая душа, не ведаў яшчэ глыбіні чалавечай рэўнасці і зайздрасці.

Сам старшыня Саюза Міхась Лынькоў звярнуў на мяне ўвагу, здзівіў і парадаваў, сказаўшы: «А я, в'юнаша, помню вашы апавяданні». Тыя, што я прысылаў у «Полымя» да арміі і з Мурманска, з батарэі. Выходзіць, сам галоўны рэдактар чытаў творы маладога аўтара.

Пленум — падзея таго даўняга часу, якая зрабіла глыбокае ўражанне і добра запомнілася на ўсё жыццё. Ехаў я назад у сваю Пракопаўку тузам. Пісаць пачаў з падвоенай энергіяй. Апавяданне нарысы — каб зарабіць капейку, большасць з іх друкаваў у «Гомельскай праўдзе». Загадчыкам аддзела там быў разумны і добры Абрам Рабіновіч. Ён паверыў у мой талент і даваў мне «зялёную вуліцу». Мы пасябравалі і дагэтуль падтрымліваем сувязь, хоць у часе барацьбы з касмапалітызмам ён пакінуў рэдакцыю і пайшоў у школу выкладаць «бясклясавую дысцыпліну» — матэматыку; пасля многія гады быў дырэктарам школы, лепшай у Гомелі.

Але апавяданні — так сабе, між іншым. Спеў раман. Расказы Івана Сяргеевіча Бібікава, старшыні сельсавета, партызана, з якім мы цягнулі лямку ўсёй работы, ды і іншых партызан і проста вяскоўцаў далі багацейшы матэрыял. У людзей усё было ў памяці, і ў любой

кампаніі — усляміны. Дзіўнгі, што партызан было намнога менш, чым франтавікоў, але больш яркая, цэласная — таму, што ўсё адбывалася тут, дома, з удзелам знаёмых, блізкіх — вырысоўвалася эпапея партызанская. Бібікаў расказаў, як расстралялі яго сям'ю, уначы, па-бандыцку,— і ў мяне адразу «пішацца» сюжзтны вузел. Так з'яўлялася задума «Глыбокай гільні». Між іншым, назву рамана прыдумаў Андрэй, ён напісаў мне з Журавіч.

3 лістапада

Што творыцца ў краіне? Алею даюць па 250 грамаў на месяц. Па 8 грамаў на дзень. Нюхаць яго, ці што? І гэта пры сгановішчы, калі сабраны рэкордны ўраджай. Прымаюцца Вярхоўнымі Саветамі ганебныя законы — аб абароне спажывецкага рынку: забараняецца вываз тавараў, пасылкі. Але ад гэтага ніводная рэсгіубліка яшчэ не пабагацела. І не пабагацее! Насыціць рынак можна толькі агульнымі сіламі. Помню, пры Брэжневе ўзнік дэфіцыт тканін баваўняных — рушнікоў, прасцін. Забілі трывогу. І за тры-чатыры месяцы становішча наладзілася. Магла б яго, дэфіцыт той, ліквідаваць адна Беларусь ці адна Эстонія? Дзіўна, што за што ні вазьміся— усюды каротка і ўсюды рвецца. Вінавацяць адміністрацыйна-камандную сістэму. Але ж пры ёй былі хлеб, масла, гарэлка, віно. А сёння перад святам па талонах нельга купіць пляшкі гарэлкі. Дзікія чзргі — пры талонах! Недзе ў маі групу пісьменнікаў, мастакоў. акцёраў прымаў наш новы прэм'ер Кебіч. Добра помню, пытанне задаў Янкоўскі: «Вячаслаў Францавіч, калі скончым з гэтай ганебнай з'явай — з чэргамі па гарэлку?»

Прэм'ер адказаў з зайздроснай самаўпэўненасцю: «Абяцаю цвёрда: да верасня праблема будзе вырашана». Вырашана... праз два месяцы ўвялі талоны, а ў кастрычніку—лістападзе і па талонах нічога нельга купіць. А ў 1945-1947 гг. гарэлкі было навалам, у кожнай сельскай крамцы. Пры той разрусе і беднасці. А зараз гібне збожжа, не будзе ляжаць бульба, вырашчаная ў нізінах — лілі дажджы тры месяцы. Любы гаспадар перагнаў бы і збожжа і бульбу ў прадукт, які не псуецца і які дае шматкратны прыбытак — за кошт яшчэ чаго папоўніць бюджэт? Ды не ж... Спытаў у «Соснах» у сакратара Клецкага райкома Ерашука: «У вас што, няма спіртзаводаў?» — «Былі два — дэманціравалі». Хоць аднаго дурня выключылі з партыі за такі падрыў эканомікі, за такую дурную барацьбу з п'янствам? Але ж выключаць трэба Гарбачова, Лігачова, Якаўлева. Хто з іх ініцыятар закону? Калі Якаўлеў — зразумела, гэты ведае, што робіць. Кажуць, Лігачоў, тады можна зразумець хіба адно: якія ёлупы кіравалі краінай!

А што думалі члены ЦК, а гэта ж — сакратары ЦК, абкомаў, вялікіх гаркомаў. Цвет партыі. Бараны! Іх такі прывялі ў загон на ўбой. Пляснуліся адзін за адным. Зараз шукаюць ратунак у сепаратызме. Зрабіліся прыхільнікамі суверэнітэту. Якога, Панове? Што вамі зроблена для яго ажыццяўлення? Суверэнітэт — гэта першнаперш дабрабыт народа. Еўропа аб'ядноўваецца, і ніхто не баіцца за свой суверэнітэт. Венгрыя, Чэхаславакія пішчом лезуць у ЕЭС — каб хутчэй з СЭВа, далей ад такой узаемадапамогі, хоць без нашай нафты і газу пазнаюць ліха, ужо б'юць трывогу.

Аднак зноў занесла ў сучаснасць. А куды дзецца ад праблем сённяшніх? Ніколі яшчэ я не адносіўся да нашай рэчаіснасці так негатыўна. Я быў ідзалістам і аптымістам. Мне здавалася, што пры ўсіх глупствах, якія мы з Андрэем бачылі добра, пры маразме Брэжнева і бязмоўнасці партыі, мы ўсё ж ідзём да лепшага. Я вітаў перабудову. Расчараваўся, бо перастаў разумець, каму такая перабудова на карысць. Народу? Не. Хіба Бушу, Колю, Тэтчэр. Яны вітаюць нашы восем грамаў алею на чалавека. Яны паціраюць рукі і шчодра асыпаюць Мішу прэміямі. Нараджаецца раман. Злы. Ажно робіцца страшна: пад канец жыцця і гэтулькі злосці! Чаму? Не галадаю ж яшчэ, дзякуй богу. Галадаў жа пасля вайны — і плаваў у аблоках, быў поўны самых ружовых мар і спадзяванняў. Таму што наперадзе было жыццё, а зараз яно за спіной, а наперадзе — змрок, бесперспектыўнасць. Не асабіста для мяне. Для дзяцей і ўнукаў. Для іх жыў, працаваў, капіў ганарары. А цяпер нават за мізэрныя зберажэнні дрыжыш: дзеля чаго стараўся? Але раман напішу. Дай бог здароўя. І не будзе ён злосны да людзей, да добрых людзей.

10 лістапада

Не помню ўжо, калі я пачаў пісаць яго, раман. Улетку ці ўжо ўвосень 1946-га. Першую частку напісаў хутка, хоць перапісваў разы тры, як і «Помету». Почырк у мяне тады быў добры, разборлівы, не тое што цяпер, калі папухлі суставы. Паслаў у «Полымя». Канешне, тады не было яшчэ завалаў рукапісаў, як цяпер. Аднак увага, з якой паставіліся да маладога аўтара і загадчык аддзела У. Карпаў, і галоўны рэдактар Пятрусь Броўка, у наш чэрствы час заслугоўвае самага добрага слова. Прачытаць у рукапісе, паправіць мову, перадрукаваць на машынцы, за машынку нават платы не бралі з «вяскоўцаў»... Карацей кажучы, месяцаў праз чатыры-пяць (экспрэс!) частка была надрукавана, здаецца, у 10-м нумары за 1947 год. І не прайшла незаўважанай. Тады на яе адгукнуліся Паслядовіч, Хадкевіч, Сабаленка, нехта Рабаў, Валодзін (Дадзіёмаў), рэцэнзіі далі

рэспубліканскія, абласныя, раённыя газеты. Гэта было падзеяй. Цяпер нічога падобнага няма, нават прыхільнікі вялікага пісьменніка не здольныя арганізаваць столькі публікацый, колькі тады з'явілася на першую частку рамана невядомага вясковага настаўніка. Большасць з гэтых рэцэнзій я нават не меў магчымасці прачытаць, седзячы ў сваёй Пракопаўцы. Але дзве запомніліся, у адным нумары «ЛіМа» — старшыні Саюза Міхася Лынькова і Усевалада Краўчанкі. Лынькоў бязлітасна, непедагагічна крытыкаваў «аповесць». Прытым не па істотным, а па дробязях, уедліва распісаў п'янкі паліцэйскіх — натуралізм. Краўчанка тут жа яму пярэчыў і рабіў гэта больш доказна: пісаў, што гэта бадай першае праўдзівае слова аб жыцці ў акупацыі, аб нараджэнні партызанскага руху. Я прачытаў «ЛіМ», і дзіўная ў мяне, наіўнага, была рэакцыя — не толькі не засмуціўся, але ўзрадаваўся: на мяне звярнуў увагу сам Лынькоў! Ура! Я апынуўся ў цэнтры літаратурнага жыцця! Здзівіўся, калі прыехаў у «Гомельскую праўду» і пачуў, што сябра мой і рэдактар Абрам Рабіновіч занепакоены. Ён лепш, чым я, ведаў «кухню», ведаў, як перакрываецца кісларод маладому аўтару. Цяжка вытлумачыць учынак мудрага і клапатлівага Міхася Ціханавіча. Праз многа гадоў, калі мы пасябравалі і я наведваў яго ў бальніцы, ён неяк з болем сказаў: «Не крыўдуй, Іване, за той мой водгук. Падбілі мяне сукіны дзеці». Значна раней за гэтае прызнанне, бадай, тады, калі я пераехаў у Мінск, мне такія хлопцы, як Карпаў, Сабаленка, Шахавец, Вялюгін (які ўсё ведаў!), сказалі, што гэты «сукін сын» — Кучар! Ён тады быў намеснікам галоўнага рэдактара «ЛіМа», галоўным быў Аркадзь Куляшоў, які ў 33 гады лічыў сябе ісусам у літаратуры і вельмі рэдка з'яўляўся ў рэдакцыі, палітыку рабіў Кучар, ён кіраваў фурманкай. Міхась Лынькоў пачаў вялікі раман аб партызанах, але нічога не апублікаваў яшчэ. І раптам такая заяўка нейкага Шамякіна! Апераджае «в'юнаша». Мае рацыю праныра Кучар: прытрымаць! Клюнуў стары (48 гадоў) на правакацыю. Не падумаў нават, што Кучар не дабро яму робіць, а падкладвае свінню. Ішла жорсткая барацьба паміж Лыньковым і Броўкам, апошні рваўся на пасаду старшыні (і праз год заняў яе!). Броўка, галоўны рэдактар «Полымя», не мог прапусціць выступление супраць твора маладога аўтара, партыйнага твора. Старшыня Саюза глушыць маладых! Думка гэтая адразу ж была даведзена да кіраўніцтва ЦК. Броўка, калі мы рабілі разам у СП і нярэдка бралі чарку, неяк на падпітцці прызнаўся: «А я тады паказаў таму старому дурню, як выступаць супраць маладых».

Вось такая ішла «гульня». Пазней я даведаюся, што гэта былі не літаратурныя палемікі, а працяг той зацятай дурной барацьбы, якая ў

1937-1938 гадах прывяла да трагедыі, да арышту многіх і нават пакарання смерцю. Як яны не перасадзілі яшчэ адзін аднаго, а заадно і нас, маладых, пасля вайны?! Думаю, ратаваў іх ад Цанавы Панамарэнка, ён адзін добра разумеў, што ніхто з іх не вораг.

Лынькоў вельмі хутка змяніў сваю думку пра мой раман. Ужо ў 1949 годзе, у часе тыдня беларускай літаратуры ў Маскве (у дэлегацыі быў і я, слухач партшколы), Міхась Ціханавіч апублікаваў у «Правде» вялікі артыкул з высокай ацэнкай «Глыбокай плыні». Безумоўна, артыкул гэты памог мне праз два гады атрымаць за раман Сталінскую прэмію.

У 1953 годзе мне асабіста расказваў Панамарэнка, ён любіў пахваліць сябе: «Сталін на Палітбюро спытаў маю думку пра ваш раман. Я даў яму тую ацэнку, якую даў Лынькоў». Можна заключыць: Панамарэнка ішоў на Палітбюро, узброены артыкулам Лынькова.

12 лістапада

Працаваў я сапраўды апантана. Пісаў многа. Зараз сам здзіўляюся: адкуль браліся сілы, час? Галадалі ж. А ўмовы... Адзін пакойчык з печчу. Адно акно забіта фанерай — не было шкла. У другім колькі шыбак злеплены з асколкаў шкла. Зімою ў шчыліны гэтых шыб на стол, на рукапісы намятала гурбачкі снегу. У маразы ўсёй сям'ёй спалі на печы. Помню стол свой. Стары, панскі, тры ножкі з фігурнай разьбой, паедзеныя шашалем, чацвёртая — неакораная бярозка. Стол быў падарункам Машы ад сельсавета, не магла фельчарыца жыць без стала. На гэтым стале напісаны апавяданні, «Глыбокая плынь». Дарэмна, калі пабагацелі і купілі новы стол (здаецца, у пачатку 1948 года), мы некаму аддалі яго, той «музейны» стол. Але ж не павязлі б мы яго ў Мінск.

інстытут літаратуры падрыхтаваў 6-томны біябібліяграфічны даведнік беларускіх пісьменнікаў. Адам Мальдзіс прыслаў мне для праверкі бібліяграфію маіх твораў — 77 старонак. Чытаю тыя гады. Апавяданні: «У снежнай пустыні», «Бацька», «Караван», «Браты», «Настаўніца», «На знаёмых шляхах», «Жыццё», «Першая камандзіроўка», «Шлях на радзіму», «Над Дняпром», «Гандляры», «Успаміны». Якія? Пра што? «Наташа», «Здзейсненая мара», «Газета». Нарысы, артыкулы — у «Полымі», «Беларусі», «Бярозцы», «ЛіМе», «Работніцы і сялянцы», «Чырвонай змене» і г. д. Гэта побач з «Глыбокай плынню», дзве другія часткі я апублікаваў у 7-8 нумарах «Полымя» за 1948 год.

Далібог, добрую палавіну апавяданняў, а тым больш нарысаў не помню. Пра што «Жыццё», «Газета», «Шлях на радзіму»? Варта было б зрабіць фотакопіі — цікава ўсё ж.

Дзіўна, што ў бібліяграфіі рэцэнзій на мае творы няма артыкулаў Лынькова і Краўчанкі. Не захаваўся, відаць, нумар «ЛіМа» ў падшыўцы. Можа, там было штось Кучарава; яшчэ ў 50-х гадах, пасля XX з'езда, у бібліятэках з газет і часопісаў зніклі выкрывальныя артыкулы Кучара — павыразаў, бандзюга.

Сёння 70 гадоў Андрэю. Было б. Восем гадоў, як яго няма. Учора прагартаў яго пяты том. Многа «прахаднога» — артыкулы, даклады тых часоў. Але тое, што ён пісаў для сябе,— востра, разумна, таленавіта, гучыць і сёння. Паедзем на могілкі. Паклонімся нашаму вясёламу сябру. Сцяпан Лаўшук малайчына, што не зацягнуў з падрыхтоўкай Збору твораў. Пры рынку такі стратны збор яе прабіць. А для нашага брата гэта лепшы помнік.

Выйшла мая кніга ў «СП» «Своя нелегкая дорога», сёння купілі. Там і аповесць пра Андрэя. Хвалю сябе: добрую справу я зрабіў, напісаўшы ўспаміны пра Лынькова, пра Глебку, Броўку, Мележа. Шкадую, што не напісаў пра Кулакоўскага, у кнізе ёсць толькі артыкул пра яго.

15 лістапада

Крызіс нарастае. Учора ўзбунтаваліся дэпутаты Вярхоўнага Савета Саюза: патрабавалі неадкладны даклад прэзідэнта аб становішчы ў краіне. Гарбачову трэба сыходзіць. інакш яго чакае лёс у лепшым выпадку Жыўкава і Хонекера. І Рыжкову. А разам з імі і Ельцыну. Але гэты, здаецца, утрымаецца на падтрымцы паповых, сабчакоў, заслаўскіх, шмялёвых. Ох, дэмагогі! Азартныя, але бяздарныя ігракі. Нехта пажартаваў: «Хіба яны не ў адной ложы? Знаць бы, хто ў іх магістр. Няхай бы прымірыў, а то з'ядуць адзін аднаго, як скарпіёны».

Настрой сабачы. Два дні хадзіў і хістаўся — нейкія сасудзістыя з'явы, неўрапатолагі вызначаюць агульна: склератычныя. Без іх ведаю. Хораша трымаліся зубы і раптам пасыпаліся, дагэтуль ірваў карэнныя... А цяпер трэба рваць пярэднія, наперадзе — пакутлівыя працэдуры.

У чэрвені 1947 г. СП выклікаў мяне на нараду маладых літаратараў. Нас было многа, чалавек 50, ёсць калектыўнае фота. Але пісьменнікамі стала хіба якіх дзесяць чалавек, тых, хто ўжо і тады выявіў сябе — Аўрамчык, Васілевіч, Русецкі. Па выніках нарады мяне прынялі ў Саюз пісьменнікаў. Гэта была падзея ў маім жыцці. Вяртаўся ў Пракопаўку з радасцю: адзін член СП на ўсю Гомельшчыну! Быў расчараваны, што Маша прыняла гэта больш чым спакойна, а калегі па школе і зусім абыякава. Рабілі выгляд ці не разумелі? Адзін

толькі Бібікаў, малапісьменны чалавек, разумеў, што гэта значыць для мяне, і бадай ганарыўся, што працуе разам з прызнаным пісьменнікам. Ва ўсялякім разе адносіцца да мяне ён пачаў з пэўнай пачцівасцю — без бацькоўскай паблажлівасці, як да роўнага. Жылі па-ранейшаму, вясной, улетку 1947 г. Хіба трохі лепш, чым год назад,— атрымліваў нейкія ганарары, хоць выплачвалі са спазненнем. За першую частку «Глыбокай плыні» мне выпісалі 12 тысяч. Але ў снежні адбылася рэформа, і я атрымаў 1200. Рабіновіч, знаўца цэн, падлічыў, што за дарэформенную суму я купіў бы раза ў паўтара больш — тавараў, не прадуктаў. Тады ж, у снежні 1947 года, была адменена картачная сістэма і... сёння нельга не здзівіцца! — як многа ў магазінах было прадуктаў. Праз два з палавінай гады пасля заканчэння вайны. Праўда, сяло працягвала галадаць — удовы і сіроты. А ў гараджан, выходзіць, не было грошай. Рэформа выкінула тыя грошы, што зберагаліся ў панчохах, сярод якіх былі фальшывыя, выпушчаныя немцамі.

Успамінаю адзін камічны эпізод. Не адразу пасля прыёму ў Саюз, пазней, пэўна, у жніўні, калі «Глыбокую плынь» здавалі ў набор, я прыехаў у Мінск, і той жа Усевалад Краўчанка падбіў мяне прасіць літарныя карткі. Маючы такія карткі, пісьменнікі за мізэрную аплату атрымлівалі проста багаты для таго часу набор прадуктаў. Я, бядняк, зайздросціў, пабыўшы ў гасцях у Краўчанкі.

Пайшоў да Паўла Кавалёва, які быў адказным сакратаром Саюза. Той прыняў маю просьбу з разуменнем і тут жа даручыў дырэктару Літфонду выбіць мне літарныя карткі, якія буду атаварваць у Гомелі. Дырэктарам быў Мірон Левін, вялікі гумарыст, пра яго дагэтуль расказваюць анекдоты, не чалавек — легенда. Па калідорах Дома ўрада Левін павёў мяне да міністра гандлю. Але па дарозе спыніўся: «Спачатку зойдзем сюды». Зайшлі ў шыкоўны буфет з поўным наборам напіткаў і закусак. «Па дзвесце грамаў каньяку. Балычок, і корка». Грошай у мяне было мала, але за такія карткі апошняе аддасі. Я толькі піскнуў: «А як жа міністр?» — «Ты что думаешь, министр живет духом святым?» З боязі ап'янець і з-за беднасці я прытварыўся, што не п'ю. А Левін перакуліў шклянку каньяку, смачна закусіў і павёў мяне да міністра. Міністрагне было. Прыняў яго намеснік; думаю, Левін адразу ішоў да гэтага чалавека, прозвішча яго мне не запомнілася. Але як запомніўся дыялогі Спектакль!

«Слухай, Майсей, ты знаеш, хто такі Пушкін?»

«Мірон! За каго ты мяне прынімаеш?»

«Ну, дык во гэта другі пасля Пушкіна»,— і паказвае на мяне, нізенькага, як Пушкін, худзенькага, у залатанай гімнасцёрцы пад

клятчастым юнраўскім пінжачком — абноскам нейкага амерыканца. Я ледзьве не праваліўся скрозь падлогу.

Просьба была тут жа задаволена: а як жа, другі пасля Пушкіна!

Намеснік міністра паляпаў мяне па плячы.

«Вяртайся ў свой Гомель. Сёння ж напішу ў аблвыканком. Вам прышлюць»,— запісаў мой адрас. ідучы назад, зноў заглянулі ў буфет.

Цяпер ужо і я на радасцях каўтануў, забыўшыся, што не п'ю. Я цярпліва чакаў. Спачатку і Маша спадзявалася, пасля начала кпіць. Прыйшоў снежань, адмянілі карткі, так і не дачакаўся я іх. Па-мойму, звычайны здзек. Не з мяне. З літаратуры нашай. Вялікія гумарысты!

17 лістапада

У «Аповесці пра сябра» я пісаў, што выбарчыя дакументы я вёз у чужым паліто — Героя Савецкага Саюза Халяўкі. Больш як два гады не мог купіць паліто — хадзіў у шынялі. Толькі атрымаўшы 1200 рублёў ганарару за «Глыбокую плынь», я купіў на гомельскай таўкучцы кажушок. Звычайны, хатняга вырабу. Але ён запомніўся маім калегам. Ягодоўгаўспаміналі. П'яны Бялевіч казаў: «Гэты кулачок у кажушку...» Нахабнік Кучар, які заўсёды піў за чужы кошт, асуджаў: «Ходзіць у кажуху, а ў рэстаране глядзіць, каб разлічыліся мы». А сам ён, Кучар, ніколі не разлічваўся.

Кажушок гэты я насіў яшчэ першую зіму ў Мінску, хадзіў у ім у партшколу. Там, наадварот, папракалі: «Што ты паліто не купіш? Ганарары палучаеш!»

Запомнілася пакупка першага паліто. Багатага, «міністэрскага», з найлепшага раціну. Але каштавала яно роўна дзве тысячы. І мы з Машай колькі разоў выходзілі з магазіна, пакутліва рашаючы задачу: купляць — не купляць? Купілі.

Першым сустрэў мяне ў новым паліто Мікола Аўрамчык, яшчэ большы за мяне бядняк; помню яго здзіўленне: «Ух ты, не пазнаць!»

Дзіўна: пазнейшыя больш значныя падзеі — паездкі за мяжу, юбілеі — не запомніліся, а вось такія бытавыя дробязі тых першых пасляваенных гадоў — часоў не толькі творчага станаўлення, але проста чалавечага, помняцца і дагэтуль. Амерыканцу гэта напэўна будзе смешным — пакупка паліто. Нам не смешна — горка.

...Вучыўся я завочна ў Гомельскім педінстытуце. Але калі першы год — у 1946-м — здаваў усе предметы акуратна, то, зрабіўшыся пісьменнікам, стаў хадзіць з «хвастамі». Прыязджаў на сесію і акунаўся ў літаратурнае жыццё — у інстытуце, у «Гомельскай праўдзе». Беларускую літаратуру чытаў энтузіяст Карпачоў. Ён проста насіўся са мной, прымаў дома, частаваў, наладжваў выступленні,

памагаў здаць цяжкія прадметы. Здаецца, уводзіны ў мовазнаўства ці штосьці падобнае, але блізкае да літаратуры, мудрагелістае, я пераздаваў разы тры, уедлівы русак — выкладчык сароміў мяне: «Какой же вы писатель!» Увогуле з мовамі ў мяне былі нелады, у тым ліку і з беларускай, але беларусы былі пад уплывам Карпачова і ставіліся да мяне паблажліва. Хваліў мяне гісторык. Гісторыю я нязменна здаваў на «выдатна» і ў інстытуце, і пазней у партшколе. Яшчэ калі паступаў у інстытут, так расказаў пра Брусілаўскі прарыў, што выкладчык доўга ўгаворваў: «Молодой человек! Зачем вам эта нудная словесность? Поступайте на исторический».

Я напэўна мог бы стаць гістарычным пісьменнікам, каб не меў своеасаблівай прагнасці да сучаснасці, каб не любіў яго, сучаснае жыццё, не прайшоў вайну, не захапляўся людзьмі, якія акружалі мяне. А я захапляўся імі — сваімі вайсковымі сябрамі, яшчаснымі дзяўчатамі — салдатамі, яшчэ больш няшчаснымі сялянкамі, што аралі на сабе, партработнікамі, пісьменнікамі... Я любіў іх. Я дараваў людзям іх чалавечыя слабасці. Напэўна, пісьменнік павінен быць больш скептычны, злосны, уедлівы, бязлітасны — як Платонаў, як Макаёнак, як Быкаў...

Аднак пра вучобу. Інстытут не грэў, правалы білі па самалюбстве. І я з радасцю прыняў прапанову Саюза пісьменнікаў паступіць у партыйную школу.

На ўступных экзаменах рускі дыктант напісаў на чацвёрку, гісторыю здаў на пяць. Быў залічаны. Але і тут узніклі сур'ёзныя праблемы. Слухачы партшколы, не мінчане, павінны былі вучыцца без сем'яў. Я не мог без сям'і. Назад я не вярнуўся, быў упэўнены: на перыферыю мяне не пашлюць, паступіў я на журналісцкае аддзяленне. А галоўнае: не ўяўляў жыццё без Машы, даволі было пяцігадовай разлукі. Да таго ж мы чакалі дзіця. Як толькі жанчына трохі падкармілася, цяжарнасць не перапынялася, развівалася нармальна.

Пайшоў да дырэктара школы іллі Паўлавіча Кожара, былога камандзіра Гомельскага партызанскага злучэння. Чалавек гэты быў добры, на рэдкасць сумленны, але знешне суровы. Пасля мы былі ў найлепшых адносінах, ён стаў маім кансультантам па партызанскай тэматыцы. А тады ён адказаў коратка:

«На сямейных у нас няма жылля».

«Я не прашу інтэрнат, толькі дазвол. Я знайду кватэру...»

«Такі багаты?»

«Я пішу... Во»,— і паклаў яму на стол карэктуру «Полымя» з другой часткай «Глыбокай плыні».

Гэта зрабіла магічнае ўздзеянне, напэўна, Кожар калі не чытаў, то чуў пра першую частку рамана. А гам жа пра Гомельшчыну, і камандзір злучэння — Ружак (ззаду наперад — амаль Кажур).

Дазвол мне Ілля Паўлавіч даў. Больш таго, пасля — у час вучобы — апякаў і ахоўваў. Я многа прапускаў лекцый. За гэта ён караў. іншых. Мяне разы два выклікаў і па-оацькоўску ўшчуваў. Дазвол дазволам, але дзе знайсці кватэру ў разбураным Мінску? Тыдзень хадзіў па раёне Камароўкі (чамусьці ў іншыя раёны не цягнула, відаць, хацелася быць бліжэй да Дома друку), як жабрак, стукаў у веснічкі прыватных дамоў, добра, што сабак было яшчэ нямнога, не нарасцілі. Пашанцавала. Знайшоў пакой па Лагойскім тракце, побач з Домам друку. Але ўмова: аплата на год уперад; таму яго і не перахапілі, хто меў тады такія грошы?! На той дзень грошай не было і ў мяне. Але ў мяне друкаваўся раман. Урач, які жыў да таго і аплаціў наперад, паверыў мне — аддам. Але кватэра з'ядала амаль увесь ганарар. Як жыць? На адну стыпендыю? У нас жа, як кажуць, ні стала, ні кала. Меўся адзін жалезны ложак. Яго везлі з Пракопаўкі — увесь наш скарб.

Пераезд фарсіравалі, перабраліся за паўмесяца да навучальнага года. Па нашых недакладных разліках Маша павінна была нарадзіць у пачатку верасня.

20 лістапада

Прэзідэнт адчуў, што пахне смажаным, што цярпенне дэпутатаў... народа! — на грані, і прапанаваў кардынальныя меры па выхаду з крызісу. Праўда, пераважна палітычныя. А трэба эканамічныя — накарміць народ! У многіх гарадах уводзяцца карткі на хлеб. Дажылі. Але ва ўсім бязладдзе і глупства. Калі ўжо картачная сістэма, то яна павінна быць агульнадзяржаўнай, як у вайну, тады будзе парадак. А калі Паставы ўвялі талоны на хлеб, а Глыбокае ці Мядзель не ўвядзе — глупства несусветнае, яшчэ адзін прыклад безуладдзя, бездапаможнасці.

Міша атрымаў яшчэ адну прэмію — Ф'юджы — «человеку, чья деятельность в политической и общественной областях может служить исключительным примером борьбы за утверждение прав человека». Усталяваў права на чэргі для няшчасных жанчын нашых. Народ бадай жа аднадушна лічыць, што імперыялізм вельмі шчодра асыпае нашага лідэра ўзнагародамі, дабротамі. За што? Во пытанне, якое не дае спакою ні інтэлігенту, ні рабочаму, ні селяніну. За развал сацыялістычнай сістэмы? За развал Саюза? За развал эканомікі ўласнай краіны? Можна ўявіць, як Коль, Буш, Тэтчэр паціраюць рукі.

Яны такі выкарыстаюць раззбраенне на карысць сваіх народаў. А мы? Што дала, што дасць канверсія?

Будзем спадзявацца на здзяйснеине прэзідэнцкіх мер. Дай бог ажыццявіцца ім!

21 лістапада

Запомнілася, як мы сядзелі на Мінскім вакзале — прыехалі так рана, што не хадзілі яшчэ трамваі. З адным парусінавым чамаданам, вузлом. Бедна апранутыя. Як выкінутыя на бераг. Радыё перадало аб павышэнні цэн на паштовыя адпраўленні. Дробязь, а чамусьці ўстрывожыла Машу. У трамваі кандуктарка груба патрабавала аплату за чамадан, і зноў Маша ўпікнула мяне: «Хіба не ведаў, што за чамадан трэба плаціць?» А чорт яго ведаў, не ездзіў я з чамаданамі. А на кватэры новы сюрпрыз. Не гаспадыня — сястра нашага гаспадара (дом быў раздзелены паміж дзвюма сёстрамі, якія там жылі, і братам, які меў казённую кватэру),— настырная мяшчанка ўбачыла, што кватарантка цяжарная — каму хочацца мець немаўля за сцяной! — заўпарцілася: не пушчу. Але ж не яна гаспадыня. Дамоўленасць была з урачом, які аплаціў пакой на год наперад. Логіка такой малапісьменнай бабы дзіўная: «Давайце пісьмо ад урача». Быццам такі дакумент меў нейкую юрыдычную сілу. Мусіў ехаць назад да вакзала, дзе на вуліцы Талстога ўрач збудаваў уласны дом. Але паперка не спатрэбілася: Насці, гаспадыні, так спадабалася Маша, што яна ўпусціла маіх у пакой і нават дала прымус і каструлю згатаваць снеданне.

Пакойчык быў метраў дванаццаць з грубкай пасярэдзіне, што змяншала жылую плошчу — прастора за грубкай, каля дзвярэй, натуральна ператваралася ў кухню. А як сям'і без кухні? Але сябры прыходзілі да заключэння, што нам пашанцавала: пакой ізаляваны, ход з калідора, у такіх сялянскіх дамах рэдка была такая планіроўка. У першую ж ноч мы пазналі «шчасце» — нашэсце клапоў. Гэта было бедства. Жылі мы ў даваенны час, у вайну асабліва, з вошамі, блыхамі, клапамі. Але ж не было іх столькі, неяк змагаліся — травілі, мылі, чысцілі. А там нічога не памагала. Як ні травілі — клапы лезлі ва ўсе шчыліны ад гаспадароў дома, а тыя, па-мойму, змірыліся і ніякай барацьбы не вялі. Сапраўдным няшчасцем гэта стала, калі нарадзілася дзіця. Ножкі дзіцячага ложачка ставілі ў каструлі з вадой. Але і гэта не памагала: клапы, што «месеры», пікіравалі са столі, запаліш святло і бачыш, як ляціць у люльку пікіроўшчык.

Таццяна нарадзілася 8 кастрычніка — так доўга мы яе чакалі. Маша разбудзіла мяне гадзін у пяць раніцы, стаяла адзетая ўжо, проста сказала:

«Вядзі».

«Куды?»

«О божа! У раддом — куды ж!»

«Пехатой?»

«А дзе ты знойдзеш машыну?»

Я бадай спалохаўся. Для мяне гэта была тайна. А яна — спакойная: нараджала ўжо, да таго ж рабіла фельчаркай, сама прыняла, можа, сотню родаў, перад вайной многа нараджалася. Помню, як яна ашаламіла мяне яшчэ ў Пракопаўцы. Была зімовая раніца. Я галіўся тупой брытвай, збіраючыся ў школу. Маша гатавала снеданне, паліла печ. Заглянуў сусед, старшыня калгаса Літвінаў. Паклікаў фельчарыцу. Выклікалі яе так і ўдзень, уначы. Вярнулася яна мінут праз 15-20.

«Палі мне на рукі цёплай вады. Літвінаў вады не нагрэў».

«Што ў яго?»

«Прыняла ў Юлі роды. Хлопчык».

«Так хутка?» — здзівіўся я.

«Бывае і так хутка. А бывае, і суткі і двое пакутуе».

Удзень я пайшоў у раддом, Маша напісала: дачка. Не помню, як я жыў, пакуль Маша была ў раддоме, тады парадзіх трымалі дзён 12. Прагуляць у партшколе столькі дзён я не мог. Здаецца, памагала тая ж Насця: у Машы рэдкі талент ужывацца, дружыць з людзьмі. Запомнілася, як я доўга шукаў машыну, каб забраць Машу з раддома, не ісці ж з дзіцём пехатою. Прыехаў позна, калі ўсе ўжо выпісаліся, і жонка пакрыўдзілася, сапсавала настрой і сабе, і мне, сапсавала свята.

Быў я нядрэнным мужам і бацькам, але папрокаў ад жонкі меў нямала, у тыя бурныя гады пісьменніцкага і чалавечага станаўлення асабліва многа. І, безумоўна, слушных. Эгаізм маладога мужчыны рэч асаблівая, якую цяжка вытлумачыць, хоць можна апраўдаць.

Раніцою, павіснуўшы на трамвайнай падножцы, ехаў у партшколу, нярэдка з'яўляўся са спазненнем, толькі заступніцтва Кожара мяне ратавала ад кары, калі на мяне даносілі за прагулы і спазненні. Шэсць, а то і восем гадзін напружанай вучобы, у той час нямала і талмудыстыкі. Але я ўгрызаўся ў навукі на занятках, ведаючы, што дома рыхтавацца няма як — дзеці, няма калі — цягнула літаратура. Вырываўся з аўдыторыі і па дарозе дадому не мог, проста не мог не заглянуць у Дом друку, у рэдакцыі, не сустрэцца з калегамі — пісьменнікамі. Гэта што глыток свежага паветра, што чарка для п'янюгі. А за тым духоўным глытком ішоў і глыток матэрыяльны. Рэдка калі не спускаліся вясёлай кампаніяй уніз — у «шалманы», што акружалі Дом друку. Добра працаваў гандаль! А ў «шалманах» гарэлачка на

разліў, смажаная траска, вэнджаныя кілбасы, такія смачна-пахучыя, што глянеш — слінкі цякуць. Няма грошай — прадаўшчыцы даюць напавер: каманда надзейная, вядомая! І пайшло-паехала. Другая партшкола, другі універсітэт — бясконцыя спрэчкі аб жыцці і літаратуры. А час... о, як хутка ён ляціць у такіх кампаніях! Не аглянешся — ужо ноч. Валачэшся дадому, што вінаваты сабака. Гатовы падставіць галаву: бі, але не пілі. Усё роўна — слёзы, папрокі. Прымірэнне ў ложку. А раніцою баліць галава, зноў спазненне.

Маша ўрэшце не вытрымала, выставіла ультыматум: не перастану бадзяцца — паедзе назад, у вёску. Спалохаўся. Пачаў абыходзіць Дом друку, хоць цягнула туды нясцерпна.

Але самае дзіўнае, да неверагоднасці, што ў такіх умовах, пры такім жыцці я знаходзіў час пісаць — пачаў раман «У добры час». Во сіла маладосці!

...Учора правялі вечар памяці Андрэя, яму было б 70. Усяго. Я вёў і перахваляваўся — Раеўскі і Нікіфаровіч стварылі стрэсавую сітуацыю. Але ўсё прайшло добра. Парадавала аўдыторыя: вельмі ўважліва слухалі нас, пісьменнікаў, цёпла сустракалі акцёраў, якія ігралі фрагменты са спектакляў «Трыбунал», «Верачка», «Пагарэльцы». Не пастарэў Андрэй! Прагартаў яго пяты том. Здзівіўся, што ён нямала чаго запісваў, а здавалася, пісаць ке любіў — усё, акрамя п'ес, артыкул з яго не магла выбіць ніводная рэдакцыя. Выкарыстаў выпісы з тома ў сваёй прамове. Прагучалі. Прыкладаю іх да дзённіка.

Андрэй Макаёнак, 1946 год:

Страсть — вот необходимое, безусловное качество писателя, художника, любого деятеля искусства. Без этого качества немыслимо создать произведение искусства, без него немыслим талантливый художник.

Страстно жить: страстно любить и страстно ненавидеть, а значит, и страстно творить — бороться и утверждать. Вот что должно быть характерной особенностью человека — писателя.

1947

Бедны яўрэй усё жыцце верыў богу і скардзіўся яму ў сваіх малі'твах на дрэннае жыццё. Нарэшце ён вырашыў звярнуцца да яго з пісьмовай скаргай і папрасіць у яго хаця б рублёў трыста. Так і зрабіў. Напісаў пісьмо, паклаў у канверт і напісаў адрас: «На неба, Богу». На пошце рашылі, што тут нешта падазронае. Пісьмо накіравалі ў ГПУ. Там распячаталі, прачыталі і пасмяяліся. Хтосьці з работнікаў прапанаваў сабраць яўрэю грошы і паслаць. Сабралі.

Толькі не 300, а 150 рублёў, і адправілі. На канверце напісалі адрас яўрэя і зваротны: «На неба, Богу», а для пэўнасці паставілі штамп ГПУ. Атрымаў яўрэй грошы, узрадаваўся і рашыў падзякаваць богу. Напісаў, як і раней, пісьмо. Яно зноў трапіла да тых жа работнікаў ГПУ. і зноў яны распячаталі пісьмо і прачыталі: «Грошы твае, о госпадзі, я атрымаў, за што ад усёй душы дзякую. Толькі другі раз, калі будзеш пасылаць мне грошы, то не пасылай праз ГПУ, бо тыя машэннікі 150 рублёў свіснулі».

1949

Придумав бога, люди вынуждены были выдумать и дьявола. Иначе — идея бога теряла всякий смысл. Создать культ Сталина и обойтись без Берия — немыслимо.

1959

Секцыя драматургаў нагадвае каманду паруеніка, які трапіў у штыль. Няма ветру. У наш час, відаць, трэба пераходзіць на іншыя рухавікі, незалежныя ад ветру, каб можна было рухацца наперад нават і супраць ветру. Драматургічныя фрэгаты час абсталяваць рухавікамі ўнутранага згарання ці нават атамнымі, каб даследаваць усе шыроты, усе глыбіні чалавечага акіян-мора.

Маршал Бірузоў у кнізе «Советский солдат на Балканах» піша: «Вечная слава героям, якія загінулі за свабоду і незалежнасць нашай радзімы», А потым з горыччу заўважае: «Але вось прайшяі гады, і мы сталі забываць гэтую клятву...» Забываем таму, што абезасобілі салдат-герояў. Трэба было б так: «Слава табе, Кузьма (!ван, Сцяпан), ты аддаў жыццё за Радзіму!»

Была война. Подполье. Борьба. Риск. Провалы. Застенки. Гестапо. Пытки. Муки. Кровь. Смерть. Героика. Подвиги. Автор взял все это из жизни. Использовал в сценарии. Но имен не назвал. Подменил имена. Обворовал мертвых. Подло, бессовестно! Обидно, больно. Это же продолжение пытки. Это же — метод гестаповцев. К.— гад!!!

Безымянные герои подполья.

Безымянный «культ личности».

Безличная кукуруза, принесшая вред сельскому хозяйству.

Бюрократ — без должностей.

Разве можно терпеть это в литературе? Это же письма без адреса, и туда и обратно без адреса. Безадресная литература.

1960

Вярніцеся да Леніна! Па-сапраўднаму. Бо... Эксплуатуе словы і думкі Леніна нават Мао. А дух яго? Ідэя яго? Нашы кіраўнікі... Я паверу гэтым людзям тады, кал і яны ліквідуюць закрытый магазіны. Канверты былі? Іх замянілі, а не адмянілі. Гэта ж падкормка... Не — прыкормка. Як карасёў... Карасі-ідэалісты. Здорава, Шчадрын! Ты — маладзец!

1975

Почему же не нашлось человека, который бы выступил против Сталина так же, как он выступал против правых и левых оппортунистов? Видимо, только потому, что в силу определенного культурного уровня соратников ему нельзя было предъявить лобовых обвинений в «реставрации капитализма» или еще что-нибудь подобное. А понятие гуманности было далеким, чуждым. А ведь его антигуманизм, жестокость вредили делу социализма так же, как частная собственность, «реставрация капитализма».

1976

Гандаль — размеркаванне. Сталы заказаў. Што гэта? Не прозвішчы, а нумары. З-пад прылаўка. Кантроль немагчымы, а ўмовы для карупцыі, махлярства, подкупу — выключныя.

Вяртаючыся да імён памагатых у часы рэпрэсій... Памагатыя ці каты? Прш Ягода — нарком унутраных спраў. Берман — начальна будаўніцтва Беламорканала. Коган — начальнік будаўніцтва канала Масква — Волга; Фінкельштэйн, Біксон, Серпухоўскі і інш.— начальнікі буйнейшых канцлагераў.

1980

Шамякіну я прымерваю вусы, хахол запарожца. І... Смешна. І іншым прымерваю іншы характар. Выхілкі, манеры.

Пошук характэрнасці — у нечаканым «прыжыўленні» рысаў, якія ўласцівы зусім іншаму чалавеку, тыпу.

1982

Калі б навуку гісторыю выклікалі ў суд як сведку, то можна з упэўненасцю сказаць, што вінаваты будзе апраўданы, а невінаваты асуджаны на катаргу.

23 лістапада

У «Аповесці пра сябра» я пісаў пра наша жыццё, пра наш быт у гэтыя гады, і паўтарацца мне не хочацца, хоць ёсць многа дэталяў, якія не выкарыстаны ні ў дакументальных рэчах, ні ў раманах, аповесцях. Сказаць пра тое жыццё — «багема» — нельга. Мы не былі багемай у дэкадэнцкім разуменні, ды і блокаўскіх умоў у нас не было. Якая там багема ў тым пакойчыку, у якім, напрыклад, жыла мая сям'я! І ў тых «шалманах», дзе мы пілі! Смешна ўжываць гэтае слова. Багема — гэта заняпад, разлажэнне, пратэст, песімізм. А мы... мы перажылі страшэнную вайну, нагаладаліся, але выжылі, перамаглі, і ў нас была падвоеная... патроеная прага да жыцця, да ведаў. Мы буялі, як зеляніна вясной пасля доўгага дажджу, мы падбрыквалі, як нецелі, выпушчаныя з цёмнага хлява на вясновае сонца. Мы, канешне, бачылі гора, галечу, сірот, удоў. Але мы верылі, што жыццё наладзіцца. І яно такі наладжвалася.

Машы гэта падабалася, што так легка (магазін побач) можна накарміць малую, сябе — кармяшчую маці, мяне, бадзягу і працаўніка,— усё дзіўна пераплятала ся.

Гатаваць асабліва не было на чым: пару чыгункоў у грубку, больш не лезла, прымус у калідоры — холадна... Але паесці было што, зараз яна расказвае пра гэта, смяецца. Купляла ікру, лепшую кілбасу па 50-70 рублёў за кілаграм, булкі і... пляшку піва, між іншым, чаго не хапала ў зімовы час — малака, замяняла півам, выявіўшы, што яно добры малакагонны сродак. Не было ў нас ніякага люстра, не было як глянуць на сябе. Праз пэўны час пасля родаў пайшлі ў лазню, глянула Маша на сябе ў люстра, ахнула: «Ах, божа! Што гэта са мной!» Тоненькай былінкай была пасля нашай жаніцьбы. Такой і заставалася да з'яўлення Таццяны. А Таня расла што пампушачка. Добра харчавалася маці — добра расло дзіця. Малую палюбіў халасцяк Андрэй Макаёнак, і яна ў паўгода пазнавала ўжо яго і радасна цягнулася на рукі. Андрэй прыходзіў амаль кожную нядзелю, кожны святочны дзень. А побач кватараваў Аляксей Кулакоўскі. Маша разумела, што мне патрэбна «общение», і радавалася гэтым гасцям, не шкадавала ні часу, ні намаганняў, каб купіць, згатаваць. Часта да нас далучаўся Пятро Васілеўскі, які вучыўся ў Маскве. Ці хутчэй — мы далучаліся да яго: яго цешча Марыя Адамаўна, лепшая краўчыха, якая шыла жонкам міністраў, такія прыёмчыкі наладжвала — з шыкам, не па-студэнцку — па-панску. Самае дзіўнае, што мы нічога не баяліся, смела выказваліся. Хахмач Пецька часам такое ляпаў, што цешча яго ледзьве не траціла прытомнасць. А мы з Андрэем рагаталі. Наіўныя былі? Ды не, не сказаць! Мы проста лічылі, што на вайне заваявалі

сабе права на свабоду. Я, праўда, разумна асцярожнічаў — бацька дваіх дзяцей! А Андрэй і Пятро праязджалі нават зрэдку па Сталіну. І па Берыю, па Цанаву.

Андрэй паступіў у партшколу на год раней — у 1947-м. Помню гучную справу, у якой ён іграў першую ролю. Нехта Каліберaў, якога пасля Макаёнак «увекавечыў» у камедыі, вынюхаў, што слухач Дзялец Міхаіл Іванавіч, будучы старшыня Камітэта па друку, пры паступленні ў партыю на фронце скрыў, што ў калектывізацыю бацька яго «абкладаўся па цвёрдаму», лічыўся падкулачнікам. Мішу пагражала выключэнне са школы, з партыі. Андрэй рашуча выступіў у абарону Дзяльца — супраць групы каліберавых. Як распаліліся страсці! Бегалі ў ЦК, пісалі. Але большасць пайшла за Андрэем, у абарону Дзяльца. На сход прыйшоў Зімянін, другі сакратар ЦК. Успамінаюць яго ў Беларусі добрым словам. Быў рэалістам — у крыўду людзей не даваў, ратаваў нямала партызан. (Вытокі нянавісці Берыі і Цанавы да партызан патрабуюць даследавання, я гэта паспрабаваў зрабіць у «Ахвярах»: групы НКУС часта правальваліся, часцей, чым армейскія, і Берыя шукаў вінаватых — партызан: маўляў, яны «закладвалі» ці, ва ўсялякім разе, не падтрымлівалі, бо не любілі энкавэдыстаў. Логіка ёсць.)

Зімянін падтрымаў групу Макаёнка — Дзяльца ўратавалі. І Міхал пасля ўсё жыццё быў удзячны Андрэю. А так легка каліберавы маглі зламаць лёс чалавека.

24 лістапада

Безумоўна, у 1949-1950 гадах я не друкаваўся столькі, колькі ў год папярэдні — 48-мы. Бібліяграфія гэтага года займае больш за старонку, а гады вучобы — па абзацу. Аднак апрача таго што пісаў раман, першая частка якога называлася «Блізкі час», надрукаваў некалькі апавяданняў, большую частку якіх не ўключыў пасля ні ў зборы твораў, ні ў зборнікі. і зараз не помню, што такое «Складанае пытанне», «Залатыя агні», «Рэчы падказалі», «Падарунак».

«Блізкі час» я пісаў доўга — для таго часу, друкаваў па частках: першую — у 1951-м. другую — у 1952-м, трэцюю — у 1953 годзе. На яго было многа водгукаў. Дзіўна, што зараз ніводзін раман, аповесць — не толькі мае — не маюць такой прэсы, як тады. Адгукаліся не толькі рэспубліканскія, але і абласныя, раённыя газеты.

Ацэнкі рамана былі станоўчыя. Акрамя адной. Па першай частцы выступіў інструктар ЦК Епіфан Войніч і даказваў, што я чарню калгасную рэчаіснасць, азмрочваю характары. Лескавец — што за герой? Я прыняў рэцэнзію спакойна, як і выступление Лынь-

кова па «Глыбокай плыні». А зайздроснікі мае паціралі рукі: так яму і трэба, малады ды ранні, падрэзаў яго Войніч, гэта ж думка ЦК. Тады толькі так разважалі. Удзячны рэдакцыі «Полымя» — Танку, Карпаву, Іх не спалохаў Войніч, І яны надрукавалі другую і трэцюю частку «Блізкага часу». Не падабалася мне гэтая назва, і ў асобным выданні раман пайшоў пад назвай «У добры час» — іншы акцэнт, не вынік, пачатак: у добры час аднаўляюць людзі жыццё. Больш праўды і больш логікі. Пасля, пры перавыданні, мяне прымусілі выкінуць звенні — змянілася аграрная палітыка. А між іншым, у звяках было для таго часу рацыянальнае зерне: гэта зачаткі арэнднага падраду. Даць бы ім прастор — і гэта хоць трохі разняволіла б людзей, што, дарэчы, было і ў рамане, чаго спалохаўся партыйны функцыянер Войніч. Але нават гэтая самадзейнасць удоў і сірот некага спалохала. Гадоў трыццаць «У добры час» не перавыдаваў, не ўключаў ні ў адзін збор твораў, столькі ж не перачытваў і цяпер не помню ўжо калізіі, вооразы. А Віктар Каваленка — глыбокі літаратуразнаўца, галаваі — кажа, што дарэмна я выкінуў раман са сваёй біяграфіі: там праўдзівыя характары і атмасфера часу. Мае рацыю: любы твор, нават сярэдні, з'яўляецца дакументам эпохі. Ідэаяагічныя напластаванні лёгка адмятаюцца, а факты застаюцца — паводзіны людзей у пэўных умовах, быт. Афіцэр Лескавец, як. пабачыў Еўропу, прыязджае ў зямлянку, і пара гэтая гняце яго, яму цесна і душна, Гэта не спадабалася бяздумнаму артадоксу Войнічу, і гэта падабаецца ўдумліваму крытыку Каваленку.

Аб'ектыўныя крытыкі і чытачы ацэньвалі ўменне маладога пісьменніка нават пра калгас, яго людзей расказаць цікава, займальна, панарамна, напісаць запамінальныя характары. Але адбывалася дзіўная рэч: крытыкі, якія лічылі сябе заканадаўцамі моды, пісалі пра мяне ўсё менш і менш. Пра «Глыбокую плынь» яны напісалі больш, чым пра «Сэрца на далоні», пра «Вазьму твой боль», «Петраград...»... У чым загадка? Як ні сумна, але

трэба сказаць, што людзі гэтыя самі паддаваліся модзе і ўплывам. У адносінах мяне дзейнічаў механізм зайздрасці. О, гэта страшная рэч. Зайздросцілі калегі — празаікі, і яны ўплывалі на крытыкаў, ствараючы пэўную атмасферу.

У першыя гады мы жылі дружна, пасля пачалі разыходзіцца. Пра гэта я напішу, калі падыду да партрэтаў сваіх сяброў... былых. А тут толькі адзін прыклад зайздрасці, якая зрабіла чалавека ненавіснікам. Я пісаў пра Усевалада Краўчанку, як ён памог мне. Ён пачаў пісаць яшчэ да вайны і лічыў сябе ўжо мэтрам, класікам. Але прайшлі пяць-шэсць гадоў. Я выдаў два раманы, а ён — слабенькую аповесць, незаўважаную крытыкай, слабыя апавяданні, на большае пораху не

хапала. І лепшы сябра мой пачаў хмыкаць і ганіць маю творчасць. У мяне здзіўлена пыталіся: «Што ў цябе з Севам?» Нічога ў мяне не было. Я любіў яго, быў удзячны і перажываў яго адчужанасць. Канчаткова яго «даканала» прысуджэнне мне ў 1951 годзе за «Глыбокую плынь» Сталінскай прэміі. Для таго часу гэта была вышэйшая ацэнка, Краўчанка гэта разумеў, як ніхто. і чалавек, сын настаўнікаў, нават страціў звычайную прыстойнасць, так яго раз'ядала зайздрасць. Ён не толькі не павіншаваў мяне, але пры першай сустрэчы ў рэдакцыі ці СП — у калектыве нахабна, непрыгожа дэманстраваў, што не заўважае мяне, што такі лаўрэат для яго, «сапраўднага пісьменніка», не існуе. Шчыры Мікола Аўрамчык, які нікому не зайздросціў, хапаўся за галаву: «Ну, ніколі не думаў, што Сева можа такі» Праўда, да разрыву і варожасці не дайшло. Мая памяркоўнасць улагодзіла яго. Мы заставаліся сябрамі — для людзей. Але Усевалад не прамінуў выпадку зрабіць хоць дробненькую брыдкасць. Даходзіла да абсурду. У 1957 годзе я купіў «Волгу», першую, нават у СМ не было яшчэ, прадалі пробную партыю. Да таго ў мяне была «Победа». І ў Краўчанкі таксама. Спаслаўшыся, што яго машына сапсавана, ён папрасіў мяне даць «Победу» з'ездзіць на Палессе, да бацькоў. Я даў, бо разумеў, што адмова разарве дружбу канчаткова. Дык ён нават на машыне «адыграўся», за якія два тыдні разбіў яе так, як жулікаваты шафёр (я, дурань, гады два трымаў шафера) не разбіў, які зарабіў на маёй машыне на дом — неўзабаве збудаваў. Краўчанка вярнуўся з Палесся, калі ў мяне гасціў Віктар Вольскі, а мы дамовіліся, што я аддаю машыну Віктару — за сімвалічную цану. «Добрая ж машына, амаль новая». І тут заглянуў Сева, аддаў ключы. Глянулі мы з Віктарам на машыну і... заплакаць захацелася. У сю палескую гразь прывёз, нават не памыў. Я змаўчаў — у імя дружбы, а новы ўласнік «Победы» — Віктар моцна палаяўся з ім, сур'ёзна абвінаваціўшы: «Бесчестный ты человек!»

Пасля пры кожнай сустрэчы са мной Краўчанка злосна лаяў Вольскага: «Падумаеш — Герой! Наплюваў я на тваю Зорку!»

Мне прыкра пісаць гэтую непрыемную праўду пра чалавека, які трагічна скончыў жыццё. Нягледзячы ні на што, я да канца лічыў яго сябрам сваім і дагэтуль удзячны яму!

У 1961 годзе Краўчанка паехаў з першай турысцкай групай у Францыю і выкінуўся там з шостага паверха гасцініцы...

Пасля я памагаў сям'і Усевалада ўсім, чым мог: уладкаваў Еўдакію Емяльянаўну, дабрэйшую жанчыну, на працу ў СП, памог з кватэрамі ёй, дзецям, з выданнем небагатай спадчыны Краўчанкі. Нават парэкамендаваў А. Гутковічу дачку Усевалада Вольгу на невялікую ролю ў фільме «Атланты і карыятыды».

27 лістапада

Сюжэт па тэлебачанні: немцы збіраюць нам прадукты, пасылкі. Ажно ў галаву ўдарыла. Якая ганьба! Эфіопія! «Няшчасныя» немцы не знішчылі нас — дык вымушаны карміць. А справы ўсё горш і горш. Зніклі малочныя прадукты. У Мінску гадоў 25 не было перабояў з малаком, недзе ў сярэдзіне 60-х не хапала масла: запомнілася гэта, бо прывозіў масла з Масквы. Пасля ні разу не ўзнікала такая патрэба. Куды яно падзелася, малако? З калгасаў не магло не паступіць. Няма мяса (а дзе мяса?) — больш спажываюць малака? Настолькі, каб да 10 раніцы ў магазінах цэнтра горада не засталося пляшкі кефіру. Нейкае таямнічае знікненне. Дзе ўрад? Што робіць?

9 снежня

Аб XXXI з'ездзе КПБ. Аб адным факце, які красамоўна сведчыць аб настроі партактыву, аб адносінах яго да лідэра свайго — аўтара перабудовы. У самым пачатку раптоўная прапанова: запрасіць на з'езд Уладзіміра Бровікава. У ліку аргументаў: Аксёнава запрасілі, Кузьміна запрасілі... Кузьмін — член ЦК, членаў ЦК — мінчан усіх запрасілі. Я не здагадваўся, з якой мэтай запрашаюць Бровікава, пакуль у перапынку мне не растлумачылі. Здзівілі: Бровікава ў першыя? Што за фігура? Журналіст, які не адбыўся, партработнік — сакратар абкома, другі сакратар ЦК, старшыня Саўміна, пасол, 60 гадоў. Хворы: выразана нырка і яшчэ штосьці. Чым паказаў сябе? Быў паслухмяны выканаўца, як усе. Але ёсць у яго заслуга: год назад, будучы паслом у Польшчы, выступіў на Пленуме ЦК з крытыкай курса Гарбачова. І гэтага даволі, выходзіць, каб для многіх стаць героем. Трэба Ельцын! Яшчэ адзін Ельцын. Свой'Навошта? Каму ад гэтага была б карысць? Ініцыятары — віцябляне, землякі. Навумчык, сакратар абкома, кажа мне:

«Іван Пятровіч, вы маглі б выступіць у падтрымку Бровікава?»

«А ён што, сур'ёзна намераны балаціравацца?»

«Канешне».

«Нікога я не буду падтрымліваць. Прагаласую, за каго хачу».

«Шкада».

На другі дзень Бровікаў з'явіўся. І балаціраваўся. Не збянтэжыла і гісторыя з сынам: работнік КДБ, ён забіў міліцыянера, атрымаў шэсць гадоў.

«Я не згодзен з прысудам і падаў касацыю»,— адказаў бацька.

Але ж забіў чалавека, якія б ні былі абставіны! «Защищая свою честь»,— апраўдвае бацька. Страпяй у кожнага, хто назаве мяне дурнем, так? Такое разумение чэсці.

Вынікі першага тура: з 701 дэлегата за Бровікава прагаласавала 274, за Грыгор'ева — 52 (падлажылі віцябляне свінню свайму сакратару, я лічыў, што Грыгор'еў будзе ў першай двойцы), за Камая — 63, за Малафеева — 300.

Я ўпэўнены быў, што, пацешыўшы сябе, праверыўшы адносіны да сябе, чалавек здыме сваю кандыдатуру. Не. Куды там! Дрэнна я ведаю псіхалогію людзей гэтай катэгорыі, хоць многа і пісаў пра іх. А ўвогуле не такая ўжо яна і складаная,іх псіхапогія.

У другім туры Бровікаў набраў яшчэ больш галасоў — 293. Ход думкі партакратыі разумею, але апраўдаць гэтых людзей не магу: не рэалістычная, хутчэй эгаістычная палітыка, недарэмна бэнээфаўцы ім «вешаюць» сабак. Сюжэт! Яшчэ да з'езда ўзыходзілі парасткі замыслу: раман аб сённяшняй барацьбе. Ці п'еса? Не, раман! Злы.

...Ідзе снег. Першы. Як ён некалі хваляваў, першы снег! Старасць — гэта страта паэтычнага ўспрыняцця свету. Да аднаго хіба засталося замілаванне — да дзяцей. Маша і Славяна — шумныя раскідухі, але мяне радуе іх прысутнасць. Гуляючы па парку, любуюся маленькімі, што кормяць качак і вавёрак. І тымі, каго мамы возяць у калясках. Зазіраю ў каляскі, хоць і ведаю, што мамам гэта не падабаецца — баяцца дурнога вока. У мяне добрае вока!

Пішу, а за сцяной Славяна музіцыруе на піяніна, і мне гэта не перашкаджае. Наадварот — падганяе думкі. Снег і музыка.

12 снежня

Здзіўляюся дагэтуль, як асіліў, але партшколу я закончыў на «выдатна», дыплом з адзнакай. На працу мяне накіравалі ў ДБВ — дзяржаўнае выдавецтва, тады яно было адзінае ў рэспубліцы. Я ўзначаліў рэдакцыю мастацкай літаратуры, рэдакцыя, праўда, складалася з двух чалавек — я і вясёлы Мікола Татур. Самі рэдагавалі па некалькі кніжак, астатнія, усю паэзію, здавалі на пазаштатнае рэдагаванне. І такім чынам выпускалі, па-мойму, кніжак сорак у год. Многа! Маючы ў СП 60-70 членаў. І паліграфбазу — друкарню імя Сталіна, якая перажыла вайну. Па-мойму, ніводнай новай машыны не было. Але кніжкі выпускалі разы ў тры хутчэй, чым цяпер. Тая ж «Глыбокая плынь», здадзеная ў канцы 1948 года, у наступным годзе выйшла. Яшчз больш дзіўна, неверагодна — маладыя сёння не вераць — у тым жа 1949 годзе раман выйшаў на рускай мове ў «Советском писателе». Броўка парэкамендаваў яго «Новому миру», а там рабіла

магілёўская жанчына Соф'я Мазо, былая жонка Яўгенія Далматоўскага, у той час ужо жонка Аляксандра Караганава, тэатральнага і кінакрытыка. Пад псеўданімам С. Грыгор'ева яна стала маёй першай перакладчыцай, пераклаўшы 17 аркушаў месяцы за тры. У лютым здала пераклад — увосень выйшла кніга. Нармальнае праходжанне кнігі — як на Захадзе, у праклятых капіталістаў. Не магу ўцяміць: ад чаго гэта залежала? Ад беднасці на творы? Не сказаў бы, што ў нас не было чаго друкаваць, нават у нас, у Беларусі, дзе пасля 1937 года і вайны засталася жменька прафесійных літаратараў. Праўда, касяком ішлі мы, моладзь. Зараз вешаюць усіх сабак на партыю. Але, партыя вінаватая, што дала сябе ж знішчаць, што адзін дыктатар дыктаваў мільёнам сваю волю. Але — дзіўная рэч; на аснове сваёй біяграфіі, Мележа, Макаёнка, усяго ваеннага пакалення я раблю вывад: у ЦК пра нас дбалі, нас расцілі, памагалі. Безумоўна, і сачылі, каб мы не крывілі лінію. Але я пісаў ужо: вока, вушэй ДБ мы не адчувалі і выказваліся смела, незалежна. Не ведаю, ці было так усюды. Можа, у гэтым заслуга Панамарэнкі? У размове са мной у 1953 годзе ён сказаў, што не даў Цанаве перасадзіць партызанскіх камандзіраў і падпольшчыкаў. Аднак пасаджана было нямала. Большая заслуга Панамарэнкі ў клопаце пра нас, маладых творцаў. Ён любіў пісьменнікаў, мастакоў, акцёраў. Гэта перадавалася апарату. Пра нас ведалі. Нас чыталі. Гэта перадавалася такім апаратчыкам, як Броўка, Кавалёў: рабоце з маладымі аддаваліся сур'ёзна, уважліва. Для нас, новых членаў, Саюз пісьменнікаў рабіўся родным домам. Гэтую ўвагу да маладых працягнуў і я, калі стаў кіраўніком Саюза. І цяпер ужо сталыя літаратары ўспамінаюць наш клопат з удзячнасцю.

А цяпер маладымі не займаецца ніхто — ні ў саюзах творчых, ні ў ЦК, ні ва ўрадзе. Кінуты ў «рыначную» стыхію: плывіце, як хочаце, хто дужэйшы, спрытнейшы ці нахабнейшы, той выплыве. Не лепшая гэта палітыка, не дзяржаўная — пры адсутнасці выдавецтваў, выставачных студый, тэатраў, якія выступалі б як добрыя мецэнаты. Такая канкурэнцыя затубіць не адзін талент. Дарэмна маладыя радуюцца такой свабодзе. Для нармальнага росту дзіцяці трэба мама!..

Поспех «Глыбокай плыні» кружыў мне галаву. Здавалася, што я ўсё ўмею. Але хутка пераканаўся, што рэдактар я ніякі. За сцяной працавала рэдакцыя дзіцячай літаратуры, яе ўзначальваў Алесь Якімовіч. Ён даў мне перакласці Купрына «Белы пудзель». Вялікае апавяданне я адмахаў за колькі вечароў, так, паміж «шалманам» і гушканнем Тані.

Якімовіч цярпліва адрэдагаваў мой пераклад. Глянуў я — і кроў ударыла ў галаву. Ад сораму. Ад таго, што я яшчэ такі пачатковец.

Мае творы так не рэдагавалі, правілі, безумоўна, у часопісах, але ўсё ж не так — не тыцкалі ў нос, як далікатны Якімовіч. Нічога ён крыўднага не сказаў, для яго, старога рэдактара, гэта была звычайная работа. А мне дробны эпізод гэты перавярнуў душу. Па-першае, прымусіў па-іншаму, творча, паглыблена авалодваць мовай. Заняткі ў партшколе, чытанне Маркса, Леніна, Сталіна не пакідалі часу на літаратуру. Цяпер я ўглыбіўся ў Коласа, Чорнага, Лынькова, сваіх равеснікаў. Калі здаў трэцюю частку рамана «У добры час», Карпаў здзівіўся: «Расцеш! Хвалю!»

І другое, напэўна, я зразумеў... не, выразна гэта не вызначалася, але пытанне напэўна ўзнікла: а ці маю я маральнае права ўзначальваць выданне ўсяе мастацкай літаратуры? І менш чым праз год я перайшоў на іншую пасаду, рэдактарскую, але аднаго выдання — галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна» (пазней ператвораны ў часопіс «Нёман»). Хоць наўрад ці было матывам гэтае маё ўнутранае пытанне, была іншая аб'ектыўная прычына.

13 снежня

Якая прычына? Куды вёў ход думкі? За ноч забыўся. Ага, успомніў. У хуткім часе пасля заканчэння партшколы мяне паклікаў сакратар партбюро Ілля Данілавіч Гурскі на «сур'ёзную размову» і паведаміў, што ёсць думка выбраць мяне сакратаром. Па-мойму, стары схітраваў: хацеў вызваліцца ад гэтай нялёгкай для таго часу нагрузкі, а ківаў угору: «Ёсць думка». А я заставаўся яшчэ солдатам: слухаюся! Але, напэўна, і палесціла такая прапанова. І мяне выбралі. І я пацягнуў партыйны воз, і сакратар з мяне атрымаўся значна лепшы, чым рэдактар. Я апынуўся ў сваёй стыхіі: быў камсоргам батарэі, парторгам і камсоргам дывізіёна — штатная пасада, цягнуў за Калбеку партработу. Можа, арганізатар быў я не лепшы — мне арганізоўваць Коласа, Крапіву, Броўку, Танка? — але напісаць пратаколы ўмеў, а ў нас — не толькі ў той час! — аб рабоце мяркуюць па паперах, пісьмовых справаздачах.

Мне падабалася і ў выдавецтве — у гушчы пісьменнікаў, падабалася і ў Саюзе: сакратар партбюро быў фігура. І я гойсаў паміж Домам друку і вуліцай Кірава, дзе туліўся тады СП. Не помню дакладна, але думаю, што «Советская Отчизна» — гэта ідэя Броўкі, каб разгрузіць мяне для партыйнай работы. Магчыма, Паўла Кавалёва: былы работнік ЦК, Павел трымаў у сваіх руках усе «кадравыя пытанні», назначэнні членаў СП міма яго праходзілі хіба што ў Акадэміі, туды ён не дабіраўся. А якая гульня ішла пры назначэннях! Рэкамендацыі афармляліся рашэннем прэзідыума і партбюро — у

газеты, у Міністэрства культуры, у кіно, на радыё, у музей... Цяпер любы кіраўнік схадзіў бы з такой рэкамендацыяй у... А тады лічыліся, бо ведалі, што рэкамендацыя ўзгоднена там — у ЦК. Безумоўна, гэта быў «административный раж» Броўкі ці Паўла, але на аўтарытэт Саюза пісьменнікаў такая ўсюдыіснасць працавала моцна. З намі лічыліся. Чыноўнікі мусілі лічыцца. Іншымі сродкамі, але і пазней, калі фактычным кіраўніком — першым намеснікам, першым сакратаром — быў я, нам удавалася падтрымліваць гэты аўтарытэт на добрым узроўні, той жа Машэраў любіў з намі пагутарыць і лічыў сваім абавязкам памагчы пісьменнікам. Пазней аўтарытэт зніжаўся. Ці не дайшоў да нулявой адзнакі? І ў асяроддзі навуковай і тэхнічнай інтэлігенцыі, і ў асяроддзі рабочых, не кажучы ўжо пра чыноўнікаў, адзываюцца пра нас негатыўна, калі не сказаць больш — зняважліва. Але самае крыўднае: літаратуру нашу проста не чытаюць, не ведаюць. Дарэмна некаторыя авангардысты цешаць сябе, што робяць пераварот у змесце, у форме. Нікому гэта не патрэбна. ішла вайна — і Твардоўскага, Ціханава, Пракоф'ева, Суркова, Сіманава ды і Куляшова чыталі ў акопах. Цяпер, па-мойму, не чытаюць ні традыцыяналістаў, ні авангардыстаў. Нават перастаюць чытаць гарачую публіцыстыку — абрыдла. Людзі думаюць пра хлеб надзённы, якога ўсё менш і менш. А мы, «уладары думак», дзелім лаўры.

15 снежня

Учора адбыўся пленум ЦК КПБ. Мяне выбралі членам бюро ЦК. Шышка! Раней быў бы. А цяпер — лішні клопат, лішнія мазалі на задніцы. І адказнасць. Хоць за што адказваць? У тым і бяда, што партыя вызвалілася ад адказнасці за... хлеб, за мяса, за метал, за чаравікі і шкарпэткі. І за культуру. Але калегі мае будуць ківаць: у бюро — пісьменнік, няхай ваюе за мову, за выданні. А з мовай стала горш, чым было ў гады застою — сведчаць тыражы беларускай перыёдыкі, заказы на нашы кнігі, паэзія збірае ледзьве па 500 экземпляраў. Вось тут і жыві! Баюся, адсутнасць паперы загоніць беларускую літаратуру ў магілу.

Адно станоўчае: больш інфармацыі з першых рук, без пасрэднікаў, магчымасць глянуць на жыццё рэспублікі з пятага паверха. Калі хопіць сілы на раман аб перабудове, гэта спатрэбіцца — расшырыць панараму. Каб толькі здароўе. А яго мала. Часта перажываю цяжкія дні. Сасуды. Пазаўчора вельмі патана пачуваўся. Учора лепш. Сёння зноў качае, як на палубе марскога судна. Халадзееш ад думкі, што трэба пасадзіць сябе за працу на тры гады. Раней кожную новую рэч пачынаў з радаснай узбуджанасцю. А цяпер

узбуджаюць толькі ўспаміны; у іх акунаешся то як у гарачую, то як у халодную ванну.

Што запомнілася з дзейнасці на пасадзе сакратара партбюро?

Лета 1951-га. Не памыляюся? Бандзюга Кагановіч, які перад тым быў першым на Украіне, пачаў кампанію барацьбы з украінскім нацыяналізмам. Быў ён і ёсць на Украіне. А дзе няма? Але на гэты раз, безумоўна, не без згоды Сталіна ўдар наносіўся па тых, хто з Гітлерам ваяваў і, натуральна, апяваў родную зямлю. Карацей кажучы, пачалася шырокая кампанія — як працяг «Звезды» і «Ленинграда». Там быў запявалам Жданаў, тут Кагановіч. Мішэнню для першага залпу быў выбраны выдатны верш Уладзіміра Сасюры «Любі Украіну». Выступіла «Правда». Сігнал для пошукаў нацыяналістаў ва ўсіх рэспубліках.

Я, лапух, не адразу сцяміў, што да чаго, ажно пакуль не прыйшоў у СП і не ўбачыў вельмі ўзбуджанага Петруся Броўку. О, ён быў чалавекам вопытным, ён ведаў, з чаго кампанія пачынаецца і чым канчаецца. І ён выпрацоўваў стратэгію. Здаецца, ён паспеў ужо параіцца з Крапівой і Глебкам. Ва ўсялякім разе ў яго ўжо быў спісачак твораў, паэтычных, якія належала кінуць у гэты касцёр. Максім Танк пераклаў верш Сасюры. Броўка абураўся: «А навошта яму трэба было перакладаць такі верш?» Пры знешняй добразычлівасці яны ўсё ж раўніва адносіліся адзін да аднаго — Броўка і Танк. Але думаю, што Броўка не зларадніча ў, што Танк уліп, Броўка перажываў і за яго і за сябе, безумоўна, і за Саюз. Хачу верыць, што ён стараўся неяк нейтралізаваць падзеі, не даць кастру палыхнуць так, каб у ім нехта згарэў. Хопіць! Перажыў 1937 год. Пасаджаны быў цесць, цешча, швагер. Сам ледзьве ацалеў, ведаў, што на арышт Купалы, Коласа, яго, Крапівы, Лынькова, Глебкі, Самуйлёнка (Чорны ўжо сядзеў) быў падрыхтаваны ордэр; Панамарэнка ратаваў іх. Паводзіў сябе Броўка на гэтай бойні не героем, пра што я напішу. Тады я гэтага не ведаў. Але, аналізуючы зараз многія яго паводзіны, прыходжу да высновы, што некаторыя ўчынкі мучылі яго ўсё жыццё; ён выказаў гэта, паміраючы, калі я наведаў яго ў бальніцы. Тады, у 1951 годзе, ён стараўся адвесці бяду ад сваіх калег, але і хітраваў, што рабіў нярэдка. Хітруючы, падстаўляў пад удар маладога пісьменніка — мяне.

Ён пабег да Гарбунова, сакратара ЦК. І вярнуўся з «баявым заданием», хоць няма сумнення — гэта быў яго, Броўкаў, план, цяльпух Гарбуноў не дапяў бы да такіх дэталяў: як можна хутчэй, не адкладваючы, правесці адкрыты партыйны сход, і катэгарычна: «Даклад даручылі табе, Іван Пятровіч!»

Мяне абдало варам. Даклад на такую тэму — мне, маладому, галышу яшчэ! Акрамя кароткіх рэцэнзій, не пісаў я ў крытычным жанры нічога. І не ўмеў, ведаў свае магчымасці. Але палохала не гэта! Тэма! Па той увазе, якую надаваў ёй паважаны мною Пятро Усцінавіч, я пачынаў даходзіць да незвычайнасці сітуацыі. Страшна было абвінаваціць без віны вінаватых. Ды каго? Людзей, на якіх маліўся, на творчасці якіх вучыўся, каго лічыў сваім настаўнікам?

Не ўмеў я адмаўляцца, як цяперашнія маладыя, не так мы былі выхаваны; Броўка ведаў, чым узяць: вырашыў ЦК. Ён супакойваў мяне: «Не бойся. Мы табе паможам. Калектыўна вырашым, якія творы «падсасюрыць»,— настрой у яго яўна ўзнімаўся, ён пачаў жартаваць.

16 снежня

У той жа дзень паехалі ў Дом творчасці « Каралішчавічы», дзе адпачывалі Крапіва, Куляшоў, Лынькоў. Прыхапілі мудрага Пятра Фёдаравіча Глебку — надзейная апора. Сабраліся на палянцы, як падпольшчыкі,— далей ад пісьменніцкіх вушэй, каб загадзя не ведалі. Пачалі раіцца, каго «падсасюрыць». Безумоўна, Танка. Нікуды яму не дзецца: пераклаў «Люб! Украіну». Броўка падкінуў уласкы прыродаапісальны верш — «без адзнакі, без ідэі». Даваў прыклад аб'ектыўнасці і самакрытычнасці. Яго тактычны ход падтрымаў Глебка: «Бяры, Іване, і мой».

Не помню, як гэты верш называўся, але помню: абсалютна нейтральны і даўні — ці не даваенны яшчэ?

Кандрат Крапіва ахвяраваў байку і нават падказаў, як яе ацаніць. У вогуле, ён, акадэмік, падкідваў тэзісы даклада, хоць я не сцяміў і наўрад ці выкарыстаў яго мудрасць: сказаць так, каб нічога не сказаць, каб нікому не балела. Для гэтага трэба было мець яго, Крапівы, вопыт.

Аднак адчувалі, што «паліва» мала. Глядзелі на Куляшова, Лынькова: дайце! Яны маўчалі. У іх не было безыдэйных твораў. І Броўка не вытрымаў: «А я ўзяў бы і нядаўнія Аркадзевы «Зямля і неба», «Зямля і мора».

Куляшоў пабялеў, яўна спалохаўся. Ён у сто разоў лепш, чым я, неабстраляны, разумеў, што значыла трапіць у гэтую драбілку. Адна справа лёгкія прыродаапісальныя свістулькі. Зусім іншае — новыя вершы з прэтэнзіяй на філасофію, дзе некаторыя радкі можна вытлумачыць, як хочаш. Ведаў паэт, як умелі тлумачыць. Можа, і не ведаў, што ўмею я, але адчуў, што сапраўдны аўтар даклада Броўка, я — выканаўца. І Куляшоў рашуча запярэчыў, каб «падсасюрылі» яго.

Броўка ўзарваўся:

«А што ты хочаш — быць святцей за нас?»

І яны счапіліся. Прыгадвалі старыя крыўды. Я ўпершыню ўбачыў, каб два сур'ёзныя пісьменнікі, паэты, так сварыліся. Пра даўнія крыўды яны казалі так, што я мала што разумеў, пасля хіба ўведаў іх сэнс. Глебка паспрабаваў іх мірыць. Але Куляшоў сказаў штосьці крыўднае і яму. Пятро Фёдаравіч без дыпламатыі паслаў яго... Крапіва хмыкаў. Лынькоў таксама маўчаў, толькі на твары яго адбівалася пакута, твар крычаў: «Пасаромейцеся, хлопцы!» Пасля я неаднойчы бачыў на яго твары гэтую пакутлівую грымасу.

Так мы і разышліся, не скончыўшы пералік твораў, якія належала аплываць толькі таму, што Кагановіч пачаў новую кампанію за ідзйную чысціню савецкай літаратуры.

Выпівалі ў сталоўцы. Без Куляшова, зразумела. І без Лынькова. Броўка абураўся супраць абодвух.

«Лынь маўчыць, як праведнік. Калі пашукаць у яго рамане безыдэйшчыны, дык хапае яе там».

«Не залазь глыбока, Пятрусь. Не выберамся»,— папярэдзіў Глебка. Ён і Куляшова пачаў абараняць, і яны з Броўкам бадай што пасварыліся.

«Ліберал ты, Нонік!»

Але так яны сварыліся ледзьве не ў кожным застоллі — гарачы, узрыўны Пятрусь і спакойны, разважлівы, памяркоўны пад любой чаркай Пятро.

Карацей кажучы, нарада тая не толькі не памагла мне, але ўнесла яшчэ большы сумбур, няўпэўненасць і... страх перад адказным дакладам. Пакутліва я пісаў яго. Да знямогі. Ночы тры — да світання. Перачытваў зборнікі, шукаў безыдэйныя творы, знайшоў у Бялевіча, у Астрэйкі, яшчэ ў кагосьці. Але мала знайсці, трэба ўпісаць у даклад так, каб і «сена было цэлае, і коні сытыя». Гэтую задачу я разумеў, уласна, старыя яе падказвалі, нават той жа трапяткі Броўка, які ўзваліў на мяне тое, што павінен быў зрабіць сам. Хоць, безумоўна, было, не хаваю, і жаданне паказаць сябе перад класікамі не дурнем — першы даклад! І які! Ды гэтае жаданне астудзіў Андрэй Макаёнак, ён параіў:

«Ты не вельмі выкладвайся. Гэта той выпадак, калі чым слабей даклад, тым лепш будзе людзям. Ды і табе».

І я зрабіў такі даклад. Сход прайшоў бясшумна, хоць сядзеў на ім сам Гарбуноў. Былі ў дакладзе і цытаты з «Зямлі і неба». Але Куляшоў змаўчаў. (Гадоў праз 15 на падпіцці выказаў крыўду: «Ты крытыкаваў мяне па ўказцы Броўкі, ён хацеў знішчыць мяне». Так, тэрміналогія ў таго пакалення была такая — знішчыць. На шчасце, у

нашага пакалення была іншая псіхалогія: «Чым слабей даклад, тым лепш...»)

Забыцца на мой даклад пісьменнікам памог крытык Бур'ян. Неўзабаве ён выступіў у «ЛіМе» з артыкулам на цэлую паласу. Назваў тыя ж творы, што называў і я. Але як разнёс іх! З якім пафасам!

З якімі эпітэтамі! Гаварылі пра яго артыкул. Былі і такія, што смакавалі: «Добра ён выдаў гэтаму «класіку» Бялевічу».

Разумная частка пісьменнікаў асуджала Бур'яна, безумоўна, паміж сабой, у вузкіх застольных кампаніях.

«Падсасюрванне» абышлося без ахвяр, з сінякамі.

19 снежня

Учора праходзіў вечар, прысвечаны 80-годдзю выдання «Песень жальбы». Падзея ў час адраджэння нацыянальнай культуры! Але барацьбіты за гэтае адраджэнне ніяк не зрэагавалі на гэтую падзею. З'явілася чалавек 20, не пісьменнікаў, пераважна супрацоўнікаў музея. Вінаваты арганізатары — СП, Дом літаратара. Выступалі старыя «коласаўцы», удзельнікі ўсіх падзей, звязаных з жыццём і творчасцю класіка нашай літаратуры: Максім Лужанін, Янка Брыль, я, Даніла.

Не толькі на вечары, думаў пра гэта і раней, што маё сакратарства дало мне магчымасць больш, чым каму з маіх равеснікаў, сустракацца з Коласам.

Я пісаў пра гэта, часта расказваў. Але і ва ўспамінах і ў выступлениях перад школьнікамі мы, усе, ствараліідэальны вобраз Песняра, пісалі ікону. А ён быў чалавек звычайны, толькі з божым дарам. З яго, праўда, і пры жыцці, пасля вайны, якраз жа ў той час, калі я сустракаўся з ім (асабліва да смерці Сталіна) ствараліі звышчалавека. Такой пашанай заліваўся хіба Горкі, што, па-мойму, укараціла яму жыццё. Тое ж і з Коласам. Чалавеку не было і 70, а яго — як у шкарлупіну пасадзілі і гэтым ізаляваліі ад бурнага пасляваеннага жыцця. На сходы нашы не хадзіў, маладых не ведаў. Ды і ў Акадэміі віцэ-прэзідэнт з'яўляўся на гадзіну-дзве і пісаў там трэцюю частку трылогіі, паэму «На шляхах волі», якую даследчыкі ўспамінаюць, але рэдка дэталёва разбіраюць. Чамусьці пра такі рэжым народнага паэта асабліва клапаціўся Броўка. Стыль эпохі — мець свой культ? Такое разумение абавязкаў старшыні Саюза? Ці Броўку падабалася такая пашана і ён рыхтаваўся заняць месца Коласа?

Броўка сказаў:

«Трэба з'ездзіць да старога і прыняць членскія ўзносы».

Ва ўспамінах я далікатна маніў, што Колас быў хворы, пра чалавека ў такім узросце заўсёды можна сказаць, што яму нядужыцца,

ведаю па сабе. Усё астатняе — праўда: хваляванне маё, няведанне, пра што гаварыць (не быў я ў маладосці такім гаваруном, як цяпер). Ды! Колас быў з катэгорыі такіх жа маўчуноў. Праўда і тое, што стары і малады як бы ажывіліся і паразумеліся, калі на яго пытанне я адказаў, што ў мяне трое дзяцей. Мабыць, да таго паэт з псіхапогіяй селяніна прымаў мяне, як хлапчука, блазнюка, а тут прыняў як мужчыну, галаву сям'і, гаспадара. Тады знайшліся тэмы для размовы. Какстанцін Міхайлавіч паклікаў пакаёўку. Цікавая, між іншым, дзяўчына. У мяне склалася ўражанне, што стары як бы баяўся яе.

«Дзіцятка, ходзь сюды, наверх».

«А што вам трэба?» — крычала яна знізу.

«Падай ты нам што-небудзь закусіць».

«Ай, усё падай ды падай!»

Але стол накрыла багаты.

І мы добра выпілі. Тады развязаліся языкі маўчуноў — і ў старога, і ў маладога. Так паўтаралася, бадай без выключэнняў (разы два ён сапраўды быў нездаровы, ляжаў у ложку), кожны мой прыход, кожны месяц чатыры гады. Пад канец была розніца. Старому забаранілі піць. Даніла пільна сачыў, каб бацька не парушаў рэжым. І мы часам пілі, як «падполышчыкі»,— без паслугі, без добрай закусі, пад акраец хлеба і цыбуліну.

Можа, тады я зразумеў, як трагічна адзінокі ён — пры ўсёй пашане начальства, калег. Помню, Маша панікавала, калі я казаў, што ў маім дзённым плане — паход да Коласа.

20 снежня

Уважліва слухаю з'езд народных дэпутатаў — аб становішчы ў краіне. Уражанне: Гарбачоў у нечым спяшаецца (у развале сацыялізму), аў іншым — як накарміць народ — спазняецца. Гаварыць пра гэта трэба было два гады назад, не спадзявацца на авось. Ды і цяпер яго клопат больш не пра тое, як накарміць, а пра ўмацаванне ўлады прэзідэнта. І тут спазніўся. Уладу ў яго вырваў... Ельцын і рэспубліканскія князі, якія ідуць за Ельциным. А гэты лідэр нахрапісты. Выступіў ён пагрозліва, у яго больш прадуманых хадоў, як у Каспарава. Перайграе ён Мішу. А калі яшчэ яго выберуць прэзідэнтам Расіі... — цэнтру хана. Злосць кіпіць мая на абодвух: дбаюць пра амбіцыі свае, а не пра народ, не пра краіну. А становішча крытычнае, раўназначнае лету 1942 года, калі Гітлер дапяў да Волгі, да Сталінграда, выйшаў на Каўказ. Дзе сілы, каб спыніць цяперашняга ворага?! Парадаксальна, але абодва, Гарбачоў і Ельцын, акружаюць сябе людзьмі з аднаго і таго ж лагера: якаўлевы — у цара Міхаіла,

паповы ў цара Барыса. Што ж ім хочацца — пайграць? Ці гаспадар яшчэ не вызначыў, на каго ставіць? Ідзе прыкідка, прымерка? Ох, як трэба трэці, незалежны. Славянін з вялікай літары, які б здолеў навесці парадак. А так доўга нас будзе ліхаманіць. Гарбачоў у заключным слове згадзіўся на рэферэндум аб зямлі. І зноў кідаецца, як у прорву: хутчэй, у лютым, да пасяўной! А народ збіты з толку пісакамі. Можа прагаласаваць за прыватную ўласнасць. І — што? Развал калгасаў. І — голад. Поўны. Як у Эфіопіі. Ніякімі пасылкамі нас не накормяць. Халадзееш ад такой перспектывы. Работа валіцца з рук. Можна зразумець псіхалогію людзей: няма перспектывы — няма стымулаў. Між іншым, толькі ў калгасах яшчэ працуюць. Узбунтуем гэтых кармільцаў — складвай лапкі. А з трыбуны з'езда выступают,ь палітыкі, вучоныя гародзяць лухту, далёкую ад рэальнага жыцця (бывае лухта і блізкая). Лепш за ўсіх іх выступіў радавы шахцёр данецкі. Святлей робіцца на душы, што простыя людзі ўрэшце зразумелі, хто ёсць хто: хораша шахцёр урэзаў «вялікаму тэарэтыку» Якаўлеву.

Ці данясе хто-небудзь будучым пакаленням нюансы гэтай д'ябальскай барацьбы? Перапляценне сіл больш складанае, чым у 1917 годзе. ЦІ знойдзецца новы Ленін? Ці прыйдзе Карнілаў — Піначэт? Адно безумоўна: Гарбачоў — Керанскі. Праўда, ёсць «тэарэтыкі», якія даказваюць, што, каб застаўся Керанскі, Расія была б ужо другой Амерыкай. Да чаго яшчэ дагаворымся?

21 снежня

З'езд — грандыёзны спектакль. Заява Шэварднадзе аб адстаўцы — дэмарш, яўна падказаны — калі не знешнім рэжысёрам, то сваімі ўнутранымі яўна. «Дэмакраты» пачалі вытыхацца. Не такі запал. Трэба было ўпырснуць ім пад хвост шкіпінару. Пырснуў грузін. Заварушыліся. Адразу выцягнулі на трыбуну цяжкую артылерыю — Лігачова. Але старая пушка. Кінуўся Бурлацкі. Ды збіць «рэакцыянераў» нялёгка. «Дэмакраты» палохаюць дыктатурай, Шэварднадзе ціснуў на гэта, ён палохае не нас — свет, «сяброў» нашых цяперашніх. Дыктатура дрэнна, але Напалеон ратаваў Францыю і праславіў яе, нягледзячы на свой фінал. Чорт не браў іспанію пры Франка. Нашы аператары знялі фільм пра Чылі і ўсім, што апынулася на плёнцы, сцвярджаюць: пры дыктатуры Піначэта краіна дасягнула эканамічнага росквіту. Парадоксы. Грымасы гісторыі. Во так! «Что день грядущий мне готовит?» і цікава, і страшна.

Акунаюся ў мінулае.

Колас. Ва ўспамінах пра яго я адзначаў: шкадую, што не запісаў нашы размовы. Можна пашкадаваць. Лужанін запісваў, хоць не

здаецца мне, што ў кнізе сваёй сказаў праўду: стварыў гэткі ж ідэалізаваны вобраз, як і ўсе мы, грэшныя, і зараз выступаем на такіх вось сустрэчах, як юбілей «Шесень жальбы», і лъём сіропчык, нават такія жорсткія рэалісты, як Брыль, Панчанка. Што было запісваць? Пра літаратуру ён наогул не любіў гаварыць, ды і не ведаў ён яе, навейшай літаратуры. Не, можа, і ведаў, але не ўсё прымаў. Абыходзіў размову пра Броўку. Любіў аднаго Глебку. Але мудры Пятро адышоў ад паэзіі — бадай не пісаў, хоць у вайну напісаў, на маю думку, найлепшыя вершы. Безумоўна, стары мудры чалавек выказваў нямала цікавага. Расказваў. Але ў большасці гэта мінулае, якое мала цікавіла мяне. Ды і якім педантам трэба быць, каб запісваць звычайныя застольныя гутаркі? І калі? Вяртаўся дадому цёпленькі. Сварыўся з Машай. А назаўтра кідаўся ў імклівую плыньжыцця: раман, работа, новыя сустрэчы.

Пры жыцці Сталіна Колас не гаварыў на палітычныя тэмы, хіба толькі пра безгаспадарчасць у калгасах. «Ездзіў, браце, учора ў Балачанку. Пад самымі Пухавічамі, за гародамі, дагэтуль грэчка няскошана. Што там за гаспадары! Пазваніў у ЦК».

Палітыкі стары баяўся. Не, пасля смерці Сталіна гаварыў. Асабліва пасля XX з'езда. Ён, член ЦК, першы прачытаў даклад Хрушчова. Прыехаў у «Каралішчавічы» (дарэчы, пасля смерці Сталіна ён стаў больш дэмакратычны: нярэдка прыязджаў у тыя ж «Каралішчавічы», каб выпіць чарку з намі, маладымі, зрэдку адпачываў там).

Быў узбуджаны вельмі. Помню, сказаў:

«Хлопцы, якога ж тырана мы цярпелі!»

Толькі ў гэтым годзе, месяцы два назад, я зразумеў усю глыбіню трагедыі, якую перажылі і ён, Колас, і Купала. 1 не ў 1937 годзе — значна раней: у 1930-м; Цяперашні старшыня КДБ Шыркоўскі прывёз у СП і «ўрачыста» перадаў з архіваў камітэта дакументы таго часу: пісьмы Купалы, з іх адно, перадсмяротнае, напісанае пасля рашэння разлічыцца з жыццём, і пісьмы Коласа ў ЦК. Цікавыя дакументы! І хвалюючыя. Купала адмаўляе ўсе абвінавачванні і клянецца, што ён верна служыў народу, партыі, Колас каецца. Асуджае сваю нацыяналістычную творчасць. Закрэслівае лепшыя творы, у тым ліку шэдэўр «Новую зямлю». Пісьмо — крык спалоханага і разгубленага чалавека. Балюча чытаць яго. Цікава: шчыра пасля гэтага яны славілі Сталіна? А ёсць жа вершы ўзнёслыя, пранікнёныя.

24 снежня

Парушыўся сон. Засынаю перад тэлевізарам. Засынаю, лёгшы спаць апоўначы. А гадзіны праз тры прачынаюся і пакутую гадзіны

дзве-тры. І лезуць у галаву змрочныя думкі. І аб лёсе краіны. І аб сваім уласным. Наведваюцца думкі пра смерць. З'яўляліся яны і раней, але не былі такімі... як тут сказаць? — «осязаемыми», ці што?.. грувасткімі, як валун,— не зрушыць ніякай філасофіяй, ніякім гумарам. Андрэй некалі пра смерць гаварыў з гумарам, але ставіў цвёрдую задачу: дажыць да 80. І верыў, што дажыве. Я ведаў гэта і тым трагічней прыняў яго раптоўную смерць.

Маша кажа, што не баіцца смерці. Не веру. Усе мы людзі, і кожнага з нас палохае небыццё, Хочацца быць! Быці заўсёды. Разумееш, што фізічна гэта немагчыма, і імкнешся быць у справах сваіх, у памяці блізкіх, нашчадкаў. Шчаслівы той, хто застаецца ў памяці народнай. Мы, пісьменнікі, шчаслівыя: нас могуць забыць, але нас не выкідаюць, як палітыкаў. Гэта — з начных думак. І ад гэтага робіцца страшна. Кнігі нашы прасякнуты ідэалогіяй, якой мы служылі, але па сутнасці сваёй, па сюжэтах і характерах яны глыбока гуманныя, чалавечныя. Антычалавечнасць — аплёўванне чалавека і гісторыі, прыйшла з «свабодай» сённяшняй. Што пішуцы Што паказваюць! Жах! Страшна за дзяцей. А камусьці гэта трэба — зрабіць людзей жывёламі. І як па-шарлатанску ідэолагі сучасныя ўмеюць падмяніць «понятия».

25 снежня

Праблемы ў БелСЭ. Малады Малашэвіч носіцца з ідэяй вын гнаць пенсіянераў.

«Дык пачынай з мяне»,— пажартаваў я.

Далікатнічае, жартуе, а сам, ведаю, спіць і бачыць сябе галоўным. Ох, людзі! Я гатовы пайсці сам. Хопіць. Ä разлічыць адразу 15 чалавек, некаторыя выдатныя работнікі,— мне цяжка, ды яшчэ абвясціць пра гэта пад Новы год.

Во яны, прычыны бяссонніцы старога пісьменніка: становішча ў краіне, у рэспубліцы, у сваёй установе, боль за людзей. А мог бы пісаць... пра каханне. Ды не пішацца пра каханне...

30 снежня

Канчаецца год — цяжкі і неспакойны. Чым парадуе год Новы? Напішам яго з вялікай літары — з прымхлівай пашанай. Прадчуванне: радасці будзе мала. А трывог і клопатаў — як ніколі.

Забраліся ў лес, у Дом творчасці «Іслач»: Маша старая, Маша малая, Славяна, я на ўсе школьныя канікулы — дзеля іх, малых. Прыгожы лес, бераг Іслачы. Выпаў снег, мокры, праўда. Я выбіраў некалі гэтае месца, пачаў будаўніцтва. І ганарыўся нашым домам. Сёння

баліць: і тут прыкметы запусцення. Баюся, што будзе горш: Літфонд не мае грошай на датацыю, усё захапілі бурлацкія, «апрэлеўцы».

Здавалася, што з'езд дэпутатаў канчаецца аптымістычна: усе выказаліся за дагавор. І раптам апошні акорд «за ўпакой»: інфармацыя міністра фінансаў, панічны енк Гарбачова. Ельцын тарпедаваў эканамічнае пагадненне.

Тут гавораць бабы, якія ўсё ведаюць, што Беларусь першая, калі не лічыць прыбалтаў, павышае цэны на ўсе асноўныя прадукты і тавары. Вось табе і навагодняя радасць!

Сяджу перад акном, гляджу на лес. Харошыя сосны. Цудоўна ўздзейнічае лес. Была ў нас з Коласам роднасць душ: дзеці леснікоў, мы любілі лес. Ён бадай жа штодня хоць на гадзінку выязджаў у лес. Калі з Лужаніным — палілі касцёр, бралі чарку, грэшнікі. Колас заглядваў у «Каралішчавічы» да Лынькова, Глебкі. Свата свайго Маўра не любіў. Той такі быў занудлівы, у яго быў цяжкі гумар, зусім іншы па якасці, чым, напрыклад, у Глебкі, які валодаў надзвычай прыемным гумарам; з ім заўсёды было весела. Такі ж народны гумар меў Антон Бялевіч, але розніўся ад Глебкі тым, што пад чаркай рабіўся зласлівы і хамаваты, лёгка мог абразіць чалавека. Пасля сам перажываў, каяўся, прасіў прабачэння. А выпіваў — зноў тое ж. Колькі разоў мы з Броўкам ратавалі яго. Броўка, абураны, неаднойчы абвяшчаў: «Усё. Апошні раз! Яшчэ адно такое хамства — выключым з Саюза!» Антон пацеў, уздыхаў, як апоены конь, кляўся: усё, завязвае. Ды дзе там! Броўка разоў колькі выносіў справу Бялевіча на прэзідыум. Але Антона ратавалі. Нават такія праведнікі і цвярэзнікі, як Вітка: «метал гром и молнии», а прапановы даваў мяккія. Антон быў фальклорны тып, Несцерка, яму ўсё даравалі. Аднак пра яго яшчэ я, магчыма, напішу. Цяпер — пра Коласа.

Здараліся кур'ёзныя сітуацыі. Праверыў райком уплату членскіх узносаў. Недаплата. У партарганізацыі СП — нярэдкая з'ява. Хтось не ўлічвае падатак, хтось не праверыў, калі паступіў ганарар з выдавецтва на ашчадную кніжку, хтось нечаканы ганарар хацеў скрыць... Не ад партыі — ад жонкі. Але ў большасці выпадкаў гэта драбяза. Скланялі нас на канферэнцыях і пленумах нярэдка. А тут унікальны выпадак: Колас не даплаціў узносы з 50 тысяч. Нават райкомаўцы разгубіліся. Забыўся дзед? Не праверыў? У яго тады выходзіў Збор твораў.

Праблема: як сказаць пра гэта старому? Прашу Броўку: «Пятро Усцінавіч, вам усё ж прасцей выканаць гэтую місію». Не хоча. «Не буду я казаць! Ты сакратар, ты і скажы». Сакратар-то сакратар, але

40 гадоў розніцы ва ўзросце. Дыстанцыя! Усё ж умаліў я Броўку. Сказаў той.

Упершыню Колас пазваніў сам, ніякіх лішніх слоў, адно: «Іван Пятровіч, дык прыязджай, браце»,— зразумела без слоў, з якой мэтай мой нечарговы візіт.

Увайшоў я ў кабінет. Колас за сталом над рукапісам. А на краі стала ляжаў пачак грошай і партбілет. Лаканічна:

«Дык вось»,— кіўнуў на грошы і білет. Ніякіх тлумачэнняў. І ўвогуле ніякіх размоў, ніякіх пачастункаў. Маўляў, на, бяры і хутчэй каціся адгэтуль. Быццам я вінаваты, што яму прыходзіцца выкладваць паўтары тысячы. Мяне ажно ў жар кінула. Узяў я ціхенька грошы, запісаў у ведамасць, у білет за бягучы месяц. І — дай бог ногі. Адчуваў сябе без віны вінаватым. У наступны раз ішоў у дом пад соснамі і ногі трымцелі. Не, Колас, як звычайна, гасцінны, уважлівы. Просіць:

«Ты, брат сакратар, правярай, а то я магу і забыцца».

А як я магу праверыць? Хоць пасля не саромеўся параіць яму падумаць, дзе былі публікацыі.

Хадзілі легенды аб яго скупасці.

Не, Колас не быў скупы, ён быў па-сялянску ашчадны, нялёгкай, як і продкі яго, працай зарабляў свой рубель. Араў і сеяў.

Па сваёй натуры Канстанцін Міхайлавіч быў гасцінны чалавек. У яго ўзросце я не ведаю роўных яму па гасціннасці. Я ў свае 70 у параўнанні з ім — жмот, скупярдзяй. Праўда, час іншы і магчымасці. На вячэры ў яго доме я першы раз напіўся: упадабаў каньяк «Двин», які да таго не піў, не ведаючы, што ён градусаў на шаснаццаць мацней за стандартныя напіткі. Балявалі дні тры, а гэта ж 3 лістапада — дзень нараджэння. Потым 7 лістапада, свята. Высокі госць з Украіны Максім Рыльскі да 6-га не прасыхаў, ледзьве яго пасадзілі ў вагон у чужых галёшах. Гулялі, што казакі.

І вось як узнікалі легенды аб скупасці.

Толькі 15 лістапада, пасля афіцыйнага юбілейнага вечара і прыёму, вырваліся павіншаваць высокага юбіляра артысты тэатра, які носіць яго імя. Ехалі з Віцебска на аўтобусе — 300 вёрст. З адмысловымі падарункамі. Глыталі сліны, смакуючы багаты пачастунак, ехалі ж добрыя пітакі — Ільінскі, Шэлег, Шмакаў, маладыя тады яшчэ, дужыя.

Колас прыняў падарункі, адрасы, падзякаваў і... паспяшаўся адпусціць гасцей без застолля. Растлумачыць учынак практычнага старога чалавека чым іншым немагчыма — толькі знясіленасцю, нядужасцю.

Натуральна, акцёры плявaліся, прапіваючы камандзіровачныя ў буфеце калег — тэатра Купалы.

Андрэй і расказаў мне, як абураўся гарачы Ільінскі. Андрэй асуджаў старога. Я абараняў, я ведаў яго лепш, сустракаючыся штомесячна.

У маім уяўленні Колас застаўся шчыра гасцінным чалавекам. Але ашчадным. А гэта якасць разумная. Дагэтуль ходзіць сярод апаратчыкаў анекдот. У Коласа ў магазіне вьщягнулі грошы, і ён здзівіўся: «Няўжо гэта ёсць яшчэ людзі, якім трэба грошы?» Злосны анекдот, не ў адносінах нават да Коласа, у адносінах да ўсіх нас, летапісцаў: што мы вось так уяўлялі жыццё і так пісалі яго. Пісалі, сачынялі оды аб выдачы зарплаты без касіра. А практыкавалі ж такую дурноту бюракраты. А журналісты і пісьменнікі славілі высокую свядомасць працоўных. А працоўныя гэтыя цягнулі ўсё, што дрэнна ляжала, у некаторых калгасах палавіну ўраджаю расцягнулі. Мне расказваў сакратар Хойніцкага райкома: да Чарнобыля прыязджалі з Гомеля, з Мазыра, Рэчыцы на «Жыгулях» і вывозілі ледзьве не ўсе пачаткі кукурузы, якія там, на мяжы з Украінай, паспявалі да той кандыцыі, калі іх можна было варыць і прадаваць на рынку. Паспрабуй сарваць гэты пачатак у амерыканскага фермера! У любога прыватніка любой дзяржавы. Прыватная ўласнасць свяшчэнна. Крытыкі сацыялізму, нашага, які мы доўга будавалі, маюць рацыю. Дзяржаўнае — нічыё, і ў гэтым бяда, даказваюць сучасныя разумнікі. Але ў дзяржаўным — наибольшая сацыяльная справядлівасць. Між іншым, не толькі ў нас. А ў нас гэта ў псіхалогіі людзей. Гэта дае тую роўнасць, якая, па логіцы, яднае людзей. Нашы дурні ідэолагі ніколі не ўмелі гэта выкарыстаць. І ўся бюракратыя. З-за сквапнасці сваёй і некультурна^яны рабіліся злодзеямі. На высокіх пастах, як Брэжнеў,— буйнымі, на нізкіх — дробнымі. А трэба была элементарная сумленнасць, трэба трымацца запавету: не ўкрадзіі

31 снежня

Апошнія дзве старонкі заш'су за 30-га напісаў сёння, не стаў разрываць разважанні пра Коласа. Непрыкметна перайшоў на час сённяшні, калі ўсё, чаму маліліся, рушыцца. Пачынае палохаць, што шмат хто гэты развал гаспадаркі краіны прымае як натуральны працэс. Мой сябра Пятро Васілеўскі нават з гумарам. Яму можна пазайздросціць: і ў свае 68 гадоў ён не пазбавіўся гумару.

2 студзеня 1991 года

Сустрэлі яго, Новы, у катэджы, дзе жылі Васілеўскія. Закусь небагатая, а шампанскае і гарэлка былі. Атрымалася хораша, пасямейнаму. Пятро, падвыпіўшы, быў у сваім амплуа — гумарыст. Заўсёды забаўляла яго якасць — да ўсяго адносіцца скептычна, лёгка. Мяне забаўляла, Андрэя, вялікага гумарыста, часта злавала Пецькава легкадумнасць. У Андрэя гумар быў заўсёды сацыяльны, значны. Пятро быў і застаецца надзвычай начытаны чалавек, а творча нейкі бясплодны, за ўсё браўся — рэжысуру, прозу, драматургію — і ні ў чым не пакінуў хаця б скандальны след. А мог. Мог тады напісаць з іроніяй. Не напісаў, не паставіў у кіно.

Збіраецца на днях паехаць у Дубулты.

«Зімой на Балтыку? Што будзеш рабіць? Пісаць?»

«Не. Пагляджу, як яны будуць аддзяляцца. І пісаць не буду. Навошта?»

«Чым жа займацца?»

«Чытаць».

Перачытвае ўсё. Разумна можа выказацца аб прачытаным — з тым жа гумарам. Скептычна ставіцца да ўсіх прарабаў перабудовы — правых, левых. А сын яго, таксама Пятро, мастак па адукацыі, журналіст па рабоце, супрацоўнік «ЛіМа», у палоне лявацкага псіхозу. Ім здаецца, што толькі яны могуць перабудаваць Беларусь. Носяцца з ідэяй Балтыйска-Чарнаморскай федэрацыі. «Чушь собачья», — коратка вычарпальна і ахарактарызаваў ідэю Пятро-старэйшы.

Выступае Гарбачоў з навагоднім віншаваннем. Васілеўскі-малодшы:

«Праз год нас Пазьняк будзе віншаваць».

Я параіў малодшаму журналісту (якога д'ябла малады — пад 40):

«Пятро, не стварай сабе куміра. Мы стваралі — і расчароўваліся».

Яны, «дэмакраты», такія ж рабы — гэтак жа ствараюць сабе ідалаў.

Успомнілі Андрэя. З Васілеўскім мы часта ўспамінаем яго, яны ж сябры юнацтва, маладосці. У Пятра часам прарываецца крыўда: Андрэй жорстка расправіўся з сябрам за яго скептычнасць у адносінах да некаторых п'ес, хоць што да «Лявоніхі», з-за якой яны моцна пасварыліся, Васілеўскі меў рацыю, не прымаючы камедыю сур'ёзна. Кан'юнктурная рэч. Тут Андрэя падвяло яго захапленне пражэктамі Машэрава.

За навагоднім сталом мы спрабавалі змадэляваць: якім бы мог быць Андрэй у наш час?

Актыўны дзеяч свайго кірунку, лічыць Пятро. Я не ўпэўнены: ужо ў 60 ён быў стомлены чалавек і... лянівы — да пісання і прамоў. Ні публіцыста, ні трыбуна з яго не было б у 70. Камедыю напісаць мог бы. Але камедыі і раманы, як і паэзія, пагоды не робяць, народ не ўзнімаюць. Што з сённяшняй літаратуры — пры анархічнай свабодзе! — усхвалявала хаця б маладых крыкуноў? Пашумелі вакол «Дзяцей Арбата» і... вытхнуліся, нікога гэта ўжо не цікавіць. І русафільскія сачыненні не цікавяць.

На расійскім з'ездзе У. Карпека, прачытаўшы «Санет» Вазнясенскага: «Бог спит, спать, спать, спать, телефон опять — общепит? блядь», хораша сказаў: на такія вершы рэцэнзія можа быць толькі з аднаго слова: «Херня!»

Не, не быў бы Андрэй лідэрам новай партыі. Як не будзе ім ніхто з нашага пакалення — ні старой адзінай партыі, ні любой новай. Лідэры павінны яшчэ вырасці! Іх няма. Такіх, што здолелі б павесці народ.

Не навагоднія думкі. Але адкуль узяць іншыя? Можна пераказаць толькі разважанні калег пра развал эканомікі, размовы жанчын пра цэны — якія яны будуць у новым годзе. Моладзь балявала да знямогі. Калядавалі ў тры, шумелі да шасці раніцы. Хоць якая моладзь? Панізнік, Рагойша... Сапраўды маладыя, між іншым, не вылазілі на людзі — пілі ў сваіх норах. Маладыя Адамчыкі выціснулі нават бацьку, плюнуў Чэсь на гады свае і паехаў пісаць пятую частку бясконцага рамана. Усе з прэтэнзіямі на эпапеі — Чыгрынаў, Сачанка, Адамчык, Далідовіч... Шчаслівыя людзі: іх мала хвалюе, што нас перастаюць чытаць. Вось табе і адраджэнне! На чым адродзімся? На публіцыстыцы Сідарэвіча, пісьменніцкіх сынкоў — Тараса, Дракахруста, Васілеўскага.

4 студзеня

Ёсць падзеі, перыяды жыцця, якія запомніліся надзвычай ярка, а ёсць кавалкі ў некалькі гадоў — што правалы, ямы, напісаць пра гэты час амаль немагчыма — пуста. Ці, можа, трэба пісаць раней, як Талстой «Детство», «Отрочество»... Я помню апошні курс тэхнікума. Але ці не таму, што было каханне і даўно напісана «Непаўторная вясна». Нічога, здаецца, асаблівага не адбылося ў 1945-1948 гадах у Пракопаўцы, але звычайныя падзеі, што адбываліся ў калгасе, у сельсавеце, у школе, помняцца з храналагічнай дакладнасцю. І людзі. Яны стаяць перад вачамі. Безумоўна ж, таму, што ў маладым узросце, праз дзесяць — пятнаццаць гадоў, напісаны «Мост». Пра практыку ў Росі не пісаў, але добра гэта помніцца. Мурманск, пачатак вайны не

выбіць з памяці. «Агонь і снег»? А потым Петразаводск і Германія. А Кандалакша (а гэта ж два гады) — правал, ніводнай яркай падзеі. Таму і «Зеніт» пачаўся з Анежскага возера. Баржы нашы не бамбілі. Але застаўся ў памяці страх — усе мы баяліся бамбёжкі на вадзе, і не хавалі гэтага ні афіцэры, ні салдаты. А ўзрыў грубкі быў, дзяўчыну раніла... І тэатр быў. І абстрэл грузавіка на шашы, толькі мы пад'ехалі пазней. Дарога ад Петразаводска да Познані напісана з дакументальнай дакладнасцю. Дзіўна, чаму яна гэтак запомнілася? Незвычайнасцю адносін паміж людзьмі? У незвычайных абставінах людзі дзіўна раскрываюцца.

Выдатна помню і першы пленум СП у 1945 годзе і ўсе наступныя прыезды ў Мінск. І першыя гады жыцця ў Мінску, пра што я падрабязна напісаў. Але зноў жа — ці не таму, што пісаў пра гэта раней?

А ёсць гады бляклыя, яны зліваюцца і расплываюцца, што масляністыя плямы. Як ні дзіўна, такімі мне здаюцца другая палавіна пяцідзесятых, шасцідзесятыя. Дзіўна таму, што гэта былі гады хрушчоўскай адлігі. Не, калі пакорпацца ў мяшку памяці, то са старога хламу можна выцягнуць антыкварыят падзей. Аднак найлепш звязвае ланцуг падзей паслядоўнасць успамінаў, калі звяно чапляецца за звяно.

«Отчизна» мяне не грэла, не любіў я чытаць чужыя рукапісы, рускамоўных аўтараў было безліч, і нямала сярод іх яўных графаманаў. Здаецца, у пачатку 1953 года я звольніўся, перайшоў на вольны хлеб. Цяпер думаю, што гэта ад самаўпэўненасці, ад перабольшання сваіх творчых магчымасцей: пражыву з ганарару. Сталінская прэмія як бы давала гарантыю. Не лічу разумным свой крок. Андрэй пакінуў «Неман» (тая ж былая «Советская Отчизна»), калі яму падбіралася пад шэсцьдзесят і ён стаў саюзнапрызнаным драматургам, атрымоўваў збораў ад спектакляў па 5-8 тысяч у месяц. А са мной адбылася метамарфоза: пастарэўшы, я баяўся пакідаць службу, не меў упэўненасці, што пракармлю сваю вялікую сям'ю з ганарару. А сям'я расла: у 1950 годзе нарадзіўся сын Саша. Трое дзяцей!

6-студзеня

Аднак вольным тварцом я быў нядоўга, толькі паспеў пачаць «Крыніцы». У 1954 годзе Броўка выбіў адзінку намесніка старшыні праўлення і прапанаваў мне заняць гэту пасаду: за чатыры гады майго партыйнага сакратарства ён угледзеўся ў мае арганізацыйныя здольнасці, ацаніў адданасць справе. Броўка чалавек супярэчлівы, але ў падборы памочнікаў сабе ён рэдка памыляўся, тут у яго быў нюх. Думаю, акрамя ўсяго, яму падабалася мае паважлівае стаўленне да

старэйшых, у тым ліку, канешне, і да яго. Гэта была не толькі мая асабістая якасць. Не, мы, ваеннае пакаленне, бадай усе былі такія. Акрамя п'яных выбрыкаў Бялевіча і, пазней, сумбурных і бяздоказных наскокаў на старэйшых Карпюка — «чыханне ім на лысіны», як назваў гэта Крапіва, адказваючы Карпюку. Я не магу назваць ніводнага свайго равесніка, які б сапраўды чыхаў на лысіну не толькі Коласу, але і таму ж Броўку, Глебку, Лынькову, Крапіве, Танку, Куляшову, Гурскаму нават (пра творы яго, бачачы іх слабасць, рэдка хто адзываўся абразліва — паважалі чалавека, салдата). На што ўжо востры на язык быў Макаёнак, але і ён ні на каго са старэйшых не чыхнуў, як гэта робяць маладыя сёння — ніякіх аўтарытэтаў не існуе! Што гэта было? Ад чаго ішло? Ад выхавання ва ўмовах культу, у арміі, на вайне? А можа, ад павагі да тых, хто, па сутнасці, стварыў яе, беларускую літаратуру,— пры ўсіх чалавечых і творчых слабасцях гэтых стваральнікаў?! Мы адчувалі, што СП адзіны нацыянальны астравок у моры стыхіі, якая гатова была праглынуць рэшткі карабле крушэння. У нас нямнога было іншых магчымасцей змагацца за беларускую культуру, як падтрымліваць тых, хто ўцалеў у бурах, падтрымліваць адзін аднаго. Сцвярджаю: ваеннае пакаленне разумела гэта лепш, чым, між іншым, даваеннае пакаленне (перасадзілі адзін аднаго), чым пазнейшыя пакаленні і сённяшнія «дэмакраты» — змагары за адраджэнне нацыі, якія не проста чыхаюць — плююць на нас, ветэранаў, хоць мы намнога ўжо старэйшыя, чым былі ў тыя гады Броўка, Лынькоў. Міхасю Ціханавічу ў 1954 годзе было 55.

7 студзеня

«Пазнейшыя пакаленні» — гэта тыя, каму сёння ўжо пад 60, і яны самі востра перажываюць тое, чым захапляліся яшчэ гадоў трыццаць назад. «Гуманісты» гэтыя зрабілі нямала, каб укараціць жыццё Броўку, напрыклад, якому і без іх выпала за жыццё — на дзесяцярых хапіла б. Праўда, не толькі людзі азмрочвалі яго жыццё. Час. І яго ўласны характар. Парадаксальна — яго залішняя актыўнасць. Сапраўды, чалавек гэты быў вельмі супярэчлівы. Працаўнік, добры кіраўнік — для Саюза пісьменнікаў, уважлівы да людзей, дзелавы, актыўны, дакладны да педантычнасці. Многа зрабіў для пісьменнікаў. Шчыра дбаў пра развіццё літаратуры з разумением яе значэння ў комплексе нацыянальнай культуры. Умеў наладжваць кантакты з начальствам — для справы і... для сябе. Даволі яму было падкінуць ідэю, якую ён прымаў, і калі запісаў на вузенькай палосцы паперы і па~ лажыў у верхнюю кішэню пінжака,— можаш лічыць, што пытанне будзе вырашана, нягледзячы, ці гэта агульная ідэя,

глабальная, што тычылася літаратуры, тэатра, кіно, калгаса, завода, ці асабістая просьба чалавека, калегі ці выбаршчыка, якога ён першы раз бачыць. Вельмі часта было так. Пагаварылі напярэдадні, абмеркавалі чарговую просьбу ў ЦК, Саўмін, гарком. Назаўтра прыходжу позна на работу (Броўка нікога з пісьменнікаў, што служылі ў СП, не прымушаў прыходзіць раней дзвюх гадзін. «Раніцою, хлопцы, пішыце»,— быў яго наказ. Мудры наказ!), гляджу на шэфа і бачу, што ён радасна-ўзнёслы.

«А я ўжо пабываў у Кірылы Трафімавіча... (у Пятра Міронавіча, у Кісялёва, у Рудака) і ўсё вырашыў».

Выходзіў рана на прагулку і лавіў патрэбнага кіраўніка на падыходзе да ЦК — не траціў час на перагаворы з памочнікамі.

У Броўкі быў жорсткі рэжым працы і адпачынку. Ён нязменна паднімаўся ў шэсць раніцы, нязменна пры любым надвор'і гуляў. На працы не затрымліваўся. Размовы — абы бавіць час — не вёў. Жыў так, быццам яму не хапала часу. Але нікуды ніколі не спазняўся. На поезд прыходзіў за паўгадзіны. Неаднойчы ў Маскве абурана кідаў нас з Глебкам, марудаў, у гасцініцы і ехаў на вакзал сам, адзін. За такую звышакуратнасць ніхто на яго не крыўдзіўся, яна дысцыплінавала тых, хто рабіў з ім побач. Расслабляўся ў добрым застоллі. Вось там часу не шкадаваў. Выпіць любіў. На падпітці неяк зусім па-іншаму раскрываўся. Гаварун ён быў і цвярозы, але пад чаркай успамінаў тое, пра што ў іншай абстаноўцы наўрад ці сказаў бы. Маленства любіў успамінаць. Прачула гаварыў пра маці, якую спалілі ў Асвенціме, пра сваякоў і вяскоўцаў. Песні спяваць любіў. Але калі Броўка заспяваў — маўчы, не перашкаджай. І калі ў размове яго перапынялі — лёгка крыўдзіўся, што дзіця. Нават Крапіва, далікатны маўчун, не адважваўся перапыняць Пятра Усцінавіча. Адзін Нонік меў на гэта права; на Глебку Броўка не крыўдзіўся. (Між іншым, і адзін і другі весела расказвалі, як іх бясконца блыталі — Броўку і Глебку. Пятро Фёдаравіч паказваў кнігу, падараваную Багданам Чалым. Украінец. Два дні піў на дачы Глебкі і напісаў на развітанне: «Друзі маему Пятрусёві Броўкі, на дачы якога» і... г. д.)

4 студзеня

Памёр Кандрат Крапіва. Апошні з магікан. Два месяцы не дажыў да свайго 95-годдзя. Адпакутаваў дзед. Жыццё яго было нялёгкім, калі не сказаць больш. Удзельнік колькіх войнаў: першай сусветнай, грамадзянскай, фінскай, Айчыннай. (Між іншым, двойчы яго ратаваў Панамарэнка — у 1938-м, калі ўжо гатовы быў ордэр на арышт Купалы, Коласа, Крапівы, Лынькова, Броўкі, Глебкі... на восем

чалавек, і ў 1939-м ці ў пачатку 1940-га, калі яго прызвалі; назначылі камандзірам роты, і часць прыбыла на Карэльскі перашыек, уступіла ў бой. Крапіву раптам адазвалі — пастараўся Панамарэнка. А ўрэшце, можа, і трэці раз ратаваў — у Айчынную; не без ЦК КГ1Б усіх вядомых пісьменнікаў парабілі газетчыкамі, а пасля адклікалі ў распараджэнне Штаба партызанскага руху.)

Але жыццё яго было цяжкім не толькі ад войнаў. Загінуў на фронце сын. Пасля школы, паступіўшы ва універсітэт, цяжка захварэла дачка Людміла, рана памерла ад рака жонка Алена Канстанцінаўна, гадоў трыццаць назад, пры нас ужо, у «Каралішчавічах» яна была патроншай нашых маладых жонак, вучыла іх розуму.

Крапіва, безумоўна, з'ява ў беларускай літаратуры. Заканамерна яго месца побач з Купалам, Коласам. Талент унікальны, рэдкі — камедыйны. На выгляд чалавек змрочны, маўклівы, ён валодаў надзвычайным дарам бачыць людзей, падзеі праз кантаслуп смешнага, іранічнага, сатырычнага пераламлення. Яго байкі 20-х гадоў стралялі. А пасля камедыі. Для мяне і дагэтуль з'яўлйецца загадкай напісанне, а тым больш пастаноўка «Хто смяецца апошнім». Не мог ён не ведаць, што над ім вісела пагроза. І раптам у 1938-1939 гадах такі твор! Ці гэта вынік зігзагаў сталінскай палітыкі: завінціць — адпусціць? Матывы і звышзадача аўтарская цікавілі і Макаёнка. Ён падбіваў мяне пайсці да старога і пагаварыць на гэтую тэму, выклікаць на шчырасць. Але не сабраліся. Стрымліваў характар Кандрата Кандратавіча: не верылі, што ён адкрыецца, не выказваўся ён аб тым часе ні пры хрушчоўскай адлізе, ні пазней, калі ўсе нямала сказалі. Не выказваўся нават у вузкім коле — Броўка, Глебка, мы з Андрэем. Глебка і Броўка ўспаміналі. Крапіва маўчаў.

Мужным крокам быў і «Мілы чалавек» — камедыя аб вайне, аб жуліках на вайне. На гэты раз камедыю «прыхлопнуў» той жа Панамарэнка: знялі спектакль з трэскам, пастановай бюро ЦК. Можа, гэта і выбіла сатыру з Крапівы. І ў сваёй творчасці і ў ацэнцы з'яў у літаратуры, творчасці маладых ён зрабіўся залішне артадаксальным, партыйным. Такім жа быў у навуцы на пасадзе віцэ-прэзідэнта АН. Там ён быў службіст, і яго доўга трымалі, прыходзіў на работу і актыўна займаўся справамі нават тады, калі аслеп. А пайшоў на пенсію — пакінуў за сабой пасаду ў Інстытуце мовы і рэдагаваў руска-беларускі слоўнік на слых: рэдактарка яму чытала, а ён правіў. Яснасць розуму захаваў да апошніх дзён. На Кастрычніцкае свята мінулага года, атрымаўшы ад Крапівы паштоўку, пасаромлены, што не напісаў яму, я пазваніў. Зоя Мікалаеўна передала яму трубку, і мы

колькі мінут абмяркоўвалі нялёгкае становішча ў краіне; дзед быў у курсе ўсіх падзей.

Апошняя іскра вясёлага таленту бліснула, калі Крапіве пераваліла за 80. Ён сачыніў «Браму неўміручасці». Помню, камедыя друкавалася ў «Звяздзе», і я штораніцы чуў Машын смех — чытала чарговы нумар і рагатала. Спектакль у тэатры Купалы, на жаль, не стаў такі вясёлы. Маша была вельмі расчаравана, калі паглядзела. «Не Крапіва»,— сказала. Сапраўды — больш Раеўскага, які не столькі асмейваў, колькі аплёўваў. А каго калі смяшылі пляўкі? Брыдка, нясмешна.

Доўгае, трагічнае (яго смех адцяняў гэтую трагічнасць), яркае і... сумнае жыццё. А напісаць пра Крапіву, мне ў прыватнасці, нават кароткі ўспамін цяжка. Не пускаў ён нікога ў сваю душу. Жыў, як у панцыры. Чым абумоўлена? Характерам? Розніцай ва ўзросце? Ці — найбольш верагодна! — абставінамі жыцця? Часам здавалася, што чалавек гэты нікому не верыць, і толькі розумам, не сэрцам, падтрымліваў нармальныя адносіны з усімі — такія, якія дыктавала жыццё.

Мне пазванілі, каб выступіў на паніхідзе, і я, сорамна прызнацца, пабаяўся: што сказаць? Адмовіўся, а цяпер перажываю.

10 студзеня

Пахавалі Крапіву. Высахлы, як мумія. Алена Васілевіч на гэтае маё паведамленне сказала: «Не трэба столькі жыць». Можа, сапраўды не трэба?

Расказвае Зоя Мікалаеўна, нявестка. На Новы год яшчэ падняўся да стала і выпіў чарачку каньяку. Задыхацца пачаў 5 студзеня. Але спытаў урача А. М. Драко (ён расказаў): «А можа, мне лепш хадзіць, а то цяжка дыхаць».

«Ён не памёр,— сказала на памінках Зоя,— ён адышоў: ціха заснуў і не прачнуўся».

Але перад тым... як заснуць, былі яго апошнія словы: «Скажыце Ноніку і Ніне...» Глебкам!

Але што сказаць — не дагаварыў. Апошняя ўспышка памяці высветліла з небыцця старога сябра і земляка (вёскі побач), які адышоў на 21 год раней, будучы на дзевяць гадоў маладзейшым. На загадцы смерці выраслі ўсе рэлігіі. Адукаваныя людзі прымушаюць сябе верыць, што там, на тым свеце, жыццё працягваецца. І, мабыць, ім лягчэй ад гэтага. Безвыходнасць, марнасць, непатрэбнасць жыцця — ад усведамлення, што з жыццём тваім усё канчаецца. Філасофія ідэалістаў: першаснае — сознание, дух: свет існуе, пакуль існую я. А дух вечны. Адгэтуль — бог. Але трэба было апраўдаць і матэрыяльнае жыццё, злучыць яго з Духам. Адсюль Ісус Хрыстос.

15 студзеня

Жыву палітыкай. Усе так жывуць. Але і да палітыкі трэба «хлеб насущный». А яго не хапае... Хлеб, дзякуй богу, ёсць. Але да хлеба... Мяса на Камароўскім рынку — 20 рублёў.

Набліжаецца юбілей. Маша ўжо не спіць начамі — думае, як правесці гэтае свята. Смешна называць 70 гадоў святам. Ад афіцыйнага вечара адмовіўся. А што зрабіць? Расшчодрыцца на п'янку ў кафэ СП? Дык і гэта няпроста арганізаваць — ні гарэлкі, ні прадуктаў. Учора звярнуўся да старшыні райвыканкома, каб купіць гарэлкі і віна. Уніжэнне. І для мяне. І для яго. Хоць наўрад ці адчуў ён гэта, яму, можа, нават палесціла, што звяртаецца народны пісьменнік з гэтакай просьбай, да таго ж яму гэта звыкла — не адзін я прашу, здараецца, людзей вымушае няшчасце, а ёсць нахабнікі, якія так і жывуць — вось такім даставаннем, для іх гэта ўніжэнне — задавальненне, гульня, спорт. З пляшкі гарэлкі, кавалка кілбасы, якія нельга купіць нармальным шляхам, пачынаюцца махінацыі, павязка людзей не агульнымі справамі, работай, а даставаннем, камбінацыямі — «я — табе, ты — мне». Часам сумленныя людзі не заўважаюць, як іх усмоктвае балота. А што казаць пра яўных злодзеяў! Крадзеж усюды і ўсяго робіцца нормай. Што такое нашы прэміі, якія мы зарабляем не павышэннем прадукцыйнасці, а павышэннем цаны на кнігі, умением выбіць папёру, каб даць новы тыраж «Энцыклапедыі маладой сям'і»? Доім, што карову, адну ходкую кнігу. І так паўсюдна. Але гэта драбяза ў параўнанні з тым, як нашы мільярды апынуліся ў швейцарскім банку («Комсомольская правда» за 12/1). Во крадзеж! Увесь свет нас абірае!

А вось факт «дабрачыннасці», расказвае Алеся: сястра іх супрацоўніцы атрымала ад немкі, з якой перапісваецца, пасылку: мяшочак сухароў, кулёк цукерак, кулёк... солі. Пражывём на такой міласэрнасці! Няўжо адукаваныя немцы не ведаюць, што соплю мы можам засыпаць усю Еўропу! Пахаваць пад соллю.

16 студзеня

Перажыў Броўка многа. Тым больш здзіўляла яго надзвычайная актыўнасць, скіраваная на самаўзвышэнне.

У 1937 годзе пасадзілі яго цесця, вядомага беларускага дзеяча М. Рыдзіеўскага, саслалі цешчу, іх сына Ігара, які жыве дагэтуль. У вайну немцы знішчылі маці, сястру. Брат Сцяпан апынуўся ў палоне. (Між іншым, Сцяпан быў супрацьлегласцю свайму славутаму брату: дабрэйшы чалавек, якому нічога не трэба, праўда, у яго не было дзяцей, і ў адным хіба быў грэшны — любіў чарку. Вельмі можа быць, што да такой філасофіі яго прывёў палон. Расказваў з гумарам, што ратавала

яго тое, што ён навучыў свайго майстра немца з Рурскай шахты гнаць самагонку, той пад сваю адказнасць браў яго з лагера дадому для работы... і падкармліваў.)

Не адзін Лынькоў (пры яго адносінах ён мог быць неаб'ектыўным), але і іншыя пісьменнікі (Гурскі, напрыклад) расказвалі, як панікаваў Броўка ў пачатку вайны, вельмі баяўся акружэння, рэдакцыя трапляла ў такую сітуацыю. Але пазней паводзіў сябе роўна, спакойна, упэўнена. Баязліўцам не быў. Пра абстрэл і бамбёжку Навабеліцы расказваў з гумарам. На другі ж дзень вызвалення Мінска на грузавіку паехалі ў сталіцу, гналі як наперагонкі, каб не спазніцца заняць кватэры і пасады. Пашанцавала (слова самога Броўкі): пад Бабруйскам ашалела вырываліся з катла нямецкія часці.

Ні тады, калі працаваў з ім і захапляўся яго дзелавітасцю, але не ўсё ведаў аб яго адносінах з калегамі, у прыватнасці з Лыньковым, ні цяпер, калі ведаю многа і аб даваенным часе і аб барацьбе ў першыя пасляваенныя гады, не мог разгадаць загадкі паводзін гэтага ўвогуле асцярожнага і абачлівага чалавека.

Перш за ўсё цяжка зразумець яго зацятую і, як высвятляецца, непрыгожую барацьбу за тое, каб зваліць з пасады старшыні Саюза пісьменнікаў Міхася Лынькова і заняць яго месца. Што яго штурхала? Прага ўлады? Чым кіраваўся? На што спадзяваўся? З яго «кампраматам» — цесцем, цешчай, шваграм, якія сядзелі (цесця, здаецца, расстралялі).

Тры ці нават чатыры гады жорсткай барацьбы, пра якую нам, маладым, расказвалі Кучар, Астрэйка, Панчанка. Маглі, дурні, з'есці адзін аднаго. Але Броўка перамог, дамогся свайго. Аднак у гісторыі гэтай (такой думкі мы трымаліся і тады, і яшчэ больш яна ўмацавалася ў мяне цяпер) надзвычай высакародна выглядае Міхась Ціханавіч. Яму, старшыні Саюза, лягчэй было з'есці зяця «ворага народа». Лынькоў не апусціўся да гэтага. Лынькоў не пайшоў на помету. А былі падставы. Факт, пра які нам не сказаў і Кучар, а ён умеў мазануць дзёгцем усіх. Аб ім расказала Соф'я Захараўна, удава Лынькова, на вечары, прысвечаным 90-годдзю Міхася Ціханавіча,— у 1989 годзе, у час «вялікай галоснасці».

У 1937 годзе, калі Лынькова вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета, Броўка, Кузьма Чорны (пазней яго пасадзілі) і Эдуард Самуйлёнак (ніколі раней гэтае прозвішча не выплывала ў падобных гісторыях) напісалі на Лынькова данос, і не ў адзін адрас — у ЦК КПБ, у НКВД, у «Правду». Удава зачытвала цытаты. Наколькі вялікай была крыўда Лынькова і як доўга і ціха чалавек таіў яе, сведчыць наступны факт. 1975 год. Памёр Лынькоў. Званок удавы:

апошняе завяшчанне Міхася Ціханавіча — пад некралогам не павінна быць прозвішчаў Броўкі і Лужаніна. Такой была «помета» яго!

Між іншым, дало гэта клопату мне. Танк да гэтага аднёсся спакойна. А я не мог змірыцца: як можна без подпісу Броўкі? Мала што, лічыў я, ліберал, было паміж пісьменнікамі пры жыцці. Смерць мірыць. Тым больш што і Броўка на краі магілы: пяць гадоў назад яму выразалі страўнік — рак. Не падпісаць — нанесці траўму хвораму чалавеку. Трэба здаваць некралог, газеты не могуць чакаць, а загадчыкі аддзелаў не адважваюцца ўзяць на сябе вырашэнне такога далікатнага пытання: падпісваць ці не падпісваць. А Машэрава няма, Аксёнава няма, Кузьміна няма. Знайшлі Аксёнава ў адным з раёнаў Віцебшчыны. Але і ён адмовіўся вырашаць такое пытанне па тэлефоне. «Чакайце. Я хутка прыеду». 300 вёрст — хутка! Сядзім з Танкам у прыёмнай гадзіну, дзве. Чакаем. Паўлаў адбіваецца ад рэдактараў. Нарэшце Аксёнаў з'яўляецца. Уважліва выслухвае і... хітруе: «А ваша якая думка?»

«Не зразумее нас грамадскасць, чаму пад некралогам няма Броўкі»,— шчыра адказваю я. Максім Танк згаджаецца са мной.

Аксёнаў задаволена заключаў:

«Вельмі правільна думаеце. Маглі б вырашыць і без мяне».

Маглі б, канешне, але... не маглі ў той час: усё вырашаў ЦК. Але на гэтым гісторыя з некралогам не скончылася. Пахавалі на другі дзень Міхася Ціханавіча. Урадавую камісію ўзначальваў першы намеснік Старшыні Савета Міністраў У. Ф. Міцкевіч. У часе пахавання Соф'я Захараўна маўчала. Сказалі апошняе слова перад магілай. Развіталіся. Засыпалі зямлёй. Усклалі вянкі. Трэба ехаць на памінальны абед, падрыхтаваны ў Саюзе пісьменнікаў. І тут удава дала нам аплявуху. Са мной і з Танкам не стала гаварыць: «Вы не выканалі апошняй просьбы Міхася Ціханавіча. Не паеду я з вамі. Без вас памянём».

Міцкевіч разгублены: «Як жа ехаць без родных і блізкіх! Што гэта за памінкі будуць?» Помню, дождж пайшоў. Радавыя палезлі ў аўтобусы. А мы стаім пад дажджом, раімся. Толькі Л. П. Чагінай, сакратару Прэзідыума Вярхоўнага Савета, удалося нарэшце ўгаварыць прынцыповую ўдаву. Прынцыповасць яе заслугоўвае павагі.

26 студзеня

Напярэдадні браў у мяне інтэрв'ю палкоўнік з ваеннай газеты. І раптам пытанне, якое мяне ашаламіла:

«Як вы адносіцеся да таго, што Алесь Ганчар выйшаў з партыі?»

Ганчар?! Алесь, сябра мой! Калі ж ты быў шчыры? У беларускай літаратуры я не назаву празаіка, які выдаваў бы такую «клюкву», якую выдаваў Ганчар. Безумоўна, чалавек — таленавіты, але ж губіў свой талент. Сам. Ніхто яго не прымушаў захліпацца ад захаплення: «О, партыя мая! О, людзі савецкія! О, колгоспна сялянства!» Такія панегірчыкі, такі сіроп — што ў той час ад яго ванітавала. У мяне аднаго абзаца няма ва ўсіх 10-12 тамах. І ў Мележа. І ў Навуменкі. Не кажучы ўжо пра Макаёнка і пра маладзейшых, што прыйшлі ў адлігу. Такую «клюкву» хіба што паэты выдавалі — Броўка, Кірэенка... Увогуле, як правільна нехта сказаў, украінская проза ніяк не магла вылезці з шырокіх казацкіх шараваpаў. Але каб жа з казацкіх! Са сталінскага галіфэ. І Ганчар быў сцяганосцам. Што ён можа перавыдаць пасля прыходу да ўлады «Руху», лідэрам якога стаў?

Паехаў на творчы вечар, арганізаваны беларускай асацыяцыяй «Айчына» Фрунзенскага раёна, ёю кіруе Леанід Дайнека. Убачыў афішу, дзе пазначалася, што білеты прадаюцца (ніколі не выступаў платна!), пустую залу і ледзьве не самлеў. Растлумачылі: білеты, бо маюць паказаць фільм «Вазьму твой боль», а фільм забараняецца паказваць бясплатна, пракат не дае. і людзей да пачатку трохі сабралася — чалавек 300. Моладзь — вучні старэйшых класаў. І парадавала мяне гэтая моладзь: уважлівая, карэктная, чыталі мае творы — паказала віктарына. Выступілі Дайнека, Мікола Мятліцкі. Проста, па-сяброўску. Мяне ад стомы ажно хістала, як на палубе ў шторм, гаварыў седзячы. Але, здаецца, сказаў шчыра — пра сябе і пра час. Слухалі вельмі ўважліва. Пацяплела на сэрцы. Ехаў дадому бадзёры, хоць змораны смяртэльна.

Сёння паступілі першыя віншаванні — ад калег-равеснікаў: ад Пімена Панчанкі і Міколы Аўрамчыка.

Пімен піша: «Віншую цябе, выдатнага беларускага пісьменніка». Выдатным ён наўрад ці лічыць мяне, ставіўся да мяне раўніва, хоць адносіны ў нас былі найлепшыя, чалавек ён сумленны, душой не крывіў. А наконт выдатнасці... дык і сам я не лічыў і не лічу сябе такім. Шчыра рабіў што мог.

Мікола віншуе цёпла. Ён піша з Крыма, каторы год зімуе там: Рур з'еў яго лёгкія. Прыслаў верш. Няхай застанецца ў дзённіку, бо ці апублікуе ён.

Івану Шамякіну

Помніш, колькі ўваходзін
(Ды ў якія дамы!)
і радзін і народзін
Разам справілі мы?

Праўда, хоць навасёлле
і радзіны былі,—
Разам справіць вясёлле
Дзецям мы не змаглі.
Мабыць, выпрабавання
Не хапіла таго
На трываласць кахання
У кагось аднаго.
Бо ўзялі ды ў нядзелю
У аднолькавы час
Два згулялі вяселлі,
Як знарок — напаказ.
Як нам быць, не спыталі
Ні ў цябе, ні ў мяне,
Што не станем сватамі
Мы па іхняй віне.
Не анёл жа ты боскі,
Ды і я не святы...
Але ўсё ў нас па-свойску,
Хаця мы не сваты!

2-X-90. Кактэбель

Вунь калі напісаў! Шкадуе Мікола, што не сталі мы сватамі. Яго дачка Ірына (у яго тры дачкі) сустракалася з нашым Сашам. Выпрабавання не хапіла ў нашага разбойніка. Мы з Машай таксама шкадуем: у Ірыны двое дзяцей. А Саша і Таццяна (нявестка) і дагэтуль бяздзетныя, а ім па 40. Сумна.

27 студзеня

Падзеі сённяшнія засланяюць успаміны, часы тыя, якія былі блізкімі яшчэ ўчора, а сёння імкліва аддаляюцца ў глыбіню такой мінуўшчыны, якая, здаецца, бліжэй да эпохі Вялікага княства Літоўскага, чым да нашага бурнага часу, дзе людзі вар'яцеюць ад анархіі, прагі ўлады, барацьбы за ўладу. Трагедыя ў тым, што, дайшоўшы да вяршынь тэхнічнага прагрэсу, расшчапіўшы атам і ўзляцеўшы ў космас, чалавек нямнога адышоў ад тых, што рэзалі адзін аднаго ў глыбокай старажытнасці. А можа, стаў нават больш крыважэрным. Французы, дайшоўшы да Масквы, рускія, дайшоўшы да Парыжа, гэтак не зверствавалі, ды і немцы ў 1914-1918 гадах не рабілі таго, што гітлераўскія орды, што робіць вялікі гуманіст Буш у нашы дні, авіяцыя якога робіць па 2000-3000 вылетаў у дзень на іракскія гарады. Колькі ахвяр! Жах! Дзікунства прымае розныя формы і вельмі

хітра маскіруецца высокімі ідэямі. Гітлер і Сталін былі правадырамі нацый, сталі дэспатамі. Буш сёння герой. Стане забойцам? Можа застацца ў героях — во парадокс. Аб рэпрэсіях 1937-1953 гадах напісалі тысячы кніг, паднялі тысячы фактаў. Аднак ніхто яшчэ не вытлумачыў і псіхалогію Сталіна, і псіхалогію мае, усеагульны псіхоз.

Думаю над падзеннем Броўкі, маладога, 32-гадовага. Чым вытлумачыць данос? Прагай улады — не інакш. Яна ў яго праяўлялася і ў той час, калі я рабіў побач з ім і захапляўся яго актыўнасцю. Але не помню факта подласці. Аналізуючы яго паводзіны, заключаю, што ён жыў са страхам, асабліва пасля XX з'езда, калі пачалі вяртацца рэпрэсіраваныя, і стараўся ўсіх улагодзіць, усім быць добрым. Сваіх даўніх калег, што адсутнічалі па 18-20 гадоў, сустракаў з увагай. Скрыган стаў яго лепшым сябрам. Ды і іншыя нічога дрэннага пра яго не казалі. Далускаю, што баяліся — навучаныя горкім вопытам. Але прыгадваю адзін эпізод, над якім тады не вельмі задумваўся, хоць і абмяркоўвалі яго з Андрэем, але які асэнсаваў цяпер, пасля выступления Соф'і Захараўны на юбілейным вечары.

Вярнуўся Мікола Хведаровіч, не ў ліку першых, у годзе 1957-м ці 58-м. Але ён быў першы, каго аднавілі не толькі ў СП, але і ў партыі. І ён тут жа падаў у партбюро заяву: даносы на яго пісала член партыі Эдзі Агняцвет. А сакратаром бюро ў гэты час быў Андрэй. Як ён, змагар за праўду, загарэўся даць справе ход, раскруціць на ўсю шырыню. Разумеў, што ў нераце будзе не адна Агняцвет, а можа, і рыба буйнейшая. З даносчыцай ён гаварыў крута, зняважліва. Успамінаю, як яна бляднела, апраўдваючыся: маўляў, яе, камсамолку, прымусілі, такі быў час. Макаёнак не сунімаўся. Броўкі ў гэтыя дні не было ў Мінску, ён многа ездзіў, у СП дзяжурыў я. І я першы далажыў яму аб сенсацыйнай падзеі: Андрэй паспеў ужо правесці пасяджэнне бюро. Прыгадваю, як Броўка змяніўся э твару — не пазнаць. Але не выдаў свайго спалоху. Ды тут жа паехаў некуды. Пазней я даведаўся — у Акадэмію, да Глебкі і Крапівы. Не да Лынькова ж! А можа, і з Лыньковым гаварыў?

У той жа дзень ці на другі, да партсходу, запрасіў Броўка Андрэя і мяне ў госці і пад чарку пераконваў партсакратара зняць пытанне з парадку дня. Навошта варушыць старое? Гэта ж пачынаць новы віток варожасці. Каму гэта на карысць? У іншы ж час жывём. Забыць былыя крыўды! Талстовец! А непраціўленцам Броўка не быў. Андрэй адразу сцяміў, што да чаго.

«Баіцца,— сказаў ён жорстка, калі мы выйшлі з гасціннай кватэры.— Мабыць, у самога рыла ў пуху».

Я абараняў свайго шэфа. Я такі па натуры талстовец. Мне нават Эдзі стала шкада. Андрэй адмацюкаў мяне. Пасварыліся. Але Броўка ўчуяў, што Макаёнка ён не пераканаў. На другі дзень Андрэя запрасілі ў ЦК, спачатку — у аддзел, пасля — да Цімоха Гарбунова, сакратара. Там пераконвалі яго словам! Броўкі. Супрацiўляўся сатырык. Гарбунова ён не любіў, жорстка высмейваў. Але на Андрэя ціснулі цераз яго сяброў — такіх, як я, як Глебка, не помню яшчэ хто... здаецца, Лужанін. Гэты сам быў высланы яшчэ ў 1932 годзе, прыяцелем Броўкі не быў, але крыві Агняцвет не жадаў. Дабрак Глебка, гаварун, асабліва настойліва пераконваў. Усе мы — ганебна ўспомніць! — аказаліся дабрачкамі. Ведалі ж, што даносчыкамі былі і Кучар, і Модэль, і Бэндэ. І, выходзіць, ратавалі іх ад грамадскасці. Не гатовы былі да асуджэння? Ва ўдзячнасць людзі гэтыя абвясцілі нас антысемітамі, Андрэя публічна, у прэсе, мёртвага. Во як яны дзейнічаюць!

А між тым Андрэя таксама ўламалі. Плюнуў ён — не пайшоў проціў старых. Толькі ў хуткім часе падаў у адстаўку і рашуча адводзіў сваю кандыдатуру на ўсіх наступных выбарах — не толькі ў сакратары, але і ў члены бюро. Выбілі былога сакратара гаркома камсамола, работніка райкома партыі з актыўнай партыйнай дзейнасці.

Гісторыя гэтая — сюжэт для аповесці. Хіба напісаць? Ды наўрад у наш час гэта можа прагучаць актуальна.

31 студзеня

Ух! Цяжка быць юбілярам. У 70. Баяўся я яго, юбілею. Чаму? Немагчыма растлумачыць. Але страх жыў. Таму адмовіўся ад афіцыйнага вечара. Ад рэстарана. Стараўся, каб дзень гэты прайшоў як можна цішэй. Не выйшла. Здзіўляюся, што такі рэзананс набыло мае 70-годдзе. Шырока дала прэса, тэлебачанне, радыё. Нават «Маяк». Беларускія газеты бадай усе, акрамя хіба нефармальных ліcткоў.

У БелСЭ вырашылі сабраць калектыў на кароткае віншаванне. А адбылося доўгае, ледзьве не на дзве гадзіны, пасяджэнне. Віншавалі ад СП, Камітэта па друку, Камітэта міру, Фонду міру (сам 85-гадовы Заір Азгур з'явіўся, што асабліва здзівіла), ад Савета ветэранаў, епархіі, выдавецтваў.

Перад сходам завіталі міністры культуры і адукацыі, у часе лёгкага частавання (каньяк, гарэлка, бутэрброды) з'явіліся айцы горада і раёна. Помпа! Паток тэлеграм. Карацей кажучы, не чакаў я такой увагі. Прыемна, безумоўна. Але радасці нямнога — 70! Ад хвалявання балела галава. Стаміўся.

Прыехаў з Масквы Віктар Вольскі і з Ленінграда брат яго Яўген. Кранулі такой сяброўскай вернасцю. Дзякуй ім. І зайздрошчу ім:

Яўгену — 73, Віктару 70 будзе ў жніўні, а яны такія лёгкія на пад'ём. Віктар увогуле здзіўляе: дырэктар Інстытута Лацінскай Амерыкі, па пяць-шэсць разоў на год лётае і ў Паўднёвую і Паўночную Амерыку. Хлебам чалавека не кармі — дай злётаць. Яму проста: дасканала валодае партугальскай, іспанскай, нядрэнна англійскай мовамі, і французскую разумеў. Хоць здаецца мне, што на паездкі ён растраціў талент буйнога вучонага — географа, эканаміста. Умее ж чалавек пісаць, валодае пяром. Але да стала яго цягне слабей, чым на самалёт. А ў мяне наадварот: кожная паездка нават у Маскву для мяне праблема. Два гады не магу вырвацца ў Маскву, а оылі ж і пленумы СП, і пленумы Камітэта міру.

5 лютага

Работа ў СП мяне захапляла. Быць ва ўзросце 30-40 гадоў у гушчы не толькі літаратурнага, культурнага жыцця сваёй рэспублікі, але і ў пэўным сэнсе саюзнага — каго б гэта не захапіла, не ўзняло, не падагравала б гонар! У Саюзе пісьменнікаў можна пазяхаць, лічыць мух, калі быць абыякавым гультаём (былі і ёсць такія!). Можна працаваць на ўласную славу (былі і такія!). Броўка грашыў гэтым, пра сваю славу не забываўся. А хто з пісьменнікаў забываўся? Так! не стаў бы пісаць — гэта ж катаржная работа. Пра слабасці Броўкі можна пісаць, гаварыць многа. Але нельга не ацаніць яго вялікую заслугу: ён дбаў пра родную літаратуру. У імя яе славы, яе росту з яго фантанам білі ідэі. Ён быў ініцыятар новых выданняў, зборнікаў, анталогій — не толькі ў нас — у Маскве, нарадах маладых (колькі мы іх правялі, рэспубліканскіх, абласных!), інтэрнацыянальных сустрэч літаратараў — дэкад, тыдняў, дзён, семінараў, тэматычных, юбілейных вечароў. І я не згаджуся з цяперашнім вызначэннем, што ўсё гэта была помпа, паказуха. Не! Да дэкад рускай, украінскай, малдаўскай, таджыкскай, узбекскай, літоўскай, латышскай літаратур рыхтаваліся год-два. Перакладалі, друкавалі, выдавалі кнігі. Мала чыталі пераклады? На жаль, мала. Але след заставаўся. І сустрэчы, вечары з удзелам пісьменнікаў іншых рэспублік, высокія словы аб дружбе — не маглі яны не ўпасці ў сэрцы людзей, асабліва моладзі. Здзіўляцца можна іншаму: чаму дэструктыўным сілам удалося так хутка выветрыць з душ моладзі гуманныя і высокія ідэі еднасці і дружбы людзей? Якія сродкі могуць быць вынайдзены ў будучым, калі прапагандай гэтых ідэй не будуць займацца літаратура, кіно, тэатр?

Шырока праводзілася работа з маладымі. Думаю, у тыя гады не згубіўся ні адзін сапраўды таленавіты чалавек. У Броўкі было незвычайнае чуццё на дараванні. Прымалі ў СП у той час адкрытым

галасаваннем. Таго, хто выносіўся на прэзідыум, як правіла, прымалі. Але перад гэтым сур'ёзна абмяркоўвалі са старшынёй — каго выносіць. Часам мы, маладзейшыя, ліберальныя (я, Ткачоў, Хадкевіч), і настойліва прасоўвалі «добрага хлопца», земляка. Але Пятро Усцінавіч быў катэгарычны:

«Хлопец ён добры, але ў Саюз яму яшчэ рана. Няхай папрацуе. А вось гэтага трэба прымаць»,— хоць пра гэтага мы і круцілі насамі. І памыляўся Броўка вельмі рэдка. Здаецца мне, у часы дэмакратыі, пры трох тайных галасаваннях памылак больш. Каго толькі не прымаюць. А літаратура мізарнее.

Карацей кажучы, Броўка не даваў нам, падначаленым, калупаць у насах. Але адно даваў: пісаць. Ва ўсялякім разе не перашкаджаў. Мне не перашкаджаў. Дзіўная якасць: умець нагрузіць арганізацыйнай работай і даць магчымасць заняцца творчасцю.

І я пісаў. Апантана.

8 лютага

Захаваўся пачатак дзённіка за 1953 год — за 4 і 5 сакавіка — дні хваробы і смерці Сталіна. Дзённікі я пачынаў і раней, ёсць, напрыклад сшытак за 1952 год, першы запіс — радасць з нагоды таго, што скончыў «У добры час», што на стале не засталося ніводнай папкі з рукапісамі — аднёс у рэдакцыю, паслаў перакладчыку. Але дзённікі тых часоў кароткія: пачынаў новы раман, аповесць — і жыццяпіс уласны спыняўся. Аднак гэты запіс — «сталінскі» — самы кароткі, усяго за два дні. Усяго! І пра адно і тое ж — як мы плакалі «па вялікім і мудрым». Чаму такі кароткі запіс? Чаму я не працягваў свае перажыванні? Не было іх, перажыванняў? За два дні высахлі слезы? Ці вельмі ж былі заняты ў пачатку «новай эры»? Не помню, каб был; нейкія асаблівыя падзеі, якія займалі б час і ўвагу сакратара партбюро. Звычайнае: жалобны мітынг, мітынг у падтрымку новага кіраўніцтва, які моцна абурыў Машу (яна гэта і зараз успамінае) — абурыў тым, што. не паспеўшы пахаваць Сталіна, пачалі славіць Малянкова. Асабліва вызначыўся Павел Кавалёў. Ды і Броўка. Во закамплексаванасць была! І памыліліся. Мікіта перайграў Малянкова. На шчасце. Цяпер я ўпэўнены, што захоп улады Малянковым ці Берыя прадоўжыў бы сталінскі дэспатызм. Хоць першыя паслясталінскія рэформы (асабліва ў сяле) народ доўга звязваў з Малянковым — пасля таго, калі «кукурузная палітыка» Хрушчова правалілася. Хадзіла пагаворка: «Быў Малянкоў — паелі і блінкоў».

Безумоўна, тады я не так думаў — да 1957 года, калі Хрушчоў разграміў «антыпартыйную групу». Але ўнутрана, інтуітыўна я

адчуваў, што далей так жыць нельга, што жыццё са смерцю Сталіна не спынілася. Наадварот. Набыло іншы сэнс. Памагаў Андрэй, найбольш Андрэй, хоць хутка цверазелі і іншыя калегі мае.

Запомніліся эпізоды ў дзень смерці Сталіна. Маша разбудзіла мяне ў шэсць раніцы з рыданнямі.

«Памёр...»

Я таксама заплакаў. Сапраўды, здалося, што свет перавярнуўся, парушаны ўсе ўстоі, жыццё бурыцца і мы ляцім у тартарары. Праз гадзіну мне пазванілі з рэдакцыі «Звязды» не з просьбай — з прапановай напісаць аб сваіх пачуццях у гэты трагічны час усенароднага гора. Я ў тыя гады легка пісаў барабанную публіцыстыку. Былі гатовыя штампы. У такой сітуацыі штампы не падыходзілі. Жалоба патрабавала іншага стылю, іншых слоў, а іх не было: мы многа пісалі пра вайну і не навучыліся пісаць пра смерць, сацрэалізм смерць узвышаў і паэтызаваў: загінуў за Радзіму, за Сталіна!

Мы жылі на першым паверсе, і прахожыя заглядвалі ў вокны майго кабінета. Жыў тады ў Мінску рускі паэт Дзмітрый Кавалёў, мой зямляк, веткаўскі, мы з ім сябравалі з даваеннага часу — былі актыўнымі членамі літаб'яднання пры «Гомельскай праўдзе»; ён, Кастусь Кірэенка, Леанід Гаўрылаў былі нашымі кумірамі — іх ужо друкавалі не толькі ў Гомелі, але і ў Мінеку. Пасля вайны мы зблізіліся яшчэ больш — землякі і ваявалі ў адным месцы — Кавалёў быў мараком Паўночнага флоту. (Я напішу, як два сябры мае пасля аддаліліся ад мяне гэтага чалавека.)

Дзіма ў роспачы і горы ішоў да мяне ў такую рань паплакаць разам. Угледзеў праз акно, што я сяджу за сталом, пішу, і страшэнна абурыўся. Ускочыў у кватэру і ледзьве не кінуўся на мяне з кулакамі.

«Ты можаш пісаць у такі дзень! Ты знаеш, хто памёр!»

Цікава, што пасля XX з'езда Кавалёў стаў самым ваяўнічым антысталіністам, мала хто з паэтаў так скланяў «бацьку роднага», нават Еўтушэнка так не ўмеў, як імпульсіўны, гарачы марак Дзмітрый Кавалёў.

Разам з ім мы пайшлі на плошчу, дзе стаяў гіганцкі манумент правадыра. Быў моцны для сакавіка мароз — градусаў 15. На плошчу з усіх бакоў ішлі людзі. Старэнькія бабулі неслі вазоны кветак, якія тут жа мерзлі, але манумент быў абстаўлены гаршкамі. Ці ўсе плакалі? Безумоўна, не ўсе — колькі было пакрыўджаных. Але яны маўчалі. Дзесь па абедзе я пайшоў да Андрэя — паплакаць з ім. і ашаломлены быў больш, чым Кавалёў, калі ўбачыў, што я пішу: Макаёнак і Аляксей Русецкі (яны жылі ў адной кватэры, некалі ў ёй жыў і я з Аляксеем Кулакоўскім) сядзелі за сталом, пілі гарэлку, і Андрэй, як звычайна,

весела рагатаў, яўна расказваў новы анекдот ці «вожыкаўскую хохму», ён тады рабіў у «Вожыку».

«Як вы можаце?! — абурыўся я.— Паглядзіце, што робіцца на вуліцы! Увесь народ...»

«Знаеш што, Іван? Не свішчы наконт усяго народа. Мы таксама народ. І калгаснікі твае церахоўскія таксама народ. І ты лічыш, што яны плачуць? Чорта з два! Народ — ён мудры. А што здарылася? Памёр адзін чалавек».

«Які чалавек!» — не здаваўся я.

«Які? Звычайны. А можа, і горшы за нас з табой. Ты сам расказваў, што калгаснікі пра яго гаварылі...»

«Як жыць будзем без... правадыра?»

«Іван! Такую тваю маць! Пасаромейся! Ты што, кроку не можаш ступіць без правадыра? Не бойся. Знойдзецца новы. Такое месца пустым не бывае. Будзе табе пра каго пісаць. Сядай лепш ды выпі за... за што хочаш? За ўпакой яго? Мы з Аляксеем кульнулі за свабоду».

Выпілі. Залішне нават. Спрачаліся. Сварыліся нават. Андрэй мацюкаўся, нягледзячы на прысутнасць Лены і Люды, і яго жонка і суседава прывыклі, што ён не выбірае сповы і не скупіцца на іх. Вельмі можа быць, што пасля гэтай і наступных дыскусій з Андрэем ды і з такімі, як Рылько, мне расхацелася пісаць дзённік жалобных дзён. Так і засталіся дзве кароткія нататкі. Людзі эмацыянальныя, мы маглі паплакаць. Але не бачыць, як жыў народ (сяло асабліва), мы не маглі. Яшчэ задоўга да ўсталявання паняцця «культ» мы добра ўсведамлялі, што гэта такое, яго вытокі, яго вынікі, уздзеянне на псіхалогію людзей. Адказны сакратар СП, увогуле добры чалавек, былы памочнік такога рэалістычнага кіраўніка, як Панамарэнка, хадзіў у фрэнчы «а-ля Сталін», курыў такую ж люльку і паводзіў сябе адпаведна. Маладзенькі лейтэнанцік, фанатык, у Доме афіцэраў схапіў Паўла загрудкі: «Ты каму падражаеш?!» Культаўцы былі вакол нас, мы з імі сустракаліся штодня. Гэта быў (і ёсць!) трывалы і масавы сацыяльны тып.

Не з'явіліся яшчэ афіцыйныя дакументы, але адчувалася, што жыццё мяняецца. Атмасфера жыцця.

У гэты час у мяне выспяваў сюжэт новага рамана — таго, адзінага, калі на першым аркушы паперы я напісаў «Крыніцы» і за тры гады не змяніў назвы; усе іншыя творы, нават апавяданні, мелі многія варыянты назваў.

Але ці адразу з'явіўся вобраз Бародкі?

9 лютага

З'яўленню такога вобраза, здаецца, памог пашыраны пленум ЦК КПБ, які праходзіў у чэрвені 1953 года ў клубе імя Дзяржынскага. Чалавек 700 актыву! Сакратары ўсіх вялікіх партарганізацый! Тры дні засядалі. Драматызм, якога людзі майго пакалення не помнілі. Хіба камуністы 20-х помнілі.

Берыя быў не дурань, ён знаў, на чым сыграць: на нацыянальных пачуццях. І на перастаноўках людзей. Ён знаў, на каго можна было абаперціся, зрабіць стаўку. Пачалася спешная беларусізацыя. Залішне спешная. Мой франтавы сябра Сямён Твардоўскі, намеснік упраўляючага Рэспубліканскай канторы Дзяржбанка, звоніць і літаральна моліць: «Дай машынку з беларускім шрыфтам, прашу цябе. Хоць дні на тры, пакуль заменім літары ў сваіх».

Першым сакратаром ЦК быў Мікалай Сямёнавіч Патолічаў, рускі, па агульным прызнанні — сумленны, порядочный чалавек, ад сталінскай лініі ён не адступаў, але што тычыла ўнутрырэспубліканскіх гаспадарчых спраў, то вёў ён, прызнавалі ўсе, даволі незалежную палітыку. Ведаў прамысловасць, і яна расла небывалымі тэмпамі. З сельскай гаспадаркай не атрымлівалася. У культуру не лез: разбірайцеся, беларусы, самі. Але па часці русіфікацыі не ціснуў, такіх акцый, як пазней зрабіў яго пераемнік К. Т. Мазураў, не рабіў: школы на рускую мову не пераводзіў.

Але з беларусізацыяй адразу ж (во працавалі! хто?) была пушчана чутка: Патолічава заменять. Ды якая да д'ябла чутка! Канкрэтнае дзеянне: у рэспубліку быў вернуты былы другі сакратар, малады, энергічны беларус М. В. Зімянін, які гады два рабіў дзесьці на Паволжы, у Мардовіі, здаецца. Заняў ён без пленума свой ранейшы кабінет — другога. Але ў першы ж дзень узяў на сябе ўсе абавязкі першага. Прымаў людзей, фарміраваў кабінет — і партыйны, і савецкі. Недурны, здаецца, чалавек, а вёў сябе, як напалеончык. Прыгарнуў усіх падхалімаў. Нявызвалены Патолічаў апынуўся ў ідыёцкім становішчы: губернатар без улады. Між іншым, да гонару Броўкі, ён не кінуўся да Зімяніна на наклоны і выказваўся пры нас пра ненармальнасць такога становішча. Запомнілася гэта таму, што пасля заканчэння палітычнага спектакля ён хваліўся сваёй прадбачлівасцю. А можа, тайна і хадзіў?

Праз паўмесяца (ці раней?) быў скліканы гэты шырокі пленум. і пачаўся ён не з даклада Патолічава — з даклада Зімяніна. Мудрасці ў Міхаіла хапіла не бэсціць свайго, для яго яўна ўжо, папярэдніка на пасадзе. Але сцэнарый, напэўна, быў падрыхтаваны. А можа, і самадзейнасць? Гэтыя людзі заўсёды былі ультрарэвалюцыянерамі і...

падхалімамі. Першы выступіў Чорны (сапраўды чорныі), старшыня Дзяржплана рэспублікі, і змяшаў Патолічава, перад якім тры гады падхалімнічаў, з гразёю. Абвінавацію ва ўсіх грахах, у тым ліку і за русіфікацыю. Сустрэлі яго выступление ледзьве не змрочным маўчаннем — два-тры дзесяткі плескачоў. Здаецца, было адно ці два нейтральныя выступленні — аб праблемах гаспадарчых.

На трыбуну падняўся сакратар Дзяржынскага райкома Лемяшонак, былы партызанскі камандзір. І ён камень на камен! не пакінуў ад галоўнага планавіка — у абарону Патолічава. Лемяшонак — заіка, і пры яго заіканні кожная вымаўленая фраза — што эканомная і прыцэльная чарга з аўтамата.

«Усю дарогу нас вядуць «чорныя». Можа, хопіць, таварышы? У вайну мы самі хадзілі. І добра хадзілі. Да Берліна дайшлі». Гром апладысментаў. Праводзілі Лемяшонка з трыбуны шквалам воплескаў.

Зімянін пабялеў: недурны чалавек, сцяміў, што над выбраннем яго навісла сур'ёзная пагроза.

Апаратчыкі, такія як Абрасімаў, Кляшчоў, Гарбуноў, старался ўтаймаваць страсці, павярнуць да нуднага абмеркавання гаспадарчых спраў. Не атрымоўвалася. Людзі, якія доўга маўчалі і згаджаліся, страцілі пакорнасць. Крытыкавалі і Патолічава, але гэта была не чорная крытыка, а — дзелавая. Большасць жа адкрыта выказвалася, што ён павінен і далей узначальваць беларускую партарганізацыю. Можна было толькі пісьменніцкай фантазіяй уяўляць, як адчуваў сябе «Напалеон», Міхаіл Васільевіч, ганарысты, гарачы, даўні «рубщик лозы» ў камсамоле, калі быў першым, яго любілі і баяліся. Між іншым, і дагэтуль можна пачуць пра Зімяніна самыя супярэчлівыя думкі. Але «падмачыў» ён сябе не тады, не на дыпламатычнай рабоце, не на пасадзе галоўнага рэдактара «Правды», а на пасадзе ідэолага Л. І. Брэжнева — у вачах творчай інтэлігенцыі: некалі смелы чалавек пачаў баяцца любой ініцыятывы.

10 лютага

На трэці дзень работы пленума нечакана аб'явілі перапынак ажно на гадзіну, да абедзеннага часу. Праходзіць гадзіна... дзве... тры... Лета. Цяплынь. Удзельнікі гуляюць па праспекце, па Камсамольскай. Мая кватэра — насупраць клуба. Забаўляюся з пяцігадовай Таняй, трохгадовым Сашам, гляджу ў акно — пайшлі ў залу? Не. Андрэй прыйшоў. Цікава ўсім было, як развіваюцца падзеі: трэці дзень засядаюць, і ўсе ўжо зналі, што адбываецца, і... падтрымлівалі Патолічава. Чаму не падтрымлівалі свайго Зімяніна? Паабедалі з Андрэем. Па чарцы ўзялі. Тады гэта была не праблема, не адзін я

грашыў, іншыя спускаліся да рэстарана «Зара» і адзначаліся там. Без малога гадзіны чатыры бяздзейнасці, чакання! А большасць актыву — учарашнія партызаны, франтавікі.

Урэшце гучна пазванілі — я ў кватэры пачуў і запомніў той званок у будынку, які яшчэ ахутвала тайна: доўгі і вясёлы званок. Усе спяшаліся ў залу, ажно ціснуліся ў дзвярах — прагнулі сенсацыі. З'явіўся прэзідыум. Зімянін не наперадзе, не на першым месцы, маленькі, згубіўся сярод радавых. Старшынскае месца заняў Абрасімаў — намеснік старшыні Саўміна. Падняўся, абвясціў:

«Таварышы! Бюро ЦК параілася з Прэзідыумам ЦК КПСС. Нам параілі: у сувязі з тым, што пленум аказаў таварышу Патолічаву поўны давер, пакінуць яго на пасадзе першага сакратара. (Гром апладысментаў.) У сувязі ж з тым, што таварыш Кляшчоў (старшыня Саўміна) едзе на вучобу (ні пра якую вучобу да таго дня не было размовы), бюро рэкамендуе таварыша Зімяніна на пасаду старшыні Савета Міністраў. Просім пленум падтрымаць...»

Рэдкія воплескі. Без доўгіх пастаноў скончылася трохдзённая работа шырокага пленума ЦК КПБ.

Не адразу — праз колькі дзён — стала вядома, што арыштаваны Берыя. У той жа дзень. Таму так доўга наша кіраўніцтва не магло пераіцца, як паводзіць сябе далей, што рабіць з Патолічавым. Мала што ёсць думка пленума. Але без ЦК КПСС такія пытанні не вырашаліся.

Безумоўна, пасады старшыні Зімянін не заняў. Прыехаў з помпай, з сустрэчай на вакзале, выехаў адзінока, непрыкметна — назаўсёды. Афіцыйна ў рангу сакратара ЦК прыехаў у Мінск праз 27 гадоў — на пахаванне Машэрава.

Прыгадваю размову з А. Т. Кузьміным. Здаецца, мы прасілі новае выдавецтва — дзіцячае. А вырашаў такое пытанне толькі ЦК КПСС.

«Там жа наш чалавек — Зімянін»,— сказаў я Кузьміну.

Аляксандр Трыфанавіч чмыхнуў і закурыў новую цыгарэту.

«Я табе скажу... між намі... са сваім вырашаць цяжэй, чым з чужым».

І яшчэ адно. Ужо калі я перайшоў у «Энцыклапедыю», мы пачалі выпускаць кнігі «Памяць» — раённыя. Машэраў і Кузьмін гарэлі гэтай ідэяй, горача падтрымлівалі. А Зімянін (зноў жа расказваў Кузьмін) даў ім па носе — сказаў Кузьміну:

«Ты што, хочаш быць святей папы? Адзін выдаць сто пяцьдзесят тамоў? Калі ў краіне не хапае паперы?»

Заўсёды яе не хапала, паперы. А на якія выданні яна ідзе зараз? «Памяць» мы ўсё ж працягвалі і працягваем выпускаць. Па раёнах.

Але я пераскочыў у дзёнь сённяшні. Перамежаванне такое, відаць, лагічнае, бо паслядоўна наўрад ці дайду да нашага часу, ды і праз год-два падзеі часоў маёй старасці забудуцца ў большей меры, чым падзеі маладосці. Закон памяці, інакш не бывае. Праўда, і адтуль, з маладосці, не ўсё выплывае, шмат што забылася, а калі помніцца, то «гола» — толькі факт, без карэнняў— адкуль вынікла? чым скончылася?

Менавіта пасля таго чэрвеньскага пленума ў сюжэце рамана, які пісаўся яшчэ ў галаве, з'явіўся вобраз Бародкі, культаўца, злога дэмана і ахвяры (але, і ахвяры!) сістэмы, сталінізму. За тры гады да XX з'езда! Што штурхнула? Хто стаў прататыпам? Зімянін? Гарцуеў, мой церахоўскі сакратар? Ці мноства іншых сакратароў, з якімі піў гарэлку? У той час я многа ездзіў па раёнах, удзельнічаў у канферэнцыях па «Глыбокай плыні», па ёй былі праведзены сотні канферэнцый. Пасля атрымання мной Сталінскай прэміі некаторыя сакратары спускаліся да таго, каб папрысутнічаць на канферэнцыі (мала хто з маіх калег меў такі гонар) і павячэраць: без добрай вячэры ў той час не абыходзілася ніводная сустрэча, спіцца можна было, слабавольныя і співаліся.

Хто прататып — на пытанне гэтае я не мог бы адказаць нават і тады, не толькі зараз, праз 37 гадоў, напісаўшы два дзесяткі раманаў, аповесцяў, стварыўшы вобразы іншых «бародак» — таго ж Гукана. Але літаратуразнаўцы і дагэтуль помняць Бародку, бытаваў наваттэрмін « бародкаўшчына».

11 лютага

Пісаўся раман лёгка, добра помню. Школа, калгас — што я нядаўна перажыў. А можа, найперш — адчуванне свабоды, раскаванасці. Ды і ўпэўненасці ў сваіх магчымасцях было больш — трэці раман. Друкаваў урыўкі. Але Бародку не выводзіў на свет белы (праверыў па бібліяграфіі). Усё яшчэ баяўся? Друкаваў пра Алёшу Касцянка, пра старога настаўніка Гаманюка. Між іншым, бібліяграфія здзівіла яшчэ адной акалічнасцю: у гэтыя гады я друкаваў нямала апавяданняў: «Вясновымі днямі», «Памылкі», «Мужнасць» (пра што, не помню, трэба раздабыць, надрукавана ў «ЛіМе» 19 сакавіка 1953 года. Няўжо пра Сталіна?). Пасля пайшлі лірычныя апавяданні, якія ўключаў у зборы твораў: «Першае спатканне», «Спі, мой сыночак», «Бацькі і дзеці», «Завіруха»... Дзіўлюся, як апавяданні спалучаліся з працай над раманам. Маладосць! На ўсё хапала часу. На раман, на апавяданні, на артыкулы, на працу ў СП, выступленні, на застолле, на любоў, на дзяцей... Шчаслівы час! Думаю, было ў маладога пісьмен-

ніка яшчэ адно: боязь доўга не друкавацца. Тры гады пісаць раман і маўчаць? Не забыліся б, што ёсць такі пісьменнік! Маладосць — гэта прага хутчэйшага задавальнення сваіх патрэб, духоўных і фізічных.

«Крыніцы» апублікаваў у 4-5 нумарах «Полымя» за 1956 год. Краіна жыла XX з'ездам. Мала хто яшчэ чытаў даклад Хрушчова, але гаварылі пра яго многа. Бародка здзівіў маіх калег і крытыкаў. Нават такога туза, як Анатоль Вялюгін. Пісьменнікі не часта чытаюць адзін аднаго. «Крыніцы» чыталі. Многа было водгукаў у прэсе. Прафесійных крытыкаў — усе станоўчыя. Адзін рэзка адмоўны — у органе ЦК КПБ «Камуніст Беларусь. Аўтар — В. Буробін, сакратар райкома партыі з Віцебшчыны. Пазней я пазнаёміўся з ім. Інвалід вайны, без рукі, недурны чалавек, але Бародку прыняць не мог нават пасля XX з'езда.

Артыкул Алеся Адамовіча, які заяўляў пра сябе як пра крытычную зорку першай велічыні, называўся «Крыніцы б'юць з глыбінь...»

1953 год быў насычаны падзеямі. Пасля смерці Сталіна арышт Берыі. Вераснёўскі пленум, які ўзварухнуў не толькі сяло, але і нашага брата, пісьменніка, бо больш за ўсё нас хвалявалі праблемы аграрныя, хоць жылі ў горадзе, можна сказаць, сытна — прадуктаў хапала, былі б грошы, праўда, рынак пасля завяршэння калектывізацыі ў Заходняй Беларусі падаражаў, найперш мяса.

Варта было б перачытаць матэрыялы таго пленума, які яшчэ называўся «малянкоўскім». Ці не перапісваем яго ідэі ў цяперашнія аграрныя праграмы?

Цэлы дзень чыталі ў райкоме абвінаваўчае заключэнне па справе Берыі. Расказаў Андрэю — ён загарэўся напісаць трагедыю. Але не на трагічнае амплуа ён быў запраграмаваны пры ўсёй сваёй узрыўной сіле. Да таго ж яму не адразу далі магчымасць пазнаёміцца з прыгаворам. Помню, што Андрэй мацюкаў райкомаўцаў, я, сакратар, памагаў яму прачытаць дакумент. Астыў драматург. Жыў поспехам «Выбачайце, калі ласка!». Жыў новай камедыяй.

Якія-небудзь яркія падзеі наступных двух гадоў у памяці не захаваліся, варта было б пагартаць газеты таго часу. Але не па газетах я пішу летапіс эпохі — па ўласных перажываннях. Урэшце, гэта пісьменніцкі дзённік, а не даследаванне гісторыка.

У 1954 годзе прайшлі пісьменніцкія з'езды — наш і ўсесаюзны, апошні праз дваццаць гадоў пасля першага. Што запомнілася? Надзвычайная інтэрнацыянальная еднасць. Нішто яе не пахіснула — ні Сталін, ні Берыя. І выяўлялася яна не толькі на пасяджэннях, але і ў гасцініцы, у рэстаране. Мяне ўзносіла да нябёс, што я, малады, сядзеў няхай і не побач, але нярэдка за адным сталом — з Коласам, Рыльскім, Самедам Вургунам, Пракоф'евым, Бажаном, Леанідзе.

Завязваў добрае знаёмства са сваімі равеснікамі па літаратурным стажы — з Ганчаром, Васілём Казачэнкам, Міколам Нагнібедай, Юрыем Збанацкім... Праўда, дружбе з украінцамі памагло, што за месяц да з'езда я быў на Украіне ў складзе дэлегацыі з Пятром Глебкам і Янкам Брылём на 300-годдзі ўз'яднання Украіны з Расіяй. Грандыёзнае свята было! Выяўленне пачуццяў любові не выклікала ніякага сумнення. Цалаваліся азербайджанцы і армяне, рускія і літоўцы, узбекі і кіргізы. Што мы не падзялілі цяпер? Каму трэба так сварыць людзей? Увогуле вядома — каму. Гэта тая міна, якой лягчэй за ўсё ўзарваць Саюз. А каму на карысць разбурэнне такой Дзяржавы — школьніку зразумела.

14 лютага

...Першы паznаёміўся з дакладам Хрушчова на XX з'ездзе Броўка — член ЦК. Вярнуўся ён з «вялікага дома» надзвычай узбуджаны, здалося мне, і спалоханы, і ўзрадаваны. Бывае такое спалучэнне? Пэўна, бывае. Спалоханы, бо і сам у пэўным сэнсе з'яўляўся культам, і становішча такое не магло не падабацца. Узрадаваўся — бо нарэшце вызваляўся ад таго страху, які гнёў і ціснуў без малога 20 гадоў.

Я і тады прыгадаў, і цяпер не магу не занатаваць адзін, бадай жа анекдатычны, але разам з тым і трагікамічны эпізод, які адбыўся за колькі месяцаў да з'езда.

У чэрвені 1955 года Броўка адзначаў сваё 50-годдзе. Шырока адзначаў, пышна. Гарадскі вечар з гасцямі з Масквы, Ленінграда, Кіева... Пасля банкет — у месцы цесным і прасторным (яшчэ адно незвычайнае спалучэнне) — у нашым пісьменніцкім Доме творчасці «Каралішчавічы». Цесна было размясціць гасцей у сталоўцы, на верандзе. Не вельмі зручны падзел. Але за сценамі — лес, прастор, лета, цяплынь. Цесна было, пакуль ішлі афіцыйныя тосты. А потым разбрыліся па лесе на палянкі, пад сосны. Між іншым, мне гэты прастор, як кажуць, вылез бокам. Сярод гасцей была маладая таленавітая Тамара Мікалаеўна Ніжнікава. Прывабная пампушка, тады яшчэ ў меру поўная. Чортаў хахол, сябра мой Вася Казачэнка, некуды знік з Тамарай. А жонкі пісьменніцкія, добрыя правакатаркі, нацкавалі Машу, што, маўляў, бачылі, як са спявачкай пайшоў Шамякін. А я з хлопцамі частаваўся на паляне. І хоць выстаўляў я Андрэя і іншых у сведкі, галавамыйка мне была такая, што помніцца і дагэтуль. Дэталі нашага маладога жыцця. Маша была раўнівая. Гэтую рэўнасць я напісаў чуць пазней у «Сэрцы на далоні» — у вобразе Галіны, жонкі Яраша. На чытацкай канферэнцыі ў ваенным гарадку ў Печах афіцэрскія жонкі (раманы чыталі жонкі, не афіцэры, цяпер, па-

мойму, і яны перасталі чытаць — ёсць тэлевізар!) ледзьве не пабіліся з-за супрацьлеглага стаўлення да гэтага вобраза.

Аднак мяне заносіць на ўзбочыну. Пра чытацкую рэакцыю на розныя творы, розныя вобразы варта напісаць асобна. Можа, дабяруся!

Дзён праз колькі пасля юбілейнай даты Пятро Усцінавіч наладзіў прыём дома — для вузкага кола гасцей. Госці — кіраўнікі рэспублікі: Патолічаў, Мазураў, Гарбуноў; Казлова, здаецца, не было, не помню. Пісьменнікаў усяго чацвёра — Крапіва, Глебка, Панчанка, я, без жонак. Не, Ніна Глебка была — памагала гаспадыні, Алене Міхайлаўне. Начальства запрашалася з жонкамі, але былі толькі Патолічава і Мазурава. Авальны стол рыжскай мэблі (тады самая прэстыжная была — рыжская) рассунулі, але адной укладкі аказалася мала, і практычны Сцяпан Броўка ўставіў яшчэ адну шырокую дошку. Спачатку адчувалі сябе ніякавата: мала каму прыходзілася піць з такім высокім начальствам. Але выпілі па чарцы, па другой, убачылі, што «ўладары» п'юць гэтак жа, як і мы, грэшныя. Патолічаў нічуць сябе не стрымліваў. Мяне нават рассмяшыла, калі ўгледзеў, што жонка тузае яго за штаніну.

— Не пі! — гэтак жа, як тузала мяне ў гасцях Маша.

І раптам — о жах! — пад цяжарам пляшак і талерак стол абрушыўся, устаўная дошка выпала, шмат што рухнула на падлогу. Канешне, пабляднеў Броўка. ускрыкнула Алена Міхайлаўна. Ды і мы разгубіліся. Але малайцы Патолічаў і Мазураў — тут жа пачалі жартаваць. Па нешта — па малаток, ці што — я пайшоў на кухню і ўгледзеў карціну: цешча Броўкі Алена Рыгораўна Рыдзеўская ляжала самлелая, дачка і Ніна Глебка паілі яе вадой і кроплямі. Дзіва што! Ад аварыі такой магла б самлець любая іншая гаспадыня. А тут — учарашняя лагерніца, жонка расстралянага «ворага народа». Перад такім начальствам абрушыўся стол! Дыверсія! Сібір — не менш! Безумоўна, не столькі за сябе спалохалася маці — за дачку, за зяця.

А начальства, бадай, радавалася прыгодзе. Патолічаў і Крапіва селі ў кабінеце гуляць у шахматы. Мазураў і я, калі жанчыны прыбралі пад сталом і на стале, залезлі пад стол і збівалі яго вялікімі цвікамі. «Будзе стаяць да стагоддзя». Пімен весела даваў кансультацыі і крытычна ацэньваў нашу работу: «Ці ўмее старшыня Саўміна трымаць малаток? Шамякін яўна развучыўся».

Карацей кажучы, калі не тады, то цяпер, з вышыні гадоў, можна ўявіць эмоцыі Петруся Броўкі, калі ён паслухаў даклад Хрушчова. Праз колькі часу па нейкай патрэбе, падпісаць нешта, я апынуўся ў Коласа. Ён быў змрочны. Помню яго словы, сказаныя з болем,

абурэннем: «Іван Пятровіч, браце, то якому ж ідалу мы пакланяліся». Можна зразумець яго боль. Столькі вершаў (і не абы-якіх — таленавітых) прысвяціў ён «генію ўсіх эпох і народаў».

17 лютага

У чэрвені 1956 года я паехаў у Югаславію. Турыстам. Упершыню. Не, за мяжу — не ўпершыню. Акрамя ваеннага падарожжа ў Польшчу і ў Германію, увосень 1955 года мы ездзілі ў Польшчу. Афіцыйна. На дні беларускай культуры. Шэсць пісьменнікаў і тэатр Янкі Купалы, увесь асноўны састаў. Паездка запомнілася. Як нас рыхтавалі! Неаднойчы збіралі ў ЦК. Што гаварыць. Як паводзіць сябе. У што апранацца. Абавязкова капялюш — прадпісвала інструкцыя, зацверджаная ажно ЦК КПСС. І пасля такой падрыхтоўкі 50 чалавек без грошай (грошай не браць!) два дні сядзелі ў Брэсце — не гатовы былі ў Маскве дакументы. Пісьменнікаў пасялілі ў гасцініцы абкома, і абком карміў, ды і тыя з нашых, хто ўжо выязджаў за мяжу (Броўка, Танк), былі смялейшыя, не трымаліся дакладна інструкцый і мелі нейкія грошы, ва ўсялякім разе купіць гарэлку было за што. Акцёры перабіваліся хто як мог, а ў поездзе да Варшавы (ехалі ад Брэста цэлы дзень) галадалі.

Прымалі нас з помпай. Трымаліся яшчэ «сталінскія парадкі». Дысцыплінка. Вечары ў вялікіх залах з высокімі прамовамі аб дружбе народаў, партый. Што паказваў тэатр? «Паўлінку». Здаецца, «Заслонава» і «Пяюць жаваранкі».

Пасля я ездзіў з Танкам і Аркадзем Куляшовым. Тады гэта былі маладыя вясёлыя хлопцы, рагатуны, анекдотчыкі. Максім ведаў Польшчу і палякаў, выдатна валодаў мовай, зачароўваў полек. Запомніліся сустрэчы ў Беластоку, у якім я працаваў у 1940 годзе, на нашай мяжы — у Крынках. Дзіўнае адчуванне, калі ехалі ўздоўж мяжы: вось яна, родная зямля, 300 метраў нейкія, а перайсці не можаш — калючы дрот, узараная паласа, вежы з пагранічнікамі. Са свайго боку гэта здавалася натуральным. Польскія пагранічнікі мяжу не ахоўвалі. Начальнік заставы да позняй ночы піў з намі гарэлку.

А пасля Альштын. Старажытныя палацы. Азёры. Край гэты зачараваў мяне. Гісторыя не ў кнігах, а вось такая — наяве, увасобленая ў архігэктуры, у музеях (музей Каперніка!), робіць нейкае асаблівае магічнае ўздзеянне. Пасля я слухаў узнёслыя захапленні У. Караткевіча архітэктурнымі помнікамі і кожны раз прыгадваў свой «альштынскі настрой».

У тыя гады я меў надзвычайную прагнасць да ведаў, да кніг, да новых людзей, да новых уражанняў.

Там жа ў Альштыне мы апынуліся ў незвычайнай сітуацыі і пасварыліся паміж сабой: мы з Максімам — супраць Аркадзя. Куляшоў быў чалавек своеасаблівы. Складаны, супярэчлівы. Але Паэт — з вялікай літары. Не толькі ў сваёй паэзіі, тут якраз ён рабіў уступкі свайму сумленню і напісаў кан'юнктурнага не менш за Броўку і Танка. Паэтам ён быў у жыцці. У той час ён быў закаханы ў Лілю Драздову, актрысу тэатра, жанчыну цікавую. Тэатр застаўся ў Варшаве і на другі дзень меўся выехаць некуды на перыферыю. Аркадзь гэта ведаў. Па плану мы павінны былі вярнуцца ў сталіцу напярэдадні ўвечары. Але гасціннасць альштынцаў паламала ўсе графікі. Вячэралі гадзін да дзвюх ночы. Куды ехаць! Кастрычнік, туман. Выпрашылі начаваць. А Куляшоў — у аглоблі: ехаць, і ўсё! Абачлівы Максім пасварыўся з ім. Добрыя гаспадары не павінны былі адпускаць нас. Але ў гаспадароў псіхалогія зразумелая: хутчэй пазбавіцца ад гасцей, да таго ж яны адказвалі за графік, ім маглі кіўнуць з цэнтра за зрыў яго. Як мы ні супрацiўляліся з Максімам — Аркадзь настояў: ехаць пасярод ночы. Во — сіла кахання! Ці дурноты? Я пачуў, як мацюкнуліся вадзіцелі машын. Вельмі можа быць, што яны не толькі павячэралі, але і «прычасціліся».

Туман у даліне Вісты — не прабіць. Цвярозы Танк злосна хмыкаў. Я, ап'янелы, засынаў і прачынаўся: у падкорцы трымаўся страх. Куляшоў весела жартаваў — каб не заснуў вадзіцель. Нейкія 220 кіламетраў ехалі шэсць гадзін. Лілю Аркадзь не захапіў у гасцініцы — тэатр выехаў раней. Гэта пацешыла Танка. На снеданні і ў самалёце да Катавіц яны памяняліся ролямі: вясёлы быў Максім, змрочны і злы Аркаша, палыселы закаханы.

Варшава не зрабіла ўражання ні ў 1945-м, ні ў 1955-м, ні пазней. Зрабіў Кракаў. У першы раз, другі і трэці. Хоць трэці — гэта ўжо ў 70-х гадах. Нас чацвёра ездзіла ад СП СССР. Але ніхто намі не займаўся, кінуты мы былі на волю лёсу. Праўда, нават галадалі багатыя класікі: грузін Нонашвілі, малдаванін Іван Чабану, латыш Гунар Цыруліс і я, аўтар паўсотні выданняў. Усю групу ратаваў я: па-першае, захапіў рублёў 500 грошай, а палякі іх ахвотна абменьвалі, па-другое, не пасаромеўся з'ездзіць у газету, якая апублікавала маё апавяданне, і яны мусілі выплаціць нейкі ганарар. І польскіх пісьменнікаў напаіў і накарміў. З'ездзіў да нашага пасла, былога сакратара ЦК КПБ С. А. Пілатовіча, ён толькі пачынаў сваю дыпламатычную дзейнасць, і ў размове падкінуў яму ідэю: выкарыстоўваючы наш прыезд, пазнаёміцца з польскімі пісьменнікамі — прыняць трупу ў пасольстве. Ён ажыццявіў гэтую ідэю. На прыём прыйшлі і правыя і левыя. На дурніцу палякі любяць выпіць. А хто не любіць?

Эх, як мяне носіць! Я ж пачаў з Югаславіі. А з Югаславіі я пачаў, каб расказаць пра чарговую, пасля «Крыніц», кнігу — як нарадзілася задума.

19 лютага

Сабраліся мы ў Югаславіі ў добрай кампаніі — Танк, Панчанка, Брыль і я. Але ў апошні час мяне адлучылі ад іх, каб зрабіць старастам другой групы. (Двойчы я ездзіў у турысцкія падарожжы ў гэтай якасці — пастухом! І ў трэці раз адмовіўся ад паездкі, спаслаўшыся, што нездаровы, і ўсё роўна мне ківалі: маўляў, падвёў.) А староста трупы нават не пастух, а бог ведае што: любая дурная баба лічыць, што ты павінен выконваць яе капрызы. А гэта ж быў усяго яшчэ 1956 год! Два месяцы пасля XX з'езда. І — Югаславія! З ёй толькі што Хрушчоў аднавіў адносіны, разарваныя Сталіным у 1948 годзе.

Між іншым, у тую першую паездку я, лапух, так і не дапяў, што нада мной і ўсёй групай быў сапраўды староста ў абліччы радавога турыста: работнік органаў. У гэтым было маё шчасце, што я не дапяў, гэта дало раскаванасць, свабоду, хоць, сапраўды, радавыя турысткі, такія ж наіўныя, як я, настрой мне псавалі. Адна дурніца, работніца АН, у Спліце дэманстрацыйна пакаціла на матацыкле з югаславам на ўсю салаўіную прыморскую ноч. Можна здагадацца, чым яна займалася. А я не спаў бадай жа ўсю ноч. Дарэчы, і група настроілася супраць яе, асабліва бабы — ад зайздрасці, ці што? На другі дзень давялі яе да слёз, да істэрыкі. І жанчына паводзіла сябе, як пабіты сабачка,— перад усімі віляла хвосцікам. А мяне вельмі прасіла не дакладваць у Акадэмію. На ліха мне! Шкада яе «плявацельніцы»? Між іншым, усе змаўчалі. Сустрэла яна мяне, мабыць, праз год і вельмі дзякавала, я не адразу нават сцяміў, за што так дзякуе,— забыўся на прыгоду. Няўжо не было старосты? Быў. Але яна ўлашчыла яго. Выходзіць, некаторыя здагадваліся, хто сапраўдны староста, адзін я хлопаў вушамі. Пасля расказвалі Максім, Пімен і Янка пра свайго «старасту», які палюбіў пісьменнікаў, як братоў родных,— не адступаў ад іх.

У тым жа 1956 годзе мы ездзілі з Андрэем Макаёнкам у Фінляндыю ў складзе поезда міру, чалавек 120. У гэтай групе кагэбіст не таіўся, і гэта было натуральна і нікога не абражала: мір мірам, а служба службай — бяспека. Да гэтага мы былі прывучаны. Аднак яшчэ раз паўтараю: слежкі за пісьменнікамі тут, у Мінску, не адчуваў і ў 1948-1953 гады, у сталінскі час, інакш нас напэўна перасаджалі б за крытычныя ацэнкі рэчаіснасці, асабліва калгаснай. Таму і насцярожанасці ніякай не было ні пры паездцы ў Польшчу, ні пры паездцы ў Югаславію. Яна з'явілася пазней, калі ў 1960 годзе я ў другі раз

паехаў турыстам — паплылі з Машай па Дунаі ад Ізмаіла да Вены. І зноў мяне ў старасты групы. Як я адбіваўся! Але паклікалі ў ЦК: «Давяраем вам». А група — сталыя людзі; чалавек шэсць акадэмікаў і прафесараў, дацэнты, дырэктары заводаў, магазінаў. Тут я ўжо адразу, на інструктажы, пачаў ламаць галаву: хто ён, сапраўдны староста? Не мог вызначыць і пакутаваў: гаўно псіхолаг, а лезеш у знаўцы чалавечай душы!

Ён з'явіўся ў Кіеве, там групу папоўнілі ўкраінцамі — данецкімі шахцёрамі. І адразу выдаў сябе, яшчэ ў поездзе да Адэсы. Дурань. Пачаў шпыняць Машу — што яму трэба было ад яе? І тая добра адбрыла яго. Вопытнага акадэміка Мікалая Васільевіча Турбіна спалохала, ён сказаў мне: «Смелая ў вас жонка. Але скажыце ёй: з гэтым чалавекам няхай не заядаецца». Хоць чалавек той адрэкамендаваўся намеснікам міністра. І легенда неразумная. Але яна дала мне магчымасць узвальваць свае абавязкі на яго: вы ж міністр! Праўда, тут абавязкі былі няцяжкія і кантынгент не той, што ў Югаславіі, умовы іншыя — увесь час на сваім цеплаходзе і ўсе перагаворы з уладамі і туркампаніямі вёў капітан.

Зноў адступаю. Дарэмна. Пра дунайскае падарожжа варта запісаць асобна, калі храналагічна падступлю да шасцідзесятых. Вяртаюся ў Югаславію.

Як ні псавалі мне часам турысткі настрой — адна паехала, другая адстала, трэцяя забылася штось у гасцініцы,— гэта быў выдатны адпачынак, такога я ў сваім жыцці не меў. І пазнанне новага. Між іншым, для параўнання з сучаснымі цэнамі: кошт пуцёўкі — 800 (да рэформы 1961 года) руб. на 21 дзень! Дзіва!

Пачатак чэрвеня. Цеплыня. Казачная прырода. У Дуброўніку адразу палезлі ў мора, хоць югаславы здзіўляліся: для іх сезон яшчэ не пачаўся. А мора — сляза, на 10-15 метраў на дне відаць кожны каменьчык, медуза.

Югаславы пасля разрыву праяўлялі да нас павышаную цікавасць. На буйных заводах прымалі турыстаў на ўзроўні калі не дырэктараў, то старшынь заўкомаў ці парткомаў, не ніжэй, і... стараліся перавярнуць нас у сваю веру — даказаць перавагу сваіх форм эканомікі над нашай сістэмай. А яны рабілі прыкладна тое, што мы пачалі гадоў праз трыццаць,— ішлі да свабоднага рынку.

Я быў прагны, засыпаў югаславаў пытаннямі, падкаваны пасля партшколы марксіст, спрачаўся з імі, бабы шыпелі на маю цікаўнасць. А ў аўтобусе, гледзячы на горы, на ўробленыя палі, я расслабляўся, пагружаўся ў нейкую вельмі ж прыемную элегію, настальгію па дому, у смутак па жонцы, па дзецях. І неяк зусім інакш,

чым на вайне,— больш узнёсла, паэтычна, успамінаў вясну нашага кахання, жаніцьбу, развітанне, калі я адыходзіў у армію.

Я пісаў аповесць. У галаве. Не адразу нават сцяміў, што пішу. Праз колькі дзён спахапіўся: божа, дык я ж пішу! І гэта было надзвычай радасна — так пісаць. Так лёгка, так проста. Не напружваючыся, не тужачыся, шукаючы сюжэтныя хады, вобразы. Усё прыходзіць само — і надзвычай, як кажуць па-руску, «осязаемо», ёмка, поўна, ярка. Пэўна, так ствараюцца натхнёная паэма, вершы.

Вяртаўся дадому з гатовай аповесцю. Надзвычайная паездка! З той жа лёгкасцю і радасцю там, дзе нарадзілася наша каханне — у Церусе, запісаў аповесць на паперу — за які месяц, не больш. Гэта была «непаўторная вясна».

А пачаў рыхтаваць у друк і сцяміў — гэта ж пачатак кнігі аб лёсе майго пакалення. І пачаў пісаць гэтую кнігу — «Трывожнае шчасце», спачатку тэтралогію. Пісаў ужо звычайна, па засвоеных прыёмах творчасці — сачыняў з пакутамі, бяссоннымі начамі, пошукамі матэрыялу, партызанскага,— для «Начных зарніц». «Агонь і снег» ішла лягчэй і атрымалася такой жа натуральнай, як і «Непаўторная вясна». А ў «Пошуках сустрэчы», нельга не згадзіцца з крытыкай, збіўся на прыгодніцтва, меў такую слабасць.

24 лютага

Хрушчоўская адліга сапраўды была вясёлым часам. Вярталіся «декабристы», як жартаўліва, але з павагай называлі тых, хто 18-20 гадоў назад быў вырваны з літаратуры і з жыцця. Мы, маладыя, цёпла сустракалі іх, без усялякай перастрахоўкі. Баяліся хіба Броўка, Глебка, Куляшоў, што я расказаў у эпізодзе з Хведаровічам і Агняцвет. Недзе яшчэ ў годзе 1954 ці 1955 у СП напісаў пісьмо Іван Аляксеевіч Скрыган. Я нават не ведаў, што быў такі пісьменнік. Спытаў у Броўкі, той адазваўся аб ім хораша. І я напісаў Скрыгану доўгае пісьмо — аб справах у СП, у літаратуры, хто я, хто мы — ваеннае пакаленне. Вярнуўшыся, Янка прызнаўся, што пісьмо вельмі кранула яго, бо першае было такое за 18 гадоў, хоць пасля вайны, да другога высялення, ён працаваў вольна ў Таджыкістане і нават у Эстоніі (адкуль яго выслалі). Ён быў надзвычай удзячны мне, і мы пасябравалі. Між іншым, Ян Скрыган адзін з тых, хто вярнуўся не азлобленым. Уступіў у партыю. Пісаў добрыя апавяданні, нават пра бяду сваю, аптымістычныя. Такім жа быў Хведаровіч Мікола. Злосць прарывалася ў Бярозкіна і Звонака, але баязлівая ў той час. Бярозкін быў адзінокі, без сям'і, любіў выпіўку, смачную ежу. Мы, я ў тым ліку, ахвотна адгукаліся на яго запрашэнні завалiцца ў рэстаран, за наш

кошт, безумоўна, на яго ніхто і не разлічваў — бедны былы вязень. З ім было цікава: эрудыт і добры расказчык; п'яны ён шмат расказваў пра лагер таго, што пазней прачыталі ў Салжаніцына.

3 сакавіка

Здавалася, што тэтралогію я напісаў хутка — за які год. Не. Паглядзеў у бібліяграфіі даты публікацыі. «Выдыхнуў» я толькі «Непаўторную вясну», у першым нумары «Полымя» за 1957 год апублікаваў. «Начныя зарніцы» надрукаваў толькі ў канцы 1958-га, «Агонь і снег», «Пошукі сустрэчы» ў канцы 1959 года.

Значыцца, у 1960-м я пісаў ужо «Сэрца на далоні», доўгіх прастояў у мяне ў той час не было, хоць і сістэматычкай працы — з дня ў дзень, як, напрыклад, над «Зенітам» ці «Злой зоркай», таксама не было — адрывала праца ў СП, грамадская актыўнасць— паездкі, выступленні, напісанне артыкулаў, спакусы бытавыя — рэдка калі адмаўляўся ад пісьменніцкай кампаніі, а «казу вадзіць» мы любілі, можа, у час адлігі яшчэ ў большай меры — свабода! Ды і багацелі, мелі за што выпіць і закусіць. Ніводзін, бадай, прыход у СП акадэміка Пятра Глебкі не канчаўся «акадэмічным» развітаннем, заўсёды — начным цалаваннем.

Але Глебка не пісаў, яму не хацелася пісаць. «А навошта, Іване?» — адказваў ён на мае пытанне. У мяне такога пытання не ўзнікала. І дагэтуль не ўзнікае. Я тварыў. Фантазіі — вулкан. Раман «Сэрца на далоні» па чытабельнасці мог параўнацца хіба з «Глыбокай плынню». Пасля ўжо ніводзін раман так не чытаўся — час у чытачоў адбірае тэлебачанне. Хоць «Атланты...», якія не прызнаваў Мележ, былі бестселерам 70-х гадоў не толькі ў Беларусі, але і ў Саюзе — пасля апублікавання ў «Роман-газете». Па «Сэрцы...»быў паток пісем. Я мусіў напісаць і апублікаваць у «Советской Белоруссии» цэлы артыкул «Размова з чытачом», які пасля стаў назвай кнігі крытыкі і публіцыстыкі. Я адказваў на пісьмы чытачоў, на іх пытанні. Але, праглядаючы той артыкул сёння, мне здаецца, што і ў ім я сачыняў — выстрайваў сюжэт, які мог падабацца тым, хто захапляўся раманам. У сапраўднасці і тады, і сёння я не магу ўспомніць, што з'явілася штуршком для напісання такой рэчы — якія факты, прататыпы. І «Снежныя зімы», і «Атланты...» мелі такую «точку отсчета». Адно праўда, што я і напісаў у артыкуле,— «побуждающим мотивом» была гісторыя Мінскага падполля. Здаецца, у 1957 годзе я два дні сядзеў на нарадзе былых падпольшчыкаў, пасля XX з'езда яны адважыліся сабрацца, і тыя, хто ацалеў, і тыя, што вярнуліся з берыя-цанаваўскага «курорта» (многія сядзелі). Думкі ў падпольшчыкаў аб сваёй

арганізацыі, аб кіраўніках былі самыя супярэчлівыя, спрачаліся яны да асабістых абраз. Асабліва многа гаварылі пра Івана Кірылавіча Кавалёва. Пра Казінца — так мала, што тады я не запомніў гэтае прозвішча, яно ўсплыло значна пазней.

Пра Мінскае падполле многа гаварылі нашы «літаратурныя даследчыкі», такія ўсезнаўцы, як Анатоль Вялюгін. Але пісалі пра яго кан'юнктуршчыкі, як Алесь Кучар («Гадзіннік спыніўся апоўначы»). Без паглыблення ў гісторыю напісаў сваю драму «Людзі і д'яблы» і Кандрат Крапіва. Яго зламалі гісторыяй з «Мілым чалавекам», і некалі смелы і мудры драматург выкладаў афіцыйную версію. А афіцыйная версія — гэта версія В. Казлова, І. Варвашэні, якую падтрымліваў П. Панамарэнка, а следам за ім і К. Мазураў.

4 сакавіка

Тое, што я пачуў ад падпольшчыкаў на нарадзе і пры наступных сустрэчах, размовах (некаторыя з былых падпольшчыкаў працавалі ў выдавецтве — Вольга Крайко, Казачок, яшчэ нехта, усіх ужо не помню), не адпавядала версіі Казлова. Было ў Мінску падполле! Ды яшчэ якое! І гэтыя людзі, што ў першыя месяцы акупацыі ўзняліся на барацьбу, арганізаваліся, заслугоўваюць асаблівай славы. Гэта былі бясстрашныя адданыя камуністы. Мне хацелася напісаць пра іх раман. Але я ўсё яшчэ знаходзіўся ў палоне партыйных догмаў і занадта верыў у вывады, ацэнкі партыйных органаў — гаркома, абкома, ЦК. Той жа Казлоў быў для мяне непагрэшным аўтарытэтам. Але, напэўна, ужо да пачатку працы над «Сэрцам...» аўтарытэт гэты хоць і не знізіўся, але я пранікаў у чалавечую сутнасць гэтых людзей і... спускаў іх з неба на грэшную зямлю. Я зразумеў: прызнаць Казловым, Варвашэнем, Бондарам Мінскае падполле, з якім яны нават не здолелі ўстанавіць сувязь, значыцца прызнаць, што абком меў уладу, кіраваў барацьбой на даволі абмежаванай тэрыторыі — у Любанска-Старобінскай зоне. Паўночней Слуцка не выходзілі. Здавалася б, навошта ім пыжыцца. Ну, не маглі вы пранікнуць у першы год-паўтара акупацыі ў Мінск — то прызнайце гэта, партызанскія шапкі з вас не спадуць, ордэнаў назад не забяруць. Не, прасцей зрабіць Кавалёва правакатарам і сотні сапраўдных герояў, што ішлі на смерць, супрацоўнікамі СД. А мы, маўляў, мудрыя: таму і не ішлі на сувязь з Мінскам.

Асэнсаванне чалавечага падзення (у імя чаго?) увогуле мужных людзей ашаламіла мяне і... нарадзіла Гукана — вобраз, якога бадай няма не толькі ў беларускай літаратуры, але і ва ўсёй савецкай літаратуры пра вайну. Крытыка не адразу дайшла да яго сэнсу. Адзін Сяргей Гусак, крытык сур'ёзны і ўдумлівы, праз паўгода пасля

апублікавання рамана выступіў у «Немане» з рэцэнзіяй, якую так і назваў «Падзенне Сямёна Гукана».

Пошукі Іванам Новікавым герояў падполля далі мне Кірылу Шыковіча.

Пасяляць герояў у Мінску я не адважыўся, адчуваў: залезу — не вылезу, а матэрыялу яўна не хапала; і сёння, пасля «Гандляркі...», «Ахвяр», у якіх героі дзейнічаюць у Мінску, я не гатовы да шырокага палатна, хоць трагедыю Кавалёва варта было б напісаць, бо разумею яе.

Антон Яраш — падпольшчык — Кабушкін, пра гэтага хлопца ўжо ў першыя пасляваенныя гады хадзілі легенды. (Яшчэ адзін дзіўны, пакуль што не асэнсаваны мной парадокс: Іван Фролавіч Клімаў, які дваццаць гадоў ваюе за Кавалёва, мужны для свайго ўзросту чалавек, не прызнае Кабушкіна, лічыць яго агентам СД, без дакументальных доказаў. «Чуццё»,— кажа ён. Не веру ў чуццё!)

Герояў я пасяліў у горадзе Н., пазнавалі Гомель. Перачытаў зараз «Размову з чытачом». Увогуле ўсё правільна, акрамя хіба таго, як канструяваўся сюжэт. Я спрасціў адказ на гэтае пытанне, усё больш складана, хоць перад сваім адказам я раблю вельмі правільную выснову: «Напісаўшы некалькі раманаў, аповесцей, п'ес, дзесяткі апавяданняў, я не адважваюся з гэткай лёгкасцю сказаць, з чаго пачаўся той ці іншы твор, як з'явіўся зародак сюжэта ці вобраза і што было першае — тэма, ідэя, сітуацыя, характар? Усе гэтыя, на першы погляд, простыя рэчы на самай справе з'яўляюцца даволі глыбокімі аспектамі псіхалогіі творчасці». Не адкрыццё, але сказана правільна.

Здзівіўся, што ў артыкуле ні слова аб тым, адкуль доктар Савіч, Зося. А між тым гэта той факт, калі невялікі газетны артыкул ці расказ вагоннага спадарожніка дае і сюжэт, і вобразы. Цяпер ужо не помню, у якой газеце, у якім горадзе гэта адбылося, але помню, што прачытаў я гэта на Украіне,— аб тым, як немцы з помпай пахавалі забітага імі ж урача, які, як устанавіў журналіст праз многа гадоў, з'яўляўся адным з кіраўнікоў падполля. Адразу, напэўна, не звярнуў увагі, таму ніколі не спасылаўся на гэтую публікацыю (пазней, пасля апублікавання рамана, даведаўся, што падобны факт быў і ў нас — у Мазыры ці ў Калінкавічах, і ў адказах, вусных, чытачам я зрэдку спасылаўся на гэты факт). Але што такое мастацкі вымысел? З'явіўся Гукан — і ў добрага сюжэтчыка павінны былі з'явіцца адпаведныя сітуацыя і вобразы — доктар Савіч і Зося, адносіны да якіх прывялі смелага партызана да нізкага падзення.

Маё калегі — такія «аналітыкі», як Кучар, звязвалі Гукана з Казловым, але ў іх «плётках» я адчуваў элемент правакацыі ў адно-

сінах рамана і аўтара — о, Кучару толькі дай зачэпку сутыкнуць людзей ілбамі — і катэгарычна адмаўляў гэтую сувязь.

8 сакавіка

Аднак акунуся я ў вясну жыцця, у цёплае мора маладосці. Гэта як бы ўцёкі ад сённяшняга дня, ад клопатаў бязрадаснай старасці. Але, яна была ў нас, вясна, непаўторная, трывожная напачатку, больш спакойная і багатая ва ўзросце 30-40 гадоў. Па мерках Захаду, жылі мы больш чым сціпла. Але ў параўнанні са сваім народам — бадай жа багата. У 1951 годзе, атрымаўшы Сталінскую прэмію, я купіў «Пабеду». У 1953 годзе атрымаў кватэру плошчай 72 кв. м, чатыры пакоі. Пліту на кухні палілі дрывамі, цягалі на чацвёрты паверх, і ўсё роўна — гэта раскоша, нават па мерках сённяшняга дня.

Мы мала падарожнічалі, рэдка ездзілі на курорты. Мы з Машай. Машу не пускалі дзеці, яна калацілася над імі.

Першы раз мы з ёй паехалі ў Кактэбель толькі ў 1953 годзе, калі Тані было пяць, а Сашу тры гады. Упершыню ўбачылі мора. Але, і я таксама. Якое мора бачыў я? Баранцава? Не бачыў я Баранцава, быў толькі ў вусці заліва, Белае — Кандалакшскую губу. Фінскі заліў — ад Петрадварца. Між іншым, там Маша ўпершыню ўбачыла мора, мы ездзілі ў Ленінград у 1951-м з дзесяцігадовай Лінай, жылі ў перакладчыка майго Арсенія Астроўскага, старога літаратара, інтэлігентнасць якога нас ашаламіла: ён і жонка яго, пражыўшы гадоў трыццаць, былі на вы. Машу і Фінскі заліў зачараваў. А ласкавая цёплая Кактэбельская бухта, казачныя горы заваражылі нас абаіх. У другі раз — пры маіх магчымасцях! — мы наведаліся ў той жа Кактэбель гадоў праз 12 з трыма дзецьмі, Таня нават жаніха свайго прыхапіла — Славіка, цяперашняга мужа, і ўсё. Больш я ў Кактэбелі не быў. А некаторыя ж не вылазяць адтуль. А маскоўскія «класікі» едуць, як у сваю вотчыну. Яшчэ аднойчы мы з'ездзілі з Машай у Гагры, з малой Алесяй, узялі Клаву з Наташай. Нябога гэтая Клава, урач, таксама ўпершыню ўбачыла мора. У 1957-1958 гадах мы былі ў санаторыі ў Місхоры — па няшчасці: гады тры я пакутаваў ад бранхіяльнай астмы, ад якой ва ўзросце 46 гадоў памерла Клава.

...Перапыніў тэлефонны званок. Званіў сын Грачанікава. Знайшоў бацьку ў моргу, выйшаў 5-га з дому, а сёння толькі знайшлі мёртвага. Божа мой! Мой малодшы сябра, зямляк, вучань, дабрэйшы чалавек. З адзінай славянскай слабасцю — залішне выпіваў.

Вось табе і свята. Як недарэчна абрываецца чалавечае жыццё! А гэта ж такое багацце: разумны чалавек, таленавіты паэт, рэдактар! Вечная табе слава, дарагі Анатоль!

9 сакавіка

Ён прыязджаў на семінары маладых, будучы яшчэ студэнтам ці інжынерам завода, але асаблівай увагі я не звярнуў на гэтага прыгожага, гусарскага выгляду хлопца. Зацікавіла хіба толькі, што ён з Шарпілаўкі, вёскі, блізкай ад Церухі, на правым беразе Сожа. Я помніў гэтую вёску з маленства, калі бацька быў лесніком пад Краўцоўкай; касіў на лузе сена і браў мяне з сабой. Мяне заварожваў Сож, мне здавалася, што на тым беразе другі свет. А там такія ж хлопцы лрыганялі паіць коней, купалі іх, купаліся самі, дражнілі мяне цераз раку. Паміж краўцоўцамі і шарпілаўцамі была рэўнасць: краўцоўцы зімой хадзілі да шарпілаўскіх дзяўчат і нярэдка біліся там.

З Шарпілаўкі ўзяў сабе жонку Мікалай, Машын брат. Як аднавокі інвалід забраўся туды, за раку? Было гэта ў 1946 годзе. На вяселлі я ўпершыню пераправіўся ў Шарпілаўку — ездзілі па нявесту. Васьмігадовы Толя Грачанікаў прысутнічаў на вяселлі: бацькі нявесты Горленкі і Грачанікавы — суседзі, і дзеці такой падзеі не прапускаюць, тым больш у галодную вясну сорак шостага. Анатоль расказваў пра гэта вяселле з гумарам, вельмі можа быць, што блытаў яго з многімі іншымі — сяло вялікае.

Рыгор Барадулін сачыніў эпіграму, што я цягну ў літаратуру гамяльчан. Калі рабіў першым сакратаром СП, у ЦК напісалі ананімку такога ж зместу — адкрываю шырокую вуліцу гамяльчанам на ўсе пасады. Лухта, безумоўна. Праўда ў іншым: у маладосці я часта ездзіў на Гомельшчыну, адпачываў там, пісаў, і натуральна, што сувязі з землякамі ў мяне былі больш шырокія, чым з гродзенскімі ці віцебскімі літаратарамі. Але з Грачанікавым я зблізіўся, калі ён працаваў у гаркоме камсамола. Не помню, з чаго пачалося. Напэўна, з літаратурнага вечара — ён вьщягнуў мяне да моладзі. Гэта было. А потым Леанід Гаўрылкін і ён прыехалі да мяне ў Церуху. Надзя ўзрадавалася, што яе сусед стаў маім госцем, і старалася пачаставаць найлепш.

А праз год ці два, калі Толя быў ужо першым сакратаром гаркома, у мяне ўзнікла ідэя прапанаваць яму паехаць на Вышэйшыя літаратурныя курсы пры інстытуце імя Горкага.

Гаўрылкін падтрымаў маю ідэю.

«Ну, станеш ты сакратаром гаркома партьі... і што? і загінуў твой талент. Быць паэтам і партработнікам немагчыма».

А талент яго раскрываўся, выйшла першая кніга «Магістраль». Пакутліва ён вырашаў гэтую дылему: ехаць — не ехаць. Я не ўлічваў адной акалічнасці: прыгажун-паэт паводзіў сябе па-гусарску — не прапускаў прыгожай жанчыны. Адносіны яго з Нэлай былі складаныя.

Яна адпусціла яго ў Маскву, але пазней прызнавалася: лічыла, што ад'язджае ён беззваротна. Змірылася.

Помню: я сядзеў у Церусе і яны прыехалі — Грачанікаў і Гаўрылкін. Толя ажно счарнеў. «У цябе чаму такі настрой? У Маскву едзеш!» — ужо было рашэнне аб залічэнні на курсы. «Сёння мяне вывелі са складу бюро гаркома. І адзін кінуў: дурням карысна павучыцца. Выходзіць, для іх я дурань...»

«Плюнь».

У той вечар я ўпершыню ўбачыў яго п'яным. Хоць і сам я цвярозым не быў.

Пра курсы тыя літаратурныя жартавалі: да паступлення на іх чалавек пісаў нармальна, у традыцыях сваёй літаратуры, пасля ж курсаў або зусім пераставаў пісаць, або сачыняў такое, што мы, кіраўнікі, хапаліся за вушы. Нас папракалі ў ЦК: «Каго пасылаеце?!» Грачанікаў, па-мойму, вярнуўся нармальным чалавекам і паэтам. І да сям'і вярнуўся. Нэла радавалася, прыехалі туды ж, у Цераху, абое і выглядалі маладажонамі. Але што рабіць у Гомелі? Тут Барадулін мае рацыю: Грачанікава перацягнуў у Мінск я. Назначылі загадчыкам аддзела «ЛіМа». Далі кватэру, з якой ён выйшаў апошні раз 5 сакавіка. Харошы рэдактар быў. Шчыры чалавек. Яго любілі. І ніхто не запярэчыў, калі праз два гады на чарговым з'ездзе я прапанаваў выбраць яго намеснікам старшыні Саюза пісьменнікаў — трэба маладыя кадры. Равеснікі віталі яго выбранне. Працаваў ён шчыра, без палітыканства, на што часам хварэлі некаторыя калегі яго і равеснікі. Малады, энергічны, безадказны ў выкананні любога даручэння. Работа з маладымі, выступленні, паездкі — усюды Толя, вясёлы, дасціпны, разумна скептычны да шмат якіх нашых мерапрыемстваў, навязаных зверху. Але ён быў залішне добры, мяккі і... слабы. І гэтым карысталіся людзі, якія прыкідваліся сябрамі, а на самай справе — ворагі злыя.

10 сакавіка

Апошні раз мы сустрэліся 13 лютага.

Адбылося пасяджэнне прэзідыума Камітэта міру, якое я вёў. Анатоль — член прэзідыума. Збіраюцца нашы члены не вельмі актыўна, найбольш акуратныя ветэраны. Грачанікаў падтрымліваў старшыню — мяне і з'яўляўся часцей, чым іншыя. Актыўнічаў. Была ў яго і зацікаўленасць: замежныя паездкі, ён любіў ездзіць, і яго ахвотна пасылалі не толькі па лініі Камітэта, але і ЦК ЛКСМБ, Таварыства дружбы, ды і СП, хоць ахвотнікаў там больш, чым камандзіровак.

На тым апошнім пасяджэнні ён сядзеў змрочны, маўклівы — ніводнага жарту. Мне не падабаўся яго настрой.

Выйшлі разам. Чакала мяне машына. «Паедзем да мяне, ты ж не выпіў чаркі за мае 70 год. Мне нават няёмка, што я не здолеў запрасіць цябе».

Анатоль ахвотна згадзіўся. За сталом трохі ажывіўся. Жартаваў. І разважаў вельмі сур'ёзна аб становішчы ў краіне, з болем. Выпіў тры маленькія чарачкі — «напёрстки». І — стоп! Мяне гэта ўзрадавала: у чалавека з'явілася сіла волі. Між іншым, пра гэта мне сказала і Нэла: трымаўся Толя, і яны радаваліся — яна, Алеся, Андрэй.

Няпоўны расказ Андрэя па тэлефоне і пасля, учора, званок Эдуарда Скобелева наводзіў на думку: забойства. Не. Учора я наведаўся да ўдавы, дзяцей.

Толю падабралі 5 сакавіка ў 11 гадзін дня на праспекце Машэрава з траўмай галавы. Завезлі ў бальніцу, зрабілі аперацыю, і ён жыў да вечара сёмага. А сям'я нічога не ведала, бо ён быў без дакументаў. Званілі ў тую ж бальніцу, але служба інфармацыі ў нас ганебная: раз няма ў моргу — значыцца, не паступаў. Заключэння Андрэю не выдалі, але здаецца мне: кровазліццё ў мозг. Хто мог ударыць у такім людным месцы пасярод дня? Не было ў яго такіх ворагаў, бо нікому ён не рабіў зла.

Так трагічна загінуў адзін з лепшых нашых паэтаў. Сумна. Звужаецца кола сяброў — мацней цісне абруч адзіноцтва.

14 сакавіка

Сумна і горка. Не толькі ад смерці таварыша — ад таго, як разладжаны ўсе нашы структуры.

Сям'я Грачанікава папрасіла пахаваць Анатоля на Усходніх, ці, як іх называюць у народзе, Маскоўскіх могілках. Яны закрытая, і хаваюць там толькі выбраных, славутых, з нашых апошняга — Крапіву.

Званю ў панядзелак 11-га ў гарвыканком, у 9 раніцы — каб захапіць кіраўніцтва. Ужо засядаюць — планёрка. Усе. Старшыня савета, выканкома, намеснікі. Што плануюць? Пасля трох выхадных нікому нельга дазваніцца.

Праходзіць гадзіна, другая — звоніць Вільтоўскі, які дзяжурыць у гарвыканкоме, каб атрымаць дазвол на месца пахавання. Нічога не вырашаецца. У Мулярчыка даведваюся, што ён асабіста перадаў распараджэнне Малафеева. Гарсаветчыкі не выконваюць? Указанне першага сакратара ЦК? І гэта тыя самыя людзі, што яшчэ два гады назад выцягваліся ў струнку!

Гадзіны ў дзве званю Мазай. Яна шчыра прызнаецца, што яе званка будзе мала. Званка намесніка Старшыні Саўміна — не па глабальнай праблеме — аб пахаванні аднаго пісьменніка! Ніна дае мне «адрас»: да Малафеева паехаў Кебіч. Званю Мулярчыку, літаральна вымушаю маладога загадчыка аддзела падняцца да першага і разам са Старшынёй Саўміна вырашыць гэтую праблему. Нарэшце вырашаюць! Ды і пасля гарсаветчыкі яшчэ круцяць. У канцы дня мне звоніць Г. П. Сянкевіч, нам. старшыні, які вядзе камунальную гаспадарку, пачынае выпытваць: а ці зразумеюць нас пісьменнікі, што пахаваем Грачанікава побач з Крапівой, Караткевічам. О божа! Даруй мне, грэшнаму. Але хацелася загнуць «у бога, душу маць». Няшчасная літаратура! Так мы паміраем, так нас хаваюць! Але эпізод гэты характарызуе ўсю сітуацыю, разлад структур, калі патрэбна столькі намаганняў, каб пахаваць чалавека, то як жа вырашаюцца глабальныя пытанні, якія закранаюць лёс тысяч, мільёнаў, усяго народа?!

Між іншым, гэтая бюракратычная цяганіна мела працяг. Прывезлі нябожчыка на могілкі, а магіла не гатова. Гадзіну чакалі ды гадзіну хавалі. Прамерзлі. Я ў зімовым паліто быў і літаральна акалеў, а некаторыя ў куртачках на «рыбьем меху».

І яшчэ адна дэталь: на памінках у нашым пісьменніцкім кафэ не паставілі нават малых чарак — адны фужэры. Пакралі іх, ці што? Змёрзлыя людзі хапілі па фужэру гарэлкі — і адразу тлум, бязладныя выступленні, рэплікі. Даруй ім, Толя. Ты сам быў гэткі ж завадны пад чаркай. Старэйшы брат Рыгор, палкоўнік у адстаўцы, плакаў пры развітанні больш, чым жанчыны. А ўвогуле плакалі многія. Гэтага «завадnога» чалавека любілі: ён сапраўды-такі быў Чалавек і Паэт.

15 сакавіка

Я ўспамінаў, як мы, маладыя, адпачывалі. Настроіцца на лірычны лад пасля пахавання, пасля бурнага пасяджэння ў БелСЭ вельмі нялёгка. Але хочацца паслядоўнасці. У гэтых запісах, хоць яны і дзённікавыя — пад настрой, ёсць свой унутраны сюжэт; я адчуваю яго, як сюжэт рамана.

Адпачываць мы не ўмелі. Усе, нават класікі; Крапіва за ўсё доўгае жыццё толькі двойчы ездзіў на курорт, сам неяк прызнаваўся. Ды магчымасці былі небагатыя. Цяпер хоць дач набудавалі. Хоць які адпачынак на чатырох сотках зямлі, калі чуваць, як псуе паветра суседка?

У пэўным сэнсе мая сям'я ў тыя далёкія гады апынулася ў найлепшых умовах. Яшчэ калі працаваў настаўнікам у Пракопаўцы, выпісаў лес, удзельнікам вайны ён выдаваўся бясплатна. Выпісаў на

бацькаў абход. Бацька нарыхтаваў бярвенні і зрубіў зруб. Невялічкую хаціну, сем на шэсць, калі не менш, бацька мой не мог дазволіць, каб у сына была большая хата, чым у людзей, усім франтавікам выпісвалі аднолькава, здаецца, па 25 куб. м. Мы з Машай не думалі, што так хутка апынёмся ў Мінску, і марылі пра ўласную хату і... пра карову — вяршыня мар сельскіх настаўніка і фельчаркі.

Бацька бамбіў пісьмамі: што рабіць са зрубам — гніе. А мы ўжо разбагацелі, грошы нам не трэба былі, і я па невядомых прычынах не даваў згоды на прадажу: няхай стаіць — есці не просіць. А потым разбагацелі яшчэ больш, Сталінскую прэмію атрымаў, і ў Машы з'явілася ідэя: пабудаваць дом для Вольгі, якая з-за іх, малодшых, засталася адзінокая. Куды ёй дзявацца пад старасць? Будаваць у Церусе — не было сумнення. Цесць Філат Азаравіч і Мікалай ухвалілі нашу ідэю і ахвотна ўзяліся за будаўніцтва: разумелі, што гэта і для Вольгі, і для маёй сям'і. З такім разлікам месца выбраў я: вынес дом да рэчкі Церуха, сто метраў ад хаты цесця, перад іх вокнамі, але пад вербамі, на наносным пяску. Суседзі хмыкалі, але стары Філат, паэт у душы, выхаваны на класічных кнігах, ухваліў. Коля спачатку скрыпеў, а пасля і яму падабалася. Суседзі-сяляне здзіўляліся: што будзе расці на гэтым пяску? А вырас, між іншым, выдатны сад — пакуль жыў бацька, пра гэта я пісаў у першай кнізе «Карэнняў...». Цяпер, між іншым, побач з нашай хатай выросла цэлая вуліца.

Карацей кажучы, у 1952 годзе, улетку, сям'я мая адпачывала ў райскім кутку. Толькі і клопатаў было ў Машы глядзець, каб малыя самі не палезлі ў рэчку. А Церуха ў той час была чысценькая, з пясочкам на дне, у засені вербаў, алешын. У двухстах кроках — калгасная гідрастанцыя, тая, што была прататыпам будоўлі ў рамане «У добры час». Калі электрык не напіваўся, давала святло. Але самае прыемнае — шум вады на плаціне. Ласкавы шум, пад які і добра пісалася і добра спалася. А колькі было рыбы! Філат ішоў з таптухай, бадай, штодня і за дзве-тры гадзіны прыносіў унукам торбу рыбы — лінёў, шчупакоў.

Магчымасць пакінуць малых на такіх надзейных нянек, як Вольга і Клава, дазволіла Машы паехаць упершыню да мора — у Кактэбель.

Мне хораша пісалася ў Церусе. Прыемна адпачывалася. Я сябраваў з кіраўнікамі, з леснікамі. Ледзьве не штодня прагульваўся па казачным лесе да Пыхані — па дарозе, па якой некалі хадзіў у школу. Радасныя ўспаміны будзілі фантазію, асабліва калі працаваў над «Трывожным шчасцем». У Пыхані гасцінна сустракаў ляснічы Мікалай

Нікіціч Палевікоў, цікавы і дасведчаны чалавек, выдатны знаўца сваёй справы — лесаводства.

Сапраўдным святам было, калі прыязджаў Андрэй, з маладой прыгожай Ленай, з малымі Алай і Сяргеем. Андрэй захапляўся спінінгам. Мы ехалі да Сожа і цэлы дзень сцябалі блёснамі па вадзе, як правіла, без улову. А дзеці купаліся, гулялі на лузе. А які там луг! Які прастор! У мяне кожны раз дух захоплівала, як толькі выязджалі з цярухскага сасняку да старыцы Кажэўя. Якія назвы: Казары, Кажэўя, Качча! Так і дагэтуль я не прачытаў нідзе этымалогію гэтых назваў.

У 1954 годзе я атрымаў правы, па сутнасці, не ўмеючы вадзіць машыну, атрымаў залік «па блату», экзаменатару, старшаму лейтэнанту — жанчыне вельмі спадабалася «Глыбокая плынь». Пагаварылі пра раман — і ездзі на здароўе. Да таго ж я, дурань, два гады з палавінай трымаў шафёра, які бессаромна абіраў мяне, ледзьве не штодня ў новай машыне нешта «ламалася»: гані, Іван, грошы!

Шафёр СП адвёз мяне ў Церуху, і там я асвойваў упраўленне аўтамабілем. Як вучыўся — пра гэта варта напісаць вясёлае апавяданне. Але навучыўся. Праз месяц-паўтара з Церухі ў Мінск прыехаў сам, везучы поўную машыну дзяцей.

Маладосць — гэта смеласць. І рызыка. Які я быў вадзіцель, маючы практыку тры-чатыры месяцы, бо зімой не ездзіў, аднак адважыўся ў наступнае лета паехаць з дзецьмі ў Адэсу ў Дом творчасці.

Ад Церухі да Белай Царквы дарога нішто. А далей — праз Умань, Першамайск — жах! Нейкія восемсот кіламетраў, а дзве ночы начавалі ў дарозе. Другая ноч у стэпавым сяле. Дзецям далі прытулак, а я спаў на двары і прачнуўся ад таго, што мяне мачыў дождж. Перабраўся ў «Пабеду», сядзенне ў «Пабедзе» не раскладвалася, дасыпаў, скурчыўшыся.

Які я быў вадзіцель — сведчыць такая дэталь. Праз два-тры дні Мікола Нагнібеда ўзяўся паказаць нам з Машай Адэсу. Паказаў. Ехалі — маўчаў. А вярнуліся ў Дом творчасці — выцер пот з ілба і сказаў: «Больш я з табой не паеду. У вайну столькі стрэсавых сітуацый не меў».

Але што асабліва ўразіла і адбіла жаданне ездзіць на курорт на машыне — гэта адсутнасць калонак, вымушанасць купляць крадзены бензін, а купляць прыйшлося нават у камбайнера, што я, малады ідэаліст, асабліва перажываў.

Дзецям мора падабалася — не выцягнуць. А Машы гэта было пакутаю. І яшчэ адно: гасцінныя ўкраінцы — Нагнібеда, Чалы, Гайдаенка — так часта спакушалі на чарку, што Маша пачала сварыцца з імі. Аднойчы яны павезлі мяне на лоўлю бычкоў. Выйшлі ў мора кіла-

метраў за дзесяць, і ў нас заглох матор. Пакуль дайшлі на вёслах! Іх жонкі, марачкі, прывычныя. А Маша пачарнела ад страху, стоячы ля мора. Больш на рыбалку мяне не адпускала. Нават Мікола Львовіч не мог яе ўгаварыць. Там мы пасябравалі са Сцяпанам Алейнікам і яго жонкай Клаўдзіяй Іванаўнай. Алейнік для Машы стаў ідэалам: цвярозы, разважлівы чалавек — не раўня Чаламу, які штовечар выдумляў розыгрышы, часам некарэктныя, крыўдныя. Гулялі казакі!

16 сакавіка

У 1957 годзе сядзеў я неяк на партактыве. Нехта з ветэранаў партыі крытыкаваў гарком і выканком: план будаўніцтва жылля не выконваецца, а ў Ждановічах Міністэрства будаўніцтва будуе дачы. Каму?

Выступіў першы сакратар, былы гомельскі партызан, вясёлы чалавек А. Д. Рудак. І... як кажуць, «свіснуў»: будуюць для вучоных, пісьменнікаў... Якіх пісьменнікаў? Першы раз чую — я, намеснік старшыні СП. Я не адважыўся вылезці з гэтым пытаннем. Але адказалі без мяне:

«Хто там з пісьменнікаў? Не ведаем. А вось Кагановічы ажно тры браты: дырэктар аўтабазы Саўміна, дырэктар кінатэатра, дырэктар магазіна».

Безумоўна, партызаны загудзелі: стварыць камісію! А я хутчэй да Броўкі — расказаў яму. Загарэўся Пятро Усцінавіч. Данёс ЦК. Дзён праз колькі — званок з гарвыканкома: няхай пісьменнікі, чалавек пяць-шэсць, едуць у Ждановічы, выберуць сабе дачы; пасёлак ужо спланаваны, пракладваліся камунікацыі, пачыналася будаўніцтва. Броўка ўзяў сваіх сяброў — Крапіву і Глебку, я — сваіх: Мележа, Пестрака. Між іншым, мне дасталася дача аднаго з Кагановічаў, здаецца, дзеяча ў галіне культуры.

Будавалі дачы доўга і дрэнна. Кагановічам, напэўна, пабудавалі б хутчэй і лепш, а мы... якія мы арганізатары! На ўвесь пасёлак хіба адзін быў сапраўдны гаспадар — Іван Сямёнавіч Шчасны. Ды, можа, тыя трое, што пасля судзіліся з будаўнічай арганізацыяй і... прайгралі: дачы ў іх забралі пад летнія дзіцячыя садзікі.

А мы прынялі — што збудавалі, бо размова была кароткая: не хочаш — не бяры, ахвотнікі знойдуцца. Броўка і Глебка, якія будаваліся воддаль ад пасёлка, бліжэй да «мора», якое стваралася, умелі і падпаіць будаўнікоў і націснуць праз начальства.

Але, як бы то ні было, у 1959 годзе мы ўжо адпачывалі ў Ждановічах. Добра — блізка і ў той жа час тады яшчэ некранутая мясціна, нават дарогі не было, колькі разоў я садзіў машыну ў гразюку.

Пра дачы нашы я пісаў ва ўспамінах пра Глебку, Броўку, Макаёнка. У 1981 годзе я мадэрнізаваў сваю дачу. Будыніна знешне не шэдэўр архітэктуры, але прасторная — для сям'і маёй. Але Церуху не забывалі. Дзеці рваліся туды кожнае лета хоць тыдні на два, на месяц. З Церухой нішто не магло параўнацца. Там нават паветра асобае, кажа Маша. І я згаджаюся: такіх вечароў у Ждановічах не бывае. Дзівосныя вечары. Украінскія, шаўчэнкаўскія — з пахам вербаў і яблык, з шумам стаўка, з салаўіным раем. Туды ездзілі Таццяна з малой Машай, Клава з Наташай. Толькі Славяна не была. Да чарнобыльскай бяды не звазілі — маленькая. Пасля Чарнобыля дзяцей туды не возім. Адзін я ездзіў на кароткі час, на тыдзень, не больш: начаваў у Церусе (яна параўнаўча чыстая) і ездзіў адтуль на сустрэчы да выбаршчыкаў — у Хойнікі, Брагін, Лоеў, Рэчыцу. Паездкі гэтыя далі матэрыял для «Злой зоркі». Сур'ёзны раман. Такога аб катастрофе веку не напісалі ні нашы, ні ўкраінцы. У Шчарбака — залішне дакументальны, у Яварыўскага нават такая трагічная тэма ў тых шырокіх шараварах, у якіх танцавалі гапак, толькі што не з вясёлымі, як у Ганчара, а з трагічнымі воклічамі: о, ненько мая, Украіна!

У 1960 годзе мы з Машай упершыню паехалі ў замежнае турысцкае падарожжа — па Дунаі, ад Ізмаіла да Вены. Запомнілася на ўсё жыццё. Казачнае падарожжа! Стаяла залатая восень — канец верасня, пачатак кастрычніка. Камфартабельны цеплаход «Амур» (для нас сімвалічная назва). Купілі мы каюту люкс: не скупіліся, лічылі сябе багатымі людзьмі. Да Вены на судне, разлічаным на 200 пасажыраў, плыла невялікая група савецкіх турыстаў — чалавек сорак: толькі асвойвалі маршрут. Назад з Вены набілася нахабнікаў-немцаў, якія выціснулі нас з бара: яны багатыя, а мы свае чэкі прапілі. А напачатку сапраўды жыццё было райскае. Прадуктамі запраўляліся ў балгарскіх, румынскіх, югаслаўскіх, венгерскіх, аўстрыйскіх партах. Кавуны, дыні, вінаград, яблыкі, грушы, віны ўсіх гатункаў, а каньякі свае, армянскія, найвышэйшага гатунку, марачныя, без нацэнкі, па старых добрых цэнах: «Арарат», «Дзвін» рублёў па 8. Надзвычайная турысцкая зручнасць: не трэба сяліцца ў гасцініцах, разбіраць, збіраць чамаданы, грузіцца ў аўтобус. Прыйшлі ў Бялград ці Будапешт — суткі-двое стаянка, насычаная праграма па аглядзе гарадоў, помнікаў. На абед, на начлег — да сябе на цеплаход, дзе душ і ўсё, што душа пажадае.

Праз дваццаць гадоў пасля шлюбу ў нас з Машай быў сапраўдны мядовы месяц (плавалі тры тыдні). Не было яго пасля шлюбу, бо пражылі мы ўсяго тыдні два ў сялянскай хаце (за сцяной гаспадыня,

дзеці) — маладыя, няўмелыя, сарамлівыя. Не такі ён быў, наш мядовы месяц, і пасля пяцігадовай ваеннай разлукі — галодныя былі, на нішчымніцы жылі. Падарожжа тое — «свята, якое заўсёды з намі», як пісаў Хемінгуэй.

І кампанія добрая: акадэмік Турбін з жонкай, мы пасябравалі з імі, акадэмік Вечар, дзіўны чалавек, але цікавы, прафесар Шчэрба, нігіліст і скептык, мастак Яўген Красоўскі, які апантана пісаў пейзажы (у мяне і зараз вісіць яго эцюд — Дунай у раёне Катаракт), наш Алесь Адамовіч, эрудыт, які ведаў літаратуру, мастацтва Балгарыі, Югаславіі, Аўстрыі лепш, чым некаторыя гіды. Адтуль, з Дуная, мы «прывезлі» дачку Алесю: яна нарадзілася 16 чэрвеня 1961 года.

Помню, я забраў Машу з раддома 25 чэрвеня. Павёз на дачу. І яшчэ запомнілася: незвычайны, небывалы ўраджай клубніц, увесь наш ладны, добра ўроблены ўчастак нагадваў чырвоны дыван. Цяпер клубніцы не спеюць — разросся сад, пастарэў, у 30 гадоў дрэва старое, трэба высякаць, маладыя замахваюцца, а я не даю — мне балюча. «Кансерватар»,— гавораць дзеці.

19 сакавіка

У 1963 годзе мяне ўключылі ў склад дэлегацыі на XVIII сесію Генеральнай Асамблеі ААН. Палёт за акіян. І радасна і страшна. Страшна не столькі мне, колькі Машы. Колькі хваляванняў у яе было! Паехала ў Маскву, каб праводзіць мяне. Ляцелі спецрэйсам разам з Грамыкам. Наш міністр Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў трымаў мяне пад сваёй апекай: ільсціла яму, што побач пісьменнік. Ды і «шышка» я ўжо быў, якая ў нас у той час раўнялася нулю, а там, у ААН, гучала — Старшыня камісіі Вярхоўнага Савета па замежных справах. У аэрапорт ехалі ў адной машыне, яго жонка таксама праводзіла, яна пасля расказвала, ды і Маша сама дагэтуль прызнаецца: адарваўся «ІЛ» ад узлётнай паласы, і яна разрыдалася, і не магла супакоіцца да самай Масквы. Міністэрша гэтага не магла зразумець. Міністэрша радавалася, што муж паляцеў у 18-ты раз і папоўніць яе гардэроб амерыканскім шмоццем. Машу супакоілі толькі Вольскія, Віктар і Улада, запрасіўшы да сябе. Віктар ужо неаднойчы лятаў у Лацінскую Амерыку, і ён тактоўна смяяўся з Машыных страхаў. А пасля колькі разоў мы смяяліся разам, Маша — з намі, без крыўды.

Мае ўражанні? У вельмі напружаных умовах мне ўдалося ўсё ж напісаць старонак сто дзённіка. У «Полымі» я паспеў яго апублікаваць амаль цалкам пад назвай «Два месяцы ў Нью-Йорку». У кнізе — абшчыпаны, бо кніга выходзіла пасля адстаўкі Хрушчова. Але пра дзённік — ніжэй.

Першае ўражанне — смешнае, але павучальнае, больш такога глупства я не рабіў ужо і зразумеў Канстанціна Сіманава, які некалі годзе ў 1949 здзівіў нас, маладых, тым, што прыехаў у залатаных чаравіках. А я, дурань, абуў новенькія і... дзіка пакутаваў і ў самалёце, і першыя дні ў Нью-Йорку, пакуль не купіў амерыканскія. Яшчэ адно пра адзенне. Безумоўна, да паездкі я пашыў сабе ажно два касцюмы — светлы, рабочы, і чорны для прыёмаў. Шыў у майстэрні Саўміна ў лепшага краўца Ляхмана, які шыў усім міністрам. А я ў самалёце ўжо, убачыўшы акружэнне Грамыкі, маладых маскоўскіх дыпламатаў, параўнаў іх танныя, для дарогі, купленыя за мяжой, касцюмы з маімі дарагімі — маё эстэтычнае чуццё абурылася: да чаго ж няўклюдны, прымітыўны, бяздарны ляхманаўскі «шэдэўр». Сорамна стала. А сарочкі нашы, гальштукі! Ганьба. Праўда, праблему сарочак вырашылі ў першыя ж дні, не адзін я — усе купілі бялюткія нейлонавыя, танна і практычна — легка памыць і не трэба прасаваць. А касцюма амерыканскага, нават таннага, я так і не купіў, бо хацелася нешта прывезці Машы, дзецям. Між іншым, у ААН, у Вавілоне, «ляхманаўскі пакрой» не асабліва кідаўся ў вочы — у якім адзенні там толькі не хадзілі!

Работа ў ААН мяне хутка расчаравала: бясплодная гаварыльня, спрэчка глухіх. У першы ж дзень, праўда, здзівіла: як мог Мікіта грукаць чаравікам па стале? Усё ж так важна і паважна, чапурыста. Атрымаў слова дзякуй «пану шэрману», выступіў — дзякуй.

Кузьма, якому таксама ўсё абрыдла, часта пакідаў мяне на пленарных пасяджэннях аднаго — на выпадак нечаканага галасавання. А як галасаваць? Прыходзілася падымацца і бегчы да саюзнай дэлегацыі, якая сядзела ў другім канцы залы, такое, між іншым, было ўказанне — не саромецца, хоць газеты гэта высмейвалі. Ды і нашы шэфы саюзныя таксама высакамерна пасміхаліся. Мне гэта было абразліва. Увогуле атмасфера ў прадстаўніцтве мне не падабалася. Высакамернасць саюзных дыпламатаў, павышаная пільнасць кагэбістаў: паліцэйскія ў ААН мяне не спынялі. Запомнілі (ці не па касцюмах маіх?), а свае спынялі: здзекаваліся, ці што? Увогуле адчуваў я сябе ў Нью-Йорку цяжка, напружана. Сядзеў на камітэце і баяўся, каб пасяджэнне не зацягнулася, бо нахабнікі-шафёры (саюзныя) маглі і не чакаць. А я — без мовы, у вялікіх гарадах дрэнна арыентуюся. Ды і папярэджвалі: па адным не хадзіць. Я ўсё ж зрэдку выходзіў — цягнула ўбачыць як можна больш. Вылазіў нават на Пятую авеню, асабліва калі ўдавалася ўгаварыць Анатоля Стука ці Івана Трухана. Адзін я ўвесь час успамінаў аповесць Караленкі «Без языка». Разы два мне ўсё ж прыйшлося ісці пехатою ад ААН да прадстаўніцтва на 67-й

стрыт. 42-я стрыт — рэклама Нью-Йорка, і я так доўга ішоў па ёй, што ў прадстаўніцтве нашым, беларускім, захвалявaліся.

Міністрам, нашаму і ўкраінскаму, відаць, таксама не падабалася жыць пад нядрэмным вокам назіральнікаў, высокіх і нізкіх, яўных і тайных, і яны пасялілі свае дэлегацыі на дачы ў Астарбеі. Хораша. Прасторна. Паветра чыстае. Цішыня. Можна паспаць. Можна пагуляць — гектараў дзесяць, калі не больш, нашай тэрыторыі: уласнасць СССР! Але ездзіць туды за 50 кіламетраў пакута, асабліва ў пятніцу, у спякотныя дні. А ў кастрычніку было спякотна. І яшчэ адна пакута — ад заганнай слабасці Кузьмы, па-мойму, ён быў алкаголік: пабудзе на двух-трох прыёмах, пасля едзе на дачу. А я і міністр культуры Мінковіч Міхаіл Аляксандравіч «прывязаныя» да яго машыны, мусім сядзець, чакаць, часта без вячэры — вячэра на дачы. Нарэшце едзем. У Нью-Йорку магазіны зачынены. А недзе на паўдарозе на адмысловай развязцы (я так і не сцяміў, у які бок мы там паварочвалі) — ланцужок крамак, і адна з іх позна адчынена, у ёй напіткі і смачныя закускі, гаспадар — паляк, даўні знаёмы Кузьмы. Шафёр спыняўся там без каманды, і мы з Міхалам ведалі, штотрэба: пляшка віскі і закускі. Сам Кузьма ніколі не плаціў — усё за наш кошт, за нашы 13 долараў сутачных, на якія трэба харчавацца, паглядзець кіно, тэатр, купіць падарункі жонкам, дзецям.

Вячэрнія «бдения» вельмі перашкаджалі мне запісваць свае ўражанні, і я не любіў гэтых частаванняў, здзіўляўся Кісялёву (там адзначылі яго 60-годдзе) і Мінковічу, у якога быў ужо выразаны страўнік. Самагубцы славяне!

Дзіўлюся, як я выкраіў час напісаць за два месяцы сотню старонак. Учэпісты пісар!

Няма патрэбы пераказваць «Нью-Йоркскі дзённік» (кніжны варыянт назвы). Адно скажу: пафас яго — захапленне багаццем Амерыкі. Захапленне да зайздрасці, да болю, да злоснага асуджэння: у-у, праклятыя буржуі! Але ўсё роўна захапленне. Ніхто з нашых журналістаў у той час такіх пачуццяў не выказваў. Адгэтуль стаўленне да дзённіка. У Мінску — спакойнае, як да ўсіх маіх твораў, і «Полымя» дало самы поўны варыянт. У Маскве... Міша Гарбачоў (не прэзідэнт — кансультант СП, мой перакладчык, і не толькі мой), пераклаўшы, перадаў дзённік на саюзнае радыё. За яго там схапіліся. Рэдактар і загадчык рэдакцыі, відаць, любілі Амерыку. Падрыхтавалі некалькі перадач. Але радасць наша з Гарбачовым была заўчасная: начальства скараціла да адной перадачы.

У «Советском писателе» ў мяне выходзіла кніга апавяданняў. Я загарэўся жаданнем дапоўніць яе дзённікам. Прачытала галоўны

рэдактар В. М. Карпава, схапілася за вушы: «Иван Петрович, я вас считала партийным писателем».

«А что же тут непартийное?»

«Да вы же превозносите их».

«Есть за что, Валентина Михайловна».

«Я категорически против включения в книгу».

А ў хуткім часе далі адстаўку Хрушчову, і Карпава радавалася:

«Я спасла вас».

У дзённіку я аддаваў даніну Хрушчову.

«Спасибо, Валентина Михайловна».

20 сакавіка

Яшчэ трохі пра Нью-Йорк. Пра дэмакратыю ў нашых дэлегацыях. Прагаласаваць не так, як саюзная дэлегацыя,— скандал, хоць часам мне здавалася, што звычайная чалавечая логіка, прыстойнасць патрабуе, каб мы галасавалі інакш, разам з большасцю, з Амерыкай. Не, палітыка логікі не прызнае.

Нашы лічылі, што «гваздзём» агульнай дыскусіі будзе выступление Грамыкі. Безумоўна, да голасу вялікай дзяржавы, ды яшчэ пры такім кіраўніку, як Хрушчоў, мусілі прыслухоўвацца. Але нічога асаблівага ў выступленні нашага міністра я не пачуў. А якая ішла ігра... Кісялёў раздаў нам тэкст прамовы Грамыкі: «Уважліва прачытайце і выкажыце свае заўвагі». Мяне здзівіла гультайства памочнікаў: у прамове былі нават стылістычныя ляпы. Мідаўцы, работнік ЦК Чарнушчанка, былы дыпламат, маўчалі, хітруны, мы, наіўныя — пісьменнік, рэктар, журналіст — выкладваліся з самалюбівай надзеяй: паможам Грамыку. Кісялёў слухаў, нічога не аспрэчваў, загадваў сакратару: «Запісвай, запісвай». А выступіў Грамыка, і мы, ашаломленыя, пачулі, што не папраўлена ніводная коска. Не адважыўся Кузьма перадаць нашы заўвагі. Ды і ўкраінскі міністр не адважыўся, хоць выдаваў сябе вялікім самасційнікам. Гэтак жа паўтаралася з выступленнем Кісялёва: абмяркоўвалі, спрачаліся, але ніводная «чужая» заўвага не была прынята. Дык у Кісялёва хоць памочнік быў з добрым адчуваннем рускай мовы — Эдуард Скобелеў, які ў той час пісаў архаічныя вершы, а пазней стаў харошым празаікам.

Такі фармалізм канчаткова расчараваў мяне, і я нават не стаў пісаць свае выступленні, шкадаваў энергіі і часу, даручыў Віктару Калбасіну, прафесійнаму дыпламату. Дарэчы, я ні разу не выступіў — захварэў. Першы прыступ халецыстыту, з тэмпературай. Тыдні два ляжаў у прадстаўніцтве (пахаладала, і на дачы не жылі). Я пісаў у дзённіку, дома ўжо дапоўніў, як гэта пакутліва заставацца аднаму ў

доме, дзе нікому да цябе не было справы. Кісялёў і той забыўся на мяне — не памочнік і не сабутэльнік. Чаго я больш за ўсё баяўся — трапіць у амерыканскую бальніцу (пазней гэта перажыў Максім Лужанін). Ад адной думкі апынуцца сярод амерыканцаў, без мовы, кідала ў жар і холад.

Прасіў Кісялёва адаслаць мяне дадому, ён чамусьці не згаджаўся. «Мы з вамі паплывём назад на «Куін Мэры», паглядзім Парыж»,— такой была мара ўсіх дэлегатаў, і міністр абяцаў задаволіць яе.

Аднойчы я проста расплакаўся — не вытрымалі нервы. Гэта кранула Кузьму, і пытанне аб маёй адсылцы было вырашана даволі аператыўна. Са мной, у мэтах эканоміі, адсылалі работніка МІДа і шафёра. Здзівіла, як мяне праводзілі: раптам чалавекі чатыры з саюзнай дэлегацыі, сам генеральны сакратар дэлегацыі (называлі так), які да таго, бадай, і не вітаўся са мной, хіба паблажліва адказваў на маё прывітанне.

Я — пасажыр першага класа. Нас завялі ў асобную залу, кампанія «SAS» частавала віскі — толькі лятайце. Такая ўвага да маёй персоны нават устрывожыла. Але калі выпілі віскі, усё растлумачылася: генсек паказаў мне «Известия», дзе быў апублікаваны новы склад Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях. Туды быў уключаны і я. Во ад чаго я так вырас у вачах чыноўнікаў.

Адарваўся «Боінг» ад узлётнай паласы, праплылі злева агні Нью-Йорка, і я адчуў сябе здаровым, радасна ўзбуджаным. Браў з сабой «малютку» — кішэнны томік Пушкіна. Дастаў яго, пачаў чытаць з небывалай асалодай, «упоением» — усё роўна што глытаў кісларод. Сцюардэса, мабыць, палічыла, што я чытаю Біблію, глядзела на мяне здзіўлена і паважліва. Уначы мне не спалася, і я чуў, бачыў, як сцюардэса колькі разоў, як маці на малых, папраўляла пледы на кожным з пасажыраў. Во абслугоўванне! Нашы дрыхлі б. Але здзівіў і іншы парадак — дэмакратыя іх. Салон быў паўпусты. Пасля царскай вячэры з любымі напіткамі да мяне з другога класа прыйшоў Кірушкін, работнік нашага міністэрства. Натуральна, сеў побач — свабоднае месца. Але тут жа яго паднялі — уміг, катэгарычна. Кірушкін растлумачыў па-англійску, што ён — мой памочнік. Тым больш здзівіліся такому панібрацтву. Памочнік — пастой, схіліўшыся, атрымай указанні і — каціся; не купіў — не маеш права нават прысесці. Тады я абурыўся: праклятыя буржуі! А цяпер думаю: ад гэтага ў іх і парадак ва ўсім.

Цудоўнае ўражанне зрабіў на мяне Капенгаген, дзе мы правялі гадзін восем, кампанія завезла нас у гасцініцу ў цэнтр горада, і мы, паснедаўшы, блукалі па горадзе. Божа мой, які кантраст шалёнаму

Нью-Йорку — ціхі, добры, прыгожы еўрапейскі горад, людзі на веласіпедах ездзяць. Адразу зняў псіхічную напружанасць. Здавалася: з Капенгагена да Мінска і пехатой можна дайсці.

Вярнуліся ў аэрапорт — соваецца па зале знаёмая постаць. Ілья Эрэнбург. Мяне знаёмілі з ім, але падысці я не адважыўся, бо ведаў, што чалавек гэты жыве ў іншых вымярэннях, гэта не Фадзееў і не Сіманаў. Аднак пры пасадцы ў «ТУ» спытаў: «Дзе былі, Ілья Грыгор'евіч?» — «У Стакгольме». Прозвішча, канешне, успомніць не мог, але пазнаў, што я пісьменнік, спытаў: «Украінец?» — «Беларус. Шамякін».— «А-а»,— і больш ніякай увагі, у самалёце спаў. А мы з Кірушкіным і шаферам Мішам (недаравальна забыў прозвішча) пілі «Сталічную», якую падалі да абеду — у нашым самалёце падавалі ўсім аднолькава, без класаў.

Дзіўны лёс у гэтага Мішы (шафёр Машэрава): ён вярнуўся, каб афарміцца, узяць жонку і паехаць у Нью-Йорк на тры гады. Перад выездам туды... павесіўся. Думаю: спалохаў яго Нью-Йорк. Гэты горад жоўтага д'ябла спалохаў не аднаго чалавека і растаптаў, хоць іншых узняў, узбагаціў.

Што мы перажылі? Не я, не сям'я. Краіна. Усяго не ўспомніш — усіх паваротаў. Загадка, якую не вытлумачылі эканамісты (хоць што яны вытлумачылі?): як Сталіну ўдавалася ў такой разбуранай краіне штогод 1 красавіка паніжаць цэны, пачынаючы з 1948 года. За які кошт? За кошт бязлітаснай эксплуатацыі сялянства? Хрушчову гэта не ўдавалася. Паспрабаваў напачатку Брэжнеў — хутка вытхнуўся. Ды і паніжаў на сінтэтыку — дробязь. На яе і сёння не павышаюць.

Думкі гэтыя — працяг успамінаў пра Нью-Йорк. Не, не пра заакіянскія ўражанні — пра зварот дадому. Два з паловай месяцы, а жыццё рэзка змянілася. З маслам і да таго было цяжка, вазіў з Масквы, але не стала... хлеба. Мала хто помніць гэта. Але ж было. Жытнёвы з вялікімі чэргамі прадавалі. А пшанічнага наогул не было. А я з халецыстытам. І дзеці малыя, Алесі два з палавінай гады. У нейкім кафэ да кавы давалі маленькую булачку. Маша ішла ў гэтае кафэ, брала кубкаў шэсць кавы, не выпівала ніводнай, клала шэсць булачак у торбу, каву пакідала на стале студэнтам. Як я адчуў кантраст з праклятай Амерыкай! Але з пазіцый сённяшняга дня здзіўляе іншае: як хутка пераадолелі гэты крызіс! Ужо вясной 1964 года булкі з'явіліся. А пасля «дварцовага перавароту» — ціхага, мірнага, без мітынгу: пасля ўдалення вялікага рэфарматара Мікіты наступіла проста Амерыка. У нас у Беларусі ў 1965-1970 гг. не ведалі, куды дзяваць мяса. Кілбас прадавалі гатункаў дваццаць. Гарэлак, каньякоў, він — сваіх, балгарскіх, венгерскіх...— вочы разбягаліся. Помню, на адным

пленуме ЦК міністр мяса-малочнай прамысловасці Баўрын скардзіўся, што няма куды дзяваць сала — ніхто не купляе. Бо заеліся! Машэраў параіў яму засальваць і— вывозіць у Сібір, на поўнач.

Што ж было да зняцця Мікіты? Сабатаж? Тое, што ў наш час мае месца грандыёзны сабатаж — няма сумнення. Кім арганізаваны? Камандная сістэмай? «Дэмакратамі»? Ці тымі і тымі? Пры такім безуладдзі крызіс не пераадолець. Забастоўка шахцёраў спыняе металургічныя заводы. А гэта — крах, поўнае разбурэнне дзяржавы. Трэба ўлада! Цвёрды парадак. Нават ёлуп Брэжнеў пераадольваў крызісы. У разгар застою стварылася вострая напружанасць з тканінамі. З паўгода ліхаманіла. Але не больш. Правялі пленум. Але, пленум! Адбыўся круты разнос у Палітбюро, у Саўміне. Далі па шыі і ўзбекскім баям, і іванаўскім «мануфактурным магнатам» — і пайшла тканіна, перад «вялікай перабудовай» яе было навалам, хапіла нават гады на тры «перабудовы». А сёння пятля крызісу зацягваецца так, што хутка задушыць... Каго? Народ не паддасца — выжыве! А кагось задушыць. Ну і хрэн з імі!

На бюро я спытаў у Малафеева:

«Вы ездзілі з прэзідэнтам па Гомельшчыне, Магілёўшчыне. Казалі вы яму пра гэта?» — размова, па-мойму, ішла аб пасяўной, аб пагрозе зрыву сяўбы.

«А што ж вы думаеце - я маўчаў?»- бадай пакрыўдзіўся сакратар.

«І што ён?»

«Уздыхае».

Вось так: прэзідэнт уздыхае. Прэзідэнта аблажылі, як мядзведзя. І залажылі. Не сумняваюся — прададуць. Ну, і хрэн з ім! Не адзін я кажу гэта — большасць народа. У такой сітуацыі разумныя палітыкі падаюць у адстаўку. Але тое, што Гарбачоў не падае, у мяне асабіста падтрымлівае агеньчык надзеі: а можа... Думаю, не зашкодзіў бы вопыт Ерузельскага: ваеннае становішча. Палякі не ставяць гэта генералу ў віну: ён ратаваў дзяржаву, нацыю ад грамадзянскай вайны.

27 сакавіка

Безумоўна, не актыўным удзельнікам, хутчэй сузіральнікам, але ў 60-я гады я апынуўся ў гушчы падзей агульнасаюзнага літаратурнамастацкага жыцця. Прысутнічаў на дзвюх сустрэчах Хрушчова з творчай інтэлігенцыяй — на Ленінскіх гарах і ва Уладзімірскай зале Крамля. Аб сустрэчах гэтых многа напісана, асабліва групай «пакрыўджанага» Еўтушэнкі. (Усюды яго крыўдзілі: Шолахаў не накарміў сіротку абедам.) Сур'ёзнага даследавання няма, ёсць эмацыянальныя ўспаміны. А між тым гэта быў пачатак той жорсткай барацьбы, якая

працягваецца сёння адкрыта, аголена і набывае суровыя формы і небяспечны змест.

Барацьба была складаная. Сілы не былі размежаваныя, як цяпер. Прайшоў XX з'езд, асуджаны Сталін. І вось яны, першыя антысталіністы... Але ж і я за XX з'езд, супраць сталінізму, супраць новага культу, ды і мае настаўнікі, сябры — Броўка, Глебка, Пракоф'еў, Грыбачоў, Сафронаў (з апошнімі сябраваў Броўка, і ён не аддзяляў мяне ад «вадапойных» сустрэч) таксама, на словах, прынамсі, падтрымлівалі апошнія рашэнні партыі. Розніца паміж мной і імі была хіба ў тым, што яны ўсе яшчэ захапляліся «мудрасцю» Мікіты, а мы з Андрэем ужо ставіліся да яго крытычна — за аграрную палітыку яго. І яшчэ розніца. Безумоўна, Броўка, Грыбачоў, Пракоф'еў добра ведалі сваіх праціўнікаў — з 20-30-х гадоў, добра ўсведамлялі, што гэтыя «патрыёты» Расіі і Саюза, калі захопяць, няхай і не палітычную, літаратурную, мастацкую ўладу, літасці не дадуць, славянскак дабрыні ў іх няма. Груба кажучы, пачалася зацятая барацьба за ўладу, за «кармушку», што ў адкрытым выглядзе адбываецца і зараз. Праўда, не магу кінуць цень на «старых», сказаўшы пра кармушку, да яе рваліся тыя, «ультрарэвалюцыянеры», прыкрываючыся высокімі лозунгамі, а людзі тыпу Пракоф'ева, Броўкі аб'ектыўна, шчыра былі перакананы, што яны служаць ідэям Рэвалюцыі, Леніна.

Безумоўна, старыя мелі большы доступ да Хрушчова, і яны пераканалі яго ў небяспецы павароту ў мастацтве, «новых плыняў», якія ў сапраўднасці былі даўнія, той жа абстракцыянізм на Захадзе завяршаў свой віток. Выкрываць гэтую «мазню» было проста: людзі, якія кіравалі партыяй і дзяржавай, маючы пэўную адукацыю і пэўную культуру, выхаваныя, у лепшым выпадку, на фальклоры, Пушкіне і Някрасаве, ніяк не маглі прыняць гэтых авангардысцкіх выкрунтасаў. Да таго ж дурнямі яны не былі: добра разумелі, што народ таксама не прыме гэтых навацый — не тыя традыцыі! — і выхоўваць яго, народ, такой пісанінай і мазнёй немагчыма — трэба трыбун Маякоўскі, «лепшы паэт эпохі».

28 сакавіка

Хрушчоў — чалавек эмоцый, паслядоўнасці ў яго не было ні ў чым. Ён мог трэсці кулакамі, тупаць нагамі, грукаць чаравікам, але тут жа мог даць і «задні ход». Як легка заводзіўся, так легка адыходзіў. У яго быў характар, падобны на мой, толькі больш імпульсіўны. Можа, для палітыка гэта не лепшая якасць. А можа, і добра. Ва ўсялякім разе ў незвычайнай сітуацыі, якая пагражала не толькі нашай краіне —

усяму чалавецтву — у карыбскім крызісе яго ўменне адступіць уратавала мір у свеце. Сталін, напэўна, не адступіў бы, у яго была паслядоўнасць і ўпартасць параноіка. Між іншым, не магу не ўспомніць эпізод кубінскага крызісу. Сітуацыя нагняталася. І самае страшнае, што народ бадай згадзіўся з думкай: будзем ваяваць. І пакажам амерыканцам! Помню, які апанаваў мяне, бацьку чатырох дзяцей, страх, калі я ўбачыў такі настрой. Праз 17 гадоў пасля сканчэння страшэннай вайны — новая. Думаю, і ўдзельнікі вайны, і дзеці іх не разумелі, якой яна магла быць, новая вайна. Мыслілі катэгорыямі перамогі над фашызмам.

У дзень кульмінацыі крызісу атрымалі ганарар. Тады гэта была падзея, заўсёды не хапала грошай, і зароблены я сумы выдавалі порцыямі; хадзілі нават сачынёныя Вялюгіным радкі:

Одну лишь сотню он просил,
И взор являл живую муку,
Но Матуз хрена положил
В его протянутую руку.

Матуз — Захар Матузаў, дырэктар выдавецтва. Нехта прапанаваў: «Пайшлі, хлопцы, хоць вып'ем. Ці не ў апошні раз?»

Набралася ладная кампанія. Але весялосці за сталом не было: размовы толькі пра Кубу. У тыя дні нідзе не выключалася радыё. Грымела яно і ў рэстаране, і ніхто не пратэставаў. І раптам паўза і... голас (ці не Левітана?): «Через пять минут будет передано экстренное сообщение»,

Змоўкла зала. Пабялелі твары ў маіх калег. А ў мяне, помню, як абарваліся ўсе шлункі, боль ударыў у жывот. Так было пры першым налёце ў ноч (палярную ноч) нямецкай армады на Мурмашы, Дэталі: намеснік дырэктара Раман Дзегцяроў моўчкі наліў поўны фужэр гарэлкі і аглушыў сябе. Па яго прыкладу гэта зрабілі бадай усе. Без слоў, без тостаў. Якія тосты!

Д'ябальскі доўга цягнуліся пяць хвілін. Хтось злосна выдумаў такое выпрабаванне мільёнам людзей.

І вось: «От советского правительства» — гучна, але незразумела — ці трагічна, ці радасна.

Міг — і «ўра!» заглушыла радыё. Крычалі не мы — інтэлігенты! Крычалі побач з намі, як пасля высветлілася, аграрнікі, раённыя работнікі, старшыні калгасаў, якія пасля чарговай нарады з душэўнай трывогай завалілі ў харчэўню выпіць па апошняй.

А мне хацелася плакаць — ад радасці. Кінуўся ў фае да аўтамата, пазваніў Машы.

«Ты чула? Чула?»

«Чую, што ты ўжо вясёленькі»,— пагрозліва адказала яна.
«Не! Радыё чула? Мы выводзім нашы ракеты!»
У Машы заняло дыханне, потым яна сказала вельмі ласкава:
«Ты ж глядзі: не вельмі радуйся, а то я вас ведаю».
Яна нас ведала.

29 сакавіка

На Ленінскіх гарах, у доме прыёмаў, сустрэча была спакойная. Пачалі з абеду, даволі сціплага. Віна сухога далі мала: мабыць, пляшку на траіх. Насупраць мяне сядзеў Расул Гамзатаў, вастраслоў. Ён папрасіў у афіцыянткі яшчэ віна. Яна адмовіла. Ён абурыўся: «Прыязджай да мяне ў Дагестан, я выкупаю цябе ў віне».

Нехта супакоіў яго:

«Расул, выкажы свае прэтэнзіі Мікіту Сяргеевічу».

Ніякіх тостаў — проста абед. Але Хрушчоў гаварыў. Ён расказваў пра Сталіна. Рысаваў даволі аб'ёмны партрэт «правадыра». Развенчваў яго, але ў нечым, мне здалося, і захапляўся. У Хрушчова ўсё супярэчлівае. Даводзіў, што Сталін быў хворы чалавек, параноік, здольны на самыя нечаканыя ўчынкі, прадбачыць якія было немагчыма.

Адзін з яго расказаў. Адпачываў Хрушчоў на Каўказе. Раптам званок Паскробышава: «Таварыш Сталін жадае бачыць вас у сябе на дачы». Еду не без трывогі. Самы гасцінны прыём. Курортны. Абедаем. Весела гутарым. Успамінаем. Пасля абеду гуляем. Усё нармальна. На мае жаданне развітацца (добры той госць, які своечасова ад'язджае) Сталін гэтак жа гасцінна гаворыць: «А куды вам спяшацца? Начуйце». Паспрабуй не паслухацца! Застаюся. Вячэраем па-сталінску. Сталін любіў віно. А я яго не любіў, мне лепш чарка гарэлкі. Між іншым, не першы раз Сталін «наліваў» нас віном, нават тых са сваіх гасцей, хто ўвогуле не піў. Сталіну адмовіць баяліся. У той вечар мы з ім таксама «наліліся». Начую. З'яўляюся на снеданне. Сталін сядзіць адзін у сталоўцы. Вітаюся. Саджуся, дзе свабодны прыбор. Сталін здзіўлена ўскідвае бровы, глядзіць шклянымі вачамі. І раптам сурова пытае: «А вас хто запрасіў сюды?» Уяўляеце мае адчуванне? Гэта на члена Палітбюро, якога сам паклікаў у госці. «У любой іншай кампаніі паслаў бы такога гаспадара...— Хрушчоў робіць выразны жэст, але тут жа прызнаецца: — Не пашлеш. Паспрабуй...»

Асабіста мяне, ды, бадай, большасць, Хрушчоў проста ачараваў такой чалавечай шчырасцю. Ды і многія іншыя расказы слухаліся як самыя займальныя гісторыі. Я перадаў гэта эскізна, ён жа расказваў падрабязна, доўга, са сваім асаблівым красамоўствам, з дэталямі, якім пазайздросціў не адзін з нас, сачыніцеляў. Мікіта, відаць,

неаднойчы быў абражаны і ўніжаны Сталіным. Але гэта не проста ўніжэнне, кожны факт немилости вождя таіў у сабе смяртэльную небяспеку. Чыталася паміж радкоў: нямала ён надрыжэўся, нямала правёў бяссонных начэй. Зразумела была нам Мікітава злосць на «бацьку», яна пыхкала і без малога праз дзесяць гадоў пасля яго смерці, выразна пыхкала, нягледзячы на яго «аб'ектыўнасць» і жаданне расказваць з гумарам — і ў адносінах да іншых, і ў адносінах да сябе. Але ён, як і ўсе іншыя, вучыўся ў Сталіна, і «навука» гэтая, як заразная інфекцыя, уелася ў мозг і ў кроў. Атрэсці яе было няпроста. Не ўдалося скінуць груз Хрушчову, які шчыра хацеў гэта зрабіць. Не здолеў сам, не дазволілі памочнікі. Не проста не дазволілі — убралі. Праўда, дэмакратычна, не па-сталінску — па-хрушчоўску. Брэжнеў узяў з метадаў сталінскіх больш, чым Хрушчоў, але, самае галоўнае, пераняў ад свайго папярэдніка: без рэпрэсій! Быць добрым! Ал'е «дабрыня» яго была не на карысць народу — на карысць апарату, чыноўнікам. Яны нічога не баяліся, для многіх з іх не існавала законаў і ўсталявалася згубная ўседазволенасць. Крытыка гэтых «парадачкаў» заціскалася.

Сустрэча на Ленінскіх гарах праходзіла без асаблівых канфліктаў, ва ўсялякім разе такіх, якія помніліся; пра яе нават «пакрыўджаныя» Хрушчовым мала пішуць у час галоснасці. Больш пра другую сустрэчу — ва Уладзімірскай зале. На першай сустрэчы больш гаварыў Мікіта, спакойна, стрымана, часам з гумарам, і «класікі», якія трымаліся сталінска-жданаўскай літаратурна-мастацкай палітыкі, больш трывала, чым сам Хрушчоў, ведалі тыя тонкасці, якіх не ведаў ён, і падбухторвалі яго, заводзілі. Безумоўна, гэтая «заводка» працягвалася і ў час паміж сустрэчамі. Таму на другой, больш афіцыйнай сустрэчы Мікіта паводзіў сябе ваяўніча — махаў кулакамі, тупаў нагамі. Але і дысідэнты з'ядналіся, асмялелі, маючы міжнародную падтрымку, перайшлі бадай што ў наступленне. Цяпер пра тую сустрэчу напісаны тамы, менавіта прадстаўнікамі дысідэнцкай групы, партыйная частка маўчыць. Яны маюць стэнаграму, яны збіраюцца, успамінаюць і выпрацоўваюць трактоўкі, канцэпцыі, часта з пазіцый сучасных, без уліку атмасферы таго часу. Я стэнаграмы не маю, іх успаміны перачытваць цяжка, ды і жадання няма — навошта? Параіцца няма з кім. З тых беларусаў, што прысутнічалі, засталіся Максім Танк, Заір Азгур і я. Што скажа 85-гадовы Азгур? Мала што помніць і Яўген Іванавіч — я спрабаваў гутарыць з ім. Таму абмяжуюся гэтымі агульнымі ўражаннямі. Хіба дадам. Безумоўна, я трымаўся партыйнай лініі, я шчыра верыў у яе абсалютную правільнасць — калектыўная ж мудрасць партыі! Але разносы Хрушчова зрабілі на мяне цяжкае ўражанне — не творчая дыскусія. Мне, напрыклад, шкада было

Андрэя Вазнясенскага, з якім быў знаёмы, ён прыязджаў да нас, мы разам пілі каньяк, і на шмат якія літаратурныя праблемы ў нас была агульная думка, асабліва разумеліся два Андрэі — ён і Макаёнак. А я, калі часам і не згаджаўся, рэдка даводзіў сваё перакананне, бо не меў таго красамоўства, што яны, абодва выдатныя палемісты.

31 сакавіка

Трапіў я і яшчэ на адну акцыю, якая была раней і пра якую цяпер таксама вельмі многа пішуць,— на пасяджэнне таго пашыранага сакратарыята, на якім выключылі з СП Барыса Пастарнака. Тут гісторыя цікавая ў сэнсе характарыстыкі другога рускага паэта, роля якога ў літаратуры значна вышэйшая.

Я з'яўляўся членам праўлення выдавецтва «Советский писатель», тады, па-мойму, яшчэ рэдсавета, праўленне стала пазней. Парадаксальна, але ў той далёкі, здавалася, недэмакратычны час дырэктар (пазней — старшыня праўлення) Мікалай Васільевіч Лесючэўскі праводзіў надзвычай дэмакратычныя пленумы, асабліва тыя, дзе зацвярджаліся планы выпуску і рэдакцыйнай падрыхтоўкі. Такі пленум праходзіў тры дні — як правіла. Сабіралася сотня людзей, афіцыйных членаў праўлення было чалавек 60 плюс работнікі выдавецтва. Ішло дэталёвае абмеркаванне ўсіх пазіцый плана. Па асобных рукапісах разгараліся вострыя дыскусіі. Часам Лесючэўскі ішоў на такі «кампраміс»: «Я сам прачытаю гэты рукапіс. Да заўтра». І прачытваў, здзіўляючы ўсіх — у рукапісе 20-25 аркушаў. Я актыўна выступаў, з-за гэтага і прабыў у праўленні 30 гадоў. Мне ўдавалася часта дадаць у план 2- 3, а то і чатыры кнігі беларускіх празаікаў, паэтаў. Я «дрался за них, яко лев».

Дзе, у якім выдавецтве ў наш звышдэмакратычны час так абмяркоўваюцца планы? Пасля смерці М. В. Лесючэўскага і ў «СП» спынілі гэтую практыку; уключыцца ў план звыш адведзенага ліміту (беларусам — 9 кніг, і кропка) стала немагчыма, тут жа рэзалі пытаннем: «Замест каго?» Канешне, былі выпадкі, што трапляла ў план слабейшая кніга і адкладвалася лепшая, больш актуальная. Але паспрабуй «зняць» такога аўтара — нажывеш ворага на ўсё жыццё, бо любы графаман лічыць, што яго кніга самая лепшая. Апошнія гады чатыры-пяць я рэдка ездзіў на пленумы праўлення «СП». Не бачыў карысці ад гэтай фармальнасці.

Аднак я адхіліўся. У якім годзе выключылі Пастарнака? Заглянуў у КЛЭ — у 1958-м яшчэ (вунь калі я быў ужо актыўным членам рэдсавета «СП»). Прыехаў у Маскву. Пасяліліся ў адным нумары гасцініцы «Украіна» з добрым рускім паэтам, амаль нашым земляком —

смалянінам Мікалаем Іванавічам Рыленкавым. Тады мы пасябравалі, нягледзячы на розніцу ў гадах — ён з 1909 года. Цікавы, добры, мудры чалавек. Рэаліст у паэзіі і ў жыцці. На ўсё і на ўсіх ён меў свой погляд — рэальны, не без здаровага сялянскага скепсісу: і на сваіх землякоў Ісакоўскага і Твардоўскага, і на Суркова, і на нашага Броўку. Характарыстыкі даваў людзям трапныя, глыбокія, але добразычлівыя, злосці ў яго не было, нягледзячы на тое, што яго, сапраўды добрага паэта, былыя сябры трымалі ў рангу «абласнога» літаратара.

Увечары, пазасядаўшы, сумленна папрацаваўшы, мы пайшлі з Рыленкавым у рэстаран. Рэстаран у новай гасцініцы пампезны, будаваліся высотныя гмахі са сталінскім размахам — «с излишествами». Але сам рэстаран — кухня, абслугоўванне — тады быў на высокім узроўні — еўрапейскім, пазней я зрэдку спыняўся ў гэтай гасцініцы і заўважаў, як зніжаўся гэты ўзровень. Цікава, які зараз? Не быў там гадоў 12.

Месцы мы знайшлі ў першай, не самай прэстыжнай зале — на праходзе. Вячэралі доўга — Мікалай Іванавіч, падвыпіўшы, станавіўся незвычайным субяседнікам, ён выдатна ведаў усю літаратурную кухню, усю ненапісаную гіторыю савецкай літаратуры.

Пілі ўжо каву, калі ўбачылі, як з глыбіні залы, нікога не бачачы, ідзе Твардоўскі ў суправаджэнні чалавека, якога пасля ў нашых колах я не сустракаў. Убачыў я, сказаў Рыленкаву. Той падняўся, па-свойску спыніў Твардоўскага: «Здравствуй, Саша».— «Здоров, Коля!» Землякі, аднагодкі, сябры. Твардоўскі і яго спадарожнік селі за наш стол. Новы заказ, хоць Аляксандр Трыфанавіч быў ужо на добрым падпіцці. Твардоўскі, адчувалася, кіпеў, хоць расказваў стрымана. Цэлы вечар ён ездзіў па кватэрах членаў рэдкалегіі «Нового мира», каб падпісалі даўнішняе рэдакцыйнае заключэнне аб адхіленні «Доктора Живаго». Ездзіў не адзін і не з гэтым маўклівым спадарожнікам — вазіў яго загадчык аддзела ЦК Палікарпаў у сваім «ЗіСе». Твардоўскі паднімаўся да Луконіна, а Палікарпаў заставаўся ў машыне: ведаў кіраўнік, што адзін ён вернецца ад таго ж Луконіна ў лепшым выпадку на другі дзень, а подпісы трэба неадкладна, у заўтрашні нумар «Литературной газеты», якая была ўжо набрана і звярстана, але патрэбна было адзінадушнае асуджэнне рэдкалегіі. І Твардоўскі сабраў подпісы. Але гэтая прынізлівая працэдура, недавер да яго давялі лепшага паэта Расіі да белага калення. Ён сапраўды быў бледна-пасінелы, скрыгаў зубамі. І піў. У рэстаране пачалі падаваць сігналы: гадзіна ночы.

«Закажы ў нумар»,— уладна загадаў мне Твардоўскі.

Я запрасіў афіцыянта.

«Поллитра водки... закусочку».

«Адну? — абурыўся Ал. Тр.— Тры!»

Я ледзьве не самлеў, бо заўсёды ведаў меру.

У нумары Рыленкаў і Твардоўскі пасварыліся. Мэтр сказаў земляку: «Гавно ты пишешь, Коля, в последнее время» — і — дзіўна! — на памяць прачытаў ягоны верш. Мабыць, Мікалай Іванавіч адчуваў, што верш не з лепшых, і горка расплакаўся.

Скончылася тым, што Рыленкаў заснуў, «спадарожнік», па-мойму, абсалютна цвярозы, нябачна знік. Засталіся мы з Твардоўскім адзін на адзін. Гаварыць нам не было пра што. Ён крытычна выказаўся пра Броўку, што мне адказаць? Лягчэй было згадзіцца, калі ён пахваліў Куляшова. Ён піў. Баючыся адмовіцца, я мусіў падтрымліваць яго — чокацца.

«Правядзі мяне на таксі».

Я пасадзіў яго ў таксі і атрымаў ад яго вышэйшую пахвалу: «А піць ты ўмееш, Шамякін».

Пазней я рэдка калі адважваўся павітацца з ім, бо ён не заўсёды адказваў — праходзіў, як бы не пазнаючы.

Рыленкаў не здолеў паехаць на Вялікі Гнезднікоўскі завулак. Я паехаў адзін. Пасяджэнне было кароткае: Лесючэўскі абвясціў, што ўсіх нас, членаў рэдсавета, запрашаюць на пасяджэнне сакратарыята СП для абмеркавання Барыса Пастарнака, якому прысуджана Нобелеўская прэмія.

Сабіралі аўдыторыю.

Я паехаў у гасцініцу, забраў Мікалая Іванавіча, і мы паехалі на Варонскага, у «дубовую залу» — былую масонскую ложу.

Я не ведаў Пастарнака асабіста, не зацікавіў ён мяне, празаіка, але яшчэ з даваеннага часу помніў яго вершы, яны падабаліся мне. «Доктора Живаго» я, канешне, не чытаў. Ды і хто мог чытаць рэч, апублікаваную за мяжой? З тых, што сабраліся на сакратарыят, хіба які дзесятак чалавек, каму належала вырашаць лёс аўтара.

Цяпер аб тым пасяджэнні пішуць вельмі многа і... няпраўду. Па-першае, на сакратарыяце нават пры прысутнасці рэдсавета «СП», а нацыяналы прыйшлі ўсе, было не так ужо мнагалюдна. Дзе ж вы былі, абаронцы Пастарнака?

І нарэшце... гэта добра запомнілася. Мне хацелася, каб нехта выступіў за Пастарнака. Не таму, што я падтрымліваў яго, не, я ішоў за ўсімі, я верыў ім, старым і мудрым, але мне, сюжэтчыку, хацелася канфлікту, драматургіі. Ніхто не выступіў з добрым словам. Усе асуджалі. Усіх абурала: як савецкі пісьменнік можа прымаць буржуазную прэмію?! Няхай адмовіцца! Няхай адмовіцца! У мяне няма — няхай і ў яго не будзе, такая, па-мойму, логіка пераважала.

Рыленкаў знік — ці не з Твардоўскім? Вярнуўся позна ўначы і сказаў, што гэта ганебнае пасяджэнне і ўсім ім павінна быць соромна. Але ж яны — гэта і сам Твардоўскі, які таксама прамаўчаў. А Панова, Далматоўскі і иже с ними — яны не яны?

Разгарнуў том «Краткой литературной энциклопедии». Выйшаў праз 10 гадоў пасля выключэння Пастарнака. Галоўны рэдактар А. А. Суркоў, які выступаў там асабліва пафасна — як заўсёды. Вялікі артыкул, разоў у шэсць большы, чым пра Рыленкава. Ацэнка «Доктора Живаго»: «В романе выражено глубокое разочарование в идее революции, неверие в возможность социальной перестройки общества. Герой романа отвергает жестокость белогвардейского лагеря и не приемлет революционного насилия и жертвенного подчинения личности судьбам революции». Пісалася як для сённяшняга дня — найвышэйшая ацэнка.

З красавіка

У Маскву ў тыя гады, калі я стаў вядомы і адносна багаты, часта ездзіў. Любіў Маскву. Асабліва карыснымі і цікавымі былі пленумы Камітэта па Ленінскіх і Дзяржаўных прэміях. Тады Камітэт быў вялікі, больш за сто чалавек, ад Беларусі — ажно чацвёра: Пятро Глебка, я, мастак Яўген Зайцаў і кампазітар Камінскі (паехаў у Ізраіль).

Пленумы М. С. Ціханаў праводзіў доўгія — пры адборы конкурсных твораў засядалі мінімум два тыдні. Работы хапала. Выстаўкі. Архітэктурныя збудаванні. Спектаклі. Фільмы. Усё глядзелі. Ацэньвалі. Потым засядалі секцыі. На нашай, літаратурнай ішло даволі жывое шырокае дэмакратычнае абмеркаванне. Што б зараз ні гаварылі, ні пісалі, якія б «зашораныя» яны ні былі, якія б чалавечыя слабасці ні мелі, але ўсё ж гэта былі аўтарытэтныя пісьменнікі, мастакі, кампазітары, рэжысёры, акцёры. Ціханаў, Твардоўскі, Грыбачоў, Чакоўскі, Пракоф'еў, Ісаеў, Бажан, Ганчар, Лупан, Абашыдзе, Турсун-задэ, Расул Гамзатаў... Называю тых, каго помню. Слухаць іх было цікава. Прагляды сталічных спектакляў, конкурсных і няконкурсных, фільмаў (акрамя конкурсных, паказвалі лепшыя замежныя) — былі для мяне, самавука, без літаратурнай адукацыі, выдатнай школай. Я ўсмоктваў усё, як губка. Увогуле любое мастацтва, сапраўднае, я ўспрымаў эмацыянальна, з душэўным трапятаннем, з радасцю. Скептыцызм некаторых старых, таго ж Глебкі, мяне раздражняў: ён часам глядзеў спектакль ці выстаўку вачамі акадэміка. Але розум яго мяне пакараў, я літаральна быў улюбёны ў гэтага чалавека. І яшчэ ў аднаго — у Аляксандра Андрэевіча Пракоф'ева, цікавейшага чалавека і паэта. На пленумах мы былі неразлучнай тройцай. Жылі нязменна ў гасцініцы

«Масква». Глебка і Пракоф'еў сябравалі з даваеннага часу, і сяброўства гэта было не фармальнае, не «інтэрнацыянальнае», сапраўднае, чалавечае, душэўнае. А галоўнае — вясёлае. Абодва гумарысты, жартаўнікі, яны былі душой любога застолля, любой кампаніі. І на пленумах былі байцамі, не маўчалі — задзірыстыя. Мелі тонкі мастацкі густ. Але, на жаль, ад догмаў сталінскіх вызваляліся натужліва, не так, як гэта рабілі мы з Макаёнкам. Чацвёртым нашым кампаньёнам там, у Маскве, быў Ягор Ісаеў, мы, маладзейшыя, лёгка кантактаваліся і часам «бунтавалі» супраць дзядоў, асабліва ў ацэнцы хрушчоўскіх рэформ; Ягор і я падтрымлівалі развенчванне культу асобы. На падпіцці Ягор рабіўся залішне шумным — стамляў. Я не люблю шумнага застолля, бо сам, наадварот, раблюся маўклівым, засяроджаным, можа, нават трохі насцярожаным, пакуражыцца я магу толькі сярод сваіх — у сям'і.

Пракоф'еў адносіўся да нас з Ягорам, як строгі бацька да сыноў: то захапляўся, весела рагочучы, то строга абураўся. «Ванька, Ванька, я тебе скажу, понимаешь, хреновину ты городишь. Слушай, что я тебе скажу». Але мне асабліва падабалася, калі ён смяяўся — залівіста, да слёз.

Помню выпадак. У мяне быў уклад невялікі ў ашчаднай касе ў гасцініцы «Масква», каса тулілася ў кутку. Я пайшоў узяць грошы, а Пракоф'еў і Глебка засталіся на другім баку фае і, безумоўна, назіралі за мной, «праязджаліся», жартавалі. Новая, немаладая работніца касы ўгледзела іх і цішком папярэдзіла:

«Будзьце асцярожныя, вось тыя двое ўвесь час назіраюць за вамі».

«Тыя? О, гэта страшныя злодзеі!»

Падышоў і расказаў ім аб папярэджанні касіркі. Як рагатаў Аляксандр Андрэевіч! І доўга, спусціўшыся ў фае і ўгледзеўшы касу, смяяўся.

«Ванька, Ванька! Так как она сказала. «Два типа»? Нет, Петька, ты послушай, на кого мы похожи с тобой!»

Пасля вячэрніх праглядаў мы вячэралі, як правіла, у нумары, часцей за ўсё ў Глебкі; Пятро Фёдаравіч быў гаспадарлівы, дамавіты і па гэтай часці геніяльны арганізатар, ва ўспамінах пра яго я пісаў, як легка ён умеў сыходзіцца з людзьмі, у гасцініцы, прынамсі, на сваім паверсе ён ведаў усіх пакаёвак, усіх афіцыянтак, і перад ім яны дабрэлі. Ды і перад Пракоф'евым, які мог праспяваць вясёлыя частушкі, часта па-народнаму «крутыя». Але да жанчын адносіўся парыцарску, як і Глебка. Гасцілі неяк у Ісаева. І Ягор нахаміў сваёй

жонцы. Добрая, мілая, ціхая руская жанчына. Расплакалася. О, як абурыўся Пракоф'еў!

«Егор! Или ты попросишь прощения, или я оставлю твой дом! Как ты, понимаешь, можешь! Как ты можешь!» — і слёзы ў вачах.

Ягор просіць прабачэння.

«Нет! На коленях! Только на коленях!»

Ісаеў падае на калені. Жонка не прывыкла да такіх выяўленняў пачуццяў. Плача. Плача Ягор. Плача Аляксандр Андрэевіч. А разам з імі і я. Толькі ў Глебкі вочы сухія. Між іншым, я ні разу не бачыў, каб ён праслязіўся на спектаклі, на фільме — ад чуласці. Вочы яго рабіліся вільготныя толькі ад смеху. Чаму гэта? Адсутнасць сентыментальнасці? Але ж па натуры сваёй быў дабрэйшы чалавек.

12 красавіка

Адзін эпізод з работы Камітэта. Мы з Глебкам акуратна адпрацоўвалі свае камандзіровачныя — акуратна хадзілі на ўсе пасяджэнні секцыі, нашай, літаратурнай, аб'яднаных секцый, на пленарныя пасяджэнні. Пракоф'еў на секцыях быў рэдка. Звонім раніцою.

«Аляксандр Андрэевіч, гудок чулі?»

«Ребятушки, ребятушки, сегодня без меня. Понимаете, хочу сочетать общественное с личным». «Сочетать» — пісаць вершы. Я зайздросціў здольнасці чалавека пасля зацяглай вячэры пісаць. Я рэдка пісаў у гасцініцах — хіба артыкул газетны. У санаторыях пісаў. У «Соснах», напрыклад, вельмі прадукцыйна. Як увосень 1989 года пісалася там «Злая зорка», старонак 50 адмахаў за 22 дні. Да Бальзака далёка, але ж...

Некаторыя члены Камітэта з'яўляліся рэдка, пераважна на заключнае галасаванне,— «маскоўскія класікі». Твардоўскі, напрыклад. Пад яго «іграў» Вадзім Кажэўнікаў. Але Аляксандр Чакоўскі, М. Грыбачоў праяўлялі проста-такі школьную дысцыплінаванасць. Яны «задавалі тон», хоць часта трымаліся супрацьлеглых ацэнак.

Але было пасяджэнне секцыі, на якое сабраліся не толькі ўсе літаратары, але і многія прадстаўнікі іншых мастацтваў. Мелася абмеркаванне «Одного дня Ивана Денисовича».

Перад тым і ў нас у гасціницы была бурная вячэра. Пад удар старых трапіў я. Я быў пад уражаннем расказаў Р. Бярозкіна аб лагерах і яго ацэнкі аповесці Салжаніцына. Ды і самі мы (Мележ, Макаёнак, Брыль, Аўрамчык...) ацанілі аповесць станоўча, хоць кожны па-свойму, у залежнасці ад таго, напэўна, хто ў якой ступені вызваліўся ад сталінскіх дагматаў; пры ўсіх хрушчоўскіх зігзагах мы за

тое дзесяцігоддзе прайшлі шлях большы, чым за два наступныя — брэжнеўскія.

Пра аповесць мы гаварылі з Глебкам, і ён у прынцыпе падзяляў маю думку. Але калі на словы Пракоф'ева: «Ребята, завтра Сашке (Твардоўскаму) надо дать бой» я нясмела прызнаўся, што мне аповесць Салжаніцына падабаецца,— узнялася бура.

Пракоф'еў плачучым голасам загаласіў:

«Петька! Петька! Ты послушай. Нет, ты послушай, что говорит твой дружок. Ванька! Если ты занимаешь такую позицию, нашу компанию оставь. Иди к Твардовскому и Сатюкову!» (Быў такі хітры царадворац — галоўны рэдактар «Правды», які матляўся, што флюгер.)

На мяне накінуўся і Ягор. У яго былі свае аргументы: няхай рэч будзе і геніяльная, але даваць Ленінскую прэмію за першую аповесць невядомага пісьменніка...

Я, безумоўна, і не думаў актыўна выступаць — па такім творы хопіць гаваруноў, гэта не раман нейкага таджыкскага ці латышскага калегі; тут першае слова належала нам, нацыяналам, хоць мы добра ўсведамлялі, што паўплываць на вынікі мы можам хіба сваім тайным голасам, прамовы нашы мала што значылі.

Секцыя была бурная. Група Твардоўскага, можа, не з'яўлялася большай па колькасці, але актыўнай, ваяўнічай, Твардоўскі ўмацаваў яе экспертамі-крытыкамі. Але і група Грыбачова, Кочатава, Пракоф'ева, Сафронава, колькасна падмацаваная нацыяналамі, таксама не маўчала і не абаранялася, бадай наступала — у іх меўся магутны арсенал марксісцка-ленінскіх догмаў. Дарэчы, у гэтай групе не апошнюю скрыпку іграў Алесь Ганчар.

Твардоўскі, між іншым, сказаў:

«Хто сёння выступае супраць аповесці Салжаніцына, той выступае супраць рашэнняў XX з'езда».

Як падскочыў Пракоф'еў:

«Сашка! Сашка! Это, понимаешь, запрещенный прием. Ты на нас подобным образом не жми».

Я ўспомніў Сацюкова. На секцыі ён актыўна выступаў за аповесць.

Секцыя не рэкамендавала.

Праз тры дні — пленум.

Мне не даравалі і маўчанне — распякалі, хоць Глебка рабіў гэта жартаўліва: «Не даць яму выпіць сёння. Няхай папостуе, пакуль не пакаецца».

На другі дзень «Правда» дала вялізны артыкул Самуіла Маршака з вывадам, што гэтая аповесць калі не вышэй, то на ўзроўні Льва

Талстога. Пракоф'еў пляваўся. І напіўся ў той дзень — так перажываў сваё ідэйнае паражэнне.

А праз суткі ці двое, у дзень пленума, тая ж «Правда» дала падборку пісьмаў чытачоў супраць аповесці: антысаветчына.

Група Аляксандра Трыфанавіча панікла, не сталі нават выступаць, усё было зразумела. Сацюкоў выступіў супраць аповесці, за тры дні змяніўся чалавек. Во так рабілася літаратурная палітыка!

14 красавіка

Броўка, майстра тактычных хадоў, рабіў манеўры: выбіў адзінкі, замест структуры «старшыня-намеснікі» прапанаваў сакратарыят, ажно шэсць сакратароў. Гэтай «дэмакратызацыяй» хацеў улагодзіць сваіх гарачых праціўнікаў. Можа, частку «цэнтра» і павярнуў у свой бок. Але яму ўсё ж укінулі 84 чорныя шары з двухсот з нечым, на май 1966-га, як дае БелСЭ, у СП было 242 члены. Вельмі балюча перажыў гэта надзвычайна самалюбівы чалавек, якому споўнілася 60. Не атрымаў ён пашаны, якую меў Колас у тыя ж 60-65 гадоў.

Ідэя сакратарыята прайшла. Сакратарамі выбралі Броўку (першым), Брыля, Мележа, Панчанку, Шамякіна (мне ўкінулі ўсяго 27 галасоў, і да гэтага Броўка адносіўся раўніва і дакараў, што я «працаваў на іх», хоць, клянуся, супраць яго не сказаў ніводнага благога слова). Адказным сакратаром быў выбраны Мікола Ткачоў: ён шчыра рабіў, не лез у класікі, і яго пісьменнікі прымалі без зайздрасці — самай страшнай хваробы ў нашым асяроддзі.

О, як ускладнілася работа! Броўка адышоў, уся арганізацыя лягла на нашы з Ткачовым плечы, а я не быў нават выбраны другім, да гэтай ідэі прыйшлі пазней, калі Броўка пайшоў з Саюза ў БелСЭ і першым выбралі Максіма Танка, добрага чалавека і паэта. А наша чацвёрка (без Ткачова) — лебедзь, шчупак і рак. Усе мнілі сябе класікамі. Пімен рэдка з'яўляўся нават у нашу кантору. Але, чалавек сумленны, ён першы зразумеў, што нехта ж, хоць адзін, павінен нешта рабіць, хаця б пісьменнікаў прыняць, памагчы ў іх клопатах. Я гэта ўмеў і любіў. І памагчы мог: мяне ведалі рэспубліканскія, гарадскія кіраўнікі, з некаторымі з іх я вучыўся ў партшколе. Працаваў актыўна хіба Янка Брыль, але ў адным кірунку — па сувязях з літаратурамі іншых народаў, еўрапейскай, асабліва польскай. Але што зробіш, калі такое было жыццё! Хто мог памагчы Пестраку, Машару, Перкіну, Барсток, Гаўрусёву, Лупсякову?

Калі нас сабраў сакратар ЦК Пілатовіч пасля прыходу Танка і сказаў, што трэба выбіраць другога сакратара. Каго? — на мае здзіўленне, мае калегі і апаненты адзінадушна назвалі мяне; ніхто з іх «хо-

мут ломовой лошади» адзець не захацеў. І цягнуў я лямку яшчэ 14 гадоў.

Іван Паўлавіч Мележ хварэў. Чалавек ён быў складаны. Правільна кажуць: пра нябожчыка гавораць або добрае, або не гавораць нічога. У гэтым ёсць мудрасць. Але, можа, гэта датычыць таго часу, калі адкрытая труна ці свежая яшчэ магіла. Ва ўспамінах «Палёт над Палессем» я сказаў пра яго шчыра. Але ў наш час нельга не бачыць, што ўспаміны нашы іканастасныя. Чалавечай сутнасці, супярэчлівасці натуры мы не раскрывалі. Тут яшчэ мае значэнне і «рэдактура» блізкіх: сям'я не прапускае не толькі негатыўнае, але і чыста чалавечае, напрыклад, закаханасць у другую жанчыну ці ноткі гумару.

Іван Паўлавіч лічыў сябе лепшым празаікам у Беларусі, амаль адкрыта выказваўся пра гэта. І я не асуджаю яго і не асуджаў, хоць некаторыя «праязджаліся» па яго «вялікасці», я ж разумеў, што гэта толькі падкрэслівае трагізм яго становішча: чалавек верыў, што мог бы падняцца да новых мастацкіх вышынь, каб не хвароба...

З Мележам мы пачалі з добрага сяброўства. Асабліва калі ў 1953 годзе пасяліліся побач, на адной пляцоўцы, праз сцяну, я чуў, як ён кашляў, лёгкія ў яго таксама былі хворыя. Маша вельмі шкадавала яго... Калі не лічыць тых, на каго абрушыўся тапор рэпрэсій, Іван Паўлавіч Мележ, лаўрэат Ленінскай прэміі, трагічная фігура ў нашай літаратуры, у прыватнасці, у нашым ваенным пакаленні. Няхай жа будзе яму спакойна на тым свеце!

18 красавіка

Прагледзеў яшчэ раз бібліяграфію сваіх твораў. Многа я напісаў. Асабліва ў 60-70-х гадах. Апавяданні, артыкулы, п'есы. Многа смецця. Але за што мне крыўдна — за п'есы. Мне здаецца, іх недаацэньвалі, яны праходзілі неяк між іншым. Не шанцавала на рэжысёраў? Не шанцавала. Не ўмеў наладжваць кантакты ў тэатрах, як умеў гэта Андрэй. Гэта дзіўна: я плаваў, што рыба ў вадзе, у рэдакцыях і адчуваў сябе чужым у тэатры, нават у ТЮГу, дзе ставілі мае п'есы. Можа, я прыйшоў туды залішне сур'ёзным аўтарам — вядомы раманіст, грамадскі дзеяч, крыху пазней, з 1971 г.,— Старшыня Вярхоўнага Савета. І акцёры дзіцячага тэатра ставіліся як да мэтра, «шышкі», начальніка. Андрэй у купалаўцаў быў сваім чалавекам. Напэўна, драматургія мая была ў нечым празаічная. Але цяпер ставяць газетныя рэпартажы. А я заўсёды быў сюжэтны. Гэта зразумеў Юрый Шчарбакоў, які інсцэніраваў і паставіў у тэатры Якуба Коласа «Крыніцы». Спектакль для Віцебска быў сенсацыяй — з-за Бародкі і многіх смелых рэплік. Дар драматурга адчула ў мяне і Любоў Іванаўна Маза-

леўская (старыя майстры больш удумлівыя): яна паставіла ў Тэатры юнага гледача маю першую п'есу «Не верце цішыні». Не шэдэўр п'еса: меладрама з модным для таго часу сюжэтам. Але спектакль пратрымаўся ў рэпертуары гадоў 15, яго «прагналі» разоў 600.

Пазней такія рэжысёры не траплялі ся. Я не помню нават, хто паставіў «Экзамен на восень». А між тым гэта цікавая п'еса. Год ці два назад яе паставіла тэлебачанне, і я глядзеў спектакль з цікавасцю і хваляваннем. Быў харошы спектакль у Брэсцкім тэатры па «Сэрцы на далоні», пастаўлены Волкавым. Лепшую маю п'есу, дарослую, «І змоўклі птушкі» паставіў у тэатры Купалы Барыс Эрын. Ставячы гэтую п'есу, ён адначасова падрабляў яшчэ недзе, на рэпетыцыі з'явіўся разы тры, не больш, іх праводзіла яго асістэнтка ці памочнік рэжысёра Галіна Уладамірская, добрая, слаўная жанчына, але які ж рэжысёр? Спектакль выцягнулі выдатныя актрысы ў ролі Наталлі Фадзееўны — Марыя Захарэвіч і Лілія Давідовіч. Маша Захарэвіч — гэта нацыянальны скарб, а яе не ацанілі, не ўзнялі.

Маю працу ўтэатры можна назваць «бесцветной». Бясколернай у кіно не назавеш. Там усё каляровае — вясёлае і шумнае.

Малады і самалюбівы, я радаваўся, калі Іосіф Шульман вырашыў здымаць фільм «Крыніцы».

Рэжысёр ён быў рамесны, божай іскры не меў, але валодаў прафесіяй. Працаваць з ім было цікава. Мы спрачаліся, шумелі. Для мяне адкрываўся новы свет. Я паехаў на здымкі ў Мазыр, пасябраваў там з выканаўцам галоўнай ролі акцёрам МХАТа Залатухіным. У гасцініцы не жыў. Зняў за Прыпяццю хату ў рыбака. Рыбачыў. Піў. Жыў з сынам, які пасля стаў вядомым акцёрам. Я таксама прыехаў з сынам — з 13-гадовым Сашам. Купаліся да адурэння. Баяліся за хлопцаў — заплывалі далёка. А ўвечары юшка з рыбакамі. Хораша такія кантактныя людзі вывучаюць жыццё! Лёгка. Без натугі. Без спецыяльнай мэты. Проста і весела жывуць. Але як гэта памагае ім ляпіць вобразы! Так, між іншым, жыў і Андрэй. Бываюць і таленавітыя зануды, але ўвогуле сапраўднаму мастаку пыха не да твару.

Мой другі кінарэжысёр, бадай, з гэтай, другой катэгорыі. Вячаслаў Нікіфараў, які цяпер велічыня ў кіно, здымаў фільм па аповесці «Эшалон прайшоў». У аповесці былі нядрэнныя сцэны з Леніным. Леніна нам здымаць не дазволілі, тады на ўсё павінен быў быць дазвол. Нікіфараў перад тым зняў самастойна адзін усяго фільм «Зімародак». «Хлеб пахне порахам» (назву прыдумаў Анатоль Вялюгін) была яго другая работа. Ён лічыў, што ў яго ёсць права ўсё перарабляць па-свойму. Мы ледзьве не хапаліся загрудкі. Старшыня камітэта У. В. Мацвееў неаднойчы мірыў нас. З Шульманам можна было пакрычаць,

але і дамовіцца. З Нікіфаравым дамовіцца нельга — так чалавек сцвярджаў у кіно сваё «я». Сцвердзіў. Выходзіць, да мэты прыводзяць розныя сродкі.

Месцам здымак выбралі чамусьці Даўгаўпілс. Латышы лепш кармілі, ці што? Але ў тыя гады і ў нас не галадалі. Адзінае тлумачэнне: стары вакзал, дарэвалюцыйны — што трэба. Ездзіў я туды. Праз Нарач, Літву. Накуляўся на родных прасёлках. Зайздросціў літоўскім дарогам. Уражанні ад Даўгаўпілса і здымак — бляклыя. Не Мазыр. Самойлава не было, казалі, што ён чалавек цікавы. Пацешыла хіба адна карцінка. Прайшоў поезд «Ленінград — Берлін», а на вакзале надпіс — «Орша» і ўсе даўнія надпісы. Пасажыры спачатку здзівіліся. Пасля актыўна фатаграфавалі. Фінал Нікіфараў, лічу, сапсаваў, зрабіў няпраўду, але ўвогуле фільм атрымаўся, рэжысёр меў усё ж «божую іскру». Аднак ужо ў сталым узросце «Дуброўскага» паставіў дрэнна, Пушкіна прачытаў дзіўна.

27 красавіка

Самсон Самсонаў знаходзіўся ў зеніце славы — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за «Оптимистическую трагедию». Велічыня саюзная — да носа не дацягнуцца. І — о цуд! — гэты жывы кінакласік прыехаў да мяне ў Мінск, «снизошел» да нацыянала, прачытаўшы ў «Молодой гвардии» «Торговку и поэта». Ён загарэўся ідэяй паставіць фільм. І актрысу знайшоў, новенькую, маладзенькую — Наташу Андрэйчанка — на ролю Вольгі.

Самсонаў здорава ўмее развіваць ідэю, сюжэт — ставіць фільм на словах. Ён адкрываў мне, аўтару, аповесць, да яго тлумачэння, далібог жа, я не разумеў, што напісаў. Ніхто яшчэ не даваў такой высокай ацэнкі маёй творчасці. Раблю папраўку на чыста яўрэйскую хітрасць — і аднак... цешыла самалюбства: такі рэжысёр сам прыехаў да мяне з заманлівай прапановай. Ён і Андрэю падабаўся, а той, лічыў я, мае развіты нюх на рэжысёраў.

Але калі мы разам пачалі рабіць сцэнарый, я адразу ж пераканаўся, што пісаць ён абсалютна не ўмее, ад яго вусных распрацовак на паперы заставалася прымітыўная жвачка. Рэжысёр не мог звязаць дыялог дзвюх асоб — каб ён стаў натуральны і раскрываў характары. Усё прыйшлося рабіць мне. Ён згаджаўся, не супраціўляўся, як Нікіфараў,— сур'ёзны чалавек! Але пры здымках рабіў па-свойму і... дрэнна. Збянтэжыла адна дэталь... мяне збянтэжыла, Машу — абурыла. Ён прапанаваў, каб аўтарам сцэнарыя стаяў я адзін, хоць я быў за тое, каб і ён быў сааўтарам. Але пагадненне на раздзел гонарару пароўну ён вымусіў мяне падпісаць, без натарыяльнай заверкі, у

СП засведчылі мой подпіс. Растлумачыў шчыра: ён не хоча выплачваць аліменты сваёй былой жонцы, вядомай актрысе Валодзінай, якая, маўляў, і без таго абагацілася за яго кошт. У нас... у Машы асабліва... было зусім іншае разуменне понятия чести, совести. як можна такім чынам абіраць уласную дачку? Мяне ўніжала, што патыражныя, а яны былі немалыя — тут Самсонаў пастараўся, мне прыходзілася перасылаць яму паштовым пераводам. Пры гэтым пільна сачыў за правільнасцю сум — цераз ВААП. Калі я затрымаўся з чарговым пераводам, ён не пасаромеўся тут жа напомніць па телэфоне з указаннем усіх ваапаўскіх каардынат. Я, лапух, не адразу сцяміў, што падатак бяруць з мяне, а ён атрымоўвае чыстую суму. Карацей кажучы, я ўпершыню ў жыцці ўдзельнічаў у супрацьзаконнай акцыі — скрыцці аліментаў.

Арганізатар Самсонаў быў выдатны: прабіць на «Мосфильме» звышпланавую пастаноўку — ого! Для гэтага трэба быць або тройчы лаўрэатам, або Самсонам Іосіфавічам.

На здымкі я не ездзіў. Аднойчы наведаўся на студыю і пашкадаваў: Самсонаў павёў мяне да дырэктара, які з ветлівасці прыняў (ведаў, што ад такога рэжысёра не адаб'ешся), але чыноўніку таму было наплявать на нейкага нацыянальнага аўтара, цікавасць яго абудзілася хіба на міг, калі хітры Самсонаў паведаміў, што ў сённяшнім нумары «Правды» мой вялікі артыкул; «Правда» была «Правда», і ў дырэктара «Мосфильма» аўтары газеты выклікалі навагу большую, чым аўтары аповесцяў і сцэнарыяў.

Самсонаў арганізаваў прэм'еру ў нас у Мінску, у Доме літаратара. Прывёз групу чалавек восем. Народу набілася поўна. Яшчэ нейкую дэлегацыю неграў прывялі. Доўга выступалі я, Самсонаў, аператар, Андрэйчанка, нехта з нашых крытыкаў...

Нарэшце пусцілі фільм. Першыя кадры, размова Вольгі з Ладуцькам і... нема. Няма гуку. Во сюрпрыз! «Шаўкі» тут жа мусцілі плётку, што гэта хітра прыдуманая «дыверсія», каб сарваць паказ. Каму і навошта гэта патрэбна было?

Я пайшоў да кінамеханікаў: што можна зрабіць? Трэба «гукавы блок», новы, гэты выйшаў са строю. Дзе ўзяць? Ды ў любым кінатэатры, там маюць запасныя. З цяжкасцю дазвоньваюся да намесніка дырэктара «Міру». Тлумачу. Націскаю на замежную дэлегацыю. Зразумеў. Пакуль напісалі гарантыйнае пісьмо, пакуль схадзіў кінамеханік, прайшло больш гадзіны. Але — дзіўна — зала не разышлася. І дэлегацыя неграў цярпліва чакала.

Фільм віталі. Зроблены, безумоўна, прафесійна, але ўсё ж рамесна, здзівіла мяне мастацкая глухата вядомага рэжысёра. Пасля я

паглядзеў некаторыя яго фільмы. Ёсць ганебна бяздарныя — як «Танцпляцоўка».

Ганарар дзялілі папалам, а на аплату банкета чалавек, якога я частаваў шчодра і ў Мінску, і ў Маскве, не вылажыў і капейкі: маўляў, будзь удзячны, што цябе паставіў такі рэжысёр! Вось так.

23 сакавіка

Дзесьці менавіта ў гэты час — у 70-я гады, застойныя, мы з Андрэем былі членамі сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі нашай студыі. І мы добра вывучылі кінакухню. Памыйніца. Мы верылі, што можам нешта зрабіць, і актыўнічалі, асабліва ў першыя гады. Мы стараліся зрабіць нацыянальнае кіно. Таму стаялі сцяной супраць той сцэнарнай халтуры, якая плыла з Масквы. Там, па-мойму, існаваў цэлы сіндыкат кінадзяльцоў, якія забяспечвалі «адсталых» нацыяналаў прадукцыяй, часта даволі заляжалай. Некаторых лавілі на тым, што сцэнарыі іх пабылі ў Кіргізіі, Таджыкістане, Латвіі, не прайшлі там — давай паспрабуем шчасце на «Беларусьфільме». І, наадварот, «рэзалі» мы — і фільм, набыўшы «нацыянальны каларыт», выходзіў ва Узбекістане.

Супраць такіх майстроў мы ваявалі. Часам небеспаспяхова. Але дарэмна мы цешылі сябе. Нічога не мянялася. Ішла гульня. Маскоўскіх «геніяў» падтрымлівалі нашы.

Астылі мы да работы ў студыі. Ды і да кіно ўвогуле. Я хоць спакойна адносіўся (параўнаўча спакойна) да таго, як рэжысёры калечылі мае творы. Узрыўны Андрэй гаварыў з такімі рэжысёрамі на такой «высокай ноце», што слухаць было і люба, і страшна. Сябра яго юнацтва (разам хадзілі ў школу, перапісваліся ў вайну) Пятро Васілеўскі ўзяўся паставіць камедыю па «Лявоніхе на арбіце» і... ад дзіўнага разумення прыроды смешнага, хоць у жыцці чалавек дасціпны, зрабіў бог ведае што — набор трукаў. І старыя сябры пасварыліся страшэнна, зрабіліся ворагамі. Мае спробы памірыць іх засталіся марнымі. Андрэй забараніў мне называць імя Васілеўскага. Сапраўды, мы, што маці: рабі што хочаш са мной, але не з дзіцём маім — творам.

І ўсё адно я астыў да кіно настолькі, што «Вазьму твой боль» аддаў Міхасю Пташуку на водкуп: рабі што хочаш. І ён зрабіў нядрэнны фільм. Ёсць паўторы пройдзенага ў кіно пра вайну. Але ў чым каштоўнасць? Беларус, вясковы хлопец, ён абсалютна дакладна паставіў вясковыя сцэны. Ніякі «геній» Самсонаў гэтага не зрабіў бы; Камароўка — тая ж вёска, а ў «Гандлярцы...» столькі высмактанага з пальца. Во ў чым сутнасць нацыянальнага мастака!

Прыемна было працаваць мне толькі з адным рэжысёрам — Гутковічам Аляксандрам Залманавічам. Гэты ціхі і інтэлігентны чала-

век, па-мойму, добрай сярэдняй рукі рэжысёр, меў вельмі каштоўную якасць: з творчай павагай ставіўся да аўтарскага тэксту. Ён сам умеў напісаць, але без узгаднення са мной не мяняў у дыялогу ніводнай рэплікі. Ён паставіў чатырохсерыйны фільм, тэлевізійны, па «Трывожным шчасці». У фільме многа белых нітак, але не па віне Гутковіча: яго так фінансавалі і так памагалі, што ён не мог нават «купіць» зенітную батарэю, якая дала б залп халастымі, не кажучы пра самалёт; замест гармат — муляжы, бярвенні. Якая тут можа быць праўда! Як акцёрам страляць з бярвенняў?

У 1979-1980 гадах Гутковіч зняў, па-мойму, добры, праўдзівы чатырохсерыйны тэлевізійны фільм па «Атлантах і карыятыдах». Павага да тэксту, адсутнасць усялякага кінатрукацтва, букет акцёраў робяць фільм сур'ёзным творам. Яго двойчы ці тройчы за 10 год пракруціла ЦТ, разы чатыры — беларускае. Апошні раз перад маім 70-годдзем. І людзі з цікавасцю глядзелі і ў наш час! Чаго варты Ігнатовіч! Во дзе раскрыта псіахалогія партакрата! Але крытыка пра гэта прамаўчала, Дарэмна выдумалі, што мастакі раздзяліліся па нацыянальнай прыналежнасці. Не! Па сумленнасці. Палітычнай. Мастацкай. Спекулянты і мафіёзі заўсёды застаюцца вернымі сабе і сваёй карпарацыі. Раней гэта раздзяленне маскіравалі высокімі словамі. Цяпер усе паўсталі голымі, у сваёй сутнасці. Ох, як у мяне свярбіць рука нарысаваць некаторых са сваіх калег і нават сяброў па СП і па БелСЭ. Стрымліваю сябе. Спадзяюся, што жывыя яшчэ раскрыюць сябе. Хоць, бадай, пік праходзіць. Пры любым выніку палітычнага ўзрыву наступіць спад стрыптызу: раздзеліся ўжо — далей няма куды, хіба скуру скінуць.

25 красавіка

Не помню, па чыёй п'есе была прэм'ера ў брэсцкім тэатры — па маёй ці Андрэевай. Магчыма, «Сэрца на далоні», іх спектакль стаў падзеяй.

Пасля прэм'еры Андрэй загарэўся жаданнем паглядзець Белавежскую пушчу, ні разу не быў там. А я наведваўся і пазнаёміўся з дырэктарам пушчы Раманавым Уладзімірам Сяргеевічам, маім земляком, цікавым, мужным чалавекам: інвалід вайны, без адной нагі, ён быў і добры гаспадар, і вучоны, і паляўнічы адменны, навучаў там усё начальства паляваць. А былі там тузы — неаднойчы Хрушчоў, пасля Брэжнеў, натуральна, усе нашы — Мазураў, Машэраў, Кісялёў, «народныя дэмакраты» — і Гротэваль, і Хонекер, і Гамулка, і Герэк, і Кадар (па словах Раманава, найлепшы паляўнічы, прафесіянал), і Жыўкаў, і Фідэль Кастра; неафіцыйныя сустрэчы, пра якія рэдка і скупа

паведамляла прэса, адбываліся там. Раманаў мне трохі расказваў пра гэтых людзей, і ў Андрэя «гарэў зуб» пачуць расказы з першых рук.

Дырэктар тэатра завёз нас у пушчу. Размясціліся ў Камянюках у гасцініцы, тады яшчэ новай, добра ўгледжанай, з добрым рэстаранам, з фірменнымі стравамі — кілбасы з дзіка, журавіны і іншае. Во як жылі ў пачатку застойнага часу! Пазванілі Раманаву на кватэру. Раіса Іванаўна аддала пісьменнікам большую ўвагу, чым Брэжневу: знайшла мужа недзе ў лясніцтве.

Уладзімір Сяргеевіч з'явіўся з аператыўнасцю, з якой, можа, не з'яўляўся да высокага начальства: мы цікавыя для яго былі гэтак жа, як і ён для нас. Пакуль знаёміліся, у суседнім нумары, па яго заказе, накрылі стол, думаю, не горшы, чым накрывалі Гамулку ці Кадару. Прыйшла Раіса Іванаўна, прывабная жанчына, рагатуння, вастраслоўка, як і муж, я пільнаваў Андрэя, каб не пачаў фліртаваць, спрыт на гэта ў яго быў незвычайны, і жанчыны проста ліплі да яго. Не, у Андрэя быў іншы інтарэс. Яны вельмі хутка паразумеліся — ён і Раманаў, родныя душы — гумарысты, веселуны, выпівакі, выдатныя расказчыкі. Расказы Раманава пра «вярхоўных» варта было б запісаць — цяпер, з сучасных пазіцый. Тое, што ён расказваў тады, я не адважваюся запісваць цяпер — забылася, баюся, што наблытаю. Але як дабрацца да Уладзіміра Сяргеевіча? Як яго «падняць» на тыя ж расказы? Баюся, што і ён цяпер раскажа зусім па-іншаму. Пра сваіх ён расказваў з гумарам, нават саркастычна, не толькі пра былога Хрушчова, але і пра новага актыўнага ў той час генсека Брэжнева. Любіў чалавек павесяліцца — жыццялюб! Сур'ёзна і з павагай Раманаў расказваў пра аднаго Касыгіна. Аляксей Мікалаевіч не паляваў, не выпіваў. Калі світа паехала на паляванне, ён, адзін, без аховы, сеў у «газік», за рулём якога быў бязногі Раманаў. «Пакажыце мне гаспадарку».

27 красавіка

На другі дзень мы выступілі ў пагранічнікаў, парыліся ў іх лазні.

Абедалі ў Віскулях, ва ўрадавым комплексе, у глыбіні некранутай пушчы. Безумоўна, не ў той зале, дзе абедаў Брэжнеў,— у гасцініцы для аховы. Але паказаў нам Раманаў усё. Адчувалася, што яму хацелася, каб хтось з нас напісаў пра тое, як адпачывае партыйная эліта, самыя вярхі яе.

І ў мяне з'явілася такое жаданне — напісаць пра пушчу. Паляванне напісаць. Але як? Героі хто? Вазьмі гэтых пад любымі прозвішчамі — «зарэжуць на корані». Круціў розныя сюжэты. Але быў у мяне сюжэт, над якім я працаваў ужо,— аб лёсе чалавека, кіраўніка, які меў уласную думку і ні ў вайну, у партызанах, ні ў мірны час не

глядзеў начальству ў рот. Іван Антанюк, кіраўнік рэспубліканскага маштабу ў сферы аграрнай, выступіў абарону... траў. Сучаснай моладзі гэта не зразумець. Але быў час, калі і травы сталі высокай палітыкай, звычайная канюшына, на якой у Беларусі, Польшчы, Літве стагоддзямі трымалася жывёлагадоўля, і добра трымалася.

«Кукурузнік» Хрушчоў, «рубаха-парень» і рубака, вырашыў і тут зрабіць пераварот і абвясціў вайну травам. Добра помню, што не толькі спецыялісты, але і мы, пісьменнікі, з самага пачатку лічылі гэта глупствам, дзеці сялян, мы добра ведалі, што такое канюшына. А кукуруза, кіяхі... іх садзілі на Брэстчыне і Гомельшчыне толькі на гародах.

Знайшліся людзі, якія выступілі супраць гэтай бяздумнай палітыкі. Але ў чым была бяда рэфарматара Хрушчова? Ён, як і Сталін, не мог цярпець тых, хто думае інакш, не так, як ён, вярхоўны. Розніца была ў тым, істотная, безумоўна, што Сталін такіх садзіў, Хрушчоў адсылаў на пенсію. Побач з ваеннымі з'явіліся і цывільныя, былыя кіраўнікі, пенсіянеры ва ўзросце 45-55 гадоў. І як правіла — не горшыя людзі, тыя, хто ўмее думаць самастойна.

Падзеі я на гэты раз не апярэдзіў, пісаў раман пасля таго, як Хрушчова змясцілі. Але людзей гэтых рэдка вярталі назад: выросла новая генерацыя кіраўнікоў, падладжвалася пад «новы вецер». Навошта ж ім такія, як Антанюк? Неспакойна з імі. Вобраз у мяне быў гатовы — у галаве. Але як бы не хапала «запеўкі». і вось там, у пушчы, асяніла: пачаць раман з палявання тут. Антанюк у новай якасці. Раней ён прыязджаў сюды гаспадаром. А тут выпадкова трапляе ў кампанію саюзнага міністра, якому арганізоўвае паляванне ў пушчы дырэктар інстытута Валянцін Будыка, у мінулым начальнік штаба брыгады, якой камандаваў Антанюк. Пачаў я раман інтрыгуюча — не для масавага чытача: «Зубр стаяў пад старымі елкамі, камялі якіх абраслі сівым мохам. У гэтым глухім кутку пушчы ўсё першабытна замшэлае...»

Радавыя чытачы чыталі раман не так, як «Глыбокую плынь» і «Сэрца на далоні». Але начальства, нават тое, што па-беларуску не чытала, прачытала. Адны хвалілі, другія круцілі — хто галавой, хто носам. А Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, старшыня Саўміна, мой зямляк, увогуле разумны і дасціпны чалавек, значна пазней у даверлівай размове сказаў мне:

«Хацелі мы зарэзаць твае «Снежныя зімы»... Але пашкадавалі, каб не сапсаваць табе біяграфію».

Вось так. А маглі і сапсаваць. Так залежаў наш лёс — ад размовы членаў бюро за абедам. Даволі было б Сурганаву сказаць: «Это

безобразие, что он написал о пуще. Этого нельзя позволять!» — і будзь здароў, Іван Пятроў.

2 мая

Храналагічна я «пераскочыў», напісаўшы пра «Снежныя зімы». Увогуле гісторыю твораў я не пішу, я пішу ўласную біяграфію і летапіс часу. Але творчасць мая так шчыльна прывязана да часу, што «біяграфія» таго ці іншага твора — гэта як бы дапаўненне ці тлумачэнне, каментарый да тых ці іншых падзей, палітычных, грамадскіх, літаратурных.

Асаблівасцю маіх твораў з'яўлялася тое, што і самі яны рабіліся падзеяй: іх чытала кіраўніцтва — тое нават, якое рэдка разгортвала беларускую кнігу (хоць, калі я цяпер сустракаюся з былымі «тузамі», цяперашнімі пенсіянерамі, успамінаюць яны, як правіла, дзве кнігі — «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», хто-ніхто — «Атланты...»), іх чыталі нават пісьменнікі, якія сваіх вельмі рэдка чытаюць; некаторыя пасля выказваліся крытычна — не ў прэсе, па завуголлі, але ацэнкамі сваімі палохалі крытыкаў; мяне рэдка крытыкавалі, але і не хвалілі, як Брыля ці Быкава.

З твораў, якія з'явіліся раней «Снежных зім», увагу прыцягнула аповесць «Мост» («Полымя», № 6-7 за 1965 год) — пятая аповесць у раней напісаную, выдадзеную і перавыдадзеную кнігу «Трывожнае шчасце». Гэта, бадай, самая аўтабіяграфічная мая аповесць — пасляваеннае жыццё герояў Пятра і Сашы, жыццё сяла. Пісалася рэч у хрушчоўскую адлігу, раскавана, амаль без аглядкі на цэнзара, унутранага — пэўна. Мяне віншавалі з удачай. Адзін з першых з вялікім артыкулам выступіў у «ЛіМе» Васіль Быкаў, ужо даволі прызнаны пісьменнік, ён узлятаў імкліва, як ніхто з нас. Даў аповесці найвышэйшую ацэнку.

І раптам... маўчанне, прахадныя рэчы атрымоўвалі большую прэсу, чым сур'ёзны «Мост». У чым справа? Што здарылася? Кіўнула начальства? Не. Да гэтай рэчы ідэолагі не мелі прэтэнзій. Тайну раскрыў Бярозкін... Сутнасць была не ў аповесці, у адным эпізодзе — на дзве старонкі. У сельсавет прыязджаюць упаўнаважаны райкома загадчык райфіна Рабіновіч і начальнік аддзела дзяржбяспекі Булатаў. Не пачата сяўба. Не ідзе малако. Бабкоў, Грамыка, Шапятовіч атрымоўваюць добрую праборку. Стараецца Рабіновіч. Мала таго — паўтарае тое, што гаворыць Булатаў. Сцэна спісана з натуры. Ледзьве не штодня да нас прыязджалі такія ўпаўнаважаныя, і рабіновічы былі самыя зацятыя.

Я перачытаў зараз гэтую сцэну — абсалютна нічога абразлівага ў адносінах яўрэйскага народа. Націск звычайнага апаратчыка таго часу, на якога ў сваю чаргу ціснулі. Але, Булатава Рабіновіч баяўся, перад ім падхалімнічаў. А хто ў той час не баяўся булатавых!

10 мая

Але, народ мудры. Учора глыбока краналі рэпартажы аб святкаванні Дня Перамогі. Выйшлі тысячы людзей і ў Вільнюсе, і ў Рызе, і ў Варшаве, і ў Браціславе. Рэдка было ў Будапешце. Але мадзяры былі самымі зацятымі памагатымі Гітлера.

Глядзеў з хваляваннем «Салдаты» па Някрасаву і «Вайну» па Стаднюку. Такія творы нікому не ўдасца перакрэсліць. Гэта не класіка, але гэта дакумент гісторыі, напісаны ўдзельнікам падзей.

Някрасаву, які сербануў франтавога пылу, удалося стварыць характары, Івану Фоціевічу, сябру майму,— панараму першых месяцаў вайны. Прыйдуць новыя пісьменнікі, напішуць, можа, больш таленавіта, дакументаў ім больш раскрыюць, але ўсё роўна наўрад хто з іх напіша з той праўдай, якую неслі мы, удзельнікі. Кожны бачыў яе па-свойму — праўду вайны, гэта залежала ад таго, як быў настроены, хто яго акружаў і дзе ён ваяваў. Салжаніцын, Быкаў, Васільеў — па-свойму, Астаф'еў — па-свойму, звышідэалістычна пісаў пра яе Ганчар. Я — стрымана, але з узвышэннем людзей. І яны вартыя былі таго, каб іх узвышаць, тыя ж мае дзяўчаты ў «Зеніце» ці тая ж Вольга Ляновіч, Шапятовіч, Саша.

12 мая

Усё яшчэ жыву Днём Перамогі, але не падзеямі вайны — падзеямі нашых дзён. Ідэаліст, палітработнік, я верыў у наш высокі гуманізм і, дабраўшыся ў 1945 годзе да Германіі (я дэталёва расказаў пра гэта ў «Зеніце»), вельмі гуманна адносіўся да немцаў, нянавісці да іх не адчуваў. А цяпер, калі не мы, а яны пажалі ўсе плады Перамогі — ажно да лёгкага і вельмі таннага ўз'яднання дзвюх Германій, — немцы пачалі раздражняць мяне. Учора злараднічаў і рагатаў, калі ўсходнія маладыя немцы закідалі Коля тухлымі яйкамі. Ацю яго!

15 мая

Пазваніла Алеся. Гумарыстка:

«З цябе шампанскае».

«За што?»

«Адгадай».

«Калі добры перавод...»

«Бяры вышэй».

«Што можа быць вышэй за грошы ў час рыначных адносін?»

«Табе — «Дружба народаў».

Ордэн! Чуў, што Саюз да 70-годдзя нешта сачыняў. Але да юбілеяў цяпер не даюць. Не спадзяваўся. Не чакаў. Чатыры месяцы прайшло. Што ж, не так радасна, як раней, але прыемна, таіць няма чаго,— няхай будзе ордэн і ад прэзідэнта. Пастараліся нашы. Дзякуй ім. Не забылі на ветэрана вайны і літаратуры. Аднак ніхто з калег не пазваніў, не павіншаваў. І мае добрыя намеснікі з БелСЭ. Што гэта? Няўвага? Ці непавага? Сумна. Вось так часта заўсёды яны побач — і радасць і расчараванне, гаркота.

18 мая

Яшчэ раз аб тым, як узнікалі задумы раманаў, фармаваўся сюжэт. Не помню, па якім пытанні нас слухалі на бюро ЦК. Але я прачытаў, што наступнае пытанне — аб забудове Паркавай магістралі Мінска. І я застаўся ў зале, каб паслухаць; і ў 50-гадовым узросце я ўсё яшчэ быў прагны да таго, што адбывалася вакол, хацелася ва ўсё пранікнуць, усё пазнаць — палітыку, сельскую гаспадарку, тэатр, архітэктуру, не кажучы ўжо пра хлеб свой — літаратуру. Цяпер, калі кіпяць страсці, такой цікавасці няма, хоць часам рэпартаж з сесій Вярхоўных Саветаў СССР, БССР, РСФСР магу слухаць да гадзіны ночы, а разоў колькі і да дзвюх гадзін, тэлевізар з адным вокам глядзець лягчэй, чым чытаць.

Да гэтага часу хвалю сябе, што застаўся на абмеркаванні архітэктурнай праблемы. Размова была вострай, крытычнай і доўгай. Гадзін каля трох. Па-першае, для мяне адкрылася новая тэма, творча блізкая, але да якой я падступаў хіба толькі пры ацэнцы раманаў У. Карпава; пра раман «За годам год» я пісаў. Валодзя жыў архітэктурай Мінска і ў застоллі многа гаварыў пра яе, часам так доўга, што мы, моладзь у параўнанні з ім, адварочваліся: асаблівай далікатнасцю не вызначаліся, за сталом хацелася ахапіць усе праблемы свету — ад сваіх дробных крыўд да глабальных падзей сусветнай палітыкі.

Новай гранню адкрыўся на тым бюро П. М. Машэраў. Па-першае, нейкай надзвычайнай, я сказаў бы, апантанай зацікаўленасцю ў тым, якой будзе Паркавая магістраль. Па-другое, нечаканым высокім прафесіяналізмам: добра падрыхтаваўся да размовы. Не дылетанцтваваў. Паміма рэплік, першы сакратар гаварыў добрую гадзіну. Мяне проста ашаламіла, якой ён бачыў гэтую магістраль. Цуд! Нельга было не згадзіцца з яго планамі, з яго архітэктурнымі рашэннямі, да такога не даходзіў нават наш «архітэктар» У. Карпаў, а галоўнае — не

даходзілі прафесіянальныя архітэктары. ГалоўАПУ, гарвыканком, Дзятлаў і Шарапаў падпалі пад жорсткую крытыку за забудову першага ўчастка праспекта за «дамы-тычкі», за гасцініцу «Юбілейная», за Палац спорту. Сапраўды, бясслаўная архітэктура. Аднак выходзіць, што і Машэраў не адразу дапяў, што ўсё гэта не тое, не так, інакш у яго было сто магчымасцей умяшацца на стадыі планіроўкі, праектавання, збудавання гэтых «шэдэўраў». Ідэя ў яго была выдатная: забудаваць лепшым жыллём, адміністрацыйнымі і культурнымі гмахамі толькі да першага кальца, а далей, да Ждановіч, паміж Свіслаччу і чыгункай — парк, незвычайны, па ўзоры заходніх, ландшафтны парк. Пятро Міронавіч думаў пра людзей: уся паркавая зона Драздоў, дзе размяшчаліся ўрадавыя дачы, і далей — Ждановічы, Мінскае мора, Крыжоўка, Заслаўль — усё аддаць для адпачынку працоўных. Цяпер, калі ідуць нападкі на партыю, я часта ўспамінаю гэтае і многія іншыя выступленні Машэрава. Не пра сябе думаў кіраўнік партыі! Не думаў жа ён тады, што Паркавая стане праспектам Машэрава. Але калі гэта здарылася, я зноў-такі часта думаў аб тым пасяджэнні. Як прадчуванне, як рок!

Між іншым, пасля смерці Машэрава ідэя аб забудове Паркавай спаганена, як, можа, ніводнае іншае добрае пачынанне яго. Сорамна глядзець, як забудоўваецца гэты праспект, які сапраўды мог бы стаць унікальным, упрыгожыць горад-герой.

Самая застарэлая, заразная хвароба наша, ад якой цывілізаваныя народы, калі не вылечыліся, то стараюцца вылечыцца,— гэта нераадольнае жаданне пераемнікаў закрэсліць сваіх папярэднікаў, іх саміх, іх ідэі, нават самае добрае, што яны зрабілі. Вызначаліся гэтым і пераемнікі Машэрава. А з імі стараліся і падначаленыя. Прылажыў да гэтага руку, сумна пісаць, і яго пер'аемнік Ц. Я. Кісялёў. Не любіў ён Машэрава. Але ж хіба можна помсціць мёртваму, ды яшчэ такім чынам — калі ад гэтага церпіць цэлы горад? Мой сябра Юрый Грыгор'еў, якога Машэраў назначыў, пасля Дзятлава, начальнікам ГалоўАПУ,— дагаджаў новаму начальству. Ды і другі мой сябра і кансультант Юрый Шпіт, хоць і быў антыподам Грыгор'ева, гнуў не туды, даказваў, што ідэі Машэрава — дылетанцтва. О не, хлопцы! І я з вамі нярэдка спрачаўся, хоць і на мяне вы глядзелі з архітэктурнай вежы: маўляў, лезе не ў свой гарод літаратар, хоць «Атланты...» амаль усе архітэктары ўхвалілі і «блох» вылавілі там нямнога.

А што зараз робяць з гэтым слаўным праспектам, бог мой! Нават Шпіт, страціўшы ўладу і стаўшы радавым, плюецца. Жыллёвы масіў у раёне Гвардзейскай — іудзейскія могілкі, толькі што з нагрувашчваннем не чорных, а жоўтых камянёў. Бачыў такія могілкі ў Нью-Йорку,

праязджаў многа разоў міма, а пасля, з узгорка, глядзеў на панараму Манхэтэна — копія тых жа могілак.

Адзінае светлае месца, якое ўпрыгожвае праспект Машэрава, — абеліск гораду-герою, нават не сам манумент, а яго прывязка, «упісанасць» у ландшафт Свіслачы. Калі і гэты, правы бок магістралі сапсуюць падобнай забудовай — усё загубяць. Ці пасадзяць наперадзе «Планеты» які-небудзь «прафсаюз» — стыне кроў.

Аднак я ўглыбіўся ў архітэктуру, марная трата часу і паперы: архітэктараў нашых не пераканаеш.

Дзіўны і незабыўны быў ход (не, палёт!) маёй думкі на тым бюро! Я тады абдумваў новы раман. Вельмі хацелася напісаць галоўнага героя з Андрэя Макаёнка. Характар! Асоба! Але якую пасаду яму даць? Мастак, жывапісец? Вакол жыцця, працы, барацьбы мастака «накручваўся» сюжэт. І раптам там, на бюро, апаліла думка: не тое! Мастак — дробна! З кім ён можа сутыкацца? Са сваімі калегамі-зайздроснікамі, як і Андрэй, і я ў СП? Дробна, лакальна, не трэба масаваму чытачу нашы «мастацкія праблемы». Галоўны герой — галоўны архітэктар горада! Да Мінска прывязаць цяжка, але абласны горад — не ніжэй. Толькі на такой пасадзе ён будзе ў гушчы жыцця, сярод праблем, якія цікавяць сотні тысяч людзей,— якое яно, жыллё, якія магістралі, транспарт, зоны адпачынку, культурныя цэнтры. Вось такія бываюць павароты ў праектаванні сюжэта!

Гады на тры я стаў архітэктарам. Пазнаёміўся з дойлідамі — з тым жа Грыгор'евым, Шпітам, Дзятлавым, з галоўнымі архітэктарамі Брэста, Гомеля, Магілёва. Хадзіў на пасяджэнні архітэктурнага савета, на калегіі Дзяржбуда, вёў доўгія дыскусіі са старшынёй яго Уладзімірам Каралём, які свой немалы талент загубіў адміністрацыйнай работай. Але арганізатар ён быў выдатны. Да яго па-рознаму адносіліся калегі, будаўнікі, але аўтарытэг прызнавалі. Чалавек ён быў шырокай натуры, па захапленні мастак. Помню, неяк сустрэліся ў дэпутацкім пакоі Беларускага вакзала — група пісьменнікаў, ехалі з пленума СП, і ён, нечым узрадаваны, здаецца, нейкай прэміяй. І там, у пакоі, і ў вагоне старшыня камітэта напаіў каньяком чалавек дзесяць пісьменнікаў і сваіх калег, людзей даволі загартаваных па гэтай часці.

Мае ўменне сыходзіцца легка з людзьмі розных прафесій і рангаў памагала ствараць арыгінальныя і разнастайныя характары. Чаго варты Макаед і Ніна Іванаўна ў «Атлантах...». А колькі мяне шпілялі ханжы ад літаратуры і ідэалогіі за тое, што Ніна прыехала на дачу Карнача і спакусіла яго. Ох, які гвалт узнялі! Як можна! Дзе наша, савецкая, мараль? Літаральна так. Смешна ўспамінаць.

Увогуле гісторыя збору матэрыялу, напісанне і далейшы лёс рамана «Атланты і карыятыды» — гэта яшчэ адзін раман. Можа, вярнуся яшчэ ва ўспамінах.

19 мая

Прыгадаў Пятра Міронавіча — і ўначы доўга думаў пра лёс гэтага чалавека, шмат у чым супярэчлівага. Але ўвогуле дзеяча высокага маштабу. У самым галоўным — Камуніста. Ён варты таго, каб у палеміцы з антыкамуністамі, якія аплёўваюць ці гатовы абліць чорнай фарбай кожнага камуніста (акрамя сябе, яны святыя, хоць да сваіх прафесарскіх званняў лезлі праз партыю, з дапамогай партыі), ставіць яго ў прыклад — Машэрава. Ён не пазбаўлены быў чалавечых слаоасцяў, як усе грэшныя. Але ён трымаў іх пад кантролем, свае слабасці: дазваляў сабе не больш таго, што дазваляла становішча.

Статус кандыдата ў члены Палітбюро быў прыдуманы не ім. Каб ён паспрабаваў не выконваць гэты статус, рэзка вызначыўся сваёй непагрэшнасцю — гэтага яму не даравалі б. Брэжнеў і без таго не любіў Пятра. За што? Паспрабую паразважаць ніжэй.

Цяпер пра Машэрава многа пішуць, цэлыя аповесці, у аповесці С. Антановіча яго апошнія месяцы распісаны ледзьве не па гадзінах, а дзень смерці — па хвілінах.

Пасля яго трагічнай гібелі ў мяне, груба кажучы, свярбелі мозг і рука — напісаць пра яго дакументальную аповесць. Яшчэ раней мне хацелася напісаць пра яго маці, якую расстралялі фашысты. Апярэдзілі падхалімы і спаганілі тэму: ніхто не напісаў нічога сур'ёзнага ні ў прозе, ні ў паэзіі, ніхто не ўзняўся да сапраўднай трагедыі (а трагедыя шэкспіраўская!), як, між іншым, ніхто не напісаўтрагедыю дзяцей Міная, бадай, «Балада» А. Куляшова — вяршыня, хоць канцэпцыя яе прадыктавана ўмовамі вайны, ідэалогіяй вайны. Праз сорак гадоў можна было б напісаць, але ніводзін сур'ёзны мастак не ўзяўся за гэтую тэму. Ды і хто гэта мог зрабіць? Выношваў гэтую тэму Андрэй, але да трагедыі ён так і не ўзняўся. Мне здавалася: смерць дзяцей — не прадмет даследавання. А пра смерць маці хацелася напісаць. Не адной. Іх арыштавалі чацвярых, матак партызан. І ўсіх расстралялі. Пераканаць: пра гэта трэба пісаць, цяпер гэта больш неабходна, чым у любы іншы пасляваенны час. Можна ўсё адмовіць, але патрыятызм і матчыну адданасць Радзіме і сынам адмовіць нельга. Калі хтось гэта хоча зрабіць — злачынца, якому няма апраўдання перад народам і гісторыяй.

Чаму я не напісаў пра Пятра пасля смерці яго? Астудзілі мой творчы жар? Так, астуджалі, я пісаў пра гэта яшчэ ў дзённіках 1981

года. Размовы з Паляковым, Кузьміным, Святланай Піліпаўнай, Паўлам Міронавічам (да Паліны Андрэеўны звярнуцца не хапіла чамусьці духу) былі подступамі да тэмы.

Але галоўная прычына не ў парадзе Кузьмина: пачакаць, не спяшацца, маўляў, не настаў час пісаць пра Машэрава. Пазней, значна пазней да мяне дайшоў сэнс слоў Аляксандра Трыфанавіча: ён баяўся і адцягваў з'яўленне «велічальнай аповесці» пра таго, каго пасля смерці хацелі закрэсліць. Не віню яго. Такі быў час, такія норавы ў лартыйнай іерархіі.

Хутчэй за ўсё не ўзяўся я за гэтую, напэўна, пачэсную працу таму, што не разумеў Героя (ён такі Герой — з вялікай літары). Ды і цяпер, бадай, не разумею — супярэчнасцяў яго характару і нават яго біяграфіі.

Мяне здзівіў Іван Яўцеевіч Палякоў, які ў сваю чаргу здзівіўся, калі я сказаў яму, што бацьку Пятра ў 1937 годзе рэпрэсіравалі. Разам яны працавалі з камсамола, сто разоў сядзелі за добрым бяседным сталом, і, выходзіць, Машэраў нікому са сваіх калег не сказаў пра гэтую істотную дэталь сваёй біяграфіі. Чаму? Баяўся? Не верыў? 25 гадоў пасля XX з'езда? Хіба не дзіўна? Паўтараю, як я даведаўся пра гэта. Недзе ў годзе 1978-1979, пасля таго як Машэраву да 60-годдзя было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, выдавецтва «Беларусь» запланавала кнігу пра Герояў (задума, напэўна, узнікла і тэрмінова рэалізоўвалася менавіта таму, што званне гэтае атрымаў Першы). Папрасілі, каб напісаў пра Машэрава я. Задание пачэснае. Але Савелій Паўлаў папярэдзіў:

«Не больш паўаркуша. Пятро не дазволіць, каб пра яго было напісана больш, чым пра іншых, вы ж ведаеце яго».

Магчымасці абмежаваныя. Можна было напісаць, не выходзячы з дому. Героя свайго я добра ведаў: сустракаўся і ў яго кабінеце, і на пленумах, бюро, на семінарах па сельскай гаспадарцы. Любіў ён праводзіць такія семінары і браў на іх пісьменнікаў, мастакоў, нават кампазітараў — далучаў да жыцця. Думаю, іроніі гэта не заслугоўвае, заслугоўвае ўдзячнасці: урэшце і праз паказуху — глядзелі ж найлепшыя гаспадаркі — мы пазнавалі і жыццё, і характары, у тым ліку і характар самога Пятра; на гэтых семінарах ён быў асабліва дэмакратычным, любіў, калі мы з Андрэем задавалі пытанні (падначаленыя — сакратары райкомаў — іх не задавалі), загараўся, калі мы нешта аспрэчвалі ў тэарэтычным плане, але злаваўся, калі мы ставілі падсумненне дасягненні сельскай гаспадаркі, выказвалі скептыцызм ці рабілі намёкі, што, маўляў, ці не прысутнічае тут паказуха. За

апошняе асабліва моцна злаваў. Нешта такое ляпнуў, памойму, Алесь Асіпенка, і яго выключылі са спісу ўдзельнікаў будучых семінараў.

Гаспадаркі па паўгода рыхтаваліся да такога рэспубліканскага семінара і паказуху — ох, як умелі арганізаваць! Па гэтай частцы ўсе вялікія майстры — ад рэспубліканскіх органаў да даярак — хітрыя бабы, ім ад гэтага горш не рабілася, іх лепш забяспечвалі тэхнікай, ствараліе лепшыя бытавыя ўмовы.

Рэаліста, скептыка і гумарыста Андрэя гэта злавала і засмучала — ён любіў Пятра.

«Слухай, няўжо ён гэтага не разумеў, не бачыць, што яму ж «втирают очки»? Разумны чалавек! На храна яму гэта трэба? — неадной-чы, адышоўшы ўбок ці ў гасцініцы, казаў ён мне.— А што, калі адкрытым тэкстам сказаць яму пра гэта. Папрашу заўтра на вячэры ў афіцыянткі каньяку, прытварыся п'яным і... ашаламлю...»

Ведаючы сябра свайго, я дапускаў, што можа ён выкінуць такі нумар, і пераконваў яго не рабіць гэтага.

Карацей: напісаць кароткі нарыс пра першага сакратара было няцяжка, чыста журналісцкая праца. Але цікавасць да Машэрава-чалавека прымусіла мяне колькі дзён пасядзець у партархіве і праштудзіраваць дасье брыгады, у якой малады Пятро партызаніў, быў камісарам — добрую паўтысячу самых розных дакументаў,— і сярод іх прачытаў заяву Машэрава з просьбай прыняць яго ў партыю. У гэтай заяве-біяграфіі ён паведамляе, што бацька яго, Мірон Машэраў, у 1937 годзе рэпрэсіраваны органамі НКУС. Мужна для таго часу і вельмі сумленна! Чалавек раскрыўся новай гранню і яшчэ вышэй узняўся ў маім разуменні яго.

Многа там цікавых дакументаў, асабліва для таго, хто сур'ёзна займаўся партызанскім рухам, а я ўжо нямала напісаў раманаў, аповесцей. Асабліва зацікавіў яшчэ адзін дакумент пра Машэрава.

Камандаванне брыгады прадставіла да ўзнагарод ладную групу партызан, чалавек, здаецца, пятнаццаць. Сярод іх Пятра — на ордэн Леніна. На прадстаўленні рэзалюцыя начальніка Беларускага партызанскага штаба П. А. Калініна: «Тав. Машэраў і яшчэ адзін (выпала з памяці прозвішча, трэба праверыць) заслугоўваюць звання Герояў Савецкага Саюза».

Ніжэй кароткая рэзалюцыя П. К. Панамарэнкі: «Поддерживаю».

21 мая

У нарысе я пра бацьку не напісаў. Як званне Героя прысвойвалася — напісаў. Але ў той жа дзень я расказаў пра сваё адкрыццё Андрэю. Помню, мы доўга хадзілі ў Ждановічах па лесе і абмяркоў-

валі, на першы погляд, ардынарную дэталь біяграфіі кіраўніка: хіба ў аднаго Машэрава быў пасаджаны бацька? Пасля XX з'езда рэабілітаваны бацькі і іх сыны, і многія займалі адказныя пасады. Але мы звязалі гэта з іншай падзеяй — нашай, літаратурнай. Дзесяць гадоў ляжала п'еса Макаёнка «З кірмашу», камедыя, у якой падзеі першага акта адбываюцца ў 1937 г.— як на хвалі апусташальных арыштаў да ўлады прыходзіць невук і хапуга. П'есу затрымала міністэрства, Галоўліт: усе чапляліся за свае крэслы. Андрэй, паваяваўшы з міністэрствам, нажыўшы сабе ў асобе Міхневіча ворага, занёс п'есу Машэраву — аўтарытэтнаму арбітру. Чытаў Пятро п'есу доўга, нарэшце запрасіў драматурга на гутарку. Андрэй сказаў мне: «Хадзем разам. Мне весялей будзе. Аспрэчваць Пятра ты не адважышся, але па дыханні я буду адчуваць тваю падтрымку — родненькі-народненькі побач, кіраўнік мой дарагі». Андрэй без жартаў не абыходзіўся.

«Як пайсці без запрашэння?»

«А я ўжо званіў Кузьміну, ён згадзіўся, што з табой мне будзе весялей, і перадасць Пятру».

Я і цяпер шкадую, што не запісаў хаця б тэзісы той размовы, Яна цягнулася больш за тры гадзіны. Перш-наперш здзівіла, як удумліва, дэталёва, з алоўкам прачытаў сакратар п'есу. І зачаравала, як Пятро Міронавіч гаварыў. А гаварыў ён, па сутнасці, адзін, зрэдку Андрэй не згаджаўся з яго думкай. Але гэта яго не раздражняла, а толькі заводзіла на новы віток разважанняў. Гаварыў ён разумна і цікава, як не ўмелі гэта рабіць крытыкі, гаварыў аб'ёмна, маштабна. І што нас тады ўразіла і што стала зразумелым гадоў праз дзевяць — пасля майго адкрыцця — з болем, чалавечым болем гаварыў ён пра даваенныя рэпрэсіі. Сталіна абяляў: не адзін ён, яго падвялі такія прайдзісветы, як Ягода, Яжоў, Берыя, Берман, Наседкін... Назваў многія прозвішчы работнікаў НКУС у Беларусі, адчувалася: ведае віну кожнага. Андрэй тут жа перапыніў, праводзячы сваю даўнюю думку:

«Дык чаму не сказаць пра іх усяму народу?»

«Ты думаеш, гэта проста?» Машэраў, закурыўшы, можа, дваццатую цыгарэту, доўга хадзіў па кабінеце, а потым узняўся на новы «віток» — аб сітуацыі, якая склалася ў сувязі з развянчаннем культу асобы. І зноў — многа слушнага, хаця і спрэчнага. Андрэева аспрэчанне не перапыняў, а выслухоўваў уважліва і зноў «заходзіў здалёк». Многа дэталяў, якіх мы не ведалі. Намёк на новы культ - Брэжнева. Але глухі намёк, на поўны голас праслаўлены партызан не адважыўся сказаць.

Заключэнне добразычлівае, сяброўскае — Андрэю:

«Няхай паляжыць твая п'еса гадоў пяць. А там будзе адкрыта ёй дарога. Ручаюся».

Гэтыя пяць гадоў мы часта ўспаміналі, бо п'еса праляжала 12 гадоў і пайшла пад новай назвай «Пагарэльцы», перапрацаваная не лепшым чынам, між іншым, не без маёй дапамогі (у чым каюся перад памяццю сябра); я, сюжэтчык, падказваў яму новыя хады — маскіровачныя. Андрэй запісваў іх, новыя варыянты сцэн, чытаў мне і... мацюкаўся. «Гаўно гэта, Іван, не тое. Такі ход можа зразумець хіба Георгій Колас. Нават акцёры яго не зразумеюць і не сыграюць. А гледачы?»...

Але які сэнс укладваў Машэраў у «пяць гадоў»? Спадзяваўся на перамены. Безумоўна, у сувязі з уходам Брэжнева. Не думаў Пятро, што «мудры Леанід» перажыве яго.

Брэжнеў не любіў Машэрава. Пра гэта ведаў і наш беларускі актыў, і маскоўскі, у вузкім коле пра гэта гаварылі, чулі мы такія размовы. Завошта не любіў? Лепшая рэспубліка, асабліва па сельскай гаспадарцы. Забяспечвала Маскву і Ленінград мясам і бульбай.

Ведаючы псіхалогію людзей, тылу Брэжнева, можна зразумець вытокі яго непрыязі да аднаго са сваіх калег па Палітбюро. Зайздрасць. Зайздросціў яго сапраўднай, не ліпавай, ваеннай славе, Герою Савецкага Саюза 1943 года, а не... якога там за Малую зямлю. Зайздросціў абаяльнасці Машэрава. Прыгажун спартыўнай паставы. Выдатны прамоўца. Мысліў і выказваўся заўсёды лагічна, выразна. А найбольш, думаю я зараз, Брэжнеў не любіў Пятра за тое, што яго любіў народ. Безумоўна, была служба, якая вывучала рэйтынг кожнага кіраўніка, ступень яго аўтарытэту. І калі там былі аб'ектыўныя людзі, якія рабілі не па прынцыпу «Что угодно?» — то пра Машэрава, пра любоў да яго беларусаў яны выказваліся высока. І гэта раздражняла Генсека.Ён ведаў, што людзі не ў вялікім захапленні ад свайго «правадыра». Ачмурыць так народ, як гэта здолеў Сталін, нікому ўжо пасля не ўдалося — ні Хрушчову, ні Брэжневу. І не ўдасца!

23 мая

На маё паведамленне І. Я. Палякову пра бацьку Пятра ён, між многага іншага (у тым ліку і негатыўнага, што засмуціла мяне, упэўненага, што Пятра ўсе любілі), сказаў:

«Незадоўга да смерці ў неафіцыйнай гутарцы, па-мойму, тады ж, калі ён сказаў, што хутка памрэ, ён раптам спытаў: «А ці ведаеце вы, што немцы мяне арыштоўвалі і я месяц сядзеў у барысаўскай турме?» Не, мы гэтага не зналі... ніхто з нас (цёзка мой не ўдакладніў, хто прысутнічаў на гутарцы). Не зналі. І я табе, Ваня, скажу больш: і не хацелі знаць! На храна нам гэта трэба!»

Гэта мяне ашаламіла. Чаму? Палякоў не растлумачыў — чаму. Такая непавага да таварыша, з якім з'елі сем пудоў солі, да яго біяграфіі? Не! Там жа я зразумеў: людзі вопытныя, навучаныя суровым жыццём, такім чынам ахоўвалі свайго кіраўніка. Пачалавечы яны маглі любіць ці не любіць яго. Але, ведаючы адносіны да яго там, на палітычным алімпе, яны не жадалі даць хоць які козыр нядобразычліўцам, падхалімам Брэжнева прынізіць партызанскую славу Машэрава. Ох, як парадавала б Брэжнева чорная пляма ў біяграфіі Героя вайны. Калегі Пятра Міронавіча ахоўвалі не толькі яго, але і сябе: ніхто не жадаў, каб на яго ўпала пасля падазрэнне, цень, што ён стаў даносчыкам, стукачом.

Ні ў адной аўтабіяграфіі, напісанай Машэравым, гэтай дэталі няма, я пытаў яго памочнікаў.

Што магло адбыцца? Арыштавалі настаўніка-камсамольца, які арганізоўваў моладзь Расон, у канцы 1941 ці ў пачатку 1942 года. Магу здагадвацца: за яго прасіла маці, можа, нават «выкупіла», як рабілі гэта многія маткі, фашысты-гады «прадавалі» часам тых, хто, на іх думку, асаблівай пагрозы «новаму парадку» не нёс. Вельмі можа быць, што калі не ад самаго Пятра, то ад маці ўзялі падпіску, што з партызанамі ён не будзе мець ніякай сувязі. Таму так жорстка і расправіліся з жанчынай.

З маёй думкай згадзіўся і Андрэй.

24 мая

Яшчэ адна дэталь, якой няма ў афіцыйных аўтабіяграфіях. Але такія не запісваюцца ў іх, яны — для мемуараў, а іх Пятро не пакінуў.

У часе сесіі пілі каву ў пакоі для адпачынку прэзідыума, члены бюро ЦК мелі-асобны пакой, не помню, з якой нагоды загаварылі пра літоўцаў. Не помню хто, сур'ёзна ці ў жарт, выказаў нешта негатыўнае. Пятро Міронавіч запярэчыў і, па сутнасці, мне, бо ўвесь час звяртаўся да мяне, расказаў, як літоўская сялянка ратавала яго таварыша. Яны, знясіленыя, адступалі ад прускай граніцы. Заначавалі на хутары, гаспадыня накарміла іх. А раніцой з трывогай падняла; ёй перадалі: у блізкай, за кіламетр, вёсцы — немцы. Сама вывела чырвонаармейцаў у лес.

Я спытаў:

«Пасля вайны вы не шукалі гэтую жанчыну?»

Машэраў задумаўся, згадзіўся:

«А трэба было пашукаць. Не помню назвы вёскі, але мясціны тыя пазнаў бы. Я расказваў гэты эпізод Снечкусу»[2].

З-за нейкай фальшывай далікатнасці, з-за нежадання паказаць, што не ведаю яго біяграфію, я не спытаў, як ён апынуўся на прускай мяжы. Пасля нехта з біёграфаў сказаў мне, што ўлетку 1941 года Машэраў быў на ваенных зборах. Аўтары, якія пішуць аповесці, таксама мінаюць гэты эпізод у жыцці героя.

Смерць Машэрава пацвердзіла мае тлумачэнне, але і некаторыя з тых, хто займаў высокія пасады, дагэтуль упэўненыя, што смерць яго — не няшчасны выпадак...

Пахаванне Машэрава вылілася ў маніфестацыю народнай любові да свайго кіраўніка. Праз вестыбюль залы Вярхоўнага Савета бясконца ішлі людзі. Жанчыны плакалі. Калі я ішоў туды, то ў чарзе ажно на вуліцы Свярдлова звярнуў увагу на жанчыну з двума малымі, адно было на руках. Потым убачыў яе каля труны, праз добрую гадзіну — столькі яна выстаяла з дзяцьмі.

Жалобны мітынг на плошчы Леніна ішоў пад дажджом, але плошча была запоўнена народам. І ўсе гэтыя людзі ішлі за труной да плошчы Перамогі. Там мы селі ў аўтобусы. Пачалося будаўніцтва метро — мара Пятра Міронавіча,— і аўтобусы ішлі па вуліцах Краснай, па Якуба Коласа, Каліноўскага, і ўсюды, да самых могілак, суцэльнай сцяной стаял і мінчане. Пад дажджом, які ўзмацняўся. Калі прыехалі на могілкі, дождж перайшоў у халодны асенні лівень. Мне клапатлівы кіраўнік справамі Прэзідыума Мікалай Рыгоравіч Налівайка ўручыў парасон. А прэзідэнту АН Мікалаю Аляксандравічу Барысевічу трэба было выступаць з развітальнай прамовай над магілай. І я яго прыкрываў сваім парасонам, за што ён быў удзячны. Пасля мы так і стаялі пад адным парасонам, разам сядзелі ў аўтобусе, разам селі за стол на памінальным абедзе ў доме прыёмаў. Мокрыя, акалелыя, галодныя, мы, ратуючыся ад прастуды, выпілі не па чарцы, а па фужэру гарэлкі. Побач з намі сядзелі незнаёмыя людзі — ці з абласцей, ці з іншых рэспублік. І раптам Барысевіч на поўны голас, са слязамі, выгукае:

«Забілі, гады, Пятра! Забілі!»

---

[2] У 1992 годзе было апублікавана інтэрв'ю М. В. Зімяніна. Успамінаючы П. М. Машэрава, былы першы сакратар ЦК ЛКСМБ і сакратар ЦК КПБ паведамляе, што ўзнікала праблема пры вырашэнні пытання аб прысваенні Пятру Міронавічу звання Героя Савецкага Саюза, бо з данясенняў органаў было вядома, што ён нядоўгі час знаходзіўся ў нямецкім палоне, куды трапіў у пачатку вайны. Аднак, нягледзячы на гэта, высокае званне прысвоілі. Гэта робіць гонар П. К. Панамарэнку, М. В. Зімяніну, П. З. Калініну. Ведалі кіраўнікі, як выдатна ваяваў камсамолец-патрыёт!

«Мікалай Аляксандравіч! Ды няшчасны гэта выпадак!» — стараюся ўратаваць прэзідэнта.

«Іван Пятровіч! Ды каму ты верыш? Гісторыя разбярэцца!»

Не разбярэцца яна, гэтая прастытутка — гісторыя! У чым яна разабралася?!

Я, між іншым, перакананы, што смерць Пятра Міронавіча няшчасны выпадак. Але яшчэ адзін штрых аб думцы людзей.

Вясной 1982 года я трапіў у маскоўскую бальніцу ў Кунцава — аслеп на левае вока. Ляжаў з былым намеснікам старшыні Дзяржплана СССР Ракоўскім. Мудры чалавек! І раптам на прагулцы ён пытае:

«Так как вы там убили Машерова?»

З вуснаў такога чалавека ды яшчэ гэтакае — «як вы забілі?» — абразліва было пачуць.

«Якое забойства! Няшчасны выпадак!»

Ён паглядзеў на мяне, як на хлапчука: «Вы наивный человек, Иван Петрович. Писателю это непростительно. Вы должны знать, как это делается».

Не, знаць гэта я не хачу! Хоць і магу сканструяваць любы сюжэтны ход, у тым ліку любое забойства. Але мадуліраванне дэталёва апісаных іншымі фактаў на «злой умысел» — не выводзіць мяне з наіўнасці: не, не магло быць!

25 мая

Машэраў па сваёй натуры быў ідэалістам. Ён шчыра верыў у вялікую ідэю — у камунізм. Верылі і мы. Зараз, праўда, высвятляецца, што далека не ўсе члены партыі верылі ў камунізм. Я веру. І Андрэй верыў. Але ў нас было нямала скепсісу наконт метадаў ажыццяўлення гэтай ідэі. І даволі крытычныя адносіны, асабліва ў Андрэя, да «высоких исполнителей», такіх, як Брэжнеў. Машэраў такой крытычнасці не выклікаў, менавіта за гэта яго і паважалі — за шчырасць і адданасць ідэі. Служэнню ёй, практычнай рабоце ён аддаваў усяго сябе. Працаваў, як кажуць, «на износ». На асабістыя радасці ў яго амаль не заставалася часу. Не піў і п'яніц не любіў, караў іх сурова. Курыў празмерна. У маладосці трохі займаўся спортам. Любіў водныя лыжы. Успамінаю расказ украінскага паэта Сцяпана Алейніка. Дэлегацыя Вярхоўнага Савета на чале з Машэравым была ў Венгрыі. Дзень адпачывалі на Балатоне. Машэраў раз пайшоў на водных лыжах, другі, трэці.

«Ды з такой хуткасцю, з такімі віражамі, што ў мяне, старога, замірала сэрца,— расказваў Алейнік.— І калі ён сабраўся чацвёрты раз, я падышоў і настойліва папрасіў: «Пятро Міронавіч, не хадзіце.

Хопіць!» Ён здзівіўся: «Чаму?» — «Не толькі вы адказваеце за нас, але і мы за вас. Не хочам мы лішніх эмоцый. Хто вас возіць, вы знаеце? Колькі іх было ў гітлераўскім войску! І дзейнічалі больш па-зверску, чым немцы. А вы — партызан... Не хадзіце!» Закранула парада паэта самалюбства кандыдата ў члены Палітбюро. Пачырванеў. Здалося мне: узарвецца. Не. Падзякаваў. І больш не пайшоў».

З пазнейшых радасцей хіба было паляванне ў Белавежы. Але вырываўся Пятро Міронавіч туды рэдка, як правіла, з гасцямі, маскоўскімі ці замежнымі. А госці — тая ж работа, і вельмі нялёгкая. Помню, як я знясільваўся ад дэлегацый, калі рабіў у СП. Асабліва ў той час, калі любая сур'ёзная размова канчалася «обильным возлиянием». Замежнікі ад нас не розніліся, наадварот...

Машэраў у выключных выпадках выязджаў з будынка ЦК з заканчэннем рабочага дня, але падначаленых, акрамя хіба В. Я. Крукава, не прымушаў працаваць вечарамі. Людзей ён любіў, ашчаджаў. Успыліць мог, і нярэдка. Але хутка і адыходзіў, стараўся пагасіць сваю ўспышку і, калі не прама — становішча не дазваляла — то ў нейкай форме мог павініцца, перапрасіць. Вельмі рэдка хто таіў на яго крыўду. Успамінаю адно пасяджэнне бюро. Зацвярджалі членаў калегій міністэрстваў. Ішоў малады мужчына на члена калегіі Міністэрства будаўніцтва. Загадчык аддзела даў найлепшую характарыстыку. Але жорсткі і прынцыповы А. А. Смірноў, які займаў тады пасаду старшыні партыйна-дзяржаўнага кантролю, паведаміў:

«Работнік ён добры. Але тыдні два назад заснуў у скверы перад абкомам партыі. Чаму заснуў — думаю, растлумачваць не трэба. Не на працы змарыўся. Але месца ж выбраў для адпачынку...» Смірноў уедлівы, насмешлівы. У зале — смех. Можна, здавалася, ператварыць у жарт. Не. Машэраў ажно змяніўся з твару.

«Было?»

Прэтэндэнт патупіўся.

«Вінават. Выпілі з таварышам па інстытуце».

«Зняць пытанне! Можаце быць свабодны. Працуйце на сваім месцы. Але яшчэ адзін факт...— і да міністра: — Вы зналі аб гэтым?»

Іван Мацвеевіч Жыжаль, выдатны работнік, разумны, дасціпны, шчыры беларус, сябра многіх пісьменнікаў — у маладосці акцёрам быў, іграў у Галубка, падхапіўся:

«Партком трэста даў ацэнку...»

«Аб'явіць міністру вымову за падбор кадраў і што не праінфармаваў аддзел!»

Катэгарычна, без галасавання. Жыжаль сядзеў побач. Я, малады, гумарыстычна настроены вясёлым эпізодам, уразіўся, адчуўшы, як закалаціўся заслужены будаўнік. Мне стала шкада яго.

«Супакойцеся, Іван Мацвеевіч. Што вы так расстроіліся? Не будуць вам запісваць вымову».

«Як супакоіцца, братка ты мой? Ды і не гэта хвалюе — запішуць не запішуць. З 1925 года ў партыі і не меў ніводнага папярэджання нават». Для будаўніка гэта унікальны выпадак.

«А вы скажыце пра гэта Пятру, толькі выберыце момант пасля пытання, якое заспакоіць і парадуе яго».

«Думаеш, паслухае?»

«Вы ж яго лепш, чым я, ведаеце, ён — добры».

«Добры».

Скончыліся пытанні, якія мяне цікавілі (мне, члену рэвкамісіі, дазвалялі прысутнічаць — для пошуку сюжэтаў), але я заставаўся ў зале: чым скончыцца гісторыя з Жыжалем?

Гадзін пяць мы з ім прасядзелі, да вечара, і я здзіўляўся, як стары чалавек хвалюецца. Урэшце ён вылучыў момант, папрасіў слова.

«Пятро Міронавіч, больш сарака гадоў у партыі і... не меў ніводнага спагнання»,— і як захлынуўся чалавек, заняло голас.

Машэраў уважліва паглядзеў на яго, зразумеў, паблажліва пасміхнуўся, звярнуўся да членаў бюро:

«Ну, што, таварышы? Прапаную абмежавацца заўвагай».

Тут яго дружна падтрымалі.

І Жыжаль уміг стаў Жыжалем, у калідоры — гумарыст, рагатун, анекдотчык накшталт Макаёнка. Між іншым, Івана Мацвеевіча любіў Якуб Колас, у доме яго Жыжаль быў першым госцем на любым свяце, юбілеі. Чалавек гэты быў надзвычайнай энергіі і сапраўдны будаўнік. Адбудова Мінска, лепшыя яго раёны, Ленінскі праспект, напрыклад, ад Дома ўрада да плошчы Перамогі, забудоўваліся пад яго кіраўніцтвам. Такія былі камуністы!

Нямала Машэраў зрабіў і для культуры, хоць у гэтай сферы фігура яго найбольш супярэчлівая, пра што я скажу ніжэй.

26 мая

Пятро Міронавіч любіў пісьменнікаў, і мы, творцы, любілі яго. Наш, цяпер ужо даволі вялікі калектыў, старыя і маладыя, павінен быць удзячны яму за тое, што ён зрабіў для развіцця нацыянальнай літаратуры. Многа зрабіў. Паэты не сядзяць на Алімпе, не п'юць нектар, не харчуюцца райскімі яблыкамі. Ім трэба будынкі, часопісы, выдавецтвы, папера, кнігагандаль, ганарары, жыллё. А што мы маглі

зарабіць, збудаваць, стварыць самі — без падтрымкі партыі, дзяржавы? Сёння, калі наступае рынак, закон аб мовах не адкрыў, на жаль, большыя прасторы для беларускай літаратуры. З усёй адказнасцю сцвярджаю, што за 46 пасляваенных гадоў ніколі літаратура і пісьменнікі не знаходзіліся ў такім гаротным, безабаронным становішчы, як зараз, калі нікому мы не патрэбны і ніхто намі не займаецца з тым клопатам, яю мы мелі ў змрочныя застойныя гады.

Машэраў стаў ініцыятарам стварэння часопіса «Маладосць», яшчэ будучы першым сакратаром ЦК Л КСМБ. Ён прабіў пастановы ЦК КПСС (без такіх пастаноў ніхто не меў права гэта зрабіць) аб пераўтварэнні альманаха «Советская Отчизна» ў штомесячны часопіс «Неман». Як гэта расшырыла магчымасці для публікацый, асабліва маладых! Яшчэ большая яго заслуга ў стварэнні выдавецтваў «Мастацкая літаратура», «Юнацтва», «Беларуская Савецк.ая Энцыклапедыя». І выдавецтвы гэтыя заўсёды мелі рукапісы, якія рабіліся кнігамі, і паперу для выпуску гэтых кніг.

Аднак заўважу, апераджаючы развагу на гэтую тэму, па колькасці беларускамоўных кніг на 1000 чалавек насельніцтва мы заставаліся на апошнім месцы. Эстонія выпускала іх у сто разоў больш.

Машэраў, як кажуць у апараце, не адфутбольваў ніводнага сур'ёзнага пытання, з якім звяртаўся ў ЦК Саюз пісьменнікаў.

Доўга і пакутліва вырашалася пытанне аб пераносе праха Янкі Купалы з Масквы ў Мінск. Ажыццявіў жаданне нацыянальнай інтэлігенцыі Машэраў. Нялёгка было ўтыя часы затраціць па 700 тысяч — у адзін год! — на помнікі Купалу і Коласу. Якраз была прынята чарговая пастанова аб эканоміі сродкаў, а ў нас эканомілі на культуры (не на зброі!) — і ў мінулыя гады, і ў гады шумнай перабудовы. Перабудоўвайся, таварыш культура, без грошай!

Шукай спонсараў па свеце! Балет знаходзіць. А літаратура дзе знойдзе? Наша, беларуская. Машэраў пайшоў на рызыку (сам сказаў нам пра гэта), але помнікі нацыянальным паэтам збудаваў. Якія — гэта ўжо на сумленні мастакоў. Здавалася, першы кіраўнік добра разумеў, што без выдавецтваў, музеяў, помнікаў нацыя — не нацыя. Разумеў, безумоўна, але разам з тым быў і ў ідэйных шорах агульнай палітыкі.

Некалькі штрыхоў культурнай дзейнасці Пятра Міронавіча — з тых, да якіх я меў непасрэднае дачыненне.

Саюз пісьменнікаў змяшчаўся ў асабнячку па вул. Энгельса, у якім Осіпава і Мазанік пакаралі ката беларускага народа Кубэ. Па генплану будынак падлягаў зносу. Куды нас засунуць? Да каго звяртацца? Канешне ж, да Пятра, так па-свойску мы яго і называлі.

Пайшлі брыгадай — Крапіва, Лынькоў, Броўка, Танк, Мележ, я. Сур'ёзна выслухаў. Закурыў. Паразважаў, як заўсёды, і аб высокай палітыцы, і аб надзённых справах. Рэзюмаваў: «Задалі вы задачу. Нялёгкую, скажу вам шчыра. Але буду думаць».

Тыдні праз два запрашаюць нас у ЦК. У зале — кіраўнікі Саўміна, гарсавета, архітэктары.

Машэраў ставіць задачу: «Выбраць добрае месца ў цэнтры горада і ў кароткі час — за два гады — збудаваць Дом літаратара».

Але... Добра мне запомнілася гэтае «але», бо абурыла яно нас, змагароў за самастойнасць: кошт па праекце не павінен перавышаць мільён. Звыш мільёна мы абавязаны зацвярджаць у Дзяржплане СССР, а там такі аб'ект «зарэжуць без размоў».

Во дэталь да «самастойнасці» рэспублікі: першы сакратар, кандыдат у члены Палітбюро разам са сваім бюро не меў права ўзводзіць аб'ект коштам звыш мільёна рублёў. А хто дазваляў? Нафарбаваная баба ў доме на праспекце Карла Маркса, загадчык пададдзела, які вёў саюзныя рэспублікі. І нярэдка рашэнне залежала ад таго, які хабар гэтай «цэнтральнай кабеце» прывозілі абарыгены. А што мы, беларусы, маглі павезці? Бульбу? У гэтай «высакароднай» акцыі першынство займалі нашы паўднёвыя і ўсходнія браты. Ім было чым «пазалаціць» ручку.

Дом літаратара будавалі не два гады. Зацягвалася будаўніцтва. Нашы паходы ў міністэрства, у Саўмін, нават банкеты будаўнікам вынікаў не давалі (слабыя, мабыць, былі банкеты). Да нахабства, каб прасіць Машэрава ўздзейнічаць на будаўнікоў, мы не апусціліся. Але, як кажуць, ён сам выклікаў агонь на сябе: пацікавіўся, як у нас справы. Я пайшоў да яго на прыём. Паскардзіўся на будаўнікоў, хоць і адчуваў, што гэта нядобра: у мяне наладзіўся з імі — з кіраўніцтвам трэста, з начальнікам участка, прарабамі ды і з рабочымі — колькі кніжак ім падарыў! — добры кантакт.

Машэраў выказаў незадаволенасць і будаўнікамі, і заказчикам.

А дзён праз тры мяне, «саву», падняў з ложка яго памочнік:

«Праз гадзіну Пятро Міронавіч будзе на вашым аб'екце».

Паляцеў на Фрунзе непаголены. Там ужо былі міністр, упраўляючы трастам, інжынеры. З'явіўся Пятро Міронавіч. Доўга хадзіў па будынку, не баючыся запэцкацца, слухаў апраўдальныя тлумачэнні будаўнікоў, цёпла размаўляў з жанчынамі-тынкоўшчыцамі, з мужчынамі-паркетчыкамі. Сабраліся ў вагоне-бытоўцы. Разносу не было. Кароткая задача:

«Вось так, таварышы, дамаўляемся: свой чарговы з'езд пісьменнікі павінны праводзіць у сваім доме. Усё ясна, Архіпец?»

«Ясна, Пятро Міронавіч».

А на мяне глядзяць ваўкамі, калі я паведаміў, што да з'езда засталося тры месяцы.

З'езд мы правялі ў новым доме. Машэраў увесь час прысутнічаў на ім і, адчувалася, быў задаволены, хоць у будынку было сто недаробак, многія з якіх мы, «сакратары грамадства», не бачылі, а ён убачыў.

А будаўнікі скрыгаталі на мяне зубамі:

«Мы на вашым аб'екце панеслі паўмільёна страт. Хто аплоціць?»

На такую суму перавысілі праектны кошт. Ненармальна. Так мы заганялі эканоміку ў трубу. Але нават я, пісьменнік, умеў адбіцца:

«Фінансаваў будоўлю Савет Міністраў. Туды і звяртайцеся».

Але, здаецца, туды яны так і не наважыліся напісаць афіцыйна, плакаліся вусна, ды помню, што Н. Л. Сняжкова займалася гэтым пытаннем, шчыра жадаючы памагчы будаўнікам пакрыць іх страты.

Жыллё — найпершая патрэба, хіба пасля харчу, для кожнага чалавека. Для пісьменніка кватэра яшчэ і майстэрня, месца працы. Дваццаць шэсць гадоў я прарабіў у СП, і забеспячэнне пісьменнікаў кватэрамі было галоўным клопатам. Праўда, калі старшынёй быў Броўка, то першую скрыпку іграў ён. Пасля яго ўходу гэты клопат лёг на мае плечы, іншыя сакратары такой прозай займаліся мала — творцы! Не ляніўся пісаць пісьмы ў ЦК, у Саўмін, у гарвыканком. Нярэдка па гэтых пісьмах прымаліся станоўчыя рашэнні, але выдзялялася жылля нямнога. Выбівалі грошы ў Саюзе пісьменнікаў СССР — з багатага Літфонду, каб будаваць жыллё на далявым удзеле.

«Бяру загрудкі» аргсакратара Верчанку Юрыя Мікалаевіча, з якім у мяне сяброўскія адносіны: «Дай грошы на жыллё».

«Грошы я табе дам. Алма-Ата не асвоіла. Але без будаўнічых лімітаў. Прасі ў свайго ўрада».

«Давай без лімітаў».

Але куды дзяваць такія грошы? У каго прасіць ліміты? З Ціханам Кісялевым у мяне найлепшыя адносіны, але, ведаю з вопыту, ліміты ў старшыні не выб'еш, ён вельмі лоўка ўмеў адмаўляць — з вясёлым гумарам, за чаем з сушкамі, з анекдотамі. Спадзяванне на Пятра.

Іду да яго. Не любіў ён такіх просьб, хмурыўся.

«Куды я дзену твае паўмільёна? Безлімітных грошай у рэспубліцы — дзяваць няма куды».

«Але ж у пісьменнікаў вельмі цяжкае становішча».

«Ну, не такое яно ў вас цяжкае. Ты ведаў бы, што ў іншых арганізацыях».

Ведаю. Але — клопат пра сваіх.

«Ды расце ж Саюз, Пятро Міронавіч. Во паглядзіце, якія літаратары выраслі. У Маскве друкуюцца, у Варшаве. А жывуць у адным пакоі. Дзе толькі пішуць? Гэта ж подзвіг!»

Называю дзесятак прозвішчаў маладых, расказваю пра іх творы. Такія размовы Машэраў любіў. Гэта, бадай, адзіная тэма, калі ён слухаў, а не гаварыў сам. Чытаць яму не было калі, і памочнікі мала чыталі і не ўмелі даць такой інфармацыі. А яму хацелася быць і ў курсе нашага, літаратурнага жыцця, між іншым, гэтак жа ён цікавіўся і мастакамі, кіно, менш — тэатрам.

Пакурыў. Падумаў. Здымае трубку.

«Піліп Лаўрэнцьевіч? Шамякіна знаеш? Любіш чытаць? Ну во, я знаў, каму пазваніць. У яго ёсць паўмільёна рублёў. Так, багач! Але ў яго няма лімітаў. Знайдзі. Ды знаю я, знаю... Пашукай, пашукай — знойдзеш. Дамовіліся? — кладзе трубку, да мяне: — Ляці да Коханава, дамаўляйся з ім...»

Ляцець не прыйшлося. Вяртаюся ў Саюз — званок па вяртушцы. Старшыня Дзяржплана, звычайна спакойны і карэктны, ледзьве не з мацюкамі:

«Што вы там поўзаеце па высокіх паверхах? Дзе я вам вазьму? Адрэжу ад вашай вобласці? Але скажу, каб гамяльчане не пускалі вас на мяжу. Няма ў мяне лімітаў!»

Разумею: старшыня Дзяржплана выпускае пару. Няхай пашуміць. Нікуды не дзенецца. Сам Машэраў загадаў! Адказваю з перавагай пераможцы:

«Піліп Лаўрэнцьевіч! Але ж вы ведаеце, што я не пасаромлюся схадзіць да Пятра Міронавіча яшчэ раз. Прыемна вам будзе мець яшчэ адзін званок?»

Злосна ляпнуў трубкай. На паўмільёна лімітаў не знайшоў, а на 350 тысяч знайшоў. Але і гэта, як кажуць, хлеб: па тым часе добрых кватэр 15 на наступны год! Каго не парадаваў бы такі набытак!

27 мая

Вымаліі ў таго ж Верчанкі грошы на новы Дом творчасці. Нам Масква давала больш ахвотна, чым іншым: ведала, што мы асвойвалі іх, не расцягвалі будоўлю на многія гады. Украіна гадоў сем праектавала свой дом пад Адэсай, на касе, пачала будаўніцтва, ды і дагэтуль не завяршыла.

З добрым маім калегам, аргсакратаром Міколам Ткачовым доўга выбіралі месца. Аб'ездзілі паўвобласці — ад Стаўбцоў да Мядзеля. Нарэшце выбралі маляўнічае месца на Іслачы, за Ракавам. Але Валожынскі райвыканком і Мінскі аблвыканком нізавошта не давалі

дазвол. Старшыня аблвыканкома, партызанскі камбрыг Дзмітрый Цябут,чалавек быў незалежны, упарты, рашэнняў сваіх не адмяняў. Гаварыць з ім было цікава, але цяжка. Я падключыў яго былога партызана Алеся Савіцкага. Пайшлі на паклон разам. Форма размовы ў Цябута цікавая.

«Камбрыг, трэба памагчы пісьменнікам»,— просіць Алесь.

«Хлопцы, не мыльцеся — галіцца не будзеце. Зона дзіцячага адпачынку, а вы хочаце столькі лесу высекчы».

«А хто можа вырашыць?»

«Ніхто не вырашыць без мяне. Сам бог».

Самаўпэўнены партызан быў. Пасля мы з ім ляжалі ў адной палаце, і мяне забаўлялі яго ўедлівыя, трапныя характарыстыкі кіраўнікам — усім, акрамя Машэрава, хоць было гэта пасля смерці Пятра Міронавіча.

Звярнуўся да А. Н. Аксёнава. Той паабяцаў памагчы. Без вынікаў: На Цябута і старшыня Саўміна не мог паўплываць, бо пастанову аб рэжыме зон дзіцячага адпачынку прымаў урад. «Няхай адменіць пастанову твой Аксёнаў»,— сказаў мне Цябут.

А месца такое, што чым больш мы туды вазілі калег, тым больш пераконваліся: толькі тут мы можам тварыць! Але хто можа памагчы? Толькі Машэраў. Няёмка ісці да першага з чыста гаспадарчай просьбай. Але выйсця не было. Пайшоў. І яму просьба наша не спадабалася. Нахмурыўся.

«Што, мала месц добрых на Міншчыне?»

«Пятро Міронавіч, за тры з палавінай мільёны які дом можна збудаваць! Для ўсёй творчай інтэлігенцыі. Міжнародныя сустрэчы можна будзе праводзіць».

Сам не ведаў, чым узяць яго. Уразіла яго сума, напэўна, ён думаў, што ў нас нейкага паўмільёна — на буданчык.

«У вас тры з палавінай мільёны? Шчодра вас фінансуюць,— і выснова: — Канешне ж, для такога дома трэба добрае месца. І каб блізка. На пенсію пайду — буду адпачываць у вас. Пусціце?»

Званок Цябуту: трэба памагчы пісьменнікам. І непахісны камбрыг без бою здае пазіцыі. Пасля хітраваў: «А мне цікава было паглядзець, як высока вы дапнеце. Цаню прабіўных людзей».

У нашы дні маладыя пісьменнікі, у якіх усё менш і менш перспектывы палепшыць свае жыллёвыя ўмовы, дакараюць маладых кіраўнікоў Саюза: не ўмееце выбіваць так, як Броўка і Шамякін. Бяда не ў тым, што не ўмеюць, спрабаваў я памагаць ім — не выхсдзіць. Бяда не толькі пісьменнікаў, мастакоў — народа, што няма кіраўніка, які меў бы ўладу і аўтарытэт, роўны аўтарытэту Машэрава. Урэшце

людзям усё роўна, хто ён на пасадзе — сакратар, старшыня, прэзідэнт. Толькі антыкамуністы палітыканствуюць на гэтым і руйнуюць усё, што ствараласа такімі камуністамі, як Машэраў. Ён — асоба з вялікай літары.

Але ідэалагічная закамплексаванасць у яго оыла моцная, і гэта прыводзіла да непажаданых вынікаў.

Па натуры Машэраў быў дэмакратам.

Гродзенскі абком выключыў Аляксея Карпюка з партыі. Знайшлі «чорную пляму» ў ваеннай біяграфіі: знаходзячыся ў нямецкім лагеры, ён меў ашчадную кніжку, дзве сотні марак. Як? Завошта плацілі яму фашысты?

Дарэмна нікому не плацілі. Так, не плацілі нашым нявольнікам. Але Карпюк у той час быў грамадзянінам рэйха: раён Беласточчыны, дзе ён нарадзіўся, і некаторыя раёны Гродзеншчыны былі далучаны да Усходняй Прусіі. А статус грамадзян Германіі нават у лагерах быў інакшы — плацілі за работу, дазвалялі атрымаць перавод з дому.

Мы пайшлі да Машэрава з Максімам Танкам, і я растлумачыў гульню фашыстаў у законнасць.

Слухаў ён уважліва, здзівіўся:

«Ты адкуль знаеш гэта?»

«Чытаў».

Выкурыў Пятро не адну цыгарэту.

«Ручаецеся — не вораг?»

Нават ён у 70-я гады ўсё яшчэ быў закамплексаваны на ворагах.

«Які вораг! Партызаніў і да лагера, і пасля. Ручаемся за яго сумленнасць. Складаны чалавек, супярэчлівы, выступае на сходах нашых і пленумах так, што за вушы хапаемся,— горача падтрымлівае мяне Максім Танк,— Але пісьменнік таленавіты. Савецкі. Партыйны».

«Няхай напіша апеляцыю ў ЦК».

На бюро Карпюку залісалі вымову. Дзіўна, што і ў наш дэмакратычны час зноў усплывала «справа Карпюка». Вырашылася яна ў яго карысць. Але дэталяў я не ведаю — да мяне Карпюк не звяртаўся. Не знаю, ці звяртаўся да каго з маладых кіраўнікоў СП.

Ведаю факты па іншых пісьменніках, мастаках, акцёрах, калі Машэраў памагаў ім уратавацца ад расправы крытыкі ці тым больш карных органаў. І не ведаю ніводнага выпадку, каб з яго бласлаўлення кагосьці з інакшдумцаў пакаралі крымінальна. З партыі часам выключалі, як выключылі з СП паэта Яфімава за яго публічны пратэст супраць уводу савецкіх войск у Чэхаславакію. Злодзеяў, жулікаў Машэраў караў бязлітасна — і быў парадак, не было масавага

злачынства. Бязлітасны быў да парушальнікаў закону — «мазырская справа»; «віцебскую» «раскруцілі» пасля яго смерці.

Многа добрага зрабіў гэты чалавек і для эканомікі, і для культуры. *Але...* Якое цяжкае, але нялёгка пісаць пра яго, бо асабіста я дагэтудь не магу вытлумачыць палітычна, філасофскі, псіхалагічна гэтую *вопиющую* супярэчнасць. Адкуль яна ў даволі разумнага чалавека? Ад ідэалагічнай зацыкленасці? Зацыклены мы былі бадай усе, але не ў такой жа меры. Разумелі ўсё ж ненармальнасць палітыкі, якая праводзілася.

Разумеў жа Машэраў, што без культуры не будзе нацыі, стараўся памагчы ёй. А ў імя чаго? Дзеля чаго? Дзеля справаздачы? Знікала ж мова народа — аснова нацыянальнай культуры. Гэтыя пытанні мы задавалі і тады, гэты боль пёк, і мы крычалі. Казалі і Машэраву, і ён нібыта згаджаўся. Але русіфікацыя не спынялася, яна ішла гэтак жа інтэнсіўна, як пры Г'усараве (дык гэты ж рускі), пры Мазураве; нават русак Панамарэнка не дазваляў такіх паваротаў, калі газеты заходніх абласцей, раёнаў, «Сельская газета» пераводзіліся на рускую мову. Працэс гэты не быў стыхійны. Ён заахвочваўся пры сарамлівым замоўчванні многіх. Беларускі настаўнік, які добра ведаў родную мову (паэму «Сказ пра Лысую гару» чытаў на памяць з выдатным вымаўленнем), Машэраў ніводнага разу — ні на адным пленуме, нарадзе, з'ездзе, сесіі, урачыстым пасяджэнні — не выступіў па-беларуску. І ў прыватнай размове з намі, пісьменнікамі, не ўжываў яе; Ц. Я. Кісялёў з Броўкам, Танкам, са мной, з іншымі пісьменнікамі гаварыў на матчынай мове. А Машэраў як дэманстраваў сваю рускасць. І гэта дзейнічала мацней за любыя пастановы — такі прыклад Першай асобы ў рэспубліцы. Акрамя нас, пісьменнікаў, ніхто не выступаў па-беларуску — ніводзін ідэолаг усіх рангаў — ад ЦК да райкомаў, міністр культуры, нават нашы калегі з іншых творчых саюзаў. Выключэнне на рэспубліканскім узроўні рабіў адзін міністр асветы Міхаіл Гаўрылавіч Мінкевіч, светлая яму памяць.

Во гэта сапраўды цяжка вытлумачыць. Такая была ўпэўненасць, што ў хуткім часе, пры блізкім камунізме, нацыі сальюцца і мовы аджывуць? Няўжо была? Ці быў моцны націск з Крамля: «Ніякіх уступак нацыяналізму!»? Аднак жа ў іншых рэспубліках працэс так не фарсіраваўся. У той жа суседняй Літве. Снечкус (дарэмна «Саюдзіс» скланяе яго) адважваўся нават прымаць захады, каб як можна менш рускіх ехала ў Літву, а маглі б навадніць: узровень жыцця ў Літве быў значна вышэйшы, чым ва «ўладаркі метраполіі». Няшчасная Расія, якую вінавацяць ваўсіх смяротных грахах, дагаворваюцца да таго, што там нават зарплата была вышэй, у пасляваенны час (ды і да

вайны) жыла бядней за ўсіх. Не трэба была рускаму народу русіфікацыя іншых народаў. Хапала ў яго сваіх праблем. Каму ж гэта трэба было?

Цяпер усе — і рускія, і беларусы, і малдаване, і латышы — вымушаны збіраць вельмі горкія плады той жа нацыянальнай палітыкі.

Не, чалавек шчыра верыў у перамогу камунізму, інакш вытлумачыць некаторыя дзеянні Машэрава нельга. Я не назаву другога кіраўніка, які б так апантана выступаў супраць прыватнай уласнасці. Гэта ў той час, калі Генсек меў 44 аўтамабілі. Машэраў сваёй уласнасці, акрамя хіба мэблі і адзення, не меў. Кінуць у яго за гэта камень, думаю, не пасмеюць самыя зацятыя прыхільнікі прыватызацыі. Аднак такая сляпая прывязанасць да аднаўкладнасці не толькі прамысловасці, але і сельскай гаспадаркі не памагала вырашаць многія праблемы. Індустрыялізацыя рэспублікі, яшчэ раз паўтараю, не загана — заслуга. Японцы больш, чым англічане, «натрамбоўвалі» свае невялікія астравы прамысловасцю — і цяпер абіраюць увесь свет.

Машэраўскія выступленні нават супраць маленькай прыватнай уласнасці не памагалі знаходзіць выйсце з крызісных сітуацый. Ніхто з савецкіх, партыйных работнікаў не меў права купляць аўтамашыну (куплялі, канешне, дзецям). Але ў аснове гэта пакушэнне на свабоду асобы. Да Палітбюро дайшло нарэшце (ад саюзнікаў нашых — ГДР, Венгрыі) — неабходна развіваць садова-агародніцтва кааператывы. Выйшла пастанова. Машэраў перарабіў яе на свой лад: зямлю даваць калектывам, але не будаваць на ёй домікі, а будаваць шматпавярховыя дамы, і кожнаму агароднiку даваць у ім пакой. Яшчэ адзін калгас. Камуна. Калі за кавай у пакоі адпачынку Вярхоўнага Савета ён выказаў гэтую ідэю і калегі падтрымлівалі яго, я адважыўся заўважыць, што не пойдуць людзі ў такі «сад». Узлаваўся. Два дні работы сесіі не заўважаў старшыню, і я піў чай з міністрамі — ім каву не давалі, Чагіна эканоміла грошы.

Такія кааператывы не арганізаваліся, людзі імкнуліся мець свой кавалак зямлі і сваю хоць маленькую хацінку.

Але падобная ідэя атрымала ўвасабленне ў забудове сядзіб новых саўгасаў, што ствараліся на асушаных землях.

Вясной 1976 года пасля пісьменніцкага з'езда, які яму спадабаўся, Пятро Міронавіч запрасіў групу пісьменнікаў пралящець на верталёце над Палессем. Ён тады зрабіў падарунак цяжкахвораму івану Мележу, даўшы ўказанне пасадзіць верталёт на школьным двары яго роднай вёскі Глінішча.

Прызямліліся ў саўгасе «Камуніст» Ельскага раёна. На чорнай голай зямлі былога балота — тры пяціпавярховыя дамы, чуць воддаль

кацельня. І ўсё. Жахлівы выгляд. І тут павінны жыць людзі! А як весці ўласную гаспадарку, жывучы на пятым паверсе?

Пімен Панчанка і я катэгарычна выказалі гэта Машэраву, Кісялёву, Гвоздзеву, які ажыццяўляў такую забудову. Гумарыст Ціхан пасміхаўся і жартаваў. Гвоздзеў вельмі сур'ёзна даказваў, як мы памыляемся: людзі радавацца будуць — цяпло, газ. А Машэраў зноў узлаваўся. Напэўна, адчуваў, што робіцца не тое.

29 мая

На антыпрыватніцкія ідэі нярэдка клявалі і мы, выказнікі думак народных. І часам мастакі сур'ёзныя. Мой сябра Андрэй Макаёнак, не без уплыву Машэрава, які і з трыбуны, і ў прыватных гутарках вельмі любіў развіваць гэтыя ідэі, і даволі пераканаўча, напісаў «Лявоніху на арбіце». Камедыя падабалася Пятру. На спектаклі ён весела смяяўся, радуючы аўтара і акцёраў. Яшчэ больш спадабалася Машэраву ананімная, таленавіта напісаная, востраса тырычная паэма «Сказ пра Лысую тару» — аб тым, як пісьменнікі стварылі свой садовы кааператыў, як дзялілі зямлю, будаваліся, здабывалі гной; Алесь Кучар вазіў яго з цырка, з-пад слоноў — эпізод, з якога нельга было не рагатаць.

Пятро Міронавіч, расказвалі памочнікі, чытаў паэму ледзьве не ўсім гасцям з Масквы, з іншых рэспублік, тлумачачы чыста беларускія ідыёмы, усё астатняе рускія разумелі — рэч звонкая, у традыцыях класічнай паэзіі.

30 мая

Нельга кінуць Машэраву папрок, што яму бракавала прынцыповасці. І аднак... Час і сістэма, іерархія вымушалі і яго ісці на «сделку с совестью».

Брэжнеў праявіў абразлівую непавагу да Беларусі, калі чатыры гады не ўручаў Мінску Зорку Героя. І паўгода не ўручаў Зорку Героя Сацыялістычнай Працы Машэраву, хоць узнагародзіць вымушаны быў, бо залішне навешаў зорак сабе.

Нарэшце Генсек ашчаслівіў мінчан.

Раніцою сустракалі поезд на вакзале. Лета. Цяплынь. Настрой узнёслы. Члены ЦК, міністры «травили» анекдоты. Я назіраў за Машэравым і заўважыў, што ён нервуецца. Не дзіўна: ён гаспадар і яму належыць прыняць самага высокага госця.

Спытаў у сваіх, што ў нас размяшчаецца ў новым шматпавярховым будынку насупраць абсерваторыі.

«Інстытут».

«Ведаю, што інстытут. Але які? Як ён называецца?»

Ніхто з членаў бюро не мог назваць, як называецца ўстанова. Машэраў узлаваўся. Паклікаў гарадскіх кіраўнікоў, якія стаялі воддаль. Але і яны блыталіся, і гэта яшчэ больш раздражняла Пятра Міронавіча. Яны гаварылі ледзьве не шэптам, з аглядкай: інстытут закрыты — ці няма побач шпіёнаў? А між тым я, грэшны, ведаў, як называецца гэты інстытут. Але мяне забаўляла няведанне кіраўнікоў, і я маўчаў, я знаў, што не даруюць яны мне, калі я «вытру нос» ім. А Машэраў рэаліст. На поўны голас:

«Здорава мы кіруем! Нікулкін, як называецца інстытут, які ахоўваюць твае хлопцы?»

Але і старшыня КДБ не знаў.

(Неяк у Маскве, гуляючы ў Георгіеўскай зале, Нікулкін расказваў мне сваю біяграфію і не мог успомніць рэспублікі, у якой працаваў. «Там, за Волгай...» Я падказваў: «Марыйская, Мардоўская... Татарская... Башкірская...» «Во, Башкірская»,— успомніў праніклівы разведчык).

Машэраў сярдзіта высмеяў памочнікаў: «Дакіраваліся, што не знаем, чым кіруем. Давайце выйдзем на плошчу да людзей, і яны глядзі што хорам назавуць гэты інстытут».

Я таксама быў упэўнены, што знойдзецца нямала «шпіёнаў», якія ведаюць не толькі назву, але і чым там людзі займаюцца.

Падышоў кароткі поезд. З якой дакладнасцю спыніўся! Салон-вагон роўненька насупраць увахода ў вакзал. Адтуль адразу ж, як у казцы, раскацілася дывановая дарожка.

Спускаўся Леанід Ільіч цяжка, яго падтрымлівалі, хоць прыступкі, заўважыў я, зроблены спецыяльныя —да самай платформы. Дзеці паднеслі кветкі. Машэраў сказаў кароткую прывітальную прыстойную прамову. Кашлатыя бровы Генсека натапырыліся, здалося мне, што ён нечым незадаволены. Чым? Мала пашаны пры сустрэчы? Але што яшчэ можна было прыдумаць? Усё было, што адпрацавана за многія гады.

На сустрэчы ў ЦК я не прысутнічаў. Там Брэжнеў уручыў Пятру Міронавічу Зорку. Інфармацыя аб гэтым з'явілася вельмі кароткая. Не дзіва. Галоўнае — свята горада-героя!

Урачыстае пасяджэнне праходзіла ў тэатры оперы і балета. Выслухалі брэжнеўскае «пык-мык». З дапамогай памочнікаў ён прымацаваў да сцяга горада Зорку і ордэн Леніна.

Выступілі прадстаўнікі класаў і сацыяльных груп. На трыбуне — першы сакратар ЦК КПБ. Пастава. Голас акцёрскі. Дзве зоркі на светлым пінжаку. О, як ён знешне адрозніваўся ад Брэжнева! Зала ажно калыхнулася — любавалася сваім Героем.

Але хвіліна-дзве — і я сцяўся, мне стала няёмка, сорамна. Я сядзеў у прэзідыуме і ўбачыў, як у зале змяніўся з твару Андрэй, ды і не адзін ён.

«Божа! Навошта Пятру гэта?» — біла ў скроні думка.

Якую ён выдаваў хвалу «вялікаму і мудраму»! Выходзіла, што без дарагога Леаніда Ільіча мы даўно загінулі б.

У перапынку перад канцэртам у скверы перад тэатрам Андрэй з болем спытаў: «Ну, скажы мне, навошта яму трэба было слацца перад гэтым дубам? За што такія паклоны? Што чатыры гады не прывозіў Зорку тым, што палеглі на гэтай зямлі?»

«Палітыка, Андрэй».

«Іван, пайшоў ты са сваёй палітыкай! — і далека мяне паслаў, але падумаў і сказаў: — Усё роўна я паважаю гэтага чалавека. І скажу яму пра гэта».

«Узлуецца»,

«Няхай злуе».

Цікавы фінал прабывання Брэжнева ў Мінску. Увечары быў прыём у рэстаране «Журавінка». На двух паверхах сабралася чалавек восемсот. Я сядзеў недалёка ад «прэзідыума» і пільна сачыў за госцем: спатрэбяцца дэталі, як-ніяк я летапісец свайго часу.

Тост Машэрава тэзісна паўтарыў яго прамову.

Брэжнеў сядзеў, як адключаны ад свету гэтага, як прыслухоўваючыся да сябе, можа, і праўда ў старога штось балела. Нічога не выпіў, ад афіцыянта адмахнуўся, талерка так і засталася чыстая. І раптам, калі мы не паспелі разжаваць першую закуску, ён, ні слова не сказаўшы, падняўся і пайшоў да выйсця. Натуральна, следам кінуліся ўсе, хто суправаджаў яго (адзін сядзеў побач са мной і бесцырымонна перакуліў тры чаркі, і добра аплятаў ежу). За імі — ашаломленыя кіраўнікі рэспублікі.

Як Старшыня Вярхоўнага Савета я суправаджаў нямала розных дэлегацый і ведаў цвёрдае правіла: хто сустракаў, той абавязаны і праводзіць. Таму выскачыў на вуліцу і я, за што мне пасля дасталася ад Андрэя, ён доўга па-акцёрску перакрыўліваў, як я, падцягваючы штаны, бег праз залу да лесвіцы.

Машыну маю ДАІ адагнала невядома куды — не той нумар. Я ўскочыў у машыну міністра аховы здароўя.

«Што яго сарвала так?»

Гумарыст Мікалай Яўсеевіч — катэгарычна:

«Чалавеку захацелася выпіць. Не знаеш, якая гэта смага!»

«Жартуеце? Што ён, там не мог выпіць?»

«О, гэта высокая палітыка! Перад народам кіраўнік павінен быць цвярозым».

Падляцелі да вакзала — насустрач з будынка выходзіць Машэраў і ўсе, хто паспеў прыехаць.

Поезд адышоў. Ці паціснуў хоць госць рукі гаспадарам — гэтага я так і не высветліў.

Машэраў ішоў вясёлы, узбуджаны, яўна задаволены. Чым? Зоркай? Ці тым, што «ўладар» адбыў? Чамусьці звярнуўся да мяне:

«Ну, што? Паедзем дапіваць?»

«Канешне, паедзем, Пятро Міронавіч! Столькі смакаты засталося!»

Засмяяўся.

«Як ты сказаў — смакаты? Ёмкае слова,— і да памочніка: — Перадайце ўсім, каб вярталіся на прыём».

Тыя, хто быў разумнейшы і застаўся ў зале, як мае калегі-пісьменнікі, не трацілі часу дарэмна. З'яўленне Машэрава сустрэлі радаснымі воплескамі.

Прыём працягваўся весела.

На госця забыліся. Пілі за Беларусь-партызанку. За Зорку Мінску. За Зорку Першага сакратара.

Такім запомніўся мне камуніст Машэраў.

22 чэрвеня

50 гадоў з дня пачатку вайны. Што гэта за дзень? Жалобы, безумоўна, смутку. Украіна афіцыйна абвясціла 22 чэрвеня Днём Памяці. Правільна! Але, Дзень Памяці — з вялікіх літар. А можа, і дзень радасці — для тых, хто дажыў да 50-годдзя трагедыі (дай бог усім ім дажыць да 50-годдзя Перамогі!), для мяне — што бог ці лёс падарылі гэтае вялікае шчасце — пражыць ажно паўстагоддзя пасля таго дня, калі я мог легчы ў халодную кольскую зямлю — кулямётная чарга «месера» перарэзала баннік у метры ад мяне, я ім толькі што выбіў снарад.

Я пісаў пра першы дзень вайны ў аповесці «Агонь і снег», у рамане «Зеніт»,— у дзённіках. Чаго я не напісаў?

Уначы ўспамінаў той дзень. Храналогію напісаў. Пра страх ад першай бамбёжкі. Але яна была ў ноч з 22-га на 23-е — у палярную ноч, калі свяціла сонца. А ўдзень быў дождж... І пасля трывогі, якую ўзняў я, днявальны, пачуўшы выступление Молатава па радыё, мы сядзелі каля прыбораў і гармат па гатоўнасці нумар адзін. Мы чакалі іх не толькі са страхам (страх прыйшоў, калі пасыпаліся першыя бомбы), але і з цікавасцю (во чаго я не напісаў): якая яна, вайна?

Колькі іх прыляціць, самалётаў? Якія маркі? І колькі мы саб'ём іх? Верылі: многа, нас жа добра вучылі, па тэорыі кожны снарад павінен патрапіць у цэль. Спрачаліся. Былі скептыкі. Але выказаўся, па-мойму, толькі вопытны Іван Майбарада, што саб'ём мы мала. Нават Нёма Пясоцкі, разумнейшы з нас, маўчаў: тыдні два назад яго выключылі з камсамола за тое, што пахваліў нямецкую авіяцыю — «юнкерсы» і «месершміты». Яго дапытвалі: адкуль ён так знае фашысцкіх кіраўнікоў — амаль увесь гітлераўскі ўрад?

Але і пра гэта я пісаў. Даўно. У 60-х гадах. Першая бамбёжка ацвераэіла нас. Ашаламілі і спалохалі і наша няўменне страляць, і бездапаможнасць нашай авіяцыі: «месеры» зразалі ледзьве не кожны «1-153», ды і нямала «1-16», якія ўзнімаліся з аэрадрома ў Мурмашах, за паўкіламетра ад батарэі. Зразалі над нашымі галовамі.

Так, дзень памяці... Хочацца ўспамінаць. Праваяваў я сумленна і пражыў пасля Перамогі 45 гадоў, можна лічыць, шчасліва. Радавала творчасць, радавала сям'я, сябры. Што радуе цяпер? Усе радасці — у мінулым.

28 червеня

Толькі ў тым годзе бюро ЦК рэабілітавала Івана Кірылавіча Кавалёва, арганізатара Мінскага падполля. Я прысутнічаў на пасяджэнні і актыўна выступіў за Кавалёва — у падтрымку людзей, якія ўзнялі гэтае пытанне,— Клімава, Дамарада. На мяне пакрыўдзіўся Іван Новікаў, з якім у нас найлепшыя адносіны.

Я пісаў пра аповесці І. Новікава, «прабіваў» іх у «Сов. писателе», хоць там былі адмоўныя рэцэнзіі — па мастацкіх якасцях; масквічы, далёкія ад нашых спраў, бачылі толькі адзін бок кніг.

Аднак я ніколі не згаджаўся з вывадамі Новікава і Давыдавай наконт Кавалёва. Не мог я згадзіцца, што ён правакатар. Зламала СД пасля арышту — можа быць. Я не гісторык, не вывучаў дакументаў, ды наогул не люблю архіваў (дзіўлюся свайму захапленню гісторыяй архівамі ў часе работы над «Петраградам—Брэстам», перавярнуў гару кніг, падшывак, газет, мемуары Троцкага раздабыў; у той час гэта было ой як нялёгка!).

На чым грунтавалася мае перакананне? Пасля XX з'езда, у 1957 годзе (можа, у канцы 1956га), не помню, па чыёй ініцыятыве, наўрад ці Варвашэні, сабралі былых падпольшчыкаў. Чалавек 70, а можа, і ўся сотня. Мала хто застаўся з іх жывы. Осіпава, Мазанік... Не помню, як я трапіў туды. Здаецца, зацягнуў мяне туды Кучар, які ледзьве не захапіў тады манаполію на Мінскае падполле, яму аднаму (так ва ўсялякім разе ён пахваляўся п'яны) КДБ паказваў дакументы. Але

добра помню адно: упершыню я пачуў там імя Кавалёва. Два дні, згаджаючыся з усімі іншымі афіцыйнымі версіямі, падполыпчыкі спрачаліся пра ролю і лёс сакратара гаркома. Імя Казінца я з той нарады не запомніў, пасля са стэнаграмы даведаўся, што пра яго гаварылі ў сувязі з работай у яўрэйскім гета, але там, між іншым, героем быў Гірш Смоляр, які пасля выехаў у Ізраіль і напісаў кнігу пра Мінскае падполле.

Абсалютная большасць падполыпчыкаў, што і ўрэзалася ў памяць, аспрэчвала думку меншасці, што Кавалёў быў правакатарам і што, маўляў, па яго даносе адбыліся вясновыя арышты. Даказвалі, што нават пад катаваннем ён не выдаў ніводнай канспіратыўнай яўкі, а называў людзей, якія вялі «двайную ігру» — тых, каго напэўна падазраваў, што яны агенты СД. Прыводзілі шмат прыкладаў. Выступала жанчына, якая бачыла Кавалёва на заводзе Варашылава, куды яго прывезлі з турмы для выступления перад рабочымі. Хоць было яшчэ цёпла, Кавалёва апраналі ў доўгае паліто, крысо якога было мокрае. Яму перабілі мачавы пузыр. Гаварыў ён седзячы і аслабленым голасам, так, што мала хто пачуў, што сказаў.

Карацей. Усхваляваў мяне лёс гэтага чалавека. І мне захацелася напісаць пра яго. Але як? Афіцыйна на ім кляймо здрадніка. Ды дакументальную рэч я і не думаў пісаць. Замахваўся на раман пра падполле: не называць горад, імёны герояў вымышленыя, але сакратар гаркома з лесам Кавалёва быў бы фігурай нумар адзін.

1 ліпеня

Упершыню я выкарыстаў правакацыю СД супраць Кавалёва ў ваенным сюжэтным ходзе рамана «Сэрца на далоні», напісаўшы доктара Савіча. Праз лёс яго дачкі Зосі Савіч я пайшоў далей, як ва ўмовах «оттепели» адраджаецца добрае імя Савіча — Кавалёва. Журналіст Шыковіч — сапраўдны змагар за праўду, змагар не толькі з перастрахоўшчыкамі, але і з такімі, як Гукан, боязь якога заплямiць сябе сувяззю з Савічам робіць яго не проста трусам (слова баязлівец залішне мяккае), але і падлюгам —як у адносінах падполыпчыка Савіча, так і яго дачкі, якая хавала і карміла яго, Гукана. Новікаў высока ацаніў раман, упэўнены, што Шыковіч гэта ён, хоць герой мой іншага складу, іншы па характары. Крытыкі, нават такія, як В. Каваленка, вельмі ўдумлівы даследчык, слаба зналі гісторыю Мінскага падполля, бо ні адзін з іх у разборы рамана не «выйшаў» на лёс Івана Кавалёва. Ці азіраліся на афіцыйную версію? А сам я? «Пракруціў» добры дзесятак сюжэтаў з лёсамі Кавалёва, Амельянюка, Кедышкі, Кабушкіна, Казінца. Але ні адзін з гэтых сюжэтаў не рэалізаваў. Выка-

рыстоўваў асколкі, як у «Шлюбнай ночы», напісаўшы Сцяпана, Валю, Машу. На канкрэтны адрас — Мінск — я выйшаў у аповесці «Гандлярка і паэт». Але там у цэнтры апынулася простая жанчына, камароўская гандлярка Вольга Ляновіч. Як узнік гэты вобраз? Дакладна не помню. На канферэнцыях на пытанне гэтае адказваю, што, жывучы на прыватнай кватэры на Лагойскім тракце, я пазнаёміўся з пляменніцай гаспадыні, якая была падпольшчыцай. Доля праўды ёсць. Была такая жанчына, але бачыў яе я разы два і блізка не пазнаёміўся. Сапраўды гаспадыня ў застоллі захаплялася пляменніцай: «Пра нашу Альку можна кнігу пісаць. Яна паказала сябе ў вайну — няхай раскажа». Але жанчына была негаваркой, сказала хіба, што выконвала некаторыя заданы партызан.

Увагу маю прыцягнула другая жанчына, сапраўды камароўская гандлярка — прыгажуня, весялуха, рагатуння. Як яна гандлявала! Цуд! Каля яе таўкліся маладыя мужчыны. І не толькі маладыя. Між іншым, звярнуў маю ўвагу на яе вялікі народнік Піліп Пестрак. Любіў з ёй пагаварыць. І яе дасціпнасць надзвычай весяліла «старога» (а старому— тады было гадоў 45-48). Піліп Сямёнавіч так рагатаў, размаўляючы з гандляркай, што прыцягваў увагу паўрынку прадаўцоў і пакупнікоў. Пасля, гады тры, усю зеляніну я купляў толькі ў гэтай жанчыны, імя яе сапраўды было Вольга. А мяне яна лічыла чамусьці журналістам і называла ласкава, іранічна «журналісцік». «Каму ты так многа бярэш памідор?» — «Дзецям».— «У цябе столькі дзяцей? Ой, памру»,— і залівалася смехам. А потым у педінстытуце я сустрэў пляменніцу гаспадыні; яна вучылася на вячэрнім аддзяленні. Пагаварыць мне з ёй зноў не ўдалося, і гаспадыню не папрасіў запрасіць пляменніцу яшчэ раз. Языкатая мяшчанка магла ляпнуць Машы: «А вашаму спадабалася наша Алька! Глядзіце, адаб'ём». Была б мне галавамыйка, без віны вінаватаму. Але сустрэча ў педінстытуце адразу ж «сплавіла» вобраз падпольшчыцы і гандляркі ў адзін вобраз. Каб раскрыць яго, вобраз, трэба напружаны сюжэт. Такі сюжэт для гандляркі не знаходзіўся гадоў 25. Ён з'явіўся ў адзін міг. У Саюз пісьменнікаў прыйшла жанчына, принесла сшытак вершаў на рускай мове. Без аўтарства. Гісторыя: у пачатку вайны цётка гэтай жанчыны выкупіла ў Масюкоўшчыне палоннага, хворага хлапчыну. І хлопец пісаў вершы. Хлопец памёр ад туберкулёзу. Ці ўяўляюць яго вершы каштоўнасць? — цікавіла жанчыну. Вершы вучнёўскія, але патрыятычныя. Дакумент часу! Я прасіў «ЛіМ» надрукаваць іх.

Але во ён, сюжэт: Вольга выкуплівае палоннага, і ён паэт! Для немцаў ён яе муж. А для суседзяў? Незвычайная сітуацыя ў звычайных для вайны абставінах.

2 ліпеня

Уплыў паэта, каханне яго робіць з Вольгі свядомую падпольшчыцу. Але каб яна ўступіла ў барацьбу, павінна адбыцца сустрэча з арганізатарам падполля. І я напісаў Яўсея — Андрэя — Камандзіра. Пішучы яго, кіраўніка падполля ў першую ваенную зіму, я не мог не думаць пра Кавалёва. З расказаў на той даўняй нарадзе найбольш запомніўся Іван Кірылавіч. Не помню, хто што сказаў, але адклаўся ў галаве менавіта такі вобраз, як Яўсей мой: вясёлы, дасціпны, рызыкоўны.

«Гандлярка і паэт» чыталася гэтак жа, як «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні» — самыя чытабельныя мае раманы. Беларуская крытыка адмерала ёй нямнога сваёй увагі. 1 дагэтуль не магу сцяміць, хто іграў ролю «прыказчыка», дыспетчара, дырыжора крытычнага аркестра. Але быў нехта. У дачыненні да мяне гэтае «адмерванне» мела месца. Разносаў не было, пры такой чытацкай цікавасці разнесці было рызыкоўна: хто табе пасля паверыць? Тактыка была прынята езуіцкая: замоўчваць. «Гандлярка...» і «Атланты...» атрымалі менш рэцэнзій, чым «У добры час» — раман зусім маладога празаіка. Але тады не было «дырыжора». І была павышаная ўвага чытачоў, крытыкаў, прэсы да кожнай новай з'явы беларускай літаратуры, якая, па сутнасці, голькі станавілася на ногі. Да сённяшняй сталай літаратуры няма і дзесятай долі той увагі, што была ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

Масква сустрэла «Гандлярку і паэта» больш чым прыхільна. У часопісе «Молодая гвардия» ёй далі «зялёную вуліцу» — надрукавалі з аператыўнасцю, якая здзівіла мяне. Аповесці «Гандлярка і паэт» і «Шлюбная ноч» пайшлі ў «Роман-газете». Між іншым, у гэты час адзначалася 50-годдзе «Роман-газеты», далі спіс аўтараў, і я атрымаў саюзнае першынство па колькасці публікацый у «Роман-газете»: больш за Сіманава, Ганчара; пазней мяне перагнаў А. Чакоўскі. Вось так ставіліся да маёй творчасці дома і ў Маскве! «Нет пророка в своем отечестве». Не, менавіта таму, што ствараліся «прарокі», адціскаліся ўсе іншыя, хто вытыркаўся. Андрэй гэта смешна паказваў на пальцах: які вытыркнуўся, таго забівалі назад, як цвік. Я пісаў, як пасля публікацыі ў «МГ» да мяне на паклон прыехаў такі кінатуз, як Самсон Самсонаў.

«Молодая гвардия» вылучыла аповесць на Дзяржаўную прэмію СССР. Саюз пісьменнікаў БССР не мог не падтрымаць — Максіму Танку парэкамендавалі зрабіць гэта ў «высокім доме...».

У «Правде», «Известиях», «Сельской жизни», яшчэ ў нейкіх газетах з'явіліся рэцэнзіі маскоўскіх, ленінградскіх крытыкаў з высокай ацэнкай. Добразычлівыя і наіўныя сябры мае віншавалі з прэміяй. Прамаргаў «дырыжор». Спешна пачаў папраўляць. У Маскве ў Саюзе пісьменнікаў СССР у савеце па беларускай літаратуры было арганізавана абмеркаванне нашай прозы. Я займаў пасаду першага сакратара, і ўсе камандзіроўкі ішлі праз мяне. Але дэлегацыю на савет вызначыла бюро секцыі прозы: салідныя людзі — празаік, два крытыкі. З усімі імі ў мяне былі найлепшыя адносіны. Па «Гандлярцы...» адзін з іх глыбакадумна і прынцыпова зрабіў адну заўвагу: у Мінску магазіны, склады ніхто не рабаваў, выходзіць, здалі іх немцам цэленькімі. Ён адыходзіў з Мінска, але сітуацыі не знаў. Пасля яго заўвагі я праверыў у старажылаў: яшчэ як чысцілі ўсе акраінныя магазіны і да ўступлення немцаў, і ў першыя дні акупацыі.

4 ліпеня

Увогуле я не прыдаў спачатку значэння ні савету, ні складу дэлегацыі. Нават узрадаваўся, што паехалі менавіта гэтыя людзі — сябры.

Першая мне пазваніла Валянціна Шчадрына, кансультант па беларускай літаратуры СП СССР: «Сябры» мае разнеслі «Гандлярку...», здзівіўшы масквічоў. Двое з іх — партызаны. Аўтарытэты! Іх тэзіс галоўны: як можна ў цэнтр твора ставіць гандлярку! Былі ж героі, падпольшчыкі, іх аўтар не ўбачыў. Крытыкі хітра не ўбачылі ні Яўсея — Андрэя — Камандзіра, ні бязногага Захара Пятровіча — Віціка. Нявыгадна ім было гаварыць пра гэтыя вобразы. Агонь па Вользе! Хіба гэта вобраз сацрэалізму? І гэта гарадзілі адукаваныя людзі, да таго ж тыя, што заўсёды лічылі сябе левымі, прагрэсіўнымі. Не ўпэўнены, што яны думалі так. Магчыма, выконвалі задание «дырыжора». Хацелася б мне ведаць, хто ён. А перакананасць мая цвёрдая, што ўсё было арганізавана. Не помню, праз які час сустрэў я работніка Саўміна, якога ведаў, але нават прозвішча не помніў,— з будаўнічага аддзела, Мацюш ці Мацюшэнка. І ён мне кажа: «Хацеў званіць вам, Іван Пятровіч, але пасаромеўся. Ехаў я ў адным купэ з вашымі калегамі, прозвішчы яны не назвалі. Дык яны ўвесь вечар рэпеціравалі, як крытыкаваць вашу кнігу ў Маскве, на савеце нейкім... Я масля прачытаў гэтую «Гандлярку...», мне спадабалася. Чаму яны так абурыліся супраць Вольі вашай — мне, будаўніку, гэтага не зразумець».

Як жа тут не паверыць у «дырыжора»! «Лит. газета» пра такія саветы рэдка давала інфармалку ў два дзесяткі радкоў. Пра гэтае пасяджэнне беларускага савета дала разгорнутую справаздачу. Усё было задзелана, адрэжысіравана. І гэтага хапіла, каб з падачы

Вадзіма Кажэўнікава, старшыні секцыі літаратуры,— ён зачытаў вытрымкі з літгазетаўскай справаздачы,— аповесці былі зняты з абмеркавання. І ніхто не выступіў у абарону — нават мой сябра Ганчар (я некалі ў гэтым камітэце да крыві змагаўся за яго «Тронку»).

А «старая Магдаліна» — Г. М. Маркаў, старшыня камітэта, «апраўдваўся» пасля перада мной: «Падвёў цябе твой савет». Мой! Во фарысеі і чарнакніжнікі!

Няхай будучы чытач ведае літаратурныя норавы таго, цяпер ужо вельм! далёкага, часу. Але ўсё тое лічу драбязой у параўнанні з тым, што робіцца зараз. Цяпер не проста могуць «запаліць». Цяпер могуць знішчыць і маральна, і фізічна. Такая банда рвецца да ўлады — не толькі ў высокай палітыцы, але і ў літаратуры. Пачуў па радыё, што створаны «незалежны» (ад каго незалежны?) Саюз пісьменнікаў, ва ўчарашнім нумары «ЛГ» дэкларацыя. Захопяць Літфонд і абрабуюць да ніткі нас, нацыяналаў, пусцяць па свеце.

14 ліпеня

Дзіўна, чым бліжэй ва ўспамінах я падыходжу да апошняга дзесяцігоддзя — да старасці, тым менш успамінаю падзей, факіаў і... людзей, якія маглі б зацікавіць і мяне, і будучага чытача, калі запісы гэтыя, спадзяюся, убачаць свет, рана ці позна. Эпізоды маленства — як я пасвіў каровы ці падглядаў за голымі студэнткамі — здаюцца больш значнымі, чым з'езды і пленумы, сусірэчы з вядомымі пісьменнікамі, палітыкамі, літаратурныя (прэчкі. Увогуле літаратура як бы адыходзіць у небыццё. Нават уласная творчасць. Што ўрэшце значыць для мяне, для гісторыі літаратуры эпізод, як трое пасрэдных літаратараў змаўляюцца «заваліць» маеаповесці? Цікавіць мяне (ды і будучых гісторыкаў, бадай, можа зацікавіць), хто дырыжыраваў імі. У вогуле хто — я інаю: якія сілы. Але цікава ведаць імёны гэтых людзей і «механізм змовы». Вось гэтага я, сюжэтчык, не магу змадуліраваць, бо мы з Андрэем ніколі не змаўляліся супраць каго-небудзь, накат супраць тых, хто, добра ведалі не адны мы, робіць нам гадасці. Маглі паскланяць такіх, Андрэй — памацюкаць, але ніякіх дзеянняў супраць іх не планавалі. «Будзем ігнараваць, іван»,— казаў Андрэй. Гэта пры тым, што мяне ён папракаў у лібералізме, у «мяккацеласці медузавай». І любіў паўтараць словы Піліпа Сямёнавіча Пестрака, якія той сказаў, калі я стараўся памірыць яго і Вялюгіна, п'яных (яны ў Церусе счапіліся біцца): «А ты атлусцелы правадыр беларускіх апартуністбш».

Не скажу, што мяне не кранае хамства людзей. Але я ніколі не адказваў на хамства хамствам.

Не хвалю сябе, не ўзвышаю. Добра разумею, што якасць гэта далека не лепшая, асабліва ў наш век, калі ідзе жорсткая барацьба. Толькі ўзрост можа апраўдаць маю адносную пасіўнасць у гэтай барацьбе. Служыць ідэі, як Маркс, як Ленін? У сучасных няма ідэі — толькі падідэі. Даволі прасачыць эвалюцыю Гарбачова ўсяго за шэсць гадоў. Ды і не эвалюцыя гэта, эвалюцыя мае законы. Сумбур. Эклектыка. Служэнне розным багам і розным ідалам. «Без гордости, без чести». Пакланіўся Ельцыну на яго каранацыі. Едзе кланяцца «сямёрцы».

Зноў палітыка! Цьфу — брыдота! Як мы, аднак, палітызаваны! Як толькі за дзённік — «высокая» палітыка. А дзе ж жыццё народа, таварыш творца? Урэшце, жыццё ўласнай сям'і? Тваё ўласнае жыццё — духу твайго? Менавіта праз гэта будучы чытач, бадай, мог бы лепш уявіць і атмасферу часу.

Вяртайся, Іван, да літаратуры! Пачаць бы раман! Пра наш дзень. Ёсць ідэя такога рамана. Ёсць сюжэт. Але трагічны, змрочны, з самымі цяжкімі прароцтвамі. Баюся. Баюся такой тэмы, такой ідэі. Я ж — светлы пісьменнік. Нават пішучы вайну, я не мог напісаць «Карателей». На даследаванне паталогіі чалавека трэба мець іншы склад псіхікі. У Адамовіча яна ёсць. Нават Быкаў — да «карацелей» не ўзнімаўся. Хіба напіша іншых карнікаў — берыеўскіх.

16 ліпеня

Узяў адпачынак у БелСЭ і нікуды не еду, першы раз за многія гады, хоць усе тыя «многія гады» — гадоў 13 — я ездзіў у адно месца — у «Сосны» на Нарачы. Вабілі камфортнасць, высокі ўзровень абслугоўвання, павага персанала (усе ведаюць мяне, усіх ведаю я) і блізасць — ад ганка дачы да ганка санаторыя на машыне за дзве гадзіны. Але і туды больш не захацелася — абрыдла. Маша не згадзілася: лета, гарод, трэба рабіць нарыхтоўкі, бо невядома, якая зіма нас чакае, безумоўна, не сытая, хоць хачу верыць, што і не галодная. Прымушаю сябе верыць...

Між іншым, барацьба з прывілеямі рэзка знізіла ўзровень нават такога санаторыя, як «Сосны». Прывілеі трэба было скарачаць. Але ці так? Абмежавалі адных паноў, плодзім другіх. Куды былому прэзідэнту Палякову ці яго намесніку Мікулічу...

Малашэвіч вярнуўся з «Сосен» і сказаў коратка і выразна: «Засралі». Уявіў — і стала горка і крыўдна. Усё прасралі і засралі. Народ злосны, прагне разбурыць усё, што вышэй за ўзровень яго жыцця. Некалі, у 1917 годзе, Горкі абураўся, што ў Зімнім заіадзілі вазы.

Пусці туды натоўп сёння — і ён зробіць тое самае. Парадаксальна, што інтэлігенты сёння асабліва злосныя.

Кажу Машы: «Мой сёлетні отпуск — рэпетыцыя жыцця пенсіянера». Трэба выпрацоўваць новы рэжым. Цікава, што людзі фізічнай працы, у большасці сваёй чакаюць пенсіі ці ва ўсялякім разе не баяцца «вольнага жыцця». Стамляюцца? Ці знаюць, чым заняць сябе? Я знаю, чым заняцца: пішы, Іван! Але... не пішацца. Раман не пішацца, п'еса не пішацца. У БелСЭ я не перапрацоўваўся, з'яўляўся ў свой кабінет толькі ў другой палове дня. Але што гэта — самалюбства? Там я адчуваю сябе «человеком при деле». Успамінаю свайго сябра Віктара Вольскага. Ён, бадай, штомесяц лятае ў Лацінскую Амерыку, у другія краіны.

«Не абрыдла табе? — пытаюся.— Гэта ж дзіка стамляе».

«Стамляе. Але не абрыдла. Толькі там я адчуваю сябе Чалавекам».

Вось так: дырэктар інстытута АН, член-карэспандэнт толькі там адчувае сябе чалавекам. А я раней у СП, а цяпер у БелСЭ адчуваю сябе чалавекам. А так здаецца, што на мяне забудуць. Гэта трагедыя, калі сапраўды-такі могуць забыць пісьменніка, які напісаў паўтара дзесятка тамоў кніг, якія, дарэчы, нядрэнна чыталі. Што зробіш... няшчасныя беларусы забываюць нават Коласа. Забылі Куляшова, Броўку. Забываюць Мележа, Макаёнка. А між іншым, абодва былі вельмі высокай думкі пра сваю творчасць. Ну, Мележ з яго самалюбствам — не дзіва. Але Андрэй, рэаліст, скептык і гумарыст, сур'ёзна казаў: «На сто гадоў не разлічваю. Але гадоў пяцьдзесят п'есы мае будуць ставіць». Сумна, Андрэй, паведамляць табе тудыг. і праз 9 гадоў — ніводнага спектакля. І пакуль што я не бачу ніводнага рэжысёра, які б зацікавіўся спадчынай лепшага камедыёграфа.

І што — вось так з дня ў дзень запісваць, што прыйдзе ў галаву, што сцякае з пяра? Не, трэба ўмець і ўспаміны арганізаваць у пэўны сюжэт. Хаця б па ўзоры таго, як я напісаў пра Машэрава. А можа, і прадоўжыць пісаць пра людзей? Баюся самога сябе — суб'ектыўных ацэнак некаторых «дырыжораў». А ўрэшце, у суб'ектыўным — увесь цымус.

20 ліпеня

Сапраўды, па меры набліжэння да часу цяперашняга ўсё менш і менш успамінаецца эпізодаў творчага жыцця, ды і ўвогуле жыцця — сямейнага, грамадскага, якія хацелася б занатаваць, якія варты былі б увагі не толькі маёй, але, спадзяюся, і маіх чытачоў, хоць і стараюся пісаць, не адчуваючы гэтага своеасаблівага цэнзара за сваёй спіной і не бачачы яго перад сабой. Раней бачыў будучага чытача — таго, які

ў той час, калі я гнуў спіну і сляпіў вочы над рукапісам, гугукаў у калысцы і мачыўся пад сябе. Цяпер разгледзець гэтага чытача немагчыма, бо не толькі сам Гарбачоў — сам бог не можа прадказаць, якія мы будзем праз 15-20 гадоў.

Безумоўна, творы, напісаныя ў апошнія 10-15 гадоў, маюць сваю «біяграфію» — гісторыю нараджэння і жыцця. І гісторыі гэтыя цікавыя і нярэдка павучальныя. Але я паўтараюся, калі пішу пра тое, як узнікла задума таго ці іншага рамана, аповесці. Так, гэта «отправная точка». Але не менш важны і працэс самога напісання. Гэта ў мяне чамусьці выпадае. Хтось з калег маіх пажартаваў: «Гэта так проста — пісаць. Кладзі перад сабой паперу, бяры запраўленую аўтаручку і... страчы. Напішацца само». Не, само не пішацца. Два дзесяткі гадоў «насіў» Вольгу. Сшытак вершаў няшчаснага ваеннапалоннага даў сюжэт амаль імгненна. Але колькі пасля прыйшлося перачытаць дакументалістыкі па падполлі. Між іншым, мая асаблівасць, амаль закон: калі пішу, мастацкія творы на гэтую тэму не чытаю. А дакументальныя рэчы, гістарычныя даследаванні — гэта сыравіна, па сутнасці, нічыйная: бяры! З гісторыі сюжэты бралі ўсе. У сусветнай літаратуры нямнога імёнаў сур'ёзных пісьменнікаў, якія б не чэрпалі з мора гістарычных фактаў. Мора гэта невычэрпнае. Але што рабіў з гэтымі фактамі, напрыклад, той жа Шэкспір! Недарэмна Леў Талстой, які надзвычай беражліва адносіўся да гісторыі, не прызнаваў драматурга, якога прызнаў увесь свет. У рускай літаратуры першы прыклад павагі да гістарычных падзей даў Пушкін — у «Барысе Гадунове». Як разумею яго радасць: «Ай да Пушкін! Ай да сукін сын!» Хацелася мне калі-небудзь так выгукнуць? Асобныя старонкі «Трывожнага шчасця», «Атлантаў...», «Гандляркі...» я перачытваю з цікавасцю і сёння, хоць увогуле чытаць сваё не люблю, карэктуры не люблю, узваліў іх на Машу.

Нядаўна, калі кніга выйшла ў серыі «ШБ», пагартаў «Петраград...» і парадаваўся: публіцыстычна, але цікава. Сур'ёзна, «весомо» і... што дзіўна, тады, 12 гадоў назад, я адказваў сённяшнім антыленінцам. Ва ўсялякім разе перапісаць гэтыя старонкі мне не хочацца. Справа іншая, што моцна шкадую, што тады я не дабраўся (немагчыма было дабрацца!) да тых матэрыялаў, якія сёння адкрыта публікуюцца. О, каб я меў іх! Стоп! І што? Спыніўся, думаю. Безумоўна, што, захаваўшы гістарычную праўду, павагу да подзвігу Леніна ў барацьбе за Брэсцкі мір, раман я напісаў бы зусім іншы — глыбей і цікавей. Але думаю і пра такое: а ці ўзяўся б я за гэтую тэму, каб яна была адкрыта, ляжала на паверхні? Баюся, што не. А каб пры той жа закрытасці я дабраўся да ўсіх крыніц — хапіла б смеласці ў той час

абнародаваць тое, што было за «семью печатями». Баюся зноў жа, што не. Не хапала ў мяне мудрасці «пісаць у стол». Я спяшаўся ўсё апублікаваць, што выходзіла з-пад пяра. І яшчэ адно... Не без уплыву Андрэя, и ў мыслях сваіх, у размовах за чаркай займаў апазіцыйную лінію да афіцыйнай ідэалогіі, асабліва брэжнеўскага часу,— ідэалогіі Суслава — Зімяніна. Але ў сваёй дзейнасці партыйнаіа прапагандыста — не буду крывіць душой — я ўсё ж быў зашораным артадоксам, гэткім жа, як і Машэраў (пра што я пісаў) — чалавек, якога прырода надзяліла творчым розумам. У гэтым ірагедыя не аднаго яго — мільёнаў. І мая. Я лічыў, што сваёй пюрчасцю памагаю партыі ў выхаванні новага чалавека. На жаль, мы яго ўяўлялі такім жа зашораным, гэтага чалавека. Праўда, я ніколі не згаджаўся, што нам, адукаваным людзям, не трэба ведаць усе перыпетыі барацьбы Леніна, бальшавікоў, сутнасць чалавечую, ідэалагічную праціўнікаў Леніна. Мы ж жылі пасля XX з'езда! Ранейшая, сталінская, закрытасць не проста незразумелай была, але абражала недаверам да нас, савецкай інтэлігенцыі. Гэтым можна вытлумачыць маю цікавасць да вобраза Троцкага — у рамане.

Я пісаў ужо, якія цяжкасці пераадольваў, каб сабраць крупінкі таго, што сёння сыплецца, як з прарванага мяшка.

У артикулах для масавага чытача, у інтэрв'ю розных я трохі спрашчаў дэталі пошукаў матэрыялаў. Бадай, «спрашчаў» — не гоє слова, часам, можа, і ўскладняў: «будаваў сюжэт», гэта ўжо «хвароба» — усё «засюжэціць». Па сутнасці — усё праўда, юлькі ў жыцці ўсё цягнулася месяцамі, гадамі і было не такім маслядоўным, як у расказе для чытачоў, пісьмовым ці вусным.

21 ліпеня

Абсалютна дакладна я расказваў, як узнікла задума рамана. Сапраўды, з тэлеграмы Леніна камісару станцыі Орша Данілу Івашчанку. Пасылка хлеба ў Германію нашым ваеннапалонным, якія галадалі там,— гуманны акт. Гэта ўсхвалявала. Але каб напісаць нават тое, што я напісаў на аснове тэлеграмы,— кінааповесць «Эшалон прайшоў» (фільм «Хлеб пахне порахам»), я мусіў заглянуць у гісторыю заключэння Брэсцкага міру — у сам дагавор, у пратаколы да яго, у тым ліку ў пагадненне пра абмен нленнапалоннымі, каб ведаць статус нашых палонных. Заглянуў і лыбей, чым вучыў гэта ў партшколе. Дзіўна, што Брэсцкаму міру надавалі мала ўвагі. Ва ўсялякім разе я, адукаваны чалавек, нісьменнік, не прачытаў нават усе ленінскія працы аб міры. А пач«»у чытаць іх, і захапіўся, і ўразіўся: які крык душы! Якая палымянасць! З такім запалам Ленін, бадай, не вёў

ніводнай палемікі. І гэта акт найвышэйшага гуманізму! Перамога Леніна ратавала сотні тысяч жыццяў рускіх, ды і нямецкіх салдат. А можа, і мільёны выйшлі з вайны жывымі. Цяпер чалавеку сярэдняй адукацыі няцяжка ўязіць, чым магла б закончыцца бухарынская авантура «рэвалюцыйнай вайны». Цяжэй прадказаць вынікі не менеў авантурнай пазіцыі Троцкага «ні вайны, ні міру». Увогуле дзіву даешся, як, здавалася б, разумныя людзі, не дурні ва ўсялякім разе, маглі штурхаць краіну, рэвалюцыю на падобныя авантуры. Вось чаму захапіў мяне ленінскі рэалізм, цвярозасць у ацэнцы сітуацыі і чалавечнасць у адносінах тых, каго хацелі кінуць, як у топку, у полымя «рэвалюцыйнай вайны»,— знясіленых, галодных, дрэнна ўзброеных салдат.

Між іншым, здавалася, што Сталіну выгадна было распісаць гісторыю барацьбы за Брэсцкі мір: ён быў паслядоўным саюзнікам Леніна ў гэтай барацьбе. Аднак мяне проста ашаламіла беднасць гістарыяграфіі па гэтай тэме. Бадай, самай сур'ёзнай работай была невялічкая кніжачка Чубар'яна «Брестский мир». Цяпер разумею, чаму была нявыгаднай праўда пра Брэст ці нават падрабязнае апісанне фактаў, пазіцый кожнага з удзельнікаў. Натуральна, што гісторыкі, асабліва тыя, што сядзелі ў ІМЛ, былі блізка да крыніц... і маглі напісаць — багацейшая ж тэма! Не пісалі. Чаму? І мастацкіх твораў аб Брэсце не было. Дарэчы, гэта стала стымулам да цяжкай працы — па меры таго як я акунаўся ў матэрыял. Чытаў не толькі ленінскі тэкст, але і падтэкст, ён выяўляўся ў каментарыях да ленінскіх артыкулаў, менавіта ў іх сумленныя гісторыкі выказвалі тое, чаго, відаць, не маглі сказаць у даследаваннях, ведалі — не пусцяць «цэнзары». У «Біяграфіі Леніна» нічога гэтага няма — агульныя разважанні пра брэсцкі перыяд.

«Акунаўся»... якое недакладнае слова можа вырвацца! Я расказваў абсалютную праўду: дабрацца да падшыўкі «Правды» за 1918 год — ох, якая была праблема! Спецхран! Ахоўнікі гэтых «звышсакрэтных» дакументаў папярэджвалі народнага пісьменніка: «Без права рабіць выпіскі!» Вось тут і твары! Выпісваў, безумоўна, што трэба; у ахоўнікаў хапала такту раоіць выгляд, што яны не бачаць гэтага, не правяралі мае блакноты.

Усе намаганні раздабыць мемуары Троцкага вынікаў не давалі, а яны — во як патрэбны былі, бо ведаў я пра гэтага дзеяча вельмі мала. Паспрабаваў бы я ім зацікавіцца ў партшколе — наўрад ці пісаў бы цяпер гэтыя радкі. Але ж канец 70-х не 40-я: замкі віселі, але за жаданне заглянуць у «спецхраны» ніхто не асуджаў, хоць і ніхто не памагаў. Звяртаўся я па такую дапамогу да Кузьміна. Абяцаў, але пальцам не паварушыў — рабіў выгляд, што забываўся, і... зноў

абяцаў. А пасля, калі чытаў рукапіс, здзіўляўся: «Адкуль ты набраў гэтага?» Набраў! Ішоў на самыя нечаканыя хады. Сядзеў неяк у прэзідыуме побач са старшынёй КДБ Нікулкіным і — бац яму:

«Якаў Пракоф'евіч, дастаньце мне мемуары Льва Троцкага».

Ажно адхіснуўся ад мяне кіраўнік бяспекі:

«Навошта вам Троцкі?»

Растлумачыў. Дзіўна, але зразумеў ахоўнік тайнаў, цяперашніх і даўніх, зацікавіўся маёй задумай.

«Але дзе я магу дастаць? Няма ў мяне такіх бібліятэк»,

«Я вам падкажу: у Брэсце! Мытня і пагранічнікі канфіскуюць іам нямала літаратуры. Упэўнены, што мемуары Льва Давыдавіча могуць быць сярод гэтага «імпарту». Каб яго ды не везлі!»

(Між іншым, нас, пісьменнікаў, і тады ўжо абурала, што ў Брэсце паляць канфіскаваныя Біблії. Во ідыятызм быў! З Біблії, паміж іншым, і нарадзілася ідэя: Ягораў У. Д. прывёз мне з Брэста Біблію на рускай мове.)

Нікулкін згадзіўся:

«А што! Гэта ідэя. Пашукаем».

Я забыўся на размову — і раптам званок дадому.

Сам Нікулкін!

«Іван Пятровіч! Знайшлі вам мемуары Троцкага, але толькі... на нямецкай мове».

Я кракнуў ад роспачы, але тут жа спахапіўся: другой такой магчымасці можа і не быць!

«Давайце на нямецкай».

«Вы чытаеце на нямецкай?»

«Прачытаем. Дачка чытае»,— зманіў я, сцяміўшы, што для чытання старонняму кагэбіст можа і не даць. І ён такі пагіярэдзіў: не разглашаць, не расказваць прачытанае! Кнігу прывёз падпалкоўнік з накладной, у якой я распісаўся. Во тайна!

Я тут жа пазваніў Вользе Няхай, дацэнту інстытута замежных моў.

«Вольга! Дай ты мне «немца», як! мог бы перакладаць з ліста».

«Многа трэба перакладаць?»

«Кнігу ў 500 старонак».

«Ты што, жартуеш? Што за кніга?»

«Па тэлефоне магу сказаць адно: вельмі патрэбная для мяне. Для працы».

Вольга звязала мяне з маладым дацэнтам Анатолем Мірскім. Ён прыходзіў вечарамі, і мы, зачыніўшыся ў кабінеце, чыталі з ім «Мою жизнь» Льва Троцкага. Начытаўшыся, вячэралі — пілі каньяк і абмяр-

коўвалі прачытанае. О, каб уведаў Нікулкін, што Мірскі расказвае прачытанае сваім калегам!

Гістарычныя, дакументальна дакладныя раздзелы займаюць, бадай, не больш трэці рамана, іншыя персанажы, сюжэтныя калізіі — вымышленыя. Але і ў іх павінна быць дакладнасць, бадай тая ж — дакументальная. Падзеі, гістарычны фон, быт, умовы жыцця, адзенне, адносіны салдат і афіцэраў пасля рэвалюцыі. Гісторыкі, сухары, гэтага не даюць. Могуць даць толькі пісьменнікі, удзельнікі сусветнай вайны, сведкі рэвалюцыі. Мемуараў аб тым часе нямнога. Мемуары пісалі белагвардзейцы, эмігранты, але да іх дабрацца было цяжэй, чым да Троцкага. Камісары-камуністы мемуараў... хацеў сказаць... не пісалі. Але спыніўся. Публікацыі часоў перабудовы сведчаць, што пісалі і нашы, але іх не друкавалі. Чыя была такая «мудрасць». Сталіна? Якую мэту ставіў дыктатар? Чаго баяўся? Яго многія з мемуарыстаў, безумоўна, славілі б. Але гісторыя абрастала б «мясам», а так заставаўся голы «шкілет». Баяўся я такога шкілета, з усіх сіл стараўся напісаць раман з «мясам». Ніколі да таго не задумваўся, што гэта такая цяжкая задача — «тыповыя характеры ў тыловых абставінах». Да таго самай далёкай гісторыяй для мяне была Айчынная вайна. Але я быў удзельнікам яе. Пазней, калі пісаў «Зеніт», неднойчы параўноўваў працу гэту з «Петраградам...» і здзіўляўся, як і праз сорак з гакам гадоў лёгка ўсплываюць дэталі «зенітнай эпапеі» — і прырода Мурманска, Кандалакшы, Петразаводска, і характары дзяўчат, і ўласныя перажыванні. Нічога не трэба было шукаць спецыяльна, вычытваць у некага іншага. Тут усё мае. У «Петраградзе...» многа прыйшлося шукаць — вывучаць. Перачытаў «Тихий Дон», «Хождение по мукам». Чытаў доўгія і нудныя раманы Сяргеева-Цэнскага. Але менавіта яны далі багацейшы матэрыял па часці франтавога быту першай сусветнай; стары выпісваў усё з педантычнай скрупулёзнасцю. У нас гэта рабілі так «бытавікі» Чорны, Кулакоўскі. Я такому бытапісанню не прыдаваў значэння, я раскрываў характары праз дынаміку сюжэта. Крытыка папракала мяне за няўвагу да бытавой дэталі. Што датычыць ранніх рэчаў, то яна мела рацыю, але ўжо ў «Сэрцы на дапоні», у «Снежных зімах», у «Атлантах...» (асабліва!) — колькі там быту! Але ён не быў ніколі для мяне самамэтай, як у таго ж Сяргеева-Цэнскага, Чорнага, ён не вылазіў на першы план, не засланяў галоўнае. У гэтым плане, як і ва ўсім іншым, геніяльны Чэхаў: ён увесь «бытавік», але ніводная бытавая дэталь не вылазіць, не тырчыць, не мазоліць вочы, яны, дэталі гэтыя, як бы растворяюцца ў густым мастацкім варыве. Усё — адно цэлае. І нічога лішняга. І ніякіх «правалаў» ці недахопу солі, перцу, кіслаты, салодкасці. Як вельмі

ўмела згатаваны ўкраінскі боршч: ясі і не думаеш, з чаго ён — колькі ў ім чаго, колькі буракоў, колькі мяса...

Карацей кажучы, на «Петраграда...» я патраціў часу, энергіі (ажно аслеп!) больш, чым на любыя тры іншыя раманы. Крытыкі і гісторыкі не выявілі ніводнай недакладнасці. Але мяне здзівіў адзін удзельнік першай сусветнай — Кандрат Крапіва. Неяк наведаўся да яго неўзабаве пасля надрукавання рамана, а ён кажа:

«Чытаю, Іван Пятровіч, ваш раман. Што ж... у цэлым добра: праўдзіва. Але...» — і пачаў рабіць заўвагі пераважна па амуніцыі, чалавечай і конскай, асабліва што датычыць зімовай вопраткі афіцэраў — бекешаў, башлыкоў. Здзівіў Крапіва яшчэ тым, што ў гэты час быў амаль ужо сляпы, відаць, раман яму чыіала сакратарка. Да ленінскіх раздзелаў, зразумеў я і пашкадаіі.іу, стары не дабраўся.

25 ліпеня

Цяжка ствараўся раман. Але друкаваўся яшчэ цяжэй. У дзённіках 1981 года я пішу свае перажыванні ад перыпетый з «публікаваннем другой і трэцяй часткі, тады я штосьці перабольшваў, драматызаваў; цяпер за некаторыя запісы таго часу няёмка. Але і цяпер, калі ў цэлым гісторыя «Петраграда...» мне вядома, крыўда на некаторых людзей не зменшылася. Справа іншая, што добры па натуры, верны хрысціянскаму запавету, я дараваў сваім ворагам. Таму ж сябру майму Кастусю Кірэенку. Ен проста здзекаваўся з мяне з садысцкім задавальненнем. Па першай частцы, якая ішла да майго 60-годдзя, у яго не было ніякіх заўваг, хоць карэктуру пасылаў у Гістпарт, каб застрахаваць сябе. Псторыкі зрабілі дробиыя заўвагі і без узгадненняў з »ышэйшымі інстанцыямі далі «дабро», думаю, сам Платонаў гэтай часткі не чытаў...

Іван Пташнікаў пры рэдагаванні шчыра спачуваў мне; добры мастак разумеў, уяўляў, што адчуваў бы ён сам (асабліва ён! нікому ж не даваў паправіць у сябе ніводнага слова!). Самае простае для галоўнага рэдактара было адхіліць раман. і самае правільнае. Няхай аўтар збірае візы, рэцэнзіі, даказвае, што галоўны рэдактар памыляецца. Кірэенка на гэта не пайшоў. Папершае, зусім разрываць адносіны са мной яму не хацелася — не той аўтар. Вядомы, папулярны, фігура — як-ніяк Старшыня Вярхоўнага Савета, без стуку заходзіць да Палякова, да Аксёнава, да Кузьміна. Як усе людзі яго тыпу, пры знешняй прынцыпойасці, калючасці, узрыўнасці Кірэенка быў, па-руску кажучы, «трусоват».

Такі ён быў — мой сябра Кастусь (няхай даруе яму бог).

Не, адхіліць раман ён не мог. Ён убачыў магчымасць павадзіць Героя за нос, унізіць яго і перад ЦК, і перад місьменнікамі, ён нават выказваўся ў гэтым плане: «Шамякін думае, што яму ўсё дазволена. Троцкага героем зрабіў».

Не, адхіліць раман Косця не мог. Ён панёс яго «наверх» — галоўнаму ідэолагу Кузьміну. У мяне з Аляксандрам Трыфамавічам добрыя адносіны. Але яго звышасцярожнасць, лбачлівасць я добра ведаў ужо і тады. Не асуджаю: такі быў час, гакія норавы, яны героя вайны — лётчыка, штурмана, якога, як он казаў, «сшылі з кавалкаў», зрабілі служкам, чыноўнікам.

У запісах 1981 года я толькі здагадваўся, як развіваюцца надзеі, па якім сцэнарыі. Цяпер, праз дзесяць год, ведаю напэўна. Кузьмін спалохаўся Троцкага, як ніхто. Але па іншай прычыне, чым Кірэенка. Косця наіўны, Кузьмін лепш ведаў абстаноўку на самым верее — у ЦК КПСС, ведаў, хто там робіць палітыку, каму такі Троцкі можа не спадабацца. Прысуд быў жорсткі: друкаваць пасля заключэння ІМЛ! Сакратар ЦК КПБ ведаў, як застрахаваць сябе.

Паслалі туды карэктуру. Я, наіўны, спадзяваўся, што ёсць у НМЛ людзі, якія прачытаюць у арыгінале, мне называлі нават прозвішчы беларусаў. Але што яны — дурні? Ніхто чытаць не ўзяўся: падумаеш, нейкі беларускі пісьменнік падкідвае дурную працу! Каб я хоць знайшоў магчымасць аплаціць! Але пры ватным чынам не прапануеш супрацоўніку ІМЛ (там жа святыя!), а «Полымя» — часопіс жабрацкі.

Пасадзіў цяжарную Таццяну перакладаць гістарычныя раздзелы, а гэта старонак 200 з хвосцікам. Пераклала вельмі спешна. Пазваніў дырэктару ІМЛ Ягораву, пасля я добра пазнаёміўся з ім на сесіях Вярхоўнага Савета, мы аказаліся амаль аднадумцамі.

Заключэнне даў кандидат назук. Здзівіла і мяне, яшчэ больш Кузьміна і Кірэенку, што заўвагі былі зроблены не па Троцкім — па фактах барацьбы за мір, па трактоўцы ленінскіх палажэнняў. Выходзіла, што мы па-рознаму разумелі Леніна. Па адным гэтым раман лёгка можна было пахаваць. Але, падобна, што Кузьміна гэта турбавала менш. Якраз тут ён разважаў разумна: «Шамякін думаетак, хтось інакш. Маюць права».

Супрацоўнік ІМЛ не адмаўляў раман, многім раздзелам даў станоўчую ацэнку. «Зарэзаць» мяне ніяк нельга было. А тут яшчэ Кузьмін схітраваў не ў сваю карысць — падключыў да рамана івана Антановіча, разумеючы, наколькі Іван вышэйшы па адукацыі, па інтэлекце. Калі канчаткова вырашаўся лес рамана на нарадзе чацвёркі ці пяцёркі — Кузьмін, Антановіч, Платонаў, Паўлаў, Кірэенка (без аўтара!), Антановіч катэгарычна выказаўся за публікацыю,

даказаўшы, што не надрукаваць раман аб Леніне (не аб Троцкім жа!) — неразумна, гэта не зробіць ім, суддзям, гонару, гісторыш рана-позна вылезе вонкі. І тут хітры Кузьмін перахітрыў разумнага Антановіча: «Вось табе, доктар навук, і даручаем адрэдагаваць яго!»

Але Антановіч быў не менш хітры — ён добра ведаў, чаго баіцца шэф. І рэдагаваў не для літаратуры, не для аўтара і чытачоў — для заспакаення шэфаў.

26 ліпеня

Кірэенка, адчуваючы высокую падтрымку, нават не спусціўся да таго (во сябра!), каб асабіста пагутарыць з аўтарам. Усё даручыў Івану Пташнікаву. Той мог толькі вачамі павесці ў бок кабінета галоўнага, на словы ж вельмі скупіўся. Безумоўна, па загаду Кірэенкі паставіў мне ультыматум: калі хачу, каб раман пайшоў, павінен згадзіцца з усімі заўвагамі, зробленымі алоўкам.

«Чые гэта заўвагі?»

«Не знаю. Спытайце ў яго»,— у Кірэенкі.

«Не пайду я пытаць».

«І правільна!»

«Дайце ж хоць паглядзець заўвагі».

Дае старонак 20, не больш. Дапісак не многа, выкрэсліванняў многа. Яны ашаламілі: выкрэсліваецца тое, што датычыць ацэнак дзейнасці наркома па замежных справах. Ужо па гэтых старонках я адчуў, што вобраз Троцкага рэдагуецца да выгляду «тэлеграфнага слупа» — ніякіх адценняў, нюансаў, аўтарскіх ацэнак, адны факты. Дапіскі залішне навуковыя, не мастацкія. З большасцю іх я не згадзіўся, папраўляў па-свойму, не вяртаўся да першапачатковага тэксту (гэтага Пташнікаў не дазваляў) — пісаў новы варыянт, гэта Іван Мікалаевіч паблажліва дазваляў. Але каб вярнуць выкрасленае — ні ў якім разе. Такім выканаўцам мусіў быць пісьменнік, які ўвогуле даволі скептычна ставіўся да афіцыйнай ідэалогіі, да сацрэалізму, меў сваё мастацкае крэда і часам быў непахісны ў адстойванні сваіх прынцыпаў.

Я ўступіў дыктату «інкогнітнага» рэдактара, хоць адчуваў сябе ўніжаным, абражаным: да мяне ўжо даўно гэтак не ставіўся ніводзін рэдактар не толькі ў нашых беларускіх выданнях, але і ў маскоўскіх — у «Сов. писателе», «Худ. литературе», «Романгазете». Уніжэнне заключалася і ў тым, што ананімны рэдактар цыркаў свае папраўкі невялікімі порцыямі, часам з перапынкам у тыдзень. У гутарках з Андрэем я праклінаў такую сістэму і ня рэдка ў роспачы... напіваўся. Між іншым, абурала мяне і тое, што Андрэй, незразумела чаму, ставіўся да ўсёй гэтай гісторыі даволі раўнадушна, быццам учарашні галоўны рэдак-

тар «Немана», які праклінаў гэты хлеб, лічыў, што так і трэба рэдагаваць. Неяк у яго вырвалася: «Не бярыся за такія тэмы».— «А хто павінен браць — Шатроў?» — «Шатроў можа ўзяцца за любую тэму. Мы не можам, бо над намі Шатровы». Во гэта праўда! Ну, Іван, Іван! Што яго прымусіла гэтак рэдагаваць? Калі я даведаўся, чыя гэта работа, быў ашаломлены. Ох, людзі, людзі — чалавекі! А Кірэенка задзіраў нос і пры сустрэчах «покровительственно» жартаваў — радаваўся, што самога Шамякіна «паставіў на калені». І яшчэ раз паспрабаваў унізіць мяне: ганарар выпісаў па ніжэйшай стаўцы, як пачаткоўцу. Я не вытрымаў — выказаў пратэст, хоць і ветлівы. Ён натапырыўся.

Пры наступнай сустрэчы — не занасліва, а ліслівa (загаварыла сумленне?) Кастусь сказаў: «Ты што — пакрыўдзіўся? У насгупным нумары мы нацягнем, колькі зможам».

«Не трэба!»

Вось так мы тварылі! І так друкаваліся. Нават тыя, каго зараз лічаць «баловнями судьбы» і «любимцами партии». Нават разумнейшыя з партакратаў, такія, як Іван Антановіч, любілі не нас, неспакойных,— любілі свае пасады і свой спакой.

2 жніўня

Яшчэ адна дэталь з гісторыі «Петраграда — Брэста». Майму пастаяннаму перакладчыку Арсенію Астроўскаму было ўжо гадоў 85. Даваць такі вялікі раман дзеду я пабаяўся.

Трэба было шукаць новага перакладчыка. Тады ўжо Таццяна пераклала «Гандлярку...», але яе падводзіла здароўе, і Маша выказалася супраць таго, каб нагружаць яе такой работай — 700 старонак тэксту; Таццяна ў інтэлектуальнай працы зацятая, фізічную не любіць. Мне падказаў перакладчыка Савелій Паўлаў: свайго сябра, адказнага работніка ЦК КПСС, нашага земляка Уладзіміра Сеўрука. Канешне, я схапіўся за гэтую кандыдатуру — найлепшы перакладчык для такога рамана: штось падкажа, паправіць, а галоўнае, паможа прабіваць. Ён ужо кагосьці з нашых перакладаў, не помню каго. Праўда, па-мойму, Вялюгін, які заўсёды ўсё ведаў, сказаў, што перакладае не сам Сеўрук — жонка яго. Але гэта ўжо іх сямейная справа. Усе ведалі, што Міша Гарбачоў, Міхаіл Васільевіч, працуе з парабкамі — беларускімі студэнтамі: філолагі перакладаюць яму па 20 руб. аркуш. Ведалі гэта, і ўсё роўна маладыя празаікі стараліся аддаць на пераклад земляку — прабіўны: пераклад Гарбачова раней ці пазней, але абавязкова ішоў у «Сов. писателе», хоць палавіна «прабіўных» абавязкаў выпадала на маю долю, члена праўлення, Я Гарбачову даваў дробязі — пару апавяданняў, «НьюЙоркскі дзённік», які не пайшоў.

Пазваніў Сеўруку. Ён ахвотна згадзіўся. Я завёз яму рукапіс. Ён, шышка, сам прыйшоў у гасцініцу «Масква», добра куляў каньяк — запілі пагадненне. А калі пачалася «эпапея» з раманам, а яму, безумоўна, дакладвалі, раіліся — і Кузьмін, і Паўлаў, я раптам атрымліваю па пошце рукапіс свайго рамана. І ніводнага слова ад перакладчыка — ні прабачэння, ні апраўдання, ні спасылкі на занятасць. І не пазваніў. Абтрос рукі, як ад бруду. Спалохаўся, дзеяч! «Памог»! Вось такія яны былі, вяршыцелі нашых лёсаў! Нядаўна Сеўрука назначылі рэдактарам «Недели», і «сябры» яго арганізавалі ў рэдакцыі «Известий» бунт: не даруюць яго кіраўніцтва, хоць, па-мойму, нікога з іх ён не чапаў, з'есці мог свайго ці адмахнуцца ад любога з нас, як ад рамана майго адмахнуўся. Можа, пазней пашкадаваў. У Маскве «Петраград...», адрэдагаваны Антановічам, пайшоў без затрымкі — у «Молодой гвардии» — у часопісе і выдавецтве (тыраж 200 тысяч), у «Роман-газете» (тыраж — 2 мільёны экз.). Ніякіх істотных заўваг. Галоўліт зняў адзін абзац, ды і той рэдакцыя ўзгадняла з аўтарам. «Романгазета» выйшла да 27 з'езда КПСС, дэлегатам якога я быў, там прадавалася, я сачыў, як куплялі. І радаваўся: знаёмыя віншавалі мяне.

3 жніўня

Як падводзіць памяць! Учора напісаў, што «Петраград...» выйшаў у «Сов. писателе». Праўда, усумніўся. Пазваніў Сяргею, каб паглядзеў у маіх выданнях.

«У якой яна вокладцы?» — спытаў зяць.

«У белай».

«У карычневай. І выданне «Молодой гвардии»,-;паведаміў ён праз хвіліну. Тады толькі ўстала ў памяці кніга, зусім нядаўняя — 1985 года. А вось першыя свае кнігі, саракагадовай даўнасці, я добра помню. Так, пакуль што раман меў шчаслівае жыццё: два выданні беларускія, два рускія — чатыры з «Романгазетой» і часопісам-, украінскае, чэшскае, балгарскае, эстонскае. Здаецца, перакладаюць кітайцы, казаў адзін госць, стажор. Раман аб Леніне цікавіў. Няўжо так лёгка вытравіць з свядомасці ледзьве не двух мільярдаў людзей вобраз рэвалюцыянера, тэарэтыка сацыялізму, філосафа, эканаміста? Хто вышэй за Леніна ў XX стагоддзі? І балюча, калі даходзіць да здзеку, да глумлення. Учора расійскае тэлебачанне ў «Пятом колесе» (наша!) ва ўрыўках з фільмаў, у інтэрв'ю з кінадзеячамі абуральна здзекавалася з Леніна: звязанага акцёра — пад Леніна, нясуць у псіхбальніцу, там жа ляжаць Сталін, Хрушчоў, Брэжнеў, туды ж ловяць Гароачова... У любой дзяржаве за абразу прэзідэнта... Наш глытае пілюлі. Няхай бы хоць Раіса абурылася! Але бог з імі. Крыўдна за Леніна, нават не за

хуліганскі здзек, ён толькі паказвае ўзровень стваралынікаў пасквіля,— за тое, што генія станяць побач з пігмеямі, з такімі сапраўды невукамі, як Брэжнеў.

Няварты ўвагі твор гэтак не перакладаюць!

Але ў Беларусі адносіны да рамана былі зноў-такі дзіўнымі: яго замоўчвалі, як і іншыя творы мае,— прафесійныя крытыкі замоўчвалі. Першыя адгукнуліся гісторыкі, потым — маладыя навукоўцы, пераважна чамусьці жанчыны, мабыць, у іх больш шчырасці, і яны менш паддаюцца ўплывам, бо не бываюць у п'яных кампаніях. Як пасля яшчэ аднаго факта не паверыць, што існаваў... існуе дырыжор-інкогніта? Хто мяне не прымае — я знаю. Але хто ў гэтым аркестры трымае дырыжорскую палачку — дагэіуль з'яўляецца для мяне тайнай.

Да 70-годдзя Кастрычніка вынеслі на абмеркаванне пашыранага прэзідыума — аб рэвалюцыі і вобразе Леніна ў беларускай літаратуры. Што не знайшлі для даклада саліднага крытыка — не дзіўна, гэта заўсёды праблема: хто возьмецца за такі даклад? Але што запрасілі старонняга, не члена Саюза, літаратуразнаўцу, »ыкладчыка Інстытута культуры Няхая — гэта чыйсьці пралік, прамаргаў дырыжор. Нягледжачы на тое, што дакладчык даў немалы гістарычны экскурс — пачаў з Чарота, з Купалы, з Бядулі, добрыя працэнтаў 50-60, калі не больш, яго доўгага даклада былі прысвечаны разбору «Петраграда— Брэста», і ацэнку раману даваў самую высокую. Нельга было не ўбачыць, як выцягнуліся твары ў многіх маіх сяброў. Усё ж прамаргалі арганізатары — мала што даручылі даклад Няхаю, дык яшчэ запрасілі гісторыкаў — таго ж Мікалая Сташкевіча, які адзін з першых яшчэ гады тры назад, яктолькі раман выйшаў, выступіў з сур'ёзнай рэцэнзіяй. Сапраўды прамаргалі? Ці была нейкая тайная задума — усё-такі 1987 год! Хоць да развянчання Леніна яшчэ не дайшло, але на рэвалюцыю кароцічы ўжо наскоквалі.

12 жніўня

Ездзілі з Машай у Маскву. 10-га Віктару Вольскаму споўнілася 70. Нельга было не паехаць, ён да мяне прыязджаў, не адзін — з братам Яўгенам. Абодва яны надзвычай лёгкія на пад'ём. А для мяне нават паездка ў Маскву — праблема. Стагнаў і шкробся. Але з'ездзілі без клопатаў, лёгка.

Пра Вольскіх хочацца напісаць. Варта напісаць. Гэта — асобы. Характары. Але разам з тым і з чалавечымі слабасцямі. Ды зраблю я гэта пазней, дай бог здароўя. Некалі свярбела рука напісаць пра яго аповесць — пра той бой у Малдове, за які ён, камандзір батарэі,

атрымаў Зорку Героя Савецкага Саюза. і пра яго драму — з-за брата, якога ў 1949 годзе пасадзілі. І пра яго жонку, незабыўную Уладу, якую шчыра любіла Маша,— пра яе жаночую драму. І пра жанчыну, якая яе замяніла.

Гэтая Ала Аляксандраўна — феномен, просіцца ў аповесць. Уся сям'я просіцца ў аповесць ці раман. Я прапанаваў тост за светлую памяць Лізінай маці, Кацінай бабулі — Уладзіславы Ісідараўны. Ліза, дагэтуль вясёлая, горка расплакалася. Яшчэ адна драма. Аднак пра іх пасля.

22 жніўня

Адбылася трагедыя, за якую народу прыйдзецца доўга і дорага плаціць. Але адно яна высвеціла: якія бяздарныя людзі кіравалі вялікай дзяржавай. Ізалявалі Гарбачова ў Крыме. Ха! Смешная ізаляцыя. Дзеянні ГКЧП называюць пераваротам...

16 верасня

Памёр Саша. Сынок мой! Выю, як ранены звер. Жыву са страхам за жонку. Толькі вытрымала б. Толькі вытрымала б! Без яе і мне канец. Падтрымай яе, божа. Спадзяюся на дзяцей, унукаў: яны будуць трымаць. Балюча, што так раптоўна і так недарэчна.

7 кастрычніка

Жыву яшчэ, раз хвалююць і палітыка, і справы літаратурныя. Трэба жыць! Трагедыя не ў аднаго мяне, у нас з Машай. Трагедыю перажываюць народы. Кроўю сэрца абліваецца за сербаў, за харватаў. Міратворца папа рымскі! Спыні паству сваю — католікаў! Маўчыць Вайтыла. Рэжце праваслаўных сербаў. Маўчыць і патрыярх Алексій. Навошта яму сварыцца з папай! Наладзілі ж адносіны. А што ім да таго, калі ляжа колькі тысяч? Памоляцца за ўпакой іх душ — і бог блаславіць намеснікаў сваіх на зямлі на новыя палітычныя камбінацыі. Ох, людзі, людзі!

12 кастрычніка

Месяц, як памёр Саша. Маша плача. Хацелі ехаць на могілкі — не прыехаў Слава, зяць. А я баюся са сваім адзіным вокам весці машыну. Стаіць дзівоснае надвор'е, такога кастрычніка даўно не было. Выкапалі бульбу, а цана дзяржаўная 2 руб. 80 к. за кг. Жах! А ў Іркуцку паўтара. Хто ў нас узвінчвае цану? Як жыць людзям? Гэта ж наш другі хлеб, без двукосся.

Учора занімаўся зневажальнай справай: даставаў гарэлку да 40 дзён. Кланяўся старшыні райвыканкома. Дзякуй ім, па-чалавечы хоць адносяцца. Дзейнічае мой аўтарытэт. У чытачоў. А ў пісьменнікаў? У нас — кожны сам сабе найвышэйшы аўтарытэт. А можа, гэта і добра?

Быкаў публічна заявіў, што палавіна беларускіх пісьменнікаў сексоты (секретные сотрудники, КГБ, конечно). Ашаламіла гэта мяне. Божа мой! Як жа трэба ненавідзець сваіх калег, каб такое сказаць! І нашы прамаўчаць? 90 працэнтаў — гэта людзі, якія ўступілі ў СП пасля смерці Сталіна. Каму трэба было вербаваць пісьменнікаў у хрушчоўскі і ў брэжнеўскі перыяд? Якія ў іх сакрэты? Яны выказвалі іх у сваіх кнігах, а ўсё, што за цэнзурай,— у п'яных дыспутах у рэстаранах, кафэ.

19 кастрычніка

Пераехалі з дачы на гарадскую кватэру. Маша плача тут часцей. Адсюль хавалі Сашу. На піяніна стаіць яго жалобная фатаграфія. Страшэнна крыўдна. Недарэчная смерць. Часам караю сябе: не збераглі. А як берагчы саракагадовага мужчыну, які асобна жыў? Пачынаю верыць у лёс. І пратэстую: завошта ж такая кара нам? І ўсё часцей думаю пра ўласную смерць. Учора вельмі блага адчуваў сябе — галава, відаць, спазмы сасудаў, праўда, з'явы гэтыя былі і раней, у 1989 годзе ставілі дыягназ: парушэнне мазгавога кровазвароту. Смерці не баюся, але халадзею ад думкі, што маю смерць не перажыве Маша. А без нас будзе цяжка Ліне, Таццяне, Алесі, унукам нашым. Як ім без бабулі ў наш суровы час? А развал краіны... не прадаўжаецца — завяршаецца. Вінавацяць партыю і не вінавацяць Гарбачова, Якаўлева, Ельцына. Яны ўсё яшчэ — героі, рэфарматары. А каму карысць ад іх рэформ? Бушу, Колю? Што мае ад іх народ? Дурні журналісты і не меншыя ідыёты парламентарыі, рускія, беларускія, армянскія: спакойна гавораць аб пагаршэнні становішча, аб голадзе, маўляў, інакш і не можа быць. Схамяніцеся, людзі! Да чаго нас прывучаюць! Да якой думкі! Крычаць трэба! Біць у званы! Але хто будзе біць? Одряхлевшая партыя не варухнулася, каб абараніць сябе ад уласнага Генсека. Як легка ён адмовіўся ад гэтага паста! Каб утрымацца ў прэзідэнцкім крэсле. Не! Не ўтрымаешся! Не паможа і Буш.

Хто будзе крычаць аб народным горы? «Дэмакраты»? Гэтым чым горш — тым лепш... для іх. Але пажнуць яны плады, ох пажнуць! Урэшце зразумее народ, хто ёсць хто.

Зноў успомніў Быкава. Ён напамінае пра сябе. На сустрэчы з маладымі на пытанне, якія ў яго адносіны з беларускімі пісьменніка-

мі, адказвае: ніякія. Сапраўды, якія могуць быць адносіны з сексотамі?

21 кастрычніка

Сорак дзён, як няма Сашы. Умоўнасць. Але праваслаўны абрад і народная традыцыя ўздзейнічаюць на псіхіку, на эмоцыі. І ў гэтым ёсць сэнс і мудрасць — яшчэ раз памянуць таго, каго фізічна няма, але хто ў сэрцах нашых. Набожная Марыя Ціханаўна, сваячка мая, якая акуратана наведвае царкву, падказвае нам усю абраднасць. Учора разам з Таццянай маліліся ў саборы за Сашу. З яе слоў: на 40 дзён душа пачынае жыць самастойна. Хачу паверыць у гэта. І ў бога хачу паверыць. А ў што яшчэ верыць? Зруйнаваны, забруджаны, абпляваны ўсе ідэалы. Пустэча, як на месяцы. Адзін вулканічны попел у сэрцы, у галаве.

Сарачыны адзначылі ўчора. Малайцы сваякі нашы. Пляменніцы Машы — Тамара, Наташа, Маша ўзялі на сябе ўвесь груз падрыхтоўкі стала. І нагатавалі — божа мой! Навошта столькі? На два-тры дні хопіць не адной нашай сям'і. З Гомеля прыехалі сястра мая Таццяна і пляменніца Маша з дачкой. І, бадай, нечакана — пляменнік Алёша з жонкай. Пабылі на могілках, паабедалі і — назад у Гомель: заўтра на работу. Малайцы. Дзякуй вам, дарагія мае. Усё-такі лягчэй, калі сабіраемся ўсе разам: чалавек 25 сваіх.

Лішнія спачуванні — гэта цяжка. Разумею, што нялёгка іх выказваць. Калі месяцы тры-чатыры назад у Максіма Танка памерла дачка Вера, я тыдзень паднімаў тэлефонную трубку і... не адважваўся пазваніць, баяўся прычыніць таварышу боль. Ледзьве адважыўся. Але поўнае маўчанне, напрыклад, сям'і Макаёнкаў неяк нядобра ўразіла. Чаму маўчаць? Сяргей працуе ў нас і не прыйшоў выказаць спачуванне ад сябе, маці... ад сям'і. А Алёна? Пасля вашага гора смерці Андрэя — колькі я хадзіў да вас, колькі званіў! А колькі напісаў пра Андрэя. Колькі перажылі мы з Машай, памагаючы сям'і ў судовай цяжбе з Любай. Як жа растлумачыць іх маўчанне? Далікатнасць? Чэрствасць?

І Пятро Васілеўскі, Галя! Так сябравалі некалі! Ды і цяпер ніякая кошка не прабегла паміж намі. Рэдка сустракаемся — пастарэлі... Унучкі нашы сябруюць, звоняць адна адной часта. А дзеда і бабулю, выходзіць, не кранула гора даўняга сябра? Але бог з вамі! Я вам зычу толькі дабра. Гэта не крыўда мая — гэта развага. Што гэта? Бракуе чуласці? Інтэлігентнасці? Ці, можа, так і трэба — маўчаць? Не знаю. Але заставацца аднаму не хочацца. Хочацца быць сярод пюдзей. Так лягчэй. Таму і з БелСЭ не іду. Між іншым, савет працоўнага калектыву пастанавіў зняць у назве «Беларуская савецкая энцыклапедыя» сло-

ва савецкая. Можа, яно і непатрэбнае. Але ўсё роўна горка і балюча. Вакол — адна горыч. З ею і памром?

26 кастрычніка

Пуста ў галаве, пуста ў душы. Не знаю, чым заняцца і дома, і на рабоце. Разумею Машу. Зараз выйшаў у калідор, а яна поўзае на каленках, мые падлогу. Абурыўся: «Што, Алеся не можа зрабіць?» «Божа мой! Як ты не разумееш. Я павінна нечым заняцца». Разумею. Паднімаецца ў шэсць раніцы і цэлы дзень занімаецца... У паўзах — плача. Ёй не спіцца. Якія гэта пакуты. А я, сорамна прызнацца, сплю, засынаю цяжка, позна, але раніцою сплю да дзевяці. Адышлі на задні план усе справы, творчыя, службовыя, грамадскія, і я неяк дзіўна супакоіўся. Спустошанае супакаенне. Думаеш: з-за чаго хвалявацца? Нічога ж не зменіш за кароткі астатак жыцця. Пачынаць раман? А навошта? Каму ён патрэбны? Народу цяпер не да нашага сачыніцельства, У лепшым выпадку ён чытае «Анжэліку», у самым лепшым — «Унесенные ветром», монадзь — сексуальную муру... Божа мой! Як імкнуцца закрэсніць усю савецкую гісторыю! Як здзекуюцца, глумяцца над тым, што было святым і што, па логіцы цывілізаваных людзей, мавінна застацца, калі не святым, то звычайным помнікам гісторыі. Нельга выкінуць ледзьве не стагоддзе з жыцця народа. Самае крыўднае — хто здзекуецца? Няхай яны — што ў іх святога на чужой зямлі, заутра яны будуць у Амерыцы ці ў Ізраіле. Але ва унісон ім гарлапаняць нашы ўнукі, дзеці беларускіх пісьменнікаў нават. Не хочуць адстаць ад «прагрэсу», а большасць — ад страху, што за тое, што яны не «перабудаваліся», іх пагоняць з працы. Пагоняць. Такая «дэмакратыя»! І такая прафесія журналіста: вторая древнейшая, першая — прастытуцыя. І колькі іх развялося — палітычных прастутытак! Пры диктатуры аддаваліся аднаму. А цяпер? Усім, хто можа больш заплаціць. Не хачу ганіць усіх журналістаў, сам па сутнасці журналіст і некалі пісаў гэтак жа — па заданию. Сярод іх ёсць разумный людзі. Не ў Гарбачова ці Ельцына можна прачытаць няхай спрошчанае, але арыгінальнае, вартае ўвагі. Не люблю эканаміста Шмялёва. Але яго артыкул у «Известиях» ажно ў чатырох нумарах — «Шанс на спасение» — прачытаў з цікавасцю. Ёсць канструктыўныя думкі. Толькі бяда ў тым, што ніхто нікога не слухае, размаўляюць, як глухія,— і ў парламентах, і ў прэсе, і на мітынгах. Агульнае ўражанне ад Шмялёва: людзі, якія пастараліся ўсё разваліць пад высокімі лозунгамі дэмантажу камуністычнай сістэмы, спалохаліся — далёка зайшлі з развалам: давялі народ да галечы. Цяпер баяцца яго, народа, узрыву яго баяцца, бунту, бессмысленного и беспощадного. Такі ўзрыў — а ён

спее — змяце і камуністаў і дэмакратаў, і ўсіх шмялёвых і паповых, якія ўмеюць служыць любому ўладару — дурню Брэжневу, «рэфарматару» Гарбачову, але не навучыліся служыць народу, бо ніколі і не імкнуліся да гэтага, хоць імем народа і кляліся. А народ — ох, які разгневаны! Страшна робіцца. Ён не стане разбірацца, хто ёсць хто, будзе біць любога ў андатравай шапцы — і былога партакрата і сённяшняга бізнесмена, кааператара. Выплеснецца самае низменное, самае пачварнае. Хто навядзе парадак? Адна надзея на армію. Між іншым, «дэмакраты» зменшылі свой гнеў супраць арміі, гэтак не аплёўваюць яе, як да ГКЧП. Але ці ёсць аўтарытэт, за якім армія пайшла б?

Супярэчлівае ў мяне стаўленне да поўнай незалежнасці Беларусі — да перспектыў гэтай незалежнасці, тых, якія рысуюць Пазьняк і Трусаў. Шчыры беларус, я — за незалежнасць. Але калі яны выступаюць і супраць эканамічнага саюзу — гэта самагубства. Не пражывём мы адны! Прыбалтаў будзе карміць Захад. Нас — калі бушы і колі прызнаюць? 46 гадоў Беларусь член ААН, а нас не знаюць і не хочуць знаць. Няшчасны народ! Без мовы, без прызнання. Без нацыянальнага гонару. Нават той нацыяналізм, які праяўляецца,— далёка не лепшай якасці — такі, што палохае звычайных людзей. Як жа ў такіх умовах з'явіцца лідэру нацыі?

31 кастрычніка

Учора адбылася рада СП: аб пазіцыі СП Беларусі ў адносінах да сітуацыі, што склалася ў СП СССР і Літфонду СССР. Адамовіч, Быкаў, Еўтушэнка, Чарнічэнка і розныя там аскоцкія і пулатавы моцна цямняць, ствараючы «новы» саюз расійскіх пісьменнікаў (расійскіх! каб увесці ў зман нацыянамаў). Але мэта іх усім вядомая: захапіць Літфонд, каб зрабіць іншых, беларускіх, узбекскіх і рускіх пісьменнікаў голымі — без сродкаў існавання. Г. Маркаў, калі пайшоў з СП, пакінуў на рахунку 140 млн. руб. Што засталося?

Быў на ўрачыстым вечары, прысвечаным 70-годдзю БДУ. І абурыўся супраць нашых, такіх, як былы партработнік А. Караткевіч. Слова таварышы, падкрэслена, сцёбаючы нас па вачах, ужываў негр-студэнт. А нашы, камуністы, баяліся ўжыць гэты зварот усіх сацыялістаў свету, не кажучы пра камуністаў. Нашы: шаноўныя спадары, спадарыні! Штучна гэта! Ні ва ўсходняй, ні ў заходняй Беларусі — нідзе так людзі не звяртаюцца адзін да аднаго. «Пан, пані» — распаўсюджана. І мне гэтыя словы, няхай і польскія, больш да душы. Вось да такой дэмакратыі дажылі: слова таварыш баяцца пачалі.

3 лістапада

Учора — Дзяды. Ездзілі з Машай на магілу Сашы. Наплакаліся. Намёрзліся. Маша плача: «Ні разу і не прысніўся ты мне, сынок». І я ні разу не сасніў яго, жывога. Дзіўна. Столькі думаем пра яго, гаворым, плачам! А чужыя сняць, брату Таццяны, жонкі Сашынай ён колькі разоў прыходзіў у сне.

Што застаецца ад чалавека пасля яго смерці? Мы, матэрыялісты, адказваем: справы яго. Усяго? І больш нічога? Глядзеў па тэлевізары перадачу з Амерыкі Філа Данах'ю і Познера — інтэрв'ю з тымі, хто быў у стане клінічнай смерці. Усе чацвёра бачылі другі свет, некаторых суправаджалі ангелы. Ангелы — галюцынацыі людзей, якія выхоўваліся ў рэлігійнай веры. Думаю, уяўленні гэтыя не тады ўзнікаюць, калі яны былі ў стане смерці, а тады, калі яны ажывалі — іх вярталі ўрачы ў свет гэты. Калі я выходзіў з наркозу пасля цяжкай аперацыі халецыстыту, мне ўяўляліся... ільвы. Чаму раптам ільвы? Але я іх помню і зараз, праз 17 гадоў,— добрых, мірных ільвоў, якія сядзелі вакол, сумна глядзелі на мяне і якіх я не баяўся. Тады я тлумачыў: галюцынацыйныя асацыяцыі ад нядаўна прачытанай аповесці «Старик и море»; у жорсткай барацьбе з рыбай старому і наяве ўяўляліся львы. Ці не перажыў сам Хемінгуэй гэтага пасля авіякатастрофы ў Афрыцы: ляцеў жа паляваць на львоў?

Сніш, між іншым, усялякую муру, сёння, напрыклад, адгалоскі пасяджэння рады, барацьбу Малашэвіча за ўладу. Як нахабна дзейнічае чалавек: сваёй рукой піша праект загаду і, не ўзгадніўшы са мною, назначае сябе маім першым намеснікам. Сюжэт — для камедыі. Але не да смеху — сумна: гэта адзнака часу. «Дык чаму мне нельга?» — думае Малашэвіч, за ім — Сташкевіч, думаюць сотні, тысячы бесцырымонных прэтэндэнтаў ва ўладары, вялікія і малыя.

Разгарнуў «Полымя», прачытаў вершы Генадзя Бураўкіна: цікава, што напісаў чалавек, седзячы ў гэта складаны час у Нью-Йорку (наш прадстаўнік у ААН). Вершы тэхнічна зроблены добра — лаканічна, вобразна. Але ні слова пра тое, што перажывае народ, які амаль галадае. Толькі яго настальгія па радзіме. У настальгію я веру, сам перажыў.

5 лістапада

Да чаго дагаварыліся «дэмакраты»! Жах! Якая бессаромнасць, нахабства! У «ЛГ» Марыэта Чудакова (во ўжо сапраўды Чудакова!) у артыкуле «Блуд борьбы» (блуд Чудаковай) устрывожаная, што дэмакраты пачалі грызню паміж сабой, піша: «Силы ж демократии с каждым днем разъединяются и распыляются. Именно это, на наш взгляд,

является первостепенным объектом тревоги. Об этом сегодня — именно сегодня, потому что завтра *действительно* (курсіў М. Ч.) может стать поздно — надо нам тревожиться, а *не о голоде и холоде зимой и не о бунте...*» (курсіў мой). Божа мой! Да якога маральнага падзення трэба дайсці, каб напісаць такое! Да якой знявагі і нянавісці да народа! Няхай памруць, няхай замерзнуць мільёны, абы мы, дэмакраты, былі з'яднаныя. Дзеля чаго? Каб Чудакова і ёй падобныя нажылі мільёны, а пасля выступілі дабрачыннымі дзядзькамі і цёткамі — накармілі міласэрнай пахлёбкай тых, хто ўцалее: усім памерці не дадуць, бо без рабоў і ім не пражыць. Во логіка дэмакратаў! А яшчэ адмаўляюць Марксаву тэорыю класавай барацьбы!

І ўсё ж паўтараецца! З Ельцына робяць культ. А як жа! герой: свабоднымі цэнамі ён абрабуе самых-самых бедных і дасць мільёны «третьему сословию» — які тэрмін выдумалі, падлюгі!

Чудакова: «Нужно, не побоюсь дурными ассоциациями обвешенного словца, сплотиться вокруг президента России и для начала помочь ему произвести первые радикальные — ведь мы же ждали их от него требовали даже!— и потому непопулярные экономические действия».

Хто патрабаваў, хто чакаў дзеянняў на агрaбленне народа, на давядзенне яго да поўнага жабрацтва? І пасля гэтага марыэты і чудаковы называюць сябе гуманістамі?!

7 лістапада

Святы дзень. Быў. Дзень нашага нараджэння — дзень Рэвалюцыі, якая пераўтварыла ўвесь свет. Ці не ад нашай Рэвалюцыі распалася каланіяльная сістэма? ЦІ не ад яе сталі добрымі капіталісты — у адносінах рабочых? Толькі нашы свярдловы, троцкія, сталіны, брэжневы не зразумелі сэнс рэвалюцыі, тыя магчымасці, якія яна адкрывала.

Рэвалюцыю трэба было развіваць, удасканальваць, а не аплёўваць, не адмаўляць, як гэта робяць «дэмакраты». Паўзуць у першапачатковы драпежны капіталізм, у 18-е стагоддзе і называюць гэта прагрэсам. Сабчакі кідаюць выклік Рэвалюцыі — трусяць старым царскім ашмоццем, рухляддзю — паклікалі «вялікага князя» Уладзіміра Кірылавіча і наладжваюць балі ў яго гонар, а побач няшчасныя ленінградцы-пецярбуржцы стаяць у чарзе за хлебам. Якая пагарда да народа, якое бессаромства!

Пайшоў на камуністычны мітынг у парку Горкага. Тысячу чалавек сабралася. Выступалі па-баявому. Малайцы ветэраны! Але ў гэтым і бяда, што — ветэраны, што няма моладзі. Маладыя стаялі на мосце,

скандзіравалі: «Гань-ба!» — нам, камуністам. Нічыпар Пашкевіч сказаў, што ён ішоў там і ўбачыў: кожны другі п'яны. Каб не міліцыя, банда гэта магла б зрабіць пабоішча старых. Жах! Хто паіў? Во што варта дасмодаваць сумленным журналістам і напісаць, як дзейнічаюць тыя, хто абвясціў сябе дэмакратамі. Чыста фашысцкія метады. Ды мала іх, сумленных журналістаў! Пабачыў многіх знаёмых, былых партработнікаў. Сумныя людзі. Але аптымізм ныступленняў дае надзею. Створаны камітэт па аднаўленню мартыі камуністаў. У арганізатары мне позна. Аднак камунісіам застануся!

Віны сваёй за дзеянні Сталіна, Берыі, Гарбачова, Якаўмева не адчуваю. Віна іх! І гісторыя асудзіць апошніх, як асудзіла першых. Узважыць іх віну, і невядома яшчэ, у каго яна будзе цяжэйшая: у дыктатара Юзіка ці дэмакрата Мішкі.

...Маша ўсё ж гатуе святочны абед. Прыехала Таццяна. Чакаем Алёшу з праўнучкай нашай, унучкі нашы Маша і Слапяна ў нас — на канікулах.

Баюся піць, але выпіць хочацца. Гэтага патрабуе душэўны стан, настрой. Жыць хочацца! Жыццё не абрыдла. Я люблю яго, жыццё. Сядзелі на ўрачыстым вечары 70-годдзя БДУ з Іванам Чыгрынавым. Закранулі тэму, што рабуюць кватэры. Я кажу: «Пісталет трэба мець». Іван адказвае: «Не хачу пісталета... Яшчэ застрэлішся». Скаланула мяне. Няўжо чалавек думае пра такі канец? У мяне вось ён, пісталет, пад рукой, у шуфлядзе стала. Але ў мяне ніколі не з'явілася гэтая страшная думка — ні ў якія хвіліны роспачы, гора, болю.

9 лістапада

Да чаго дажылі! Да чаго дайшлі! Прафесар В. Трушкоў у «Праўде» прыводзіць «канцэпцыю» свайго калегі прафесара (во якія прафесары!) В. Карапанова (няўжо рускі?). Што ж прапануе гэты «вучоны»? «Выход все же есть,— дэкларуе мудры эканаміст.— Немедленное интегрирование экономики СССР или его республик в мировую экономику». Як? «На принципиально другой основе». Стаць добраахвотна калоніямі высокаразвітых краін! Вось так. Мудра і проста! «Официально признать, что Советский Союз в целом и каждая из его республик политические и экономические банкроты. Естественно надо обратиться (курсіў мой) к Западу с просьбой прикрепить отдельные республики или регионы к развитым странам. Допустим, Россию — к США и Японии, Украину — к Англии, Беларусь — к Франции. Понадобится создать смешенную администрацию по управлению колониями».

Вось так! Беларусам варта крычаць «ура!»: нам пашанцавала — мы будзем калоніяй Францыі. Сукін ты сын, Карапанаў! Ворагі нашы не даходзілі да такога! Хіба Гітлер хацеў «прывязаць» акупіраваныя рэспублікі да Германіі.

Чытаеш такое — і сэрца крывёю абліваецца. І нашы «мастакі» пішуць такое, што не ведаеш, ці плакаць, ці смяяцца. Валерый Грышановіч, былы работнік ЦК, адкуль выбіўся ў дырэктары выдавецтва, здаецца, сур'ёзны чалавек. Ці толькі здавалася? Надрукаваў у «Народнай газеце» слабыя вершы пад тучным вызначэннем жанру «Паэма надзеі — «Пагоня» вяртаецца на Беларусь». Многа ў паэме «клюквы» накшталт той, што падобныя паэты выдавалі ў сталінскі перыяд, пазней такога не было.

Бязмерна пакутныя людзі
зямлі беларускай
насустрач Пагоні
выносяць іконы.

О, божа! — адно хіба і можна — застагнаць, бо не да смеху. Аднак і сумны смех апаноўвае.

Серп, молат, калоссі — гэта дрэнна, гэта бальшавіцкія сімвалы, а вось коннік з захопніцкім мячом, які імкнецца дагнаць (каго?) і забіць,— гэта той сімвал, што патрэбны народу. І смех і грэх!

Слухаў учора па БТ апазіцыю парламента — Пазьняка, Навумчыка і інш. Ашаламляе іх зацыкленасць, адсутнасць адчування рэальнасці. Калі незалежнасць, то рваць усе сувязі з Расіяй. Пражывём, маўляў. Наша валюта — лён. Дзе ён, хлопцы? Хто і калі яго вырасціць? Яго ж таму і не стала, што культура працаёмкая, патрабуе рук, а іх у вёсцы няма. Калі будуць? «У нас ёсць буры вугаль». Дзе, колькі? А калі ёсць, то як можна сур'ёзным людзям не разумець, што для таго каб наладзіць яго дабычу і пераабсталяваць кацельні з газу на той вугаль, патрэбен не адзін год і спецыяльнае абсталяванне, якога няма. А як жыць сёння, заўтра? Замярзаць у імя ідэі незалежнасці? Значыцца, стаць калоніяй Францыі — калі паска, ці не так і Пазьняк думае? А заключыць разумны саюз з братнім народам — ганьба? Ад адной маці нарадзіліся, і ніколі паміж рускімі і беларусамі не было мяжы, ні фізічнай, ні духоўнай, ні геаграфічнай, ні этнічнай. Урэшце, багацейшаму брату можна і пакланіцца — не ганьба: брат! Ганьба кланяцца немцам і французам. А мы кланяемся. Мы аддалі ім ГДР, а яны нам — дулю. Сёння пачуў па «Маяку», што кангрэс ЗША супраць таго, каб даць нам гуманітарную дапамогу ў адзін мільярд долараў. Што для Амерыкі, якая абажралася, адзін мільярд? Гуманісты, такую іх маць!

Учора чытаў газету і... заснуў, на міг, відаць. Я часта засынаю над газетай, кнігай, перад тэлевізарам. І пачуў: як да пляча майго дакранулася рука і... голас Сашы: «Папа, не спі». Расхваляваўся. Машы баюся расказваць. Увогуле, я баюся такога засынання. Прачытаў, здаецца, у Маравіа: герой вёз любоўніцу, і яна, маладая, здаровая, уміг памерла ў машыне. Забойства? Не. Яна заснула, расслабілася, а ён рэзка затармазіў: разрыў шыйнага пазванка. У мяне пасля такога хвіліннага сну баляць шыя і галава.

Учора цэлы дзень ішоў дождж. Не было як выйсці пагуляць. Змрочна, сумна. На свята пазваніў адзін Антонаў. Я пазваніў Вольскім і Танку. Прыслалі паштоўкі І. Я. Палякоў і Іван Мяла. Увечары 7-га званіў Дзяльцу, ён спаў: прыехаў з палявання. Учора пазваніў, пагутарылі. Дзяды — малайцы: у іх добрая кампанія — Майсеенка, Шаціла, Раманоўскі... Упалявалі дзіка, выпілі ў лесе па чарцы. Зайздросна. А я — адзінокі. Каму пазваніць, каб разам пагуляць? Чаму ніхто не пазвоніць мне? Навуменка, Скобелеў, Савіцкі — у адным доме. Сумна.

10 лістапада

Калі памёр бацька, я адчуваў сваю віну: маючы такога сына, ён мог правесці апошнія дні не ў добрушскай бальніцы. Такую ж віну я адчуваў і пасля смерці Клавы: мог я памагчы ёй лячыць бранхіяльную астму больш актыўна — памагчы дастаць пуцёўку ў спецсанаторый, у саляныя шахты. Хоць Клаўдзія была добры ўрач і лепш ведала, чым хто, што ёй трэба. Аднак грызла мяне віна.

Хварэла маці. Я паехаў наведаць яе. Абурыўся: маці ляжала па сутнасці на кухні — у катушку за печчу. Сялянскае варварства — абы цёпла. Цыкнуў на Галю: «Вы што, не можаце палажыць яе ў сваёй спальні?» — «Дык не хоча яна». Маці не хацела турбаваць дзяцей, а ў іх розуму і чуласці не хапіла. Перанеслі. Дзень быў марозны, сонечны. У бакоўцы, што служыла спальняй, поўна сонца. І маці ў гэтым іскрыстым святле ажно заўсміхалася. Наведаўся. Прывёз з Добруша ўрача. І лічыў, што свой сыноўні абавязак выканаў. А мог забраць яе ў Мінск, не тады, калі везці было рызыкоўна,— раней. Была б у сталіцы — не ў лесе, побач з ракетнай базай, дзе, вельмі можа быць, і тады была радыяцыя; цяпер пасёлак Дубецкі, дзе жыў наш зяць, выселены — больш за сотню кюры.

І вось зноў адчуванне віны — за смерць Сашы. Намнога цяжэйшае. Пра тое, што мы не ўмеем выхоўваць дзяцей,— і казаць няма чаго. Але мы пасіўна лячылі яго: лажылі ў бальніцу, пасылалі ў санаторыі з гастрытам, халецыстытам.

Колькі перажыла Маша, калі ён заставаўся дома, у сваёй кватэры, адзін, жонка яго Таццяна любіла ездзіць то да маці ў Лоеў, то да сястры ў Вільнюс (ледзьве не кожны выхадны), то да суседкі ў Варшаву. І сын наш заставаўся адзін — без дзяцей, без жонкі. З тэлевізарам?

13 лістапада

У «Рабочай трыбуне» (тыраж 932 000 экз.) здымак плаката, які неслі рабочыя 7 лістапада, тэкст: «Прости нас, Вл. Ильич! Теперь власть у агента ЦРУ из Кремля, мафии из белого дома, спекулянтов из мэрии. Будьте вы прокляты, предатели русской нации, торгаши нашей землею...»

Груба, але... настрой мас перадае дакладна. Такое чуеш штодня ад людзей самых розных сацыяльных пластоў. Смелы чалавек А. Юркоў — галоўны рэдактар. А што Гарбачоў, Ельцын, Папоў? Пракаўтнуць такую жабу? Любы палітык, які паважае сябе, пасля такіх абвінавачванняў (няхай не пацверджаных дакументальна) падаў бы ў адстаўку. Буржуазны палітык — з пачуццём гонару і сумлення. З нашага ж — што з гуся вада. Наладжвае прэзентацыю сваёй кнігі аб... сваіх запэцканых трусах. Калі краіна развальваецца, яны пішуць кнігі, каб атрымліваць мільённыя ганарары ў цвёрдай валюце. Я не веру абвінавачванню «агент ЦРУ». Не хочацца верыць — першая асоба! А міжнароднік, глыбокі палітык Эдуард Скобелеў даказвае, што і такое магчыма: не ЦРУ напрамую, дык масонскай ложы ці іншай сусветнай арганізацыі — з тых, што, застаючыся ў цяні, кіруюць светам.

Была супрацьсіла — камуністычны рух. Зруйнавана. Ці ўтрымаюцца хоць кітайцы? Калі іх марксізм-ленінізм мааісцкі, дагматычны, нятворчы,— адужаюць і іх. Што гэта я — трачу веру ў камунізм? Не, усё яшчэ веру: будучыня — за сацыялізмам! Не можа народ, які пры ўсіх зігзагах пазнаў роўнасць, стаць рабом «третьего сословия» — мафіі, зладзеяў, спекулянтаў.

14 лістапада

Аб падзеях далёкіх — маладосці сваёй — я пісаў з цікавасцю і натхненнем. Па меры набліжэння да часу сённяшняга цікавасць згасае. Што здарыцца? Пастарэў? Стаміўся? Ці самі падзеі страцілі значнасць на фоне таго, што адбываецца сёння ў краіне, у СП, у маім жыцці? А пра гэта я пішу — пра свае перажыванні. Раней здавалася, што і гісторыі напісання раманаў, аповесцяў будуць цікавымі для чытача, будучага, далёкага. Цяпер я не ўпэўнены ў гэтым. Драматычным, цяжкім, творча напружаным было стварэнне «Петраграда —

Брэста». Але ці перавыдадуць калі-небудзь гэтую кнігу? Як аплёўваюць Леніна — жах! Тэлебачанне, прэса ўздзейнічаюць на звычайных хуліганаў — усё дазволена! — і яны ўчыняюць акты дзікага вандалізму. Сёння ў «Звяздзе»: у Светлагорску заліта карычневай фарбай бетонная скульптура хлопчыка Валодзі Ульянава.

Можна вініць літаратуру, кіно ў шмат якіх грахах, але ўсе творы прасякнуты гуманізмам, патрыятызмам. З прыходам на ТВ Ягора Якаўлева (во злавесная фігура!) не паказваецца ніводнага патрыятычнага фільма, нават дзіцячага — аб ваенным гераізме. Усё, гады, хочуць закрэсліць. Халадзееш ад думкі, што ім гэта ўдасца. Але надзея не згасае.

Аднак я зноў у дзень сённяшні. А куды дзенешся? Спакойна напісаны «Вазьму твой боль», «Зеніт». Але «біяграфіі» кожнага з гэтых твораў не паўтараюцца з біяграфіямі ўсяго, што напісана раней. Пра «Вазьму твой боль» крытыка пісала многа, «Зеніт» амаль не заўважыла. А дарэмна! Гэта новае слова пра вайну, пра тыя «тылы» і пра тых герояў, пра якіх місалі мала.

Раман-успамін. Так і варта было вызначыць яго жанр. Увесь час, а гэта каля трох гадоў, пакуль пісаў, я жыў успамінамі пра людзей, з якімі ваяваў. Дзіўна, яны выплывалі з глыбінь памяці ў бяссонныя ночы. Я не помніў прозвішчы многіх, але выплывалі іх твары і іх дзеянні ў самых розных сітуацыях. Многія напісаныя раздзелы я перачытваў з асаблівым хваляваннем. Не помню, што пісаў у ваенных дзённіках, якія не захаваліся, думаю, што там былі голыя і не звязаныя, «не арганізаваныя» факты, але ўспаміны пра вайну ў гэтым дзённіку — сухія і бледныя ў параўнанні з успамінамі раманнымі. Праца над «Зенітам» — своеасаблівая творчасць: сінтэз мемуараў і сачынення. Фантазіі нямала, як і ў іншых творах, але тут яна хораша «прыземлена», прывязана да асабіста перажытага. Гэта, здаецца, заўважыла Грамадчанка, і нічога не ўбачыў доктар Дзюбайла.

Буду жыць — трэба напісаць аналіз сплаву мемуараў і сачынення.

11 лістапада

На магіле Сашы былі пазаўчора. А Маша паехала сёння, калі я яшчэ спаў, гультай. Соромна. Ем, п'ю, сплю, гляджу тэлевізар, чытаю газеты — усю лухту і... нічога не раблю таго, ад чаго застанецца след. Ад творчасці. Трэба пачынаць раман! Але стрымлівае злавеснае пытанне: а навошта? Пакінуць дакумент часу? Пішацца многа рознымі аўтарамі, але пераважна публіцыстыка. Паспрабаваць пісаць раман без усялякага ўнутранага цэнзара. Атрымаецца? У Пыльчанкі ёсць

біяграфія, і яна будзе «ціснуць» на характар, ён душэўна ранены чалавек: смерць сына, жонкі, цяжкая хвароба другога сына, нездароўе ўнучыка — адзінай уцехі і радасці. І — распад, распад усяго, што ствараў, чаму верыў.

Не, не гатовы я пісаць раман, трэба, каб хоць прытупіўся боль страты. Буду «цягнуць» дзённік, успаміны.

Недалёкае, але і няблізкае ўжо. 1981 год. Іду да 60-годдзя. Пераход ад сталасці да старасці. Але поўны яшчэ планаў, самалюбівых спадзяванняў. Хочацца прызнання, славы... Сапраўды, хацелася — прызнаюся, грэшны. Такімі ж планамі поўніўся і Андрэй: гарэў, ваяваў з Раеўскімі. Чысла 26 студзеня запрасіў нечакана, у канцы дня першы сакратар ЦК Ціхан Кісялёў. Тады да першага з'яўляліся, як кажуць, на адной назе. Увайшоў у кабінет — Ціхан выйшаў насустрач, абняў. Гэта мяне нават спалохала — такая ласкавасць начальства. Падвёў да стала, падаў лаперу. Рашэнне Палітбюро аб прысваенні мне звання Героя Сацыялістычнай Працы. Захлынуўся ад шчасця. Ведаў, што прадстаўлялі, але не вельмі спадзяваўся, ведаючы, на якім узроўні гэта вырашаецца, а галоўнае — хто павінен даць дабро, візу: Саюз пісьменнікаў СССР. А там, акрамя Георгія Маркава, які падтрымліваў мяне, былі і стаўленікі Озерава — Сураўцава і К. Не, злітаваліся ці не адважыліся ісці супраць ЦК: ідэалогію ўзначальвалі Зімянін і Шаура, беларусы. Але гэтыя землячкі завалілі б «без угрызения совести», каб толькі ўбачылі, што ў СП СССР яны моршчацца. Не ўбачылі, відаць.

30 студзеня праходзіў XIX з'езд КПБ, я — дэлегат, і мяне зацалавалі. Дадому навезлі гару падарункаў — гамяльчане, ніцябляне, магіляўчане. Не чакаў такой увагі. Ведалі абкомы загадзя аб такой падзеі, мабыць, Ціхан падказаў.

З'езд закончыўся, і мяне павезлі ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета. І. Я. Палякоў уручыў Зорку. Тройка растлумачыла, што на юбілейным вечары быць не могуць — тут жа едуць у Белавежу: прыязджае Хонекер (ці Кадар), нехта з іх. З адсутнасці першых асоб на вечары спрабавалі зрабіць палітыку, нехта, мабыць, зларадніча. Але выступіў А. Кузьмін з прывітаннем ЦК, Прэзідыума, Саўміна і растлумачыў, чаму няма першых.

Вечар вёў Андрэй, але жартаваў ён не лепшым чынам, часам грубавата, Машу некаторыя жарты абуралі. Шчыра гаварылі землякі, чытачы, партыйныя работнікі. Але выступленні не запомніліся. Здымала тэлебачанне. Нядаўна мне сказалі, што ўсе тыя запісы не толькі мяне — Броўкі, Крапівы, Мележа сцёрты.

Усё сціраюць «дэмакраты». Крычаць пра Беларусь, беларусізацыю і сціраюць 70 гадоў, самых плённых, яе культуры. Думаюць, што яны створаць новую культуру на голым месцы. Смешна і горка.

Ва ўрадавым пакоі абмывалі Зорку. Пілі толькі марачныя каньякі. Працягвалі ў мяне дома.

А на другі дзень, у суботу, я заказаў «вузкі» абед — чалавек на 40 у кафэ Дома літаратара. На прысутнасць высокага начальства не спадзяваўся і тады, калі заказваў, але ўпэўнены быў, што Кузьмін і Сняжкова будуць. Ніна прыйшла, «вялікі ідэолаг» прыслаў Івана Антановіча. Але справа не ў тым, хто прыйшоў. Нашы ўсе прыйшлі. Стол накрылі да збору гасцей. Не лепшым чынам, не такі багаты, як планаваў, але нічога. Выпіў я там без учарашняга кантролю за сабой. У гардэробе, калі апранаўся, спатыкнуўся — нарабілі ўсходцаў і бар'ерчыкаў — і зламаў руку, кісць правай рукі. «Хуткая» завезла ў траўматалагічны цэнтр. Хірург зрабіў здымак і... свіснуў, але — малайчына! — склаў удала, ламаць паўторна не прыйшлося.

Вось так закончыўся мой трыумф, маё свята. Не, не закончылася. Праз дзесяць дзён, 9 лютага, пазваніў Мальцаў, зяць наш: загінула Галя, сястра мая. Ехала на веласіпедзе на работу ў ваенны гарадок, быў ветраны дзень, з сасны звалiўся сук і — па галаве. Жахліва ўспомніць, што я перажыў у тыя дні. Не здолеў паехаць на пахаванне — загіпсаваная рука не лезла ў рукаў, а на дварэ моцны мароз. Паехалі Маша і Саша. Сынок мой! На тваю долю выпадала ездзіць на ўсе пахаванні.

Пра мяне нядаўна яшчэ гаварылі: удачлівы. Які ўдачлівы, людзі добрыя? Колькі ў мяне трагедый — не дай бог нікому, ворагам маім. Колькі смерцяў блізкіх! Як я баюся яе, смерці! Не сваёй. Блізкіх сваіх. Страх гэты і ўдзень і ўначы халадзіць душу.

20 лістапада

Нейкая запаволенасць у дзеяннях, нічога не паспяваю зрабіць. Якая-небудзь драбяза можа адняць не адну гадзіну, як учора: прыйшла паштоўка з райсабеса — прадставіць копіі тых жа дакументаў, што прадстаўляў пры афармленні пенсіі. Навошта? Дзе яна, пенсійная справа? Здалося, што я пакідаў іх, копіі. Пачаў шукаць. Штось ёсць, чагось няма. І гэта нарушыла ўвесь рытм дня, майго творчага часу. (Якая творчасць! Але вымушаю сябе сядзець за сталом.) Урэшце дадумаўся пазваніць туды, у райсабес. Аказалася добрая жанчына: «Калі знойдзем вашу справу — нічога не трэба». Вось такі стыль работы! А нейкаму старому хвораму пенсіянеру трэба было б збіраць гэтыя даведкі. Сёння райсабесаўка пазваніла сама: нічога не трэба,

акрамя назвы і адраса ўстановы, дзе раблю. Між іншым, паўгода я атрымліваю пенсію цераз сваю бухгалтэрыю — удзельніка вайны. Сыр-бор разгарэўся ў сувязі з назначэннем мне яшчэ ў ліпені (во колькі ішло) персанальнай пенсіі саюзнага значэння. Саюза няма — пенсія ёсць. Што будзе далей? Учора апублікаваны праект закона РБ аб пенсійным забеспячэнні. Не знайшоў пункта аб выплаце поўнай пенсіі пенсіянерам — удзельнікам вайны. І пункта аб персанальных пенсіях. Не будзе? Дарэмна. Неразумная люмпенская ўраў-нілаўка. Мільён крадзі шляхам спекуляцыі, а той, хто напісаў 20 тамоў кніг, зрабіўшы навуковае адкрыццё, якое дало грамадству мільёны рублёў, атрымаць пенсію на 50-100 рублёў больш не мае права: роўнасць! Такая логіка «дэмакратаў». Большасць з іх маладыя і пра пенсіі не думаюць. Пакуль мы маладыя, мы бессмяротныя. Але, пакуль маладыя... А мы смяротныя. Не проста смяротныя — смертнікі, прыгавораныя без права памілавання.

Хацеў дадаць колькі штрыхоў да падзеі 1981 года, а збіўся на пенсію. Жыццё, што зробіш. і скончыўся мой «творчы час». Паеду ў выдавецтва «МЛ»: у красавіку падпісаны да друку ірохтомнік — і ніякага руху. Не было паперы. Цяпер нібыта мапера ёсць — камбінат перагружаны ў канцы года; невыгодныя яму малыя тыражы: 40 тысяч — дробязь. Дамовіўся з дырэктарам паліграфкамбіната Германавым. Пагляджу, чаго парта яго слова. Адна з нашых бед — дэвальвацыя слова. І рэх даўні, славянскі, але цяпер ён робіцца катастрофай для гых, хто вымушаны прасіць, а ў якасці прасіцеляў усе мы выступаем.

...Цікавыя звесткі дала газета «7 дней». Прывяла дадзеныя апытання аб аўтарытэце дзеячаў беларускіх. Апыталі 900 чалавек. Шушкевіч — 24 прац., Пазьняк — 7 прац., Адамовіч — 0,7 прац., Быкаў — 0,3 прац. Вось так, «отцы нации»!

22 лістапада

Усё прыніжае — усе «правы чалавека», якія дала «дэмакратыя». Быў я Чалавек, Асоба, Пісьменнік, Дзеяч грамадскі, мартыйны, дзяржаўны, а стаў... прыніжаны прасіцель. Некалі выдавецтва давала маім раманам «зялёную вуліцу». А цяпер Грышановіч са сваімі памочнікамі камбінуюць, як бы не друкаваць падпісаныя ў друк тамы Шамякіна, а надрукаваць на гэтай паперы штось больш прыбытковае. Што? Але самае страшнае, што з гэтым прыніжаным становішчам пачынаеш мірыцца, ужывацца ў ролю «маленькага чалавечка».

Пасля смерці Сашы нічым не хочацца займацца, асабліва тым, што раней было звязана з самалюбівымі імкненнямі, тщеславными

желаниями. Калі што і раблю, то па інерцыі. І дзённік гэты... мемуарная частка яго паблекла, згубіла сэнс. Дакумент эпохі? Хіба мала іх, дакументаў эпохі?

І аднак... калі ўжо разгарнуў яго, то занатую штрыхі ўспамінаў з таго трагічнага (смерці Галі) года майго 60-годдзя. Яшчэ больш трагічным стаў год гэты — 70-годдзя майго. Рок!

Праз тры тыдні пасля свята і траўмы з загіпсаванай рукой я паехаў на XXVI з'езд КПСС. Паехаў з Машай, мне дазволілі, без яе я не мог яшчэ апрануцца, завязаць гальштук.

З'езд цягнуўся дзён дзевяць, здаецца, і я дагэтуль помню, як пакутліва сядзець там было — з рукой, якая ныла, балела, слухаць алілуйшчыну Брэжневу.

Беларуская дэлегацыя сядзела ў першых радах, мы, Героі, у самых першых, я — у трэцім радзе, непадалёк ад трыбуны. І вось ён перада мной — вождь «вялікі і мудры». А ў сапраўднасці — стары хворы чалавек. Чытаў даклад — пыкаў, запінаўся, глытаў словы, аблізваўся потам, праз мінуту сёрбаў малочна-кіслародны кактэйль. Па-чалавечы мне шкада было Леаніда Ільіча: чалавеча, на хрена табе гэта трэба? Я баяўся, што не выцягне ён даўжэзны, на чатыры гадзіны, даклад, які павінен быў стаць праграмай дзейнасці жыцця партыі, народа, хоць добрых працэнтаў 80 да праграмы гэтай адносіліся скептычна.

Пасля першага перапынку Брэжнеў зусім аслабеў, хістаўся за трыбунай, праз паўгадзіны папрасіў новы перапынак. У кулуарах абмяркоўвалі, хто прадоўжыць даклад. Не. Зноў Брэжнеў. І як ажыў. Атрымаў допінг. Скончыў даклад на высокай ноце, бадзёра.

Дэталь. Побач са мной, на крайнім ад праходу месцы, сядзеў народны мастак СССР Налбандзян і ўвесь час рысаваў Брэжнева, эскізаў 20 зрабіў. Стараўся!

24 лістапада

Пакутліва мне было слухаць нудныя прамовы. А ў гасцініцы сумавала Маша. Праўда, невялікі занятак у яе быў, прыемны. У гасцініцы быў арганізаваны для дэлегатаў гандаль сувенірамі і прадуктамі. Тавары пераважна імпартныя. Прадукты, якія там прадаваліся, адменныя. І ўсё без нацэнак, у найпрыгажэйшай сувенірнай тары.

У фае — паштовае аддзяленне з незвычайнай для нас арганізацыяй прыёму пасылак: спецыяльныя фанерныя каробкі, клейкая лента. Упакоўка — тры-чатыры хвіліны. Канвеер.

Падарунак кожнаму дэлегату — магнітафон, праўда, наш, савецкі, але зроблены без хаўтуры. Вялікая помпа! Але... быў і парадак.

Галасавалі так, што мне ледзьве не зламалі зламаную руку. Валодзя Шаплыка, наш сакратар ЦК ЛКСМБ, ратаваў мяне — вынес ледзьве не на руках з натоўпу. Усе прагнулі хутчэй прагаласаваць за... Леаніда Ільіча. І прагаласавалі... аднагалосна.

26 лістапада

Мяне асабіста прадуктовы магазін ашалямляў (у прамтаварным такога адчування не было), не проста ашаламляў, шакіраваў і нават абражаў. Народ не еў не толькі далікатэсы, але ў цэнтральнай Расіі, Сібіры не ўсюды было мяса (у нас, у прыбалтаў, на Украіне было). Ніхто, па-мойму, з эканамістаў не вытлумачыў перыяду ўздымаў і падзенняў — прычыны іх. Канешне, жылі бедна. І аднак... У год выбрання Гарбачова Генсекам — чаго не было ў краіне, якая панесла такія страты ў вайну? Магазіны ламіліся ад тканін, адзення, абутку, посуду — металічнага, фарфоравага, шклянога; клямачныя вырабы каштавалі капейкі, і іх было навалам. Горш было з прадуктамі. Але хлеба, самага таннага ў свеце, мучных вырабаў, крупы хапала. А колькі было вінаў, гарэлкі, каньякоў. Значыць, хапала заводаў вырабляць іх.

Парадаксальна, але дэмантаж сацыялізму пачаўся з разбурэння спіртавых, вінных заводаў, са знішчэння вінаграднікаў. Ініцыятарамі былі рэфарматар Гарбачоў і кансерватар Лігачоў.

Сёння цана таннага балгарскага каньяку 93 руб. Гарэлка — 50 руб., 50 руб. — мяса! На каго гэта разлічана? Для каго гэта робіцца? Хто дыктуе такія цэны?

«Дэмакраты» не разумеюць, што не яны наладжваюць такое жыццё — трэцяя нябачная сіла, а яны будуць у адказе, віна ляжа на іх, як лягла на камуністаў. «Дэмакраты» лічуць, што ўсё развалілі камуністы. Што ж гэта яны раней не развальвалі, хоць вярхушка і вяла сябе па-свінску?

Пра механізм і рухаючыя сілы сказала ў «Правде» ў інгэрв'ю Таццяна Карагіна, учарашняя дэмакратка, якая, адчуваецца, моцна расчаравалася ў «дэмакратыі» ельцыных, Пановых, сабчакоў. Руская жанчына, з сялян, дайшла да яе! Але гаворыць яшчэ нясмела, обтекаемо. «... По моему ощущению, в стране существует политический заговор, который сопровождается политическим саботажем». І хто ж арганізуе гэты сабатаж? Ах, доктар, як дыпламатычна ты гаворыш: «И идет эта борьба с точки зрения, будет так говорить, некоего мирового сообщества (курсіў мой). Словом, для меня как научного работника совершенно очевидно, что нами кто-то управляет». Упраўляюць, Тацияна, ох як упраўляюць! Позна для цябе гэта стала очевидным. Я ў гэтым быў перакананы яшчэ ў 1985-1986 гг. адразу

пасля «антыалкагольнага закону»: падказана антысавецкім цэнтрам. З п'янствам трэба змагацца, але ж не стварэннем дэфіцыту бюджэту, не развалам эканомікі. Любая сялянка гэта ведае. Гарбачоў, Лігачоў і іх апанент Ельцын гэтага не ведалі. Іх памірылі — тыя, што намі ўпраўляюць.

5 снежня

Памёр наш былы зяць, бацька ўнука нашага Алёшы, якога Маша і Вольга вырасцілі, ажанілі, — Рэгаўцоў Анатоль, да лета гэтага года — маёр міліцыі. Пра нябожчыка не хочацца сказаць што кепскае, ды і адносіўся я да яго з мужчынскай аб'ектыўнасцю: я яго ўладкаваў у міліцыю і нават пасля таго, як ён развёўся з Лінай, памагаў яму заняць вышэйшыя пасады па службе — званіў міністрам, начальнікам упраўлення. Але — аб'ектыўна — крыві папсаваў ён нямала. Толькі дзеля Алёшы Маша трывала яго наведванні; між іншым, даволі рэдкія да сына і тады, калі ён быў малы, і тады, калі вырас. Алёша служыў у арміі апошні год ва Уруччы — у Мінску. Вольга Філатаўна ездзіла да ўнука кожны выхадны. Маша радзей. А бацька... ці наведаўся разы два-тры без усялякіх гасцінцаў?

Апошнія паўтара года, калі Алёша жаніўся, бацька наблізіўся да сына (ці сын да бацькі?). Сустракаліся часцей. Рагаўцоў другі раз не жаніўся, меў сужыцельку.

Алёша быў у шпіталі, калі бацька памірaў. Вярнуўся — разрыдаўся: бацька ёсць бацька. Ды і сам прывід смерці ашаламіў хлопца. Следам за ім разрыдалася Маша, увагналі ў слёзы і мяне: вельмі свежая рана ад смерці Сашы.

Сваякі вырашылі хаваць Анатоля Касьянавіча ў сваёй вёсцы Жлобінскага раёна. Мы хвалявaліся за Алёшу, пакуль не пазналі, што з ім едзе жонка яго, Наташа. Маша адразу супакоілася. А Рагаўцова мне шкада па-чалавечы: 53 гады! Так мала! І зноў думаю: што ёсць смерць? Учора позна чытаў Л. Талстога «Круг чтения». Якраз разгарнуў на павешанні Светлагуба. Па-мойму, раней я ўсяго не чытаў — урывак, Ігнація Межанецкага не помню.

«Осуждение ближнего неразумно: оно ни на что не нужно, а между тем вредно и себе и другим»,— запісаў Леў Мікалаевіч. Мудра. Усё ў яго мудра, хоць і спрэчна. Многа пра бога. Ісціну Евангелля Светлагуб спасціг у турэмнай камеры. А я, грэшны, колькі ні стараўся чытаць — не разумею. Не дайшоў? Многа мітусімся — мала думаем.

Учора прыйшоў на работу на стале праект загаду. Месяц назад падпісаў загад аб 30-працэнтнай надбаўцы да зарплаты. Новы загад: адмяніць 30 прац.— устанавіць 100 прац. Спалохаў мяне гэты праект.

Склікаў сваіх намеснікаў, старшыню рады, прафкома. Выказаў сумненні: а ці будуць у новым годзе грошы, каб заплаціць звычайную, без надбавак зарплату? Здаўся на «милость победителей»: падпісаў, бог з вамі, нядоўга мне засталося падпісваць такія загады. Цвёрды намер: хутчэй вызваліцца! У Машы ён яшчэ цвярдзейшы. Ды і час. Имей совесть, дед!

10 снежня

Садружнасць славян я вітаю, у гэтым адзіны ратунак, асабліва нам, беларусам, якіх без Расіі можа скубці нават Літва, не кажучы пра Польшчу. Дзіву даёмся, што «дэмакраты» нашы — пазнякі і ткачовы — нават супраць такой садружнасці выступаюць. Такую зашоранасць немагчыма зразумець. Выступаць супраць белавежскага пагаднення можна, але з пазіцыі... Гарбачова. Так. Пазаўчора я слухаў яго інтэрв'ю ўкраінскаму тэлебачанню. Недурныя думкі выказваў. Але чым разумней яны былі, тым большая злосць мяне апаноўвала. Няўжо толькі цяпер да яго дайшло, што «страна в опасности, Отечество в опасности... Налицо распад государства...». Кожны селянін і студэнт бачылі гэта даўно. І гаварылі. Прэса крычала. Што ты зрабіў? Разагнаў партыю? І гэтым хацеў ратаваць сябе? Не, дадуць табе выспятка, і вылеціш ты, кароль без дзяржавы... Хоць ён яшчэ галоўнакамандуючы. Не ўчыніў бы авантуры, каб ратаваць сябе. Гэты дэмакрат і гуманіст здольны на ўсё.

Садружнасць славян добра. Але Назарбаева, па-мойму, абразіла не з'яўленне на сустрэчу Краўчука і Шушкевіча. І паляцеў ён у Алма-Ату, каб стварыць ісламскую садружнасць. Хрысціяне-армяне пацягнуцца да нас, азербайджанцы да іх. І пачнецца... не дай божа, Югаславія.

Не веру я ў мудрасць Ельцына, у яго славянскую шчырасць. (Якаўлевы яго лепшыя памочнікі.) Не знаю, што такое Краўчук, хутка перавярнуўся з сакратара ЦК, інтэрнацыяналіста, у нацыяналіста. Не думаю, што фізік Станіслаў Шушкевіч набраўся вопыту ў палітыцы. Па-мойму, на авансцэну выходзіць армія. Слова за ёй — за каго яна? Ці хопіць у генералаў мудрасці выступіць за народ, а не за Гарбачова ці Ельцына?

Учора адзначылі 100-годдзе Максіма Багдановіча. Унікальная з'ява наш Максім! Жыць у Ніжнім, у Яраслаўлі і пачаць пісаць па-беларуску... Геній? Прарок? Не ўпільнавалі хлапчыну. А хто мог упільнаваць, калі не было маці?! Наш сын меў і маці і жонку... Чэхава не вылечылі, у якога была калі не сусветная, то ўсерасійская слава. А што было ў Багдановіча? Дзіўна, што ніхто з нашых не напісаў

сур'ёзнай кнігі пра гэтую зорку нацыянальнай паэзіі. Во дзе выяўляецца слабасць нашай літаратуры.

Сядзеў з раніцы на сесіі аддзялення АН. Былі цікавыя паведамленні — з фактамі, якіх я не ведаў. Увечары ўрачыстасць у оперным тэатры. Нязменны «адкрывацель» такіх вечароў Гілевіч.

Крыкі ў зале ад паведамлення аб перайменаванні вуліцы Горкага ў Багдановіча. (Між іншым, на юбілейнай камісіі я прапаноўваў перайменаваць вуліцу Свярдлова. Не адважыліся. Фігура! Што там Горкі з яго мільённымі выданнямі на сотні моў свету!) Крычалі «Жыве Беларусь!» на паведамленне аб перайменаванні праспекта Леніна ў праспект Францыска Скарыны. А мне было горка і крыўдна за асляпленне людзей, за іх новую зашоранасць. Знішчалі храмы сіяністы, троцкія, ліноў'евы, кагановічы. Што ж мы паўтараем іх? Гісторыя нічому не навучыла. Не проста здзіўляе — палохае злосць некаторых людзей.

13 снежня

Акрамя вайны, дзе мог памерці многа разоў, асабліва ў пачатку яе, двойчы быў у недалёкім мінулым вельмі блізка да смерці, заглянуў у яе твар, як кажуць, вісеў на валаску перад яе пашчай.

Першы прыступ халецысцыту здарыўся ў Нью-Йорку з болямі, тэмпературай. Моцна я там спалохаўся. Са слязамі прасіў міністра Кісялёва хутчэй адаслаць мяне дадому. Смерці не баяўся, смерць, адчуваў, не пагражала, палохала перспектыва апынуцца ў амерыканскім шпіталі — без мовы, як той герой Караленкі. Адразу ачуняў, калі «Боінг» адарваўся ад нью-йоркскага аэрадрома, а перасеў у Капенгагене ў «ТУ» — танцаваць хацеў.

Дыеты не трымаўся, хоць ездзіў і ў Есентукі, у Трускавец (невыносна сумныя курорты). Якая там дыета! Зеніт славы. Паездкі, банкеты. І вось у студзені (8 студзеня) 1974 года схапіла, пасля банкету — адзначалі 50 гадоў Георгія Шыловіча. Боль дзікі. Забралі ў бальніцу. Няпоўныя суткі — на ўколах, у кашмарным сне. На другі дзень раніцою прыходзіць у палату Мікалай Еўстафавіч Філіповіч, абвяшчае: «Аперыруем неадкладна». Запомнілася адна дзіўная дэталь: выходзіў з наркозу — з'яўляліся львы: сядзелі перада мной і сумна глядзелі.

З падрыхтоўкай пасля ўдалення желчного пузыря паднімаюцца на 4-5 дзень, мяне паднялі на 15-ты. Вінаваты банкет: страўнік, кішэчнік забіты ежай.

Месяц праляжаў у бальніцы. Паўгода сядзеў на дыеце — так патрабавала ўрач.

Ратаваў ад поснага жыцця той жа Філіповіч. Сустрэліся выпадкова. «Ну як?» — «Дык так, нічога, але што гэта за жыццё— ні выпіць, ні закусіць».

«Чаму не выпіць? Хто сказаў? Не баліць?» — «Не».— «Плюньце. І выпіць можна, у меру, канешне. І ешце ўсё».

І зноў пачалі мы з Андрэем дэгуставаць усе гатункі каньякоў. Выбар марачных каньякоў быў невялікі, але мы здабывалі. А які гэта цуд — армянскія марачныя каньякі! Недарэмна іх піў Чэрчыль. Ведаў смак стары гурман!

Спалохаў мяне не желчный пузырь — вока: у маі 1982 года я аслеп на левае вока. Тромб сасуда. Кажуць, каб урач адразу паставіла дыягназ, можна было б пазбегнуць такога глабальнага паражэння. Прамаргала К. К. Жукоўская. Толькі праз тры дні паставіла дыягназ Галіна іванаўна Кузняцова, пасля яна мяне колькі гадоў лячыла, і хоць лячэнне не дало ніякіх вынікаў, я ўдзячны ёй — за чуласць; я забываўся на сваю слепату, яна не забывалася: званіла, патрабавала з'яніцца на агляд. Тады ж у маі яна і Т. В. Бірыч адаслалі мяне у «крамлёўскую бальніцу» — у Кунцаўскую. Колькі ў гады перабудовы, што закончылася пшыкам, «дэмакраты» крычалі мра гэтую бальніцу. А па-мойму, бальніца як бальніца, такімі мавінны быць усе — па ўмовах. А па абсталяванню... пасля и быў у Фёдарава, тады ж, здзівіўся, што афтальмалагічнае аддзяленне «крамлёўкі» так бедна абсталявана. За 38 дзён мне зрабілі штук 200 уколаў — і ніякіх вынікаў воку, а самапдчуванне агульнае пагоршылася.

Маша, мая падзвіжніца Маша, прыязджала кожную суботу-нядзелю, я выпрасіў для яе пропуск, і яна праводзіла выхадныя дні са мной з раніцы да вечара. Маша з удзячнасцю ўспамінае Уладзіміра Елісеевіча Лабанка, гэта ён, намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета, пазваніў у пастнрэдства, каб ёй безадказна давалі гасцініцу і машыну ў Кунцава і на вакзал. А больш яна нікуды не ездзіла.

Звыкшыся са сваім становішчам аднавокага, вырваўся я і бальніцы з радасцю. Маша забрала мяне. Прама з вакзала — на дачу За сорак дзён як падрасла маленькая Славянка: пампушачка! Плакаў ад шчасця. Бяда і радасць — побач.

Праз тыдзень актыўна ўдзельнічаў у святкаванні 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы. У ясны летні дзень сядзелі на святочным мітынгу ў Вязынцы. Выступалі паэты, спевакі. А ўгары над трыбунамі, над стотысячным натоўпам кружыў иорталёт — кіношнікі здымалі для... гісторыі. (Ці засталося што з тых здымкаў?) Моцна глушыў верталёт словы. І раптам і цэнтра доўгага рада прэзідыума паднімаецца першы сакратар ЦК Кісялёў, падыходзіць да мяне і

голасна гаворыць: «Слухай, ты быў зенітчыкам... Збі яго». Жартаўнік Ціхан Якаўловіч! Не ведаў, не адчуваў чалавек, што праз месяц, на курорце, у Крыме, яму паставяць дыягназ: рак страўніка.

14 снежня

Студзень 1984 года — роўна дзесяць год пасля ўдалення мухіра. Урач сагітавала легчы ў бальніцу на абследаванне. Hör — з камфортам, у люкс: два пакоі на аднаго чалавека, іэлевізар, тэлефоны — агульны і ўрадавы, так што і народны місьменнік зрэдку карыстаўся прывілеямі, прызначанымі для иышэйшага эшалона ўлады.

Галоўнае абследаванне: зрабіць гастраскапію і каланаскшіію — японскі зонд з лямпачкай у страўнік і кішэчнік. Тры дні поўнага галадання. Паўдзесятка клізм і —вельмі непрыемная працэдура. Урач Антон Адамовіч лічыўся па гэтай часці лепшым спецыялістам. Выявіў у страўніку паліп — не зачапіў. Выявіў два ці тры паліпы ў кішэчніку — састрыг. Без болю.

«Во і ўвесь страх»,— пажартаваў Адамовіч. Не, страх быў наперадзе. Легка паабедаў. Легка павячэраў. Кашмарная ноч. Вельмі дрэннае адчуванне раніцою, ледзьве пагаліўся і памыўся. З'еў кашу — і разануў боль у жываце.

На мае шчасце, дзяжурыла (была субота) сама загадчыца аддзялення Ірына Аляксандраўна Аляшкевіч, вопытны ўрач, аўтарытэтны кіраўнік. Паглядзела мой жывот, памерала температуру і — угледзеў я — вельмі ўстрывожылася. Праз гадзіну да мяне пачалі заглядваць начальнікі Улашчык, Анішчанка, незнаемы прафесар Шот. У суботу — начальнікі? Няўжо з-за мяне? А рабілася ўсё горш і горш, з цяжкасцю стаў паднімацца на ложку, плылі сцены і людзі. Нарэшце з'явіўся, як заўсёды, вясёлы Мікалай Філіповіч. Я з надзеяй глядзеў на яго — верыў толькі яму. І ён без доўгіх абследаванняў: «Трэба аперыраваць. Неадкладна».

«А што здарылася?»

«Проста, па-жыцейску,— вам прадзіравілі кішку».

Калі ўрачы выйшлі, у мяне хапіла сілы пазваніць Машы. Праз якія 15 мінут яна была ў бальніцы, але мяне ўжо ўсыпілі і міма яе, ледзьве не самлелай, правезлі на качалцы ў аперацыйную.

Ільвы не з'яўляліся, калі выйшаў з-пад наркозу. Але як растлумачылі мне пасля Філіповіч і Чарнова, становішча маё ў першыя трычатыры дні пасля аперацыі было крытычнае.

«Баяліся мы за вас»,— сказаў Мікалай Яўстафавіч.

«Што — цяжэй, чым удаление жоўцевага?»

«Што вы! Не параўнаць. У вас развіўся перытаніт, агульнае заражэнне. Такіх медыцына нямногіх выратоўвае...»

«Значыцца, зірнуў туды?»

«Зірнуў».

Вось так. Пакланіцца трэба хірургу: двойчы ратаваў. Залатыя рукі ў Філіповіча.

Увогуле, да мяне была асаблівая ўвага — урачоў, сясцёр. Калі перавялі з рэанімацыі ў палату, зноў жа ў люкс, загадчыца аддзялення Чарнова Раіса Грыгор'еўна спачатку выдзеліла сястру, якая дзяжурыла тут жа, спала на суседнім ложку. А крыху пазней Раіса Грыгор'еўна дазволіла Машы начаваць са мной. Праўда, даведаўся я значна пазней, для такога дазволу была іншая прычына, акрамя майго стану. Незвычайная сітуацыя. Раманна-драматычная. Выйшаў першы нумар «Маладосці», у ім была надрукавана мая аповесць пра Андрэя — «Тайна драмы». Чыталіся ўсе мае творы вельмі хораша. Я пісаў, як чыталася «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні». Але ніводзін раман не чытаўся так, як гэта невялікая дакументальная аповесць. Чыталі нават тыя, хто, можа, за ўсё жыццё не прачытаў ніводнай беларускай кнігі.

Чыталі чыноўнікі. Чыталі ўрачы, сёстры, у бальніцы 4-га умраўлення, дзе я ляжаў, з асаблівай увагай: «гераіня» аповесці Любоў Іванаўна Макаёнак — іх урач. Тады, уражаны смерцю сябра, я адкрыта не выражаў непрыязнь да Любы, але яна вырывалася і ў перадачы яе характеру, адносін да Андрэя.

У гэты час, калі выйшаў часопіс, Люба судзілася з Андрэевымі дзяцьмі з-за маёмасці, з-за дачы перш за ўсё. У карысць дзяцей сведчылі Маша і Ядвіга Паўлаўна. А тут яшчэ і аповесць. Люба лічыла, што ўсё знарок падроблена супраць яе. Можна ўявіць, як яна ненавідзела мяне. Яна траціла прытомнасць, крычала тамжа, на рабоце, пасля судовых пасяджанняў. Канешне, уся сітуацыя супадзенняў магла сапраўды нервова патрэсці яе, і яна трапіла ў тую ж бальніцу ўжо не як урач, а як хворая.

Свайго ўрача пры пераходзе з аддзялення ў аддзяленне ніхто не затрымаў бы. Вось гэтага і баялася Чарнова. Мудрая і асцярожная жанчына.

21 снежня

Апошняя кропля ў маім рашэнні пайсці з БелСЭ. Учора гутарыў з Тутэвічам, ён даўно намерваўся пагутарыць са мной. Пачаў ён са «слязы», так яму, нябозе, шкада мяне. «Паслухаў я на нарадзе, як людзі, якія мала што зрабілі для нацыянальнай культуры — хто такі

Малашэвіч, Кісялёў, Дзясько? (гэта праўда!)... непаважліва адносяцца да вас, чалавека, якім павінен ганарыцца народ, і ганарыцца...»

Высокую ноту ўзяў старшыня камітэта. Сапраўды, да слёз мог давесці. Да слёз — не да слёз, але ціск, відаць, нагнаў — ударыла ў патыліцу, у паясніцу. Нервы... Даўно ж вырашылі з Машай: кідаю. І гэта ніколькі не хвалявала: я — рэаліст. Але ўсведамленне, што гэтага хоча і ён, сын мой па ўзросце,— дыпламатыя даволі празрыстая! — такое ўсведамленне чамусьці расхвалявала. Але потым і павесяліў ён мяне — калі пачалі абмяркоўваць кандидатуры на галоўнага, які заменіць мяне. Артадокс, партапаратчык учарашні раптам прапанаваў М. А. Ткачова — старшыню БСДГ, загадчыка рэдакцыі, якога мы перацягнулі з Гродна, і тады, два з палавінай гады назад, я атрымаў за гэта ад партыйнай вярхушкі па лысіне. (Галко кіпеў: «Мала вам сваіх нефармалаў!») Павесяліў Бутэвіч тым, што раскрыў матывы сваёй раптоўнай «любові» да Ткачова.

Кебіч спалохаўся апазіцыі і гатовы БНФ прапанаваць міністэрскія партфелі.

«Вы ж разумееце,— растлумачыў мой дарагі сябра Анатоль Іванавіч,— што прамысловасць і сельскую гаспадарку яны не возьмуць — не дурні. Патрабуюць тэлебачанне, друк, культуру, магчыма, адукацыю...» Лагічна.

Хіба БНФ, БСДГ партыі? Кучкі інтэлігентаў-самалюбцаў, палітыканаў. А вялікая партыя (600 тысяч у Беларуси) растала, як лёгкі дым, як тонкая пара. Дрэнь мы, а не камуністы! Да сябе траціш павагу. Але не трачу яе да Леніна — змагар! Нічога не баяўся. Наламаў дроў? Не ён. Акружэнне — опечатку Троцкі, які расстрэльваў славян, пасля Сталін і Берыя, якія знішчалі ўсіх, хто ім здаваўся ворагам, нават сваіх, грузін, нікога не шкадавалі.

Гнеў мой і нянавісць скіраваны супраць Гарбачова. Гляджу па тэлевізары, чытаю інтэрв'ю — хачу зразумець — і злараднічаю: «Пайграў, сукін сын? Пакрасаваўся? На каго спадзяваўся? На Буша? На Коля? Зад яны табе паказалі, ідыёт. Ім патрэбны новыя халуі».

Сачу за Ельцыным, як пяць — тры гады назад сачыў за Гарбачовым (таму, наіўны дурань, я тады верыў). А гэты на чым сарвецца? На лібералізацыі цэн? На Садружнасці, якая ад сепаратызму «напалеонаў» Краўчука і Назарбаева пачне развальвацца? Расія ёсць Расія. І калі Ельцын захоча ўтрымацца, ён скончыць дыктатурай — іншага выйсця няма. З Гарбачова і дыктатара не атрымалася. Між іншым, гэта адзінае, што яго апраўдвае: галоўнакамандуючы мог бы ўзняць армію. Не адважыўся — без каманды Буша. Ельцын можа

адважыцца, характар у яго авантурны і незалежны. Па-мойму, Буш і Коль баяцца яго і не адважваюцца гуляць, як з лялькай.

Але ніхто з іх не забывае пра сябе, кожны грабе пад сябе. Колькі нахапалі Міша і Раіса толькі за выданне кніг, якія самі не пісалі! А я напісаў 20 тамоў і памру, відаць, жабраком.

Бутэвіча я супакоіў: «А што табе баяцца? Паедзеш паслом. Колькі паслоў трэба будзе РБ!»

Падобна, яму падабалася гэтая перспектива. Задаволены праводзіў мяне ў прыёмную — як ганаровага госця.

А я ўсё ж «завёўся»: да дзвюх гадзін не мог заснуць. Божа мой! Які калейдаскоп думак у бяссонную ноч? Плачу па сыне. І ні разу не сасніў. І Маша не бачыла яго ў сне. Дзіўна — чаму? Каго толькі не сніш — Леніна, Сталіна, бацькоў, чужых выпадковых людзей, жывых і мёртвых!.. Чаму ж не з'яўляешся ты, сыне наш?

22 снежня

Учора ў Алма-Аце ўжо адзінаццаць незалежных (ад каго? ад чаго?) дзяржаў падпісалі Белавежскае пагадненне. Садружнасць я вітаю. Але калі зацяты хахол Краўчук з пенай заяўляе, што грамадзянства Садружнасці не можа быць, толькі грамадзянства Украіны,— сумна. Былі мы грамадзянамі СССР — вялікай сусветнай дзяржавы, а сталі... Ну, Расія, Украіна — яшчэ нічога. А мы? Армяне? Туркмены? Станем мы ад гэтага шчаслівейшымі? Расія будзе трымаць палец на атамнай кнопцы і зойме месца ў Савеце Бяспекі. Расшырыліся правы незалежных? Лапухі. Галодная Расія пакажа незалежным кулак і патрабуе хлеба, бульбы, мяса, цукру, бавоўны. Ельцын патрабуе —яму трэба ўтрымацца, інакш галодны народ змяце яго.

Ганарова сыходзіць Гарбачоў. Я не крыважэрны, але выспятка пад зад даць яму хочацца. Да чаго давёў краіну! Толькі што Алеся і Сяргей вярнуліся з Камароўскага рынку. Кілаграм ізюму 100 руб., арэхі — 70, пляцёначка часнаку—дзесяць маленькіх галовак — 20. На 200 руб.— маленькая торбачка, тое, што яшчэ два гады назад каштавала дзесятку.

Учора гуляў — сустрэў Брыля. Разам пагулялі, пагутарылі шчыра, па-сяброўску. Ён толькі што атрымаў пісьмо з Варшавы ад Бартэльскага, гэтага пісьменніка я даўно і добра ведаю, сустракаўся ў нас, у Маскве, у Варшаве. Бартэльскі скардзіцца: вельмі дрэнна жыве. «Што з таго, што ўсё ёсць, а купіць я нічога не магу». Бартэльскі — намеснік старшыні Саюза польскіх пісьменнікаў. У сацыялістычнай Польшчы — фігура і забяспечаны чалавек. Вось так прыходзіць жаданы капіталізм. Для каго жаданы? Усеагульнае зацямненне мазгоў. І народ

маўчыць. Дзіўна маўчыць, нават забастовак няма. Стаіўся, ці што? Страшна, калі народ безмолвствует.

24 снежня

Апублікавана Пастанова ВС аб зацвярджэнні эталона дзяржаўнага герба. І герб...

Серп і молат з калоссямі — гэта дрэнна. Коннік з мячом і шчытом—ох як добра, як разумна, як гуманна! Які палёт фантазіі!

Нацыяналізм — найстрашнейшая ідэалагічная зашоранасць, горш камуністычнай.

Выступіў па нашым тэлебачанні Жырыноўскі. Пры выбарах прэзідэнта я не прымаў яго сур'ёзна. Памыляўся. І вельмі. У сённяшняй сітуацыі просты люд падтрымае лідэра ЛДП: праўда! Не фашыст, канешне, але прыёмы знаёмыя.

Але дзіўна адрэагавалі дэмакраты нашы — апазіцыя БНФ у ВС. Патрабавалі на сесіі зняць з пасады старшыню Камітэта па тэлебачанні А. Сталярова — за выступленне Жырыноўскага. Вось і ўвесь плюралізм! Спачатку — заткнулі рот камуністам, потым — усім іншым. Дэмакратызм у натуральным выглядзе! Лагічная эвалюцыя.

29 снежня

Гаротная маці: учора Машы цэлы дзень плакалася, любая дробязь нагадвала сына — цацкі на ёлку, сама ёлачка. Сёння паехалі на магілу Сашы. Наплакаліся. Намерзліся. Маша далонямі засланяла свечку ад ветру — ажно пакуль уся не згарэла. Елачкі многія нясуць — і гэта кранае. Здаецца, пасля наведвання магілы, размовы з сынам, Машы робіцца трошачкі лягчэй. Паехалі на дачу — і яна займалася там прозай: як бы падабраць усё каштоўнае, каб не ўкралі. Дачы рабуюць бессаромна. Нават электралямпачкі выкручваюць — дэфіцыт.

Няма эмоцый прыемных, усе — балючыя. Усё абурае, раніць. Прачытаў інструкцыю пра купоны. Дзікунства. Изощренный здзек з народа. Толькі ворагі маглі прыдумаць такі здзек. Загружаюцца бухгалтэрыі, банкі, магазіны. А народ ператвораны ў заложніка, у раба бюракратычнай сістэмы, горшай за сталінскую.

З сыходу Гарбачова зараднічаў і абураўся: туды табе і дарога, рэфарматар, але за што такія даброты? Са слоў Ельцына — во хто зараднічае! — выходзіць, што Міхасёк прасіў 200 чалавек аховы. Во персона! Каму ён трэба?

Спуск сцяга СССР глыбока параніў душу. Божа мой! Такую дзяржаву развалілі! Тысячу гадоў сабіралі. Чытаю «Фаворита». Як немка Кацярына сабірала землі імперыі! Усе сабіралі. Хто ж развaліў?

Не адзін Гарбачоў. Кінуты былі ўсе сіла антыкамуністычныя. Дурня Гарбачова выкарысталі. Сыходзячы, як прастытутка, пазіраваў перад камерамі амерыканскага тэлебачання. Брыдка. Так яму хочацца ў гісторыю ўвайсці. Не ўвойдзеш — уліпнеш.

Выць хацелася, калі шаўкі тыпу Гурнова глумяцца над Дзяржавай, над Сцягам і Гербам. Сцяг папрасілі камуністы — на захаванне. Дажыць бы, калі ён запалошчацца над Крамлём, над Домам урада — чырвоны, з сярпом і молатам — сімваламі міру і дабрабыту.

31 снежня

Час траціць сваё значэнне. Раней Новы год — падзея, свята. Мяжа... ад лепшага да яшчэ лепшага. Што гэты Новы год? Падзея? Горка назваць так. Гора сям'і нашай. Гора народа. Развал дзяржавы. Распад усіх структур. Перадае «Маяк» — як знікаюць саюзныя структуры: пазванілі ў Міністэрства аховы здароўя — ніхто не адказвае, няма міністэрства. Добра — нічаць падхалімы Ельцына. Ідыёты! Гэта ж жах, што ў адзін дзень знікае Міністэрства аховы здароўя. Катастрофа. Такое міністэрства ў нашых умовах павінна рэарганізоўвацца год, калі не тры гады. Не знаю, пра што ўчора гаварылі ў нас на Вайсковым адзінаццаць князёў, але пра гэта — пра ахову здароўя, як і пра абарону,— павінны былі гаварыць. Не дайшлі. Не дапялі.Не ўзняліся. Якая дробязь — ахова здароўя. Хто пра яе калі думаў у дзяржаве Расійскай? Кацярына? Пра саноўнікаў — не пра сялян. Мікалай Другі, якога імкнуцца кананізаваць,— велікамучанік?! Класікі літаратуры, публіцыстыкі ў дарэвалюцыйны час напісалі, як цар-бацюхна «клапаціўся» пра народ. Мае рацыю А. Дракахруст, які ў «ЛіМе» апублікаваў вельмі правільны артыкул пра «заслугі» Мікалашкі. Між іншым, народ яшчэ тады так і называў яго — Мікалашка. Павага? Наўраді Хутчэй наадварот.

А адзінаццаць — князі, без двукосся. Дзяржава адкінута гадоў на 500 назад. Удзельныя княствы. Дык тады імі хоць не камандавалі з-за акіяна, як сёння: усе паўзуць, як у Каносу, на паклон да «папы» — Буша. Божа мой, які сорам! Спаборнічаюць проста — Ельцын, Краўчук, Назарбаеў... Хоць бы ў каго праявіўся нацыянальны гонар!

Дагэтуль аб учарашняй сустрэчы — ніякай інфармацыі, акрамя паведамлення, што сустрэча была цяжкай. Уяўляю труднасці пры амбіцыях Ельцына і Краўчука. Каса на камень. І абодва з вярхушкі партапарата, з той вярхушкі, якой мы, дурНі, пакланяліся. Не кляну вас, не предаю анафеме — чакаю. Чакаем. Чаго?

У горадзе разабралі хлеб, сёння Маша стаяла паўтары гадзіны за буханкай хлеба. За два кілаграмы мяса і кілбасы заплацілі 280 руб.

Жах! Як жыць простаму чалавеку? А народ безмолвствует. Ці надоўга гэтае маўчанне? І за якія ідэалы ён выступіць? За што ліецца кроў у Тбілісі? Амбіцыі прэтэндэнтаў на ўладу. Сумны вывад: ніякая культура, ніякая асвета, ніякія вялікія ідэі гуманізму не робяць людзей лепшымі. Мы ўсё ж тыя дзікуны, што і 1000-500 гадоў назад. Сумна. З чым я ўваходжу ў 1922-гі? З пустой душой, з пустой галавой, з жалобай і безнадзейнасцю. Дай, бог, сілы перажыць гэты стан і нешта зрабіць яшчэ. Можа, не ўсё будзе забыта. Можа...

2 студзеня 1992 года

Вось і Новы год. Што ён прынясе народу? Пачаўся шалёным скачком цэн. Крычым пра незалежнасць... Якая незалежнасць! Ельцын чыхне — у нас галава баліць, тэмпература падскоквае, У Маскве злавілі «путчыстаў» — у нас тут жа пачалі вышукваць ведзьмаў — сваіх путчыстаў, ледзьве мяне не залічылі ў іх лік — член бюро ЦК быў!

Ельцын «адпусціў» цэны (куды апусціў? каму на карысць?) — нашы мусілі ламаць галовы, як бы пры свабодных цэнах хоць трошкі абараніць няшчасны народ, які пакаштаваў свабоды. Дзіўна прыціхлі ўсе, нават бэнээфаўцы. Чым «крыць», што славіць, што адмаўляць (няма КПСС), што сцвярджаць, за што змагацца? За свабоду для новых капіталістаў? А як расцягваюць народную маёмасць! Жах! Грабяць усе, хто можа. Учора гуляў з В. Н. Гурыным. І ён сказаў: наш спрытны прэм'ер — член трох замежных асацыяцый, якія запускаюць свае драпежныя кіпцюры ў нашу зямлю. Знаюць, каго прынімаць. Апе ў любой дэмакратычнай дзяржаве гэта — скандал і неадкладная адстаўка. Нашы дэмакраты маўчаць.

Яшчэ адзін «змагар» за народ — прэзідэнт АН Платонаў. Чатыры месяцы чытаў лекцыі ў ЗША, зарабляў долары і пляваў на Акадэмію. Пакінуў там, за акіянам, дачку ў каледжы. Вярнуўся — і кіруе, разносіць людзей, якія працай сваёй не далі развалiцца Акадэміі. Бессаромны нахабнік! Прэтэндуе, каб выбрацца на новы тэрмін, маючы кантракт з амерыканцамі.

Гурын расказаў: на прэзідыуме шчырыя беларусы — Гарэцкі, Ліштван — урэзалі прэтэндэнту. Малайцы! Кебічы і платонавы лізалі парогі ЦК, каб прабіцца ў кіраўнікі. Цяпер ліжуцца з тымі, каго матэрыяльна і маральна падтрымлівае ЦРУ і масад,— з будучымі гаспадарамі, з якіх ствараюць «трэці клас». Няўжо народ дасць умацавацца гэтаму класу хапуг, бандытаў, мафіёзі?

Пазваніў І. Я. Палякову. Ён бадзёры.

«Нічога, Ваня, жыву весела. Маю 400 руб. пенсіі. Стаю ў чэргах».

Праслаўлены партызан, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета — прэзідэнт сапраўдны, якога народ любіў. Яго выгналі з дачы. Цікава, хто заняў яго дачу? Сняжкова Ніна Лявонаўна (пазваніў і ёй, маёй зямлячцы) расказала, што 88гадовага Івана Фролавіча Клімава выселілі з дачы ў Сляпянцы за адзін тыдзень да яго смерці. Цяпер дачы гэтыя здаюць у крэдыт замежным бізнесменам — за смехатворную цану, але ж за тое — валюта! Хутка ўсё прадамо.

Новы год — упершыню сустракалі ўчацвярох — Маша, Алеся, я, Сяргей. Маша выпіла кроплю віна да наступлення года, за светлую памяць Сашы І... пайшла ў спальню. Плакала, канешне. Мы ўсё ж выпілі шампанскае. Я і гарэлкі глымуў. Жыве надзея, што будзе ён лепшы, год 1992.

Учора на абед прыехала Таццяна з дзецьмі і мужам. Вячаслаў прыехаў ужо цёпленькі. Безадказны бацька. З дзяўчаткамі весялей, і было крыўдна, што яны не засталіся ў нас— Славяна закапрызнічала. Але сёння яны прыехалі — глядзець фільм пра Ісуса: Сяргей дастаў у некага відыёкасету. Фільм —на шэсць гадзін. Што ж, гэта цікава, такога мы не бачылі.

Вось так пачаў Новы год. Будзь літасцівы, год Малпы, год высакосны!

3 студзеня

Вадзім Кожынаў апублікаваў у «Правде» разумны артыкул «Куда движется человечество». У сацыялізм. Ён больш грунтоўна і падрыхтавана, з фактамі і лічбамі, даказвае тое, што апошні час сцвярджаў я. На жаль, дылетанцкі, без належных эканамічных ведаў. З Кожынавым можна спрачацца аб сутнасці Рэвалюцыі і Рэстаўрацыі — контррэвалюцыі. Але нельга не згадзіцца а яго ацэнкай аграпрамысловай палітыкі развітых краін. Яны рабілі тое ж, што мы, камуністы, але намнога разумней і вынік: у нас — голад, а ў іх перавытворчасць прадуктаў, праблема збыту. З тым, што навука, культура, адукацыя выведзены ўсімі развітымі краінамі з рыначных адносін, з гэтым, піша Кожынаў, згадзіліся Шаталін і Яўлінскі. Але патрабуючы рыначных адносін у сельскай гаспадарцы, яны вядуць да поўнага развалу яе, да голаду.

Кожынаў цытуе з сур'ёзнай працы:

«Нынешние проблемы сельского хозяйства являются следствием политики, проводимой всеми промышленными странами Запада с 50-х годов. Правительства разных стран использовали один и тот же прием: они исключили рыночный сектор из рыночной экономики...» Вось так. А нашы адгіускаюць цэны на малако і мяса. Каму трэба

галодны «бунт», «бессмысленный и беспощадный»? Чытаюць хоць Гайдары, бурбулісы, кебічы такія артикулы? Баюся, што не. Ды яшчэ ў «Правде». Адхрышчваюцца ад яе былыя прававерныя сацыялісты. Іх цягне назад — у капіталізм. Пух на рылах. Не выйдзе, панове! Нават разумныя антыкамуністы прыходзяць да высновы: чалавецтва ідзе да сацыялізму. Зіноўеў, Лімонаў, Максімаў... Дапяў і Кожынаў... А былыя ідэолагі КПСС набралі вады ў рот. Дзе вы, тэарэтыкі?

5 студзеня

Цэны — вочы на лоб лезуць. Каго бог хоча пакараць, таго пазбаўляе розуму. Нашых «мудрацоў». Па-мойму, яны лезуць у пятлю. Новы путч не будзе падобны на жнівеньскую аперэту з трыма «героямі Савецкага Саюза». Будзе Тбілісі, калі не горш. Аднаго не магу зразумець. Нашы дэмакраты (у двукоссі) — мудрацы (таксама ў двукоссі). Але кансультанты ў іх з-за бугра — мудрацы без двукосся. Яны завошта караюць народ? Ім навошта поўны развал? Што ім трэба ад нас? Мы і так ужо — іх калонія, эканамічная і духоўная. Здзіўляе прэса, калегі мае журналісты. Рыжкоў падняў цэны на капейкі — якое выццё ўзнялося! Пасля красавіцкага павышэння ў два разы Паўлава заплявалі. А тут жахлівы скачок — і «мудрыя» разважанні, толькі «Правда» дала злыя пісьмы чытачоў. Во шэльмы — газетчыкі, самі ж, ідыёты, галадаюць. Свабодныя цэны могуць быць пры свабоднай канкурэнцыі. А калі дзяржаўныя манапалісты ўстанаўліваюць цэны, якія ўлезуць у галаву дурням... Білет на аўтобус да Докшыц — 25 руб. А гэта — сто кіламетраў. З'ездзіў. студэнт да маці па бульбу — выкладай 50 руб. Дарагая бульба будзе, танней на Камароўцы купіць. Але ж маці трэба пабачыць...

Дзіўна маўчыць народ. Не адышоў ад шоку? Не апрытомнеў?

Зрабілі сабе ажно пяць выхадных (рабілі ў мінулую пераднавагоднюю суботу і нядзелю) — і я ўжо не знаю, чым заняцца. Страшна застацца без пасады. Але трэба ісці. Чым заняцца? Улезці ў раман? Але ж палітыкі ў ім будзе больш, чым у любым папярэднім. А пісаць любоўную гісторыю ў час такога распаду, разлажэння — сорамна. Нырнуць у глыбокую гісторыю? Не дазволяць вочы.

Чытаю «Фаворита» Пікуля. Чарнавік. Але чытаецца. І не можа не захапіць веданне аўтарам гісторыі. Тытанічная праца! Нечалавечая.

8 студзеня

Мітрапаліт Філарэт запрасіў на каляднае богаслужэнне і на святочны прыём. На богаслужэнне мы з І. С. Кірычэнкам не пайшлі: ён пасля аперацыі, а я таксама пабаяўся, што цяжка будзе стаяць. А

на прыём у восем вечара пайшлі. Нядобра. Акадэмік Саўчанка жартаваў: хто не быў на богаслужэнні, таму выпіць не дадуць. ВС і Саўмін прадстаўлялі намеснікі — Шаладонаў Васіль і Дзямчук Міхал. Асноўная маса запрошаных — кіраўнікі грамадскіх арганізацый, два ці тры міністры. Стол багаты — для сённяшняга дня: заліўная сяўруга, парася, вяндліна і многія прысмакі. Выпіўка, праўда, аднастайная: гарэлка, белавежская, віна — ніякага. А-ля фуршэт. Салодкі стол — у суседнім пакоі з пірожнымі, тартамі.

Філарэт і памочнікі яго былі занадта вясёлыя. Радаваліся. Чаму? Свяцу? Што адслужылі літургію хораша? А, увогуле, ім ёсць чаму радавацца. Хто адраджаецца — дык гэта рэлігія. Усе. Праваслаўе асабліва.

На прыёме гаварыў са старшынёй абласнога Савета А. І. Цішкевічам аб цэнах, абураўся, што да прыгарада Мінска — Барысава білет на аўтобус —17 руб. Пры нашых зарплатах! Здзівіўся, што кіраўнік пачаў даказваць заканамернасць гэтага: падаражаў бензін, запчасткі, выраслa зарплата. А хто давёў да гэтага? Кіраўнічкі!..

Няма добрага сшытка— для дзённіка. Я иеэканомна выкарыстоўваў іх: пісаў на адной старонцы. Раманы я пісаў на выдатнай паперы — на фінскай, чарнілами. Дзе ўзяць такую? Пра раман я думаю. Але не гатовы яшчэ. Чакаю. Чаго? Мне здаецца, будзе паварот. Няхай бы—паварот, а не пераварот. Бяскроўна можаш варочацца і налева і направа, абы народу было лепш.

18 студзеня

А дні... ляцяць... Учора глядзеў усеармейскі сход. Шэсць тысяч афіцэраў зрабілі ўражанне. Сіла! Куды яе скіруюць? Я не ўсё слухаў — з 12 да 14 і закрыццё. Не чуў Ельцына, а газеты са справаздачай будуць хіба ў панядзелак. Выступленне Шапашнікава спадабалася. Але калі ён пачаў па-бабску выбягаць з залы, калі хтось патрабаваў яго адстаўкі,— плявацца хацелася. Каму ён служыць? Ельцыну?

«Правда» ўчора выйшла з шапкай: «Прости, армия, наших президентов». А прощения ім няма! «Дэмакратам», якія наладзілі траўлю арміі, глумление над ёй і нават над памяццю тых, хто аддаў жыццё за Айчыну. Нельга дараваць Ельцыну і Краўчуку. Партыйныя лідэры, кіраўнікі вышэйшага рангу! Kani ж вы былі шчырымі?!

Маша з'ездзіла на магілу Сашы. Заехала да ўдавы, узяла Сашына паліто, шапку. І сынаў дух так расхваляваў яе, што, вярнуўшыся, яна рыдала. Я — разам з ёй. І Вольга Філатаўна. Ад дзяцей і ўнукаў хаваліся.

Знайшоў даўні запіс.

Клод Элебер, французский журналист:

«По мере того как наука и техника входит через широко открытые двери в наши дома, мораль, основанная на наших привычных духовных ценностях, вылетает в окно».

«Наши старые компасы пришли в негодность, а новых у нас нет».

«Мы пытаемся узнавать, который час, глядя на циферблат без стрелок».

Не помню дакладна, але думаю, што гэта запісы 1985 года. Гэты «служебный дневник» на 1985 год мне падараваў Міхал Іванавіч Дзялец — помню добра.

А гэта ёмка сказана: «Наши старые компасы пришли в негодность, а новых у нас нет».

Раскідаў я падобныя запісы па блакнотах, якія не знайсці, не сабраць.

24 студзеня

Па «Маяку» — карэспандэнт з Пакістана: 80-гадовы сенатар на ўласным юбілеі ў сваім доме выказаўся за аддзяленне яго роднай правінцыі (не ўлавіў — якой?) ад Пакістана. Толькі ўзрост сенатара ратаваў яго ад турмы за такую сепаратысцкую заяву — паведамляе карэспандэнт. Вось так захоўваецца цэльнасць дзяржавы! А наш мечаны разам з «дэмакратамі» разваліў такую Дзяржаву. Рыдаць хочацца. І шаленства працягваецца. Калі ўрад Ельцына, а за ім і ўсе іншыя ўрады не спыняць рост цэн, не возьмуць пад кантроль,— яны, цэны, з'ядуць гэтыя ўрады. Ідзе дзікі разбой, анархія, здзек над народам. Плата за музыкальную школу была 12 руб. у месяц, цяпер — 165. Нават Таццяна задумалася: прадаўжаць навучанне Славяны ці не? Дзеці рабочых, безумоўна, адсыпяцца. Хто будзе вучыцца? Новая буржуазія? Мала ў яе яшчэ дзяцей. Застануцца беспрацоўнымі выкладчыкі.

Жывуць людзі, як зайцы пад мокрым кустом: уздрыгваем ад кожнай кроплі, якая падае. Маша настойвае, каб я ішоў з БелСЭ, а я баюся — з-за зарплаты, з-за купонаў, з-за адзіноцтва. Дрыжу. А працаўнік я дрэнны, ды і працаваць стала складана. Людзьмі нельга ўпраўляць, яны лічуць, што дэмакратыя гэта ўседазволенасць. Дзівакіі Якая дэмакратыя? Эканамічная залежнасць зрабіла нас прыгоннымі. І псіхалогія павінна быць крепостных новай буржуазіі, мафіі. А некаторыя іграюць у дэмакратыю. Доктар Ткачоў — з «Пагоняй» у руках: артыкул аб Пагоні надрукаваў у многіх выданнях. Няма хлеба і мяса — ешце сімвалы. Так, ці што? А шаферу нашаму Арлоўскаму проста лень працаваць, і ён філасофствуе аб рыначнай эканоміцы.

Дзесяць гадоў вазіў мяне і, здавалася, быў нармальным чалавекам. А цяпер, калі мы з-за цаны (100 тысяч у год карыстанне машынай з гаража СМ) скарацілі адну машыну і яму трэба ездзіць больш — па вытворчых патрэбах,—узбунтаваўся, учора да абеду не прыехаў у выдавецтва. Намеснікі лічылі, што я езджу, а я нікуды не ездзіў. Пачалі высвятляць: дзе быў, што рабіў? Машына каштуе 400 руб. у дзень, дык ён яшчэ і нахаміў нам. Здзекліва кінуў: «Вы самі стварылі такую сістэму».

Сістэма — дрэнь, але і такая развальваецца: сістэма, эканоміка, ідэалогія.

Уначы прачынаюся і не магу заснуць па 2-3 гадзіны. О, якая гэта пакута — начныя думкі, мае, сённяшнія! Раней у такую бяссонніцу я канструяваў сюжэты, ляпіў вобразы. Цяпер думаю пра Сашу, пра дзяцей і ўнукаў, якім трэба жыць (як яны будуць жыць?) і... пра ўласную смерць. А гэта жахліва — думаць пра смерць... без веры ў бяссмерце душы. Без веры ў тое, што зроблена табой за доўгае жыццё. Доўгае? Яно праляцела, што іскра. Не згасла яшчэ, Падаруе бог ці лес яшчэ колькі гадоў жыцця — напішу раман. Пра распад. Можа, варта хутчэй узяцца за яго? Чаму цягну? Суцяшэнне — у працы.

25 студзеня

Ездзілі на Магілу. Цяпер для нас гэтая Магіла з вялікай літары. Маша, я, дзве Таццяны, Вячаслаў. Стаялі гадзіну — пакуль не згарэла свечка. Дзень дзівосны: сонца, іней. Харство. І ад гэтага асабліва балюча. Сыне наш! Чаму б табе не радавацца жыццю? Плакалі і гаварылі. Удава (пры мне ўпершыню) расказвала, што апошнія паўгода Саша часта гаварыў, што хутка памрэ. І баяўся ночы, прасіў: «Ты слухай мяне». Не, не пачула жонка. Маці магла б пачуць. Не спалася яму, і ён глытаў снатворнае. І ніхто з нас — ні я, ні Маша, ні ўрачы, якія выпісвалі гэтае чортава зелле, не папярэдзілі, што, выпіваючы, ні ў якім разе нельга прынімаць таблеткі. Толькі, калі здарылася бяда, я ўспомніў даўняе папярэджанне старога доктара Нейфаха.

А ў Сашы была бяссонніца — у 40 гадоў. Па-мойму, да яго пахамску адносілася яўрэйская група БелГПЗа, а яны ж — начальнікі. А ён быў чалавек чуллівы, уражлівы. Глядзеў фільмы і плакаў. Так плачу я. Плача Славяна. А сястра яе Маша не плача.

Пра характары дзяцей сваіх, унукаў варта было б напісаць. У кожнага свой характар, і ва ўсіх — складаныя.

У Таццяны — нявесткі — яўна неспакойна на душы, яна паблекла, схуднела. Яе мучае сумленне. За што? Прыйшла і не паглядзела, што муж ужо мёртвы — глядзела тэлевізар. Але, ад гэтага могуць быць

пакуты сумлення. Ды і радасці давала Сашу мала — ні дзяцей, ні добрай увагі: гойсала то ў Вільнюс да сястры, то ў Лоеў, то ў Варшаву. А ён, нябога, мог і раўнаваць, ад гэтага і лішнюю чарку браў. Ля магілы разважалі: лёс. Асабліва верыць у судьбу, у запраграмаванасць, предопределение наша Таццяна, якая выпісвае 40 выданняў і ўсё чытае. Я чытаю зараз В. Рэнана «Жизнь Иисуса». Мне здаецца, што сур'ёзная кніга. «Чытала?» — спытаў у Таццяны. Чытала. Усё чытала. Здзівілася, што я, грэшны, толькі цяпер чытаю, сказала: «Скандальная кніга». Не прынімае доказ Рэнана, што Ісус рэальны чалавек, «рэлігійны анархіст».

Выходзіць, верыць, што Ён — сын Бога? Так паварочваецца светапогляд адукаванай жанчыны, кандидата навук. І — дзіўна, што такіх многа. Што гэта — пошук ісціны? А дзе мне шукаць ісціну?

Прыйшоў да мяне Г. А. Маслыка, загадчык рэдакцыі БелЭН, і паказаў партийны білет: зарэгістраваў сваё членства ў партыі камуністаў Беларусі. Рэгіструюць на прыватнай кватэры, ледзьве не ў падполлі. І мяне шкрабанула па сэрцы. Маслыка, пракурор, між іншым, сурова пакараны за «віцебскую справу» — запісалі суровую вымову, выгналі з рэспубліканскай пракуратуры, хоць «справу» гэтую ён не вёў, але павінен быў кантраляваць, застаўся камуністам і па сутнасці і па форме. Я — 50 гадоў у партыі, верыў у яе і веру, што камуністычныя ідэі, адноўленыя, ачышчаныя ад бруду, перамогуць, іншага компаса ў грамадства нашага, якое ўсё ж пазнала перавагі сацыялізму пры ўсіх перакосах яго, няма і не будзе,— я не адважыўся пайсці на перарэгістрацыю на гэтую прыватную кватэру. Чаму? Боязь? Старэчая інертнасць? Хутчэй — другое. Калі думаеш пра смерць,— губляеш сэнс жыцця; траціш характар змагара. Пражыць бы сённяшні дзень! Але ж трэба думаць не пра сябе. Думай пра дзяцей, таварыш камуніст! Думай пра людзей!

26 студзеня

З іх Катэхізіса:

«Больше шума и словесной мишуры, больше непонятного и наукообразного, создавайте теории, гипотезы, направления, школы, методы, реальные и нереальные. Пусть не смущает вас, что о них завтра забудут. Придет новый день, придут новые идеи. В этом выражается могущество нашего духа, в этом наше самоутверждение, в этом наше превосходство. Пусть русские ломают головы в поисках рациональных зерен в наших идеях, пусть ищут и находят то, чего там нет. Завтра мы дадим новую пищу их примитивным мозгам».

Вось так. Хіба не так дзейнічаюць якаўлевы, сабчакі, паповы? Цытату гэтую прыводзіць А. Кузьміч. Пасля апублікавання гэтага і іншых артыкулаў А. Кузьміч (Цыкуноў А. К.) загінуў пры нявысветленых абставінах. І такімі метадамі не грэбуюць «дэмакраты».

29 студзеня

Арон Сімановіч дапісаўся да вялікай шчырасці. Во што напісаў:

«Лейба Давидавич Троцкий, который стремился к развалу величайшей в мире державы — России, по этому поводу говорил:

— Мы должны превратить ее в пустыню, населенную белыми неграми, которым мы дадим такую тиранию, какая не снилась никогда самым страшным деспотам Востока. Разница лишь в том, что тирания эта будет не справа, а слева и не белая, а красная, ибо мы прольем такие потоки крови, перед которыми содрогнутся и побледнеют все человеческие потери капиталистических войн. Крупнейшие банкиры из-за океана будут работать в теснейшем контакте с нами. Если мы выиграем революцию, раздавим Россию, то на погребальных обломках ее укрепим власть сионизма и станем такой силой, перед которой весь мир опустится на колени. Мы покажем, что такое настоящая власть. Путем террора, кровавых бань мы доведем русскую интеллигенцию до полного отупения, до идиотизма, до животного состояния. А пока наши юноши в кожаных куртках — сыновья часовых дел мастеров из Одессы и Орши, Гомеля и Винницы,— о, как великолепно, как восхитительно умеют они ненавидеть всё русское! С каким наслаждением они физически уничтожают русскую интеллигенцию— офицеров, инженеров, учителей, священников, генералов, агрономов, академиков, писателей!..»

Не трэба цяпер знішчаць нас рукамі «своих юношей», залішне відавочна будзе. Ды і навошта падстаўляць сваіх, калі можна зрабіць гэта рукамі, крывёю «наших юношей» — нацкаваць украінцаў на рускіх ці наадварот. Рэпетыцыя прароблена — у Югаславіі. О, божа! Якая гэта будзе трагедыя, калі ІМ удасца сутыкнуць Расію і Украіну! Куды нам, няшчасным беларусам, дзявацца? Колькі разоў у гісторыі мы апыналіся ў цэнтры сусветнай калатнечы — ад міжусобіц князей да нашэсця Гітлера. Нас ужо ўцягваюць у новую калатнечу: здаецца, сур'ёзныя людзі, беларусы, вучоныя, выступілі публічна :і лрэтэнзіяй на Віленскі край. Апомніцеся, людзі добрыя! Падумайце, каму гэта патрэбна?

З такімі думкамі не спіш начамі. Ды і навокал — у БелСЭ, дома — ствараюць эмацыянальныя перагрузкі. Куды дзявацца? Дзе схавацца? Нямнога ж засталося жыцця. Разумею Юлію Друніну — не

вытрымала мужная франтавічка, задушыла сябе газам. А мне хочацца пажыць. Але схавацца ў скіт не магу. Учора горача выступіў на радзе СП аб гібелі беларускай літаратуры. А яна гіне. Адраджаць яе будзе значна цяжэй, чым пасля «камуністычнага прычэсвання». Парадокс: пры камуністах яна квітнела. І не так ужо нас прыціскалі. Хто прыціснуў таго ж Быкава? Лаўрэацкімі медалямі зациснулі, ці што?

Але ці галоўнае цяпер літаратура? Штс будзе з народам? Як нахабна яго рабуюць. Сталін так не рабіў. І... народ безмолвствует.

30 студзеня

Дзень нараджэння — 71 год. Мой дзень нараджэння заўсёды быў добрым сямейным святам. А 50, 60, 70 — падзеяй рэспубліканскага значэння, грамадскай: артыкулы, тэлеперадачы, пісьмы, тэлеграмы. Яшчэ год назад з 70-годдзем мяне нечакана шырока віншавалі. З'явіліся сакратар ЦК, сакратары гаркома, старшыня гарвыканкома, міністры. І быў стол — у БелСЭ. І быў каньяк. Ажно не верыцца, што год назад быў яшчэ каньяк і яго пілі людзі добрыя, госці мае. І 250 рублёў прэміі ад камітэта былі яшчэ сумай — 25 пляшак гарэлкі. А што сёння? Боль ад страты сына. Маша падышла хвіліну назад, расплакалася перад Сашыным партрэтам: «Сашанька, усе прыйдуць, а цябе не будзе».— «Калі ласка, не заводзься, расстроішся сама, расстроіш мяне».

Прачнуўся ў шэсць і больш не заснуў. Алеся і Сяргей пажартавалі: «Гэта табе не спіцца, бо падарункаў чакаеш. Як Славяна». Год ці два назад малая Славяна, соня, у дзень свайго нараджэння прачнулася гадзін у пяць і не заснула.

«Пра што ты думаеш, Славяначка»? — спытала бабуля, якая спала з ёй.

«А хто што падорыць».

Удзень, за сталом, гэта ўсіх весяліла.

Год назад і ў мяне яшчэ была весялосць.

Пазваніў Сцяпан Лаўшук, павіншаваў. Я адказаў: «У 71 трэба не віншаваць, а спачуванне выказваць». І гэта не жарт. Павіншаваў Алесь Шлег. Удава Карпава — Марыя Міхайлаўна прынесла кветкі і кніжку ўспамінаў пра У. Карпава, дзе і мой артыкул. І ўжо стала весялей. А потым прыехалі дзеці. Радасна, калі дзеці. Балюча, што Саша не парадаваўся сыну ці дачурцы. Страшна за Алесю.

8 лютага

Пакутлівая бяссонніца. Выпіўшы пасля працы чарку, засынаю перад тэлевізарам. Кладуся — засынаю не адразу, але засынаю. А пасля прачынаюся гадзіны праз тры, і пачынаецца на тры-чатыры

гадзіны пакутлівая разгарачаная работа мозгу. Што толькі не пракручваеш! З кім толькі не ваюеш. Пачынаеш з якога-небудзь Малашэвіча ці Салановіча і канчаеш Ельцыным, Бушам. Пустая трата разумовай энергіі. Але адкараскацца не можаш. Гэта ўжо, па-мойму, хвароба, і няпёгкая. Ці апісана яна псіхіятрамі?

Пяць месяцаў мадэліраваў размову з нявесткай аб машыне, якую я падарыў Сашу. Баяўся, што яна будзе прэтэндаваць. Адцягвалі размову на пакуту сябе — мы з Машай. Нарэшце пагаварылі і лёгка, мірна дамовіліся: нам — машына, ёй усё іншае, у тым ліку і ўклад у банку, які мы паклалі на імя Сашы. Напісалі заяву аб раздзеле маёмасці, упэўненыя, што ўсё так. Куды там! Паехалі ўчора ў натарыяльную кантору. Божа мой! Жах! Найцяжэйшае ўражанне. Ад самой атмасферы. Стаўпатварэнне. Сотня чалавек. Мітынг. Выклікаюць па запісу папярэдніх. Гутарыць па-чалавечы з натарыусамі нельга: у іх штампованыя адказы. Нам яшчэ «пашанцавала»: мае прозвішча дайшло да старшага натарыуса. Яна павяла нас у кабінет, пачала сама друкаваць на машынцы нейкія дакументы, выпісваючы дадзеныя з нашых пашпартоў, з тэхпашпарта, дагавора аб дараванні. А ў мяне ад бяссоннай ночы і стрэсавай сітуацыі плавалі ў вачах жоўтыя кругі. Мы з Машай падпісалі дакумент, не прачытаўшы. Што там яна сачыніла? І Таццяна не прачытала. Цяпер караем сябе: паводзілі, што непісьменныя жанчыны. І, увогуле, навошта натарыус друкавала дакументы, калі канчатковае рашэнне будзе пасля шасці месяцаў з дня смерці Сашы. Ах, Саша, Саша! Колькі клопатаў ты нам задаў. І ўсе яны сумныя, цяжкія.

Сёння ездзілі з Машай на магілу. Заснежана і пуста — у суботу народу мала, у нашай зоне — старое пахаванне — адзінкі жывых людзей. Холадна. Снег ішоў. Маша паліла свечку, засланіўшы яе газетай ад ветру, ёй чамусьці хочацца, каб абавязкова згарэла адна свечачка, каб як бы вымярэнне часу прабывання свайго над магілай. Сыпанула круп, і адразу прыляцела сінічка — як пасланец з іншага свету — і не баялася нас. Нейкія тры градусы ніжэй нуля, а прамёрз моцна. І зараз, праз дзве гадзіны пасля звароту, па целе поўзаюць мурашкі. Настрой — горшага не бывае.

13 лютага

Сёння Славянцы 10 гадоў. Сабраліся ў нас, надарылі ёй падарункаў, добра, што яшчэ ёсць што падарыць. Маша раздарвае ўнукам свой «залаты запас». Я — ручку, каляндарык, «Культуру питания», якую выпусціла БелСЭ. Харошая кніга. Надпісаў: «Няхай жыццё тваё, мая малая, будзе такім жа багатым, як гэтая кніга». Між іншым,

парадокс: есці няма чаго, а кніга гэтая коштам 25 руб. ідзе ў спекулянтаў па 100-150 руб. І купляюць. Нейкі ўсеагульны псіхоз. Людзі звярэюць. Страшна робіцца. Дысцыпліны ніякай.

Пазаўчора падаў заяву Бутэвічу аб вызваленні мяне ад пасады галоўнага рэдактара. Хваляваўся, пакуль сачыняў чатыры радкі, а падаў спакойна, на здзіўленне сабе. Міністр узрадаваўся, добранькі зрабіўся: яму цяжка было пазбавіцца ад такога заслужанага чалавека. Я памог яму. Папрасіў яго да падпісання загаду не разглашаць: хочацца яшчэ тыдзеньдва з'яўляцца ў БелСЭ паўнапраўным галоўным, а не экс. Абразлівыя аднолькава і шчырыя спачуванні і злорадныя ўхмылачкі ў спіну,

Тэлебачанне запісала маё слова пра У. Карпава. Сказаў пра славутага партызана і нашу літаратурную маладосць.

15 лютага

І зноў — сумная навіна: памерла свацця наша Таццяна Васільеўна, толькі што пазваніла наша Таццяна.

Я пісаў ужо: не столькі баюся сваёй смерці, як смерці блізкіх. Не была блізкім чалавекам свацця наша, чалавек дзіўны, але смерць яе ўсё роўна ўразіла.

А была яна сапраўды незразумелая — для Машы. Ды і мяне здзіўляла яе абыякавасць да сыноў, да нашага зяця Вячаслава асабліва, да ўнукаў. Жывучы на Пуліхава, пешшу 10-15 мінут, яна ні разу не прыйшла паглядзець на ўнучак Машу і Славяну. Ці заглядвала хоць на кватэру да сына? Нешта не помню, каб Таццяна, дзяўчаткі гаварылі пра такі візіт. Машу гэта не проста здзіўляла — абражала такая абыякавасць да родных сваіх. Маша ўсё гатова аддаць не толькі дочкам сваім, унучкам — пляменнікам і нават чужым.

Тыдні два назад памерла ў Гародні яе пляменніца Таццяна, урач, маці пяцярых дзяцей, 44 гады. Лейкемія. Між іншым, і ў свацці лейкемія.

Стрыечная сястра маёй Машы, таксама Маша, скардзіцца: не здолее Галя, маці нябожчыцы, паехаць з Гомеля ў Гародню на 40 дзён — няма за што, такую цану ўзвінцілі на білеты, гады. Да чаго дапусцілі, давялі народ! і Маша кажа мне: «Я пашлю Галі на білет рублёў 200. Як можна, каб маці не паехала на 40 дзён?» Ледзь не заплакаў ад такой спагады і чуласці. А тут яшчэ Вольга Філатаўна са сваёй мізэрнай пенсіі дае сто рублёў — для той жа няшчаснай Галі.

Учора засядалі прэзідэнты. У будынку ЦК КПБ. У габеленавай зале. Выдатны габелен работы М. Савіцкага з партрэтам Леніна. Габе-

лен не знялі. Не паспелі? А бюсты Маркса і Леніна перад будынкам знеслі за адну раніцу. І зрабілі гэта былыя камуністы. Вандалы!

Учора ледзьве не пасварыўся з Хаўратовічам: ён даказваў, што пражывём мы і без Расіі — «Фінляндыя жыве». Што робіцца з людзьмі, божа мой? Чаму такая зашоранасць? Ішлі, ехалі ў метро трое — Міхась Ткачоў, лідэр БСДГ. Гэты асілак па выгляду і па свайму палітычнаму значэнню — так яўна ўяўляе ён — маўчаў, не падтрымліваў ні маё перакананне — не пражывём! — ні аптымізм Хаўратовіча: пражывём. З чым? На чым? З кім? Што робяць нашы кіраўнікі з цэнамі? Дикий произвол. У імя чаго? Ды і не пахне тут рынкам. Аддае нахабным абрабаваннем народа. Прытым чыняць проста здзек — цэны павышаюцца ледзьве не штодня, без асаблівых пастаноў. І народ безмолвствует. Калі і як ён скажа сваё слова? Добра, калі гэта будзе толькі слова. А калі кулі?

Можна спаць хіба з такімі думкамі? Бяссонніца даканае. Бывае роспач страшэнная. Але жыць усё роўна хочацца. Што там — наперадзе?

18 лютага

Вынеслі на пасяджэнне рады глабальнае пытанне: Саюз пісьменнікаў Беларусі і ўсталяванне яго міжнародных сувязей. Запрасілі міністра замежных спраў Краўчанку Пятра, былога ідэолага гаркома. Успамінаю, як ён «ціснуў» на мяне, калі пленум ЦК павінен быў рэкамендаваць ВС кандыдатуру старшыні СМ: каб і я прагаласаваў за Кебіча і іншых агітнуў.

Я прагаласаваў, тады лепшага гаспадарніка не бачыў, ды і цяпер не бачу, хоць у Кебічу расчараваўся. Лаўкач, па-мойму, працуе на сябе. А хто не працуе на сябе? Той жа Пятро, добра ўладзіўся, лётае па свеце, не пасаромеўся пра сваю знешнепалітычную дзейнасць расказаць так, як быццам у свеце па значэнню ён другі пасля ястраба Бекера.

Аднак аб радзе. Пытанне мяне здзівіла, у СП няма валюты на адзін білет да Варшавы, не кажучы ўжо пра Нью-Йорк. Якія сувязі? І выступленні калег здзівілі — Брыля, Рагойшы, Макаля: погляд у адзін бок — на Захад. Як быццам ад таго, што выйдзе адна-дзве кнігі ў Аўстрыі, Канадзе — о як узнімецца наша літаратура! Выйдзе яшчэ раз Быкаў, ні Рагойша, ні Макаль не выйдуць. Смешна. І я не вытрымаў — даў рэпліку: «Давайце павернемся на Усход. Масква перакрыла ўсе краны выданню нашых кніг на рускай мове. А без выдання па-руску — ох, як туга мы будзем выходзіць на сусветны рынак». Сказаў мякка — туга. Зусім не будзем выходзіць. Хто нас прачытае па-беларуску?

Эмігранты? Якія ў іх магчымэсці? Здзівіла і выступление Краўчанкі. Гаварун. Нямала выдаў цікавай інфармацыі, якой не было ў прэсе. Ды і тую, што была, падаваў «дыпламатычна»: аб перакідцы Віцебскай дывізіі ў Грозны — «Між намі: думаю, шырока гэта не пойдзе». А гэта ўсё ў газетах. Не чытаў іх міністр, ці што?

70 дзяржаў прызнала РБ. «А як з пасольствамі?» — спытаў я. «Цяжка»,— згадзіўся міністр. Нашы валютныя магчымасці дазваляюць у бліжэйшыя тры гады адкрыць 9 пасольстваў. Усяго. Здзівіла, што ў ліку 9 ёсць Ізраіль, але няма Францыі. За 10 плануе слаўны Урад адкрыць 28 пасольстваў. За 10 гадоў! Божа мой. З улікам краін СНД ці без іх? Забыўся запытаць.

Ашаламіла мяне, што былы інтэрнацыяналіст палохаў нас Расіяй. Іграў на публіку? На нацыяналізм Брыля, Законнікава, Мальдзіса? Намякнуў, што Ельцын можа перакрыць нам газ. «Дык палезем жа ў" зямлянкі, памарозім дзяцей!» — кінуў я рэпліку. Брыль адпарыраваў: «Іван, у цябе старое мышление». Няўжо сур'ёзна верыць, што выжывем без Расіі? Абсурд. Эстонія, маючы парты і не такую, як мы, падтрымку Захаду, ужо замярзае. Дабрадзеі, якія аплаквалі лёс акупаваных прыбалтаў, не спяшаюцца прывезці мазуту.

Цікавы яшчэ адзін нюанс, псіхалагічны. Па-мойму, міністр сядзіць, як заяц пад мокрым кустом. Палітычнай упэўненасці не мае. Але пакінуць хоць які след яму хочацца. Не грамадскія арганізацыі, а МЗС рыхтуе сусветны з'езд беларусаў у нас у Мінску (пры нашай беднасці!) на верасень гэтага года.

«Чаму такая спешка?» — спытаў я.

«Мы думалі перанесці на 1993-ці, але разважылі: невядома, што можа адбыцца да таго часу».

Такая ўпэўненасць у палітыкаў! І жывуць многія з іх — як бы больш уварваць у дзяржавы, у народа. Як вялікі зладзей Гарбачоў, якому я, дурань, верыў у пачатку міфічнай перабудовы. Перабудаваліся! Па-мойму, другога такога злыдня не было на Русі за 1000 гадоў. Што там Грышка Атрэп'еў, Распуцін, Троцкі, Сталін! Немка Кацярына — як збірала дзяржаву Расейскую! А сённяшняя банда расцягвае, ужо расцягнула. Калі армія не варухнецца — загінем.

Вось так праз выступление аднаго міністра адкрылася палітыка Урада незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Сумная палітыка.

Стварылі замежную камісію ў СП. А што яна зробіць? Барыс Сачанка прапанаваў арганізаваць выдавецтва, якое б выдавала нашы кнігі на замежных мовах. Для каго? Як распаўсюджваць? Па-беларуску не можам выдаць. Нават у міністра хапіла розуму сказаць,

што гэта ў сённяшніх умовах нерэальна. А што рэальна? Усё — за межамі рэальнага, здравого смысла.

21 лютага

Учора ўбачыў першую прыкмету голаду. Дзе? У Саюзе пісьменнікаў. Быў вечар Міколы Мятліцкага. Прэм'ера яго чарнобыльскай кнігі паэзіі «Палескі смутак». Харошы вечар арганізаваў мой малады зямляк. Можна пазайздросціць яго энергіі. Вечар вёў Алег Лойка. Выступілі Лужанік, я, Сачанка, Марук, Пісьмянкоў, Захарэвіч, Анісенка, Мархель — добрыя чытальнікі. Паўтары гадзіны пісала тэлебачанне, радыё. Шчодра. Вітаю. Добра, што нашы вечары яшчэ запісваюць бясплатна, што тэлебачанне яшчэ бясплатнае.

Мікола запрасіў землякоў — са свайго трагічнага Бабчына, людзі прыехалі з розных месц, куды загнаў лёс. У маім былым кабінеце накрыў стол — а-ля фуршэт. Шыкоўны па нашым часе стол — вяндліна, кілбаса, капуста, бутэрброды з маслам, сырам.

Безумоўна, і сам «юбіляр» не разлічваў на такую колькасць людзей. Першая прыкмета галоднасці. Як цягнуліся за гэтай закуссю! І што спачатку ашаламляла — цягнуліся жанчыны і накладалі на свае талеркі як можна больш. Мужчыны гэта рабілі больш стрымана, хоць некаторыя напіліся. І хіба можна асудзіць гэтых няшчасных жанчын? Калі метадыстка Дома літаратара ела такую вяндліну? І калі яшчэ з'есць за сваю зарплату?

І горка гэта было назіраць. Балюча. Да чаго нас давялі! Хто? Ківаюць на камуністаў. Але ж пры іх гадоў 35 добрых нават для такой метадысткі кавалак кілбасы не быў праблемай. Яна атрымоўвала 150 руб., але абедала за паўтара рубля ў кафэ. Цяпер палучае 500, а той жа обед — 30 руб. у тым жа кафэ, якое было дзяржаўным, а цяпер стала прыватным — групы пісьменнікаў: Дударава, Чыгрынава... Растуць свае капіталісты. Брыдка і сумна. Жахліва траціць апошнія ідэалы. Душа поўная роспачы. Але прапагандыст з мяне вылез. У сваім слове на вечары, пахваліўшы Міколу за боль і смутак у яго паэзіі, я звярнуў увагу, што ў некаторых маладых паэтаў гэта становіцца модай. Гэта так. І я заклікаў: творцы! сябры мае! таварышы! не спадары і спадарыні («Товарищ, верь, взойдет она...») — дайце проблеск святла! Дайце людзям надзею! Не пра распад і роспач трэба пісаць — трэба і мне пісаць! — пра Надзею, Веру, Любоў.

23 лютага

Заўсёды святкавалі гэты дзень, асабліва мы, ветераны вайны. Святкавалі шумна, сумна і весела. І было гэта звыкла, традыцыйна. А

сёння... сёння дзень гэты здаўся мне незвычайным. Смутак? Так. Трывога. Без радасці? Не, штось і радаснае. Надзея? Нейкія новыя адносіны да вайны і да арміі сённяшняй. Да арміі, якую яшчэ ўчора «дэмакратычная» банда бязлітасна і брыдка аплёўвала, сёння ўсе адносяцца з павагай, сур'ёзна. На яе спадзяюцца, яе баяцца. Ельцын усклаў вянок да магілы Невядомага салдата. Пакланіўся Святому Агню. Хапіла розуму. Але ветэранаў да Агню гэтага не пускаюць. Цверская перакрыта для шэсця. Сутычкі з АМОНам. Гуляюць «дэмакраты» з агнём — не з вечным, знішчальным. Страшна. Але, урэшце ж, трэба некаму навесці парадак. Акрамя арміі, гэтага ніхто не зробіць. Але арміі трэба камандзір. Ёсць ён? Армейскія камандзіры не палітыкі, наперад не вылазяць, да рашучага бою сядзяць у бліндажах... Дайце каманду!

Павіншавалі мяне ўнукі, Фёдар Цітавіч ды Ліда Кірэенка. Чаму мне не хочацца нікога віншаваць? Вярэдзіць раны размова.

Правялі вечар БелЭН у Доме літаратара. Я баяўся, што не сабярэцца народ, асабліва калі даведаўся, што галоўныя «балелыцчыкі» за энцыклапедыю — рада славутая на вечар не з'явіцца. Але вечар прайшоў добра. Народу было поўна.

Учора заехаў пляменнік Мікалай з жонкай і маленькай дачушкай. Ездзілі з Гомеля ў Паставы да сястры Люды, якая нарадзіла сына. Малайчына Люда — другое дзіця! Малайчына брат! Але ж і афрыканец! Быў на гандлёвым флоце. Выгналі— пабіўся з памочнікам капітана. Учора, выпіўшы, прызнаўся, што біўся з родным бацькам, які пасля смерці сястры маёй Галі ажаніўся з другой жанчынай. Вечная драма! Ушчуваў я, ушчуваў гэтага забіяку. Але ашаламіў ён шырынёй сваёй натуры: у падарунак дзядзьку купіў пляшку «Напалеона»—400 руб. Інакш зайсці не мог. Як назавеш такога чалавека? Працуе на будоўлі рабочым, жонка ўдзіцячым садзе. Кажа, зарабляе нядрэнна. Але ж не столькі, каб купляць «Напалеон». Ламалі з Машай галовы: чым аддарыць? Яна знайшла матэрыял на плацце, я — сарочку, якая мне цеснаватая. Лягчэй стала. Не кожны падарунак можа радаваць.

29 лютага

Учора адбыўся вечар, прысвечаны 60-годдзю «ЛіМа». Арганізатары пастараліся: добры сцэнарый, поўна людзей, звычайна на такія вечары пісьменнікі не ходзяць.

Але здзівілі мяне некаторыя выступленій Перш — галоўііпга рэдактара Міколы Гіля, малодшага Гілевіча. Адкуль у сыпи пагойскага селяніна такі паталагічны антыкамунізм? Урэшце, сёння гэта ўжо нямодна — паліваць такім брудам камумісгаў, гэтага нават Стара-

войтава не робіць. Толькі наш Пазыняк. І Гіль. Брат яго падобных выступленняў не дапускаў у разгар антыкамуністычнай істэрыі, Перад кім выслужваецца І Інь? Як можна рабіць пампезны юбілей газеты, якая 57 гадоў была камуністычнай? Ён жа, Гіль, кажа: газета — санраўдная энцыклапедыя беларускай літаратуры і мастацтва. ХІба яна ў той час не кіравалася ідэямі партыі? і нічога — жыла. Пабачым, як будзе існаваць далей.

Другі, хто здзівіў,— Краўчанка. Быў у ЗША і вельмі шчаслівы, што сустрэўся з «геніяльнай паэтэсай» Наталляй Арсеньевен. Тры дні сустракаўся, запісаў на 10 гадзін яе расказ. Больш міністру замежных спраў не было чаго рабіць. Арсеньева перадала яму верш пра Чарнобыль. Ашчаслівіла! Прачытаў страфу — прымітыў. Урачыста ўручыў Гілю верш — надрукаваць! Во ашчаслівіць чытачоў! Зала пляскала, але не вельмі — па інерцыі. Па-мойму, многім людзям было няёмка за міністра. Але спектакль адбыўся. Ніводзін паклон ніводнага камуніста нават бяздарнаму Брэжневу не здаваўся мне такім зневажальным, як гэты паклон Краўчанкі. Каму? — во пытанне. Ён лічыць: нацыянальнай ідэі. Ха! Памажы газеце выжыць, член урада! Няхай сябра твой Кебіч дасць паперы. Гарым усе сінім полымем. Гарыць і нацыянальная ідзя.

Вечар не быў «сухі». Яшчэ адно здзіўленне. Прыём на сотню чалавек. Гарэлка, шампанскае, добрая закусь, халодная і гарачая. Такі прыёмчык па нашым часе пацягне на тысяч 7-8. Адкуль грошы? Міністэрства культуры адваліла? Дзяржаву развалілі, раскралі, абрабавалі, прадаём і... прапіваем. Свабода!

Напіліся пісьменнікі. Пашкевіч не трымаўся на нагах. Як і хто давёў яго дадому?

Перад тым як пайсці, я затрымаўся каля стала, дзе сядзелі Брыль і дэпутат наш Леанід Баршчэўскі, галоўны падпявала БНФ. П'янаваты, ён мяне «паляпаў» па плячы: «Мы нас прызнаём». Даслоўна. Ха! Яны мяне прызнаюць! Баршчэўскі мяне прызнае! Нікому не вядомы, каб не дэпутацтва, перакладчык з нямецкай, выкладчык нейкага Наваполацкага іэхнікума (але ўжо вырваў кватэру ў Мінску — спрытнюга!). Тры гады назад прыняты ў СП. Кланяюся табе, Леанід Пятровіч, што ты мяне прызнаў. Але мог бы «заканадаўца» палітычны і літаратурны помніць, што мяне прызнаў народ, калі цябе не было і ў праекце, і сорак пяць гадоў чытаў. 45! А табе ад нараджэння 34. Між іншым, гэтая адзіная твая перавага — гады. Але не сумняваюся: скончыцца тваё дэпутацтва — і той жа Гіль хіба што возьме цябе радавым супрацоўнікам. І Краўчанка высокай пасады не дасць, хоць і валодаеш ты нямецкай мовай. Божа мой! Яны мяне прызнаюць! Было

б смешна, каб не было сумна. Не дай божа, цалкам захопяць пазынякі — баршчэўскія ўладу, то могуць і закрэсліць усіх, каго прызнаваў народ,— каб узвысіцца самім. А як інакш узвысіцца, маючы брашурку па археалогіі ці пару перакладаў з нямецкай? Такія «дэмакраты» закрыюць усіх і ўсё.

А за два дні да гэтага вечара ездзілі ў Лагойск. 80 гадоў Уладзіміру Карпаву. Удава Марыя Міхайлаўна ўгаварыла мяне. Яна — малайчына, што так захоўвае памяць пра мужа. Экспазіцыя ў школьным музеі ў Камарыне, дзе жыў. І тут, у Лагойску, дзе партызаніў. Добрая школа, чыстая, цёплая. «Дэмакраты» збудуюць такія школы? Уважлівыя вучні, настаўнікі. Купілі 90 кніг «Зеніту», «Драмы». Забалела рука — пісаць аўтографы.

Ездзілі Сцяпан Кухараў, Паўлюк Прануза, Генадзь Тумаш, партызан Груздзеў, выступіў лагойскі партызан Сасноўскі Б. Ул., Марыя Міхайлаўна.

Быў абед у школьнай сталоўцы. І была гарэлка — па сто грамаў. І стала радасна ад таго, што людзі жывуць звычайным жыццём, вучаць дзяцей, не панікуюць. «У мяне свой дом, куры, свінчо»,— сказала настаўніца, якую мы падвозілі.

Такія сустрэчы разганяюць тугу, паніку, роспач. А не «ласка» Баршчэўскага: «Мы вас прызнаём!» Праўда, выпіў я лішняе да «ласкі» гэтай — з Пашкевічам і Макалём. І зноў бачыў, як хутка змялі закусь халодную, не спадзяваліся на гарачае. І было ад гэтага горка — назіраць галодных пісьменнікаў, журналістаў.

Сёння — цяжкая галава. Маша паехала на могілкі, да Сашы. І я адчуваю сябе вінаватым. Даруй мне, сыне.

1 сакавіка

Маша глянула ў акно і горка заплакала: «Вясна. А Сашы няма». А Сашы няма. І не сціхае боль наш. Маша спыняецца перад партрэтамі, фота сямейнымі і плача.

Няма ў нас вясны. Божа мой! Ды ў 300 млн яе няма. Укралі народную радасць гарбачовы, ельцыны, паповы...

Учора прачытаў у «Комсомольской правде» (усё яшчэ камсамольская!) інтэрв'ю з Гарбачовым пад загалоўкам «Суда я не боюсь». Не, баіцца. Круціцца, як уюн на патэльні. Апраўдваецца. Няма ў яго ні віл, ні ўкладаў у замежных банках. «Через вашу газету с огромным тиражом я обращаюсь ко всем банкирам мира: я разрешаю сообщить в печати всю информацию о моих зарубежных вкладах, назвать суммы и даты вложений. Публикуйте!»

Дэмагог, сукін сын! На недасведчаных прастакоў разлічана заява — на нашых, хто не ведае, што такое банк. Няхай бы знайшоўся хоць адзін дурань і даў бы нават, што ў Гарбачова мізэрная сума — сотня-тысяча долараў; на другі дзень такі банк лопнуў бы, страціўшы давер укладчыкаў. Тайна укладу — тайна, святая святых усіх банкаў, акрамя нашых.. У нас не проста могуць разгласіць, але канфіскаваць без тлумачэнняў. (Ламаю галаву, што рабіць з укладам.) Таня: купляць рэчы. Па сённяшніх цэнах? А потым што — прадаваць? Мы з ёй камерсанты? Мы нічога не прадалі за жыццё сваё.

Аднак пра Гарбачова, Стараецца трымаць хвост пісталетам. Але — паміж радкамі — змрочна ў яго на душы. Думаю, што не спіцца яму. Скардзіцца: зменшылі афірэцаў у ахове, павялічылі агароднюю брыгаду. Сажай бульбу, Міша! Сушы сухары! Хоць... ёсць у яго ўклад, ёсць... А суда яму не пазбегнуць — усенароднага. Няхай не пасадзяць. Але гісторыя асудзіць не ў меншай ступені, чым Гітлера і Сталіна. Яны ўчынілі крывавую бойню, «перабудоўшчык» развалiў краіну — пераможцу ў вайне — і давёў народ да галоднага мору. Божа мой! Няўжо будзем паміраць з голаду? Дзеці будуць паміраць? Выць хочацца.

6 сакавіка

Маша перадрукоўвае дзённік. Скончыла чарговы сшытак — папрасіла працяг. Аддаў перадапошні з напісанага. Самы цяжкі — з запісам нашага гора. Разгарнуў на вераснёўскіх запісах — наплакаўся. А як Машы друкаваць? Ажно страшна робіцца.

«Дэмакраты» закрэсліваюць усю савецкую гісторыю, а літаратура — летапіс часу. Хутка мы, старыя, памром. І нашы месцы пастараюцца хуценька заняць «новыя». А ім трэба стварыць бачнасць (што яны займаюць не месца Броўкі, Глебкі, Макаёнка, Мележа, а сваё), што гісторыя пачынаецца з іх.

Часам мне робіцца шкада гэтых людзей. І капіталістаў новых шкада. Будзе іх народ біць, ужо падрываюць прадпрыемствы. Чуў па «Маяку». Будуць біць, як зладзеяў, канакрадаў. Бо адкуль яны ўзялі мільёны? Укралі. У мяне ўкралі. У нас. У народа. Я, год назад, адносна багаты чалавек, сёння жабрак. Жыву на пенсію. Добра, што нейкая адзенне ёсць. Божа мой! Як гэта горка. Можа, толькі цяпер разумею Буніна — яго паталагічную нянавісць да балышавікоў: чалавек усё страціў, столькі даўшы народу.

Суцяшайся, Іван, што жыць засталося нядоўга, што да смерці сына ты жыў шчаслiва: цябе лгабілі — сям'я, чытачы. О, божа! Дай мне сілы гэтак жа дастойна пражыць апошнія гады, сумленна, як я пражыў жыццё, за яго мне не сорамна.

Учора трапіліся на вочы радкі Пушкіна, забытыя мной:

Мой путь уныл. Сулит мне труд и горе
Грядущего волнуемое море,
Но не хочу, о други, умирать;
Я жить хочу, чтоб мыслить и страдать.

Я жыць хачу!

Прачытаў, што запісваў у 72 гады Леў Талстой. У «Кругу чтения», які ляжыць у мяне на стале, вялікі мудрэц і вялікі акцёр пісаў: «У человека есть всегда место спасения от всех бедствий; место это — его душа».

А калі яна пакалечана?

7 сакавіка

Угодкі па Анатолю Грачанікаву. У кафэ СП. Ашаламіў стол: вяселле, не памінкі. Якія мы марнатраўцы! Ад таго і бедныя. Колькі кілбас было навалена розных гатункаў. Нават каньяк «Арарат». «Спецыяльна для вас»,— сказала Нэла Іванаўна. І мы з братам Толевым Рыгорам Сямёнавічам асушылі пляшку гэтага царскага пітва, якому сёння бог ведае якая цана. Рыгор лічыць, што Анатоля забілі. Палкоўнік у адстаўцы, інжынер авіяцыі, выкладчык сімферспальскага інстытута, лічыць, што забойства мог арганізаваць КДБ. «За што?» «За публікацыі». Публікацыі былі смелыя. Але хіба толькі ў «Маладосці»? У рускіх часопісах — у дзесяць разоў смялейшыя, аднак жа не рабілі замаху ні на Іванова, ні на Куняева.

«Маладосць» (сіяністаў не чапаў, ды і КДБ не чапаў) ішоў у агульнай плыні дэмакратыі, у якую яшчэ год назад верылі. Не, палкоўнік, не магу згадзіцца, што брата твайго забілі.

Памінкі спадабаліся, што не было асаблівай жалобы, быў вечар успамінаў і паэзіі Грачанікава, вершы яго чыталі сябры, акцёр Казінін. І гучалі знаёмыя радкі зусім па-новаму. Кранала. Я плакаў і радаваўся. Вярнуўся дадому як бы ачышчаны. А заўтра свае памінкі — паўгода па Сашу, так захацелася маці: вычытала, што чым часцей успамінаць, тым лягчэй яму там... у другім жыцці. Будзем верыць у гэта. Можа, у гэтым ратунак — у веры.

Адна вера не з'яўляецца — што жыццё наладзіцца неўзабаве. У Р. Грачанікава вельмі песімістычныя думкі ў сувязі з сітуацыяй у Крыму. Страх. Няўжо пральецца кроў? Рыгор сказаў сур'ёзна: «Нам бы калі не генерала, то хаця бы каттана Піначэта». Адзіная надзея.

16 сакавіка

Учора адзначылі паўгода па Сашу. Так захацела Маша. Для яе і Вольгі Філатаўны аўтарытэт царквы высокі, а свяшчэннік сказаў: чым часцей успамінаюць, тым лягчэй і душы ўсопшага, і блізкім жывым. Гэта праўда. Цяжка было ля магілы Сашы. Сонца, вясна, жаночы дзень і... ад уяўлення, што сын там, у сырой зямлі, рыдаць хацелася. Маша і Вольга наплакаліся. А пасля памінальнага абеду нібыта і лягчэй зрабілася.

А сёння зноў на душы валун: адчуванне, што падыходжу да апошняй рысы. Не толькі я. Народ увесь. Ходзяць фантастычныя чуткі аб новым скачку цэн. На бензін, напрыклад. Колькі ж будзе каштаваць праезд? Кіраўнікі нашы дарагія! Чым вы думаеце? Няўжо сілы, што развалілі Дзяржаву, такія ўсемагутныя і такія помслівыя, што хочуць нас давесці да голаду і поўнага разбурэння? У вайну хапала гаручага. А колькі танкаў, самалётаў, машын штодня было ў баю! І колькі выганялі яго, бензіну? Колькі здабывалі нафты? Куды ж дзяюцца сённяшнія 600 мільёнаў тон? Плыве на Захад? Жах.

13 сакавіка

З цікавасцю пайшоў на сход пайшчыкаў камерцыйнага банка, у мінулым годзе БелСЭ ўнесла туды 100 тысяч. Сутыкнуўся з новай структурай: банк учора ператварылі ў акцыянерны. Рабілася гэта так «дэмакратычна», што мінулая партыйная дэмакратыя куды вышэй была: усё прынімалася аднагалосна сур'ёзнымі людзьмі — віцэ-прэзідэнт АН Сцепаненка, Шамякін, дырэктары заводаў, аб'яднанняў, тэлестудыі і г. д. Хтось не ўсё разумеў, камусь усё да лямпачкі: акцыянерны дык акцыянерны, склад савета — якая розніца, хто там будзе, савет, фірма. Кіруе ўсім старшыня праўлення — віхлявая бабачка Сурына Валянціна Пятроўна. Банкірка. Мае «тайоту» — адвезла нас са Сцепаненкам дадому, шафёр адвёз. Уладарка. Выкінула тысяч дзесяць на вячэру. Пытала ў праўлення? У наш час — каньяк, шампанскае, «Белавежская», добрая закусь. За нашым сталом апынуўся малады бізнесмен Ярахавец Я. У., які помніць мае творы, яму яўна ліслівіла, што сядзіць з вядомым пісьменнікам. Быў арганізатарам будаўнічага кааператыва. Але вытворчасцю займацца нявыгадна. Мае намер стварыць страхавое агенцтва — наступае капіталізм! Прапанаваў мне: «Мы вас застрахуем бясплатна, умацуем дзверы, паставім замкі, але за гэта дамо ў рэкламе, што ў нас застрахаваўся Шамякін».

«Дзякую. Каб навесці на мяне ўсіх злодзеяў». Смяецца, гад. Але абураў мяне не гэты тып, які ўжо варочае мільёнамі. За сталом сядзеў немец Эдуард Карлавіч (прозвішча не запомніў), прадстаўнік банка ў

Штатгардце, кіраўнік сумеснага прадпрыемства ў Мінску. Па-руску гаворыць без акцэнту. Аказваецца, нарадзіўся ў Казахстане, скончыў 9 класаў савецкай школы, выехаў у ФРГ у 1975 годзе. Дзялок вышэйшай маркі. Паводзіў сябе не як госць — як гаспадар ці акупант: Ярахаўца вучыў, даваў парады, з Мурынай на «ты», скончыўся каньяк — пайшоў, прынёс новую пляшку. Вось так. Зброяй яны нас не ўзялі — возьмуць «гандлем»: «накапіцелі» тыпу Сурынай і Ярахаўца за «мерседэсы» ўсё прададуць. Прачніся, народ!

Між іншым, Эдуард Карлавіч катэгарычна супраць утварэння ў Расіі нямецкай аўтаноміі. Тут да яго логікі я не дапяў. Трэба такія, як ён, знаўцы Расіі, Беларусі, Казахстана, Украіны для экспансіі на Усход, спачатку з маркай, а там і з аўтаматам. Непаважліва адазваўся пра ўсходніх немцаў: не ўмеюць працаваць, развучыліся камуністы, уздыхаюць па мінулым. Уздыхаюць усё ж? У іх, дзе паліцы ломяцца ад прадуктаў. А як жа ўздыхае наш народ! Народ-партызан...

Не, я за сувязі, за гандаль. Але ж будзьце, чортавы карлы і фрыцы, партнёрамі, а не заваёўнікамі.

...Чытаў «День». Малайцы русафілы! Агрызаюцца добра. Але баюся, што Ельцын і Гайдар іх задушаць. «Дело Горбачева» пакуль што бледнае: пра Чарнобыль — фіцюлька, больш значна — будаўніцтва дачы ў Фаросе — 150 млн., во хапуга! Больш цікава «Власть» — «пасяджэнне» ценевага кабінета, там ёсць думкі, прагнозы, міма якіх не пройдзеш. Малайчына дысідэнт Эдуард Лімонаў — яго артыкул «Убийство часового». Страшны вывад: «Космополитизм современного мира — фикция. Нации и племена ничуть не дружелюбнее сегодня друг к другу, чем они были два тысячелетия назад. И вторая мировая бойня, и уничтожение Ирака, и война в Югославии — тому примеры».

Згадзіцца? Не магу!!! Не, не варожасць нацый і плямён тут вінавата — барацьба за раздзел свету. «Золотой телец» — во хто правіць светам. Карабах — не проста вайна за кавалак зямлі горнай. Трэба разваліць ідэалогію дружбы, пасеяць зерне варожасці, раз'яднанымі лягчэй упраўляць. Ох, якая гэта іх перамога — развал Саюза!

Пахаладзеў, прачытаўшы ў «Звяздзе» падборку нашых ачумелых нацыяналістаў з патрабаваннем звароту Вільні. Жах! Камусьці вельмі патрэбен Карабах у цэнтры Еўропы. Апамятайцеся, людзі! Мала вам зямлі? Усе атрымаем свае тры аршыны.

16 сакавіка

Арэнбургскі пісьменнік Пётр Красноў апублікаваў у «ЛР» артыкул «Интервенция». Смелыя думкі, нечаканыя і разумныя прапановы. З нашых ніхто нічога падобнага не напісаў, хоць вусна выказваюць,

бадай, тоеж (Савіцкі, з якім я учора гуляў). Мы лянівыя і залішне зацыкленыя на сваіх нацыянальных праблемах, хоць пры любым урадзе (нават Пазьняка) мы будзем ісці ў фарватэры Расіі. (Праўда, ёсць сілы, што цягнуць у абдымкі Польшчы. Во ашчасліваць!)

Красноў дае ёмкае выражэнне сённяшняму ладу: «Редкое по наглости и публичности самоуправство, презрение «малого народа» к интересам страны положены в основы «правового демократического государства» — неприкрытая коррупция, повседневная ложь и обман, карьеризм любой ценой царят в нашем верхушечном политическом вертепе, побившем все рекорды застоя».

Красноў не проста канстатуе факты, як многія іншыя аўтары, ён робіць вельмі слушныя высновы: «И вывод здесь возможен только один, простой и жестокий: пока все эти Горбачевы и «горбачевцы» не будут преданы открытому народному суду, осознанному, а не стихийному, как сейчас,— на свою российскую, тысячелетнюю, выверенную историческую дорогу нам не вернуться, высшего смысла своего бытия и достойного образа жизни не обрести. Без этого так и станем во всех смыслах вторсырьем истории, расходуемым материалом для хищнической мондиалистической цивилизации, рабочим быдлом в ее загонах». Трапна! Справядліва!

Ёсць разумныя людзі на Русі! Ёсць яны і ў нас! Але няма лідэраў, арганізатараў, і... народ... не, не безмолвствует,— слоў многа, народ ашаломлен, у шоку. Ці доўга будзе цягнуцца такі стан? Страшна падумаць, што доўга: такая сіла супраць нас! У тысячу разоў больш магутная інтэрвенцыя, чым ваенная інтэрвенцыя 14 дзяржаў.

22 сакавіка

Як змянілася атмасфера! У СП, прынамсі, а ён — неблагі барометр. Ці даўно — тры — два, можа, яшчэ год назад — кіпелі палітычныя страсці. Былі ў эйфарыі нацыяналісты — пачынаецца росквіт беларускай мовы, культуры! Пракліналі камуністаў. У змагары за новую Беларусь лезлі яўрэі — як заўсёды ультрарэвалюцыянеры.

Сход 19 сакавіка. Гадзіны чатыры прагаварылі. І — ніводнага выступлення палітычнага. Аб чым сказаць? Як расквітала нацыянальная культура? Каго вініць? Камуністаў? Усё яшчэ робяць гэта. Але нашы зразумелі: калі беларускае згіне, літаратура ў прыватнасці, дык гэта будзе «плодом» дзейнасці «дэмакратаў».

Усе таўкліся вакол таго, як жыць: Літфонд — выбары старшыні праўлення, ганарары (ніхто іх не павышае), Дом творчасці «Іслач», які ўжо здалі ў арэнду Міністэрству культуры. (Добра, што не Будзінасу!)

Вось такія змены, пераварот у галовах пісьменнікаў. Нікога не цікавяць ні праблемы СНД, ні праблемы РБ.

Перад гэтым была сустрэча з ваеннымі. Таксама здзівіла. Нашы, пісьменнікі (Пашкевіч, Асіпенка), як і 20 гадоў, гаварылі пра вайну, хіба з паваротам: як яе зараз адлюстроўваць. Самае палітызаванае было маё выступленне. Я сказаў: армія наша знаходзіцца ў тым жа стане, што ў канцы чэрвеня, у ліпені 1941 года паміж Беластокам і Смаленскам. Хтось здаецца ў палон, хтось страляецца, хтось прабіваецца да будучай перамогі. Калі праб'юцца і знойдзецца Жукаў, які арганізуе гэтыя часці, мы ўратуемся. Нам падкідваюць ідэю нацыянальнай арміі. Без агульнай арміі СНД, якая ахоўвала б межы Садружнасці, нас з'ядуць па адзіночцы. Як толькі Румынія праглыне Малдову, тут жа палякі прад'явяць прэтэнзіі на Брэст, Гародню, Навагрудак. І наша беларуская армія ў 50 тысяч супрацьстаіць палякам, якіх падтрымае НАТО? Мы павінны мець сваё НАТО\ Прыходзька выгукнуў: «Стратэг!» Але пасля ніхто ні слова пра маё выступление, як і не было яго. Ні нашы, ні ваенныя.

Наведаў я ў бальніцы Максіма Танка, ён у рэанімацыі, задыхаецца, з ім мне далі пагаварыць мінуты тры.

Дэталь да сходу і да становішча пісьменнікаў. У перапынку зазірнуў у кафэ. За ўсімі столікамі — творцы, геніі. Усім хочацца выпіць. А пляшка гарэлкі са здзеклівай назвай «Белая Русь» больш ста рублёў.

На сталах па пляшцы, пустой ці пачатай, на чатырох-пецярых, набралі апошнія рублі на гэтую праклятую гару, як казаў Піліп Пестрак. Але не гэта ўразіла. Закусь. На сталах — па скібцы хлеба і па адным-два квашаным памідоры. Вось так! Атрымалі, за што змагаліся. Балюйце, бунтары, «дэмакраты»!

26 сакавіка

Тры дні ішоў гадавы сход Акадэміі. Што ўразіла: у прыватных гутарках вучоныя, як і ўсе сумленныя людзі, не хапугі, не зладзеі, абураюцца развалам краіны, эканамічнай катастрофай; з трыбуны ніхто абурэнне гэтае не выказаў. «Дэпалітызацыя галоснасці». Плачуць, што знаходзяцца на мяжы голаду, што структуры АН разваль-ваюцца, інстытуты скарачаюцца — хто падаецца сам у бізнес, каго трэба звальняць, бо няма грошай. Але абурэнне тымі, хто давёў да такога стану, не вырвалася ні ў аднаго змагара за справядлівасць. Тым больш дзіўна, што выступалі дзяды, якім па 75-80, на трыбуну не могуць падняцца, як Дарожкін, Сірата. Ім чаго і каго баяцца? Маладыя, пяцідзесяцігадовыя, маўчалі ці гаварылі пра чыста наву-

ковыя праблемы. Нейкі ўсеагульны шок. Дзіўна, што і рабочы клас маўчыць. Цешыцца, што зарплата іх вышэй за чыноўніцкую, за пісьменніцкую, навуковую. Дырэктар інстытута АН — 2500 руб. Шафёры зарабляюць у два разы больш. Людзі баяцца беспрацоўя. І гэта звязала ім языкі і асобных штурхае на вельмі непрыгожыя ўчынкі.

Але жыццё ёсць жыццё, і летапіс яго з'яў уяўляе цікавасць, дзённік любога чалавека — непаўторны дакумент.

Усё ж у мяне ў аснову леглі ўспаміны. Трэба вярнуцца да іх — і да гісторыі сваіх твораў, да гісторыі СП, да партрэтаў калег. Дай, божа, сілы. Не выбівай з сядла...

Учора ў перадачы ТБ спадабалася гутарка кінарэжысёраў. Хоць большасць сярод іх было яўрэяў, яны мусілі прызнаць: было савецкае кіно, і добрае, ідэалагізаванае, але чалавечае, гуманнае, не тое што сённяшняя «парнуха». Даходзіць. Ваду муціў кінакрытык — дурны антысаветчык. Было кіно! Была савецкая літаратура! Прызнаюць і гэта! І аб ёй варта пісаць!

29 сакавіка

Аб людзях. Пра калег маіх. У апошнім «ЛіМе» кароткія нататкі Скрыгана пра свой драматычны, бадай, трагічны лес. Пра сваё «хождение по мукам» ён мог бы напісаць эпапею. Слабыя эскізы. І паўтор: пісаў ён пра гэта раней — у біяграфічных апавяданнях. Але і гэтыя нататкі кранулі мяне: чалавеку 87 гадоў. Дай бог кожнаму! І ён пры поўнай памяці ніша пра перажытае. Каротка, эскізна? У гэтым, можа, і каштоўнасць. Я разумею Івана Аляксеевіча: публікацыя — голас, што я яшчэ жыву на гэтай пакутнай зямлі.

Я люблю гэтага чалавека, да яго ў мяне асаблівыя пачуцці. Прамаргаў яго 85 гадоў, успомніў на другі ці трэці дзень, перажываў, але ўсё роўна пазваніў і па голасе Янкі пачуў, што ён рады: не забыўся на яго.

Тыдні два назад быў у СП сход. Я ўвайшоў са службовага ўвахода — на залу і ў другім радзе ўбачыў маленькага худзенькага дзядулю. Божа мой! Скрыган на сходзе! Кранула іэта і ўзрадавала — во сіла жыцця! Каб не перад залай, то шчыра пацалаваў бы свайго цёзку.

Скрыган — чалавек незвычайнага характару, усімі дзеяннямі яго рухае дабрыня, хоць не скажу, што ён абыякавы да зла: у нашых колішніх застольных гутарках ён апраўдваў многія грахі калег. Паводзіны ж аднаго свайго «таварыша па няшчасці» там, у лагеры, асуджаў сурова. Так што «непротивленцем злу» Янка не быў.

Цікава мы з ім пазнаёміліся (здаецца, я пісаў пра гэта, і ён пісаў).

Хрушчоўская «адліга». Думаю, што было гэта ў годзе 55-м, да XX з'езда, напэўна. З далёкай Сібіры прыйшло ў Саюз пісьменнікаў пісьмо, пісаў нехта Іван Аляксеевіч Скрыган (я хіба чуў прозвішча), пісаў па-беларуску, хораша на роднай мове. Ніякіх просьбаў не выказваў, акрамя адной: хацеў бы ведаць, што там, у Беларусі, што ў Саюзе пісьменнікаў? Пасля звароту прызнаўся, што ведаў, што Броўка старшыня Саюза, і ўпотай разлічваў на яго адказ. Аднак звароту да яго ў пісьме не было — безыменна, не помню, ці былі словы «таварышы», «калегі», «сябры». Я спытаў у Броўкі: «Хто такі Янка Скрыган?» Убачыў: і сумеўся, і ўсхваляваўся мой патрон, ажно закурыў, што рабіў рэдка. Адказаў усхвалявана, усё яшчэ з «аглядкай»: «А знаеш, Іван Пятровіч, я табе скажу шчыра: а неблап чалавек быў!» Быў... як бы не ведаў, што ён ёсць, будзе; аднагодак, намнога пераживе Пятра Усцінавіча.

«Дык вось жа ён пісьмо прыслаў».

Броўка ўсхваляваўся яшчэ больш. Доўга чытаў кароткае пісьмо, не ўзяў яго сабе — вярнуў мне, не параіўшы, аднак, адказаць. Тады я не ведаў, што да вайны яны былі лепшыя сябры. Забягаючы наперад, скажу, што, пасля звароту Скрыгана, сяброўства іх працягвалася. Броўка стараўся памагчы рэабілітаванаму таварышу ўсім, чым мог,— кватэрай, выданнямі. Гэта было пазней. А тады я не мог пакінуць пісьмо івана Аляксеевіча без увагі. Мне вельмі захацелася адказаць яму шчыра, па-сяброўску. Такое было ў рэчышчы майго стаўлення да тых змен, якія адбываліся ў грамадстве. І я напісаў Янку доўгае, старонак на некалькі, пісьмо пра Саюз, пра сябе, пра сяброў маіх, што прыйшлі ў літаратуру пасля вайны.

Пасля Скрыган расказваў, неаднойчы і не аднаму мне, як кранула яго мае пісьмо — першае пасля арышту ад беларускага пісьменніка, калегі. «Я адчуў, што набліжаецца вялікая змена ў маім жыцці — калі мне вось так могуць пісаць мае маладзейшыя таварышы».

Адказаў ён мне з удзячнасцю, але стрымана — каб не «падвесці добрага чалавека». Больш пісаў пра маё апавяданне, якое прачытаў у «Беларусі». (Хто выслаў яму часопісы?) Нават рабіў далікатныя заўвагі — па мове. Адарваны ледзьве не на 20 гадоў ад Беларусі, Скрыган не страціў чуцця роднай мовы. Калі пасля працаваў у БелСЭ (Броўка ўзяў яго да сябе), то быў прызнаным аўтарытэтам, найлепшым стылістам.

Прайшло колькі месяцаў, Янку рэабілітавалі, і ён вярнуўся ў Мінск. Мы сустрэліся на ганку будынка СП па вул. Энгельса. Не помню, хто мне прадставіў яго, здаецца, Алесь Якімовіч.

«Гэта — Янка Скрыган».

«Скрыган?!» — здзівіўся я і ўзрадаваўся.

«А гэта — Іван Шамякін».

«А братачка ты мой! Дык гэта ты? Дай я цябе пацалую. Каб ты ведаў, як я табе ўдзячны, за пісьмо тваё».

Увайшлі ў кабінет (ён быў адзін на старшыню і намесніка) і доўга гутарылі.

30 сакавіка

У мяне, увогуле, была павышаная цікаўнасць да пакутнікаў, што вярталіся з няволі. Да Бярозкіна, напрыклад, пра што я пісаў. Бярозкін многа расказваў, залішне многа — увесь лагерны «фальклор», як я цяпер пераканаўся з многіх публікацый. А з яго расказаў выходзіла, што ўсё гэта адбывалася з ім. Нічога такога не расказваў Янка Скрыган. У яго ўсё проста, буднічна — проста жыццё, вельмі цяжкае,— у Сібіры, Сярэдняй Азіі. Нядоўгая радасць была ў Эстоніі, дзе яго паўторна арыштавалі (прамаргалі энкавэдысты з'яўленне «ворага» ажно ў Эстоніі, на мяжы). Пра жахі лагерныя ён расказваў нямнога, стрымана. Але ад сціпласці трагізму ў яго расказах было не менш. І была яшчэ адна асаблівасць: ніколі ў яго не вырывалася нянавісць да савецкай улады, да партыі ў цэлым, як праяўлялася гэта ў другіх.

Янка Скрыган ніколі не ныў, ніколі не скардзіўся. І жыццё, якое займеў тут, у Беларусі, прынімаў з радасцю, з захапленнем. Большага аптыміста я, бадай, не ведаю. Можа, гэта рыса характеру, вельмі істотная, і памагае яму жыць доўга, жыць творча. Дай бог пражыць табе, мой добры сябра, яшчэ не адзін год!

Прыём у Саюз для яго быў шчасцем. Помню яго прыём у партыю: усе, старыя і маладыя, гаварылі вельмі хораша. Думаю, што камуніст ён быў шчыры — не для кар'еры. Якая кнр'ера ў пісьменніка, ды яшчэ з такой біяграфіяй!

Творчай пладавітасцю не вызначаўся, хоць меў пра што нісаць. Пра лес свой — колькі нарысаў, апавяданняў, назваўшы цыкл іх «Кругамі». Я рэкамендаваў кнігу яго ў «Советский иисатель» і ўважліва перачытаў. Чціва не для тых, хто шукае вострых адчуванняў — незвычайных сюжэтных хадоў. Не, Скрыган не сюжэтчык, бадай, і не бытаапісальнік. Яго творы — для людзей сталых, сур'ёзных, удумлівых. Прастата, з якой ён расказвае пра даволі драматычныя падзеі,— гэта не ад старонняй сузіральнасці, а менавіта ад таго, што аўтар удзельнік гэтых падзей і ў яго свая філасофія. Талстоўская? Магчыма. У яе беларускім сялянскім увасабленні.

Нейкі час мы жылі ў адным доме (Маркса, 36), у адным пад'ездзе, пасябравалі сем'ямі, яшчэ больш зблізіліся.

5 красавка

Заўтра развітаюся з энцыклапедыяй: так вырашыў бог і начальнік— міністр Анатоль Бутэвіч, які вельмі ж шкадуе мяне. Дзякуй яму. Я сам шкадую сябе. І яго, нябогу. На мае месца назначаецца Міхась Ткачоў, супраць якога настроена большасць калектыву: заваліў як загадчык рэдакцыі гісторыю Беларусі. Змагар за Беларусь! Каб не назначаць яго, да Бутэвіча хадзіла дэлегацыя.

Настрой у мяне сабачы. Фінал! Што мне застаецца — Камітэт міру? Не грэе. Пра камітэт я напішу.

Малайчына Маша: яна не дае дайсці да роспачы. «Спі спакойна. І не думай. Ты сваё адпрацаваў!» Гэта так — адпрацаваў!

А можа, гэта і не канец? Нечакана ў адну ноч сканструяваў апавяданне. Пачаў пісаць. Апавяданне — прагноз. Сумнае і злое.

8 красавка

Пазаўчора вызваліўся ад пачэснай пасады галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя». Была савецкая. Баяцца нават слова «савецкая». Перад кім становімся на лапкі? Жалкія рабы!

Сам Бутэвіч не з'явіўся, прыслаў намесніка Станіслава Нічыпаровіча. Той прачытаў загад. Сказаў два словы. Я прачытаў напісанае колькі месяцаў назад развітальнае слова. Два словы сказаў Хаўратовіч. І ўсё. Загад аб прызначэнні М. А. Ткачова, лідэра БСДГ. «Придут другие времена,— взойдут другие имена».

А ўчора я прыехаў па зарплату. Кабінет пусты, новы галоўны ўладжвае свае справы. Увайшоў Генадзь Маслыка, адзін з разумных загадчыкаў рэдакцый, і сказаў:

«Ад імя большасці калектыву хачу папрасіць у вас прабачэння».

«За што?»

«За тое, як праводзілі вас. Кветачкі не купілі нават».

«Ах, бог з імі, з кветкамі».

«Ды справа не ў кветках — у культуры нашай».

Гэта так. Аказваецца, да апошняй хвіліны трымалі ў сакрэце ад людзей гэты «ўрачысты акт». Але ж Хаўратовіч, Мамашэвіч ведалі. І Самуэль, якая памагала Ткачову «ўзысці на прастол», ведала. Сумна і горка. Ды хіба ўпершыню разачароўваюся ў людзях? Ды ці я адзін?!

Учора быў на вечары выдавецтва «Мастацкая літаратура»: юбілей — 20 гадоў. А помпы! Пасяджэнне ў татры Янкі Купалы. Спектакль. Гэта парадаксальна — свет можна здзівіць: праклятыя камуністы стваралі выдавецтва, і пры іх яно жыло, і пісьменнікі пры ім жылі, няхай і небагата, але ніхто не быў пакрыўджаны. А цяпер канае

выдавецтва, канае літаратура, галадаюць творцы. Поўны развал. Але юбілеі давай! Сэнс? Абы выпіць? Выпілі добра.

Прапіваем тое, што яшчэ не раскралі, што не пералілося яшчэ ў кішэні новай буржуазіі. А накапіцелям першаснага капіталу наплявацъ на літаратуру, тым больш беларускую. Зарабіць можна на «Анжелике»: прадаецца камплект — 8 кніг па 500 руб. Але ўпэўнены: хутка і гэтая крыніца выкачвання ў народа грошай вычарпаецца: галодным не да «Анжелик». Хутка кнігі заменяць плакаты: «Хлеба! Хлеба!»

19 красавка

Пішу апавяданне і не разгортваю дзённік. Ды і што пісаць? Страшны крык душы? Цяжка асэнсаваць, што робіцца — чаму і дзеля чаго? Здаецца, людзі, што стаяць каля руля Расіі, Украіны, Беларусі, Малдовы, Грузіі, Арменіі, Азербайджана, ды і азіяты, звар'яцелі. Як бы спаборнічаюць, хто хутчэй канчаткова разваліць сваё «княства», давядзе народ да голаду і самазнішчэння. Расійскі з'езд — камедыя, фарс. Але калі гайдары — бурбулісы пагразілі адстаўкай, як пачалі ціснуць з-за бугра: не дамо 24 млрд. долараў! Калі дадуць? Як дадуць? На якіх умовах? Што з гэтага атрымае мая шматпакутная Беларусь? Яе лідэры таксама спаборнічаюць, як хутчэй абрабаваць народ. Жах, што робяць! Павышана ў чатыры разы цана на бензін — 6 руб. за літр (а быў жа пры камуністах — 16 кап.), у 5-6 разоў — на дызельнае паліва, асноўнае для сельгастэхнікі. У разгар пасяўной! Каго бог хоча пакараць, ён пазбаўляе яго розуму. Ці так масава прадаюцца? Выраслі цэны на газ, ваду, электраэнергію. Зноў падаражэла гарэлка.

27 красавка

Вялікдзень. Але... няма радасці, няма свята. Свята, бесперапыннае, можа быць, калі ў сям'і ўсе жывыя, здаровыя, калі ёсць спакой, лад, дабрабыт. Як было гэта 40, 30, 20 і 10 гадоў назад. Хоць дзесяць гадоў назад, якраз на 1 мая я страціў вока.

Адтуль ці яшчэ раней — з першай аперацыі, са смерці бацькоў пачаліся ўдары лесу.

Учора ўсё ж было свята. Прыехала Таццяна з дзецьмі. Абедалі. Без чаркі: Слава — за рулём, а я запрошаны быў мітрапалітам Філарэтам на велікодную вячэру — богаслужэнне і пасля на святочны прыём.

Стаяць у саборы дзве гадзіны было цяжка — я апрануў цяжкае паліто. Але, увогуле, цікава назіраць гэты грандыёзны спектакль, выдатна адрэпеціраваны за стагоддзі. Не тое што па тэлебачанні.

Вось яны, свяшчэннікі,— рукой падаць, і большасць знаёмыя. Харошы хор. Усё ўспрымаеш у комплексе.

Уважліва праслухаў па тэлебачанні на ўсяночнай палітычнае пасланне Алексія і тут, у саборы, пасланне Філарэта. Расчаравалі. Хапіла ў іх пафасу «предать анафеме» той лад, што разбураў рэлігію — камуністаў. Але маглі б больш поўна сказаць, хто гэта рабіў: свярдловы, троцкія, луначарскія і ўсе, хто служыў другой веры, ненавідзеў праваслаўе. Не, ні разу царква не сказала гэта з той адкрытасцю, з якой робяць лепшыя рускія пісьменнікі. Каму ж вы служыце, святары? Папоў цалуе патрыярху ручку. Здзек. Насмешка. Алексій, патрыярх усея Русі, знаходзячыся ў ЗША, пайшоў на паклон да рабінаў. Першы такі выпадак за ўсю гісторыю царквы. А пасланні? Яўнае угодничество перед власть имущими і ні слова пра тое, да чаго ўладары давялі народ.

Заклікалі б народ пасеяць хоць, ураджай сабраць! Каб жыла вера, павінен быць хлеб надзённы. Раней царква клапацілася пра гэта. А цяпер да таго, як і колькі будзе пасеяна, няма клопату, як і ў парламентарыяў нашых. Якое ж свята можа быць у душы?

Даўняя думка і абурэнне: чаму Сінод не выступіць у абарону хрысціян — армян? Голас 200 млн. праваслаўных — малітвы і пропаведзі — вымусілі б мусульман задумацца раней, чым паўтарыць генацыд 1915 года. А могуць паўтарыць! Нахабства мусульманскае расце! Туркмены перакрылі газ на Украшу і вядуць перагаворы, каб гнаць гэты газ у Еўропу праз Іран і Турцыю. А пазёр Краўчук едзе ў Іран і просіць газ! Той жа туркменскі газ паставіць Іран. Якія ідыёты! Сваю дзяржаву развалілі, каб цяпер гэтак зняважліва нізкапаклоннічаць.

Я заўсёды быў добры чалавек і нікому не жадаў зла. А ўчора стаяў у саборы, а перада мной, праз праход на сцэну, на якім «ігралі» святары, каля алтара стаялі дзеці, я глядзеў на іх, і мне пад святое песнапенне хацелася плакаць: што іх чакае — дзяцей? Толькі б не голад!

На п'янцы начальства было больш, чым у царкве. І выпівалі добра. Ды і Філарэт шчыра куляў чаркі. У жыцці ён — свецкі, кампанейскі чалавек. Дыпламат. Недарэмна ўзначальіпў знешнія зносіны Сінода.

Заўтра выбары прэзідэнта АН. Кіпяць страсці. Да мяне толькі што заваліўся Рыгор Жэбіт з Інстытута філасофіі, зямляк, паляшук. Дзіўны чалавек! На любых выбарах ён актыўны арганізатар гэтых выбараў, прапагандыст за адных, бязлітасны обличитель другіх. Памойму, не заўсёды ўпапад. Ды і сам што мае? Прызнаваўся, што

людзі, якім памагаў, пасля прадавалі яго. Але гэта не дзіўна. Хіба ў мяне мала было такіх «сяброў»?

Маша з дзецьмі паехала на дачу. Сонечны дзень. А мне вячэраць з немцамі. Са святарамі нашымі было больш прыемна. Дапускаю, што яны добрыя людзі. Але — немцы. У маім новым апавяданні, якое пішу, мастак Рачыцкі кажа: «Назаві мне хоць адзін факт... у гістарычным плане... каб немец без выгоды памог славяніну?» Так, чалавек чалавеку можа. Але немец — славяніну, у гістарычным плане!.. Пакуль што яны не ўступілі ў актыўную экспансію: многа клопатаў з былой І ДР. Але калі парламент і ўрад прадоўжаць сённяшнюю палітыку, хутка нас акупіруюць, і гэта будзе не менш жорсткая І больш трывалая акупацыя, чым у 1941-1944 гг.

4 мая

Мінуў Першамай. І зноў без радасці. Гадзіны тры задавальнення, калі пісаў апавяданне. І абедаў з унучкамі. Пісаў, па-мойму, 2 мая. Забываюся, што рабіў тры дні назад. Але помню, што было 30 гадоў назад.

Сёння паехаў у гараж. Засмуціўся. У «Волгі», якая набегала 2 тысячы км сеў акумулятар так, што не загарэлася лямпачка А трэба гнаць на рэгістрацыю машыну, якая была ў Сашы (у Таццяны, нявесткі, хапіла сумлення не прэтэндаваць на машыну, якую я падарыў сыну). Стаяць тры машыны і — ніводнага акумулятара. А цану да яго нагналі да 4-5 тысяч. Жах!

17 гадоў плаціў за стаянку машыны ў гаражы — 19 руб. Месяц назад—107, сёння парадавалі — 227. Каму трэба такое рабаванне? І куды ідуць гэтыя грошы, якіх усюды не хапае? На стварэнне класа капіталістаў? Поўны развал. Ці перажывала хоць адна краіна нешта падобнае нават пасля татальных войн? Сумна. Горка.

Паехаў з унучкамі на дачу. Вясна. Зелень. Парадавацца б. Падняўся ў свой кабінет, сеў за рабочы стол і... пачуў жаданне заплакаць па-дзіцячы — наўзрыд. Пасля сядзеў у бяздумнай прастрацыі.

Так праходзяць выхадныя дні — пяць нерабочых дзён?

У БелЭН абвясцілі «адгул» да 11 мая. Чым заняцца народу, асабліва таму, у каго няма дачы?

Учора гуляў па парку і ўбачыў сітуацыю са свайго апавядання, якое пішу: паэт, не член СП, прадаваў сваю кнігу, выпушчаную недзе на Доне. А жыве і працуе Арнольд Патап'еў у Мінску. Прачытаў дзесятак вершаў. Па тэхніцы слабей, па думцы і пачуццях не горш, чым у многіх прызнаных паэтаў.

У мяне прадае свае кнігі вядомы на ўвесь былы Саюз стары пісьменнік — прадаю я. Не дай божа, каб адбылося гэтае змрочнае прароцтва.

9 мая

Дзень Перамогі. Адзінае свята, якое адзначаецца ўсімі народамі былога Саюза — вялікай магутнай Дзяржавы. Рускімі і ўкраінцамі, армянамі і азербайджанцамі. І новыя ўлады прызналі. Думаю, падзеі 23 лютага навучылі нечаму ельцыных і паповых. Прэзідэнт Расіі выступіў са зваротам да народа. У нас — загад міністра абароны Казлоўскага. Што за фігура — не знаю. Беларуская армія... калі яна будзе, якая яна будзе? Іван Навуменка сказаў мне: «Вы не адчуваеце, што мы ператвараемся ў захудалую правінцыю?» У сэнсе культуры ўжо ператварыліся. Без перакладаў і выданняў на рускай мове мы, пісьменнікі, будзем даходзіць хіба да Пухавіч, да Гародні не дойдзем, там хутка запануюць палякі.

Сустрэў неяк днямі Івана Пташнікава. Больш змрочных прагнозаў ні ад каго не чуў, нідзе не чытаў, ні ў камуністычных, ні ў манархічных выданнях. І пра армію вельмі негатыўна адзываўся, пра генералітэт наш. І правільна! Дзярмо генералы! Пташнікаў слушна сцвярджае: народ прадалі двойчы дзве сілы: першая — КПСС, другая — Савецкая Армія. Нельга не згадзіцца. 15 млн членаў партыі пайшлі, як бараны, на бойню: нідзе ва ўсім СССР не выступілі ў абарону свайго райкома, гаркома. Што датычыць арміі, то прадала не армія — генералітэт, які не падтрымаў Язава і пайшоў на паклон да Ельцына. Пташнікаў мае рацыю: як можна, прыняўшы прысягу Саюза, тут жа прысягаць Краўчуку.

Ішоў дождж, але я пайшоў да манумента Перамогі. З-за дажджу народу было нямнога, але ветэраны сабраліся. Многа знаёмых. Ускладалі вянкі. Афіцыйна. Першых асоб я не бачыў: намеснікі, міністр абароны, гарсавет. Прачаканіў крок ганаровы каравул. Раней на такія дробязі не звяртаў увагі, цяпер запамінаецца кожная дэталь: што выкінулі, што змянілася, што ўвялі новае. Новага няма. Каля варот парку, калі ветэраны ўжо разышліся, збіраліся дзве групы: Чыкін з групай камуністаў і другая — пад незнаемым сцягам. Камуністы і манархісты? Не. Славянскі сабор. Упэўнены, што толькі Саюз славян можа нас уратаваць. Без саюзу з Расіяй, Украінай — мы, беларусы, фікцыя, захудалая правінцыя, як сказаў Навуменка.

Паабедаў з Сяргеем і Алесяй (Маша на дачы), выпілі па шклянцы віна. Пазваніў ветэранам-пісьменнікам. З Піменам Панчанкам і Міка-

лаем Кругавых гаварыў доўга, вуха забалэла. Разумею іх: людзям хочацца выказацца.

14 мая

Пазваніў В. Зуёнак, што В. Кебіч будзе праводзіць у СП антыкрызісны камітэт. Камітэт мне — да лямпачкі, хоць ад імя Камітэта абароны міру я і падпісаў дэкларацыю. Кебіч нам трэба для вырашэння пытання аб ганарары. Мы жабракі, нам плацяць па 300 руб. за аркуш — па стаўках 1982 года. Два месяцы просімся да прэм'ера, і ён не можа прыняць групу пісьменнікаў — Брыль, Шамякін, Чыгрынаў, Зуёнак, Законнікаў. Было калі такое? Пры Панамарэнку, Патолічаве, Мазураве, Машэраве, Кісялёве? Маглі яны не прыняць Коласа, Броўку, Лынькова, а пазней і нас, грэшных? Вось табе і нацыянальнае адраджэнне! На храна Кебічу беларуская літаратура! Улада і грошы — багі яго. Канешне, прэм'ер не прыехаў, чакалі паўтары гадзіны: вёў прэзідыум, пасля паехаў на пахаванне сваяка. Але здзівіў мяне збор выканкома камітэта: Пазьняк, Трусаў, Голубеў, Вярцінскі, Ткачоў, падпалк. Статкевіч, яшчэ нейкі палкоўнік, якія спрабуюць размаўляць па-беларуску — з натугай, калькай. Далікатна пасядзеў я на іх пасяджэнні, амаль бязмоўна. Цікава было паназіраць. Дакументы — накіды, эскізы. Але пыха!.. Гэта было цікава назіраць, як Пазьняк і Трусаў уяўляюць сябе вершителями судеб народа. Але трагедыя ў тым, што ў гісторыі нярэдка да ўлады прыходзілі бесноватые Гітлер, Сталін, Напалеон, Мао і інш., па сутнасці шызафрэнікі. Перад іх нахабствам пасуют. Вялікая заслуга буржуазнай дэмакратыі, што яны здолелі адгарадзіцца ад такіх: кандыдаты ў прэзідэнты праходзяць праверку ў псіхіятраў.

Змрочны жарт: ратаваць нас можа толькі Іосіф Адольфавіч Піначэт.

18 мая

Пазаўчора пераехалі з Машай на дачу. Быў цёплы дзень. А ўчора так захаладала, што я дзіка мёрз на верандзе, дзе тэлевізар. Ды і тэлевізар — адзіная пацеха, даволі брыдкая па многіх перадачах «дэмакратаў» — быў разрэгуляваны — постаці людзей, што ў пакоі смеху, кароткія і тоўстыя. Для палітыкаў гэта падыходзіла: такія яны і ёсць — крывыя, пачварныя. Але ж фільмы!.. «Багатыя таксама плачуць». Прымітыўная — па рэжысуры, ігры акцёраў — высмактаная з пальца меладрама, а трымае і старых, і малых, і нават такога сачыніцеля, як я, што з'еў на сюжэтах сто сабак. А што яшчэ глядзець? На шчасце, добры сусед пад вечар адрэгуляваў мне тэлевізар.

Гэта парадокс: магу пераканаўча напісаць і аратага, і слесара, і архітэктара, і ўрача, а сам нічога не ўмею, цвіка забіць, каб добра трымаў. Сёння зноў пацяплела, надвор'е ўзняло настрой. Маша і Вольга Філатаўна працуюць у агародзе, а я не знаходзіў, чым заняцца. Апавяданне (вызначыў жанр «фантастычная аповесць») скончыў. Страшна ад такой «фантастыкі» — ад прагнозу, што нас чакае ў канцы 1993 года. Але самае страшнае, што гэта, напэўна, будзе рэальнасцю. Нашы «мудрацы» баяцца такіх прагнозаў, нават калегі мае; рускія (Бялоў, Распуцін) прагназуюць тое ж. Палітыкі маўчаць. А сёння чуў па «Маяку» прагноз спецыяліста Міжнароднага валютнага фонду: Расіі трэба 10 гадоў, каб стабілізаваць рынак, у бліжэйшыя тры гады спажыванне будзе зніжацца. Да якой мяжы? Ці не ніжэй той, у якой апынуліся мае героі — багатыя людзі ў мінулым: вядомы пісьменнік і больш чым вядомы — славуты мастак. А беднасць, голад асабліва, прыніжае людзей. Прыніжае інтэлігентаў, штурхае на злачынства «простых людзей». О, гэтыя загадкавыя простыя людзі! Чаму маўчаць? Дзе ты, гераічны рабочы клас? Цябе ж рабуюць бессаромна, а ў цябе адзінае патрабаванне: павышай зарплату. А купляць за гэтыя тысячы што? Не разумею я «дэмакратаў», адамовічаў, чарнічэнкаў, столькі яны выліліслёз аб лёсе сялянства і цяпер ухваляюць сітуацыю, пры якой фермерства немагчыма. Хто можа стаць гаспадаром і даваць таварную прадукцыю пры сённяшняй цане на машыны, угнаенні, бензін, салярку? Між іншым, толькі што пачуў: Расія зноў падняла цану на энерганосьбіты. Што застаецца нам? Беларусаў так рабуюць з усіх пяці бакоў: Літва, Польшча, Украіна, Латвія, Расія.

Па-мойму, у хуткім часе «добрыя суседзі» пачнуць рваць нас на кавалкі — Пташнікаў мае рацыю. І легка дакажуць: не было ў гісторыі такой краіны — Беларусь. Маніпуляцыя з дзяржавай 400-гадовай даўнасці — Вялікім княствам Літоўскім — фікцыя, мыльны пухір. А між тым: ёсць народ, і ён мае права на сваю дзяржаўнасць. І яна можа быць у Саюзе з вялікімі і магутнымі. Апаненты кідаюць: а Фінляндыя, Нарвегія, Данія? Так. Але для гэтага трэба мець такую гісторыю, якую маюць яны. У нас яе няма. Адмаўленне ад гісторыі апошніх 70 гадоў (усё ж 70!), ад савецкай гісторыі — памылка нацыяналістаў. Існаванне БССР, падпісанне рэспублікай першага Саюзнага дагавору ў 1922 годзе — наш сур'ёзны козыр. Як неразумна выкідваем яго, козыр гэты, з гульні. Як гэта ў карцёжнікаў называецца? Шулерства?

Ах, колькі іх, шулераў ад палітыкі, у палітыцы!

24 мая

Нават пры Сталіне мы так не фальшывілі: не займаліся самападманам. Тады, прынамсі, я верыў. Мільёны верылі. А цяпер ні ў што не веру. І калегі мае не вераць і выказваюць гэта ў размове адзін на адзін. А публічна займаюцца «мастацкім свістам». І пятніцу адбылося пашыранае пасяджэнне рады, на самай справе звужанае, бо і кворуму членаў рады не было. Мудрыя кіраўнікі, маладыя, вынеслі глабальнае пытанне «Адраджэнне і сучасны літаратурны працэс». Які фальш! Якое адраджэнне? Дзе яно? Культура, тая культура, што створана была за 70 гадоў «таталітарнага рэжыму, няволі, уціску, цэнзуры», канае. Усё рушыцца: літаратура, мастацтва, кіно, тэатр. .Сустрэў Марыю Захарэвіч: тэатр Купалы не можа выехаць на летнія гастролі не толькі ў Маскву, Кіеў, Рыгу, Новасібірск, куды ён штогод ездзіў пры «праклятых камуністах»,— у Гомель, Пінск не можа выехаць. «А што — па Мінскай вобласці?» — «Ды і на выезд у калгасы грошай няма». Вось так! Такое адраджэнне!

А свіст у нас быў. У. Конан зрабіў агляд прозы за 1991 год. У мяне такое ўрэжанне, што некаторыя з твораў, якія назваў, ён не чытаў — па чутках, па інтэрв'ю пісьменнікаў у «ЛіМе». Разумны і хітры Алег Лойка абмежаваў сваё паведамленне агульнымі разважаннямі без прозвішчаў, твораў — гэта аб паэзіі сучаснай, у якой не менш, чым пры Сталіне, сацыяльнай няпраўды, эйфарыі, «свісту». Ці ёсць хоць адзін твор і ў прозе і ў паэзіі аб сучасным жыцці людзей — рабочых, сялян, інтэлігенцыі, аб нараджэнні «трэцяга саслоўя» — як злачынна яно нараджаецца? Большасць мільянераў можна сёння садзіць на лаўку пэдсудных. Пры камуністах нам не давала сказаць праўду цэнзура. А цяпер хто не дае? Цэнзар, які сядзіць у кожным: баяцца, каб іх не асудзілі за ўхіл ад адраджэння. Не знаць жыцця народа не можам: самі творцы сядзяць на галодным пайку.

Інстытут літаратуры АН уключыў у навуковы план эмігрантаў. Во адкрыццё зробяць! Брыль у соты раз адзначыў ісціну, што мы вельмі дрэнна чытаем адзін аднаго. Некалі чыталі, цяпер сапраўды не чытаем. Брыль сказаў, што ён чытае. З адным вокам. Я шкадую сваё адзінае вока, хоць чытаю нямала публіцыстычнай муры. Я чытаю павольна, цяжка, удумпіва. Таго ж Брыля, Быкава, Пташнікава.

Сёння ўсе паехалі на «Лысую гару» на Таццянін участак, на якім гаспадыня была за вясну першы раз, зямлю ўрабілі Маша і Вольга Філатаўна.

Застаўшыся адзін, я вырашыў навесці парадак у гаражы. А там завалы. Колькі ўсякіх вадкасцей для машыны, і ўсё гэта некалі каштавала капейкі. Раней пры такіх рэвізіях я шмат што выкідаў. Цяпер

— не: можа, і не спатрэбіцца, але няхай стаіць. Знайшоў дзесятак запісных кніжак, у якіх мной, дзецьмі запісана па колькі тэлефонаў. Ні адну не выкінуў, абцёр пыл, схаваў у лазні. Беднасць прывучае да ашчаднасці. Але ж яшчэ не беднасць. Абураюся, што і Таццяна, і ўнучкі не перанімаюць маёй ашчаднасці. Ці гэта — псіхалогія старых? Дзед мой Міна (я пісаў пра гэта) і бацька былі незвычайна ашчаднымі людзьмі і пры гэтым пражылі ў страшнай беднасці. А дзед Сцепанец быў шчодры і... багаты, да рэвалюцыі жыў багата. Памёр жабраком — пасля вайны ў Краснадарскім краі. Які лёс чакае нас? Няўжо жабрацтва? Прарочае апавяданне напісаў, ажно страшна зрабілася, калі пазаўчора перачытаў, робячы папраўкі. Не дай, божа, дажыць да такога. Вось у такім адраджэнні мы жывём. Так займаемся самападманам. А можа, гэта адзінае, што грэе нейкую надзею, хоць маленькую?

10 чэрвеня

Сумуе мой дзённік, паўмесяца не разгортваў, хоць жыў ім — чытаю даўнія запісы, пачаў з 1981-1982 гг. Цікава. Гісторыя з публікацыяй «Петраграда...», якую я напісаў у мінулым годзе, не помнячы, што яна заняла так многа месца ў дзённіку дзесяцігадовай даўнасці. Хораша і цікава напісаны ролі Кузьміна і Антановіча і нават Кісялёва. Цяпер іх боязь, страхоўка здаюцца смешнымі, але і сумнымі: калі такой дробязі не маглі вырашыць, то як вырашаліся вялікія дзяржаўныя пытанні? Поўны параліч актыўнай дзейнасці, самадзейнасці, усе глядзелі ў рот маразматыку Брэжневу, палітыкану Суславу, прыстасаванцу, падхаліму і нахабніку Шауры, хітруну Зімяніну і іншым такім жа, што сядзелі ў ЦК КПСС. Гэты параліч не даў магчымасці вялікай партыі — партыі Леніна — абараніцца ад Гарбачова і Ельцына. Крыўдна. Балюча.

Дзённікі чытаю з мэтай публікацыі — дамовіўся з Законнікавым і Пташнікавым. Выбіраю. Але шкада тых шчырых запісаў. Здымаю хіба негатыўнае пра калег, якія жывыя і здаровыя. Кузьміна мне таксама шкада, увогуле, ён нядрэнна ставіўся да нас з Андрэем. Але без яго боязі і страхоўкі гісторыя «Петраграда...» будзе незразумелай і нецікавай, непатрэбнай сучаснаму чытачу. Думаў выбраць самае-самае, галоўным чынам мемуарныя старонкі. Шкада рэзаць па жывым, каштоўнасць дзённікаў — у іх паўнаце і натуральнасці, адсутнасці пазнейшага рэдагавання. Мой дзённік чытаўся б. Але... Пазаўчора адкрыў «7 дней» і прачытаў «факт з каментарыем» — «Пресса в накауте». Пісьмо дырэктара выдавецтва Іванавіча (былога работніка ЦК) рэдакцыям, міністэрству інфармацыі, фінансаў:

«Сообщаем, что в связи с недостаточным финансированием газет и журналов «Наше слово», «Голас Радзімы», «Дети и мы», «ЛіМ», «Неман», «Беларусь», «Полымя», «Мастацтва», «Крыніца», «Спадчына», «Тэатральная Беларусь», «Мападосць», издательство «Полымя» вынуждены с июля т. г. приостановить выпуск вышеперечисленных изданий.

Вось так! І калі гэта здарыцца, то гэта не накаут, гэта, як кажуць, пад нож усю беларускую перыёдыку, усю мастацкую літаратуру. Як можа развівацца літаратурны працэс без перыядычных выданняў?! А што творыцца з кнігамі? Дажылі, даскакаліся, спадары дэмакратыі! У 1922 годзе адкрылі «Полымя», у 1943-1944 аднавілі «Полымя», «ЛіМ», стварылі «Беларусь», «Вожык». Неўзабаве «Маладосць», пасля — «Неман». Раслі! Ніякія партыйныя перастрахоўшчыкі не маглі спыніць літаратурны працэс, нацыянальны, нягледзячы на русіфікатарскую палітыку.

Дэмакраты, «змагары» за нацыянальнае, за незалежнасць падкасілі пад корань аснову нацыянальнай культуры — літаратуру. Жыве Беларусь! З чым? З кім? З гандлёвай мафіяй, пярэваратнямі, якім начхаць на ўсё беларускае? А я, наіўны дзед, мару апублікаваць дзённікі. Смешна. Сумна. Балюча.

«Вожык» у рубрыцы «Знаёмыя творы» даў шарж: я з лапатай-пяром з лейкі паліваю дрэва, з якога ападаюць мае кнігі, зоркі сыплюцца міма. Малюнак Гіргеля, словы майго сябра Барадуліна:

Хвалілі партыя і ўрад
І ставілі класічна ў рад.
Ды сціх узнагародны град.
Што ўзяць з літаратурных град?
Як спадзяванне мець на ўрад?
Цяпер Шамякін рад?
Наўрад.

Ды не, Грыша, не наўрад — чаму такая няпэўнасць? Што можа радаваць? Цікава, што цябе радуе? Што закрываюцца беларускія выданні, канае літаратура?

17 чэрвеня

Ельцын перад сумесным пасяджэннем кангрэса і сената: «Коммунистический идол рухнул навсегда. Это заявляю я вам...» Няма слоў для абурэння. Май жа сумленне: ты — адзін з тых, хто ствараў гэтага ідала.

А якое ханжаства! Жах! Пакуль Ельцын прадаваўся Бушу, жонка яго і пані Буш рабілі сэндвічы для... беспрацоўных. Пасаромеліся б тэлепадхалімы паказваць такое. Не! Няхай народ знае!

Кангрэсмены і сенатары сустрэлі заявы Ельцына авацыяй, падняўшыся з месц. Яшчэ б — такая радасць! Пра такое яны і не марылі, не снілі.

19 чэрвеня

«Одиннадцать раз американский конгресс стоя аплодировал президенту России» — даюць шапку «Известия». Што яны — ідыёты ці вялікі народ лічаць за ідыётаў? За што апладзіраваў? За такі падаруначак можна падняцца і не адзінаццаць разоў! Нам бы яго атрымаць. У. Надзеін не мог утрымацца ў канцы рэпартажу ад пытання, якое хвалюе не толькі расіян, але і ўсе народы былой магутнай дзяржавы — СССР: «Спишут ли они ядерные подводные лодки в металлолом с той же решительностью «непаралельнасцю», с которой Россия сняла с боевого дежурства могучие ракеты СС-18?»

Вось такая была «камуністычная імперыя». За 40 гадоў адных ракет зрабілі столькі, што за 20 гадоў іх немагчыма знішчыць — не хапае «пораху» нават пры амерыканскай дапамозе. І нідзе не было жабракоў. Экспарт рэвалюцыі — глупства. Але ж на ўсё хапала. І не было дэфіцыту бюджэту. Эканамісты! Растлумачце гэты феномен. А сёння чытаю ў тых жа «Известиях»: «За пять последних месяцев животноводство Украины принесло республике убытков на астрономическую цифру в 55,7 миллиардов рублей...» Пры цане каўбасы ў 100-300 руб. А пры цане ў 2-5 руб. не прыносіла. Ніводзін эканаміст не можа растлумачыць гэтага абсурду. І хаця б адна рэспубліка — незалежная, калі не палепшыла, то не знізіла б узровень жыцця свайго народа. Дзе там! Прыбалты, з якімі заходнія дабрадзеі няньчыліся, па якіх пралівалі слёзы, жывуць горш, чым мы, беларусы. Абіраюць нас, вывозяць мяса, масла, халадзільнікі, тэлевізары. Вось табе і капіталістычны лад!

22 чэрвеня

51 год пачатку вайны. У душы маёй гэта заўсёды быў дзень памяці па тых, хто не вярнуўся. Але тайна жыла і радасць, што я вярнуўся. Застаўся б пад Мурманскам — і ніякага следу. Як успаміналі б Маша і Ліна? Сёння няма гэтай тайнай радасці. След? Напісана многа. А лёс усёй гэтай спадчыны? Справа не толькі ў тым, што пазнякам хочацца закрэсліць усю «камуністычную літаратуру». Трачу веру, што нашчадкі мае — дзеці, унукі — праявяць такія ж намаганні, як праяўляе, напрыклад, удава У. Карпава. Слава ёй! Дзеці Андрэя— абыякавыя да яго спадчыны. Баюся, як бы выпускам пяцітомніка не закончылася ўвекавечанне. А ён, Андрэй, быў

упэўнены, што п'есы яго будуць ставіць гадоў 50. Ах, Андрэй, каб ты, дружа, ведаў, чым скончыцца наша напружаная праца!

По ком звонит колокол? Сённяшні, памінальны. Ён звоніць не толькі па брату майму Паўлу — ён звоніць і па мне. Нас адпяваюць жывых. І гэта самае страшнае.

З трывогай, але і з... надзеяй чакаю сённяшняга мітынгу на Манежнай. Дай бог, каб нас сабралася многа — і больш нічога не трэба. Ворагаў павінна ўстрашыць наша масавасць — масавасць бацькоў, дзядоў. А калі яшчэ далучыцца і моладзь, ворагі мусяць смактаць валідол. Мы — народ! А ён бессмяротны. Яго нельга ні разагнаць, ні расстраляць.

Няхай жыве, няхай здравствует народ!

27 чэрвеня

Маша і Вольга Філатаўна паехалі на Чыжоўскія могілкі — на магілу Клаўдзіі. Сёння 17 гадоў, як яна памерла гэтак жа раптоўна, як і Саша наш. Я пісаў ужо, яшчэ даўно, у «Карэннях...», што Вольга ездзіць на магілу сястры кожную нядзелю ўсе 17 гадоў! Прыклад вернасці, не сястрынскай, мацярынскай, яна вырасціла іх, пахавала малодшых — Клаву, Мікалая, старэйшую сястру Галю. На днях збіраецца паехаць у Нясвіж, праведаць сястру Моцю і пляменніцу Тамару, адтуль — у Церуху, пакланіцца магілам маці, бацькі, Колі, Мішы. Што робіць Вольга — гэта вялікі подзвіг. А цяпер і Маша. Да Сашы яна ездзіць кожную суботу ці нядзелю. А ў мінулую сераду просіць: «З'ездзім да Сашы. Пальём кветкі». Прыехалі — дождж. Але не кветкі яе цягнулі. Тайная размова з сынам, тайнае общение з ім, бачу я, як яна пераўтвараецца каля магілы сына. Божа! Толькі цяпер я разумею, што перажывалі маці, якія не зналі, дзе магілы іх сыноў. Ці напісаў хто-небудзь іх боль? Класікі да гэтага не дайшлі.

На пасяджанні рады СП 23.VI вырашалі ўступаць ці не ўступаць у створаную на IX з'ездзе пісьменнікаў СССР у міжнародную супольнасць пісьменніцкіх саюзаў (МСПС). На з'ездзе нашы следам за Украінай не ўступілі, не адважыліся, зрабілі заяву, што параяцца дома. Раіліся, тры гадзіны. Я — за ўступленне. Быў і буду! Не можам мы адрывацца ад Расіі! Здзівіўся, што супраць выступілі такія мае калегі, як Сачанка, Рагойша. Усё-такі гэта заразная хвароба — нацыяналізм. Давядзе ён да бяды, як армян, малдаван, азербайджанцаў і рускіх ва ўсіх рэспубліках — во няшчасныя. Дзякуй богу, што беларусы, народ наш не выдзяляе, не раздзяляе рускіх, палякаў, літоўцаў, яўрэяў.

На радзе прынялі тыпова беларускае рашэнне: пачакаць да восені. Брава! Куранят лічаць па восені. Дай бог, каб да гэтай восені ўсе мы паразумнелі— у Маскве, у Мінску, у Кіеве, у Тбілісі... Але ці паразумнеюць нашы павадыры — ельцыны, краўчукі, шэварднадзе, снегуры?..

30 чэрвеня

Учора прыехалі да мяне Афанасьевы ў суправаджэнні Міколы Мятліцкага. Афанасьевых ажно трое: бацька, сын, унук. Бацька пенсіянер, былы дырэктар школы. Фігура — сын Мікалай Іванавіч, у недалёкім былым генеральны дырэктар «Гомсельмаша» і цяпер генеральны дырэктар нейкага аб'яднання, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення міру.

Сынаў сын — Іван — таксама фігура ўжо: дацэнт Гомельскага універсітэта, літаратурны крытык.

Адна просьба ў Афанасьевых была адкрытая: нямецкая сям'я запрасіла іх на адпачынак траіх — Мікалая, жонку яго, Івана. Вельмі ім хочацца паехаць, відаць, выгодна: Мікалай, Іван толькі што ездзілі ў маі з дэлегацыяй камітэта. Шалёная цана на білеты. А могуць паехаць, я за тры білеты разарыўся б. Падпісаў пісьмо на імя пасла ФРГ — каб паскорылі выдачу візы.

Афанасьевы з Шарпілаўкі, землякі, аднавяскоўцы Анатоля Грачанікава. Мікалай равеснік, разам канчалі школу, інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Праз Толю я з ім даўно знаёмы, і мне падабаўся генеральны дырэктар нашага волата селыасмашын. Дзелавы чалавек. Думаю, што і цяпер ён процветает і тры білеты ў ФРГ для яго дробязь, не тое што для народнага пісьменніка.

Другую просьбу, бадай галоўную, выказаў Мятліцкі. Івана афармляюць для паступлення ў СП, прайшоў прыёмную камісію. Ці нельга паскорыць прыём? 2 ліпеня — рада. Бачыў я яго артыкулы, праглядаў, але ўважліва не чытаў, нават да нядаўняга часу не ведаў, што гэта — сын таго Афанасьева.

Пакінуў ён сваю кніжачку «Будзем садзіць сад...». Кніжачка пра Быкава і Казько. Ухмыльнуўся я: піша пра Быкава, а дапамогі з прыёмам просіць у мяне. Ну, да бог з ім, у яго дысертацыя была па Быкаву, яўна выцяжкі з дысертацыі. Артыкул — аб творах на чарнобыльскую тэму, аб «Злой зорцы». Заумны артыкул. Па-мойму, галоўная задача не творы разабраць, а паказаць сваю эрудыцыю — хвароба маладосці. Гэта крытыка для крытыкаў, а не для масавага чытача. Нават мне цяжка было адразу сцяміць: ганіць ён мой раман ці хваліць. Іграе ў аб'ектыўнасць. Але калі я вычытаў, што «Последнюю

пастораль» Адамовіча Іван Афанасьеў ставіць вышэй «Злой зоркі», я перастаў верыць у яго заглыбленую критичную эрудыцыю... «Пастораль...» — ганебна слабая аповесць для такога крытыка, філосафа і мастака, як Алесь Адамовіч; нават самыя-самыя «прыдворныя» крытыкі мэтра пра аповесць гэтую далікатна і сарамліва змаўчалі. Адзін вывад крытыка заслугоўвае ўвагі: «Злая звезда» на языке классической теории означало вступление «в зону контакта с незавершенным событием современности», «неготовой современности» (М. Бахтин). Вось бы крытыку і варта было б танцаваць ад гэтай печкі — паказаць шляхі завершанасці гэтай падзеі — чарнобыльскай. А шпыляць Пыльчанку за тое, у чым грэшныя ўсе мы, у тым ліку і Афанасьевы... Ваня, лёгка магу даказаць, што Пыльчанка праяўпяе куды большую прынцыповасць, чым сам ты. Я лёгка чытаю падтэкст тваіх рэверансаў Быкаву, Адамовічу, Алексіевіч. З такой дысертацыяй лягчэй было абараніцца. І ў Саюз ты пройдзеш без затрымкі. І я шчыра памагу гэтаму. Я знаю чалавечыя слабасці і асабліва слабасці маладосці. Я, канешне, у 28 не быў такі, але я жыў у іншы час, і бацька мой быў усяго-наўсяго радавы ляснік з двума класамі прыходскай школы. І настаўнікі, камандзіры мае вучылі мяне так, што я ні разу не дазволіў сабе чыхнуць на іх лысіны.

З заўтрашняга дня запраўка аўтамашын па лімітных картках — 30 літраў на месяц. А ў нас пуставаты бак у машыне, якая была Сашава і на якой мы цяпер ездзім на яго магілу.

Маша дамовілася з зяцем Вячаславам паехаць на запраўку ў 5 гадзін раніцы. І, чакаючы яго прыезду з горада, прачнулася ў тры гадзіны, лёгшы ў 12, і больш не заснула.

«Ну, што ты — цягніка чакала? Баялася, што праспіш?»

«Такі характар».

Але, такі характар! І мне часам робіцца страшна за такі яе характар — згарыць. А. Пыльчанка, Ваня, жыў і працаваў на тых жа законах, што і генеральны дырэктар Афанасьеў. Во пра гэта ты не падумаў, чыхаючы на маю лысіну. Дай бог табе жыць па іншых законах!

4 ліпеня

Слухаў зараз Козырава. Заяўляе: «Партыя вайны — КПСС». А яны з Ельцыным — ох якія міратворцы! Нахабства бязмежнае, такое было хіба ў камуніста Троцкага, Сталін і той не «ўзнімаўся» да такіх беспардонных сцвярджэнняў.

Козыраў — дыпламат — патрабуе суда над партыяй. Выхаванец яе! А сам 20 жніўня 1991 г. апынуўся ў Парыжы, Нібыта з мэтай:

пераможа ГКЧП — ён будзе ствараць урад у эміграцыі. Што ні слова — хлусня ў ступені.

Вытхнулася мемуарная частка маіх дзённікаў. Што і хто варты ўвагі з недалёкага мінулага — апошніх 10-15 гадоў? Пэўна, усё значнае занатавана ў дзённіках 1981-1984 гадоў. І ўсё-такі варта было б ахарактарызаваць некаторых дзеячаў. Машэраву я адвёў старонак 35. Колькі Папякову, Кісялёву, Кузьміну? Слюнькову я шырока напісаў у «Злой зорцы», хоць зараз не ўпэўнены, што ён заслугоўвае той негатыўнай ацэнкі, на якую я паддаўся па расказах тых, многія з якіх сёння сталі «дэмакратамі».

Цяпер я апраўдваю яго строгасць у адносінах чыноўнікаў — гультаёў і хапуг, якія тады бралі хабар цішком, а цяпер робяць гэта адкрыта, бесцырымонна. Цяпер 90 працэнтаў чыноўнікаў жывуць па прынцыпу: дурань, калі маеш магчымасць хапнуць і не хапаеш. Усё можна купіць.

33 гады нікому не давалі ўчасткаў на нашым дачным пасёлку, хоць і былі свабодныя. Колькі дзён назад прыязджае «мерседэс», і землямер адводзіць участак маладому «бізнесмену». Ён ту жа прапануе прадаць трубы газавыя нам, пасёлку (тры гады мы займаемся праводкай газу для ацяплення) 8 тон за 150 тысяч руб. Во дабрадзей!

За добрыя вочы яму адвялі ўчастак у такім прэстыжным месцы? Во яны, даброты капіталізму! Для каго даброты?! Сумна. Ад усяго сумна. Сумна. Схадзіў у санаторый на пошту, паўгадзіны туды — назад, і стаміўся. Сілы выходзяць, што з прадыраўленага мяча. Колькі іх засталося? А хочацца яшчэ і жыць і пісаць.

Выбраў старонак 220 з дзённіка 1981-1982, 1990-1991 гг.— да свайго 70-годдзя дайшоў. Але дзённік не задавальняе. Раман! Цягне на раман. Ці хопіць творчай патэнцыі? І хочацца і — страшна.

Чытаю «День». Калі гэта не «громаадвод», Праханаў і яго каманда заслугоўвае вышэйшага бала — за смеласць. Але часам халадзею: часам смеласць іх на грані правакацыі, так здаецца мне. Ці гэта смеласць смертнікаў? Вызываю агонь на сябе?

9 ліпеня

На стале «Неман» з артыкулам Івана Афанасьева, з яго разносам Пыльчанкі за... беспрынцыповасць — і ўспомнілася ўчарашняя размова з Іванам Кірычэнкам па тэлефоне. Сярод многіх спраў камітэта, не помню, у якой сувязі, ён паведаміў, што толькі што ў яго быў член прэзідыума камітэта Афанасьеў. Відаць, атрымаў (па майму пісьму паслу), едуць у Германію сям'ёй на ўласнай машыне. Ад Кірычэнкі ён

вырваў процівазаконнае пісьмо начальніку мытні: сувеніры вязуць ад імя Камітэта міру.

«А якія хоць сувеніры, сказаў ён?» — спытаў я.

«Кажа: дзве шапкі, гарэлка».

Я рагатнуў.

«Вам смешна,— сказаў пакрыўджаны Іван Кірычэнка.— А я падпісваў і ведаў, што адтуль ён за сувеніры прыедзе на «мерседэсе». Кірычэнка быў там і знае: ён ездзіў і драбязу купіў, а Афанасьеў вунь які бізнес зробіць!

Зробіць! Вернецца на дзвюх машынах: абодва водзяць — бацька і сын. А можа, і маці... Сваю «Волгу» загоняць за паўмільёна, а можа, «мерседэс» за мільён. Як лёгка пасля будзе крытыкаваць раманістаў за... недасканаласць маральную герояў!

Я падліў масла Кірычэнку:

«На здароўе, няхай купляюць. Дзелавыя людзі».

«Ды няхай. Каб толькі на мытні не прыдраліся»,— баіцца Іван за подпіс свой.

«Да Афанасьева не прыдзяруцца?! Не хвалюйцеся, Іван Сямёнавіч».

Во характары — адразу два: буйны гаспадарнік і будучы «заканадаўца» новай літаратуры. Яны — гаспадары нашага будучага жыцця. Сябе не пакрыўдзяць. Падумаюць і пра народ — як думаюць Шушкевіч, Кебіч. Прэм'ер Афанасьеў — не горшы варыянт. Адзін з тых, хто разумеў народ, яго патрэбы.

Куды Афанасьевых — у аповесць, у раман?

Цікава, што напіша Іван, калі пазнае сябе?

У «Совесткой Белоруссии» інфармацыя пад загалоўкам «Чужая боль близка премьеру»: Кебіч наведаў хворага Пімена Панчанку. Суцешна: не забываюць пра нас. Але... навошта такая рэклама пад такой шапкай: чужы боль блізкі прэм'еру? Перастараліся падхалімы.

10 ліпеня

Судзяць Партыю. Маю Партыю, у якой я актыўна працаваў — ваяваў, пісаў — роўна 50 гадоў — увосень 1941 года мяне ў Мурманску прынялі кандидатам у члены. Балюча за суд? Не. Але крыўдна, горка, злосна. Злосна — хто судзіць? Усе, хто быў у партыі, не проста быў, займаў кіруючыя пасады, як Ельцын. Ёсць у гэтых людзей хоць кропля сумлення? Даруе ім народ і бог?

Адвакатаў партыі ў тэлепраграме подла абразаюць. Але нават у тых фрагментах, якія даюць, вельмі пераканаўчыя доказы на карысць партыі. А вось выступление адваката Ельцына Андрэя Мака-

рава, які, між іншым, абараняў зладзея Чурбанава (во спекулянт!), перанеслі ажно на сённяшні дзень — не хапіла ўчора часу. «Высокі суд» задаволіў яго просьбу. Паспрабуй не задаваліць — пажыццёва ў гэтай мантыі не прасядзіш! Клаунада! Я разумею мантыю ў судзе прысяжных. Але ў канстытуцыйным... Які можа быць вердыкт?.. Не прызнаць канстытуцыйнымі ўказы Ельцына — не адважацца «незалежныя» суддзі. Прызнаць неканстытуцыйнай партыю? Рызыкоўны прэцэдэнт. Прызнаць канстытуцыйнай? З'ядуць Зоркіна «дэмакраты». «Дэмакраты» знішчаць умеюць больш тонка, чым рабіў ідыёт Берыя.

А «дэмакраты» выяўляюць сябе з кожным днём: сёння падаражала мяса і гарэлка на 40-50 працэнтаў. Забі — не разумею, і ні адзін высокі эканаміст не мог мне растлумачыць, што адбываецца.

На Украіне з 1 студзеня цэны выраслі ў 27 разоў, зарплата — у 8. Як жа жылі без дэфіцыту бюджэтаў, калі хлеб быў па 14 кап., мяса па 1 руб. 90 кап., гарэлка па 4 руб., бензін — 20 кап.? І памагалі паўсвету, у чым так цяпер вінавацяць партыю. Дзе логіка ў абвінаваўцаў? Ім бы пры такім становішчы лепш памаўчаць.

Але ўразіла мяне рэакцыя простых людзей. Сёння ў санаторыі «Беларусь» на пошце размова жынчын пра падаражанне і каментарый:

«Давялі камуністы».

Вось так дзейнічае прапаганда! Не вытрымаў: «Пры камуністах хлеб быў па 14 кап.». Змоўклі бабы. Спалохаліся. Паштарка Ганна Афанасьеўна, якая добра ведае мяне, хітра ўсміхалася. Запалоханыя людзі. І гэта сумна.

Ліне — 51 год. Бабуля. Маша падрыхтавала для старэйшай дачкі, з якой сербанула ліха, святочны абед. Алёша выставіў шампанскае. І было маленькае свята. Другі тост моўчкі.

Пазваніла Алеся: у Сцяпана Лаўшука раптоўна памерла жонка, 44 гады. Я не знаў гэтую жанчыну, але заплакаў. Даў тэлеграму Сцяпану.

Пазваніў Пімену. Ён дома. Во брахуны журналісты, просценькі факт не могуць праверыць.

72 ліпеня

Здзіўляюць палітыкі. Я паважаю Кебіча. Прачытаў яго выступленне на нарадзе-семінары старшынь выканкомаў. Нядрэннае выступленне: за рэальнымі лічбамі падзення вытворчасці ўбачыць аптымістычныя перспектывы — трэба ўмець. Але, можа, якраз аптымізму і не хапае нам. А які я быў аптыміст! Але калі я чытаю ў выступленні 8 ліпеня наступнае, цытую па «СБ» за 11.VIII: «Поставки мяса за

пределы республики за полугодие снизились больше чем наполовину. А это как-никак 66 тысяч тонн... Переполнены холодильники мясокомбинатов и торговых организаций...», а праз дзень — 10 ліпеня — «радуюся» навіне: цэны на мяса павышаны, і не на 5-10 працэнтаў, як у Італіі, а на 40-50,— тут палітыку ўрада зразумець немагчыма. І прэм'ер гэты фартэль не тлумачыць сваім падначаленым. Чаму?

«Хозяйства не могут сдать скот, а это, естественно, вызывает у них большие финансовые затруднения. В общем, возник настоящий затор»,— вяшчае прэм'ер І... расчышчае затор павышэннем цэн. Тыя ж італьянцы, французы, нават немцы пагналі б такі ўрад у шыю: злазь з даху — не псуй гонты! Наш народ глытае мяса па 100-200 руб. Праглынуць не можа, і яно гніе. І хто панясе за гэта адказнасць?

Спякота. Прагнозы на ўраджай песімістычныя нават у прэм'ера-аптыміста. Учора перадала Масква: Літва збярэ хлеба не больш 50 працэнтаў ад мінулагодняга. Не пасеялі, раздаўшы зямлю, распусціўшы калгасы, плюс засуха. Жах. А рублі ў іх ёсць, у літоўцаў, у латышоў, і яны кінуцца да нас. Што робіцца! Такой ганьбы не перажывала ніводная дзяржава нават у сярэднявеччы пры самых бяздарных каралях. Дзе ж вы, нашы мудрацы? Нічому, выходзіць, вас не навучылі? А самі вы вучыцца не маглі? Эх, эканамісты!

13 ліпеня

Конкурс на гімн, «Звязда» апублікавала тэксты. Жах! Во ўзор дэградацыі філасофіі і паэзіі. Акрамя «Пагоні» Багдановіча, якая ніяк не кладзецца на гімн,— лірыка:

«Хай пачуюць, як сэрца плача. Па радзімай старонцы баліць»,— вершы асабліва ананімныя, дзіка бяздарныя. Хто ўдзельнічае ў конкурсе — графаманы?

Мы не згубіліся ў свеце,
Мы збераглі свой дом —
Нам пераможна свеціць
Грунвальд сваім шчытом.

Вершы пачаткоўца, якія не надрукаваў бы ніводзін салідны часопіс, хіба райгазета.

Не лепшыя і ўсе іншыя варыянты.

Я пісаў ужо, здаецца. Сцяг я прыняў. Герб прыняць не магу. Серп, молат і калоссе — гэта дрэнна? А недарэчны коннік са шчытом і мячом —добра? За кім ён гоніцца? Ніхто толкам не вытлумачыць гэтую сімволіку для нашага часу. Для літоўскіх князёў — яна была да месца, бо іх дэвіз: заваёвы!

Няхай Ткачоў не ідэалізуе гэтае княства. Не апраўдваю задзірыстасць маскоўскіх князёў. Але літоўскія былі не лепшыя — прагныя заваёўнікі!

Дарэчы, на днях з нейкай нагоды Масква паказала герб Узбекістана: той жа вянок з калоссяў і бавоўны, а ўсярэдзіне замест зямнога шара — птушка даўгашыяя — драфа, ці што? Прыгожа, з захаваннем прыемнасці. А маглі ж і ўзбекі знайсці нейкую старыну і не 400-гадовую, а 2000-гадовую, ёсць у іх. Хто ж разумнейшы? Божа, колькі глупства мы нарабілі! А колькі яшчэ наробім? Баюся, не менш, чым пры Сталіне, Брэжневе, Гарбачове.

19 ліпеня

Пра тое, якія глупствы — злачынствы творацца, здорава сказаў Пётр Абовін-Егідэс у артыкуле «Я обвиняю» (Правда за 16.18.VII). Чалавек, які прайшоў пры балышавіках усе «круги ада», дысідэнт, які быў і ў турме і ў псіхушцы, эмігрант, ён бязлітасна выкрывае Ельцына і яго каманду:

1. «Я обвиняю президента России в том, что им и его командой осуществлена контрреволюция».

2. «Я обвиняю президента и его команду во втором искусственном голоде» (первый — сталинский — в 1932-1933 гг.).

3. «Я обвиняю тех, кто организовал развал Союза».

4. «Я обвиняю президента за разгром власти Советов».

5. «Я обвиняю команду Ельцина в том, что она оказывает давление на Конституционный суд...»

І гэтак па многіх пунктах.

Нельга не згадзіцца з Абовіньім-Егідэсам, калі ён піша: «Надо четко различать коммунизм как исторически сложившийся идеал социально-экономического строя и «коммунизм» как стратегию, которую предложили большевики».

«Правда» — сур'ёзная газета, ленінская, такой яна была хіба да рэвалюцыі, пакуль Троцкі выпускаў сваю газету. Але яе задушаць. Не веру ніводнаму слову Ельцына з яго заяў аб прэсе. Па часці дэмагогіі ён пераплюнуў і Сталіна і Гітлера.

Ездзіў з Кірычэнкам і Мурашкам (галоўны ўрач санаторыя «Беларусь») у Івянец, у школу-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў. Дырэктар там актывіст камітэта Гольдшміт Фёдар Лазаравіч. Гаспадар! Агледзеўшы школу, я падумаў і сказаў: калі «дэмакраты», левыя і правыя, збудуюць і гэтак абсталююць такія школы, тады я прызнаю іх. Выдатныя вучэбны, аздараўленчы комплексы. Усё ёсць — камп'ютэры, трэнажоры, басейн, сауна, цяпліца, свінні, каровы, 60 га зямлі.

Гольдшміт, калі загаварылі пра Ізраіль, з высокай ацэнкай кібуц, сказаў: «Я туды ніколі не паеду». Веру. І яшчэ ён хораша сказаў — з сумам: «Усё ж пры райкоме парадку было больш». Адчуў гаспадар на ўласнай скуры.

Памёр Аляксей Карпюк. Не быў я з ім блізкім, больш таго, пэўны час ён ставіўся да мяне негатыўна — да пераезду Быкава ў Мінск. пасля мы паразумеліся. Ён даў дзве свае аповесці ў рукапісе пачытаць і, што бывае рэдка, сур'ёзна ўлічыў мае заўвагі і пажаданні. Мне шкада яго. Жыццё ў яго пакутнае было, бо па характары ён быў рэвалюцыянерам, з усімі ваяваў — з палякамі, немцамі, рускімі, сваімі камуністамі. Тыдні тры, не больш месяца назад, на пасяджэнні рады ён спыніў і даверліва сказаў: «Ведаеце, што я перанёс?» Ведаю: рэзекцыю страўніка. Рак! Пасля такой аперацыі ён акуратна прыязджаў з Гродна на нашы бязладныя пасяджэнні. Мне шкада Аляксея. Трэба напісаць пра яго. Хто яшчэ напіша? Раней напісаў Быкаў, друкаваў у «Литературной газете».

1 жніўня

Першае жніўня! Мінае лета. Жахлівае лета. Яшчэ тыдзень-два такой сухмені — загіне бульба, буракі, капуста. І нішто нас не ратуе — ні багаты Захад, ні бяскрайні Усход, ні бог, ні Ельцын.

Засуха гняце мяне — і спякотай, і вельмі змрочнымі думкамі. Не проста са страхам — з жудасцю гляджу ў заўтрашні дзень. Раблюся ашчадным да абразлівай скупасці. Таццяна і Вячаслаў могуць купіць дзецям бананы. Люблю ўнучак, але на такія траты ні разу не адважыўся: няхай ядуць гуркі з гарода, вішні, думаю, у свежай садавіне і гародніне вітамінаў больш.

Учора Маша (малая) загарэлася зрабіць піражкі з вішнямі. І бухнула грамаў трыста масла ў каструлю — слівачнага, таго, што даюць па 400 грамаў на месяц у нас, у Расіі і гэтага не даюць. Такое марнатраўства мяне расстроіла. Пачаў ушчуваць: трэба эканоміць.

Здзіўляюць яны мяне, маладыя. Таццяна ўчора купіла альбом «Современная церковная живопись» — 450 руб. (О, божа!) Не купіў бы я такой кнігі.

Карацей кажучы, сумна, вельмі сумна. Ці даўно я марыў: маю грошы, пайду на пенсію, найму шафёра, буду ездзіць, жыць у дамах творчасці, лячыцца ў санаторыях.

Грошы — дай бог, каб было за што купіць хлеб і кавалак сала ў галодную зіму, што наступае. Які шафёр! Смешна.

Ездзілі на магілу Сашы. Сёння Маша-малая пажадала сама паехаць: «Я даўно не была». І гэта кранула мяне да слёз. І на магіле мне

хацелася плакаць, як даўно ўжо не плакаў. Ах, сын, сын! Да ўсіх бед і ты пакінуў нам несуцешнае гора. Але не здаюся. Пішу аповесць, трагічную — аб лёсе мастака, таго ж Міхала Рачыцкага, што і ў папярэдняй аповесці з нямецкай назвай «Зямны рай». Назва новай аповесці «Вернісаж». Збяруцца на вернісаж знаёмыя мастакі, акцёры, пісьменнікі, міністры. Наперадзе — самае цяжкае: паспрабаваць напісаць характары праз бязладны дыялог людзей, якія падвыпілі. Рачыцкі прадаў у Данію карціны і зарабіў кучу долараў. Разбагацеў. А майстэрня апусцела. Тырчаць крукі ад знятых карцін.

16 жніўня

Здаецца, да ўсяго мы прывыклі — да любых цэн. І, аднак, учарашняе павышэнне ашаламіла мяне, не проста ашаламіла — кінула ў роспач, у паніку, як у кацёл, дзе зварыся. Малочныя прадукты — у два разы, хлеб — у тры. Хлеб! Буханка самага радавога жытнёвага хлеба — 10-12 руб. Жах! Куды мы ідзём? Хлеб — эквівалент усяго. Пры дурным рынку, пры свабодных цэнах на ўсё іншае — на муку ў тым ліку, на крупы, цукар, алей гэта дасць такі смерч цэн, што вочы палопаюцца. І ніякай індэксацыі ўкладаў. Грабеж, якога не бачыў свет! На колькі павысяць зарплату? Пенсіянерам — 300 руб. у месяц. Радуйцеся, ветэраны! І хутчэй працягвайце ногі! Вызваляйце кватэры для «трэцяга саслоўя». Народ безмолвствует. Дзе ты, народ? Дзе вы, змагары за народ? Дзе моладзь? Куплена? Абвяшчаюць забастоўку авіядыспетчары і патрабуюць 90 тысяч у месяц зарплату. І гэта змагары?

25 жніўня

«Литгазету» чытаю рэдка, не выпісаў. Учора ўзяў два нумары ў бібліятэцы санаторыя за 29 ліпеня і 5 жніўня.

У першай гутарцы А. Адамовіча з Гр. Рышанай. Але Адамовіч здзівіў і разачараваў. Гаворыць тое ж, што і тры гады назад. Усё развалілася, народ абрабаваны да ніткі, а ты ўсё тое ж... Гутарка — рэклама кнігі «Спасибо, хунта! Самолечение от коммунизма». Але праклёны іх не лепшы метад барацьбы з ідэалогіяй, тэорыяй. Хто з іх абвергнуў Маркса, Леніна? Ім здаецца, што сацыялізму прыйшоў канец. Наіўныя людзі! Мы яшчэ будзем кланяцца Кітаю, а не Амерыцы.

У наступным нумары гутарка І. Залатускага і У. Максімава: «Обратно эту ленту не перемотаешь». Які творчы палёт і свабода думкі ў дысідэнта Максімава!

Вось у Максімава: «Окололитературные смердяковы становятся законодателями мод во всех областях нашей жизни: в культуре, политике, экономике». Але, пазіцыі заваёўваюць смердзяковы.

І. Залатускі: «Коммунисты тоже не печатали «Размышления о Божественной литургии» Гоголя и многих сочинений Лескова, в том числе брошюру «Евреи в России».

У. Максімаў: «Но они хотя бы не покушались на классику».

Цяпер класіку замяняюць амерыканскімі баевікамі.

Аб літаратуры: «Еще вчера многотиражные журналы хиреют, книжный рынок заполняется словесной макулатурой».

«...история отечественной литературы, русская история переписывается в духе самоуничтожения и нигилизма».

«Парадокс времени: я — убежденный антикоммунист, которым по обе стороны границы еще недавно пугали людей, вынужден защищать (во!) путчистов от недавнего выпускника Академии общественных наук ЦК КПСС, вдруг возомнившего себя большим борцом с коммунизмом, чем весь блок НАТО, вместе взятый». Пра Бурбуліса? Пра яго, подлага здрадніка.

Малайчына Максімаў!

Бывае радасць і ў гэты змрочны час. Абяцаюць першы том у «Мастацкай літаратуры». Дай бог, гэта дае нейкую надзею на жыццё, духоўнае і матэрыяльнае.

Пімен за тыдзень да свайго 75-годдзя трапіў у бальніцу. Пімен апошні год сядзеў на адной мізэрнай пенсіі. Яго наведаў Кебіч. Пімен, канешне, не сказаў яму пра сваю беднасць. А няўжо вы не знаеце пра яе, Вячаслаў Францавіч? Урад жа абрабаваў нас — нашы ўклады, якія мы капілі на старасць. Абакралі нас, прэм'ер.

1 верасня

Восень. А тэмпература 30 з гакам. Сухмень. Сухавей. Як божая кара. Не помню, каб у такі час так працягла стаяла такая спякота. Засохла бульба, буракі. Не выросла атава. Жывёла засталася без кармоў. Што будзе?

Сказаў мне начальнік упраўлення гандлю І. Ф. Вашкевіч, што ў халадзільніках 100 тысяч тон мяса. І ніхто не купляе. А ў магазінах мяса няма. І ніхто не ідзе на паніжэнне цэн — мафіі гэта не выгадна.

Пазьняк са сваёй антыкамуністычнай зацятасцю сцвярджае, што толькі неадкладная раздача зямлі ўратуе нас. Каму раздаваць? Але ў адным яны маюць рацыю, што былая партакратыя самкнулася з мафіяй Усе былыя маюць добрыя месцы, адны ў дзяржаўным апараце, другія — у прыватных структурах бізнесу. Ідзе дзікі, нябачны грабеж народа, краіны. Хапаюць — хто колькі можа.

Мне расказвалі, што напярэдадні павышэння цаны на гарэлку намеснік старшыні СМ Косцікаў і былы першы сакратар Мінскага

гаркома КПБ Місуна правярнулі аферу, якая дала аб'яднанню, якое ўзначальвае Місуна, 30 млн. руб. Жах! А колькі мае Косцікаў? Але ж калі гэта хоць на 30 працэнтаў, на 10 працэнтаў, праўда, і то слоў нельга знайсці для абурэння. А гонар нацыі — паэты Панчанка і Танк маюць па 1800 пенсіі ў месяц. Пімен з-за гордасці не сказаў Кебічу, калі той наведаў яго дома (не ў бальніцы, як пісалі газеты). А прэм'ер жыве ў іншым вымярэнні.

А нашы свістуны занімаюцца бог ведае чым. Першачарговая задача — скасаванне званняў работнікам мастацтва і літаратуры? Камісія ВС вынесла такі праект. Я выступіў супраць — за званні. Няхай — пісьменнікі. Але акцёры без усялякай надзеі на званне!.. Няшчасныя. «У Амерыцы няма». Ідыёты! У Амерыцы актрысе за ролю ў кіно плацяць мільён. Калі мы здолеем заплаціць такія грошы? Праз сто гадоў? «ЛіМ» тут жа арганізаваў адказ на мой артыкул інваліда вайны з Ляхавіч Васіля Сокала. Але як вылазяць «белыя ніткі»: увесь пафас допісу ў праслаўленні Быкава і Гілевіча: яны выступаюць за беларусізацыю, а майго голасу не чуваць. Вася, дарагі мой таварыш па няшчасці, калі ты ёсць! 45 гадоў людзі чыталі мае раманы на беларускай мове, гэта варта больш, чым заклік з трыбуны. Я пісаў: «...мне будзе балюча, калі ў мяне жывога раптам аднімуць званне, узнагароды».

Адказ Сокала: «Аднак народны пісьменнік Ніл Гілевіч не кідаецца ў роспач». Табе гэта вядома, Вася? Шкада мне цябе. Я ў свой час і не заікнуўся аб званні, прысваенне народнага ў 1972 годзе Мележу і мне было нечаканасцю. Я сядзеў у Церусе і толькі на другі дзень прачытаў у газеце.

Не думаю, што Ніл Гілевіч лёгка развітаецца з ім, са званнем. Я, бадай, гэта зраблю лягчэй — у маім узросце.

Чытаю «ЛІМ». Божа мой, пра што толькі ні пішуць: сто артыкулаў пра сімволіку, на якім фоне крыж — на сінім, белым. І ніводнага артыкула аб тым, як жыве народ і што ён думае пра нашы сімвалы. Дзе традыцыі ранніх Купалы і Коласа — боль і гнеў за галечу і бяспраў'е народа?

А ў нас выступае настаўнік з Бабруйска: вучні дрэнна вучацца, а таму трэба ўвесці платнае навучанне. Апупеў чалавек! Найвялікшая сацыяльная заваёва — бясплатнае навучанне. Следам за намі, Саюзам Саветаў, на яго перайшлі ва ўсіх развітых краінах. Ды і папуасы вучацца бясплатна. А гэты... А можа, ты дрэнны настаўнік, таму ў цябе вучацца дрэнна. Калі з сотні дзесяць не хочуць вучыцца, гэта не значыць, што 90 павінны за гэта плаціць.

Даўно не дабіраўся да дзённіка. А сёння як бы юбілей — роўна два гады з 1 верасня 1990 года пішу больш-менш акуратна. З вялікімі

інтэрваламі гэтым летам. Скончыў «Вернісаж». Страшная аповесць. У фінале. Але ж праўда — такі лёс мастака!

7 верасня

Во і восень. Сёння ідзе дождж. Ах, каб гэтыя дажджы ды на месяц раней!

Учора ездзіў на коласаўскае свята ў Мікалаеўшчыну. 110 гадоў, як нарадзіўся Купала і Колас. Ці даўно адзначалі 100? Выступалі паэты. Вёў нязменны Ніл. Цікавыя вершы ў Макаля, у Аўрамчыка. Але кранулі яны слухачоў?

Здаецца, цытаты з Коласа, якія я прывёў, ускалыхнулі больш.

Пасля —

Багачы і панства,
Нашы дабрадзеі,
Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі,—

адгукнулася аўдыторыя не вельмі зразумелым гулам.

Смех пачуў у прэзідыуме пасля радкоў:

Канстытуцыю далі,
Адчынілі дзверы...

Актуальна: толькі што апублікаваны праект новай Канстытуцыі. Смяюцца ўладары новага жыцця.

Я прачытаў гэтыя радкі ў падтрымку тэзіса: ці тое зараз пішам мы пра жыццё народа?

Гілевіч заклікаў: давайце па-новаму прачытаем Купалу і Коласа! Ох, як трэба перачытаць нам, творцам, маладым у першую чаргу.

Сёння прачытаў у «Литгазете» (урэшце гэтая газета пачала пошукі праўды) артыкул Генадзя Краснікава «Прогресс в отсутствии культуры». Разумныя разважанні: «Соцреализм сменился повсеместно анатомическим реализмом». Як кажуць, не ў брыво, а ў вока.

«На телевидении, в прессе, на радио ежедневно совершается аккультно-половой шабаш».

«У нас нет объединяющей идеи, глубоко продуманной, отшлифованной в дискуссиях (а не в потасовках!)»,

У рускіх няма. А ў нас ёй і не пахне. Якая ідэя? Што мы сцвярджаем, што адмаўляем? Вымяраем шпору ў вершніка на «Пагоні»?

Колькі артыкулаў у «ЛіМе»! А як жыве народ? Дрэнна жыве народ,— сказаў я ў сваім выступлений Больш ніхто гэтага не сказаў. Журналісты смялей гавораць, чым паэты, празаікі, драматургі.

Вельмі слушны вывад робіць другі крытык, Курбатаў: «Все усилия литературы сделались единичны, словно каждый в изгнании работает. Процесса-то так и нет».

Ох, няма, няма яго, літаратурнага працэсу! Працуем, як у выгнанні. Паміраць будзем у адзіночку.

«Корневая система наша распласталась в сыпучем песке, и от того при первом порыве крепкого ветра всех нас может смести безвозвратно» (той жа Г. Краснікаў).

Думаў, з-за дарагавізны транспарту людзей будзе мала. У Альбуць не прабіліся (я прыехаў на машыне Юрыя Броўкі з некатарым спазненнем). Стаяла паўсотня аўтобусаў. Пайшоў дождж. Я ўскочыў у аўтобус. Ажно з Глыбокага калектыў мастацкай самадзейнасці. Мяне пазналі. Засыпалі пытаннямі. Дзякуй богу, працуюць яшчэ ўлады. А людзям маладым чаму не прыехаць бясплатна на такое свята?!

Надвор'е злітасцівілася, і ўсё прайшло добра — у Смольні, Мікалаеўшчыне, Бярвянцы.

Ехаў з намі дзядзька Юры Ігар Міхайлавіч Рыдзіеўскі. Яму — 76. Але ж паехаў слухачом. Цікавы чалавек. З багатай і трагічнай біяграфія й. Але аптыміст і зараз. Не з усімі яго думкамі аб прычынах грандыёзнага катаклізму, што разваліў Вялікую Дзяржаву і давёў народы (усе!) да галечы, я згаджаўся, але паслухаць яго цікава.

Цікавыя ў іх адносіны — дзядзькі і пляменніка. Юрка камандуе, Ігар Міхайлавіч адносіцца да гэтага з гумарам разумнага чалавека.

Прачытаў дзённікавыя запісы Івана Пташнікава. Спадабаліся. Ён піша лаканічна і вобразна, я часам расплываюся, залішне тапчуся. Яшчэ адна добрая якасць гэтага даволі бескампраміснага ў прыватных размовах чалавека: карэктнасць да калег, асцярожнасць. Выдатна разумее розніцу паміж сказаным і напісаным — надрукаваным.

11 верасня

Заўтра год, як няма Сашы. Божа мой. 8.IX яму было б 42. Ездзілі на могілкі. Наплакаліся — Маша, Вольга і я. Заўтра памінальны абед. Збяруцца родныя, сваякі. Няшчасная Маша! У мінулую ноч не заснула і на гадзіну. Боль страты. Клопаты. Праблема ж з усім. Гарэлку прасіў у начальніка Упраўлення СМ па гандлю Вашкевіча І. Ф. Зрабіў. Культурны чалавек: не прыніжаў мяне ні заявамі, ні паклонамі — яго шафёр прывёз мне пляшкі на дачу. Да чаго дажылі! Боль у мяне, можа, і прытупіўся, я, не ў прыклад Машы, сплю.

Машу завёз у горад. Яна гатуе абед. Добра, што прыехала з Гомеля Маша, пляменніца, прыйшла Наташа, гэта выдатныя гаспадыні, яны памогуць. Паехала ў горад Вольга, каб заўтра пайсці ў царкву.

Памоліцца за ўпакой раба божага Аляксандра. І ўсё балюча. І крыўдна.

15 верасня

Прачытаў уначы ў «ЛГ» Алу Латыніну «Конец советской цивилизации». Не менш і не больш. Што, савецкая цывілізацыя выраслa на пустым месцы? Дура ты! Не было Пушкіна, Гогаля, Талстога, Шаўчэнкі, Ніязі, Руставелі, Купалы, Коласа?

Артыкул — справаздача аб нарвічскім сімпозіуме на базе рускай школы ў Нартфільдзе, штат Вермонт. Туды з'ехаліся з ЗША, Ізраіля, Расіі, каб адпець савецкую літаратуру. Хто прыехаў? Латыніна называе дакладчыкаў: Вайль, Геніс, Фрумкін, Леў Лосеў, Міласлаўскі, Гольдэнберг, Серман, Чансін, Гордзін, Ар'еў, Розінер, Эткінд. Кіраўніца Рошэл Рутчайлд. І рускія — Ігар Яфімаў, Парамонаў і Вяч. Вс. Іваноў. Гэтаму дакладчыку такая павага — імя, па бацьку, праўда, вось так — Вяч. Вс.; даклад яго называўся: «Почему Сталин убил Горького?»

І вось такая сотня «вышэйшых суддзяў» хавала «савецкую цывілізацыю» і рускую літаратуру. Не ўсю: Мандэльштама, Пастарнака, Трыфанава, Вазнясенскага пакідалі: яны прадстаўляюць рускі народ. Ха! Ці ёсць хоць пачуццё гумару ў гэтых людзей? Няма ні Федзіна, ні Ляонава, ні Шолахава, ні Распуціна, ні Бялова... што там гаварыць пра ўкраінцаў, беларусаў, армян!

Назваўшы даклад «Почему Сталин убил Горького?», думаеце асуджалі Сталіна і ўзнімалі Горкага, які так многа зрабіў для іх? Не, тапталі Горкага: дружыў са Сталіным, Ягодай, ездзіў на Балтыйска-беламорскі канал, прыняў калектывізацыю... Уяўляю гэты шабаш ведзьмаў, дзе пігмеі, шаўкі, злыя і баязлівыя шакалы скублі, рвалі, грызлі мёртвае цела Асілка, Велікана, пад уплывам творчасці якога ледзьве не стагоддзе развівалася не толькі руская літаратура, але і амерыканская, англійская, нямецкая. Гнюсны зброд касмапалітаў! Горкі застанецца ў культуры! Хто з вас застанецца? Ты, Латыніна? Здрадай рускай літаратуры ты закрэсліла ўсё, што напісала пра яе дагэтуль.

А зараз прачытаў у «Савецкай Беларусі» — і зноў абурэнне. Пад рубрыкай «факт» інфармацыя з запытальным знакам «Запад нам поможет?» БНФ запрасіў з ЗША кансультанта — віцэ-прэзідэнта інстытута Крыбеля фонду незалежнага Кангрэса ЗША (дзяржаўная структура!)—Джона Экснісіаса. І вось кансультацыя яго, даю па «СБ», без перакладу:

«...американский консультант предложил руководству БНФ образовать в ближайшее время совместно с другими аппозиционными партиями и движениями «коолицию демократических сил» и единым

широким фронтом повести наступление на парламент республики и ее правительство».

Заклік да звяржэння ўлады! Дзе Пятро Краўчанка? Дзе ўрад? Такога правакатара нават папуасы выдварылі б за 24 гадзіны.

«Он посоветовал представителям оппозиции обратиться в суд с жалобой на Верховный Совет, который, дескать, сознательно затягивает сроки проведения референдума, а также начать сбор подписей под «всенародной обвинительной петицией».

Вось такую кансультацию получаюць тыя, хто ліжа пану Экснісіасу месца, што ніжэй паясніцы. Дзе ваш гонар, спадары?

Усім кіруюць з «незалежных інстытутаў» Амерыкі.

22 верасня

Памёр Янка Скрыган. І хоць чалавек не дажыў усяго два месяцы да 87 — дай бог кожнаму!— мне шкада яго. Святы чалавек Іван Аляксеевіч! Я пісаў пра яго. Можа, яшчэ напішу. Вельмі хацелася развітацца. Але напярэдадні вячэраў з немцамі і ў панядзелак блага адчуваў сябе, а паніхіду назначылі чамусьці рана — на 12. Машыны не знайшоў. Аўтобусам пабаяўся — непарадак з кішэчнікам, добра, што не паехаў, ледзьве паспеў дайсці да санаторыя «Беларусь» — 10 мінут хады.

Вячэру давалі таму ж Рудольфу Дорману. Раней у мяне быў пэўны скепсіс да яго дабрачыннай дзейнасці. На гэты раз скепсісу стала менш: у Аксакаўшчыне з яго дапамогай збудавана 10 гасцінных домікаў. Для нас, беднякоў, гэта многае каштуе. Бацькі будуць мець прытулак, калі будуць прыязджаць да сваіх хворых дзяцей. А галоўнае, дзеці змогуць пажыць з бацькамі бццам бы дома, у сваёй хаце. Што ж, дзякуем вам, пастар.

Пасля вячэры доўга стаялі на вуліцы — Іван Альбінавіч Кенік, Ніл Гілевіч, я. І, між іншым, гаварылі аб гэтым кансультанце Джоне Экснісіасе, яўным агенце ЦРУ, які вучыў нашых, як зваліць урад, разваліць парламент. Моцна абураліся і Гілевіч і Кенік, мацней, чым я. У іх абурэнні, у ацэнцы магчымага рэфэрэндуму чытаўся стоены страх за сваю будучыню. Я адчуваў сваю перавагу: у мяне быў страх не за крэсла — за народ, за краіну.

30 верасня

Апошні тыдзень блага адчуваю сябе. Яшчэ раней з'явіўся шум у галаве — у левым вуху; як палі забіваюць — гух, гух. Учора, сёння яўныя сімптомы стэнакардыі: нават пры павольнай хадзьбе задыхаюся. Раней гэта было пры цяжкіх нагрузках— узыходжанні на паверхі ці

калі дровы калоў. Чаму раптам? Ніякіх парушэнняў. Рана здаю. У мае гады Максім Танк быў сардэчнікам, гадоў сем назад ўжывілі стымулятар. Яўген, сын Іванаў, дажыў да 80, дай бог яму яшчэ многія лета.

Здаў у «Маладосць» «Perklius abd Erden» і «Вернісаж». Праройкія рэчы. Не дай божа, каб праройтвы мае здзейсніліся. Але песіміст не адзін я. Гаварыў учора з Янкам Сіпаковым — у яго тыя ж думкі.

Божа мой! Як нас абяздолелі. Толькі што ламалі з Машай і Вольгай галаву, дзе хаваць бульбу, якую прывязе Тамара. Хляўчук у горадзе ўзламалі, пусты. Бульба па 25 руб. за кілаграм. На дачы ёсць паграбы. Але дзе гарантыя, што не залезуць сюды? Ці думаў хоць адзін аўтар дзесяці раманаў, выдадзеных на 30 мовах, над такімі праблемамі? Паміралі ад сухотаў, як Чэхаў, але пра бульбу і хлеб не думалі.

Хіба тут да высокага мастацтва? Пра што пісаць? Пра трагедыю краіны, народа! Не хопіць духу на раман. Хіба выдыхну вось такія кароткія аповесці.

І дзённік «заела». Мемуарная частка вытхнулася. Магу хіба адкарэкціраваць ранейшыя запісы.

Учора перажыў колькі прыемных хвілін — перад тэлевізарам, калі ішоў кастытуцыйны суд. Пісьмо Гарбачова з адмовай з'явіцца ў суд. Яго страх пад радкамі. І аднадушнасць і суддзяў, і сведкаў ад КПСС, і адвакатаў таго боку — макаравых: зрабіць усё, каб гада гэтага выцягнуць у залу суда, няхай адкажа на пытанні, няхай паслухае яго народ.

Я нават пра Зоркіна, іншых суддзяў пачаў лепш думаць. І яны не могуць яму дараваць развал Дзяржавы! А якая Дзяржава была! Пачысціць бы яе ад гарбачовых, ельцынаў— і няблага можна жыць. Швецыю не дагналі б. Але былі б вышэй Індыі, Кітая...

9 кастрычніка

У панядзелак 5-га вярнуўся з адпачынку галоўны ўрач санаторыя «Беларусь». Прыходзячы ў санаторый на пошту, я заглядваю да яго, калі ён ёсць. Улетку ён правёў мне сеанс іглатэрапіі.

У аўторак мы сустракаліся. Першая рэакцыя ўрача:

— А чаму вы пабляднелі?

Я сказаў яму пра свае сімптомы. Адышка яму не падабалася.

—Давайце праверым кроў.

У сераду я здаў у лабараторыю санаторыя кроў. Нізкі гемаглабін: 72 пры норме 140.

Спачатку я, невук, не прыдаў гэтаму значэння. Мурашку аналіз устрывожыў. Цэлы дзень яго не было — матаўся па горадзе. Увечары ён пазваніў мне.

— Прашу вас, не адкладваючы, зрабіце кантрольны аналіз — у сваёй паліклініцы.

Спалохаў ён мяне. Добра, што ў шафера Паўла, які рабіў у БелСЭ, а цяпер у «Юнацтве», ёсць хатні тэлефон. Ён падскочыў раніцою.

Паўторны аналіз прыкладна той жа: гемаглабін трохі вышэй — 82, але эрытрацытаў яшчэ менеў.

Агульная думка: трэба лажыцца на обследование. Думка ўрачоў, маіх блізкіх. Ох, не люблю бальніц! Раней у «люксах» ляжаў і ўсё роўна ўспамінаю з дрыжыкамі.

Сказала доктар Р. М. Завіркіна, якая лячыла мяне гадоў 20, што ёсць сто прычын малакроўя. Але пачынаюць з выключения анкалогіі: раку страўніка, печані, кішкі. Зноў каланаскапія. Аднойчы ўжо прадзіравілі кішку. Страх!.. Увогуле, у нас страх перад анкалагічнымі хваробамі. Хонекеру ставяць дыягназ — рак печані — і трымаюць у турме (гуманісты), хочуць судзіць, заяўляюць, што з гэтай хваробай можна пражыць яшчэ 10 гадоў. Чалавеку, якому 80. Па-мойму, такое могуць гарадзіць толькі немцы! Гады! Але і французы... Мітэрану выразалі прастату і абвясцілі на ўвесь свет, што злаякасная. Жах! Але дзіва з дзіваў: у шпіталі прэзідэнт праляжаў адзін тыдзень і адразу прыступіў да выканання абавязкаў. Філосаф пан Метэран! І мужны чалавек! А я... і смерці баюся. А яшчэ больш пакут, фізічных для сябе, душэўных для Машы. Пасля смерці Сашы... жыць пад страхам.

У нядзелю 11-га трэба завяршаць дачны сезон, пераязджаць у горад. А там не паліцца.

18 кастрычніка

З 13-га ў бальніцы. Малайчына мой доктар і начмед, уладзілі добра — у так званым «люксе». Удвух. Кічкайлу Аляксандра Трафімавіча я знаў даўно і па яго рабоце ў сельбудзе, у Магілёве, у СМ — на пасадзе намесніка. Займаўся Чернобылем. Камітэт міру трымаў з ім кантакт. На вячэры, якую ён даў прадстаўнікам фірмы «Аджон», я, дурань, выпіў лішне, чаго даўно не дазваляў сабе. Запомнілася дрэннае адчуванне таму, што на другі дзень мы з Машай паехалі ў Гомель. На службовай машыне. Але было спякотна, і я блага адчуваў сябе.

Кічкайла ўзначальвае нейкі Беларуска-польскі цэнтр. Па званках яму, па гасцях (нават французы прыходзілі) раблю вывад, што цэнтр займаецца добрай камерцыяй. Вітаю, калі бізнесменамі робяцца людзі з такім гаспадарчым вопытам, а не свістуны, спекулянты, што зарабляюць мільёны на перапрадажы гарэлкі.

З усіх апошніх пастаноў урада лічу самай разумнай — аб увядзенні дзяржаўнай манаполіі на гандаль алкагольнымі напіткамі.

З Аляксандрам Трафімавічам цікава пагутарыць. А так самаадчуванне паганае. Анемія. Да таго ж прымяшалася прастуда: кашляю, герпес...

Супакоілі, што каланаскапія і гастраскапія не выявілі нічога падазронага.

Галоўны ўрач Макарэвіч Мікалай Міхайлавіч, які сёння дзяжурыць, лічыць, што прычына ў дэфіцыце жалеза. А гэта ўмеюць лячыць.

А, увогуле, настрой паганы: абыякавасць да ўсяго. Нават чытаць не хочацца. Але жыць хочацца! Гэта добра — кажа Маша. Дай бог вышкрабацца.

22 кастрычніка

Кічкайла выпісаўся. Урач сказала, што лажыцца Адамовіч Павел Сямёнавіч, былы адміністрацыйнага аддзела ЦК КПБ. Па-мойму, чалавек прыстойны.

Дзейнасць Кічкайлы здзіўляла. Да яго прыходзілі цэлыя дэлегацыі, і не толькі нашы, былі французы, амерыканцы. Факт, як ідзе разграбленне маёмасці.

Гарбачоў і Ельцын аддалі армію, якая апынулася ў краінах Прыбалтыкі, у Закаўказзі, на поўнае разграбленне. Пагадненні былі падпісаны? Латышы выпускаюць афіцэраў і салдат толькі што не голымі ў натуральным сэнсе. Усё іншае — зброя, гаручае, амуніцыя — застаецца ім. Разумею камандуючага, якому хочацца вывезці хоць штонебудзь.

Кічкайла добры сябра генерала. Дамовіліся з начальнікам управлення Аэрафлоту Беларусі, быў ён тут, піў каньяк. Кічкайла на днях едзе ў Рыгу. Фёдараў пасылае на адзін з ваенных аэрадромаў, якія латышы яшчэ не катралююць, транспартныя самалёты. Вывозяць найбольш каштоўнае. Але каму паступіць гэтае дабро? З-за далікатнасці я не спытаў. Няма сумнення, што маёмасць будзе безгаспадарчая і ля яе легка можна пагрэць рукі. І людзей гэтых немагчыма асудзіць. А што — аддаць латышам, цывілізаваным дзікунам, якія рускіх, беларусаў не хочуць празнаваць за людзей, права голасу не даюць? Дэмакраты!

А колькі іх, такіх аперацый, у былой магутнай дзяржаве! Кралі брэжневы, пры Брэжневе, але ж не ў такім маштабе. Калі верыць Гдляну аб кражах Рашыдава і ўсіх узбекскіх «баяў», то і іх сумы

памеркнуць перад тымі, што могуць хапнуць тыя, хто трымае дабро і перадасць яго без квітанцый — каму?

Знаў, што ідзе грандыёзны крадзеж у 15 краінах, але не ўяўляў, што ўдзельнічаюць у ім не толькі наваяўленыя капіталісты, але і многія, вельмі многія з тых, хто трымаў уладу і мае яе зараз. Дэвіз гэтых людзей: не прапусціць моманту. Багацце — улада!

Такога разграбления не было нават у 1917 г. Была партыя, якая не дала разгулу анархіі,— РСДРП, РКП(б). Цяпер няма такой партыі. А цяпер так проста яшчэ — канфіскаваць украдзенае ў дзяржавы, вярнуць народу. Багацеі не сталі класам, не маюць сваёй арміі, сваёй сілы. Даволі рабочаму класу выйсці на вуліцу, утварыць урад нацыянальнага ратунку. Супраць рабочых армія не ўзнімецца. Цяпер не ўзнімецца. А што будзе далей? Пасіўнасць рабочых палохае. Калі рабочых купяць —хана ўсім ідэям. Не будзе сацыялізму, але не будзе і чалавечага капіталізму. У што ператворацца 15 «незалежных» дзяржаў?

28 кастрычніка

Бяздзейнасць нараджае бяздумнасць. Ці наадварот? Раней ляжанне ў бальніцы было пакутай. 38 дзён у Крамлёўскай бальніцы на нагах вясной у Кунцаўскім парку, дзе можна было гуляць, здаліся турмой. А тут «абжыўся» і не хочацца мне ні на вуліцу, ні дадому нават... Паеў, прыняў працэдуры — і ў гэтым нібыта ўсё жыццё. Псіхалогія старасці? Пэўна. Адна задача — прадоўжыць жыццё. Усё іншае адышло на другі план — творчасць, грамадская работа, грошы... Хоць кажуць: даў нядрэннае інтэрв'ю па радыё; сам не чуў, людзі чулі. Інтэрв'юіраваў Валянцін Мыслівец, пытанні задаваў «вострыя», залішне «лабавыя».

Палітыкай усё ж жыву і выпускаю пару ў размове з суседам па палаце — Адамовічам П. С., з хворымі, з якімі сустракаюся ў калідоры.

Толькі што прачытаў у «Правде» «Программное заявление XX Всесоюзной конференции КПСС». Сур'ёзны дакумент. Дзякуй богу, ёсць змагары.

Я парадаваўся стварэнню фронту нацыянальнага спасения. Сіла! Нават прадажныя дыктары тэлебачання мусілі паведамляць аб кангрэсе з сур'ёзнасцю і павагай. А ўчора Ельцын, яўна спалоханы такой арганізацыяй, патрабаваў закрыць Фронт, які, маўляў, нідзе і нікім не зарэгістраваны. Іграе з агнём.

Наша сесія абмяркоўвае праект Канстытуцыі. С. Шушкевіч выступіў за платную медыцыну і адукацыю. Жах! Як чалавек ад народа! Гэта была найвялікшая сацыяльная заваёва. Што ж вы

робіце, кіраўнікі? Абрабаваны, галодны народ вымушаеце на смерць, асабліва старых. Пры цэнах на лекі — платнае лячэнне ў бальніцах! Давялі дэмакраты!

У СП быў сход, прысутнічала Таццяна, расказвала па тэлефоне. Даўняе пытанне: уступаць ці не ўступаць у садружнасць Саюзаў пісьменнікаў? На саюзным з'ездзе нашы «мудрацы» не падпісалі дагавор.

І на сходзе: Сачанка, Брыль, Асіпенка, Далідовіч... супраць. Яны — за незалежную Беларусь, і выходзіць, ніякіх кантактаў з Расіяй. Яшчэ адзін псіхоз. Ці даўно кожны з іх абіваў парогі маскоўскіх выдавецтваў, каб выдацца па-руску. Гэта выводзіла нашу літаратуру на саюзны і сусветны рынак. А што будзе з незалежнасцю? Хто, на якую мову нас будзе перакладаць? На польскую? Французскую? Дачакаецеся, хлопцы. Ах, божа мой. Ці прыйдзем да розуму?

2 лістапада

Трохі акрыяў: гемаглабін 94, а быў усяго 42. Знешне набыў выгляд нармальнага чалавека. А быў непазнавальна бледны. Запусціў я сваю хваробу. Мужыкі мы.

Прачытаў у «А. Ф.» інтэрв'ю з Ельцыным. Які дэмагог пан прэзідэнт! Бадай, і Гітлера пераплюне. Калі яго не зваляць, стане дыктатарам і паляцяць галовы, як пры Сталіне.

4 лістапада

Памёр Міхась Ткачоў, які заняў пасаду галоўнага рэдактара энцыклапедыі пасля мяне. Доктар гістарычных навук. Прыйшоў у БелСЭ на пасаду загадчыка рэдакцыі гісторыі з Гродненскага універсітэта. Загадчык быў слабы, за тры гады не падрыхтаваў ніводнага тома Гісторыі Беларусі. Не ўмеў? Не. Увесь час аддаваў палітычнай барацьбе — актыўны дзеяч БНФ, пасля арганізаваў сваю партыю — БСДГ. З выгляду — асілак. І ўяўляў сябе дзеячам высокага рангу, яўна рыхтаваўся заняць высокі пост у парламенце і ўрадзе. Памойму, ідэя рэферэндуму належыць яму, ён быў ідэолаг БНФ, чалавек высокай эрудыцыі. Аднак на ўсіх глядзеў з вышыні свайго росту, як велікан на пігмеяў. Мяне, галоўнага, паблажліва паляпваў па плячы з яўным падтэкстам: кончыўся, маўляў, ваш час.

І вось фінал на 51 годзе жыцця. Аказваецца, у яго была хранічная хвароба нырак. І ён, дзівак, замест таго каб лячыцца, лез у лідэры нацыі. Тры гады жыў у Мінску без сям'і, без кватэры. Смерць яго ашаламіла мяне. І па-чалавечы шкада Міхася Аляксандравіча да слёз. А з энцыклапедыі нават ніхто не пазваніў.

...Малады Клінтан спляжыў старога Буша. Тут, у бальніцы, варожаць: хто лепш? Няўжо нехта спадзяецца, што Амерыка накорміць нас? Смешна. Прыбалтаў не накармілі. Абрабаваць гэтыя «дабрадзеі» могуць. І абрабуюць да ніткі. Усё наша багацце перакачуе за акіян.

13 лістапада

Далечваюся ў Гарадзішчы. Тут, у будынку грамадзянскай абароны, створаны рэабілітацыйны цэнтр коек на 30. Медыцына тут адладжана, возяць лепшых урачоў. Але гаспадара няма: будынак не дагледжаны, вокны не заклеены, холадна, асабліва ў зале, дзе тэлевізар. А ўся інфармацыя — з тэлевізара, газет няма. За 20 км ад сталіцы — тайга. Сёння ўначы нападала снегу. Лес заснежаны — прыгожа. Але да сталоўкі (метраў дзвесце) ледзь дабраліся, асабліва тыя, хто ў чаравіках, як я. Прачысціць сцежку ніхто не дадумаўся. Ох! гаспадары! Ніякая прыватызацыя не пераадолее абыякавасць да людзей, адзін да аднаго. Думаю, будзе наадварот.

Адчужанасць, зайздрасць, злосць, варожасць будуць нарастаць. І кончыцца тым, што пачнём страляць. Жах! Ельцын з яго камандай літаральна штурхаюць народ да братазабойства. Па-мойму, гэта стратэгічны план нашых «сяброў» — бушаў і колеў. Ганебнае выступление прэзідэнта вялікай краіны ў англійскім парламенце — пресмыкательское. Ігра на публіку. «С коммунизмом мы покончили раз и навсегда» — і сарваў апладысменты ястрабаў, якія яшчэ ў 1917-1918 гг. не спалі, думалі, як пакончыць з камунізмам,— бацькі гэтых пордаў. Той жа Чэрчыль, якога Ельцын праславіў, узнёс яго фултонскую прамову, тую, якая пачала халодную вайну. Славіў англійскую дэмакратыю. Але, яны разумныя: яны не ўспамінаюць, як іх бацькі тапілі ў крыві выступленні ў калоніях, як рабавалі паўсвету. Багатым можна пайграць у дэмакратыю. Сваё каланіяльнае панаванне яны выдаюць за прагрэс для «адсталых» народаў. Так яны пішуць сваю гісторыю, гак вучаць дзяцей. А нашы «дэмакраты» ўсё аплёўваюць. Чытаю ў «Новом мире» некага С. Джымбінава. Гэты аплёўвае не толькі Леніна, але і рэвалюцыянераў-дэмакратаў — Бялінскага, Чарнышэўскага, Пісарава.

Бальшавікі зрабілі глупства, калі крэслілі шмат што з духоўнай спадчыны народаў. Чым жа лепшыя «дэмакраты»? Яны Горкага хочуць закрыць. Ха, пігмеі! Горкі выйшаў на сотнях моў. Няхай Прыстаўкін так напіша і столькі.

Учора вярнуўся з Гарадзішча. Сёння схадзіў у ашчадную касу — подзвіг! — хоць на горку лез цяжка. Узяў сем тысяч рублёў «звярамі», бо прадукты прадаюцца толькі за іх. Пакуль ляжаў у бальніцы, Маша

ўзяла 10 тысяч. Такія тэмпы страт. Корміць мяне пячонкай цялячай, а яна па 300 руб. Ішоў з банка — зайшоў у магазін гародніны. Яблыкі — 81 руб., капуста — 37, буракі — 30, бульба — 21. Знайшліся дэпутаты нашага парламента, якія патрабуюць павысіць цэны (да якіх сум, абраннікі і абаронцы народа?) і замарозіць зарплату.

Калі меркаваць па дакладу Э. Шыркоўскага, у нас хоць пачалі барацьбу з карупцыяй. Ці не на словах? Але хто будзе змагацца? Міністры МУС, былы і цяперашні, збудавалі дачы — палацы. Некалі людзі, што адпачывалі ў санаторыях «Крыніцы» і «Беларусь», хадзілі на экскурсію паглядзець дачу Андрэя Макаёнка. І ахалі. Абураліся: во жывуць, буржуі! Цяпер там жа побач начальнікі МУС збудавалі дзесяткі намнога лепшых дач, чым дача драматурга з саюзным іменем. За якія сродкі? Па сённяшніх цэнах такія дачы каштуюць мільёны... А грошыкі народныя, крадзеныя — хабар, выкарыстоўванне матэрыялаў, сілы падначаленых (гэтым асабліва грашаць вайсковыя генералы — усе будуюцца). Пакуль усе пабудуюцца, не народ — начальнікі, абрабуюць няшчасны народ да ніткі. А я ўзяў сем тысяч і падлічваў, наколькі ж хопіць маіх сумленна запрацаваных ганарараў пры такіх тэмпах. Гады на два. А калі цэны будуць расці — і таго менш. А потым? А што пакінуць дзецям, унукам? Камерсанта ў сям'і ніводнага няма. Усе зарабляюць розумам сваім. Нябога Таццяна загнала сябе: лекцыі, артыкулы. Пісаць умее. Учора з Машай угаворвалі яе, каб гэтак не нагружала сябе і больш займалася дзецьмі.

22 лістапада

Учора, упершыню пасля смерці яго, сніў Сашу: у гаражы корпаліся ў машынах, ён — у сваёй, я — у сваёй. Толькі я глядзеў на яго як бы з другога паверха і бачыў, што верх кузава машыны яго брудны — у кроплях бруднай вады. Я спусціўся, а машыны яго няма. «Дзе машына?» — «Я загнаў яе. Не паеду». Куды не паеду — ні ён не сказаў, ні я не спытаў. Я ўпікнуў яго: «І не працёр».— «Праціраў!» — «Як ты праціраў? Мне зверху відаць было». А на пляцоўцы паміж гаражамі — поўна машын, многа людзей. І Саша знік паміж гэтых людзей. І — пачаўся другі сюжэт сну, абракадабра, сумбур. Загадкавая з'ява сны. Чаму сын не сніўся ні мне, ні маці? А Таццяна, жонка яго, сніць часта.

Ах, сын, сын! Не шанаваў ты сябе. А можа, гэта лёс, запраграмаванасць? Выпіваў... Але ж і я, малады, не бязгрэшы быў. Гулялі казакі. Аднак бог, лёс шкадаваў мяне. На вайне. Дзве цяжкія аперацыі. Пасля другой, калі прадзіравіў Адамовіч кішку, хірург Філіповіч, калі я ачуняў: «Мы чуць выратавалі вас». І цяпер — анемія

гэтая. Прычын для яе дзесяткі. І я рыхтаваў сябе да горшага. Дзякуй богу, заключэнне: дэфіцыт жалеза. «Это мы умеем лечить»,— сказаў прафесар Я. П. Іваноў, галоўны гематолаг. Але ад чаго ён, дэфіцыт?

24 лістапада

Партрэт сына. Яго і наша трагедыя.

Нараджэнне сына пасля дзвюх дачок было вялікай радасцю для нас з Машай, хоць маці ён каштаваў месяца прабывання ў раддоме: пры родах занеслі інфекцыю. Маша знаходзілася ў крытытчным стане. Не магла нават напісаць мне колькі слоў, і я не разумеў і перажываў: што здарылася? Пакутавала маці, пакутавала дзіцятка. Перажываў я, калі Маша ўрэшце не сваім почыркам напісала, што здарылася.

Саша ў маленстве быў забаўным хлопчыкам, яго ўсе любілі, а маці проста калацілася за сынком, асабліва калі ён хварэў. А хварэлі дзеці часта, гэта было карай для нас, бацькоў.

Помню, у «Каралішчавічах». Сядзела Маша з жанчынамі. Стаяў я з калегамі. Гулялі дзеці. Старэйшыя, у тым ліку і Таня, скакалі з высокай лавы. І ён, двухгадовы, скочыў і... расквасіў сабе носік, губкі. Маша вінаваціла мяне, я вінаваціў Машу. Хто з нас не дагледзеў?

Клопату з сынам стала больш, калі ён пайшоў у школу. Як і большасць хлопчыкаў, вучыцца Саша ленаваўся, не тое што яго сястра Таня, якая ўвесь час была выдатніцай — у школе, універсітэце. Вучобу Саша мяняў на гульню. Хлопец ён быў кампанейскі, кантактны, добры па характары. Можа, у перыяд росту ў яго сапраўды балела галава. Можа... Ён пачаў скардзіцца на галаўны боль. Колькі Маша павадзіла яго па дактарах. Вазілі ў Маскву. Устанаўлівалі розныя дыягназы — ад бяскрыўднага да страшнага, які прыводзіў маці ў роспач.

Дзіўна, што пад вясну хлопец як бы абуджаўся і канчаў навучальны год, увогуле, нядрэнна — на чацвёркі, тройкі. Аднойчы толькі меў экзамен на восень, не помню, па якім прадмеце.

Здаецца, у пятым класе ў Сашы з'явілася захапленне — галубы. Маша не ўхваляла, я ўхваляў, даваў грошы на пакупку галубоў. Ажно пакуль... выйшла аднойчы Маша ў двор, пачула ўгары грукат, глянула на дах нашага пяціпавярховага дома І... як толькі не самлела. Галубятнікі бегалі па бляшаным даху — ганялі галубоў: Саша бегаў каля самага невысокага бар'ерчыка. Маша прызнавалася, што перажыла хвіліны страшнейшыя за тыя, калі ў 1941 годзе яны сядзелі ў пограбе і над галавой пачулася нямецкая мова і ў люк прасунулася дула аўтамата.

З таго выпадку і я і Маша пачалі вайну з галубамі. Саша быў лагодны, лёгка паддаваўся ўплывам. Захапленне галубамі хутка прайшло. Захапіўся фатаграфіяй, чаму мы ўзрадаваліся.

25 лістапада

Пачуццё адказнасці ў Сашы было: у дзесятым класе школы ён займаўся так, што гэта нас, бацькоў, радавала. Пяцёркі прыносіў не часта, але «конікаў» не выкідваў, зігзагаў не рабіў, здавалася, прыйшоў да розуму. Школу скончыў на чацвёркі і тройкі, але ў размове часам даваў глыбейшыя веды, чым у выдатніцы-студэнткі Тані... Каб ён вучыўся далей — гэта было не толькі наша жаданне, але і яго. Прыцягвала яго толькі адна прафесія — геолага. Рамантык. Не ўяўляў, што гэта такое, ды, відаць і сам я не вельмі ўяўляў будні гэтай прафесіі.

Саша набраў прахадны бал на ўступных экзаменах. Студэнцкая стыхія закружыла яго. Кампанейскі, шчодры хлопец, ён адазу аброс сябрамі, не надта разбіраючыся, хто з іх сябраваў шчыра, хто — з хітрасцю, выгадай: у сына Шамякіна вадзіліся грошы. Маша шчодрая нават у адносінах да чужых людзей. А тут адзін сын.

Гулялі будучыя геолагі. Помню, Саша папрасіў у канцы першага курса адзначыць Дзень геолага на дачы. І мы дазволілі. Быў пачатак красавіка, дача не ацяплялася яшчэ. Маўляў, доўга не пасядзяць — холадна. Але Саша не вярнуўся нанач. Безумоўна, маці ўстрывожылася, і мы раніцою на таксі пакацілі на дачу. Спяць хлопцы, а на стале — свінушнік, у цэнтры стала — 30-літровая бутля, пустая. Мае самаробнае віно. Шэсць чалавек высмакталі такую ёмкасць. Жах! Пасля таго Маша катэгарычна забараняла нам, мужчынам, рабіць хатняе віно, хоць ва ўрадлівыя гады яблык не было куды дзяваць, надзялялі ўсіх знаёмых.

На другім курсе студэнт наш пачаў яшчэ больш куралесіць. Пазваніла куратар групы, папрасіла бацькоў прыйсці. Я не пайшоў — сорамна. Пайшла Маша. Вярнулася расстроеная: Саша прапускае заняткі, мае «хвасты».

Пагаварылі мы з ім строга, я забараніў Машы даваць яму грошы. Кончыў другі курс, а ў пачатку трэцяга курса, калі зноў пазванілі з універсітэта, я ўзлаваўся і пайшоў на крайнюю меру: «Ідзі ў армію! Можа, там цябе навучаць розуму!» Тады ва універсітэце была ваенная кафедра і студэнтаў не прызывалі.

Саша спачатку пакрыўдзіўся і абурыўся. Але праз нейкі час сказаў: «Пайду ў армію, бацька». Да слёз кранула гэта. Я зразумеў: хлопец сам хоча разарваць заварожаны круг, вырвацца з яго, ад

сяброў сваіх, апынуцца ў атмасферы, дзе не было б такой волі для яго, бязвольнага.

Напісаў заявы ў ваенкамат, рэктарат. Саша апынуўся ў Печах у вучэбным цэнтры. Маша кожную нядзелю ездзіла да яго з торбай прысмакаў, карміла ўсё аддзяленне. Зрэдку ездзіў я... Камандзіры хвалілі Сашу, і гэта нас радавала: армія яму на карысць!

23 лютага мы з Машай, ды, бадай, і ўсе бацькі — беларусы, прысутнічалі на прыняцці прысягі. Урачысты дзень. Натуральна, я быў у цэнтры ўвагі. Выступіў, павіншаваў будучых малодшых камандзіраў. Ваенны карэспандэнт апублікаваў у «Савецкай Беларусі» артыкул і здымкі.

26 лістапада

Маша баялася, што пасля «вучэбкі яго загоняць бог ведае куды. Прыйшлося прасіць начальства, каб сына пакінулі ў Беларусі. Увогуле, натуральная бацькоўская просьба, за яе не сорамна. Сёння ўсе дзеці беларусаў служаць у сваёй рэспубліцы. Просьбу маю задаволілі: на радасць маці Сашу прыслалі ў Мінск, ва Уручча, камандзірам радыёўстаноўкі. Кантактны хлопец, ён лёгка ўжываўся і з начальнікамі, і з падначаленымі.

Маці кожную нядзелю наведвала сына, мяне папракала, што ў мяне рэдка з'яўлялася жаданне бачыць сына.

Зрыў адбыўся на другі год, у пачатку лета. Пазваніў камандзір роты і з трывогай паведаміў, што сын наш знік з часці, больш сутак як няма; яшчэ суткі — і будзе лічыцца дэзертырам. Маша ледзьве не самлела. Ды і я моцна расхваляваўся. Куды мог падзецца хлопец? Ды ўспомніла Таццяна: Сашын універсітэцкі сябра, сын афіцэра, жыве там жа у закрытым гарадку і ён жэніцца.

Таццяна, не ведаючы вайсковых законаў, смяялася з такой прыгоды, абсалютна ўпэўненая, што Саша там, на вяселлі. Пазванілі ў часць, перадалі здагадку. Праз гадзіну звоніць камандзір: точна, накрылі іх там, сонных і ачмурэлых з перапою. Акрамя Сашы былі яшчэ вайскоўцы з іншых часцей. Гжэчная кампанія! «І куды вы іх? На губу?» — «Вашага павязу ў лагер. Часць ужо там. Вырашаць будзе камандзір батальёна».

Маша прымусіла паехаць у лагер — улагодзіць камандзіраў, хоць я і супраціўляўся: «Няхай паганцу ўлепяць сутак пятнаццаць губы». Але маці і гэтая кара страшыла. Паехалі, загрузіўшы багажнік напіткамі і закуссю. Доўга шукалі. Знайшлі. У батальёне аказаўся начальнік артылерыі дывізіі, падпалкоўнік, добры, вясёлы чалавек. Ён неяк

адразу супакоіў Машу: «У мяне свой такі сцярвец. Усе яны цяпер такія. Зараз мы прыпішам яму іжыцу».

Знайшлі Сашу, сядзеў у адзіноце ў сасняку. Доўга ўшчувалі яго — і я, і маёр, і падпалкоўнік. Саша артачыўся, палохаючы маці.

«Будзем разбіраць на камсамольскім сходзе»,— сказаў маёр.

Напісаў Сашу грознае пісьмо. Не ездзіў да яго. Маша сказала, што сын вініўся; на сходзе яму запісалі вымову.

27 лістапада

Пакуль Саша служыў, у БДУ геалагічнае аддзяленне закрылі, бо адкрылі цэлы факультэт у Гомельскім універсітэце. Зволіўся ён з арміі ў пачатку лістапада. Не прагульваць жа цэлы год! Я сам павёз яго ў Гомель. Рэктарам быў Уладзімір Аляксеевіч Белы, з якім я хораша пазнаёміўся, калі ён яшчэ рэктараваў у БІПЖТце: выступалі там з Анатолем Грачанікавым, які скончыў гэты інстытут. Знаёмства добра замацавалі пры адкрыцці універсітэта — з міністрам Мяшковым М. М. былі ганаровымі гасцямі. А ў той час усе ўрачыстасці канчаліся банкетамі.

Белы сустрэў ветліва. Тут жа залічыў Сашу на трэці курс. «Вазьміце над ім шэфства, Уладзімір Аляксеевіч».— «Бяру,— і да Сашы: — Будзеш штомесяц дакладваць мне аб сваіх поспехах. І аб цяжкасцях!»

Саша пасля расказваў нібыта з абурэннем, але, адчувалася, з удзячнасцю свайму рэктару: «Ох, гэты Белы! У касцях маіх сядзіць. Спрабаваў я не пайсці — ён сам выклікаў і добрую праборку даў». Думаю, шэфства такое пайшло хлопцу на карысць — дысцыплінавала яго, прымушала сур'ёзна займацца: за два гады шмат што забылася, асабліва ў матэматычных дысцыплінах, а ў геалогіі іх нямала. Як сказаў мне рэктар: «Трывалы серадняк. З такіх добрыя спецыялісты выходзяць».

І зігзагаў асаблівых не было, пропуску лекцый: студэнцкіх куцяжоў... Ва ўсялякім разе да нас не даходзіла, і Маша была больш спакойная, чым нават тады, калі сын быў у арміі. Грошай яму не шкадавала, пасылала больш, чым трэба было на пражыццё. Бяда, калі грошай няма, але яшчэ большая бяда здараецца, калі дзеці ведаюць, што яны ёсць і ўмеюць атрымаць іх вось такім чынам, карыстаючыся мацярынскай ці бацькоўскай любоўю.

28 лістапада

Там жа, у Гомелі, Саша пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, Таццянай Масленка, яна вучылася ў музычным вучылішчы. І перад пятым курсам абвясціў, што хоча жаніцца. Я трохі «круціў носам», а

Маша адразу згадзілася, маўляў, гэта ўтаймуе хлопца, будзе спакайней, калі побач з ім будзе жонка.

Паехалі ў Церуху, каб адтуль з'ездзіць у Лоеў — пазнаёміцца з нявестай і яе бацькамі. Помню: калі пад'ехалі да дома Масленкаў, пастукалі, маці, Марыя Рыгораўна, так усхвалявалася, што пачала заікацца. З гумарам і здзіўленнем я падумаў: «Свацця — заіка. Як жа яна працуе настаўніцай?» Не, супакоілася — і перастала заікацца.

Прызнавалася: «А што вы думаеце. Сам Шамякін у сваты прыехаў!»

Нявеста не зрабіла ўражання. Што Саша знайшоў у ёй. Прыгажун, высокі ростам. А яна, Таня, таксама перахвалявалася ў той дзень: такія агледзіны, а жаніх не прыехаў, Саша дзесьці на Палессі, у Тураве, здаецца, праходзіў практыку, паабяцаў ёй прыехаць і не прыехаў, толькі на другі дзень з'явіўся. Я спрабаваў па форме жартаўліва, па сутнасці ўсур'ёз угаварыць і Машу і Масленкаў: «Куды ім спяшацца. Вучацца ж. Няхай пачакаюць годзік. Мы з табой два гады сустракаліся».

Маці дзяўчыны была чалавекам практычным, мае ўгаворы ёй не падабаліся, і яна адказала: «Праз год вы не прыедзеце».

Карацей кажучы, знайшоў хлопец спадарожніцу, ды шчасця не набыў. Не віню Таню. А кончылася гэтае сумеснае жыццё трагедыяй: Саша памёр, калі яна ў суседнім пакоі глядзела тэлевізар. І цяпер гэта мучае яе.

Але... Вяселле мы зрабілі шыкоўнае — у рэстаране «Юбілейным», чалавек на 80. Запрасілі нямала калег маіх: сын жэніцца! Прыехалі сваякі з Гомельшчыны, нашы і нявестчыны.

Год маладажоны жылі ў Гомелі на прыватнай кватэры. Часам прыязджалі на выходны да нас. Маша лічыла, што жаніцьба Сашу пайшла на карысць, радавалася і адорвала маладых чым толькі магла — і грашыма, і рэчамі: жывіце, вучыцеся.

Дзяржаўныя экзамены Саша здаў на добрыя адзнакі, што мяне здзівіла і парадавала. Без маёй дапамогі маладога інжэнера-геолага накіравалі ў Мінск, у БелГІІЗ (институт инженерных изысканий). Не аднаго Сашу размеркавалі ў Мінск — чалавек дванаццаць: першы свой выпуск геолагаў, раней іх выпрошвалі ў Масквы. У працу Саша ўключыўся лёгка. Працаваць ён умеў, да навукі быў не вельмі прыдатны, не як Таццяна: сястра яго. Кантактны, кампанейскі, абсалютна не здатны да канфліктаў. Энергічны, рухавы.

Значны час у начальніка буравой групы займалі ўзгадненні, іх было больш, чым трэба, на маю думку, хоць сэнс у гэтым быў: усюды кабелі, у тым ліку электрычныя, культурныя пласты... Саша паказаў

нам дакумент, на якім сабраў подпісы 28(!) кіраўнікоў розных арганізацый, некаторыя, здавалася, не маюць дачынення да геалагічных даследаванняў. Помню, Андрэй абураўся: бюракратыя! Між іншым, Саша якраз любіў гэтую частку сваёй работы, а не палявую. Палявая яго расчаравала. Аднастайна, нудна, цяжка. Дзе рамантыка геолага, пра якую марыў вучань і студэнт, нагледзеўшыся фільмаў? Сапраўды, асабліва цяжка было ў камандзіроўках. І асабліва зімой. Цэлы дзень на буравой. У апошнія гады праблемай стала паабедаць, павячэраць па-чалавечы. Намерзнуцца буравікі. Хочацца пагрэцца, пацешыць душу, пагаварыць у кампаніі. Безумоўна, чарка. У калгасах — гэта самагонка не лепшага гатунку. Саша і не адмаўляў гэтага: «А што ты, бацька, хочаш, калі душа прымярзае да рэбраў».

Выпіўкі, сухая ежа сапсавалі яму страўнік. «Крычала» печань. Саша ахвотна лажыўся ў бальніцу — лячыць страўнік, печань. Амаль кожны год мы арганізоўвалі яму пуцёўкі ў санаторыі. У той трагічны 1991 год ён паехаў у Юрмалу ў санаторый «Беларусь». Маша вельмі хацела, каб з ім паехала Таццяна. Не паехала. Суседка па кватэры, муж якой рабіў у Варшаве, прыслала запрашэнне. Як яна магла не паехаць у Варшаву?

19 гадоў пражылі — і марна. І так крыўдна і балюча, што не засталося сынавага сына ці дачкі. Прозвішча знікне, калі я памру.

«Яго і наша трагедыя»,— напісаў я. Не. Толькі наша. Яму цяпер усё роўна. Ні зямных радасцей, ні зямных трагедый. Там іх няма. Тагасветнае жыццё выдумана для суцяшэння жывых.

2 снежня

Прачытаў у «Правде» інтэрв'ю Мікалая Яроменкі «Культура, отданная на закланье».

Глыбока крануў эпізод, які ён прыводзіць: прыйшоў да яго 85-гадовы народны артыст СССР Здзіслаў Стома. Сеў і заплакаў: «Коля, няма за што жыць». Хутка ўсе заплачам, пенсіянеры, напэўна. А нашы «інжынеры чалавечых душ» славяць гербы літоўскіх князёў і не бачаць, як жыве народ. Крычаць аб «балышавіцкай цэнзуры», а самі выдумалі горшую цэнзуру і могуць толькі пляваць на мінулае народа і літаратуры, быццам не яны стваралі яе. Дзіўна. Кажуць: раней выслугоўваліся перад ЦК. А цяпер перад кім выслугоўваюцца? Ніхто і не чытае іх панегірыкі «во славу демократии». А як на нашых радах і сходах кожны стараецца паказаць, што ён самы-самы перадавы, самы дэмакрат. Горка і смешна слухаць. Уступіць у садружнасць Саюзаў пісьменнікаў? Не, ніякіх саюзаў з рускімі! Мы, маўляў, самі з вусамі. І гэта тыя, што некалі стараліся надрукавацца ў рускіх часопісах, вы-

дацца ў «СП» ці «Молодой гвардии». Дзе цяпер надрукуюцца? І ператворымся мы ў захудалую правінцыю з такой самастойнасцю.

Праслухаў даклад Ельцына на 7-м з'ездзе народных дэпутатаў Расіі. Дэмагогія. Пра тое, як жыве народ, ні слова. Рэформы не для народа. Рэформы — для стварэння класа ўласнікаў, капіталістаў.

Сумна. Чытаў у «Правде», як катастрафічна расце колькасць самагубстваў. Ніколі не разумеў логікі самагубцаў — жыццялюб! Цяпер разумею: чым такое жыццё, лепш — «в мир иной». Не дай божа, дажыць да такой роспачы!

11 снежня

Мы — незалежныя, але Расійскі з'езд слухаем з большай увагай, чым сваю сесію парламента. Хіба толькі драматызм падзей прыцягвае? Ад таго, што адбудзецца ў Расіі, залежыць і наш лес... Думаю, што гэта разумеюць нават прибалты і закаўказцы. Ігра ў незалежнасць, у нас, прынамсі, нагадвае аперэту з фальшывымі галасамі. «Спяваюць», а слухаць немагчыма.

Ельцын выявіў сваю натуру дыктатара, такім ён быў першым сакратаром, ведаюць яго. Падумаеш, трагедия—-з'езд не зацвердзіў Гайдара. Фігура. Калі ён чым кіраваў? У Італіі па два разы на год мяняецца ўрад — і нішто не развалілася. Знайшоўся вялікі рэфарматар — Гайдар. Пасрэдны журналіст, ніякі эканаміст. Але, здаецца, справа не ў Гайдару, не толькі ў Гайдару. Барысу трэба прычына, каб разагнаць з'езд, Вярхоўны Савет. Трэба дыктатура. Мітынг на заводзе рыхтаваўся яшчэ да галасавання, на завод былі кінуты прадукты, тавары. Здзіўляе рабочы клас: лёгка яго купляюць. Не той рабочы клас, што быў у 1917-м. У Маскве асабліва. Слова можа сказаць правінцыя. Ёсць сілы! Па дэпутатах відно. Як выступілі Тулееў, Траўкін. Учора хораша выступіў Руцкой, сказаў адкрытым тэкстам: каманду Гайдара трэба судзіць! Трэба! Ой трэба! Трэба мяняць «жыхароў» «Матроскай цішыні» — Паўлава, Язава, Янаева і садзіць туды Гарбачова, Ельцына, Гайдара за здраду Радзіме. Бо яшчэ год улады рэфарматараў, і Расія будзе ўшчэнт развалена. А за Расіяй і мы. Эканоміка трашчыць — цэны галапіруюць. Дзяржаўны апарат разлажыўся — далей няма куды, такой карупцыі, бадай, не знялі ні афрыканскія, ні лацінаамерыканскія краіны.

Сустрэў Віктара Лівенцава.

— Як жывеш?

— Добра.

— Аптыміст.

Расказвае. Сын у Маскве кіраўнік сумеснай руска-аўстрыйскай фірмы. Мільянер. Здорава сынкі былых упісваюцца ў рынак. Ды і самі былыя не спяць у шапку. Дзялкі. За кошт народа.

19 снежня

70 гадоў «Полымя». Вечар у філармоніі. Я выступаў — ад сябе, ад Камітэта абароны міру. Ва ўсіх прамоўцаў хапіла розуму не пляваць на савецкую гісторыю, інакш сам юбілей страціў бы ўсялякі сэнс. Думаю, што пераважная большасць пісьменнікаў разумеюць, што пры тым камуністычным рэжыме пры ўсёй яго ідэалагічнай зашоранасці створана вялікая літаратура. Яна, літаратура, адна трымала нацыянальнае слова. Нас чыталі — і мова не паміралa, не магла памерці. Каго больш чыталі, той зрабіў большы ўклад у падтрымку жыццядзейнасці мовы.

30 снежня

Канчаецца год. Наступае новы. А што ў ім будзе новага? А вынікі гэтага года, што становіцца гісторыяй? Сумныя для краіны — СССР. Сёння 70-годдзе Вялікай Дзяржавы, якую так ганебна развалілі. Гарбачоў, Ельцын з дапамогай фанабэрыстага хахла Краўчука, асцярожнага дэмагога Шушкевіча. Учора слухаў яго прэс-канферэнцыю: круціўся, як уюн на патэльні, як пісаў некалі пісьменнік Ілья Данілавіч Гурскі, добры і мудры чалавек.

Рабіў Станіслаў рэверансы і Расіі, і Пазьняку, і «партакратам» ВС: ён, маўляў, за рэферэндум, але недасканалы закон аб рэферэндуме, а таму ён супраць. Рэферэндуму баяцца ўсе, акрамя БНФ. Але калі Пазьняк і Трусаў лічаць, што праз рэферэндум яны маглі б заняць былы кабінет П. М. Машэрава, дзе цяпер сядзіць Шушкевіч, то памыляюцца яны, бо далёкія ад народа, не ведаюць яго настрой.

31 снежня

Быў учора ў Саюзе. Яўген Каршукоў імяніннік, выставіў пляшку гарэлкі. Пасядзелі, пагутарылі — і хораша: як пабыў у сваёй стыхіі, глытнуў свайго паветра. Нічыпар Пашкевіч хутка п'янее. Абурэнне яго ўчора было супраць Дударава, які праўленню Літфонду наладзіў абструкцыю — за кафэ, якое хацеў прыватызаваць, і супраць Міколы Гіля і лімаўцаў, якія надумалі «праватызаваць» тыднёвік, ужо распусцілі старую рэдакцыю — падзякавалі за работу і — будзьце здаровы. Звышнахабства! А старшыня СП Васіль Зуёнак нічога не ведае. Быў орган СП, а стаў органам БНФ — па публікацыях. Фінансуецца, як орган СП.

Усе абураліся, але адчуваю, што абурэннем усё і скончыцца. Хочацца ўспомніць хоць што светлае ў годзе, які канчаецца. Грамадскае, асабістае. Няма. Чорнае ўсё. Ні іскрынкі.

Слухаў учора навагодняе вітанне Ельцына. Чаму на дзень раней? Вырашыў гульнуць прэзідэнт пад Новы год?

Божа мой, якая сацыяльная дэмагогія! «Рэформа пайшла» — гарбачоўскі «працэс пайшоў». І каго яна ашчаслівіла, рэформа Ельцына і Гайдара? Народ? Такой жа дэмагогіяй займаўся Станіслаў Шушкевіч.

Расчаравалі апошнія нумары «Правды»: патухае ў газеце выкрывальны агонь. Хто яго залівае? А харошая газета была, такая ж праўдзівая, як у першае дзесяцігоддзе свайго існавання. Калі патухне і гэты агонь — усё, амба, лічы, што капіталізм перамог, народ скарыўся. Палітыка, палітыка... каб яна спрахла!

Што-небудзь сваё, душэўнае. Няма свайго. Знікаюць высокія ідэалы — знікае духоўнае жыццё. Застаецца адно матэрыяльнае: клопат пра дзень сённяшні, дзень заўтрашні, які ў чорным тумане. Маша прыйшла з магазінаў, расстроеная. Паліцы пустыя. Пад Новы год!

Дзе ж вы, радасці жыцця?

3 студзеня 1993 года

Упершыню сустракаў Новы год адзін, як перст. Не, не адзін — з тэлевізійнымі брахунамі. Алеся і Сяргей паехалі ў Докшыцы. Маша лягла спаць, пасля смерці Сашы яна не прызнае, пазбягае любыя ўрачыстасці. Але ўдзень першага сабрала ўвесь клан — 15 чалавек — на йавагодні абед. Абед гэты, вельмі добры абед, гатавала сама, падняўшыся ў шэсць гадзін раніцы. А сёння паехала на могілкі. Мароз, холад. Прасіў не ехаць. Дзе там! Угаварыць яе немагчыма. Васемнаццаты год Вольга ездзіць на магілу сястры штонядзелі. Друг! год Маша ездзіць да сына. Можа, ёй лягчэй ад выкананага абавязку.

Чытаю газеты: пад Новы год прыйшлі два нумары тыднёвіка «День». Юрый Уласаў прарочыць дыктатуру. Не Ельцына. Але дыктатары не вырастаюць за год-два. І прыход іх заўсёды крывавы!

7 студзеня

Нашы пішуць: нараджэнне Хрыстова. Тады рускія павінны гаварыць: рождение Христово. Нашы самастойнікі баяцца стараславянскага слова — Раждзество. Так гаворыць народ, так пісалі ўсе нашы асветнікі, ад Скарыны.

Учора Іван Навуменка сабраў камісію па спадчыне Крапівы. Глядзелі эскізы надмагільнага помніка вялікаму сатырыку, зробленыя

Святланай Гарбуновай. Святлана харошы скульптар. Але Крапівы няма ні ў адным варыянце. Відаць, скульптар можа перадаць характар чалавека. Характар творцы, мастака перадаць не можа. Цікава, які помнік Мальеру ў Парыжы? Астроўскі перад Малым тэатрам эпічны, гэта знаходка. А калі Шатэрнік пасадзіў у крэсла Макаёнка (на магіле) — я пратэставаў: не ў характары Андрэя такая заспакоенасць. Ён гарэў, як метэарыт. І згарэў. Па-мойму, на магілах павінны быць не постаці пісьменнікаў, мастакоў, а сімвалы, якія выражалі б сутнасць іх творчасці. Скульптурныя партрэты могуць ставіць звычайным людзям, якія пакінулі толькі прадаўжэнне роду свайго.

У паўзе Навуменка спытаў, ці чытаў я інтэрв'ю Быкава. Не чытаў.

«Ён так па вас праязджаецца. Трэба адказваць». Шкрабанула па сэрцы. Сёння прачытаў гэтае інтэрв'ю ў «Звяздзе». І стала мне шкада майго калегу. Зашоранасць канчаткова асляпіла яго. Вася абліў гразёю гісторыю «Полымя» і ўсіх супрацоўнікаў зрабіў агентамі КДБ. За што? Што не надрукавалі «Мёртвым не баліць»? Дык Масква ж надрукавала.

Адказваць на гэта — не паважаць сябе. Хлусня ці няведанне: ніводзін твор Быкава не праходзіў праз такое чысцілішча, як мой «Петраград — Брэст». Я адказваць не стану. Але, урэшце, не літаратура галоўнае.

Вольга і Маша паехалі на магілу Клавы: сёння дзень яе нараджэння. Сестры не прамінаюць ніводнага каляднага дня. Пакуль жывём мы, будзе жыць памяць пра Клаву, Сашу, Колю, Мішу. А калі нас не стане?

11 студзеня

Учора расійскае тэлебачанне перадало дзікі факт, які проста ашаламіў. Божа мой, да чаго дажылі! У людзей, для якіх долар стаў богам, знікае ўсё чалавечае.

З Пскова ішоў аўтобус з мяшэчнікамі, гарбахватамі, хапугамі ў Польшчу. На пад'ездзе да мяжы (да Брэста, Гродна?) памёр адзін з пасажыраў. Што робяць астатнія? Спыняюцца? Павяртаюць назад? Не. Г'арыць бізнес. Труп нябожчыка кладуць на задняе сядзенне, накрываюць і працягваюць свой маршрут — да польскага базару. Праходзяць мытню. Перазджаюць граніцу. Чатыры дні ездзяць па Польшчы, прадаюць, купляюць, начуюць у аўтобусе, ядзяць, п'юць — побач з нябожчыкам. Жах! Да якога падзення дайшлі людзі! Ніводны з нас, савецкіх пісьменнікаў, ніколі не прыдумаў бы такога сюжэта. Мы — гуманісты і верылі ў людзей. І тыя, савецкія, людзі не пайшлі б

на такое дзікунства. «Свабодны рынак» робіць іх такімі. А якія яшчэ могуць быць злачынствы!

Уначы пракручваў гэты сюжэт. Але жудасна рабілася, што 25-30 беларусаў мушу рабіць вось такімі... нелюдзямі. Безумоўна, нелюдзі, інакш не назавеш. А мы спадзяёмся на спонсарства, мецэнацтва. Смешна. Калі пераможа капіталізм (не дай божа!), то хіба дзеці, унукі сённяшніх спекулянтаў, якія скончаць Сарбону, Кембридж, Гарвард, падумаюць пра галодных. Сённяшнія не падумаюць. Літаратура, культура... — наплюваць ім на яе.

Я пісаў, што ляжаў з Кічкайлам. Былы старшыня аблвыканкома, намеснік старшыні СМ стаў камерсантам. У бальніцы ў яго быў філіял фірмы: прыходзілі пачкамі нашы дзялкі, французы, амерыканцы...

Я падарыў Кічкайлу першы том свайго трохтомніка, другі і трэці яшчэ тады не выйшлі. Ён выпісваўся. Я пазваніў яму, як там у Гарадзішчы? Ён сам спытаў: «Другі том не выйшаў?» — «Ёсць». Маша прынесла кнігу ў бальніцу. Напісаў прачула: на добрую памяць і іншае. Пазваніў, каб прыслаў каго-небудзь на кватэру ўзяць кнігу. «У мяне сын там жыве, побач з вамі». Прайшло два месяцы — ніхто не з'явіўся. Я пазваніў «паважанаму Аляксандру Трафімавічу пад Новы год, павіншаваў і паведаміў, што ўжо два тамы з аўтографамі ляжаць на маім стале. «Добра, я прышлю вадзіцеля».

13 студзеня

Мексіканскі серыял «Багатыя таксама плачуць», прымітыўны сіроп, выклікаў псіхоз. Заставаліся нядоеныя каровы — даяркі імчалі да тэлевізараў. Збягалі раней часу з работы самыя акуратныя служачыя. Праверыў: глядзелі самыя патрабавальныя літаратурныя, тэатральныя, кінакрытыкі. Зараз ідзе аўстралійскі фільм «Вяртанне ў Эдэм». Глыбокі сцэнарый, праўдзівыя канфлікты, суровае выкрыццё маралі буржуазіі. Выдатныя акцёрскія ролі. Высокапрафесійная рэжысура. Захапляючая аператарская работа — якія пейзажы. Панарамы Сіднея! Для мяне 45 мінут серыі — радасць пазнавання новага: чужога матэрыка, іншых людзей, малазнаёмага сацыяльнага пласта. А гледачы «Багатых...» не глядзяць «Эдэм...». Народу трэба займальны прымітыў. «Новыя выдаўцы» — жулікі гэта ўчуялі: кніжны рынак навадніліі дэтэктывамі, сексуальнай макулатурай. Але, думаю, справа не толькі ў попыце. Літаратура гэтая, фільмы падкідваюцца «духоўнымі пастарамі» з-за бугра — тымі, хто сёння накіроўвае ідэалогію нашых «дэмакратаў». Здаецца, бяскрыўдны — Чэйз, але куды ён паварочвае думкі, імкненні юнакоў! А тут яшчэ рэклама, «поле чудес», «рынгі» розныя са стаўкамі ў дзесяткі тысяч рублёў. Во жыццё! —

здаецца галышу. Навошта забіваць галаву сур'ёзнымі кнігамі! Талстой, Чэхаў? Старое. А Горкі, Маякоўскі, увогуле, сталіністы. Так вымятаецца з маладых гадоў усё сур'ёзнае, высокамаральнае, высакароднае. А таму возяць труп. Думаю, што пры панаванні КПСС нашу дубовую, абсалютна нягнуткую ідэалогію нам падкідвалі, каб пасля лягчэй было разбурыць яе. І разбурылі. ЦРУ пралічвала на дзесяцігоддзі наперад, у іх — яўрэйскія галовы.

Чытаю «Апрель семнадцатого» Салжаніцына. Сур'ёзна. Але — божа мой! — як гэта сумна! Прэтэнзія на «Войну и мир». Куды там! Набор выразак з газет 1917 года. Можа параўнацца з філасофскімі адступленнямі Талстога? І блізка не начавалі! Увогуле, што за жанр? Даследаванне? Раман? Даследаванне рэгістрацыйнае, без філасофіі. Керанскі, Ленін, Гучкоў, Мілюкоў — апісальна. Зусім не так, як рысуе Талстой Кутузава, Аляксандра, Напалеона.

Раман? Вымышленыя героі — нежывыя, таксама апісальныя. Аўтара падвёў «ГУЛАГ». Там даследаванне было адкрыццём для чытача, тамы прачытваліся, хоць упэўнены, не ўсё праўда ў «ГУЛАГу», будучыя гісторыкі сур'ёзна паправяць літаратара, не сумняваюся. Гэта была рэч на патрэбу дня — сацыяльны заказ тых, хто даўно стараўся дэманціраваць сістэму. Салжаніцын для іх быў знаходкай: ён люта ненавідзеў тую сістэму і меў талент. О, як яго паднімалі! Нават бродскія не мелі такой славы. А нашы дурні лыпалі вачыма, хлопалі вушамі. Выслалі... Кінулі шчупака ў рэчку!

30 студзеня

Мне — 72. Стары лапаць. А трапячуся. Учора парадаваў аналіз крыві: гемаглабін дагнаў да нормы — 130 — з 42, з якімі паступіў у бальніцу.

Сёння з'ездзіў на магілу сына. Пакланіўся. Пасля наведаўся на дачу. Нарэшце лягла зіма: мароз раніцою 15, снег. На дачы прыгожа.

Шлюць тэлеграмы, звоняць. Віншуюць нават чытачы, якіх не помню.

Дзённік паклаў у шуфляду стала. Улез у аповесць. У страшную аповесць: да якога падзення даходзяць людзі ў выніку рынку (базар, а не рынак), пагоня за грашамі, за доларамі, асабліва, робіць людзей нелюдзямі, у думках іх не застаецца нічога святога. Пішу з хваляваннем. Вельмі шкада героя, шчырага чалавека, вучонага, які памірае ў дарозе. Пішу і плачу. Зноў плачу. «Над вымыслом слезами обольюсь». А бязлітасны сябра мой Андрэй называў гэта шызафрэніяй. Кажуць, яе 500 відаў. І творчасць туды ж? Не, дарагі Андрэй! Гэта не

шызафрэнія, гэта — выяўленне магчымасцей чалавечага розуму. Творчасць любая — вяршыня інтэлекту.

«Звязда» апублікавала заяву пісьменнікаў, прыхільнікаў міжнароднай супольнасці пісьменніцкіх саюзаў. Падпісала больш 100 чалавек. Танк, я, Савіцкі, Навуменка ў ліку першых. Ініцыятары Г. Пашкоў, В. Мыслівец. Дзякуй ім. Мы, старыя, з-за інертнасці нашай абмежаваліся б размовамі і абурэннем, што кіраўніцтва наша не падпісала Дагавор аб супольнасуці.

Збіраюцца дзеці, унукі. Накрываюць стол. Не вельмі вясёлая дата — 72. Але калі арганізоўваюць маленькае свята — гэта прыемна. Свята для ўсіх — старых і малых!

1 сакавіка

Пісаў аповесць. За паўтара месяца — 100 старонак. І ў маладосці не працаваў з такой інтэнсіўнасцю. Захапіў сюжэт. І характары. Яшчэ адзін прысуд «рынку», які калечыць душы людзей, прысуд чалавечай сквапнасці і жалоба па людзях сумленных, якіх развал, «дэмакратыя» робяць, у лепшым выпадку, жабракамі, а то і зусім пазбаўляюць жыцця, як герояў маіх — Рэчыцкага, Булаўскага.

Аповесць атрымалася. Пасля некалькіх варыянтаў назвы, якія з'яўляліся ў працэсе напісання, спыніўся на незвычайнай рэкламнай назве — «Сатанінскі тур».

Прагна пісаў, спяшаўся, як баяўся, што не хопіць часу. Увогуле, прагна жыву. Прагна ем — пасля анеміі, прагна п'ю, хоць асцярожна, і не прапускаю прыёмаў, на якія запрашаюць. Прагна общаюсь з людзьмі. І люблю іх, людзей. Нават ворагаў сваіх. Талстовец. Але і ненавіджу — тых, што развалілі краіну, вялікі Саюз. А развал працягваецца. Ідзе татальнае абядненне народа. Штомесячна падскокваюць цэны, і не на 3-5 працэнтаў, як у Італіі, а на ўсе 100 і больш. Вось і сёння скочылі. Радуйцеся, працоўныя, дэмакратыя вас ашчаслівіла. Дні тры назад спрачаўся з нашым спікерам. Ён з'явіўся на вечар памяці бацькі свайго — Станіслава Шушкевіча, з нагоды 85-годдзя сярэдняга паэта было арганізавана некалькі вечароў — па тэлебачанні, у музеі Янкі Купалы, у Саюзе пісьменнікаў.

Я сказаў Шушкевічу:

«Нельга паднімаць цэны».

«А што рабіць? Ад нас усё вывозяць. У Эстоніі буханка хлеба 40-50 цэнтаў. А ў нас 2 цэнты».

Дзіўная матэматыка дзяржаўнага кіраўніка, першай асобы: чаму падлік на долары, на цэнты? Самыя адсталыя краіны маюць сваю валюту і ёй вызначаюць унутраныя цэны. А мы ў дзікім рабстве

пакланення долару, які нічым не забяспечаны. І дзіўны метад аховы ўласнага рынку — павышэнне цэн.

Пры гэтым «свішча» старшыня ВС: «Я выступаў перад рабочымі электрамеханічнага завода, і яны — за павышэнне цэн».

Такую мутню мог змарозіць толькі чалавек, які далека адступіў ад гэтых рабочых, жонка якога не стаіць у чэргах, не падлічвае «зайцоў». Рабочыя за павышэнне цэн! — перахрысціся, Стась! Каб гэта сказаў Клінтан ці Коль, рагатала б уся Амерыка, уся Германія і ўвесь свет. Там павышэнне на тры працэнты выклікае масавыя дэманстрацыі пратэсту. Нашы не пратэстуюць. Штыль. Зацішша. Ашаломленыя людзі, ці што? Але спее гнеў. Аслепленыя дэмакраты не бачаць гэтага. Не, пэўна адчуваюць. і баяцца. «Дэмакратычныя» пісакі палохаюцца напамінку пра суд народны. Дробны, але цікавы факт. Напісаў адказы на анкету «ЛіМа» з нагоды 100-годдзя Максіма Гарэцкага. І было там такое:

«Якуб Колас мог у 1907 годзе кінуць прыгавор:

Багачы і панства,
Нашы «дабрадзеі»,
Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі!

Хто-небудзь з нас кінуў падобнае «пажаданне» сённяшнім багачам, што нажываюцца на абядненні, на жабрацтве народа, на яго няшчасці?! А між тым тыя багачы былі родавыя, саслоўныя і вызначаліся ўсё ж высакароднасцю, успомнім дзекабрыстаў. А сённяшнія багачы? Хто яны? Якія іх медаты ўзбагачэння? А мы, творцы, чырыкаем, як вераб'і, аб заваёвах дэмакратыі!

Усё гэта «вялікі дэмакрат» Мікола Гіль зняў без узгаднення з аўтарам. Во і ўвесь плюралізм, уся свабода — дарэвалюцыйнага Коласа спалохаліся.

7 сакавіка

Быў на пленуме ЦК КПБ. З 255 членаў, выбраных на 31-м з'ездзе, з'явілася 125, праўда, чалавек 16 выбылі — памёрлі, выехалі за межы Беларусі. Мала? Не, нямала. Збор асабіста мяне ўзрадаваў, былі ж яшчэ члены кантрольнай камісіі. Малафееў зрабіў даклад. Без праграмы, больш пра сваю дзейнасць за гэтыя паўтара гады — апраўдваўся. Але ніхто яго не вініў. Пафас усіх выступленняў — аб'яднанне з ПКБ. Чыкін, Ляшкевіч, Сямёнаў, сустаршыні выканкома ПКБ, адчувалі сябе пераможцамі. Аб'яднанне — разумны крок, яно можа стварыць самую масавую партыю — перад выбарамі; калі эканамічнае становішча не палепшыцца, а напэўна, не палепшыцца, камуніс-

ты могуць мець у парламенце калі не большасць, то даволі значную і сур'ёзную апазіцыю. А могуць заваяваць і большасць, як Бразаускас. Бяда наша ў тым, што няма лідэра, нацыянальнага. Малафееў — не лідэр. Чыкін? Актыўны, разумны, але рускі, гэта дае падставы БНФ адкрываць па ім агонь.

На 24 красавіка назначаны XXXII з'езд. З'езд павінен прыняць рашэнне аб аб'яднанні. У ПКБ на 99 працэнтаў члены КПБ. Але з 600 тысяч (на жнівень 1991 -га) арганізавалася 20 тысяч. Што дасць улік членаў КПБ, аб'яўлены бюро, пацверджаны ўчарашнім пленумам? Было б у аб'яднанай партыі хаця б тысяч 50-60. Другой такой па колькасці партыі няма — па адной-дзве тысячы. Не хочуць людзі ісці ні ў якія партыі — расчараваліся і ў камуністах і ў дэмакратах. Нас можа набрацца паўсотня тысяч, але бяда ў тым, што добрыя працэнтаў 60-70 — гэта людзі майго ўзросту, пенсіянеры.

Цікава: быў агент БНФ на пленуме?

21 лютага мы з Іванам Навуменкам пайшлі ў парк на мітынг, прысвечаны 75-й гадавіне Савецкай Арміі і Флоту. Дзён праз тры сустракаю ў выдавецтве Рыгора Барадуліна, а ён мне з ухмылачкай: «А вы былі на камуністычным зборышчы». Я здзівіўся: калі, дзе? На бюро ЦК я не пайшоў, пленума не было. «У нядзелю ў парку»,— удакладніў Барадулін. «Грыша! У нядзелю было не зборышча, а мітынг удзельнікаў вайны, якія ратавалі наш народ».

Учора на пленуме былі Сачанка і Чыгрынаў, ім увага. Ваню — у рабочую групу па падрыхтоўцы з'езда. Лідэраў пацешыла, што ўсе пісьменнікі — члены ЦК і Лучанок з'явіліся на пленум. Натуральна, што ім увага: параўнаўча маладыя.

Зайшлі ў буфет, а там гарэлка, каньяк і бутэрброды, сасіскі. Расшчадрыўся Барыс. Узяў пляшку. А потым яшчэ нейкі былы сакратар гаркома, зямляк Чыгрынава. А за суседнім сталом — Камай, Чыкін, Зеляноўскі, Малафееў, Місуна (кажуць, Місуна стаў мільянерам). Гулялі казакі.

14 сакавіка

Толькі што прачытаў у дзённіку за 1991 год абурэнне самім сабой: «Як дзённік —так палітыка. Абрыдла». Але куды ад яе дзенешся? За VIII з'ездам народных дэпутатаў Расіі сачылі з большай увагай, чым за любой сесіяй свайго ВС. І так не адзін я. Усе. Жывём падзеямі ў Расіі, у Маскве. Прывыклі? Ды не! Цалкам залежым ад яе, ад Расіі, не толькі ў эканоміцы, але і ў палітыцы. Не адарвацца нам! Ды і адрывацца было б вялікім глупствам! Куды адрывацца? Лезці ў абдымкі Польшчы, Германіі?

З'езду даю вышэйшы бал. Далі дэпутаты добрую пстрычку Ельцыну. Ёсць за што! Дайшло да людзей. Але побач з задавальненнем — трывога. Ельцын па прыродзе — авантурыст. Ад такога можна ўсяго чакаць. Ды і падбухторваюць яго. З-за бугра. Як заварушыліся Клінтан, Буш, Мітэран. Хістаецца трон пад іх стаўленікам. Плануюць — як ратаваць. Нахабна ўмешваюцца ва ўнутраныя справы вялікай дзяржавы. Да чаго дажыў, вялікі рускі народ! Ганьба! Да чаго цябе давялі — больш правільна.

17 сакавіка

Памёр акадэмік Бокуць Барыс Васільевіч. І мне сумна і балюча. Мы хораша пасябравалі з Барысам Васільевічам, калі ён быў рэктарам Гомельскага універсітэта. І тады, відаць, сустракаліся часцей. Прыязджаючы на Гомельшчыну, я ніколі не мінаў універсітэт. Па ініцыятыве Бокуця штогод праводзілі Дзень беларускай літаратуры ва універсітэце. Я заўсёды ўзначальваў брыгаду, і пісьменнікі ахвотна ехалі ў Гомель.

Харошая атмасфера была на сустрэчах, і яна ішла ад рэктара. Зала заўсёды была паўнюткая і шчыра зацікаўленая. Фізік Бокуць выдатна валодаў беларускай мовай, добра ведаў літаратуру. Склад брыгады ён заўсёды прасіў у мяне загадзя і прачытваў творчасць ўдзельнікаў сустрэчы. Гэта маіх калег проста захапляла. Яны кланяліся такому рэктару. Бокуць удзяляў асаблівую ўвагу філалагічнаму факультэту. Як ніхто з іншых рэктараў. Ён рабіў Гомельскі універсітэт беларускім. Гаварыць з ім было надзвычай цікава. Помню, пасля чарнобыльскай аварыі я прасядзеў у яго кабінеце гадзіны 3—4. І даведаўся пра радыяцыю больш, чым з усіх публікацый. Прагнозы ў Бокуця былі змрочныя. Я не згаджаўся, нават спрабаваў аспрэчваць, невук.

«Дай бог, Іван Пятровіч, каб было так, як я прагназую. Баюся, што будзе горш».

Разам з тым ён меў цэлую праграму барацьбы з вынікамі аварыі, падняў усе навуковыя сілы універсітэта. Але начальству не падабаліся яго праўдзівыя выказванні. І, замест таго, каб сказаць Чалавеку і Вучонаму дзякуй, абком пачаў ганебную кампанію супраць рэктара свайго універсітэта. І за што! За навуку? За Чарнобыль? Не. Інвалід вайны, акадэмік пачаў будаўніцтва просценькай дачы (хіба тады будаваў хто такія, як будуюць зараз?). Я, здаецца, пісаў, як сустрэў Бокуця ў ЦК, як нервова ён курыў — рыхтаваўся да размовы з сакратаром аб гэтай няшчаснай дачы. Вынікаў тая размова не дала. Неяк пасля пры сустрэчы Барыс Васільевіч махнуў рукой. Ён быў філосаф.

Ён быў мужны чалавек. З вайны каля пазванка ў яго сядзеў асколак міны — так, што ніхто з хірургаў не ўзяўся аперыраваць. Бокуць хадзіў у карсеце. Часта перажываў зверскі боль — да страты прытомнасці. Асколак гэты аста ўкладваў яго на 2-3 месяцы ў бальніцу. Я наведваў яго тут, у Мінску, у бальніцы. І захапляўся ім — яго аптымізмам, яго цікавасцю да ўсяго, што адбываецца ў краіне. Між іншым, ён, можа, адзіны з тых, каго ведаў, з кім шчыра гаварыў, сустрэў «перабудову» без эйфарыі, на якую было захварэў і я. «Блеф гэта, Іван Пятровіч, блеф. Пройдзе час — памянеце мае словы». Успамінаю, Барыс Васільевіч, успамінаю. Мудры вы чалавек! Няхай будзе вечнай памяць пра вас!

Пайду на пахаванне. Хаваюць сёння з Акадэміі.

Прыехалі чацвёра маладых немцаў — евангелісты. Вячэралі ўчора з імі.

24 сакавіка

Патыхае порахам з Масквы. Калі сёння на сустрэчы Ельцын, Хасбулатаў, Зоркін не дамовяцца і адбудзецца з'езд, які вынесе імпічмент (божа, няўжо ў вялікай магутнай рускай мове няма свайго слова?), Ельцын, галоўнакамандуючы, падыме армію. Прыроджаны дыктатар! І яго здорава падбухторваюць на гэта Клінтан, Коль, Мітэран і ўся банда міжнародных шакалаў, якія, разваліўшы СССР, імкнуцца цяпер разваліць і Расію — удаўся ж эксперымент у Югаславіі. Ад Ельцына, які стаў служкай гаспадароў свету, можна чакаць усяго. Пра народ палітык гэты не думае. Страшная рэч улада, яна пазбаўляе чалавека ўсіх маральных прынцыпаў. Ва ўладароў свая мараль, простаму чалавеку незразумелая. Бяда ў тым, што і власть имущие, выпрацаваўшы ўласную мараль, перастаюць разумець мараль агульнанародную. Хрысціянін Джугашвілі, як! вучыўся на свяшчэнніка, забыўся ўсе хрысціянскія запаветы. Тое ж здарылася з Гітлерам.

Буржуазія даўно гэта зразумела і здолела абмежаваць уладу каралёў, прэзідэнтаў. Толькі з'езд, Вярхоўны Савет мог бы трымаць пад кантролем такога, як Ельцын. Калі ён выйдзе з-пад гэтага кантролю, цяжка ўявіць, што можа натварыцца. Не дай бог!

Вычытаў аповесць. Вычытаў порцыю дзённіка ўспамінаў. Прастой. Сумна. Не знаю, чым заняцца. «Накручваю» сюжэт новай аповесці. Аб чалавеку, кіраўніку, які ўлез у карупцыю. Аб яго падзенні. А колькі такіх! Але толькі пачаў і зноў доўга не мог заснуць. Баюся бяссонніцы.

29 сакавіка

Чацвёрты дзень привязаны да тэлевізара. Гляджу з'езд. Вялікі спектакль! Асабліва драматычны быў учарашні дзень: галасавалі за отрешение прэзідэнта ад улады. Ледзь утрымаўся Барыс: 612 — за тое, каб звaліць яго, не хапіла нейкіх 70 галасоў, бо трэба 2/3. Але 612 ад агульнай колькасці 1033 і ад 900, якія прынялі ўдзел у галасаванні. Чалавек, які мае гонар, паважае сябе, павінен быў падаць у адстаўку. Дзе там! Позна ўвечары п'яны пайшоў да тых, хто яго падтрымліваў,— да лавачнікаў, мафіёзі, п'яных падонкаў — і дзякаваў ім. Свістун. Няшчасная Расія! Набыла прэзідэнта. Пазаўчора выступаў п'яны перад дэпутатамі. У любой дэмакратычнай дзяржаве парламент патрабаваў бы медыцынскай экспертызы і па выніках яе — неадкладны імпічмент. А ў іх спектакль цягнецца. Сённяшняе пасяджэнне пачалося з таго, што выступіў дэпутат, якога ўчора пабілі тыя, перад кім выступаў Ельцын,— далі па галаве жалезным прутом.

Ідзе цягучае абмеркаванне пастановы аб захаванні канстытуцыйнага ладу. А прэзідэнт плюе на ўсе пастановы. Ён смела ідзе на рэферэндум, спадзеючыся, што апытанне будзе арганізавана па яго сцэнарыю, што да ўрнаў актыўна прыйдуць тыя, хто нажыўся на рэформах, і не прыйдуць тыя, хто збяднеў і страціў усялякую цікавасць да палітычнага спектакля. А такіх многа! Вельмі многа. Народ аглушаны, ашаломлены, усе яго думкі скіраваны на адно, як зарабіць лішнюю капейку і як купіць прадукты. А яны ўсё даражаюць. Сёння ў нас, у Беларусі, смятана, тварог падаражалі ў 4 разы.

Ельцын не сам думае, за яго думаюць цэнтры — там, за бугром і акіянам. З'езд патрабаваў тлумачэнняў ад Міністэрства ўнутраных спраў і ад мэра аб учарашніх падзеях. Лужкоў вёў сябе нахабна. Прэс-служба прэзідэнта называе з'езд камуністычным.

Ва ўсім, што адбываецца ў Маскве, я ўнюхваю пакуль што замаскаваную правакацыю — такую, як у жніўні 1991 г.— ельцынскую: яўна яго кансультуюць з Вашынгтона, Бона, Парыжа.

Аб нас. Усе слухаюць з'езд, і ніхто не слухае сесію нашага ВС. Гэта да пытання пра незалежнасць: яшчэ адно пацвярджэнне, што мы неадрыўныя ад Расіі. На нашай сесіі сур'ёзная прапанова Кебіча: аб стварэнні эканамічнага саюзу Расіі, Беларусі, Казахстана. Трэба зусім не мець розуму, каб выступаць супраць такога саюзу. Мы ж на краю катастрофы. Непастаўка нафты — зрыў сяўбы і ўборкі. Непастаўка металу — закрыццё заводаў, масавае беспрацоўе, недапастаўка газу — замярзанне, акаленне гарадоў, людзі вымушаны будуць з гарадскіх кватэр лезці ў зямлянкі. Уперад — у дэмакратычны каменны век!

Зноў у душы маёй трывога і роспач. Страх за дзяцей! І злосць на ўсіх — і на камуністаў, што аддалі ўладу без бою, і на дэмакратаў, якія бяздумна, па-дурному разбураюць усё, на чым трымалася жыццё. Гэта ж ідыятызм — так разбураць толькі па той прычыне, што гэта ствараласа, будавалася камуністамі! Нямала яны зрабілі карыснага для народа. Ад таго і шалеюць ельцыны, паповы, пазьнякі.

3 красавіка

Нарэшце выйшла «Злая зорка». Год ляжала падпісаная карэктура. Узрадаваўся, як даўно ўжо не радаваўся выхаду сваёй кнігі. Даўно новае выданне, тым больш перавыданне, стала буднічнай з'явай. А дарэмна. Гэта свята. Атрымаў у выдавецтве экземпляр «Зоркі...» і адчуў свята. Ляцеў дадому на крыллях. Прачытаў пачатак, фінал. Заплакаў ад сцэны смерці Вольгі Андрэеўны. Узбудзіўся так, што доўга не мог заснуць. І на другі дзень перачытваў асобныя раздзелы. Па-мойму, крытыкі не ацанілі раман. Крытыкі далёкія ад аварыі. А я адчуў гэтую бяду так, як адразу адчуў яе мой герой Пыльчанка. Сумна. Заказ кнігагандлю быў на 40 тысяч, выдалі 10 тысяч — няма паперы. Але, як сказала Маша, радуйся, Іван, і гэтаму. Радуюся.

Але гэта яшчэ адзін штрых у тэму аб беларусізацыі. Словы, словы... а справы — вось яны: рэзкае падзенне тыражоў.

Два дні праходзіла канферэнцыя ТБМ. Мяне нават не запрасілі — работа Гілевіча.

Мова трымалася тымі з нас, пісьменнікаў, каго чыталі, і мова цеплілася. Трымалі яе Колас, Чорны, Лынькоў, Мележ, Макаёнак, Быкаў, Шамякін... Іх чыталі. Кнігі іх не залежваліся на прылаўках магазінаў.

А зараз паліграфію захапілі прыватнікі, якія выдаюць парнаграфію. Літаратура гэтая запаланіла рынак, месца беларускім выданням не застаецца. Вось аб гэтым павінен быць клопат.

19 красавіка

І зноў аповесць, таму дзённік убаку. Распісаўся, кажуць калегі. Не так ужо і распісаўся. Аповесці па 2-4 аркушы. А раманы па 20-25. Садзіць сябе за раман баюся. Ды і харошы гэта жанр — кароткая аповесць. Дарэмна раней ігнараваў. «Зямны рай» і «Вернісаж» — у цэнтры ўвагі, пра іх гавораць больш, чым пра любы мой раман. Ёсць высокія ацэнкі. Прыемна, што гэта ацэнкі маладых — Алеся Камароўскага, Андрэя Федарэнкі... Але пісаць — не пішуць. Баяцца? Трэба ж у тым ці іншым плане разважаць, да чаго прывяла «дэмакратыя».

Учора быў Вялікдзень. Паехалі на магілу Сашы. Народу на могілках — як на Радаўніцу.

А ўвечары пайшоў па запрашэнню мітрапаліта Філарэта на велікодную вячэру ў епархію. Стол здаўся бедным. Але ўладыка растлумачыў, тут жа: «Сёння ў нас вечар будзе даўгі. Па запрашэнню нашага спонсара фірмы «Хелена Валеры» паедзем на вячэру».

Паехалі ў Палац піянераў. Выдатны палац — помнік сацыялізму. Няхай дэмакраты збудуюць хоць адзін такі! Яны нават інтэрнацыянальнага слова піянер баяцца: Палац моладзі. Уяўляю, каб пры Машэраве камусь прыйшло ў галаву наладзіць у палацы піянераў такую п'янку — што было б! А п'янка была грандыёзная! У зале, дзе дзеткі давалі канцэрты, тры даўжэзныя сталы чалавек на трыста. Праўда, былі свабодныя крэслы. Пітво: гарэлка імпартная, каньяк французскі, шампанскае італьянскае, віны таксама замежныя, закусь — велікодная. Такі прыёмчык пацягнуў мінімум на паўмільёна, калі не на ўвесь мільён. Ух!

Канцэрт. Музыка царкоўная і свецкая. Танцы зусім сучасныя. У «прэзідыуме» Станіслаў Шушкевіч, Міхаіл Мясніковіч, за сталамі — намеснікі старшыні СМ, міністры, дэпутаты, бізнесмены.

Аўкцыён карцін. Адно невялікае палатно (чыё?) пайшло за 80 тысяч. Негр нейкі, які сядзеў недалёка ад нас, купіў мазню за пяць долараў (ацэнена была ў тры тысячы рублёў).

Ісус Хрыстос выгнаў гандляроў з храма. І вось зноў гандляры налезлі ў храм. Хто ж яны, такія багатыя спонсары? Былі яна і ён. Назва фірмы раскрылася: яна — Елена, ён — Валерий. А назва польска-французская. І нічога беларускага. Але гэта пазьнякі вітаюць. Гаспадыня дала візітку: «Скрыпель Елена Альбертаўна. Прэзідэнт». Яна — прэзідэнт. Ён — у цяні. На чым разбагацелі? На спекуляцыі, канешне. Што ім дае такая вось сувязь з праваслаўнаў царквой? Без выгады не сталі б яны выкідваць такія грошы. Жабракам каля сабора, думаю, сотні не раздалі.

А ўвогуле... піў я, еў, але не пакідала адчуванне: пир во время чумы. Пад вобразам распятага Хрыста. Страшна. Усё — страшна. Жыццё страшнае. І нішто не дае радасці — ніякія святы, ніякія вячэры.

2 чэрвеня

Выехаў на дачу і не ўзяў сшытка з дзённікам. Двойчы ездзіў і забываўся.

За два месяцы сачыніў аповесць на 130 старонак. Адразу назваў «Падзенне» і не меў больш варыянтаў. Падзенне былога камуніста, сакратара райкома. Рынак уцягнуў яго ў карупцыю, дзялкі і бізнесмены падсунулі яму прастытутку, якая заражае яго, бацьку

дваіх дзяцей. Гэта прыводзіць да самазабойства жонку Юшкоўскага — героя. Аднак што запісваць змест?

Цікава другое. Пры набліжэнні да фіналу ўзнікла адчуванне, што раблю не тое. Чаму? Немагчыма вытлумачыць. Але такое з'яўлялася і раней. Над якім творам? Дакладна не памятаю. Здаецца, пры рабоце над «Снежнымі зімамі», над «Шлюбнай ноччу» І, як ні дзіўна, над «Петраградам — Брэстам». Дакладна помню, што калі пісаў «Сэрца на далоні», «Атланты...», «Злую зорку», ні разу нічога падобнага не перажываў. Магчыма, пачуццё такое ўзнікала ад лішняга закручвання сюжэта, калі расказ выходзіў за межы праўды. У «Петраградзе...» гэта адбывалася ад няўпэўненасці ў сваім веданні гісторыі, у адчуванні недахопу гістарычных фактаў; я пісаў, як цяжка збіраў матэрыял: прачытаць аўтабіяграфію Троцкага было праблемай.

У «Падзенні» я, магчыма, гвалціў свае перакананні: занадта вымазаў дзёгцем у мінулым артадаксальнага камуніста. Столькі я стварыў вобразаў сапраўдных камуністаў. Але такая логіка жыцця, праўда яго. Колькі іх, камуністаў, стала пярэваратнямі, адступнікамі. А тых, хто намерваўся працаваць сумленна, «рынак» уцягвае ў авантуры, шмат хто разважае, назіраючы, што робіцца: «Усе крадуць, а я што — дурней за іх?» Словы гэтыя гаворыць у аповесці намеснік старшыні камітэта Бязвушка. Усе крадуць. Жах! І яшчэ адно. Скончыў «Вернісаж», «Сатанінскі тур» — скакаць хацелася ад радасці. Скончыў «Падзенне» — і адчуў не радасць, а смутак. Найшла нейкая спустошанасць. З'яўлялася раней нешта, падобнае на страх: а ці з'явіцца новы сюжэт? Часам гэта боязь «спісанасці» цягнулася месяцамі. Канчалася ў адну ноч: «прыходзіў» сюжэт. Але цяпер нешта іншае. Таго, што спісаўся, не баюся. Напісаў — дзякуй богу. Страшна іншае: а каму гэта трэба ў наш час? Якія эмоцыі выкліча гісторыя развалу добрай сям'і? Усё развальваецца! Вось чаму сумна і пуста ў душы.

Чытаю «Князя тьмы». Барыс — малайчына! Не Ельцын — Алейнік. Ён зрабіў грамадзянскі подзвіг. Гэта кніга прасвяціць шмат каго, бо раскажа, адкуль усё ішло — ад «агентов влияния».

17 чэрвеня

Пазаўчора нас прыняў Кебіч. Зрабіў прэм'ер шырокі жэст. Мы — ветэраны літаратуры і мастацтва. Запрошаны былі 10 чалавек: Максім Танк, Васіль Быкаў, я, Пімен Панчанка, Міхаіл Савіцкі, Стэфанія Станюта, Аляксандра Клімава, Фёдар Шмакаў, Анатоль Багатыроў, Уладзімір Алоўнікаў. Пімен не з'явіўся.

Сабраліся ў Міністэрстве культуры. Адтуль паехалі ва ўрадавую рэзідэнцыю «Заслаўль». Там сустрэў прэм'ер з акружэннем — Дзямчук, тры міністры, работнікі Саўміна.

Пагулялі. Падкінулі свае праблемы, болі. Я — першы: аб ганарары. Я пісаў Кебічу аб гэтым. На маім пісьме была яго рэзалюцыя, паказваў М. Дзямчук. Але тут я адкрыў: не ўчытваўся прэм'ер у маё пісьмо. Я там прыводзіў факт: раней у «Полымі» мне плацілі 300 рублёў за аркуш, і месячны аклад галоўнага рэдактара быў таксама 300 рублёў. Цяпер мне плацяць 4 тысячы руб., аклад жа галоўнага — 52 тысячы рублёў. «Выгадней чытаць, а не пісаць». На гэтае маё заключэнне Кебіч засмяяўся, а, увогуле, факту здзівіўся. Паклікаў Дземчука, Бутэвіча.

«Трэба вырашыць!» «Працуем!» Колькі часу яны працуюць? Я так і сказаў: «Каб гэта паўгода не вырашалася!»

Дзямчук растлумачыў прынцып: каб не вяртацца да гэтага пытання і не пісаць новыя пастановы аб павышэнні ганарару — з ростам інфляцыі ісці ад мінімальнай зарплаты: 6-8 мінімальных зарплат за аркуш. Як за паэзію, за п'есы, пераклады? Але ў дэталі не было як унікнуць.

Кампазітары падкінулі сваю праблему: не выдаецца музыкальная літаратура, няма нотнага набору. Гэта абурыла Кебіча. Бутэвічу: «Наладзіць!»

Паскардзілася Клімава: 14 тысяч пенсіі. Народнай артыстцы СССР! Ды і Танк казаў, што ў яго 15 тысяч. Бардак! Дзіўна, але Кебіч не паабяцаў павысіць Клімавай пенсію. Пастанову яго аб пенсіях за асобыя заслугі заблакіравала апазіцыя БНФ — Зянон Пазьняк. Гэтага «бацьку нацыі» не хвалюе, што народны паэт і народная артыстка маюць па 14-15 тысяч.

Пасля прагулкі — абед у зале прыёмаў, пратакольны, з гарэлкай, шампанскім пад марожанае, каньяком пад каву.

У заключэнне — сюрпрыз: кветкі і тонкія канверты, аднак у канверце аказалася сто тысяч — купюрамі па 5000 руб. Што ж, кожны з нас зарабіў гэтую мізэрную дапамогу. І кожнаму яна дарэчы, бо кожны адчувае сябе жабраком. Маю беднасць ілюструе Машына пакупка. Ад вялікай беднасці мы у 1946 годзе ў Пракопаўцы купілі казу. І цяпер Маша купіла казу. З казы пачыналі — казой канчаем. Пасаромеўся сказаць пра гэта прэм'еру. А дарэмна. Я быў супраць пакупкі, а цяпер мудрасць Машы ацаніў: тры-чатыры літры малака — знаходка на дачы. У горад ездзіць немагчыма. Тут ляснік бярэ па 100 руб. за літр. Чым было карміць дзяцей?

Аднак яшчэ трохі аб прыёме.

Клімава ўзняла пытанне аб тым, што ў перадачах па тэлебачанні многа сексу, «парнухі». Усе ж ведаем план ЦРУ, выказаны яшчэ Далесам — як атруціць нашу моладзь. А тут, цяпер выступае Быкаў і апраўдвае «сексуальную рэвалюцыю», маўляў, любое грамадства павінна прайсці праз гэта, на Захадзе перахварэлі сексам, і мы павінны перахварэць. Адкрыў Амерыку. Нават няёмка неяк стала. Амерыканцы сапраўды даўно ўжо перахварэлі дурнотай гэтай і даўно паставілі заслон парнаграфіі. Яны вучаць моладзь сексуальным адносінам разумна, умела. І сям'я ў іх умацоўваецца, многа нараджаецца дзяцей. А ў нас падае караджальнасць, расце смяротнасць. Нядаўна пачуў па расійскай праграме, што колькасць вяселляў за два апошнія гады скарацілася ў два, а ў асобных рэгіёнах — у тры разы. Дажылі!

21 чэрвеня

Чытаю ў «Полымі» дзённікавыя запісы Янкі Брыля «Вячэрняе». Там жа мой дзённік. Яго — у раздзеле прозы, мой — «Успаміны. Дзённікі. Дакументы».

Гэта працяг яго абразкоў. Ён не ставіць дат, запісвае лаканічна, вобразна, па-брылёўску, намагаючыся з кожнага запісу зрабіць маленькую навелу. Ёсць безумоўныя ўдачы. Але я не пра гэта. У Брыля запісы апошніх год. Прэтэнзій у яго да Сталіна, камуністаў у сто разоў больш, чым у Быкава, за братоў, нявінна асуджаных. І, аднак, Янка, успамінаючы тыя злыя часы, нідзе не апускаецца да паталагічнага антыкамунізму. Янка разумее, што такое стаўленне да гісторыі, якой бы трагічнай яна ні была, прыніжае сур'ёзнага пісьменніка. Сур'ёзны аўтар не аплёўвае мінулае, а стараецца разабрацца ў ім. Шкада, што ў такіх кароткіх абразках гэта цяжка зрабіць. Напісаць бы яму раман аб трагедыі братоў сваіх і сваёй уласнай! Споведзь. Не напіша: 76 гадоў. У такім узросце ніхто з нас не напіша раман.

На адным са з'ездаў СП СССР прадавалі чарговы адрасна-тэлефонны даведнік членаў Саюза пад рэдакцыяй аргсакратара Ю. Н. Верчанкі. Побач стаяў Міхаіл Дудзін і тут жа скаламбурыў:

Был я молод, водку пил
И читал Аверченко,
А сейчас я вот купил
Однотомник Верченко.

Зайздроснае ўменне вось так выдаваць экспромты. Але мяне кранула іншае, у пэўнай меры засароміла: я не чытаў Аркадзія Аверчанка.

Прыехаў дадому, знайшоў даўняе (ці не дарэвалюцыйнае?) выданне — прачытаў. І не было мне смешна. Было сумна. Нецікава. Пасля Чэхава — гэта слаба. Здзівіўся, што ў яго была такая папулярнасць.

Кніжніца Таццяна купіла гумарыстычны раман «Шутка Мецената» і аповесць «Подходцев и двое других». Прачытаў. І тое першае ўражанне ўмацавалася: нецікава. Пустышка. Які гумар? Ніякага гумару. Сачынёныя гісторыі аб бяздзельніках на патрэбу бяздзельнікам, якім не было чаго рабіць. Можа, такіх «мецэнатаў» падобнае чціва і забаўляла. У наш час рускамоўныя жванецкія і івановы намнога цікавейшыя, ад іх крыўляння можна смяяцца, а ад «Шутки Мецената» спаць хочацца. Я чытаў на сон. І добра спаў. А Чэхаў захапляе паранейшаму; разгорнеш том — адарвацца не можаш.

Езджу ў горад — пазірую Мікалаю Рыжанкову, ён лепіць мой партрэт. Цікавы чалавек Мікалай Аляксеевіч. З ім прыемна пагаварыць — мой аднадумец. Цікава пазнаваць таямніцы зусім іншага мастацтва — пластычнага. Як з камка гліны вырысоўваецца вобраз. Учора пасля работы «раскалолі» пляшку настойкі.

З «Вячэрняга»:

«Сталінізм, саветызм катэгарычна адмаўляецца, а паміж гэтай антычалавечнасцю была ж і другая, не менш небяспечная,— фашысцкая прага авалодання светам. А тут яно — жаданне апраўдацца нейкім выключным патрыятызмам, адно падкрэсліваючы, а другое замоўчваючы. Калі ўжо праўда, дык патрэбна ўся, якой бы горкай для тых ці іншых яна ні была».

Падпісваюся пад кожным словам! Гэта развагі Грамадзяніна і Мастака!

І яшчэ з Брыля:

«Ёсць філасофія пацукоў, што бягуць з карабля, і філасофія капітанаў, якія пакідаюць яго апошнімі, а то і зусім не пакідаюць». Мудра!

1 ліпеня

Загадкава памёр Валянцін Мыслівец. Выпіваў з нейкімі людзьмі ў сябе дома. Людзей гэтых не стала. А яго знайшлі акрываўленага. Разбіта шкло шафы, і ён ім парэзаўся, руку парэзаў пад пахай. Сабутэльнікі зніклі, але выклікалі міліцыю. Чаму не «хуткую»? І міліцыя... не павезла раненага ў бальніцу, павезла ў аддзяленне. Чалавек памёр ад страты крыві. Жах! Роўна год назад загадкава ўтапіўся яго сын. У Аксакаўшчыне, дзе глыбіня стаўка на Іслачы метр, не больш.

Валянцін па-баявому выступаў супраць БНФ і ўсіх тых, хто разваліў Саюз ССР. Заставаўся камуністам. Нейкія навумчыкі падалі

на яго ў суд —за абразу. Як яны называюць камуністаў! І ніхто іх не судзіць.

З-за смерці сына я званіў міністру Ягораву.

Адказ: няшчасны выпадак.

Зноў няшчасны выпадак?

Генадзь Пашкоў у прамове на паніхідзе даволі празрыста сказаў: забойства.

2 ліпеня

Абвясцілі вынікі тайнага галасавання аб даверы Шушкевічу. З 204 дэпутатаў толькі 27 выказалі давер свайму старшыню. Для Шушкевіча жах. А мне яго шкада, па-чалавечы, хоць пазіцыю яго я не прынімаў. Але ён быў нацыянальны кадр і не дурнейшы за іншых. Але... іграў палітыка, «прэзідэнта». І гэта яго згубіла. Ігра адразу вылазіць. Пісьменнік, які іграе пісьменніка,— дрэнны пісьменнік. Праўда, Горкі іграў. Чэхаў не іграў, ён ва ўсім быў натуральны. Мудры Міхась Лынькоў не іграў, ён сумленна рабіў сваю справу.

З палітыкаў многія іграюць «бацькоў нацыі». Але таленавітыя робяць гэта таленавіта. Як Чэрчыль. А Гітлер рабіў гэта бяздарна, назойліва, крыкліва. Сталін іграў, але ігру сваю не выносіў на людзі, не пазіраваў.

11 ліпеня

8-га цэлы дзень сядзеў на Першым з'ездзе беларусаў свету. У прынцыпе, я вітаў ідэю такога з'езда. І напачатку ўсё ішло прыстойна, паважна, нават выступленне Быкава, які адкрыў з'езд, не выклікала ўнутранага пратэсту. Нармальныя, сугучныя часу даклады. Вытрыманыя выступленні прадстаўнікоў дыяспары — без злоснага аплёўвання савецкай гісторыі. Пад вечар выступіў Пазьняк. Пазьняк аплёўваў усё, не толькі мінулае, але і сучаснае — парламент, урад, «рэанімацыю», як ён сказаў, КПСС. І яму... наладзілі авацыю. Зала паднялася. Між іншым, перада мной сядзела група беларусак з Польшчы, яны не паднялiся і не пляскалі. Былі ад захаплення эмігранты з ЗША, Канады, Аўстраліі. (А з ЗША найбольшая група — 108 чалавек.)

І тады я зразумеў — сутнасць з'езда. Шабаш былых паліцэйскіх. І рэванш іх. Самі яны, у выступленнях, захоўвалі «аб'ектыўнасць». Выказвалі толькі радасць «ад адраджэння». А калі пырснуў слінай дэпутат, эмоцый сваіх не стрымалі, не маглі стрымаць; гэта ж такая радасць: пабітыя ў вайне, ганебна ўцёкшыя з зямлі сваёй, яны дачакаліся сваёй перамогі, рэваншу. Шчасце народа, што большасць з

іх старыя ўжо, нямоглыя і іх рэванш ідэалагічны, маральны. Да ўлады яны не дабяруцца, а дзеці іх англізаваныя, мовы бацькоў не ведаюць.

Больш я на з'езд не паехаў: нялёгка дабірацца з дачы на аўтобусе.

Учора слухаў па тэлевізары заключнае пасяджэнне. Кароткія вытрымкі з выступленняў нічога не дадалі. Здзівіла рашэнне арганізацыйнага пытання. Спляжылі Яўгена Лецку, які арганізаваў «Бацькаўшчыну», аддаў ёй нямала сілы. Далі адстаўку яму. Прэзідэнтам, па прапанове Быкава, выбралі Радзіма Гарэцкага, старшынёй рады Ганну Сурмач, якая была намеснікам у Лецкі.

Пакуль «Бацькаўшчына» была аб'яднаннем групкі ў ліку дзесяткаў іншых аб'яднанняў і арганізацый — няхай будзе Лецка. А калі такі з'езд, удзел урада (старшынёй аргкамітэта быў Пятро Краўчанка), сусветнае прызнанне, грошы (нейкі наш спонсар адваліў 20 мільёнаў рублёў на правядзенне з'езда) — трэба больш аўтарытэтныя: віцэ-прэзідэнт АН, пляменнік пакутнага Максіма Гарэцкага — гэта фігура! Ход абсалютна правільны, беспамылковы. Хто мог выступіць супраць Гарэцкага? Між іншым, я таксама вітаю яго выбранне. Я менш ведаю яго, лепш ведаў яго бацьку Гаўрылу Гарэцкага: мудры чалавек! Недарма і высланы, ён дасягнуў навуковай вышыні.

15 ліпеня

Вычытаў пасля машынкі «Падзенне». Страшная праўда. Незвычайная трагедыя. Таццяна выказалася супраць падобных сюжэтаў — са смерцямі. А я трымаюся філасофіі: калі ўсё жыццё — трагедыя, то натуральна, што ў лесе людзей, сем'яў трагедый стала непамерна больш. І наш абавязак — паказаць іх. Эйфарыя ад незалежнасці праходзіць, і хутка шмат хто з іх пойдзе па маіх слядах — за «Вернісажам», «Падзеннем». У тэмах я заўсёды быў першаадкрывальнікам.

...Паназіраў на сустрэчы з Кебічам за Станютай і Клімавай, пачуў стогн Аляксандры Іванаўны (Станюта — аптымістка), і захацелася мне напісаць аб лёсе старой актрысы ў наш час, праклятым богам. Паўтару Рачыцкага? Не, гэта будзе зусім іншы сюжэт, хоць з такім жа трагічным фіналам. І назва ёсць — «Адна на падмостках». Актрыса іграе сваё жыццё. Але многа яшчэ правалаў у калізіях гэтага жыцця. І формы не знаходжу. Трэба нейкі своеасаблівы сімбіёз двух жанраў — прозы і драматургі. Але мая драматургія была залішне празаічная, гэта мая слабасць. І, увогуле, сужыццё двух такіх арганізмаў — ці было дзе? Цяпер у тэатры ўсё ёсць. Ігралі кнігі Брэжнева, напісаныя журналістамі, іграюць кнігу Ельцына, Гарбачова...

Актрыса, адна, павінна сыграць тых, хто быў ёй блізкі, станоўча ці адмоўна, хто памагаў жыць ці атручваў яе жыццё,— тых, каго няма ўжо і хто будзе сядзець у зале. У гэтым незвычайнасць. І ў гэтым, здаецца, найвялікшая цяжкасць. Здолею знайсці ключ — будзе аповесць.

Учора быў на прыёме ў французскага пасла — Дзень узяцця Бастыліі. Шануюць людзі сваю гісторыюі Пасольства ў Драздах, у дзікім лесе: ледзьве знайшоў. Дача былых Кузьміна — Пячэннікава. Няўжо такой яна была тады? Ці так адрамантавалі французы? За валюту і нашы будаўнікі могуць зрабіць.

У пакоі пасол павёў аднаго Шушкевіча. Усе іншыя (чалавек 100) пілі ў армейскіх палатках, пастаўленых на лужайцы. І напіліся — пад шум дажджу.

17 ліпеня

Чытаю В. Русакова «Рассказы о потомках А. С. Пушкина». Цікавы факт. Абуральны.

Старэйшая дачка Марыя Аляксандраўна пасля трагічнай смерці мужа (застрэліўся ў 1877 г. у судзе, абвінавачаны інтрыганамі, заўсёды іх хапала!) засталася без сродкаў існавання. Звярнулася да Аляксандра II, але «небольшую пенсию ей назначили лишь много лет спустя». І толькі ў 1899 г.— да стагоддзя Пушкіна — размер пенсіі быў павялічаны да 300 рублёў у год! Ашчаслівіў малады цар дачку Пушкіна — выдаў па 80 кап. на дзень. Жыві і радуйся. А цяпер гэтага цара хочуць кананізаваць у святыя. А ці святы? Святыя дзеці яго. Дзеці заўсёды святыя! Расстрэл дзяцей дараваць свярдловым і юроўскім нельга!

18 ліпеня

І яшчэ адзін факт.

Адзінаццаць пісем А. С. Пушкіна, якія захоўвала яго малодшая дачка Н. А. Меренборг, былі куплены Савецкім урадам за адзін мільён долараў. Хто ж лепш клапаціўся пра спадчыну вялікага паэта — цар, устанавіўшы Марыі Аляксандраўне пенсію ў 300 руб. у год, ці бальшавікі, якія заплацілі за пісьмы Пушкіна мільён?

Яшчэ ў 1991 г. я пісаў пра артыкул дысідэнта А. Зіноўева ў «КП». Выдатны артыкул!

У «Правде» за 10 ліпеня г. г. апублікаваны выступленні В. Аксёнава, У. Букоўскага, Аляксандра Зіноўева, У. Максімава. Зіноўеў і Максімаў сказалі нешта такое, чаго не сказалі і прававерныя камуністы — тыя, што засталіся верныя марксізму-ленінізму.

Аляксандр Зіноўеў:

«И война Гитлера против Советского Союза была войной Запада против России. Это важно понять. Гитлер был направлен, и направлен не случайно. Сейчас можно сказать, что, когда мы рассматривали весь прошлый период как борьбу двух систем, это была ошибка. Речь шла и идет о чем-то гораздо более серьезном, а именно: о господстве на планете, о том, кто будет эксплуатировать планету в своих интересах».

І далей:

«Та катастрофа, которая здесь наступила,— результат деятельности властей, идиотизм плюс предательство. Вот что решило дело». Пра Аляксандра Якаўлева: «По-моему, одна из самых гнусных личностей в России».

«Запад есть исключительное явление в истории человечества и в мире. Лишь для очень немногих народов то, что называют демократией и капитализмом, дало положительные результаты. Для подавляющего большинства народов — ив истории человечества и сейчас — этот западный тип общества был гибелен или имел результатом превращение этих стран в придаток Запада, в колонии».

Што ўгатавана і нам —даводзіць Зіноўеў, які пражыў там, на Захадзе, каля 15 гадоў, і я з ім згаджаюся.

Сёння прачытаў у «Комсомольской правде» гутарку У. Букоўскага і У. Максімава ў рэдакцыі. Гэтыя не такія глыбокія, як Зіноўеў. Букоўскі ідэалізуе Захад: «Желание Запада «развалить» эту страну никогда не было». Глупства! Было! Яшчэ якое! Зіноўеў мае рацыю: Гітлер і ўся «халодная вайна», новы тып вайны, у якой «Запад превосходил Советский Союз в десятки раз во всех отношениях — и в экономическом, и в политическом, и в идеологическом, и в пропагандистском и т. д.» (Зіноўеў). Нашы ідыёты гэтага не разумелі!

Букоўскі, увогуле, віляе. А ў Максімава ёсць трапныя адказы. «Ведущий: как бы вы оценили роль современной российской интеллигенции?»

«Максимов: Я лично поддерживаю товарища Ленина в этом смысле. Это не мозг нации, а гавно».

«Скажите, когда, в какие времена интеллигенция, начиная от Гомера, кончая Сартром, занималась бы апологетикой буржуазии, денежного мешка, стяжательства? Или когда, в какой стране, в какие века выступала бы в поддержку платного образования или медицины? Такому бы интеллигенту в порядочном обществе никто бы руки не подал» ...это единственная социальная группа людей, у которых напрочь отсутствует здравый смысл».

22 ліпеня

Хочацца часам паехаць у горад, сустрэцца з калегамі. Але ў большасці выпадкаў нікуды не хочацца. Аднак і на дачы жыццё набывае бяссэнсавую абыякавасць і аднастайнасць, асабліва калі не пішу. Калі сачыняеш, жывеш выдуманымі калізіямі, размаўляеш з героямі, плачаш над іх лесам. Пазаўчора паглядзеў фільм па раману «Вазьму твой боль». Глядзеў і плакаў. А сам жа сачыніў! Між іншым, фільм падабаўся мне больш, чым тады, калі выпускалі яго і я глядзеў упершыню. Глядзеў я многа разоў яго: Пташук арганізоўваў сустрэчы з гледачамі і адразу па выхаду на экраны і — калі вылучылі на прэмію.

Сёння ён набыў нейкае новае гучанне, калі ўсе шышкі павылазілі са сваіх нор, нашых і замежных, і правят бал. Шкадую, што фільм не паказалі ў час работы 1-га з'езда беларусаў свету.

Часам няма чым заняцца. Чытаць цяжка, па тэлевізары — пустата. Але чытаю. Прачытаў раман Мэры Сцюарт «Полые холмы», гістарычны — пра юнацтва караля Артура. Пятае стагоддзе — ніякіх дакументаў. Адна легенда, якую аўтар змяшчае ў канцы рамана. Сачынёнасць незвычайная. А верыш, бо таленавіта. Нашы «гісторыкі» так не ўмеюць. Цікава пісаў Уладзімір Караткевіч, але ў яго толькі фон гістарычны; рэальных гістарычных персанажаў ён не ўмеў ствараць. Зараз многа пішуць пра літоўскіх князёў — не веру. Не веру ў іх клопат пра беларускі народ. Дралі яны з яго сем шкур. Ідэалізацыя ВКЛ — паганая рэч, не лепшы сродак выхавання патрыятызму, «нацыянальнай» годнасці.

Гляджу фільмы. Здзіўляюся: колькі халтуры ў амерыканскім кіно, нават дэтэктывы бяздарныя, нецікавыя. Засынаю.

Нарадзіўся новы жанр — серыялы на 100-200 серый. Амерыканскі «Санта-Барбара», учора ішла 195-я серыя. Па-мойму, гэта нядрэнна, але нават я гляджу неакуратна. Поспехам у гледача карыстаюцца мексіканскія серыялы — «Багатыя таксама плачуць», «Мачыха, ці Мая другая мама», «Проста Марыя». Многа прымітыўнага, сентыментальнага.

Здымкі танныя — у «Багатых...» ніводнай сцэны на натуры, усе — у адным павільёне; у «Мачысе...» натуры трохі ёсць. Поспех іх легка вытлумачыць: яны чалавечныя, з хрысціянскай мараллю, без сексуальнай і ўсялякай іншай брыдоты, сюжэты — на каханні, сям'і, быце, без выхадаў у сацыяльнае жыццё. Гледачу абрыдла «парнуха». Яго цягне да сентыментальнага. А сентыментальнага ва ўсіх гэтых фільмах ажно залішне. І, можа, гэта правільны шлях — адрадзіць сентыменталізм, рамантызм. Крытычны рэалізм — адкрыццё Бальзака і Талстога — прывёў у гнілое балота, смярдзючае, пасля якога цяжка

адмыцца. У тым, што называлі сацыялістычным рэалізмам, быў глыбокі сэнс. Мы славілі чалавека, будучы атэістамі, мы трымаліся хрысціянскай маралі, евангельскіх запаветаў. Памылка балышавікоў — абвяржэнне хрысціянскай філасофіі, шальмаванне двухтысячагадовай рэлігіі. Памылка? О, не! Гэта не памылка, гэта была прадуманая стратэгія замены хрысціянскай філасофіі іудзейскай, сіяністцкай. Але і 70 гадоў ім не хапіла, каб разбурыць праваслаўе, мусульманства. Справа іншая, што і адна і другая філасофія адраджаецца не лепшым чынам, не основополагающими догматами. Праваслаўная царква з незвычайным старанием і паспешлівасцю адраджае ў першую чаргу тое, супраць чаго змагаўся Леў Талстой. Царква "адраджае царкву, а не філасофію. Абраднасць робіцца модай. У храмы ходзяць, свечкі ставяць (Ельцын, Папоў), а вучэнне Хрыста прапаведуецца слаба, філасофія хрысціянства не прывіваецца, дагматы яе не робяцца нормамі жыцця. Больш таго: царква пусціла ў храм гандляроў. Царква робіцца апалагетам гандлярства, буржуазіі, залатога цяльца. І яна падразае свае карані куды глыбей, чым рабілі гэта марксісты.

Марксізм-ленінізм — вельмі сур'ёзнае вучэнне, але яму варта было застацца сацыяльнай догмай, а не ўсеабдымнай філасофіяй, на што яно замахнулася. Бяда ў тым, думаю, што творцы вучэння не былі хрысціянамі. Няхай бы яны па меры пазнання законаў прыроды і грамадства рабіліся атэістамі — не бяда, але было б лепш, каб яны з пялёнак выхоўваліся ў хрысціянскай маралі.

Я, інтэрнацыяналіст, заўсёды з павагай ставіўся да сваіх калег і сваіх суседзяў па дачы — яўрэяў, але я не мог не бачыць, што маральныя навыкі ў маіх дзяцей і ўнукаў і ў дзяцей і ўнукаў Яшы Камянецкага былі розныя, хоць яны елі адзін хлеб і гулялі ў адной і той жа пясочніцы. Яны рваліся ў Амерыку і выехалі туды. А я прапанаваў Славяне з'ездзіць з групай дзяцей у Германію: на «оздоровление», яна катэгарычна адмовілася: «Не хачу я ў тваю Германію!» Маці яе і ў маладосці нікуды не хацела ехаць, і цяпер не хоча. «Трусіха ты»,— упікаю я. Але ці толькі баязлівасць? Не. Зусім іншая псіхалогія прывязанасці да сваёй зямлі, да свайго дома.

26 ліпеня

Такога бардака ва ўладных структурах дзяржавы не было, бадай, у самых нізкаразвітых афрыканцаў на першай стадыі іх «незалежнасці». А тут вялізная Расія з усёй адпрацаванай сістэмай кіруючых органаў, сувязі, што засталося ад Саюза!..

Абмен грошай узору 1961-1992 гг. Першае паведамленне — і агульная думка: яшчэ адно аграбленне народа. А ўчора слухаю па

радыё дэпутата Філіпава, начальніка аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце, і — вушам сваім не веру. Ён пацвярджае: так, агрaбленне. Але хто зрабіў? Цэнтральны банк Расіі. А банк у падпарадкаванні Вярхоўнага Савета. І адкрытым тэкстам: гэта правакацыя Вярхоўнага Савета, Хасбулатава. А прэзідэнт нічога не знаў. І ўрад не знаў. Няўжо? Страшна робіцца. Вайна пачнецца — і прэзідэнт не будзе знаць. Жах! Што робіцца ў вялікай Расіі!

А ўвечары па тэлебачанні на нарадзе ў Вярхоўнам Савеце Хасбулатаў прабірае намесніка ўпраўляючага банкам.

Аглядальнік Кісялёў, верны ельцыніст, скланяе «рэформу», пацвярджае, што гэта сапраўды-такі агрaбленне маламаёмасных, тых, хто збіраў на халадзільнік, пераканаўча даказвае, што багачы не пагараць, у іх грошы — у валюце. Але ні слова не сказаў, што прэзідэнт і ўрад не ведалі, што робіць банк краіны. Дык ведалі ці не ведалі?

Нават пры Сталіне народу не вешалі на вушы столькі лапшы. Бардак — інакш не назавеш. А ў якім становішчы рэспублікі рублёвай зоны? Арменія, Малдавія заявілі пратэст. Бутэвіч мне казаў, што ў РБ няма рублёў, каб купіць паперу. Пасля такой «рэформы» іх зусім не стане.

Ад грошай, што падарыў Кебіч, у мяне засталося 30 тысяч— пяцітысячныя купюры. З іх дзве — 1993 г., чатыры — 1992 г. Трэба мяняць! Ламай галаву. А ў нас выхадныя — Дзень незалежнасці!—тры дні гуляем. А потым тры дні будзем мяняць грошы і — зноў выхадныя. Не жыццё — маліна! Няпоўны рабочы дзень, няпоўны тыдзень, адпачывай за свой кошт. Багацей, рэспубліка!

Пасля вайны бабы аралі на сабе. Але аралі! і праз пяць гадоў прамысловасць дасягнула ўзроўню 1940 года! Такіх тэмпаў росту не ведалі ні пасляваенныя пераможцы Англія, Францыя, Італія, ні павержаная Германія. А мы? Дзевяты год перабудовы. Што збудавалі? Што перабудавалі? Прадаём з аўкцыёна «незавершанку» і... ваенныя гарадкі. Расцём! Хтонебудзь панясе за гэта адказнасць? Але хто ўзваліць на Гарбачова, Ельцына, Краўчука, Шушкевіча віну? Хоць што такое Шушкевіч? Яго віна адна: што ад тщеславия раздутого ён узяўся не за сваю справу. Шкада мне яго. Увогуле, нядрэнны чалавек — у сваёй сферы, на сваім узроўні— прарэктара, прафесара. Паездзіў з маладой жонкай па свеце — хопіць. Займайся фізікай!

Два дні ліў дождж з моцным ветрам. Палажыў зерневыя. Азімыя і без таго не лепшыя, горш мінулагодніх, калі бязбожна сушыла. Недахоп збожжа пасадзіць нас, Беларусь, ды і не толькі нас, на такую мель, што доўга не здымемся і не ўзнімемся. Беспрасветна. Страшна робіцца. Аралі на сабе, і ў канцы 1947 года адмянілі картачкі,

накармілі горад, праўда, сяло пры гэтым галадала. Цяпер адно добра — жыве сяло! Але накормяць 25 працэнтаў сяльчан 8 мільёнаў гараджан, якія пры камуністах елі многа і смачна — больш, чым багатыя немцы і галандцы? Пяройдзем, як яны, на 100 грамаў хлеба, дзесяць грамаў масла і кубачак кавы. Каву нам завезлі: 1000 руб. за 100 грамаў. Нядорага. Ха! У іх яна каштуе не адзін долар...

...Меў запрашэнне на ўрачыстае пасяджэнне і на прыём з нагоды Дня незалежнасці. Не паехаў — ліў дождж. Ды і не вельмі радуе галодная незалежнасць. Да яе, незалежнасці, трэба масла, каўбасы, гарэлка, бензін у колькасці і па цэнах, што меліся ў дзяржаве, якая называлася Савецкі Саюз.

Па-мойму, мы яшчэ не асэнсавалі ўсю глыбіню трагедыі вялікага развалу, асэнсуем, напэўна, тады, калі будзем зусім галадаць ці заходнія «дабрадзеі» ператвораць нас у сучасных рабоў. Калі я чытаю, слухаю пра амерыканскую дэмакратыю, мяне апаноўвае злосць. Апалагеты амерыканізму, успомніце гісторыю іх дэмакратыі! Знішчэнне цэлага народа — індзейцаў. Аднаўленне рабаўласніцтва ў XVIII-XIX стагоддзях. На адсталым Усходзе яно знікла дзве тысячы гадоў назад! А зараз што робіць гэтая хвалёная «дэмакратыя»?! Не падабаецца Панама — душым Панаму, нейкія гранадцы (а іх усяго 300 тысяч) захацелі жыць не па-амерыканску — па зубах іх! Не падабаецца Садам Хусейн — наносім ракетны ўдар па Багдаду. Мы магутныя — і мы правим миром. І правяць! Прадбачу, які кулак яны апусцяць на Расію (ды і на нас), калі хтось паспрабуе вывесці рускіх, украінцаў, беларусаў з-пад амерыканскай апекі, з-пад іх «дабрачынасці». Не дазволяць — няма сумнення. Хіба пабаяцца, калі ацалее хоць частка ядзернага шчыта, створанага камуністамі. Ды, здаецца, не ацалее — ельцыны, па ўказцы бушаў, клінтанаў, знішчаць. Долары яны нам даюць толькі на адно — на раззбраенне, каб парэзалі ракеты, самалёты, танкі. І рэжам, олухі цара нябеснага. Шушкевіч прывёз з Вашынгтона 57 мільёнаў. (Між іншым, абяцалі 97.) На канверсію. На раззбраенне. Ні капейкі, ні цэнта на пшаніцу. А булачак не будзе — гэта ўжо пэўна. Радуйцеся, народы СНД! Радуйся, народ беларускі! Рэж танкі і пі ваду, вады, дзякуй богу, хапае. Ваду, можа, ад нас не вывезуць. Хоць Байкал гатовы купіць — немцы. Ёсць яшчэ што прадаць. У нас — Нарач. Ура! Жывём, браты!

27 ліпеня

Хасбулатаў робіць афіцыйную заяву, што ні ён, ні Вярхоўны Савет нічога пра абмен не ведалі. У гэты ж дзень Гярашчанка (ЦБР)

гаворыць у Чарнамырдзіна, што з Хасбулатавым у суботу раніцою ён узгадніў пра абмен купюр.

Што ўсе яны нахабныя брахуны — няма сумнення. Але хто большы? Вешаюць народу лапшу на вушы. А Ельцын у гэтай сітуацыі на кані: выдаў указ аб павышэнні сумы да 100 тысяч (было 35) і расцягнуў тэрмін абмену на ўвесь жнівень.

Як сюжэтчык не сумняваюся: сцэнарый распрацоўваўся на Валдаі. Прэзідэнт лавіў рыбку, глушыў каньяк, а падхалімы мазгавалі, як узняць яго рэйтынг і даць выспятка спікеру.

Акадэмік Раўшэнбах (разумны немец!), адказваючы ў тэлеперадачы на пытанне аб тым, што такое порядочность, разважаючы, у сваю чаргу спытаў у залы: ёсць высокая пасада. Прэтэндуюць двое — адзін порядочный, другі — нягоднік.

«Хто зойме месца?» Зала хорам: «Негодяй». Акадэмік заключав: «Чым вышэй структура, тым больш в ней негодяев». Павесяліў ён мяне. Павесяліў яшчэ адным. У Германіі яго агітавалі застацца — немец жа, лагеры нашы прайшоў. Ён адмовіўся: «Не магу».— «Чаму?» — «У вас скушно». Малайчына! Не абразліва, але ў самае яблычка.

Хлопчыку Машынай плямянніцы Машы Івановай я арганізаваў паездку ў Ірландыю на аздараўленне. Учора мама сустрэла яго ў аэрапорце Мінска. Уладзілася да Гомеля на «рафік», на якім сустракалі дзяцей. З «рафікам» адчалілі «Волгі», на іх таксама сустракалі дзяцей. Чые машыны? Пракурора Гомеля, упраўляючага банкам, галоўнага бухгалтера гэтага банка, старшыні калгаса і яшчэ нейкага туза. Так аздараўляюцца «дзеці Чарнобыля»! Думаю: пры Машэраве кожны з гэтых кіраўнікоў вельмі сур'ёзна падумаў бы, раней, чым заняць месца ў такой аздараўленчай трупе. Але сёння ж «дэмакратыя» і «прывілей наменклатурных няма». Смешна і сумна. Калі народ стане таспадаром свайго жыцця? Аніколі!

29 ліпеня

Расказваў Славік Іваноў, сынок пляменніцы, які ездзіў на аздараўленне ў Ірландыю. Некаторыя дзеці там папрашайнічалі. На вуліцы, у магазінах. Навучыліся па-англійску: «Мы з Чарнобыля». Жах! Адчуванне: унізілі, абразілі і мяне. Чые гэта дзеці? Яшчэ раней расказвалі дарослыя. У школах: хто з'ездзіў тры-чатыры разы за мяжу на аздараўленне — герой, хто не ездзіў ні разу — нішто, з ім нават не гулялі. А хто мог з'ездзіць тройчы? Сынкі! Сынкі, дочкі бізнесменаў, пракураваў, старшынь усіх рангаў. Хіба не брыдота? Вунь адкуль расслаенне. А што будзе? Няшчасны народ! Нават дабрачынную дапамогу замежнікаў накіроўваюць не на карысць дзецям тваім — на шкоду ім.

Свярбіць рука напісаць пра гэта. Але каму гэта паможа? На ўсе самыя вострыя выступленні ў СМІ — Ніякай рэакцыі, акрамя хіба выпадкаў, калі нельга не ўмяшацца пракуратуры. А на падобныя факты з галіны маралі ўсе плююць. Навокал не такое творыцца. І нават тыя змагары, што закідвалі парторганы пісьмамі аб непарадках на заводах, у калгасах, бальніцах, магазінах, школах, маўчаць. Не, пішуць. Шушкевічу. Называліся астранамічныя лічбы пісем у ВС. Але тады пісьмамі займаліся райкомы, гаркомы. Цяпер выплываюць хіба адзінкі з ліку тых, якімі павінна заняцца пракуратура ці Кантрольная палата. Між іншым, не вельмі ўсведамляю, чым займаецца гэты орган. Ведаю, што функцыі яго значна вузей, чым Камітэта народнага кантролю. Каму-каму, а чыноўнікам — бюракратам, казнакрадам — М. І. Лагір не даваў спакойна жыць. За гэта яго не любілі. А Машэраў цаніў.

...Заліло Брэстчыну і Гомельшчыну. Плаваюць. Надзвычайнае становішча. А колькі палажыла збожжавых! Велізарныя страты хлеба, якога не хапае. Балюча.

А цэны ўсё растуць. Маша (пляменніца) перадала пенсію Вольгі Філатаўны — 23 тысячы за два месяцы. Алёша (унук) паехаў у горад, забраў грошы і тут жа 10 тысяч растраціў. А што купіў? Індзюшку — дзецям суп варыць — і тры кіло мяса. І гэта — 10 тысяч! А на дачы— адзінацца едакоў. Таццяна і Алёша ўжо растрацілі свае летнія адпускныя. Трэба жыць на пенсіі: 36 тыс.— мая, 9 тыс.— Машына, 12 тыс.— Вольгі Філатаўны. А ганарар усё яшчэ 4000 за аркуш. Дзямчук абяцаў: «Праз тыдзень будзе пастанова!» Прайшло шэсць тыдняў! Што ім да нейкіх пісьменнікаў! Без нас чыноўнікам жылося б спакайней.

1 верасня

Месяц не разгортваў гэты сшытак. Пісаў «Адну на падмостках». Апантана пісаў. Учора закончыў, роўна месяц працы, пачаў 1 жніўня, скончыў — 31-га. 80 старонак — тры аркушы.

Сімбіёз прозы і драматурпі не спатрэбіўся, ды і наўрад ці можна было гэта ажыццявіць. У працэсе напісання, не, начамі, калі абдумваў хады, прыйшла нядрэнная кампазіцыя, эканомная: на трох аркушах — доўгае жыццё гераіні: галодная старая актрыса іграе эпізоды ўласнага жыцця, каб нешта зарабіць да мізэрнай пенсіі. Маю пяць аповесцей. Вопыт ці жыццё прывялі да гэтага жанру —да кароткіх аповесцей: «Зямны рай» і «Вернісаж» — па два аркушы, «Сатанінскі тур»—чатыры, «Падзенне» — пяць, «Адна на падмостках» — тры. За 16 месяцаў я напісаў 16 аркушаў. Добрая прадукцыйнасць. І ў маладыя гады гэтулькі не выдаваў. Толькі «Злую зорку» напісаў за паўтара года,

калі не лічыць, што думаў над раманам, матэрыял збіраў гады тры. Таксама праца!

Пісаць зараз тоўстыя раманы нельга — не надрукуеш. Ды і цікавей рабіць такія аповесці! «Выдыхнуў» за тры, за два месяцы — і гуляй. Вырашаю, у які часопіс даваць аповесці. Не хацелася ў «Полымя», бо трэба працягваць дзённік.

Пра дзённік. Учора гаварыў па тэлефоне з Пашкевічам. І ён: «Ёсць тэлепатыя. Мы з Юрэвічам твой дзённік толькі што абмяркоўвалі. Я дык у захапленні. Вельмі трапныя характарыстыкі палітычным дзеячам. Проста не верыцца, што гэта напісана ў 1990 годзе. Прадбачліва».

Ніводнага слова я не правіў. Ды і здаў я рукапіс год назад, столькі часу рэдакцыя цягнула.

Гераіня мая Аляксандра Астроўка, гумарыстка, прыходзіць у магазін, бярэ буханку хлеба. Касірка:

«З вас 120 руб.».

Яна здзіўлена.

«Вы хіба не чулі, што з сённяшняга дня хлеб удвая падаражэў?»

«А дзетачка! Якое ж гэта шчасце!»

З сённяшняга дня падаражала сувязь: абанентная плата за тэлефон — 500 руб. у месяц, а была 2 руб. 50 кап. Ой, як дорага! Было! Гарэлка — 1100 руб. У парках — 2500— 3000. Во даюць прастор для нажывы! Як мудра было спыніць завод на рамонт! А ці спыняўся? Ёсць пастанова СМ аб дзяржаўнай манаполіі на продаж спіртнога, акрамя імпартнага. У парках прадаецца «руская водка». Маўляў, прывезеная з Расіі. Народ лічаць за дурня? Хто яе вёз з Масквы? З мінскага завода ўзята. Колькі ён выпускаў гэтай «рускай водкі»!

13 верасня

Учора было два гады, як памёр Саша. Штодзённы боль трохі прытупіўся: жывыя, мы думаем пра жывое. Але ўчора балела моцна. Асабліва на могілках. Дзень быў змрочны, марасіў дождж. На магілах — пустэча. Хоць звычайна ў нядзелю там поўна народу. Дзе пахаваны Саша — раён даўняга пахавання, там у добрыя летнія дні народу менш, чым у раёне, дзе хаваюць у апошні час.

Крыўдна, вельмі крыўдна, што сын так мала пажыў. Цяжкае жыццё ў нашы дні, але ж ёсць і ў ім свая радасць. Жыццё— найвышэйшы дар божы, сцвярджаюць рэлігіі. І ў гэтым іх мудрасць. Такая філасофія перамагла вучэнне аб канцы свету, апакаліпсісе. Калі той канец? А я хачу жыць сёння і радавацца жыццю!

Слаба я напісаў уход з жыцця Рачыцкага, яго самагубства. Не сам уход — апошнія гадзіны жыцця яго, размову з Іванам Андрэевічам. Трагічная нота адна — просьба яго да сябра: «Пасядзі са мной». Гэта крык душы, і гэта, магчыма, «хапанне за саломінку» — праменьчык надзеі, што хтось не дасць яму здзейсніць задуманае. Не дайшло гэта да Івана.

Аляксандра Паўлаўна не думае пра самагубства, але ўключае газ і, аглушаная смерцю чалавека, якога кахала бадай жа паўстагоддзя, забывае чыркнуць запалку. Яе ратуе кот. Такі фінал «Адной на падмостках».

А жыццё робіцца ўсё цяжэйшым і цяжэйшым. І не дзіва, што ўсё больш старых канчаюць яго, як Рачыцкі.

Я абараняў урад, як робіць гэта Іван Антановіч. (Прачытаў учора яго артыкул у «Рэспубліцы». Хітруган Іван!)

Але сёння хочацца крыкнуць і Кебічу, і Шушкевічу, і ўсім: якога чорта вы там сядзіце? Не так ужо Расія перакрыла краны. А бензіну няма. Не, ёсць — у камерсантаў. І цана, якой не было і ў блакіраванай Арменіі: 1000 руб. за 1 літр. Жах!

А ёсць жа пастанова СМ, што камерцыйныя структуры могуць прадаваць прадукцыю, якую вырабляюць дзяржаўныя прадпрыемствы, толькі на 25 працэнтаў даражэй. Дык чаму ж бензін тысяча? Дурню зразумела: усе маюць ад гэтага вельмі добры навар. Мімаволі ўзнікае думка: а ці не маюць і тыя, што сядзяць у Доме ўрада?

15 верасня

Галоўны харч народа — жытнёвы хлеб падаражаў удвая: буханка 120 руб. Без аб'явы, без абурэння спажыўцоў. Учора — 60, сёння — 120! «Якое ж гэта шчасце!» — кажа мая гераіня. Вельмі баюся, што ўрэшце цярпенне народа лопне.

20 верасня

Нарэшце сонечны дзень. Ажно настрой узняўся. Так ліло. Як зараз выбраць бульбу? Ураджай добры, але ляжаць у буртах не будзе, замнога вільгаці. Гаспадары гэта разумеюць, Маша ўчора была ў горадзе і бачыла: на кожным бойкім месцы — прадаюць бульбу. Цану збілі да 60 руб. за кілаграм.

Учора схадзіў на дачу В. А. Піскарова. Увогуле, ён і жонка яго Праскоўя Іванаўна — малайцы. І дачу збудавалі дай бог, калі генерал быў яшчэ міністрам. Трымаюць курэй, парсючкоў. Пакаштаваў смачнай вяндліны. Працуюць ад цямна да цямна. Асабліва яна. Мае жанчыны, Маша і Вольга, гэтак жа працуюць. Але мы з-за маёй інерт-

насці спазніліся шмат што збудаваць, купіць. Цяпліцы не маем. А ў Піскарова — капітальная. Цяпло падведзена. Кацёл у іх на керасіне. Шкрабуць патыліцы: дзе ўзяць пяць тон керасіну? І колькі будзе каштаваць? Паўмільёна. Але, відаць, f паўмільёна для іх не праблема.

А мяне зляпіў Мікалай Рыжанкоў. Добры партрэт. Работу ён дорыць мне. Хачу, каб адліў. Але на бронзу і адліццё трэба тысяч 100-150. Дзе ўзяць? Папрасіў Алесю прадаць маю норкавую шапку. Доўга праляжала. Не насіў — баяўся, што адарвуць з галавой.

Чаркаскае інфармацыйна-рэкламнае агенцтва выпускае альманах, год назад па просьбе паслаў ім «Ахвяры». Прынялі. У маі прыслалі дагавор — па пяць тысяч за аркуш. Мізер, але і гэтаму быў рады, 30 тысяч у маі нешта каштавалі. Але дагэтуль ні кнігі, ні ганарару. «Пагарэлі», ці што,— выдаўцы? Сёння напісаў ім пісьмо. Вось так і жыву. Божа мой! Ці думаў я, што дайду да такой галечы? Пісьменнік, творча актыўны! За паўтара года напісаў пяць аповесцей. Але надрукаваў пакуль што дзве. «Сатанінскі тур» з 10 нумара перанеслі ў 11 нумар «Маладосці» — з-за юбілею Вячаслава Адамчыка. Божа, Вячаславу — 60. Старэем.

22 верасня

Пан Ельцын распусціў Вярхоўны Савет. Сцэнарый па сэнсу той жа, што ў 1933 г. у Германіі. Ды і па форме падобны. Так дзейнічаў Гітлер: падпал рэйхстага і тэрор супраць камуністаў і сацыялістаў. Так зрабіў Франко: удар па дэмакратах. Яшчэ больш нахабна дзейнічаў Піначэт, той адразу пачаў артабстрэл прэзідэнцкага палаца, забіў Альендэ. Са страхам думаю, што можа быць і ў Маскве чылійскі варыянт: пачнецца штурм «белага дома» — Дома Саветаў. У былога партыйнага лідэра Ельцына паталагічная нянавісць да Саветаў. Чаму? Пэўна, так яму дыктуюць з-за бугра. Вялікія «дэмакраты» Клінтан, Мітэран, Коль і іншыя тут падтрымалі шалёна антыдэмакратычны, антыканстытуцыйны акт Ельцына. Вось яна, іх дэмакратыя, у поўнай красе! Я за саюз з Расіяй, за што нашы «дэмакраты» мяне з'ядуць. Але я супраць цеснага (федэрацыя, канфедэрацыя) саюзу з Расіяй Ельцына — дыктатара. Амаль упэўнены, што нашы «незалежнікі», якія клялі Расію, падтрымаюць Ельцына. І на саюз з ім пойдуць. Вось тады ад незалежнасці РБ застануцца адны ўспаміны. Але такія яны, нашы змагары за незалежнасць, суверэнітэт, нейтральнасць. Што ім да народа! Наплявалі яны на народ! Яны добра ведаюць, што пры сапраўдных дэмакратах — сацыялістах — у іх будзе нямнога магчымасцей узбагаціцца, набіць кашалькі, гойсаць па свеце. А рэформы Ельцына — Гайдара адкрыюць ім неабмежаваны прастор для ўзбагачэння,

першапачатковы капітал за сваю пазіцыю яны атрымаюць у доларах ці марках.

Ах, мая няшчасная Беларусь! Былі ў цябе лідэры, але не далі ім разгарнуцца. Каб Машэраву трохі больш самастойнасці! Ды і Ціхану Кісялёву, выдатнаму прэм'еру. Не рэалізаваны іх творчыя магчымасці. Брэжнеў ненавідзеў Пятра. Ніхто дагэтуль з усезнаек нашых так і не напісаў — за што?

Я меў добрую думку пра Панамарэнку. Я, здаецца, пісаў, як ён, стаўшы міністрам культуры СССР, выклікаў мяне ў Маскву і паўтары гадзіны расказваў, як ён выратаваў Купалу, Коласа, Лынькова, Крапіву, Броўку, Глебку. І я паверыў і расказваў калегам, і версію гэтую з пэўнымі варыяцыямі пасля паўтаралі, яе падтрымаў і Барыс Сачанка. Між іншым, тое, што расказаў мне, Панамарэнка паўтарыў Макаёнку значна пазней, калі ўжо быў на пенсіі і апублікаваў кавалкі сваіх успамінаў у «Нёмане». (Між іншым, наблытаў у мемуарах столькі што многія з партызан, нават тых, хто прызнаваў яго заслуг!, абураліся.)

І раптам чытаю ў «Рэспубліцы» публікацыю Р. Платонава, былога дырэктара Інстытута гісторыі КПБ. Цяпер ён робіць у архіве, які некалі быў у яго падначаленні. І дзейнічае там з хітрасцю. Вышуквае матэрыялы, якія вельмі даспадобы «дэмакратам», але пры гэтым захоўвае поўную аб'ектыўнасць: ніякіх каментарыяў ад сябе, толькі факты і нічога, акрамя фактаў.

І вось ён, Платонаў, публікуе пісьмо Панамарэнкі Сталіну, у якім той даносіць, што нацыяналістычны цэнтр — Саюз пісьменнікаў, ідыёлагі нацыяналізму—Купала, Колас, Крапіва, Броўка... усе тыя, каго, па яго расказу, ён выратаваў ад арышту. Пытае ў Сталіна: што рабіць яму, маладому кіраўніку?

Думаю, Платонаў хітра абрывае пісьмо. Напэўна, было там і тое, што казаў Панамарэнка,— што яму Наседкін даў гэты спіс і ён паехаў да Сталіна і сказаў правадыру: калі пасадзіць усіх вядомых пісьменнікаў, то рэспубліка застанецца без літаратуры. Помню, Панамарэнка сказаў мне; «Я спросил у него: так с кем же работать, товарищ Сталин?»

Мне пра далейшае развіццё сітуацыі ён не казаў, мабыць, тады яшчэ не дасачыніў яе, а Андрэю сачыняў, як добры раманіст: Сталін тут жа паклікаў Жданава і сказаў яму: «Вот тов. Понамаренко правильно ставит вопрос: почему мы не можем наградить наших писателей?» І, замест ордэраў на арышт, Купала, Колас атрымалі ордэны Леніна, іншыя з названай групы — ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, Знак Пашаны.

Аб'ектыўны, сапраўды аб'ектыўны гісторык, прывёўшы такое пісьмо, павінен быў дакапацца, чаму ж замест ордэраў на арышт сыпанулі ордэны. Які ход мела пісьмо, ці ёсць рэзалюцыя Сталіна на ім? Гэта ж надзвычай цікава — для характарыстыкі Сталіна. Гэта разумны жэст быў: у лютым 1939 г. 132 пісьменнікі з усіх рэспублік (нашых — 9) былі ўзнагароджаны. Узнагароды забяспечылі ім бяспеку ад НКУС і ўзвялі ў ранг класікаў. Тады ўжо, безумоўна, і Панамарэнка абсыпаў іх дабротамі — выданнямі, машынамі, хоць машыны Купалу і Коласу былі выдадзены ўрадам да Панамарэнкі, дачай у Ляўках — Купалу. Колас дачы не дачакаўся. Коласу пасля вызвалення ўжо Панамарэнка даў добры па тым часе дом у двары АН.

5 кастрычніка

Адбылася трагедыя ў Маскве.

Учора Віктар Чыкін заявіў БТ, што не верыць ні аднаму слову з перадачы Расійскага ТВ. Не верыць прамой трансляцыі, як штурмавалі Дом Саветаў. Але што адбылося дагэтуль?

Я таксама не паверыў нападзенню на штаб ОВС СНГ. Не дурні Руцкой, Хасбулатаў, Макашоў, каб паслаць 8 чалавек на штурм такога аб'екта. І з якой мэтай? Мець пункт сувязі? Але колькі там маглі пратрымацца 8 чалавек? Безумоўна, то была рэпетыцыя правакацыі. Хасбулатаў і Руцкой не маглі не помніць, як рыхтавалі ўзброенае паўстанне Ленін і бальшавікі. 90 працэнтаў Петраградскага гарнізона гатова было падтрымаць бальшавікоў або захаваць нейтралітэт. Узброены былі рабочыя, створана Чырвоная гвардыя.

А на што маглі разлічваць парламентарыі? На падтрымку рэгіёнаў? Далека. А Масква была інертная. Колькі іх, абаронцаў ВС?

А сцэнарый падзей 3 кастрычніка — копія гітлераўскага путчу 1933 года: падпал рэйхстага, абвінавачванне камуністаў — і фашысцкая диктатура, дыктатура Гітлера.

Любому, хто думае, логіка Ельцына і яго натхніцеляў абсалютна зразумелая. Рос уплыў камуністаў — самая масавая партыя. За іх, за камуністаў, маглі прагаласаваць на выбарах. І гэта палохала «дэмакратаў»: не толькі гайдараў і шахраяў, але і Клінтана і Коля. Ох, з якой аператыўнасцю яны заяўлялі аб падтрымцы Ельцына!

Думаю, не без дапамогі ЦРУ быў распрацаваны план грандыёзнай правакацыі. Падбухторыць нават прыхільнікаў ВС на штурм мэрыі, тэлецэнтра — нескладаная справа. Уручыць зброю ад імя Макашова — і гуляй стыхія, грамі, хлопцы.

Дзіўна штурмавалі «Астанкіна». Ахова мізэрная — і нічога не захапілі, пашкодзілі першы паверх. Апаратныя цэлыя. Расійскае

тэлебачанне ні на хвіліну не перапыняла перадачы. Раніцою 4-га і «Астанкіна» аднавіла перадачы. Хіба не «падпал рэйхстага»?

Няўжо людзям цяжка зразумець, што Ельцына спалохала тое, што большасць («Правда» налічыла 63 суб'ектаў Федэрацыі — рэспублік і абласцей) — не падтрымалі яго. Моцна спалохала. Для гэтага яму о як патрэбны быў «фашысцкакамуністычны мяцеж»!

Кадры, калі выводзілі Руцкога, Хасбулатава, кранулі, ажно запяршыла ў горле і вочы набрынялі слязамі. Шкада іх. Ім могуць інкрымінаваць сур'ёзнае злачынства — загінулі людзі. Іх могуць асудзіць да вышэйшай меры. Але яны памруць не як злачынцы. Яны памруць, як героі, што змагаліся супраць дыктатуры і сапраўднага фашызму, у рускім варыянце. Але без іх крыві, без крыві тых, што загінулі, ельцыністы не дасягнулі б мэты. А з імі клінтаны і колі. А іх стратэгічная задача— знішчыць камунізм. Можна ўявіць, як адкрыецца «паляванне на ведзьм»: расійскія партыі камуністаў (усе!) будуць разгромлены. А за імі — і наша. Нашы «дэмакраты» — русафобы (на словах!), але разгром выбранага народам Вярхоўнага Савета падтрымаюць аднадушна, не сумняваюся. Падтрымалі Шушкевіч, Кебіч. Сумна ад гэтага. Настрой сабачы.

Нямецкі пасол запрашае сёння на прыём з нагоды дня ўз'яднання Германіі — здрады Гарбачова, здрады ўсім, хто лёг у вайне, хто жыве яшчэ — удзельнікам вайны.

Хацеў не ісці. Але хочацца сустрэцца з людзьмі, пачуць розныя думкі. Нашаму брату ўсё трэба ведаць: мы — летапісцы. Большасць — храновыя летапісцы. Учора ў «Панараме» Вольга Іпатава ўхваляла разгром Вярхоўнага Савета ў Маскве. Вось такія мы гуманісты і такія летапісцы! Толькі што паслухаў «Навіны» з «Астанкіна». Паказваюць адну і тую ж разбітую вітрыну. Можна было б ужо і забіць хоць фанерай—холадна. Не! Дзе там — трэба паказваць усяму свету: во што нарабілі камуністы!

Нейкі Лучынскі апраўдваў забарону «Правды», «Советской России», «Дня». Пачынаецца! Усё апраўдаюць пад шыльдай «дэмакратыі»!

7 кастрычніка

Чым больш пішуць аб перамозе Ельцына, чым больш кляймяць Хасбулатава і Руцкога, тым больш цвярдзее мае перакананне ў правакацыі, роўнай падпалу рэйхстага.

У «Труде» запісаны расказ работніцы Дома Саветаў. Нават у праельцынскага журналіста пры жаданні аб'ектыўнасці вынікае: ніхто ў Доме, у тым ліку і Хасбулатаў, які разам з усімі сядзеў у зале Савета нацыянальнасцей, не праяўлялі ніякіх агрэсіўных дзеянняў,

гатоў быў здацца. Гэта ж чытаецца і ў тэксце, і ў падтэксце Руслана Аушава, прэзідэнта Інгушэціі, які з Ілюмжынавым хадзіў у Дом на перагаворы. Безумоўна, абаронцы абараняліся. Калі па іх білі з гармат, яны стралялі з аўтаматаў. Натуральны акт самаабароны. Але навошта было біць з гармат? Во галоўнае. Пасля заяў прэзідэнта, што штурму не будзе. Нават калі нейкія экстрэмісты і нападалі на «Астанкіна». На гэта лёгка было справакаваць любую групу, у тым ліку і баевікоў парламента. Але пры чым тут тыя, хто заставаўся ў «белым доме»? Белы дом стаў чорным. Па чыёй віне?

З подлай заявай выступілі лідэры БНФ. Адразу патрабуюць забароны ПКБ. Вось табе і ўся дэмакратыя!

10 кастрычніка

Ліна звярнула маю ўвагу на дэталь, якую я прапусціў, але якая вельмі красамоўна пацвярджае маю ацэнку падзей у Маскве. Паведаміў «Труд», мабыць, не падумалі, як гэта прасветліць галовы тым, у каго яны ёсць.

3.X у Маскве было 25 амерыканскіх журналістаў. Раніцою ў чорны панядзелак іх стала 80! За ноч прыляцела каля 60 чалавек. З ЗША, з Англіі і з Японіі (так у «Труде»), Такая сувязь паміж Масквой, Токіо, Нью-Йоркам? Не! Арганізавалі спецрэйсы. Нічога не пашкадавалі, каб паказаць амерыканскім, сусветным абывацелям крывавае шоу ў Маскве. Сенсацыя — як паміраюць людзі! Занялі для здымак лепшыя кропкі вакол ДС. Але як кампаніі даведаліся аб штурме, які мае быць? Паведаміла ЦРУ? З іх спецыялістамі па правакацыях раіліся нашы правакатары. Ім трэба быў такі паказ! Трыумф Амерыкі! І поўнае падзенне Расіі! Бананавая рэспубліка!

Упэўнены, што ні Хасбулатаў, ні Руцкой, ні Макашоў не знялі і не здагадваліся, што па іх будуць біць з 120-мм пушак.

Таццяна купіла «День», выйшла газета падпольна і нават у нас (во дэмакратыя!) падпольна прадавалася. Мітрапаліт ленінградскі і ладажскі Іаан сцвярджае, што ў перагаворах Алексій і Сінод займалі пазіцыю Ельцына. Безумоўна, абаронцы парламента гэта адчулі. Царква верная сабе: заўсёды падтрымлівае власть предержащих.

А цяпер тэлеі прэса тлумяць людзям галовы. На аўтобуснай супынцы звычайная цётка, уборшчыца ў санаторыі — не вышэй:

— Іх расстраляць трэба!— Хасбулатава, Руцкога.

— За што, цётка?

— А што яны першыя пачалі страляць. Столькі народу паўбівалі.

Маша не вытрымала, пачала спрачацца. Мае жанчыны малайцы — разумеюць, што да чаго.

О, гісторыя. Навучыла ты чаму-небудзь? Не. Даўно вядома, што гісторыя вучыць толькі аднаму: што яна нічому не вучыць. Мудра сказана!

Перачытваю Чэхава. Не самыя вядомыя апавяданні: «Припадок», «Княгиня» — учора прачытаў. І ў захапленні, можа, большым, чым ад хрэстаматыйных. Геніяльны псіхолаг! Проста і мудра! «Княгиня»... Такой раздвоенасці характеру, пэўна, ніхто не напісаў. Колькі старонак — а які вобраз! А між тым большасць людзей — «княгіні». Хіба не такімі былі арцымені, місуны? А ілюмжынавы, што іграюць у дабрачыннасць? Не веру я ў шчырае спонсарства. Калі гэта робіцца не з матэрыяльнай выгодай, то з маральнай — для душэўнага камфорту, для славы, ад жадання паказацца лепшымі, чым яны ёсць у сапраўднасці. Ды я сам, можа, у пэўнах умовах быў «княгіняй». Аднак не напісаў жа гэтага. Хіба ў дзённіках прабіваецца, як трава праз асфальт, гэтая супярэчлівасць характару і ўчынкаў. Я бываў смелы ў творчасці, у выступлениях. Нечакана смелы. А ў жыцці я — баязлівец, чалавек з павышанай мніцельнасцю. Напішу, апублікую, а пасля перажываю. Але гэта — як допінг, як наркотык: знаюць, што шкодна, але п'юць. Так і смеласць у творчасці. Я першы сказаў больш поўна аб сённяшнім развале. Здзіўляюся, што пры адсутнасці цэнзуры калегі мае нічога смелага не пішуць— палезлі ў гісторыю. У паэзіі... Асобныя трапныя назіранні аб сённяшнім жыцці.

Пачынею думаць, што мы, пісьменнікі, журналісты, рабы ў большай ступені, чым іншыя катэгорыі інтэлігенцыі. У праекце архітэктара філасофія апасродкавана. Ды і ў мастака. Акцёр нясе чужыя думкі — Шэкспіра, Чэхава і... Матукоўскага. Інжынеру ўсё роўна, на каго працаваць... ці бухгалтеру лічыць чужыя грошы. Палітыкі... Калі лічыць прастытуцыю древнейшей прафесіяй, журналістыку — другой старажытнейшей прафесіяй, то я, бедей, еб'яднеў бы прастытуцыю і палітыку, яны непадзельныя. І яны штурхаюць не прастытуцыю няшчасных женчын, галодных, і гэтых же галодных журналістаў, пісьменнікеў. Думею: кеб раптам вярнуліся камуністы, то куды б перавярнуліся некаторыя? Ах, як хочацца паглядзець!

28 кастрычніка

Сустрэў Эдуарда Скобелева. Сказаў яму, што запісаў раней: каб... то куды перавернуцца нашы перавёртышы, на які бок, два ж бакі, трэцяга няма?

— Ёсць,— сказаў Эдуард.— Жывот. Лягуць на жывот і па-пластунску папаўзуць да новых «гаспадароў», хто б яны ні былі — паны, спадары, таварышы.

Трапна.

Ён мне сказаў: у Маскве адбылася татальная чыстка. Арыштаваны тысячы людзей, дзесяткі тысяч высланы. Высланы яго сябра — супрацоўнік «Нашего современника». Во яна, дэмакратыя! І прэса, тая самая, што называе сябе дэмакратычнай.

Хіба я не меў рацыю, калі пісаў, што ад пажараў у Маскве моцна патыхнула дымам рэйхстага?

Праўды дазнацца няма адкуль — не выходзіць «Правда». Штоніштo прасвятліла наша «Мы и время». Выходзіць. Руцкой, Макашоў клюнулі на выдатна спланаваную правакацыю. Лапухі! Але, мабыць, спадзяваліся на нейкія сілы. На каго? На армію? Наўрад. На працоўных Масквы? Дарэмна. На рэгіёны?

Неразумна спадзявацца на Новасібірск і нават на Бранск, падняўшы невялікі атрад на штурм тэлецэнтра. Гэта самагубства, адчай.

Народ безмолвствует. Але ці доўга? У Расіі адпусцілі цэны на хлеб, і буханка жытнёвага падскочыла да 220-240 руб. расійскіх, якія ў тры разы даражэй нашых «зайчыкаў».

Па-мойму, гэта бомба пад Ельцына і яго акружэнне — цэны на хлеб. Самыя развітыя краіны цэны на асноўныя прадукты трымаюць пад кантролем.

Учора глядзеў «Общественное мнение». Гайдар, Зюганаў, Баравой, Жырыноўскі, Сабчак.

Зюганаў выступіў разумней за ўсіх. Але пры ўзрыве можа ўзляцець экстрэміст Жырыноўскі. Ішло тэлеапытанне. Яно пацешыла: за Зюганава — 36 прац. Праўда, за Гайдара — 45. Дзіўна. За Жырыноўскага — 10 прац. Але самае прыемнае, што за капіталіста Натанавіча — 3 прац. Усяго. Не страцілі расіяне цвярозы розум. Няма лідэра. Чым праявіў сябе Зюганаў? 40 тамамі сур'ёзных прац па марксізму, палітэканоміі, філасофіі, практичных пытаннях класавай барацьбы, што меў Ленін да 1917 года? Зюганаў не мае нават вопыту практычнай работы, што маюць Шэварднадзе і Аліеў.

Учора пераехалі з дачы ў горад. Люблю дачу. Але ў такі час там няўтульна, нудна, цяжка — паліць. Хоць Ліна пераязджаць не хацела — ёй там вальней, чым у цеснай кватэры.

29 кастрычніка

«Мы и время» дала ўкладыш — ліcток фармату «Правды» са звычным загалоўкам. Артыкулы праўдзістаў, якія не трапілі ў газету, бо яе закрылі.

Выдатнае адкрытае пісьмо Ельцыну Наталлі Марозавай. Але асабліва мяне ўразіла публікацыя Васіля Фартышава «Неистовые требова-

ли крови». Аказваецца (я прапусціў гэта, седзячы на дачы), «Известия» 4-го — у дзень штурму — апублікавала пісьмо 42 пісьменнікаў — «Писатели требуют от правительства решительных мер». Адамовіч, Быкаў, Бакланаў, Гранін, Раждественскі, Астаф'еў. Калі гэта апублікавана раніцай 4-га, то пісалася, збіраліся подпісы не пазней як удзень 3-га, а хутчэй за ўсё раней.

Чытаеш і халадзееш. Жах! І гэта пішуць змагары за дэмакратыю! Данос калектыўны, якіх не было і ў 1937-м. Аб дэпутатах: «...эти тупые негодяи уважают только силу». Заклік: расстраляць іх! Закрыць «Правду», «Советскую Россию», «День» і нават «Литературную Россию».

Вось і ўся дэмакратыя! Далей дэмакратызавацца няма куды! Няма слоў для вызначэння сутнасці гэтых «дэмакратаў». Тых, хто не з імі, яны называюць фашыстамі. А яны? Хто яны? Гебельс пазайздросціў бы гэтым «вялікім гуманістам, змагарам за праўду і чалавечнасць». Гэтыя людзі закрэслілі сябе як пісьменнікі. І гісторыя пра тое скажа сваё важкае слова. А мне дык чартоўскі крыўдна: некаторыя ж з іх былі таленавітымі сачыніцелямі. І грымелі пры камуністах. І аблашчаны былі ўладамі — Брежневым, Суславым. Той жа Ананьеў, Гранін, Раждественскі...

Учора было пасяджэнне рады СП. «Літаратура, тэлебачанне, радыё». Быкаў прыйшоў са спазненнем. Я выступіў. У ліку іншага сказаў аб тым, што тэлебачанне не дае добрых гутарак з пісьменнікамі. «Мне хацелася б паслухаць і Лужаніна, і Максіма Танка, і Янку Брыля, і Васіля Быкава...»

Рэпліка Быкава: «Чаму не выступаюць! Выступілі Шамякін, Іван Новікаў і ўсё растлумачылі нам».

Нашы выступленні па праекце Канстытуцыі. І я, і Новікаў супраць паста прэзідэнта. І за Саветы. Што не падабалася Васілю Уладзіміравічу? Ці не цэліць ён у прэзідэнты?

Але не толькі гэтыя заслугоўваюць знявагі. Шмат хто і з тых, супраць каго яны ваююць. Урад наш.

Што вы робіце, «дабрадзеі» народа? Колькі можна гнаць цэны? Двойчы за месяц павышэнне на гарэлку — на 100 прац. І на — 50. Хоць якія 50 прац. І пры павышэнні тлумачэнне Камітэта па цэнах: павышаецца цана на гарэлку, каб не павышаць на хлеб. А ўчора: з 1 лістапада ў два разы павышаецца цана на хлеб і малочныя прадукты. Кольк! можна падманваць народ? Няўжо не разумееце, палітыкі, што лопне яго цярпенне?

На колькі там пагоршылася эканамічнае становішча ў Італіі? На колькі выраслі цэны? На 3-5 прац. І — усеагульная забастоўка. Бастуе 14 мільёнаў чалавек! І зляціць урад, памойму, 45 ці 47 пасля вайны.

Цярплівыя мы, славяне.

31 кастрычніка

Іван Чыгрынаў у бальніцы. Наведаў яго. Выглядае ён дрэнна. Мяне ўразіла, што за якія тры месяцы, якія я не бачыў яго, вельмі ж палысеў чалавек. Чаму такое хуткае аблысенне?

Іван чалавек цяжкі, складаны, але таленавіты. За талент я палюбіў яго, хоць ён пра мяне не заўсёды трымаўся роўнай думкі — трапляў пад уплывы маіх «дабрадзеяў».

А ўвогуле размова ў нас была цікавая — пра палітыку. Каб мы, людзі, былі мудрэйшыя і ўрад у нас быў разумнейшы, такіх людзей трэба было б ашчаджаць ды ашчаджаць. Але да нас нікому няма справы — ні Шушкевічу, ні Кебічу, ні нуварышам, спекулянтам. Каму трэба беларуская літаратура! Машэраву трэба была. Партыі камуністаў трэба была. БНФ не трэба. Ды і Чыкін далёкі ад нас. Не да літаратуры яму. Можа, калі-небудзь у будучым успомняць і тыя і другія. Але калі тое будзе? Не дажывём. Я не дажыву.

1 лістапада

Зайшоў у цэнтральны кніжны магазін. Аддзел рускай і замежнай літаратур, цэны — 1200, 1700, 2500, 4000 руб. Беларускі аддзел: трэці том Быкава — 300 руб. Убачыў свой «Зеніт»!

— Колькі каштуе?

— Пяць руб.

— Пяць?!!

Божа мой: дык гэта ж адна капейка. Раман за капейку! Жах! І гэтых кніг, мінулых гадоў — навалам. Усё, што каштавала 50 кап., 1 руб., 2 руб., пераацэнена да 5, акруглена. Дзіўная пераацэнка! Здзеклівая. Абразлівая для нас, аўтараў. Але найбольшы страх, што і за капейку не бяруць. Рулон туалетнай паперы — 400 руб. І — бяруць. Горка, крыўдна да слёз. Вось і ўся наша беларусізацыя! Па пяць рублёў маглі б разабраць школы, бібліятэкі, нямнога ў іх беларускіх кніг. За пяць тысяч (кіло каўбасы!) — тысяча кніг. І школы не бяруць. Як ніколі адчуў: якая гэта ліпа, фарс, паказуха — беларусізацыя, пра якую Гілевіч выдаў цэлую кнігу артыкулаў. Між іншым, кніга гэтая ў мяккай вокладцы каштуе 120 руб. Знаю, што скажуць: маўляў, такія кнігі... О не, панове! Кнігі не горшыя за тыя, што прадаюцца па 3-4 тысячы! Ляжаць Купала, Колас, Куляшоў, Танк, Мележ (мая хоць адна, іншых — па некалькі, «Зеніту» тыраж быў 55 тысяч), Брыль, Сачанка, Чыгрынаў, Караткевіч, Сіпакоў... І Быкаў!

Сказаў прадаўшчыцы:

— Пераацанілі б хоць.

— Не трэба. Так усё ж купляюць. А вось гэта,— паказала на том Быкава за 300,— зусім не ідзе.

Вось аб чым трэба гаварыць на нашых радах, пісаць. Не, маўчым. Звонім без свята і малітвы. Упустую. Самі сабе звонім — не народу. Пагана на душы. А перад тым быў добры настрой: прыязджалі ўнучкі — Маша і Славяна. Рагатухі, асабліва Маша. Славяна, малодшая, больш стрыманая. Але абедзве вялікія цыганкі. Выманілі ў дзеда калькулятар, касету, тэлефонны апарат, фотаальбом. Пры гэтым малая больш практычная: Маша — альбом, Славяна — апарат. А бабуля налажыла варэння і аладак. Шчасця вам, дзяўчаткі!

7 лістапада

76-я гадавіна Кастрычніцкай рэвалюцыі. Якое свята было! Сусветнае. Але там, за мяжой, святкавалі яго камуністы, рабочыя-сацыялісты. А ў нас — асабліва шумна тыя, хто зараз аплёўвае і Рэвалюцыю і Леніна — ельцыны, валкагонавы.

А сёння ў Маскве забаранілі нават мітынгі. У нас сабраліся на плошчы Леніна, усклалі вянкі. Прайшлі па праспекце — па тратуары, правялі мітынг у парку Горкага. Прыемна, што людзей было больш, чым у мінулым годзе, з'явілася моладзь. А мітынг мне не спадабаўся: нейкі скамечаны, кароткі, з бляклымі прамоўцамі. На такім мітынгу павінны выступаць трыбуны, добра падрыхтаваныя, каб словы іх запальвалі людзей, заклікалі і вялі. А словы былі вялыя, дзяжурныя. Чамусь не выступіў Чыкін. А ён можа прэтэндаваць на ролю лідэра.

Учора да гадзіны ночы чытаў «Мы и время» — спецвыпуск, зроблены з Праханавым, рэдкалегіяй «Дня». Цікавыя артыкулы, яны прасвятлілі, унеслі карэктывы ў мае заключэнні аб падзеях 3-4 кастрычніка. Усё больш складана, чым я ўяўляў, і правакацыя больш складаная.

Прадажнае тэлебачанне не паведамляла, што 2 кастрычніка на Смаленскай плошчы сабралася 100 тысяч абаронцаў Вярхоўнага Савета. Перад шэсцем гэтай масы дрогнулі АМОН, войскі. Гэта натхніла Руцкога, Хасбулатава. Яны спадзяваліся, што на іх акцыі выйдзе 500 тысяч. Пра гэта ў газеце няма, але кажуць, што сваю падтрымку паабяцалі камандзіры дзвюх дывізій. І дрогнулі. Ці гэта было правакацыяй? Без ЦРУ не абышлося: спецрэйсы ў ноч на 4-га для карэспандэнтаў арганізавала яно. Дэпутат, якога забралі разам з Руцкім і Хасбулатавым, піша, што Руслан Імранавіч вёў сябе спакойна, Руцкой плакаў.

Дурні прыйшлі да ўлады. Каб Ельцын і яго каманда былі разумнейшыя, то рынак, без спешкі, можна было ўвесці, нічога не руйнуючы — ні СССР, ні гісторыі нашай. Пакуль што да нуварышоў дайшло адно: нельга пляваць на подзвіг народа ў Вялікай Айчыннай.

Ускладняецца сітуацыя ў нас, у Беларусі. Расійскі рубель каштуе ўжо 6 «зайчыкаў». Гэта катастрофа: расіяне вывезуць нашы прадукты. Кіло сала на рынку даходзіць да 10 тысяч руб.

У пятніцу быў на паседжанні антыкрызіснага камітэта. Ёсць і такі. Пры арганізацыі яго ўзначальваў Кебіч. Цяпер сабраліся, каб Кебіча зняць. Я спытаў: «А старшыня ведае, што яго хочуць звольніць?» Разгубіліся. «Мы перадалі ў апарат»,— адказаў М. Статкевіч.

Дзеяч! Лічыўся старшынёй выканаўчага камітэта антыкрызіснага, па логіцы намеснік Кебіча, і не мог пагаварыць са старшынёй. І гэтыя людзі лічаць, што ўратуюць незалежнасць рэспублікі ў выпадку агрэсіі. Смех. Дзіцячая гульня. А ўвогуле — паноптыкум. Лідэры партый! А ў партыях па 300-400 чалавек, у лепшым выпадку — тысяча-дзве.

Выступалі ўсе, як пупы зямлі, отцы нации. Смешна і сумна. Заняліся б чым-небудзь больш канкрэтным.

Там жа, у Саюзе пісьменнікаў, Таццяна Кузьмінічна ашаламіла мяне жахлівым паведамленнем. Унук Кастуся Кірэенкі вярнуўся дадому з работы і ўбачыў... зарэзаную жонку і маленькую дачку. Божа мой! Дзіця, дзіця за што забілі? Такіх звяроў не расстрэльваць трэба — чацвертаваць на пляцы публічна.

Хачу і баюся пазваніць Лідзіі Пятроўне.

10 лістапада

Моцна падмарозіла. Мінулая ноч — да 12 градусаў. Удзень — 9. Відаць, будзе ніжэй. Маша і Вольга з раніцы паехалі на дачу — ратаваць яблыкі: засталіся на верандзе. Яны па-сялянску ашчаджаюць усё, што можна з'есці. Не дзіўна: цэны, нават на бульбу, трымаюцца шалёныя. Я сам раблюся ашчадным. Сёння смажыў сала — заправіць грэчневую кашу. Якія тоненькія скрылёчкі адразаў — папера!

Цэлы дзень сядзеў дома. Чытаў і думаў. Думаў і чытаў.

Учора глядзеў па тэлевізары адкрыццё сесіі. Апазіцыя ўвесь шквал агню — на Кебіча. Абаранялі ўрад нямногія і вяла. Цяжка абараняць. Але і Пазьняк нічога канструктыўнага не прапануе. Старая дэмагогія, якая набіла аскоміну. Дзе выйсце? Не бачу. І ніхто не бачыць. На мітынгу 7 лістапада прамоўцы кляймілі і ўрад і БНФ. Справядліва. Але зноў жа — ніводнай канструктыўнай прапановы.

Тупік. Ківаюць на Літву. Літву падкормлівае Захад. І ўсё роўна літоўцы едуць да нас не толькі па мяса і сала, але і па бульбу.

Куды ўсё дзяецца? Ва ўсіх — у Расіі, на Украіне, у Казахстане?.. Пры такіх падатках. Пры рэзкім скарачэнні расходаў на абарону, пры адмове дапамогі знешняй слабаразвітым... Адно тлумачэнне: ідзе гіганцкае прысваенне нацыянальнага даходу нуварышамі, мафіяй. Капіталы ўплываюць у замежныя банкі. Людзі гэтыя не думаюць аб сваім народзе. Часам думаю: чорт з імі, няхай бы бралі ўладу, выбіраліся ў парламент, можа, з'явіўся б у іх клопат аб сваім народзе, як ён ёсць у амерыканскіх, нямецкіх, шведскіх капіталістаў. Не вераць у стабільнасць. Кожны думае толькі пра свой уласны шлунак.

Апублікаваў у «ЛіМе» ўрывак з «Падзення» і даў злую, уедлівую ўрэзку. Словы гераіні з «Адной на падмостках»: «А гэта ж такое шчасце: прыходзіш у магазін і бачыш: учора буханачка хлеба каштавала 60 руб., а сёння — 120». І пра чытачоў: «Можа, чытачам, занятым сённяшнімі праблемамі і клопатамі, не да нашых твораў? Не думаю так. Капі не ім, то дзецям іх усё ж захочацца прачытаць, даведацца, як іх, грэшных, вярталі ў рай».

12 лістапада

Вячаславу Адамчыку — 60. Я не заглядваў у «святцы», таму здзівіўся. Ці даўно помню яго маладым! Я, кіраўнік СП, убачыў, што Адамчык таленавіты празаік, і ставіўся да яго з павагай. Празаік ён цікавы, глыбока нацыянальны, у яго добрая мова, сакавіты жывапіс, хоць, магчыма, стыль трохі архаічны — пад Чорнага. Раманы яго Таццяна мая і я чытаем з цікавасцю. Увогуле, мы, беларусы, дасягнулі лепшых узораў літаратуры.

14 лістапада

У пятніцу да гадзіны ночы слухаў даклады Шушкевіча, Кебіча, Багданкевіча на сесіі. У спікера залішне навуковападобны, у прэм'ера прасцей, але таксама дайсці да сэнсу нават мне было няпроста. А як жа рабочаму, калгасніку? Ім трэба просты адказ: як зрабіць жыццё лягчэйшым? І калі прыйдзе хаця б стабільнасць?

У Італіі цэны астранамічныя, але ж і зарплата: у рабочага — 20 мільёнаў, у прафесара — 70 (між іншым, разумныя прапорцыі. Пакуль у нас не будуць такія, не зрушымся).

Нічога пэўнага не сказаў ні кіраўнік ВС, ні прэм'ер. Адзіная дэталь, якая пацешыла: дэпутаты не захацелі слухаць альтэрнатыўны даклад апазіцыі. Думаю, таму, што БНФ не мае ніводнага сур'ёзнага эканаміста — дылетанты.

Гуляў у парку. Пенсіянераў устрывожыла заява Кебіча аб змяншэнні льгот. Па кім хочуць ударыць? Па жабраках. Што значыць пазбавіць удзельнікаў вайны бясплатных лекаў пры цяперашняй цане на іх? Асудзіць на смерць старых хворых людзей. Платны праезд у гарадскім транспарце, можа, і не вельмі падарве жабрацкі бюджэт пенсіянераў. І ўсё ж...

Толькі што атрымаў адказ на мае пісьмо Кебічу аб індэксацыі ўкладаў, пакладзеных да 1991 года. Расія павялічыла іх у тры разы. Кручкатворы з Мінфіна адказваюць мне, як малому. Замест таго каб напісаць: няма грошай на індэксацыю, гарым і без яе,— гародзяць: «Як сведчыць *сусветны вопыт* (курсіў мой), правядзенне індэксацыі ўкладаў шляхам карэкціроўкі сум укладаў на працэнт, адпавядаючы ўзроўню інфляцыі, не прыводзіць да паляпшэння становішча ўкладчыкаў, а выклікае новы віток інфляцыі». Во логіка! Калі мяне абрабавалі — гэта добра, а вярнуць хоць невялікую частку ўкрадзенага — гэта дрэнна. Радуйцеся, укладчыкі! Слава ўраду! Слава Мінфіну. Раней я меў на кніжцы 2500 месячных акладаў галоўнага рэдактара БелСЭ, цяпер ад іх застаўся адзін аклад, калі не менш. Дзеці здзекуюцца з мяне, што я сядзеў на гэтых грашах, як сабака на сене. Стары дурань! Але ж баяўся застацца без зберажэнняў — на пахаванне не будзе.

Маша ўсю пенсію расходуе на пакупку прадуктаў. Атрымалі разам з ёй 140 тысяч пенсіі, і ўжо мала што засталося — за тыдзень. Купіла сала, сёння паслала Алесю і Сяргея купіць 6 літраў алею — па 4 тысячы за літр.

Маша многа галадала і да вайны, і ў вайну, і ў першыя гады, калі жылі ў Пракопаўцы, і цяпер вельмі баіцца, каб не галадалі дзеці; усё купленае дзеліць на тры сям'і.

23 лістапада

Мінулы тыдзень — сустрэчы і вечары. 15.XI прымаў немцаў, вячэраў з імі. Яны прывезлі чарговую порцыю дабрачыннай дапамогі. Івану Кірычэнку немцы прыгналі машыну — купілі.

У сераду — рада: «гарыць» «Іслач». Як ратаваць? Дудараў прапанаваў двух дзеячаў — мужа і жонку, якія зрабілі прыбытковым Дом творчасці тэатральных работнікаў. Некаторыя аднесліся да іх скептычна. Ды і я таксама. Але падумаў і разважыў: без такіх дзялкоў не абысціся. І ўчора рада, на паседжанні якой я не быў, прыняла гэты варыянт уратавання Дома творчасці. Дом, магчыма, яны ўратуюць ад краху, але і сябе не пакрыўдзяць. У гэтай гісторыі цікава, як мяняецца псіхалогія нашых пісьменнікаў — змагароў за сацыяльную спра-

вядлівасць. У недалёкім мінулым мы распялі б дырэктара «Каралішчавіч» за якія 10-20 кг прысвоеных прадуктаў, цана якіх тады раўнялася сотні руб. Цяпер добра разумеем, што ў нас хапнуць не адзін мільён, але ідзём на здзелку з нуварышамі і са сваім сумленнем. Савіцкі і Асіпенка «патрэслі паветра», але і яны здаліся.

У чацвер быў вечар, прысвечаны 70-годдзю «Новай зямлі». Добры вечар. Перапоўненая зала, прамоўцы, якія мелі пачуццё часу, канцэрт стаўбцоўскай самадзейнасці, асабліва кранула выступление дзяцей. Я таксама выступаў. Паўтарыў тое, што пісаў ва ўспамінах пра Коласа.

«Новая зямля» сапраўды шэдэўр нашай класікі, гэты твор непадуладны часу, палітычным вятрам.

Даніла сказаў мне:

— Я цябе вызаву на дуэль.

— За што?

— За дзённік. Ты пішаш, што ствараўся культ Коласа. Дык я табе скажу, што ў Шамякіна быў большы культ. Колас быў толькі намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета (у каго? У непісьменнага Бельскага?), а Шамякін — Старшынёй. Колькі год?

— Усяго 14.

— Во! Усяго. Коласу не далі Героя, а табе далі. А вагон спецыяльны... дык усяго два разы ён і карыстаўся ім.

Але Даніла —добразычлівы, я люблю яго. Неўзабаве яму будзе 80, а думкі ў яго маладыя і памяць выдатная, скарга адна: «Глухну».

У пятніцу адкрывалі помнік Жэні Янішчыц — на магіле. Скульптура не лепшая, на маю думку: партрэт выразны, але рэалістычныя крылы — не знаходка. На каталіцкіх могілках — нямала анёлаў абстрактных. Рабіць анёлам зямную жанчыну, грэшную ўжо тым, што сама загубіла сябе ў росквіце таленту,— гэта залішне. Жэні мне шкада, як нікога з тых, хто адышоў заўчасна.

Ішло доўгае богаслужэнне (мабыць, свяшчэнніку не сказалі, што яна самагубца), пасля выступалі нашы «святары». А было холадна, я замёрз да пасінення і да заканчэння паніхіды паехаў з Дударавым і Някляевым.

А ўвечары Яўген Вайтовіч наладзіў сустрэчу творчых работнікаў з пасольскім корпусам. Па сутнасці, міністр даў адыходную, бо едзе паслом у Літву. Шкада, чалавек порядочный.

Учора прачытаў у Э. Лімонава простую, правільную, але нечаканую думку, я да яе не дапяў.

«И вот представитель высшей советской буржуазии (Евтушенко) предлагает отменить монополию на власть коммунистической аристо-

кратии. Для того, чтобы передать ее выборным представителям буржуазии. Себе и своим приятелям!».

І далей: «Академик (Сахаров), привилегированный, как и Евтушенко, член общества. Давно, со времен Хрущева, эти люди каждый по-своему воюют за власть. Желают отменить привилегии коммунистической аристократии и расширить привилегии своего класса: советской буржуазии знания (падкрэсліў я) — ученых, писателей, инженеров, журналистов, адвокатов, докторов, экономистов, преподавателей университетов...»

Праніклівы вывад пісьменніка! Выдатнае тлумачэнне пазіцыі тых «гуманістаў», якія заклікалі Ельцына расстраляць парламент. Яны хочуць вярнуць сабе прывілеі.

У суботу гасціў у Навуменкі: ажаніўся Павел. Дасціпныя яго дочкі — Валерыя і Таццяна — у маці, але маці, весялуха некалі, вастраслоўка — брытва!— здала: хварэе. Ды і Іван невясёлы, на вяселлі сына выпіць не мог.

А я, дурань, выпіў на прыёме, на вяселлі — і ўчора падскочыў ціск, балела галава. Хацеў ехаць у Гомель, паехала пісьменніцкая брыгада, і пабаяўся, адмовіўся. Паўлаў пашкадаваў.

Зноў павышаны цэны — на прадукты пенсіянераў: малако, кефір, тварог, смятану. Што робім?!

Учора ў паліклініцы сустрэў каля дзесятка знаёмых пенсіянераў. Змрочныя. Жартуюць, але гумар чорны. А тут яшчэ моцна марозіць — не па-лістападаўску. У кватэры мёрзнуць ногі, абуваю валёнкі.

Жыве Беларусь!

14 лістапада

Жывеш, як той селянін-бядняк, у якога мала хлеба, мала кармоў для жывёлы,— з думкай: «Як перазімаваць? Як перазімаваць?» Ведае, што вясной будзе яшчэ галадней, але вясна не палохае — зіма палохае. І я баюся зімы. Не голаду — холаду. У многіх гарадах яго ўжо адчуваюць. Як на бяду, рана захаладала: тры тыдні стаяць марозы, для лістапада немалыя — 10-16 градусаў. Усё замерзла. А снегу няма. Гінуць звяры ў лесе — ад бязводдзя: усё замерзла і снегу няма. Ласі, казулі, дзікі...

У кватэры градусаў 15, у маім кабінеце трохі цяплей. Учора пачуў у СП: Ельцын, калі ўмацуе дыктатарскія паўнамоцтвы, паставіць нас на калені. Паставіць! Не трэба яму будзе войска, даволі перакрыць газ. І я думаю пра незалежнасць, пра якую крычаць нашы нацыянал-дэмакраты. Незалежны той, хто багаты. Гэта адносіцца ў аднолькавай меры да дзяржаў і да людзей. Незалежны швед, бельгіец,

датчанін, і дзяржавы іх адносна незалежныя, хоць і малыя. А ў такіх гігантах, як Бразілія і Нігерыя, нават буржуазія — ці можа лічыць сябе незалежнай? У Бразілію ператвараюць Расію.

Я адчуваў сябе незалежным, калі быў параўнаўча багатым, калі выходзілі мае кнігі не толькі ў Мінску, калі я мог паехаць у Маскву, у Кіеў, у Ленінград, Кішынёў, як да братоў сапраўдных — да сяброў, калі там у выдавецтвах прынімалі мяне з зацікаўленасцю, гатовыя выдаваць. І выдавалі.

І чыста «тэхнічны» бок: білет да Масквы ў «СВ» і на самалёце каштаваў 14 руб., да Кіева — 11. А тут мне расказвалі: капітан пагранвойск не можа прыляцець з Курыл, дзе служыць, тры гады да бацькоў у адпачынак: яму аплочваюць, але ж ёсць жонка, дзеці, а авіябілет у адзін бок — 800 000 руб. Жах!

І да Хрыста, і асабліва з вучэннем Хрыста, людзі змагаліся за сацыяльную справядлівасць. У нас, у СССР, яна была ажыццёўлена, тэарэтычна, праўда. Але тэорыя давала права змагацца за практычную справядлівасць. Усё ўзарвалі. Геніяльны ход — стварыць клас буржуазіі. Стварыць хітра, так, каб у клас гэты лезла моладзь. Поўна іншаземных марак машын. Дзе купляюць? У Германіі. За грашы. Германія вызваляецца ад металалому і стварае ў нас клас паразітаў. Ім жа, дурням, здаецца: у СССР яны да старасці не мелі б такой машыны, а тут — во, шыкую. Аб заўтрашнім дні не думаюць — аб той сітуацыі, калі машыны гэтыя разораць іх і стануць сапраўдным металаломам.

«Справядлівасць»: малады невук, недавучка зарабляе ў 10-20 разоў больш (не маючы ніякага прызнанага даравання), чым сапраўды таленавіты літаратар, мастак, акцёр, інжынер, вучоны.

Аднак праблемы часу зацьмілі ўспаміны пра часы лепшыя і пра добрых людзей. Чамусьці знікла жаданне ўспамінаць. Дрэнна. А трэба, неабходна яшчэ што-нішто ўспомніць і некаторых людзей добрых.

27 лістапада

Чытаю Э. Лімонава і... абураюся, плююся (але чытаю). Разумны ж чалавек, таленавіты пісьменнік. Бытавыя, палітычныя назіранні вельмі трапныя, асабліва ў рамане «Иностранец в смутное время»: характарыстыкі рускім «дэмакратам» выдатныя — Еўтушэнку, Сахараву, Ю. Сямёнаву і інш. У гэтым рамане няма парнаграфіі, мала мацюкоў. Але ў «Это я — Эдичка» — жах. Мацюк на мацюку, парнаграфія самая брыдкая, сувязь з жанчынамі яшчэ можна дараваць, але з мужчынамі. Не, гэта не «красное письменство»! Якая там прыгажосць! Гэта... што? Падзенне? Самарэклама? У анатацыі паведам-

ляецца: «Роман «Это я — Эдичка», переведенный на все европейские языки, принес писателю всемирную известность». Жах! Гэта ён такі, чытач заходні?! Да якога ж маразму трэба дайсці, каб ганяцца за падобнымі раманамі! Пэўна ж, Лімонаў не адзін там, на Захадзе, такі. На чым зарабляюць грошы і славу! Цікава, як гэтыя брыдкія словы гучаць на англійскай, французскай, італьянскай? Ёсць ім эквівалент? Ці ў разумным перакладзе гэта «змазана», закамуфлявана?

На вокладцы папярэджанне: «Учитывая автором использование ненормативной лексики, издательство не рекомендует эту книгу для чтения несовершеннолетним».

Але гэта тое папярэджанне, якое створыць гэтым несовершеннолетним рэкламу. Супраць такое «ненормативной лексики» трэба цэнзура — цэнзура нораваў. Падобная свабода не на дабро людзям. Раманы выпусціла Омскае книжнае выдавецтва. «Дзяржаўнае, значыцца. Дажылі!»

Быў учора ў «Энцыклапедыі». Забраў картку прафсаюзнага ўліку — перайду ў СП, у самую, бадай, бяздзейсную прафарганізацыю. А ці ёсць яны дзейсныя? Па-мойму, пры манаполіі партыі прафсаюзы дзейнічалі больш актыўна, чым цяпер.

У СП — вечар памяці Піліпа Пестрака: 90 гадоў з дня нараджэння. Папрасілі выступіць, і я ахвотна згадзіўся. Думаю аб гэтым арыгінальным чалавеку, цікавым, супярэчлівым.

Зараз розныя пярэваратні аплёўваюць камуністаў. Што ж, ім трэба выслужыцца перад тымі, хто плаціць. Піліп быў камуніст шчыры, пераконаны. Убачыўшы на Волзе, у бежанстве, рэвалюцыю, ён застаўся верны ёй да канца. Нішто яго не пахіснула — ні галеча, ні цяжкая праца, ні адзінаццаць гадоў панскай турмы. Наадварот, у турме ён гартаваў свае перакананні. У 20-х гадах польская турма была ліберальная: у ёй давалі чытаць кнігі, у тым ліку Маркса і нават Леніна. Думаю, ніхто з нас, з тых, што скончылі універсітэт, партыйную школу, не праштудзіраваў так Маркса, як Пестрак. Слабей ведаў Лента, мала, мабыць, давалі яго кніг. Але Леніна ён чытаў увесь час, колькі я ні прыходзіў да яго на дачу (побач жылі), заўсёды на стале бачыў разгорнуты том Леніна з беражлівымі карандашнымі адмецінамі: Пестрак да кніг адносіўся з сялянскай ашчаднасцю.

Канешне, самавук, ён не ўсё асэнсоўваў з улікам часу, гістарычных падзей. Для яго, як і для многіх з нас, марксізмленінізм ператварыўся ў рэлігію. У Пестрака класавыя пазіцыі былі надзвычайныя. Але разам з тым нельга назваць яго дагматыкам. Маркс, Ленін былі для яго найвышэйшыя аўтарытэты. Але я ні разу не чуў, каб ён на высокай ноце адазваўся пра Сталіна, нават пры жыцці правадыра.

Тады ж было рытуалам пачынаць і канчаць любое публічнае выступленне «здравицей вождю». Два чалавекі ў СП яго не выконвалі — Пестрак і Макаёнак.

Але — дзіўна і парадаксальна!— калі Сталіна пачалі асвістваць пасля даклада Хрушчова, Пестрак ні разу «не свіснуў» нават у прыватных гутарках. Сярод лідэраў партыі, ніжэйшых за Сталіна, куміра для Пестрака не было. Мы, маладыя, захапляліся Панамарэнкам, Піліп адзываўся пра яго больш чым негатыўна. Мы лічылі: крыўдуе, што Панамарэнка пазбавіў яго статуса дэпутата Вярхоўнага Савета СССР, у 1940 годзе вязень польскіх турмаў быў выбраны ў вышэйшы саюзны орган.

Сваімі адносінамі да кіраўнікоў Піліп часам палохаў нас, абачлівых. Помню выпадак. Сядзелі ў рэстаране «Беларусь». Добра выпілі. Загаварылі пра Цанаву, пра кнігу яго, міністр унутраных спраў выпусціў тады два тамы «дакументаў» пад сваім прозвішчам аб партызанскім руху ў Беларусі, у якіх узвышаў Сталіна, Берыю, органы і, натуральна, сябе. (Між іншым, «писатель» гэты, што не напісаў сам ні радка, забраў з выдавецтва за свае «сачыненні», якія вымяраліся шасцю тыражамі, увесь фонд ганарару, мы пасля паўгода сядзелі на галодным пайку.)

Дык вось там, у рэстаране, Пестрак раптам на поўны голас даў усемагутнаму Цанаве, які ўсюды меў «вушы», кароткую і вычарпальную характарыстыку:

«Жулік!»

Вялюгін тут жа ўцёк з-за стала. Андрэй Макаёнак, выдатны акцёр, каб увесці ў зман «вуха», разыграў моцна п'янага, накінуўся на Пестрака: «Хто жулік? Я — жулік? Ды я не пагляджу на вашы гады!»

Помню, Піліп спачатку разгубіўся і ледзьве не палез у бутэльку. Але сцяміўшы, што да чаго, зарагатаў, як толькі ўмеў рагатаць ён, і абняў Андрэя.

Абышлося; мабыць, «вуха» ў п'яным вэрхале не сцяміла, хто жулік. А што за Пестракам у той час сачылі, то гэта было пэўна. Ён ведаў пра гэта, пасля расказваў многія факты слежкі. Між іншым, яна, слежка, у Полыпчы, у турме, і тут, пасля вайны, зрабіла яго хваравіта мніцельным. Ён падазраваў нават уласную жонку Анастасію Сцяпанаўну, з якой пазнаёміўся ў турме.

Мне Пестрак паскардзіўся: знікла колькі пісем, якія ён пісаў у ЦК КПСС, Хрушчову. Пісьмы гэтыя былі на 20-30 старонак супраць Панамарэнкі, Зімяніна і другіх. «Узяла Насця!» Навошта было Насці? Пасля яго смерці рукапісы гэтыя знайшлі. Сам схаваў. Гэта быў па-

чатак хваробы, ад якой ён пакутаваў гады тры апошнія — рассеяны склероз.

Калі Пестрака ўжо не стала і на ўвесь свет загрымела слава палымянага рэвалюцыянера Чэ Гевара, я часта думаў: «А Піліп Сямёнавіч быў нашым Чэ Гевара».

У сваім артыкуле да 70-годдзя Пестрака я пісаў: «Ёсць людзі, у якіх цікавая і ў пэўным сэнсе багатая біяграфія, але жыццяпіс іх не можа адлюстраваць пэўны перыяд ці нават пэўны момант у гісторыі народа. Біяграфія, усе галоўныя падзеі Піліпа Пестрака адбіваюць цэлую вялікую эпоху. Гэта — Паэт, які не здолеў бы апяваць сваё інтымнае індывідуалістычнае быццё, інтымныя пачуцці, бо ўсё жыццё яго было... у эпіцэнтры барацьбы».

1 снежня

Вечар памяці Пестрака адбыўся. Хромчанка, я, Юрэвіч хораша выступілі, хвалю і сябе. Але было мне сумна і горка. З'явілася ўсяго 30 чалавек. Гультайкі ўсё ж метадысткі Дома літаратара. Іван Курбека на вечар «Новай зямлі» забіў залу так, што стаялі ў праходах.

Але што асабліва абурыла: не прыйшоў сын, хоць яму званілі, з ім гаварылі. Родны сын!

Учарашні запіс пра Пестрака прынёс творчае задавальненне — выканаў мемуарную задачу. Трэба пісаць партрэты калег.

4 снежня

Сюжэты. У музеі Рэвалюцыі выяўлена, што партрэт Сталіна на меднай пласціне, падораны яму ў 1949 годзе (да 70годдзя), выпраменьвае 200 тыс. мікрарэнтген. Хто зрабіў такі партрэт? Безумоўна, асуджаныя фізікі. Спадзяваліся, наіўныя, што Сталін павесіць яго ў сябе ў кватэры. Во сучасны метад пометы!

Прыватнік булачнай застрэліў хлопчыка, які ўкраў з яго фургона дзве булкі. Факт — завязка. Развіццё сюжэта — як бандыт гэты азвярэлы адкупліваецца ад правасуддзя; барацьба двух розных работнікаў пракуратуры — сумленнага следчага і начальніка-хабарніка.

Быў на прэзентацыі кнігі Паўла Прудніка «За калючым дротам». Кнігі я не чытаў, паслухаў урыўкі ў выкананні акцёра.

Чытаю Чэрчыля «Другая сусветная вайна». Магутны сэр Уінстан! Стыль! Мысль! Праўдзівасць! Але і ён не без чалавечай слабасці: пра сябе — вышэй, чым пра ўсіх іншых. Сябе піша мудрацом, які ўсё прадбачыў.

Віцэ-прэм'ер і міністр фінансаў Расіі заявіў у «КП»: рублёвая зона стане рэальнасцю тады, калі Беларусь будзе заходняй вобласцю Расіі. Правакатар, сукін сын! Міна пад Кебіча.

У газеце А. Праханава «Заўтра» (замест «Дня») у артыкуле аб ролі арміі ў Расіі і СНД амерыканскі генерал У. Е. Одэм піша: «В Беларуси они (военные) плетут заговор против правительства, чтобы удержать на своих производствах выпуск военной продукции».

А па-мойму, наш урад не фарсіруе канверсію. Урэшце, наш ратунак у гандлі зброяй.

У гэтай жа газеце аглядальнік «Вашынгтон пост» Коэн: «История не окончилась, она просто перешла в хаотичное состояние, и мы охвачены гражданской депрессией. Когда Советский Союз развалился, мы, американцы, потеряли больше чем врага. Мы потеряли соратника в поисках смысла».

7 снежня

Фірма, якая па тэлефоне назвалася «Аракулам», а ў дагаворы «Харугва»... Але справа не ў гэтым. Занёс учора ім «Трывожнае шчасце» для расклейкі, падпісаў дагавор. Аванс не даюць. Лукша мяне папярэджваў, што многія з гэтых выдавецтваў уключаюць у план беларускія кнігі, каб пад іх выбіваць паліграфічныя ліміты, а пасля выдаваць — што выгадна. Паглядзім.

Але самае цікавае: увайшоў дырэктар, пазнаёміліся. «А-а, я чытаў вас, «На ростанях». Я сумеўся, і рэдактарка пачырванела. Вось такія людзі нас выдаюць. Такія хочуць быць гаспадарамі! Тут жа пачаў званіць ажно ў Бярдзянск — аб пастаўках трактароў. Потым званіў сваім. У паўзах — захоплена расказваў аб сваёй нядаўняй паездцы ў Аўстралію — жыццём іх захапляўся. Сказаў: «Пока у нас не будет частной собственности, мы будем бедными». Спрачацца з такім чалавекам не было жадання. А мае ж, безумоўна, вышэйшую адукацыю, вучыў палітэканомію. Як вучыў? Чаму навучыўся?

9 снежня

Слухаў сесію. Абурыўся. Якой часам глумотай займаюцца тры сотні сур'ёзных людзей. Можа, гадзіну талдычылі, спрачаліся: браць ці не браць падатак з магазінаў «б'юціфры» — гэта магазіны ў міжнародных залах аэрапартоў, на прапускных пунктах, за лініяй мытні. А магазінаў гэтых у нас ажно... чатыры. Прыбытак іх за гэты год — 700 тысяч —у рублях, у «зайцах», не ў валюце. Месячныя аклады двух дэпутатаў! А іх, дэпутатаў, 350, ды столькі ж, калі не больш, штату ВС. (А было ж некалі ў Прэзідыуме ВС — 65 чалавек. Расцём і

багацеем!) І такой вось праблемай займаюцца дэпутаты. Няма больш праблем? Усё трашчыць, усё развальваецца. Стаім над бездаННю. А «вялікія дэмакраты» патрабуюць закрыць «Мы и время» і «Позицию» за тое, што кажуць праўду пра жыццё народа.

На вечар Арсеньевай не пайшоў, хоць перад гэтым быў у СП. А Пятро Краўчанка, кажуць, з самалёта з'явіўся на вечар. Віват міністру!

Перад вечарам сустрэў Брыля. Ён крытычна адзываецца аб Арсеньевай, але не пайсці на вечар не мог. Абураўся Янка. Ездзіў у Брэст наведаць цяжкахворага У. Калесніка. Высокаморальны сяброўскі ўчынак! Расказвае пра Уладзіміра Андрэевіча: памірае, але ўсё чытае і... раздражняецца ад таго, што пішуць; вельмі абурыў яго артыкул нейкага паліцэйскага ў «ЛіМе», які піша, што бандытамі былі партызаны, а яны, паліцаі, змагаліся з бальшавікамі. Калеснік сумленна партызаніў. Брыль абураўся: «Што там думае Гіль!»

13 снежня

Колькі дзён зацята рэкламавалі шоу «Сустрэча новага палітычнага года». Хацелі на ўвесь свет адсвяткаваць перамогу Ельцына-Гайдара. І пляснуліся ў лужу. Вядучая з помпай абвясціла, што на вялікіх экранах у зале прыёмаў праз кожныя тры мінуты будуць паказвацца вынікі галасавання па акругах, рэгіёнах. (Колькі каштавала ўстаноўка экранаў, камп'ютэраў, тэлеграфных апаратаў? А шампанскае?!) Шампанскае палілося ракой. Пілі шчыра..Разы два выскачылі лічбы па Далёкаму Усходу. Першы, «Выбар»,— 17 прац., другая, ЛДПР,—14 прац., трэцяя, КПРФ,— 13 прац. І на гэтым паказ спыніўся, Няшчасная вядучая не знала, што рабіць. Дзіўна, што не было нават акцёраў добрых. Не прыйшлі? Нейкі безгалосы спявак выступаў тройчы. Вылезла Шукшына, віншавала... Каго, з чым? Шукшын у труне перавярнуўся.

Не з'явілася інфармацыя ні праз пяць мінут, ні праз паўгадзіны. Чым заняць тэлегледачоў? Пачалі выступаць. Ціснулі на Канстытуцыю: яна прынята, балбаталі «дэмакраты». Там, безумоўна, вынікі ведалі. Жырыноўскі хадзіў пераможцам. Расчараванне выказаў Каракін. Сказаў, што наступае фашызм, і кінуў: «Ты сдурела, Россия». Свіння! Так сказаць аб народзе! Не, Расія не здурэла! Расія выказала пратэст супраць Ельцына—Гайдара і супраць каракіных.

Але хто такі Жырыноўскі? У суботу паказвалі фільм пра яго— дзеля таго, каб развянчаць Вульфавіча. Агент КДБ. За што сядзеў у Турцыі ў турме? Пазёр і г. д. А я сказаў: «Не развянчанне, а найлепшая рэклама».

Маша толькі што спытала: «А ці не рыхтуюць яго (Жырыноўскага) замест Ельцына?» Я спачатку адмовіў амаль катэгарычна. А цяпер думаю: а чаму не? Калі ў Барыса пухліна, а ЦРУ пра гэта добра ведае з дакладнейшым дыягназам, то чаму не Вульфавіч? Пажывём — пабачым. Сёння ён сказаў, што на выбарчую кампанію ён патраціў мільярд. Адкуль такія грошы?

15 снежня

Аляксандр Лукашэнка зрабіў грунтоўны даклад аб карупцыі. Кроў стыне. Такое ўражанне, што немагчыма знайсці дзяржаўнага чыноўніка, які быў бы не замазаны хабарам, удзелам у камерцыі, спекуляцыі. Горш, чым у афрыканскіх ці бананавых рэспубліках. Але калі выступае падгалосак БНФ і бачыць прычыну гэтай ганебнай з'явы ў тым, што буксуюць рэформы — пераход да капіталізму, то гэта глупства гучыць дэмагогіяй. Дзе логіка? А як інакш можа стварыцца клас капіталістаў? У нас. Толькі разбоем — разграбленнем таго дабра, якое стварыў народ пры сацыялістычным ладзе. Першапачатковае накапленне капіталу ўсюды ішло разбойна — вайной, набыццём калоній, экспрапрыяцыяй феадалаў. «Цывілізаваная» Амерыка. Еўрапейскія авантурысты, якія перабраліся туды, у Новы свет, усе былі рабаўнікі. Знішчалі бязлітасна індзейцаў, каб захапіць іх землі, рэзалі, стралялі адзін аднаго. А пасля, як жывёлу, лавілі ў Афрыцы неграў і арганізавалі грандыёзны рынак рабоў, якога не ведала ніводная старажытная імперыя. І гэта — у XIX стагоддзі, пасля Вялікай французскай рэвалюцыі, якая абвясціла свабоду, роўнасць, брацтва.

Адны багацелі на гандлі рабамі, другія — на бесчалавечнай эксплуатацыі іх. Кландайк, дзе таксама стралялі адзін аднаго, бадай, быў найбольш гуманным спосабам узбагачэння: там самі шукалі, самі працавалі.

У Еўропе шлях накаплення быў даўжэйшы і больш гуманны: капіталістамі рабіліся ўласнікі зямлі — бароны, графы, князі, якія стагоддзямі смакталі кроў сялян. Рускія капіталісты на 50-70 працэнтаў разбойнікі. Меншая частка, самых працавітых, сумленных, рэлігійных, стваралі капітал сваёй працай, але нярэдка жорсткай эксплуатацыяй сваёй сям'і, што хораша паказаў Горкі.

І гэты клас прадажныя пісакі паэтызуюць? Ганьба!

Чым больш будзе пашырацца працэс капіталізацыі, тым больш будзе з'яўляцца зладзеяў. Місуна, Арцыменя — гэта кветкі, вучні разбою, дзеці. З'явяцца ваўкі, ільвы. Працэс можа спыніць толькі новая форма сацыялізму — форма ўсенароднай уласнасці. Але няма тэарэтыкаў гэтай новай формы. А пакуль што разграбление будзе

працягвацца і нарастаць. Ні парламенты, ні МУС, ні КДБ, ні пракуратура яе не спыняць. Жырыноўскі абяцае спыніць. Веру—спыніць, калі стане дыктатарам. Рыхтуе яго не ЦРУ — Германія. У яго ярка выражаныя пранямецкія тэндэнцыі і планы.

Учора выступаў у вайсковай часці. Інертныя хлопцы-салдаты: ніякіх пытанняў. Афіцэры скардзяцца на сваё жыццё: аклады іх у два-тры разы меншыя, чым у Расіі. Пераезд афіцэраў-беларусаў у сваю рэспубліку спыніўся, а рускія стараюцца выехаць ад нас. Папаўзём мы ў абдымкі Расіі. Але каб хоць цывілізавана — у канфедэрацыю, без страты дзяржаўнасці, мовы.

Званіў Генрых Далідовіч: дагэтуль не выйшаў 11 нумар «Маладосці» — няма паперы. А там — «Сатанінскі тур». Хочацца, каб аповесць дайшла да чытача. Генрых сказаў, што ўразаюць датацыю на часопісы, газеты — беларускамоўныя. Загіне літаратура. А добрая ж літаратура вырасла! Не горшая за французскую і нямецкую.

20 снежня

У суботу сядзеў гадзіны паўтары на з'ездзе сялянскай партыі, запрасіў яе старшыня Я. М. Лугін. Уражанне сумнае. Сяляне? Памойму, больш тых, хто арэ на асфальце, а жне ў кабінетах ці ў камерцыі. Выступленні — паўтор 3-гадовай даўнасці. Нават Чарнічэнка шмат ад чаго адмовіўся. У праекце пастановы: вярнуць маёмасць прымусова калектывізаваным сялянам, кампенсаваць па сучасных цэнах. Чым думаюць людзі? Прыняць такое — загнаць дзяржаву ў трубу. Які бюджэт вытрымае! А потым як гэта распаліць страсці. Сялян тых даўно няма, асноўныя фонды яны выпрацавалі даўным-даўно — коней, калёсы, гумны. Прэтэндаваць сталі б іх дзеці, якія бясплатна атрымалі добрую адукацыю, бясплатна лячыліся. І цяпер многія з іх, заражаныя бацыламі прыватніцтва, пачалі б прэтэндаваць: аддайце бацькава! А дакументаў ніякіх. Хто такія дакументы хаваў? Ды і вайна знішчыла. І рвалі б глоткі адзін аднаму. Расцягвалі агульнанародную маёмасць. А расцягваюць і без гэтага. І расцягнуць. Вось такі з'езд сялян! Старшынь знаёмых — ніводнага; яны арганізавалі сваю партыю — аграрна-дэмакратычную. Хо-хо!

Пасля паехалі ў «Ісламч» на семінар маладых. Трапілі ў лядоўню: дом, у які я ўклаў столькі сіл, чатыры дні не апальваецца — няма мазуты, у будынку 4-5 градусаў. Добра, што плюсавая тэмпература на дварэ, размарозілі б, гады, усю сістэму. Сказаў маладым: «Мы жылі пры сацыялізме, вы будзеце жыць у раю капіталістычным. Але мы дня аднаго не мерзлі так ні ў Дамах творчасці, ні ў кватэрах».

«Радуйцеся, в'юнашы!» — сказаў бы Лынькоў.

Пагаварылі. Пасля выпілі ў лядоўні.

Учора, у нядзелю, цэлы дзень правёў у Данілы, сына Якуба Коласа, у музеі, у хаце.

Ала, жонка яго, арганізавала здымкі фільма — аб Коласе, музеі, але галоўнае — аб сям'і сваёй: яна, дачка, унучка, сястра яе, муж сястры, дачка іх. Ідэя яе, ініцыятыва яе мне падабаліся. Мы з Мушынскім хораша гаварылі пра Коласа. Але апошні акорд выклікаў супярэчлівае пачуццё. Ала пасадзіла Данілу ў рабочае крэсла, і ён сказаў у камеру: «Стужка гэтая знята ў адным экземпляры і належыць жонцы маёй Але Цімафееўне Міцкевіч і дачцэ маёй Веры Данілаўне».

23 снежня

Як п'юць пісьменнікі? У дзённіку я пісаў, як у маладосці мы вадзілі «казу». Якое мора разліўное было ў 1948-1950 гг. і пазней. І любая закусь. Пасля мы рабіліся снобамі. У Маскве, Кіеве — лепшыя рэстараны, марачныя каньякі. І на сваіх дачах — нават у Андрэя, халасцяка,— поўная сервіроўка стала і тыя ж марачныя каньякі.

Пазаўчора прымалі ў СП. Прынялі адразу 10 чалавек, трэцяга Адамчыка: бацька і два сыны члены СП. Вітаю. Хлопцы здольныя. Але ўспомніў, як прынялі Таццяну. І тут жа сачынілі фельетон у «Вожык» (аўтар ананімны, але вядомы): маўляў, бацька і дачка, хутка пойдуць унукі. Прынялі ўнука Клімковіча. Дай бог каб пісалі і мае ўнучкі, я ганарыўся б. Маша і Славяна ўжо сачыняюць, і Таццяна кажа, што ў малой гэта атрымоўваецца лепш, чым у студэнткі Машы,— стыль лепшы.

Па даўняй традыцыі прыём адзначаюць: маладыя запрашаюць старых. Я ў гэтым нічога кепскага не бачу: творцы яднаюцца. Але калі быў першым сакратаром, удзельнічаў не часта, ухіляўся. Вячэралі ў рэстаранах, пасля —у кафэ Дома літаратара. А цяпер? Хто можа запрасіць у рэстаран?

Сабраліся ў кабінеце У. Паўлава. Кожны з маладых унёс сваю долю — гарэлку і закусь, пераважна сала, нехта здагадаўся прынесці капусты і цыбулі. Без талерак, без відэльцаў. Тры шклянкі — на 20 чалавек. Вось так балююць пісьменнікі, ашчасліўленыя капіталізмам. Баюся, што заўтра будзе горш.

Рэдактары б'юць трывогу: здымаюць датацыі. Ураду наплываць на нас. Падумаеш, нейкія беларускія пісакі! Валянціну Распуціну ў Маскве адключылі святло і збіраюцца выселіць з кватэры, якую выдаў яму, сібіраку, СП СССР. Якая подласць! Ці вядзе хто ўлік злачынстваў супраць народа, супраць культуры?

Нашы ўладары таксама ўсё развалілі. Разваляць калгасы — вось самае страшнае. І тады будзе голад. Ён грядет, кажучы па-руску. Ельцын-дыктатар, але я гатовы прасіць яго: вазьмі Беларусь у рублёвую зону. Здаецца, была б хоць маленькая гарантыя. Расія ёсць Расія!

29 снежня

Як усе мы збяднелі! Арсен Ваніцкі зрабіў жэст: запрасіў у Таварыства дружбы трупу ветэранаў, пачаставаў віном, кавай. Мы сказалі добрыя словы. Выдаў падарункі — набор нямецкіх прадуктаў: брус шмальца, бутэлька алею, макароны, цукар, бекон... І ўсе былі гэтаму рады.

Учора прымалі Гундольфа Брэгера. Абедалі ў Мурашкі, у санаторыі. Была харошая размова, спрэчка: ён — супраць будаўніцтва атамных станцый, я лічу, што пакуль не адкрыты танныя, дзейсныя крыніцы альтэрнатыўнай энергіі, без атамных станцый не абысціся. Размова інтэлігентных людзей. КІрычэнка катэгарычна супраць атамных.

1 студзеня 1994 года

Вось і Новы год. М. А. Барысевіч, віншуючы мяне, сказаў: «Ці думалі мы ў вайну, што дажывём да 1994 года?»

Па-мойму, шчасце ў тым, што ніхто не думае, да якога года дажывём. Людзі проста жывуць. І хочуць жыць! Але так часта жыццё ім скарачаюць гвалтоўна.

Якім ён быў, год, што кануў у нябыт? Для народа вельмі цяжкі. Для мяне? Можа, нават трохі лепшы, чым папярэдні. Абышлося без сур'ёзных хвароб, як у мінулым. Без бяды, калі не лічыць збяднення. Але і агрэбленне крыху кампенсаваў. Атрымаў ганарар за «Сатанінскі тур». Далі аванс за «Злую зорку». Расшчадрыўся Барыс Сачанка — адваліў былому галоўнаму 150 тысяч. Мільянер! Але які гэта мізэр у параўнанні з тым, што я меў за адзін раман — 5-10 тысяч. О, як многа яны каштавалі, калі бензін быў — 20 капеек, хлеб — 16, каньяк — 8 рублёў, каўбаса найлепшая — 5-6 рублёў. Настальгія па цэнах! Настальгія па мінулым!

Фінансавыя ін'екцыі забяспечылі даволі багаты навагодні стол. Сустракалі Новы год учацвярох — Маша, я, Алеся, Сяргей. Сёння на абед прыехалі дзеці: Таццяна з дзяўчатамі — Машай і Славянай, Алёша з Наташай і маленькай Волечкай. І зноў такі ж стол. Толькі не было шампанскага. Думаю, што такі абед ні немцы, ні галандцы — скупярдзяі — не мелі. Ды і амерыканцы — не ўсе. Праўда, набор у іх мог быць большы — асартымент, асабліва па частцы фруктаў. Але

лімончык і ў нас быў. Хораша ішоў пад каньячок. Дай бог, каб не былі галодныя і ў годзе, што наступіў.

11 студзеня

Праляцела 10 дзён новага года. Бязлікія дні. Ніводнай падзеі, якая запомнілася б. Хіба калядная вячэра ў Філарэта. Там хоць сустракаеш людзей, якіх не бачыш месяцамі. Але размовы там — застольныя і... з аглядкай. Э. І. Шыркоўскі на падпітку пытаецца ў мяне: «Ведаеце, як генерала пасадзілі на гаўптвахту?» Пасля мне растлумачыў Кірычэнка. Старшыня КДБ паехаў у адпачынак. Шушкевіч хварэў. Яго намеснік Вячаслаў Кузняцоў (здаваўся мне статыстам) склікаў прэзідыум і пачаў разносіць Шыркоўскага: выехаў без дазволу. А пасля знайшлі яго заяву з рэзалюцыяй Шушкевіча. Селі ў лужу. Але прабачэння ў Эдуарда ніхто не папрасіў. Дзіўныя гульні! Усе пнуцца ў Напалеоны. Тэма — для сатырыка ўзроўню Макаёнка. Шкадую, што я не валодаю такім талентам. Гульні не дзіўныя — небяспечныя. Ад дурных амбіцый пакутуе народ.

Кебіч ездзіў да Чарнамырдзіна, дамовіўся аб рублёвай зоне. А ўчора перадае беларускае тэлебачанне: 12-га едзе ў Маскву Шушкевіч — высвятляць аспекты і нюансы дамоўленасці. Брэд! Хіба так можна кіраваць дзяржавай?

Чытаю Чэрчыля. Ва ўмовах вайны была поўная дамоўленасць не толькі паміж членамі англійскага ўрада, камандавання — ніякіх амбіцый! — але і паміж Чэрчылем і Рузвельтам, амерыканцамі і англічанамі. І нават Сталін лічыўся з імі, хоць па пытанню Другога фронту выказваўся рэзка, без дыпламатыі.

Чэрчыль адзін раздзел чацвёртага тома называе: «Русское «спасибо», але і пра «спасибо» гэтае піша карэктна.

Прыгадаў Чэрчыля — і яшчэ адно ўражанне ад «Другой сусветнай вайны»: аўтар — выдатны гісторык, але, як філосаф, не вызначаецца. Аўтар раманаў, сэр Уінстан мог бы даць больш псіхалогіі і філасофіі ў паводзінах людзей на вайне. Але ўсё роўна кнігі чытаюцца, як раманы. Малайчына стары!

Тры месяцы не пішу. Свярбяць рукі. Складваецца сюжэт: забойства галоднага хлопчыка камерсантам. Забойства — завязка. Гісторыя — як забойца спрабуе купіць пракуратуру, каб закрылі справу, і аднаго купляе, але другі дакапваецца да ісціны. Да буржуазіі, якая вылупліваецца з яек сацыялізму (яйкі нібыта курыныя, а вылупліваюцца кракадзільчыкі), адносіны ў мяне да заблытанасці складаныя. Сацыяліст і гуманіст, я буду іх выкрываць. Але ў эканамічным плане я гатовы прызнаць іх, каб яны пачалі ствараць, а не нажываць капітал

спекуляцыяй, тым, што было зроблена іх бацькамі пры сацыялізме. Каб яны рабіліся цывілізаванымі і дбалі пра народ. Усе ж—адукаваныя людзі, сынкі былых камуністаў. Добрыя псіхолагі працавалі супраць нас, зналі, чым можна было разваліць, зруйнаваць усе сацыялістычныя ідэалы — «мерседэсамі». Горад забіты машынамі. Пры цане на бензін 20 капеек за літр у зімовы сезон не шныра ла столькі машын, як сёння, калі бензін каштуе 1800 за літр. Хлопчыкі прожигают жизнь: машыны, напіткі. Уражанне такое, што жывуць па прынцыпу: пасля нас хоць патоп. А мне пазваніў Міша Баранаў, старшыня калгаса і літаратар, і з болем паведаміў: «Баюся, што не пасею. Няма гаручага». Шушкевіч і Кебіч знаюць пра гэта? Ці таксама працуюць па прынцыпу: «Пасля нас хоць патоп»? Перацягваюць канат: хто — каго? Відовішча! А мы, лапухі, глядзім і цешымся. Балюча і смешна.

15 студзеня

Расказаў Генрых Далідовіч. Павісла пагроза над часопісамі — Мінфін хацеў зрэзаць (можа, і зрэжа) датацыю. А што значыць — закрыць літаратуру. Пайшоў галоўны рэдактар да свайго ўплывовага члена рэдкалегіі Быкава: «Васіль Уладзіміравіч, пазваніце Дземчуку». Не згадзіўся.

Сёння ў Мінск прылятае Клінтан. Падзея. Але здзівіла адна дэталь. Выступіць у Акадэміі навук. Але з адной умовай! Слухачы — вучоныя, не старэйшыя за 35. Вось так яны працуюць! Каб нашы кіраўнікі мелі хоць кроплю гонару, яны павінны былі аспрэчыць такую ўмову. Дзе там! Прынялі з паклонам. Аднак упэўнены: «малады» Пазьняк на сустрэчы будзе, у газеце прайшло паведамленне, што ён намераны паскардзіцца шэфу, што ў Беларусі не ідуць рэформы, не расце капіталізм так, як хочацца Пазьняку і Клінтану, мала яшчэ рабуюць галодны народ. Памажы, пан Клінтан, прыціснуць гэтых «саўкоў». Амерыканскі «корпус міру» сюды б, каб навёў парадак. Змагары за незалежнасць!

16 студзеня

Атрымалася яшчэ цікавей, чым я прагназіраваў учора. «Гаспадар свету», пагаварыўшы з нашымі кіраўнікамі, зачыніўся з Пазьняком і ў тайне даваў яму інструктаж, як зваліць пракамуністычны парламент і ўрад. Што ж, калі нашы лапухі без нацыянальнага гонару, то так ім і трэба. Цяжка ў гісторыі знайсці выпадак такога прыніжэння і такога дыктату. Так з пераможанымі не рабілі. Чытаю ў Чэрчыля: пасля высадкі саюзнікаў у Італіі і падзення Мусаліні Рузвельт і

Чэрчыль вялі перамовы з каралём і Бадальё з павагай, ва ўсялякім разе не топчучы нацыянальную годнасць італьянцаў.

Клінтан плюнуў на наш суверэнітэт. І ўсе стаялі па стойцы «смірна» ці пакорліва кланяліся. ЁН плюнуў на пратакол. Плюнуў на лысіны акадэмікаў. Дай яму моладзь! Урэшце так нам і трэба. Мы — калонія. І Расія калонія. Вось і ўвесь вынік дэмакратызацыі!

Маша зноў паехала на магілу Сашы. Кожную нядзелю. Пакутніца. А мне сорамна, што стаў ездзіць рэдка. Гультай! Да фізічнай працы. Адно не ляную ся — пісаць. Заўтра здам кнігу і сяду за новую аповесць. Трэба пісаць! Хоць нярэдка абпякае думка: а навошта? Для каго? Пісаў Броўка, пісаў Мележ, Куляшоў, згарэў ад прабівання сваіх п'ес, ад сварак з дурнямі і перастрахоўшчыкамі Андрэй. І што? Андрэй неяк выказаўся: «Думаю, п'есы мае гадоў пяцьдзесят будуць ставіць». Увы, як кажуць рускія! Ружовыя мары нашы былі, дарагі сябра мой. І ўсё роўна — трэба пісаць!

21 студзеня

Учора правялі вечар памяці Алякcея Кулакоўскага. Я вёў. Добра, што хоць гэтая традыцыя засталася — помніць тых, каго няма. Адным гэтым Саюз апраўдвае сваё прызначэнне. І добра, што ён ёсць, Саюз. «Друзья, прекрасен наш союз!» А хацелі ж разваліць. Крытыку Сідарэвічу прапанавалі ўступіць у Саюз, ён адмовіўся: «Не хачу я ў гэты сталінскі калгас». Дурань. Думаю, пашкадуе, калі ўжо не пашкадаваў.

В. Зуёнак у інтэрв'ю «Звяздзе» хораша сказаў пра гэты «сталінскі калгас». Нацыянальныя аб'яднанні пісьменнікаў ёсць, бадай, ва ўсіх краінах. Пэн-клуб — аб'яднанне касмапалітычнае. У статуце яго забараняецца члену Пэн-клуба быць у другой арганізацыі. Аднак нашы «прагрэсісты», стварыўшы аддзяленне Пэн-клуба, не выйшлі з Саюза пісьменнікаў РБ. Ні адзін не выйшаў.

Гаварылі пра Кулакоўскага хораша, шчыра — усе старыя: я, Навуменка, Юрэвіч, Новікаў, Аўрамчык, Васілеўскі Пятро (між іншым, Пятро пад старасць робіцца залішне сур'ёзным, а быў жа вастраслоў, гумарыст, нігіліст, скептык).

На вечары такія ходзяць пераважна старыя. І гэта сумна. Я пашкадаваў, што не напісаў пра Аляксея добры ўспамін — такі, як пра Лынькова, Мележа. Заслугоўвае. Характар. Асоба. Празаік свое-асаблівы — сумнаваты, але глыбокі, знаўца жыцця, людзей, мовы. Кранула настаўніца з Салігорска — Марыя Сцяпанаўна Мацюкевіч. Без камандзіроўкі, нават без дазволу дырэктара прыехала на вечар, яна ваюе за адкрыццё музея Кулакоўскага. А родныя сыны на бацькаў

вечар не з'явіліся. Леанід — палкоўнік, ваенны пракурор, Мікалай — інжынер. Ах, дзеткі, дзеткі! Сумна.

Недахоп такіх вечароў-успамінаў — доўга гаворым. Хвароба старых. Работнікі радыё скардзяцца: не хапае стужкі. А Уладзімір Юрэвіч, які 50 гадоў аддаў радыё, гаворыць даўжэй за ўсіх.

Прачытаў «Першацвет», першы нумар — часопіс маладых. Проза слабая: ад яе патыхае нашаніўскімі абразкамі. Нават апавяданне старой Алены Васілевіч — як выцягнутае з архіва, замалёўка-ўспамін пра вайну. Паэзія лепш, хоць паэты — што блізняты. Рэзка выдзяляецца Соф'я Шах — яе вянок санетаў «Вера». Гэта сур'ёзна і стала. І почырк свой. Цікава прасачыць: не памыляюся? Некалі я даў высокую ацэнку маладой Раісе Баравіковай. Не памыліўся — лепшая паэтэса. Куды там стогадовай Наталлі да Раі! Паэтка — божьей милостью. Дай ёй бог шчасця і новых удач!

21 студзеня

Вярхоўны Савет даў адстаўку Шушкевічу. Засыпаўся на дробязях. Рамонт кватэры, збудаванне помніка. Ніжэйшыя за яго хапаюць мільёны і выходзяць сухімі. Усе «высокія» рамантавалі кватэры за дзяржаўны кошт, дачы будавалі з «выкарыстаннем службовага становішча». За што будуюць катэджы побач з маёй дачай работнікі МУСа? Адкуль у іх грошы? На дачах міністраў і намаў працавалі заключоныя: так іх «выхоўвалі» не красці. Просты рабочы можа сцягнуць дэталь, бомж выцягнуць кашалёк з кішэні.

Пазьняк на заключэнне пасяджэння сказаў: «Я вас віншую з паўзучым камуністычным пераваротам. Далей будуць выбары прэзідэнта, выберуць Кебіча, і ад незалежнасці Беларусі нічога не застанецца».

Памёр Алесь Адамовіч. І мне па-чалавечы шкада яго. У нас былі супрацьлеглыя палітычныя погляды. Але як літаратара я высока цаніў яго. Загубіла яго, як губіць і ўсіх нас, тщеславие. Здавалася б: маеш талент — пішы і гэтым зробіш ты значна больш. Не! Лез у Маскву. Нашто яму быў той інстытут кіно? Мая Таццяна вельмі шкадавала Адамовіча, яна высока цэніць яго творчасць, асабліва яго літаратуразнаўчыя працы.

30 студзеня

Мой дзень. Стукнула 73. Узрост! У некага я чытаў, што бывае радасная старасць. Ёсць пэўныя радасці; дзеці, унукі. Ёсць, кажуць, мудрасць. Не думаю, што я стаў мудрэй, чым 20 гадоў назад. Мудрэй, безумоўна, чым у 20 гадоў. Не помню, згадаў хто-небудзь у 1941 г. у Мурмашах, што мне 20. Здаецца, не. У арміі з днём нараджэння не

віншавалі. Бацькі мой дзень нараджэння не помнілі. Маша? Успомніла. Тэлеграмы не было.

Адзначаючы 30 гадоў, жывучы ў адной кватэры з Кулакоўскім, мы напіліся. Нават стрыманы Кулакоўскі і брат мой Ігнат Міхайлавіч Шаўчэнка. Я трымаўся лепш за іх — я рэдка перапіваў. Як адзначыў 40 гадоў — не помню. Было застолле дома. Смяшыў усіх Андрэй.

50-годдзе было шумнае: афіцыйны вечар, банкет у рэстаране «Юбілейны». Прысутнічала каля ста чалавек. І запомнілася сума, якую я заплаціў,— 1100 руб. Во жылі пры камуністах! Якія смешныя цэны!

60 год — вялікая радасць: званне Героя Сацыялістычнай Працы. А на другі дзень — бязладны абед у кафэ СП, які мне хацелі сарваць. Пасля абеду я зламаў руку.

Пра 70-годдзе я пісаў. Яно было цёплае. Ад вечара я адмовіўся. У «Энцыклапедыі» вырашылі сабрацца на 15-20 Мінут. Але віншавальнікаў з'явілася столькі, што засядалі гадзіны паўтары. А ў кабінеце маім — аля-фуршэт. Бутэрброды, але напіткаў — заліся. Так было яшчэ тры гады назад. А сёння праблема купіць пляшку гарэлкі. Нашай няма. Імпартная — 18 тысяч. Але Маша ўсё роўна дае шыкоўны (па нашым часе) абед: студзень, катлеты, гуска, яйкі фаршыраваныя. Для Машы, ды і для мяне, галоўнае — добрая прычына сабраць дзяцей, унукаў. Але ў Тані зноў прыступ панкрэятыту, не прыедзе, і гэта нас засмуціла. Маша не баіцца сваіх хвароб, пазаўчора гвалтам вадзіў у паліклініку да акуліста, але вельмі баіцца, калі хварэюць дзеці.

Быў учора на паніхідзе Алеся Адамовіча — у СП. Народу — поўная зала. Памёр ён у судзе. Дзеляць маёмасць Літфонду. За каго ён стараўся? Супраць каго? Адняць маёмасць у Бондарава, Бялова, Распуціна, Крупіна і тых маладых рускіх пісьменнікаў, што ўжо галадаюць? Ды і ў нас. Літфонд быў на ўсіх.

А пахаванне якое! Пакуты для сям'і. Дом кіно ў Маскве. Царква. Самалётам даставілі труну пасярод ночы. Стаяў дома. Паніхіда ў СП. Зноў царква. Позні выезд у Глушу. Ноч у бацькоўскай хаце. Паніхіда ў школе. І — вечны супакой на запушчаных сельскіх могілках. Хто туды прыедзе, прыйдзе? Думаю, дарэмна сям'я выканала гэты «высокі» запавет, які ён зрабіў, калі хварэў на інфаркт: пахаваць побач з маці. Маці яго была Маці (з вялікай літары) — мужны і мудры чалавек. Яе мудрасць ратавала сыноў у вайну. Але ж вельмі запушчаныя ў нас сельскія праваслаўныя могілкі.

27 лютага

Улез у аповесць «Бумеранг». Па евангельскаму запавету: не забі! Думалі невіноўныя ў лагерах аб помсце Сталіну, Берыю? Безумоўна,

былі такія, што думалі, недарэмна шмат хто з тых, што вырваліся з турмаў у выніку імклівага наступления немцаў, пайшлі на службу да акупантаў. Цяпер з іх робяць герояў. Але ў мяне іншыя героі — патрыёты, крыўда штурхае іх на помету. Своеасаблівую: паслаць правадыру ўсіх народаў да яго 70-годдзя падарунак — адмыслова зроблены пісьмовы прыбор з радыяцыяй. Гэта тыя, што ў няволі працуюць над атамнай бомбай. Але яны дрэнна ведалі псіхалогію дыктатара: нічога з многіх тысяч падарункаў ён не ўзяў сабе (гэта не Брэжнеў, які меў 44 аўтамабілі падораныя), усё адсылалася ў Музей Рэвалюцыі. І 45 гадоў стаяў там экспанат, у залах, у сховішчах — для наведвальнікаў — доза бяспечная. А для супрацоўнікаў, якія рабілі побач з такім экспанатам гадамі?

Выбралі ў акадэмікі. Трынаццаць гадоў пратрымалі ў членкорах. Ужо не спадзяваўся — узрост. Але памаглі «сябры». Р. Г. Гарэцкі захацеў працягнуць у ганаровыя акадэмікі Быкава, Гілевіча, Брыля. Але калі Л. М. Сушчэня праводзіў нараду аддзялення і выказаў гэтае меркаванне, адразу пачуліся галасы (Навуменкі, Бабосава, Марцэлева): «А Шамякін?»

На прэзідыуме АН Навуменка, Хатылёва, Махнач энергічна падтрымалі прапанову аб выдзяленні вакансіі спецыяльна пад мяне.

Па ганаровых папрасілі прапановы ў Саюзе пісьменнікаў. Я сказаў Зуёнку: «Абавязкова дадаць Пімена!» Дадалі.

На сходзе аддзялення вылучылі чацвярых. Але... Быкаву і Гілевічу былі галасы супраць пры адкрытым галасаванні. (Я сядзеў у першым радзе, і няёмка было азірацца — хто галасуе?)

Перад выбарамі дазнаюся: Брыль і Панчанка далі згоду балаціравацца, Быкаў, Гілевіч — не далі. Ідэя Гарэцкага правалілася.

Цікавыя вынікі галасавання. Адам Мальдзіс на знаёмстве выступіў з яркай прамовай аб сабе і сваёй дзейнасці. А вынік галасавання — 8 за з 31. Яшчэ ніжэй набраў тэатразнаўца Анатоль Сабалеўскі. А былы сакратар ЦК В. Г. Ціхіня прайшоў з першага тура, за яго прагаласавала 25 чалавек. А дырэктара інстытута гісторыі М. П. Касцюка, які прайшоў на аддзяленні, правалілі на агульным сходзе: акадэмікі ўкінулі яму 20 чорных шароў.

На сходы хадзіў моцна прастуджаны. Але як не пойдзеш! Цяпер — тэмпература, кашаль. На радасці яшчэ выпілі ў Віктара Каваленкі.

19 красавіка

Скончыў аповесць «Бумеранг». Эпапея: герой успамінае сваё жыццё — вайну, палон, партызанства ў Югаславіі, лагер (наш). Але адмовіўся ад трагічнага фіналу — смерці гераіні, дачкі Жыгуновіча, і,

думаю, аслабіў сюжэт. Таццяна, Маша даўно дакараюць мяне, што многа смерцяў пачаў пісаць. У «Адной на падмостках» пашкадаваў гераіню, але памірае яе былы муж, акцёр. У «Бумерангу» самому не хацелася так жорстка расправіцца з жанчынай, і без таго пакрыўджанай лесам — муж-яўрэй паехаў у Аўстралію, эмігрыраваў, а яна не паехала, яна не магла паехаць — беларуска-масквічка. У музеі нажыла прамянёвую хваробу — ад падарунка, які бацька-зэк і яго сябры 45 гадоў назад падрыхтавалі «вялікаму і мудраму».

Што рабіць цяпер? Зрабіць паузу? Хоць ёсць сюжэт — супраць нуварышоў. Ды не будзе ўжо дзе надрукавацца. Падрыхтаваў чарговую порцыю дзённіка — для «Полымя».

Да палітыкі астыў, напрыклад, выбары прэзідэнта мала хвалююць. Ні адзін з прэтэндэнтаў на прэзідэнта не цягне. Шмат што не падабаецца ў Кебічу — іграе на публіку, як слабы акцёр, але іграе з промахамі. Кебіч хоць гаспадар, ведае эканоміку і людзей. Для кіраўніка гэта нямала.

24 красавіка

Выступаў у Інстытуце гуманітарных ведаў. Быў у настроі. Прагаварыў дзве гадзіны — пра сябе, пра «біяграфію» твораў, пра сённяшні стан грамадства і літаратуры. Сам сабе падабаўся. Слухачы — настаўнікі — слухалі ўважліва. Шкада, што нельга было запісаць такое выступление. Расказваў пра зенітчыц, і вочы набрынялі слязьмі.

27-га з'езд пісьменнікаў, здаецца, адзінаццаты. Акрамя першага, даваеннага, я на ўсіх прысутнічаў — рыхтаваў, праводзіў. І гэта было падзеяй. Займаўся ЦК, напярэдадні, за месяц-два, пісалі ўсе газеты. Сёння — ніхто ні слова. Адраджэнне! Запрашэнне на з'езд — маленькая паперачка, на радавыя вечары друкуюць лепшыя. Ні папак, ні блакнотаў. Жабрацтва. На мінулым, у 1990-м, з'ездзе ўсё яшчэ было. Але сам з'езд быў бедламам, крыкам воюшаў. Між іншым, экстрэміст гэты Воюш выехаў у ЗША. На строме часу ўсплывае ўсё г...

Якім будзе заўтрашні з'езд? Здаецца, экстрэмісты прыціхлі, моладзь ціхая.

Учора быў на дачы і перажыў непрыемныя хвіліны. Вырашыў абрэзаць галіну яблыні, што лягла на дах веранды. Пералезці туды трэба было з балкона. Мінулым летам легка пералазіў — здымаў яблыкі. Учора ледзьве перабраўся цераз парэнчы ў метр вышынёй. Дрэнна. Трэба хадзіць! Трэба жыць! Цікава пабачыць, чым скончыцца бардак, арганізаваны «дэмакратамі». О, не! Не дажыць. Гэта доўга будзе працягвацца — збядненне народа. Так жыць, як жылі ў 70-х, пачатку 80-х гадоў, мы ўжо не будзем і праз 10-15 гадоў.

30 красавіка

Правялі з'езд пісьменнікаў — XI. Другі праводзілі ў 1949 годзе. Запомніўся. Было многа гасцей. Першыя знаёмствы з масквічамі. Усё здавалася надзвычайным, я, аўтар «Глыбокай плыні», адчуваў сябе на алімпе. Жыў у прыватным пакойчыку, але жыццё было поўна надзей. Галоўнае — вярнуўся з вайны жывым, здаровым і прагнуў пісаць, акрылёны першым поспехам. Навокал былі цікавыя, добрыя людзі, яны падтрымлівалі мяне (пазней я адчуў, што далека не ўсе падтрымлівалі шчыра, некаторыя ставілі падножку).

Што сказаць пра наш ўчарашні з'езд? Канешне, таго бедламу, што ў 1990-м, не было. Не бегалі па зале, не крычалі. Але размовы пра літаратуру не адбылося. Уладзімір Паўлаў зрабіў пералік і ніякага аналізу... Ды і пра што гаварыць? Па-мойму, ніхто яшчэ не гатовы гаварыць пра сучасную літаратуру. Ды і якая яна, літаратура пра нашу сучаснасць?! Праклёны камуністам? Не адышлі яшчэ ад эйфарыі дэмакратыі, хоць да яе, дэмакратыі, так і не прыйшлі.

Дэпутат Гілевіч выступіў першы і скіраваў усю размову ў бок ад літаратуры — на палітыку, на пагадненне аб рублёвай зоне. Натуральна, што пасля Гілевіча ўсе кінуліся ратаваць незалежнасць Беларусі. Прынялі адозву да народа. І хоць бы адна маленькая канструктыўная прапанова: а як жа без расійскай нафты, газу, металу выйсці з тупіка? Далучыцца да Польшчы? Даць немцам яшчэ раз акупіраваць нас? Без зброі. Немцы могуць. А я перакананы: нашу незалежнасць, якая можа быць у індустрыяльным свеце, можа забяспечыць толькі Расія. Пры ўмове, што кіраваць ёй будуць не ельцыны і жырыноўскія.

Юлія Канэ, якая два гады назад выехала ў Ізраіль, з'явілася на з'езд. І яе тут жа выбіраюць у прэзідыум. Дзе гонар, незалежнікі? Недурная баба, яна сама кпіла на гэты конт: «Трэба было выехаць у Ізраіль, каб адзін раз пасядзець у прэзідыуме з'езда». Між іншым, выступіла і дала пару мазкоў аб жыцці літаратараў у Ізраілі, параўнала наш Дом, нашу залу з іх памяшканнем у Тэль-Авіве: зала на 50 чалавек у падвале з дзіравымі дарожкамі. Мала хто ўспомніў, што такі дом беларускім пісьменнікам збудавалі камуністы — ініцыятыва Машэрава. Але ўспамін гэты ніхто не мог агласіць — зацюкалі б, такая свабода слова, плюралізм. Людзі многія думаюць ужо інакш, але сказаць не могуць, баяцца — нямодна. Наша братва— што інстытуткі: не дай божа надзець штось нямоднае.

Працавала кафэ. Многа пілі. Увогуле, п'юць многа. Але — во дзіва! — ні адзін п'яны не палез на трыбуну.

Старшыню выбіралі з'ездам. Я падтрымаў Зуёнка. Выбралі.

З'явіўся Пазьняк у суправаджэнні Баршчэўскага. Выступіў. Увогуле, адзін яго тэзіс здзівіў: не трэба нагнятаць песімізм, не ўсё ў нас дрэнна. Нова.

Пры галасаванні не хапала кворуму. Схавалі апячатаную урну. Дагаласоўвалі ўчора. Заключнае пасяджэнне назначылі на тры гадзіны. Сабралася мала, ды і тыя разышліся. Падліковая камісія толькі ў сем вечара дала вынікі, не аформіўшы пратакольна.

Заўтра 1 Мая і Вялікдзень. Я любіў свята 1 Мая. Хадзіў на дэманстрацыі. Радавалі калоны людзей. Глупства, што ўсе ішлі па прымусу. Можа, пры Сталіне і было гэта, але пасля XX з'езда хіба студэнтаў прымушалі. А большасць ішло па закліку сэрца. З дзецьмі.

Зазелянелі дрэвы — прыемна глядзець. Цёпла. А я кашляю. Хопіць пісаць! Гэта ўжо як наркотык. Не пішу — хварэю. Але загадаў сабе: за новую аповесць месяц-два не бяруся! Вытрымаю?

2 мая

Смаркаюся, кашляю. Хварэць не хочацца. Тры дні сяджу дома. Адзін. Не пайшоў нават на прыём да мітрапаліта з нагоды Вялікадня.

Маша ўчора ездзіла на магілу Сашы. Я яе адгаворваў: нікога не будзе. Людзей было як на Радаўніцу. Новая традыцыя. Па хрысціянскіх канонах у Дзень уваскрасення Хрыста на могілкі не ходзяць. Пакланенне мёртвым — добра. Але гэта ператвараецца ў фетыш, у Машы прынамсі. А ў некаторых — у моду, напэўна.

Аднаму нудна. Чытаю энцыклапедыю «Христианство». Цікава. Як многа мы не зналі. Адукацыя наша, марксісцка-ленінская, была аднабаковай, зашоранай.

Прачытаў трагедыю А. Дударава «Купала». Прафесійна зробленая гістарычная казка для недасведчаных. Між іншым, Шэкспір таксама пісаў свае гістарычныя трагедыі для гістарычных невукаў. Хто ў той час ведаў, што адбывалася 100-200 гадоў назад.

14 мая

Перабраўся на дачу. Хораша тут! Устаў — і на зямлі. Зеляніна навокал. Сонца. Глыбокае неба, сёння — асабліва, як вымытае шкло.

Сапсаваць настрой могуць нечакана. Пазваніў Георгій Колас. Паведаміў (ніхто з палымянцаў пра гэта не сказаў): Юрка Броўка выступае ў 5 нумары «Полымя» з адказам мне — на дзённікі.

Па словах Коласа: піша з крыўдай і непачціва. За што? Што я прывёў расказ С. З. Лыньковай на вечары аб тым, што Броўка, Чорны, Самуйлёнак пісалі на Лынькова і таго знялі з кандыдатаў у дэпутаты. Ю. Броўка даводзіць, што Лынькоў быў дэпутатам першага

склікання. Колас праверыў: быў, але калі выбраны? За два дні да выбараў 22 чэрвеня 1938 года Лынькоў раптоўна быў зняты з кандыдатаў па Суражскай выбарчай акрузе. Выбраны ён праз паўтара года на дадатковых выбарах ад Заходняй Беларусі.

Маша папракнула: «Ты, як баба,— усе плёткі збіраеш». Не, дарагая! Гэта не плёткі, гэта — гісторыя. Пра Броўку я напісаў добра, з высокай ацэнкай і яго таленту, і, асабліва, яго арганізатарскіх здольнасцяў. Гэтага Юрка не заўважыў. Заўважыў аб'ектыўную інфармацыю, што не на карысць паэта. Я разумею сына: ён ваюе за бацьку, ёсць жа музей яго, і Юрка дырэктар. І ён не хоча зразумець, што я хацеў даць асобныя штрыхі трагедыі часу. Не віна Броўкі, як і Чорнага, што яны пісалі такое,— бяда іх. Броўка не быў нягоднікам. Арышт цесця, цешчы, швагра зламалі, спалохалі яго, і ён усімі сродкамі — паэзіяй і пісьмамі — імкнуўся даказаць, які ён правільны, лаяльны, ідэйны. Не толькі арышт блізкіх па сям'і, але і арышт блізкіх па літаратуры: Янка Скрыган быў лепшым сябрам яго. І Хведаровіч.

Цікавую дэталь сказаў Колас: Чорнага арыштавалі ўжо пры Панамарэнку, а ўсе мы лічылі — да яго з'яўлення: Панамарэнка вызваліў. Колас чытаў пісьмо Цанавы Берыю: просіць дазволу вызваліць Чорнага, той даў згоду даць паказанні на працэсе нацдэмаў. Зламалі Кузьму. Толькі працэсу гэтага, па-мойму, не было. Ці быў закрыты? Многа яшчэ загадак і тайнаў. Бяда ў тым, што такім даследчыкам, як Георгій Колас, я не вельмі веру — аб'ектыўнасці іх, вытлумачэнню вывуджаных з архіва фактаў.

Яму не далі асабістую справу Лынькова. Просіць, каб я паглядзеў — мне дадуць. А ці ёсць яна? Відаць, ёсць, калі быў зняты з кандыдатаў, а праз паўтара года зноў выбраны. Ці не ідэалізаваў я Лынькова? Але мне быў сімпатычным гэты чалавек. І Броўку я любіў шчыра. Крыўдна, што Юрка не прачытаў гэтага. Думаю, юрыста нехта настроіў... Крыўдна, што Юрка не пагаварыў са мной. У нас жа былі найлепшыя адносіны. Каварная гэта рэч —успаміны. Як высока я ўзнёс Машэрава! Адна заўвага, што, ні разу не выступіўшы па-беларуску, ён даваў сігнал на русіфікацыю — і Машэравы пакрыўдзіліся, Наталля выступіла з асуджэннем маіх успамінаў.

Але пра што тады пісаць?

21 мая

Сяджу позна ўвечары, прачынаюся ўначы — і не адразу сцяміў, чаго не хапае на маёй дачы, нейкіх гукаў. Якіх? Дайшло нарэшце. Паяздоў! За два кіламетры ў Ждановічах — чыгунка на Маладзечна, Вільнюс, Рыгу. У тыя гады па ёй праз кожныя 20-30 мінут праходзіў

цяжкі састаў, уначы добра чу ваць яго ход. Ход лёгкіх электрычак удзень не чуцен. Няма цяжкіх саставаў. Не ідуць. Няма чаго вазіць ні ў Беларусі, ні тым больш у Прыбалтыку. А вытворчасць усё падае і падае. Калі спыніцца гэтае падзенне? Што яго спыніць? Рублёвая зона? Генадзь Лыч, эканаміст, скептычна адзываецца аб зоне.

Атрымаў аванс за кнігу — пяць мільёнаў. Жах! Мільянер. А чаго варты мільёны? І куды іх дзяваць, калі яны абясцэньваюцца не па месяцах — па днях. Зноў гавораць аб падаражанні гарэлкі. Чацвёртае за пяць месяцаў 94-га. Калі Кебіч гэта зробіць, то можа пагарэць на выбарах.

Маша мільён павезла Таццяне на рамонт халадзільніка. Мільён паабяцала Тамары — за будучую бульбу. Гэта, відаць, правільна: Тамара акуратна забяспечвае нас бульбай. Невядома, колькі яна будзе каштаваць увосень. 20 мяшкоў, якія запасаем на зіму на тры сям'і, напэўна, не менш, нават і ў расійскіх рублях.

Аб грашах. Я не здымаў іх з тэрміновых укладаў, спадзяваўся на індэксацыю. Наіўна. Гады тры не адзначаў працэнты, індэксацыі. Было тады — 220 тысяч. Сума! Дзесяць «Волг», і яшчэ на каньяк і каўбасу засталося б. Цяпер, пасля ўсіх «індэксацый», з працэнтамі за тры гады — 420 тысяч. Месячная пенсія! Які дзікі грабеж! Ці быў яшчэ дзе такі? Гэта ўсе мае накапленні за 40 гадоў — ганарары за 120 выданняў, прэміі і дзяржаўныя і ўсе іншыя.

Вось такое жыццё! Нашчадкі! Будзеце смяяцца ці будзеце спачуваць?

Хто не піша раманы, але накралі грошай, тыя яшчэ тры гады назад памянялі іх на долары — надзейна, ці пабудавалі катэджы. Лыч сказаў мне, што Кебіч мае чатыры дачы. Не веру. Але калі гэта праўда, то робіцца сумна. Навошта яму ажно чатыры дачы? Гэта ў мяне ўзнікае такое пытанне? А ў іх, эканамістаў, не ўзнікае, яны ведаюць, куды ўкласці набытыя грошы, асабліва калі яны набытыя не ў шахце, не пісаннем раманаў, карцін.

Стаялі вельмі цёплыя дні. Сёння пахаладала. Але ўсё роўна тут, на дачы, хораша.

25 мая

Учора адбыўся пленум рады. Выбралі сакратароў. Выбралі ранейшых. Я галасаваў за іх: хлопцы добрыя.

А ўвогуле, адчуў, што большасць членаў рады абыякавыя да спраў Саюза. Падае яго прэстыж. Што ён можа даць сваім членам? Выданні? Не. Пуцёўкі? За пяць мільёнаў? Замежныя камандзіроўкі? Ніякіх магчымасцей, І ніякіх сувязяў нават з былымі рэспублікамі

СССР. Вось ужо сапраўды незалежнасць у поўным сэнсе. Радуйцеся, браткі беларусы. Што пісьменнікі паўгалодныя — гэта яшчэ паўбяды. Бяда, што яны ізаляваныя ад свету, не выдаюцца ла-руску і на роднай мове іх мала чытаюць. Начальнік Упраўлення кніжнага гандлю паставіў у міністэрстве пытанне: беларускія выданні браць на камісію. Разлікі з аўтарамі пасля рэалізацыі тыражу. Смерць літаратуры. Сказаў пра гэта Бутэвічу. Ён супакоіў, маўляў, і Андрею к, ад якога я пачуў гэта, і ўсе мы — панікёры. Запанікуеш мімаволі. Перспектыва змрочная. І для народа ў цэлым. І для яго песняроў у прыватнасці.

Не скажу за ўсіх, а я ўсё ж жыву справемі Саюза. Нічога не маю ад яго. Але гэта мой дом. Я будаваў гэты будынак, і я ганаруся, што выбіў яго. Канешне, без Машэрава не збудавалі б. Ох, успомнім мы яшчэ не раз камуністеў!

Мяне перасмыкае, што Дом літаратара напоўнены камерсантемі. Пакуль яны арандатары. Але могуць стаць і гаспадарамі. Вось тады ўжо сапраўды капут. Паставім крыж на літаратуры, самастойнай і незалежнай.

27 мая

Учора прыехаў Мікола Мятліцкі з сябрам сваім і земляком — дырэктарам фірмы (у яго, як высветлілася, тры фірмы) Аляксеем Ерамчуком. Нрывезлі гарэлку — ізраільскую — і закусь. Ерамчуку гадоў пад сорак. Скончыў Інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, рабіў аўтамеханікам у калгасе. Пересяліўся з зоны, і вось — капіталіст. З палескім размахам. Свойскі хлопец, кампанейскі. Такія капіталісты рассляблюць класавую непрыязнь. Мікола стварыў фонд «Палескі смутак». Павязуць дабрачынны груз землякам — у Хойнікі. Пад прыкрыццём фонду Ерамчук хоча атрымаць ці стары дом, ці ўчастак для будаўніцтва офіса. Колькі ж трэба мець грошай? Мае. Гандлюе бензінам. А я ўчора заправіўся, заліў 40 літраў — 156 тысяч. Маша купіла індзюшку — 80 тыс. Я купіў Славяне (яна хварэе) тры бананы, апельсін — 20 тыс. Мільён з трох атрыманых за «Падзенне», «Адну на падмостках» ужо чмыхнуў. Вось тут і жыві! Хочацца паслаць такую палітыку. І палітыкаў. Усіх. І нуварышоў, што прапіваюць нароблснае бацькамі-камуністамі. Каб не здраднікі і хапугі Брэжнеў, Гарбачоў, Якаўлеў, сецыялізм у ідэі сваёй чыстай — найсправядлівейшая сістэма. У прынцыпе там атрымоўвелі па працы. І не кралі так. Спекуляцыя была ганьбай і каралася па закону. А цяпер: хто спекулюе, той жыве. Ці хто бярэ хабар.

4 чэрвеня

Прачытаў выступление В. Кебіча ў Нясвіжы. Па-мойму, акцыя яго з творцамі не вельмі ўдалася. У канцы 1992 г. ён павёз групу мастакоў, пісьменнікаў у Мір, дзе ішлі рэстаўрацыйныя работы, пачатыя яшчэ пры Машэраве. Нешта зроблена ў Нясвіжы — у паркавай зоне. І вось — новая паездка. Мяне запрашаў А. І. Бутэвіч. Я даў згоду, але паехаць не атрымалася.

Аб выступленні Кебіча. Пра культуру — агульныя словы. Больш сур'ёзная другая палавіна прамовы — эканамічная. Але новага, бадай, нічога. Я не веру абяцанням кандыдатаў, не таму, што лічу іх хлусамі і дэмагогамі, а таму, што не здольны ніхто з іх выканаць тыя абяцанні выбаршчыкам, якую пасаду ні заняў бы. Ельцын абяцаў легчы на рэйкі. Лёг?

Новае адно: словы прем'ера аб зберажэннях нашых. «Таму ўрад прыняў рашэнне аб 60 працэнтах кампенсацыі ўкладаў насельніцтва». Што такое 60 працэнтаў? Абясцэняцца і яны. Але хоць бы на год-два хапіла. Памру — каб было за што пахаваць. Здавалася б, якая розніца, як цябе пахаваюць. Не думаеш. І хочацца, каб лепш. Жыве ў нас бог.

У «СБ» выступілі Вячаслаў Дашкевіч і Віктар Трасцянскі. На з'ездзе яны выступілі супраць звароту аб асуджэнні пагаднення аб рублёвай зоне. У знак пратэсту здалі білеты. Заслугоўваюць павагі за сваю прынцыповасць. На пленуме рады Бураўкін узняў гэтае пытанне: мы павінны выказацца аб іх прыналежнасці да СП. Я прапанаваў сакратарыяту пагутарыць з імі і вырашыць пытанне пасля іх тлумачэнняў. Куды там! «Палажыўшы білеты, яны заявілі аб сваім выхадзе з СП». Галасавалі. Чалавек пяць супраць выключэння. Узрадавала, што амаль усе маладыя, пяць і я (ліберал), устрымаліся. Большасць — за прапанову Бураўкіна.

А Дашкевіч і Трасцянскі хораша назвалі свой артыкул у «СБ»: «Жизнь все расставит по местам, или О том, как писатели исключили писателей из своего союза за инакомыслие».

15 чэрвеня

Баяцца рублёвай зоны і не хочуць бачыць, што мы даўно ўжо ў доларавай зоне. Адбылася ціхая, мірная доларавая акупацыя, ненамнога меней бедственная, чым гітлераўская ваенная. У камерцыйных, ды і не толькі, структурах усе разлікі ідуць у доларах. Добры хабар бяруць чыноўнікі толькі ў доларах. Свабодная купля-продаж долараў. Адкуль яны ўзяліся? Такая маса! Дзе яшчэ падобнае ёсць? Па-мойму, долары гэтыя нічым не забяспечаныя, урад ЗША ніякай адказнасці за

іх не нясе. Не ён іх прывозіў. У адзін дзень яны могуць лопнуць. Дзікая катастрофа адбудзецца. Апакаліпсіс. Якое будзе разарэнне банкаў, фірм. А будзе!

Наш дачны пасёлак намерваецца правесці газ. Вераць людзі ў Расію, што газ яна будзе даваць бесперабойна. Дай бог! Сказалі — па 10 мільёнаў з дачы. Але іх у мяне няма. Аднак пайшоў на сход. Прайшло тры тыдні. І ўстаноўлена такса: па адной тысячы долараў з дачы. Адна тысяча па курсу сённяшняга дня раўняецца 22 мільёнам. Колькі будзе, пакуль будуць весціся работы? Таму і рашылі збіраць даларамі.

Юрка Броўка надрукаваў у «Полымі», пятым нумары, «Ліст да І. П. Шамякіна, народнага пісьменніка Беларусі». Пачынае паважліва: «Дарагі Іван Пятровіч». Канчае булыжнікам: «Словам, ніякіх доказаў таго, што ў 1937 годзе адбылося «падзенне» маладога П. Броўкі, у вашых успамінах няма. А вось што з Вамі, паважаны Іван Пятровіч, здарылася сёння?»

Нічога не здарылася, дарагі Юрка. І не ставіў я за мэту даказаць падзенне. Я паважаў Пятра Усцінавіча і, нягледзячы ні на што, прадаўжаю паважаць. Я ўдзячны яму. Пра пісьмо я ведаў раней — мне сказаў сам Лынькоў. Але размова была адзін на адзін, і я нават у вусных гутарках нікому не сказаў ні слова пра гэтае пісьмо, акрамя Андрэя. Навошта даваць «адрас» накірунку — дзе і што шукаць. Я маўчаў да таго часу, пакуль Соф'я Захараўна не зачытала цытаты з гэтага пісьма на вечары 90-годдзя з дня нараджэння Міхася Лынькова — перад залай чалавек у 250. І то я зрабіў запіс у дзённіку ці не праз год пасля вечара.

Не меў я намеру кінуць цень на Броўку, Чорнага, Самуйлёнка. Я хацеў даць штрышок часу. Не іх віна — іх бяда, што яны мусілі пісаць такое пісьмо. Яны не ставілі за мэту пасадзіць Лынькова. Самае большае — ім хацелася не даць яму выбрацца ў Вярхоўны Савет БССР.

Юрка праверыў, што пісьма ў архіве няма. А вось у Г. Коласа яно ёсць, ён званіў мне пяць разоў, прасіў паглядзець асабістую справу Лынькова, маўляў, яму не даюць, а мне дадуць. А мне не трэба правяраць: я веру Лынькову і Соф'і Захараўне. Недарэмна ж было яго перадсмяротнае завяшчанне: каб пад некралогам не было подпісу Петруся Броўкі.

Юрка зрабіў глупства, апублікаваўшы пісьмо. Так эпізод гэты забылі, дзённікі мае не ўсе чытаюць, а хто і чытаў — на гэта не звярнуў увагі. Пісьмо яўна прыцягнула ўсеагульную ўвагу: было ж пісьмо трох ці не было? І Г. Колас дакажа, што было.

Не хацеў запісваць тое, што расказваў Лынькоў — мне па сакрэту. Але напішу. Пасля таго як пасадзілі Чорнага, Броўка, ганарысты і гарачы Пятрусь, стаяў перад Лыньковым на каленях, прасіў дараваць. А Броўку пасадзіць было легка: пасадзілі яго цесця, цешчу, швагра. Лынькоў праявіў высакароднасць і мудрасць. Божа мой! Якая трагедыя часу! Шэкспіру такое не снілася.

Доктару юрыдычных навук — Юрку — варта было ўзважыць усе акалічнасці, спалучыць іх. Не ўзняўся — зацьміла крыўда. Разумею: за бацьку балюча. Хоць я ў гэтых жа дзённіках, у «Карэннях і галінах» не пашкадаваў дзеда і бацьку — напісаў пра іх слабасці.

Юрка піша: «Колькі Вы робіце крытычных заўваг! А ці заўсёды паклапаціліся пра доказы? Як разумець, не пабаюся сказаць, жорсткасць? Вы ж не пашкадавалі нават сваіх блізкіх. На адной толькі старонцы часопіса 182, нумар 7, дасталася і сакратарцы Вялікага Кіраўніка, і самому Кіраўніку, і яго жонцы, і на гэтай жа старонцы выносіцца прысуд яшчэ і герою-партызану, і нават былому пракурору сталічнага горада». Дзіўна піша доктар! Не пашкадаваў Святлану Філіпаўну... За што? Што яна яўна пабаялася расказваць пра Машэрава, зволеная Ц. Я. Кісялёвым з цёплага месца? Звычайная чалавечая слабасць — боязь: напіша Шамякін — будзе яшчэ горш. Словы Святланы, што ў іх былі складаныя адносіны. Ну і што? У сям'і ўсё бывае. Абурыўся Дзядковым, які пачаў аплёўваць Машэрава, помсціць мёртваму, што той не зрабіў яго міністрам? Юрка не бачыць, што яго калега-юрыст у сваім водзыве пра Машэрава выяўляе сябе, мякка кажучы, непрыгожа.

Нас адвучылі пісаць людзей такімі, якія яны ёсць, нас вучылі іх ідэалізаваць. Цяпер я пішу пра чалавечыя слабасці, у тым ліку і ў дзённіку — пра слабасці рэальных людзей.

27 чэрвеня

Перадалі папярэднія вынікі галасавання па выбарах прэзідэнта. Лукашэнка — 45,1 прац. ад колькасці галасаваўшых, Кебіч — 17,4, Пазьняк — 12,9, Шушкевіч — 9,9, Дубко — 6, Новікаў — 4,6. Нечаканыя вынікі, для мяне прынамсі. Некалі пасля расійскіх на палітычным шоу Каракін выгукнуў: «Ты здурэла, Расія». Я так не скажу. Але народ збіты з панталыку. Каманда Кебіча, маючы ўладу, аказалася бездапаможнай перад Лукашэнкам. Ён перайграў іх, бо лепш ведае настрой народа. На гэтым настроі маглі б атрымаць больш камуністы. Але... вылучэнне Новікава было фармальным. Хто такі Новікаў? Нават я яго не ведаў. І партыя вылучыла, а падтрымаць не захацела. Ганьба такой партыі!

17-га да мяне прыехалі Мулярчык (быў загадчыкам аддзела культуры ЦК КПБ) і яшчэ адзін Яўген Пятровіч (таксама рабіў у ЦК ці ў абкоме, добра ведаю яго, а прозвішча ўспомніць не мог). Падводзіць памяць. Перад іх прыездам пазваніў Пятро Краўчанка і сказаў мэту іх прыезду: прасіць Новікава і Дубко зняць свае кандыдатуры на карысць Кебіча. (Цяпер думаю: каб яны знялі, яўна прайшоў бы Лукашэнка.) Але калі Мулярчык паказаў праект пісьма, якое мы павінны былі падпісаць, я схапіўся за галаву. Нашым аўтарытэтам хацелі націснуць на пленум ЦК, які збіраўся 18-га, каб прымусіць Новікава зняць сваю кандидатуру. Члены ЦК працавалі на Кебіча. Дурны праект: вінавацілі Новікава ў амбіцыях і інш. Браткі! Вы ж яго вылучылі. Я запратэставаў і выкрасліў усе абвінавачванні ў адрас Новікава і ўсіх іншых кандыдатаў. Нельга пленуму падхалімнічаць перад Кебічам! Згадзіліся, знялі ўсё, што я выкрасліў. Прыехалі на другі дзень, перад пленумам, знайшлі мяне ў санаторыі «Беларусь» на масажы. Да мяне адрэдагаванае мной пісьмо падпісалі Танк, Яроменка, Чыгрынаў, Лучанок і іншыя.

Прагноз на другі тур. Перацягне Лукашэнка? Відаць, калі не зробяць яму падножку. Хоць бываюць нечаканасці. Гісторыя дэмакратыі ведае іх. Можна расстраляць парламент і застацца дэмакратам, выратавальнікам народа.

26 чэрвеня

Валкагонаў напісаў біяграфію Леніна ў дзвюх кнігах. Можна ўявіць, колькі бруду вылiў гэты пігмей на генія.

Гісторыя не ведае такой масавай здрады веры, ідэі, як у нас цяпер. Але з усіх пярэваратняў (рускае оборотень — лепш, у ім— звярынае) самыя брыдкія, бадай, Гарбачоў, Якаўлеў, Валкагонаў. Валкагонаў — самы ваяўнічы оборотень, бо ўмее пісаць і піша многа.

Хочацца напісаць вобраз чалавека, вернага ідэі. У В. Чаропкі вычытаў такі вобраз: гэта вялікая княгіня Алена Іванаўна, дачка Івана III і жонка літоўскага вялікага князя Аляксандра. Бацька паставіў умовы: не пераходзіць у рымскую веру, і Алена вытрымала ўсе націскі: мужаў, папскіх месіянераў, польскай шляхты, якая нават не каранавала яе, праваслаўную, калі каранаваўся ў польскія каралі Аляксандр. Во характар! Але пісаць пра такую сівую даўніну, не займаўшыся ёй, ведаючы гісторыю толькі па падручніках,— праца, бадай, непасільная, старому і сляпому. Колькі перачытаць трэба.

Між іншым, пра кнігу Чаропкі «Імя ў летапісе». Я пісаў: зрабіла ўражанне. А вось прачытаў том Карамзіна — усё пра Івана III — і сумна развесяліўся. Чаропка цалкам усе факты, пісьмы здзёр у

Карамзіна, толькі вялікі рускі гісторык усё даваў з пазіцый расійскіх, патрыятычных, Чаропка — вялікм літоўскіх. іван абкарнаў ВКЛ, сабранае Вітаўтам. Чаропка славіць Аляксандра, палітыка бяздарнага. Вось так пішацца гісторыя! Так валкагонавы пішуць гісторыю Рэвалюцыі і біяграфію Леніна. Хіба не сумна?

...«Звязда» дала дасціпны загаловак артыкулу — «Лука-шок». А ўвогуле, шок. Для шмат каго. А я пачынаю мірыцца з думкай: няхай паспрабуе пакіраваць дырэктар саўгаса, кіруе ж у Польшчы электрык. Праўда, палякі ад яго не ў захапленні. Дзейнічае перавернуты дагары Марксаў лозунг: хто быў нічым, той стане ўсім.

Кірычэнка стварае фірмы з удзелам камітэта. Была прэзентацыя новай фірмы «Мір і згода». Хацеў не ехаць. Але ён без «генерала» не можа. Прыехаў на дачу з прэзідэнтам фірмы Смірновым. Было дзесятак бізнесменаў, упраўляючы банкам «Магнат». (У РБ — 30 камерцыйных банкаў, банкір сказаў, што ў Аўстрыі іх — 2000.)

Да таго як сесці за стол, горача абмяркоўвалі вынікі галасавання. Усе яны цяпер за Лукашэнку. Але, адчуў, і баяцца яго. Галоўная тэма: як ён будзе адбіраць катэджы, у яго гэта гвоздь праграмы.

Я іх заспакоіў: няхай не баяцца, канфіскуе ён 10-15 катэджаў, не больш, забраць усе — рэвалюцыя, на яе і гэты канфліктны чалавек не пойдзе. І я ў гэтым абсалютна ўгіэўнены. І што шчасця народу не прынясе — няма сумнення. Не стала б горш. А можа быць. Лета паганае. Можа быць неўраджай. За ўвесь чэрвень сёння — першы летні дзень. З сонцам весялей.

1 ліпеня

Дзякуй богу, 50-годдзе вызвалення Беларусі адзначаецца па-чалавечы. Успамінаюць гісторыю, перамогі Савецкай Арми, партызан. Сарамліва замоўчваюць ролю партыі ў арганізацыі ўсенароднага супраціўлення. Але ў гэтым вінаватыя не толькі пазнякі, але і самі камуністы. На сходах, прысвечаных даце, яны, ветэраны, добра выступаюць, а на тэлебачанне, у масавую прэсу не прабіваюцца. Няма актыўнасці. Ды і сам я такі. Мне тэлебачанне дало б слова.

У арганізацыях 50-годдзе адзначаюць застоллямі. Нават спонсары не скупяцца. Камітэт міру (Кірычэнка) арганізаваў прыём на 50 чалавек. Царскі прыём. Два старшыні калгаса — Скавародка і Рубель — ахвяравалі па свінні. Нішто сабе! Думаю, што ветэраны з'елі не больш трэці свінні. Ідэя са свіннямі—дырэктара рэстарана «Троицкое предместье». Мудрыя прадпрымальнікі! Хвала ім! Саюз пісьменнікаў таксама знайшоў спонсара. Без свіней. Учора там была сустрэча

ветэранаў. Я не паехаў — знясілеў. Трымаюся. Але ўсё ж трохі вып'ю, а на другі дзень цяжка.

3 ліпеня

Напісаў 1944 год. Помню гэты дзень. Толькі прыехалі ў Петразаводск. Штаб размяшчаўся ў фінскіх домiках нейкага лесасклада. Лесаматэрыялу мора. Батарэі акопзаліся ў розных канцах горада. Я хадзіў на батарэі. Не столькі хацелася выконваць свае абавязкі камсорга, хоць выконваў я іх добра, шчыра, камсамольцы, асабліва дзяўчаты, любілі мяне, колькі лішні раз прыгледзецца да толькі што вызваленага горада, сустрэцца з тымі, хто быў у акупацыі. Фіны хітрыя, зверствавалі ў 1941-1942 гг., а ў 1943-1944 гг. паводзілі сябе гуманна, нядрэнна забяспечвалі насельніцтва — па нормах ваеннага часу.

Афіцэры нацягалі трафейных прыёмнікаў. Нават мы з Калбекам набылі. Я прыйшоў з батарэі стомлены. Не ад працы — накупаліся з камандзірам батарэі Ільіным у Анежскім возеры. І раптам прыбягае Ліда Жураўлёва, пісар штаба, ленінградка, перажыла блакаду, ды так і не набрала вагі — худая, доўгая — і радасна паведамляе, ведала, што я жыву наступлением у Беларусі: «Мінск вызвалілі!»

І радавалася разам са мной. І Калбека радаваўся. І камандзір дывізіёна Кузьмін, пскавіцянін, радаваўся. І начальнік штаба Мураўёў, яраславец, радаваўся. А на другі дзень я абышоў усе батарэі, пражэктарную, кулямётную роты і расказваў пра вызваленне Мінска так, быццам сам там прысутнічаў. І пра Мінск, хоць быў у ім аднойчы ў 1940-м, вяртаючыся з Валкавыска, з Росі, з практыкі. Па прачытанаму расказваў. Пра акупацыю я ведаў не толькі з газет, з радыё, мне ўжо з восені 1943 года пісалі з Гомельшчыны. Маша пісала. Малапісьменныя дзяўчаты валагодскія, комі, слухалі мяне, як ніводнага высокага прапагандыста — са штаба корпуса. Маёры, падпалкоўнікі маглі цікава расказаць афіцэрам. З радавымі, сяржантамі, асабліва з дзяўчатамі, гаварыць не ўмелі.

Учора прайшло ўрачыстае пасяджэнне — у Палацы спорту. Сядзеў у прэзідыуме і радаваўся... Яшчэ адной перамозе: не ўдалося былым паліцаям закрэсліць нашу Перамогу, вялікі подзвіг народаў СССР. Пра гэта гучала з трыбуны. У дакладзе Кебіча, у выступленiях Чарнамырдзіна, Масола, Бразаускаса, прадстаўнікоў усіх рэспублік, акрамя Латвіі і Эстоніі: гэтыя зацятыя нацыяналісты не адгукнуліся на запрашэнне нашага ВС, урада. Нацыяналізм — гэта хвароба, адна з форм шызафрэніі. Далібог, так.

Доўга гаварылі — тры гадзіны, але слухаць было прыемна. Знаёмых, якіх не бачыў з часоў пленумаў ЦК, пабачыў. Узрадаваўся,

убачыўшы Кузьму Шаплыку — дагэтуль старшыня калгаса, 50 гадоў — з восені 1944 года. Мудрэйшы чалавек гэты Кузьма! Бядуля з хітрынкай, іграе на публіку, добры акцёр. І Старавойтаў. Кузьма — святая прастата. Але які гаспадар!

Папрасіў Машу зрабіць святочны абед. Адчуваю гэтае свята! Радуюся. Выстаўлю апошнюю пляшку віна, рэйнскага, якую падарылі немцы. Горка — яны нам дораць. Прынімаю. Але стаўлюся да іх недаверліва — мірныя акупанты. Прасіў Дабралюбава не выкідаць адносіны Рачыцкага да гэтых акупантаў. Пераконваў, што без слоў пра немцаў не зразумелым будзе яго самагубства. Ці пераканаў? На здымкі рэжысёр мяне не запрашае. Праўда, я не рвуся. Я своеасаблівы аўтар. Я гару, пакуль пішу. Напісаў — і астыў. Андрэй прысутнічаў на ўсіх рэпетыцыях сваіх п'ес. Я разы два наведаўся і больш не пайшоў: чарнавая ігра мяне раздражняла. І глупства рэжысёраў. У таго ж Эрына нейкае перавёрнутае бачанне і сітуацый і характараў.

Выпі за сваё здароўе, Іван! І за светлую памяць Андрэя. І Вані Мележа. І Броўкі, якога я па-ранейшаму паважаю, нават калі ён і падпісаў тое злашчаснаё пісьмо супраць Лынькова. Не віню. Смуткую. Добрых людзей паганіў суровы час. Наша шчасце, што мы дажылі да часоў, калі магчыма аб'ектыўная ацэнка. Не, няхай яна будзе і суб'ектыўнай, і, напэўна, у большасці ветэранаў яна суб'ектыўная, але без аглядкі на афіцыйную — свая. А гэта самае каштоўнае, у творчасці — асабліва.

11 ліпеня

Маем прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка перамог з вялікім адрывам — за яго прагаласавала 80 прац. тых, хто прыняў учора ўдзел у галасаванні. За каго галасуе мой народ? За палітыку, за ідэю, за праграму — за капіталізм, сацыялізм ці за чалавека, які выявіў сябе толькі ў адным — выступленні супраць карупцыі? Але беды народа не ад карупцыі чыноўнікаў. У развале сацыялізму і павароце да капіталізму, прытым не шведскага,— самага найдзікага, таго, які ў Амерыцы быў 200 гадоў назад.

Я слаба знаю Лукашэнку, не ўнікнуў у яго праграму, тое, што ён казаў у тэледэбатах,— занадта агульнае і мала чым адрозніваецца ад праграмы Кебіча. А ўвогуле, без партый, якія раўняліся б кансерватыўнай і лейбарысцкай, рэспубліканскай і дэмакратычнай — толку не будзе. За прэзідэнтам павінна быць партыя. Інакш ён, звычайны чалавек, будзе паддавацца самым розным уплывам. То на яго будзе ціснуць Ельцын, то Коль ці Клінтан, то свае данілавы.

У Лукашэнкі, безумоўна, характар ёсць, але як ён раскрыецца, якія рысы пераважаць? Ці ёсць мудрасць? Мог бы я быць прэзідэнтам? Не. Я лёгка паддаюся ўплывам. У мяне слабая сіла волі. Добра гэта ці дрэнна? Бог знае.

Ну, дай бог нашаму прэзідэнту мудрасці. У яго абяцанні да канца года вывесці рэспубліку з крызісу я не вельмі веру. Не стала б горш. Быў бы хлеб, газ, электрычнасць, цяпло — і то дзякуй богу. Што пісаць? Гісторыю? Вернасць ідэі, рэлігіі? Ці вар'яцкую сучаснасць? Вагаюся ўжо месяц. А пісаць трэба, пакуль ёсць сіла.

Нейкі Сокал сцёбнуў мяне ў «ЛіМе» за інтэрв'ю, якое я даў дысертанту Мікулічу. Абвініў у падхалімажы Кебічу. Падхалімам я не быў. Выказаў тое, што думаў. У гаспадарчыя здольнасці прэм'ера я верыў. Праўда, што яго выберуць — не верыў, але, каб застацца сумленным перад самім сабой, галасаваў за яго. Кампанію ён вёў бяздарна, каманда падводзіла яго пад манастыр. Апошняя лістоўка перад выбарамі проста правакацыйная. «Благодаря мудрому управлению Кебича». Вялікі і мудры! Жах! Дзякуючы гэтай «мудрасці» ў нас няма таго, што ў Эстоніі, дзе дабрабыт будуецца на кантрабандзе. Няма таталітарызму, як у Туркменіі... Не расстрэльвалі парламент. Такая агітацыя за прэм'ера. Не здзіўлюся, калі МЗС гэтых краін заявяць пратэст.

13 ліпеня

Не заявяць: Кебіч падаў у адстаўку. Зараз мне сказалі па тэлефоне, што ў адстаўку падаў увесь урад. А хто будзе кіраваць да сесіі? Дэмарш? Дзеянні па прынцыпу: чым горш, тым лепш. Дурная палітыка. Ці пражывём 10 дзён і без урада?

На Украіне перамог Кучма. І я парадаваўся гэтаму. Не падабаўся мне пазёр Краўчук: залішне любаваўся сабою. А кражу, багацейшую краіну, якая амаль усё мае сваё, давялі да ручкі. Ці краўчукі, ельцыны давялі? А ці не МВФ? Яго задача — а фонд — гэта тая ж сямёрка — змятаць патэнцыяльных канкурэнтаў. А Расія, Украіна, Казахстан вельмі сур'ёзныя канкурэнты.

Спякота. Халодны чэрвень — 10-14 градусаў. І нясцерпна гарачы ліпень — 28-32 градусы. І холад, і спякота паніжаюць працаздольнасць. Нічога не раблю, вычытаў пасля машынк! «Бумеранг». Але няма актыўнай падрыхтоўкі да будучай работы. «Без пакаяння» (так назваў аповесць пра бізнесмена, які забівае галоднага хлапчука за два батоны) дало дзіўнае адчуванне: быццам сюжэт рэалізаваны. З'яўленне такога адчування раней перапыняла працу над сюжэтамі, часам даволі ўжо распрацаваную — у галаве.

«Алены Іванаўны» баюся. Прачытаў сотні старонак гістарычнай літаратуры — і мала што засталося ў галаве. Дзіравая стала галава. Няма пранікнення ў эпоху. У Брэсцкі мір я пранік. Блізка. На 500 гадоў у глыбіню не пранікаю. Баюся, што дэталі буду браць не з гістарычных даследаванняў (інакш немагчыма), а з раманаў і фільмаў. А гэта прыводзіць да другаснасці. 90 прац. раманаў аб глыбокай гісторыі — не лепшы паўтор таго, што напісана да іх, тымі, хто быў бліжэй да часу. А !ван III і вялікі князь літоўскі Аляксандр — ох, як далека! Аднак трэба ж пісаць, пакуль магу пісаць.

Учора сачыніў пісьмо Юрку Броўку — адказ на яго адкрыты ліст мне, надрукаваны ў «Полымі». Маша ўхваліла: доказна і памяркоўна, нічога не аспрэчваю, але паведамляю тое, што Ю. П. не знае. Дарэмна ён даказвае, што пісьма не было. Пісьмо было. І такі датошны даследчык, як Г. Колас, знойдзе яго. Справа іншая: а ці такое ўжо гэта падзенне Броўкі, Чорнага, Самуйлёнка? Я не чытаў поўны тэкст пісьма. Але тое, што яны паслалі яго ў «Правду», сведчыць, што не было там нічога асаблівага — звычайная тагачасная літаратурная барацьба. Справа іншая, што такія артыкулы давалі падставу сталінска-яжоўска-берыеўскім органам заводзіць крымінальныя справы. Можа, і Кучар тайных пісем у НКУС не пісаў, але па яго артыкулах з абвінавачваннем у варожых класавых пазіцыях пасадзілі не аднаго добрага літаратара.

Цяпер пішуць і друкуюць супраць пісьменнікаў-камуністаў больш брудна і сурова, бескампрамісна, але, дзякуй богу, нікога яшчэ не садзяць. Ні ў нас, ні ў Расіі.

Дарэчы, дзіўна, што гэтая поўная свабода не вельмі раскавала нашага брата, некаторых, наадварот, скавала, Няма тэмы. Людзі сумленныя, аб'ектыўныя, нясмелыя ўвогуле на раздарожжы: яны не дазваляюць сабе паліваць брудам савецкую гісторыю, але не бачаць ніякага ідэалу ў сучаснасці, у скрыпучым неразумным звароце ў капіталізм. Бачаць, што нясе народу гэты капіталізм. Але ў нямногіх хапае смеласці напісаць што-небудзь роўнае маім «Вернісажу» ці «Падзенню». Вось табе і свабода!

Літаратура марнее. Калі не знікне праблема публікацыі, тыражоў, літаратура пачне выраджацца, а за ёй — іншыя віды мастацтва і ўся культура. Такія могуць быць вынікі адраджэння, беларусізацыі.

24 ліпеня

Уважліва слухаў сесію, «каранацыю» Лукашэнкі. Яго перадвыбарная абяцанка-цацанка выклікала гумарыстычныя адносіны. Ведаем мы гэтую гульню, разлічаную на прастакоў. Павышэнне цаны на

гарэлку з 10 тысяч да 30 адразу адвярнула ад яго пітакоў. Адзін ружовы пухір лопнуў. Але справа не ў гэтым. У часе сесіі мая гумарыстычная ўхмылка знікла. О, гэта не наіўны ігрок! Я ўбачыў у ім... Ельцына. Уся тактыка Ельцына 91-га года. Каманду падбірае разумна, хітра. Чаго значыць зварот Кастэнкі, Ягорава! Гэтыя яму будуць служыць — армія і КДБ. Я не знаю Захаранку. Нечаканая фігура. Але, пэўна ж, невыпадковая.

Памёр Уладзіслаў Рубанаў. 42 гады. Таленавіты празаік. Што здарылася? Ехаў на пахаванне і баяўся.

10 жніўня

За тры тыдні выдыхнуў «Без пакаяння» — сто старонак. Працаваў, як нячаста рабіў гэта нават у маладосці: па пяць старонак у дзень выдаваў, па чатыры гадзіны сядзеў за сталом. Але так нельга — наганяў галаўны боль. Нельга ў маім узросце перагружаць мозг, ён склератычны. Па-мойму, атрымалася. Невялікі зрэз сучаснага жыцця: падзенне новых гаспадароў і старых чыноўнікаў — тэма, якая праходзіць у «Падзенні». Утрымаўся ад спакусы пабудаваць дэтэктыўны сюжэт, першапачаткова ўзнікала такая канструкцыя. Сцэна аперацыі патрабуе кансультацыі з хірургамі.

У фінале элемент выпадковасці, хоць логіка падзей непазбежна прыводзіць да смерці Анкуды: турма — банальна. Але іншай смерці я не прыдумаў. Павесіўся? Не страляе. Гэта было. Але там, у «Вернісажы», канчае з жыццём праз павешанне выдатны мастак, расчараваны «дэмакратыяй». Вешаецца забойца — не тое. Сумленне, пакуты яго ганяюць Анкуду на машыне. І ён павінен быў загінуць у машыне. Хто іграе са смерцю, таго яна падсцерагае на кожным крутым павароце. Сцэна кінематаграфічная — аварыя на мосце.

Цікавы гэта працэс — канструяванне сюжэта. Мала хто з практыкаў раскрыў спружыны сюжэтаўтварэння. Тэарэтыкі напісалі нямала цікавага, але, бадай, галоўнага не сказапі. Чытаю Эрыка ван Ластбейдэра — раман «Ніндзя». Дэтэктыў. Добры дэтэктыў, разумны, псіхалагічны. Вызначэнне жанру — «остросюжетный роман». Думаю, гэта не аўтарскае вызначэнне—нашых выдаўцоў, каб даражэй прадаць.

Памёр Алесь Асіпенка. Сябрамі мы не былі, але я перажываю яго смерць. Мяне балюча раніць канчына маіх калег, ветэранаў вайны — асабліва. Алесь быу харошы партызан, і партызанскія рэчы яго вартыя сур'ёзнай увагі.

Пасля паўтарамесячнай дзікай спякоты ўрэшце пайшоў дождж. Уначы прагрымела навальніца, а паўгадзіны назад пайшоў ціхі, спор-

ны, абложны. Паправіць хоць бульбу? Па прагнозах: недабор зерневых — 30 прац. Прэзідэнт, якога так дружна падтрымаў народ, рыхтуе яму, народу, шокавую тэрапію: павышэнне цаны на хлеб у 10 разоў, на малако — у 15 разоў.

Да здравствует король!

12 жніўня

Выступіў па ТВ наш прэзідэнт. Мне выступленне падабалася. Ва ўсялякім разе — метад размовы: шчырасць, адкрытасць, даверлівасць. Хоць ёсць перабор: аб сустрэчы з Ельцыным і Чарнамырдзіным. Уражанне такое, што Расію адкрыў ён і што без Расіі выйсця няма.

Аб павышэнні цэн на хлеб і малако прэзідэнт гаварыў доказна. Але ў тое, што ён (адзін ён!) за 6-8 месяцаў выведзе краіну з крызісу, я, грэшны, суровы рэаліст, не веру. І што Ельцын — добры і спагадлівы і гатовы ўсім памагчы няшчасным беларусам. Ой, ці так? Памылка Аляксандра Рыгоравіча: замяняць мінчан магіляўчанамі. Небяспечная памылка.

14 жніўня

Прачытаў у «Правде» інтэрв'ю Зюганава. «Не хочу, чтобы на Россию смотрели, как на побежденную страну». Чалавек Зюганаў разумны, раней я недаацэньваў яго. Але па вучэнню Леніна — апартуніст, які цалкам адмаўляе класавую барацьбу. Што такое класавая барацьба ў наш час? Зюганаў ні слова пра яе. Але калі няма класавай, то якая барацьба ёсць? Без барацьбы не будзе руху. Зюганаў гаворыць: «Сейчас качественно новый этап — этап борьбы структур. Организаций. Технологий. Программ. И это требует сплочение сил тех, за кем есть соответствующий капитал. Научная школа. Промышленно-производственная структура. Солидная партия. Или какойто экономический союз». Вось так. Першы камуніст апраўдвае амерыканскі, еўрапейскі, японскі капіталізм: яны маюць усё, што ён пералічыў. Між іншым, лепшы публіцыст, камуніст Сяргей Кара-Мурза адкрыта называе Зюганава апартуністам.

Кара-Мурза — малайчына! У невялікіх артыкулах ён робіць цэлыя адкрыцці. Во артыкул «В кого целится прошлое?». Для мяне было адкрыццём:

«Ведь катастрофа коллективизации была вызвана тем, что селу вместо артели была навязана модель кибуца, разработанная перед первой мировой войной сионистами-трудовиками для колонизации Палестины. Эта их разработка и сегодня по праву считается блес-

тящим социально-инженерным проектом, но делался он не для русского крестьянина, а для горожанина-колониста-еврея».

Закід сённяшняй апазіцыі — Зюганаву, Шафарэвічу, Зоркіну: «Тот факт, что никто из оппозиции не хочет в эту проблему лезть, прискорбен».

І — высокая ацэнка мудрасці сялян:

«Насколько честнее молчаливая позиция самих крестьян! Они переболели колхозами, сдвинули их к артели, не поставили свои жертвы в пику сталинизму, абманули надежды гитлеровских психологов».

І дакладнае тлумачэнне прычын 1937 года:

«Но жертвы села не могли быть забыты, они вскрыли и затянувшиеся было раны гражданской войны. Резонанс этих двух ударов по крестьянской России породил ту скрытую волну ярости, которая прорвалась в 37-м году. Ведь главное-то в этом феномене не то, что Сталин перед войной решил устранить всю находившуюся в оппозиции номенклатуру, а то, что массы это поддержали с необъяснимой страстью. Но с необъяснимой ли? Разве не подумали многие, что пришла наконец расплата военным преступникам гражданской и палачам крестьян в коллективизацию?»

Кара-Мурза папярэджвае, што калі не зрабіць вывадаў, «то не меньше невиновных пострадает и в будущем, когда в потерявшей новые миллионы жизней России будут судить нынешних революционеров. Вот когда окаянное прошлое выстрелит из пушки».

18 жніўня

Тайны таленту... Пачаў чытаць Рэмізава, мала чытаў раней. Чытаць немагчыма. А быў жа велічыня! Між іншым, складальнік і аўтар прадмовы паведамляе, што ў эміграцыі Рэмізаў выдаў 45 кніг, а пры складанні аднатомніка з гэтых 45 кніг нельга было выбраць ніводнага твора. Вось такая яна, эмігранцкая літаратура! Руская. Праўда, быў там Бунін, Набокаў, Зайцаў... Мережкоўскага я таксама не мог чытаць — нецікава. Прачытаў «Лолиту» Набокава. Спекулятыўная рэч. У класічных літаратурах забароненая тэма: растление малолетней. Набокаў знаў норавы Захаду, знаў кніжны рынак, знаў, на чым можна зарабіць. І зарабіў на «Лолите».

А што гаварыць пра эміграцыю беларускую? Дарэмна яе Сачанка і іншыя рэаніміруюць. Мёртванароджаная. Паэзія — на ўзроўні нашаніўскай — без Купалы, Коласа і Багдановіча, Арсеньева ніжэй Буйлы. Прозы няма. П'еса Сяднёва па-за літаратурай. Прачытаў рэцэнзію Алеся Марціновіча на адна томнік Янкі Юхнаўца. Безумоўна,

крытык цытуе лепшае. Але некалькі цытат здаліся паэзіяй. Трэба прачытаць кнігу.

В. Верасаева чытаў многа. Падабалася. Знайшоў у дачнай бібліятэцы аднатомнік. Апавяданне «В степи» зрабіла ўражанне. Пачаў чытаць аповесць «Без дороги». Першую частку — герой-урач прыязджае ў маёнтак да сваякоў, плавае з паненкамі на лодцы цэлую ноч — ледзьве праглынуў: даўжэзны і неабавязковы дыялог, цікавасць прыйшла ў другой частцы, калі доктар добраахвотна едзе на барацьбу з халерай і цёмныя мужыкі, якія лічаць, што ўсё зло — ад дактароў, да смерці збіваюць няшчаснага Дзмітрыя.

А вось Уілкі Колінз чытаецца — «Женщина в белом». Падрабязнейшае апісанне традыцыйных для літаратуры XIX стагоддзя сітуацый: пра адно і тое ж расказваюць розныя людзі - такая, здавалася б, неэканомная кампазіцыя. Мноства дыялога. А чытаецца. Во загадка.

Паездка Чычыкава па мёртвыя душы. Аднастайна і нудна была б апісана многімі літаратарамі. У Гогаля — не адарвацца. Але ёсць і феномен Дастаеўскага. Асобна ўзятыя раздзелы—у радавога чытача скулы перавернуцца ад пазяхання. А гэтыя ж раздзелы ў цэлым — карціна, ад якой дух займае.

Мая тэорыя, якой я трымаўся: у рамане кожны раздзел будаваць, як навелу: завязка, кампазіцыя, развязка, але кампанаваць раздзелы так, каб была агульная завязка, агульная развязка. Кульмінацыйных вяршынь можа быць некалькі. У «Снежных зімах» — кульмінацыя «ваенная», кульмінацыя «мірная», і ў Антанюка і ў Надзі.

27 жніўня

Во да чаго дажыла «дэмакратыя»!

У «Новай народнай газеце» яе галоўны рэдактар Наталля Машэрава выступіла з артикулам «Не страляйце ў Машэрава», у якім з болем за бацьку абараняе яго. Пятра. Міронавіча ў выступленні па радыё аплявaў известный поэт. Цікава — хто? Наталля далікатна нават не назвала імя «известного поэта». Невялікі прыстойны артыкул. І хто ж абараняе паэта? І як! У нумары за 23.VIII «ННГ» дае факсімільна пісьмо, якое ёй прыслалі. Не магу не прывесці яго. Во што пішуць «змагары за Беларусь»: «Не паскудзь зямлю нашу, падла. Каб не была ты бабай, тупой, нахабнай, вартай свайго татачкі лярвай, мы даўно заткнулі б тваё чырвонае хайла. Але ты баба. Нават і не яна, а нешта сярэдняе. Пакінь ты ў спакоі свайго радзіцеля, палітэса сраная. Ты ж два словы звязаць не можаш, а лезеш. Куды ты лезеш? Зразумей, што да пары збан ваду носіць. *Мінаецца ваш час*, свалата савецкая. Ду-

дзіце, пэўныя, што мы ўрэшце паставім вас на месца. А не захочаце стаяць — павесім. За ногі. Як некалі Мусаліні.

Беларусь альбо смерць!!!

Беларуская нац. арг.
«Правы рэванш»

Словы, якія я падкрэсліў, падкрэслены ў арыгінале пісьма, газета дала факсімільны тэкст.

Вось так! «ННГ» дала прэс-рэліз «Правага рэваншу» — іх праграму. І зварот — да народа, да прэідэнта, ВС, кабінета міністраў, да лідэраў усіх партый. І адказы людзей, кіраўнікоў партый: «Фашизм в Беларуси — это реальность?» Большасць адказваюць: немагчымы.

Жанчына 35 гадоў:

«Думаю, возможен. Люди обозлились сейчас, о других не думают. Но не дай бог!»

БНФ — В. Івашкевіч: разаўецца фашызм ці не — гэта залежыць ад таго, наколькі беларускай будзе ўлада!

ПКБ — В. Чыкін: «Возможен. И элементы его просматриваются, скажем, если не в программе, то в некоторых заявлениях лидеров Белорусского народного фронта».

Магчымы ці немагчымы ў нас фашызм — адказаць, думаю, аднозначна немагчыма. Мяркую, што аўтарам пісьма Н. П. Машэравай да ўлады не прабіцца. Але фашызм шматлікі. Нават фашызм Гітлера і Мусаліні розніўся. А цяпер маецца мноства мадыфікацый і адценняў фашысцкай філасофіі.

Безумоўна адно: ён магчымы там, дзе народ галадае. Калі людзей давядуць да голаду, тады можа вылезці ў фюрэры любы дэмагог.

Я быў у паніцы ўвосень 1992 года: ідзём у голад і холад. Цяжка, але перажылі. Наступае восень 1994 года, і настрой мой далека не аптымістычны.

Я пісаў, што мне спадабалася выступление прэзідэнта па тэлебачанні, акрамя абяцання за 6-8 месяцаў вывесці рэспубліку з крызісу: мастацкі свіст! Але такім жа свістам аказалася і яго запэўненне, што павышэнне цэн на хлеб будзе апошнім павышэннем. Не прайшло два тыдні — рэзкае павышэнне на гарэлку.

Згодзен з аўтарам артыкула ў «Звяздзе» Ігарам Карнеем: «Неабдуманыя крокі асобных чыноўнікаў ад улады выклікаюць не толькі буру пралетарскага гневу, але і ўражваюць поўнай адсутнасцю логікі».

Так! Неразумнее павышэнне цэн у Расіі прывяло да заняпаду самай прыбытковай галіны айчыннай прамысловасці. Як антыалкагольная кампанія падарвала эканоміку СССР, так цэны на гарэлку падрываюць наш бюджэт. Карней піша: «Расія аказалася літаральна

залітай таннай гарэлкай з Польшчы, Беларусі, Украіны, Кітая. А мы ўжо заліты імпартам. А пры сітуацыі, калі дарагая руская гарэлка сёння стала ў тры разы танней за беларускую...» На каго ж мы працуем?!

А прэзідэнт ператвараецца ў тэлезорку. З Каравулавым гутарыў тры з палавінай гадзіны. Знайшоў час! Расія пакажа «Момант ісціны» 5 верасня, а наша — заўтра. А 31 жніўня — чарговы зварот да тэлегледачоў.

Сяджу без грошай, нягледзячы на павышэнне пенсіі. З'еў яе, пенсію, за 10 дзён — усе на дачы. Мусіў прасіць дапамогі ў Літфонду. Разважыў: цяпер яны зарабляюць на тым, што здаюць Дом літаратара ў арэнду. А я ж яго будаваў. Столькі сілы аддаў. Самога Машэрава выцягнуў на будаўніцтва. Дык чаму не мець кроплю ад арэнды?

А ўвогуле, цяжкі гэта стан — збядненне пасля адноснага багацця. Тое, што зрабілі з укладамі,— грабеж, які нельга дараваць.

29 жніўня

Учора перадалі гутарку Лукашэнкі з Каравулавым. Што ж, прэзідэнт наш псіхолаг, ён знае, чым узяць слухача. Нават такі тэлевізійны зубр, як Андрэй Каравулаў, клюнуў на яго шчырасць. У заключэнні ён, тэлекаментатар, спытаў: «Якая сволач выдумала, што вы беларускі Жырыноўскі?»

На гэта пытанне Лукашэнка адказаў хітра — Вульфавіча не пакрыўдзіў.

А ў мяне захапленне, якое было з'явілася, пачынае падаць. Не да нуля, але да адзнакі... рэальнай ацэнкі.

23.VIII я быў на прыёме ў украінскага пасла У. Жалібы. Першае ўражанне. Раней на такіх прыёмах было не менеў як 50 прац. знаёмых. На гэтым — 10-15. Пісьменнікі, мастакі, тры міністры. Астатнія — незнаёмыя, маладыя. Новая каманда. Спецыялісты? Можа, па адукацыі. А па вопыту работы? Маладыя дылетанты. А дылетанства можна схаваць у палітыцы. У эканоміцы вылезе. І ўжо вылазіць.

Перад прыёмам мне пазваніў Іван Навуменка амаль у паніцы: не выходзяць часопісы, а ў яго ў 7 нумары «Полымя» аповесць — трэцяя частка трылогіі пра маленства і юнацтва. Разумею: нявыхад часопісаў — катастрофа для нас і смяртэльны ўдар па беларускай літаратуры. Хоць некаторыя да гэтага адносяцца спакойна. Іван Чыгрынаў там, на прыёме, на маю трывогу адказаў: «А ў мяне п'еса ў сёмым». Не выявіў трывогі і Васіль Зуёнак. Я сказаў Івану: «З тваім настроем ты мне не памочнік у размове з Ганчаром». Але да Ганчара ён пайшоў і падтрымаў мяне. Намеснік прэм'ера здзівіўся: «Першы раз чую, разбяруся».

Разбярэцца, можа, калі напомняць памочнікі. А памочнікам, падобна, не да гэтага: яны асвойваюць, прымяраюць мяккія крэслы. Што ім да часопісаў, да лесу Шамякіна, Навуменкі і іншых! Ды і да беларускай літаратуры, якую мала хто з іх чытае. Праўда, цяпер і рускую не чытаюць. «Новый мир» з 2 мільёнаў экземпляраў з'ехаў да 20 тысяч. На вялікую Расію, на СНД, на ўвесь свет. Даехалі. І спыніцца не можам.

31 жніўня

Глядзеў вывад нашых войск з Германіі — развітанне ў Трэптаў-парку, развітанне з 660 тысячамі нашых воінаў, што ляжаць у нямецкай зямлі. Цырымонія падаецца як урачыстасць, свята. А мне плакаць хацелася. Для немцаў — урачыстасць, так, яны — пераможцы. Для нас — жалоба, ганьба, прызнанне свайго паражэння. Я не за тое, каб расійскія войскі заставаліся на чужой зямлі. Хопіць! Але навошта з гэтага рабіць шоу? Парадаваць немцаў і амерыканцаў? Думаю, што нават французы не будуць радавацца.

Абурыла ў выступление Ельцына поўнае забыццё, што ваявалі не адны рускія, не толькі расіяне палеглі ў вайне. А дзе ўкраінцы, беларусы, узбекі? Так цяжка яму было вымавіць Савецкі Саюз, нават з пітэтам былы.

У сённяшнім нумары «Известий» Ота Лаціс (яшчэ адзін пярэварацень) даказвае, як разараўся СССР ад прысутнасці нашых войск у Германіі, Польшчы, Афганістане, на Кубе. Але не разарыўся, Разарылі яго, калі пачалі выводзіць войскі. Вывад з Германіі — падпісанне акта аб капітуляцыі: Ельцына перад Колем. Але немцы хітра захоўваюць знешнюю прыстойнасць. А эстонцы, латышы яшчэ і хамяць.

1 верасня

Пачынаецца восень. Сумна. Сумна без творчасці. Хочацца пісаць! «Алену Іванаўну»? Не пранікнуў я ў старажытнасць. Трэба больш прачытаць аб тым часе.

Часам апаноўвае роспач. Перажыў яе два дні назад. Прычына — дробязь. Даўно ведаў, што са школьнай праграмы знялі «Трывожнае шчасце». Не ведаў — чым замянілі. Выпадкова сустрэў Васіля Уладзіміравіча Івашына. Яму 81, але яшчэ робіць у інстытуце, які раней называўся інстытутам педагогікі. Ад яго даведаўся, што праграмай займалася не міністэрства — іх інстытут. «Гэта Крот памяняў»,— сказаў Івашын. Пазваніў М. А. Лазаруку, дырэктару, ён у бальніцы.

І гэта дробязь завяла. Кандыдат навук выкідае з праграмы добрую кнігу, патрыятычную — тое, што трэба моладзі. Ды такой

праўды аб першых пасляваенных гадах, як у аповесці «Мост», ніхто і зараз не напісаў! Што ж не спадабалася Кроту? І нават цяпер, калі мне ўчора пазваніў Лазарук і паведаміў, што «Трывожнае шчасце» замянілі на «Сэрца на далоні» і «Ахвяры», логікі ў такой замене не бачу.

І Гукана, і Золатава трэба «раскрываць», тлумачыць. Кожны настаўнік вытлумачыць? І кожны вучань зразумее складанасць і трагізм вобраза Гукана. Золатаў — прасцей. А Кідала і Булатаў зразумелы, ды і крытыка добра раскрыла іх.

Пра «Ахвяры» настаўнік нічога не знойдзе. Ды і саму кнігу не знойдуць: адно выданне невялікім тыражом.

Але гэтая гадзіна роспачы цяпер радуе своеасабліва. Радуе тым, што я яшчэ не абыякавы да лесу сваіх «дзяцей» — твораў. Мне яшчэ хочацца, каб іх чыталі, вывучалі. А гэтае, няхай сабе, па-руску кажучы, і тщеславное жаданне — магутны стымул для творчасці. Поўная абыякавасць спаліла б гэты стымул. Пэўным стымулам быў заробак, ганарар, які даваў дабрабыт. Але цяпер, калі ганарар мала што дадае да пенсіі, роля яго знізілася да ніжэйшай адзнакі. Цяпер ужо цвёрда знаеш: колькі ні пішы — не разбагацееш. Дык павінен жа быць маральны стымул! Прага славы, вядомасці была ў маладосці магутным рухавіком. З гадамі яна аслабла. Якая слава? Смешна! Была, ды сплыла.

Раней я ахвотна выступаў перад чытачамі. Цяпер — аніякага жадання. Але, відаць, трэба сябе перамагаць.

Учора А. Лукашэнка зноў сустракаўся з тэлегледачамі. Любіць чалавек экран. Не асуджаю, у яго гады і я любіў. Гаворыць ён шчыра. Але ў гэты раз здалося мне, што не пра самае галоўнае. Бярэ слухача на лёгкую нажыўку. Але не варта забываць, што на чарвяка клюе плотка. А ёсць жа і «акуні», і «шчупакі». І «акулы». Ёсць «акулы», іх трэба браць на добрага жыўца!

Прэзідэнту прыслалі пытанне: «Чаму падбірае ў каманду магіляўчан?»

Я адчуваў, што такое пытанне будзе. Але я не задаў бы яго. А вось чаму беларуса Гайсёнка ён замяніў на рускага Стражава, на міністра адукацыі і навукі — такое пытанне ўзнікне не толькі ў мяне — ва ўсіх шчырых беларусаў. Я толькі сёння з яго інтэрв'ю ў «Звяздзе» даведаўся, што В. І. Стражаў — рускі, растоўскі. Не знайшлося беларуса? Тут у прэзідэнта яўна асечка. І нашы дарагія нацыяналісты яму за гэта ўкінуць «чорныя шары». Ён, па-мойму, залішне заварожаны 82 прац., паўтарае іх. Але нацыянальную палітыку робяць не магілёўскія сяляне і мінскія рабочыя, яе робяць інтэлігенты. А нацыя-

нальная інтэлігенцыя — народ апантаны. Адступленне ад нацыянальнага свайму, можа, і маглі б дараваць, рускаму не даруюць.

4 верасня

Сёння па-летняму цёпла. Прыехалі дзеці. Узняўся настрой. Бяздзейнічаю, а час ляціць. У змрочныя дні, калі не пішу, час цягнецца аднастайна, нудна. Часам хочацца, каб хутчэй скончыўся такі дзень. А потым думаеш: а навошта — хутчэй? Куды спяшаешся, Іван? У магілу? Добра, каб дні цягнуліся доўга і біялагічныя працэсы старэння каб не паспяшаліся. Адчуванне дваякае: часам — нішто, а часам чую сябе старым і нямоглым. Паўнею. Ад мучнога і бульбы. На каўбасу і мяса грошай не хапае. На такім меню сядзелі з Машай і Лінай у Пракопаўцы ў 1945-1948 гг. Прыехалі ў жніўні 1948-га ў Мінск і акунуліся ў изобилие. Колькі было самых разнастайных каўбас! Цяпер чую іх пах! Кракаўская, палтаўская, маскоўская... Ікра, рыба, крабы. Еш — не хачу. Адкуль узялося праз тры гады пасля вайны? Мала куплялі? У людзей не было грошай? Часткова так. Сяляне сядзелі на галодным пайку. А — рабочыя нічога. За 1200 руб. стыпендыі, якія я атрымоўваў у партшколе, можна было нябедна жыць нам, чацвярым — нарадзілася Таццяна.

Цікава і другое: цэны на гэтыя каўбасы зніжаліся штогод. Ва ўсялякім разе з 1954-1955 гг. да 1990-га цэны на прадукты масавага ўжытку не павышаліся, толькі на далікатэсы. А сёння? Наш прэзідэнт з экрана тэлевізараў абвяшчае, што гэта (на хлеб) апошняе павышэнне, і праз тыдзень рэзкі скачок — на гарэлку, пасля — на бензін і тут жа — кватэрная плата і плата за электрычнасць, газ, ваду, цяпло. Жыць стала лепей, жыць стала весялей! І кожны разумнік, які сядзіць ля кармушкі, тлумачыць, што, маўляў, гэтыя цэны пакрываюць расходы на 10-15 прац. Гэта гаварыў мой сябра міністр сувязі І. М. Грыцук. І ніхто, ні адзін эканаміст не можа растлумачыць: а як жа пры камуністах было, адкуль браліся грошы на сельскую гаспадарку, на будаўніцтва жылля, школ, заводаў, на пакрыццё датацый на камунальныя паслугі, на сувязь, транспарт. Пры тых расходах на абарону!

Але аб гэтым я пісаў. Што з таго? Аб гэтым можна прачытаць у «Правде», якую не пускаюць да нас, у «Мы и время». Але хто чытае такія выданні? Аб гэтым... аб фактах. Але мала асэнсавання ўсіх фактаў. І страшная зацыкленасць некаторых людзей, нават адукаваных, разумных.

Учора былі на магіле Сашы. І так мне стала горка, балюча, як не было ўжо даўно.

10 верасня

8-га быў дзень нараджэння Сашы. Ездзілі на могілкі. 12-га — дзень смерці. Тры гады ляжыць наш сын. Балюча... Каля магілы асабліва балюча. У свядомасці ён усё яшчэ жывы. Змірыцца са смерцю немагчыма. Хто сустракае яе з філасофскім спакоем? Манахі? Самазабойцы? Салдаты на вайне? Магчыма, толькі салдаты. Ідуць жа на верную смерць. Але перад атакай ядуць, п'юць, жартуюць. Я не забываю страх першага дня вайны. І за яго мне не сорамна. І я, бадай, лічу сябе героем, што пасля, праз усю вайну, я не адчуваў страху. Падалі недалёка бомбы, і — хоць бы хны. Інстынкт самааховы, канешне, быў, але страху — ніякага. Прывычка? А цяпер, пражыўшы 74 гады, я баюся смерці. Сорамна прызнавацца? Не, не сорамна. Леў Талстой і ў 82 баяўся. Уцякаў ён не ад Соф'і Андрэеўны, уцякаў ад смерці.

«Горад мёртвых» — могілкі гнятуць мяне, што магільныя пліты. Праўда, адчуванне гэтае рознае — рознай напружанасці: адзін раз вельмі змрочнае, у другі — па-філасофску разважлівае, а то і зусім гумарыстычнае — гумар вісельніка.

Па-мойму, страх смерці гнаў старых, асабліва інтэлігентаў (ніводзін селянін не можа столькі награшыць, колькі той, хто робіць кар'еру галавой), у манастыр, у скіты, прымушаў прымаць схіму. Але, пэўна, у гэтым была мудрасць: чалавек аддаляўся ад грэшных зямных клопатаў, сам сябе забяспечваў самым неабходным — хлебам і вадой — і нічога не хацеў ведаць. Ці зліваўся ён з прыродай? Ці не адыходзіў ён ад чалавечага, не ператвараўся ў жывёліну? Маліўся? Але малітва вельмі звужае свет. А вось мне, старому, хочацца яшчэ ўсё пазнаваць. Людзей, зямлю, космас. З якой прагнасцю гляджу «Падводную адысею капітана Кусто». Між іншым, Кусто гэты ў маім узросце рабіў падводныя здымкі. Дык, можа, вось такім павінна быць жыццё. Да апошняга дыхання.

Жыву палітыкай, літаратурай, кіно. Жыву жыццём народа, хварэю за яго беды. Здзіўляюся тым, хто ў эйфарыі ад таго, што адбылося, ад развалу Саюза. Па-мойму, у такой зйфарыі — сытыя. Бытие определяет сознание. Формула дасканалая і неаспрэчная.

Прачытаў у «Звяздзе» драму !вана Чыгрынава «Чыстыя рэкі, мутныя воды». Слаба. Рэгістрацыя факта. І што асабліва здзіўляе — на патрэбу дня: надрукаваў да 480-й гадавіны бітвы пад Оршай. Мне дзіўна, як з мухі стараюцца зрабіць слана. Дзеля чаго? А калі рускія ў адказ падлічаць, колькі разоў Масковія біла Літву? Незлічона. Ды і ўвогуле смешна выцягваць факты 500-гадовай даўнасці. Па гэтай логіцы можна перакроіць карту свету. Мала дзе былі межы 1000-500 гадоў назад! Мала хто пабіў каго ў сівой старажытнасці!

Пра гістарычную літаратуру. Па-мойму, найлепшы прынцып — Шэкспіра: гістарычнай праўды мала, але сюжэт, чалавечыя страсці, характары! Талстой не прынімаў Шэкспіра за няпраўду. Але Гамлет, Макбет, Лір жывуць 500 гадоў і будуць жыць. Па гэтаму прынцыпу тварылі многія, у тым ліку наш Караткевіч. Дыялогі герояў даўніны, якія сачыняе Чыгрынаў, не пераканаюць і вучня. Пераканалі б пакуты, долі, радасці Васілія, Казіміра, Чалядніна, Астрожскага... А іх няма. Ёсць рэгістрацыя факта. А пісьменнік таленавіты — Іван Чыгрынаў. Характар складаны.

11 верасня

Да ўчарашніх разважанняў. Прачытаў у «Известиях» інтэрв'ю Франсуа Мітэрана. У яго рак, і ён не знае пра гэта, дзве аперацыі перанёс. Аднак прадаўжае выконваць абавязкі прэзідэнта і спадзяецца дапрацаваць да сканчэння тэрміну — да мая 1995 года.

Пытанне карэспандэнта: «Не облегчит ли вам встречу со смертью то, что вы всю жизнь о ней думали?»

Мітэран: «Эта перспектива ждет каждого из нас, и поэтому не стоит ее страшиться. Я знаю, что перестану существовать через несколько месяцев или лет. Однако меня беспокоит не то, что я умру, а то, что перестану жить» (курсіў мой). Памойму, дакладна: страшыць не смерць — небыццё. Свет будзе існаваць, людзі будуць жыць, а цябе не будзе. Шчаслівыя тыя, што вераць у загробную жизнь. Геніяльная прыдумка рэлігійных філосафаў. Толькі ніхто з іх толкам не расказаў, якое яно тое жыццё.

А мяне сёння спалохала дробязь. Учора трохі выпіў з зяцем і ўнукам. Вячаслаў ездзіў з цешчай у Нясвіж, да Тамары, яна забяспечвае бульбай, прывезлі свежаніны. Пад свежаніну грэх не выпіць. І колькі я там выпіў! Асцярагаюся. Пасля глядзеў фільм, з цікавасцю, не спаў. А сёння прачнуўся, падумаў: пра што фільм? І не мог успомніць нават тэму, хоць папярэдні фільм, паказаны ўчора,— «Дзве жанчыны» з Сафі Ларэн добра помню, да дэталяў.

Нядобры сімптом. Што адбылося? Сімптомы аслаблення памяці ёсць, даўно лаўлю сябе на тым, што даўно мінулае помню, учарашняе не помню. Але каб забыўся тэму фільма — да гэтага яшчэ не даходзіла.

Званю часам Максіму Танку і дзіўлюся яго памяці: помніць усё, што прачытаў за тыдзень-два. А чытае многа. І яму 82. Праўда, жыў ён цвяроза, як мала хто з нашага брата.

Іду глядзець адысею Кусто.

21 верасня

Прачытаў кнігу Вольгі Івінскай «В плену времени». Івінская — палюбоўніца Барыса Пастарнака, але галоўнае — добры літаратар, перакладчык, па-мойму, прачытаў між радкамі, ды і сама яна піша, што яе абвінавацілі ў гэтым пасля смерці Б. П. Многія пераклады паэзіі рабіла яна, не Пастарнак; нямала перакладаў з дзесятка моў выдадзены і пад яе прозвішчам. Кнігу яна напісала выдатную, калі цаніць аб'ектыўна.

Гісторыя яе сувязі з Пастарнакам, каханне іх і асабліва гісторыя «Доктара Жывага» і яе дзвюх пасадак — за Пастарнака — чытаецца, як найлепшы раман, лепш за любы дэтэктыў. Ды і гісторыі па сутнасці дэтэктыўныя. Па-мойму, другой кнігі, якая так бы изобличала дурноту нашых партийных босаў і бяздарнасць органаў, няма.

Баючыся пасадзіць Пастарнака — фігура! — яны, ідыёты, садзяць яго палюбоўніцу, жанчыну, у якой двое дзяцей ад двух мужоў. Бабачка яна, відаць, тая; адзін муж пусціў сабе кулю ў лоб. Але юрлівасць — не прычына для пасадкі. А ў час смерці Б. П. ёй было ўжо пад 50. І пасадзілі яе і дачку яе Ірыну за тое, што яны прынялі ад замежнікаў грошы за «Жывага...», ганарар. Нават не ў валюце — у рублях. Во дзікунства! Горш за сярэднявечча: тады за законна атрыманыя грошы нікога не пасадзілі б.

Хораша Вольга Усеваладаўна сцёбнула па некаторых «сябрах» Пастарнака, якіх цяпер выдаюць за святых.

Ну, Суркоў — зразумела: камуніст. Але ганебнейшым чынам паводзілі сябе ў гісторыі з «Доктарам Жывага» Катаеў, Слуцкі, Салаухін, Мартынаў... І беспартыйны Федзін. Трусы!

Сам Пастарнак таксама быў трусаваты, але яго «заводзілі», яго хораша маральна падтрымлівала дваранка івінская, якая савецкую ўладу не любіла гэтак жа, як і Пастарнак. Але ў Б. П. трусасць была тыпова яўрэйская. А мужнасць Івінскай — руская, дваранская.як у Цвятаевай, Ахматавай. Ахматава была па-жаночы больш мудрая, абачлівая, асцярожная. Хораша Івінская піша аб гэтых дзвюх пакутніцах рускай літаратуры. Трагізм жыцця і смерці Марыны глыбока кранае.

50 гадоў «Неману». Г. Бубнаў папрасіў напісаць колькі старонак да юбілею. Пазаўчора-ўчора напісаў старонак 10. Успомніў асобныя штрыхі рэдактарскай дзейнасці Андрэя. Здзівіўся, што не прыгадаў іх, калі пісаў «Тайну драмы (Аповесць пра сябра)». Пра Андрэя можна яшчэ многа што сказаць. Дватры эскізна напісаныя эпізоды дапоўнілі «Аповесць».

23 верасня

Вольга Івінская прыводзіць словы Канстанціна Паўстоўскага ў сувязі з гісторыяй «Жывага...»: «Кому-то, очевидно, было выгодно гонением на Пастернака подорвать авторитет советской власти и выставить на осмеяние. Или выгодно в этом дутом деле доказать свою верноподданность». Што датычыць другога, то тут, безумоўна, даказалі гэта Катаевы і слуцкія. Але з пазіцый сённяшняга дня ўяўляецца вельмі трапнае першае вызначэнне — «подорваць» і «выставить на осмеяние». Колькі было ў верхніх эшалонах якаўлевых, ельцыных, валкагонавых. І, пэўна, нямала яны рабілі, каб выставіць сваю краіну на сусветнае асмяянне, прадставіць яе імперыяй зла. Няма сумнення, што нашы тут пастараліся не менш за Бжэзінскага. І за Гебельса, тады, да вайны яшчэ. Калі цяпер ворагаў Саветаў і камунізму вылезла, што заразных пацукоў, то колькі ж іх было ў 20-30 гадах! Сурова асуджаю рэпрэсіі. Але часам думаю: а без чысткі мы не маглі б рухнуць у 1929, 1937, 1941 гадах? А ў вайну, напэўна, Саюз развалiўся б у першыя ж месяцы. І мы сталі б нямецкай калоніяй. З Амерыкай Гітлер дамовіўся б, каб у яго лапах апынуліся Расія, Украіна, Польшча, уся Еўропа, не радавалася б і Вялікабрытанія; англічан ратавалі мы, Чэрчыль у мемуарах не піша пра гэта адкрыта, але разумев, і ў падтэксце я чытаў яго ўдзячнасць рускім.

Так што Саюз разбуралі знутры.

Талісме Насрын, 32-гадовая пісьменніца-феміністка з Бангладэш у інтэрв'ю выказала сваю думку пра Каран. Стотысячны мітынг мусульман патрабаваў яе смерці. Але ёй удалося вылецець у Швецыю.

Сам па сабе цікавы факт: як мы залежым ад усяго — пісьменнікі. Але я з усмешкай падумаў пра іншае: Насрын удалося паляцець у Швецыю. А я каб, не дай божа, прыйшлося ўцякаць ад «дэмакратаў», не меў бы за што даехаць да Вільнюса.

Дзіўна. Такі я папулярны быў, столькі мне пісалі, запрашалі, а цяпер у беспрасветнай прасторы. Павіс. Апынуўся вне времени: выйшаў з аднаго часу... гадзіннікавага пояса і не ўступіў у другі. Узнікае такая сітуацыя?

1 кастрычніка

Учора быў на прыёме ў кітайскага пасла. Кітайцы сабралі людзей па маштабах сваёй краіны — чалавек 500. 45-я гадавіна ўтварэння КНР — падзея! Калі Кітай выстаіць перад Амерыкай, сацыялізм пераможа, будучыня будзе за сацыялізмам. Можа, у вярхушцы КНР няма гарбачовых, ельцыных. Ці ўмеюць купіць любога?

Гарэлку нашу выпілі ўміг, закусі хапала.

Для мяне было праблемай даехаць да Ждановіч. Папрасіў Ягорава, старшыню КДБ. Той даў сваю «вольву».

3.X — прыём у немцаў. Не паеду. Аб'яднанне Германій для мяне — дзень жалобы, нашага паражэння, а не ўрачыстасці.

З кастрычніка

«ЛіМ» чытаю не вельмі акуратна: выпісвае Таццяна, перасылае са спазненнем; цяпер, па беднасці, мы не дубліруем выданні: раней яна выпісвала 30 розных газет і часопісаў, я — 15. Былі часы! Але ўчора прачытаў нумар за 23 верасня. Адчуванне гэтае было даўно, замацавалася цвёрда. Тыднёвік застыў, замарозіўся на антыкамунізме і антысаветызме 1990-1991 гадоў. А час ляцеў. Мяняліся каштоўнасці і погляды, мяняліся людзі. Дзіўна. Сёння гучыць глупствам ганіць усё, што было: эканоміку, культуру, узровень жыцця народа, і хваліць, узносіць той рай, у які ўступім. Але ніяк не ўступаем. І аўтары не задаюць сабе пытанне: чаму не ўступаем? Чаму развал працягваецца? Дзіўна і крыўдна, што пісьменніцкая газета не хоча бачыць, як жывуць людзі і што яны думаюць пра рай, які ім абяцалі. Газеты зацыкліліся на антысаветызме, і аўтары не бачаць далей свайго носа. Няўжо рэдактары і аўтары такія шчаслівыя? Чатыры сотні актыўных пісьменнікаў, і ніхто не піша пра сённяшняе жыццё народа. Такой заідэалагізаванасці не было, бадай, і пры Сталіне. Баяцца, што не надрукуюць? Нас маглі пасадзіць, і мы ўсё ж адважваліся на некаторую праўду. Раман «У добры час» (1949-1953) . ...Агульны фон, безумоўна ружовы. Але ў дэталях — праўда. Зямлянкі, бульбіна на закуску, непасільная праца — аруць на сабе — і шмат іншага. Недарэмна работнік ЦК артадокс Войніч назваў гэта паклёпам на калгасную рэчаіснасць.

Няўжо з 400 чалавек ніхто не можа сказаць праўдзівага слова пра жыццё народа? І пра сенняшнюю інтэлігенцыю. Не бачаць? Баяцца? А вось А. Зіноўеў з Мюнхена, У. Максімаў з Парыжа бачаць і цэляць у дзесятку.

А. Зіноўеў у «Правде»: «Завершение русской контрреволюции». Вельмі слушна: адбылася контрреволюция и завершилася она 4 октября 1993 года — расстрэлам парламента.

Бязлітасная, але праўдзівая ацэнка ролі інтэлігенцыі:

«Россейская, холуйская по натуре, интеллигенция подготовила население страны к эпидемии предательства, начавшейся в 1985 году, всячески поддерживала процесс разрушения страны и в конце концов оправдала все преступления правящих клик.

Все политическое пространство России уже захватили дилетанты, демагоги, тщеславные болтуны, мракобесы, невежды, перевертыши, предатели, мелочные хитрецы и интриганы, шкурники, хапуги, трусы, приспособленцы, явные дураки и даже просто клинические шизофреники».

Зіноўева дапаўняе У. Максімаў:

«В самом деле, кто, кроме отъявленных негодяев этого цвета, мог бы дозволить себе в катастрофически нищающей стране так откровенно, так напоказ окружить себя столь вызывающей роскошью и довольством? Кто, кроме них, посмел бы среди бела дня, на глазах у всего мира расстрелять свой собственный народ?»

Максімаў гаворыць добрае слова пра Аляксандра Лукашэнку і дае аплявуху Анатолю Казловічу, які яшчэ ў жніўні, не ведаючы, як плюнуць на прэзідэнта, нічога лепшага не прыдумаў, як папракнуць Аляксандра Рыгоравіча: «Не у всех богатых есть, как у президента, корова и 25 соток огорода, ухоженного работящей женой».

Максімаў з сарказмам ацэньвае гэты пасаж:

«Вот ведь как устроился популист: 25 соток личного огорода и работящая жена в придачу! И все это говорится и пишется козловичами на фоне чудовищного по своему размаху грабежа страны, возникновения миллиардных состояний, сделанных на криминальном перераспределении государственной собственности, беспрецедентной в истории человечества, почти узаконенной коррупции».

Максімаў канчае артыкул добрымі пажаданнямі Аляксандру Лукашэнку. Дай бог, каб яны збыліся!

Аляксандр Зіноўеў падкрэслівае: «Советский социальный строй, политическая система, система воспитания, система образования и просвещения, система жизненных ценностей, тип культуры и так далее были вершиной русской истории вообще. Это, повторяю и подчеркиваю, был оптимальный вариант «обустройства» России, вершина ее исторического бытия».

Вось так! Дысідэнт, які змагаўся з камуністамі, якога садзілі ў турму і выслалі, зразумеў гэта, бо бачыў «капіталістычны рай». А нашы «камуністы», што купаліся ў масле пры Саветах, на ўсё забыліся. Каму і чаму моляцца? Сумна думаць пра гэта.

23 кастрычніка

Тры дні не разгортваў дзённік. Чаму? Перабраўся з гарышча, дзе не ацяпляецца, а сшытак застаўся там. Праблема была знесці? Смешна. Інерцыя. І звычка: усё каб было пад рукой, тады пішацца. Ды і падзей асаблівых не было. Усё тое ж, працяг развалу.

Не, была падзея, мая творчая. Ігар Дабралюбаў паказаў гатовы фільм па «Зямным раі» і «Вернісажы». Не ўсім я задаволены, не ўсе мае пажаданні ён выканаў. Але ўвогуле — бомба, абвінаваўчы акт часу і «дэмакратам». Эдуард Гарачы ў ролі Івана больш натуральны, чым Белахвосцік у ролі Рачыцкага: не сыграў ён трагедыю ў заключнай сцэне — размове з Іванам адзін на адзін. Хоць у цэлым Белахвосцік уражвае. Некалі я меў не вельмі высокую думку пра яго талент. Андрэй аспрэчваў, Андрэй цаніў яго высока, толькі казаў, што ён з тых акцёраў, якім патрэбны добры рэжысёр. Дабралюбаў не памыліўся: лепшага бадай што ў нас няма. Хіба Федзя Шмакаў?

Між іншым, Аляксандра іванаўна Клімава геніяльна сыграла Веру, жонку Рачыцкага. Па сутнасці без слоў — тры фразы. Што значыць школа! Я бачыў на гэтую ролю Машу Захарэвіч, казаў Ігару Міхайлавічу, але ён бачыў па-свойму і ... не памыліўся: Клімава, бадай, лепш. Таццяна Мархель выконвае песню, якая расчуліла да слёз не аднаго мяне. Таццяна — самародак, але ёй, па-мойму, не хапае сцэнічнай школы, яна, як і Галіна Макарава, да ўсяго даходзіць сама, чуццём сваім, арганічнай народнасцю. Яны ад зямлі, з сялянскай хаты. Яны, магчыма, не да канца асвоілі геніяльную сістэму Станіслаўскага, але яны не далі Эрыну і іншым «наватарам» сапсаваць свой талент, свой божы дар. Маладзейшыя клююць на «ноўствы» і псуюць сябе, свой талент. Не вырасце з іх ні Ждановіч, ні Платонаў, ні Дзядзюшка, ні Станюта, ні Макарава, ні Захарэвіч. Яны будуць няшчасныя пад старасць. Але ніхто з іх не скончыць так, як вялікі мастак Рачыцкі: выгадна прадаў карціны ў Галандыю — і жыццё скончылася. Жах!

Які будзе лёс фільма? Сапсавалі густ людзей амерыканскай секскультурай. Фільм хораша глядзеўся б старэйшым пакаленнем, але пенсіянеры ў кіно, тэатры не ходзяць — дорага. Людзі даведзены да жабрацтва.

Папрасіў у дырэктара студыі Ю. Цвяткова хоць сотню тысяч авансу за сцэнарый. А ён выпісаў поўны разлік. Я не адразу сцяміў, што Цвяткоў схітраваў: дырэктар ёсць дырэктар. «Танцуем» зараз пры аплаце ад мінімальнай зарплаты. З першага лістапада яна будзе падвоена — 20 тысяч. Лапух я! Напрасіўся, дурань! Атрымаў 840 тысяч, і раней — 200. Мільён. Гучыць. А што купіць за яго можна? У дзесяткі разоў менш, як за 6 тысяч — аўтарскі ганарар у той залаты век, аплёваны «дэмакратамі».

Лукашэнка скасаваў сельскія Саветы і раённыя ў гарадах. ВС падтрымаў. Я не прыдаў значэння спачатку, хоць думаў, як можна ў двухмільённым Мінску засяродзіць усе службы ў гарадскім Савеце.

Са спазненнем Віктар Піскароў узняў пытанне на сесіі, што ліквідацыя Саветаў — не канстытуцыйная акцыя. Сабраў належную колькасць дэпутацкіх подпісаў для звароту ў Канстытуцыйны суд. Лукашэнка пакрыўдзіўся: не даюць яму ўзяць усю ўладу ў яго рукі.

А ўчора зноў падаражаў хлеб. Во і ўсе перадвыбарныя абяцанні! Ці вымаліў прэзідэнт у Ельцына і Чарнамырдзіна газ і нафту, каб не замерзлі? Абяцаныя 12 градусаў у кватэрах — гэта катастрофа для старых і дзяцей. Тут, на дачы, наганяем градусы 22, і ў мяне мерзнуць ногі. Мярзляк. Гады не грэюць.

25 кастрычніка

Памёр Анатоль Вялюгін. Яшчэ адзін равеснік. Сумна. У канцы красавіка ў часе з'езда мы сядзелі ў Віктара Лужкоўскага, бралі чарку. Анатоль быў у сваім амплуа: добра піў, многа гаварыў, здзіўляў мяне сваёй дасведчанасцю. Я перад тым не бачыў яго гады тры, можа. Ён моцна распаўнеў. Нехта пажартаваў: Чэрчыль. А Таццяна Кузьмінічна паведаміла, што памёр ён ад раку, моцна схуднеў. За пяць месяцаў! Чалавек ён быў парадаксальны. Ва ўсім. Думаю, што моцна раздвоены, з грузам на душы. Ва ўсялякім разе не ад добрага жыцця жонка яго выкінулася з сёмага паверха. Неўзабаве пасля смерці жонкі новая трагедыя — смерць адзінай дачкі: згарэла п'яная. Але Толя, здавалася, легка перажыў такія трагедыі: ажаніўся з маладзейшай.

Вялюгін меў магутны арганізм. Мяне заўсёды здзіўляла: столькі піць і мець такую памяць — фенаменальную. Па веданні паэзіі, беларускай, рускай, сусветнай, Анатоль Сцяпанавіч быў хадзячай энцыклапедыяй. Я сам неаднойчы звяртаўся да яго за даведкамі, калі пісаў артыкулы галоўным рэдактарам «Энцыклапедыі».

Вялікім паэтам Вялюгін не быў. Але па меншай меры тры пасляваенныя дзесяцігоддзі быў адметнай і значнай фігурай у нашай літаратуры. Не занімаючы кіруючых пасад, знаходзіўся ў цэнтры літаратурнага жыцця. Па-першае, быў лідэрам усіх выпівак, лідэрам літаратурнай багемы. Па-другое, зза сваёй памяці, паэтычнай эрудыцыі меў заслужены літаратурны аўтарытэт. Маладыя паэты яго любілі.

Здзіўляла не толькі яго паэтычная эрудыцыя, але і яго дасведчанасць пра людзей, падзеі. Ён не часта ездзіў у Маскву, але сябраваў з рускімі паэтамі і ведаў усе тайны літаратурнага алімпа, усе тайны «мадрыдскага двара» - вярхоў.

Нашых партызанскіх камандзіраў, жывых і мёртвых, ведаў, як мала хто з нас, хто пісаў на гэтую тэму. Праўда, ён любіў выпіць з імі — з партызанскімі камандзірамі. Менавіта – з партызанскімі, з армейскімі такой сувязі не меў. Былі ў яго сябры і ў МУС, і ў КДБ. Але

сувязі з імі ён не афішыраваў, як, напрыклад, Аляксандр Міронаў сваю дружбу з міліцыяй; Саша выручаў усіх пісьменнікаў, каго лавіла ДАІ.

Я захаваю пра цябе, Анатоль, увогуле добры ўспамін як пра чалавека неардынарнага.

29 кастрычніка

Прачытаў у «Полымі», нумар 10, артыкул Данілы Міцкевіча «Не тыя сцежкі» — водпаведзь на мае дзённікі, апублікаваныя яшчэ ўлетку 1993 года, на тыя яго мясціны, дзе я зрабіў спробы больш рэалістычна, па-чалавечы, без іконописи ўспомніць пра Якуба Коласа. Дагэтуль жа мы пісалі іконы. І я ў тым ліку. І да гэтага так прывыклі, што мая «Аповесць пра сябра» — пра Андрэя (хто лепш знаў яго?) выклікала гнеўнае абурэнне некаторых «рэалістаў».

Безумоўна, за 40 гадоў шмат якія дэталі забыліся. Безумоўна, сын, блізкія, сакратар Коласа помняць лепш. Яны, аўтары допісу, пішуць, што «аўтар мог бы пасля паглядзець газеты і часопісы адпаведных гадоў, прачытаць даследаванні навукоўцаў, пазнаёміцца з матэрыяламі фондаў музеяў, пагаварыць з жывымі яшчэ сучаснікамі». Мог. Але гэта быў бы ўжо не дзённік, а даследаванне. А дзённік ёсць дзённік, ён апавядае пра падзею дня, а падзея цягне асацыятыўна ўспамін. Так пішу я. Па-мойму, самае каштоўнае ў дзённіку яго суб'ектыўнасць — аўтар са сваімі думкамі, няхай памылковымі.

Каб да прачытання не было званка Георгія Коласа, я моцна здзівіўся б злаславасці добрага Данілы. Пасля апублікавання дзённікаў мы не раз сустракаліся, я быў яго госцем, піў каньяк, і ён жартоўна выказваў заўвагі па недакладнасцях. Галоўнае, што стварылі культ Коласа. «Культ Шамякіна — большы. Колас не быў старшынёй Вярхоўнага Савета, а Шамякін быў. Колас — не Герой Сацпрацы, Шамякін — Герой...» Астатняе дробязі.

А тут раптам Даніла піша: «...усё сказанае Шамякіным пра Коласа не адпавядае сапраўднасці. Літаральна ўсё! Усё без выключэння!» Во так. Прачытаўшы, можа, і я дапяў бы да гэтай здагадкі. Але прасвяціў Георгій. Аўтар пісьма вядомы.

Праўда, Даніла ўсё ж дапісаў пра наша сяброўства і пра мае заслугі перад ушанаваннем памяці Коласа.

Учора закончылі дачны сезон. Пераехалі ў горад. Цёпла. Утульна... Пакуль што цёпла. Што будзе далей?

5 лістапада

Праходзіла пасяджэнне рады СП. Пытанне: аб выданнях і распаўсюджанні беларускай літаратуры. Ставім гэтае пытанне за маю бытнасць разоў 30. Заўсёды гаварылі гнеўна ў адрас чыноўнікаў, якія душылі беларускую мову, беларускую літаратуру. Можа, нават больш гнеўна, чым гаварылі ў гэты раз. Але тады Броўка, Танк, Шамякін ішлі ў ЦК, дакладвалі аб гэтым гневе і нешта выбівалі: выдавецтвы, часопісы, пастанову аб кніжным гандлі, крытыку міністраў асветы, культуры, «Белспажыўсаюза», а тады яны баяліся крытыкі зверху — з ЦК. Ва ўсялякім разе пры, безумоўна, ненармальным становішчы з мовай ніхто з нас не баяўся, што заўтра не выйдуць «Полымя», «Неман», «Маладосць». Гэта было б ЧП, за гэта паляцелі б галовы. А цяпер пагроза такая вісіць і нікому няма справы. Да каго пойдзеш са скаргай? Прэс-сакратар прэзідэнта ў прэсе заяўляе, што трэба зняць датацыю з часопісаў, няхай зарабляюць самі. Ха! Чым заробім? Я сказаў пра тое, што было. Вярцінскі кінуў рэпліку: «Дык, можа, вернем ЦК?» Мудрэц! А было б няблага вярнуць. Каб толькі без дурняў і здраднікаў, рэнегатаў.

Спадзяванне на прэзідэнта. Вырашылі прасіцца на прыём. Але надзеі на тое, што наступіць для нашай літаратуры залаты век, такой надзеі няма. Быў залаты век. Сапраўды, залаты, бо не губляўся ніводзін таленавіты чалавек.

Данілу я пазваніў. Сказаў: «Добры ты адлуп даў мне». Задаволены дзед. Старыя што малыя.

Учора быў на «каласавінах» — штогодніх коласаўскіх чытаннях пад дзень яго нараджэння. Выслухаў 17 дакладаў. Некаторыя па-новаму асэнсоўваюць і эпізоды жыцця, і творы. Ад паездкі ў Мікалаеўшчыну адмовіўся. Сёння паехалі. Але Ала і Вера самога Данілу не пусцілі. І правільна. 80 ёсць 80. Сядзеў ён на канферэнцыі сумны і задумлівы — як у іншым свеце. Сам часам бываю ў такім стане. Хто сустракае смерць спакойна? Вялікія мудрацы ці тыя, хто, увогуле, не задумваецца над жыццём? Пэўна, яшчэ тыя, хто верыць у замагільнае жыццё. Але з гэтых — толькі малапісьменныя, у якіх вера замяняе веды.

Толькі сёння атрымаў адказ на мае пісьмо Лукашэнку — з Міністэрства культуры. Цяпер цвёрда ўпэўнены: прэзідэнт яго не бачыў. Лёс яго вырашыў Фядута. А між іншым, не дапускаю, каб мае пісьмо не паказані Машэраву, Кісялву. Нават Слюнькову. А Лукашэнку можна не паказаць: што для іх стары дзед, хоць ён і народны і акадэмік! Во і ўся дэмакратыя. А простыя людзі пішуць і вераць, што іх прачытае прэзідэнт. Што ж, наіўнасць — гэта лепшая форма

адгараджэння ад жыццёвага свінства, асабліва ад таго, якое цяпер імянуюць дэмакратыяй.

12 лістапада

Прэзідэнт вярнуўся пасля лячэння і адразу — на экран. Выступленне яркае. Але адчуванне супярэчлівае. Пагрозы, пагрозы... Такі прэзідэнцкі стыль? Да такога рэдка даходзіў нават Ельцын. Кулакамі махаць — слабасць! Таму і здалося мне, што Аляксандр Рыгоравіч разгублены.

Акцыяй з цэнамі ён адновіць сваю папулярнасць. Крок рашучы. Але мне, грэшнаму, слаба верыцца, што цэны павышалі без яго ведама, у яго адсутнасць. Спадзяваліся, што народ праглыне і гэтую жабу? Уладзімір Ягораў данёс, што народ — вулкан перад звяржэннем: глухі падземны гул. Трэба выпускаць пару. А калі рабілі без яго, без прэзідэнта, тым горш: не кіруе, значыцца, сітуацыяй, не валодае і каманда адчувае гэта. Ці нюанс: добра ведалі, што ён пойдзе на гэты крок — верне цэны. Гэта дасць яму папулярнасць, але гэта разваліць бюджэт і вымусіць прэзідэнта праз месяц узняць цэны.

А я ўяўляю, як гандлёвая мафія пагрэе рукі — спачатку на павышэнні, пасля на паніжэнні цэн за такі тэрмін, за два дні, выхадныя.

Так дзяржава не можа жыць!!!

Пагражаць кулаком ВС — глупства. Паўтор пройдзенага: расстрэлу «белага дома». Каму патрэбны такія лаўры? Але ўлада п'яніць, як наймацнейшы наркотык.

«Цэнтральная газета» запрасіла за «круглы стол» на размову аб ролі інтэлігенцыі ў наш час. Злосна я гаварыў пра інтэлігенцыю — як Максімаў.

Між іншым, Генадзь Пашкоў (галоўны рэдактар «Цэнтральнай газеты»), адзін з тых, хто рабіў у ЦК, не перавярнуўся, і гэта робіць яму гонар.

Сядзеў у Бутэвіча. Тэлефонны званок. Размова. З кім? З Пячэннікавым. Дзе ён? Прэзідэнт фірмы. Яшчэ адзін ідэолаг марксізму! Але і прэзідэнты яны, па-руску кажучы, непорядочные. Адзін такі прэзідэнт, былы загадчык аддзела ГК А. Варывончык, узяўся выдаць «Злую зорку» па-руску. Здаў рукапіс у жніўні 1993 года. Набралі. Прачыталі з Таццянай карэктуру. І... пшык. Тры месяцы не магу яму дазваніцца. А калі трэба было падтрымаць Кебіча і падпісаць заклік да В, Новікава зняць сваю кандидатуру, ён, Варывончык, знайшоў мяне на дачы.

...Успомніў Бутэвіча... Учарашні гнеў прэзідэнта на сродкі інфармацыі яўна паставіў крыж на Толевай кар'еры. Чацвёрты месяц чакае ўказа, цягнучы лямку неназначанага міністра. Анатоль, у гэтай,

«фядуцінай сітуацыі», найлепшы міністр — для нас, пісьменнікаў, ён, як ніхто з чыноўнікаў, разумее, што значыць для культуры, для мовы беларуская літаратура.

18 лістапада

Учора праходзіў вечар 35-годдзя музея Коласа і 80-годдзя Данілы. Даніла званіў мне, запрашаў на вечар, сказаць слова не прасіў. Ды я і не рваўся. У ліку прамоўцаў быў і Барадулін. Заглянуў у пісьменніцкі даведнік і вельмі здзівіўся, што ў ліку членаў СП няма Данілы. «Толькі за апошнюю публікацыю яго варта прыняць». Публікацыя — аспрэчванне маіх успамінаў пра Коласа. Мы з Данілам паразумеліся, паспрачаліся. Падумаеш, праблема! Недакладнасці ці суб'ектывізм некаторых выказванняў пры глыбокай павазе да Коласа. Так зразумелі дасведчаныя і добразычлівыя слухачы: сёння пазваніла Вольга Васільеўна Казлова. Ды гэта дробязі.

Перад вечарам з кабінета Зуёнка званіў Ніне Марчанка. Наша глыбокапаважаная Ніна была памочніцай у Сняжковай, у Мазай, рабіла ў аддзеле Саўміна, зараз — у структуры прэзідэнта. З ёй прыемна пагаварыць, яна добрая. Гаварыў пра паход групы пісьменнікаў да прэзідэнта. Але за тры тыдні кіраўнікі СП так і не дамовіліся пра такую сустрэчу. Прэзідэнту не пазвоніш. Я, ідэаліст, усё яшчэ веру... у шчырасць яго веру. Хоць ёсць ужо сімптомы шчырых слоў і... няшчырых спраў. Гэта небяспечна. Для народа. І для яго. Так робяцца палітыканамі тыпу Ельцына.

Сталін і Гітлер умелі палітыканства прыкрыць высокімі ідэямі, адзін — перамогай сацыялізму, другі — узвышэннем арыйскай расы, выбранасцю немцаў, іх прызначэннем панаваць ва ўсім свеце.

У Клінтана ёсць ідэя: Амерыка вышэй за ўсіх! А ў нашых сённяшніх якія ідэі? Накарміць народ? Не накормяць. Захад замежнымі прадуктамі не накорміць. Але і за іх трэба плаціць, і добра плаціць. Чым? Пакорнасцю? Рабалепствам?

У Лукашэнкі нават нацыянальная ідэя слабая. А без гэтай апоры лёгка трапіць у сеці касмапалітызму.

26 лістапада

Сход сесіі АН. Выступіў Лукашэнка. Мне падабаюцца яго выступленні яны прывабліваюць шчырасцю. Акцёр. І палітык. Дарэмна некаторыя хмыкалі: дырэктар саўгаса. А якая адукацыя была ў Гітлера, у Сталіна? Можна заглянуць і глыбей: у Напалеона. Я сказаў: палітык. Можа вырасці і палітык. Справа іншая, што прастору яму мала – звязаны, і многія яго абяцанні, у якія сам ён верыць,

павісаюць у паветры ці лопаюцца, як пухіры. У наш час назалежных у поўным сэнсе мала, у поўнай меры хіба Кітай. Незалежных ад ЗША, "сямёркі", якую ўзначальвае супердзяржава, МВФ, НАТО і г. д.

У Лукашэнкі адна памылка: набор у камамду непрафесіяналаў. Дарэмна ён разганяе ўсіх кебічаўцаў: чыноўнікі, якія ведаюць справу і навучыліся красці культурна, служылі б яму гэтак жа верна, як Кебічу, як ЦК. А Лукашэнка набірае дылетантаў.

Але аб выступленні. Галоўнае не форма — змест. Яно, выступленне прэзідэнта, узбадзёрыла акадэмікаў — усіх, хто робіць у АН. Бо ўстанову гэтую ўжо адпявалі — пасля інтэрв'ю некаторых памочнікаў (Ганчара): тыя сцвярджалі, што навука павінна развівацца ў ВНУ. Павінна, але... 300 гадоў яна ў Расійскай імперыі засяроджана ў АН. Бурсак Сталін гэта выдатна разумеў. Знішчэнне АН — канец фундаментальней навуцы.

Прэзідэнт абвясціў, што АН будзе жыць як дзяржаўная структура, будзе фінансавацца лепш, чым дагэтуль, маю на ўвазе гады «незалежнасці».

Штрых, як ваююць за партфелі. Размаўляю з Л. Гулякам (быў загадчык аддзела ў СМ, намеснік міністра культуры, цяпер — начальнік канцылярыі ў Ганчара; між іншым, раней у віцэ-прэм'ера быў адзін памочнік, цяпер — загадчык канцылярыі, галоўны саветнік, саветнікі і яшчэ не адзін чалавек). Кажу Гуляку: «Што вы так мучыце Бутэвіча?» — «Бутэвіч не праходзіць. Давайце кандыдатуру».

Праз гадзіну гавару з Ганчаром, і той: «З Бутэвічам уладзілася. Указ на стале ў прэзідэнта».

Бяссонніца. На дачы хораша спаў. Прачынаюся пасярод ночы і валяюся дзве-тры гадзіны. І што толькі не лезе ў галаву! Во каб запісаць. Такога яшчэ ніхто не стварыў, ніякі Кафка і Пруст. Паток, мутны, успамінаў, разваг, гіпотэз, меркаванняў, спадзяванняў, самых неверагодных. Ад праблем глабальных, касмічных да бытавых дробязяў.

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

Шамякін І.

Роздум на апошнім перагоне: Дзённікі 1980-1995 гадоў.— Мн.; Маст. літ., 1998, — 527 с.

ISBN 985-02-0187-8

«Роздум на апошнім перагоне» — так назваў народны пісьменнік Іван Шамякін кнігу сваіх дзённікаў-успамінаў. Пісьменнік, які многія дзесяцігоддзі быў у цэнтры літаратурнага і грамадскага жыцця, пятнаццаць апошніх гадоў, з перапынкамі, вядзе дзённікі. Але гэта не толькі запісы падзей бягучага дня. Расказ пра сваё маленства, пра дзеда, бацьку, маці, пра жонку, дзяцей, сваякоў. Расказ пра людзей, з якімі разам ваяваў у суровыя гады ваеннага ліхалецця. А галоўнае — успаміны пра літаратурных настаўнікаў, сяброў, паплечнікаў — пра Коласа, Лынькова, Броўку, Макаёнка, Мележа, Пестрака, пра некаторых рускіх, украінскіх пісьменнікаў. Цікавыя ўспаміны пра вядомых грамадскіх дзеячаў — Машэрава, Кісялёва, Палякова, Клімава. Нарэшце, чытача не могуць не зацікавіць водгукі пісьменніка на падзеі апошніх гадоў — гадоў развалу ілюзій і рэальнага жыцця.

УДК 882.6-4 ББК 84(4Бей)6
ISBN 985-02-0187-8